Мінск
«Вышэйшая школа»
1977

СКЛАЛІ
К. П. КАБАШНІКАЎ, А. С. ЛІС,
А. С. ФЯДОСІК, І. К. ЦІШЧАНКА

Навуковы рэдактар
прафесар М. Р. Ларчанка

МІНСК
«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»
1977

# БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР

## ХРЭСТАМАТЫЯ

ВЫДАННЕ ДРУГОЕ,
ДАПОЎНЕНАЕ

Дапушчана Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР як вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў

8С Бел
Б 43

Рэцэнзенты

Кафедра беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта; кандыдат філалагічных навук *Н. С. Гілевіч.*

**Беларускі** фальклор. Хрэстаматыя. Выд. 2-е, дап.
Б 43 Склалі К. П. Кабашнікаў, А. С. Ліс, А. С. Фядосік, І. К. Цішчанка. Мінск, «Вышэйш. школа», 1977.
840 с. з іл.

Вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ па курсу «Беларуская вуснапаэтычная творчасць».

У хрэстаматыю ўключаны выказванні класікаў марксізма-ленінізма, рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў аб фальклоры, а таксама фрагменты з прац заснавальнікаў беларускай і ўкраінскай літаратур, падаюцца апісанні звычаяў і абрадаў, уключаны як ужо вядомыя, так і навейшыя запісы традыцыйнага і сучаснага фальклору, даюцца методыка і праграма збірання фальклору.

Б $\frac{70700-011}{М 304(05)-77}$ 124—77 **8С Бел**

© Выдавецтва «Вышэйшая школа», 1977.

# АД СКЛАДАЛЬНІКАЎ

Другое, дапоўненае і перапрацаванае выданне хрэстаматыі «Беларускі фальклор» падрыхтавана ў адпаведнасці з новай праграмай для ВНУ рэспублікі «Беларуская вуснапаэтычная творчасць».

Першае выданне выйшла пад рэдакцыяй акадэміка П. Ф. Глебкі. Як вучоны і як дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР ён многа зрабіў для развіцця фалькларыстыкі.

Кніга атрымала станоўчую ацэнку навукова-педагагічнай грамадскасці. У той жа час у апублікаваных рэцэнзіях быў выказаны шэраг заўваг і пажаданняў.

Рукапіс другога выдання хрэстаматыі абмяркоўваўся на пасяджэннях кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і каардынацыйнага навуковага савета па праблеме «Вуснапаэтычная творчасць і быт беларусаў». Складальнікі ўлічылі заўвагі, зробленыя ў друку і пры абмеркаваннях, перапрацавалі і дапоўнілі раздзелы, а таксама склалі новыя. Так, уведзены новы раздзел «Легенды і паданні», дзе сабраны ўзоры апавядальных жанраў, якія да апошняга часу выпадалі з увагі даследчыкаў беларускага фальклору. Вылучаны асобны раздзел «Дзіцячы фальклор», што дае магчымасць шырэй азнаёміцца яшчэ з адным багатым своеасаблівым раздзелам фальклорнай спадчыны. Значна пашыраны раздзелы. «Заснавальнікі марксізма-ленінізма аб фальклоры і рэвалюцыйнай паэзіі», «Пісьменнікі і дзеячы культуры аб вуснай народнай творчасці», «Каляндарна-абрадавая паэзія», «Сямейна-абрадавая паэзія», «Пазаабрадавая песня», «Прыказкі і прымаўкі», «Загадкі». Прыкметна абноўлены матэрыялы іншых раздзелаў, дапрацаваны або напісаны нанава прадмовы. Зменена структура раздзела «Беларускі савецкі фальклор». Творы размяшчаюцца па жанрах у храналагічна-тэматычным парадку.

Раздзелы падрыхтавалі: К. П. Кабашнікаў — «Асаблівасці і значэнне вуснапаэтычнай творчасці», «Казкі», «Легенды і паданні», «Гераічны і гістарычны эпас», «Фальклор рабочых. Паэзія змагання», «Методыка збірання фальклору»; А. С. Ліс — «Каляндарна-абрадавая паэзія», «Народ-

на-рэвалюцыйная паэзія Заходняй Беларусі»; А. С. Фядосік — «Заснавальнікі марксізма-ленінізма аб фальклоры», «Сямейна-абрадавая паэзія», «Прыказкі і прымаўкі», «Анекдоты», «Народна-паэтычная творчасць савецкага часу»; І. К. Цішчанка — «Замовы», «Загадкі», «Пазаабрадавыя песні», «Дзіцячы фальклор», «Частушкі», «Народны тэатр». Раздзел «Пісьменнікі і дзеячы культуры аб вуснай народнай творчасці» склалі А. С. Ліс і І. К. Цішчанка.

Складальнікі выказваюць шчырую падзяку загадчыку кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта М. М. Грынчыку, дацэнту Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Н. С. Гілевічу, загадчыку кафедры беларускай літаратуры Брэсцкага пед-інстытута У. А. Калесніку, загадчыку кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага дзяржаўнага педінстытута Я. К. Усікаву, дацэнтам Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута А. М. Пяткевічу і М. Я. Янкоўскаму, прафесару Башкірскага дзяржаўнага універсітэта Л. Р. Барагу і іншым таварышам, слушныя заўвагі і парады якіх садзейнічалі паляпшэнню кнігі.

# УВОДЗІНЫ



# АСАБЛІВАСЦІ І ЗНАЧЭННЕ ВУСНАПАЭТЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Вусная народная паэзія — эпічныя, лірычныя і драматычныя творы, народжаныя калектыўным мастацкім геніем працоўных — важная і неад'емная частка духоўнай культуры чалавецтва. У ёй адлюстраваны мары і спадзяванні людзей працы, іх гісторыя, быт, гаспадарчы вопыт, грамадска-палітычныя і эстэтычныя ідэалы. Яна — адна з крыніц развіцця літаратуры і прафесійнага мастацтва.

У большасці тэарэтычных прац і падручнікаў, што з'явіліся ў апошнія гады, вуснапаэтычная творчасць, або фальклор, вызначаецца як калектыўная паэтычная творчасць працоўных мас. Тэрмін «фальклор» — англійскага паходжання, ён узнік у сярэдзіне XIX ст. і даволі хутка стаў міжнародным. Побач з ім ужываюцца тэрміны «народная паэтычная творчасць», «вуснапаэтычная народная творчасць», «народная паэзія», якія падкрэсліваюць, што перад намі паэзія, створаная народам, аб ролі якога ў гісторыі сусветнай культуры А. М. Горкі пісаў: «Народ — не толькі сіла, якая стварае ўсе матэрыяльныя каштоўнасці, ён — адзіная і невычэрпная крыніца каштоўнасцей духоўных, першы па часу, хараству і геніяльнасці творчасці філосаф і паэт, што стварыў усе вялікія паэмы, усе трагедыі зямлі і найвялікшую з іх — гісторыю сусветнай культуры».*

Фальклор — адзін з відаў народнага мастацтва, які адлюстроўвае рэчаіснасць у вобразах, створаных пры дапамозе паэтычнгаа слова. Народная паэзія дае нам сапраўдныя ўзоры мастацкай дасканаласці, што адзначалі вялікія мысліцелі і паэты розных часоў і народаў. К. Маркс, раскрываючы сакрэты ўздзеяння на сучаснікаў мастацтва старажытнасці, пісаў, што грэчаскае мастацтва і эпас у пэўным сэнсе захоўваюць значэнне нормы і недасягальнага ўзору.** Аб высокім мастацкім узроўні фальклорных твораў вельмі пераканаўча гаварыў на І з'ездзе савецкіх пісьменнікаў А. М. Горкі:

---

* *Горький М.* О литературе. М., 1953, с. 48.

** К. Маркс и Ф. Энгельс об искусстве, т. 1. М., 1967, с. 121.

«Я зноў звяртаю вашу ўвагу, таварышы, на той факт, што найбольш глыбокія і яркія, мастацкі дасканалыя тыпы герояў створаны фальклорам, вуснай творчасцю працоўнага народа».* «Самым высокім відам мастацтва, самым таленавітым, самым геніяльным» ** назваў народную творчасць М. І. Калінін.

Адна з важнейшых спецыфічных рыс народнай вуснапаэтычнай творчасці — калектыўнасць. У калектыўнасці заключаны вытокі высокага мастацкага майстэрства і ідэйнай глыбіні фальклору, з калектыўнасцю звязаны многія яго асаблівасці. «Толькі пры ўмове суцэльнага мыслення ўсяго народа,— пісаў М. Горкі,— магчыма стварыць такія шырокія абагульненні, геніяльныя сімвалы, якімі з'яўляюцца Праметэй, Сатана, Геракл, Святагор, Ілья, Мікула і сотні іншых гіганцкіх абагульненняў жыццёвага вопыту народа».***

Калектыўнасць вуснай народнай паэзіі — гэта не звычайнае сааўтарства, а своеасаблівы і працяглы працэс мастацкай творчасці, працэс ідэйнага і паэтычнага ўдасканалення песень, казак, легенд, прыказак, прымавак. Найбольш ярка праяўляецца калектыўнасць у пастаянным працэсе адбору і шліфоўкі твораў народнай паэзіі: з многіх і многіх складзеных калі-небудзь твораў народ выбірае і захоўвае, шліфуючы дзесяцігоддзямі, толькі самае лепшае, сугучнае яго думкам і эстэтычным поглядам. Калектыўнасць таксама праяўляецца і ў існуючых на кожным гістарычным этапе пэўных фальклорна-эстэтычных нормах, выпрацаваных калектывам, у межах якіх ствараецца кожны новы твор, і ў багацці сродкаў мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, накопленых за стагоддзі, якімі шырока карысталіся і карыстаюцца невядомыя аўтары фальклорных твораў, і ў комплексе ідэй, народжаных жыццём і барацьбой народа, якія ўвасабляюцца ў мастацкіх вобразах вуснапаэтычнай творчасці.

Калектыўны пачатак у фальклоры, які з'яўляецца галоўным і вызначальным, не супрацьстаіць індывідуальнаму пачатку. Фальклору ўласціва арганічнае адзінства калектыўнага і індывідуальнага, пры якім калектыўнасць не перашкаджае праяўленню індывідуальных здольнасцей складальнікаў і выканаўцаў. Ад таленту казачніка, спевака ў значнай ступені залежыць мастацкі ўзровень твора і яго ўспрыняцце слухачамі: сапраўдны выканаўца добра валодае голасам, мімікай, рухамі, ён заўсёды імправізуе, перадае свае адносіны да падзей, аб якіх апавядае.

З калектыўнасцю народнай творчасці арганічна звязана вусная форма бытавання фальклору. Фальклор узнік раней, чым пісьменнасць, і, натуральна, бытаваў толькі ў вуснай перадачы. У эпохі феадалізму і капіталізму пры амаль суцэльнай непісьменнасці працоўных перадача з вуснаў у вусны таксама была адзіным шляхам распаўсюджвання фальклору. Такім шляхам

* *Горький М.* О литературе, с. 698.
** *Калинин М. И.* Об искусстве и литературе. М., 1957, с. 155.
*** *Горький М.* О литературе, с. 49.

народ знаёміўся не толькі з песняй, казкай, прыказкай, прымаўкай, легендай, але і з лепшымі ўзорамі пісьмовай літаратуры.

Аднак вуснасць як адна з спецыфічных асаблівасцей фальклору не павінна разглядацца толькі як вынік непісьменнасці працоўных мас да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вуснае бытаванне — гэта адна з неабходных умоў працэсу мастацкага ўдасканалення народных твораў, адбору лепшага з мастацкай спадчыны. У наш час, час суцэльнай пісьменнасці і тэхнічнага прагрэсу, друк, радыё, тэлебачанне спрыяюць масаваму распаўсюджванню народнай паэзіі, прапагандзе лепшых яе ўзораў, аднак яны не кананізуюць тэкст, не спыняюць бесперапыннага працэсу паэтычнай шліфоўкі фальклорных твораў.

Вуснае бытаванне народнай паэзіі вядзе да стварэння варыянтаў аднаго і таго ж фальклорнага твора, якія адрозніваюцца паміж сабой пэўнымі зменамі. Запісана, напрыклад, некалькі варыянтаў вядомай беларускай народнай песні пра Бандароўну, казкі «Дурны воўк», легенды «Вялікі грэшнік» і многіх іншых твораў.

Калектыўнасць, вуснасць бытавання, варыянтнасць — рысы, якія ўласцівы толькі фальклору і якімі ён прынцыпова адрозніваецца ад мастацкай літаратуры. Фальклорныя творы адрозніваюцца ад твораў пісьмовай літаратуры і некаторымі асаблівасцямі мастацкай формы. Да гэтых асаблівасцей у першую чаргу адносіцца традыцыйная паэтыка, выпрацаваная народам на працягу стагоддзяў. Традыцыйная народная сімволіка, разнастайныя формы паралелізмаў, пастаянныя эпітэты, метафары, параўнанні і іншыя віды тропаў, асаблівасці кампазіцыі надаюць вуснай паэзіі спецыфічны каларыт. Гэтыя мастацкія сродкі характэрны і для старадаўніх класічных форм народнай творчасці, і для многіх твораў, што ўзнікаюць у наш час, хаця, бясспрэчна, паэтыка савецкага фальклору набывае і новыя рысы.

Фальклор адрозніваецца ад пісьмовай літаратуры і асаблівасцямі тыпізацыі. Літаратуры рэалістычных напрамкаў уласціва стварэнне тыповых характараў у тыповых абставінах. Тыповы характар, адлюстроўваючы асноўныя рысы свайго сацыяльнага асяроддзя і сваёй эпохі, праяўляецца праз індывідуальныя якасці героя, праз яго індывідуальнае і непаўторнае аблічча. Вобразы вуснапаэтычнай творчасці не маюць такой індывідуалізацыі. Як пісаў праф. У. І. Чычараў, «у фальклоры мы маем уласна не тыповыя характары, а тыповыя вобразы, якія абагульняюць якасці людзей. Напрыклад, Іван — адзін і той жа ў розных казках: розныя мянушкі яго — сялянскі сын, дурань, царэвіч і інш.— толькі вар'іруюць дэталі вобраза, але не змяняюць яго сутнасці».* Да асаблівасцей фальклору належыць і тое, што мастацтва слова тут вельмі цесна звязана з музычным мастацтвам, харэаграфіяй і неаддзельна ад працэсу выканання.

Узнікненне фальклору адносіцца да глыбокай старажытнасці і звязана з працоўнай дзейнасцю чалавека, з яго барацьбой за падпарадкаванне сіл

* *Чичеров В. И.* Русское народное творчество. М., 1959, с. 14.

прыроды. «Прызнана і ўстаноўлена,— пісаў А. М. Горкі,— што мастацтва слова нарадзілася ў глыбокай старажытнасці з працэсаў працы людзей. Прычынай узнікнення гэтага мастацтва служыла імкненне людзей да арганізацыі працоўнага вопыту ў моўных формах, якія найбольш лёгка і трывала замацоўваліся ў памяці,— у формах двухрадкоўяў, «прыказак», «прымавак», працоўных лозунгаў старажытнасці».* Далейшае развіццё народнай паэзіі таксама было звязана з працоўнай дзейнасцю чалавека, з яго барацьбой за справядлівасць і сацыяльную роўнасць.

Ідэі справядлівасці, сацыяльнай роўнасці заўсёды ўласцівы народнай паэзіі, якая адлюстроўвае думы, запаветныя мары і пачуцці працоўных, іх адвечнае імкненне да свабоды, шчасця і міру. Класавы характар і народнасць фальклору якраз і праяўляюцца ў тым, што ён нясе гэтыя ідэі, перадае адносіны народа да важнейшых падзей, выказвае інтарэсы працоўных. Калі звярнуцца да беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці дакастрычніцкага часу, лёгка заўважыць, што на ўсіх этапах развіцця ў ёй моцна гучыць голас сацыяльнага пратэсту. Творы адлюстроўвалі і ў той жа час услаўлялі барацьбу супраць прыгнёту, супраць іншаземных захопнікаў. Патрыятызм працоўных мас, іх самаадданая барацьба за свабоду і незалежнасць нашай краіны, за яе роскміт ярка праявіліся ў творах савецкага часу. Выкрышталізаваныя ў фальклоры маральныя і этычныя нормы, эстэтычныя густы, адносіны да працы — гэта мараль і этыка працоўных, гэта погляды народа на мастацтва, гэта яго адносіны да працы. Аднак трэба мець на ўвазе, што не ўсе вуснапаэтычныя творы адлюстроўвалі толькі перадавыя, прагрэсіўныя і рэвалюцыйныя ідэі. Умовы жыцця працоўных мас у грамадстве, падзеленым на антаганістычныя класы, адбіліся на іх свядомасці, якой былі ўласцівы і супярэчнасці і абмежаванасць, што знайшло адлюстраванне і ў некаторых творах. Апрача таго, дзе-нідзе ў рэпертуар працоўных траплялі творы, складзеныя прадстаўнікамі пануючых класаў і царквы з мэтай прапаганды сваіх, варожых працоўным ідэй. Таму да шматлікіх твораў, якія бытавалі і бытуюць у народзе, патрэбен класавы і гістарычны падыход, які дапаможа пазбегнуць суб'ектывісцкіх памылак у іх ацэнцы і адрозніць сапраўдную народную паэзію ад твораў, якія не з'яўляюцца фальклорам. Возьмем, напрыклад, некаторыя песні і казкі эпохі феадалізму, у якіх побач з пратэстам супраць прыгнёту адбілася і абмежаванасць светапогляду сялян, якія не маглі яшчэ ведаць шляхоў вызвалення. Калі ўлічыць гістарычныя ўмовы, у якіх узнікалі творы, мы іх ацэнім станоўча. Калі ж гэтыя ўмовы ігнараваць, значная частка фальклорнай спадчыны атрымае памылковую ацэнку. Другі прыклад — духоўныя вершы. Хаця яны раней бытавалі ў вуснай перадачы, многія з іх ні па паходжанню, ні па ідэйнаму зместу нельга аднесці да народнай паэзіі. Вось чаму класавы і гістарычны падыход да вуснапаэтычнай народнай творчасці з'яўляецца адным з асноўных патрабаванняў сучаснай навукі.

---

* *Горький М.* О литературе, с. 787.

Фальклор займаў і займае важнае месца ў духоўным жыцці народа. Цяжка пераацаніць яго грамадска-палітычнае, эстэтычнае і выхаваўчае значэнне на ўсіх этапах развіцця грамадства, хоць яго роля і ўдзельная вага не заўсёды былі аднолькавымі. Народная вусная паэтычная творчасць вучыць палымяна любіць сваю радзіму, яна садзейнічае выхаванню лепшых якасцей чалавека: імкнення да свабоды, павагі да людзей, працавітасці, справядлівасці, сумленнасці, непрымірымасці да недахопаў і інш. Народная паэтычная творчасць выхоўвае пачуццё прыгожага на лепшых узорах створанага народам мастацтва. У дакастрычніцкую эпоху для большасці працоўных фальклор з'яўляўся фактычна і школай, і кнігай, і, нарэшце, цэлым кодэксам маральна-этычных норм. Палымянае паэтычнае слова народа ўзнімала масы на барацьбу з прыгнятальнікамі, садзейнічала росту класавай свядомасці працоўных.

Народная творчасць — адна з жыватворных крыніц развіцця нацыянальнага прагрэсіўнага мастацтва і літаратуры. Аб вялікім значэнні фальклору ў развіцці літаратуры вельмі трапна пісаў А. М. Горкі: «Мільтан і Дантэ, Міцкевіч, Гётэ і Шылер уздымаліся вышэй за ўсё тады, калі іх акрыляла творчасць калектыву, калі яны чэрпалі натхненне з крыніцы народнай паэзіі, бязмерна глыбокай, незлічона разнастайнай, моцнай і мудрай».*

Асабліва вялікае значэнне меў фальклор для развіцця літаратуры тых народаў, якія доўгі час пакутавалі пад сацыяльным і нацыянальным прыгнётам, мова і літаратура якіх былі пад забаронай. Фальклор з'явіўся першай паэтычнай школай многіх выдатных беларускіх пісьменнікаў. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, М. Багдановіча, Я. Коласа, Я. Купалы і многіх іншых вядомых беларускіх паэтаў і празаікаў непарыўна звязана з народнай паэзіяй і па сутнасці вырастала з яе. Гэта сувязь праявілася не толькі ў шырокім выкарыстанні фальклорных сюжэтаў, тэм, вобразаў, мастацкіх сродкаў, але і ў падыходзе, ацэнцы і адлюстраванні з'яў рэчаіснасці. Сувязь з народнай творчасцю спрыяла станаўленню рэалізму і народнасці беларускай літаратуры.

Фальклор як мастацтва слова звязаны з іншымі відамі народнага і прафесійнага мастацтва. Можна было б прывесці шмат прыкладаў дабратворнага ўплыву народнай паэтычнай творчасці на прафесійнае музычнае, выяўленчае мастацтва, на драматургію. Многія буйныя музычныя творы напісаны на фальклорныя сюжэты і шырока выкарыстоўваюць народны мелас. Напрыклад, толькі на сюжэт вядомай многім народам казкі «Золушка» кампазітарамі розных краін напісана каля дзесяці опер і балетаў, у тым ліку дзіцячая опера Б. Асаф'ева і балет С. Пракоф'ева. Беларускае народнае паданне «Машэка» лягло ў аснову лібрэта аднайменнай оперы Р. Пукста. Пастаянна звярталіся да беларускага народнага меласу кампазітары

---

* *Горький М.* О литературе, с. 54.

М. Чуркін, М. Аладаў, А. Туранкоў і інш. Да фальклорных сюжэтаў звярталіся сусветна вядомыя майстры жывапісу В. М. Васняцоў, В. А. Сяроў і інш. Шырокае выкарыстанне сюжэтаў і матываў вуснапаэтычнай творчасці ўласціва таксама народнаму прыкладному мастацтву, асабліва кераміцы, разьбе па дрэву. У сваю чаргу літаратура і прафесійнае мастацтва ўплываюць на развіццё фальклору, асабліва на мову, стыль, вершаскладанне, у пэўнай ступені на сістэму вобразаў і прыёмы мастацкага адлюстравання рэчаіснасці.

Фалькларыстыка як навука аб народнай паэзіі таксама звязана з іншымі галінамі навукі і ў першую чаргу з гісторыяй. Вывучэнне народнай вуснапаэтычнай творчасці толькі тады будзе плённым, калі даследчык знойдзе тлумачэнне складаных з'яў развіцця фальклору ў фактах гісторыі яго стваральнікаў — працоўных мас. Значная частка фальклорных твораў, асабліва песень, звязана з абрадамі. Іх вывучэнне патрабуе добрых ведаў этнаграфіі — навукі, якая займаецца даследаваннем матэрыяльнага і духоўнага быту народа, у прыватнасці пытаннямі паходжання і сутнасці тых ці іншых абрадаў або звычаяў. Знаёмства з тэорыяй музыкі і харэаграфіяй аказвае вялікую дапамогу ў вывучэнні песень, прыпевак і частушак у першую чаргу пры разглядзе іх мастацкіх асаблівасцей, рытмікі, структуры верша, а таксама пры класіфікацыі песень і г. д.

У творчасці кожнага народа ёсць свае непаўторныя рысы, якія складаюць нацыянальную спецыфіку фальклору. Разам з тым вельмі многія творы, складзеныя рознымі народамі, падобны паміж сабой. Прычынамі такога падабенства з'яўляюцца агульнасць законаў развіцця чалавечага мыслення, свядомасці людзей і мастацкай творчасці, асабліва ў падобных умовах жыцця, генетычная блізкасць некаторых народаў, як, напрыклад, славянскіх, пастаянны працэс культурнага абмену паміж народамі.

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць таксама мае шмат падобнага з творчасцю іншых народаў свету і ў той жа час уносіць у агульную скарбніцу народнай паэзіі свой пэўны ўклад, канкрэтнае значэнне якога становіцца відавочным пры разглядзе асноўных этапаў развіцця беларускага фальклору і складвання яго асаблівасцей.

Адным з важнейшых фактараў, пад моцным уплывам якога адбывалася і адбываецца развіццё беларускага фальклору, з'яўляецца адзінства паходжання і трывалыя сувязі ўсходнеславянскіх народаў, іх духоўнай культуры, што абумовіла блізкасць паэзіі і садзейнічала ўзаемапранікненню, ўзаемаўзбагачэнню фальклору. Фальклор Старажытнай Русі — агульная спадчына ўсходніх славян, з якой вырасла і расквітнела вусная паэзія рускіх, украінцаў і беларусаў.

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць эпохі феадалізму была прадстаўлена амаль усімі жанрамі, якія ўласцівы таксама рускаму і ўкраінскаму фальклору: каляндарная і сямейная абрадавая паэзія, казкі, паданні і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы, народны тэатр у розных яго відах, сацыяльна-бытавая лірыка. Не было ў беларускім фальклоры

твораў такіх жанраў, як быліны або думы, спецыфічных для рускага і ўкраінскага фальклору, але беларускі народ таксама стварыў свой гераічны і гістарычны эпас, які хаця і не набыў адзінай жанравай формы, аднак даволі поўна адлюстроўваў многія гераічныя старонкі гісторыі нашага народа. На Беларусі бытавалі казкі і паданні аб волатах і асілках, казкі на былінныя сюжэты і песні быліннага складу, гістарычныя песні і паданні, якія апавядаюць аб барацьбе беларускага народа з рознымі іншаземнымі захопнікамі і прыгнятальнікамі.

Параўноўваючы жанравы склад фальклору трох братніх усходнеславянскіх народаў, можна адзначыць і іншыя адрозненні. Некаторыя жанры і віды народнай паэзіі ўласцівы толькі беларускаму фальклору або найбольш шырока ў ім прадстаўлены. Да іх ліку можна аднесці валачобныя песні, якіх няма ў рускім і ўкраінскім фальклоры, шматлікія і разнастайныя купальскія, жніўныя, восеньскія песні і інш. Наогул, абрадавая паэзія беларусаў, асабліва каляндарная, звязаная з земляробчай працай, у пэўнай ступені вызначае нацыянальную спецыфіку беларускай песеннай творчасці. Свае адметныя рысы маюць не толькі названыя вышэй валачобныя, купальскія, жніўныя, восеньскія песні, але і тыя групы песень, якія больш ці менш поўна прадстаўлены ў фальклоры ўсходнеславянскіх народаў, напрыклад калядныя, веснавыя, а таксама радзінныя песні. Асаблівасці ў жанравым складзе мае таксама беларускі казачны эпас, у якім паўней, чым у рускім і ўкраінскім фальклоры, прадстаўлены казкі аб жывёлах, легенды, некаторыя групы чарадзейных казак. Беларускія казкі ўзбагачаюць казачны эпас славян некаторымі новымі сюжэтамі і вобразамі. Характэрным відам беларускага народнага тэатра з'яўляецца батлейка. Нацыянальны каларыт беларускаму фальклору надаюць паэтычныя вобразы волатаў і асілкаў, асобныя мастацкія сродкі, паэтычная мова. Але, вылучаючы некаторыя спецыфічныя рысы беларускага фальклору, не менш важна адзначыць агульнае ў паэзіі братніх народаў як вынік агульнасці іх паходжання і непарыўных сувязей на працягу ўсёй гісторыі.

У эпоху феадалізму вуснапаэтычная творчасць беларускага народа няспынна папаўнялася творамі ярка выражанага сацыяльнага пратэсту. Казкі і песні, прыказкі і прымаўкі і іншыя творы, накіраваныя супраць паноў і служкаў культу, адыгрывалі важную ролю ў фарміраванні светапогляду працоўных мас, заклікаючы на барацьбу з прыгнятальнікамі.

У эпоху феадалізму ў сілу канкрэтных сацыяльна-эканамічных, палітычных і гістарычных прычын роля фальклору ў духоўным жыцці працоўных Беларусі была як ніколі вялікай. Доўгі час ён заставаўся для працоўных мас адзіна даступнай сферай выяўлення эстэтычных поглядаў і мастацкіх здольнасцей, адзіна даступнай шырокім масам скарбніцай ведаў аб навакольным свеце. У гэты гістарычны перыяд асабліва ярка праявіліся асноўныя спецыфічныя рысы фальклору як народнага мастацтва слова — калектыўнасць, вуснасць, варыянтнасць, канчаткова склалася традыцыйная паэтыка.

Многія складзеныя беларускім народам у эпоху феадалізму вуснапаэтычныя творы дзякуючы глыбіні выказанай у іх думкі, шчырасці пачуццяў і дасканаласці мастацкай формы вытрымалі выпрабаванне часам і зараз шырока бытуюць у народзе, хвалюючы нашых сучаснікаў. Вобразы Несцеркі, Рымшы, мудрай дзяўчынкі-Семілеткі і многіх іншых герояў беларускага фальклору дапамагаюць глыбей зразумець гісторыю нашага народа, асаблівасці яго нацыянальнага характару.

Беларуская народная паэтычная творчасць эпохі капіталізму набывае новыя рысы, больш складаным становіцца фальклорны працэс. Хаця паранейшаму ў жыцці шырокіх мас вялікае месца займае традыцыйная паэзія, яна не застаецца нязменнай і не з'яўляецца ўжо адзіным выразнікам мар і спадзяванняў народных, адзіным сродкам выяўлення мастацкага таленту і задавальнення эстэтычных запатрабаванняў.

Многія творы і нават некаторыя жанры традыцыйнага фальклору — замовы, пэўная частка абрадавай паэзіі і іншыя,— якія ўжо не адпавядалі ні грамадска-палітычным поглядам працоўных, ні мастацкаму асэнсаванню рэчаіснасці, знаходзіліся ў стадыі паступовага адмірання. Але больш варта гаварыць аб жыццяздольнасці традыцыйнага фальклору, чым аб яго адміранні ў эпоху капіталізму. Гэта жыццяздольнасць праявілася не толькі ў бытаванні старога, але і ў наяўнасці тых унутраных жыватворных сіл, якія садзейнічалі ўзнікненню новых варыянтаў традыцыйных песень, узбагачэнню старых жанраў новымі творамі і складванню новых відаў народнай паэзіі. Ды і само адміранне старога адбывалася даволі своеасабліва: забываліся, знікалі з быту некаторыя абрады, але частка песень, звязаных з імі, працягвала сваё існаванне ўжо як творы пазаабрадавай паэзіі. Народ не вельмі спяшаўся развітацца са многімі ўзорамі сапраўднага мастацтва, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Узросшая цікавасць самых шырокіх мас да сацыяльных пытанняў надала асаблівае значэнне тым творам са спадчыны мінулага, якія можна характарызаваць як творы ярка выражанага грамадска-палітычнага напрамку. Антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі, песні, прыказкі і прымаўкі не толькі захоўвалі свае сацыяльныя функцыі, але і адпавядалі эстэтычным густам і мастацкаму мысленню працоўных мас на новым гістарычным этапе.

У песнях, у казках і ў іншых жанрах яскрава праявіліся тэндэнцыі да больш глыбокага і праўдзівага адлюстравання рэчаіснасці, зварот да самых надзённых, важных і хвалюючых праблем. Гэтыя тэндэнцыі ўласцівы ў першую чаргу творам сацыяльнай тэматыкі, але прыкметны ў любоўнай лірыцы, казках і г. д.

Імкненне да больш глыбокага і праўдзівага адлюстравання рэчаіснасці выявілася ў тым, што ў рамках старых жанраў нараджаліся варыянты раней вядомых твораў, а таксама новыя творы, якія адлюстравалі новы этап барацьбы працоўных супраць прыгнятальнікаў. Вялікім здабыткам беларускай народнай паэзіі з'явіліся казкі, песні і творы іншых жанраў, у якіх беларускі народ узняўся да крытыкі існаваўшага ладу, як ладу сацыяльнай

нязроўнасці і несправядлівасці, выступаў супраць цара, выкрываў ілжывасць рэлігійнага вучэння, адмаўляючы існаванне бога. Да іх ліку адносяцца казкі «З чаго ліха на свеце», «Іванка Прастачок», «Прошча», «Заламка», песні «Ой, ляцелі гусі...», «Горка доля ты, батрацкая...», прыказкі «Ад прыгона аслабанілі, ды пад пана пасадзілі», «Цар указам, а пан бізуном», «Да бога высока, да цара далёка», «За тым і бог, хто бедака перамог» і многія іншыя. Характэрнай рысай развіцця традыцыйных жанраў было ўсё больш глыбокае адлюстраванне рэчаіснасці, узмацненне рэалістычнай плыні ў народнай паэзіі.

З эпохай капіталізму звязана канчатковае фарміраванне і далейшае развіццё новых відаў вуснапаэтычнай творчасці — частушкі, народнага анекдота,— якія выраслі на глебе традыцыйнага фальклору і хутка сталі вядомы шырокім колам гарадскога і сельскага насельніцтва.

Яшчэ больш значнай і прынцыпова новай з'явай у паэзіі беларускага народа было зараджэнне і развіццё рабочага фальклору, які ўзбагаціў скарбніцу беларускай народнай творчасці новымі тэмамі, ідэямі, мастацкімі вобразамі. Рабочы фальклор на Беларусі быў звязан з традыцыйнай паэзіяй, і ў той жа час ён развіваўся разам з рабочай паэзіяй рускага і ўкраінскага народаў, што спрыяла ўзаемаўзбагачэнню паэтычнай творчасці, надавала ёй рысы інтэрнацыяналізму. Ужо ў эпоху капіталізму мастацкая творчасць рабочых праяўлялася ў розных формах: апрача вуснай паэзіі назіралася некаторае развіццё мастацкай самадзейнасці, самадзейнай паэтычнай творчасці і інш.

Неад'емнай часткай духоўнай культуры беларускага народа стала рэвалюцыйная паэзія, якая аказала вялікі ўплыў на развіццё традыцыйнай вуснапаэтычнай творчасці, рабочага фальклору, на фарміраванне светапогляду працоўных.

Карэнныя змены адбыліся ў беларускай народнай паэзіі савецкага часу. У паэзіі народа, які скінуў з сябе кайданы сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, ярка адлюстраваліся яго палымяны патрыятызм, воінскі і працоўны гераізм, імкненне да міру ва ўсім свеце, інтэрнацыяналізм. У беларускім савецкім фальклоры створаны новыя вобразы народных герояў — герояў рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Праз усе этапы развіцця сучаснай беларускай вуснапаэтычнай творчасці і ўсе яе жанры праходзіць адна з вядучых тэм — Партыя — Ленін. Створаная беларускім народам казка «Ленінская праўда», у якой шырока выкарыстаны лепшыя традыцыі фальклору,— адзін з яркіх твораў народнай Ленініяны, які выклікаў да жыцця шматлікія варыянты ў розных народаў СССР.

Жанравы склад вуснапаэтычнай творчасці савецкага часу некалькі змяніўся ў параўнанні з мінулым. Асноўнае месца зараз належыць песеннай творчасці: песням і частушкам. Сярод новых песень ёсць узоры грамадзянскай і любоўнай лірыкі, балад, жніўных песень і г. д. Разнастайнасцю вылучаюцца і частушкі. Менш прыкметныя ў рэпертуары апавядальныя жанры, асабліва казкі. З апавядальных жанраў трэба адзначыць вусныя сказы,

успаміны. У час Вялікай Айчыннай вайны былі створаны легенды пра Заслонава, Каўпака і іншых герояў. Па-ранейшаму шырока бытуюць прыказкі і прымаўкі.

Характэрнай асаблівасцю беларускай паэзіі савецкага часу з'яўляецца яшчэ большае ўзаемадзеянне фальклору і літаратуры, узаемапранікненне і ўзаемаўзбагачэнне паэтычнай творчасці народаў нашай краіны і суседніх краін.

Побач з творамі, узнікшымі пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у наш час яшчэ актыўна бытуюць лепшыя ўзоры традыцыйнай фальклорнай спадчыны, якія захоўваюць свае высокія эстэтычныя якасці і садзейнічаюць выхаванню павагі да працы і людзей працы, любві да Радзімы.

Адна з галоўных рыс фальклорнага працэсу нашых дзён — разнастайнасць форм праяўлення мастацкіх талентаў народных мас. Побач з вядомымі класічнымі фальклорнымі формамі маюць месца такія з'явы, у якіх больш выразна праяўляецца ўжо не калектыўны, а індывідуальны пачатак. Асабліва гэта датычыць самадзейнай паэтычнай і музычнай творчасці. Інтэнсіўна ідзе працэс фалькларызацыі літаратурных твораў. Задача фалькларыстаў — старанна вывучаць гэтыя з'явы, каб дапамагчы народу найбольш поўна праявіць свае мастацкія здольнасці.

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць глыбока і ўсебакова раскрывае веліч мастацкага генія народа, прыгажосць яго маральнага аблічча, высакароднасць ідэалаў, самаадданую барацьбу за іх ажыццяўленне. Разам з іншымі відамі народнага і прафесійнага мастацтва яна з'яўляецца важным сродкам выхавання савецкага чалавека — актыўнага будаўніка камуністычнага грамадства.

# ЗАСНАВАЛЬНІКІ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА АБ ФАЛЬКЛОРЫ І РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ПАЭЗІІ

## К. МАРКС

### УВОДЗІНЫ

**(з эканамічных рукапісаў 1857—1858 гадоў)**

Адносна мастацтва вядома, што пэўныя перыяды яго росквіту ні ў якім разе не знаходзяцца ў адпаведнасці з агульным развіццём грамадства, а значыць, таксама і з развіццём матэрыяльнай асновы апошняга, якая складае нібы шкілет яго арганізацыі. Напрыклад, грэкі ў параўнанні з сучаснымі народамі, або таксама Шэкспір. Адносна некаторых форм мастацтва, напрыклад эпасу, нават прызнана, што яны ў сваёй класічнай форме, якая складае эпоху ў сусветнай гісторыі, ніколі не могуць быць створаны, як толькі пачалася мастацкая вытворчасць, як такая; што, такім чынам, у галіне самога мастацтва пэўныя, значныя формы яго магчымы толькі на нізкай ступені развіцця мастацтваў. Калі гэта мае месца ў межах мастацтва ў адносінах паміж рознымі яго відамі, дык тым менш дзіўна, што гэта акалічнасць мае месца і ў адносінах усёй галіны мастацтва да ўсяго грамадскага развіцця. Цяжкасць заключаецца толькі ў агульнай фармулёўцы гэтых супярэчнасцей. Варта толькі вызначыць іх спецыфіку, і яны ўжо растлумачаны.

Возьмем, напрыклад, адносіны грэчаскага мастацтва і потым Шэкспіра да сучаснасці. Вядома, што грэчаская міфалогія складала не толькі арсенал грэчаскага мастацтва, але і яго глебу. Хіба той погляд на прыроду і на грамадскія адносіны, які ляжыць у аснове грэчаскай фантазіі, а таму і грэчаскага {мастацтва} магчымы пры наяўнасці сельфактараў, чыгунак, лакамятываў і электрычнага тэлеграфа? Куды ўжо Вулкану супраць Робертса і К°, Юпітэру супраць громаадвода і Гермесу супраць Crédit Mobilier *! Усякая міфалогія пераадольвае, падпарадкоўвае і фарміруе сілы прыроды ва ўяўленні і пры дапамозе ўяўлення; яна знікае, такім чынам, разам з надыходам сапраўднага панавання над гэтымі сіламі прыроды. Што было б з Фамай ** пры наяўнасці Прынтынг-хаусквер? Перадумовай грэчаскага мастацтва з'яўляецца грэчаская міфалогія, г. зн. прырода і самі грамадскія

* Crédit Mobilier — французскі акцыянерны банк.

** Фама — багіня чутак.

формы, ужо перапрацаваныя бессвядома-мастацкім чынам народнай фантазіяй. Гэта яго матэрыял. Але не кожная міфалогія, г. зн. не кожная бессвядома-мастацкая перапрацоўка прыроды (тут пад прыродай разумеецца ўсё прадметнае, значыць, уключаючы і грамадства). Егіпецкая міфалогія ніколі не магла б быць глебай ці мацярынскім лонам грэчаскага мастацтва. Але, ва ўсякім разе, нейкая міфалогія. Значыць, зусім не такое развіццё грамадства, якое выключае ўсякія міфалагічныя адносіны да прыроды, усякае міфалагізаванне прыроды, якое, такім чынам, патрабуе ад мастака незалежнай ад міфалогіі фантазіі.

З другога боку, ці магчымы Ахілес у эпоху пораху і свінцу? Або нагогул «Іліяда» побач з друкарскім станком і тым больш з друкарскай машынай? І хіба не знікаюць непазбежна сказанні, песні і музы, а тым самым і неабходныя перадумовы эпічнай паэзіі, з паяўленнем друкарскага станка?

Аднак цяжкасць заключаецца не ў тым, каб зразумець, што грэчаскае мастацтва і эпас звязаны з пэўнымі формамі грамадскага развіцця. Цяжкасць заключаецца ў тым, што яны яшчэ працягваюць дастаўляць нам мастацкую асалоду і ў пэўных адносінах служыць нормай і недасягальным узорам.

Мужчына не можа зноў ператварыцца ў дзіця, не ўпадаючы ў дзяцінства. Але хіба яго не радуе наіўнасць дзіцяці і хіба сам ён не павінен імкнуцца да таго, каб на больш высокай ступені аднаўляць сваю сапраўдную сутнасць? Хіба ў дзіцячай натуры ў кожную эпоху не ажывае яе ўласны характар у яго непасрэднай праўдзе? І чаму дзяцінства чалавечага грамадства там, дзе яно развілося прыгажэй за ўсё, не павінна мець для нас вечнай прывабнасці, як ступень, якая ніколі не паўтараецца? Бываюць невыхаваныя дзеці і старэча разумныя дзеці. Многія са старажытных народаў належаць да гэтай катэгорыі. Нармальнымі дзяцьмі былі грэкі. Чароўнасць, якую мае для нас іх мастацтва, не знаходзіцца ў супярэчнасці з той неразвітай грамадскай ступенню, на якой яно вырасла. Наадварот, яно з'яўляецца яе вынікам і непарыўна звязана з тым, што няспелыя грамадскія ўмовы, пры якіх яно ўзнікла, і толькі і магло ўзнікнуць, ніколі не могуць паўтарыцца зноў.

### Ф. ЭНГЕЛЬС

## НЯМЕЦКІЯ НАРОДНЫЯ КНІГІ*

Хіба не з'яўляецца вялікім гонарам для кнігі, калі яна — народная кніга, нямецкая народная кніга? Аднак іменна таму мы маем права жадаць большага ад падобнай кнігі, іменна таму яна павінна задавальняць усім разумным патрабаванням і быць ва ўсіх адносінах бездакорнай.

---

* З артыкула «Нямецкія народныя кнігі».

Народная кніга мае сваёй задачай забавіць селяніна, калі, стомлены, ён вяртаецца ўвечары са сваёй цяжкай дзённай работы, пацешыць яго, ажывіць, прымусіць яго забыць сваю цяжкую працу, ператварыць яго камяністае поле ў духмяны сад; яна мае сваёй задачай ператварыць майстэрню рамесніка і ўбогі паддашак замучанага чаляднiка ў свет паэзіі, у залаты палац, а яго дзябёлую красуню ўявіць у выглядзе дзіўна-прыгожай прынцэсы; але яна мае таксама задачай, побач з Бібліяй, праясніць яго маральнае пачуццё, прымусіць яго ўсвядоміць сваю сілу, сваё права, сваю свабоду, абудзіць яго мужнасць, яго любоў да айчыны.

Значыць, калі патрабаванні, якія можна па справядлівасці прад'явіць наогул да народнай кнігі, заключаюцца ў багатым паэтычным змесце, моцным слоўцы, маральнай чысціні, а да нямецкай народнай кнігі яшчэ ў здаровым, сумленным *нямецкім духу*, г. зн. у якасцях, якія ва ўсе часы застаюцца аднолькавымі, то мы, апрача таго, маем права патрабаваць, каб народная кніга адпавядала свайму часу, інакш яна перастае быць народнай кнігай. У прыватнасці, калі звярнуць увагу на наш час, які характарызуецца барацьбой за свабоду, на канстытуцыяналізм, які развіваецца, на супрацiўленне прыгнёту арыстакратыі, на барацьбу думкі з піэтызмам, яснасці духу з рэшткамі панурага аскетызму, то я не бачу, чаму мы не мелі б права патрабаваць ад народнай кнігі, каб яна ў гэтых адносінах садзейнічала малаадукаваным колам, паказвала ім, хоць, зразумела, і не шляхам непасрэднай дэдукцыі, правільнасць і разумнасць гэтых імкненняў,— але ні ў якім разе не патурала б крывадушшу, падхалімнічанню перад знаццю, піэтызму. Само сабой зразумела, аднак, што народнай кнізе павінны застацца чужымі звычаі мінулых часоў, якія з'яўляюцца ў нашу эпоху недарэчнасцю ці несправядлівасцю.

Мы маем права і абавязаны разглядаць, паводле гэтых прынцыпаў, і тыя кнігі, якія з'яўляюцца цяпер сапраўды нямецкімі народнымі кнігамі і звычайна аб'ядноўваюцца пад гэтай назвай. Яны — прадукты часткова сярэдневяковай нямецкай або раманскай паэзіі, часткова народных забабонаў. Раней яны служылі для вышэйшых саслоўяў прадметам пагарды і насмешак, потым, як вядома, рамантыкі адшукалі іх, перапрацавалі, праславілі. <...>

Калі мы будзем разглядаць усе гэтыя кнігі цалкам, у адпаведнасці з выказаным у пачатку прынцыпам, то зразумела, што яны адным толькі бокам задавальняюць гэтыя патрабаванні: у іх дастаткова паэзіі і дасціпнасці, да таго ж у форме, зусім даступнай самым неадукаваным людзям; але другім сваім бокам кнігі цалкам не могуць задавальняць нас: некаторыя выяўляюць якасці, якія супярэчаць нашым патрабаванням, іншыя адпавядаюць ім толькі часткова. З'яўляючыся прадуктамі сярэдневякоўя, яны, вядома, не могуць задавальняць тыя асаблівыя патрабаванні, якія мае права ставіць ім наш час. Нягледзячы на знешняе багацце гэтай галіны літаратуры і нягледзячы на дэкламацыі Ціка і Гераса, яны пакідаюць жадаць яшчэ

шмат чаго; ці будзе калі-небудзь запоўнен гэты прагал — гэта іншае пытанне, на якое я не бяруся адказваць.

<...> Я пераходжу цяпер да двух сагаў, якія створаны нямецкім народам і належаць да самых глыбокіх твораў народнай паэзіі ўсіх народаў. Я маю на ўвазе сказанне аб «Фаусце» і аб «Вечным жыдзе». Яны невычарпальныя: кожная эпоха можа, не мяняючы іх сутнасці, засвоіць іх сабе, і калі перапрацоўка сказання пра Фауста пасля Гётэ тое ж самае, што Іліяды post Homerum, то ў іх усё ж адкрываюцца кожны раз новыя бакі, не гаворачы ўжо зусім аб важнасці сказання пра Агасфера для навейшай паэзіі. Але ў якім выглядзе знаходзяцца гэтыя сагі ў народных кнігах! Яны пададзены там не як творы свабоднай фантазіі, не, а як творы рабскіх забабонаў: кніга аб вечным жыдзе дапускае нават рэлігійную веру ў змесце яе, якую яна спрабуе апраўдаць Бібліяй і радам недарэчных легенд; ад сказання ў ёй засталася толькі сама знешняя частка, затое яна змяшчае ў сабе даўжэзнае нуднае хрысціянскае павучанне пра жыда Агасфера. Сказанне пра Фауста зведзена да ўзроўню банальнай гісторыі аб ведзьмах, прыхарошанай ардынарнымі анекдотамі аб чарадзействе; нават тая крупінка паэзіі, якая захавалася ў народнай камедыі, амаль зусім знікла. Абедзве гэтыя кнігі не толькі няздольны даць паэтычную асалоду, але ў цяперашнім сваім выглядзе могуць толькі зноў умацаваць старыя забабоны, таму што чаго іншага можна чакаць ад падобнай чартаўшчыны? Разуменне сказання і яго зместу, відаць, знікла зусім і ў народзе. Фауст разглядаецца як звычайны вядзьмар, а Агасфер — як звычайны злачынца пасля Іуды Іскарыёта. Але хіба нельга было б выратаваць абодва сказанні для нямецкага народа, аднавіць іх у першапачатковай чысціні і выкласці так ясна, што іх глыбокі сэнс будзе ў пэўнай ступені зразумелы і менш адукаваным людзям? <...>

Перад намі ляжыць другі рад народных кніг жартоўнага характару: «Эйленшпігель», «Саламон і Марольф», «Поп з Каленберга», «Сем швабаў», «Шыльдбюргеры». У нямногіх народаў можна сустрэць такую калекцыю. Гэта дасціпнасць, гэта непасрэднасць задумы і выканання, дабрадушны гумар, які суправаджае заўсёды з'едлівую насмешку, каб яна не зрабілася занадта злой, надзвычайная камічнасць палажэнняў — усё гэта, па праўдзе сказаць, здольна заткнуць за пояс значную частку нашай літаратуры. У якога з сучасных аўтараў хапіла б выдумкі, каб стварыць такую кнігу, як «Шыльдбюргеры»? Якім празаічным здаецца гумар Мундта, калі параўноўваем яго з «Сям'ю швабамі»! Зразумела, для стварэння падобных рэчаў неабходна была эпоха, больш спакойная, чым наш час, падобная ў гэтым на неспакойнага дзелавога чалавека, які заўсёды спасылаецца на неадкладныя справы, што перашкаджаюць яму падумаць аб чым-небудзь іншым. Што датычыцца формы гэтых кніг, то, калі выкінуць з іх пару-другую няўдалых вострых жартаў і пачысціць знявечаны стыль, то ў іх давядзецца змяніць нямногае. <...>

Гэтыя старыя народныя кнігі з іх старажытнай гаворкай, з іх памылкамі і дрэннымі гравюрамі, маюць для мяне выключную паэтычную пры-

вабнасць. Яны мяне пераносяць з нашага напружанага часу з яго сучаснымі «станамі, сумбурам і тонкімі ўзаемаадносінамі» ў іншы свет, які значна бліжэйшы да прыроды. <...>

### З працы К. Маркса «Канспект кнігі Льюіса Г. Моргана «Старажытнае грамадства»

<...> *Перыяд дзікасці і ніжэйшая ступень перыяду варварства* — гэтыя *два этнічныя перыяды* ахопліваюць, па меншай меры, 4/5 усяго жыцця чалавецтва на зямлі.

На ніжэйшай ступені варварства пачалі развівацца вышэйшыя ўласцівасці чалавека. *Асабістая годнасць, красамоўства, рэлігійнае пачуццё, шчырасць, мужнасць, храбрасць сталі цяпер агульнымі рысамі характару, але разам з імі з'явіліся жорсткасць, здрадніцтва і фанатызм. У галіне рэлігіі мае месца пакланенне* стыхіям з *цьмяным уяўленнем аб асабістых бажаствах* і аб *вялікім духу; прымітыўнае вершаскладанне, агульныя дамы* і *хлеб з маісу* — усё гэта адносіцца да гэтага перыяду. Ён даў таксама *сіндзіасмічную сям'ю* і *канфедэрацыю плямёнаў, арганізаваных у фратрыі і роды. Уяўленне*, гэты вялікі дар, які так шмат садзейнічаў развіццю чалавецтва, пачало *цяпер ствараць няпісаную літаратуру міфаў, легенд і паданняў*, аказваючы ўжо магутны ўплыў на чалавечы род. <...>

### З артыкула Ф. Энгельса «Ландшафты»

<...> Толькі з таго часу, як я спазнаў паўночнагерманскі стэп, я пасапраўднаму зразумеў «Дзіцячыя і сямейныя казкі» братоў Грым. Амаль на ўсіх гэтых казках заўважаецца адбітак таго, што яны ўзніклі тут, дзе з наступленнем ночы знікае ўсё чалавечае, і жудасныя, бясформенныя стварэнні народнай фантазіі носяцца над зямлёй, пустынны выгляд якой наводзіць страх нават у ясны поўдзень. Яны — увасабленне пачуццяў, якія ахопліваюць адзінокага жыхара стэпу, калі ён у такую бурную ноч крочыць па сваіх родных месцах або ж з высокай вежы аглядае іх пустынную гладзь. Тады перад ім зноў паўстаюць уражанні, якія захаваліся з маленства ад бурных стэпавых начэй, і ператвараюцца ў казкі. На Рэйне або ў Швабіі вы не падслухаеце тайны ўзнікнення народных казак, між тым як тут кожная навальнічная ноч, *асветленая* маланкамі ноч, гаворыць Лаубе,— сцвярджае гэта грамавым гулам. <...>

## У. І. ЛЕНІН

## ЕЎГЕНІЙ ПАЦЬЕ

### (Да 25-годдзя яго смерці)

У лістападзе мінулага, 1912, года споўнілася 25 гадоў з дня смерці французскага паэта-рабочага Еўгенія Пацье, аўтара славутай пралетарскай песні «Інтэрнацыянал» («Паўстань, прakляццем катаваны» і т. д.).

Гэтая песня перакладзена на ўсе еўрапейскія і не толькі еўрапейскія мовы. У якую б краіну ні трапіў свядомы рабочы, куды б ні закінуў яго лёс, якім бы чужынцам ні адчуваў ён сябе, без мовы, без знаёмых, удалечыні ад радзімы,— ён можа знайсці для сябе таварышаў і сяброў па знаёмаму напеву «Інтэрнацыянала».

Рабочыя ўсіх краін падхапілі песню свайго перадавога барацьбіта, пралетарыя-паэта, і зрабілі з гэтай песні сусветную пралетарскую песню.

І рабочыя ўсіх краін ушаноўваюць цяпер Еўгенія Пацье. Яго жонка і дачка яшчэ жывыя і жывуць у беднасці, як жыў усё жыццё аўтар «Інтэрнацыянала». Ён нарадзіўся ў Парыжы 4 кастрычніка 1816 года. Яму было 14 гадоў, калі ён напісаў сваю першую песню, і гэтая песня называлася — «Няхай жыве свабода!» У 1848 годзе, у вялікай бітве рабочых з буржуазіяй, ён удзельнічаў, як барыкадны барацьбіт.

Пацье нарадзіўся ў беднай сям'і і ўсё жыццё заставаўся бедняком, пралетарыем, зарабляючы хлеб упакоўкай скрынак, а пасля маляваннем па матэрыі.

З 1840-га года ён адклікаўся на ўсе вялікія падзеі ў жыцці Францыі сьаёй баявой песняй, абуджаючы свядомасць адсталых, заклікаючы рабочых да адзінства, бічуючы буржуазію і буржуазныя ўрады Францыі.

У час вялікай Парыжскай Камуны (1871 г.) Пацье быў выбраны членам яе. З 3600 галасоў за яго было пададзена 3352. Ён удзельнічаў ва ўсіх мерапрыемствах Камуны, гэтага першага пралетарскага ўрада.

Падзенне Камуны прымусіла Пацье ўцячы ў Англію і ў Амерыку. Славутая песня «Інтэрнацыянал» напісана ім у *чэрвені 1871-га года*, на другі дзень, можна сказаць, пасля крывавага майскага паражэння...

Камуна задушана... а «Інтэрнацыянал» Пацье разнёс яе ідэі па ўсяму свету, і яна жывая цяпер больш, чым калі-небудзь.

У 1876 годзе, у выгнанні, Пацье напісаў паэму «Рабочыя Амерыкі да рабочых Францыі». Ён паказаў у ёй жыццё рабочых пад гнётам капіталізму, іх галечу, іх катаржную працу, іх эксплуатацыю, іх цвёрдую ўпэўненасць у будучай перамозе іх справы.

Толькі праз дзевяць гадоў пасля Камуны вярнуўся Пацье ў Францыю і адразу паступіў у «Рабочую партыю». У 1884-м годзе быў выдадзен першы том яго вершаў. У 1887-м — другі пад назвай «Рэвалюцыйныя песні».

Рад іншых песень паэта-рабочага быў выдадзен пасля ўжо яго смерці.

8-га лістапада 1887 года парыжскія рабочыя праводзілі на могілкі Pere Lachaise, дзе пахаваны расстраляныя камунары, прах Еўгенія Пацье. Паліцыя ўчыніла пабоішча, вырываючы чырвоны сцяг. Велізарны натоўп удзельнічаў у грамадзянскім пахаванні. З усіх бакоў нясліся крыкі: «Няхай жыве справа Пацье!»

Пацье памёр у галечы. Але ён пакінуў па сабе сапраўды нерукатворны помнік. Ён быў адным з самых вялікіх *прапагандыстаў пры дапамозе песні.*

Калі ён пісаў сваю першую песню, колькасць сацыялістаў рабочых вымяралася самае большае дзесяткамі. Гістарычную песню Еўгенія Пацье ведаюць цяпер дзесяткі мільёнаў пралетарыяў...

## У. І. ЛЕНІН

## РАЗВІЦЦЁ РАБОЧЫХ ХОРАЎ У ГЕРМАНІІ

Рабочыя пеўчыя таварыствы Германіі нядаўна святкавалі своеасаблівы юбілей: колькасць рабочых-спевакоў дасягнула 100 000, пры агульнай колькасці членаў рабочых пеўчых таварыстваў у 165 000 чалавек. Колькасць работніц, якія ўваходзяць у гэтыя таварыствы, складае 11 000.

Рабочыя хоры маюць свой друкаваны орган: «Газету рабочых спевакоў», якая пачала выходзіць рэгулярна толькі з 1907 года.

Першыя крокі рабочых пеўчых таварыстваў адносяцца да 1860-х гадоў. У Лейпцыгскім «Рамесным асветным таварыстве» было ўтворана пеўчае аддзяленне, і ў члены яго ўваходзіў, між іншым, Аўгуст Бебель.

Фердынанд Ласаль надаваў вялікае значэнне арганізацыі рабочых хораў. Па яго намаганню, члены «Усеагульнага нямецкага рабочага саюза» заснавалі ў 1863 годзе ва Франкфурце-на-Майне рабочае таварыства пад назвай: «Пеўчы саюз». Збіраўся гэты саюз у цёмным, напоўненым чадам, заднім пакоі адной франкфурцкай карчмы. Асвятляўся пакой сальнымі свечкамі.

Колькасць членаў саюза была 12. Калі Ласалю прыйшлося, пры адной з яго агітацыйных паездак, пераначаваць у Франкфурце, гэтыя 12 рабочых спевакоў праспявалі яму хорам песню вядомага паэта Гервега, якога Ласаль доўга ўпрошваў напісаць словы для рабочай песні хорам.

Пасля адмены выключнага закону, у 1892 годзе рабочыя хоры складалі ў Германіі 180 пеўчых таварыстваў з 4300 членамі . У 1901 годзе колькасць членаў дасягнула 39 717, у 1907 — 93 000, а ў 1912 — 165 000. У Берліне лічыцца 5352 члены рабочых пеўчых таварыстваў, у Гамбургу — 1628, у Лейпцыгу — 4051, у Дрэздэне — 4700 і т. д.

Нядаўна мы паведамлялі аб тым, як рабочыя Францыі і іншых раманскіх краін ушаноўвалі дваццаціпяцігоддзе смерці Еўгенія Пацье (1816—1887), аўтара славутага «Інтэрнацыянала». У Германіі прапаганда сацыялізма рабочай песняй значна маладзейшая, і «юнкерскі» (памешчыцкі, чарнасоценны) урад Германіі ставіць куды больш подлых паліцэйскіх перашкод такой прапагандзе.

Але ніякія паліцэйскія прыдзіркі не могуць перашкодзіць таму, што ва ўсіх вялікіх гарадах свету, ва ўсіх фабрычных пасёлках і ўсё часцей у хацінах батракоў чуецца дружная пралетарская песня аб блізкім вызваленні чалавецтва ад наёмнага рабства.

## З АРТЫКУЛА У. І. ЛЕНІНА «КРЫТЫЧНЫЯ ЗАМЕТКІ ПА НАЦЫЯНАЛЬНАМУ ПЫТАННЮ»

<...> У *кожнай* нацыянальнай культуры ёсць, хоць бы не развітыя, *элементы* дэмакратычнай і сацыялістычнай культуры, бо ў *кожнай* нацыі ёсць працоўная і эксплуатуемая маса, умовы жыцця якой непазбежна параджаюць ідэалогію дэмакратычную і сацыялістычную. Але ў *кожнай* нацыі ёсць таксама культура буржуазная (а ў большасці яшчэ чарнасоценная і клерыкальная) — прытым не ў выглядзе толькі «элементаў», а ў выглядзе *пануючай* культуры. Таму «нацыянальная культура» наогул *ёсць* культура памешчыкаў, папоў, буржуазіі. Гэтую асноўную ісціну, азбучную для марксіста, бундыст пакінуў у цяні, «загаварыў» сваім наборам слоў, г. зн. на справе *супроць* ускрыцця і растлумачэння класавага бяздоння даў чытачу зацямненне яго. *На справе* бундыст выступіў, як буржуа, увесь інтарэс якога патрабуе пашырэння веры ў пазакласавую нацыянальную культуру. <...>

## З ПРАМОВЫ У. І. ЛЕНІНА НА III УСЕРАСІЙСКІМ З'ЕЗДЗЕ РАСІЙСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ «ЗАДАЧЫ САЮЗАЎ МОЛАДЗІ»

<...> Пралетарская культура не з'яўляецца выскачыўшай невядома адкуль, не з'яўляецца выдумкай людзей, якія называюць сябе спецыялістамі па пралетарскай культуры. Гэта ўсё суцэльная бязглуздзіца. Пралетарская культура павінна з'явіцца заканамерным развіццём тых запасаў ведаў, якія чалавецтва выпрацавала пад гнётам капіталістычнага грамадства, памешчыцкага грамадства, чыноўніцкага грамадства. Усе гэтыя шляхі і дарожкі падводзілі і падводзяць, і прадаўжаюць падводзіць да пралетарскай культуры гэтак жа, як палітычная эканомія, перапрацаваная Марксам, паказала нам тое, да чаго павінна прыйсці чалавечае грамадства, паказала пераход да класавай барацьбы, да пачатку пралетарскай рэвалюцыі. <...>

## У. І. ЛЕНІН АБ ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

### I

<...> Пасля пераезду Савецкага ўрада з Петраграда ў Маскву мы пачалі арганізоўваць у Крамлі пры Кіраўніцтве справамі Савета Народных Камісараў невялікую бібліятэку, якой заўсёды мог бы карыстацца Уладзімір Ільіч.

У першую партыю кніг, запатрабаваных Уладзімірам Ільічом, уваходзіў і «Словарь русского языка» Даля. Уладзімір Ільіч паставіў яго на эта-

жэрку, якая пакручвалася, каля свайго пісьмовага стала. Ён вельмі часта займаўся ім, не толькі праглядваючы, але і ўважліва чытаючы прыказкі і прымаўкі, якія прыводзіліся там у якасці прыкладаў, а таксама вывучаючы асобныя словы ў іх разнастайным значэнні.

Я прапанаваў яму прынесці кнігі з маёй асабістай бібліятэкі, дзе сабраны былі творы народнай літаратуры і матэрыялы па вывучэнню рускай мовы. Размова перайшла на фальклорныя матэрыялы, вывучэннем якіх я займаўся ў гадзіны адпачынку. Калі я сказаў Уладзіміру Ільічу, што ў мяне ў бібліятэцы ёсць даволі добра падабраныя кнігі былін, народных песень і казак, ён адразу ж выказаў пажаданне паглядзець іх. У сувязі з тым, што мая бібліятэка яшчэ не ўся была распакавана і якраз да скрыні з выданнямі па фальклору не дайшлі рукі, дык я пайшоў да Дзям'яна Беднага, які меў цудоўную бібліятэку, і папрасіў дазволу ўзяць у яго на некаторы час некалькі кніжак па фальклору, якія, як мне здавалася, павінны былі асабліва зацікавіць Уладзіміра Ільіча. Яфім Аляксеевіч даў мне цэлае бярэмя кніг. Калі я даставіў кнігі Уладзіміру Ільічу, ён хутка праглядзеў іх па загалоўках, расклаў па жанрах і больш за ўсё ўвагі звярнуў на «Причитанья Северного края», сабраныя Е. В. Барсавым, дзе ў другой частцы былі надрукаваны «Плачи завоенные, рекрутские и солдатские».

— Па задуме цікавая кніга,— сказаў Уладзімір Ільіч, кладучы «Завоенные плачи» прама супраць сябе.

У гэты дзень вечарам я бачыў, як Уладзімір Ільіч уважліва чытаў «Смоленский этнографический сборник», складзены У. М. Дабравольскім.

— Які цікавы матэрыял,— сказаў Уладзімір Ільіч, калі я раніцай увайшоў да яго.— Я бегла праглядзеў усе гэтыя кніжкі і бачу, што не хапае, відаць, рук ці жадання ўсё гэта абагульніць, усё гэта праглядзець пад сацыяльна-палітычным пунктам гледжання. На гэтым жа матэрыяле можна было б напісаць цудоўнае даследаванне аб чаканнях і спадзяваннях народных. Глядзіце! — дабавіў ён,— вось тут у казках Анчукова, якія я перагартаў,— і ён пачаў зноў праглядваць гэту кнігу,— тут жа ёсць выдатныя месцы. Вось на што трэба было б звярнуць увагу нашых гісторыкаў літаратуры. Гэта сапраўды народная творчасць, такая патрэбная і важная для вывучэння народнай псіхалогіі ў нашы дні.

На жаль, у гэты раз мне не давялося далей гутарыць з Уладзімірам Ільічом у адносінах да ўзнятага пытання. Але я зразумеў, чаму Уладзімір Ільіч неаднаразова гаварыў мне, што, запісваючы і сабіраючы сярод народных мас рукапісы, апавяданні, сказанні, легенды, выкладанні розных вучэнняў і да таго падобныя творы, я раблю патрэбную і важную справу. Я зразумеў, што ён ставіцца да этнаграфіі вельмі станоўча, глыбока разумее яе сэнс і значэнне і хоча, каб этнаграфічны матэрыял заўсёды абагульняўся, аналізаваўся і разглядаўся з марксісцкага пункта гледжання. Зразумела, ён меў бясспрэчную рацыю. Толькі навуковы марксісцкі аналіз дае нам магчымасць зразумець сутнасць народнай творчасці, якая адлюстроўвае векавую барацьбу, жаданні і чаканні народных мас.

## III

<...> — Добрая кніжачка! — сказаў Уладзімір Ільіч, вяртаючы мне праз некалькі дзён «Завоенные плачи», на якія ён звярнуў асаблівую ўвагу.

— Я ўважліва прачытаў яе. Які надзвычай каштоўны матэрыял, і так выдатна характарызуе аракчэеўска-мікалаеўскія часы, гэту праклятую старую ваеншчыну, муштру, якая знішчае чалавека. Так і ўспамінаецца «Николай Палкин» Талстога і «Орина, мать солдатская» Някрасава. Нашы класікі, бясспрэчна, адсюль, з народнай творчасці, нярэдка чэрпалі сваё натхненне. Чаму б не напісаць даследаванне, чым была аракчэеўская ваеншчына для сялян, параўнаўшы гэтыя «плачы» над адыходзячымі на службу з песнямі тых жа сялян, якія ўцякалі ад памешчыка, ад рэкрутчыны, ад салдатчыны і арганізоўвалі «панізовую вольніцу», збіраючыся на Волзе, на Доне, у Наваросіі, на Урале, у стэпах у асобыя гурты, дружыны, атрады, у вольныя таварыствы вольных людзей. Той жа народ, а зусім іншыя песні, поўныя маладзецтва і адвагі, смелыя дзеянні, смелы спосаб думак; пастаянная гатоўнасць да паўстання супраць дваран, папоў, знаці, цара, чыноўнікаў, купцоў. Што перараджала іх? Да чаго яны імкнуліся? Як і за што змагаліся? Хіба гэта не цікава ведаць? І ўсё гэта гучыць у народнай песні. Нават тут, у гэтых журботных «заваенных плачах», якія раздаваліся ў вёсках, пры памешчыку, пры старастах, пры начальстве,— і то прарываецца і нянавісць, і свабоднае дакорлівае слова, заклік да барацьбы скрозь слёзы матак, жонак, нявест, сясцёр. А тут, глядзіце, слабенькі артыкульчык гэтага Елпідзіфора Барсава. Ён зрабіў добрую справу, сабраўшы і запісаўшы ўсё гэта. Але вельмі можа быць, што самае важнае, патаемнае, яму, як пану, і не сказалі. Трэба дакапацца да схаваных, тайных песень, плачаў, казак, сатыр — яны павінны быць, і ў іх мы знойдзем шмат новага і, магчыма, асабліва каштоўнага.

Я быў узрушаны гэтым нечаканым выказваннем Уладзіміра Ільіча. Бясспрэчна, у такім падыходзе, у такім вывучэнні — галоўнейшы сэнс гэтых незлічоных запісаў, якія рабіліся і робяцца цяпер тысячамі фалькларыстаў. Я з глыбокай пашанай захоўваю той экземпляр «Завоенных плачей», які быў у руках Уладзіміра Ільіча і дзе ён зрабіў рад адкрэсліванняў на палях. Дзям'ян Бедны падараваў мне гэту кнігу. І я спадзяюся, калі хопіць сіл, распрацаваць яе па ўказаннях Уладзіміра Ільіча, каб выдаць яе пановаму.

## IV

Вяртаючы кнігу «Завоенные плачи», Уладзімір Ільіч сказаў мне:

— А я так захапіўся гэтымі запісамі, што забыў, што кніга ж не мая, і пачаў адкрэсліваць асабліва цікавыя тэксты, на якія варта было б звярнуць асобую ўвагу.

Я з радасцю сказаў Уладзіміру Ільічу, што Дзям'ян будзе шчаслівы мець кнігу з яго паметкамі, і прапанаваў яшчэ пакінуць кнігу. Ён усміхнуўся і сказаў:

— Ды вось усё справы і справы, а так хочацца напісаць артыкул на аснове гэтага вельмі цікавейшага, сапраўды народнага матэрыялу: гэта ж сапраўды народныя думы, само катаржнае жыццё народа! Ды вось няма часу. Няхай другія пішуць.

І ён — на мой жаль — працягнуў мне кнігу і адразу ж паглыбіўся ў паперы, якія ляжалі перад ім. Я зразумеў, што прыдзецца змірыцца з гэтым, і больш нічога не дамагаўся.

У той жа дзень увечары я быў у Дзям'яна Беднага, і мы старонку за старонкай уважліва разглядвалі гэтыя трохкаляровыя адкрэсліванні на палях, а ў некаторых месцах падкрэсліванні асобных радкоў.

Калі ўчытацца ва ўсё, што вылучыў Уладзімір Ільіч, то яскрава абазначыцца звязная гама глыбока праніклівых сялянскіх перажыванняў, выказванняў, смутку і тугі, праз якія часам, нібы скрытна, мільгаюць ноткі выбухаючага затоенага гневу і палымянага жадання скінуць памешчыцка-царскі прыгнёт, уціск і векавечныя здзекі.

— Вось як трэба вывучаць фальклор,— усклікнуў Яфім Аляксеевіч,— а не крыхаборнічаць, звяртаючы больш за ўсё ўвагі на розначытанні, націскі, паўтарэнні і ўсю тую знешнасць, якой надаецца ў нас несуразмернае значэнне. Скрозь і ўсюды павінны быць прыкладзены палітычны пункт гледжання, які раскрывае ўнутраную барацьбу народа з прыгняталънікамі, пачынаючы ад цароў зямнога і нябеснага да апошняга паліцэйскага ярыжкі ўключна.

## V

<...> Калі ўважліва ўчытацца ва ўсё, што так ці інакш адзначыў Уладзімір Ільіч у «Плачах завоенных, рекрутских и солдатских», дык адразу стане зразумелым той напрамак, які кіраваў ім пры чытанні гэтых народных песень пры трагічных праводзінах у салдаты ў стары, мікалаеўскі час. Уменне вылучыць з велізарнага ліку запісаў самае важнае, найбольш грамадска каштоўнае ярка кідаецца ў вочы пры ўважлівым чытанні адкрэсліванняў Уладзіміра Ільіча. Гэтымі ўдумлівымі заўвагамі, зробленымі пры беглым прачытванні велізарнага тома, Уладзімір Ільіч як бы даў напрамак усёй рабоце нашых даследчыкаў у галіне народнай паэтычнай творчасці.

Глыбокі сацыяльна-палітычны аналіз, выяўленне грамадскіх матываў народнай творчасці, ускрыццё іх ідэйнай сутнасці і палітычнай значымасці класавых антаганізмаў, адлюстраваных у фальклоры народаў СССР і рускага народа ў прыватнасці і ў асаблівасці,— вось што патрабуецца ад сучаснага вывучэння гэтай народнай творчасці. Гэты шлях даследавання ўказаў усім нам Уладзімір Ільіч сваім вывучэннем «Завоенных плачей». І гэты запавет Уладзіміра Ільіча мы павінны выканаць. <...>

# ПІСЬМЕННІКІ І ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ АБ ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

## В. Р. БЯЛІНСКІ

Паэзія кожнага народа ёсць беспасрэднае выражэнне яго свядомасці; таму паэзія цесна зліта з жыццём народа. Вось прычына, чаму паэзія павінна быць народнаю і чаму паэзія аднаго народа не падобна на паэзію ўсіх іншых народаў.

⟨...⟩ Для кожнага народа ёсць дзве вялікія эпохі жыцця: эпоха натуральнай непасрэднасці, або дзяцінства, і эпоха свядомага існавання. У першую эпоху жыцця нацыянальная асаблівасць кожнага народа выражаецца больш рэзка, і тады яго паэзія бывае пераважна народнаю.

Паэзія кожнага народа знаходзіцца ў цесных суадносінах з яго гісторыяй: у паэзіі і ў гісторыі роўным чынам заключаецца таямнічая псіхея народа, і таму яго гісторыя можа быць растлумачана паэзіяй, а паэзія — гісторыяй.

⟨...⟩ Зразумела, усякі асобны народны твор быў абавязаны сваім пачаткам адной асобе, якая, з гора або з радасці, раптам заспявала яго; але, па-першае, гэта асоба, стварыўшы, ці, кажучы яго ўласнай мовай, склаўшы песню, сама не ведала, што яна — паэт, і глядзела на сваю справу не як на справу, а хутчэй як на забаўку ад няма чаго рабіць; па-другое, песня, пераходзячы з вуснаў у вусны, зведала многа змен, то прыбаўляючыся, то ўбаўляючыся, то паляпшаючыся, то скажаючыся, гледзячы на ступень прысутнасці ці адсутнасці паэтычнага пачуцця ў спяваўшых яе.

## М. А. ДАБРАЛЮБАЎ

Зборнік п. Афанасьева пераўзыходзіць іншыя па сваёй паўнаце і па дакладнасці, з якой выдавец стараўся прытрымлівацца народнай гаворкі, нават самога вымаўлення. Але і зборнік п. Афанасьева не запаўняе таго недахопа, які неяк прыкра ўражвае ва ўсіх нашых зборніках. Недахоп гэ-

ты — поўная адсутнасць жыццёвага пачатку... Вырваць факт з жывой сапраўднасці і паставіць яго на палічку побач з пыльнымі фаліянтамі, або класіфікаваць некалькі ўрывачных, выпадковых фактаў на аснове школьных лагічных дзеянняў — гэта значыць знішчыць тую жыццёвасць, якая заключаецца ў самім факце, пастаўленым у сувязі з акаляючай яго сапраўднасцю. П. Афанасьеў не адхіліўся ад звычайнай дарогі нашых збіральнікаў, і таму нам уяўляецца і яго зборнік якімсьці паліпсэстам, у якім хоць і відаць некаторыя рысы сапраўднага народнага жыцця, але разабраць іх надзвычай цяжка пад новым напісаннем мудрагелістага кніжніка. ...А народ то і не ўведаеш з казак, выданых п. Афанасьевым. ...Нам казкі найбольш важныя, як матэрыялы для характарыстыкі народа. Што з таго, сапраўды, што ў народзе захаваліся казкі аб дружбе лісы з ваўком, аб каварных штуках лісы над петухом, аб яе адносінах да чалавека і г. д. ...Нам ніхто са збіральнікаў і апісальнікаў народнага быту не растлумачыў, у якіх адносінах знаходзіцца народ да расказваемых ім казак і паданняў. Ці верыць, напрыклад, у народзе у тую разумнасць адносін паміж звярамі, якая выказваецца ў многіх казках? Ці падобныя казкі прымаюцца ў народзе такім жа чынам, як мы чытаем паэмы Гамера? Ці думаюць казачнікі і іх слухачы аб сапраўдным існаванні цудоўнага трыдзесятага царства, з яго жамчужнымі пальцамі, кісельнымі берагамі і інш.? Ці лічаць сапраўднасцю вайну цара Гароха з грыбамі, магутнасць рознага роду знахараў, чараўнікоў, ведзьмаў і інш., дапамогу добрага чараўніка, які абараняе нявіннасць і г. д.? Ці, наадварот, усё гэта ў іх не праходзіць у глыбіню сэрца, не аваладвае ўяўленнем і розумам, а так сабе гаворыцца для прыгожага слова... Таму нам здаецца, што кожны з людзей, хто запісвае і збірае творы народнай паэзіі, зрабіў бы вельмі карысную рэч, калі б не стаў абмяжоўвацца простым запісваннем тэкста казкі або песні, а перадаў бы і ўсе абставіны, як чыста знешнія, так і больш унутраныя, маральныя, пры якіх удалося пачуць яму гэту песню ці казку.

## М. Г. ЧАРНЫШЭЎСКІ

<...> Народная паэзія... заўсёды поўная свежага, энергічнага, сапраўды паэтычнага зместу. Яна заўсёды ўзвышаная, цнатлівая, калі можна так сказаць, чыстая, пранікнута ўсімі пачаткамі прыгожага, якія цалкам развіваюцца ў чалавеку, праўда, толькі цывілізацыяй, але якія, аднак, ляжаць у сутнасці нашай маральнай арганізацыі, таму інстынктыўна ўладараць над чалавекам, калі ён не сапсаваны неспрыяльнымі абставінамі. Яна належыць цэламу народу, таму чужая ўсялякай дробязнасці і пустаты, якой у несапсаваным народзе можа паддацца толькі асобны чалавек, а не цэлая маса; яна наогул поўная жыцця, энергіі, прастаты, шчырасці, дыхае маральным здароўем. Які змест, такая і форма яе: простая, натуральная, высакародная, энергічная.

## МАКСІМ ГОРКІ

<...> Найбольш глыбокія і яркія, мастацкі дасканалыя тыпы герояў створаны фальклорам, вуснай творчасцю працоўнага народа. Дасканаласць такіх вобразаў, як Геркулес, Праметэй, Мікула Селянінавіч, Святагор, далей — доктар Фауст, Васіліса Прамудрая, іранічны ўдачнік Іван-дурань і нарэшце — Пятрушка, які перамагае доктара, папа, паліцэйскага, чорта і нават смерць,— усё гэта вобразы, у стварэнні якіх гарманічна спалучаліся рацыё і інтуіцыё, думка і пачуццё. Такое спалучэнне магчыма толькі пры непасрэдным удзеле стваральніка ў творчай рабоце рэчаіснасці, у барацьбе за абнаўленне жыцця.

Вельмі важна адзначыць, што фальклору зусім чужы песімізм, не гледзячы на той факт, што творцы фальклору жылі цяжка і пакутліва — рабская праца іх была абессэнсавана эксплуататарамі, а асабістае жыццё — бяспраўнае і безабароннае. Але пры ўсім тым калектыву як бы ўласціва ўсведамленне яго бессмяротнасці і ўпэўненасць у яго перамозе над усімі варожымі яму сіламі.

<...> Сапраўдную гісторыю працоўнага народа нельга ведаць, не ведаючы вуснай народнай творчасці, якая бесперапынна і пэўным чынам уплывала на стварэнне такіх буйных твораў кніжнай літаратуры, як, напрыклад, «Фауст», «Прыгоды барона Мюнхгаўзена», «Пантагруэль і Гарганцюа», «Тыль Уленшпігель» дэ Кастэра, «Вызвалены Праметэй» Шэлі і шмат якія іншыя. Ад глыбокай старажытнасці фальклор неадступна і своеасабліва спадарожнічае гісторыі. У яго свая думка аб дзейнасці Людовіка XI, Івана Грознага, і гэта думка рэзка адрозніваецца ад ацэнкі гісторыі, напісанай спецыялістамі, якія не вельмі цікавіліся пытаннем аб тым, што іменна ўносіла ў жыццё працоўнага народа барацьба манархаў з феадаламі.

## П. М. ШПІЛЕЎСКІ

<...> Па дарозе мне сустракаліся знаёмыя твары і касцюмы, чулася родная беларуская мова, якая... шчаслівы час!.. некалі, у гады маленства і дзяцінства, гучала ў вушах маіх, калі добрая бабулька-нянька закалыхвала мяне фантастычнымі казкамі пра шапачку-невідзімку, пра заклятых княжнаў, пра Бабу-Ягу — касцяную нагу.

У гады дзяцінства я і сам марыў, што некалі, гадоў праз дваццаць... буду вывучаць або, дакладней, давучваць родную сваю мову і для гэтага падарожнічаць па тых самых месцах, што дарагія для мяне ўспамінамі аб шчаслівым мінулым. Цяпер настаў для мяне час выкарыстаць даўняе знаёмства з гэтай старажытнарускай мовай, на якой гаварылі галоўныя плямёны славяна-рускія, крывічы і дрыгавічы, і на якой пісалі на Русі многія акты і дагаворы, нават Літоўскі статут. Прыглядзеліся і казкі, чутыя ў дзяцінстве, і прымаўкі, і прыказкі, і розныя павер'і пра духаў, ведзьмароў, чараўнікоў і страшыдлаў некалі язычніцкага рускага народа.

Тое, над чым раней у нас смяяліся і лічылі не больш чым забавамі лакейскіх і дзявочых у памешчыцкіх хутарах, цяпер звяртае ўвагу вучонага рускага свету, за тое цяпер узяліся сур'ёзна і разумна ў вучоных кабінетах і кафедрах... І не дзіва, беларуская мова, паданні, павер'і і казкі беларусцаў варты таго: беларуская мова такая самастойная, настолькі характарыстычная ў археалагічных і філалагічных адносінах, паданні, павер'і і казкі яе настолькі арыгінальныя, да таго напоўнены першабытнай, старажытнай паэзіяй славяна-рускай, што пры сучасным напрамку і развіцці ў нас філалогіі і археалогіі становіцца неабходным даследаваць і знайсці галоўны прытулак старажытнай рускай славяншчыны і пазнаёміцца добра з роданачальнымі яе элементамі, якія захаваліся ў Беларусі: вывучаючы беларускую мову, паданні, павер'і і казкі беларускага народа, мы вывучаем мову, паняцці і вераванні сваіх продкаў.

Пачуўшы даўно знаёмую мне беларускую мову, я міжволі спыніўся і, здавалася, удыхаў у сябе пачутыя ў паветры гукі меладычнай, пявучай мовы, у душу маю так вось і прасіліся адгалоскі слоў, вымаўленых, па звычаю беларусцаў, нараспеў, працягла.

## АЛЯКСАНДР РЫПІНСКІ

Ёсць у простай яго (селяніна) думцы, у шчырай наіўнай ноце яго песні, у яе прыродных танах якаясь невядомая любасць, чаройная сіла, якая прымушае шыбка біцца сэрца; захапляе, уракае, нават самой прастатой цешыць розум.

## ЯН ЧАЧОТ

Калі б такія ўсе ўрачыстасці (вяселлі і старажытныя святы) не ўнікалі вока даследчыка, які цікавіцца і любіць свой край і сялян, быў бы гэта цудоўны помнік уласнай фантазіі і ўяўлення жыхароў беларускай зямлі, што не настроены ні на грэчаскі, ні на лацінскі, ні на французскі лад, а спяваюць так, як адчуваюць сэрцам. Такіх урачыстасцяў шмат, напрыклад, купалле, дзяды, каляды, вялікдзень, шчадрэц, зажынкі, дажынкі, Юр'е. Усё гэта з рытуаламі і песнямі... Словам, пільна трэба заняцца збіраннем такіх помнікаў сапраўднай літаратуры гэтага краю.

## ІГНАТ ХРАПАВІЦКІ

Не трэба думаць, што паэзія беларуская была пазбаўлена ўсялякай гістарычнай вартасці. Наадварот, можа стаць прадметам цікавых назіранняў для гісторыка, які, не абмяжоўваючыся храналогіяй, сухой наменклатурай славутых імён, апісаннем войнаў і да т. п., хацеў бы адкрыць нам унутранае жыццё народу. Бо ў ёй выразна адбіты звычаі, хатні быт, характар нашага люду.

2 Зак. 3328

Памыліліся б мы, аднак, гаворачы, што гэта схільнасць нашага селяніна прыймання ўсялякіх уражанняў выключала здольнасць глыбока прасякнуцца імі. Нават павярхоўнае знаёмства з паэзіяй нашага люду павінна засцерагчы нас ад падобнай памылкі. Без гэтай велічы сэрца як бы мог просты беларускі селянін, аздобіць свае творы кветамі найтанчэйшых пачуццяў і выпрацаваць у сабе такі мастацкі інстынкт, які часта адкрывае яму без дапамогі навуковых росшукаў самыя запаветныя таямніцы мастацтва.

## АДАМ МІЦКЕВІЧ

...З усіх славянскіх народаў русіны, гэта значыць сяляне Пінскай, часткова Мінскай і Гродзенскай губерняў, захавалі найбольшую колькасць агульнаславянскіх рыс. У іх казках і песнях ёсць усё. Пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі літоўскі статут напісаны іх мовай, самай гарманічнай, з усіх славянскіх моў найменш зменінай. Усю сваю гісторыю на зямлі яны прайшлі ў страшэннай галечы і прыгнёце.

## УЛАДЗІСЛАЎ СЫРАКОМЛЯ

Справай вялікага значэння з'яўляецца ці то збіранне легенд, якія засталіся з часоў дахрысціянскай славяншчыны, у мэтах чыста гістарычных, ці то мастацкае адкрыццё цераз іх мінулага, што мроіцца за імглой вякоў, мінулага, частку вестак пра якое данеслі летапісы, частку дакапваемся мы з курганоў. Здаецца, гэта няшмат, але і з такой крыхі геніяльны паэт можа стварыць рэчы гамераўскай магутнасці, бо шмат таго, што нам недараскавала кніжка або старая магіла, знайсці можна пад саламянаю страхою народа, які ў паданнях, казках, прыказках, прымхах і мове захаваў яшчэ мноства дахрысціянскага элементу. Вышэй жа за ўсё — умець падслухаць біццё сэрца гэтага народа, умець адкрыць іерогліфы легенд ключом уласнай шчаслівай інтуіцыі, умець узнавіць вобразы мінулага ў барвах і контурах, якія на працягу стагоддзяў асталіся,— вось заданне паэта, вось яго нагляднaя ніва.

## М. В. ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ

У песнях беларусаў шмат хараства і грацыі. Калі беларуская дзяўчына дзе-нібудзь у лесе ці на паляне зацягне вяснянку, у яе песні адбіваецца лікаванне веснавой прыроды, ціхая радасць прабуджэння вясны; любоў і пяшчота нястрымана ліецца ў голасе спявачкі. Гэта — гімн вясне. На полі ў час жніва раздаецца ціхая журботная мелодыя, здольная выклікаць у слухача шчырыя слёзы: гэта маладзіца аплаквае сваю горкую долю. Але калі жнеі вяртаюцца дахаты, асабліва пасля дажынак, то з іх грудзей выліваецца вясёлая здаровая песня, у якой чуецца здаволенасць пасля несупыннай

дзённай працы. Матывы песень, прымеркаваных да другіх часоў года, адрозніваюцца тужлівым настроем, які цалкам гармануе са словамі.

...Народная творчасць беларусаў складае наша вялікае багацце, якім беларусы могуць ганарыцца. Яго павінны падтрымліваць і захоўваць.

## ЯНКА КУПАЛА

<...> Кнігі абудзілі маю фантазію... Але больш за ўсё, я думаю, зрабілі на мяне ўплыў беларускія народныя казкі, якія я чуў у маленстве. Калі мы жылі ў Прудзішчы (тады я быў яшчэ хлапчуком), у нас служыў рабочы... нехта Песляк... І вось ён быў, як мне тады здавалася, надзвычайны майстра расказваць казкі, ды яно так і было. Памятаю, што я не даваў яму праходу. Ці пойдзе ён у поле араць, ці паедзе на начлег, я заўсёды з ім і заўсёды выпрошваю ў яго казкі. Расказваў ён захапляюча... Можаце сабе ўявіць: чалавек ходзіць за сахой, а следам за ім, як варона, хаджу я і слухаю. Другі такі апавядальнік... быў ужо ў Селішчы. Таксама я яму не даваў спакою ні днём, ні ўначы. Дык вось хто, бадай, быў маім першым настаўнікам, хутчэй натхніцелем у адносінах да маёй... паэтычнай творчасці.

Не толькі блізкасць да народа, з якім я падзяляў і гора і радасць, але і народная творчасць, з якой я знаёміўся, слухаючы ад блізкіх мне людзей казкі і інш., безумоўна, рабілі на мяне свой уплыў у сэнсе развіцця фантазіі... Якія былі паэтычныя штуршкі? Усё навакольнае. І сацыяльная і нацыянальная крыўда, і беларуская прырода, і песні, пачутыя на полі, на вяселлі, на вечарынцы і г. д.

## ЯКУБ КОЛАС

<...> І другое, што ўражала больш за ўсё: матчын голас. Нават калі яна сварылася на нас і пачынала ўшчуваць, голас не траціў мяккасці і дабраты. Я вельмі любіў, як яна спявала. Спявалі ў нас рэдка: прыедуць госці, падгуляюць і тады заводзяць песні: і жанкі і мужчыны. Тут ішлі ў ход найболей жартоўныя мелодыі, скочныя. Галасы, у тым ліку і матчын, рабіліся прарэзлівымі, як бы штучнымі. А мне падабалася іншае. Управіўшыся з чарнейшаю работаю па хаце і па гаспадарцы, маці садзілася, як на адпачынак, за верацяно або за шытво. Яна спачатку абзывалася ледзь чутна, тонка-тонка, як шчыгол, прабуючы голас, ці не ахрып часам за ноч. Потым матчына песня бралася ў сілу і запаўняла хату.

Спявала маці, калі дома не было мужчын, бацькі і дзядзькі. Ці то саромелася яна, ці можа лягчэй было ёй думаць, успамінаць дзявочыя гады пад той просценькі напеў. А ўлюбёная матчына песня расказвала пра нешчаслівае каханне, і галоўнаю асобаю, разлучнікам, выступаў Нёман. Ні матыву, ні слоў успамянуць не магу, але яна недзе жыве ва мне, і калі пачынаю ўяўляць нашу хату, маці пры рабоце,— здаецца, чую і песню. <...>

<...> Я многа запісваў такога (этнаграфічнага і фальклорнага) матэрыялу і ведаў многа апавяданняў і анекдотаў з сялянскага жыцця. Гэтымі апавяданнямі я на працягу чатырох год забаўляў сваіх таварышоў у часы адпачынку.

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

Жыў на свеце музыка. Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы. І плакала ў яго руках скрыпка, і такая была ў яго гранні нуда, што аж за сэрца хапала...

Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы: так і ўдарыўся б груддзю аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваёй долі...

А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў у вачах людзей і тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, звоніць рымка, бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і заве ён народ. І людзі падымалі апушчаныя галавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы.

Тады бляднелі і трасліся, як у ліхаманцы, і хаваліся ад страху, як тыя гадзюкі, усе крыўдзіцелі народу. Многа іх хацела купіць у музыкі скрыпку яго, але ён не прадаў яе нікому. І хадзіў ён далей між бедным людам і граннем сваім будзіў ад цяжкага сну.

Але прыйшоў час, і музыкі не стала: злыя і сільныя людзі кінулі яго ў турму, і там скончылася яго жыццё... І тыя, што загубілі музыку, узялі яго скрыпку і пачалі самі граць на ёй народу.

Толькі іхняе гранне нічога людзям не сказала. «Добра граеце,— гаварылі ім,— ды ўсё не тое!» І ніхто не мог растлумачыць, чаму ад грання музыкі так моцна білася сэрца бедакоў. Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора.

Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разбілася. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам. І з-паміж таго народу, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе...

## ЦЁТКА

Наша народная песня вылілася з сэрца, вуснаў і фантазіі ўсяго народу беларускага і дзеля таго называецца народнай. Гэту песню наш народ складаў вякамі ў розныя хвіліны свайго жыцця: ён як бы выкаваў шчырымі словамі ў вузкія рамкі песні ўсе свае радасці, свой смех, сваё гора, долю і нядолю, слёзы жыццёвыя. Песня народная шчырымі словамі, не раўнуючы, як працавітымі пчолкамі, сабрала ўсё багацце красы і праўды для сваіх

узораў. З пакалення ў пакаленне народ ад дзеда — унуку, а ўнук — праўнуку перадаваў у песні глыбокую і праўдзівую навуку тым, перад каторым яшчэ слаўся няпройдзены цяжкі жыцця шлях.

Толькі кожнае новае пакаленне да дзедавай навукі-песні дадавала яшчэ ўласнымі губамі свой уласны погляд на жыццё, свой боль, свой жаль, свой смутак і сваю радасць. Таму то для нас народная песня так зразумела, так родна, так блізка сэрцу, бо ў ёй мы чуем і слёзы памершай маткі і радасць брата, надзеі сястры і залатыя свае ўласныя сны. Затым то наша песня народная так гудзе ўлетку пры кожнай працы — ці то на полі, ці то на лузе, ці ў лесе, ці ў садочку. А прыдзе зіма,— заштурмуюць сіверы — народная песня разам з намі туліцца пад страху — у цесную нашу хатку, жыве ў ёй разам з намі, з нашымі думкамі, жаданнямі. Сэрцу нашаму песня дае пацеху, а дзеткам, слухаючым яе,— жывую навуку.

## ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

<...> Беларуская народная творчасць — гэта заваражанае люстра сялянскага жыцця, якое адбівае жывы малюнак не толькі за пэўны перыяд, за маленькі час, але сцэніруе быт ад самога пачатку гістарычнага існавання народа да апошніх дзён. Калі возьмем любую песню, любую казку, дык адразу пабачым вобраз, пачуем непадроблены голас народа, які падсвядома, інстынктыўна рваўся да вольнага жыцця доўгімі вякамі. Наша народная творчасць — гэта рухлівы калектыўны вусны летапіс, пісаны не ў манастырскіх мурах.., але апяваная ў песнях на сотні ладоў гора-нядоля мужыка-селяніна. На прасторах палёў і лугоў араты бачыў вакол сябе волю, а на сваім карку адчуў бізун панскага прыганятага, які не адыходзіў ад нявольніка ні на крок.

<...> Песня гэта кіравалася тахтам грабель і цапоў; дзынканне касы і шастанне сярпоў на спелых каласах тварылі яе рытмы; зычная крынічка, пералівы рэчкі на лузе даравалі ёй час ад часу просценькія вянкі рытмаў; чырвоная калінка, шэрая зязюленька і зялёны яварок шчыра вартавалі беларускую песню з абодвух канцоў: служылі ёй загартаванымі прыпевамі-замовамі.

<...> Водгалас пушчы падхопліваў яе, песню, прапускаў праз сіта галін-пляцёнак, рассяваў яе ветрам віхурным па ўсіх абшарах беларускага краю. Па разлогах-далінах, па вёсках-сялібах яе сустракалі, як шчыра пажаданую госцейку-сваццю, жалейка, дуда, цымбалы і ліра.

## МАКСІМ ГАРЭЦКІ

<...> Мастацкасць вусных народных твораў з'яўляецца прадуктам безупыннай творчасці на працягу многіх вякоў, прычым усё горшае з мастацкага быту забывалася ці адкідалася, а ўсё лепшае жыло. Паміма таго,

што першымі аўтарамі вусных твораў былі выдатныя паэты-мастакі, іхнія творы шліфаваліся потым масамі, праходзячы праз многія-многія вусны, і з'яўляліся школаю для далейшага развіцця мастацкасці.

* * *

Вусная народная творчасць гэтак жа старая, як і само чалавецтва. Нарадзіўшыся адначасна са з'яўленнем чалавека, як мыслячай істоты, вусная народная творчасць расце, развіваецца, ускладняецца адначасна з узростам, развіццём і ўскладненнем чалавечага духа. Народная творчасць жыве датуль, пакуль жыве народ.

<...> Народная вусная творчасць дае багаты матэрыял і для лінгвіста-мовазнаўца, і для гісторыка культуры, і для юрыста (народнае звычаёвае права), і для гісторыка літаратуры, і для паэта, і для артыста-мастака, і для разьбяра і г. д. Народная творчасць наогул, а беларуская народная творчасць увасобку — гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць.

## КАНДРАТ КРАПІВА

<...> Мастацкі бок прыказак гаворыць нам аб вялікай жывасці ваабражэння стваральнікаў прыказак, аб чым сведчаць тыя надзвычайныя супастаўленні, якія мы бачым у метафарах і параўнаннях. Мастацкі густ народа выявіўся як у справе маляўнічасці, так і ў сугучнасці прыказак, якая часамі дасягае ўзроўню лепшых узораў сучаснай паэзіі. Вобразнасць скрозь вызначаецца канкрэтнасцю і пластычнасцю. Нават адцягненыя паняцці, як голад, бяда, няволя, уяўляюцца рэальнымі істотамі.

Спецыфічнымі рысамі светапогляду і характару беларускага селяніна мінулага часу, якія адбіліся ў прыказках, на мой погляд, з'яўляюцца адсутнасць рэлігійнага фанатызму, скромнасць і некаторы скептыцызм у адносінах да рэчаў і людзей, а адгэтуль іронія, якой прасякнута такая значная колькасць беларускіх прыказак. <...>

## А. А. АФАНАСЬЕЎ

Чароўная беларуская народная казка па праву можа лічыцца непараўнальнай па сваёй паэтычнасці ў свеце казак славянскіх народаў.

## С. В. САЎЧАНКА

<...> Багацце казак пра жывёл у Беларусі — даволі знамянальная з'ява. Да таго ж, беларускія казкі пра жывёл і расказваюцца на дзіва захапляюча... Нам здаецца, што гэтыя казкі — сапраўдныя ўзоры беларускага казачнага эпасу... У беларускіх зборніках багата таксама «лірычных» казак, старых, традыцыйных, пра Каціғарошка, Сучанка, пра пачварных змеяў

і інш. І расказваюцца яны надзвычай жыва і маляўніча; адчуваецца, што апавядальнік вельмі блізка зжыўся са сваімі героямі, цудоўна разумее ўсе матывы іх учынкаў і ўмее надзвычай вобразна перадаць.

Перачытаўшы ўсе рускія казкі, мы можам смела сцвярджаць, што па жывасці і прыгажосці апавядання беларускія казкі не маюць сабе роўных. Нават лепшыя казкі Анчукова і Сакаловых уступаюць ім у гэтых адносінах, хаця пераўзыходзяць у строгасці эпічнай канструкцыі. <...>

## Е. Р. РАМАНАЎ

...Беларускія песні... рашуча абвяргаюць думку аб беднасці беларускіх мелодый. Праўда, большая частка іх тужлівая і выклікае слёзы ў слухачоў, якія хоць крыху знаёмы з трагічнай гісторыяй гэтага народа-пакутніка, але затое яны ж сведчаць аб глыбокай старажытнасці беларускай народнай паэзіі і служаць доказам жывучасці і сілы беларуса, які не згубіў, нягледзячы на ўсе гістарычныя перавароты і цяжкія ганенні, свайго этнаграфічнага аблічча.

## МІХАЛ ФЕДАРОЎСКІ

Багацце беларускай народнай песні — нязмернае: вяселле ці пахаванне, хрэсьбіны ці заручыны, кожны занятак, кожная пара года мае свае арыгінальныя спевы. Пачуцці, страсці выражаюцца ў спеве. У песні гучыць прызнанне ў каханні, часам скарга, або нават, хоць вельмі рэдка, пракляцце. Мелодыі іх, за выключэннем вясельных, якія грашаць манатоннасцю, тужлівыя, паважныя, у вольным тэмпе, нібы шум сосен у беларускіх барах.

## АНТОН ГРЫНЕВІЧ

Песня людская адбівае ў сабе душу чалавека, яго боль і гора, яго патрэбы, жаданні і само жыццё. Як па абліччу пазнаюць чалавека, так па песні, асабліва народнай, пазнаецца цэлая нацыя, яе характар і душа. Разам з гэтым песня многа прыносіла і прыносіць карысці для народу: яна быццам зменшвае людскія няшчасці, пацяшае ў нядолі, а калі трэба, дык і весяліць. Усім вядома, што песня — гэта быццам нейкая вялікая таемная сіла: яна памагала будзіць народ, узахвочваць яго да працы, падымаць з цемнаты, клікаць да святла — навукі, да абароны свайго краю, на добрыя важныя справы. Для таго ў народаў з шырокай асветай песня даўным-даўно заваявала сабе пачэснае месца, яе справядліва шануюць, як вялікі ўсенародны скарб...

## М. М. ПЯТУХОВІЧ

Беларускі мастацкі фальклор вызначаецца вялікім багаццем і своеасаблівай разнастайнасцю. На тэрыторыі Беларусі да гэтай пары сабрана манументальная скарбніца фальклорных матэрыялаў. Але гэта скарбніца мала

выкарыстана навуковымі даследчыкамі. Багацце беларускага фальклору ў навукова-даследчым ужытку да нашай пары застаецца амаль мёртвым капіталам, які яшчэ чакае свайго абароту ў галіне навуковай думкі.

...Беларуская абрадавая паэзія грунтуецца на шырокай аграрнай аснове. Гэта аснова ва ўсіх нашых абрадах і звязаных з імі песнях выступае вельмі яскрава; можна сказаць, што ў нашай абрадавай паэзіі «ўлада зямлі» выдаецца на першы план.

## А. Т. ТВАРДОЎСКІ

### «Лявоніха»

Увечары, па дарозе ад Вільнюса да Мінска, давялося мяняць скат. І ледзь замоўк матор, як да слыху дайшлі гукі вельмі знаёмай музыкі. Здарылася, што мы быццам знарок спыніліся каля гэтага доміка на голым пагорку. Там іграў гармонік, але не просты, ды не іначай баян — па шматгалоссю і тонкай ускладнёнасці простага, зусім-зусім знаёмага матыву. І іграў, відаць, майстра сваёй справы.

Мы прыслухаліся якраз у той момант, калі ён пачаў як бы нехаця, з гэтакай акруглай раскачкай выводзячы матыў, абяцаючы, аднак, вось-вось узяць іншы тэмп,— гэта ўгадвалася перш за ўсё, чым слых вызначыў, што іграюць «Лявоніху», цудоўны беларускі танец. У вячэрнім паветры, пасенняму чуйным, ён гучаў так шчымліва, з такой падмываючай сілай, што і шафёр, які ўжо паддамкраціў задні мост, працаваў, стараючыся не вельмі грымець ключом.

«Ах, Лявоніха, Лявоніха мая...» — быццам бы неслася адтуль, з доміка, і здавалася, што гэта ён сам, невялікі, чатырохаконны, акуратны, увесь гучыць гэтай песняй.

Ах, «Лявоніха»! За кожным матывам, пачутым некалі, як за кожным пахам кветкі, цэлая бездань успамінаў, лепшая палавіна жыцця, а то і цэлае жыццё.

Ах, «Лявоніха»! Упершыню я пачуў твой цудоўны, заліхвацка-гарэзлівы і разам з тым журботна-пяшчотны лад даўно-даўно, не толькі да вайны, задоўга да юнацтва, у дзяцінстве, дзесьці ў родных мясцінах, куды яго выпадкам занесла, можа быць, з якім-небудзь ярмарачным гарманістам. І, бадай, ён тады ўжо нешта нагадаў мне, нібы ўвайшоў у маю душу невядомым шляхам яшчэ раней. Многа спагадзя, у юнацтве, калі мне давялося быць на адным з вялікіх беларускіх свят у сталіцы рэспублікі — Мінску, я зноў пачуў яго і ўбачыў гэты танец на сцэне вялікай канцэртнай залы. Тут ужо я ведаў, што гэта «Лявоніха», і матыў яе яшчэ глыбей узрушыў мяне. Прайшло яшчэ многа год, прайшла маладосць, прайшло многа беззваротна, толькі вайна не прайшла яшчэ. І вось недзе на мяжы Літвы і Беларусі я пачуў раптам «Лявоніху». Не, я яшчэ яе недзе чуў, не можа быць, каб гэта за ўсю вайну ўпершыню...

Тут мы, прыслухоўваючыся ўсё больш беражліва і напружана, абменьваючыся між сабой ад хвалявання разгубленымі ўсмешкамі, вельмі выразна пачулі, што ўсё хутчэйшаму тэмпу музыкі ўторыць глухі, грубы, але суладны стук і грукат танца.

Мы з таварышам не вытрымалі і пайшлі да доміка па сцежцы ўгору, уздоўж градак з макам, які адцвітаў і ўжо выйшаў у галоўкі. Чым бліжэй мы падыходзілі, тым больш гарэзліва і нясцерпна заліваўся баян, збіваючы з ног. Баяніст ударыўся раптам у такія тонкія, пеўневыя вярхі і то раптам «прарэзваў» на басах, масніцы дома тым часам аддавалі ўсё, што маглі.

Дзверы былі расчынены насцеж, усюды, нават у сенцах, тоўпіліся жанчыны, дзяўчаты, шмат нашых байцоў і два-тры маладзенькія афіцэры. Адзін з іх, з трохпавярховай нашыўкай за раненні і ордэнам, танцаваў на сярэдзіне. Пілотка цудам трымалася на яго незвычайна густой капе цёмнарусых валасоў з выцвілымі ад сонца чубамі налева і направа. У пары з ім танцавала дзяўчына ў ваенным. Шырокія кірзавыя халявы ботаў свабодна хадзілі вакол яе стройных, хаця і даволі поўных ног, а форменная спаднічка туга абцягвала яе. Але гэта не перашкаджала ёй танцаваць лёгка, з непрымусовай гуллівасцю, з настойлівым і неадступным выклікам лейтэнанту ў пілотцы. Пілотка ў яго ўжо вось-вось павінна была зваліцца — такія ён штукі вырабляў — і ўсё трымалася, быццам прыхопленая да валасоў шпількай.

За тлумліва людскім кругам не адразу было разгледзець, дзе баяніст. Ён сядзеў на лаве, спіной да стала, на якім быў непрыбраны посуд, што ціха брынчэў і быццам хадзіў па стале ў тэмпе танца. Гэта быў крыху санлівы хлопец з шырокім, здаровым тварам, на якім выраз санлівасці і спагадлівай важнасці станавіўся тым больш прыкметным, чым больш заліхвацка і задзёрыста ён выводзіў віртуёзныя абароты танца.

А кароткія загарэлыя пальцы байца як быццам і не спяшаліся бегаць па белых гузіках, як быццам яны толькі сачылі за парадкам, а іграў сам баян — на тое, маўляў, і інструмент такі дарагі...

Ну дзе ж я яшчэ на вайне чуў «Лявоніху»?..

Вось баяніст налягае грудзьмі на свой ганарлівы інструмент і, ледзь не хмурачыся ад важнасці, выводзіць нешта ўжо зусім незвычайнае, але якраз тое, што патрэбна распаленаму ходу танца. Раптам лейтэнант страсянуў галавой, пілотка нарэшце звальваецца з галавы, ледзь затрымаўшыся за чуб,— ды не, гэта ён знарок. Яшчэ адным такім жа зухаватым рухам галавы ён садзіць яе на месца і, працягваючы вырабляць калена за каленам, прыціскае рукі да грудзей, кланяецца, адступае, натыкаючыся спіной на цесны натоўп гледачоў: «Увесь, не магу болей...»

«Ага,— рукамі, нагамі і ўсёй наступальнай выхадкай быццам гаворыць дзяўчына,— ага, увесь? Не, трымайся, калі ўзяўся, воін».

— Міця, не адступі! — кідае нехта адчайны прызыў з натоўпу, бачачы ўсё гэта.

— Не, баюся, што шво разыдзецца,— жартуе, задыхаўшыся, лейтэнант, усё яшчэ працягваючы танцаваць.

І дзяўчына з выразам ласкавай і хітраватай урачыстасці на потным, расчырванелым твары і ў вялікіх шэрых вільготных вачах пачынае шкадаваць яго, таксама адступаючы і раскланьваючыся на хату.

І, перш чым гарманіст абарваў, я прыгадаў, калі яшчэ я чуў такую ігру на баяне і глядзеў танец накшталт гэтага. Гэта было недзе пад Юхнавам, у зімнім лесе, поўным дыму і пары, што ішла з сумётаў, пад якімі глыбока ў прамерзлай зямлі хавалася акопнае жыццё. Як гэта далёка адсюль, як гэта даўно было!

Танцавала тады перад байцамі, пад сасновымі накатамі вялізнага бліндажа, адна жанчына з пятліцамі ваеннага ўрача. Яна была родам з Беларусі і запомнілася мне яшчэ таму, што пры ўручэнні ёй у той вечар ордэна сказала замест: «Служу Савецкаму Саюзу» — «Служу савецкаму народу» — і страшэнна збянтэжылася, думаючы, што зрабіла непапраўную памылку. А потым разышлася і танцавала да ўпаду родную «Лявоніху».

Ах «Лявоніха», мілая песня, вунь як ты далёка пабывала і назад вярнулася!..

Мы паціху выйшлі. «Віліс», што ладна настаяўся, ірвануўся па яшчэ светлай шашы. І доўга ў дарозе яго ход складваўся нам на матыў: «Ах, Лявоніха, Лявоніха мая...»

І я прыгадаў, што мог прыгадаць з гэтай песні, падбіраючы радок да радка і, мусі быць, мяняючы што-небудзь, блытаючы беларускую мову з рускай, падстаўляючы словы, якіх не хапае, каб толькі не траціць ладу, што надоўга ў дарозе захапіў маю душу.

А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявонісе чаравічкі купіў.
Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі палясківала.
А чаму ж цябе пярун не забіў,
Як ты мяне ў маладосці любіў...

## А. Т. ТВАРДОЎСКІ

### Сэрца народа

Наўрад ці знойдзецца чалавек у нашай краіне, які б не ведаў цудоўнай застольнай песні:

Бывайце здаровы,
Жывіце багата...

Але мы ведаем яе ў рускім перакладзе, а песня гэта беларуская, народная, якая з'явілася ў першыя гады калгаснай заможнасці і набыла пасля паўсюднае прызнанне.

Адна гэта песня, якую балюча было пачуць у дні, калі ўся беларуская зямля ляжала за лініяй фронту, адна гэта простая, задушэўная і жартоўна-ласкавая песня — лепшае сведчанне красы зямлі і народа, які насяляе яе, народа са шчодрым, чэсным і вясёлым сэрцам.

Гэта тое самае сэрца, што моцна і назаўсёды даверылася праўдзе, якую першым абвясціў вялікі рускі народ...

У скарбніцы беларускага фальклору ёсць і іншыя цудоўныя песні, створаныя ў розны час і таксама вядомыя і любімыя за межамі гэтай рэспублікі. Узяць, напрыклад, пяшчотную і чуллівую «Перапёлачку», ці зухаватагарэзлівую нацыянальную танцавальную «Лявоніху». У ёй лёгка ўгадваецца багатае сэрца народа, з ласкавай пяшчотнасцю, з прастадушнай весялосцю і гарэзлівай зухаватасцю.

Беларусы наогул народ глыбока паэтычны. Кожны горад, кожная рака, што працякае па іх зямлі, надзелены асэнсаваным, легендарным паходжаннем...

Пройдуць гады, і народная фантазія абавязкова звяжа з памятнымі мясцінамі баёў за вызваленне Беларусі і гістарычнымі імёнамі свае легенды, паданні і песні. Гэтак жа будзе ўзнагароджана і памяць вызваліцеляў горада Магілёва, пра паходжанне якога, паводле народнага падання, расказаў у сваёй паэме «Магіла льва» Янка Купала, і памяць вызваліцеляў Мінска і іншых гарадоў Беларусі.

## А. К. СЕРЖПУТОЎСКІ

<...> Хаця добрыя апавядальнікі трапляюцца даволі рэдка, затое яны заўсёды прыцягваюць многа слухачоў. Бо тут вусныя апавяданні замяняюць усю літаратуру, якою карыстаюцца пісьменныя людзі, і таму маюць велізарнае значэнне ў жыцці непісьменнага простага люду. Пад уплывам апавяданняў, казак, прыказак і іншых твораў вуснай народнай творчасці вырабляецца часткова ўвесь светапогляд, уся жыццёвая мудрасць і ўсе этычныя ўяўленні цёмнага вясковага люду.

<...> Сапраўдныя падзеі змешваюцца ў апавяданнях беларуса з дзівоснай выдумкай. Нярэдка сам апавядальнік не ўсведамляе, дзе канчаецца рэчаіснасць і дзе пачынаецца выдумка. Такія, напрыклад, апавяданні пра страхі, пра хаджэнні мерцвякоў, пра штукарствы чараўнікоў і г. д.

Народ глядзіць на казачныя эпізоды як на падзеі, якія сапраўды адбываліся ў жыцці. Нездарма пры размовах спасылаюцца на тыя альбо іншыя сказанні з вядомых казак, апавяданняў і г. д.

Апавядальнікамі з'яўляюцца, вядома, больш здольныя і развітыя людзі. Гэта, так сказаць,— інтэлігенцыя. Адны з апавядальнікаў валодаюць найвыдатным красамоўствам, другія адрозніваюцца дарам мастацкага чуцця і творчасці, і амаль усе яны маюць схільнасць да філасофіі.

<...> Хаця кожны беларус ведае дзесяткі два бытавых апавяданняў і некалькі казак, не кожны любіць і ўмее расказваць. Добрыя апавядальнікі

сустракаюцца даволі рэдка. Усё іх мастацтва заключаецца ў тым, што яны ў свае апавяданні ўносяць асабістыя рысы,— перадаюць апавяданне пад вуглом гледжання свайго светапогляду... Добры апавядальнік... не звяртае ўвагі на дасканаласць зместу і падрабязнасці якой-небудзь падзеі. Ён бярэ ў апавяданні галоўную думку, якая выражаецца прыказкай ці адной характэрнай фразай, развівае гэту думку і вобразнымі зваротамі мовы тут жа складае цэльнае, закончанае, апавяданне. Добры апавядальнік — гэта свайго роду мастак-раманіст плюс актор-апавядальнік.



А. К. Сержпутоўскі ў час экспедыцыі (1909 г.)

Вось такія таленавітыя людзі, нікім не заўважаныя, усё сваё жыццё праводзяць у глухіх кутках. Пры іншых умовах, мусіць, яны сталі б нацыянальным гонарам. <...>

— Хадзі, песня родная, к нам у нашы святліцы! — на лад салаўіны прасіла жалейка; кволым голасам кленчыла дуда; дробным макам рассыпаючыся, шапталі цымбалы; залацiста-басавым голасам малілася ліра,— пагасціш у нас і пойдзеш далей у вандроўку. Ніякія перуны цябе не заб'юць, ніякія астрогі цябе не зняволяць, ніякія мячы і стрэльбы ў цябе жыцця не забяруць.

Ты, песня, будзеш жыць вечна, з пакалення ў пакаленне, пакуль прыдуць пісьменныя людзі і перальюць цябе на белы пергамент для ўнукаў і праўнукаў.

Нібы слуцкія паясы, нібы зычна барвяныя дываны беларускіх гарапашных сялянак, будзеш выражаць сэрцы родных песняроў і вучоных, і пакажаш свету ўсяму, як жыў калісьці беларускі ратай — твой глебны творца. <...>

<...>. У музычных адносінах беларускія песні адрозніваюцца шчырасцю, цеплынёй, мяккасцю. Песень, западаючых у душу і пакідаючых уражанне суму, у нас значна больш, чым песень бадзёрых, жыццярадасных. Матывы суму пераважаюць, але мастацкая каштоўнасць такіх песень зусім не памяншаецца. Сумная мелодыя, як дагараючы вечар, як ранняя зорка, прымушае хвалявацца чалавечае сэрца мацней, чым бойкая, шумлівая, поўная бляску, як яскравы, радасны дзень, вясёлая песня. У заміраючых гуках беларускай элегіі значна больш прыгажосці і паэзіі, клічучай да жыцця заўзятай мазуркі. Уражанне суму застаецца доўга, прападае не хутка, а ўражанне радасці мімалётнае, хуткаплыннае. Пачуцці, песцячыя сэрцы, пачуцці, грэючыя душу, найбольш уласцівыя нашым беларускім мелодыям. Шырокі размах, пустое вяселле, несустрымная дзікая гульня ў беларускіх песнях адсутнічае. Бадзёрасць і стрыманасць вяселля адчуваецца толькі ў песнях жартаўлівага характару, іншы раз у вясельных і калядных.

<...> Адносцеся да роднай беларускай песні ўважліва, з павагай. Не забывайце, што сярод гэтай народнай спадчыны пападаюцца перлы, якія ад няўмелага і грубага абыходжання трацяць сваю прывабнасць. Не забывайце, што гэта скарбніца народнага розуму, народнага гумару з'яўляецца таксама выявіцельніцай яго глыбокага суму; гэты скарб — наш нацыянальны гонар, наша слава. Не забывайце, што родная песня — гэта далікатная пахучая кветка, што расла на працягу доўгага часу — дзесяткаў, а можа быць і цэлага стагоддзя на ніве чалавечага гора, на ніве, палітай нярэдка горкімі слязьмі. Не забывайце, што гэта сціплая палявая кветка, якая вырасла на дзікіх прасторах, а не ў багатых цяпліцах, лёгка завяне, калі да яе падысці без ласкі, без кахання. <...>

## МАКСІМ ТАНК

Мне хацелася б адзначыць тую вялікую ролю, якую адыгралі ў маім жыцці творы нашых беларускіх класікаў. Я. Купалы і Я. Коласа. Толькі дзякуючы ім і народным казкам і песням, якія я чуў ад сваёй маці, ад народа, я пачаў пісаць на сваёй роднай мове.

Я ўжо збіраўся пакінуць кірмаш, калі пачуў песню. Яе спявала нейкая ў чырвонай хустцы маладзіца, седзячы на возе, засланым даматканай зялё-

най пасцілкай, на якой ляжалі закуска, казюковыя пернікі і вянок смаргонскіх абаранкаў.

Запала сонейка за лес калінавы.
Ападае раса на ліст малінавы.
Не ападай, раса, раса сцюдзёная.
Як босы я пайду сцежкай знаёмаю?
Падзёр я боцікі, з любай ходзячы,
Праз лес калінавы яе праводзячы.

<...> Заўсёды народная песня пакідае глыбокае ўражанне. Яшчэ будучы малым, я не раз прыслухоўваўся, як пяялі жнеі: доўга,



Беларускія пісьменнікі з дударамі

працяжна, быццам нашы нізінныя рэкі, звонючы нізка звісаючай лазой, алешнікам, чаротам, калышучы срабрыстыя россыпы сонца, пераліваючыся цёплымі перламі летніх зораў, плылі, шырока разліваючыся вясеннім разлівам, парываючы сваёй бязмернай глыбінёй пачуцця. І не ведаю, чаму, пачуўшы народную песню, не толькі заслухоўваюся, але мне хочацца глянуць вачыма ў яе.

Шмат я чуў, як пяялі народныя песні.

Ледзь не заўсёды яны неяк іначай гучэлі, як там, каля сваіх вытокаў. У выкананні адных яны гублялі сваю прастату, другія — пелі іх чужымі вуснамі, і здавалася, што за голасам недзе яшчэ б'ецца незразумелае, дзіўнае сэрца гэтых песняў, якое ці і патрапіць хто адчуць.

Забег у бібліятэку беларускага музея, дзе пазычыў некалькі фальклорных зборнікаў. М. паказала мне цікавы сшытак Дубяйкоўскага: «Пагаворкі». Я, захапіўшыся, так і не змог адарвацца ад гэтага рукапісу, пакуль не прачытаў і не перапісаў у свой блакнот з паўсотні яго пагаворак. Шкада, што ў нас няма ніякіх сродкаў, ніякіх магчымасцей выдаваць такія рэчы.

<...> Сяджу над галошаннямі Шэйна. Столькі ў іх цяжкога і жудаснага, што аж страх чытаць. Прыпомнілася наша пількаўская плакальшчыца Тэкля Калбун, якая не толькі ў сваёй вёсцы, але і ў суседніх аплаквала нябожчыкаў. Колькі ад яе можна было запісаць галошанняў і па старых і па малых, па дзяўчатах і хлопцах! Колькі ў яе імправізацыях было паэзіі і трагізму, навеянага жыццём нябожчыка, падказанага абставінамі яго асірацелай сям'і! Усё яна ўмела ўлічыць, нічога не забыць, пра ўсё ўспомніць. На пахаванні пастыра Данілкі, пералічваючы яго заслугі, успомніла, як ён прыгожа іграў на трубе, якія цудоўныя плёў лапці, вязаў венікі, майстраваў кошыкі і спускаў жалейкі, не забылася ўспомніць, што ён пакінуў неагледжаную на зіму сваю хату і батрачую спадчыну, якую будуць дзяліць яго дзеці:

...А хто ж, мой Данілачка,
Нацягае кастры на шаламя,
Ацэпліць у хаце прызбачку,
Пазатыкае ўсе дзірачкі
Каля шулы і на покуці?
А хто ж памірыць дзетачак,
Як паспрачаюцца, дзелячы
Тваю торбу пастырскую,
Пужку-дратаваначку,
Дзесяць пар лапцей пакінутых,
Песню трубы-берасцяначкі,
Скарынку хлеба чэрствага,
Долечку незайздросную...

Шкада, што, як быў там, я не змог запісаць яе галошання па нашым суседзе — Езупавым Мацеі, галошанне, якое цягнулася ўсю ноч; або яе галошанне па майму дзядзьку Ціхану, пра якое і сёння ўспамінаюць пількаўшчане.

Ізноў узяўся за фальклор. Я часта вяртаюся да яго, як крыніцы, каб асвяжыць свае вусны, змыць з твару дарожны пыл. Але доўга каля гэтай крыніцы стараюся не затрымлівацца. Паэзія павінна адкрываць новае. Інакш яна перастане быць паэзіяй. А новае трэба шукаць на жыццёвых шляхах не толькі свайго, але і іншых народаў.

## ЯНКА БРЫЛЬ

<...>Звычайны дзядзька ў Пасынках — Барыс Харута. От сабе, не так жыве чалавек, як з клопату не вылазіць. А голас — божа мой, што за голас! Яго б для цэлага свету, па радыё перадаваць, ды салавей гэты навек ублытаўся ў сіло вераўчаных лапцюжных абораў. Усяго і свету пабачыў за век, што ў царскіх салдатах ды на вайне (прападзі ён, той акопны свет!), адкуль прынёс дахаты для сябе аднаго — пакалечаную руку, а для сябе і для другіх — многа цудоўных песень.

З волжскім, з раўнінным, з таёжным раздоллем Расіі, з сардэчным сумам ямшчыцкіх званочкаў, з бурлацкім стогнам ды з грознаю, гордаю сілай усенароднага «Барадзіна» ці «Ермака»... З хмельнаю, буйнаю, ціхім і шчодрым сонцам залітай украінскай радасцю, пышнагрудай і каравокай, з дасціпным, смачным смехам: з размахам і адчаем запарожскай славы, страчанай, ох, як даўно, на бязмежжы крывавага Прыдняпроўя...

У гэты навальнічна-магутны рокат дзвюх музычных стыхій задушэўна ўпляталіся песні пра слуцкіх прыгонных ткачых, пра Нёман, быстры і чысты, як быццам з расы, пра юнака, што памірае ў турме, пакідаючы любы свой край у пакуце, пра ясную крынічную ваду, што плешчацца ў залаціста-сасновых вёдрах прысухі-суседачкі...

Вясной, толькі вясной — ніколі так не спяваецца! І колькі б іх, мужчын ды хлопцаў, ні было, якімі б шырокімі ні былі іх маладыя грудзі, як ні грымела б іх песня пад самыя зоры,— усіх перамагаў Барыс Харута. Нават свайго любімага памочніка, Алеся. Не крыкам, а нейкай дзіўнай ціхай сілай голасу, які з пашанай называлі хто проста тэнарам, а хто яшчэ і «дражашчым».

Спяваючы, дзядзька Барыс — і высокі, і стройны, і нават прыгожы, якім ён без песні ніколі не быў,— пагойдваўся, як тая гонкая сасна, разгайданая радасным, сонечным шумам. І, пераймаючы запявалу, у такт песні пагойдваліся мужчыны, дзяцюкі, падлеткі, што шумелі вакол яго лесам, ноччу нікому не бачным, але затое ж патрэбным і проста наўздзіў, як здаецца, прыгожым — за шум свой, вядома, за песню, што красіць любое жыццё!..

## П. І. ЧАЙКОЎСКІ ПРА БЕЛАРУСКУЮ ПЕСНЮ

### (з успамінаў мастака М. В. Мікешына)

Мае малюнкі-ілюстрацыі да паэзіі Т. Р. Шаўчэнкі і інш. так спадабаліся П. І. Чайкоўскаму, што адзін з іх я тут жа прысвяціў яму, а другі, «Фантазія» (акварэль), падарыў, просячы дазволу закончыць работу, потым прыпаднесці. Пётр Ільіч спытаў, што я хачу, каб ён напісаў для мяне. «Можа хочаце марш?» Я быў у захапленні ад гэтай прапановы. «А калі марш, то, зразумела, праграмны? — зноў перапытаў Пётр Ільіч.— Якія ма-

тывы вы прапануеце?» Я сказаў, што паходжу з простай і беднай сям'і галоднай Беларусі і што гэта можа быць выказана адной сумнай народнай песняй:

Каля рэчкі, малада, хадзіла,
Ой, люлі, люлі, хадзіла.
З рукаўка семяно, малада, сеяла,
Ой, люлі, люлі, сеяла.
Няўсхожае маё семяно,
Ой, люлі, люлі, семяно.
Неўзрашчоная мая маць-зямля,
Ой, люлі, люлі, маць-зямля...

І тут жа сам праспяваў матыў гэтай песні, а Пётр Ільіч адразу ж запісаў бездакорна правільна. Нотнай паперы не знайшлося, і ён прама пяром чарціў лінейкі для нот. «А вось, каб не забыць, я зараз... пачакайце». Тут Пётр Ільіч зноў прысеў і на аркушы паштовай паперы напісаў: «Сим обещаюсь во исполнение обещания, данного Михаилу Осиповичу Микешину, написать желанный им марш со включением в него данной им темы».

Ніжэй — радок нот і словы: «Каля рэч-кі, малада, хадзіла...»

## Р. Р. ШЫРМА

Я памятаю 1915 год. На карысць дзяцей — ахвяр вайны — трэба было зрабіць этнаграфічны канцэрт, выканаць народныя песні ў кампазітарскай апрацоўцы. Павінны былі выконвацца песні рускія, украінскія і беларускія. Цудоўны хор у 80 асоб з прыгожымі галасамі вывучыў песні рускія і ўкраінскія, а як дайшло да беларускіх, то аказалася, што не было ніводнай апрацаванай беларускай песні.

У другі раз з такім з'явішчам я сутыкнуўся ў Віленскай гімназіі. Стварылі мы там з энтузіястаў надзвычай добры хор, а апрацаваных беларускіх песень не было. Па-руску спяваць забаронена было (тое, што было ў харавой літаратуры, прыходзілася перакладаць). Вось і прышлося збіраць беларускія песні і шукаць кампазітараў, якія б зацікавіліся гэтымі песнямі, апрацавалі іх. Інакш кажучы, гэту простую беларускую сялянaчку трэба было вывесці на канцэртную эстраду дамай высокага культурнага свету. Такія кампазітары знайшліся: прафесар Галкоўскі, украінскі кампазітар Кошыц, рускі кампазітар Грачанінаў. Такім чынам, мы атрымалі матэрыял для паказу народу, пакуль не дасталі праз зялёную граніцу апрацовак беларускіх песень з Савецкага Саюза.

Запіс мелодыі — вельмі складаная справа. Той, хто запісвае народную мелодыю, павінен добра яе адчуваць. Кожная сапраўды народная песня па сваёй структуры вельмі ясная, вельмі пластычная і даходзіць да сэрца. Але не заўсёды фалькларысты правільна разумеюць яе. Некаторыя фальклорныя зборнікі, выданыя да рэвалюцыі, даюць мелодыі народных песень, якія ў кампазітарскай практыцы не знайшлі свайго месца. Зборнік З. Радчанкі

музыказнаўцы і фальклpoints ўпамінаюць, але мелодыі з гэтых зборнікаў у жыцці, у практычнай дзейнасці кампазітараў свайго праламлення не знаходзяць, бо З. Радчанка не пранікласся духам народнай песні.

Мне прыходзілася многа жыць у народзе і з народам хадзіць ад сяла да сяла. Тыя песні, якія я запісваў, я сам вывучаў на памяць. Мне не трэба было ні фанографа, ні магнітафона, мне лёгка было іх захоўваць.



Народны артыст СССР Р. Р. Шырма

Больш трыццаці гадоў я займаюся збіраннем беларускай народнай творчасці. Вандруючы па сёлах, мястэчках і гарадах Беларусі, я знайшоў багатую крыніцу народнага меласу ў вёсцы Кацялкі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Тут жыла сямідзесяцігадовая Захвея Хвораст — таленавітая народная песенніца, вядомая на ўсё наваколле.

Чатыры гады запар, кожнае лета, прыязджаючы ў вёску Кацялкі, я засвойваў мелодыі, перакладаў іх на ноты і запісваў народныя звычаі і абрады ад гэтай мілай старэнькай бабулі.

Захвея Хвораст — самародны талент. Яна карысталася ўсеагульнай павагай сельскай грамады і суседніх сёл і вёсак не толькі як славутая народная песенніца, але і як чалавек мудры і справядлівы.

Апрануўшыся ў чыстае ільняное адзенне і старанна вымыўшы рукі, яна хадзіла сустракаць з'яўленне на свет новага чалавека. Яна прайшла суровую цяжкую школу жыцця, дзяўчынкай працавала ў панскіх маёнтках



Спявачка Захвея Хвораст

яшчэ тады, калі крывавелі на народным целе раны ад парваных ланцугоў прыгоннай няволі. Глыбока ў сабе таіла яна багатую народную песню для таго, каб потым аддаць яе на ўцеху, радасць і адпачынак свайму працалюбіваму брату-селяніну і батраку-работніку.

Захвея Хвораст не толькі сустракала новага чалавека,— яна хадзіла закрыць вочы і таму, хто прайшоў свой жыццёвы шлях, для кожнай душэўнай раны ў яе знаходзілася цёплае слова. Затое якой вялікай любоўю і павагай адказвалі ёй! Нават малыя дзеці, сустрэўшы яе, калі яна ішла па вуліцы, цёпла віталі словамі: «Добры дзень, бабулька!»

На вяселлях Захвея Хвораст заўсёды займала самае пачэснае месца; там, дзе трэба было павесяліць чалавека, дарэчы была яе песня, прыгожае

мудрае слова, з якімі, здаецца, весялей і лягчэй было маладым пачынаць жыццё.

...Акрамя Захвеі Хвораст мне даводзілася сустракаць многа іншых таленавітых спявачак і спевакоў. Назаўсёды засталіся ў памяці Наталля Хадзінская з вёскі Новыя Зімодры Маладзечанскай вобласці, Тэран Карпюк з вёскі Страшава былога Ваўкавыскага павета, Буцэя Рэдзька з вёскі Каралевічы на Дзісеншчыне, Васіль Скурко з Навасёлак на Пастаўшчыне і цэлая плеяда маладых талентаў ва ўсіх кутках Савецкай Беларусі. Іх вуснамі народ расказваў пра сябе, аб сваім горы і радасцях, якія жылі ў яго марах.

З гэтымі талентамі я заглянуў у бяздонныя крыніцы народнай песнетворчасці, ад якой як зачараваны не ў сілах больш адарвацца. Я бязмерна шчаслівы, што яны дапамаглі мне захаваць найвялікшыя каштоўнасці музычнай культуры нашага народа.

Кожны народ мае свой асаблівы духоўны характар, які знаходзіць найбольшае адбіццё ў яго песнях.

Народ пяе,— па песні адразу можна распазнаць, з чыіх вуснаў, а галоўнае, з чыйго сэрца яна выйшла. У песнях чуваць, аб чым народ сумуе і да чаго рвецца яго душа.

Песня народа — гэта сапраўдная жывая чалавечая душа.

Беларуская народная песня, заўсёды ясная, пластычная і багатая, часцей засмучаная, чым рэзвая і гуллівая, адзначаецца асабліваю задумаю аб жыцці і долі.

З боку настрояў, мелодыі і рытму яна зусім самабытная.

Цудоўная, шчырая, як народнае сэрца, мелодыя, высокапаэтычны верш народнае паэзіі з яго наіўнымі чаруючымі вобразамі і зваротамі,— усё гэта разам ўзятае падымае беларускую песню на высокамастацкі п'едэстал.

## АЛЯКСАНДР ФАДЗЕЕЎ

### (З пісьма да Р. Р. Шырмы)

Дарагі Рыгор Раманавіч! Пішу вам як вялікі аматар і паклоннік харавога спеву, пішу з адзінай мэтай перадаць Вам, якую асалоду я атрымаў, слухаючы па радыё некалькі дзён назад канцэрт Вашага цудоўнага хору...

Вы — вялікі і сапраўдны майстар, дарагі Рыгор Раманавіч! Праслухаўшы першыя дзве песні «Выходзіла праўда» і «Радзіма мая дарагая» (асабліва іменна гэту, другую), я ўжо страціў тыя халодныя ацэначныя адносіны, якія, на жаль, заўсёды жывуць у нас недзе побач з непасрэдным эстэтычным пачуццём, асабліва калі мы маем справу са з'явай новай, нам невядомай,— я іх зусім страціў і ўвесь аддаўся жывой, непасрэднай, так сказаць, бескарыслівай асалодзе.

Уласна — беларускія песні, як народныя ў той ці іншай апрацоўцы,

так і сучасныя, створаныя на народнай аснове, вельмі краналі мяне яшчэ і неяк асабіста. Я сам рускі, з рускай сям'і, але біяграфічна так склалася, што ранняе дзяцінства маё, а пасля невялікага перапынку і ўсё астатняе дзяцінства і малалецтва былі ў значнай меры звязаны з беларускім асяроддзем (маці — фельчарка — служыла ў Мінскай губерні, у вёсцы, потым у Віленскай губерні, а затым сям'я наша жыла сярод перасяленцаў — беларусаў і ўкраінцаў — на Далёкім Усходзе). А вы самі ведаеце, як гэта дзейнічае на душу, калі ў незвычайным майстэрстве, пранікнёным выкананні раптам пачуеш тое (ці роднае), што пела табе маці ў дзяцінстве!

...Яшчэ раз хочацца сказаць, што ў Вашай асобе наша краіна можа ганарыцца адным з лепшых настаўнікаў і выхавацеляў, зберагальнікаў і прадаўжальнікаў таго самага лепшага, што можа даць нам харавое мастацтва.

Моцна пацiскаю руку Вашу. Аляксандр Фадзееў. 18.II.1955 г.

## ВІКТАР БАЛАШОЎ

Цяжка ўстрымацца, каб не ўсклікнуць: «Гэта цудоўна!» Вось сапраўды — гэта подзвіг, праца ўсяго жыцця, у кожным сваім дні адухоўленага светлай і мужнай любоўю да свайго народа, які стварыў мастацкія каштоўнасці найвялікшага мастацкага і гістарычнага значэння. Юнаком, які ледзь толькі далучыўся да музыкі, потым сталым музыкантам і, нарэшце, усенародна прызнаным артыстам-вучоным усё жыццё хадзіў Рыгор Раманавіч з вёскі ў вёску, слухаў, запісваў, шукаў і знаходзіў запісы песень, зробленых іншымі патрыётамі народнай музыкі.

Няма іншай такой галіны народнай творчасці, як песня, у якой жыццё народа было б адлюстравана так багата, так глыбока і мастацка дасканала. Дзвесце песень, якія складаюць двухтомнік *,— гэта сапраўдная гісторыя мастацкага жыцця беларускага народа — жывая, яркая, поўная харастваі сілы, што ўвасобіла на сваіх старонках непараўнальны музычны дар безымянных тварцоў песень. Сучасныя і будучыя пакаленні музыкантаў-выканаўцаў, кампазітараў, гісторыкаў, простыя аматары народных песень, якія чуюць у іх голас Бацькаўшчыны, голас продкаў — усе знойдуць у гэтых тамах найкаштоўнейшы матэрыял, духоўную спажыву, радасны адпачынак. Беларускія народныя песні, што атрымалі дзякуючы падзвіжніцкай працы Р. Р. Шырмы стройную, закончаную энцыклапедычную форму,— гэта вялікі ўклад у скарбніцу савецкай музычнай культуры.

## НІЛ ГІЛЕВІЧ

Многа разоў даводзілася мне слухаць родныя песні ў выкананні Дзяржаўнай акадэмічнай капэлы пад кіраўніцтвам Р. Р. Шырмы. І кожны раз было радасна бачыць, як узрушана ажыўлялася і замірала зала, як хара-

* *Шырма Р. Р.* Беларускія народныя песні. Хоры. Мінск, т. 1, 1971; т. 2, 1973.

ша — праўдзівым чалавечым святлом — свяціліся ў зале вочы, з якой невыказнай удзячнасцю раскрываліся людскія сэрцы. І думалася тады: якое гэта шчасце, што можна вось так, забыўшыся на ўсе клопаты і згрызоты, далучыцца душою да гэтага дзівоснага хараства, прыгубіць з гэтай чароўнай жывой крыніцы! Як добра і радасна жыць, ведаючы, што ёсць такі цуд на свеце — беларуская народная песня, і ёсць такі чарадзей, які гукамі гэтай песні робіць з тваім сэрцам нешта такое, што і слоў няма, каб сказаць, а толькі слёзы сыплюцца!.. І колькі іх, што выйдуць усхваляванымі з залы, панясуць з сабою ў жыццё прамяністую радасць гэтай сустрэчы, і ўжо будуць глядзець на свет не так, як глядзелі дагэтуль, і будуць думаць пра сваё чалавечае прызначэнне з большай яснасцю, чым думалі ўчора, бо застаецца тым самым пасля такога духоўнага ачышчэння немагчыма: сапраўднае мастацтва не адпускае ад сябе чалавека без свайго магічнага і шчодрага падарунка. І пойдзе гэты ўдзячны чалавек, і скрозь і ўсюды — за станком і за плугам, у лабараторыі і за мальбертам — яго не будзе пакідаць гордае ўсведамленне, што ён належыць да народа, імя якога трэба несці высока, як сцяг. І будзе гучаць у яго сэрцы, як самае чыстае і высакароднае парыванне, неўміручая народная мелодыя.

## Г. І. ЦІТОВІЧ

Багатае і разнастайнае народнае мастацтва беларусаў!

У маляўнічай народнай вопратцы ўвасоблен вялікі вопыт пакаленняў у галіне вышыўкі, ткацтва і вязання. У ліштвах і вільчаках, у керамічных вырабах і драўлянай скульптуры здзіўляюць невычэрпная фантазія і высокае майстэрства народных умельцаў. Мудрыя і глыбоказмястоўныя беларускія казкі, прыказкі і прымаўкі, дасціпныя народныя анекдоты.

Разнастайны і ўзорысты беларускі народны танец — ад урачыста-спакойных веснавых карагодаў да імклівай «Лявоніхі».

А колькі настрояў арыгінальных сюжэтаў у беларускай народнай песні! Пры пераважэ ў ёй лірычнага пачатку мы знойдзем тут і нястрыманую весялосць, і гарэзлівы жарт, і едкую сатыру, і гнеўны сацыяльны пратэст.

У гісторыі беларускага народа праз доўгі час фальклор быў адзінай формай мастацкай творчасці, і дамінуючае становішча займала ў ім народная песня, якая выконвалася звычайна без суправаджэння. Яна давала тэмп, настрой, а часта і сюжэт карагодам і скокам, жывіла характэрнымі інтанацыямі інструментальныя найгрышы.

Народнае музычнае мастацтва беларусаў развівалася і развіваецца ва ўмовах гістарычна склаўшыхся руска-ўкраінска-беларускіх узаемасувязей, якія маюць многавяковыя традыцыі і адзіную крыніцу ў старажытнай агульнарускай народнай культуры. Многімі ніцямі яно звязана з фальклорам заходніх і паўднёвых славян, а таксама суседніх літоўцаў і латышоў.

Знаходзячыся ва ўмовах заняволення, беларускі народ рупліва зберагаў самабытнасць сваёй нацыянальнай культуры. Працідзеянне асіміляцыі садзейнічала захаванню ў беларусаў і пеpажытачных з'яў, якія мы цяпер не знойдзем у народнай творчасці рускіх і ўкраінцаў. Дзеля таго даследчыкі культуры старажытнай Русі нярэдка звяртаюцца да прыкладаў з беларускага фальклору.



Народны артыст СССР Г. І. Цітовіч

## ТАЦЦЯНА ЛАПАЦІНА

Уцехай і радасцю ў нашай сям'і былі толькі песні. Праўда, больш за ўсё спявалася ў іх пра гора, пра няшчасную жаночую долю. Бывала, як пачнём спяваць, як растрывожым сабе душы, то і наплачамся.

Мы чакалі, не маглі дачакацца бацьку яшчэ і таму, што ведалі,— кожны раз прынясе з сабою новую песню. Шмат тады мы пераспявалі і ўкраінскіх песень.

Але ніколі столькі і так не спявалася, як пры Савецкай уладзе. Нібы спалі з душы ўсе аковы...

## СЯРГЕЙ ГАРАДЗЕЦКІ

У неўміручай скарбніцы паэтычных твораў, складзеных славянскімі народамі, беларуская народная паэзія ззяе, як адна з самых старажытных і самых цудоўных каштоўнасцей.

## ДРАГА ЁНТАК

...І колькасна, і якасна вуснапаэтычная творчасць беларускага народа не мае сабе роўных ва ўсім славянскім свеце.

## ЗДЭНЕК НЯЕДЛЫ

З імем Беларусі яшчэ да нядаўняга часу было звязана ўяўленне аб ціхім, задумлівым краі з бясконцымі лясамі і ціхім, замкнутым народам, як і з беларускіх песень самымі вядомымі былі дзівосныя беларускія калыханкі. У іх як быццам быў увасоблены самы дух беларускага народа.

## ВЯЧАСЛАЎ АДАМЧЫК

Мне прыгадваецца далёкая і злая зіма, наша нізкая хата, абраз на покуці пад ручнікамі, замураваныя марозам вокны і матчына песня, што спадае сумна і чыста, як сляза:

Ці ты, сынку, нагайкі не маеш?
Чаму, сынку, жонкі не караеш?

Ірвецца нітка, уцякае з матчыных рук верацяно, сціхае песня. У хаце я і маці. Бацькі каторая пара няма дадому. На двары, тонка пасвістваючы, шалее, як нячыстая сіла, вецер, трашчаць кроквы на хаце, па сцяне суха шархаціць перагонамі сыпкі снег. На двары завіруха.

— Мой ты божа, гэткая бура. Мусіць, нехта павесіўся,— кажа маці. Яна прадзе, седзячы на прасніцы ля стала, на ўслоне. Я бачу: адзін палец у маці вышмаргала нітка — ён белы. Бачу, як, крутнуўшы верацяно, яна паднімае руку: нітка даўжэе, верацяно аж гудзе, то спускаючыся, то паднімаючыся ўгору. Дастаўшы да зямлі, яно нейкі міг стаіць роўна, а потым падае і коціцца аж пад стол. Маці падымае і ставіць верацяно на прыпол, намотвае нітку і зноў, наслініўшы пальцы, скубе каструбавую кудзелю — зноў грае, мігціць, круцячыся і спускаючыся да зямлі, верацяно. Маці зноў пяе, сцішна, шчодра і толькі для сябе:

Зрабі, сынку, ды з дроту нагайку,
Карай, сынку, маладую жонку!

Я ляжу на печы, паклаўшы на кулак бараду, і слухаю. Вылежна, цёпла, хораша. А на двары ўсё няўтомна бушуе, б'е моцнымі крыллямі па нашай сцяне дзікая завіруха. І пад яе жывы плач мне лёгка думаецца пра тую

злую свякруху, што навучае сына караць нявестку. І невядома чаму свякруха мне здаецца гэткая самая, як наша старая папарацянская Аміля, гэтакая высокая, худая, як смерць, у доўгай, па самыя пяты, спадніцы, у зношаным, латка на латцы, сачыку, з нейкай анучаю на галаве. І гэтак умее качаць яйцом па жываце, выганяючы пярэпалах, і даставаць вострым языком парушынку з вока. І гэтак умее чараваць, як зачаравала Аміля Іванчышынага Казю. Казя цэлы год дурэў. Яго прывязвалі ланцугамі да шула ў гумне. Але раз, сарваўшыся з ланцуга, ён выскачыў на вуліцу голы, і яго лавілі цэлаю вёскаю.

А нявестка здаецца такою ж, як і мая цётка Сарафіна з Петрашоў, такою ж ласкаваю, сарамяжліваю, дробненькаю, прыгожаю з твару. І ў яе, як у цёткі, гэтакі ж вялікі, заўсёды насупіўшыся муж, якому «ўсё не ўнаровіш: там — пераступіў, тут — недаступіў, а ён, падла, абы-толькі біціся».

Ой, з вячора нагайка шумела,—
А з паўначы жонка забалела.
Да рассвету ў жонкі духу нету,
Да рассвету ў жонкі духу нету.

Гэтак сама біў маю цётку Сарафіну яе муж. Яна жыла ў нас, баючыся ісці дадому: «Дзе ж вы бачылі, заб'е вар'ят». І жыла б доўга, каб ён, мусіць, і на гэты раз не паслухаўся маці і не прыехаў ды не забраў яе ў Петрашы. «Што маці скажа, так ён і робіць,— залiваючыся слязьмі, наракала цётка Сарафіна,— аніколечкі свайго розуму не мае».

Ой, ты, маці, парадніца ў хаце,
Парадзіла, чым жонку караці,
Парадзь цяпер, ва што яе ўбраці,
Парадзь цяпер, ва што яе ўбраці.

Паволі круціцца, замірае верацяно. Недзе змогшыся, прылёг і супакоіўся на двары вецер. Стаіўся на печы і я, не дыхну, чакаючы, што скажа свякруха.

Складзі, сынку, атласову сукню,
Схавай, сынку, у садочку вішнёвум.

І мне здаецца, гэтак, як у мяне, у маці шчыміць сэрца і на вочы просіцца сляза. Я не бачу яе твару, яна глядзіць недзе на нітку і ўсё цягне яе з кудзелі, а голас яе дрыжыць неяк жаласна і нясцерпна сумна. І плечы яе, здаецца, уздрыгваюць.

Ой, як будуць садэ расцвітаці,
Тады будзеш другое шукаці,
Тады будзеш другое шукаці.

У гэтай песні, у гэтым смутку ёсць для мяне нешта прыемна-чыстае і дзіўна-ласкавае — я ўжо бачу тую няскорую вясну, белы ад цвету вішняк за хатаю, і я ўжо, босы, расхрыстаны, вось гэтак, у чым сяджу на печы, іду невядома куды, раптам забыўшыся пра таго вар'ята мужа, што «аб'ездзіў да ўсю краіну і не знайшоў сабе гаспадыню». І вось ён з далёкіх сватоў, з-за свету вярнуўся дадому, і я чую, што ён ужо каецца, дурань, плача. Сха-

мянуўшыся, што нарабіў бяды, а цяпер схадзіў па розум, ды позна — ірве на сабе валасы.

Устань, міла, устань, гаспадыня,
Бо без цябе гаспадарка гіне,
Бо без цябе гаспадарка гіне.

Я ведаю, што з магіл устаюць, як уставаў той салдат, якога пахавалі пад крыжам і ў якога стары Макавей зняў боты. Салдат кожную ноч прыходзіў да Макавея, стукаў у акно, прасіў, каб вярнулі яму боты, пакуль стары не занёс іх і не закапаў зноў. Я ведаю, што з магіл устаюць заўсёды, каб сказаць людзям праўду і навучыць іх. І гэта страшна, калі гавораць нябожчыкі.

Няхай гіне, няхай прападае,
Бо мая галоўка ад зямлі не ўстане.

Не, не верыць ён, што няма ў яго больш жонкі, і ў нейкай апошняй сцятай надзеі ломіць над магілаю рукі.

Устань, міла, устань, гаспадыня,
Бо без цябе мае дзеці плачуць.

А магіла недзе там, у нашым гародчыку, у вішняку, недзе там, у сырой зямлі, «не ўзнімае ўгору ручак» яго нябожчыца жонка і не прыйдзе ўжо адтуль да сваіх недагледжаных дзетак. Але няхай ведаюць яны, што іх асіраціў лядашчы бацька. Дык няхай жа за гэта папомніць ён.

Няхай плачуць, няхай тое знаюць,
Што праз цябе матулькі не маюць.

Плача песня, плача, прыпадаючы да зямлі, злы і скоры вецер.

## ВЕРА ПАЛТАРАН
## (Як запісвалі песні)

<...> Як і абяцала, Галя наказала жанкам, каб прыйшлі да яе, бо прыехала Зіна песні запісваць, і сёння дзверы ў Галінай хаце не зачыняюцца. Ідуць усе — і тыя, хто будзе спяваць, і тыя, хто любіць паслухаць песню. Следам за дарослымі, учапіўшыся за руку ці за спадніцу, цягнуцца малыя — дзе ж ад іх уцячэ тая баба ці маці! Галя бярэ іх пад пашкі, саджае на прыпечак і строга ківае пальцам: сядзіце ціха!

Зіна, занятая ля свайго «магніта», падымае галаву на кожны скрып дзвярэй.

— Добры вечар у хату! — на парозе стаіць, трымаючыся за клямку, Хрысця Дарашэвіч.— Не спазнілася?

— Праходзь ужо ды садзіся, чаго топчышса ў парозе? — Галя лёгенька, у плечы, падштурхоўвае Хрысцю да лавы.— Усе вы сягоння, дзякуй богу, насы не пазбівалі, бегучы.

— А чаго спяшыць? Вечар доўгі.— Хрысця папраўляе квяцістую хустку, расшпільвае плюшаўку на грудзях і абводзіць усіх вясёлым адкрытым позіркам. Бялявая, са светлаю ўсмешкаю на твары, яна ўся свеціцца шчырасцю і дабратой.

Настае ціхая хвіліна. Галя, абвёўшы вачамі сваіх гасцей, нешта хітра сама сабе ўсміхаецца, накідвае цёплую хустку, ватоўку і выходзіць за парог. Мінае нейкі час, дзверы зноў адчыняюцца, і парог ледзь пераступае старэнькая бабулька ў цёплай Галінай хустцы, завязанай «на шлык», і ватоўцы, што гарбом тапырыцца на спіне.

— Добры вечар,— цягне яна слязлівым голасам і туліцца да вушака, склаўшы на жываце дрыготкія рукі.

— Галя, дальбог, Галя!.. Але ж не пазнаць!

— Чаго, бабо, стуліласа? — першая адгадвае Галін намер і пачынае ёй падыгрываць Хрысця.

— Жывот, дзеткі, зарэзаў. Канчаюса...

— То трэба б палячыць. Чым толькі?..

Галя абдымае Вару за круты, поўны стан і вядзе да лавы.

— Садзіса ўжо, адсапіса.

— У вас яшчэ не калядавалі? — Вара садзіцца на лаву і развязвае цёплую хустку.

— Не яшчэ...

— Ну, то хутка і да вас дойдуць. Блізка ўжо.

— А скажыце, чаго гэта тут у вас што ні сяло, то і свой закон? — пытаюся я.— У Букчы калядуюць сёмага, у Тонежы — восьмага...

— Праўда. У Букчы калядуюць на першы дзень,— заўважае нехта.

Там папа раней не було. Так і павялося,— гаворыць Хрысця.

— От паетаму,— падхоплівае Галя.— А ў Тонежы буў поп, ён на першы дзень калядаваць не дазваляў: казаў, паганскі ето звычай.

Пад Галінымі вокнамі пачуліся гоман, смех — відаць, немалая гурба ўкацілася на падворак — і звонкі на марозе голас гукнуў:

— Добры вечар вам! Загадайце песню нам!

— Спявайце! — Галя падышла да акна, адсунула фіранку і пачала ўзірацца ў цёмную шыбіну: што ж там за каляднікі?

— Каму спяваць? — данеслася з двара.

Галя павярнулася на хату: каму загадаць песню?

— Бабцы Кацярынцы,— пачуўся нечы нясмелы голас.

— Бабцы, бабцы Кацярынцы! — загаварылі наперабой усе.

— Бабцы Кацярынцы! — гукнула Галя ў акно і адышлася, пакінуўшы фіранку незашморгнутай.

Пад акном сціхлі, нехта некаму кінуў: «Пачынай!» — і звонкія, хоць і не зусім стройныя, галасы завялі:

Чорны валішча тай дроў прывязе,
А кавянішча тай жар заграбе,
А памялішча тай печ замяце,
А ты, бабочко, стара галачко,
На печы сядзі, чырвонцы лічы.

У хаце стала ціха, неяк нават урачыста. Усе з прыхільнаю ўсмешкаю паглядваюць на бабку Кацярынку, а яна, расчуленая ўвагаю і добрым сло-

вам, раптам неяк уся засвяцілася, ажыла, і здзіўлена-радасная ўсмешка сонечным зайчыкам затрапятала на яе цёмным, у глыбокіх маршчынах, твары.

Калянднікі праспявалі і змоўклі. На лаве ля дзвярэй жанкі зашапталіся, падазвалі Галю, і неўзабаве яна, узяўшы нешта са стала, схавала пад накінутую на плечы хустку і выйшла з хаты.

<...> Віхрам — намерзлася на вуліцы — у хату ўрываецца Галя. Тупнуўшы разы са два ля парога, каб абабіць з валёнак снег, яна подбегам кідаецца да грубкі.

— Калянднікі!..— зняважліва кідае яна, пацепваючы захаладалымі плячамі.— Працёўкаюць, каб не мерзнуць, і хутчэй да дому. От старыя — тыя па совісці пяюць. Але ж усё роўна людзі любяць слухаць — прывячаюць пад кожным акном.

— А хто яшчэ якія ведае калядкі? — пытаюся я ў жанок.

— А вы смяяцца будзеце! — кідае нехта.

— У нас тут усе, хто дзе вучыўса ды лічыць сябе культурным, смяюцца з усяго етаго...

Сур'ёзна-ўрачыстая, як перад набажэнствам, з агенчыкамі апантанасці ў вачах — жывы выклік усім тым, хто смяецца «з усяго гэтага», Зіна ўстае з-за стала і бярэ ў руку мікрафон.

— Галя, Хрысця, Вара... Калі ласка, запішам каляду.

Гэтым траім збірацца доўга не трэба: жакетку — з сябе, хустку — на плечы, і ўжо сядзяць, усміхаючыся, перад магнітафонам.

— Якую каляду, каму? — падымае на Зіну вочы Галя.

— Гаспадару.

— Ну, жанкі, толькі ж плотна. Голас к голасу каб клеіўса,— зірнула Галя на Хрысцю і Вару і завяла:

Ого-го, каза-а,
Ого-го, шэра-а,
Дзе рогі дзела-а,
На соль праел-а...

Нешта далёкае, даўно забытае ўсплыло і трывожна затрымцела ў маёй душы. Успомнілася дзяцінства, наша хата з чыста выбеленаю печчу і падлогай, пацярушанай саломаю — каб не затаптаць; жмут сена на покуце, а на сене — гаршчок з куццёй, накрыты белым ручніком, і мы, малыя, на лаве, ля акна, з радасным і трывожным адчуваннем: нешта вялікае і таямнічае адбываецца ў гэтую ноч на зямлі. <...>

Дай табе божа, пан-гаспадару,
Колькі на небе зорачак свеціць,
Столькі ў полі копачак меці,
Жыці і быці, сыры ляпіці...—

голасна і дружна вядуць жанкі, і свет дзівосных вобразаў, яркіх і, здаецца, адчувальных на дотык, раскрываецца перада мною. Маладая Ганначка, якая, расчэсваючы і заплятаючы касу, задумалася: «Ой, што ж то расце

дый без кораня? Ой, што ж то гарыць дый без полымя? Ой, што ж то гудзе дый без буйнога ветру?..» Слаўны Мішачка, які на кані едзе, з канём гаворыць,— у тым добрым свеце чалавек гаворыць з усім жывым і нежывым на зямлі і чуе яго!.. І яшчэ жывуць у гэтым свеце прырода, якая гаворыць чалавечым голасам, дасціпная выдумка, добры, сакавіты гумар і бязмежная дабрата да чалавека. Той жа чорны валішча, які вязе старой бабцы дровы, кавянішча і памялішча, якія шуруюць за яе ў печы, і сама яна, што сядзіць на цёплым чаране і лічыць чырвонцы,— які гэта дзівосны малюнак і колькі ў ім сапраўднай, глыбокай любові да чалавека.

<...> Зіна запісала калядкі, якія ведаюць Хрысця з Вараю ды з Галяю, і выключыла магнітафон. Па хаце толькі паплыла ціхая гаворка пра вясковыя навіны, як на прыпечку раптам успыхнуў канфлікт: там нехта некага штурхнуў і пачулася гучнае хліпанне. Галя не прытупнула на малых, не прыкрыкнула, а толькі павярнулася ў іх бок і сказала знарок моцна, каб было чуваць і на тым ваяўнічым востраве:

— Хто з вас усіх тут адгадае мне загадку: белы, як снег, надзьмуўся, як мех, лапатамі ходзіць, рогам есць? — і хітра пакасілася на прыпечак.

— Гусь... гусь... гусь...— пачуліся адтуль вясёлыя галасы.

— Бач ты! Малыя, а хутчэй за старых адгадалі,— «дзівіцца» Галя.

— А ты давай і нам загадай,— заварушыліся і старыя.

— Адгадайце! — Галя абводзіць хату насмешлівымі вачамі.— Стаіць дуб-вертадуб, на тым дубе-вертадубе сядзіць птушка-вертаптушка, і ўсе ад яе хрысцяцца, моляцца — і цар, і царыца, і красна дзявіца?

Праходзіць хвіліна, другая, трэцяя. Пераглядваюцца, перашэптваюцца. Потым нехта нясмела:

— Мо смерць...

— А чаму на дубе? — адразу некалькі галасоў.

Усе пазіраюць на Галю. Яна паціскае плячамі:

— А я ведаю, чаго яна туды ўсперласа?..

— А каб цябе, як ты ўжо на етыя выдумкі спрытна...

Гоман, смех — на тое і загадвалася загадка.

— Ну, жанкі, а от ету адгадайце: што ўсяму свету трэба?

Зноў прыціхлі. Думаюць, гадаюць. Чуваць нават, як нехта ў сенцах шоргае рукою па сцяне, шукаючы клямку. Галя адчыняе дзверы, і ў клубах марознае пары ў хату ўваходзяць захутаныя ў цёплыя хусткі Матруна Акуліч і Тацяна Сафонава.

— Дабры вечар!

<...> Жанкі здымаюць і складываюць на лаву ватоўкі, хусткі, ахарошваюцца перад насценным люстрам і адна за адною падыходзяць да стала.

— Ты, Хрысця, садзіса ў сярэдзіну. Стуль будзе браць бас, і стуль — лягчэй спяваць,— гаворыць Галя.

— А хай садзіцца, дзе хоча, мой бас і там яе дастане,— усміхаецца Вара дабрадушна і паварочваецца да Галі.— І ты ж, глядзі, не паперараджай, гарачая вельмі!..

— Не буду. Матруно, Насця, садзіцеса ж! Сарахвіно, во сюды, на еты канец...

Усё. Расселіся, нарэшце. З ціхім шэлестам закруціўся магнітафонны дыск, жанкі зірнулі на Хрысцю: «Пачынай!» Але яна счакала яшчэ адно нейкае імгненне, даспельваючы ў сабе песню, потым пачала ціха, як бы жалячыся сама сабе:

Ой, божа ж, бо-ожа-а...
Што ж гэта любоў можа,—

са спачуваннем адгукнуліся на яе жальбу жанкі, і галасы, зліўшыся ў стройным суладдзі, павялі высока і чыста:

Каго ж я люблю-у,
Прынясі яго, божа-а.
Ой, хоць не яго-о,—

вярэдзячы душу шчымлівым смуткам, зноў узляцеў над прыціхлым хорам чысты Хрысцін голас.

То й таварыша-а яго-о,—

на той жа шчымлівай ноце падхапілі басоўшчыцы, і над шчыльнай гушчынёй галасоў лёгка ўзняўся ўвышыню звонкі Галін голас:

Распытаюса-а
Пра здаровейка яго-о...

<...> Што ето вы, жанкі, усё невясёлае спамінаеце? — адзываецца ад стала Галя.— То мо ж свята сягоння... Весялейшае што трэба, з выдумкаю!

Я на гарэ жыта жала-а,—

заводзіць яна, але тут жа абрывае песню.— Хрысця, Вара, Таня, вы чаго? Пейце!..

— Я не помню етую песню,— паціскае плячамі Вара.

— І я нешта забула,— адзываецца Хрысця.

— Ну, то давайце спамінаць разам. «Я на гарэ жыта жала» — ето заводзіць адна, а ўсе падхватываюць: «Я на гарэ жыта жала, а ў даліне копы клала»... Ну, і далей — адна заводзіць, а ўсе падхватываюць. Матруно, ты ж помніш, перакажы...

— Пастой, а ты дакуль дагаварыла?

— Ну, што ў даліне копы клала...

— Ага... Але калі я што не так — ты ж папраў.

— А бо-о... Ну, дакуль ужо ты...

— Добра, добра... А далей так: «Што наклала, то й пацерла, узяла ў торбу дый паперла. Як прыходжу да сяла, сустракае старшына, сустракае старшына дый пытае, дзе була? Я на гарэ жыта жала, трохі сабе абамяла...»

Жанкі на лавах засмяяліся, пачалі пераказваць адна адной недачутыя ці ўпадабаныя словы песні, а Матруна змоўкла і, апусціўшы галаву, пачала перабіраць махры вышыванага настольніка.

— Ты чаго? Забула? — глядзіць на яе Галя.

— Не, спомніла,— сумна ўздыхае Матруна.— Чалавека свайго спомніла...

<...> Цёмныя Варыны бровы насупіліся, твар спахмурнеў, яна хацела нешта сказаць, але перадумала і толькі пакруціла галавой:

— Ой, жанкі, не чапайце вы етаго... Ну, нашто яно вам?.. Заводзь, Хрысця, песню! Ведаеш, як далей?

— Ведаю.

Брыгадзір кажа — судзіці-і...

— Пастой. Высока. І не брыгадзір, а старшына кажа судзіці,— сумна папраўляе Матруна.

— Добра, там я ўжо ведаю:

Старшына кажа — судзіці-і...

Жанкі ўздыхнулі, набіраючы ў грудзі паветра, і падхапілі дружнымі галасамі, у якіх задрыжала ўсмешка:

Старшына кажа — судзіці,
Брыгадзір кажа — прасціці.
Брыгадзір кажа — прасціці,
Бо не будзе ў каго піці.

У хаце падняўся гоман, смех; то з другога кутка пачуліся вясёлыя выгукі.

— Ха-ха-ха-ха, добра кажа: не будзе ж у каго піці...

— А то етаго не бувае!

— Але ж нехта і скла-аў...

— Жанкі, а жанкі, а еты брыгадзір — рыхтык наш Антон Гайкевіч, і-іх-хі-хі!..

— Адкуль жа песні бяруцца — з праўды!

— Ціхаце! Вунь жанкі зноў пець строяцца!

І праўда, строяцца. Галя зірнула на зажураную Матруну, на Вару, у позірку яе прамільгнула не то спачуванне, не то жаль, яна ўздыхнула, падперла рукой шчаку і, хілячы галаву то ў адзін, то ў другі бок, завяла:

Запрагайце, хлопцы, коні,
Коні вараныя
Дый паедзем даганяці
Леты маладыя.

Жанкі счакалі, пакуль выліўся ў запеве яе голас, уздыхнулі адным дыханнем, глыбокім і лёгкім, і павялі ціха, задуменна, сеючы ў душы смутак і адчуванне незваротнае страты:

Як дагнаў я тыя леты
На высокім мосце.
Вярніцеся, мае леты,
Хоць да мяне ў госці.

Вара вядзе густа і роўна, чуючы і сябе, і жанок, раўняючы, калі трэба, сваім слухмяным голасам песню. Часам яна пераглянецца з Хрысцяю, і тады да яе басавітага гудзення асабліва шчыльна і прыгожа прыстае высокі

Хрысцін голас. А Галя... Галя нікога не чуе і не бачыць, як пяе песню. Калі яна з заплюшчанымі вачамі, з рукою, прытуленаю да шчакі, павядзе на падводцы высока і звонка — здаецца, што ў яе, як у птушкі, дрыжыць і замірае ад асалоды спеву ўся істота.

Не вернемся, твае леты,
Мы да цябе ў госці —
Было табе шанаваць нас
Яшчэ з маладосці.

Песня канула ў цішыню. Ні гуку, ні шолаху — усё роўна як няма нікога ў хаце. Зажураныя вочы, схіленыя галовы, і раптам — нечы ўздых, глыбокі, з усхліпам, як у дзіцяці.

— Хрысця, заспявай ты «Касары косяць»,— просіць нехта.

Хрысця ямчэй усаджваецца на ўслоне, складвае на каленях рукі і бярэ з самай глыбіні душы:

Ой, як выйшла хмарка ды на ўдоўчыну хату,
Ды выйшла ж ўдоўка хмарачку разганяці,
Касарыкаў касіць сена наймаці...

Галя слухае песню задуменная, спахмурнелая, нешта падымаецца ў яе душы, нешта накіпае, і слёзы ўжо блішчаць у яе неспакойных вачах.

Ой, касары косяць, вецер павява-ае,
Ды зялёна трава на касу наляга-ае.

Галя падхопліваецца з услона, затуляе рукамі твар і бяжыць у парог; яе вузкія, худыя плечы аж скаланаюцца ад плачу.

— Галя, ты што ето? — перастае спяваць і глядзіць на яе Хрысця.

— Ой, жаначкі, горненько мне, ой, жаль душу агнём паліць...

— Хадзі сюды, Галя,— Серафіма адсоўваецца на ўслоне, даючы Галі месца.— Давай мы з табой, ведаеш што,— «Галоту»! Ну...

— Пачынай!..

Невысокая, ладная, прывабная той асаблівай прывабнасцю, якую тоіць у сабе глыбіня, Серафіма выпрасталася, ускінула галаву.

Ой, ды зашумела, ой, ды загрымела,
Дый стаў дожджык накрапаць.
Ох, ды сабралася няшчасна галота
У карчму піць-гуляць...

Жаночыя галасы загулі, загаманілі кожны на свой лад, выводзячы песню, памкнуліся ў тую вышыню, куды клікаў іх Серафімін голас, і, не дасягнуўшы яе, апалі: то была не іх вышыня. Серафіма адчула гэта, хацела знізіцца голасам і пачуццём, але песня ўжо абудзіла ў ёй нешта нястрымнае, нешта непадуладнае ёй самой, і яна толькі пакруціла ў нейкай салодкай роспачы галавой, і голас яе загучаў на ўсю моц, пакрываючы сабою ўсе іншыя галасы. У ім, глыбокім і неабсяжным, загула раптам грозным гулам партызанская пушча, азваліся далёкімі галасамі паўстанцы Каліноўскага і Вашчылы, адгукнулася далёкая далечыня гісторыі і дагісторыі, у якой выспявала мужнасць народа.

...Песням няма канца. Спявачкам — стомы.

# НАРОДНА-ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ДАКАСТРЫЧНІЦКАГА ЧАСУ



# ЗАМОВЫ

Замовы (ці як іх у народзе яшчэ называюць — загаворы, нагаворы, шэпты) — гэта славесныя формулы, якім надавалася магічнае значэнне. Замовы — від народнай творчасці, які ў сучасны момант у жывым бытаванні амаль не сустракаецца.

У мінулым замовы былі шырока распаўсюджаны ў быце і мелі чыста ўтылітарнае значэнне: з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданне ў рэальнасць — падобным выклікаць падобнае.

Нягледзячы на пашыранасць сярод сялянства, замовы больш за ўсё знаходзіліся на ўзбраенні вузкай групы людзей — «прафесіяналаў», так званых шаптуноў, чараўнікоў, ведзьмароў, якія з мэтай замацавання ў насельніцтва веры ў магічную сілу слова нярэдка выкарыстоўвалі рацыянальныя сродкі народнай медыцыны, чым забяспечвалі больш устойлівае месца гэтаму віду творчасці ў народзе.

Прынята дзяліць замовы на некалькі тэматычных груп: першая група — замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор ягад, грыбоў, захаванне жывёлы, ураджаю); другая група — замовы супраць хвароб (ліхаманка, зубны боль, укус змяі, шал і г. д.); трэцяя група — замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (сюды адносяцца і прысушкі і адсушкі — любоўныя замовы); чацвёртая група — замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі, і г. д.

Замовы каштоўныя тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне многія бакі гаспадарчага, грамадскага і духоўнага жыцця чалавека. Яны з'яўляюцца помнікамі мастацкага слова народа. Па эстэтычна-эмацыянальных вартасцях, паэтычнаму майстэрству, вобразнасці мовы замовы стаяць побач з іншымі фальклорнымі жанрамі і складаюць цікавую частку вуснай спадчыны народа.

**Літаратура**

*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 2. Спб., 1893.

*Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. 5. Витебск, 1891.

*Добровольский В. Н.* Смоленский этнографический сборник, ч. 1. Спб., 1891.

*Кабашнікаў К. П.* Нарысы па беларускаму фальклору. Мінск, 1963, с. 36—40.

*Беларуская* вуснапаэтычная творчасць. Пад агульнай рэдакцыяй М. Р. Ларчанкі. Мінск, 1966, с. 67—71.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967, с. 90—97.

## ЗАМОВА ПАЛЯЎНІЧАГА

Вадзіца царыца, усяму свету памачніца. Як ты змываеш сырое карэнне, шэрае і белае каменне, так і змый і маю ружыну-ружніцу і булат-жалеза. Як страляе з неба Міхаіл-архангел громам і маланняй і вострай стралой і як ніхто не можа ўняць ні грома, ні маланні, ні вострай стралы, так ніхто не можа ўняць і мяне, раба божага, стральца, і маю ружыну-ружніцу і булат-жалеза. А над маёй ружынай-ружніцай і булат-жалезам няма спаругання на векі вякоў.

## ЗАМОВА НА СТРЭЛЬБУ

На сінім моры, на беражочку, на жоўтым пясочку стаіць дуб зялёны, да зямлі нахілёны. А з таго дуба як узняліся шуры ды буры, ветры кавуры, як нанасілі глушцоў, цяцерак, гусей і вутак, малога птаства, як цёмнай хмары. Як наганялі лісіц і зайцоў, ласей і дзікоў мне на патрэбу. Ой, ляціце, пташкі і шэрыя вуткі, ка мне, стральцу, малайцу. Бяжыце, лісіцы і шэрыя зайцы, на маю стрэльбу. А мая стрэльба ручоная, вучоная, каб маху не давала, усякае жывёлу на месцы клала.

## ЗАМОВА ДЛЯ ПЧОЛ

Стой, рой малады! Не іграй, да сырой зямлі прыпадай.

Вось вам, пчолкі, святліца — новая, цясовая, адмысловая. Жыць вам тут і быць сто лет і зім і дзвесце дзяцей павадзіць. І ты, матка ліпа Валляна, ліпа красная дзявіца, і ты, труцень Іван, параней уставайце, сваіх дзетак пабуджайце і пасылайце іх у цёмныя лясы, у шчырыя бары. Майце шум баравы, майце роў прудавы, мядведжую лапу, воўчы рост. Саграбайцеся, змятайцеся. Да чужых пчол не лятайце і чужых да сябе не пускайце. Як маці зямлі, свайго месца пільнуйцеся.

## ЗАМОВА ПРЫ ВЫГАНЕ СКАЦІНЫ Ў ПОЛЕ

Красна сонца і ясен свет, і з лунамі яснымі, і звёздамі частымі, і з зорамі вогненнымі, і ранішняй расой і з вячэрняй і сушу і мора асычаеш і маць сыру зямлю ўграваеш! І з вясенніх цяплом і з летнім агнём і ўгрэй, упар зямлю, распусці зялёну траву па лясах, па лугах, па канавах, па кустах. І сахрані ты маіх мілых жыватоў ад усякага ліхадзея! Даруй маім жыватам



*В.* і *М. Басалыгі.* Маскі

піценне і ядзенне, пакрый іх шоўкавай пеляной, а ліхадзея забі вогненнай стралой, агнём-пламенем.— Ідзіце, матушкі, у чыстае поле, у зялёныя лугі! Там вам яда — трава зялёная, там піццё — вада студзёная. І ўгрэй іх, красна сонца, а дамоў прывядзі, ясен месяц. І саблюдзі іх, красна сонца, ад ліхога чалавека, ад цара палявога, ад цара вадзянога, ад цара лесавога, ад яго дзетак царанят, каб ён кароў дамоў не вадзіў і царат малаком не паіў. І сахрані іх ад стралы вогненнай, ад звера бягучага, ад гада паўзучага, ад змяі папілухі. Амінь.

## ЗАМОВА НА СЦАЛЕННЕ МАЛАКА Ў КАРОВЫ

Першым разам, добрым часам. Госпаду богу і мамцы прачыстай пакланюся і госпада бога папрашу з усімі сіламі нябеснымі, кіеўскімі, пячэрскімі. А ўсе вы, праведнічкі прападобныя, станьце ж гасподухначку на помач божай кароўцы чорненькай. У полі стаяла богава стаянка, а ў той стаянцы богава кароўка, а ў тыя кароўкі залатыя рожкі, мядзяныя ножкі, сярэбраны язык. Прыдзі ж, кароўка, к маёй божай кароўцы, паліжы, кароўка, маю кароўку, ножкі і рожкі, і вымечка. Як жа ў моры вадзіца прыбаўляецца, каб у маёй божай кароўкі, божа, малако прыбаўлялася; як жа ў моры бераг з беражком не сходзіцца, каб і к маёй божай кароўцы ўрокі не прыходзілі,—ні жаноцкія, ні хлапоцкія, ні дзявоцкія, ні схода, ні маладзіка і не пад поўнае і ветрам ненаноснае. І дай жа ты, госпадзі, маёй божай каровачцы белага малачка, а жоўтага маслечка, тоўстага сырцу; не будзь жа ты ўрочна, а будзь жа ты малочна; як было, так каб і было, каб даў бог яшчэ болей прыбыло. А хто завідуе ды прыглядаецца, дык соль яму ў вочы і галаўня ў зубы...

## ЗАМОВА НА ЗАХАВАННЕ ЖЫВЁЛЫ

Уставала я ранюсенька, умывалася бялюсенька, выганяла я кароўку ў зялёную дуброўку, на Юр'еву роску, на мікульную траўку, на скацеркуатаўку ў чыстае поле. У чыстым полі стаіць прыстол. На прыстоле сядзіць святая матка, прачыстачка-багародзіца і дзяржыць на прыполе Ісуса Хрыста і накрывае чорнаю рызаю. Як Ісусу Хрысту з чорнае рызы не ўставаці, так блудніку-самаблудніку каля маёй каровы не бываці, з маёй кароўкі плоду, малачка не браці. Мая кароўка будзе ўросная, прарасная і будзе добра малосная. Будзе па чысту полю пахаджаці і капыцікам траўку збіваці, і роску злізаці, і сваёй хазяйцы малачко збіраці з дзеваці жылачак у чатыры цыцачкі. Смятанка жоўценька, тлусценька, тваражок гусценькі.

Кароўка на пажытак, малачко на прыбытак.

## ЗАМОВА АД ВАЎКА

Першым разам, божым часам. Госпаду богу памалюся, святой матары божай прыкланюся. Ёсць у свеце многа царыкаў, а мне тры трэба: першы царык — ясны месяц на небе; другі царык — воўк у калодзе; трэці царык — мядзведзь пад выскаддзей. Як мне з ім не схадзіцца, а ім за адзін стол не садзіцца і не піць і не есць, не гуляць, не бяседаваць, так рабу зверу з маёй скацінкай, з бурай шарсцінкай, не схадзіцца, не відацца, не стракацца. Я сваю скаціну загаворваю дзвёмі зарамі — ранняй і вячэрняй — застанаўляю, цёмнай ноччу пасцель усцілаю, дробнымі зорамі абсяваю, ясным месяцам пакрываю. Ваўку валаўство, ваўчыцы юцы, чорнай рызай вочы за-

сцілаю, застанаўляю і замыкаю зубы, губы, ногці, когці залатымі замкамі, сярэбранымі ключамі. Я ж тыя ключы вынімаю і на сіне мора кідаю. Маёй скаціне, бурай шарсціне, чур ад пары да пары, да слушнага часу.

## ЗАМОВА АД ЛЯСУНА

Хаджу па лясах, па кустах, па імхах, па балотах, па лыкадзёрах, па гніліцах, па чарніцах, па малінах — куды ні хаджу, ніколі не блуджу; сонца па сонцу, месяц па месяцу; пры частых зорках, пры вячэрніх зорах хаджу не блуджу, а табе, лясны хазяін, пакорнасць аддала; ад мяне, раба, адшатніся, у бярозу абярніся. Амінь.

## ЗАМОВА АД ДАМАВІКА

Цар дваравы! Царыца дваравіца! Твае дзеткі цараняты! Дарую я вас і хлебам і соллю, мілуйце вы і маіх жыватоў, карміце вы іх ярай пшаной, а паіце вы іх мядовай сытой, пакрыйце вы іх шаўковай пеляной, блюдзіце вы іх ад чужога дваравога, ад чужога палявога, ад падмежніка, ад качарэжніка, ад кустоўніка, ад грыбоўніка...

## ЗАМОВА АД РУСАЛКІ

Вадзяніца, лесавіца, шальная дзявіца! Адвяжыся, адкаціся, у мой двор не кажыся; табе тут не век жыць, а нядзелю быць. Ступай у раку глыбокую, на асіну высокую. Асіна, трасіся, вадзяніца, уйміся! Я закон прынімаў, златы крыж цалаваў; мне з табой не вадзіцца, не куміцца. Ступай у бор... к лясному хазяіну, ён цябе ждаў, на імху пасцель слаў, муравой усцілаў, у ізгалоўе калоду клаў; з ім табе спаць, а мне, хрышчонаму, цябе не відаць. Амінь.

## ЗАМОВА АД ЛІХОГА ВОКА

Царыца вадзіца, красная дзявіца, марская крыніца, божжа памачніца, і ўгодніца Улляніца, і румяніца, рака вялікая. Кацішся ты, вадзіца, па днях, па начах, па вячэрніх зарах, ідзеш з-пад крутых гор, з-пад красных зор, з-пад жаркага сонца, з-пад яснага месяца, з-пад латыра камня, па тонкіх жылах, марскіх сілах. Падмываеш ты крутыя берагі, жоўтыя пяскі, калоды валяныя, траву шаўковую і вымываеш сырое карэнне, белае каменне; абмываеш камушкі дробныя, крамені чорныя і жалеззе марское цяжкое. Ачышчаеш цароў, каралёў і ўвесь народ хрысціянскі, абмый і сцалі рабу гэту нядужную ад першага вока аднавокага, і ад карага, і ад ярага, і ад белага, і ад шэрага, ад стрэчнага, ад папярэчнага, ад падзіўнага і пасмешнага, ад падумнага і пагляднага, ад прыгаворнага і наброднага, ад галоснага і ад глоснага, ад завіснага і ад радаснага, ад вадзянога і сухавейнага, і скразіцельнага, і скрозь плотнага, і светавога, і агнявога, і гаравога, і палявога; ці схода, ці маладзіка, ці пад поўдня; ад часіны, ад хвіліны, і дзённага, і нач-

нога, і ранняга, і вячэрняга, і паўночнага, і паўдзённага, і радзімага, і насыльнага, і падымнага, і светавога, і калючага, і балючага, і ламучага, і гаручага, ці панскага, ці цыганскага, ці дзякоўскага, ці яўрэйскага, ці мужчынскага пад вянцом, ці жаноцкага пад ганцом, ці хлапецкага пад шапачкай, ці дзявоцкага пад завіткай, ці ўдовіна, ці ўдаўцова, ці дзядова, ці бабіна, ці бацькіна, ці маткіна, ці братова, ці сястрына, ці рабячага, ці сабачага, ці дзядзькіна, ці цёткіна, ці ад старых старыкоў, ад старых старушак, ад вядзьмінскіх і чараўніцкіх і таго беззаконнага ўдовіна навараджэнца, які два разы маць сасець; і на чым бы яны ні былі: на піцянні ці на едзянні, на гулянні-красаванні ці на мяккім спачыванні.

Вадзіца царыца, зямная і нябесная! Зара вячэрняя, зара вутранняя, сонца краснае, месячык праведны, зорачкі частыя, панядзелачак святы, святачкі святыя, гадавыя! Станьце, гаспадухначкі, на помач, святыя анёлы, на радасць, памажыце мне зглаз-урокі загаварыць! І выхадзіце вы, зглаз-урокі, з раба гэтага нядужнага, з буйнай галавы, з чорных брывей, з слухавых вушэй, з баявых наздрэй, з рацівага сэрца, з сільнага жывата, з чорнай печані, з белага лёгкага, з гарачай крыві, з пальчыкаў, з сустаўчыкаў, з рускос, з трыдзевяць касцей, з трыдзевяць жыл, з трыдзевяць пажылак, з ногцікаў, з локцікаў, з белых рук, з хрыбетнай касці, з гаручых слёз. Ідзіце вы, зглаз-урокі, на імхі, на балоты, на тонкія аржаванні, на ніцыя лозы, на гнілыя калоды, на сухія лясы, на жоўтыя пяскі, на буйныя ветры, на неадчыненыя дзверы, на нехрышчоную зямлю, дзе сонца не грэе, дзе ветры не веюць, дзе пеўні не спяваюць і гусі не крычаць і сабакі не брэшуць, і птушкі не пяюць, і звяр'ё не бегае, і людзі не ходзяць. Там вам курганы — нагуляны, і там, на белым камні, стаяць сталы цясовыя, на тых сталах абрусы белыя, на тых абрусах кубкі вінныя; там стаяць ложкі цясовыя, на тых ложках пярыны пуховыя; там у шэрых барах, у цёмных лясах ёсць прыгожая сенажаць, сярод той распрыгожай сенажаці стаіць куст ракітавы, пад кустом ракітавым сядзіць паненка, пірагі пячэ і вас да сябе ў госці кліча, і піва наварыла, і мёду насыціла.

Там вам гулянне-красаванне, там вам адпачыванне; там вам гуляць, вінныя кубкі выпіваць, на цясовых ложках аддыхаць; там быць, там вам жыць, там і раскашавацца. Тут жа вам не хадзіць, касцей не ламаць, шчырага сэрца не знабіць, цела не пушыць, не калоць, не пароць, не гарэць, не балець. Чур табе!

Вазьмі ты, вецер ціхі, вятровае ліха; дзе ты гуляў, дзе ты буяў, дзе ты рабу гэту балезную сустракаў, што ты ёй даў, каб назад адабраў.

Правялікі пан дамавы! Правялікі пан лесавы — безыменшчык! Правялікі пан баравы — Сцяпан! Правялікі пан палявы — Антон! Правялікі пан лугавы — Хвядос! Правялікая пані маці, малання-бліскуха! Прасіце вы сваіх сыноў, дванаццаць ціхіх вятроў, які нам шкоду зрабіў, адабраць вятровае ліха.

Чурайся, ліха, адракайся ад раба гэтага і ідзі, вятровае — на вецер; зямное — на зямлю; вадзяное — у ваду; агнявое — у агонь. Амінь.

## ЗАМОВА АД ЗЛОГА ДУХА

На сінім моры камень, на тым камні дуб, на тым дубе трыдзевяць какатоў, на тых какатах трыдзевяць гняздоў, на тых гнёздах трыдзевяць сарок, трыдзевяць урок — ад жаночча, ад дзявочча, ад хлапечча, ад мужчынска — русы волас, чорны волас, рыжы волас, белы волас. Святыя святочкі, хадзіце ка мне на помач; я з славамі, бог з духамі; як стала, так перастала.

## ЗАМОВА АД НЯЧЫСТАЙ СІЛЫ

Выганяю я з раба божага (імя) бясоў, д'яблаў, нячыстых духаў і самазлейшых духаў, выганяю з такога-та раба, з такога-та воласа, з ярых воч, з сэрца, з зубоў, з целясоў, з рота, з носа, з віскоў, з мазгоў, з шыі яго, з плеч, з хрыбётнае касці, з рабёр, з сярэдзіны, з рук, з ног, з суставаў, з нутры, з утробы, з жыл, з няжыл, з крыві, з целяса, з дыхання, з узгляду. І ссылаю вас, бясы-д'яблы, нячыстая сіла, на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на паганыя воды, дзе Садом і Гамора страблены. Заклінаю я вас, бясы-д'яблы, нячыстая сіла, ветраных і віхорных, і вадзяных, і жывотных, і насякомых. Заклінаю ўсемагучым богам з вышніх воблак чатырма евангелістамі: Іванам і Маркам, Луком і Матвеем. Адступайце, злыя духі, ад раба божага (імя)...

## ЗАМОВА АД ЛЯКУ

Госпаду богу памалюся, прачыстай матары пакланюся і ўсім святым прападобным кіеўскім, пячэрскім Антонію і Хвядосію. Станьце ўсе на помач ляк шаптаць. І вышаптаю яго і шчосваю — і жаночы, і мужскі, і дзявоцкі, і парабацкі, і ветравы, і зяляны, і вадзяны, і конскі, і каравячы, і свінячы, і авечы, і гусіны, і курыны, і сабачы, і кашачы. І ссылаю цябе, ляк: забярыце ляк, бабы, у чапцы, мужчыны, у шапкі, дзеўкі, у косы, хлопцы, у магеркі; вятровы — на вецер ляці; земляны — на зямлю ўпадзі; вадзяны — на вадзе плыві, каню ў ногі, карове ў рогі, свінне ў жывот, авечцы ў капыты, кошцы ў пячонкі, сабацы ў галоўку, гусю ў дзюбку, курыцы ў лапкі. І нясіце на мхі, на балоты, на крутыя горы, дзе вецер не вее і людзі не ходзяць, пеўні не пяюць, ваўкі не выюць. Там чорны вол па гарэ ходзіць, расу абівае, там увесь ляк прападае...

## ЗАМОВА АД ЛЯКУ

І, пуд-упудзішча, выгаворваю я цябе з буйнай галавы, з русага воласа, з руцівага сэрца, з жыл, з пажылак, з касцей, пакасцей, з суставаў, з суставак раба божа (імя). Святы светлы дзянёчак, стань на помач! Святы Мікола, стань на помач! Святы пяцінка, стань на помач! Святое ўзнясенне, стань на помач! Святы Пятрок-Павел, стань на помач! Святы Ілля, стань

на помач! Святы Спас, стань на помач! Святая прачыстая, стань на помач! Святы Пакроў, стань на помач! Святы Кузьма-Дзям'ян, стань на помач! Упуд-упудзішча, высылаю я цябе на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на белыя каменні, на ракітавыя карэнні.

## ЗАМОВА АД ЛЯКУ

Першым разочкам, добрым часочкам... Вялікая зара-зараніца, хвораму памачніца, стань на помач, на ратунак на радасць.

Як на небе месячка састанавіўся, састанавіся, кроў. Калеснік калесніка сустракае — немач адсякае.

Дарогай ішлі Пётра-Паўла, Ілля, сустракаюць прачыстую маці. Яны ў яе пытаюць: «Ох маці, мая маці, чым мы ету будзем балезць пакрываці?»— «Будзем жа мы пакрываць чорнай рызай». Чорнай рызай пакрывалі, к сабе пераход любімага ліха прызывалі: любімае, радзімае, спужанае, уздрыганае, уляканае, аручае, пяручае, ветраное, вадзяное, падзіўнае, пагляднае, пасмяшна, прыгаворна, намоўна, з агня, з ветра, з вады ў раба божага не быць, па касці не хадзіць, касці не ламіць, сэрца не таміць, жылак не марыць, вочак не цямніць, галовачкі агнём не паліць, у вобмарак не ўвадзіць. Патуль ты хадзіла, гуляла, буяла, пакуль раба божая Дар'я прыступіла, ухадзіла, угаварыла, высылала з жыл, з паджыл, з кагцей, з машчэй, з чуткіх вушэй, з чырвонае крыві, з жоўтае касці, з буйныя галавы, з румянага ліца, з русага валаска, з шчырага сэрца, з белага цельца. Дасць бог час добры, любі мой дух лёгкі.

## ЗАМОВА АД КРЫКСЫ

Першым разам, добрым часам. Госпаду богу памалюся, матцы прачыстай пакланюся. Матка божая, святая, стань жа мне на помач, рабу божаму, младзенцу, крыксы гаварыці. Зоры-зараніцы, красныя дзявіцы, вазьміце вы крыксы-начніцы — і бацькавы, і маткіны, і дзявоцкія, і парабацкія, і жаласныя, і карысныя, і ўцешныя, і пасмешныя, і светавыя, і заравыя. І вам, зорачкі, на стаянне, а рабу божаму, младзенцу, на здароўе; вам, зорачкі, пасвяціці, а рабу божаму, младзенцу, паспаці.

## ЗАМОВА АД ЗМЯІНАГА ЎКУСУ

...Гадзіна вадзяная, земляная, сляпні і вужы, змеі і вужакі, ярыца, пераярыца! Аддайце і вазьміце сваю жаласць і ярасць (імя або назва жывёлы). Калі не аддасцё сваёй жаласці і ярасці, то не будзе вам збудзішча ні пад кустом, ні пад лістом, ні пад карэннямі. Сонца і яркі месяц не будуць вам свяціць і не будзе прынімаць вас сыра маць-зямля.

## ЗАМОВА АД ШАЛУ

Устану я рана-раненька, умыюся бела-бяленька, узыйду на крутую гару, зірну пад ясную зару — там стаіць дзедзька-лябедзька, стары, барадаты. Дзедзька-лябедзька, унімай свайго сабаку-кусаку, круцяку і вярцяку: укусіў ён раба божага, вынімай шал з касцей, з машчэй, з чорных печаней, з сініх жыл, з гаручай крыві і буйнай галавы, каб у раба божага косці не ламіла, гаручае крыві не марыла, ясных вачэй не круціла.

## ЗАМОВА АД КРЫВАЦЯЧЭННЯ

Плыло тры рэчкі: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная — працячы! Малочная — працячы! А кроў гаручая, супыніся і запячыся. Другім разам, гасподнім часам. Плыла рака морам, а ў той рацэ тры жылы: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная — працячы! Малочная — працячы! А крывавая, суніміся і запячыся! Трэцім разам, гасподнім часам. Плыло тры рэчкі: адна вадзяная, другая малочная, а трэцяя крывавая. Вадзяная — працячы! Малочная — працячы! А кроў гаручая, сунімайся, запякайся!

## ЗАМОВА АД ЛІХАМАНКІ

Наперш вяснянка, а другая лядзянка, а трэцяя лістападніца, а чацвёртая касцяніца, а пятая квактуха, а шостая начніца, а сёмая смутніца! Адкаціся, адваліся ад грудзей і ад бела цела, ад буйнай галавы! Ты дзеўкай не шляйся, на мяне не зазірайся. Я ў хаце ляжу, на вугаль гляджу. Як вуглю згарэць, так табе ў катле кіпець. Бяжы не азірайся, назад не вяртайся, ступай у пні, у калоды, у гнілое балота. Там табе жыць, са мхоў ваду піць. Амінь.

## ЗАМОВА АД ЛІШАЯ

Іду я ў гумно і бяру палову і свінням мяшаю. А ты, лішай, рабу божаму не мяшай і выхадзі з яго і з касцей, і з мазджэй, і з ясных вачэй, і з гарачай крыві, і з чыстага цела і карэння не пускай. І здымала цябе матар божая духам сваім і ссылала цябе на мхі і на балоты, і на дзікія лозы — там яны гуляюць і сталы засцілаюць, і ўсіх лішаёў дажыдаюць: і красных, і белых, і лупленых, і коленых, і падзіўных, і прастудных, і пасмешных, і ветраных, і вадзяных, і знаючых, і нязнаючых. І чур цябе, хрышчонага, нараджонага!

## ЗАМОВА АД СКУЛЫ

Ты, зара-зарыца, ты, раса-расіца, ранняя і вячэрняя! Ты, скулішча-асудзішча, ты, скула белая, ты, скула чорная, ты, скула сіняя, ты, скула багровая, ты, скула жоўтая, ты, скула завісная, ты, скула радасная, ты, ску-

ла ўрошная, ты, скула ўгрумая, ты, скула грудзішча, ты, скула залатніца — якой бы ты ні была, я, раб божы, цябе ўпрашаю. Я цябе высылаю з касці, з машчэй, з ясных вачэй, з буйнай галавы, з рацівага сэрца, з усіх жыл, з усіх поўсуставаў, каб раб божы балець перастаў.

Ты ступай, скула, на сінія моры. На сінім моры ляжыць белы камень, на белым камні сядзіць там белая дзявіца; яна не шые, яна не мые, яна не тчэ, яна не прадзе, толькі рабу божаму помач ад скул дае.

Мы ж просім: «Красная дзявіца, сама чыстая вадзіца, ты ішла з марскога ключа, з землянога нутра, ты размывала жоўтыя пяскі, ты падлівала крутыя беражкі — змый з раба божага (імя) скулу ўгрумую і ўсю балесць!»

## ЗАМОВА АД ЗУБНОГА БОЛЮ

О вы, зубы, зубы! Чаму ж вы не белы, ды руды? Хіба вы што кепска жавалі, што хваробы дасталі. Перастаньце ж вы хварэці, будзеце, як велькі пан у гарэце. А калі не перастанеце балеці, то мы будзема вас жалезам цягнуці. Ідзі ж ты, хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы ды ў мокрае балота. А хваробы нам жаднай не трэба, бо яна прышла ад чорта, але не з неба.

## ЗАМОВА АД ХВАРОБЫ ВАЛАСОЎ

Ты волас, волас калавы і волас ламавы, і мазгавы, і рассыпны, і волас жыльны, і трохжыльны, і волас дзянны, і волас начны, і волас свярбучы, і волас ламучы, і волас знабучы! Адчаго ты колеш, адчаго ты ломеш? У буйнай галаве, у рацівым сэрцы, у скорых нагах, у ясных вачах уцішся, умірся і не калі, не ламі, ні ў маладзіках, ні ў ветахах, ні на сходзе красна сонца, ні на закаце красна месяца. Ступай у зямлю цёмную, у цьму крамешную, не к людзям жывым, а к папурам ліхім.

## ЗАМОВА АД ЗАЛАТНІКА

Загаворваю залатнік ступны, стрывожаны, калючы, падзіўны, прыгаворны, дзявочы, жаночы і хлапечы. Дванаццаць разоў загаворваю і замаўляю: не гарэць, не балець, не ламіць і жыл не сушыць. Цары, каралі б'юцца, сякуцца і зноў усціхамірваюцца. Так і ты, залатнічок, хадзі, расхадзіся і ўсціхамірвайся, на сваё месца станавіся, якое табе гасподзь бог паказаў.

Уніз не сходзі, касці не ламі, раба божага (імя) не сушы. Як чорны мак пасеўны, так і ты, залатнік, пяром угору ўзніміся, на сваё месца станавіся не ніжэй, не вышэй пупа. Як на небе маладзічок, зоркі і балачынкі круг свету ходзяць, расходзяцца і на сваё месца становяцца, так і ты, залатнічок, хадзі, расхадзіся, свайго месца пільнуйся і на сваё месца станавіся — ля пупа, ля пупа, ля пупа.

## ЛЮБОЎНАЯ ЗАМОВА (ПРЫСУШКА)

Устану я, добры маладзец, і выйду не дзвярыма за новыя вароты ў чыстае поле. У чыстым полі стаіць тры бясы, два бясы, адзін бес: бес Сава, бес Савул, бес Калдун. Падыйду я, добры маладзец, пабліжэй, пакланюся паніжэй, і вы, трыдзевяць бясоў — бес Сава, бес Савул, бес Калдун, паслужыце мне, як служылі Іраду цару. Ідзіце па гарадах, па сёлах, па дзярэўнях і збярыце ўсю таску і сухоту ад звярэй, птушак, рыб і ўсякага роду людзей і знясіце тую таску і ўсякага роду сухоту дзяўіцы Прасінні ў ясныя вочы, у чорныя бровы, у румянае ліцо, у рацівае сэрца, у чорную печань, у гарачую кроў, у трыдзевяць жыл і адну жылу станавую, падпятную, і каб гэта дзявіца не магла ні жыць, ні быць ні днём па сонцу, ні ноччу па месяцу без мяне, добрага моладца. У чыстым полі стаіць сарачынскі дуб, з-пад дуба выходзіла Баба-Яга і паджыгала трыдзевяць кастроў дубовых дроў. Так жарка, так ясна, каб разгарэліся ў дзявіцы ясныя вочы, чорныя бровы, румянае ліцо, рацівае сэрца, чорная печань, гарачая кроў, семдзесят адзін сустаў; каб тая дзявіца не магла наслаждацца, ні ў чыстым полі нагуляцца, ні ў парнай лазні парыцца, ні прэсным малаком нахлябацца, ні ў мяккай пасцелі адаспацца без мяне, добрага моладца. І гэтым добрым маім словам ключ і замок, замок замкну і ключ знясу ў акіян-мора пад латыр камень. Амінь.

## ЗАМОВА АД НАГАВОРУ

Зоры зарыцкія, хвораму памачніцы, прыступіце, памажыце ўпрасіць і ўмаліць 12 прымавак і ўгаварыць, адкуль яны ўзяліся, ці ветраныя, ці віхраныя, ці ўрочныя, ці ўлечныя, ці падуманыя, ці пакідоныя, ці памаўлёныя, ці нагавораныя, ці страчаныя, ці пасланыя. Прашу я вас усіх: выступіце з следу, з печаней, з касцей, з вачэй, ад белае касці, ад чырвонае крыві, ад русых косак, ад чорных вочак. І прашу я госпада бога. Ідзіце вы на сіняе мора. На сінім моры стаіць дуб зялёны, пад тым дубам 12 панове гуляюць. Стаяць столікі засціланыя, кубачкі паліваныя, там вам піці, гуляці, а гэтаму чалавеку здароўечка даці. На лёгкае спанне, на смачнае ўжыванне, па беламу свету хадзіці і з добрымі людзьмі гаварыці.

Як чорнаю кароваю па мору не араці, чорным катом не баранаваці, жоўтым пяском не сеяці, у жоўтым пяску каласку не бываці, так ліхім людзям яго здароўечка не ўцінаці.

### Прысушка

Лягу я, раб божы, памалюся, устану я, благаслаўлюся, памыюся я расою, вытруся я прастольнаю пеляною, пайду я з дзвярэй у дзверы, з варот у вароты, выйду я ў чыстае поле, у зялёнае памора, стану я на сырую зямлю, пагляджу я на ўсходнюю старану.

Як краснае сонейка ззяе, прыпякае мхі і балоты, чорныя гразі, так і ты прыбягай, ка мне прысыхай, раб божы, ка мне, рабе божай. Вочы ў вочы, сэрца ў сэрца, мыслі ў мыслі. Спаць бы ён не засыпаў, гуляць бы ён не гуляў, а ўсё б ка мне прыбягаў. Амінь, слава табе.

# КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

Каляндарна-абрадавая паэзія, або паэзія земляробчага календара, належыць да самых старажытных пластоў народна-паэтычнай культуры. Вытокі каляндарна-абрадавай паэзіі ў родавым грамадстве. Наглядаючы змены пор года, біялагічныя цыклы ў развіцці раслін і жывёл, старажытны чалавек, моцна залежны ад прыроды, імкнуўся ўплываць на яе: запабегнуць злым сілам, выклікаць урадлівасць нівы, спор і прыплод у гаспадарцы. Жаданага спадзяваўся дасягнуць праз абрадавыя дзеянні і словы, у магічную, цудадзейную моц якіх шчыра верыў. І хоць вера ў магчымасць словам і адпаведнымі абрадамі ўздзейнічаць на навакольны свет складае значны момант народна-паэтычных уяўленняў, не яна вызначае змест і сэнс аднаго з найбольшых, прынамсі у беларусаў, раздзелаў народна-паэтычнай творчасці. Практычная гаспадарчая дзейнасць земляроба на працягу працоўнага года, грамадскі быт ляжаць у аснове песень гадавога круга. Гэта паэзія зямлі ў самым непасрэдным сэнсе слова. Назіранні над кругаваротам у прыродзе і земляробчай працай, залежнай ад пор года, склаліся ў цэлую сістэму поглядаў, своеасаблівы гаспадарчы каляндар. Ён уключыў у сябе рад святкаванняў аграрнага характару, уласцівыя ім абрады, багатае песеннае суправаджэнне, прыкметы і інш. Пазней хрысціянства ў барацьбе з язычніцтвам імкнулася прыстасаваць свае святкаванні да старажытнага земляробчага календара. Народна-паэтычная стыхія толькі часткова, вонкава, успрыняла некаторыя элементы хрысціянскай міфалогіі, перапрацаваўшы іх адпаведна спрадвечным стыхійна-матэрыялістычным (у аснове сваёй) земляробчым уяўленням і свайму паэтычнаму бачанню свету. Юр'я, Мікола, Пятро, Ілля з песень гадавога круга — гэта тыя ж сяляне-земляробы, ратаі і сейбіты. І клопат іх пра жыта караністае ды каласістае, пра юр'еўскую расу першага выгану скаціны ў поле, пра пагодлівы сенакос і добры ўжон збожжа, пра раі семяністыя і табуны коней — чыста сялянскі клопат. Неаднолькавыя метэаралагічныя ўмовы вясны, лета восені і зімы, разнастайны характар гас-

падарчай дзейнасці ў кожным каляндарна-вытворчым сезоне абумовілі функцыянальныя асаблівасці паэзіі гадавога круга, яе цыклізацыю. Сучасныя фалькларысты і этнографы (У. Чычараў, І. Проп, А. Астахава, С. Токараў, К. Чыстоў) з увагі на працоўную аснову і наяўны рускі песенны матэрыял дзеляць каляндарныя абрады і паэзію на тры цыклы. Развітасць у паэзіі беларускага земляробчага календара песенных відаў усіх чатырох аграрнавытворчых сезонаў, акрэсленая працоўная аснова восеньскага цыклу (уборка яравых, грэчкі, апрацоўка лёну, канапель, збор грыбоў, копка бульбы і інш.) і, нарэшце, адметная музычная прырода восеньскіх песень даюць падставу гаварыць пра чатыры цыклы беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі: зімовы, веснавы, летні і асенні.

Сярод зімовых святкаванняў багаццем і каларытнасцю абрадаў вызначаліся каляды, бедная і багатая куцця, звязанае з імі калядаванне і шчадраванне, аграрная і любоўная варажба, культ продкаў у абрадах куцці *.

Зімовы цыкл каляндарнай паэзіі ўключаў песні піліпаўскія, якія спяваліся пры кудзелі. Аднак спецыфіку яго, асноўнае ядро складалі калядкі і шчадроўкі. Калядныя песні выконваліся пераважна ў час старажытнага земляробчага свята каляд. Яны выказвалі запаветныя думкі селяніна пра будучы ўраджай, дабрабыт і мелі на мэце садзейнічаць захаванню руні, статка, пчол. У змесце калядак шмат наіўнай ідэалізацыі: сялянскі двор з іх паўстае раскошным, багатым, не раўнуючы як княжаскі палац або панскі маёнтак. Шчадроўкі выконваліся звычайна на так званую багатую куццю, у ноч напярэдадні Новага года. Зместам яны вельмі блізкія да калядак і адрозніваліся больш прыпевам і іншымі дэталямі паэтыкі, напрыклад вершаваным памерам. Калядка звычайна складаецца з зачына, усхвалення гаспадароў, праслаўлення іх хаты, характва, багацця.

Менш захаваліся ў беларусаў масленічныя песні, або масленкі. Яны стаяць на мяжы зімовага і веснавога цыклу. Адлюстроўваюць абрадавыя забавы і гульні, сацыяльныя і грамадскія адносіны, услаўляюць свята і вясёлае застолле.

Надзвычай багатая беларуская каляндарная паэзія веснавога цыклу. Пачыналі яго песні гукання вясны, вяснянкі. Урачыста вырываліся заклікальныя матывы іх з дзявочых грудзей. Прасвятлёны былі яны марай аб адроджанай прыродзе, веснавым сонейку, выхадзе ў поле. У велікодных песнях гаварылася ў асноўным пра дзявочую долю і сямейныя адносіны. Выразнай жанравай адметнасцю, паэтычным багаццем, раскошай вобразаў вылучаліся валачобныя песні, якія ў пэўным сэнсе складаюць спецыфіку беларускага календара, яго паэзіі. У іх на шырокім фоне, з эпічным размахам паказана гаспадарчая дзейнасць земляроба. Сакавітымі фарбамі малюецца праца на полі ад засявання да збору ўраджаю. Наіўнай ідэалізацыяй сялянскага дабрабыту валачобныя песні пераклікаюцца з калядкамі і шчадроўкамі. Аднак паэтызацыя працы селяніна ў валачобных песнях дасягае боль-

* Усе даты абазначэння свят даюцца паводле старога стылю.

шай паўнаты, мастацкай яскравасці. Юраўскія песні ў аснове сваёй звязаны з даўнім святам старажытных жывёлаводаў і земляробаў — Юр'ем. Яны выражаюць адвечную мару селяніна аб добрым ураджаі, аб захаванні статка ад памору і дзікіх звяроў. Вобраз юр'еўскай расы, на якую ўпершыню пасля зімы выганялі статак, малюнкі ўзаранага поля-ралллі, светла-зялёнай руні стваралі агульны паэтычны вобраз вясны.

Завяршалі веснавы цыкл песні траецкія, або сёмушныя. У іх адлюстраваны культ расліннасці і культ продкаў, расказваецца аб дзявочых марах пра замужжа, вяселле.

Летні цыкл складалі песні купальскія, пятроўскія, касарскія і жніўныя. Да летняга цыклу ў пэўнай ступені адносяцца і талочныя, якія спяваліся і ў іншыя поры года, але найбольш — у час дажынак, пры застоллі дажынкавай талакі. Купальскія песні ўслаўлялі Купалу (купалле) — пару найбольшага росквіту зямных сіл, выражалі імкненне захаваць ураджай якраз напярэдадні ўборкі, адлюстроўвалі любоўныя і сямейныя адносіны. Значную частку купальскіх песень складаюць жартоўныя, якія, як і большасць купальскіх, выконваліся каля кастра і незласліва высмейвалі заганы хлопцаў і дзяўчат, адыгрывалі значную ролю ў вясёлай святочнай гульні моладзі. Пятроўскія працягвалі, развівалі далей тэму любоўных і сямейных адносін. Касарскія песні не вылучаюцца тэматычнай разнастайнасцю. Спяваліся яны на матыў жніўных. Сапраўднай скарбніцай беларускай народнай песеннай культуры з'яўляюцца жніўныя песні. Шырокі паказ працы жней у іх спалучаецца з адлюстраваннем унутрысямейных і сацыяльных адносін. Матывы жніўных песень нясуць у сабе вялікі зарад сацыяльнай нянавісці селяніна да паноў-прыгнятальнікаў і іх прыслужнікаў. Паэтычным хараством, раскошай вобразаў вылучаюцца сярод жніўных дажынкавыя песні, якія адлюстроўвалі заключны этап збору жыта з палёў.

Восеньскі цыкл быў найбяднейшы абрадамі. У ім найбольш значнае месца займаў культ продкаў — дзядоў. Сярод восеньскіх святкаванняў вылучаліся багач, пакроў, змітроўскія дзяды. Восеньскія песні — гэта песні так званага асенняга або аўсянага жніва, песні, што спяваліся пры ўборцы лёну, капанні бульбы, зборы асенніх ягад і грыбоў. У іх дамінуе тэма будучага замужжа і вяселля. Восеньская песня стварыла яскравыя малюнкі асенняй прыроды, дала цудоўныя ўзоры народнага меласу.

У жанравых адносінах каляндарна-абрадавая паэзія разнастайная. Яна ўключае абрадавыя песні заклінальныя, велічальныя, песні лірычныя і сямейныя, што паводле народнай традыцыі прымеркаваны да каляндарных цыклаў, а таксама прыгаворы, драматызаваныя дыялогі, прыказкі, прымаўкі. Народныя прыкметы, выказаныя ў форме прыказак і прымавак, перадаюць назіранні за жыццём прыроды ў дастасаванні да працы земляроба, заключаюць у сабе практычныя веды, парады. «Вясна — маці, лета — бацька»,— кажа народная прыказка. «Сей авёс у гразь — будзеш, як князь. Прышлі калядкі — гаспадарам парадкі. Зорнае неба на куццю — ураджай на ягады і грыбы. Іней на дрэвах — багатая квецень у садах. Красавік з на-

дою, май з травою. У каго Купала пракосы ўбача, у таго баба ў жніво не заплача. На Іллю да абеда лета, а па абедзе восень».

Функцыянальнае прызначэнне каляндарнай паэзіі вызначала яе мастацкую прыроду. Вобразы каляндарна-абрадавай паэзіі ўзяты са сферы гаспадарча-вытворчага быту земляроба. Вясна, зіма, даспелае жыта, жняя, спарыш, раёк, купалка і іншыя побач з вобразамі дзяўчат, хлопцаў, гаспадароў і гаспадынь — асноўныя мастацкія вобразы калядак, валачобных, купальскіх, жніўных і іншых песень. Каляндарна-абрадавая песня часта карыстаецца прыёмамі гіпербалы, асабліва ў велічальных песнях; характэрна для яе ўвасабленне.

З развіццём грамадства каляндарныя абрады, страціўшы першапачатковы магічны сэнс, ператварыліся ў звычаі і амаль выйшлі з побыту. Некаторыя трапілі ў разрад гульняў, перайшлі ў іншыя цыклы і раздзелы, асобныя — у дзіцячыя. Адной з галоўных прычын гэтых змен з'яўляюцца карэнныя перамены ў вытворча-гаспадарчым укладзе. Каляндарная паэзія ў асноўным страціла сваю вытворчую функцыянальную ролю і тым самым значэнне. Аднак з увагі на эстэтычную вартасць і пэўную жывучасць народна-песенных традыцый яна астаецца ў памяці пераважна старэйшага пакалення. Агульна прызнана, што беларуская каляндарна-абрадавая паэзія — найбагацейшая сярод паэзіі славянскіх народаў. Яна ў многім прадвызначыла спецыфіку беларускай народна-паэтычнай творчасці, складае значны здабытак нацыянальнай паэтычнай культуры.

**Літаратура**

*Шырма Р.* Беларускія народныя песні, т. 3. Мінск, 1962.
*Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў. Мінск, 1974.
*Гілевіч Н. С.* Наша родная песня. Мінск, 1968.
*Карский Е. Ф.* Белорусы, т. 3, вып. 1. М., 1916.
*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Мінск, 1967.

## КАРОТКАЕ АПІСАННЕ АБРАДАЎ ЗЕМЛЯРОБЧАГА КАЛЕНДАРА

Зімовыя абрады ў беларусаў у асноўным былі звязаны з сустрэчай і святкаваннем каляд і Новага года. Звычай святкавання масленіцы быў менш вядомы, і асноўныя сведчанні аб ім сабраны фалькларыстамі на ўсходзе Беларусі.

Увечар з 24 на 25 снежня, напярэдадні каляд, спраўлялася куцця (назва паходзіць ад асноўнай стравы, згатаванай спецыяльна на гэты вечар). У чыста ўбраную хату, на покуць, прыносіўся ахапак сена. Яго рассцілалі на стале, перад тым як заслаць абрусам. Сеўшы за вячэру, гаспадар стукаў у акно, сцяну са словамі: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці».

На працягу наступных дзён вечарамі моладзь збіралася на ігрышчы, дзе частавалася, спявала калядныя песні, ладзіла гульні («Цярэшку», «Яшчура» і інш.), танцавала. Звычайна выпраўляліся калядаваць, паказвалі

тэатралізаваныя прадстаўленні, але найбольш хадзілі шчадраваць на багатую куццю, напярэдадні Новага года. Дзяўчаты цешыліся варажбой. На багатую, шчодрую куццю быў звычай «вадзіць казу». Аднаго хлопца старанна апраналі ў вывернуты кажух, надзявалі маску... Па загаду «дзеда», які вадзіў казу, яна падтанцоўвала, пры гэтым спявалі.

Веснавы цыкл песень і звязаных з ім абрадаў пачынаўся гуканнем вясны. У другой палове дня 25 сакавіка дзяўчаты збіраліся грамадкамі і з узвышаных месцаў (з узгоркаў ці з гуменных стрэх) «гукалі вясну» — спявалі «вяснянкі», перакліканіся імі з іншымі дзявочымі грамадкамі на ўсёй ваколіцы. Часам са спяваннем вяснянак вадзілі «танкі», карагоды на вуліцы.

Адным з найбольшых веснавых свят быў вялікдзень. Вечарам у першы дзень пад вокны кожнай хаты хадзілі валачобнікі і сваімі песнямі віталі і ўзвялічвалі гаспадара, гаспадыню, гаспадаровых дзяцей: дзецюка, красную паненку. На сабраныя падаянкі ладзілі вечарынку са спевамі і скокамі.

23 красавіка, на Юр'е (свята пастухоў), упершыню выганялі скаціну ў поле, і ўсе абрады у гэты дзень (абкурванне святаянскімі травамі, біццё вербачкай і інш.) былі накіраваны на тое, каб захаваць яе і ўвесь прыплод ад рознага наслання.

У сем тыдняў па вялікадні святкавалі Тройцу, або Сёмуху. Дзяўчаты ішлі ў лугі «завіваць вянкі». Дамоў прыносілі май — бярозкі, явар і аздаблялі ім брамку, падворышча, хату.

Наступны за Тройцай-Сёмухай тыдзень зваўся русальны або гранны.

Абрады русальнай нядзелі былі звязаны з верай у русалак — загадкавых істот, у якіх нібыта перасяляліся душы тапельніц, памёршых дзяўчат. У некаторых кутках Беларусі быў звычай «провадаў русалкі». Выбіралі рослую прыгожую дзеўку, распускалі яе косы на плечы, на голае цела ці кашулю, накідалі андарак, сплятали вянок з васількоў, хмелю, зорачак, ускладалі яго на галаву абранай і вялі яе ў жыта. Там, разарваўшы вянок, уцякалі ад яе. Часам з русалкай вадзілі «танкі».

Мабыць, найбольш багатым і, бясспрэчна, адным з самых старадаўніх быў купальскі абрад, з выразнай паганскай (язычніцкай) асновай. Народная фантазія праявілася ў ім асабліва ярка.

Купалле святкавалася ў ноч з 23 на 24 чэрвеня, у дзень летняга сонцастаяння. Увесь дзень 23 чэрвеня праходзіў у падрыхтоўцы да начной урачыстасці. Моладзь збірала для кастра старыя зношаныя кажухі, магеркі, бурносы, атопкі... Дзяўчаты шукалі купальскія зёлкі: купалкі, руту, багаткі, папараць і інш. На Віцебшчыне, напрыклад, гэта называлася хадзіць у жытное. Вечарам моладзь збіралася на выгане, на лясной паляне або на высокім беразе, узгорку і раскладала купальскія кастры. Часта ўздымалі на шасце аблітае смалой запаленае кола. Пачыналіся гульні, спевы. Адным з абавязковых момантаў было скаканне праз агонь. На Купалле многа варажылі, пускалі вянкі на ваду, шукалі папараць-кветку. Паводле народнага павер'я, папараць-кветка зацвітае адзін раз у год, а 12-й гадзіне ночы, на Купалле. Хто падсцеражэ таямнічую кветку і схопіць яе, той стане празарліўцам.

Шчаслівец будзе разумець гутарку звяроў, яму зямля адкрые таямніцы сваіх схаваных скарбаў.

Пад раніцу купальшчыкі ішлі сачыць, як будзе ўзыходзіць сонца. Паводле народнага падання, яно ў купальскі дзень узыходзіць па-асобаму — іграючы. Наогул купальская ноч лічылася ў народзе за ноч цудаў і таямніц.



*М. Каменскі.* Попрадкі

Паводле народных вераванняў, у той час, калі сонца пачынала іграць, беларускія рэкі Дняпро, Нёман, Сож, Дзвіна, Бярэзіна і іншыя серабрыліся нейкім асаблівым прывідным святлом, дрэвы пачыналі хадзіць і перагаворвацца шумам свайго галля. Дар мовы атрымлівалі звяры, птушкі і травы.

З жніўных абрадаў вылучаліся зажынкі і асабліва дажынкі. Зажынкі звычайна пачыналі ў суботу пад вечар. Нажаўшы снапоў дзесяць, з песнямі вярталіся дамоў. Першы сноп зжатага жыта ставіўся на покуце. Вячэра ў гэты дзень звычайна была святочнай.

У дажынкавы дзень жнеі апраналіся ў лепшае адзенне. Калі жытні шнур падыходзіў к канцу, некалькі дзяўчат пачыналі віць вянок. У некаторых мясцовасцях у канцы жніва на загоне пакідалася жменя каласоў, якую называлі «барадой» або «кустом». Жнеі збіраліся вакол «барады», выпол-

валі траву паміж сцяблін жыта, завівалі каласы справа налева і кожная жняя павінна была некалькі разоў перакаціцца на гэтым завітым кусце. Пасля гэтага ўскладалі звіты з буйных каласоў вянок на галаву самай прыгожай дзяўчыне і з песнямі адпраўляліся да таго гаспадара, чыё жыта зжалі. Ён або гаспадыня сустракалі жней каля брамы ці на ганку, прымалі вянок і запрашалі ў хату на пачастунак.

## ЗІМОВЫЯ ПЕСНІ

### Прыехала каляда на сівым коніку...

Прыехала каляда на сівым коніку,
Паставіла коніка ў адрынцы,
Сама села на куце ў пярынцы,
Паставіла дудачкі на стаўпе:
Грайце, дудачкі, голасна,
Скачыце, дзевачкі, хораша.

### Ляцеў каршунішча, каляда...

Ляцеў каршунішча, каляда,
Цераз папялішча, каляда,
Відзеў курак стаду, каляда,
А ён жа лятаіць, каляда,
Курак выбіраіць, каляда.
— А каб жа я ведаў, каляда,
Якая мне будзіць, каляда.
Што белае скрылле, каляда,
Лятучая курка, каляда,
Што жоўтыя ножкі, каляда,
Нясушчая курка, каляда.
А што у чубочку, каляда,
Тая каршуночку, каляда.
А каб жа я ведаў, каляда.
А што мая будзіць, каляда,
Я б ножкамі браў бы, каляда,
На скрыллейку нёс бы, каляда.
А нёс бы я, нёс бы, каляда,
Аж у роўна поле, каляда,
У сваё гняздзечка, каляда.
А у новых сенях, каляда,
Там карагод дзевак, каляда.
А ў тым карагодзе, каляда,
Там Валодзька ходзіць, каляда,
Дзевак выбіраіць, каляда.

— А каб жа я ведаў, каляда,
Якая мне будзіць, каляда.
Што сінія вочкі, каляда,
Драмлівая дзеўка, каляда,
Што белыя ручкі, каляда,
Лянівая дзеўка, каляда.
Што чорныя броўцы, каляда,
Рабочая дзеўка, каляда.
А каб жа я ведаў, каляда,
Што маёю будзіць, каляда,
На коніку вёз бы, каляда.
А вёз бы я, вёз бы, каляда,
Аж у роўна поле, каляда,
Аж у роўна поле, каляда,
У сваё падвор'е, каляда.

**А йшоў-перайшоў, каляда...**

А йшоў-перайшоў, каляда,
Месяц па небу, каляда,
А браў-перабраў, каляда,
Усе звёздачкі, каляда.
А выбраў сабе, каляда,
Ясней за сябе, каляда.
Рана усходзіць, каляда,
Позна заходзіць, каляда.
А йшоў-перайшоў, каляда,
Млоды Мішачка, каляда,
А браў-перабраў, каляда,
Усіх дзевачак, каляда.
А выбраў сабе, каляда,
Павышай сябе, каляда.
Позна лажыцца, каляда,
Кожан дзівіцца, каляда,
Рана ўстаець, каляда,
Пятух не пяець, каляда.

**Прыехала каляда ў вазочку...**

Прыехала каляда ў вазочку
Да на сівенькім канёчку.
Прыехала каляда ўвечары,
Прывезла дудак рэшата.
Паставіла дудкі на стаўпе,

А сама села на куце.
Зайграйце, дудкі, тоненька,
Скачыце, дзяўчаткі, хорашанька.
А вы, хлопчыкі, пазірайце,
Сабе дзевачак выбірайце.

### Да ішлі, ехалі калядкі...

Да ішлі, ехалі калядкі
У маляваных санёчках,
У кужэльных сарочках.
А санёчкі паламаліся,
А сарочкі памараліся.

### Прыехала каляда на белым кані...

Прыехала каляда на белым кані.
Яе конічак — ясен месячык,
Яе дужачка — ясна зорачка,
Яе пужачка — ясна звёздачка,
Яе вазочак з тоўстага лядку,
Яе кажушок з белага сняжку.

### Тыдзень, тыдзень да каляд...

Тыдзень, тыдзень да каляд,
Пан з чэлядзі да не рад.
Скажу, пан, табе без спорак,
Мне ўжо твой хлеб стаў горак,
Аддай, пан, мне каляду,
Ужо я ад цябе пайду.

### А калядачкі...

А калядачкі,
Бліны-ладачкі!
А калядачкі,
Нашы ножачкі,
Паўбівалі вы
Чорны сцежачкі.
Адна сцежачка
Пайшла ў гарод,
А другая—
У чыста поле,
А трэцяя —
К быстрай рэчцы.
Што ў гарод пайшла,
То наесціся,
У чыста поле —
Нагуляціся,
К быстрай рэчцы,
То напіціся.

**Ішла каляда...**

Ішла каляда калядуючы.
Гэй, каляда, калядзіца.*
Каля двору йшла ды бядуючы,
За ёй хлопчыкі ўсё жабруючы.



*М. Э. Андрыёлі.* Калядоўшчыкі

Прыйшла каляда к Ляксею на двор:
— Пане Ляксею, просім не трымаць,
Кароткі світкі — сцюдзёна стаяць,
Ці ты спіш-ляжыш, ці нас не чуеш?
Пане Ляксею, дары каляду!
Калі не дасі бочкі пшаніцы,
Бочкі пшаніцы, другой — ярыцы,
Дык ты аддасі младу Марыльку!

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

## Насцілайце сталы, накладайце хлябы...

Насцілайце сталы, накладайце хлябы
Каляда. *
Да прыдуць к нам да тры госцікі:
Адзін госцічак — ясен месячык,
Другі госцічак — ясна сонейка,
Трэці госцічак — дробен дожджычак.
Ясен месячык: от я хвалюся
— Як узыйду я з паўночы на ночы,
То ўзрадуецца купец у дарозе,
А ясна сонейка: от я хвалюся
— От як я засвечу ясным сонейкам,
То ўзрадуецца гаспадар у бóры,
А пастух у полі.
Дробны дожджычак: от я хвалюся
— От як пайду я ў маю месцу,
То ўзрадуецца авёс і пшаніца,
Розна пашніца.

## Ці дома, дома сам пан гаспадар?..

Ці дома, дома
Сам пан гаспадар,
Добры вечар,
Сам пан гаспадар?

Што ў бары гудзе —
Пчолка-матка йдзе,
Добры вечар,
Пчолка-матка йдзе.

Ой, калі дома,
Выйдзі паслухай,
Добры вечар,
Выйдзі паслухай.

Пчолка-матка йдзе,
І райкі вядзе,
Добры вечар,
І райкі вядзе:

Выйдзі паслухай,
Што ў бары гудзе,
Добры вечар,
Што ў бары гудзе.

Семяністыя
І мядзістыя,
Добры вечар,
І мядзістыя!

## Да ці дома сам пан гаспадар...

Да ці дома сам пан гаспадар?
Святы вечар! **
Ой, нам казалі, што няма дома,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

А ў новым гумне жыцечка вее.
Ой, хадзем да яго, узвесялім яго:
Ці не дась ён нам недавеечкаў,
Недавеечкаў на гарэлачку,
На гарэлачку на кватэрачку.
Да ці дома, дома да яго жана?
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новай сваццёлцы белы кужаль чэша.
Ой, хадзем да яе, узвесялім яе:
Ці не дась жа нам недачосачкаў,
Недачосачкаў на гарэлачку,
На гарэлачку на кватэрачку!
Да ці дома, дома да яго дачка?
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новай клеці белы хусты качае.
Ой, хадзем да яе, узвесялім яе:
Ці не дась жа нам па хусціначчы,
Па хусціначчы па бялесенькай,
Па бялесенькай, па танесенькай?
Да ці дома, дома да яго сынок?
Ой, нам казалі, што няма дома,
А ў новай стайні каня сядлае,
Каня сядлае, з канём гаворыць:
«Ой, коню, коню! прадам я цябе,
Прадам я цябе за сто чырвонцаў,
За сто чырвонцаў, за чатыры грошы,
За чатыры грошы, што ты не харошы».
— Ой пане, пане, уздумай прыгоду:
Калісь мы былі ў Турэцкай зямлі,
За намі стрэлы, як дым, ляцелі,
За намі кулі зямлю пабілі.

**За сяньмі, сяньмі там за новымі...**

За сяньмі, сяньмі там за новымі,
Шчодры вечар, добры вечар,*
Стаіць святліца нова зрублена.
У той святліцы чатыры акенцы:
У першым акенцы — да яснае сонца,
У другім акенцы — да ясны месяц,
У трэцім акенцы — да дробныя звёзды,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

У чацвёртым акенцы — да цёмная хмара.
Яснае сонца — то жонка яго,
Ясны месяц — то сам гаспадар,
Што дробныя звёзды — то дзеткі яго,
Што цёмная хмара — жыта яго.
А з карэнечка — караністае,
А з саломінкі — сцебялістае,
А з каласочка — каласістае.
А дай жа, божа, пану гаспадару,
Ой жыці-быці, піва варыці,
Піва варыці, сыны жаніці,
Гарэлку гнаці, дочкі замуж даваці,
Шчодры вечар, добры вечар!

**Ой, рана, рана куры запелі...**

Ой, рана, рана куры запелі,
Каляда, куры запелі.
Ой, яшчэ раней Ганначка ўстала.
Каляда, Ганначка ўстала.
Ганначка ўстала, коску ўчасала,
Каляда, коску ўчасала;
Коску ўчасаўшы, павы пагнала,
Каляда, павы пагнала.
Павы жанучы, пер'е збірала,
Каляда, пер'е збірала;
Пер'е збірала, ў хвартушок клала,
Каляда, ў хвартушок клала.
З хвартушка брала, вяночак віла,
Каляда, вяночак віла.
Вяночак звіла, на Дунай пусціла,
Каляда, на Дунай пусціла:
— Хто вяночак пойме, той мяне возьме,
Каляда, той мяне возьме!
Ой, адазваўся малады Васілька,
Каляда, малады Васілька:
— Я вяночак пайму, я цябе вазьму,
Каляда, я цябе вазьму!
Як ступіў нагою — па пояс вадою,
Каляда, па пояс вадою;
Як ступіў другою — на дно галавою,
Каляда, на дно галавою.

### Ой, у лузе, у лузе, красна каліна...

Ой, у лузе, у лузе, красна каліна,
Святы вечар! *
А красней за таго Ганна ў таткі.
Маладая Ганначка па двару хадзіла,
Па двару хадзіла, увесь двор скрасіла.
У сенічкі вайшла, сенцы заззялі,
У хатачку вайшла, паны стаялі.
Паны стаялі, шапкі знімалі,
Шапкі знімалі, яе пыталі:
— Ці ты царэўна, ці ты каралеўна?
— Я Іванава дачка, да Ганначка.

### Стаяла бярозка тонкая, высокая...

Стаяла бярозка тонкая, высокая,
На той бярозцы кара залатая,
Выйшла, выбегла красна панна,
Да тую кару падбірала,
Да да злотнічка адымчала.
— Да мае мілы тры злотнічкі,
Да скуйце мне тры надобынькі:
Першая надобка — кован пояс,
А другая надобка — павін вяночак,
А трэцяя надобка — залаты персцень.
Кован пояс — то да пасагу,
Павін вяночак — то да вянчання,
А залаты персцень — то да мяняння.

### А ў лесе, лесе...

А ў лесе, лесе стаяла святланка арэхавая —
Святы вечар!**
А ў той святланцы дзеўка Алёнка,
Дзеўка Алёнка шыла шырынку.
Першую сшыла красненькім шоўкам,
Другую сшыла беленькім шоўкам,
А трэцюю сшыла чорненькім шоўкам.
Што белым шыла — татку аддала,

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

А красным шыла — мацеры дала,
А чорным шыла — то брату дала,
Золатам рубіла — то другу дала.
Святы вечар!

### Там за садамі трава-мурава...

Там за садамі трава-мурава,
Шчодры вячор, багаты вячор! *
На той мураве — бела бяроза,
На той бярозе — залаты росы.
Як узняліся буйныя ветры,
Абцерусілі залаты росы.
— Ідзі, Ганначка, пазбірай росы
І купі сабе трое надоб'е:
Перша надоб'е — медзяны кубак,
Друга надоб'е — срэбна талерка,
Трэце надоб'е — залаты персцень.
Медзяны кубак — к запіваннечку,
Срэбна талерка — к дараваннечку,
Залаты персцень — то к вянчаннечку.

### Узышло, узышло тры месяцы...

Узышло, узышло тры месяцы...
Гэй, каляда, каляда! **
Тры месяцы, ўсе тры ясны.
Было ў маткі тры сыночкі,
Паўставалі, паўмываліcь,
Паехалі аж на места.
А на месце тры таночкі,
Тры таночкі, усе дзявочкі:
Адзін любіць берасцянку,
Другі любіць кабрынянку,
Трэці любіць камяньчанку.

### Ой, пад лесам да пад высокім...

Ой, пад лесам да пад высокім,
Ой, там ходзіць стада коней,
Добры вечар, шчодры вечар! ***

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
*** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага двухрадкоўя.

А ў тым стадзе конь гаворыць:
«Ніхто мяне не паймае, не асядлае».
Адазваўся малады малойчык:
«Я й таго каня паймаю, я й асядлаю.
Ой, поеду ў чыста поле,
Выпалюю дзевяць лісаў,
Дзевяць лісаў, дзесятую кунку,
Да сваёй матачцы на шубку».
Як пачула гэта — загневалася
Ой, да яго міленькая.
«Ох, не гневайся, мая міла!
Ці ж ты мяне гадавала?
Гадавала мяне родна матанька:
Цёмнай ночы не даспаўшы,
Яснай свечы не тушыўшы,
Ачэпак з ножак не спушчаўшы».

### А рана, рана куры папелі...

А рана, рана куры папелі.
Святы вечар! *
А раней за таго Іванька ўстаў,
Па двару пахадзіў, званком пазваніў,
Званком пазваніў, хлопцаў пабудзіў:
— Уставайце, хлопцы, братцы, коней сядлайце,
Коней сядлайце, да й выязджайма
У чыстае поле на прагулянне,
Куню сачыці, дзеўку сватаці.
Да й высачылі куню ў дзераве,
Да й высваталі дзеўку ў цераме,
Няхай вам, братцы, куня ў дзераве,
А мне, маладому, дзеўка ў цераме.
Святы вечар!

### Зажурылася крутая гара...

Зажурылася крутая гара,
Святы вечар! **
Што ні ўрадзіла шоўкава трава,
Толькі ўрадзіў зялёны вінаград.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

— Хто таму вінаграду старожа будзе,
Малады Сцяпанка сцярог ночачку,
Сцярог ночачку, сцярог другую,
А на трэцяю крэпенька заснуў,
Прышоў к яму яго татачка,
— Вунь твае гарады туркі абляглі,
Вунь твая патрава пылам запала,
Вунь твая дзевачка между дзевак стала,
— Я ж тых турачак ды ні баюся,
Агнём выпалю, меччу высяку,
А сваю вячэру з перцам прыпраўлю,
А сваю панну паміж дзевак вазьму,
Святы вечар!

**Ды ехаў я, ехаў...**

Ды ехаў я, ехаў, каляда,*
Міма гай зялёны,
Міма сад вішнёвы,
Ды бачыў тут яблыньку —
Зеляненька цвіла
Ды белым цветам,
Ды шырокім лісцем.
Я ж яе не зачапаў,
За галінку не браў,
Ды чакаў я вясны
Ды цёплага лецечка,
Каб яна сазрэла
Ды мне, малойцу, паспела.
Ды ехаў я, ехаў
Міма цесця двара,
Да бачыў я дзеваньку,
Як кралечка прыбрана.
Я ж яе не зачапаў
І за ручку не браў,
Каб яна падрасла
Ды за мяне пайшла.

**Там за рэчкаю, там за быстраю...**

Там за рэчкаю, там за быстраю, каляда,
Там за быстраю, каляда!

Ой, там Іванька стружа стрэланькі, каляда,
Стружа стрэланькі, каляда!

Стружа, малюе, на Дунай пускае, каляда,
На Дунай пускае, каляда!

— Ляціце, стрэлкі, да маёй дзеўкі, каляда,
Да маёй дзеўкі, каляда!

* Прыпеў «каляда» паўтараецца пасля кожнага радка.

Няхай гатуе тонкі падаркі, каляда,
Тонкі падаркі, каляда!

Тонкі падаркі для маёй маткі, каляда,
Для маёй маткі, каляда!

Майму татулю — тонку кашулю, каляда,
Тонку кашулю, каляда.

Мне, маладому, з руты вяночак, каляда.
З руты вяночак, каляда!

### Пайшла каляда калядуючы...

Пайшла каляда калядуючы,
Эй, каляда! *
А за ёю дзеўкі шчадруючы.
Пайшла каляда ў адну хату,
А ў гэтай хаце куццю таўкуць.
Пайшла каляда ў другую хату,
А ў гэтай хаце серабро звініць.
Пайшла каляда ў трэцюю хату,
А ў трэцяй хаце сала шыпіць.
Пайшла каляда ў чацверту хату,
А ў гэтай хаце сала шыпіць.
Пайшла каляда ў пятую хату,
А ў пятай хаце золата блішчыць.
Пайшла каляда ў шостую хату,
А ў шостай хаце каўбасу пякуць.
Каўбасу пякуць да і нам дадуць
Хоць па маленечкаму кусочку,
Каб любілі хлопцы вашу дочку.

### Да мостам, мостам да вярбованькім...

Да мостам, мостам да вярбованькім,
Шчодры вечар, добры вечар! **
Ішла тудэма слічна паненка,
Несла мёд-віно ў туравым розе.
За ёю, за ёю панскі сыночак:
— Паждзжы, паждзжы, слічна паненка,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Дай мне мёд-віна пакаштаваці,
Віна пакаштаваці і цябе паймаці.
— Не тваё дзела, панскі сыночак,
Віно каштаваці і мяне паймаці.
Ты ж не бачыў сошкі-баронкі,
Хай табе за гэта — варона жонка.
Да мостам, мостам да вярбованькім
Ішла тудэма слічна паненка,
Несла мёд-віно ў туравым розе.
За ёю, за ёю пахарскі сыночак:
— Пажджы, пажджы, слічна паненка,
Дай мне мёд-віна пакаштаваці,
Віна каштаваці, цябе паймаці.
— То ж тваё дзела, пахарскі сыночак,
Віно каштаваці і мяне паймаці,
Ты і з коніка да не ссядаеш,
Буйна жыта да вырашчаеш.

### Ездзіў хлопец за рэчаньку...

Ездзіў хлопец за рэчаньку,
Эй, каляда,*
Найшоў хлапчына падаляначак.
Падаляначкі — тры паненачкі:
Адна паненка ўся ў золаце,
Другая паненка ўся ў серабры,
А трэцяя ўся ў ядвабе.
Вам, дзяўчаткі, песня спета,
Песня спета да супроць лета,
Каб вялікі раслі ды замуж пайшлі,
Бацьку, матку да вяселлем страслі.

### Ой, калядачкі, вярніцеся...

Ой, калядачкі, вярніцеся,
На нас, на дзевак, азірніцеся.
Мы ж вас, калядкі,
Дажыдаць будзем,
Мы ж вас, калядкі,
Шанаваць будзем.
Каб вас, калядак,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

4 Зак. 3328

Нядзель дзесятак,
А што ранейка —
То сняданнейка,
Што вячэранька —
Пагуляннейка.

### Го-го-го, каза...

Го-го-го, каза!
Го-го, шэрая!
Дзе рогі дзела?
— На соль праела;
Соль дарагая,
Мера скупая.
— Не дыбай, каза,
Крывыя ногі,
Не станавіся
Цераз дарогі:
Будзе ехаць пан —
Казу разаб'е!
На табе ляску
У залёты йці —
Папіраціся.
— Чорт цябе бяры
Із залётамі:
Ёсць у мяне конь
За варотамі,
У даліне каза
З казлянятамі,
За гарою воўк
З ваўчанятамі.
Як прыбег ваўчок,
За козку ды ўцёк,
А ваўчанята
За казлянята:
— Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе не бывае,
Там вылягае,
Дзе каза ступіць,
Там яно кусціць.

### Паварачывайся, казёл...

Паварачывайся, казёл,
На капыцікі,
На срэбраныя,
На ўсе крутыя.
Дзе казёл ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе прабягае,
Там вылягае.
Дзе казёл рогам,
Там жыта стогам,
Дзе казёл хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе казёл нагою,
Там жыта капою.
Да пашоў казёл
Па усіх старонах,
Да знашоў казёл
Караля ў зямлі
З каралíхаю,
З гаспадынькаю.
Да ты, гаспадынька,
Не будзь такая,
Як тая была барабаніха,
Барабаніла нашага казла,
Нашага казла не ўдарыла,
Толькі смех учыніла.
Скамароху —
Бочку гароху,
А скамарыцы —
Бочку пшаніцы.

За гэту свечачку
Пайдзі ў клетачку,
Да зірні ў бачок.
Дзе стаіць мачок,

Да зірні ў другі,
Дзе стаяць крупы,
Да зірні ў трэці,
Дзе вісяць лейцы.

**На новае лета...**

На новае лета
Радзі, божа, жыта.
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Жыта, пшаніцу,
Усяку пашніцу,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Дай табе, божа,
Пане гаспадару,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Піва варыці,
Сынкоў жаніці.
Шчодры вячор!
Багаты вячор!

Гарэліцу гнаці,
Дачок аддаваці,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Залезь на баляску
І дастань каўбаску,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Стань на драбінку
І дастань сланінку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

Кошычак маку
Да таго прысмаку,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!

**Наша масленка катліва...**

Наша масленка
катліва,
Штось катліва,
Люлі, катліва!

А мы масленку
пракацілі,
Пракацілі,
Люлі, пракацілі.

Сырам гору набівалі,
Набівалі,
Люлі, набівалі.

Паверх маслам
палівалі,
Палівалі,
Люлі, палівалі!

Нашы дзеванькі
гуллівы,
Штось гуллівы,
Люлі, гуллівы!

Нашы хлопцы
гарэзлівы,
Гарэзлівы,
Люлі, гарэзлівы!

Нашы маткі штось
бурчлівы,
Штось бурчлівы,
Ой, бурчлівы!

Нас да хаты з горкі
клічуць,
Дамоў клічуць,
Люлі, дамоў клічуць!

**У нас сягоння масленіца...**

У нас сягоння масленіца,
Прыляцела ластавіца,
Села-пала на жэрдачку,
Шчабятала вестачку.
Ластавіца песню спела,
Назад у поле паляцела.
Садзіцеся, хлопцы, вы на коні
Даганяйце ў чыстым полі!
Папытайце ў ластавіцы,
Што дзеецца ў Прудзішчы,
А ў Прудзішчы дзеецца
Дзевяць хлопцаў жэніцца,
Адна дзеўка замуж ідзець,
У карагодзе дзевак вядзець.

**Наша масленіца гадавая...**

Наша масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешаю к нам не ходзіць —
Усё на коніках раз'язджае.
Штобы конікі былі вараныя,
Штобы слугі былі маладыя.

**У нас маслены дзень...**

У нас маслены дзень,
На гары бабы сядзелі,
Кулаком зямлю пабілі,
Аб нявестках судзілі.
Адна нявестка шэльма была:
Клецъ запаліла, ўпроч пайшла.
А як там багацця згарэла:
Жалудова бочка віна было,
Арэхава міса масла было.

### Мы на горушцы пабывалі, пабывалі...

Мы на горушцы пабывалі, пабывалі,
Ай-люлі, пабывалі!
Маслянку сустракалі, сустракалі,
Ай-люлі, сустракалі!
Сырам гару набівалі, набівалі,
Маслам гару палівалі, палівалі,
Наша горушка катліва, ай катліва,
Свякровушка варкатліва, варкатліва:
Яна на нас варчала, ай варчала,
На горушку не пушчала, не пушчала!
А нам дамоў не хаціцца, не хаціцца,
А хаціцца пракаціцца, пракаціцца!
Мы думалі — масленкі сем нядзелек, сем нядзелек,
Ажно масленкі сем дзянёчкаў, сем дзянёчкаў!
Нас масленка абманіла, абманіла:
На сем нядзель паста пасадзіла, пасадзіла,
На белую капусту, капусту,
На горкую рэдзьку, на рэдзьку,
Ай-люлі, на рэдзьку.

## ВЕСНАВЫЯ ПЕСНІ

### Благаславі, божа мілы, зіму замыкаці...

Благаславі, божа мілы, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну аклікаці.
Зімою ў вазочку, вясною ў чаўночку,
У цёплым леце ў карэце.
Благаславі, божа, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну загукаці.

Дай, божа, на жытачка род,
На статачак плод,
Людзям на здароўе.

Вясна, вясна, вясна красна!
Што нам прынесла?
— З каробку жыта вытрасла,
З лукошак гарошак,
А з драбеяк канапеляк.

## Зіма з летам сустракаецца...

Зіма з летам сустракаецца,
Пра здаровейка пытаецца:
— Ой, чалом, чалом, да цёплае лецейка,
— Ой, здарова была, да халодная зімачка:
— Што цябе, лецейка, узвелічаюць,
Мяне, зімачку, праклінаюць?
— Бо ты, зімачка, халодная,
Лугі, балоты памарозіла,
Ой я, лецячка, да вясёлае,
Лугі, горы ізмачыла,
Лугі, горы ўзвесяліла,
Ой, там хлопчыкі сабіраюцца,
Да на мёд, віно складаюцца;
Ой ты, Іваначка, кладзі больш за ўсіх,
Твая Ганачка лепш за ўсіх.

## Прыдзі, прыдзі, вясна...

Прыдзі, прыдзі, вясна,
Прыдзі, прыдзі, красна
К нам у таночак.
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.

Едзіць вясна, едзіць
На залатым кані
У зялёным сяяні,
На сасе седзячы,
Сыру зямлю аручы,
Правай рукой сеючы,
А смыком скародзячы.
Вязець, вязець вясна,
Вязець, вязець красна
Ясныя дзянёчкі,
Чыстыя дажджочкі,
Зялёныя травы,
Красныя цвяточкі
Нам на вяночкі.

**Благаславі, божа...**

Благаславі, божа,
Вясну красну пецї
На цїхае лета,
На буйнае жыта.



*Ф. Рушчыц.* Зямля

Каб наша жыта
У трубы павілося,
У трубы павілося,
Набок схілілося.
На полі снапамі,
А ў гумне тарпамі,
На таку ўмалотна,
У арудзе прысыпна,
А ў млыне прымолна,
А ў дзяжы падходна,
А ў пячы пячыста,
А на стале краіста.
Сям'і на здароўе,
Панам — безгалоўя!

### Ты, пчолка ярая...

Ты, пчолка ярая,
Ты вылецьь з-за мора,
Ты вынесі ключыкі,
Ключыкі залатыя,
Адамкні лецечка
Лета цёплае,
Замкні зіманьку,
Зіму сцюдзёную!

### Жаваранак, ранняя птушэчка...

Жаваранак, ранняя птушэчка,
Чаго так рана з выр'ю вылятаеш?
А там пры даліне —
там ляжаць крыгі,
А там пры дарозе —
снягі і марозы.
— А я тыя крыгі крыламі разаб'ю,
А я тыя марозы нагамі растапчу.

### Вясна красна, вясна красна наступае...

Вясна красна, вясна красна наступае,
Вадой лугі, вадой лугі залівае,
Што ні прайсці, што ні прайсці, ні праехаць,
Свайго роду, свайго роду не праведаць,
Ой, вясною, ой, вясною — за вадою,
А ў лецячку, а ў лецячку — за жнівамі,
А зімою, а зімою — за снягамі.
— Дзіця ж маё, дзіця ж маё маладое,
Ты вясною, ты вясною — на чаўночку,
Ты ў лецячку, ты ў лецячку — у нядзелечку,
А зімою, а зімою — ў палазочку —
Такі ж роду, такі ж роду пераведай.

### Вясна красна, што ты нам прынясла?..

Вясна красна, што ты нам прынясла?
— Я вясна красна вам прынясла
Бохан хлеба, ступу солі.
Старым бабкам на прызбачцы,

Малым дзеткам на вулічцы,
А хлопчыкам па кіёчку,
А дзеўчаткам па вяночку,
Малодачкам па красёнцах.

### Шуміць-гудзе, вясна ідзе...

Шуміць-гудзе, вясна ідзе...
Шчасце й радасць людзям нясе.
У небе песня зазвінела,
Лясы, палі абудзіла.
Пралесачкі зацвіцелі
І птушачкі прыляцелі.
Вол бушуе — вясну чуе,
Дзеўка плача — замуж хоча.
Досыць волік бушаваці,
Яшчэ ў полі наарэшся.
Досыць, дзевачка, плакаці,
Пойдзеш замуж — нажывешся.

### Ой, вясна, вясна, што ты прынясла...

Ой, вясна, вясна, што ты прынясла,
што ты й прынясла?
А я прынясла цёпла лецечка,
дый цёпла лецечка.
Старым бабачкам пасядзеці,
дый пасядзеці,
А маладзічкам кросенцы ткаці,
дый кросенцы ткаці,
А дзевачкам цэўкі сукаці,
дый цэўкі сукаці.

### Ой, прышла вясна красна...

Ой, прышла вясна красна,
Чужыя малодкі ткуць кросна.
А я, маладзенька, не прала,
Пад лёд кудзелькі пускала.
— Плывіце, кудзелькі, валакном,
Ка мне маладзенькай палатном!
Да ўсе дзевачкі смяюцца,
Як тыя кудзелькі прадуцца.

Да ўсе людзячкі дзівяцца,
Чые то кудзелькі беляцца.
Да гэта ж тае гультайкі,
Да што стаяла ля пелькі.

**Ой, вясна мая вясёлая...**

Ой, вясна мая вясёлая,
Развесяліла ўсе горачкі,
Усе горачкі, усе горачкі-далiначкі,
Даліначкі, дзе парабачкі збіраліся,
Збіраліся, на мёд-гарэлачку складаліся,
Складаліся, аб памосце пану змаўляліся.

**Вол бушуе...**

Вол бушуе — вясну чуе, *
Воран крача — сыра хоча,

Воран крача — сыра хоча,
Дзеўка плача — сына хоча.

Воран крача, падлятае,
Дзеўка сына спавівае.

Воран крача — сыр бяленькі,
Дзеўка плача — сын маленькі.

Воран крача, сыра з'еўшы,
Дзеўка плача, сына меўшы.

Воран крача на галіне,
Дзеўка плача на магіле.

**Да вясна красна...**

Да вясна красна,
Дзе ты была?
Да што ты нам прынясла?
Прынесла хлопцам па лясачцы,
А малым дзецям па кружочку,
Малоданькам па чэпчыку,
А дзевачкам па кветачцы.
Каб хлопчыкі ў войска пайшлі,
А малыя дзеткі хутка раслі,
Малоданькі ўбраны былі,
Красны дзеўкі замуж пайшлі.

**Вясна красна...**

Вясна красна,
Што ж ты нам прынясла?
З пунькі сянцо
Вынесла, вынесла.
З току саломку
Вытрасла, вытрасла.
З клеці зярно
Вымела, вымела.
На гары бабкі
Сядзелі, сядзелі,
Кулаком зямлю
Калацілі, калацілі.

---

* Кожны першы радок страфы паўтараецца два разы.

Да нявехначак
Судзілі, судзілі.
— Ой, мая ж нявехна
Дурмі-дурак, дурмі-дурак,
Зімку прала,
Усё спала, усё спала.
Кросна ткала —
Драмала, драмала.
Вось мая дачушка
Разумна, разумна,—
Зімку прала,—
Не спала, не спала,
Кросна ткала,—
Ляшчала, ляшчала.

### Рынулі рэкі...

Рынулі рэкі, рынулі
Аж да Ганначкі пад сені.
Там збіраліся малойцы,
Складалі грошы на танцы.
Адзін маладзец найбольш клаў,
Сабе дзяўчыну намаўляў:
— Ідзі, дзеванька, за мяне,
Будзеш маёю жаною,
Будзеш маёю жаною,
Маёй маценькі слугою,
Будзеш маценькі служачка,
Мне, маладому, жоначка.

### Хадзіла паванька...

Хадзіла паванька
Па высокай гарэ, *
Губляла пер'ечка
Па шаўковай траве.
Хадзіла Алеська
Пер'ечка збіраці,
Пер'ечка збірала,
У падушачкі клала.
Падушкі пуховы,
Хто на іх спаць
будзе?
Пан із паненкаю,
Месяц із зоркаю,
Месяц із зоркаю,
Йванька з Алеськаю.

### Стаптана трава зеляная...

Стаптана трава зеляная,
Хто ж тую траву стаптаў?
Стаптаў траву дзяцінача,
Стаптаў траву маладзенькі.
Й ён да дзевачкі хадзіў,
Перапёлачак лавіў,
Не ўлавіў карасьцелькі,
А ўлавіў дзяўчоначку
Да й за правую ручачку.
За залаты персцянёчак,
За шаўковы паясочак.

* Кожны другі радок паўтараецца два разы.

**А ляцела сойка цераз чыста поле...**

А ляцела сойка цераз чыста поле,
Вясна красна, дзень цёплы! *
Ды яна схапіла Іванаву жонку.
А бяжыць жа хлопчык, шапку зняўшы.
Шапку зняўшы, галаву задраўшы.
— Сойка, сойка, аддай маю жонку.
Мая жонка тонкая пралля.
Тонкая пралля, звонкая ткалля.
Тонка прала, беленька бяліла,
Кашулечкі шыла і мяне любіла.

**Зязуля куе, лецячка чуе...**

Зязуля куе, лецячка чуе —
Ой, рана-рана, лецячка чуе.
Марыся плача, замуж не хоча —
Ой, рана-рана, замуж не хоча.
Яе матанька цешыць, не ўцешыць —
Ой, рана-рана, цешыць не ўцешыць.
Не плач, дзіцятка, маё радненька —
Ой, рана-рана, маё радненька.
Не аддам я цябе, далёка ад сябе —
Ой, рана-рана, далёка ад сябе.
Аддам блізенька, праз поле вузенька —
Ой, рана-рана, праз поле вузенька.
Будзеш хадзіці, што дзянёк да мяне —
Ой, рана-рана, што дзянёк да мяне.
Будзеш часаці русу косу ў мяне —
Ой, рана-рана, русу косу ў мяне.

**Зайдзі, зайдзі, зоранька вячэрняя...**

Зайдзі, зайдзі, зоранька вячэрняя...
Выйдзі, выйдзі, дзевачка бяздольная!
Ой, знаці, знаці, што ў каго свая маці,—
То штодзень ідуць на вуланьку гуляці!
Ой, знаці, знаці, што ў каго чужая маці,—
Не пушчае на вуланьку гуляці.

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

### Да зязюля куе...

Да зязюля куе,
Што дзяцей не мае.
Салавей шчабеча.
Дружыну збірае.
«Ці ты, салавейка,
Ці ты любіш лозу,
Ці ты любіш лозу
Ці белу бярозу?»
— Я не люблю лозу
Ні белу бярозу:
Як сяду высока,
То чутно далёка,
Як сяду нізенька,
То чутно блізенька.

### Была ў маткі...

Была ў маткі,
Была ў маткі адна дачка.
Адсюль, адтуль,
Адсюль, адтуль сваты слалі.
Матка дачкі,
Матка дачкі не давала.
Сабе служку,
Сабе служку гадавала.
Прыйшла й вясна,
Прыйшла й вясна — дачку ўзяла.
Гарэлачкі,
Гарэлачкі не насіла.
Дачкі ў маткі,
Дачкі ў маткі не прасіла.
«Дзіця ж мае маладое,
Дзе мне дары,
Дзе мне дары падзяваці?
Ці мне дубы,
Ці мне дубы абвязаці?
Што й дубочак,
Што й дубочак — то й сваточак.
Што й бярозка,
Што й бярозка — то й сватачка.
Што грушачка,
Што грушачка — то й дружачка».

### Зязюлечка баравая...

— Зязюлечка баравая,
Дзе ж ты ночку начавала?
Зязюлечка баравая,
Дзе ж ты ночку начавала?
— Адну ночку — на дубочку,
А другую — на бярозе,
А другую — на бярозе.
А там ішлі скамарохі,
А там ішлі скамарохі.
Адрэзалі па пруточку,
Адрэзалі па пруточку,
Дый зрабілі павучочка,
Дый зрабілі павучочка.
Павучочак, не гудзі ж ты,
Павучочак, не гудзі ж ты.
Шэрай зязюлькі не будзі ж ты,
Шэрай зязюлькі не будзі ж ты.

### Сярод Дуная дзевачка сядзіць...

Сярод Дуная дзевачка сядзіць,
Дзевачка сядзіць, красачкі рве,
Красачкі рве, вяночкі ўе.
Адзін савіла — на бярозу ўшчапіла,
Другі савіла — на галовачку,
Трэці савіла — у Дунай пусціла.
А там жа ехаў удалы маладзец,
Удалы маладзец жаніцца.
Прывязаў каня к белай бярозе,
К белай бярозе, к бітай дарозе.
«Удалы маладзец, падай мне вянец».
Удалы маладзец палез па вянец.
Ступіў жа раз — па пояс увяз,
А другі ступіў — і сам паплыў.
«Бяжы ж ты, кося, бітай дарогай,
К таму сялу, к татульку майму.
Выйдзе з хаты родная маці,
Цябе рассядлае і спытае:
«Скажы, канёк, дзе мой сынок?»
Не кажы, кося, што я ўтапіўся,
А кажы, кося, што я жаніўся:

Мае дружкі — круты беражкі,
Мая сваціца — рыба-плаціца.
Мая жонка — глыбока вада —
Маёй матульцы да веку бяда».

### Бяжыць рэчка ад мельнічка — ой, рана!..

Бяжыць рэчка ад мельнічка — ой, рана! *
А другая ад Дуная, ой, рана!
На той рэчцы човен плыве, ой, рана!
Бел-маладзец красны Стасенька, ой, рана!
Стружа стрэлкі з калінаньکі, ой, рана!
Што прасцейшы, ў човен кладзе, ой, рана!
Што крывейшы, на Дунай мяце, ой, рана!
Плыньце, стрэлкі, да мае дзеўкі, ой, рана!
Мая дзеўка крывічанка, ой, рана!
Мая дзеўка Касюленка, ой, рана!
Няхай прадзе на падаркі, ой, рана!
Няхай прадзе ценюсенька, ой, рана!
Няхай беліць белюсенька, ой, рана!

### Ой, там па моры па сіняму...

Ой, там па моры па сіняму
Ніцыя лозы хіляліся, хіляліся,
Ой, там два браткі змаўляліся,
Ой, адзін братка каня сядлае,
А другі братка навучае:
Не бяры, братка, багатую,
Да вазьмі, братка, убогую,
Ой, багатая пышна ходзіць.
А ўбогая дзела робіць.
Пачула тое багатая,
Узяла баршэнне ў ахапак.
Падаркі ж мае таненькія,
Рушнічкі ж мае бяленькія,
Ці мне вамі горы высцілаці,
Ці мне дуброве даравацi,
Не хочуць людзі мяне браці.

* Кожны радок паўтараецца два разы.

## На первы дзень, на вялікдзень...

На первы дзень, на вялікдзень,
Зялён явар, зялёны.*
Валачобнікі сабіраліся.
Сабіраліся, рахаваліся:
«А куды пойдзем, а куды зайдзем?»
— Пойдзем, пойдзем ўсё дарогаю,
Усё дарогаю, усё шырокаю.
Зайдзем, зайдзем к пану Івану.
«А ці дома, дома пане Іване?»
— Хоць жа ён дома — не акажыцца:
У новай каморы прыбіраецца,
Адзяе майтачкі гарнатовыя,
Адзяе боцікі ўсё казловыя,
Адзяе шубачку сабалёвую,
Адзяе шапачку ўсё бабровую,
Выводзіць каня вараненькага,
А кладзе сядло залаценькае.
Садзіцца, едзе ў роўнае поле,
У роўнае поле ды к сваймў жыту.
А яго жыта ядраністае,
Ядраністае, каласістае.
К адной мяжы нахілілася,
Свайму гаспадару пакланілася.
Песенька спета напроці лета,
А будзь жа весел, як вясна красна,
А будзь жа ціхі, як ціха лета,
А будзь жа багаты, як багата восень.
А ты, гаспадынька, усё дагадайся:
Скавародку — ў печ, па яечкі — ў клець,
Кусок сала пакрышыці,
А калбаскаю абгарадзіці,
Кварту гарэлкі і сыр на талеркі,
Зялён явар, зялёны.

## Вялічка ідзець — нечага надзець...

Вялічка ідзець — нечага надзець,
Зелена траўка-мураўка.**
Ні сарочкі, ні спаднічачкі.
Ляціць сініца — будзіць спадніца,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ляціць журоўка — будзіць шнуроўка,
Ляціць журавок — будзіць паясок,
Сядзіць буравік, ш'ець чаравік.

**Добры вечар, пане гаспадару...**

Добры вечар, пане гаспадару!
Вясна красна на ўвесь свет.*
Прыйшлі мы да пана як да багача,
Хочам пана да й павітаць,
Яго панскае здароўе спытаць:
Ці здароў пан, ці вясёл пан?
Ці здарова панская жонка?
Ці здаровы панскія дзеткі?
Панская жонка будзе падвышона,
Панскія дзеткі — як у садзе кветкі.
А панскі двор, як у вянку.
На панскім ганку крэслы стаяць,
На тых крэслах сам бог сядзіць.
«Увайдзі, божа, у панскія пакоі».
— Я не пайду ў панскія пакоі,
Але пайду ў роўнае поле,
У роўнае поле па мяжах хадзіці,
Па мяжах хадзіці — жыта радзіці.
А ўсіх жыта харашусенька —
Нашага пана ўсё найлепшае,
Найлепшае, ядрынейшае.
Яно сцяблом сцяблыністае,
А коранем караністае
І коласам каласістае,
Яно пад гару пахіліўшыся.
Як пан араў — валы бушавалі,
Як пан баранаваў — konікі іржалі.
Жнуць яго жнейкі маладзенькія,
Іх сярпочкі залаценькія.
Яны самі, як ластаўкі,
Іх галоўкі, як макаўкі.
Як яны жалі — сярпы зажалі,
Як яны селі — сярпы зазвінелі,
Як яны сталі — сярпы заззялі.
Часты, густы зоры на небе —
Часцей, гусцей снапы ў полі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Як на небе высок месяц —
Так за імі вышэй копы.
Як пан звозіў ды сваё жытцо
У цёмныя гумны да з светлага поля,
Яно ў тарпе прылежыста,
А на таку прымалоціста,
А ў арудзі прысыпіста,
А ў млыне прымеліста,
А ў дзяжы падыходзіста,
А ў печы румяніста.
А на стале, як сыр белы.
Сыр бяленькі — для коласа,
Кварту гарэлкі — для голаса.
Мы свае боты патапталі,
Пакуль пана апыталі.

**Ішлі, прайшлі валачобныя...**

Ішлі, прайшлі валачобныя,
Зялён явар, зялёны. *
Іграючы, спяваючы,
Багатага двара шукаючы.
Па чым пазнаць ды багаты двор,
Багаты двор — жалезны тын?
А вароцікі ды часовыя,
Падваротнічка — рыб'я костачка.
А лясь, пабразь у вакеначка:
Ці не пачуе нас пан гаспадар?
Ці не возьме залатыя ключы?
Ці не адамкне залатыя замкі?
Ці не пусце гасцей на двор?
На двор іду, лістамі сцялю,
Пад акном іду — чалом даю,
Чалом даю, пане гаспадар,
Ці спіш, ці ляжыш, ці не акажашся?
Ці да цэркаўкі сабіраешся?
А калі спіш, бог з табою,
А калі не спіш, гавары са мною.
Адчыні вакно высокае,
Паглядзі ў гумно далёкае,
Што ў тваім гумне за праява стала.
За праява стала, праявілася:

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Там цэркаўка станавілася.
У той цэркаўцы прыстол стаіць,
Каля прыстола залатое крэсла.
На тым крэсле сам бог сядзіць,
Пяро дзяржыць, святкі піша,
Катораму напярод пайсці.
Святое раждзество напярод пайшло,
Новы гадок — за ім у слядок.
Святы крашчэннік ваду пасвянцае,
Святыя грамніцы свечы сучаць,
Святая масленіца бліны пячэ,
Святое благавешчанне заворвае,
Чысты чацвер ячмень сее.
Святое вялічка — з красным яечкам,
З красным яечкам, з цёплым лецечкам.
На первы дзень пірагі маеш,
А на сярэднім дні пагуляеш.
Святы Юрый — божы пасол,
Божы пасол за мора пайшоў.
Адтуль ідучы, узяў ключы,
Узяў ключы залатыя,
Адмыкнуў зямлю сырэнькую,
Пусціў расу цяпленькую.
Пусціў расу на ўсю вясну,
На ўсю вясну, на ўсё лецечка,
На ўсё лецечка, на ўсё цёплае.
Святы Мікола па межах ходзя,
Па межах ходзя і ўсё родзя,
І траву расціць, і скоць пасціць.
Святое ўшэсце жыта раўнуе,
Святая тройца — жыта красуе,
Святая дзевятка — у жыце пятка,
Святы Пятро — у жыце ядро.
Святая Ільля жыта зажынае —
З белым сырам, з малым сынам.
Ільёва жана — добрая жняя:
Што раз разне — то і сноп нажне.
Сноп ад снапа — паўтара ступня,
Капа ад капы — толькі дзве ступні.
Дай жа божа, каб было спорна:
На таку ўмалотам, а ў млыну намолам,
А ў дзяжы падходам, а ў печы ростам,
А на стале сыццю — к добраму жыццю!
Гаспадарочак, мой паночак,

Вазьмі сітца, насып жытца,
Дзяржы роўна, насып поўна.
Не будзем клясці, што цяжка нясці,
А будзем хваліць, што ўмееш дарыць:
Запявальнічку — капу яечак,
Памагальнічку — дзесятачак,
А механошу — жыта калошу.
А музыкі — горкая доля;
А што даюць — бяры і тое:
Кварту гарэлкі, сыр на талерцы.
А мы госцейкі нехажалыя,
Нехажалыя, небывалыя.
Мы не часта дакучаем;
А ў гадочку па разочку.
Дзякуй табе, пане, за добрыя дары.
Каб дажыць да лета ды лепей за гэта,
Каб вы добра жылі і лепей нас дарылі.
Зялён явар, зялёны.

**Ідуць, гудуць валачоўнічкі...**

Ідуць, гудуць валачоўнічкі...
Віном, віном зялёным! *
Спяваючы, гукаючы,
Слаўнага сяла пытаючы,
Вялікага двара Гаўрылава.
Чы ў дому-дому, пане гаспадару?
Хоць і ў даму — не акажацца,
Сядзіць на куце — абуваецца.
Надзяе боты казловыя,
Кладзе шапку бабровую.
Надзяе шубу мядзведжую,
Сядлае каня ворана,
Едзе ў поле жыта глядзець.
Спатыкае яго Юр'я з Міколай:
— Не едзь, пане гаспадару,
Тваё жыта даўно агледжана,
Пры дарозе ўдалося,
За гарою ў трубы павілося.
А ў даліне жнейкі жалі,
Жнейкі жалі маладзенькі,
Іх сярпочкі залаценькі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Чысты, густы зоры на небе,—
Часцей-гусцей на зямлі копы.
Шырок, вялік месяц на небе,
Шырай таго гумно яго.
Дай жа божа, пану гаспадару,
Жыці-быці, жыта вазіці,
Жыта вазіці, у тарпу зкладжыці,
У торпах укладна,
На таку ўмалотна,
В арудзе прысыпна;
В арудзе прысыпна,
У печы прысушна,
У печы прысушна,
У млыне прымолна;
У млыне прымолна,
У дзяжы падыходна,
У печы румяна,
У печы румяна,
На стале сытна,
На стале сытна,
У сям'і спірна!
Песня спета
Процi лета.
Не кажы барыць,
А кажы дарыць:
Сыр на талерку,
Будзем піць гарэлку!
Чарка гарэлкі дзеля голасу.
Пірог пшонны на закуску,
Чарка гарэлкі дзеля голасу,
Пірог пшонны дзеля коласу.
Обад вісіць — калясо будзе!
Песня спета проці лета,
Проці лета, проці цёплага.

**Ідзём, пайдзём у слаўны дом...**

Ідзём, пайдзём у слаўны дом,
Хрыстос сын божы, Хрыстос ўваскрос! *
Спяем песню сяму-таму,
Пану гаспадару, слаўну мужу, із жаною маладою.
Пане гаспадару, устань рана, мыйся бела,

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

Сядзь пад вакном на ўсход сонца,
Глянь на двор, што дзеецца, ялееецца.
Ды на двары шацёр стаіць навюсенькі,
А ў тым шатры прыстол стаіць,
Ля прыстолу крэсла стаіць,
А ў тым крэсле сам бог сядзіць,
Каля бога ўсе святыя шахуюцца, рахуюцца —
Катораму святцу ўпярод ступіць?
Ясен Красен упярод пайшоў,
Пасля таго святы Казімір
Дровы сякець і ў клад кладзець,
Святое Благавешчанне — жытцо рушыць,
Хоць пад сняжком — з божым душком,
Святая Вербніца — вярбу ломюць,
У касцёл нясуць, пасвянцаюць;
Чысты чацверг — ачышчаець,
Святы Вялікдзень — разгаўляюцца
З чырвоным яйкам, з белым сырам, з малым сынам.
Святая Праводня — дай жа божа, мае дзеткі,
Гэта святца праваджаці і другога дачакаці!
Святая Радаўніца — садоўніца,
Сады садзюць, паліваюць
Святы Юры — ключнік божы,
Асядлаў каня варанога, а сядзельца залатое,
Узяў ключы залатыя, паехаў ў поле,
Адамкнуў зямлю, пусціў расу мядовую,
Расу мядовую, а травіцу шаўковую.
Святы Мікола — з сяўбой у поле,
Святы Барыс — збожжа павыш,
Святы Шоснік — колас точыць, выплываць хочыць,
Святая тройца — у лес ідуць,
Май ламаюць, май устаўляюць,
Святы дзевятнік — па межах ходзіць,
Зёлкі ірвець, вянкі віець,
Святы дзесятнік — у жыце пятка,
Святы Іван — і вам, і нам,
Святы Пятро — у жыце ядро,
Святы Ілля — стара жняя,
Што раз махнець, снапок нажнець,
Што снапочак, то бабачка, што бабачка, то копачка;
Свята Прачыста — у полі ўрачыста,
Святы Змітры — за ўсіх хітры,
Піва варыць, жану поіць,
Сыноў жэніць, дачок выдаець, пасаг даець:

А сыночку па канёчку, а дачушцы — па кароўцы;
Святы Пакроў — з поля дамоў,
Зямлю лёдам пакрываець,
Пчолку — мёдам, дзеўку — вянком, бабу — чапцом.
Пане гаспадару, масці кладку, заві ў хатку!
Гэты госці не часта ходзюць.
Мала просюць — раз у гадок;
Пачынальніку — чырвоны злоты ды на боты,
А маім братом — хоць па дзесятку.
Хрыстос, сыне божы, Хрыстос ўваскрос!

### Дзень добры табе, пане гаспадару!..

Дзень добры табе, пане гаспадару!
Хрыстос васкрос сын божы! *
Да чэраз поле, шырокае поле,
Да чэраз межы залаценькія
Ішлі, цяклі валачэбнікі,
Да пыталіся слаўнага пана,
Слаўнага пана, пана гаспадара.
А чым жа ён уславіўся?
І дабром сваім, і дваром сваім.
Памятаюць двары ўсё павім пяром,
Усё павім пяром, залатым крылом.
Стаўляе сталы ўсё цясовыя.
Засцілае сталы ўсё кітайкаю,
Усё кітайкаю, усё зялёнаю,
Стаўляе кубкі ўсё сярэбраныя,
Налівае кубкі зялёным вінам,
Зялёным вінам, чорным півам,
Чорным півам, да салодкім мёдам.
Зялёнае віно пану гаспадару,
Чорнае піва для жаны яго,
Салодак мядок для яго дзяток.
Дай табе божа, пане гаспадару,
Да піва варыці, да сына жаніці,
Гарэлачку гнаці, дочкі аддаваці.
Дай табе божа, пане гаспадару,
І ў каморы, і ў аборы,
А гдзе гара, там жыта капа,
А гдзе толькі лог, там сена стог.
Пане гаспадару! Не кажы так ісці,

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Не кажы так ісці, кажы надарыці;
Да дары нашы не вялікія;
Валачобнічкі не дакучнічкі;
Да ў год ходзюць, да бога просюць.
Начынальніку па дзесятнічку,
Старшаму спяўцу да капу яец.
А механошу да пірог к носу.

### Ішлі-бралі валачобнікі...

Ішлі-бралі валачобнікі,
Хрыстос васкрос, сын божы! *
А шаталіся, а бадзяліся,
К чыйму двару прытапталіся?
А к таму двару к Купрэяву.
— А ці дома, дома сам пан гаспадар?
А хоць ён і дома, ды не кажацца,
Ён не кажацца, прыбіраецца.
Надзеваіць сукну атласоваю,
Надзеваіць боты казловыя,
Надзеваіць шапку сабалёвую,
Надзеваіць пояс, як жар гарыць.
А й садзіцца ён за цясовы стол,
За цясовенькі, да за новенькі.
Да й стаяць жа за ім [тры хлопчыкі],
Тры хлопчыкі, тры малойчыкі,
Дзержаць жа яны па кубачку,
Па кубачку, па серабранаму.
У первым кубку зеляна віно,
У другім кубку салодкі мядок,
У трэцім кубку пшоннае піва.
А й каму ж піць тое зеляна віно?
— Пану гаспадару, пану ласкаваму!
Салодкі мёд — то яго жане,
Пшоннае піва — то дзяцём яго!
Не кажыце ж таміць, прыкажыце дарыць!
Нашы дары не вялікія:
Пачынальніку чырвон залатэй,
Прыпявальнічкам па дзесятку яец.
Скамарохава горкая доля:
Чарка гарэлкі, сыр на тарэлкі.
Чарка гарэлкі ля смеласці,
Сыр на тарэлкі ля крэпасці!

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

## У нядзельку ранюсенька...

У нядзельку ранюсенька
Да віно ж, віно зялёнае.*
Узышло сонца яснюсенька,
Асвяціла лясы-бары,
Лясы-бары, роўнае поле,
Роўнае поле, жыта ядраное,
У коласе, як у золаце,
У корані, як у чыстым срэбры.
Пане гаспадару, выпраў жану,
Выпраў жану жыта жаці,
Із сярпочкам залаценькім,
Із сыночкам маладзенькім.
Разок чыкне — снапок нажне,
Ступень пражне, капу нажне.
Пане гаспадару, твае копы,
Твае копы незлічоныя.

## Добры вечар, пане гаспадару...

Добры вечар, пане гаспадару,
А ці ў дому пане гаспадару?
Хоць і ў дому, не акажацца,
У каморы адзяваецца.
Кладзе порткі сігналёвы,
Абувае боты шаўровыя,
Кладзе шубу мядзвежую,
Вядзе каня варанога,
Кладзе сядло залатое,
Едзе ў поле жыта аглядаць.
Спатыкае Юр'я ў варотах:
— Куды едзеш, пане гаспадару?
— Еду ў поле жыта аглядаці.
— Хоць едзь, хоць не едзь,
Хоць вярніся,
Тваё жыта аб'язджона,
Аб'язджона, агляджона,
Тваё жыта пара жаці,
Там жнуць жнейкі маладыя,
Ў іх сярпочкі залатыя.
Серп залoжа, сноп палoжа,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Шаг падбавя, копы ставя,
Копы ліча, гаспадара кліча.
Дай жа божа, пане гаспадару,
На полі капамі,
У лугах тарпамі,
На таку ўмалотам
У кішэні злотам.

### А з-пад лесу, лесу цёмнага...

А з-пад лесу, лесу цёмнага
Выхадзіла хмара чорная.
Ніхто тыя хмары не ўгадае.
Абабраўся чэсны мужа:
Я ж гэту хмару і ўгадаю,
Я ўгадаю, я спазнаю.
Гэта хмара пчаліная маці!
На чый жа двор яна паверне?
Павярнула яна к чэснаму мужу,
К чэснаму мужу, пану Івану.
Садзіцеся, пчолкі, ўсе на дубіку,—
То на дубіку не памесціліся!
Садзіцеся, пчолкі, ўсе на вуллейку,
На вуллейку, па сасоннічку!
Па дубіку мяды густыя,
Па сасоннічкуваскі чыстыя.
Мяды варыць — то сыноў жаніць.
Васкі варыць — свечы сукаць...

### Добры вечар таму...

Добры вечар таму,
Хто ў гэтым даму!
Ці спіш, ці ляжыш,—
Гавары з намі,
З намі гавары,
З добрымі людзьмі!
Ой, выдзі на двор,
Зірні ў шчыры бор,
Што ў шчырым бару
Шуміць да гудзіць,
Раёчак ляціць,
Ройна матка йдзець,
Раёчкі вядзець.
Ой, вядзе, вядзе
Дай навучае:
— Садзіцесь, райкі,
У старыя ўлькі,
А я старэнька
У новенькім сяду!
Із вас, маладых,
Салодкі мяды,
І з мяне, старой,
Жоўтыя васкі.
Салодкі мяды —

Сыту саладзіці,
Жоўтыя васкі —
Свечкі сукаці,
Сыту сыціці —
Сына жаніці,
А свечку сукаць —
Дачку аддаваць.

**Дай на вялікдзень, дай на першы дзень...**

Дай на вялікдзень, дай на першы дзень
Дай віно ж віно зеляно!
Да ўсе святкі да гуляць пашлі,
Да ўсе святкі да гуляць пашлі.
Дай віно ж віно зеляно!
Адно адзін Юры да гуляць не йшоў,
Адно адзін Юры да гуляць не йшоў.
Да віно ж віно зеляно!
Дай на яго матка зажурылася,
Дай на яго матка зажурылася.
Да віно ж віно зеляно!
Не журыся, матка, не сварыся, родна,
Не журыся, матка, не сварыся, родна.
Да віно ж віно зеляно.
Я па мяжы хадзіў да жыцечка радзіў,
Я па мяжы хадзіў да жыцечка радзіў.
Да віно ж віно зеляно!
Чыё, сынку, жыта дай найлепшае,
Чыё, сынку, жыта дай найлепшае?
Да віно ж віно зеляно!
Пана Лукаяна дай найлепшае жыта,
Пана Лукаяна дай найлепшае жыта.
Да віно ж віно зеляно!
Найлепша дзяўчына жыта зажынала,
Жыта зажынала, ў тры радочкі клала.
Да віно ж віно зеляно!
Першы радочак дзеля засявання,
Першы радочак дзеля засявання.
Да віно ж віно зеляно!
А другі радочак дзеля спажывання,
А другі радочак дзеля спажывання.
Да віно ж віно зеляно!
А трэці радочак гарэліцу гнаці,
Гарэліцу гнаці і сына жаніці.
Да віно ж віно зеляно!
Дай жа, божа, пане гаспадару,
Каб ваша дачка ўзрасла, ўскрасла
І да зялёных свят замуж пайшла.

### Добры вечар да паненачка...

Добры вечар да паненачка.
Хрыстосваскрэс на ўвесь свет! *
Да ці дома, дома пане гаспадару.
Хоць ён дома, не адзываецца,
У чырвоныя боты абуваецца.
Пан па каморы да пахажае,
Ён свае сыночкі да разбуджае:
— Уставайце, сынкі маладыя,
Да бярыце павады шаўковыя,
Залычайце валы, валы палавыя,
Запрагайце ў ярмы, у ярмы залатыя.
Да арыце зямлю на вяліку сям'ю.

### Чый то домік на прыгорачку...

Чый то домік на прыгорачку,
Да віно ж віно зялёнае,
Залаты тыночак, зыбкія варотцы.
Каля тыну пчолкі гудзяць,
Каля застрэшку галубкі шумяць,
А ў каморы краўцы сядзяць,
Краўцы сядзяць, шубу шыюць,
Шубу й шыюць самой пані,
Самой пані, пані гаспадыні.
Сукна многа — шуба доўга.
Наша гаспадынька расхадзілася,
Па бруку ходзе, брук падмятае.
Сваіх дзетак рана пабуджае:
— Устаньце, дзеткі, ранюсенька,
Умыйцеся бялюсенька,
Пойдзем жа мы ў новую абору.
У новай аборы яў з'явілася,
Сорак каровак ацялілася,
А йшчэ столькі пазначылася.
Як на небе зорка пакацілася,
Наша гаспадынька расхадзілася,
Шуба на апашак, у кішэні пляшак;
Сыра на талерку — запіваць гарэлку,
Скварку ў печ, па яйкі ў клець.

---

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

## Добры вечар, ды паненачка!..

Добры вечар, ды паненачка!
Зялён явар, зялёны. *
Просім адамкнуць нам акеначка,
Просім пабачыць свайго каханага.
Твой жа каханы на коніку едзе,
На коніку едзе, бліжай пад'язджае,
Бліжай пад'язджае, тры падаркі мае:
Першы падарак — руцвяны вянак,
Другі падарак — залаты персцень.
Руцвяным вянком павянчаціся,
Срэбраным кубкам мёд, віно піці,
Мёд, віно піці — не ўпіваціся,
Залатым перснем абмяняціся.
Просім выйсці к нам на ганачак,
Просім вынесці нам ды падарачак:
Сыр на тарэлку — закусіць гарэлку,
Парасё з хвастом валачы на стол,
Слаўная паненка, бывай здарова,
Бывай здарова, жыві багата!
Зелён явар, зелёны.

## А ў матулькі адна дочка...

А ў матулькі адна дочка,
Сад зялёны, вішнёвы.**
Як вішанька ў садочку.
Пайшла ж яна ў садочак,
У садочак пагуляці,
Сабе грушку выбіраці.
Ды выбрала сабе грушку
Ды такую высокую.
На ёй суччa срэбранае,
На ёй лісце залатое.
Як напалі сільны ветры —
Суччa й лісце абарвалі.
Паненачка рана ўстала,
Умылася бялюсенька,
Зачасалася слізюсенька.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Пайшла ж яна у садочак,
Гэту шкоду забачыла,
Шоўкаў платок разаслала,
Сучча, лісце пазбірала,
У пучочкі павязала,
Пашла яна да злотнічкаў.
«Вы, злотнічкі-работнічкі,
Ды зрабіце мне тры выгоды:
Перша выгода — злоты кубак,
Друга выгода — злоты персцень,
Трэцяя выгода — злоты венец.
Злоты кубак — віно піці,
Злоты персцень — на мянянне,
Злоты венец — на вянчанне».
Паненачка, не будзь горда,
Не будзь горда, будзь пакорна,
На малойцаў агляніся,
Нам, малойцам, аддарыся:
Ці серабром неважоным,
Ці золатам незлічоным,
Добрым часам, перад кірмашам!
Серабро сваё мы зважым —
Мы паненку не зняважым,
А золата самі злічым —
Мы паненку падвялічым.
Чырван злоты нам на боты,
Бо мы боты патапталі,
Пакуль панну дапыталі.
Паненачка, не будзь горда,
Не будзь горда, будзь пакорна,
Татку з мамкай пакланіся,
Нам, малойцам, адгадзіся.
Як не хочаш аддарыцца —
Пойдзеш з намі валачыцца.
Нашы сцежкі далёкія,
Нашы росы халодныя,
Нашы рэкі глыбокія:
Заросішся, замочышся.
Тады нам аддарышся,
Нейдзе ж нанач папросішся.
Паненачка, не будзь горда,
Не будзь горда, будзь пакорна
На малойцаў агляніся,
Нам, малойцам, аддарыся:

Сыр на талерку, водкі бутэльку,
Пірог на стол і нас за стол.
Сад зялёны, вішнёвы.

**Пасвіла дзеўка табун коней...**

Пасвіла дзеўка табун коней —
А зялён явар кудравы. *
Пасціла, пасціла, сама задрамала,
Сама задрамала, коней пагубляла.
Пайшла яна дарогаю,
Дарогаю шырокаю коней шукаць.
Стрэла яна трох малойцаў:
— Мілыя мае тры малойцы,
Ці не відзелі вы табун коней —
Шаўковымі путамі да папутаны,
Залатымі аброцямі пазабрычаны?
Адзін кажа: я не бачыў!
Другі кажа: я не відзеў!
Трэці кажа: я й сам там быў!
Калі адгадаеш — знойдзеш коней:
А што расце без карэння?
А што бяжыць без повада?
А што шуміць без буй-ветру?
— Расце камень без карэння,
Бяжыць вада без повада,
Шуміць кола без буй-ветру!
— Твае коні ў чыстым полі,
Ядуць траву шаўковую
Да п'юць ваду крынічную!
А зялён явар кудравы.

**А ў гародзе ды на пераходзе...**

А ў гародзе ды на пераходзе
Стаіць ружа чырвоная,
Віно ж маё, віно зеляно! **
Выйшла-выбегла красна паненка,
Красна паненка, на імя Аленка,
Вышчыкнула з ружы кветку

* Паўтараецца пасля кожнага радка.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

Ды меркавала к свайму лічку.
— А дай, божа, такое лічка,
Як із ружы гэта кветка,
То пайшла б я за садавода,
Бо садавод сады садзіць,
Першы садок — ды вішнёвы,
Другі садок — ды чарашнёвы,
Трэці садок — краснае паненкі,
Краснае паненкі, маладой Аленкі.
Гэта песня табе спета,
Песня спета проці лета,
А што, панна, за дар дасі?
Сорак яек на паўміску,
Каўбасою абкружыўшы,
Белым сырам завяршыўшы,
Віно ж мае, віно зеляно!

**Ой, на азярыне ды на сіненькай...**

Ой, на азярыне ды на сіненькай,
Вясна красна на ўвесь свет!
На кладачцы ды на гібенькай,
Зялёны явар, зялёны! *
Там дзяўчына бель бяліла,
Бель бяліла, ручкі мыла,
Ручкі мыла, персцень ураніла.
Дзе бралася шчука-рыба,
З хваль нырнула, персцень праглынула
А к той азярыне ды па лугавіне
Ішлі-брылі тры малойчыкі,
Тры малойчыкі-рыбалоўчыкі
Ішлі на нерат, неслі невад.
— Ой, мілыя мае тры малойчыкі,
Тры малойчыкі-рыбалоўчыкі,
Вы злавіце шчуку-рыбачку,
Адбярыце залаты персцень.
Я ж вам буду ў вялікай адгодзе:
Аднаму буду суседкаю,
Другому буду швагеркаю,
Трэцяму, згадаем, сама маладая.

---

* Прыпевы «Вясна красна на ўвесь свет!» і «Зялёны явар, зялёны!» паўтараюцца па чарзе праз адзін радок.

Я да суседа агню пайду,
Я да швагра ў госці паеду,
А з каханым век жыць буду.
— Дзяўчыначка-журавіначка,
Загадаем табе сем загадак.
Адгадаеш — персцень атрымаеш.
Не адгадаеш — нас не дачакаеш.
А што шэпча без говара?
А што бяжыць без повада?
А што расце без кораня?
А што чорна не чэрнячы?
А што бела не белячы?
А што стогне без немачы?
А што ўецца паверх дрэва?
— Вецер шэпча без говара,
Вада бяжыць без повада,
Камень расце без кораня,
Снягі белы не белячы,
Воран чорны не чэрнячы,
Свіння стогне без немачы,
Хмель віецца паверх дрэва.

**Лужком, лужком, ды далінкаю...**

Лужком, лужком ды далінкаю,
Ды віно ж маё зеляное!
Сцежкамі дратаванымі,
Ой, зялёны явар, вінаград! *
Тудой ішлі валачобнікі,
Спяваючы, іграючы,
Малойчыка шукаючы;
— А ці дома, дома слічны малойчык,
Слічны малойчык, малады Іванька?
Хоць і дома — не акажацца,
За столікам за цясовенькім
Піша лісты ў тры землі:
У першую — турэцкую,
У другую — у шведскую,
У трэцюю — у валынскую;
У турэцкую — па коніка,

* Прыпевы «Ды віно ж маё зеляное» і «Ой, зялёны явар, вінаград!» паўтараюцца па чарзе праз адзін радок.

У шведскую — па золата,
У валынскую — па валыначку.
На коніку паязджаць будзе,
А золатам шахаваць будзе,
А з валыначкай векаваць будзе!

### Авёс зелен...

Авёс зелен, позна сеян.
А ў тым аўсе да мяжа ляжыць,
Да той мяжой да куна бяжыць.
Куна бяжыць з кунаняткамі.
Вышаў, выцек красны панічак,
Стрэліць, мецiць да куну забіць.
Стала куна прасіціся:
— Не бі, не рубі мяне.
Скажу табе тры радасці:
Першая радасць — маткі слухаць,
Другая радасць — ажаніціся,
Трэцяя радасць — каралю служыці.
Маткі слухаць, то збавен будзеш,
Ажаніціся, то багат будзеш,
Каралю служыць, то славен будзеш.

### Ой, на моры, на сінім Дунаі...

Ой, на моры, на сінім Дунаі.
Віно ж маё зеляно! *
Ляжыць кладка брусаваная,
А масточкі ўсе каваныя.
Тудой ішло семсот коней,
Усе кладачкі пазгібаліся,
А масточкі паламаліся,
Семсот коней утапілася.
Скуль узяўся красны панічык,
Красны панічык, малады Андрэйка,
Ляціць-бяжыць, гукаючы,
Свайго каня шукаючы:
— Вот не жаль жа мне семсот коней,
Вот жаль жа мне аднаго каня:
З яго рота цякло злота,
Ён капыцікам камень разбівае,

* Прыпеў «Віно ж маё зеляно!» паўтараецца пасля кожнага радка.

Ён хвосцікам вулку падмятае,
Ён вушкамі неба падпірае,
Ён вочкамі зорачкі шчытае,
Ён Андрэйку паненку шукае.

**А ў лесе, лесе да на верасе...**

А ў лесе, лесе да на верасе,
Там хадзіла стада коней,
Між тых коней вараны конік,
Ніхто таго каня не спаймае,
Не спаймае, ані асядлае.
Абабраўся слічны паніч,
Слічны паніч, малады Міколка.
Ён таго каня і спаймае,
І спаймае, і асядлае.
Асядлаўшы да й паедзе,
І ён паедзе з гары пад гару,
Напроціў турка ваяваці.
А вывеў турак варанога каня;
І ён на таго каня ані ўзгляне,
Ані ўзгляне, і вачэй не падыме:
— Не хачу з туркам да гадзіціся,
А кажу з туркам ваяваціся.
А вынес турак паўмісак злота:
І ён на тыя злоты ані ўзгляне,
Ані ўзгляне і вачэй не падыме:
— Не хачу з туркам пагадзіціся,
А кажу з туркам ваяваціся.
А вывеў турак слічную панну:
І ён на тую панну як сокал глядзіць,
Як сокал глядзіць і за ручку дзяржыць:
— Не кажу з туркам ваяваціся,
А кажу з туркам пагадзіціся.

**Добры вечар, слічны панічок!..**

Добры вечар, слічны панічок!
Вясна красна на ўвесь свет! *
Хоць і дома — не акажацца,
У каморы прыбіраецца.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ён сеў сабе за столікам,
Піша пісьмы ў тры зямлі,
Піша пісьмы, размячае,
У тры зямлі раскладае:
У першую — па коніка,
У другую — па золата,
У трэцюю — да паненкі.
Па коніка пасла пашлю,
Па золата — тавaрыша,
Па паненку сам паеду.
На коніку пад'язджаць буду,
А золатам шахаваць буду,
А з паненкай векаваць буду.
Табе, панічок, песня спета,
Песня спета проці лета,
Лета цёплага і вясёлага.
Дай жа, божа, за рок дачакаці,
Гэтага паніча панам назваці.
Вясна красна на ўвесь свет!

## У цёмным лесе стучыць, гручыць...

У цёмным лесе стучыць, гручыць,
Вясна красна на ўвесь свет! *
Мы ж думалі, што гром грыміць,
Аж моладзец борць дзяўбаіць,
Борць дзяўбаіць, пчолак садзіць,
Пчолак садзіць, бога просіць,
Каб пчолачкі зляталіся,
Зляталіся, звіваліся,
Дый малойцу асталіся —
Дый за працу мядок насіць.
Вясна красна на ўвесь свет!

## Дзень вялік, дзень вялік...

Дзень вялік, дзень вялік,
А лустачка мала:
Не свая мамка
Лустачку давала.
У каго свая мамка,
Дык дала краюшку,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Дык дала краюшку.
«Напасі цялушку!
Калі не з'ясі —
Пастушкам дасі,
А калі мала —
Дамоў пабяжы».
А мне мачыха
Дык дала скарынку,
Дык дала скарынку.
«Напасі скацінку!
Калі не з'ясі —
Дык дамоў нясі,
А калі мала —
Дык каб парвала».

**Даўно, даўно тое было...**

Даўно, даўно тое было —
Кругом зямлі мора лягло.
А ў моры тым жыў люты цмок.
Штодня збіраў з людзей аброк.
Давалі цмоку ды аброку —
На кожны двор па чалавеку.
Аддалі ўжо з кожнага двара,
Прыйшла пара і на цара
— Цару, цару, прыбірайся,
Ці сам ідзі, ці жонку шлі!
Жану сваю пашкадаваў,
Дачку-красу к мору паслаў.
Сіне мора хвалюецца,
Цароўнай цмок любуецца,
З сіня мора выплывае,
З пашчы агонь выкідае.
Цароўначка спужалася,
За бел камень схавалася.
Аж скуль узяўся ды тут Юр'я,
Пагнаў у мора свайго каня,
Прабіў цмока злотым кап'ём,
Рассек цмока вострым мячом.
Па цароўне цар слёзы лье,
А Юр'я ў двор дачку вязе.
Перад Юр'ем укленчыў цар,
Пытаецца, што даці ў дар.
— Не трэба мне такіх дароў,
З сваёй дачкой бывай здароў!

### А ў балоце на калодзе...

А ў балоце на калодзе
Мядзведзь боты шыць.
Аю-аю-аю! *
Мядзвіняты чарцяняты
Шолкам падшываюць,
А заінька-канавод
У скрыпаньку іграіць,
А сарокі белабокі
Пашлі жыта жаці,
А бацян даўганогі
Пайшоў падганяці.
Ён сарокі не дагнаў,
Доўгіногі паламаў.
Аю-аю-аю.

### Ты дуброва, ты дуброва...

Ты дуброва, ты дуброва,
Ты зялёная была. Ой-ой!
Ты зялёная была.
Па табе ж я хадзіла,
Заблудзіла была. Ой-ой!
Заблудзіла была.
Я думала, ты дуброва,
Што лясок невысок. Ой-ой!
Што лясок невысок.
Не даходзіць, не даносіць
Да татулькі галасок. Ой-ой!
Да татулькі галасок.

### Як пайшоў Мікола...

Як пайшоў Мікола
У чыстае поле,
У чыстае поле
Жыта аглядаці.
Радзі, божа, жыта,
Радзі, божа, жыта
Густа, каласіста,
Густа, каласіста,
Ядром ядраніста.
А ехалі госці
З чужое валосці,
У бару начавалі,
У бару начавалі,
Пад сасной агонь клалі.
Каб гэта сасёнка
Да на нашу старонку,

* Паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

Да на нашу старонку.
А з гэтае сосны
Было б тры угоды,
Было б тры угоды.
У коране сосны
Ды густое жыта,
Ды густое жыта.

А мы б з таго жыта
Піва наварылі,
Піва наварылі.
У сярэдзіне сосны
Ярых пчол лавілі,
Ярых пчол лавілі,
Мяды выбіралі



Араты. З фатаграфіі І. Сербава 1910 г.

У сярэдзіне сосны
Ды ярыя пчолы,
Ды ярыя пчолы.
А ў вярхушцы сосны,
Ды звонкія гуслі,
Ды звонкія гуслі.

Ды воскі тапілі,
Ды воскі тапілі.
Мы б жыта выжалі,
У гусселькі ігралі,
У гусселькі ігралі.

## Юр'я, Юр'я, божа мой...

Юр'я, Юр'я,
Божа мой, *

Падай ключы,
Зямлю адмыкаць,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Бычка напасаць!
На Юр'еву расу
Бычка папасу:
— Бычок, трацячок,
Ці повен бачок?
— Яшчэ не повен,
З левым не ровен.

**Юры, ўставай рана...**

Юры, ўставай рана,
Адмыкай зямлю,
Выпускай расу
На цёплае лета,
На буйнае жыта,
На ядраністае,
На каласістае!
Пойдзем, дзявочкі,
У лугі-лужочкі
Завіваць вяночкі
На годы добрыя,
На жыта густое,
На ячмень каласісты,
На авёс расісты,
На грэчку чорную,
На капусту белую!

**Ой ты, Юр'я, Мікола...**

Ой ты, Юр'я, Мікола,
Абыдзі жыта наўкола,
Юр'я кажа — абайду,
Мікола кажа — пагляджу.
Юр'я кажа — караніста,
Мікола кажа — каласіста,
Юр'я кажа — у копачкі,
Мікола кажа — ў торпачкі.
Юр'я кажа — з прыкроем,
Мікола кажа — з прыпёкам.

**Ой, выйду я на вулічку...**

Ой, выйду я на вулічку, бычкі бушуюць,
Юр'я, Юр'я, бычкі бушуюць.

Бычкі бушуюць, бо вясну чуюць,
Юр'я, Юр'я, бо вясну чуюць.

Загулі рэчкі, ляды паплылі,
Юр'я, Юр'я, ляды паплылі.

Зачарнела зямліца, бо пааралі,
Юр'я, Юр'я, бо пааралі.

Задрыжала бяроза, бо папукалася,
Юр'я, Юр'я, бо папукалася.

Завесялела дуброва, птушкі спяваюць.
Юр'я, Юр'я, птушкі спяваюць.

Зазелянела даліна, кветкі зацвілі,
Юр'я, Юр'я, кветкі зацвілі.

Ой, выйду я, выйду кветкі збіраці,
Юр'я, Юр'я, кветкі збіраці.

Кветкі збіраці, вяночкі віці,
Юр'я, Юр'я, вяночкі віці.

Вяночкі віці, Юр'я спяваці,
Юр'я, Юр'я, Юр'я, спяваці.

**Падай, Юрыла, ключы і замкі...**

Падай, Юрыла, ключы і замкі
Адамкнуці красну вясну,
Красну вясну,
Цёпла лецейка,
Цёпла лецейка,
Спела жыцейка.

**Павядзём Юр'е да бору...**

Павядзём Юр'е да бору
Да пасадзім Юр'е на хвою.
Няхай наша Юр'е пасядзіць
Да болей свету паглядзіць.
Дзе наша Юр'е хадзіла,
Там наша жыта ўрадзіла,
А дзе наша Юр'е юравала,
Там наша жыта красавала.

**Юр'ева маці ўпроч пайшла...**

Юр'ева маці ўпроч пайшла,
Залатыя ключы панясла.
Юр'ева маці вярніся —
Залатыя ключы найшліся.

Адамкні зямліцу,
Выпусці расіцу
На зялёную травіцу,
На здраёву вадзіцу.

### Да што там у стайні стучэла...

Да што там у стайні стучэла?
Звінела кола, звінела.
Малады Янка каня сядлае,
Яго татачка пытае:
— Куды ты, сынку, паедзеш?
Ці ў вёску, ці ў мястэчка?
Не едзь, сынку, у мястэчка,
Бо там дзевачкі лянівы:
Высока ржышчы зжынаюць,
А рэдка копы стаўляюць.
Да што там у стайні стучэла?
Звінела кола, звінела.
Малады Янка каня сядлае,
Яго татачка пытае:
— Куды, сынку, паедзеш,
Ці ў вёску, ці ў мястэчка?
Да едзь, сынку, у вёску,
Там дзевачкі рабочы:
Нізка ржышча зжынаюць,
Густа копы стаўляюць.

### Юр'я, уставай рана...

Юр'я, уставай рана,
Умыйся бела,
Да кладзі боты,
Надзявай сукні,
Да сядлай каня,
Да бяры ключы,
Да едзь у поле,
Адмыкай зямлю,
Выпускай расу
На лён, на пшаніцу,
На усяку пашніцу.

**Юр'е, добры вечар...**

— Юр'е, добры вечар,
Юр'е, падай ключы.
— Бацько, каторыя?
— Сынку, зямлёвыя,
Зямлю адмыкаці,
Расу выпушчаці.
Раса — 'ля каровак,
Трава — 'ля конікаў,
Лаза — 'ля козачак,
Дзягель — 'ля свіначак,
Мурог — 'ля авечак.

**Лятала пава па сенажаці...**

Лятала пава па сенажаці,
То ж была пава харашуха,
Збірала пава траякае зелле,
То ж была пава харашуха,
Звіла пава да тры гняздзечкі,
То ж была пава харашуха,
Знесла пава дай тры яечкі,
То ж была пава харашуха,
Высядзела пава дай тры сакалочкі,
То ж была пава харашуха.
Першы сакалочак — малады Іванка,
То ж была пава харашуха.
Другі сакалочак — малады Васілька,
То ж была пава харашуха.
Трэці сакалочак — малады Сымонка,
То ж была пава харашуха.
Жаніўся Іванка з маладой Гэлечкай,
То ж была пава харашуха.
Жаніўся Васілька з Янечкай,
То ж была пава харашуха.
Жаніўся Сымонка з Волечкай,
То ж была пава харашуха.

**Пры лужку бела бярозка зашумела...**

Пры лужку бела бярозка зашумела,
Пра людскую нядолечку песні пела.
А пад вечар яна ціханька стаяла,

У захад сонца мілага гасцечка ждала.
К ёй прыязджаў бел-малойчык начаваці,
Яму ж была бярозка, як родная маці.
Няма мамкі ў яго роднай, ні куточка,
Толькі белая бярозка ля лужочка.
І з радасцю малойчыка прынімала,
Між карэння на лісточку пасцель слала.
Рання зорка ўжо на небе патухала,
Ужо бярозка малойчыка будзіць стала:
— Уставай жа, мой саколік, досыць спаці,
Пара коні вараныя з лугу браці.
Бо твой татка не родненькі раскрычыцца,
Твая мамка не родная зажурыцца!
Пакланіўся бел-малойчык на зямельку,
Падзякаваў бярозачцы за пасцельку:
— Я паспаўся ў бярозачкі на карэнні,
Як у роднай матулечкі на калені,—
Я выспаўся ў бярозачкі на лісточку,
Як у роднай матулечкі ў прыпалочку.

### Вылятала галачка, вылятала...

Вылятала галачка, вылятала...
Выбівала аконца, выбівала,
Каб матулька дачушку пабуджала:
— Устань, дачушка, бела ўмыйся,
Вазьмі грабёначак, учашыся,
Ідзі ў камору прыбярыся,
А выйдзі на вулачку агляніся.
Правадзіла мамка дачку, правадзіла,
Праз высокія горы — з капачамі,
А праз цёмныя бары — з агнямі,
Праз вялікія сёлы — з скрыпкамі.
Дзе матуля із дачушкай сядзела,
Там вырасла мята-рута, лілея,
Дзе матуля із дачушкай стаяла,
Там вырасла яблынька чудавая,
Дзе матуля із дачушкай рассталася,
Слязлівая рэчка разлілася.

### У майго татулькі...

У майго татулькі
Сад над ракою,
Сад над ракою,
Двор на даліне.

Пусці, татулька,
У сад пагуляці,
Не буду тваіх
Вішань шчыпаці,
Толькі вышчыпну
Вінаградзінку,
Занясу матульцы
На парадзінку.

— Парай, матулька,
Што мне рабіць:
Ці замуж ісці,
Ці дома быць?
Замуж зайшоўшы,—
Вяліка гора,
Дзеўкай старэці,—
Людская размова.

### Ды хадзіў карагод...

Ды хадзіў карагод
Каля нашых варот.
Ой, люлі, ой, люлі,
Каля нашых варот.
Я чула, бачыла,
Не паспела сказаць.
Ой, люлі, ой, люлі,
Не паспела сказаць.

Карагодам назваць
Ды ў хату пазваць.
Ой, люлі, ой, люлі,
Ды ў хату пазваць.
Ды ў хату пазваць
І віном частаваць.
Ой, люлі, ой, люлі,
І віном частаваць.

### Завілася пчолка над варатамі...

Завілася пчолка над варатамі.
Гэй, люлі, гэй, люлі. *
Красна сонца заіграла над людзьмі.
Што ж ты, вясна, наша красна, прынясла?
Прынясла цёпла летца дзеля вас.
Малым дзеткам па яечку,
Старым бабкам па кіёчку,
Красным дзеўкам па вяночку,
Маладушкам па сярпочку.
Стары бабкі чапцы шыці,
Красны дзеўкі вянкі віці,
Маладушкі жыта жаці.
Красны дзеўкі на вулачку,
Маладушкі за люлечку.
Красны дзеўкі гулі ды гулі,
Маладушкі люлі ды люлі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

### Ды рынула вада з Дуная...

Ды рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Там тры конюхі да коней паілі.
Ды рынула вада з Дуная.
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Там тры дзевачкі да ваду бралі.
Да рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Іваначка кажа, я Ганначку люблю,
Я Ганначку люблю і за сябе вазьму.
Да рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Васілька кажа, я Кулінку люблю,
Я Кулінку люблю і за сябе вазьму.
Да рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.
Міхалачка кажа, я Алёну люблю,
Я Алёну люблю і за сябе вазьму.
Да рынула вада з Дуная,
З Дуная ціхага, з беражка крутога.

### Устань рана, перапёлачка...

— Устань рана, перапёлачка,
Устань рана, маладзенькая.
— Я ж устала, мае дзевачкі,
Я ж устала, мае сястрыцы.
— Умыйся бела, перапёлачка,
Умыйся бела, маладзенькая.
— Я ўмылася, мае дзевачкі,
Я ўмылася, мае сястрыцы.
— Учашыся слізка, перапёлачка,
Учашыся слізка, маладзенькая.
— Я ўчасалася, мае дзевачкі,
Я ўчасалася, мае сястрыцы.
— Надзень сукенку, перапёлачка,
Надзень сукенку, маладзенькая.
— Я ж надзела, мае дзевачкі,
Я ж надзела, мае сястрыцы.
— Прывяжы каралькі, перапёлачка,
Прывяжы каралькі, маладзенькая.

— Я ж прывязала, мае дзевачкі,
Я ж прывязала, мае сястрыцы.
— Надзень панчошкі, перапёлачка,
Надзень панчошкі, маладзенькая.
— Я ж надзела, мае дзевачкі,
Я ж надзела, мае сястрыцы.
— Абуй чаравічкі, перапёлачка,
Абуй чаравічкі, маладзенькая.
— Я ж абула, мае дзевачкі,
Я ж абула, мае сястрыцы.
— Прытанцуй нам, перапёлачка,
Прытанцуй нам, маладзенькая.

### Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці...

Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці,
Люлі, люлі, на луг гуляці.
Мы саўём вяночкі, мы саўём зялёныя,
Люлі, люлі, саўём зялёныя.
Пусцім мы вяночкі на чыстыя воды,
Люлі, люлі, на чыстыя воды.
Вяночкі, плывіце, пра долю кажыце,
Люлі, люлі, пра долю кажыце.
Ці будзем мы жывы да цёплага лета,
Люлі, люлі, да цёплага лета.
Ці спалюбяць нас хлопцы удалы,
Люлі, люлі, хлопцы удалы.
Ці павядуць нас у свае дамы,
Люлі, люлі, у свае дамы.

### Не радуйся, клён да ясення...

Не радуйся, клён да ясення,
Не к табе ідуць дзеўкі красныя,
Не табе нясуць яешні смашныя,
Гарэлку горкую, скрыпку звонкую.
Ай, люлі, ай, люлі!
Ай, люлі, люлі, люлі!
Ты радуйся, белая бяроза,
К табе ідуць дзеўкі красныя,
Табе нясуць яешні смашныя,
Гарэлку горкую, скрыпку звонкую.
Ай, люлі, ай, люлі!

Ай, люлі, люлі, люлі!
Дух да Троіца,
А святы Ілля
Дзеўкам забор!
Ай, люлі, ай, люлі!
Ай, люлі, люлі, люлі!

**Ці ты бывала, тройца, ці бывала...**

Ці ты бывала, тройца, ці бывала?
Ой, я й, маладая, не ўгадала,
Я і, маладая, не ўгадала...
Я і, маладая, на вуліцы не бывала.
Да й на вуліцы я й не бывала,
Эх, мяне мая мамачка не пушчала.
Мяне мая мамачка не пушчала,
Ой, да й у каморку, ой, запірала.
Да й у каморку, эх, запірала,
А ў каморачцы акенечка.
А ў каморачцы ды акенечка,
А там мне, маладой, ой, бядненечка.
А там мне, маладой, бядненечка,
А на вуліцы дымок, ох, да ідзе.
А на вуліцы дымок ідзе,
А там мой міленькі танок вядзе.
А там мой міленькі танок вядзе,
А ў левай руцэ ён вянок нясе.

**На граной нядзелі...**

На граной нядзелі
Русалкі сядзелі,
Рана, рана!*
Правяду русалак
Із бору да бору,
У зялёну дуброву,
Русалкі штоб не ласкаталі,
Узіму не лякалі,
Улетку не пужалі.
Прасілі русалкі
У дзевачак сарочак:
— Дайце нам сарочак,
Хоць яны раўненькі,
Абы былі бяленькі.
На граной нядзелі
Русалкі сядзелі,
Прасілі русалкі
У маладзічак намётак:
— Маладзічкі-цёткі,
Дайце нам намёткі!

* Прыпеў паўтараецца пасля кожных двух радкоў з прыбаўленнем да яго другога радка.

Хоць яны раўненькі,
Абы былі бяленькі.
Прывяду русалак
У зеляное жыта,
Там русалкі ў жыце
Зялёным сядзелі.

А мой каласочак,
Як яварочак,
А мае жыцінкі,
Як праскурачкі:
У печкі піражком,
На стале калачком.

### Пойдзем, дзевачкі, у шчыры бор...

Пойдзем, дзевачкі, у шчыры бор,
Да зрубаема высокі клён,
Да выкалемо тры дошчачкі,
Да зробімо тры бочачкі:
У адной бочачцы салодак мядок,
У другой бочачцы зялёна віно,
У трэцяй бочачцы горкае піва.
Саладок мядок — то для дзевачак,
Зялёнае віно — то для малодачак,
А горкае піва — для малойчыкаў.

## ЛЕТНІЯ ПЕСНІ

## Купальскія і пятроўскія песні

### Ішла Купала сялом, сялом...

Ішла Купала сялом, сялом
Закрыўшы вочкі пяром, пяром
На Йвана Купала.*
Закрыўшы вочкі пяром, пяром
Вітала хлопцаў чалом, чалом.
Вітала хлопцаў чалом, чалом,
Свяціла ночкі агнём, агнём.
Свяціла ночкі агнём, агнём.
Пляла вяночкі шаўком, шаўком.
Пляла вяночкі шаўком, шаўком,
Слыла Купалка цяплом, дабром,
Славу Купалу пяём, пяём.

### Сягоння Купала, а заўтра Ян...

Сягоння Купала, а заўтра Ян,
Зайграй, сонейка, зайграй нам,

* Прыпеў паўтараецца пасля кожных двух радкоў.

Каб у ясным небе звінела,
Каб сырая зямліца стагнала
Ад дзявоцкага гуляння.
Ад жаноцкага спявання.

**Да ўзыйдзі, месячык...**

Да ўзыйдзі, месячык,
Да ўзыйдзі, ясненькі,
Разлажы нам Купалейка
Хлопчыкам на іграненйка,
Дзевачкам на гуляніўка,
Дзевачкі нагуляліся,
Хлопчыкі наіграліся
З Купалейкам папрашчаліся...

**Прасілася Гарыслаўка ў ойчанькі...**

Прасілася Гарыслаўка ў ойчанькі,
На Купаленька,
На дзявоцкае пагулянейка:
— Ой, мой ойчанька, родненькі!
Пусці ж мяне пагуляць.
Да й дзецюкам Купальнічка
заспяваць:
Яны жа з нас смяюцца цэлы год,
А мы ж жа ім заспяваем
усю ноч,
Заспяваем Купальнічка такога,
Каб яны не дачакалі году другога,
Калі яны жаніціся не хочуць,
Да нас маладзенькіх любіць
не будуць.
Ой, гуляла Гарыслаўка ўсю ноч,
Нямаш жа яе ў ойчанькі
на абед;
Нізка сонца, нізка пад палудзень,
Гарыслаўка з Купальнічка ідзе,
А ойчанька яе сустракае,
У варацейках праўданькі пытае:
— Донька мая родненькая,
скажы мне,

Каго любіш верна ў сяле:
Таму пашлю залаты пояс у дары,
Што б ён пазнаў Гарыслаўку малады.
— Не пасылай, мой ойчанька, паяса,
Ой, прывядзе мне малайца мая краса!

**Ой, пойдзем, сястрыцы...**

Ой, пойдзем, сястрыцы,
Пад ясну зарніцу.
Ноч малая ды Купальная!
Набярэм, сястрыцы,
Жоўтага пясочку.
Іграй, сонца, із зарою!
Пасыпем, сястрыцы,
У таткі пад аконцам.
Ноч малая ды Купальная!
Пасеем, сястрыцы,
Белага гарошку,
Іграй, сонца, із зарою!
Гарошку не ўзысці,—
Мне ў таткі не быці.
Ноч малая ды Купальная!

**Ой, рана, рана на Яна...**

Ой, рана, рана на Яна
Зямля дрыжала з Купала.
Дзевачкі рвалі не зналі,
Жычкай крапівы нарвалі
Да самога круля пасналі.
Круль гэтага зелейка не ўвазнаў,
Да крулёвае адаслаў.
Крулёвая зелейка пазнала,
Яна яго Купалам назвала.
Дарагое зелейка Купала,
Той дзявоча гулянне,
Да весела дзевачкам жыта жаць,
Да цяжанька хлопчыкам Пятра ждаць.
Весела дзевачкам, пажаўшы,
Да цяжанька хлопчыкам, прыждаўшы.

### Ой, рана на Йвана...

Ой, рана на Йвана,*
Проці Йвана ночка мала,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Дзе, Купала, начавала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Начавала ў чыстым полі,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
У чыстым полі сярод жыта,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Чым, Купала, вячэрала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Варэнічкі вячэрала,
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Чым, Купала, запівала?
Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана.
Гарэлачкай запівала,
Ой, рана на Йвана.

### Ой, нету, нету Купаліша...

Ой, нету, нету Купаліша
Да як над нашага Янaчка;
Пяшком на вулку не выходзіць,
Ён на коніку выязджаіць,
Сабе дзеваньку выглядаіць;
Сам жа ён едзе на коніку,
Дзеваньку вязець на возіку,
Сам жа ён едзе ў атласе,
А дзеваньку вязець у пакрасе,
Сам жа ён едзіць, як жар гарыць,
Дзеваньку вязець, як цвет цвіцець.

---

* Словы «Ой, рана на Йвана» паўтараюцца два разы.

### А як я ў зёлачкі пашла...

А як я ў зёлачкі пашла,*
Шэру зязюлечку нашла,
Зязюля кукавала,
На мяне вешчавала.
На сем год замуж не йці.
Я й да хатачкі прышла,
Я й парадачак нашла:
Татулька піва варыць
Да к майму вяселлейку,
Матулька хлябы пякець
Да к майму вяселлейку,
Брацетка каня строіць
Да к майму вяселлейку,
Сястрыца дары кроіць
Да к майму вяселлейку.

### Ты, купалінька, рана, рана...

— Ты купалінька, рана, рана,
Да дзе ты была, рана, рана.
Да што ты рабіла, рана, рана.
— Ды ў бары была, рана, рана,
Я краскі збірала, рана, рана.
— Нашто красачкі, рана, рана.
— Я й вянкі віці, рана, рана.
— А нашто вяночкі, рана, рана.
— Дзевачцы на галоўку, рана, рана.

### Купалачка, дзе твая дачка?

— Купалачка, дзе твая дачка?
— А ў гародзе на пагодзе красачкі рвець,
Вяночкі ўець.
Звіўшы вяночак, пайшла ў таночак,
А ў танок ідучы пахваляецца:
— Ніхто ў мяне вяночка не зніме.
А дзе ўзяліся буйны ветры,
Знялі з галоўкі вяночак,
Пакацілі на сіняе мора,
Пайшла дзявіца шукаючы, пытаючы,

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Спатыкаіць трох рыбаловаў:
— Ах, рыбаловы, братцы мае,
Чы не відзелі вяночка майго?
— Ой, дзевіца, не шукай, не пытай:
Твой вяночак на сінім моры.
Будзем сеці закідаць, вянка шукаць.
— Вы рыбаловы, братцы мае,
Аднаму дам залаты персцень,
Другому дам шаўкову хустачку,
А за трэцяга я сама пайду.
Што персцень дала — меншы брацец,
Што хустку дала — сярэдні брацец,
А за старшага сама пайшла.

### А хто ж у нас не жанаты ходзіць?..

А хто ж у нас не жанаты ходзіць?
— Сямёнка ў нас не жанаты ходзіць:
Ён браў хмялёк у святы дзянёк,
Саладзіў солад на пярэклеце,
Мыў катлы на сінім моры,
Сушыў бочкі на сонейку.
Доля яго няшчасная:
Козы, оўцы хмель паелі,
Куры, гусі солад паклявалі,
Мора катлы патапіла,
Сонцам бочкі пашчапіла.

### Купала. Янава ночка невялічка, Купала...

Купала. Янава ночка невялічка,
Купала.
Нашы дзевачкі ўсю ноч не спалі,
Купала.
Ім зязюленькі ўсё шчабяталі,
Купала.
Дзевачкі, з ружы вянкоў не віце,
Купала,
Дзевачкі рана замуж не йдзіце,
Купала.
Віце вяночкі ды із чабору,
Купала.
Ідзіце замуж ды ўпору,
Купала.

### Была ў суседа дачушка...

Была ў суседа дачушка,
А ў другога — другая.
Адна хвалёная,
А другая сужоная.
Прыехалі баяры
Да сужоначку ўзялі,
А хвалёначкі не бралі.
Стала хвалёнка плакаці,
На свае белы дары гледзючы:
— Мае белыя дарочкі,
Каго я буду дарыць вамі?
Ці белы бярозы укрываць?
Ці чорны гасцінец усцілаць?
Белы беразняк укрыўшы,—
Расой прыпадуць,
А чорны гасцінец услаўшы,—
Баяры коньмі саб'юць
Сужанку вязучы,
А хвалёнку клянучы...

### Купалялё, на сенажаці...

Купалялё, на сенажаці
мядуначка, купалялё.
Купалялё, там кукавала зязюлячка,
купалялё.
Купалялё, там кукавала, праўду казала,
купалялё.
Купалялё, не будзіць свёкарка
родны татулька, купалялё.
Купалялё, не будзіць свякроўка
родная мамка, купалялё.
Купалялё, не будзіць залвіца
родная сястрыца, купалялё.
Купалялё, не будзіць дзеварка
Родны брацятка, купалялё.

### Малая ночка Купалночка...

Малая ночка Купалночка,
Нашы малойцы не выспаліся,
За валамі ідуць хліпаючы,
Хвастамі вочы праціраючы.
— Быцю, быцю, пазыч хваста,
Патры вочы пасля ночы.
Вяліка ночка Купалночка,
Нашыя дзеванькі выспаліся,
За валамі ідуць спяваючы,
Шолкам хустанькі вышываючы.

### Да зялёны кусток распускаецца...

Да зялёны кусток распускаецца,
Багатыр дачкой набіваецца:
— Ды бяры дачку-багатырачку,
Дам пасагу — шэру сярмягу,
Калі яшчэ мала, дык лапцёў пару,
Калі яшчэ мала, дык абор пару,
Калі яшчэ мала, дык ануч пару.
— Не бяры, сынку, ды што ў золаце!
— Не бяры, сынку, ды што ў серабры!
А бяры, сынку, што ў бяленькім!
А што ў золаце, то не паненачка, то гультаечка,
А што ў серабры, то цыганачка, то абманачка,
А што ў беленькім, то работніца.

### Купала на Йвана...

Купала на Йвана,
На Купала сонца гуляла.
Купала на Йвана,
Над Бабрынаю калясом стала.
Купала на Йвана,
Ой, у Бабрыне хлопцы белы,
Купала на Йвана.
Хлопцы белы, дзяўчатам мілы,
Купала на Йвана.
На Купала сонца гуляла,
Купала на Йвана.
Над Куняўкаю калясом стала,
Купала на Йвана.
У Куняўцы дзеўкі красны,
Купала на Йвана.
Дзеўкі красны, хлопцам страшны,
Купала на Йвана.

### Каліна, а па ельнічку...

Каліна, а па ельнічку,
па бярэзнічку, каліна,
Каліна, канюшкі свішчуць, конікаў
ішчуць, каліна.
Каліна, а згубіліся тры конікі, каліна.
Каліна, адзін конік сівы-буланы, каліна,
Каліна, другі конік — звёздачка ў ілбе,
каліна,
Каліна, трэці конік — залатагрыўка,
каліна.
Каліна, сівы-буланы — Юрачкаў, каліна,
Каліна, звёздачка ў ілбе — Іванкаў, каліна,

Каліна, залатагрыўка — Сцяпанаў, каліна.
Каліна, сівы-буланы — да Галечкі, каліна,
Каліна, звёздачка ў ілбе — да Манечкі,
каліна,
Каліна, залатагрыўка — да Валечкі, каліна.

**Ой, каліна, а хто ж у нас...**

Ой, каліна, а хто ж у нас
да дзевачак лас, каліна?
Ой, каліна, а Мішачка ў нас да дзевачак
лас, каліна.
Ой, каліна, узяў лясачку папірацїся,
каліна,
Ой, каліна, пайшоў Манечкі давядацїся,
каліна.
Ой, каліна, лясачка яго паламалася,
каліна,
Ой, каліна, Манечка яго адчуралася,
каліна.

**Каліна, чыя рута за вадою...**

Каліна, чыя рута за вадою,
каліна.
Каліна, зарасла яна лебядою, каліна.
Каліна, чаму, Ніначка, руты не полеш,
каліна,
Каліна, руты не полеш, дзевачак
не просіш, каліна.
Каліна, дзевачкі мае, не да руты мне,
каліна,
Каліна, не да руты мне, не да рутачкі,
каліна,
Каліна, узялі мяне цяжкі смутачкі, каліна.
Каліна, паехаў мілы на паляванне, каліна,
Каліна, пакінуў мяне на гараванне, каліна.
Каліна, пакуль конік наскачацца, каліна,
Каліна, дык я, малада, наплачуся, каліна.
Каліна, пакуль мілы напалюецца, каліна,
Каліна, дык я, малада, нагаруюся, каліна.

### А ў масце, масце...

А ў масце, масце
Сон-трава расце,
Ой, люлі-люлі,
Сон-трава расце.
Сон-трава расце,
Жоўты красачкі,
Жоўты красачкі
Аднагодачкі.

Нашы дзевачкі
Самаволачкі
Дзе піва чуюць,
Там заначуюць,
А дзе салодкі мёд —
Там і круглы год,
А дзе гарэлка,
Там нядзелька.

### Кукуй, зязюленька, не ўпікай...

Кукуй, зязюленька, не ўпікай,
Ой, люлі, не ўпікай.
Нямнога будзеш кукаваць,
Ой, люлі, кукаваць.
На Юр'я рана пачынаць,
Ой, люлі, пачынаць.
На Пятро позна пакідаць,
Ой, люлі, пакідаць.
Заплач, Анэтка, жалосна,
Ой, люлі, жалосна.
Нямножка будзеш плакаці,
Ой, люлі, плакаці.
У нядзельку рана пачынаць,
Ой, люлі, пачынаць.
У аўторак позна пакідаць,
Ой, люлі, пакідаць.

### А ў бару, бару, на баравіне...

А ў бару, бару, на баравіне,
Ай, рана, рана, на баравіне.
Там Аленка ягадкі брала,
Ай, рана, рана, ягадкі брала.
Ягадкі брала, цяжка ўздыхала,
Ай, рана, рана, цяжка ўздыхала
«Бярозкі мае, невядомыя,
Ай, рана, рана, невядомыя.
Дарожкі мае, незнакомыя,
Ай, рана, рана, незнакомыя,
А з некім сесці лустачку з'есці,

Ай, рана, рана, лустачку з'есці.
А з некім стаці, слоўца згукаці,
Ай, рана, рана, слоўца згукаці».
Прыйшоў да яе міленькі яе,
Ай, рана, рана, міленькі яе.
«Чаго, Аленка, цяжка ўздыхаеш,
Ай, рана, рана, цяжка ўздыхаеш?
Мы з табой сядзім, лустачку з'ядзім,
Ай, рана, рана, лустачку з'ядзім.
Мы з табой станем, слоўца згукаем,
Ай, рана, рана, слоўца згукаем».

### А ў нашым жыце перапяліца...

А ў нашым жыце перапяліца,
Яна не свішчыць — праўду гаворыць:
«Ай трудна жыці той маладзіцы,
А ў каторае заловак многа,
А дзівярочка ніводнаго.
Куды ні пойдуць — нявестку ганюць:
«Наша нявестка не работніца,
К нашаму двору непрыходніца,
Нашаму скоту непрыглядніца,
Нашым гасцём непрыветніца».
А ў нашым лесе зязюлечка,
Яна не кукуіць — праўду гаворыць:
«Ой, добра жыці той маладзіцы,
А ў каторае дзівяроў многа,
А заловачкі ніводнае.
Куды ні пойдуць — нявестку хвалюць:
«Наша нявестка работніца,
Нашаму двору прыходніца,
Нашаму скоту прыглядніца,
Нашым гасцём прыветніца».

### Ішоў вечар па вулачцы...

Ішоў вечар па вулачцы,
З Купалкай жартуючы:
«А дзе нам спаць, начаваць?»
— А ты, вечар, ў канцы сяла,
А я, Купалка, сярод сяла,
А дзе вулачка мяцёная,

Дзе дзевачка заручоная,
За купчыка аддадзёная.
Купчык будзе купчаваць,
А дзевачка — панаваць.

### Ішла Купалка сялом, сялом...

Ішла Купалка сялом, сялом,
Казала мальцам: «Чалом, чалом».
А мужчынам наругалася:
«Нашто з Купалкі дзівіліся,
А што ў Купалкі сыноў многа.
А што за многа — тры сыночкі:
Першы сыночак — Васілёк,
Другі сыночак — Іванька,
Трэці сыночак — Дзям'янка».
Ішла Купалка сялом, сялом,
Казала дзеўкам: «Чалом, чалом».
А бабачкам наругалася:
«Нашто з Купалкі дзівіліся,
А што ў Купалкі дачок многа.
А што за многа — тры дачушкі:
Першая дачушка — Аксіннячка,
Другая дачушка — Наталачка,
Трэцяя дачушка — Валячка».

### Каліна на лузе стаяла...

Каліна на лузе стаяла,
А з луга пайшла — зайграла.
Мостам ішла — грымела,
А полем ішла — лялела,
А к сялу прыйшла — зайграла,
У сяло ўвайшла — гуляла,
К варотам прыйшла — грукнула,
Пад вакенца прыйшла — гукнула:
«Адчыні, Тацянка, новы двор».
А Тацянка ёй адказала:
«Некалі, калінка, некалі:
У садзе вінаград пераспеў,
Трэба яго пашчыпаць,
Да свайго мілога паслы слаць.
Я б паслала пасол — не смею,

Напісала б лісток — не ўмею,
І пайшла б я сама — баюся,
Доўгая дарога — стамлюся.
Дык прабачай, калінка, прабачай».

**Купалка Яна на вулку звала...**

Купалка Яна на вулку звала:
«Ой, выйдзі, выйдзі, пане Іване,
На вулку дзіва паглядзець,
Дзіва паглядзець, падзівіціся:
Едзе Мішачка жаніціся.
Чатыры кані паперадзе ідуць,
А на пятым — Манячку вязуць,
А на шостым — ён сам едзе,
А на сёмым — дружыначка,
А на восьмым — радзіначка».

**На вуліцы скрыпка грае...**

На вуліцы скрыпка грае,
    Каліна.*
Кароль дачкі не пускае.
Яна ў яго прасілася,
Прасілася, малілася:
«Пусці мяне, мой татачка,
Я ж тамака не забаўлюся,
Хуценька дамоў вярнуся».
А на дварэ петушкі пяюць —
Каралёвай дачкі з вулачкі не чуць.
Ужо на дварэ сонейка ўзыходзіць —
Каралёва дачка з вулачкі прыходзіць.
Яе шаты сцерты, змяты,
Яе косачка растрапана,
Яе вочачкі заплаканы.

**Чаму, зязюлька, не кукуеш?..**

«Чаму, зязюлька, не кукуеш?
Чаму гняздзечка не гатуеш?
А пройдзе лета, прыйдзе зіма —
А дзе ж ты зімаваць будзеш?

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

А дзе ж дзетак гадаваць будзеш?»
— А мая доля бяздомніцы,
У шырокім полі прасторная.
Усім людзям я весніца,
Любому гору равесніца.

**Купальна ночка невялічка...**

Купальна ночка невялічка,
Да не выспалася дзевачка,
Да ягадкі рвала — драмала,
Перабірала — заснула,
Прыехаў дзяціначка — не чула,
Махнуў хустачкаю, не дамахнуў,
Пакаціў персцянём — не дакаціў,
Злез з коніка — сам пабудзіў!
— Устань, мая дзевачка, годзе спаць.
Да ўжо твае сватове на дварэ стаяць.
Пара табе падаркі падаваць.
Да няхай жа стаяць здаровы,—
Ужо ж мае падарачкі гатовы:
Да сорак саракоў палацён,
Да трыццаць паставоў ручнікоў,
Да апарць дробні і драбніцы,
Што дараць дзеверы і залвіцы.
Да дзяцінка дзевачку падабаў,—
Ён ёй пярсцёначак дараваў,
Дзевачка дзяцінка падабала,—
Яна яму хустачку даравала.

**Ішла паненка цераз бор...**

Ішла паненка цераз бор,
На ёй сукенка ў дзевяць пол,
Стала тая сукенка шамрэці,
Зялёна дуброва шумеці,
Стала наша Купала гарэці,
Ішлі маладкі тушыці,
Неслі ў чэпчыку вадзіцы,
Колькі ў чэпчыку вадзіцы ёсць,
Столькі ў маладкаў праўды ёсць.
Ішла паненка цераз бор,
У яе сукенка ў дзевяць пол,

Стала тая сукенка шамрэці,
Зялёна дуброва звінеці,
Стала наша Купала гарэці,
Ішлі малойцы тушыці,
Неслі ў рэшаце вадзіцы,
Сколькі ў рэшаце вады ёсць,
Столькі ў малайца праўды ёсць.
Ішла паненка цераз бор,
На ёй сукенка ў дзевяць пол,
Стала тая сукенка шамрэці,
Стала наша Купала гарэці,
Ішлі дзевачкі тушыці,
Неслі ў кубачках вадзіцы,
Колькі ў кубачках вады ёсць,
Столькі ў дзевачках праўды ёсць.

### У чыстым полі зялёны луг не кошаны...

У чыстым полі зялёны луг не кошаны,
На тым лугу стада коней вараненькіх.
Як ўзышла цёмна хмара грамавая,
Разагнала стада коней вараненькіх.
Да не жаль мне стада коней вараненькіх,
Да толькі жаль мне каня палавога:
Ён губкай мора вады выпівае,
Ён вочкамі на небе звёзды палічыць,
Ён вушкамі далёкае войска пачуе,
Ён капыткамі белы камні разбівае.

### Ой, то-то! Ляцелі гусі рад па раду...

Ой, то-то! Ляцелі гусі рад па раду, ой, то-то!
Крыкнулі гусі раз па разу:
«Чаму, Іванька, не жэнішся?»
— А як я маю жаніціся:
Хмель на тычынцы не павіўся,
А ячмень на ніўцы не наліўся,
Дачка ў мамкі не нагулялася,
А мне маладому не спадабалася!
Цяпер буду жаніціся:
Хмель на тычынку ўжо павіўся,
Ячмень на ніўцы ўжо наліўся,
Дачушка ў мамкі нагулялася,
А мне маладому спадабалася!

### Ой, то-то! Хто гэту гару капаў...

Ой, то-то! Хто гэту гару капаў, ой, то-то!
Чорную сцягу таптаў?
Васілька гару капаў,
Чорную сцягу таптаў,
Да Зосечкі ходзячы,
Падарачкі носячы.
Стук-стук пад акенечка:
— Ці дома паненачка?
Прынёс я падарачкі!
— Што ж та за падарачкі?
— Два садовых яблачкі,
Чырвоны каралічкі,
Яблачкі кругленькія,
Мы з табой роўненькія,
Каралічкі дарагія,
А мы з табой маладыя.
Каралькі насіць буду,
Тады ж я любіць буду,
Яблачкі качаць буду,
А з табой гуляць буду!

### Да Купаленка, рана, рана...

— Да Купаленка,
Рана, рана.
Дзе дасюль была?
— За ракой была,
За быстрай была.
— Што ты рабіла?
— Кужалі прала,
Ткала, бяліла,
Замуж дачок выдавала.

### Цёмная ночка Купалачка...

Цёмная ночка Купалачка,
На моры вуткі купаліся,
На беражочку сушыліся,
Наша Марыська стужылася,
Што яе дары не прадзёныя,
Хоць прадзёныя, не звіваныя,
Хоць звіваныя, не снаваныя,
Хоць снаваныя, не вытканыя,
Хоць вытканыя, не бялёныя,

Хоць бялёныя, не дзялёныя;
Таму-сяму па локцiку,
Свайму мiлому не меручы.

### А што ў нас сягоння за вечар быў?..

А што ў нас сягоння за вечар быў?
Звiнелi страмёны каля коней.
«А едзьце малойцы ў славен горад,
А ў слаўным горадзе дзяльбу дзелюць:
Кожнаму малойцу по конiку,
Нашаму Данiлку што найлепшага».
А што ў нас сягоння за вечар быў?
Звiнелi страмёны каля коней.
«Сядайце ўсе малойцы на коней,
А едзьце малойцы ў славен горад,
А ў слаўным горадзе дзяльбу дзеляць:
Кожнаму малойцу па дзевачцы,
Нашаму Данiлку што найлепшая».

### Iшла Купалiнька па вулiцы...

Iшла Купалiнька па вулiцы,
Краскамi вочы завесiўшы.
Сталi людзi дзiвiцiся,
I стала Купалiнька сварыцiся:
— Што вы за людзi за дзiўныя!
Цi вы на вулку не хадзiлi?
Цi вы Купалiнькi не вiдзелi?
Цi вы вяночкаў не звiвалi?
Я не такое дзiва вiдала:
Шчука рыба кросна ткала,
А рак небарак цэўку сучыў,
Сучыў жа цэўкi чырвоныя,
Яна ткала кiтайкi зялёныя
I слала да маткi радзёныя:
Вот табе, мацi, кiтаечка
Ад тваёй дочкi каханачкi,
Вот табе, мацi, зялёная
Ад тваёй дочкi радзёныя,
Вот табе, мацi, урубочкi
Ад тваёй дочкi галубочкi,
Вот табе, мацi, цясёмачкi
Ад тваёй дочкi паненачкi.

6 Зак. 3328

### Я зёлкі ў полі збіраю...

Я зёлкі ў полі збіраю,
Івана Купалку пераймаю
І ўсё гляджу ў цёмен лес.
А ў цёмным лесе агонь гарыць,
Каля агня Купалка сядзіць,
Купалка сядзіць і ў голас плачыць.
«Чаго, чаго, Купалка, плачаш?
Ці табе тут соўнінька мала?»
— Ох, ні мала мне яснага соўнінька,
Тут досыць мне ўсяго, усяго!
І плачу я таго, таго,
Што мяне людзі не так пераймаюць,
Толькі то й робяць,
Што агні раскладаюць.

### Сонейка, сонейка, Ян з Пятром ходзяць...

Сонейка, сонейка, Ян з Пятром ходзяць,
Сонейка, сонейка, да па межах ходзяць,
Сонейка, сонейка, да жыта глядзяць.
Сонейка, сонейка, да ідучы гаварылі:
Сонейка, сонейка, усё жыта добрае;
Сонейка, сонейка, Юрасёва яшчэ лепшае,
Сонейка, сонейка, Габрусёва найлепшае,
Сонейка, сонейка, Юрасёва ў трубу ўецца,
Сонейка, сонейка, Габрусёва ў сцірты
кладзецца.

### На моры вутка купалась...

На моры вутка купалась,
На беражочку сушылась,
Яе маладзенька журылась.
Ці было лета, ці не бывала,
Я маладзенька не ўгадала,
Мамка на вулку не пускала,
А ў каморачку замыкала.
Выб'ю я, выб'ю балоначку,
Гляну я, гляну на вулачку:
Аж-ну мой міленькі танок вядзе,
Ды і з маёй даўняй падружанькай,

Дай табе божа, падружачка,
Гэтага танка не звадзіці,
Гэтага вянка не знасіці.

**Ай, бору мой, бору мой!..**

— Ай, бору мой, бору мой!
Што ты, бору, ні шумён?
— Як я маю шумён быці,
Колі ў мяне пташак нет?
Адна была зязюля,
Тую пташачкі ўзялі,
Салавейкам падалі;
А пташачкам на адзін дзень,
Салавейкам на ўвесь век,—
— Ай, двору мой, двору мой!
Чаму, двору, ні мяцён?
— Як я маю мяцён быць,
Колі ў мяне дзевак нет?
Адна была Марынка,
Тую сваты ўзялі,
Ды сужыньку падалі,
А сваточку на адзін дзень,
А сужыньку на ўвесь век!

**Ляцеў чыжык цераз рынак...**

Ляцеў чыжык цераз рынак
Ды клікаў дзевак на купалле:
— Дзеўкі, бабы, на купаллю!
Красным дзеўкам свая воля,
А маладзіцам няма волі:
Дзіця плача ў калысцы,
А муж бурчыць у пасцельцы,
А свякроўка супроць печы,
Свёкар-бацюшка на печы,
А дзявер'я на пакоі,
А залоўкі на купаллі.
Ды я млада прыбяруся,
Ды я дзіцё прыгалублю,
Ды я мужа перапрашу,
Ды я свёкру пакаруся,
Ды я свякроўцы пакланюся,
Я дзевяр'ям па платочку,

А залоўкам па вяночку.
Пакуль млада прыбяруся,
Дзеўкі, жонкі ідуць з купалля,
А я молада на купалле.
Дзеўкі, бабы, на купаллю!
Рана, рана на купаллю.

**Кукавала зязюлька ў садочку...**

Кукавала зязюлька ў садочку,
Прылажыўшы галоўку к лісточку:
— Бедна ж мая галоўка на свеці,
Хто ж маё гняздзечка разаўе,
Хто ж мае дзеткі пабярэ?
Аказаўся салавейка ў садочку:
Я ж тваё гняздзечка сам разаўю,
— Я ж твае дзеткі сам пабяру.
Да плакала дзеванька ў святліцы,
Прылажыўшы галоўку к стальніцы:
— Бедна ж мая галоўка на свеці,
Хто ж маю косачку распляце,
Хто ж мяне да шлюбу завядзе?
Аказаўся брацейка ў каморы:
— Я ж твой братка родненькі,
Я ж тваю косачку распляту,
Я ж цябе да шлюбу завяду.

**У нашага войта на дварэ...**

У нашага войта на дварэ
Стаіць явар зялёны,
Пад яварам сталове,
За сталамі панове,
Радзяць рады тайныя,
Не так тайныя — дзіўныя,
Войтаўна сына ўрадзіла,
На бацьку няславу пусціла.
Не вінаваціць віноўнага,
Вінавацяць бацьку яе,
Што доўга замуж не выдаваў,
Вялікага пасагу шкадаваў,
Часта да свірна пасылаў
Ды з залатымі ключамі,

А з маладымі панічамі
Па вёд, па віно, па гарэлку
Такую дарослую дзеўку.

### Ай, то, то, ды за гарою за каменнаю...

Ай, то, то, ды за гарою за каменнаю, ай, то, то!
Стаяць коні вараныя,
Вараныя, прыбраныя,
Прыбраныя, сядланыя.
Як уссесці, паехаці
Да ўдованькі жаніціся.
Ды ўдованьку лёгка браці,
Лёгка браці, цяжка жыці:
Пасцель сцеліць — усё клянецца,
Спаць кладзецца — не хінецца.
За гарою за каменнаю
Стаяць коні вараныя,
Вараныя, прыбраныя,
Прыбраныя, сядланыя.
Як уссесці, паехаці
Да дзеванькі жаніціся.
Ды дзеваньку цяжка браці,
Цяжка браці, лёгка жыці:
Пасцельку сцеліць — усё смяецца,
Спаць кладзецца — прыхінецца.

### А ў горадзе на рынку...

А ў горадзе на рынку
П'ець худоба гарэлку,
А багаты дзівіцца,
Чым худоба жывіцца.
— Шынкарачка малада,
Падай піва і віна!
— Ах ты, добры моладзец,
На колькі табе?
— А на сто рублёў піва,
А на тысячу віна!
— Ах ты, добры моладзец,
Не сап'еш ты ўсяго.
Хоць я сам не сап'ю,
Таварышаў напаю.
Калі ты такі пан,
Я за цябе дзеўку аддам;
Харошую паненку —
Яўрэйскую наймічку.
Іх у касцёле вянчалі,
У каморы спаць клалі.
— Скажы, скажы, дзявіца,
Якога ты роду?
— Па бацюшку Карпаўна,
Па матушкі Войтаўна.
— Скажы, скажы, моладзец,
Якога ты роду?
— Па бацюшку Карповіч,
Па матушкі Вайтовіч.

— А хвала ж табе бог,
Што з сястрою спаць не лёг.
Пойдзем, сястра, у поле
Рассеімся травою,—
А на брату — сіні цвет,
На сястрыцы — жоўценькі.
Будуць дзеўкі краскі рваць
У вяночкі ўвіваць,
У вяночкі ўвіваць
Нас з табою памінаць...
А на Йвана Купала
Дзеўкі краскі ірвалі,
Дзеўкі краскі ірвалі,
У вяночкі ўвівалі,
У вяночкі ўвівалі,
Брата, сястру паміналі:
А брахцінька — сіні цвет,
А сястрыца — жоўценькі.

**Цераз гару чорна сцежка...**

Цераз гару чорна сцежка,
Да там ішла красна дзеўка,
За ёй ззаду бел-малойчык.
— Пастой, пастой, красна дзеўка,
Скажу табе шчыру праўду:
Каля ражства рожа цвіла.
— Праўда, праўда, бел-малойчык.
Я й там была, вянкі пляла.
Цераз гару чорна сцежка
Да там ішоў бел-малойчык.
— Пастой, пастой, бел-малойчык,
Скажу табе шчыру праўду:
Каля Пятра рэкі сталі.
— Праўда, праўда, красна дзеўка,
Я там быў, лёд прабіў, каня паіў.

**А на Купалу...**

А на Купалу
  Рана сонца іграла —
Рана сонца іграла,
  На добрыя годы —
На добрыя годы,
  На цёплыя росы —
На цёплыя росы,
  На хлябы ўраджаі —
На хлябы ўраджаі.

**Да ў адным канцы Купала...**

Да ў адным канцы Купала,
А ў другім канцы дзіўное.

Да на тым жа дзіўным дзевачка,
Да прышла па яе матачка:
Да ідзі, дачушка, дадому,
Прыехалі сваты з Альбова!
Да няхай жа едуць, да не мае.
Як будуць мае ехаць,
Да будзе дуброва звінець,
Да будзе музыка іграць,
Да будуць дзецючкі спяваць.

### Да не будзе лецечка...

Да не будзе лецечка
Да ніводнага дзянёчка,
Да не будзе ягадак
Ніводнае ягадкі.
Да не будзе дзевачак,
Да ніводнае дзеванькі:
Ягадкі з расы падуць,
Дзевачкі замуж пайдуць.

### Ой, у лесе, у лесе пры барку...

Ой, у лесе, у лесе пры барку,
Да рабіў дзяцінка каморку.
Да к яму дзевачка прыбяжала
Яна яго маладога навучала:
— Да рабі, дзяцінка, з акенцам,
Каб і к нам салавейка прылятаў,
Каб нас маладзенькіх пабуджаў.
Бо чужая матка, ні свая,
Да не будзе рана будзіці,
Пойдзе да суседа судзіці.
Сонейка зайдзе, пастаіць:
Да мая нявехна яшчэ спіць,
Сонейка зыйдзе, паграе,
Спіць мая нявехна, не дбае.

### А ў майго татулькі тры сады зялёных...

А ў майго татулькі тры сады зялёных,
Чацвёрты вішнёвы.
У адным садочку зязюлька кукуе,

У другім садочку салавей шчабечыць,
У трэцім садочку конёчык гагочыць,
У чацвёртым садочку Маланачка плачыць.
Зязюля кукавала — у шчыр бор паляцела,
Салавей шчабятаў — у лазу паляцеў,
Канёчак гагатаў — на вайну паехаў,
Маланачка плакала — ад таткі ўзялі,
Галоўку звязалі.

**Ой, дымна за дваром...**

Ой, дымна за дваром,
Едуць баяры ўсе радом,
Вязуць Янку на коніку,
Да яго галоўка на мячы,
Да за ім матачка плачучы:
«Ой, сынок Янка,
За каго галоўку палажыў?
Ці за пана-айца старога,
Ці за матку родную,
Ці за брацейка маладога,
Ці за сястрыцу малую?»
— Да не за пана-айца старога,
Да ні за матачку родную,
Да ні за брацейка маладога,
Да ні за сястрыцу малую:
Палажыў галоўку за дзеўку,
За яе ціхія паходы,
За яе нізкія паклоны.

**Перад Пятром, пятым днём...**

Перад Пятром, пятым днём
Разгуляўся Янаў конь.
Разгуляўся Янаў конь,
Разбіў камень капытом,
А ў камні ядра няма,
А ў мальчыкаў праўды няма.
Такая праўда, як узімку сонца,
Хоць яно яснае, але яно халоднае.
Перад Пятром, пятым днём
Разгуляўся Янаў конь,
Разгуляўся Янаў конь,

Разбіў арэх капытом.
У арэха ядро ёсць.
У дзевачак праўда ёсць.

### Купала на Івана! Што Іван робіць?..

Купала на Івана! Што Іван робіць? —
Косы клепець!
Купала на Івана!*
На што яму косы? — Сена касіць.
На што яму сена? — Кароў карміць.
На што яму каровы? — Малокі збіраць.
На што яму малокі? — Дзетак карміць.
На што яму дзеці? — Краскі ірваць.
На што яму краскі? — Свінней карміць.
На што яму свінні? — Горы рыць.
Што ў тых гарах? — Жалезная ступа.
Што ў той ступцы? — Палівана міска.
Што ў той місцы? — Макава зерне.
Дзе тое зерне? — А пятух склюваў.
Дзе той пятух? — На мора паляцеў.
Дзе тое мора? — Краскамі зарасло.
А дзе тыя краскі? — Дзеўкі парвалі.
А дзе тыя дзеўкі? — Замуж пайшлі.
Дзе іх мужыкі? — На вайну пайшлі.

### Зажурылася малада ўдованька...

Зажурылася малада ўдованька,
Што не кошана зялёна дубровенька;
Не журыся, малада ўдовачка,
Будзе скошана зялёна дубровачка.
Будзем наймаці касары маладыя,
Будзем плаціці па чатыры златыя.
Касары косяць — ветрык павявае,
Маё сенца ад сонца пасыхае.

### Ой, разгон, разгон Пятроў дзень...

Ой, разгон, разгон Пятроў дзень,
Паразганяў дзевачкі з гулячкі:
Годзі вам, дзевачкі, тут гуляць,
Бярэце сярпочкі, ідзеце жыта жаць!

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

### А я дзеўка добрая Алеся...

А я дзеўка добрая Алеся
Бацькі багатага,
Мой бацька — ясны месяц,
Мая маці — краснае сонейка,
Мае браты — ў саду салавейкі,
Мае сёстры — ў жыце перапёлкі;
Ясны месяц усю ноч свеціць,
Красна сонейка ўвесь дзень грэіць,
У садзе салавейка ўвесь дзень спяваіць,
У жыце перапёлкі — жыта падбіраюць.

### Да ў нашым сяле тры вуліцы...

Да ў нашым сяле тры вуліцы:
У першай вуліцы ружа лялея,
У другой вуліцы рамон бялее,
У трэцяй вуліцы крапіва млее.
Ружа лялея — то дзевачкі,
Рамон бялее — то малойчыкі,
Крапіва млее — то малодачкі.

### А ў лузе касец косіць...

А ў лузе касец косіць,
А ў лузе касец косіць
Ды, прылёгшы, галосіць.
— А чаго, касец, плачаш,
А чаго, касец, плачаш,
А ці твая каса тупа?
Ці твая каса тупа,
Ці твая каса тупа,
Ці твая жана скупа?
— А мая каса востра,
А мая каса востра,
А мая жана жостра.
Прынясла палуднаваць,
Прынясла палуднаваць,
У маленькім адлівачку.
У маленькім адлівачку,
У маленькім адлівачку
І хлеба скарыначку,
Цыбулькі быліначку,
Цыбулькі быліначку
І солі друбіначку.

### Ой, рана, рана, на Яна-Купала...

Ой, рана, рана, на Яна-Купала,
На вулачку сонейка дзевачак збірала,
У ручкі сярпочкі давала,—
Да годзе, дзевачкі, гуляці,

Да ідзіце ў поле жыта жаці,
Роўнае поле, роўнае,
Зародзіць бог жыта буйнае,
А ярую пшаніцу да на навіне,
Да збірайся, родзе, увесь ка мне.

## ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

### Гаварыла поле шырокае...

Гаварыла поле шырокае,
Жыта ядраное:
— Не магу я на полі стаяці,
Каласочкам махаці,
Толькі магу на полі капамі,
У гумне стагамі.
Гаварыла сужанькава маці:
— Не магу я па двару хадзіці,
Ключыкі насіці.
Толькі магу за сталом сядзеці,
Чарачкі наліваці,
Гасцей частаваці
Віном зеляненькім,
Мядком саладзенькім.

### У полі жыта палавее...

У полі жыта палавее,
У багатага душа млее,
Што ў засеку жыта тлее.
А ў беднага радуецца,
А ў беднага радуецца,
Што новы хлеб гатуецца,
Што з багатым зраўнуецца.

### Як пайду я дарогаю...

Як пайду я дарогаю,
Пушчу голас я дубровою,
Няхай голас галасуе,
Хто мой голас пачуе,
Той мяне пашкадуе.
А зачуў голас свёкарка.

— Калі ж дзіця маё голас вядзець,
Дык няхай ідзець пагуляе,
А калі ж нявестачка,
Хай ідзець пажынае.
Поле ж маё далёкае,
Рэзка мая шырокая.
А жыта маё ядронае,
А я ж яму дзіця не роднае.



*К. Альхімовіч.* Жніво

**Ой, час, пара дадоманьку...**

Ой, час, пара дадоманьку
Па постаці раса ўпала.
Па постаці лядовая,
Па коласі мядовая,
Лядовую валы з'ядуць,
Мядовую дзеўкі сап'юць.
Валы з'ядуць — гараць будуць,
Дзеўкі сап'юць — гуляць будуць.

**Да знаці пана, знаці...**

Да знаці пана, знаці
Да праміж усімі панамі:

Ён на коніку паязджае,
На коніку паязджае
Дай жэнчыкаў прыганяе:
— Жнеце, жэнчыкі, жнеце,
Жнеце, жэнчыкі, жнеце!
Ды самі сябе не пазнеце,
Не дажаўшы, не пойдзеце,
Не дажаўшы, не пойдзеце
Да тут начаваць не будзеце.

### Пераджані, божа, хмаркі...

Перажані, божа, хмаркі,
А-эй, перажані, божа, хмаркі,
На чужую старonaчку,
Дзе пажалі, пакасілі
Да снапочкі павазілі.
У нас не жата, не пажана,
А-эй, у нас не жата, не пажана
Да ў гуменца не звожана.

### Ой, не ляжы, ветру, ў полі...

Ой, не ляжы, ветру, ў полі,
Паміж горачак у разоры.
Да ўстань, ветру, памаленьку,
Павей ветрык паціхеньку,
Развей хмарачку цямненьку —
Маю тугу цяжаленьку.
Каб я малада жыта жала
І сярэдзіну сваю не зажала.
Панічыку, а панонічку, пусці мяне да доміку,
У мяне дома дзетак многа:
Што куточак то сыночак,
На покуці — дзевяць дочак.

### Ой, месяц ясненькі...

Ой, месяц ясненькі,
Асвяці нам дарожаньку,
Асвяці нам дарожаньку,
Кудэма ісці да доміку
Каля саду вінаграду

Да айчанькі на параду,
Да свякроўкі на вячэру,
Да мілога на пасцелю.
Вячэрайка у галушачкі,
Пасцель бела ў падушачкі.

### Да ўжо сонца за бор, за бор...

Да ўжо сонца за бор, за бор,
Пара жнейкі дамоў, дамоў,
На постаці раса пала,
На сярпочках іржа стала,
Малы дзеткі дома плачуць,
У старых бабак ручкі зябнуць,
У малодачак вянкі вянуць.

### Ой, закаціся, сонейка...

Ой, у лесе, у лесе пры барку,
Усё з гары ў далінку.
Ой, зрабі нам вячэраньку.
Няхай вечар бардзей будзе:
Нахадзіліся ножанькі,
Ой, нарабіліся ручэнькі,
Сярпы не жнуць, нажаліся,
Ручкі не ймуць, наймаліся,
Насвяціліся вочанькі
Аж да цёмнае ночанькі.

### Няхай вечар бардзей будзе...

Няхай вечар бардзей будзе,
Майму сэрцу лягчэй будзе.
Мой міленькі з таргу едзе,
Мне, маладой, гасцінец вязе—
Пярсцёначак залаценькі,
А вяночак руцвяненькі.
У пярсцёначку жыта жаці,
А ў вяночку красаваці.

## Паслаў мяне свёкар...

Паслаў мяне свёкар
Да ў бор жыта жаці,
Заказаў мне свёкар
Да сто коп нажаці,
Сорак кароў падаіці,
Трыццаць вепраў накарміці,
Дзяжу хлеба замясіці.
Я малада спазнілася,
Да дзіцяці забылася.
Прыляцела два лебядзі,
І абодва беленькія,
Браткі мае родненькія.
Узялі яны дзіця маё.
Адзін кажа: панясем мы,
Гэта ж нашай сястрыцы,
Што на чужой стараніцы,
Кожны яе наб'ецца,
Яе слёзкаў нап'ецца.

## Сакатала бочачка...

Сакатала бочачка,
У піўніцы стоячы,
— Калі мяне не вып'еце,
Я сама разліюся
Па дварэ расіцаю,
За варота крыніцаю.
Гаварыла дочачка
Сваёй роднай мамачцы:
— Калі мяне не аддасцё,
Я ад вас сама пайду
Па двары мяцёлкаю,
Да мілога пчолкаю,
Па дварэ расіцаю
Да мілога сініцаю.

## І звіўся хмель...

І звіўся хмель
З бярозаю зялёнаю,
Нажыўся Лявон
З жаной маладою.
Нанасіўся сарочак беленькіх,
Штаноў алляненькіх.
Бог яму даў
Жану маладую,
Сям'ю весялую:
У поле ідуць,
Як пчолкі гудуць
Да ўсё баравыя.
З поля ідуць —
Песенькі пяюць,
Да ўсё жніўныя.

## Ой, красуйся, жыцейка...

«Ой, красуйся, жыцейка,
Калі цёпла лецечка».
— Як жа мне красавацца?
Буен вецер павяваець,
Буен вецер павяваець,
Красу маю абіваець,
Не даець красавацца.
«Ой, красуйся ж, дзевачка,
У роднага татачкі».

— Як жа мне красавацца?
Кожны дзень сваты едуць,
Кожны дзень сваты едуць,
Не даюць красавацца,
Не даюць красавацца,
У белае прыбірацца.

### А высока, далёка...

А высока, далёка
Салавей гняздзечка ўець.
А павышай салаўя
Іванька церам ставіць:
На вуліцу вароцькамі,
К цясцю на двор ваконцамі,
Каб прыгожа глядзець было
На цесця багатага,
На цесця багатага,
На цешчу ласкавую,
На цешчу ласкавую,
На дзевачку ўдалую,
На дзевачку ўдалую,
На долю шчаслівую.

### Чырвона ружачка...

Чырвона ружачка
Блізка плоту стаяла.
Маладзенькая дзевачка
Ды да сонца ўстала.
З ружы росачку брала.
Расою ўмывалася,
Красою ўціралася,
У мамкі пыталася:
«Мамачка мая родная,
У што мне прыбраціся:
Ці ў атлас, ці ў аксаміт,
Ці ў ружовае золата?»
— У атласе — жыта жаці,
У аксаміце — пагуляці.
А ў ружовым золаце —
Да свякрухі ў хатку,
Каб яна дый пазнала,
Сваім дзіцем назвала.

### Дзевачка з поля ішла...

Дзевачка з поля ішла,
За поясам сярпок нясла,
За поясам сярпок нясла,
За плячыма — калысачку,
А на руках — дзіцятачка.
Калысачка — цыргі-цыргі,
Дзіцятачка — кугі-кугі.

### Палуднічкі прагудзелі...

Палуднічкі прагудзелі,
Палуднаваць захацелі.
Хоць гудзіце, не гудзіце,
Палуднаваць не будзеце:
Шчэ постаці не пражалі,
Капы снапоў не звязалі.

### Кругло, мало балоцечка...

Кругло, мало балоцечка,
Хоць жа яно кругло, мало,
Але ж яно ўрадлівае:
Наляцела пташак многа,
З імі разам салавеечка.
Нізка, мала Аленачка,
Хоць жа ж яна нізка, мала,
Але ж яна шчаслівая:
Наехала сватоў многа,
Выбрала сабе Іваньку.

### Наш гаспадар маладзенькі...

Наш гаспадар маладзенькі,
Пад ім конік вараненькі.
Ён усё поле аб'язджаіць,
Сваіх жнеяк аглядаіць:
Ці ўсе яго ў полі жнеі,
Ці ўсе звязаны іх жмені?
Ці ўся яго талочанька,
Ці зжата ўся валочанька?

## А чыя ж то валока...

А чыя ж то валока*
Доўга і шырока?
На ёй жэнчыкі жалі,
Серпікі паламалі.
Серпікі сталёвыя,
Жэнчыкі маладыя,
Паджынайся, нябожа,
Табе бог дапаможа.
Паперадзі лебедзі,
А ззаду мядзведзі.
Паперадзі віно п'юць,
А пазадзі кіём б'юць.

## Выйшла маці жыта жаці...

Выйшла маці жыта жаці,
Стала сярпы перакладаці.
Няма сярпа залатога —
Жанца маладога.
Вышла свякроў жыта жаці,
Стала сярпы раскладаці.
Прыбыў сярпок залаценькі —
Жанец маладзенькі.

## Што ў мяне была за свякровачка...

Што ў мяне была за свякровачка,
Што ў яе была за наровачка.
Сама ўстане ранюсенька,
Мяне ўкрые цяплюсенька:
— А спі, нявехна, высыпайся,
На работу не спяшайся.
Пакуль у полі сонца ўгрэецъ,
Сонца ўгрэецъ, расу абвеецъ,
Тады, нявехна, у поле пойдзеш.

## Баліць мая сярэдзінка...

Баліць мая сярэдзінка,
Што жыта маё рэдзенька;
Сярэдзінка не гнецца,
Постаць мая валачэцца;
Няма маёй маці
Мне постаці падагнаці,

* Кожны першы радок паўтараецца двойчы.

Няма маёй сястрыцы,
Маёй большай памочніцы,
Сястрыца б постаць падагнала,
А я трохі пастаяла,
Да й варон пастраляла.

### Добры вечар, нашай маці...

Добры вечар, нашай маці,*
Ці гатова вячэраці?
Ідзець твае дзіцятачка
Утаміўшыся, умарыўшыся,
Ядраное жыта жнучы.

### Чые гэта талачане...

Чые гэта талачане,
Што па полю блудзілі?
Пыталіся яны Лунінскага сяла,
А Януськава двара.
Там столікі цясовыя,
Там кубачкі залатыя.
Там столікі засціланы
І кубачкі наліваны
Мядком саладзенькім
І віном зяляненькім.

### Ой, дайце мне загон-разгон...

Ой, дайце мне загон-разгон,
Маладога павязнечка.
Ён са мною снапы звяжа,
Ён са мною спаці ляжа,
Снапы звяжа, памацуе,
Спаці ляжа, пацалуе.

### Ой, пара й, пара да двара...

Ой, пара й, пара да двара,**
Цёмная ночанька абняла,
Цёмная ночанька і нявідна,
Шырока дарожка й грудліва.
Вараны конічак спадбіўся,
Малады Іванька спазніўся.

---

* Кожны радок паўтараецца два разы.
** Кожны радок паўтараецца два разы.

### Ой, я маладзенька дый жыта жала...

Ой, я маладзенька дый жыта жала,
ой, маладзенька
Дый жыта жала.
Ой, жала, жала дый шчыравала,
Ой, вочкі потам дый залівала.
Ой, я маладзенька дый жала, жала
Дый дзве ночкі дома не начавала.
Начавала я ў чыстым полі дый
Пад арэхавым, дый пад кусточкам,
Пад арэхавым дый пад кусточкам,
Ой, укрывалася дый мокрым лісточкам.

### Ой, закаціся, ярка сонейка...

Ой, закаціся, ярка сонейка,
Дый за лес цёмны, дый за горачку,
Дый за лес цёмны, дый за горачку,
А мне пара ісці дадомачку,
А ў мяне дома дый ліхі свёкар,
Дый ліхі свёкар дый свякрухна.
Ой, стрэнуць мяне на вароцечках,
Ой, пашлюць мяне дый па вадзіцу.
Ой, пашлюць мяне па вадзіцу,
Ой, у шчыры бор, у крыніцу.
Я ж, маладзенька, шчэ й не снедала,
Шчэ й не снедала, й не абедала,
Шчэ й не снедала, й не абедала,
А мая родная мамка дый не ведала.

### Глядзіць, глядзіць маё вочка...

Глядзіць, глядзіць маё вочка,
Беражочак недалёчка,
А на гэтым беражочку
Стаіць прыганяты,
Здаровы, чубаты.
Судзі, божа, мне дажаць.
Бо ён скуру можа зняць.

### Сіняе азёрачка...

Сіняе азёрачка,
Чаго затанула?

Як жа мне не тануці,
Наляцелі шэры гусі
Й беражкі абтапілі,
Наляцелі шэры гусі,
Беражкі абтапілі
І вадзіцу замуцілі.
Маладая Манячка,
Чаго ж ты зажурылася?
Як жа мне не журыцца?
Наехалі чужаземцы, майго татку ўпаілі,
Наехалі чужаземцы, майго татку ўпаілі,
Маю мамку абманілі
І мяне заручылі.

**У слаўнага пана...**

У слаўнага пана
На зары жыта жала,
Па месяцу копы клала,
Дадому пайшла па ночы,
Вячэрала пры свечы,
У белым свеце спаць лягла,
Лажылася, гаварыла:
— Божа мой, калі я запачыну!
Ужо ж свет за гадзіну.

**Да гула пчолка, гула...**

Да гула пчолка, гула,
Па бару лятаючы,
Да мядок збіраючы:
— Горкі мой мядочку
Да без цябе, мой бортнічку.
Да плакала ўдовачка,
Да па двару ходзячы,
Да дроўцы збіраючы,
Да абед гатуючы:
— Горкі мой абедзе
Да без цябе, мой міленькі.
Сама сяду на покуце,
А дзеткамі абсажуся,
Слёзкамі абальюся.
Дзеткі ж мае маленькія,

Слёзкі мае драбненькія;
Дзеткі мае пабольшалі,
Слёзкі мае пагоршалі.

### Вялік наш бор, вялік...

Вялік наш бор, вялік
Над усімі барамі,
Багат наш пан, багат
Над усімі панамі.
Няма такі пана дома,
Паехаў ён у Шклова
Чарачак пакупаці,
Жнеечак частаваці.
Нашы жнейкі маладыя,
Іх сярпочкі залатыя,
Па месячку жыта жалі
І сярпочкі паламалі.

### Ты наш пане — баране...

Ты наш пане — баране,
Пускай дамоў заране.
Наша пані авечая
Дзяржала нас да вечара.
Дымна ў полі, дымна
Да й нічога не відна.
Наша пані затапіла,
Нам вячэры наварыла.
Наварыла боршчу
І накідала хвошчу,
І наварыла сачавіцы,
Накідала й чамярыцы,
Хоча жняцоў патравіці.

### У добрага пана...

У добрага пана
Пры месячку жыта жала.
Бадай яму кроўна,
Што пускаў да дому цёмна.
Бадай яму горка,
Што пускаў да дому зоркай.

### Ой, жыта жну, пажынаю...

Ой, жыта жну, пажынаю,
На дарожаньку пазіраю,
Да ці скора маці ісціме,
Мне абедаць нясціме?
Нясе хлеба булачку
І мядочку у кубачку.
Я жыта жну, пажынаю,
На дарожаньку пазіраю.
Да ці скора свякроў ісціме?
Нясе хлеба скарыначку
І вадзіцы ў чарапочку.

### Мая мамка, мая кветка...

Мая мамка, мая кветка,
Не аддавай мяне ўлетку,
Да аддавай мяне ўзімку,
Штоб сабрала сабе сілку
На свёкраву дзесяцінку.
Бо у свёкра поле далёкае,
А загоны шырокія,
Азяроды высокія,
А падпоры жалезныя,
А жнеечкі маладыя.
Я з імі не сажнуся,
Да з загонам астануся.

### Ой, у полі бярэзінка...

Ой, у полі бярэзінка,
Баліць мая сярэдзінка
Ды некаму спагадаці,
Сярэдзінку патаптаці.
А дай жа божа кугакала,
Каб пад снапком заплакала,
А я б пашла скалыхнула,
Сярэдзінка б аддыхнула.

### Поле маё, поле маё вялікае і вясёлае...

Поле маё, поле маё вялікае і вясёлае,*
Вялікае і вясёлае, й прыгожае й прывольнае.

* Кожны радок паўтараецца два разы.

Па полю іду, па полю іду — весялюся,
Па полю іду, па полю іду — красуюся,
Дамоў прыду, дамоў прыду — не шчуюся.

**Добра жаць — шырокая ніўка...**

Добра жаць — шырокая ніўка,
Вялікая постаць.
Добры вечар, сцюдзёная хатка,
Не родная матка!
Не пытаецца, ці змарылася,
Што спазнілася.
Ды пытаецца, ці доўга пражала,
Ці многа нажала.
Добра гнаць — шырокая ніўка,
Вялікая постаць.
Добры вечар, цёплая хатка,
Родная матка!
Не пытаецца, ці злянілася,
Ці многа нажала.
Ды пытаецца, ці змарылася,
Што спазнілася.

**Ой, пара дамоў, пара...**

Ой, пара дамоў, пара.
Ужо й пара мінаецца,
Ужо й пара мінаецца,
Ды наш пан валяецца:
То за пень, то за елку,
То за бабу, то за дзеўку.

**На лугу касцы косяць...**

На лугу касцы косяць,
Косяць, косяць ды мыляюцца,
На мяне ўглядаюцца,
Што я тонка, высока,
Што я бела, румяна,
Хараша я ўбрана,
На лугі я паслана.

## Лета ж маё, лецейка...

Лета ж маё, лецейка,
Ужо я твая не жнеечка!
Матка ж мая, ды матуленька,
Ужо я твая не служачка!
Таго ж я служачка,
З кім на каберцы стаяла.

## Ды ўжо вечар, вечарэе...

Ды ўжо вечар, вечарэе,
Мая мамка вячэрае,
Вячэрае ды астаўляе
Ды ў вакенца паглядае:
Нейдзе ж маё дзіця ў полі
Пры вялікім загоне,
Пры вялікім загоне,
Пры вялікім прыгоне.
Ды вячэрай, мая мамка,
Я ўжо вячэрала.
Не сухі я хлеб ела,
Слёзкамі палівала.

## Калі ж тая серада прайшла...

Калі ж тая серада прайшла,
Як я не еўшы на прыгон пайшла,
Увесь дзень жала, не лянілася,
Злому войту пакланілася.
А цяпер не аб чым тужыць:
Войт п'яны ў карчме ляжыць.

## Сонейка, сонейка...

— Сонейка, сонейка,
Ці бывала ты ў найме?
Ці бывала ты ў найме,
Ці спагадаеш ты мне?
Каб ты ў найме пабывала,
Ты ж бы мне спагадала:

Позненька ўзыходзіла,
Раненька заходзіла!
— Малада малоданька,
Не дзіві ты на сонейка,
Не дзіві ты на сонейка,
Ды дзіві ты на пана:
Я й раненька ўзыду —
Цябе ў полі знайду,
Я й позненька зайду —
Цябе ў полі пакіну!

**Ой, пара нам дамоў, пара...**

Ой, пара нам дамоў, пара,
Сцюдзёная раса пала,
Цёмная ночка настала.
А ў нас няма параднічка,
Ні пана, ні ўраднічка.
Некаму рады радзіці,
Нас дамоў адпусціці.
Дадзім пану паўбарана,
Можа пусце дамоў рана.
Бадай яго з нашым панам:
З'еў нашага паўбарана,
З'еў нашага паўбарана,
Бадай пана разарвала,
Бадай пана разарвала,
Не пусціў нас дамоў рана.
Вяліць прыйсці світаючы,
А пушчае змяркаючы.

**Ой, гудцы гудуць...**

Ой, гудцы гудуць, гудцы гудуць,
Усенькі людзі палуднуюць.
Ці гудзеце, не гудзеце,
Палуднаці не будзеце,
Ваш прыстава развусенькі,
Вы жэнчыкі маладыя,
У вас сярпочкі залатыя.
А як сталі, заспявалі,
А як селі, зазвінелі.

### Закурыўся ціхі, дробны дождждык...

Закурыўся ціхі, дробны дождждык...
Да па чыстаму полю,
Зажурыўся мой татачка родны
Па маёй горкай долі.
Не курыся, ціхі, дробны дождждык,
Да па чыстаму полю,
Не журыся, мой татачка родны,
Па маёй горкай долі.
Ні сама я долечку шукала —
Мужа выбірала.
Пан багаты з залатой палаты
Даў мне мужа ката.
Закурыўся ціхі, дробны дождждык
Да па чыстаму полю,
Зажурыўся мой татачка родны
Па маёй горкай долі.

### Пара дамоў, пара...

Пара дамоў, пара,
Халодная раса пала,
Халодная раса пала,
Нам дамоў пара стала.
Ой, чуйце дома, чуйце,
Нам вячэрку гатуйце,
На вячэрку рыбку з перцам,
Легчы спаць пад акенцам,
Легчы спаць пад акенцам,
Эй, з маладым кавалерцам,
Эй, з маладым кавалерцам,
Эй, да на белай пасцельцы.

### А мы поле рачком сышлі...

А мы поле рачком сышлі,
Пад мяжою вянок знайшлі,
А-а-ай, пад мяжою вянок знайшлі
Ды й паненцы прынеслі.
Наша пані маладзенька,
А-а-эй, наша пані маладзенька.
Да злавіла верабейку,

Да на кухні гатавала,
А-а-эй, да на кухні гатавала,
Сваіх жнеек частавала.
Жніце, жніце, мае жнейкі,
А-а-эй, жніце, жніце, мае жнейкі,
Не дажаўшы, не пойдзеце,
Не дажаўшы, не пойдзеце,
А-а-эй, не дажаўшы, не пойдзеце,
Без вячэры не ляжаце.

### А пара нам дамоў ісці...

А пара нам дамоў ісці,
Пагубляла зара ключы
Каля постуці ідучы.
— А хто ж мае ключы знойдзець,
Той жа ў восень замуж пойдзець,
А дзяўчынка йшла і ключыкі знайшла
І ў восень замуж пайшла.

### Да ў нашага пана...

Да ў нашага пана
Да нядобрая слава:
Па месяцу жыта жалі,
Па зорах копы клалі.
Цёмна ў полі, цёмна,
Бадай таму цямней было,
Хто да хаты не пушчае,
Да на полі нас трымае.
Да мы позна з поля ідзём,
Да прыганятага клянём.

### Дажынкі

Да падзякуйма богу
Да за яго выгоду:
Да за ціхае лета,
Да за буйнае жыта.
Да мы ўсё лета жалі
Да не ляжалі,
Да не ляжалі,
Усё каласкі збіралі.
Да мы поле рачком сышлі,
Да пад мяжой вянок нашлі,
Да прынеслі на галоўцы,
Палажылі на талерцы.

**Ай, добра ноч!..**

Ай, добра ноч!
Шырокае поле,
Жыта ядраное,
Ай, добра ноч!
На здароўе,
Жнейкі маладыя,

Вы сажніце
Шырокае поле,
Жыта ядраное,
Да сажніце!
Пастаўляйце
У полі капамі,



*К. Альхімовіч.* Дажынкі

Сярпы залатыя,
На здароўе!
Прыхадзіце
Заўтра раненька,
Як сонейка ўзойдзіць,
Прыхадзіце!
Прынасіце
Адзін гаршчок кашы,
А другой сараквашы,
Прынасіце!

А ў лузе стагамі,
Пастаўляйце!
А мы зжалі
І поле пажалі,
І пастаўлялі
У полі копамі,
У полі копамі,
А ў гумне стогамі
Пастаўлялі.

### Ой, хадзіў Раю...

Ой, хадзіў Раю,
Ой, хадзіў Раю, Раю, мой Раю,
Да па вуліцы.
І ніхто Раю, Раю, мой Раю,
У хату не клічыць.
Ой, абазваўся,
Ой, абазваўся, Раю, мой Раю,
Молад Іванька:
«А хадзі, Раю,
А хадзі, Раю, Раю, мой Раю,
Ка мне ў хатку.
У маёй хатцы,
У маёй хатцы, Раю, мой Раю,
Як у святліцы.
Стаяць столікі,
Стаяць столікі, Раю, мой Раю,
Пазасціланы.
Кубачкі мёдам,
Кубачкі мёдам, Раю, мой Раю,
Паналіваны.
Жнеячкі мае,
Жнеячкі мае, Раю, мой Раю,
Пазазываны.
Усе ў радочак,
Усе ў радочак, Раю, мой Раю,
Папасаджаны».

### Хадзіў Спарыш па вуліцы...

Хадзіў Спарыш па вуліцы,
Па вуліцы па шырокай,
Па мураўцы па зялёнай,
А ніхто Спарыша ў двор не завець.
Выйшла, выехала Хвядорыха:
Хадзі, Спарыш, ка мне на двор,
Ка мне на двор, за цясовы стол:
У мяне сталы пазасціланы,
Віном кубкі паналіваны,
У мяне пірагоў панапечана,
У мяне мёду панасычана,
У мяне кашы наварана.
Сядзь, Спарыш, на покуце,
На покуце да на золаце.
Пі, Спарыш, зялёна віно.
Спарыш, божа, у маім гумне,
У маім гумне, у маім дварэ:
На таку ўмалот, а ў дзяжы падход,
А ў печы рост, а на стале сыццё.

### Разгарыся вячэрняя зорка...

Разгарыся вячэрняя зорка
Перад ранней,
Расхадзіся, наша гаспадынька,
Перад жнейкамі,

Кажы выносіць цясовыя сталы
На чыстыя двары,
Бяры залатыя ключы
З-пад пояса,
Адмыкай жа залатымі ключамі
Зялёную скрыню,
Выбірай ў зялёнай скрыні
Бялёвыя абрусы,
Засцілай, наша гаспадыня,
Цясовыя сталы,
Налівай жа, наша гаспадыня,
Залатыя кубкі,
А частуй жа старшую жнейку,
Пастацяначку:
— Будзь здарова, старшая жнейка,
Пастацяначка!
На здароўе, мая гаспадыначка,
Сенатарачка!

### Каціўся вяночак па полю...

Каціўся вяночак па полю,
Прасіў жэнчыкаў дадому:
— Ідзеце, жэнчыкі, дадому,
Занясеце мяне ў стадолу,
Палажэце мяне ў старону,
Ой, то я пайду на ніву,
Ой я, мне на ніве гадзіна,
Ой я, мне ў старне гасціна!
— Адчыняй нам, пане, вароты
Нясемо вяночак з золата,
Ой, не з золата, з крапівы,
Бо шчэ мы гарэлкі не пілі.

### У нас сягоння вайна была...

У нас сягоння вайна была:
Усё поле зваявалі;
Да пану жыта пажалі,
А ты ж, пане, не ўлякайся,
Ды ў пакой не хавайся,
Бо мы ёсць не жаўнеркі,
А панскія жнейкі.

Да выходзь, пане, выходзь,
А віна бочку выкоць,
І белы сыр на талеркі,
Частуй свае жнейкі.
Да ўмеў жа нас прыганяць,
Умей цяпер частаваць.

### Ляцеў саколік па полю...

Ляцеў саколік па полю,
Збіраў пташачкі да бору:
«Да бору, пташачкі, да бору,
Ужо наляталіся па полю!»
— Нямнога ж мы лятали,
Чырвоны ягадкі збіралі!
Ездзіў гаспадар па полю,
Збіраў жанцы дадому:
«Дадому, жэначкі, дадому,
Ужо нагуляліся па полі!»
— Нямнога то мы гулялі,
Усё густа жыта жалі.
Тоўстыя снапкі вязалі,
Частыя копкі складалі.
Колькі на небе зорачак,
Столькі на полі копачак.

### Рада, рада шэра перапёлка...

Рада, рада шэра перапёлка,
Што лета даждала.
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.

Перамёрзла шэра перапёлка
Глыбока ў крыніцы,
У сцюдзёнай вадзіцы.

Перамёрзла наша гаспадынька
Без жытняга хлеба,
Без кіслага квасу.

Радзей таго наша гаспадынька,
Што жнеек сабрала
І жыта дажала.

### Ніўка, ніўка, аддай маю сілку...

Ніўка, ніўка, аддай маю сілку
На другую ніўку!
На коніка лой, на ніўку гной,
А мне здароўя!

Судзі, божа, налета жаці
І ядранейшае і гусцейшае.

### Адчыняйце шчытовы вароты...

Адчыняйце шчытовы вароты,
Ідуць жнеі з работы,
Ні так жа з работы,
Як з жаркай пякоты!
Вечар вечарэе, душа весялее,
Заранка зарае, душа занывае,
Што трэба ісці на работу,
На жарку пякоту!

### Ой, я з поля цяку, бягу...

Ой, я з поля цяку, бягу:
Да сярпочак за поясам,
Дый малазён на ручаньках.
Дзеля цябе, малазён,
Да мне ў маткі не быці,
Вох, з руты вянка не звіці.
Ой, да хоць я яго саўю,
Вох, то насіці не буду.
Зносіць мая залавіца,
Яго родная сястрыца.

### Жала я жыта...

Жала я жыта да не ляжала,
Ой, я жала яго па шчырай праўдзе,
Да не давайце да па чарачцы,
Да давайце ж па цэлай кварце.
Й ад чарачкі я не ўп'юся,
Й ад квартачкі ж да не павалюся,
Ой, я ж табе, мой бацюхна,

7 Зак. 3328

Йшчэ ж дзянёк да пажынаю.
Да лугамі ж йду, песні ж пяю,
Й аж лужочкі разлягаюцца,
Да сялом іду сільна плачу,
Варожачкі ж пацяшаюцца.
— Да пацяшайцеся, да варожачке,
Да й на сваё ж да бяздолейка,
Ах, я ж пецьму ж да й гуляцьму,
Калі ж маё да й здароўечка.

### А ў нашага пана...

А ў нашага пана
Дажыначкі рана,
Люлі, люлі, дажыначкі рана.
Усё жыта пажалі,
У копы паклалі,
Люлі, люлі, ў копы паклалі.
А ў полі капамі,
На гумне стагамі,
Люлі, люлі, на гумне стагамі.
На гумне стагамі,
У клеці карабамі,
Люлі, люлі, у клеці карабамі.
У клеці карабамі,
У печы пірагамі,
Люлі, люлі, у печы пірагамі.

### Да ці выйшла да цёмная туча...

Да ці выйшла да цёмная туча
З-пад цёмнага лесу?
Да не выйшла да цёмная туча,
Да не выйшла,
Да высыпала да дробнага дожджу
Да буйнага ветру.
Да ці выйшла наша гаспадынька
Раненька на ніўку.
Да ці выйшла?
Да не выйшла наша гаспадынька
Раненька на ніўку,
Да не выйшла.
Да высылала трох сынкоў-сакалкоў,

Дачок-перапёлак,
Да высылала мілых жней:
— Жніце, жніце, сынкі-сакалкі,
Дочкі-перапёлкі,
Жніце, жніце, мае мілы жнейкі,—
Вам прынясу гарэлкі.
Жніце, жніце на халадочку —
Прынясу мядочку.
Жніце, жніце па шырокай ніве —
Прынясу вам піва.

**Дажынычная**

Пахіліўся зялёны дубочак
З гары ды ў далочак,
пахіліўся.
Пакланіўся малады малойчык
ды роднай матулі,
пакланіўся.
Паехаў ён долам даліною,
чужой дальняй староною,
паехаў ён.
Дый вышукаць багатага цесця,
ласкавай паненкі,
пашукаць ён.
Праездзіў ён жалезныя колы,
вараныя коні,
праездзіў ён.
Не знайшоў ён багатага цесця,
ласкавай паненкі,
не знайшоў ён.

**А чы поўна арэхавая чаша...**

А чы поўна арэхавая чаша
Ядром налітая?
А так поўна — ні калыхнецца
І ні пральецца.
А чы поўна гаспадара гумно
Дабром навязёна?
А так поўна — ні з канём уехаць,
Ні пяхотаю ўйці.
Толькі можна сокалу ўзляцець,
Дабро паглядзець.

# ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ

## Чаго ты, косю, чаго, сівенькі?..

Чаго ты, косю,
Чаго сівенькі,
Ды к сялу
прылятаеш?
Ды ці ты, косю,
Ці ты, сівенькі,
Цяжку зіму чуеш?
— Ды хоць цяжкую,
Хоць не лёгкую,
Не будзе, як
лецейка:
Я ўлетку хаджу,
Расіцу тапчу,
Зялёную траву
грызу,
А ўзімку хаджу,
Сняжок тапчу,
Сухую лазу грызу.

— Чаго, Манечка,
Маладзенькая,
К століку
прылягаеш?
Ці ты, Манечка,
Маладзенькая,
Ліхую свякроў чуеш?
— А хоць ліхую,
Хоць не ліхую,
Не будзе роднай
мамкай:
Я ў мамкі хаджу,
Косачку чашу —
Я ў яе работнічка,
У свякроўкі хаджу,
Работку раблю —
Я ў яе нягоднічка.

## А ў цёмным лесе...

А ў цёмным лесе,*
Люлі-рана, мядзведзь рыкаіць.

Мядзведзь рыкаіць,
Люлі-рана, дзевак пужаіць.

Рыкай, ні рыкай,
Люлі-рана, я не баюся.

Толькі ж баюся,
Люлі-рана, асенняй ночкі.

Асення ночка,
Люлі-рана, цёмна, вяліка.

Яна разлучыць,
Люлі-рана, з айцом і мамкай.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Яна прылучыць,
Люлі-рана, к чуж-чужаніну.

К чуж-чужаніну,
Люлі-рана, к свёкру, свякроўцы.

### Ай, у бару ціцярук балбочыць...

Ай, у бару ціцярук балбочыць,
А ён з бору ляцеці не хочыць,
Ай, у бору ягодкі салодкі,
У крыніцы вадзіца студзёна.
Гапулька ат маткі іці не хочыць.
У матулькі позняе ўставанне,
У матулькі ранняе ўкладанне,
А ў матулькі гладкае часанне,
У матулькі бела умыванне,
У матулькі ранняе сняданне.
У свёкраткі такога не будзіць:
У свёкраткі позняе ўкладанне,
У свёкраткі ранняе ўставанне.
У свёкраткі не бела ўмыванне,
У свёкраткі не гладка часанне,
У свёкраткі позняе сняданне.

### Сінія мае два галубочкі...

Сінія мае два галубочкі,
Голасна забрукуйце,
Падайце тугу зялёнаму лугу,
Майму татку жалю:
Ён мяне дае і не ведае,
Якая доля будзе.
— Дачушка мая, мілае дзіця,
Я табе тое даю,
Я табе тое даю,
Што ў хазяйстве маю,
Пра долю не ўгадаю.
Сінія мае два галубочкі,
Жаласна забрукуйце,
Падайце тугу зялёнаму лугу,
І маёй мамцы жалю:
Яна ж мяне дае

І не ведае, якая доля будзе.
— Дачушка мая, мілае дзіця,
Я ж табе гэта даю,
Я ж табе даю,
Што ў скрыні маю,
А пра долю не ўгадаю.

### Восень мая, восень...

Ой, восень мая,
Восень сцюдзёная,
Чаго ты рана захаладала.
Я й не раненька,
Я й не позненька,—
Калі мая пара прышла:
Лісточак апаў, зямельку ўслаў,
Вось мая і пара прышла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі,
Во мая й другая пара.

### Ай, восень, восень, макрота...

Ай, восень, восень, макрота,*
Дзецюкам жаніцца ахота,
Дзевачкам ісці няволя,
Заняволіла субота
Усё й татулькава работа.

### Ужо не раненька, ужо не позненька...

Ужо не раненька, ужо не позненька —
Сонейка на заходзе.
Была ў мамачкі адна дачушка
І тая на выходзе.
Пайшла у каморку і чэша галоўку,
Беленька умываецца.
Выйшла з каморкі, выйшла з новенькай,
Мамачцы скланілася.
— Дзякуй, мамачка, дзякуй, родненька,
За тваё гадаванне,
Што гадавала, што шкадавала,

* Кожны радок спяваецца два разы.

Што нямножка пасылала,
А хто не гадаваў, а хто не шкадаваў,
Той пасылаці будзе.

### Няпраўдзівая каліна казала...

Няпраўдзівая каліна казала:
Цвесць не буду,
Белага цвету не пушчу,
Чырвоных ягадак не ўраджу.
Як вясна прыйшла — зацвіла.
На ёй цвяточык бяленькі,
На ёй ягад паўнеренька.
Няпраўдзівая дзевіца казала:
Замуж не пайду.
Як восень прыйшла — дак пайшла,
Яна жаніха ўзлюбіла.
Ці ў слядок яго ступала,
Ці хлеба яго скушала,
Што яна яго, маладога, спадабала?

### Перапёлка, перапёлка...

Перапёлка, перапёлка!
Не вій ты гняздзечка
Блізка ля дарожкі
Перапёлка, перапёлка!
Пастухі пагонюць,
Гняздзечка папоруць
Перапёлка, перапёлка!
Суві ты гняздзечка
На зялёным дубу
Перапёлка, перапёлка!
Станіць вецер павеваць,
Тваіх дзетак калыхаць
Перапёлка, перапёлка!
Ты дзеванька!
Ты дзеванька!
А не вій вяночка!
Восень недалёчка
Ты дзеванька!
Ты дзеванька!
Сваточкі прыедуць,
Цябе з сабой возьмуць
Ты дзеванька!
Ты дзеванька!

### Бярозка з лістом...

Бярозка з лістом
Усю восень шумела.
Мая бярозка, мая белая!
Як мы растанемся?
— Ты мой лісточык,

Ты мой зялёны,
Так мы растанемся,
Ветры павеюць,
Цябе абвеюць,
А я застануся.
— Мая бярозка, мая белая!
Я ж цябе не забуду,
На вясну к табе буду.
Дачушка з мамкай
Усю ночку гуляла:
Мая матулька, мая родная!
Як мы расстанемся?
— Сваты прыедуць, цябе возьмуць,
А я застануся.
— Мая й матулька, мая й мілая!
Я ж цябе не забуду,
Не тужы, радная,— не забуду.
Зараз у госцікі буду.

### Ай, чый то конік пад борам...

Ай, чый то конік пад борам,*
Увесь золатам укован?
Лявонькаў конік пад борам,
Увесь золатам укован.
Хто ж яму золата надаваў,
Хто ж яму коніка ўкаваў?
Надавалі золата каралі,
Укавалі коніка кавалі.
На ўсе чатыры ножанькі.
Каб не баяўся слізгаты,
На ўсе чатыры ночанькі.

### А віхор каліну паламаў...

А віхор каліну паламаў, **
А на ціхі Дунай кладку гнаў,
Там ішоў Ванька з абою,
Вёў сваю дзевачку з сабою.
— Хадзі, мая дзевачка, са мною.

* Кожны радок паўтараецца два разы.
** Кожны радок паўтараецца два разы.

— Баюся з табою, баюся:
Гібкая кладачка — увалюся,
Глыбокая рэчка — утаплюся.

### Дзе я радзілася, не была...

Дзе я радзілася, не была,*
Там мяне цёмная ночка абняла,
Пад калінаю спаць лягла,
Ножкамі каліну кранула,
На мяне каліна канула,
Не буду такая, як была,
Як мяне мамачка радзіла.
А цяпер я ў свякроўкі,
Да не ў роднага таткі,
Я стала бела, як папера,
Стала тонка, як былінка.

### Ой, заржы, заржы, вараны каню...

Ой, заржы, заржы, вараны каню,
Рана з падвор'я йдучы,
Ці не пачуе млада дзяўчына,
У саду вяночка ўючы.

Конічак іржаў, аж явар дрыжаў,
Дзяўчынанька пачула,
Яна пачула, цяжка ўздыхнула,
Жаласна заплакала:

— Чаму не прыйшоў ці не прыехаў,
Як я табе казала?
Ці каня не меў, ці дома не быў?
Ці маці не пускала?

— А я дома быў і коніка меў,
Мяне маці пускала,
Меншая сястра, бадай, не ўзрасла,
Сядзёлачка схавала:

«Не едзь, Ясенька, не едзь, брацейка,
Да тае дзяўчынанькі —

* Кожны радок паўтараецца два разы.

Не ўмее жаці, ні вышываці,
Толькі косу часаці».

— Расці ты, каса, хоць да пояса,
Буду цябе часаці,
Ці не пакіне а мой Ясенька
Мяне верна кахаці!

**Праду я, праду, спатанькі хачу...**

Праду я, праду, спатанькі хачу.
Як пайду я ў каморачку,
Прыкладу я галовачку там,
Ці не засну, ці не паляжу.
Свёкарка ідзець, мяне судзючы:
— Санлівая, драмлівая, на работу лянівая,
Толькі ёй усё спаць,
Толькі ёй усё драмаць.
Праду я, праду, спатанькі лягу,
Як пайду ж я ў каморачку,
Прыкладу я галовачку там,
Ці не засну, ці не задрамлю.
Свякроўка ідзець, мяне судзючы:
— Санлівая, драмлівая, на работу лянівая.
Праду я, праду, спатанькі хачу.
Як пайду я ў каморачку,
Мамачка ідзець, мяне жалееЦь:
— Дзіця маё ж дарагое,
Пашло замуж маладое,
Дзеткі абнялі, спаткі не далі.

**Ай, упала ластаўка, упала...**

Ай, упала ластаўка, упала
У тое дзядоўе колкае.
Ай, у тую макрыцу, травіцу.
Ай, па ёй жа пташкі тужылі,
Не тужыце, пташкі, вы па мне!
Я тое дзядоўе паламаю,
Я тую макрыцу, травіцу пакашу,
Ай, упала Гапулька, упала.
Ай, у тое дзевер'е ліхое,
Ай, у тыі залоўкі-чачоткі,

Не тужыце ж, дзевачкі, вы па мне:
Я тое дзядоўе пажну,
А заловак-чачотак пааддаю,
А ліхія дзевер'я ў суседзі,
А залоўкі-чачоткі ў гасціны.

**А тонка-звонка сасонка...**

А тонка-звонка сасонка,
А рана-рана, сасонка.
Затое тонка, што ў бару,
А рана-рана, што ў бару.
Служыў Антонька каралю,
А рана-рана, каралю.
А служыў, служыў да году,
А рана-рана, да году,
Выслужыў шубу да долу,
А рана-рана, да долу.
А служыў, служыў да канца,
А рана-рана, да канца,
Заслужыў каня-варанца,
А рана-рана, варанца.
А сеў, паехаў да вянца,
А рана-рана, да вянца.

**Хто на стаёнцы зазвоніць...**

Хто на стаёнцы зазвоніць,
Рана-рана, зазвоніць?
А там Косцячка выходзіць,
Рана-рана, выходзіць,
Сівога каня выводзіць,
Рана-рана, выводзіць.
За ім мамачка выходзіць,
Рана-рана, выходзіць:
— Куды, сыночак, паедзеш,
Рана-рана, паедзеш?
— Паеду, мамка, на рынак,
Рана-рана, на рынак,
Буду выбіраць там дзевак,
Рана-рана, там дзевак.

### Там пад борам-лесам...

Там пад борам-лесам
Там мядзведзь рыкае,
Цёмна, позна,
Там мядзведзь рыкае.

У маладой малодкі
Свякроўка ліхая,
Цёмна, позна,
Свякроўка ліхая.

А таму мядзвёдку
Саладзін падкіну,
Цёмна, позна,
Саладзін падкіну.

Я сваю свякроўку
Пярынай прыкрыю,
Цёмна, позна,
Пярынай прыкрыю.

Няхай той мядзвёдка
Саладзіны смокча,
Цёмна, позна,
Саладзіны смокча.

Хай мая свякроўка
Пад пярынай квокча,
Цёмна, позна,
Пад пярынай квокча.

### Авясец, мамухна...

Авясец, мамухна!
Авясец!
А калі ж чорт сватоў
Прынясець?
Пачакай, дачушка,
Пажнёмся —
Тагды мы сватоў
Дадждомся;
Мы ім вячэрку
Згатуем —
Да сваіх сваточкаў
Участуім.
Купленая гарэлка
На куце,
Грыбіны пірог
На стале,
Пражоная яешня
У вагне.

### Дзе ты, хмелю, быў?..

Дзе ты, хмелю, быў,
Дзе ты, хмелю, рос,
Чаму ж ты не развіўся?
— Я ў саду рос,
Прыўдарыў мароз,
Затым я не развіўся.

— Дзе, малойчык, быў,
Дзе, малойчык, жыў,
Чаму ж не жаніўся?
— Я ў цара быў,
Я ў цара служыў,
Затым не жаніўся.

### Ой, пры Дунаю, пры ціхусенькім...

Ой, пры Дунаю, пры ціхусенькім,
Ой, позна, позна, пры ціхусенькім,

Млода Варуська кубачкі мыла,
Ой, позна, позна, кубачкі мыла,

Кубачкі мыла, вянка забыла,
Ой, позна, позна, вянка забыла.

Да хто паедзе па мой вяночак,
Ой, позна, позна, па мой вяночак.

Татулька кажыць: я не паеду,
Ой, позна, позна, я не паеду,

Я не паеду, каня не маю,
Ой, позна, позна, каня не маю,

Каня не маю, вянка не знаю,
Ой, позна, позна, вянка не знаю.

Франучок кажыць: я сам паеду,
Ой, позна, позна, я сам паеду.

Коніка маю, вяночак знаю,
Ой, позна, позна, вяночак знаю.

### Вядзьмедзька кару дзярэць...

Вядзьмедзька кару дзярэць,
Вядзьмедзька кару дзярэць.
Дзяўчына ваду бярэць,
Дзяўчына ваду бярэць.
«Вядзьмедзька, нашто кара,
Вядзьмедзька, нашто кара?
Дзяўчынка, нашто вада,
Дзяўчынка, нашто вада?»
— Карою хатку крыці,
Карою хатку крыці,
Вадою лаўкі мыці,
Вадою лаўкі мыці.
Хатку крыці — зімаваці,
Хатку крыці — зімаваці,
Лаўкі мыці — сватоў ждаці,
Лаўкі мыці — сватоў ждаці.

### Пушчу я паву..

Пушчу я паву
Рана-рана, па Дунаечку,
А сама пайду
Рана-рана, па беражочку,

А ці не ўвіджу
Рана-рана, таткавы сені,
Таткавы сені,
Рана-рана, новыя дзверы?
Па гэтых сенях
Рана-рана, мне не хадзіці.
Пушчу я паву
Рана-рана, па Дунаёчку,
А сама пайду
Рана-рана, па беражочку,
А ці не ўвіджу
Рана-рана, свёкравы сенцы,
Свёкравы сенцы,
Рана-рана, старыя дзверцы?
Па гэтых сенцах
Рана-рана, па іх хадзіці,
Па іх хадзіці
Рана-рана, у свёкра жыці.

### Дабро маё зеляное, зеляное...

Дабро маё зеляное, зеляное,
Я й па табе, дабро маё, пахадзіла,
У цёмным лесе, зялёненькім заблудзіла.
Татка кліча — я й не чула,
Дабро маё зеляное.
Я й па табе, дабро маё, пахадзіла,
У цёмным лесе, зялёненькім заблудзіла.
Мамка клічыць — я й не чула,
Па голасе не спазнала,
Роднай мамкай не назвала, не назвала.
Дабро маё зеляное, зеляное, зеляное,
Я й па табе, дабро маё, пахадзіла, пахадзіла,
У цёмным лесе, зялёненькім заблудзіла.
Мілы клічыць — я пачула, я пачула,
Па голасе, па голасе я й спазнала, я й спазнала,
Сваім мілым, сваім мілым я й назвала.

### Ходзіць вутачка па сенажаці...

Ходзіць вутачка па сенажаці,
Сама сабе разважае:
«Ці ў мора плысці, ці ў мора плысці,
Ці на беражку быць?

У мора паплыўшы, ў мора паплыўшы —
Нечага жыраваці.
На беражку быўшы, на беражку быўшы —
Недзе зімаваці».
Ходзіць дзевачка па падвор'ейку,
Сама сабе разважае:
«Ці замуж ісці, ці замуж ісці,
А ці ў дзеўках быці?
Замуж няйшоўшы, замуж няйшоўшы —
Людская пагаворка.
Замуж пайшоўшы, замуж пайшоўшы —
Бедная галоўка».

### Ой, зара мая, несхадзімая...

Ой, зара мая, несхадзімая,
Ой, ля-лё, рана, несхадзімая.
За што я ў таткі нешчаслівая,
Ой, ля-лё, рана, нешчаслівая?
З царама йдучы, ўцерала ключы,
Ой, ля-лё, рана, ўцерала ключы.
А прызнайцеся, хто за мной ішоў,
Ой, ля-лё, рана, хто за мной ішоў?
Хто за мной ішоў, ключыкі знайшоў,
Ой, ля-лё, рана, ключыкі знайшоў?
Калі маленькі — братцам назаву,
Ой, ля-лё, рана, братцам назаву.
Калі старэнькі — таткам назаву,
Ой, ля-лё, рана, таткам назаву.
Калі роўніца — то замуж пайду,
Ой, ля-лё, рана, з ім жыць буду.

### Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?..

Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?
Ой, люлі, люлі, не зялёны стаіце? *
Як жа нам, канапелькам, зялёным стаяці,
Ой, люлі, люлі, зялёным стаяці:
Зверху канапелькі клююць вераб'і,
З ісподу канапелькі вада падмыла,
А ў сярэдзіне канапелькі хваля зламіла.
Чом ты, дзевачка, не вясёлая ў танку?

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Як жа мне вясёлаю ў танку стаяці,
Бацюшка кажа — за князя аддаць,
Мамачка кажа — у чорныя чарнушкі.
Ой, стукаў, пагрукаў у цясовыя вароты,
Мне бачца, мой бацька з князямі, з баярамі,
Аж то мая мамка з чорнымі чарнушкамі.



На ворыве

**Лугавая зязюлечка, лугам ляціш...**

Лугавая зязюлечка, лугам ляціш,—
Чаму не кукуеш?
Ужо тваё мінулася вясенняе кукаванейка,
Настала асенняе жыраванейка.
Ой ты, дзеўка-дзяўчыначка, ад бацькі йдзеш,—
Чаму не заплачаш?
А ўжо тваё мінулася, дзевачка, каханейка,
Ма́шына гулянейка.

**Ішла цяцера з лугоў, з балотаў...**

Ішла цяцера з лугоў, з балотаў,
Рана, рана.*

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

За ёй суполе ясны саколік:
— Пастой, цяцера, пастой, рабая,
Знімаю табе рабае пер'я,
Жадаю табе саколлі крылля!
— Я ні кідаю рабае пер'я,
Я ні жадаю саколля крылля!
Ішла Франуска з хаты на ранак,
А за ёй суполе малады Стасік.
— Пастой, Франуска, пастой, малада,
Знімаю табе румяны венчык,
Складаю табе шаўковы чэпчык!
— Я ні скідаю румяны венчык,
Я ні жадаю шаўковы чэпчык.

### Ці я табе, мая мамачка...

Ці я табе, мая мамачка,
Усю вясну не казала:
— Не ары барку ды не сей маку,
Я яго рваць не буду.
Узары дарожку, пасееш гарошку
Для сваіх малых дзетак.
Людзі прыдуць, мяне забяруць,
Твой мак зазімуе.

### Досыць, калінка чырвоненькая...

Досыць, калінка чырвоненькая,
Табе ў лузе стаяці.
Цябе, калінка чырвоненькая,
Пташачкі склявалі.
— Ні так пташачкі, ні так пташачкі,
Як дробны птушанятка.
Прылятуць — клюнуць, палятуць — клянуць:
— Ягадкі ні салодкі.
Досыць, дзевачка маладзенькая,
Табе ў мамкі гуляці.
Цябе, дзевачка маладзенькая,
Суседкі асмяялі.
— Ні так суседкі, ні так суседкі,
Як мае пароўніцы.
Ай, няхай судзяць, няхай гавораць,

Бо я іх не баюся.
Сваты прыедуць, я замуж пайду,
І я з іх насмяюся.

**Час дамоў, час дамоў, час дамоў ісці...**

Час дамоў, час дамоў, час дамоў ісці,
А ў маім дамочку раёчкі ўюцца.
Усё раі, усё раі, усё непустыя.
Ай, носяць мядочкі да ўсё густыя.
А хто ж тыя раёчкі аграбаць будзець,
Аграбаць раёчкі будзіць Міцечка,
Спажываць мядочкі будзіць Верачка.

**Хадзіла дзевенька...**

Хадзіла дзевенька
Калі рэчанькі,
Крыкнула, гукнула
Перавознічку.
Адклікнуўся, адгукнуўся
Яе міленькі:
— Я ж к табе, мілая,
Чаўнаком плыву.
— На тваім чаўночку
Я не плавала.
— Я ж табе, мілая,
Масты машчу.
— Па тваім масточкам
Я не хадзіла.
— Я ж табе, мілая,
Конікаў пашлю.
— На тваіх коніках
Я не ездзіла.
— Я ж табе, мілая,
Баяры пашлю.
— З тваімі баярамі
Я ні знаюся.
— Я ж к табе, мілая,
Сокалам ляту.
— Я ж к табе, мілы мой,
Перапёлачкай.

**Недаспелая макаўка...**

— Недаспелая макаўка,*
А дзе ж ты будзеш даспяваць?
А ці ў гародзе на лясе (градзе),
А ці ў капуснай баразне?
Маладая Валечка!
А дзе ж ты будзеш дарастаці?
А ці ў татулькі на куце,
А ці ў мілога на руцэ?

**Гуляй, гуляй, шчука, плаціца...**

Гуляй, гуляй, шчука, плаціца,
Пакуль цёпла вадзіца!

* Кожны радок паўтараецца два разы.

Маразы ударацъ, возеры станущь,— гуляць
не будзеш.
Гуляй, гуляй, малада дзеванька,
Пакуль у роднай маманькі!
Як у людзі пойдзеш, работку зададуць.—
Гуляць не будзеш.
Цябе, маладу, пашлюць па ваду,
Самі сядуць абедаць.
Горы — высокі, воды — далёкі,
на абед не паспееш.
Прынясеш вады для сваёй бяды,
Кожнаму трэба даць піць:
Дасі старому, дасі малому
і мужаньку маладому.
Дадуць кусочак, пайдзеш у куточак —
Тут твой абед будзе.

## Ой, не вылятай, сіва зязюленька...

Ой, не вылятай, сіва зязюленька,
З куточка сенажаці:
Сокалы ляцяць, на цябе глядзяць,
Хочуць цябе ўзяці.
Ой, няхай ляцяць, ой, няхай глядзяць,
То я іх не баюся,—
У вішнёвым саду, у кляновым лісту
Я ад іх схаваюся.
Ой, не выглядай, малада дзеўка,
І з бацькавага двара:
Бо едуць сваты, музыкі іграюць,
Хочуць цябе ўзяці.
Ой, няхай едуць, ой, няхай йграюць,
То я іх не баюся,—
А ў майго бацькі нова камора,
То я там схаваюся.

## Разлійся, вадзіца...

Разлійся, вадзіца,
А па лугу, па даліне,
А па жоўтаму пясочку.
Расплачся, Гапулька,
Па роду, па племені,
А па русай касіцы,
У мяне ж была
Ці не косанька?
Ў мяне ж была
Ці не русая?

Чорным шоўкам
Пераплецена.
А золатам
Перавязана?
Як наехалі госці
З чужыя валосці —
Чорны шоўк папарвалі,
А золата разабралі,
А Гапульку сабе ўзялі.

**Асіна балота красіла...**

Асіна балота красіла,
Мар'ічка Івана прасіла:
— Вязі мяне, Іван, дзе ўзяў,
Каб мой вяночак тут не звяў.
— Не бойся, Мар'ічка, не звяніць,
Калі мая мамачка загляніць,
На галоўцы вянок заззяіць,
Студзёнай вадой абаллець.

**Віліся пчолачкі...**

Віліся пчолачкі
Каля ніцай лозачкі.
— Віціся, не віціся —
Паціханьку садзіціся,
Сучайка не абагніце,
Лісцейка не абатрыце.
А віліся сваточкі
У дзеванькі за столікам:
— Віціся, не віціся —
Паціханьку садзіціся,
Серабра не абагніце,
Золата не абатрыце.

**Ой, зялён мой лён, зялён...**

Ой, зялён мой лён, зялён,
Да пры мяжы стоячы,
Да пры мяжы стоячы,
Галоўкамі звонячы.
— Не дадуць даспяліці,
Галоўкамі пазваніці.
— Ой, бяда мая, бяда,
Што я ў мамачкі адна.
Не дадуць дасядзеці.
Касіцы дарасціці,
Касіцы дарасціці,
Кубяльца налажыці,
Ой, кубялец мой новы,
Не за год налажоны,
Не за год налажоны,
За гадзіну страчоны.

**Каханка дзеванька, каханка...**

Каханка дзеванька, каханка,
А ў ей косынка кованка,
Не было каваля — раскаваць,
Не было грабянцоў — расчасаць.

Былі кавалі ў дарозе,
А былі грабянцы ў возе.
Прыехалі кавалі
З чужой стараны,
Дзевіцы косынкі раскавалі,
А сужанькі коніка падкавалі.
Былі ў дзяўчыны істужкі,
То яго коніка падпружкі.
Былі ў яе малады пярсцёнкі,
То яго коніка падкоўкі.

**Затужылася Евачка...**

Затужылася Евачка,*
Што рана восень настала.
Рутая мятачка завяла.
Не з чага маладзе вянка звіць,
На галовачку ўзлажыць.
Зачуў тое Лявонька.
— Не клапаціся, Евачка,
Я ўчора на таргу пабываў,
Я ж табе вяночак старгаваў,
А з руты з мяты зялёны,
З чырвоненькае каліны.

**Ды на полі ліпа з сонейкам йграець...**

Ды на полі ліпа з сонейкам йграець,
Рана, рана,**
Малады маладзец коніка сядлаіць,
А старшы брацітка яго намаўляець:
— Выбірай, брацітка, на ніўцы,
А не выбірай, брацітка, на рынку,
На рынку дзевачкі хваслівы,
А на ніўцы дзевачкі працаўлівы.

**Кляновы лісточак...**

Кляновы лісточак,
Ды куды ты пакоцішся,
Ці ўгару, ці ў даліну,
Ці ў бор на кляніну?

---

* Кожны радок паўтараецца два разы.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

Ды я й сам не ведаю,
Куды вецер пакоціць,
Ці ўгару, ці ў даліну,
Ці назад на кляніну!
Маладая дзяўчыначка,
Ды куды ты ідзеш?
— Я й сама не ведаю,
Куды маці аддае,
Ці ў сяло, ці ў прысёлле,
Ці ў дзявочае бяздолле!

### Хадзіў-пахадзіў...

Хадзіў-пахадзіў
Ясен месяц па небу,
Лічыў-палічыў
Зараначкі на небе.
Не далічыўся
Адной зораньκі вячэрняй,
А бог знаіць, бог ведаіць,
Дзе яна?
Каму яна, каму яна
Гэту ночаньку свяціла?
Да ці яна, да ці яна
Ў поўнач з месяцам хадзіла?
Хадзіў-пахадзіў
Андрэйка па хаце,
Лічыў-палічыў
Сямеечку ды сваю.
Не далічыўся, не далічыўся
Адной Гапулькі сваёй.
Ах, бог знаіць, бог ведаіць,
Каму яна, каму яна
Гэту ночаньку служыла?
Да ці яна, да ці яна
Ў поўнач з міленькім хадзіла?

### Зялёная дубравачка...

— Зялёная дубравачка,*
Чаго рана зашумела,
Лісця тваё пажаўцела?

* Кожны радок паўтараецца два разы.

— А як жа мне не шумець,
Лісцю майму не жаўцець,
Наехалі злыя людзі,
Злыя людзі татарыны,
Вязлі з сабой татарачку,
Маладую шынкарачку.
Руса каса да паяса,
Чорным шоўкам уплецена,
А золатам пазалочана.
Яны пада мной начавалі,
Вялікі агонь раскладалі,
Таго й рана зашумела,
Лісця маё пажаўцела.

### Ішла дзевачка за вароцейкі...

Ішла дзевачка за вароцейкі,
Расплятаючы коску.
За ёй мамачка, за ёй родная,
Разліваючы слёзкі.
— Пастой, дзіцятка, мы з табою пагаворым,
— Не буду стаяць, не буду чакаць.
Не буду й гаварыць.
Мне людзі кажуць, я й сама знаю,
Што мне ў цябе не быці.
— Дзевачка мая, дзіцятка маё,
Ідзі ў садочак, сарві цвяточак,
Стань сабе ля дзевачак.
Дзевачкі стаяць, па вяночку дзяржаць,
Там цябе дажыдаюць.
—Жаночкі сядзяць, па сыночку дзяржаць,
Там мяне дажыдаюць.

### За цёмным лесам — трава павяла...

За цёмным лесам — трава павяла,
За благім мужам — жана прапала.
На ніўку пойдзець — ніўку праклінаець:
— Каб гэта ніўка — пакарацела,
Каб гэта пастацька — павузела,
Каб я старэнька — яшчэ пастарэла!
За цёмным лесам — трава зялёна,
За добрым мужам — жана вясёла.

На ніўку пойдзець і бога просіць:
— Каб гэта ніўка — падаўжэла,
Каб гэта пастацька — пашырэла,
Каб я, маладзенька,— памаладзела!

### На моры вутачка купавалася...

На моры вутачка купавалася,
Яна свайго пер'ечка дзівавалася.
— Пер'ейка ты маё сізенькае!
Ці будзеш сізае на чыстым полі,
Як цяпер сізае на сінім моры.
У каморы дзевачка ўмывалася,
Сваіх белых ручак дзівавалася,
— Ручанькі мае бяленькія!
Ці будзеце белыя ў свякроўкі,
Як цяпер у матулькі?

### Закракатала шэра вутанька на рацэ...

Закракатала шэра вутанька на рацэ —
Заплакала родна матулька па дачцэ.
— Не плач, родна матулька, па мне.
Мамка, пойдзеш у чыста поле авёс жаць,
А я пайду на сіне мора хусты праць.
Ранняю, вячэрняю зарою
Да й сайдуцца нашы галаскі з табою.

### Ой, чаго, зімачка...

Ой, чаго, зімачка,
Ой, чаго, лютая, раненька настала.
Ой, не раненька,
А ўжо позненька зімачка настала.
Ужо лісточык апаў,
Дый зямліцу ўваслаў.
То мая пара прышла.
А рэчачкі сталі дый пазамярзалі —
То й пара другая.
А чаго, дзевачка,
А чаго, красачка маладзенька,
Замуж пайшла.
А я ўжо вырасла,

Як былінка ў полі —
То мая пара прышла.
А я ўжо расцвіла,
Як ружачка ў садзіку —
То і пара і другая.

**Румяна поле, румяна...**

Румяна поле, румяна,
Рана, рана, румяна.
Поўны двор каней нагнана,
Рана, рана, нагнана.
Ніхто тых каней не пазнаў,
Рана, рана, не пазнаў.
Да ніхто ў стаенкі не загнаў,
Рана, рана, не загнаў.
Вышла Алёнка, пазнала
І да стаенкі загнала,
Рана, рана, загнала.
Прыйшла ў хату, сказала,
Ой, рана, рана, сказала:
— Пойдзеш, татачка, да току,
Ой, рана, рана, да току,
Дай конічкам аброку,
Ой, рана, рана, аброку.
Сівому каню болей дай,
Рана, рана, болей дай.
А я пайду ў чужы край
Да за чужое дзіцятка,
Будзе свякроўка — не матка.

**Былі ў дзеда тры дачушкі...**

Былі ў дзеда тры дачушкі.
То дзеду бог даў! *
Адна выйшла за гаршкаля,
Другая выйшла за хлебароба,
Трэцяя выйшла за дудара.
Гаршкаль едзе — воз гаршкоў вязе,
Хлебароб едзе — воз хлеба вязе,
Дудар едзе — воз дудак вязе.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

### Журавы лятуць...

Журавы лятуць,
Палудзень нясуць,
Будзем палуднаваць.
Журавы селі,
Палудзень з'елі,
Нечага палуднаваць.
Мамачка ідзе,
Палудзень нясе,
Будзем мы палуднаваць.

### Ападае лісточак...

Ападае лісточак
На жоўты пясочак,
Дзевачцы да на вяночак.

### На гары лён...

На гары лён, на гары лён, белы кужаль,
валакністы, валакністы.
Не з кім стаці, не з кім стаці лён ірваці,
і гукаці, і гукаці.

Мамка кажа, мамка кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
А мне з мамкай, а мне з мамкай а ні рвання,
ні гукання, ні гукання.*

Татка кажа, татка кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
А мне з таткам, а мне з таткам, а ні рвання,
ні гукання, ні гукання.

Сястра кажа, сястра кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
Мне з сястрою, мне з сястрою, а ні рвання,
ні гукання, ні гукання.

Мілы кажа, мілы кажа: — Я з табою,
з маладою, з маладою.
А мне з мілым лён ірванне, лён ірванне і гуканне.

* Пасля 2—4-га куплетаў паўтараецца першы.

### Доўга, доўга я з вечара сяджу...

Доўга, доўга я з вечара сяджу,
Тонкі белы кужалёк праду.
Часта, часта праз аконачка гляджу.
Я думала: ясен месяц ўсходзіць,
Ажно мой міленькі каля аконка ходзіць.

### Як пайшоў жа кужаль па кутах, па лаўках...

Як пайшоў жа кужаль па кутах, па лаўках.
Каліна, маліна мая! *
Па кутках, па лаўках, па дзеўках-красаўках.
Да прышоў жа кужаль ды к нашай Насцінцы,
А наша Насцінька — ды тонкая пралля,
Ды тонкая пралля, ды звонкая ткалля:
Увадзіла ніткі пароўна калена,
Пароўна калена — таўсцей за палена.
Задумала Насцінька красенкі йткаці,
Пайшла ў добры людзі бёрды дабываці.
Бёрда не дабыла — сабак надражніла.
Сабак надражніла, людзей насмяшыла.
Параілі людзі па пнёўю снаваці,
Па пнёўю снаваці, ў ізгароду ткаці,
У ізгароду ткаці, калом прыбіваці,
Ехалі баяры, бог помач давалі:
— Бог помач, Насцінька, красёнцы йткаці!
— Красёнцы йткаці — калом прыбіваці,
— Дачкам — на платочкі, сынам — на парточкі.
Павязла Насцінька бялізну бяліці:
На рэчку каламі, а з рэчкі — валамі.

## ТАЛОЧНЫЯ ПЕСНІ

Талочныя песні хоць і развіліся ў рамках паэзіі земляробчага календара, але стаяць крыху асобна. Яны звязаны са старажытнай формай узаемадапамогі ў працы — талакой (адсюль паходзіць і іх назва). На талаку склікаліся сваякі і суседзі. Збіраліся талокі вясной — на вывазку гною, у жніво — на дажон, часам і ўвосень — на малацьбу, вывазку дрэва на зруб... Спяваліся талочныя песні звычайна ў застоллі. У іх успа-

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.

мінаўся сам гаспадарчы занятак, але пераважалі бяседныя матывы. Найбольш захавалася песень так званай жніўнай талакі, але нямала ёсць і песень веснавой талакі. Усе талочныя песні вылучаюцца жартоўным зместам.

**Талака, талака...**

Талака, талака
Талачылася,
Увесь дзень па полі
Валачылася.
Павывозілі,
Да ўвесь гнаёчак
Раскалацілі,
На ручках гнаёчак



*К. Альхімовіч.* Наём работнікаў

Мы ўвесь гнаёчак
Павыносілі,
На падводачках
Перадзяржалі,
Ножкамі зямельку
Перамералі.

**Гаспадар, гаспадар...**

Гаспадар, гаспадар,
Выхадзі з клеці,
Вынасі, вынасі
Кварту гарэлкі.
Мы твае гнаёчкі
Павывозілі,
Мы твае хлявочкі
Павычышчалі,
Мы твае нівачкі
Пазасцілалі.

### А і добра мы табе...

А і добра мы табе,
Татулька, зрабілі:
Мы твае хлявочкі
Папаражнілі,
Мы твае нівачкі
Пазалацілі.
Заплаці ж вознічкам
Хоць па грыўнічку,
А сваім капачам —
Па рубельчыку.

### Чыя ж гэта талака?..

«Чыя ж гэта талака
Шчуку-рыбу валакла
А сабе на вячэру?»
— Іванава талака
Шчуку-рыбу валакла
А сабе на вячэру.
Гаспадыня тужыла,
Што вяліка дружына:
Піва не набраці.
А гаспадар таму рад:
«Садзіцеся, жнейкі, ў рад,
Буду частаваці».

### Талака, талака...

Талака, талака
Талачылася,
Таўкучы, мелючы,
Я змарылася.
Сеяла мучыцу —
Апылілася.
Вышла на вуліцу —
Скаланулася
Ды сваім суседкам
Наругнулася.
Работка мая —
Уся пыльная,
Маім суседзям
Дый завідная.

### Добра мне, добра...

Добра мне, добра
За старым дзедам:
Не маю клопату
За яго хлебам.
Пойдзець у карчомку —
А я за ім следам.
З карчомкі ідзець —
За ручку вядзець.
Прывёўшы дамоў,
Пасцельку сцелець.
Паслаўшы пасцель,
Спатачкі кладзець.
«Спі, мая мілая,
Да белага дня:
У мяне не дзесяць —
Ты ў мяне адна».

### Як сядзем мы на лавачцы...

Як сядзем мы на лавачцы,
Як вып'ем ды па чарачцы,
Як сядзем мы на роўненькай,
Як вып'ем ды па поўненькай.

А мы пілі, не ўпіваліся,
Што дамоў ішлі — не валяліся,
У вароцейках пахіліліся,
У новых сенях паваліліся.

### На мяне казалі...

На мяне казалі:
Пасялушачка,
На мяне казалі:
Пасялушачка,
А я ў свайго таткі
Весялушачка,
А я ў свайго таткі
Весялушачка.
На мяне казалі:
Па сялу хаджу,
На мяне казалі:
Па сялу хаджу,
А я ў свайго таткі
Работку раблю.
А я ў свайго таткі
Работку раблю.
На мяне казалі:
Горка п'яніца,
На мяне казалі:
Горка п'яніца,
А я ў свайго таткі
Дый работніца.
А я ў свайго таткі
Дый работніца.

### А знаць наш бацюшка багата жывець...

А знаць наш бацюшка багата жывець,
Яго талака далёка слывець,
А ў яго талака ўсё наёмная,
Паплаціць бацюшка талачаначкам:
Маладым дзевачкам па чырвончыку,
А маладым важтайкам па рубельчыку,
А сваім кідачом паддай гарбачом:
За імі конікі настаяліся,
Малыя важтайкі нагуляліся,
У полі дзеванькі напяяліся.

### А чыя ж то жана па двару ходзіць?..

А чыя ж то жана па двару ходзіць,—
Двор разлягаець?
Максімава жана па двару ходзіць,—
Двор разлягаець.
На ганачак ўзойдзіць — аж ганачак гнецца,
А ў клетаньку ўвойдзець — аж клетанька ззяець,
За пляшачку возьмецца — гарэлачка льецца,
За чарачку возьмецца — гарэлачка п'ецца.

### Ішла талака з чыстага поля...

Ішла талака з чыстага поля,
З круглае ніўкі:
— Гаспадынька, запалі свечку,
Выдзі на сустрэчку.
Не пытаіць наша гаспадынька,
Ці жывы-здаровы, ці крэпкі, вясёлы,
Толькі пытаіць: ці многа ўвазілі,
Ці многа ўлажылі?
Улажылі поле нязмернае,
Увазілі вазы незлічоны.

### Ці не пчолка...

Ці не пчолка
Зазвінела звонка
З улля вылятая?
То ж не пчолка —
Наша гаспадынька
Па двару хадзіла,
Ключыкі насіла,
Каморы адмыкала,
Кубкі налівала,
Кубкі налівала,
Гасцей частавала.

### Ах вы, мілы мае бабачкі...

Ах вы, мілы мае бабачкі,
Вы пажалі маё жыцечка, у-у!
Вы пажніце маю белую яр,
Пабярыце канапелечкі,
Пакапайце мае градачкі,
Пакажыце мне парадачкі!

### Ды знаць наша доля худая...

Ды знаць наша доля худая,
Наша гаспадынька скупая:
Схавала чарачку пад хвартух,
На свайго мілога міргала:
— А схавай, мой міленькі, бутэльку,
Пап'юць талачанкі ўсю гарэлку.

### А мы свайму пану...

А мы свайму пану
Да ўчынілі славу,
Славу ўчынілі,
Гнаёк навазілі,

Ніўку украсілі.
Радзі ж, божа,
Жыта на навозі
Дай, божа!
Такое й на аблозі
Жыта ядраное,
Калоссе буйное.

**Каля месяца, каля яснага...**

Каля месяца, каля яснага
Усё дробныя звёзды,
У нашага гаспадара каля століку
Усё любыя госці.
А ты, Андрэйка, ты татулькаў сын,
Прыглядай жа гасцей,
А ты, чарачка пазлачоненька,
Да хадзі ж ты часцей.

**Ня слава, ня слава, Андрэйка, твая...**

Ня слава, ня слава, Андрэйка, твая,—
Не п'яна, не п'яна талака твая.
Учыні ж ты, Андрэйка, славу сваю,
Напаі, напаі талаку тваю.
А ўчыніў жа Андрэйка славу сваю,
Напаіў, напаіў талаку сваю.
У хлеве мужчынкі покатам ляжаць,
А на ніве жоначкі, як званкі, звіняць.
У хлеве мужчынкі б'юцца-дзяруцца,
А на ніве жоначкі пяюць, смяюцца.

**Ні слава, ні слава, Яначка, твая...**

Ні слава, ні слава, Яначка, твая,—
Ні п'яна, ні п'яна талака твая!
Талачу, талачу — талачаначкі,
Папілі, паелі прыхаджаначкі.
Талачу, талачу — талакі ні ўняць,
Не дадуць гарэлкі — не буду спяваць.
Капачы ў хлеве, як свінні, ляжаць.
Дзеванькі на полі, як пчолкі, звіняць.

**Ні слава, ні слава, гаспадар, твая...**

Ні слава, ні слава, гаспадар, твая,—
Ні п'яна, ні п'яна талака твая.

А ў хлеве, ў хлеве мужчынкі п'янюсенькі,
А ў полі, ў полі жоначкі цвеconsisting разюсенькі,
А ў хлеве мужчынкі, як жучкі, гудзяць,
На полі жоначкі, як пчолкі, звіняць.
Да ўчыні, да ўчыні славіньку сваю
Да ўпаі, да ўпаі талаку тваю.

### Вы мужове-панове...

Вы мужове-панове!
Піце піва п'яное,
Гаварыце мужское:
А ў каго мамка стара —
У той хаце слаўна.
А чыя жонка добра —
У той хаце штодзень гульня,
У каго жонка ліха,
У хаце няціха.

### Таргуйся, таргуйся, Кірылку, з намі...

Таргуйся, таргуйся, Кірылку, з намі,
Мы твае поленька злотам слалі,
Золатам, золатам да ўсё серабром,
Дай жа нам, Кірылка, хоць па талеру,
Вайшцякам, вайшцякам хоць па рублялёчку,
Капачам, капачам хоць па бізуночку,
Што яны табе наругаліся,
На стайні конікі настаяліся,
У полі жоначкі напяяліся.

### Па полю сіз голуб лятаіць...

Па полю сіз голуб лятаіць,
А ён свае галубкі шукаіць:
— Ай, каб мая галубка са мною,
А ўмеў ба ж я па полю лятаці,
А ўмеў ба ж я пшанічку клявацці...
Іванічка ўсё па двару ходзіць,
А ён сваю Алесечку просіць:
— Ай, каб мая Алесечка са мною,
А ўмеў ба ж я пры сталу стаяці,
А ўмеў ба ж я жнеек частаваці.

### Сілязенька галоўка сізенька...

Сілязенька галоўка сізенька,
А крылейка быстрынька,
Ці пераляціш шырокае поле,
Глыбокае мора?
— Не пералячу я шырокага поля,
Глыбокага мора,
Толькі пералячу імхі ды балоты
Ды вузкія валокі!
— А ты, Аўдулька, нежнае дзіцятка,
Ці перанясеш матульчыну негу
К свёкру на падвор'е?
— Не перанясу я матульчыну негу
К свёкру на падвор'е,
Толькі перанясу цяжкае ўздыханне,
Слёзнае абліванне.

### Ні слава, ні слава, Ярэмка, твая...

Ні слава, ні слава, Ярэмка, твая,
Ні п'яна, нясыта талака твая,
Хто ў цябе, Ярэмка, работку рабіў?
Хто ў цябе, Ярэмка, гарэлку папіў?
— Рабілі работку талачаначкі,
Папілі гарэлку прыхажайкі.
Трасейкам-паненкам хоць па талеру,
А гультаям-капачам у лоб таўкачом.

### Да бараначка чорненькі, чорненькі...

Да бараначка чорненькі, чорненькі,
На ім воўна сучыцца, сучыцца,—
Нам гарэлачкі хочыцца, хочыцца.
Мы бараначку стрыч будзем, стрыч будзем,
Мы гарэлачку піць будзем, піць будзем.
Мы бараначку астрыжом, астрыжом,
Мы гарэлачку ўсю пап'ём, усю пап'ём.
На іх воўна каротка, каротка,
Нам гарэлачка салодка, салодка.
На іх воўніца роўненька, роўненька,

Нясуць нам бутэлькі поўненькі, поўненькі.
Да наш паночак у вобрэ, у вобрэ,
Наша пані ў лісах, у лісах,
Нясець нам закускі ў місах, у місах.

### Дзе ж тая барэлачка?..

Дзе ж тая барэлачка,
Што была гарэлачка?
Ці ў хаце пад лаўкай
Зарасла мураўкай,
Ці ў сенях над суднікам
Зарасла трыпутнікам,
Ці ў хаце пад загнетам
Зацвіла жоўтым цветам?
Дайце нам зелязніцу,
Адкапаем п'яніцу,
Сядзем мы на лаваньцы,
Вып'ем мы па чараньцы,
Сядзем мы на роцьніцы,
Вып'ем мы па поўніцы.
Мы людзі рабочыя,—
Піць гарэлку ахвочыя.

### Ох вы, столікі мае...

Ох вы, столікі мае,
Вы цясовыя мае,
Чаго ж вы стаіцё
Ні засланы у мяне?
А вы кубачкі мае,
Пазлацаныя мае,
А чаго ж вы стаіцё
Не наліты ў мяне?
Ах вы госцікі мае,
Вы любыя мае!
А чаго ж вы седзіцё
Ні вясёлы у мяне?

Ці мой хмель не хмялён,
Ці мой хлеб не пушон?
Калі хмель не хмялён,
Кажу хмелю падлажыць,
Калі хлеб не пушон,
Кажу хлеб папушыць.

# СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

Сямейна-абрадавая паэзія была непасрэдна звязана з важнейшымі падзеямі ў жыцці чалавека — нараджэннем, уступленнем у шлюб і смерцю. Яна вызначаецца надзвычай багатым ідэйна-тэматычным зместам і дасканалай мастацкай формай.

Спецыфіку беларускай сямейна-абрадавай паэзіі складаюць вуснапаэтычныя творы, якія выконваюцца ў час сямейнай урачыстасці, прысвечанай нараджэнню дзіцяці (хрэсьбін). У час хрэсьбін выконваліся песні, прыпеўкі, прыгаворы. Найбольш пашыранымі былі песні, у якіх выказваліся пажаданні шчаслівай долі нованароджанаму, славілася парадзіха-маці, велічаўся бацька дзіцяці, ушаноўвалася бабка-павітуха, ухваляліся ці высмейваліся ўзаемаадносіны кума і кумы і інш. Песні пра кума і куму мелі нярэдка жартоўна-эратычны характар. Шмат выконвалася застольных і бяседных песень, звязаных і не звязаных з абрадам. Увогуле ж функцыянальнае прызначэнне хрэсьбінных, як і іншых абрадавых песень, змянялася. У старажытнасці дамінантнай у іх была магічная функцыя. Абрады і звязаныя з імі песні, на думку выканаўцаў, павінны былі садзейнічаць лепшай долі нованароджанага. Пазней жа магічная функцыя ў гэтых абрадах і песнях адышла на другі план, галоўную ролю набыла эстэтычна-мастацкая функцыя.

У беларускім фальклоры асабліва багата прадстаўлена вясельная паэзія. Як і ў радзінных, у вясельных абрадах найбольшае месца займалі песні. Песні суправаджалі ўсе асноўныя этапы вяселля: сватанне, заручыны, падрыхтоўку і пячэнне караваю, пасад нявесты, вясельную бяседу, ад'езд да маладога, урачыстае застолле ў хаце жаніха, пярэзвы і інш. Акрамя песень, якія адлюстроўвалі падзеі, звязаныя з уступленнем у шлюб, на вяселлі спявалася і шмат песень, што мелі толькі ўскоснае дачыненне да абраду або зусім не мелі ніякіх адносін да яго. У мастацкіх вобразах гэтых песень своеасабліва паэтызавалася паўсядзённае жыццё народа, яго быт, духоўны свет чалавека.

У вясельных песнях паэтызуюцца і велічаюцца жаніх і нявеста — галоўныя вобразы значнай часткі гэтых народных твораў. Жаніх часам паўстае ў вобразе князя, які едзе з дружынай, баярамі, нявеста ж называецца княгіняй. Гэта — імкненне паэтычна ўславіць, узвялічыць і ідэалізаваць у вясельных песнях галоўных дзеючых асоб шлюбнай урачыстасці. З дапамогай маляўнічых параўнанняў і іншых мастацкіх сродкаў песня стварае ідэальныя вобразы маладога і маладой, паказвае іх незвычайную прыгажосць. Часта для паэтызацыі маладых выкарыстоўваюцца вобразы сонца, месяца, зорак. У выніку шматвяковай традыцыі выпрацавалася багатая сімволіка, якая ярка характарызуе герояў вяселля.

Вясельным песням, як і ўсяму абраду, раней надавалася утылітарна-магічная роля — з дапамогаю слова і адпаведных дзеянняў спрыяць шчасліваму жыццю маладых. Але песня і многія яе сімвалы з цягам часу адарваліся ад абраду і пачалі ўспрымацца па-іншаму, з гумарам. Гумар вясельнай паэзіі ў сваёй аснове мяккі, добразычлівы, праз яго тонка раскрываюцца вобразы герояў шлюбнай урачыстасці.

На вяселлі больш, чым на іншых сямейных урачыстасцях, спявалася фрывольных песень і прыпевак, пераважна эратычнага зместу, што генетычна звязана з сімільнай магіяй,* традыцыйныя рэшткі якой захоўваліся ў перыяд панавання рэлігійнага светапогляду ў свядомасці селяніна і якія пачалі інтэнсіўна знікаць з развіццём культуры, навукі, перамогай матэрыялістычнага разумення прыроды.

Нельга ўявіць беларускае вяселле без жартоўных і сатырычных песень і прыпевак, у якіх асабліва даставалася свату і свацці, дружкам, каравайніцам, а часам нават жаніху і нявесце. У абмалёўцы вобразаў свата і свацці шырока ўжываліся гратэск і гіпербала. У адной з песень, напрыклад, іранічна малюецца такі партрэт свата: «Сват наш вельмі харош, а ў свата доўгі буслаў нос, а ў свата лыса галава, да казіна рыжа барада»; сват «плавае па хаце, як таран, лыпае вачыма, як баран». У другой песні сват — гарбаты, у яго «на гарбу вярба, а ў той вярбе сава, лапамі перабірае, свахам вочы выдзірае».

Беларускія шлюбныя абрады і вясельная паэзія мелі шмат агульнага з адпаведнымі рускімі і ўкраінскімі абрадамі і паэзіяй, што сведчыць аб блізкасці поглядаў, эстэтычных патрабаванняў і аб цесных культурных узаемасувязях усходнеславянскіх народаў. Спецыфічныя нацыянальныя рысы беларускага вяселля ярка выяўляліся ў народным гумары, у драматызаваных жартоўных сцэнках, якія ўваходзілі ў вялікую вясельную «гульню».

Да сямейна-абрадавай паэзіі належаць хаўтурныя галашэнні — імправізаваныя творы, у якіх шырока выкарыстоўваліся традыцыйныя мастацкія сродкі фальклору для выказвання смутку і гора з выпадку смерці роднага

---

* Сімільная магія (ад лац. simile, similis — упадабленне, параўнанне, аналогія) — дзеянні, у аснову якіх пакладзен прынцып: падобнае выклікае падобнае. Мэта гэтых дзеянняў, часцей за ўсё,— садзейнічаць урадлівасці, апладатварэнню.

чалавека. Для гэтых твораў характэрна эпічнасць апавядання: у адных расказваецца пра цяжкі жыццёвы шлях селяніна, у другіх малюецца карціна горкага існавання беднай удавы з дробнымі дзеткамі-сіротамі і інш. Паэтыка беларускіх хаўтурных галашэнняў багатая на разнастайныя выяўленчыя сродкі. Яны эмацыянальна насычаныя. Укладваючы ў словы ўсю ласку і выказваючы гора і глыбокі смутак, маці называе сваё памершае дзіця «лісточкам зялёненькім», «цвяточкам чырвоненькім», «яблычкам недаспелым», «салавейкам шэранькім».

У дакастрычніцкі час шмат беларускіх сямейна-абрадавых песень запісалі З. Даленга-Хадакоўскі, П. Шэйн, І. Насовіч, Е. Раманаў, У. Дабравольскі, М. Федароўскі і іншыя фалькларысты.

**Літаратура**

*Маркс К.* Введение (из экономических рукописей 1857—1858 годов).— *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., изд. 2-е, т. 12, с. 736—738.

*Энгельс Ф.* Происхождение семьи, частной собственности и государства.— *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., т. 21, с. 23—178.

*Энгельс Ф.* Немецкие народные книги.— *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., изд. 1-е, т. 2, с. 26—34.

*Ленин В. И.* Развитие рабочих хоров в Германии.— Полн. собр. соч., изд. 5-е, т. 22, с. 275—276.

*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 2. Спб., 1890.

*Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. 1-2. Киев, 1886, с. 338—367; вып. 7. Вільна, 1910, с. 35—39; вып. 8. Вильна, 1912, с. 323—550.

*Жанчына* ў беларускай народнай творчасці. Склалі Э. Галубок, А. Калечыц і Н. Багдановіч. Пад рэд. М. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата. Мінск, 1940, с. 75—165.

*Шырма Р. Р.* Беларускія народныя песні, загадкі, прыказкі. Мінск, 1947, с. 68—93, 165—167.

*Анталогія* беларускай народнай песні. Укладанне і каментарыі Г. І. Цітовіча. Мінск, 1968.

*Радзінная* паэзія. Укладанне, сістэматызацыя тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі М. Я. Грынблата. Падбор нот, характарыстыка напеваў і каментарыі В. І. Ялатава. Мінск, 1971.

*Песні* сямі вёсак. Укладанне і рэдакцыя Н. Гілевіча. Мінск, 1973.

*Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры. Складальнік В. А. Захарава. Мінск, 1973.

*Песні* народных свят і абрадаў. Укладанне і рэдакцыя Н. Гілевіча. Мінск, 1974.

*Гілевіч Н. С.* Наша родная песня. Мінск, 1968.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967, с. 77—90.

*Беларуская* вуснапаэтычная творчасць. Пад рэд. М. Р. Ларчанкі. Мінск, 1966, с. 80—85.

## ХРЭСЬБІННЫЯ ПЕСНІ

### Сцелецца да ўецца...

Сцелецца да ўецца
Па лугах трава зялёная.

Цяпер цалуе да мілуе
Мужык жонку маладую.

— Жонка мая маладая,
Радасць мая дарагая.

Парадзіла мне сыночка (дочку),
Як яснага сакалочка.

Замаладу — на ўцеху,
А на старасць — на перамену.

Замаладу — гадавацьмем,
А на старасць — пасылацьмем.

Калі сынок — залатая калыбелька,
А калі дачка, дык луб'яначка.

**Ой, дымна, дымна ў садзе...**

Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.
У нашага Іванічкі
Да трое варот у дварэ.

У первыя вароцечкі
Да сакол вылятаў.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

У другія вароцечкі
Іванічка выязджаў.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

А ў трэція вароцечкі
Да чалядачка бяжыць.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Вярнісь, вярнісь, дзяцінaчка,
Ты назад.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

Твая жана табе сына
Радзіла.

Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Я для сына ў двор не вярнуся,
Сын у мяне хазяін у дварэ.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Вярнісь, вярнісь, дзяцінaчка,
Ты назад.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

Твая жана табе дачку
Радзіла.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

— Я для дачкі ў двор вярнуся,
Дачка ў мяне госцейка ў дварэ.
Ой, дымна, дымна ў садзе,
Ой, дымна, дымна ў зялёным.

**А між сеначак, між каморачак...**

А між сеначак, між каморачак,
А між сеначак, між каморачак,
Ой, там Гэлячка павай хадзіла,
Ой, там Гэлячка павай хадзіла,
Павай хадзіла, сына радзіла,
Павай хадзіла, сына радзіла.
А Міколачка, а мой душачка,
А Міколачка, а мой душачка,
А бяжы, бяжы па бабулечку,
А бяжы, бяжы па бабулечку.
Наша бабулька ды не гордая,
Ды не гордая, а здагадалася:
І сама бяжыць, аж зямля дрыжыць,
І сама бяжыць, аж зямля дрыжыць,
І прасцінaчку у руках дзяржыць,
І прасцінaчку у руках дзяржыць.
«А прасці, божа, а дзве душачкі:
А прасці, божа, а дзве душачкі:
Адну душачку — парадзішачку,
Адну душачку — парадзішачку,

Другу душачку — нараджоную,
Другу душачку — нараджоную,
А дзве душачкі — мае ўнучачкі».
І старэнькая, і маленькая,
Мы старэнькую — шанаваць будзем,
А маленькую — гадаваць будзем.
Мы старэнькую — дзеля жаласці,
А маленькую — дзеля радасці.
Мы старэнькую — у пярыначках,
А маленькую — у пялёначках.

### Раса пала на травіцу...

Раса пала на травіцу,
Наша мама — парадніца,
Наша мама — парадніца,
Дзевяць сыноў парадзіла.
Дзевяць сыноў парадзіла,
А дзесятую дачушку.
Яе браты калыхалі,
Калышучы, прымаўлялі:
«Люлі, люлі, сястрыца,
Спі доўга, расці скора,
Сваёй маме на пацеху,
Чужым людзям на ўспамогу».

### Не кукуй, зязюлечка, рана...

Не кукуй, зязюлечка, рана,
Не кажы, што ночачка мала.
Наша Маруська ўсю ночку не спала,
Яна к сабе мілых гасцей чакала,
Мілых гасцей і бабулечкі сваей.
Столікі абрусамі засцілала,
Кубачкі вінам налівала,
Яна сваіх кумочкаў паджыдала,
Хоць мяне ды ў доме не будзе,
Бабуля прыглашоная будзе,
На куце пасаджоная будзе,
Мёдам-вінам напаёная будзе,
Падаркам надароная будзе.

## Каб я ведала, каб знала...

Каб я ведала, каб знала,
Што ты ў мяне бабкай будзеш,
Пасадзіла б я цябе
У гародзе на градзе
Пахучаю мятай.



Сялянкі з в. Дражня Бабруйскага павету. З фатаграфіі І. Сербава 1910 г.

Як мятачка зелянее,
Мая бабка маладзее.
Каб я ведала, каб знала,
Што ты ў мяне кумам будзеш,
Пасадзіла б я цябе
У гародзе на градзе
Зялёным дубочкам.
Як дубочак зелянее,
Мой кумочак маладзее.
Каб я ведала, каб знала,

Што ты ў мяне кумой будзеш —
Пасадзіла б я цябе
У гародзе на градзе
Чырвонаю рожай.
Як рожачка чырванее,
Мая кумка маладзее.

**Каб я знала, ведала...**

Каб я знала, ведала,
А хто бабай будзець,
Пасадзіла б я яе
Ў агародзе на градзе
За чырвоную розу.
Палівала б я яе
Не вадою,— сытою.
Калі б сыты не стала,
Я б і мёду дастала.

Каб я знала, ведала,
А хто ў мяне кумам будзець,
Пасадзіла б я яго
Ў агародзе на градзе
За сінь-васілёчак.
Палівала б я яго
Не вадою,— сытою.
Калі б сыты не стала,
Я б і мёду дастала.

Каб я знала, ведала,
А хто ў мяне кумою будзець,
Пасадзіла б я яе
Ў агародзе на градзе
За пахучую мяту.
Палівала б я яе
Не вадою,— сытою.
Калі б сыты не стала,
Я б і мёду дастала.

**А бабулька, пахнючая мята...**

А бабулька, пахнючая мята,
А бабулька, пахнючая мята,
Люблю цябе, што вельмі багата,

Люблю цябе, што вельмі багата.
А кумачка, чырвоная рожа,
А кумачка, чырвоная рожа,
Люблю цябе, што вельмі прыгожа,
Люблю цябе, што вельмі прыгожа.
А кумочак, сіні васілёчак,
А кумочак, сіні васілёчак,
Люблю цябе, што сеў у радочак,
Люблю цябе, што сеў у радочак.

### Не стук стучыць...

Не стук стучыць ды па сенічках,
Не грук гручыць ды па новенькіх,—
Там Міхасічка ідзець,
А ён бабу вядзець.

Хадзі, хадзі, ды бабусечка,
Ратуй маю ды Ганусечку
З вялікія мукі,
З вялікія мукі.

А й дам табе, ды бабусенька,
А й дам табе, ды бялюсенька,
А квартоўку мукі,
А квартоўку мукі.

А й дам табе, ды бабусенька,
А й дам табе, ды бялюсенька,
Квартоўку канапель,
Квартоўку канапель.

Кладзі маё а дзіцятачка,
Кладзі маё ды маленькае
Ў новенькі калыбель,
Ў новенькі калыбель.

### Бабулька ж мая міленькая...

Бабулька ж мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды маку,
Абы вырас ўнучак
Без годнага браку.

Бабулька мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды проса,
Абы вырас ўнучак
Вельмі харошы.

Бабулька мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды вікі,
Абы быў бы ўнучак
Вельмі вялікі.

Бабулька мая міленькая,
Парода твая лёгенькая.
Дам табе, бабулечка,
Тры пуды канапель,
Абы яго ўсе любілі
Так вялікага, як цяпер.

**Ох, учора, мае кумачкі...**

Ох, учора, мае кумачкі,
У нас радзінкі былі,
У нас радзінкі былі. *

А сягоння, мае кумачкі,
Мы на хрэсьбінкі прыйшлі.

Не шкадуйце, мае кумачкі,
Па рубельчыку даць.

То мы будзем, мае кумачкі,
Аж да ўторнічка гуляць.

Не шкадуйце, мае кумачкі,
Па каровачцы даць.

То мы будзем, мае кумачкі,
Усю нядзелечку гуляць.

* Кожны другі радок паўтараецца два разы.

**Наша бабачка а пірагі пякла...**

Наша бабачка а пірагі пякла,
А ў панядзелак муку сеяла,
А ў аўторак вадзіцу грэла,
А ў сераду дзяжу чыніла,
А ў чацвер жа дзяжу кісліла,
А ў пятніцу дзяжу мясіла,
А ў суботу ў печ садзіла,
А ў нядзелю умывалася,
К унучачцы сабіралася.

**Ды хто ў нас, ды хто ў нас...**

Ды хто ў нас, ды хто ў нас
З паўночы ходзіць? *

Іванька да Іванька
З паўночы ходзіць.

Іванька да Іванька
Бабачкі просіць:

— Бабка мая, любка мая,
Увойдзем ка мне.

Ой, ка мне, ой, ка мне,
Да к маёй жане.

— Іванька, Іванька,
Што жа вам бог даў?

Ці сына, ці сына,
Да ці дачушку?

Калі сын, калі сын,
То пісаці будзе.

Калі дачка, калі дачка,
Вышываці будзе.

Калі сын, калі сын,
Малявана калыбелька,

Калі дачка, калі дачка,
Лубяная каробачка.

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

### А што па масту па калінаваму...

А што па масту па калінаваму
І стучыць, і ручыць, і пастуківаець?
То Васілечка да Грыгоравіч,
Ён спяшыць, ён бяжыць да па бабушку.
— А ты, бабушка да Іванаўна!
Перабаб ты майго дзіцёначка да маленькага.
А што па масту па калінаваму
І стучыць, і звучыць, і пастуківаець?
То Васілечка да Грыгоравіч,
Ён спяшыць, ён бяжыць да па кумочка.
— Ты, кумочак мой да Іванавіч!
Перанясі ты майго дзіцёначка да маленькага.
А што па масту па калінаваму
І стучыць, і ручыць, і пастуківаець?
То Васілечка да Грыгоравіч,
Ён бяжыць, ён спяшыць да па кумушку.
— А ты, кумушка да Захар'еўна,
Перахрысці ты майго дзіцёначка да
маленькага.

### Парадзіха ў полазе ляжыць...

Парадзіха ў полазе ляжыць,
А захацела яна віннага соку...
— А пазавіце майго мілага з току:
Ці не дастанець мне віннага соку?

А ён пытаецца: — Каго, жана, радзіла?
Калі сына, я мёду дабуду,
Калі дачушку, я і так абайдуся,
Калі сына, я і горад пастаўлю,
Калі дачушку — з кажухамі адпраўлю.

### Бабка к унучцы...

Бабка к унучцы, бабка к унучцы
Баразёнкай ішла, баразёнкай ішла.
Бабка ўнучцы, бабка ўнучцы
Два гурочкі нясла, два гурочкі нясла.
На табе, ўнучка, на табе, ўнучка,
Два гурочкі мае, два гурочкі мае,

Каб не балелі, каб не балелі
Жываточкі твае, жываточкі твае.
Бабуся, бабуся, таўчы, малоць нядужа,
А на намётачкі, а на намётачкі дасужа.

### Сядзіць баба на куце...

Сядзіць баба на куце,
Як галубка у гняздзе.
— А ссадзіце бабу далоў,
Няхай едзець дамоў.
— Я дамоў не паеду,
Буду тут начаваць.
Я за гэты куток
Палучыла шкуток.
Сядзіць кум на куце,
Як голуб у гняздзе.
— А ссадзіце кума далоў,
Няхай едзець дамоў.
— Я дамоў не паеду,
Буду тут начаваць.
Я за гэты куток
Палажыў чырванчок.
Сядзіць кума на куце,
Як галубка ў гняздзе.
— А ссадзіце куму далоў,
Няхай едзець дамоў.
— Я дамоў не паеду,
Буду тут начаваць.
Я за гэты куток
Палажыла шкуток.

### Ці ведаеш, бабка...

— Ці ведаеш, бабка,
Ці ведаеш, любка,
За што намётку бярэш? *
Ці хадзіла часта,
Ці насіла смачна
А к унучцы сваёй?
— Адзін раз — із юшкай,
Другі — з калатушкай,
Трэці раз — з кісялём.

### А ў бару дуб'ё...

А ў бару дуб'ё
Ялаватае.
У Іванькі кум'ё
Усё й багатае.
У бабулькі хвартух
Сто рублей стоіць,
А ў кумы саян —
Усю й тысячу,
А ў кума штаны —
І няма цаны.

### Наша бабулька да й малімонка...

Наша бабулька да й малімонка,
Не п'ець гарэлкі, кажыць, што горка.

---

* Кожны трэці радок паўтараецца двойчы.

Яе ўнучка ўгаварыла,
Мёдам гарэлку прысаладзіла.
— А пі, бабулька, хоць упівайся,
На мяне ўнучку не забывайся.
А пі, бабулька, павесяліся,
Выйдзі на вулку ды пахваліся.
— Добрая ўнучка, ёсць чым хваліцца,
Смачна гарэлка, можна упіцца.

### Бедавала наша бабулька...

Бедавала наша бабулька: *
— А ці мая долька такая,
Ці мая ўнучка скупая?
Села на палочку ў куточку
Ды на свайго мужа мігаець:
— Прымі, прымі, мужу, бутэльку,
Бо вып'ець бабулька гарэлку,
Прымі, прымі, мужу, закуску,
Пабярэць бабулька у хусту.

### Упілася бабка, упілася...

Упілася бабка, упілася,
За столікам звілася, звілася.
Мышы-шышы шалелі, шалелі,
Хвартух бабцы праелі, праелі.
Стала бабка ўставаці, ўставаці,
Стала моцна плакаці, плакаці,
Нечым хвартух латаці, латаці.
— Збірайце, бабкі, халацця, халацця,
Бабцы хвартух наладзьце, наладзьце.

А ўпіўся кумок, упіўся,
За столікам ён звіўся, ён звіўся.
Мышы-шышы шалелі, шалелі,
Куму штаны праелі, праелі.
Стаў кумок ўставаці, ўставаці,
Стаў моцненька плакаці, плакаці,
Нечым штаны латаці, латаці.
— Збірайце, дзяўчаты, лахманы, лахманы,
Куму латаці штаны ды штаны.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Упілася кумка, упілася,
За столікам звілася, звілася.
Мышы-шышы шалелі, шалелі,
Кумцы спадніцу праелі, праелі.
Стала кумка ўставаці, ўставаці,
Стала моцна плакаці, плакаці,
Нечым спадніцу латаці, латаці.
— Збірайце, хлопцы, халацце, халацце,
Куме спадніцу латаці, латаці.

**А скочыла наша Хрыстынка...**

А скочыла наша Хрыстынка
З полу далоў,
Як ударыцца сваёй бабачцы
У ножкі чалом:
— Гуляй, гуляй, мая бабачка,
Буду й я, буду й я,
Наварыла бочку мядочку,
А дзве віна.

А скочыла наша радзіха
З полу далоў,
Як ударыцца сваёй кумачцы
У ножкі чалом:
— Гуляй, гуляй, мая кумачка,
Буду й я, буду й я,
Наварыла бочку мядочку,
А дзве віна.

А скочыла наша радзіха
З полу далоў,
Як ударыцца свайму кумочку
У ножкі чалом:
— Гуляй, гуляй, мой кумочак,
Буду й я, буду й я.
Наварыла бочку мядочку,
Дзве віна.

**Чарачка медавая...**

Чарачка медавая
Па сталу пахадзіла,
Бабачку напаіла.

— Пі, бабка, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

Чарачка медавая
Па сталу пахадзіла,
Кумачку напаіла.
— Пі, кумка, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

Чарачка медавая
Па сталу пахадзіла,
Кумочка напаіла.
— Пі, кумок, не співайся,
На пахмеллейка спадзявайся.

### Кума мая, кумачка...

Кума мая, кумачка,
Дзе жывеш? *
Чаму мяне ў госцейкі
Не завеш?

Ці ты, куме, розуму
Пытаеш?
Ці ты маёй хатачкі
Не знаеш?

А вунь мая хатачка
Ля вады,
З высокага дзераўца,
З лебяды.

Яшчэ к таму сенечкі
Прыпляту,
З харошага дзераўца,
З асату.

Тады цябе ў госцейкі
Пазаву,
Як свежае рыбачкі
Навару.

А свежая рыбачка —
Акунёк,
А любенькі госцічак —
Мой кумок!

### Кум з кумою на куце сядзіць...

Кум з кумою на куце сядзіць,
Паміж іх да ручаёк бяжыць.
А ў тым ручайку да тры кубачкі,
Да тры кубачкі маляваненькіх.
У адным кубку зеляно віно,
У другім кубку саладок-мядок,
У трэцім кубку горка гарэлка.
Зеляно віно для радзішачкі,
Саладок-мядок для кумы з кумам,
Горка гарэлачка для суседачак.

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

### Стаіць шацёр над вадою...

Стаіць шацёр над вадою,
Веццейкі да долу,
Веццейкі да долу.
А ты ж сабе, мая кумачка,
Едзь сабе дадому.
Едзь сабе дадому.
Ды я ж цябе, мая кумачка,
Люблю і кахаю,
Люблю і кахаю.
Ды я ж цябе, мая кумачка,
Я ж цябе не трымаю,
Я ж цябе не трымаю.
— Ай, кумачка, ты галубачка,
Як я цябе люблю,
Як я цябе люблю.
Я ж ад цябе, мая кумачка,
Гасцінчыка хачу,
Гасцінчыка хачу.
А ты ж мяне, мая кумачка,
Навек не накорміш,
Навек не накорміш,
А для сябе, мая кумачка,
Вялікую славу зробіш,
Вялікую славу зробіш.

### Кланялася кума куму...

Кланялася кума куму
Нізенька ў грудцы:
— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што звазіў у людцы.
Кланялася кума куму
Нізенька ў ножкі:
— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што прывёз з дарожкі.
Кланялася кума куму
Нізенька ў пяткі:
— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што прывёз дахаткі.

**Ой, кум да кумы заляцаўся...**

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек сеяць абяцаўся.
Ой, сеяў, прысяваў,
Прысяваючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек рваці абяцаўся.
Ой, рваў да й вырываў,
Вырываючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек біці абяцаўся.
Ой, біў да й прыбіваў,
Прыбіваючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек слаці абяцаўся.
Ой, слаў да й прысцілаў,
Прысцілаючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек збіраці абяцаўся.

Ой, збіраў, вызбяраў,
Вызбяраючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек церці абяцаўся.
Ой, цёр да выціраў,
Выціраючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Канапелек часаць абяцаўся.
Ой, часаў, вычэсываў,
Вычэсываючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Палаценца ткаці абяцаўся.
Ой, ткаў да вытыкаў,
Вытыкаючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
Палатна бяліці абяцаўся.
Ой, бяліў, пабяліў,
А пабяліўшы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!

Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

Ой, кум да кумы заляцаўся,
У свойчыкі качаці абяцаўся.
Ой, скачваў, прыкачваў,
Прыкачваючы казаў:
— Ты кума, ты душа,
Над ўсе кумы хараша!
Ой, ні адной
Не маю такой,
Як ты, кумачка мая.

### Што ж то за красачка...

Што ж то за красачка,
Што то за нагодка
Ў маім садзе не бывала?
Я б тую красачку,
Чырвону нагодачку
Ў сваім садзе пасадзіла,
Я б тую красачку,
Чырвону нагодачку
Рана й вечарам палівала.

Што то за кумочак,
Што за галубочак
Ў маім доме не бывае?
Я б свайго кумочка,
Свайго галубочка
За столікам пасадзіла,
Я б свайго кумочка,
Свайго галубочка
Харашэнька частавала.
Я б свайго кумочка
Свайго галубочка
Мёдам-віном напаіла.
А калі ж ні стала б,
А калі ж ні стала б,
Я й з вады дастала б.
Ай, што ж то за кумачка,
Што то за галубка
Ў маім доме не бывала?

Я б сваю кумачку,
Я б сваю галубачку
За столікам пасадзіла.
Я б сваю кумачку,
Я б сваю галубачку
Харашэнька частавала.
Я б сваю кумачку,
Я б сваю галубачку
Мёдам-віном напаіла.
А калі ж ні стане,
А калі ж ні стане,
Я й з вады дастану.

**У нашага кума бела бяроза...**

У нашага кума бела бяроза
Павалілась на дварэ;
Наша кумка дарагая
Пахвалілась пры стале:
— Не пайду, кумка, не пайду, любка,
Болі ў кумкі к табе.
— Забудзеш, кумка, забудзеш, любка,
Пакуль браці цябе.
А гарэліца ў бутэліцы
Ды якочыць, якочыць;
Наша кумушка, наша любушка
З куту іцці не хочыць.
— Не люблю, кумка, не люблю, любка,
Прыгавораў тваіх.
— Не любіш, кумка, не любіш, любка,
Ты нас, верна, кумоў.
Прыганяеш, кумка, прыганяеш, любка,
З паўночы дамоў.
Запражы, кумка, запражы, любка,
Хоць аднаго ж ты каня,
Завязі, кумка, завязі, любка,
Мяне, кумку, да двара.

**Ішоў кум па сялу...**

Ішоў кум па сялу,
Кума па гародзе,
Нясе кум чапялу,
Кума скавароду.

Кум дроў насячэ,
Кума бліноў напячэ,
Кум бліноў не хоча,
Каля кумы рагоча.

### Кум з кумою на покуце сядзяць...

Кум з кумою на покуце сядзяць,
На покуце сядзяць, мёд п'юць.
— Пі, кумок, пі, кумка!
Калі мёду не будзе,
Хоць кароўку збуду, а мёду дабуду.
— Можна, ўнучак, без віна гуляць,
Худа, ўнучак, без кароўкі дзяцей гадаваць.

### Кума кума любіла...

Кума кума любіла,
К сабе ў госці зазвала:
— Ты кума, ты душа,
Саўсім, кума, хараша.

Кум к куме ў сені,
Кума к куму ў крупені.
— Ты кума, ты душа,
Саўсім, кума, хараша.

Кум к куме ў хату,
Кума куму букату.
— Ты, кума, ты душа,
Саўсім, кума, хараша.

Кум к куме на парог,
Кума куму пірог:
— Чым цябе, кум, частаваць?
Ці віном зеляном,
Ці салодкім мядом?

### Чэраз бор сасна...

Чэраз бор сасна *
Павалілася.

А й кума з кумам
Пасварыласа.

— Ты, кума мая,
Ты, душа мая.

Чэраз двор жывём,
А й не знаемся.

Мы й не знаемся,
Не вітаемся.

Праміж нас, кума,
Рэчка быстрая.

Рэчка быстрая,
Вада чыстая.

А на тэй рацэ
Селязень плывець.

Селязень плывець
З серай вуткаю.

З серай вуткаю,
З вуцянятамі.

Селязенечка,
То — Хлімонічка.

Сера вутачка,
То — Настулечка.

Вуцянятачкі,
То — іх дзетачкі.

* Кожны першы радок паўтараецца двойчы.

### На гарэ ліпка нахілілася...

На гарэ ліпка нахілілася,
А кума з кумам пасварылася.
А за што яны пасварыліся?
Ці за трэсачкі за цісовыя,
Ці за дзетачак за хрышчоных?
Не за трэсачкі за цісовыя,
А за дзетачак за хрышчоных.
Кума кума перапрашавала:
— Хадзі, кумок, кісялёк есці,
Кісялёк есці із сыціцаю,
Кісялёк есці із сыціцаю,
Са мной, добрай маладзіцаю.

### На стале каша стала...

На стале каша стала,
Залатога вярха ждала,
— Ой ты, кумачку-пане,
Ой, такі ў цябе стане!
Ой ты, кумачку-пане,
Ой, такі ў цябе стане:
Ўсадзі руку ў кішэню,
Вымі грошыкаў жменю.

### А ў нядзелечку з параненечку...

А ў нядзелечку з параненечку *
На небе развіднела.
Кумочак ходзіць, дзіцяцю носіць,
А ў бога долі просіць:
А дай жа, божа, гэтай дзіцяці
Усякую долю ўзяці:
І хлебавую і салявую,
Трэцюю — здаравейкавую!

### Я ў хрэсьбінкі паманілася...

Я ў хрэсьбінкі паманілася,
Цэлы тыдзень сабіралася:
Ў панядзелак — у печы паліла,
У аўторак — пшаніцу сушыла.
У сераду — таўкла і малола,
А ў чацвер — у печы паліла,

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

У печы паліла, вадзіцу грэла,
А ў пятнічку — пірог учыняла,
А ў суботку — чуць на зорачку — мясіла,
А лучынка пагасілася —
Цяля з хвастом умясілася,
Ї парсюк з лычом,
І пастух з бічом.
Як сталі пірог мой кроіць,
Дык цяля мычыць,
А парсюк квічыць,
А пастух крычыць.

**Каля месяца...**

Каля месяца,
Каля яснага,
Усе дробныя звёзды.
Каля Гаўрылкі,
Каля душачкі,
Усе любыя госці.
А то кум,
То кума,
То бабуся мая,
Усе любыя госці.
— А ты, чадачка,
Пазлачонае,
Умей абхадзіцца.
— А ты, Гаўрылка,
Ты, душачка,
Умей частаваць.
— А ты, Каценька,
Ты, душанька,
Умей шанаваць!
Ты, гарэлачка,
Сасп'яначка
Умей напаіць!

**Ой, два браты, ой, два браты...**

Ой, два браты, ой, два браты
Піва наварылі,
Піва наварылі.
Ды дзве сястры, ды дзве сястры
У госці папрасілі,
У госці папрасілі.
Па багатую, па раскошную
Конікаў паслалі,
Конікаў паслалі,
А як бедную ды гаротную —
Людзьмі наказалі,
Людзьмі наказалі.
Ой, багатую ды раскошную
На куце пасадзілі,
На куце пасадзілі,

А як бедную ды гаротную —
У парозе на лаўцы,
У парозе на лаўцы.
Ой, багатую ды раскошную
Віном напаілі,
Віном напаілі,
А як бедную ды гаротную —
Халоднай вадою,
Халоднай вадою.
Ой, багатую ды раскошную
Начаваць пакідаюць,
Начаваць пакідаюць.
А як бедную ды гаротную —
Дамоў адпраўляюць,
Дамоў адпраўляюць.

### Прасілі мяне на хрысцінaчкі...

Прасілі мяне на хрысцінaчкі,
Ах-ха-ха на хрысцінaчкі,
Да я не маю хвартушыначкі,
Ах-ха-ха, хвартушыначкі.
А пайду я да суседачкі,
Ах-ха-ха, да суседачкі,
І да пазычу хвартушыначкі,
Ах-ха-ха, хвартушыначкі.
А суседачка не пазычыла,
Ах-ха-ха, не пазычыла,
І не пазычыла, выгаварыла,
Ах-ха-ха, выгаварыла:
— Да як я прала, тады ты спала,
Ах-ха-ха, тады ты спала.
Да як я ткала, ты вандравала,
Ах-ха-ха, ты вандравала.
І як я бяліла, ты ножкі мыла,
Ах-ха-ха, ты ножкі мыла.

### Я ўчора, малада...

Я ўчора, малада,
П'яна была, п'яна была,
Сягоння, малада,
Не буду піць, не буду піць.

Меліся ў мяне
Госцікі быць, госцікі быць,
А ды што за госці —
Брат да сястра, брат да сястра.
Ой, любыя госці —
Кум ды кума, кум ды кума.

### Пасаджу я квасол...

Пасаджу я квасол,
Сама йду дадому,
А мой мілы чарнабровы
П'е ў карчме з кумою.

— Ой, нядобра, няхораша,
Мой міленькі робіш,
Як дзень, як ноч п'янюсенькі
Із кумою ходзіш.

Годзе, мілы, чарнабровы,
Із кумою піці,
Ой, хадзема дадоманьку,
Вячэру варыці.

— Мая міла чарнаброва,
Яшчэ вазьму кварту,
Кума мая харошая,
Яшчэ болей варта.

Пад вішнямі, чарэшнямі
Палягалі спаці,
Мая міла чарнаброва,
Не дай людзям знаці.

Я, малада, як ягада,
Тады не ўтрывала
І, выйшаўшы на вуліцу,
Усім людзям сказала.

Там за садам, за гародам,
Йшчэ за пералазам
Іскавалі куму з кумам,
Ды абое разам.

За што ж цябе, мой міленькі,
Разам іскавалі?
— То за тое, мая міла,
Што з кумою спалі.

### Ёсць у нашай бабкі...

Ёсць у нашай бабкі,
Ёсць у нашай бабкі
Тры-чатыры валы. *

Прыехалі к бабцы,
Прыехалі к бабцы
Тры-чатыры купцы.

— Ёсць у мяне чорны,
Ды што возіць жорны,—
Я й таго не прадам.

Ёсць у мяне белы
На ўсякія дзелы —
Я й таго не прадам.

Ёсць у мяне рабы,
Той, што возіць бабу,—
Я й таго не прадам.

Ёсць у мяне крутарог,
Возіць п'яных за парог —
Я й таго не прадам!

* Прыпеў паўтараецца два разы.

### Каля месяца, каля яснага...

Каля месяца, каля яснага
Усе дробныя зоркі.
А ў Іванькі на куце
Усе любыя госці.
Любыя госці, любыя госці!
Бабуля на куце сядзіць,
Харошую песню пяе.
Першую — нараджоную,
Другую — сужоную,
Трэцюю — хрэсьбінную.
Дай божа нашаму дзіцяці
Хрэсьбінкі згуляці,
Хрэсьбінкі згуляці,
І вяселля даждаці.

### Ой запала, ой запала...

Ой запала, ой запала
Да дарожка сняжком. *

Ой, не зойдзе, ой, не зойдзе
Да бабулька пяшком.

— Запражыце, запражыце
Да дванаццаць сабак,

Завязіце, завязіце
Да бабульку ў кабак.

Запражыце, запражыце
Каня варанога,

Завязіце, завязіце
Кума маладога.

Запражыце, запражыце
Кабылу сівую,

Завязіце, завязіце
Куму маладую.

### У нашага Іванькі...

У нашага Іванькі
Віноград на дварэ,
Пасадзіў ён ды сваю бабульку
Да й на самым куце.
Ой, частуе, ганаруе
Не людзей,— сам для сябе.
— Запражыце, запражыце
Да дванаццаць валоў,

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

Завязіце, завязіце
Да й бабулю дамоў.
Наша бабулька-галубулька
Да й не пышная была,
Узяла падарак
Да й дадому павязла.

У нашага Іванькі
Вінаград на дварэ,
Пасадзіў ён свайго кума
Да й на самым куце.
Ой, частуе, ганаруе
Не людзей,— сам для сябе.
— Запражыце, запражыце
Каня варанога,
Завязіце, завязіце
Кума маладога.
Наш кумочак-галубочак
Не пышны быў,
Узяў падарак
Да й дадому пайшоў.

У нашага Іванькі
Вінаград на дварэ,
Пасадзіў ён сваю куму
Да й на самым куце.
Ой, частуе, ганаруе
Не людзям,— сам для сябе.
— Запражыце, запражыце
Лянівую кабылу,
Завязіце, завязіце
Куму маладую.
Кума-кумачка
Не пышная была,
Узяла падарак
Да й дадому пайшла.

### Выбачайце, госці...

Выбачайце, госці,
Ой, за маю чэсць,
Ох, якія мы рады,
Што вы ў нас есць.

Ох, куме з кумою —
То й первыя госці,
А брат із сястрою —
Да другія госці.

Ох, брат із сястрою —
Да другія госці,
А зяць із дачкою —
Да трэція госці.

Із кумам, з кумою
Гарэлкі нап'емся.

А з братам, з сястрою
То й нагаварэмся.

А з братам, з сястрою
То й нагаварэмся,
Ох, з зяцем, з дачкою
Толькі насварэмся.

**А чаму ты, яліначка, не зялёна?..**

«А чаму ты, яліначка, не зялёна?
А чаму ты, яліначка, не зялёна?»
— А як жа мне, яліначцы, быць зялёнай,
А як жа мне, яліначцы, быць зялёнай?
Пада мною два купчыкі начавалі,
Пада мною два купчыкі начавалі,
Яны ж маё карэннейка патапталі,
Яны ж маё карэннейка патапталі,
Яны ж маё ўсё суччайка пасмалілі,
Яны ж маё ўсё суччайка пасмалілі.
«А чаму ж ты, Арыначка, не вясёла,
А чаму ж ты, Арыначка, не вясёла?»
— А як жа мне, маладзенькай, быць вясёлай?
А як жа мне, маладзенькай, быць вясёлай?
Калі мяне мой міленькі зневажаець,
Калі мяне мой міленькі зневажаець:
Усе клетачкі, каморачкі замыкаець,
Усе клетачкі, каморачкі замыкаець.
А я свайму міленькаму угадзіла,
А я свайму міленькаму угадзіла,
А я ў яго ўсе ключыкі паўкрадала,
А я ў яго ўсе ключыкі паўкрадала.
Усе клетачкі, каморачкі паадмыкала,
Усе клетачкі, каморачкі паадмыкала,
Бачурачку гарэлачкі нацадзіла,
Бачурачку гарэлачкі нацадзіла,
Усю сваю радзімачку упаіла,
Усю сваю радзімачку упаіла,
У белую пасцелечку улажыла,
У белую пасцелечку улажыла.

**А ў цёмным лесе сава кугічыць...**

А ў цёмным лесе сава кугічыць,
Ой, люлі, люлі, сава кугічыць.

З добрай бяседы муж жонку клічыць,
Ой, люлі, люлі, муж жонку клічыць:
«А жонка, жонка, ідзі дадому,
Ой, люлі, люлі, ідзі дадому.
Не паказвай лічка свайго нікому,
Ой, люлі, люлі, свайго нікому.
Тваё лічанька бела, румяна,
Ой, люлі, люлі, бела, румяна.
Бела, румяна — мальцам спадмана,
Ой, люлі, люлі, мальцам спадмана».
— А ты, міленькі, ты невярненькі,
Ой, люлі, люлі, ты невярненькі.
Едзь на таржочак, купі званочак,
Ой, люлі, люлі, купі званочак.
Павесь званочак на падалочак,
Ой, люлі, люлі, на падалочак.
Дзе буду гуляці, будзіць чуваці,
Ой, люлі люлі, будзіць чуваці.
Як хто затроніць, званок зазвоніць,
Ой, люлі, люлі, званок зазвоніць.
А ты пачуеш — мяне ўратуеш,
Ой, люлі, люлі, мяне ўратуеш.

### За лес, за лес сонца коціцца...

За лес, за лес сонца коціцца,
Уся бяседачка расходзіцца,
Мамка мая дамоў строіцца,
Я ж, малада, правадзіць пайду
Праз два полі, праз два чыстыя,
Праз тры рэчкі беражыстыя.
«Ты, свякроўка, мая матачка,
Калышы маё дзіцятачка».
— А чорт яго накалышыцца —
Трое, двое у калысачцы.

## ХРЭСЬБІННЫЯ ПРЫГАВОРКІ

Як бабка ставіць перад кумамі гаршчок з кашай і бутэльку салодкай гарэлкі, што падаў ёй бацька нованароджанага:

— Мой унучак,— ваш хрэснік,— кашку прыслаў, а бацька ягоны вінца здагадаў. Прашу адведаць, бабку пацешыць, унучка паславіць, маць з бацькай паздравіць.

З гэтай жа прамовай бабка звяртаецца і да іншых гасцей.

Кум ад сябе і ад кумы адказвае:

— Наш хрэснік — прыветнік, не ўстаў ўзрасці,— вялеў кашу нясці, гасцей частаваць, дабра нажываць. Дай, божа, здароўя яму, быць вумнаму, разумнаму, шчасліваму, багатаму, радзіцелям пацехай ва младасці, карміцелем іх старасці, а нам — гуляць на радасці. Маць з бацькаю пздраўляем, прыбыткаў большых жалаем. Бабу за ўнука і ўгашчэнне прывячаем.

Кашу з ячменем кум разбіваець, потым адкупляець.

Кум: Я разбіваю, я адкупляю.

Бабка: Плоцім за кашу, не за вашу,— за нашу.

Бабка, кладучы на талерку тры грошы:

— Бог да нас чужаземца прыслаў і ад вас, дзядзькі і цёткі, успамогу ўзяць заказаў. Прашу чым яго падарыць, каб было за што мыла купіць, і прашу нікому не адмаўляць, бо будзе чужаземец смаракаваць, бо ён з далёкіх строн прыбыў і вас усех накорміць і напоіць. Дайце, а не адмаўляйце. Гэты госць не прыбыў, каб век тут быць.

Бабка, атрымаўшы падарунак ад парадзіхі:

— Дзякуй, унучка і ўнучак, за падарак і піражок. Каб мой унучак, а ваш сынок, вялікі рос і вяселлем трос.

Бабка на «муравінках», абвязаўшыся падараванай халсцінай:

— Каб мой унук вялікі рос, шчасліў быў! Каб на яго долю паслаў бог усяго ўволю!

Кум, б'ючы кашу (гаршчок):

— Гадуй, божа, малое, да каб на той год другое.

## ВЯСЕЛЬНАЯ ПАЭЗІЯ

### Абрад вясельны

### Сватанне*

Да бацькоў дзяўчыны прыязджаюць звычайна ўвечары сваты ад жаніха (родны бацька ці хрышчоны або брат старшы), абавязкова ўдваіх, і пад выглядам якой-небудзь пабочнай справы дамаўляюцца і да сватаўства. Калі бацькі дзяўчыны і палічаць магчымым даць згоду, то ўсё ж вырашэн-

* Намі выбрана найбольш тыповае апісанне беларускага вяселля XIX ст. Запісана яно ў Віцебскім павеце. Вяселлі, якія спраўляліся ў іншых беларускіх паветах, мелі не вельмі значныя адрозненні. Зразумела, што такое вяселле, якое прыведзена вышэй, мелі магчымасць спраўляць толькі заможныя сяляне.

не гэтай справы адкладваюць да наступнага разу і прызначаюць сватам дзень для прыезду. У другі раз яны сватоў ужо чакаюць, прыбіраюць хату па-святочнаму, падрыхтоўваюць закуску (яечню, ялавічыну і інш.) і, як прыязджаюць сваты, клічуць дзяўчыну, з якой разам і даюць сваю згоду. У знак згоды як бацькі, так і дзяўчына паціскаюць сватам рукі, што называецца р у к а б і ц ц е м, пасля чаго стрымаць дадзенае слова лічыцца амаль ужо абавязковым.

Потым сваты частуюць гаспадароў прывезенаю імі гарэлкаю, а тыя ўзаемна частуюць іх закускай і пачынаюць дамаўляцца аб часе з а п о і н, аб тым, колькі трэба прывезці гарэлкі, калі ехаць да свяшчэнніка і калі, нарэшце, прызначыць дзень вяселля. У прызначаны для запоін дзень бацькі дзяўчыны запрашаюць да сябе сваіх сваякоў. Сватоў садзяць за стол, у ганаровы вугал (на кут), і яны пачынаюць частаваць усіх сваёю гарэлкаю і закускаю. Даўшы ўсім па чарцы, сваты гавораць: «Пакажыце ж нам, за кім пытаемся». Тады хрышчоная маці дзяўчыны падводзіць яе да стала і навязвае на шыю асобна кожнаму свату па ручніку ад нявесты. Сваты ў сваю чаргу прапануюць нявесце чарку гарэлкі, у якую кідаюць грошы (20—30 кап.), і даюць ёй закуску: абаранкі, пернікі, а часам і цукеркі. Цэлую чарку гарэлкі нявеста вылівае ў вугал сваёй хусткі і ідзе з закускаю да маці, якая ў гэты час стаіць каля слупа ля печы, і, плачучы, прыказвае: «Мамка мая, прымі падаруначкі, хоць яны невялікія, толькі былі б шчаслівыя, благаславі мяне, мамка!»

Маці, прымаючы тыя рэчы, таксама плача і прыказвае: «Дачушка мая, падменніца мая! Хто ж мае плечкі падменіць, хто ж мае ручкі падменіць, хто мне працу рабіць дапаможа».

За сталом пачынаецца выпіўка і пачастунак ад сватоў, а потым падаюцца стравы ад бацькоў нявесты. У час гэтых пачастункаў жанчыны спяваюць:

Учора пілі на карову,
А сягонні на каня,
Кабы наша мілая
Здарова была.

Каб я ведала, маладзенька,
Сваю горкую долю,
Я ж бы паслала свайго татухну
У даліну па каліну.*
Вецер не веіць, сонца не грэіць,
Калінка не зрэіць.
Каб я ведала, маладзенька,
Сваю горкую долю,
Я ж бы паслала сваю мамухну

* Словы «У даліну па каліну» і «Калінка не зрэіць (сазрэла)» паўтараюцца два разы.

У даліну па каліну.
Вецер не веіць, сонца не грэіць,
Калінка не зрэіць.
Каб я ведала, маладзенька,
Сваю горкую долю,
Я ж бы паслала свайго мілага
У даліну па каліну.
Вецер павеяў, сонца прыгрэла,
Калінка сазрэла.

Гэтыя дзве песні абавязковыя, але спяваюць і іншыя, вясельныя.

**Заручыны**

Вяселле звычайна прызначаецца на нядзелю, напярэдадні ж, г. зн. у суботу, вечарам бываюць у нявесты вечарыны, або заручыны. У гэты вечар збіраюцца да нявесты ўсе запрошаныя на вяселле і ўсе знаёмыя ёй дзяўчаты. Усе запрошаныя госці павінны прынесці гаспадарам па бохану хлеба з соллю. Наняты на ўсё вяселле музыкант дударом іграе, а дзяўчаты скачуць. Танцы пачынаюць заўсёды ў той жа вечар бацька і маці нявесты. Песень да прыезду сватоў не спяваюць. Прыязджаюць сваты і, калі ўваходзяць у хату, пытаюць: «Добры вечар вам, ці не прымеце начаваць?» — «Начуйце, сваточкі, начуйце»,— адказваюць ім. Іх адразу ж садзяць за стол, а з імі і запрошаных гасцей, за выключэннем нявесты і дзяўчат, якія ў гэты час танцуюць у другой хаце. Сваты павінны прывезці з сабою гарэлку і закуску. Сеўшы за стол, яны патрабуюць місак, наліваюць туды гарэлку, якую прапануюць усім па чарцы, а кожнаму з сваякоў даюць асобную закуску (што называецца дарамі).

Прапанаваўшы потым усім гарэлкі і закускі, сваты гавораць: «Пакажыце нам таго, за кім мы страдаем».

Хрышчоная маці ўстае з-за стала, прыводзіць нявесту да сватоў і дае ім ад сябе дары: сватам па ручніку, а жаніху пасылае праз іх сарочку, панталоны, хустачку і пояс, апрача таго, кожнаму члену сям'і жаніх пасылае таксама падарункі: па кавалку палатна, па хустачцы, поясу і інш. Сваты ж перадаюць нявесце ад жаніха чаравікі і панчохі, а таксама даюць гарэлку і лепшую закуску (абаранкі, сыр і інш.). Атрымаўшы гэтыя падарункі, нявеста перадае іх маці, прычым яна кланяецца ёй да зямлі, плача і прыказвае: «Прымі мае падаруначкі! Хоць яны невялікія, толькі былі б шчаслівыя, благаславі мяне, мамачка, на доўгі век, на кароткую дарогу».

Маці, прымаючы падарункі, гаворыць: «Дачушка! Няхай цябе бог благаславіць на доўгі век, на кароткую дарогу».

Потым нявеста кланяецца іншым сваякам і плача. Усе садзяцца за стол і пачынаецца частаванне: гарэлка тут ужываецца тая, якую прывезлі сваты, стравы ж гаспадарскія. Нявеста ў гэты час не сядзіць за сталом, яна з сяб-

роўкамі ў іншай хаце танцуе, там і музыкант іграе. У перапынках паміж пачастункамі сваты і запрошаныя госці, якія сабраліся тут, спяваюць:

Я й не ведала, маладзёшынька,
Што сягонні заручынкі,
Я ж бы паслала сваю мамухну
У даліну па каліну (*далей, як у папярэдняй песні*).

На заручынах спяваюць яшчэ:

А ў нас сянні заручынкі —
Бог нам даў;
Шылі дары на ўсе сталы —
Бог нам даў;
Елі падаркі, круты баранкі —
Бог нам даў.

Ай, вумная, разумная Матрунка! *
Паставіла старожыньку на браду,
Сама села пад вішанькай у саду.
Адкуль, адкуль красна сонейка ўзыйдзець,
Адтуль, адтуль мой міленькі ўз'едзець.
Саколічак каля аконычак лятаець.
Крыльцом вакошычка адчыняець.**
Ай, вумненькі, разумненькі Паўлютка.
К цешчы на двор васілёчкам сцелецца,
У сені лезіць — гарнушычкам коціцца,
У хату лезіць чырвонаю мятаю,
За столікам саколікам верціцца,
Ля Матрункі блізёхінька садзіцца.

Калі выходзяць з-за стала, спяваюць:

Спасіба свату за цёплую хату,
За сахарную страўку.
А наша патраванька з ўсёй запраўай,
І з перчыкам, з інберчыкам,
І з крынічнай вадзіцай,
І з салодкай сыціцай.

Гаспадар адпраўляе гасцей са словамі: «Ах, ці ні пара, госцейкі, вам дамоў ехаць, я ўжо і так прахарчаваўся».

---

* Радкі 1—5 паўтараюцца па два разы.

** Тут прапушчаны тры радкі, якіх у арыгінале нельга было зразумець (заўвага П. Шэйна).

А брат нявесты гаворыць: «Што ты, бацька, адпраўляеш? Яшчэ іхняя кароўка не доена, трэба падаіць» (намёк, што не ўся гарэлка выпіта).

Сваты пачынаюць таргавацца, кажуць: «Наша дарога доўгая, можа дзе трэба мост намасціць, работнікаў наняць, мы людзі не багатыя, можа трэба будзе лес рассякаць, чым трэба плаціць? Не разбівайце ж нас».

Нарэшце, раздадуць усю гарэлку галоўнейшым асобам і, падзякаваўшы гаспадароў за хлеб-соль, збіраюцца ад'язджаць. На двары, аднак, нявеста з галоўнай баяркай затрымліваюць каня. Сваты спачатку іх знарок адганяюць, але потым, зрабіўшы выгляд, быццам толькі цяпер даведаліся, што гэта сама нявеста, даюць ёй і баярцы па чарцы гарэлкі і крыху грошай і ад'язджаюць.

## Вянец

У гэты дзень падымаюцца рана, рыхтуюць стравы, потым пачынаюць апранаць нявесту да вянца. Галоўная сваццня апранае на яе сукенку, вянок, расчэсвае касу і заплятае. (Калі нявеста сірата, дык касу ёй не заплятае, а толькі расплятае, пасадзіўшы яе на дзяжу). Потым высоўваюць на сярэдзіну хаты стол, ставяць на ім гарэлку і закуску, а бацькі і блізкія сваякі садзяцца пад абразамі; бацькі бяруць абразы, запальваюць свячу, баярка падводзіць нявесту спачатку да бацькоў, потым па старшынству да ўсіх, хто сядзіць за сталом, і пачынаецца благаславенне.

Нявеста кланяецца да зямлі па тры разы ўсім і плача, музыкант у гэты час іграе, усе благаслаўляюць словамі: «Бог цябе благаславіць на доўгі век, на кароткую дарогу».

Потым баярка разам з нявестай садзяцца за стол, п'юць гарэлку і развітваюцца з бацькамі і тымі, хто застаецца дома, едуць у царкву. Нявеста ўвесь гэты час павінна нічога не есці. Яе вязе брат або хрышчоны бацька, з ёю на возе сядзіць толькі баярка. Сваццi едуць асобна; песень у гэты час не спяваюць, толькі музыканты іграюць матывы журботных песень. Жаніха такім жа чынам адпраўляюць да вянца яго бацькі, толькі ён разам з братам або халастым сваяком павінны ехаць да вянца вярхамі. Прыехаўшы ў царкву, усе ў час абедні моляцца. З заканчэннем абедні святар адпраўляе абрад вянчання, пасля чаго маладая пара разам са сватамі накіроўваюцца да яго ў дом, дзе ён запісвае маладых у метрыку... Потым абедзве дружыны разам накіроўваюцца ў карчму або да якога-небудзь знаёмага ў сяле і там п'юць гарэлку, якую прывезлі з сабою, закусваюць, танцуюць і спяваюць песні. З царквы жаніх едзе разам з нявестай на сваіх конях. Адразу ж пасля вянца сваццi пачынаюць пець наступныя песні:

Ай, попе, попе, бацька наш!
Павянчаў жа ў адзін час,
А ў тую гадзіну шчаслівую.
Ай, рэкі, рэкі Іардані!

Стаялі папы радамі,
Там нашага Паўлюську вянчалі:
Рызкамі ручанькі звязалі,
Ніхто не можа развязаць,
Ай, ні ножычкам разрэзаць.
Так нам маладым векаваць.
Учора Матрунка весяла;
Абсела не чужына,
Усё Паўлюськіна радзіма.

А ехала Матрунка з-пад вянца,
Ай, сеяла расаду з рукаўца.
Ай, вейся, вейся, качання,
Дайся долінька з вянчання,
Шчасця, багацця ў рукаве,
Розум, здароўе ў галаве.
Матрунка ў мамкі каханка,
Чы не было кавалёў раскаваць?
Чы не было грабянцоў расчасаць?
А былі кавалі ў дарозе,
А былі грабянцы ў возе.

Пасля выпіўкі і закускі абедзве дружыны развітваюцца і раз'язджаюцца па сваіх хатах асобна, нявеста са сваёй дружынаю едзе да сябе, жаніх са сваёй — таксама да сябе дадому. Дарогаю спяваюць:

А маменька мая,
Я ужо не твая!
Я ж таго пана,
З кім я павянчана,
На вяночку стаяла,
Богу прысягала,
Пярсцёнка мяняла,
За руку дзяржала.

Бацькі сустракаюць нявесту; яна ім кланяецца ў ногі, яе вядуць у хату, садзяць з дружынаю за стол і даюць абедаць. У час абеда спяваюць:

Села сабе Матрунка за сталом,
За поўным кубкам, за віном:
«Даруй мяне, татухна, чым хочаш».
— Дарую, дачушка, дарую,
Хлеба-солі гатую.
Села Матрунка за сталом,

За поўным кубкам, за віном:
«Даруй мяне, мамухна, чым хочаш».
— Дарую, дачушка, дарую,
Кублічак трубачак гатую.
«Будзем, маменька, вячэраць,
Павячэраўшы, дзяліцца:
Табе, маменька, кублічкі,
А мне, маменька, трубачкі,
Табе, маменька, кручкі,
А мне, маменька, ручнічкі,
Табе, маменька, усё дабро,
А мне, маменька, серабро».
— Едзь, мая дачушка, без кубла,
Чаму маёй кудзелькі не скубла?
Не сядзець было на печы,
Не махаць было нагамі,
Работаць было рукамі.

Бярозка з лісточкам, бярозка з лісточкам
Усё лета шумела, усё лета шумела:
«Бярозка мая, белая мая, я ж цябе кідаць буду.
Я ж цябе не забуду, вясной к табе буду — не забуду,
Вясной к табе буду, шумець з табой буду».
Матрунка з мамкай, Матрунка з мамкай
Усю восень гаварыла, усю восень гаварыла:
«Мамухна мая, родная мая, я ж цябе кідаць буду,
Я ж цябе кідаць буду, я ж цябе не забуду,
Я ж цябе не забуду, у госці к табе буду,
У госці к табе буду, гаварыць з табой буду».

Пасля таго, як паднімуцца з-за стала і крыху патанцуюць, нявесту з сяброўкамі выводзяць у другую хату; потым падрыхтоўваюць усё прызначанае, каб надзяляць нявесту. Бацькі хрышчоныя з сяброўкамі падводзяць яе да дзвярэй, яна плача і прыпявае:

Расчыніцеся, цясовыя дзверы,
Расступіцеся, добрыя людзі!
Прапусціце мяне за цясовыя столікі,
За бялёвыя скацеркі.

Яе зноў выводзяць у хату да гасцей і садзяць за стол. Каля яе садзяцца сяброўкі, а на галоўным месцы пад абразамі садзіцца хрышчоны бацька. Ён бярэ два маленькія пірагі і гаворыць, паўтараючы тры разы: «Дудка-галубка! Каб ты век іграла, неераставала, а гэты час перастала. Просіць ма-

ладая княгіня песеньку пачаць, а бацька з маткай вяселле згуляць. Чы не знойдзецца на гэты час малады князь, песеньку пачаць, вяселле згуляць? Дам яму два боханы хлеба на месяц і чарачку вінца. Ці ёсць у доме свянцоным, у піры вясёлым бацька і маці, і браты, і сёстры, і дальныя прыезджыя? Просяць песеньку пачаць, вяселле згуляць».

Усе адказваюць:

«Бог благаславіць!» (3 разы).

Тады з натоўпу звычайна выходзіць адзін, які ўмее песню стаўбавую заводзіць, лезе на печ, садзіцца каля слупа і пачынае прыказваць: «Ах, пака на слуп забраўся, насовенка падраўся, сем гадоў пад градамі валяўся, пакуль гэтага вяселлейка я дачакаўся. Чы не далі б мне чарачку вінца, чарачку піўца, прамачыў бы я ў роце, мог бы пару слоў сказаць».

Звяртаючыся да хрышчонага бацькі: «Пане тысяцкі, ваявода шляхецкі! Чы не падаслаў бы ты мне на месяц хлеба, чарачку вінца, чарачку піўца, мог бы я табе песеньку пачаць, вяселлейка гуляць».

Пачынае пець:

Звіўся хмель з тычынкаю,
Злюбіўся Паўлюська з Матрункаю і інш.

Тады бацька хрышчоны тры разы б'е маленькімі пірагамі адзін аб другі; адзін кладзе на бажніцу, а другі кідае праз усю хату запявале. Яго тады частуюць гарэлкай. Тут бацька і маці бяруць хлеб з соллю і грошы і пачынаюць благаслаўляць і прыказваць: «Надзяляем цябе, дачушка, хлебам, соллю і добрай доляй, серабром і ўсім дабром. Цяпер на мяне, дачушка, не спадзявайся, раненька ўставай, мужа пабуджай».

Пасля благаславення бацькоўскага запявала, седзячы ўсё на печы, пачынае выклікаць усіх для благаславення такімі словамі: «Госцейкі дальнія, прыезджыя, бліжнія, прыходжыя, хадзіце маладую княгіню надзяляць: хто канём, хто валом, хто чыстым серабром. І тыя бабылкі, што не маюць кабылкі, надзяляйце маладую Матрунку: ёй многа трэба, далёка паедзе, і масточкі масціць і гваздочкі гваздзіць».

Госці пачынаюць падыходзіць да стала, кладуць грошы ў падрыхтаваную талерку, нявеста ўсякаму кланяецца, а хрышчоны частуе кожнага чаркай гарэлкі. У час гэтага благаславення, якое працягваецца некалькі гадзін, прысутныя тут жанчыны спяваюць:

Матрунку братунька * надзяляе
Серабром, серабром, усім дабром.

Нявеста кланяецца, плача і прыказвае:

Спасіба за твае, мой браце, дары,
Хоць яны не вялікі, а былі б шчаслівы.

* Або сястрыцу, або суседку і да т. п. (заўвага П. Шэйна).

З заканчэннем гэтага абраду ўсе падымаюцца з-за стала і чакаюць прыезду жаніха з дружынай за нявестай. Жанчыны спяваюць песню баяркам нявесты:

А баярачкі псічкі, *
Сядзяць як лісічкі,
А баярачкі сёстры,
А ў іх насы востры,
Вазьміце мешалкі,
Замяшайце свінням.

А баяркі спяваюць:

Жаль нам, Матрунка, цябе!
Адсылаеш нас ад сябе.

Амаль адначасова з заканчэннем надзялення нявесты прыязджае жаніх са сваёй дружынай, якая складаецца з яго бацькоў хрышчоных, сватоў, свацццяў, братоў і сваякоў. Нявесту выводзяць у сенцы, а жаніх застаецца на двары з дружынай, сярод якое пачынаецца ўзаемная ацэнка якасцей маладых; яны спрабуюць ашукаць жаніха, выводзяць яму баярак замест нявесты, але ён не паддаецца ашуканству і праганяе баярак. Нарэшце, да яго выводзяць нявесту і прымушаюць іх абдымацца. Усе бяруцца за рукі і, па запрашэнню гаспадара, уваходзяць у хату. Жанчыны ў гэты час спяваюць:

Сваты ў хату лезуць,**
У печ заглядаюць:
А чы густа капуста,
Чы вялік гаршчок кашы,***
Чы паядаюць нашы?
— А паядаюць нашы,
Астанецца вашым.
А спасіба свату
За цёплую хату,
А мы перамерзлі,
А на лютым марозе,
А ў дальняй дарозе.
Ай, ехалі сваты

* Радок паўтараецца два разы.
** Радок паўтараецца два разы.
*** Радок паўтараецца два разы.

Па калінавым масту,
Масты паламілі,
Коней патапілі, *
Сукні памачылі.
А спасіба сваццi
За сахарную страўку.
Усё юшка ды юшка,
Ай, дзе ж тое мяса?
— А хазяічка ласа,
Паела ўсё мяса.
Дзе ж тая гаспадыня,
Што капусту варыла:
Чы каровачак доіць,
Чы цялятак поіць,
Чы ў хлеў заганяець,
А к нам не біваець?

Прыезджую дружыну садзяць за стол, нявесту побач з жаніхом. Ім кладуць на дваіх толькі адну лыжку, прычым спяваюць наступную песню:

Шчабятаў салавей у бару,
А на калінінцы седзячы,
Горку ягадку клюючы:
«Ай, каб жа ка мне зязюля,
А ўмеў бы я з ёй шчабятаць,
На адной ветачцы седзячы,
Адну калінку клюючы».
Плакаў Паўлюська за сталом:
— А калі ж бы ка мне Матрунка,
А ўмеў бы я з ёй гаварыць,
З адной лыжачкі хлябая,
З аднаго кусочка кусая.
Не хацелася Матрунцы
Ай, ля Паўлюські сядзецi,
З-пад яго шапанькі глядзецi,
А для шапанькі саболля,
А выводзiць Матрунку з застолля
І з таткінага падвор'я.

У гэты час дружыну жаніха і яго самога частуюць. Маладыя за сталом мала ядуць. Як кончыцца пачастунак, дружына пачынае скакаць, гу-

* Радок паўтараецца два разы.

тарыць, а маладых адводзяць у другую хату і там іх асобна частуюць, як можна лепш, і спяваюць:

Цешча зяця жадала,
Сукнямі двор слала;
А калі б яе змога,
Наслала б і многа;
А калі б яе сіла,
Увесь бы двор украсіла.

Калі накормяць маладых, дружына збіраецца ад'язджаць. Маладых падводзяць да бацькоў, сваякоў і ўсіх прысутных у хаце. Нявеста моцна плача, кланяецца і прыказвае:

Дабранач, мая мамухна, дабранач.
А не той жа дабранач, што нанач,
А той дабранач, што на ўвесь век,
Ні на адну на мяне — на ўвесь свет.

У гэты час сваццi спяваюць:

Шаўковая нітачка к сцяне льнець,
Так Матрунка мамухне дабранач даець.

Дружына жаніха забірае нявесту, жаніх саджае яе ў свае сані і ўсе разам едуць. Усю дарогу ўсе, апрача маладых, спяваюць:

Не мамка дочцы — мачыха,
Аддала дочку скрозь ночку,
Ні праваднічка не дала,
Ні сама за ёй не прыйшла.
Мяцёна дарожка кружкамі,
Вязёна Матрунка з дружкамі.
Паедзем, брацец, мы дамоў,
Ужо нас мамухна даўно жджэ:
«Калі мае дзетачкі прыедуць?
Калі маю нявестку прывязуць?»
Прывязуць нявесту ў атласе.
Не хачу нявесты ў атласе,
Хоць бы ў беленькай сярмяге,
А была б у добрай звяге.
Прыехаў Паўлюська к варотам,
Стукнуў ботам:
— Адчыні, татухна, мне вароцікі,

Ужо мае конікі перабегліся,
Ужо я й сам, маладзец,ператужыўся,
Мая Матрунка пераплакалась,
І сваццінькі перапеліся,
І дудынька перайгралася.

Калі на шляху маладых сустракаюцца вёскі, ім робяць там перашкоды, якія затрымліваюць праезд. Перашкоды гэтыя дружына імкнецца, паганяючы моцна коней, пераскочыць; але калі гэта не ўдаецца, дык даюць гарэлку, каб разабралі платы. Пры ўездзе маладых у сваю вёску, суседзі кладуць на вуліцы куль саломы і падпальваюць яго. Праз такое полымя маладыя павінны праехаць. Калі прывязуць нявесту да двара жаніха, ім насустрач выходзяць яго бацькі. Свякруха надзявае на сябе кажух навыварат, на галаву касматую шапку, трымаючы ў руках ікону, пірог і кудзель шэрсці. У нявесты ў гэты час таксама ў руках ікона і пірог. Свякруха пры сустрэчы пытае нявесту: «З чым жа ты ка мне, нявестачка, прышла?»

Тая адказвае: «З хлебам і соллю, з добрым здароўем».

Свякруха бярэ ў яе з рук пірог і ікону, маладыя кланяюцца бацькам у ногі па тры разы, іх вядуць у хату. Сваццi спяваюць:

Выйдзі, свякроўка гарбата,
Прыехала нявестка багата;
Выйдзі, свякроўка сапліва,
Прыехала нявестка шчаслiва.

Сталы ў гэты час застаўлены рознымі стравамі, маладых і дружыну садзяць за стол, астатнія спяваюць:

Субота нядзелінку радзіла,
Дай божа добры час, гадзіну,
Каб Матрунка свякровыньке гадзіла.
Ай, не бось жа, свякровынька, я угаджу,
А я з табой каля печы пахаджу.

Калі ўстануць з-за стала, бацька хрышчоны жаніха (дружка) дастае прывезеную пасцель нявесты і рыхтуе яе для маладых. Тады галоўныя сваццi бяруць нявесту, вядуць яе ў клець, там распранаюць яе зусім, апранаюць на яе чыстую сарочку, уводзяць да яе жаніха і пакідаюць іх адных у клеці. У гэты час дружка ўносіць у хату прывезеную нявестай смажаную курыцу і хоча ёю пачаставаць усіх. Але гэта яму не ўдаецца: курыцу гэту выхопліваюць у яго з рук, раздзіраюць на кавалкі і раскідваюць па падлозе. Потым п'юць гарэлку і спяваюць:

На свадзьбу нас зазвалі,
Чарку гарэлкі не далі,
Каб я ведала, не пашла б.
Чы я б сабе работы не нашла б?
Лутчы б на печы сядзела
Ды белую кудзелю вярцела.

У гэты час галоўны сват са сваццямі ідуць у клець падымаць маладых і нясуць ім вады ўмыцца; п'юць там жа гарэлку, якую падносяць і маладым. Усе спяваюць:

Добрыя нашы марозы,
Не змарозілі нам рожы:
Пусцілі веццi па клецi,
Пусцілі хвалу па сялу.
Паглядзіце, жоначкі,
Чы ўсе нашы дзевачкі?
— Усе нашы дзевачкі,
Адной Матруны нетуці,
Пагнала яна ў поле.
Пад калінай спаць лягла,
Ножкамі каліну драгнула,
Калінка ў падалок прыгнула.
А ў яе дзецюкі прасілі:
«Не дам каліны нікому,
Панясу каліну дадому,
А ў свякраткіну камору».
А ўчора ў нас мароз быў,
А сягонні іней паў
На свякраткіну камору,
На Матрункіну пасцельку.

Я й лажылася на печы,
Я й праснулася ў клецi —
Ажну мае ножанькі разуваны
І вуснaчкі цалаваны.

Калі маладыя паснедаюць, бацькі жаніха пасылаюць яго са сватам да маці нявесты з чалабітнай. Яму даюць адвезці маці сарочку нявесты, салодкую гарэлку падфарбаваную, пернік (бутэльку з гарэлкай перавязваюць чырвонай шаўковай стужкай). Пры такім з'яўленні маладога ў бацькоў нявесты там пачынаецца агульнае вяселле.

Маладога са сватам частуюць самымі лепшымі стравамі: яечняй, халоднаю ялавічынай, пірагамі, бабкамі, мёдам, а ўсіх сваіх частуюць прыве-

зенай чырвонай гарэлкаю. Малады запрашае бацькоў жонкі і яе сваякоў у госці і ад'язджае са сватам дадому...

Пасля ад'езду жаніха бацькі нявесты збіраюць вялікую дружыну са сваіх сваякоў, каб іх пасляць з пасагам дачкі. Выбраныя садзяцца за стол, бяруцца за рукі і такім чынам выходзяць з-за стала. Яны выязджаюць, забраўшы з сабою скрыню нявесты, куды маці кладзе ёй каравай. Скрыню ставяць на воз, на яе садзіцца галоўны сват і сваццяя нявесты і ў суправаджэнні музыканта і ўсёй дружыны накіроўваюцца з песнямі да жаніха. Вось тыя песні:

Ехалі прыданыя выбіраныя,
А конікі гадаваныя,
Яны людзі пісьменныя,
А падузы раменныя,
Да раду, сваты, да раду,
А ў вялікую грамаду.
А бярыце сваю параду,
Бярыце дудыньку-ігрунню,
А сваццінньку-пявунню;
Пад маладога — дужога,
А пад сваццінькаў — лянога,
Каб ён шыбінька не нёсся,
Каб іх галасок не тросся,
Большы сваток напярод,
А сваццінька пасярод.

Да прывёзшых пасаг выходзяць бацькі жаніха, каб узяць скрыню, але ім яе не даюць дарам. Адбываецца даволі працяглы гандаль і толькі пасля добрага выкупу міраццца і дазваляюць яго ўзяць. Тады ім выносяць гарэлку і пірагі, а прыезджыя з свайго боку таксама частуюць гарэлкай і пірагамі... У гэты час маладыя павінны абысці ўсю прыехаўшую дружыну і ўсім кланяцца. Прыезджых і ўсю дружыну зноў частуюць гарэлкай і закускай. Потым некалькі старшых сваццяў ідуць з нявестай у другую хату пераапранаць яе. Здымаюць з яе галавы вянок, прычэсваюць і завязваюць хустку. Сваты жаніха ў гэты час спяваюць:

Чы харош новы дом пад кроўляю?
Чы хароша Матрунка пад намёткай?
Ай, харош новы дом пад кроўляй,
Ай, хароша Матрунка пад намёткаю.
На яе брацілкі заглядаюцца,
Што яе лічыйка папрыгажэла,
Што яе галоўка пакруглела.

Прыбраўшы маладую, яе накрываюць хусткаю *. Жаніх абавязаны пацалаваць яе, зняць з яе хустку і яе самую з дзяжы. Тады іх абодвух ставяць побач, накрываюць доўгім ручніком і вядуць у хату. Там яны, стоячы пад ручніком, кланяюцца бацькам жаніха і, зняўшы з сябе ручнік, такім жа чынам самі пакрываюць ім галовы бацькоў. Сват і сваццi нявесты дастаюць з яе скрыні новыя ручнікі, скацерці і каравай. Каравай гэты кладуць на века (накрыўка ад дзяжы), і сват, паклаўшы яго на галаву, урачыста ўносіць у хату, кладзе на стол і прапануе бацьку жаніха купіць яго. Пачынаецца гандаль, пасля якога бацька бярэ каравай і аддае яго зноў нявестцы. У гэты час сваццi здымаюць з ікон старыя ручнікі і навешваюць на іх новыя, прывезеныя нявестай; сталы таксама засцілаюць яе абрусамі. Пасля ўсіх гэтых цырымоній пачынаецца частаванне дружыны, якая прыехала.

За сталом спяваюць наступныя песні:

Ай, наша Матрунка вялікага роду,
Не здзелала нам трывогу.
Як золат персцень на руцэ,
Так яе радзінка на куце,
Як золат персцень шаруюць,
Так і радзіну шануюць,
Як золат персцень палужаюць,
Так яе радзіну паважаюць.

А ў нашага свата дзіўнае дзіва:
Цясовая хата, бліновыя дзверы,
З перапеч печка збіта, сочнямі накрыта,
Індык хату тапіў, заяц ваду насіў,
Бараны ў арганы, казлы ў барабаны,
Падцёлкі ў свішчолкі, быкі ў гуткі,
А старыя каравіцы, як ударылі ў ладаніцы!
А сівыя свінні ад смеху паздыхалі.
А ў нашага свата дый дзіўнае дзіва:
Цясовая хата, кругом хаты мята,
І ў хаце багата,
Кругом хаты елле (ель),
А ў хаце вяселле.

Як устаюць з-за стала, госці спяваюць:

Далі піць, далі есць,
Дайце пагуляці,

* У арыгінале тут, як відаць, прапушчаны словы «і саджаюць на дзяжу» (заўвага П. Шэйна).

Панчошкі шчакочуць,
Пагуляння хочуць.
Як у нас, так у вас,
А ўсё поле роўна,
Як і нам, так і вам —
Пагуляці вольна,
Як у нас, так у вас —
На полі крапіўка.
Ты, Паўлюська, будзь такоў,
Не давай Матрунке патакоў.
Мяняй конікаў з цаною,
Бі Матрунку з віною.

Калі збіраюцца ад'язджаць, спяваюць:

Паедзем дамоў, паедзем!
Каму сваю Матрунку прыкажам?
Прыкажам Матрунку Паўлюську:
Не біце Матрунку дубцамі,
Навучайце Матрунку слаўцамі,
Не біце яе вяроўкай,
Навучайце яе гаворкай,
Ад дубцоў яна дурнее,
Ад слаўцоў разумнее.

Ім адказваюць:

А будзеце, сваточкі, начаваць,
А будзеце саломкі дабываць.
А ў нас салома дарага:
За ячны снапочак — шасточак,
За сена вязку — сярмяжку,
За лубку аўса — дзеўка ўся.

Калі госці паедуць, сваякі жаніха садзяцца вячэраць і спяваюць:

Гаспадыня тужыла,
Што вяліка дружына,
А гаспадар таму рад:
«Садзіцеся госці ў рад!»
А каб яны пілі, елі,
Харошыя песні пелі.

На трэці дзень вяселля, звычайна ў аўторак раніцай, сям'я жаніха запрашае да сябе ўсіх сваіх суседзяў з вёскі. Калі госці збяруцца, запаль-

ваюць свечкі перад абразамі, моляцца богу, потым садзяцца за стол, пачынаюць дзяліць каравай. Абавязак гэты выконвае хрышчоны бацька жаніха. Сваякам жаніха даюць асобна і вялікую частку, потым таксама маладым, музыканту, братам і сёстрам маладога. Рэшткі каравая ядуць усе разам за сталом.

Устаўшы з-за стала, прымушаюць нявесту выконваць розныя работы. Перш за ўсё ёй загадваюць вымесці хату, але дзе б яна ні пачала месці, туды кідаюць знарок living рознае смецце да таго часу, пакуль малады муж не выкупіць яе ад гэтай работы, прапанаваўшы ўсім прысутным гарэлкі. Потым маладой загадваюць прынесці вады; зноў пачынаецца тая ж гісторыя: усе ідуць да калодзежа, зачарпнутую ёю ваду пастаянна выліваюць, пакуль муж зноў не заступіцца за яе і не выкупіць яе гарэлкай. Тады прымушаюць яе пячы бліны. У падрыхтаванае цеста кідаюць анучы і г. д.— зноў выкуп. Усе смяюцца быццам над няспрытнасцю маладой і, крыху патанцаваўшы, разыходзяцца па хатах.

Гэтым заканчваецца вяселле, увесь яго абрад. Часам бацькі нявесты запрашаюць яшчэ да сябе ў госці сям'ю жаніха; у такім выпадку бацькі жаніха запрашаюць у сваю чаргу да сябе сям'ю нявесты. На гэтых *п е р а з о ў к а х*, як іх сяляне называюць, спяваюць наступныя песні:

Нашай Матрункі трох дзён нет,
Прыўныла наша падвор'е:
Ў галубнічку галубы не гудзяць,
Ў гародзе красачкі не цвіцяць,
Прыехала Матрунка да дому —
Ў гародзе красачкі зацвілі,
Ў галубнічку галубы загудзелі.

А ўжо не рана, сонца на закаце,
А ўжо Матрунка на выходзе.
Яе мамухна начаваць унімае:
«Начуй, дачушка, начуй, родная!
Ужо рожа расцвітае».
— Мамухна мая, родная мая!
Не буду я начаваці,
Мне рожы не шчыпаці,
Мне віночкі не звіваці.

### Вяселле ў вёсцы Берлеж Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна

Цяпер жэняцца толькі тады, калі згаворацца самі маладыя людзі. Часцей за ўсё яны задоўга да шлюбу знаёмяцца, гуляюць, дамаўляюцца паміж сабой, а потым гавораць бацькам. Малады з бацькамі выбіраюць дзень і

едуць да нявесты і яе бацькоў (пры гэтым яны бяруць з сабой хлеб, соль, гарэлку, ручнік).

Заходзяць у хату. Адразу не гавораць чаго прыехалі, а нібы гандлююць што-небудзь, напрыклад кажуць, што прыехалі купляць цялушку. Бацькі нявесты адказваюць:

— А наша цялушка бадліва, брыклiва, крыклiва, калюча.

Сваты ж не здаюцца, не «цяраюцца», на «цялушку» згаджаюцца. Ставяць на стол гарэлку, хлеб, соль. «Запіваюць» нявесту. Так адбываюцца запоіны (або заручыны).

Калі на заручынах бываюць сяброўкі нявесты (будучыя дружкі) і іншыя госці, тады, падпіўшы, яны спяваюць шмат песень. Сярод іх і наступную:

Сваты хаты дай не ведалі *
Да ў хлеў заехалі.
Бычку ручку далі,
А кароўцы шапку знялі,
А з цялушкай прывіталіся,
А авечачцы пакланіліся.
Свіння тут падзівілася,
Са смеху пакацілася.
Адзін сват пытае:
— А дзе ж ваша маладая?
А жывёлы засмяяліся:
— Не туды сваты папаліся.
На дварэ стаіць святліца —
Там жыве красная дзявіца.
Сватам сорам стала —
Заручыны йдуць нядбала.

На заручынах дамаўляюцца пра дзень вяселля. Нявеста падносіць маладому ручнік з хлебам і соллю.

Прыкладна праз тыдзень бацькі маладой разам з ёю едуць (або ідуць) да маладога і яго бацькоў, каб упэўніцца, што вяселле будзе. Калі маладая перадумала, то вязе хлеб, соль, гарэлку і ручнік, які прывозіў жаніх, і вяртае яму, калі ж малады і нявеста згодны браць шлюб, то канчаткова дамаўляюцца пра дзень вяселля (адпаведна дамаўляюцца і ў сельсавеце аб рэгістрацыі шлюбу).

Вяселле пачынаецца звычайна ў суботу. У сярэдзіне дня ўчыняюць каравай. Для гэтага збіраюцца ўсе сваякі. Замешвае каравай часцей за ўсё хросная маці з удзелам іншых сваякоў, каравайніц. З цеста качаюць шышкі, якія потым кладуць на каравай. У сярэднюю шышку закатваюць грошы

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

(15 кап. або больш) — «для жыцця харошага» (потым, калі разразаюць каравай, гэту шышку даюць маладым).

У час падрыхтоўкі караваю спяваюць шмат спецыяльных каравайных песень. Замешаны каравай кладуць на драўляную лапату. Каравайніцы гушкаюць каравай і прыгаварваюць:

— Благаславі, ацец і маці, добрыя людзі! (Паўтараюць гэтыя словы тры разы.)

— Першым разам, добрым часам бог благаславіць.

Другім разам, добрым часам бог благаславіць.

Трэцім разам, лепшым часам бог благаславіць.

Каравай садзяць у печ, а каравайніцы ідуць за стол, каб «паліць» каравай. «Паліваюць» каравай такім чынам — п'юць гарэлку, закусваюць, спяваюць.

Вымаюць каравай таксама своеасаблíва: стукаюць тры разы лапатай аб столь, потым першая шаферка выскаквае з гэтай драўлянай лапатай на вуліцу. Калі сустрэне мужчыну, то скора выйдзе замуж, калі ж жанчыну — у гэтым годзе нельга спадзявацца на шлюб. Але ў гэту прыкмету ўжо ніхто не верыць. Выняўшы каравай і «выведаўшы» лёс першай шаферкі, зноў садзяцца за стол і «мочаць» каравай. Пры гэтым нярэдка запрашаюць маладога, каб і ён прыняў удзел у «замочванні» караваю. Пасля з караваем, упрыгожаным кветкамі, печанымі шышкамі, едуць да маладой. (Такі каравай рыхтуецца і ў маладога і ў маладой.)

Па шляху ім некалькі разоў загароджваюць дарогу: ставяць стол, кладуць на яго хлеб, соль, бутэльку з вадой, чарку. Малады павінен адкупіцца грашыма. Калі малады едзе да маладой, спяваюць песню:

Да ой, борам, борам да баравіною, *
Да хто ж там едзе да вечарыною,
Да ой едзе, едзе да Іванка п'яны:
— Адчыніся, Ленка, да я твой каханы.
— Я не адчынюся, мамкі баюся.
— Я ж тваёй мамачцы нізенька скланюся,
У цябе, маладой, нанач папрашуся,
Ноч паначаваці, цябе таргаваці,
За русую косу — тры таляры даю,
За цябе, маладую,— тры тысячы дарую.

Маці нявесты выходзіць у вывернутым кажуху, сустракае гасцей хлебам (з двумя драбкамі цукру наверсе), гарэлкай, віном і чаркамі. Выносяць каравай маладой. Маці нявесты вядзе маладога ў хату (маладая ў гэты час дзесьці схавана: дома або ў суседзяў). Ад брата маладога патрабуюць выкупу, і ён выкупляе яе цукеркамі.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Цікава адзначыць, што маладая не адзявае вянка, пакуль не прыедзе малады. Калі з'яўляецца малады, а яго брат выкупляе нявесту, яна адзявае вянок, прыданкі прымацоўваюць да яе валасоў кветкі.

Маці нявесты вядзе ўсіх за стол. Маладых садзяць на кут. Справа ад маладога садзіцца нявеста, а за ёю сваякі і прыданкі, злева ад маладога садзяцца яго сваякі і дружкі. Бацькі наліваюць гарэлку, благаслаўляюць маладых, усе крычаць «горка». Маладыя імкнуцца адкупіцца цукеркамі, але ім гэта не ўдаецца. Крыкі «горка!» сціхаюць тады, калі маладыя пацалуюцца.

У час застольнай бяседы пяюць многа песень.

Пасля працяглага пачастунку сват нясе каравай і ставіць яго на стол.* Ён гаворыць: «Благаславі, ацец і маці і добрыя людзі, каравай падаці» (паўтараюць тры разы).

Бацькі маладой прыносяць хлеб з двума кавалачкамі цукру наверсе і грашыма. Маладым даюць шышкі з каравая, у якія былі закатаны грошы.

Каравай дзеляць і пры гэтым выказваюць пажаданні шчаслівага жыцця маладым, напрыклад:

— Жадаю вам долі, шчасця, здароўя, як у зялёнага дуба, каб жылі люба, каб позна не спалі, рана ўставалі, добра працавалі, каб быў хлеба кусок і дзяцей куток.

— Сыплю вам сто рублёў медзі, каб былі дзеці, як мядзведзі.

Дно каравая завязваюць у хустку і аддаюць музыканту.

Каравай «замочваюць» да позняй ночы, а нярэдка і ўсю ноч. Спяваюць песню пра пірог:

Ой, пойдзем і паглядзім, **
У што наша сваццяя прыбрана.
Ай ці ў шоўк, ці ў атлас,
Ці ў такія сітцы, як у нас.
Добры вечар, сваціца,
Ці добрая зямліца,
Ці ўрадзіла пшаніца,
Ці спякла нам пірага?
А не спякла пірага,
Возьмем вала за рага,
Сіву кабылку за грыўку.
Да павядом на таржок,
Вытаргуем піражок.
Сядзіць сваццяя на уллі,
Пад ёй пчолкі загулі.
Адна пчолка піснула,

* Калі прыносяць каравай, маладая павінна кінуць з яго кветкі прыданкам, дружкам, г. зн. перадаць ім дзявочую красу.

** Кожны радок паўтараецца двойчы.

Сваццproperly пірог сціснула.
А другая загула —
Сваццця пірог аддала.
— Дзякуй, сваццця, за пірог.
І харошы, і прыгожы, і мякенькі,
Толькі ганьба, што маленькі.
Возьмем пірог,
Самі пойдзем за парог,
Сядзем на пясочку
І будзем дзяліць па кусочку.
Тапаром білі — не разбілі,
Адскочыла скарына —
Там — аўсяная мякіна.

Маці аддае пірог, а ўсе ідуць дзяліць яго за парог і даюць усім па кавалачку.

Потым «бяруцца» за сватоў. Звычайна жарты пачынаюцца з першага свата (шафера). Яго абуваюць у лапці, брыюць палкаю або трэскаю. Робяць для яго вянок і вешаюць на шыю, пырскаюць адэкалонам, абліваюць вадою. Нарэшце патрабуюць выкуп (звычайна грошы, за якія потым прыданкі купляюць цукеркі). Сват скача, жартуе, а бабы чаўпуць ля яго гужам, як хто зможа. *

Маладая ж у гэты час рыхтуецца ў дарогу. Яна звязвае свой пасаг, забірае таксама падарункі. У гэты час звычайна пяюць песню:

Вячэрайма, мая мамачка,**
Павячэраўшы, мы падзелімся з табою,
Табе, мамка, сені, хатачка й камора,
А мне, мамка, скрыня, пярыня й карова.
Случылася пасля ночачкі дарога,
Бывай, мая мамачка, здарова.

Брат маладога (або сват) стараецца ў гэты час украсці пару вілак, пару блюдцаў і інш. Маці маладой садзіцца на звязаныя падушкі і іншыя рэчы і патрабуе ад маладога выкуп. Потым малады бярэ нявесту за руку, падае руку старшай сваццці, якая абводзіць іх тры разы вакол кутняга стала (на куце павінен абавязкова стаяць такі стол).

У гэты час госці становяцца парамі і трымаюць булкі хлеба ў руках. Пар павінна быць столькі, колькі дзвярэй у хаце. Хлеб трымаюць уверсе, на выцягнутых руках, пакуль пройдуць маладыя. Маладая бярэ булку хле-

* Скачуць, тоўпяцца гуртам.

** Кожны радок паўтараецца двойчы.

ба, абварочвае яго ручніком, а потым гэты хлеб кладзе ў маладога на комінку печы.

Хросная маці вядзе маладых да машыны. Родная маці бярэ вядро вады і абходзіць машыну тры разы, выліваючы ваду пад машыну з розных бакоў тры разы, садзіцца ў машыну, і, праехаўшы 50 метраў, вяртаецца.

Маладая бярэ клубочак або катушку нітак, кідае яго, узяўшы нітку ў рукі, і крычыць:

— Каціцеся, дзеўкі, усе за мною (каб усе дзяўчаты выходзілі замуж, а калі хлопцы злуюць на дзяўчат, то абрываюць ніткі).

І на гэты раз маладых некалькі разоў перапыняюць. Калі прыязджаюць да маладога, маладая сыпле ў тры бакі цукеркі. Жанчыны спяваюць:

Знаці, знаці, што чужая маці,
Вывернула кажух,
Хоча спужаці.
— Не пужай, мамачка,
Я ж не баюся,
Злезу з машыны —
Нізенька схілюся.

Маці выносіць хлеб з двума кавалачкамі цукру, віно, налівае маладым поўныя чаркі. Першыя чаркі выліваюць, а ў трэцюю маладая кідае грошы, віно выпіваюць, бяруць у рот па кавалачку цукру. Маці маладога ставіць табурэтку (даўней ставілі дзяжу, накрытую кажухом), на яе кладзе падушку. Маладая павінна паслаць надзежнік. Потым маці падае маладой булачку хлеба. Маладая бярэ хлеб і разам з маладым становіцца на падушку. Маці вядзе маладых у хату. Як праходзяць цераз парог, маладая сыпле жыта па хаце, кладзе хлеб на комін і ідзе на кут. Там яна вешае ручнікі, засцілае скацеркай кутні стол (адной або трыма) і кліча радню — бацьку, маці, сясцёр, братоў маладога, дае ім падарункі.

Калі прывязуць маладую, спяваюць песню:

Ой, сватачка, салавеечка, просім вас, *
Каб не было нашаму дзіцяці ганьбы ў вас,
Каб не стаяла цёмнай ноччу пад вакном,
Каб не ўцірала дробных слёзачак рукавом,
Каб не была паветачка хатачка,
Каб не была суседачка матачка,
Паветачка — не цёплая хатачка,
Суседачка — не родная матачка.

Вяселле працягваецца. Жартуюць, пяюць, зноў благаслаўляюць маладых, нясуць каравай і дзеляць яго амаль так жа сама, як і ў маладой. Як

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

падзеляць каравай, маці маладога здымае вянок у нявесткі, павязвае ёй сваю хустку, маладая ж таксама завязвае хустачку свякрусе.

Вяселле цягнецца тры дні. Прыданкі часам адзяваюцца ў цыганоў, варожаць, патрабуюць цукерак. Калі малады з таго ж самага сяла, што і нявеста, ён едзе па маці маладой і сватоў (маладая не мае права тыдзень хадзіць да маці). Госці прыязджаюць і спяваюць:

— Добры вечар, добрыя людзі, і мы к вам, *
Ці не заляцела наша пташачка ўчора к вам,
Хоць вы на ёй усё пер'ейка парвіце,
Толькі вы яе ў зялёныя бары пусціце.
Добры вечар, добрыя людзі, і мы к вам,
Ці не заехала наша дзевачка ўчора к вам,
Хоць вы яе таўчы, малоць застаўце,
Толькі вы яе часта ў госцікі пускайце.
— Яна ў нас таўчы і малоць будзе,
Яна ў нас частыя госцікі забудзе.

Для вяселля характэрна вялікая колькасць жартоўных песень, якія спяваюцца і на заручынах, і ў маладой, і ў маладога. У час вяселля асабліва дастаецца сватам, дружкам і іншым удзельнікам. Як «пабрыюць», напрыклад, свата, спяваюць пра бруснічка (першага шафера):

У нашага бруснічка залатая ручачка,
Ён з кішэні выймае і нас, жаночак, угашчае.

У гэты час бруснічак крычыць:

— Няма, няма нічога, жанчынкі.

Тады яны здзекуюцца з яго:

Наш бруснічак харош:
Па яблыку вочы,
Буслаў нос.
У яго на спіне горб,
На гарбу вярба,
На вярбе сава.

Да свата звяртаюцца і з такой песняй:

— А наш сватачка харош, **
Па яблыку вочы, з гарбуз нос,
З начоўкі пуза — ледзь у хату ўнёс.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.
** Кожны радок, паўтараецца двойчы.

Праз тыдзень, у нядзелю, большасць удзельнікаў вяселля збіраецца зноў — на пярэзвы, галоўная мэта іх — праведаць маладых. Зноў усе садзяцца за стол, частуюцца, спяваюць, а пасля пачастунку танцуюць, вясяляцца.

## ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

### Хадзілі стральцы-лаўцы па полю...

Хадзілі стральцы-лаўцы па полю,
А забілі старога лося ў лесе.
Як зачула старая ласіца ў бару,
Як кінула крутыя рогі пад ногі:
— Няхай мае крутыя рогі прападуць,
Куды майго старога лося павядуць?

Хадзілі красныя малойцы па двару,
А злавілі красную паненку ў саду.
Як зачула яе мамачка ў каморы,
Як кінула залатыя ключы пад ногі:
— Няхай мае залатыя ключы прападуць,
Куды маё мілае дзіцятка павядуць?

### Ой, скарэй бы вячора даждаці...

Ой, скарэй бы вячора даждаці:
Пойдуць людзі дзяўчыну сватаці.

Пойдуць людзі дзяўчыну сватаці,
А мы пойдзем пад вакно слухаці.

А мы пойдзем пад вакно слухаці,
Ды што будзе дзяўчына казаці.

Дзеўка ходзіць ды ўсё пахаджае,
Белы ручкі на сэрцы складае:

— Маці, маці, парадніца ў хаці,
Парадзь, маці, што свату казаці.

Парадзь, маці, што свату казаці:
Ці йсці замуж, ці з год пагуляці?

### Да ў месяца два ражкі крутыя...

Да ў месяца два ражкі крутыя,
Да ў Янечкі два браты родныя,
Адзін брахна каня сядлаець,
А другі брахна яго наўчаець:
— Да будзь, брахна, разумненькі,
Да паедзеш, брахна, ў чужыя людзі,
Выйдзець к табе танок дзевак:
Не бяры таей, што ў золаце,
Да бяры таю, што ў розуме,
Мы золата ў краме дастанем,
Мы розуму свайго не ўставім.

### Ай, не шум шуміць...

Ай, не шум шуміць,
А зялёная дуброўка,
Ай, баліць, баліць
Да й ў мяне, малайца, галоўка.
Ай, жэніць, жэніць,
Мяне татка маладога.
Ай, бярэць, бярэць
Ды нялюбую мне жонку.
У нялюбай жаны
Печка топіцца не жарка,
Нялюбай жаны
Мне вячэрачка не смачна,
Нялюбай жаны
Мне пасцелечка не мякка,
Нялюбай жаны
Накрываннейка не цёпла,
Нялюбай жаны
Абніманнейка не цесна,
Нялюбай жаны
Цалаваннейка не ўцешна.

### Татачка мой родненькі!..

— Татачка мой родненькі!
Да нашто ты піва варыш,
Гарэлачку гоніш,

Ці ты мяне
Да й аддаць хочаш?
— Да дзіцятка, дзевачка!
Малады розум маеш,
Ці ты таго не знаеш,
Што мой двор пры дарозе,
У мяне госці на парозе,
Просяць мёду
І гарэлачкі,
Гарэлачкі саладзенькае
Да дзевачкі маладзенькае.

**Прыехалі сваты на двор...**

Прыехалі сваты на двор,
Пусцілі стралу ў акно:
— Страла мая, страла,
Па што ты прышла?
Чы па мёд, чы па гарэлку,
Чы па красну дзеўку?
— Ні па мёд, ні па гарэлку,
Але па красну дзеўку.
У чужую сторану аддаваць.
Будзе чужой мамульцы гадзіці,
Ад зары да зары рабіці.
Хмурыцца на дварэ, хмурыцца,
Ганулькі мамулька журыцца:
Гадавала дачушку на долю,
А цяпер аддае ў няволю.

**Ці ты, дзевачка, не чуеш?..**

— Ці ты, дзевачка, не чуеш,
Як цябе купцы таргуюць?
— Яны таргуюць, таргуюць,
Ды ні шэляга не даюць.
Толькі даюць віно ў чару,
За маю русу касу,
За дзявоцкую красу.
Тады красы жалела,
Як у татачкі сядзела,
А цяпер яна не трэба мне —
Ні рута, ні мята,
Ні ружа чырвона.

### Прыляцелі коршуны з сакалом...

Прыляцелі коршуны з сакалом,
Пасадзілі коршунаў за сталом.
Частуюць коршунаў, вяльмуюць,
Шэрую вутачку не ратуюць.
А ты, шэра вутачка, хавайся,
Лютаму сокалу не давайся:
Бо ён цябе, вутачку, прыклюе,
У чужую старонку панясе.

### З суботы на нядзелю нявеста сон відзела...

З суботы на нядзелю нявеста сон відзела,
Нікому не казала, сваёй мамачцы распісала:
— Да мамачка, родная, што я за сон відзела!
Галубы наляцелі, па застоллю паселі,
Па застоллю паселі, чорны шоўк развярцелі,
Чорны шоўк развярцелі, золата рассыпалі.
— А дачушка малада, малады розум мае,
Малады розум мае, сна не разгадае,
Галубы — сваты твае, чорны шоўк — коскі твае,
Чорны шоўк — коскі твае, золата — слёзкі твае!

### Хвалілася каліначка за ракой...

Хвалілася каліначка за ракой:
— Ніхто ж мяне не высячэць за вадой.

Абазваўся буен ветрык на яе:
— Ды я ж не высеку, да зламлю.

Хвалілася Марусечка за скам'ёй:
— Ніхто ж мяне не дастаніць за сталом.

Абазваўся Міколачка на яе:
— Ды я ж цябе, хоць не вазьму, заручу.

Ды я ж цябе, хоць не вазьму, заручу,
Ды я ж цябе ад дзевачак адлучу.

Ды я ж цябе ад дзевачак адлучу,
Ды я ж цябе і к жоначкам прылучу.

**Стукнула, грукнула на дварэ...**

Стукнула, грукнула на дварэ.
— Ой, паглядзі, маманька,
Ці не па мяне?

— Па цябе, дачушачка, па цябе.
— Схавай мяне, маманька,
За сябе!

— Ня буду, дачушачка, хаваці,
Трэба цябе сёлета
Аддаці.

Та-ра-ра калёсачкі, та-ра-ра,
Ой, павезлі Вольгачку
Са двара.

**Разжалілася каліна...**

Разжалілася каліна,
У лесе стоячы,
На ўсе дрэвы глядзючы:
— На ўсіх дрэвах зелен ліст,
На мне, каліне, няма.
— Чакай, каліна, пятровак,
Будуць на табе кветачкі,
Яшчэ й чырвоненькія ягадкі.
Разжалілася Надзечка
У свайго баценькі жывучы,
На ўсіх дзяўчат глядзючы:
— На ўсіх дзяўчатах вяночкі,
На мне, маладой, няма.
— Чакай, Надзечка, нядзелі,
Прыедзе Колечка на кане,
Прывязе вяночка ён табе.

**Да разгарэлася каліна...**

Да разгарэлася каліна,
Да перад сонцам стоячы,
Дробныя іскаркі ронячы,
Тушыў ветраньку, не патушыў,

Па полю іскаркі разнасіў.
Расплакалася дзевачка,
Перад татачкам стоячы.
Сунімаў татачка, не суняў,
Большае жаласці шчэ задаў.
— Да дзіцятка мае любае!
Аддаю цябе ад сябе
У тыя людзі дзіўныя,
Што мяняюць коней без цаны,
Да што б'юць жонак без віны!

### Іду замуж, да не ведаю...

Іду замуж, да не ведаю,
Да што мне да за свет будзе?
Да які мне да мужык будзе?
Да ці ён п'яніца, а ці ён дбайніца?
Калі п'яніца, то не дбайніца,
А калі дбайніца, то не п'яніца.

### Ой, звонка, звонка сасонка...

Ой, звонка, звонка сасонка...
Да званчэйшая каліна:
І ў лузе стаяла — шумела,
А й мостам ішла — грымела,
У полі стаяла — пяяла,
А ў сяло ўвайшла— зайграла,
І к варотам прыйшла — стукнула,
Пад акенцам стала — гукнула:
— А ці дома, дома дзеўчына?
Адчыні маладому вароты.
— Не смею, жанішка, не смею,
Па двару хаджу, мак сею.
Узыдзі, узыдзі, чоран мак,
Узыдзі усходам зялёным,
Зацвіці цветам чырвоным,
Залатой макаўкай узрасці.
А зялёненькі ўсход — братулькі,
Чырвоны цвяток — сястрыцы,
Залатая макаўка — жанішка.

### Дзяўчыначка мая заручоная...

«Дзяўчыначка мая заручоная,
Чаго ж ты такая засмучоная?»
— Ой, як мне жыці, вясёлай быці:
Каго любіла — трэба забыці.
Каго любіла — каб пазабыла,
Каго не знала — каб пакахала,
Каго любіла — не пазабыла,
Каго не знала — да шлюбу стала.
Пайду я ў лясы, лясы зеляныя,
Найду я часы, часы залатыя,
Дзе я хадзіла, дзе гаварыла:
«А судзі, божа, каго любіла».
Каго любіла, то пазабыла,
Каго не знала,— то пакахала.

### Будзе табе, дзевачка, вялікае гора...

Будзе табе, дзевачка, вялікае гора,
Вялікае гора.
Будзе цябе свякроўка раненька будзіці,
Раненька будзіці.
Ты раненька ўстанеш, на соўнейка глянеш,
На соўнейка глянеш.
Возьмеш вядзерца, пойдзеш за вадою,
Пойдзеш за вадою.
А твой жа суджанька пойдзе за табою,
Пойдзе за табою.
Ён вядзерца зніме, цябе абніме,
Цябе абніме.
Як ты будзеш плакаць — ён цябе суніме,
Ён цябе суніме.

### Пойдзеш, дзевачка, ў чужыя людзі...

Пойдзеш, дзевачка, ў чужыя людзі —
Там табе так не будзе:
Ой, там вулачкі немяцёныя —
Ты ж па іх блудзіць будзеш.
Ой, там суседцы незнакомыя —
Аб цябе судзіць будуць.
— Мае цётачкі, мае родныя,

Я ж таго не баюся:
Я і вулачкі павымятаю,
Я ж па іх хадзіць буду.
Я з суседцамі распазнаюся —
Я й з імі жыці буду.

**Мамачка мая, родная мая...**

Мамачка мая, родная мая,
Куды мяне выпраўляеш?
Ў чужыя людзі, не ў знакомыя,
Ды ў вялікае гора.
Мяне, маладу, пашлюць па ваду,
Самі сядуць вячэраць.
Вада далёка, гара высока,
Я й няскора вярнуся.
Прынясу вады — на сябе бяды —
Кожнаму піці даці:
І старэнькаму, і маленькаму,
І свайму міленькаму.
Піцькі падаўшы, пасцель паслаўшы,
Сама села вячэраць.
На стале ложкі, хлеба ні крошкі —
Вот мая й вячэрачка.
Ложачкі ляп-ляп, слёзачкі кап-кап —
Вот я й павячэрала.

**Як табе, маё сонейка...**

— Як табе, маё сонейка,
З месяцам разысціся,
З месяцам разысціся?
— Я пайду па залессейку,
Я пайду па залессейку,
Хмарачкай апушчуся,
Хмарачкай апушчуся,
Дожджыкам абліюся
І з месяцам разыдуся.
— Як табе, мая дзевачка,
З мамачкай разысціся,
З мамачкай разысціся?
— Я пайду па застоллейку,
Я пайду па застоллейку,

10 Зак. 3328

Коскамі апушчуся,
Коскамі апушчуся,
Слёзкамі аблїюся
І з мамачкай разлучуся.

### Станьце, дружачкі, да ўсе ў рад...

Станьце, дружачкі, да ўсе ў рад —
Будуць мяне родныя прадаваць.
Стануць мяне родныя прадаваць —
За русую косаньку грошы браць;
Роднаму бацейку — на вала,
Роднаму брацейку — на каня,
Палавым волікам — плуг цягаць,
Вараным конікам ваяваць.

### Не плач, не плач, мая матулька...

Не плач, не плач, мая матулька, да па мне,*
А я ж буду недалёчка ад цябе.
А ты ж будзеш на сінім моры плацце праці,
А я ж буду ў чыстым полі жыта жаці.
А будзем жа мы адна адной галаскі падаваці
І ранняю й вячэрняй парою,
А сыйдуцца нашы галаскі з табою.

### А ўжо позненька, не раненька...

— А ўжо позненька, не раненька,
Сонейка на заходзе,
Маладая дзеўчына неразумная
У татачкі на выходзе.
Навучай мяне, да мой татачка,
Як свёкарку гадзіць.
— Гадзі, дзіцятачка, гадзі, роднае,
Як роднаму татачку:
Раненька ўстань да добры дзень аддай,
Зірні ў вядзёрцы
Ці ё вадочка
Свёкарку ўмыцца;
Зірні на кручок,

* Кожны радок паўтараецца два разы.

Ці ёсць рушнічок
Свёкарку ўцярэцца.
— Аж, у вядзерцы поўна вадзіцы
І рушнічок на кручочку.

### Шкада табе, мамачка, а мне горш...

Шкада табе, мамачка, а мне горш,
Што аддаеш мяне няўзросшай.
Ці ў цябе хлеба-солі не стае,
Што ты мяне маладу аддаеш?

Ці табе хлеба-солі прыбудзе,
Як мяне ў цябе не будзе?
Што ж я табе, мамачка, вады не насіла,
Што ты мяне аддаеш, каб я галасіла?
Ці ж я табе, мамачка, пасцелі не слала,
Што ты мяне аддала, каб я гаравала?

### Зборная субота...

Зборная субота настала,
Ганначка дзевачак збірала.

Ганначка дзевачак збірала,
Сабраўшы, ў радочак саджала.

Сама села вышэй, вышэй усіх,
Скланіла галоўку ніжэй усіх.

Коскамі зямельку пакрыла,
Слёзачкамі лыжкі абмыла.

Ёсць яе радзімка на свеце,
Ўся яе галоўка у цвеце.

Ўся яе галоўка ў вяночку,
Ўся яе радзімка ў радочку.
*Для сіраты — пасля 4-й страфы:*

Ўся яе галоўка у цвеце,
Нет яе матулькі на свеце.

Ўся яе галоўка ў вяночку,
Нет яе матулькі ў радочку.

Ўся яе галоўка прыбрана,
Нет яе матулькі — схавана.

### Кукавала зязюля ў садочку...

Кукавала зязюля ў садочку,
Прыклаўшы галоўку к лісточку,
А к ёй пташанькі прыляталі,
А ў яе праўданькі пыталі:
— Чаго ты, зязюля, кукуеш?
— Чаму ж мне, пташанькі, не кукаваць?
Я ж была дый звіла гняздзечка,
Я ж была дый знясла яечка,
Адкуль узяўся сізой арол,
Ножкамі раскапаў гняздзечка,
Дзюбачкай раздзюбаў яечка,
К сабе і зязюльку ўзяў.
Плакала Ганулька ў святліцы,
Прыклаўшы галоўку к сястрыцы,
А к ёй дзеванькі прыхадзілі,
Ды і ў яе праўданькі пыталі:
— Чаго ж ты, дзеванька, плакала?
— Чаму ж мне, дзеванькі, не плакаць?
Я ж была дый звіла вяночак,
Я ж была пашла ў таночак,
Адкуль ўз'ехаў Іванька,
Конікам разагнаў таночак,
Ручкамі разабраў вяночак,
Ды мяне, маладу, к сабе ўзяў.

### Калінка мая лугавая...

Калінка мая лугавая,
А ў лузе стаяла — лялела,
А борам ішла — шумела,
Да сяла падышла — зайграла,
А ў сяло ўвайшоўшы — гуляла.
Пад акенца прыйшла — гукнула:
— А ці дома, дома Ганначка?
Адчыні каліне вароты.

— Некалі, калінка, некалі:
А ў садзе вінаград паспеў —
Трэба той вінаград пазбіраць,
Шоўкам у пучочкі павязаць.

### У гародзе мята...

У гародзе мята,
У садочку рута.
Няма каго паслаці
Руты наламаці.

Сястра маладая,
А брат не ўнаровіць,
А брат не ўнаровіць,
Да з голлем наломіць.

А ёсць у мяне дружачкі,
То мае служачкі.

Яны мне ўнаровяць,
Без галля наломяць.

І саўюць вяночак
На адзін дзянёчак.
І буду насіці
І бога прасіці,
Каб гэтага знасіла
І больш не прасіла.

### Ішла Надзечка з вядром па ваду...

Ішла Надзечка з вядром па ваду,
Кінула вядро на буйны вецер,
А сама пайшла ў новы гародчык,
У новы гародчык, у рутку зялёну.
— Ой, рутка мая дробная, зялёная,
Ужо мне больш з цябе вянкоў не віці,
Вянкоў не віці, іх не насіці.
Адну гэту ночку пераначаваці.
Заўтра раненька пакланюсь нізенька
Свайму бацяньку за гадаванне,
Сваёй мацянцы за прыгожае ўбранне,
А браточкам — за пачытанне.

### Каліна-маліна...

Каліна-маліна
Блізка тыну стаяла
Ды на тын галлё клала,
Красою красавала,
Расою ападала.
Маладая Манечка
Расою ўмывалася,

Красою ўціралася,
Да шлюбу прыбіралася.
Да шлюбу прыбіралася,
У мамачкі пыталася:
— Мамачка мая родная,
У што мне прыбрацца:
Ці ў ядваб, ці ў аксаміт,
Ці ў чырвоную ружу,
Каб дзевачкі не пазналі,
Паненкаю называлі.

### Чырвоная ружа...

Чырвоная ружа
Блізка тыну стаяла
Ды на тын галлё клала,
Красою красавала,
Расою ападала.
Маладая дзевачка
Да шлюбу прыбіралася,
Расою умывалася,
Лісточкам выціралася,
Айцу, мамцы кланялася,
Брацейку — забывалася:
— Брацейка мой родны,
Прашу на мяне не гневацца:
Як назад павярнуся —
Тады табе пакланюся.

### Стаяла бяроза сорак лет...

Стаяла бяроза сорак лет,
Сячыце ж бярозу пад загнет,
Кідайце бярозу ў жарку печ,
Штоб наш каравай ясен быў,
Штоб наш малады красен быў.
Ясен каравай пышкамі,
Красен малады свашкамі.

### На чыей гэта ніве...

На чыей гэта ніве
Жыта ў трубы павілося,

Жыта ў трубы павілося,
На каравай удалося?
На Пётрухнавай ніве
Жыта ў трубы павілося,
Жыта ў трубы павілося,
На каравай удалося.
А ў чыей гэта хаце
Каравай ў дзяжы йграе,
Каравай ў дзяжы йграе,
Века ўверх падымае?
У Пётрухнавай хаце
Каравай ў дзяжы йграе,
Каравай ў дзяжы йграе,
Века ўверх падымае.

**Караваю, мой раю...**

Караваю, мой раю,
Караваю, мой раю,
Я каля цябе йграю,
Я каля цябе йграю.
Я каля цябе йграю,
Я цябе прыбіраю;
Навакол сыр і масла,
Навакол сыр і масла,
Пасярод — доля, шчасце.

**Каравайнічкі, пачынайнічкі...**

Каравайнічкі, пачынайнічкі,
Ды не стойце ў запечку.
Да выйдзіце на хатачку,
Да пачніце вяселлейка,
Вяселлейка вясёлае:
Дзевачкі — у песенькі,
Музычкі — у скрыпачкі,
А мамачка — у мыселькі.

**Сыпце пшаніцу...**

Сыпце пшаніцу
Ў новыя карыты
Ды карміце коней
У вялікую дарогу.
У той дарозе
Трое варот.
У першыя вароты —
Месячык свеціць,

У другія вароты —
Сонейка грэе,
У трэція вароты —
Жанішок едзе.
Месячык свеціць —
Відненька будзе,
Сонейка грэе —
Цёпленька будзе,
Жанішок едзе —
Вяселлейка будзе.

### Каб я знала, каб я ведала...

Каб я знала, каб я ведала,
Што ў свайго таткі не буду,
То б я агарод разгарадзіла,
Табун коней упусціла,
Шкоды б бацьку нарабіла.
— Коні мае вараненькія,
Тапчэце зялёненьку руту,
Чырвонае да насеннейка,
Прыедзе к нам да вяселлейка!

### Лятуць, лятуць белы лебедзі цераз сад...

Лятуць, лятуць белы лебедзі цераз сад,
Вядуць, вядуць млоду Сонячку на пасад.
Вядуць, вядуць млоду Сонячку на пасад.
Яна ж, молада, пасадзіка не знала,
Яна ж, молада, пасадзіка не знала,
У татачкі у роднага пытала,
У татачкі у роднага пытала:
— Адкуль, адкуль, мой татачка, пасадзік,
— Адкуль, адкуль, мой татачка, пасадзік?
Ці ад цябе, мой татачка, ці ад бога,
Ці ад цябе, мой татачка, ці ад бога?
— Не ад мяне, маё дзіцятка, ад бога,
Не ад мяне, маё дзіцятка, ад бога,
Прасі бога, каб не знала другога,
Прасі бога, каб не знала другога.

### Ой, ляцелі гусанькі цераз сад...

Ой, ляцелі гусанькі цераз сад:
— Час табе, Ганусенька, на пасад.

— Ой, ды што вам, гусанькі, да таго —
Ёсць у мяне татачка ля таго.

Ляцела зязюленька цераз сад,
Клікала Ганусеньку на пасад:

— Што табе, зязюленька, да таго —
Ёсць у мяне мамачка ля таго.

Скажаць жа мне сесці — то я сяду.
Скажаць жа мне ўстаці — то я ўстану.

Скажаць мне скланіціся — скланюся,
Я сваёй матуленькі баюся.

## Сонейка каля акон ідзе...

Сонейка каля акон ідзе,
Брат сястру на пасад вядзе.
Сястра яму да ног падзе:
— Брацейка мой родненькі,
Чым я табе надаела?
Ці ціхай паходкаю,
Ці сваёю работкаю,
Ці русаю касою,
Ці сваёю красатою?
— Сястрыца мая родная,
Не ты мне надаела,
Надаелі сваты твае,
Што суботкі прыязджаюць,
Што нядзелькі ад'язджаюць,
Што суботкі мой двор збіты,
Што нядзелькі мой стол зліты.

## Няпраўдзівая калінка...

Непраўдзівая калінка —
Няпраўду лугу казала.
Казала: цвіцець не буду.
Казала: ягад не будзе.
Як прыйшла вясна цяпленька,
Аж на ёй цвету бяленька.
Як прыйшла восень сцюдзёна,
На каліне ягад чырвона.

Непраўдзівая Лідачка —
Няпраўду дзевачкам казала.
Казала: замуж не пайду,
Казала: хлопцаў не люблю.
Яна ж Сярожку любіла,
Ў адзін слядочак ступіла.
Яго слядочак цяпленькі,
Яе Сярожка міленькі.

### Сцякліся дзве рэчанькі...

Сцякліся дзве рэчанькі,
Сцякліся,
Сышліся два пасажанькі,
Сышліся.
Першы пасаг — ясны месяц,
Другі пасаг — ясна сонца.
Што з месяца — малады Колечка,
Што з сонейка — малада Надзечка.

### Да дуба, зязюлька, да дуба...

Да дуба, зязюлька, да дуба,
Пара табе, дзевачка, да шлюба.
Ужо твае конікі спражоны,
Пад акенцо прывядзёны.
— Няхай мае конікі пастаяць,
А мне ў свайго бацюхна пагуляць.

### За гарой, за гарой...

За гарой, за гарой
Цэркаўка стаяла;
Там дзяўчына
З нялюбым шлюб брала,
Шлюб брала,
У шлюба пытала:
— Шлюбе, мой шлюбе!
Скажы адну праўду:
Ці горы капаці,
Ці з нялюбым шлюб браці?
— Дзяўчына, дзяўчына!
Дурны розум маеш,
Што ў шлюба пытаеш.
Горы пакапаўшы,
Ляжаш — спачынеш;
З нялюбым шлюб узяўшы,
То навек загінеш.

### Сядай, Надзечка, у канец стала...

Сядай, Надзечка, у канец стала
З долею гаварыці.

— Доленька мая,
Як ты шчаслівая,
То ідзі да шлюбу са мною,
А як нядобрая,
Нешчаслівая,
То плыві на мора з вадою,
Доленькая мая,
З быстрымі ручайкамі,
А я пайду да шлюбу
Са сваімі дружанькамі.

**Ой, у полі крыніцы стаялі...**

Ой, у полі крыніцы стаялі,
Там валы ваду п'юць.
Маладу дзяўчыначку
Пад вянец вядуць.
Яна стала, заплакала:
— Няпраўда ваша!

Ой, у полі крыніцы стаялі,
Там валы ваду п'юць.
Маладу дзяўчыначку
Кругом прастола вядуць.
Яна стала, заплакала:
— Няпраўда ваша!

Ой, у полі крыніцы стаялі,
Там валы ваду п'юць.
Маладой дзяўчыначцы
Ручнічком рукі звязалі.
Яна стала, заплакала:
— Праўда ваша!

**Мецена вуланька...**

Мецена вуланька ды з канца,
Прывезена Насценька з-пад вянца.
Прывезена Насценька з-пад вянца,
Сыпнула золата з рукаўца.
— Выйдзі, выйдзі, баценька, із хаты
Ды й памажы золата збіраці.
— Не збірай, дзіцятка, не збярэш,

Толькі свае слёзанькі разальеш.
— Выйдзі, выйдзі, матанька, із хаты
Ды й памажы золата збіраці.
— Не збірай, дзіцятка, не збярэш,
Толькі свае слёзанькі разальеш.

### Паселі дзевачкі...

Паселі дзевачкі
Да ў тры радочкі,
Паміж іх не пазнаць
Маладой Ганночкі.
А па тым пазнаці,
Што на плечах коскі,
Што на плечах коскі,
Пад ачыма слёзкі.
А русыя коскі
Да пакрылі плечкі,
А горкія слёзкі
Да памылі ножкі.

### Каціласся калясо з клеці...

Каціласся калясо з клеці,
Спіць мая да нявехна ў клеці.
Няхай спіць хоць да вечара,
Няма хлеба дай на печыва,
Ложачкі пад камешнічкам,
Пазарасталі арэшнічкам,
А місачкі пад лаўкаю,
Пазарасталі мураўкаю.

### А у нашага суседа...

А у нашага суседа
Пачынаіцца бяседа.
Малойчыкі п'юць, гуляюць,
Дзяўчыначку падмаўляюць.
Пілі-пілі, гаварылі,
Дзяўчыначку падманілі.
Дзяўчыначку падманілі,
На павозачку ўссадзілі.
Едуць поле і другое,
На трэцяе ўз'язджаюць.
— Станем, братцы, паслухаем,
Што ў полі галасуе:
Ці саловачка спявае,
Ці зязюлечка кукуе.
Ні саловачка спявае,
Ні зязюлечка кукуе —

Плача маці па дзіцяці,
Што некаму шкадаваці.
Што некаму шкадаваці,
Роднай мамачкай назваці.
Роднай мамачкай назваці,
Сівую касу часаці.

## Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас...

Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас,
Каб не стала наша дачушка ў абідзе,
Каб не была ёй паветачка за хатку,
Каб не была ёй суседачка за матку,
Каб яна бяды-гора не знала,
Каб яна доўгіх летаў даждала,
Каб яна дзецям торбы не шыла,
Каб свякроў бы яе не сушыла.
Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас
Ды адведаць хлеба-солі ў нас.

## Ой, у полі, у полі...

Ой, у полі, у полі
Да дзве бярозкі зрасліся,
Да дзве бярозкі зрасліся.
У нашай Зіначкі,
У нашай маладой
Да дзве сястрыцы знайшліся,
Да дзве сястрыцы знайшліся.
Пілі-гулялі — не дбалі,
Пілі-гулялі — не дбалі,
Зіначку замуж аддалі.
Ой, у полі, у полі
Да два дубочкі зрасліся,
Да два дубочкі зрасліся.
У нашай Зіначкі
У нашай маладой
Да два браточкі знайшліся,
Да два браточкі знайшліся.
Пілі-гулялі — не дбалі,
Пілі-гулялі — не дбалі,
Зіначку замуж аддалі,
Зіначку замуж аддалі.

**Прыйшоў на вяселле наш сваток...**

Прыйшоў на вяселле наш сваток,
Павязаўшы крыжам ручнічок.

А казалі, сват наш вельмі харош,
Аж у свата доўгі буслаў нос.

А у свата лыса галава
Ды казлінна рыжа барада.



Вясковыя музыкі. Фота І. К. Цішчанкі

Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачыма, як баран,

Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю — трасцу ты з'ясі.

**Ды казалі, наш малады...**

Ды казалі, наш малады
Вельмі харош,
Ажно ў яго доўгі нос,
Па яблычку вочкі,

Буслаў нос.
Ды насыпце яму канапель,
Няхай клюе, як верабей,
Няхай скача, як белка,
Няхай плача, як дзеўка.

**Наша маладая — суравежка, суравежка...**

Наша маладая — суравежка, суравежка,
А ваш малады — галавешка.
Наша маладая — сыр белы, сыр белы,
А ваш малады — пень гарэлы.
Наша маладая — ластаўка, ластаўка,
А ваш малады — засланка.
Наша маладая — суніца, суніца,
А ваш малады — дурніца.

**А куды ж ты, наша Манячка, глядзела?..**

А куды ж ты, наша Манячка, глядзела —
За гэткага непрыгляднага захацела,
За гэткага непрыгляднага захацела?
Не гэткія з табой панічы гулялі,
Не гэткія з табой панічы гулялі,
За гэткага непрыгляднага аддалі,
За гэткага непрыгляднага аддалі.
Зубы рэдкія, ногі крывыя, доўгі нос,
Зубы рэдкія, ногі крывыя, доўгі нос,
Куды ж цябе, наша Манячка, бог занёс,
Куды ж цябе, наша Манячка, бог занёс?

**Кукавала зязюлька, што лес мал...**

Кукавала зязюлька, што лес мал,
Ой, плакала Марылька, што муж мал:
— Ні яго ў полачцы спавіці,
Ні яго ў люлечку ўлажыці.
Спавіўшы ў полачкі — смяецца,
Палажыўшы ў люлечку — сарвецца,
Ой, наняўшы нянечку — біць будзе.
Ой, пайду я малада па ваду,
Яго я за ручаньку павяду.
Ой, іду я малада з вадою,
А ён памаленечку за мною.

### Хвалілася цешча зяцем...

Хвалілася цешча зяцем,
Што зяць маладзенькі.
Аж ён маладзенькі.
Аж ён маладзенькі —
Як дзядок старэнькі.
Барада лыкам сшыта,
Барада лыкам сшыта,
Галава абручом збіта.

### Ты мой садыньку, вінаградáньку...

Ты мой садыньку, вінаграданьку,
Няма табе даглядыньку,
Стаяць яблынькі расхіліўшыся,
Некаму падпірацi,
Ляжаць яблачкі раскаціўшыся,
Некаму сабіраці.
Стаяць столікі ўсе цясовыя,
Некаму засцілаці,
Стаяць шкляначкі ўсе няпоўныя,
Некаму наліваці,
Сядзяць госцікі ўсе любовыя,
Некаму частаваці,
Сядзіць Ганначка да расплакаўшыся,
Некаму сунімаці.

### А хто, а хто магілачку патаптаў?..

А хто, а хто магілачку патаптаў?
Малада дзевачка па магілачцы хадзіла,
Сваю мамачку на вяселейка прасіла:
— Устань, устань, мая мамачка,
Досыць спаць,
Чаму цябе ўсю ночачку
Не відаць?
Сядзяць госцейкі па застолейку
Да й як цвет,
А я як гляну — маёй мамачкі
Між іх нет!
— Досыць, дзіцятка, па магілачцы хадзіць,
Досыць, дзіцятка, магілачку таптаць,

Досыць, дзіцятка, дробныя слёзкі раняць.
Пайду я да пана бога прасіцца,
Каб пусцілі на парадачак паглядзець,
Як ты будзеш на пасадзе сядзець,
Тады я буду ў канцы стала стаяць;
А як ты будзеш на вазочак сядаці,
Тады я буду ў новым ганачку стаяць,
Тады я буду на парадачак глядзеці,
Ці абярэцца той дзядзька за татку,
Ці перахрысціць дарожачку да вянца.

## Знаць па вутаньцы...

Знаць па вутаньцы,
Знаць па шэранькай,
Што яна падстрэлена:
Як полем ляціць,
Як полем ляціць,
Так яна нізюсенька,
У кусточку сядзіць,
У кусточку сядзіць,
Так яна ціхусенька.
Знаць па дзеваньцы,
Знаць па душаньцы,
Што яна сірацінка:
Па хаце ходзіць,
Так яна ціхусенька,
За сталом сядзіць,
Так яна смутнюсенька.

## Ясная заранячка...

Ясная заранячка,
Ясная заранячка
Па залессейку ходзіць.
Па залессейку ходзіць,
Па залессейку ходзіць,
Хмуркай апусціўшыся,
Хмуркай апусціўшыся,
Хмуркай апусціўшыся,
Дожджыкам абліўшыся.
Маладая дзеванька,
Маладая дзеванька,
Па застоллейку ходзіць.
Па застоллейку ходзіць,
Па застоллейку ходзіць,
Коскамі апусціўшыся.
Коскамі апусціўшыся,
Коскамі апусціўшыся,
Слёзкамі абліўшыся.

## Зялён рамон па падвор'ю сцеліцца...

Зялён рамон па падвор'ю сцеліцца,
Маладая дачушачка з матуляю дзеліцца:
«Табе, матуля, адна кашуля, а мне дзве,
Бо я паеду ў чужыя людзі, а ты не».
Зялён рамон па падвор'ю сцеліцца,
Маладая сястрычка з сястрыцай дзеліцца:
«Табе, сястрыца, адна спадніца, а мне дзве,

Бо я паеду ў чужыя людзі, а ты не».
Зялён рамон па падвор'ю сцеліцца,
Маладая сястрыца з браточкам дзеліцца:
«Табе, братка, і сені, і хатка, і камора,
А мне, маладой, куфар адзежы і карова».

### Мая мамачка, заставайся здарова...

Мая мамачка, заставайся здарова,
Жыві багата,
Не забывайся на мяне, маладую;
Калі буду жабраваці,
Варотцы адчыняйце,
Хоць па кусочку хлеба давайце.

### Страпянулася ластаўка...

Страпянулася ластаўка,
З-пад варот вылятаючы.
— Чуе маё пер'ейка, чуе,
Што мне цяпер не так будзе,
Як у вішнёвым садочку,
На малінавым кусточку.
Заплакала Алінка,
З падвор'я з'язджаючы:
— Чуе маё сэрцайка, чуе,
Што мне цяпер не так будзе,
Як у роднай мамачкі.
Я ж у роднай мамачкі
Бель бяліла бяленька,
Хадзіла харашэнька.
Засталася ў свякроўкі,
Бель бяліці не ўмею,
Харашо хадзіці не смею.

### Лісцем дарога прысцілаецца...

Лісцем дарога прысцілаецца,
Свёкар нявестку дачакаецца.
Прыедзе нявестка
Прыгожа, урадліва,
На долю шчаслівая.
Ой, доню, доню,
Распусці долю
Ды па маім полю.
Каб на маёй ніве
Жыта радзіла,
Каб у маёй аборы
Кароўкі рыкалі,

Каб у маёй стаенцы
Конікі іржалі,
Каб мая нявестка
Сына радзіла,

Каб яна радзіла
Дзевяць сыночкаў,
А дзесяту дочку.

**Адчыняй, матка, аконца...**

Адчыняй, матка, аконца,
Вязуць табе нявестку, як сонца!
Адчыняй, маці, другое,
Вязуць табе дзетак абое.

**Адчыні, матулька, варота...**

— Адчыні, матулька, варота,
Вязём табе нявестку, як злота!

Адчыні, матулька, карытца,
Вязём табе нявестку сварыцца.

— А я вароцечкі адчыню,
Я нявестачцы дагаджу.

Праз ваконца буду глядзеці,
Як мая нявестачка прадзеці.

Нашто нам з нявесткай сварыцца —
Будзе мне нявестачка карыцца.

Яна ж будзе ў каморы спаці,
А я буду дзіця калыхаці.

**Вынось, маці, дзежку...**

Вынось, маці, дзежку,
Прывёз сын нявестку.
Чырвоная, як каліна,
Высокая, як вярбіна.
Не будзеш гадаваці,
Адно будзеш пасылаці.
Куды бліжэй — яе пашлеш,
Куды далей — сама пойдзеш.
Яе пашлеш за мукою,
Сама пойдзеш за вадою.

### Ой, знаці, знаці...

Ой, знаці, знаці —
Гаспадынька ў хаце:
Як у хатку увайшла,
То работку знайшла.
Пасеяла жыта на ўсіх куточках:
— Каб маё жыта ў трубу вілося,
Каб маё жыццё тут разжылося.

### Не плач, малодачка...

Не плач, малодачка,
У нас табе добра будзе:
У нас кошкі мыюць ложкі,
Галкі мыюць лаўкі.
Вецер хату мяце,
Месяц дзяжу месіць,
Сонейка пірагі пячэ,
А дождждык па ваду ідзе.

### А каліна-маліна...

А каліна-маліна,
Да не стой над вадою,
Да не стой над вадою,
Не махай галіною.
Не махай галіною,
Не раўнуйся са мною,
Да было раўнавацца,
Як я ў мамкі была.
Як я ў мамкі была,
Як я бела хадзіла.
Як я бела хадзіла,
Як я чырвана была:
Да бялей твайго цвету,
Чырваней тваіх ягад.
А цяпер засмучона,
Ад мамкі адлучона.
Ад мамкі адлучона,
К міламу прылучона.
К міламу прылучона,
У чужую сям'ю прывязёна.

### Хваліўся Іванька сваёй жаною...

Хваліўся Іванька сваёй жаною,
Што мая жоначка — рукадзельніца,
Што мая жоначка — рукадзельніца,
Выткала красёнцы трыма страямі,
Выткала красёнцы трыма страямі:
А першы страёчак — ясны месячык,
А першы страёчак — ясны месячык,

А другі страёчак — ясна зорачка,
А другі страёчак — ясна зорачка,
А трэці страёчак — дробны звёздачкі,
А трэці страёчак — дробны звёздачкі.
А ясен месячык — я сам малады,
А ясен месячык — я сам малады,
Ясная зорачка — мая жоначка,
Ясная зорачка — мая жоначка,
Дробныя звёздачкі — мае дзетачкі,
Дробныя звёздачкі — мае дзетачкі.

### Як заручалі, тады казалі...

Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата каней многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак:
Аж там адзін жарабочак.
Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата кароў многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін бычаночак.
Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата авец многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
А там адзін бараночак.
Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата свінней многа,
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін кабаночак.
Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата курэй многа.
Прыйшлі ў хлявочак,
Глянулі ў куточак,
Аж там адзін пятушочак.

### У новай каморы наша Анютка заснула...

У новай каморы наша Анютка заснула,
Прыйшлі дзевачкі вяночак віць — не чула,
Прыйшлі дзевачкі вяночак віць — не чула.

А як пойдуць яе дзевачкі будзіці,
А як пойдуць яе дзевачкі будзіці,
Стане дзевачак яе мамачка прасіці,
Стане дзевачак яе мамачка прасіці:
— Не будзіце, мае дзевачкі, хай паспіць,
Не будзіце, мае дзевачкі, хай паспіць,
Няхай у мяне мая госціца пагасціць.
Няхай у мяне мая госціца пагасціць.
Нямножка будзіць яна ў мяне гасціці,
Нямножка будзіць яна ў мяне гасціці,
Яна пойдзіць сваей свякроўцы гадзіці,
Яна пойдзіць сваей свякроўцы гадзіці.

### Ой, гула пчолка, гула...

Ой, гула пчолка, гула,
Па барку лятаючы,
Да пчолак шукаючы:
— Ой, божа ж мой, божа, спазнілася,
Ад пчолачак адбілася,
К восам прылучылася.
Заплакала малада дзевачка,
З ручнічка саступаючы:
— Ой, божа ж мой, божа, спазнілася,
Ад дзевачак адбілася,
К бабам прылучылася.
Будзе мяне маці чакаці,
Па дарожках шукаці:
— Чаму ж мая дачушка не прыйшла,
Мусіць, другу хатачку найшла?

### Ці мая камора ў цяні стаяла...

Ці мая камора ў цяні стаяла,
У цяні стаяла,
Дзе я, маладзенька, позненька спала,
Позненька спала.
Ужо мая свякроўка з поля прыгнала,
З поля прыгнала.
А з поля прыгнаўшы, разуваецца,
Разуваецца,
Ка мне, маладзенькай, не адзываецца,
Не адзываецца.

— А божа мой мілы, што ж мне рабіці,
Што ж мне рабіці?
Ці мне, маладзенькай, кароўкі даіці,
Кароўкі даіці?
— Даі сабе тую, што з дому прыгнала,
Што з дому прыгнала.
— Ці я ў цябе, свякроўка, пад акном стаяла,
Пад акном стаяла,
Каб ты мяне, свякроўка, ды за сына брала,
Ды за сына брала.

### Ластаўка-перапёлачка...

— Ластаўка-перапёлачка,
А дзе лета летавала?
— Летавала ў пшаніцы.
— А дзе, ластаўка-перапёлка,
Будзеш зіму зімаваці?
— У крыніцы, у халоднай вадзіцы.
— Маладая дзевачка,
Дзе расла-гадавалася?
— Гадавалася ў роднага таткі,
А буду векаваці ў свякроўкі.
Была ў мамкі вумная-разумная,
А як засталася ў свякроўкі,
Дык ні вуму, ні розуму.

### Сваціца, галубіца, просім вас...

Сваціца, галубіца, просім вас,
Пераляцела наша ластаўка да вас.
А вы ж ёй хоць піці, есці давайце,
Часцей яе к мамцы ў госцікі пушчайце.
Вы яе хоць трэсачкі насіць застаўляйце,
А ўсё ж гаспадынькай называйце.

### Аддалі мяне, забылі мяне...

Аддалі мяне, забылі мяне,
Як жа вам не жаль будзе?

Як жа я буду ў чужой старонцы
Цяжанька тужыці?

Як жа я буду ў чужой старонцы
Свякроўцы наравіці?

Будуць жа мяне раненька будзіць,
Позненька спаць класці.

А там вулачкі невядомыя,
Блудзіць жа я буду.

А там суседкі незнаёмыя,
Судзіць мяне будуць.

Аддалі мяне, забылі мяне,
Як жа вам не жаль будзе?

Прыедзь, мамачка, прыедзь, родная,
Мяне адведаці.

## ХАЎТУРНЫЯ ГАЛАШЭННІ

### Мой міленькі дружок...

Мой міленькі дружок,
З кім ты мяне пакідаеш,
Толькі з дробнымі дзеткамі.
Ай, мой жа параднічак,
А мой жа работнічак!
З кім жа астаюся?
Толькі з дробнымі дзеткамі.
З кім жа іх гадаваць буду,
Чым я іх адзяваць буду?
Я ж іх не адзену,
Я ж іх не прыгадую,
Я ж як прычыхаюся — я і ўлякаюся.
Куды мой друг вянчальны падзеўся,
Ці ён паехаў у дарожаньку?
А ці ён пашоў у цэркаўку?
У мяне дзеткі пытаюцца:
«Куды наш татка дзеўся?»
Дзеткі мае мілыя,
Страшнае гэта слаўцо,
Што я завуся «ўдованька»,
А вы, дзетанькі,— «сіротанькі».
Сяду з вамі абедаці,

Вамі, дзеткі, абсажуся
І слёзкамі абальюся.
Што вы, дзеткі, маленькі,
А слёзанькі вашы драбненькі,
А як дзеткі пабольшаюць —
І слёзанькі пагоршаюць,
Што ёсць каму загадаць вам,
Да некаму пажалець вас
Без свайго роднага татанькі.
І вы не будзеце ведаць,
Што і быў у вас родны татанька.
Цяпер вы, дзеткі, сіротанькі,
А я астаюся ўдованькай.
Што ж вы, дзеткі, не пытаецесь:
Хто вас будзець гадаваці
І ў салдаты выпраўляці
Без свайго роднага татанькі?
Людскія такі будуць выпраўляць дзетак,
А адна ўдованька, бедная мая галованька,
Нельзя мне і слоўцам нідзе абазвацца
Без свайго дружочка, без вашага татанькі.
Прыдзець цёплае лецечка,
Людзі паедуць з сошкамі,
А я з кім і з чым?
У мяне зямелькі было нямножка:
Палосанька была і вузенька і кароценька,
А цяпер стала і доўга і шырока,
І будзець стаяць някошана,
Будзець ляжаць няорана,
А я буду хадзіць і ручанькі ламаць.
Як прыду я ў хатаньку —
Мая хатачка не міла:
Нет майго парадпічка, а дзеткам татанькі.
Усё мне не міла і хатанька пастыла.
Як стануць дзеткі і спытаюцца татанькі —
Адраклась бы лепі гэтай хатанькі.
Як жа вас гадаваць без татанькі:
Няма чаго вам зварыці,
Няма чым пасаліці.
Трудна рыбкі без вадзіцы,
Трудна дзеткам без татанькі.
Дась бог цёплае лецечка,
Вазьму дзетак за ручаньку
І павяду на магілачку,

Гукайце, дзеткі, свайго татаньку:
— Устань, устань, наш татанька!
Верна, ў гробе дошкі
Прыціснулі твае ножкі,
Што няльзя табе ўстаці.
Гора наша і сэрцу тошна,
Таткі вярнуці з магілы няможна.
Галовачкі нашы бедныя,
Асталісь мы сіраты вечныя.

**А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі!..**

А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі!
А на што ты нас пакінуў,
А цябе, як ты сам казаў, татка да мамка
Маленькага кінулі.
Да табе было вельмі трудненька на свеце,
Да не было каму цябе глядзеці,
Да цябе надта ўсе крыўдзілі.
Да трэба было для пана паншчыну адбыці,
Да ў доме ўсенка зрабіці,
Да галоднымі рокамі хлеба прыкупіці,
Але трудна было скуль ўзяці,
Да трэба было на шыю сваю набраці,
Да прыдумаць, да прыгадаці,
Як потым грошы і квоту заплаціці.
Да зноў, ты казаў, як вырас да ажаніўся,
Да зноў жыць пусціўся,
Матка ідзе з сярпом, а ты да дня з касою.
Да ты казаў, што вельмі быў ледашты
Акоман, да за якое глупства
Зараз зачне галавіці да ў морду біці.
Да ты не піўшы, не еўшы цэлы дзень,
Да прыдзеш дадому галодны, як сабака,
Да уж было табе не да яды,
Але хоць хутчэй дзе-кольвек галаву прывярнуці,
А назаўтра трэба было ўстаці,
Да работу ў рукі ўзяці,
Да за сваёю гаспадаркаю трэба было глядзеці.
Да як табе бог даў дзеці,
То і не было каму глядзеці.
Да мы, як шчаняты, валяліся пад плотам.

Да балазе й што дзянёк пражывеш,
Да ты з мацер'ю з двара прыдзеш
Ад акомана з крыўдзіны:
Да каб яму рукі пазалацелі
Да па локаць адляцелі.
А мы былі яшчэ маленькія,
Да бульбы вам накапаем і зварым...

### Ах, мая ж ты матушка...

Ах, мая ж ты матушка,
А мая ж ты зязюлечка!
Чаму ж ты, чаму памёрла,
Сваю дачку асіраціла?
Ах, каб ты ведала, знала,
Якая мяне доля спаткала!
Ух, ўстала ж бы ты, ўстала,
Раданьку бы ты мне, беднай, дала,
Ах, некаму ж мяне пажалеці —
Я й ў хаце, я й ў клеці
Слёзкамі, слязамі плачу,
А шчасця-долі дай не бачу.
Ах, свякроўка ж мяне заганяець,
Ніколі мне не спагадаець,
Ласкавага слоўца не прамовіць,
Усюды толькі гоніць да гоніць,
Плакаць па табе не пазваляець;
Ах, хоць добра зрабіла — усё хаіць.
Чаму ж ты са мной да не пагукаеш?
Сваёй дачкі да не распытаеш?
Як жывець да гаруець,
Як жа начуець, як днюець?
Ах, цяжанька ж мне, цяжанька,
Ах, трудненька мне, трудненька
У чужой хаце жыці,
У чужой матулькі быці!

### Яблычка маё недаспелае...

Яблычка маё недаспелае,
Ягадка мая недазрэлая!

Дзетанька маё міленькае,
Дзетанька маё любенькае!

Лісточак мой зялёненькі,
Цвяточак мой чырвоненькі!
Без пары ты адпадаеш,
А мне пячаль пакідаеш.
Пташачка мая любенькая!
Салавеінька шэранькі, шчабяценнік мой!
Ты ж гаворыш, як салавейка шчабеча.
Ты ж хацеў быць татку пераменачка,
А цяпер процi лецечка цёплага
Здзелаў нам пераломаньку вялікую.
Ўсе пташачкі заспяваюць,
Ўсе казявачкі пааджываюць,
Ўсе мурашачкі павыпаўзаюць,
Ўсе рабяткі на вулку павыбягаюць,
А цябе нігдзе не будзе:
У пясочак закапаюць.
Дужа мне будзець тошненька,
Дужа мне будзець маркотненька.
Што цябе, салавеінька, не чуць будзе шчабечучы.
Адкуль я буду цябе спадзявацца,
Адкуль буду дажыдацца?
Хто маю хатаньку даглядзіць,
Хто скацінку прагоніць,
Хто татку па коніка збегае?
Пацера наша вялікая,
Пацера наша дарагая,
Пацыралі мы сыночка,
Пацыралі дарагога.
Вот паследні разочак
Цалую цябе, сыночак.

**Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае...**

Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае,
Куды ж ты ад мяне адлятаеш?
І з кім ты мяне пакідаеш?
Ці ты адлятаеш у лес за пташку,
Дзе я цябе глядзець буду?
Ці з пташкамі лятаючы,
Ці з дзеткамі гуляючы?
Цвяточак мойродненькі!
Што ж ты ад мяне адсыпаешся:
Ці цябе ветрыкі адбілі?

Ці цябе дожджыкі адмылі?
А загадала ты мне загадачку:
І збудавала сабе хатачку —
Хатачку новую, за адзін дзянёчак гатовую.
Хатачка твая цёмная,
І хадзіць мне к табе нельзя будзець.
Як прыдзець цёпла лецечка,
А пайду я ў зялёны лес,
Там кукулькі кукаваць будуць,
І салавейкі шчабятаць будуць,
І я буду слухаць:
Ці не маё чадзенька з пташачкамі песенькі пяе?
Куды ж ты гэта прыбраўся,
У якую дарожаньку і ў якую староначку
Працiў лецечка цёплага,
Працiў ўрэмечка вясёлага?
Усе мурашачкі паажываюць,
Усе казявачкі павыпаўзаюць,
А мне будзець тошненька,
Як рыбачцы без вадзіцы,
А травіцы без расіцы,
Што людскія дзеткі цвяточкі ірваць будуць,
А не будзець майго дзетанькі,
Будзець ірвацца маё серданька.
Я ж цябе гадавала і думала,
Што ты мой пракапаннічак будзеш.
Хто ж маю старасць даглядзіць,
Хто ж мне пасцельку пасцеле,
Як прыдзець цёмная ночанька?
І хто ж мне пітанькі падасць?
А без свайго дзіцятачкі дзянёчкі мае будуць
маркотныя,
Бяседанька мая маркотная,
Бяседанька мая пячальная!
Музыкі у мяне не іграюць,
І радзінка мая песенькі не пяе,
Толькі адна я, гаратніца,
Хажу да слёзкі лью.
Страшны мой дзянёчак —
Пахаронен мой мілы сыночак.
Дзетка маё мілае!
Як я з табой разлучуся?
Людскія дзеткі будуць на рабоце,
А мая галоўка будзе ў забоце,

Што з табой разлучылася.
Каб ты ад мяне было сагнатае —
Я ж бы хадзіла пыталася,
І я ж бы цябе нахадзіла;
Каб ты было забранае —
Я ж бы цябе адсудзіла.
А як ўзяла цябе зямлічка,
Дык я цябе не найду,
Дык я цябе не адсужу.

### Дзедка мой, галубочак мой!

Дзедка мой, галубочак мой!
А хто ж мне цяпер лапційкі спляце?
А хто мне цяпер аборачкі саўе?
А хто ж мне цяпер гарошак перавее?
Цяпелца дагледзе ў гумне?
Хто мне цяпер мяцёлачку звяжа?
А цяпер нам з табой, дзедка, болі не ўбачыцца.
Ўсё ты мне, дзедка, адказаў:
Нахаджуся босая і голая,
Некаму мне без цябе, дзедка, ні сплесці, ні звіць.

### Бабка мая, зязюлька мая!

Бабка мая, зязюлька мая!
Хоць бы ты ў запечку пасядзела,
Дзіцятка майго паглядзела.
Хоць бы ты яго паняньчыла,
Хоць бы ты яго пакалыхала.
А цяпер некаму яго паглядзеці,
Некаму яго пакалыхаць.
А як ты была, мая бабачка:
Куды я ні пайду, мой дварок быў заведамам,
Мае дзеткі былі прыгледжаны.
А цяпер няма маёй бабачкі:
Некаму мне скацінку загнаць,
Некаму мне дзіцятка пакалыхаць.

# ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Прыказкі і прымаўкі — адзін з самых пашыраных у беларускім фальклоры жанраў. У іх трапна і ярка адлюстравана мудрасць народа, яго багаты жыццёвы і працоўны вопыт, псіхалогія і светапогляд.

Прыказкай называецца створанае народам лаканічнае, часцей за ўсё вобразнае, выказванне з павучальным зместам, якое мае прамы і пераносны сэнс. У прыказцы выказваецца закончаная думка, якая можа характарызаваць разнастайныя аналагічныя з'явы.

Прымаўка характарызуецца незавершанасцю думкі, не мае такога абагульняючага значэння, як прыказка, і ўжываецца толькі ў канкрэтных выпадках, каб адцяніць, напрыклад, пэўную рысу чалавека, яго ўчынак, раскрыць сутнасць грамадскай або прыроднай з'явы і інш.

Змест афарыстычнай творчасці беларускага народа вельмі багаты. У ёй, як у фокусе, сканцэнтравана адлюстроўваецца жыццё, быт, культура, думкі і пачуцці народа. «З бездані часоў дайшлі да нас у гэтых згустках розуму і ведаў жыцця радасць і пакуты людскія, смех і слёзы, каханне і гнеў, вера і бязвер'е, праўда і крыўда, сумленнасць і ашуканства, працавітасць і гультайства, прыгажосць ісцін і недарэчнасць забабонаў» *,— пісаў М. Шолахаў аб прыказках у прадмове да зборніка У. Даля.

Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі дакастрычніцкага часу крытыкуюць сацыяльную несправядлівасць, якая панавала ў класавым антаганістычным грамадстве, выкрываюць эксплуататарскую сутнасць царызму, царквы і рэлігіі, паказваюць невыносна цяжкае становішча працоўных, паразітычнае існаванне паноў, папоў, купцоў і капіталістаў. «Адзін з сошкаю, а сямёра з ложкаю», «Адзін сыцее — дзесяць пацее»,— трапна гаворыцца ў прыказках аб сацыяльнай няроўнасці ў дакастрычніцкай Расіі.

Народ бязлітасна ганьбуе жорсткасць, скупасць, дэспатызм багацеяў:

---

* *Даль В.* Пословицы русского народа. М., 1957, с. 3.

«Багаты — рагаты: усё глядзіць, каб каго збіць», «Багаты і вока аддасць сваё за золата», «Бедны пот лье, а багаты яго кроў п'е»; выкрывае хабарніцтва і несправядлівасць царскіх суддзяў: «Калі на табе кажушок ліхі, то суддзя глухі», «Пан і тады праў, як сведак чорт маў»; крытыкуе прагнасць, ілжывасць, амаральнасць і крывадушша папоў і ксяндзоў: «У папа, кажуць, дзве рукі: адна — што хрысціць, другая — што бярэць, а той, што дае,— няма», «У папа пуза таўсцее, а ў мужыка спіна млее», «У цябе праўды, як у ксяндза з папом» і інш.

Шматлікія прыказкі і прымаўкі адлюстроўваюць пэўныя гістарычныя падзеі: «Наша Бяроза чужых і генералаў тапіць можа», «Пякуцца французы, бы бульба ў прыску».

Тэматыка прыказак і прымавак разнастайная, у іх адлюстраваны адносіны паміж людзьмі ў грамадстве, стыхійна-матэрыялістычны светапогляд народа, яго мараль, любоў да Радзімы, нянавісць да ворагаў, сямейны быт, працоўны каляндар, прыродныя з'явы і прыкметы і г. д.

Нягледзячы на лаканічную форму, прыказкі заключаюць у сабе багаты асацыятыўны змест, адлюстроўваюць мудрасць народа. Нездарма народныя прыказкі часта выкарыстоўваў у сваіх працах, пісьмах і выступленнях У. І. Ленін. Многія прыказкі і прымаўкі сталі загалоўкамі яго прац. Ленін любіў народныя афарыстычныя творы за іх лаканізм, трапнасць, маляўнічасць і выразнасць. У сібірскай ссылцы ён з захапленнем гаварыў пра мясцовыя прыказкі: «Цудоўна, цудоўна! Вось дзе трэба вучыцца нашым пісьменнікам, адной фразай напавал б'е... Неабходна скласці вялікі зборнік. Вось будзе скарб для белетрыстаў і прамоўцаў».*

Глыбокія і мудрыя думкі адлюстроўваюцца ў прыказках у высокамастацкай форме. Прыказка вызначаецца дасканалай будовай: яна часцей за ўсё рытмічна стройная, рыфмаваная, кампазіцыйна двухчленная.

Стварэнню яркага ёмістага вобраза садзейнічаюць розныя паэтычныя мастацкія сродкі. Шырока ўжываюцца ў прыказках сінтаксічны паралелізм, антытэза: «Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ», «Адным кірмаш, а другім жыцця нямаш», «Адны гаруюць, другія пануюць»; разгорнутыя і простыя параўнанні: «Свая хатка, як родная матка», «Крамар, як камар: дзе сядзе, там і п'е»; сінекдаха, метанімія, метафара і г. д.

Асабліва пашырана ў прыказках іронія (напрыклад, «Поп «праведна» жыве: з беднага дзярэ да ў свой карман кладзе»). Сацыяльныя тыпы ствараюцца з дапамогай гіпербалы, алегорыі і іншых мастацкіх сродкаў («У пана горла — прорва: тысяча працуе, а ён адзін прагарцуе», «У папоўскай кішэні з галавой схаваешся»). Часта, каб падкрэсліць сацыяльную няроўнасць у антаганістычным грамадстве, у прыказках карыстаюцца прыёмам кантрасту: «Пакуль з багатага пух, дык з беднага дух».

Разнастайныя мастацкія сродкі, рытміка і рыфма звязваюць прыказку ў адзінае цэлае. Дасканала і мудра збудаваная, яна жыве сотні год.

* «Литературный современник», 1940, № 1, с. 10.

Напрыклад, у прыказцы «Багатаму і ў полі родзіць, і ў хляве плодзіць, а беднаму дзе ні кінь, то клін» усе элементы выказвання цесна звязаны не толькі антытэзай, але і рыфмай, якая перш за ўсё знітоўвае прыказку і дапамагае лепшаму яе запамінанню.

Шырока ўжываюцца прыказкі і прымаўкі ў творах пісьменнікаў і паэтаў, якія, у сваю чаргу, папаўняюць скарбніцу народнай мудрасці.

Яркім сведчаннем таго, як выкарыстоўваліся беларускія прыказкі ў старажытныя часы ў перапісцы, з'яўляюцца лісты аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага, напісаныя ім у 1573—1574 гг. Прыказкі, прыведзеныя ў лістах,— гэта па сутнасці адны з першых фальклорных твораў, якія дайшлі да нас у запісах.

Сістэматычныя запісы беларускіх прыказак і прымавак пачаліся ў XIX ст. Асабліва каштоўныя зборнікі афарыстычных твораў апублікавалі ў дакастрычніцкі час І. І. Насовіч, Я. А. Ляцкі, М. Я. Нікіфароўскі. Багатая калекцыя народных прыказак і выслоўяў была падрыхтавана таксама А. К. Сержпутоўскім. Але найбольш значны па аб'ёму зборнік беларускіх прыказак і прымавак быў надрукаваны ў 1935 г. у Варшаве (запісы М. Федароўскага, каля 10 тысяч). У савецкі час найбольш поўныя зборы прыказак апублікавалі Ф. Янкоўскі і Я. Рапановіч.

### Літаратура

*Носович И. И.* Сборник белорусских пословиц. Спб., 1874.
*Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej, t. IV. Warszawa, 1935.
*Янкоўскі Ф.* Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы. Мінск, 1965.
*Рапановіч Я.* Беларускія прыказкі, прымаўкі і загадкі. Мінск, 1974.
*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967, с. 142—148.
*Беларуская* вуснапаэтычная творчасць. Пад агульнай рэдакцыяй М. Р. Ларчанкі Мінск, 1966, с. 91—99.
*Кабашнікаў К. П.* Нарысы па беларускаму фальклору. Мінск, 1963, с. 65—71.
*Янкоўскі М. А.* Паэтыка беларускіх прыказак. Мінск, 1971.

* *
*

Ад прыгону аслабанілі і зноў пад пана пасадзілі.
Адна бяда ідзе, другую за ручку вядзе.
Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ.
Адны пануюць, другія гаруюць.
Адзін з сошкаю, а сямёра з ложкаю.
Багатаму за жонку хоць свінка, абы грошай асьмінка.
Багатаму чорт дзяцей калыша, а беднаму з калыскі выкідае.
Багаты беднаму не сябра.
Багаты брат беднаму брату не рад.

Багаты — рагаты: усё глядзіць, каб каго збіць.
Багатым жыццё, а бедным выццё.
Балота без чорта не будзе.
Баяцца не цівуна, а яго бізуна.
Беднаму часам і астрогу не боязна.
Бедны да беднага горнецца, а багаты ад каго хочаш адвернецца.
Бедны пот лье, а багаты яго кроў п'е.
Без гарапашнікаў-мужыкоў не было б ні хлеба, ні васьмакоў.
Белыя ручкі чужую працу любяць.
Б'юць і плакаць не даюць.
Голы разбою не баіцца.
Гушча дзяцей не разганяе.
Гэта нашага ўсяго, што з'ямо.
Давалі, ды з рук не пускалі.
Дажыліся нашы браты: ні хлеба, ні хаты.
Два на гаду Юр'і, ды абодва дурні: увосень халодны, а ўвесну галодны.
Дзе адзін пануе, там сто гаруе.
Дзе людзі бяднеюць, там паны багацеюць.
Дзе панская сіла, там мужыцкая спіна.
Дзеці, дзеці, добра з вамі ў лецe, а зімою — хоць аб печ галавою.
Дзяцей — як бобу, а хлеба — ні дробу.
Ёсць зубы, ды хлеба няма да губы.
Ёсць хлеб — соку няма, ёсць сок — хлеба няма.
Жывы ў зямлю не палезеш.
З багатым не судзіцца, з дурным не біцца.
І адсюль горача, і адтуль боляча.
Ідзі хутка — бяду здагоніш, ідзі паволі — цябе здагоніць.
І ў сваёй хаце не вольна.
Каб ты ў найме пабываў, то тады б мне спагадаў.
Казаў пан: кажух дам — цёплае панскае слова!
Калі пан пяе, то мужыка трасца трасе.
Калі б паноў чорт узяў, тады б свет гора не знаў.
Каменняў — хоць забіся, вады — хоць заліся, дроў — хоць запаліся: хлеба дакупіўшы, можна жыць.
Каму клапатно, а каму палатно.
Каня хвалі пасля дарогі, а пана — як выцягнуць за ногі.
Кляні ты пана — пан таўсцее.
Крамар як камар: дзе сядзе, там і п'е.
Ласка панская толькі да парога.
Ласкаю панскаю далёка не заедзеш.
Лепей ад беднага добрае слова, як ад багатага падмога.
Лепей з ваўком у лесе стрэцца, як на панскай печы грэцца.
На панскі розум ёсць мужыцкая хітрасць.
На службе хлеб смачны, але не спажытны.

Наняўся, як прадаўся.
Напляваць багачу, калі свой сноп малачу.
Наш пан, а ваш гаспадзін — чорт адзін.
Не проста пані, а пані Стоцкая.
Не сеюць, не жнуць, а хлеб смачны ядуць.
Не спіцца багатаму ўночы.
Не так будзе, як пан скажа, а так будзе, як мужык зробіць.
Не той піва п'е, хто варыць.
Пазычаны хлеб еж дый аглядайся.
Пакуль да бога, то чорт душу выйме, пакуль да цара, то пан скуру здыме.
Пакуль з багатага пух, то з беднага дух.
Пакуль сыты ссохне, то худы здохне.
Пан балюе, а наш брат, знай, будуе ды бядуе.
Пан з панам б'ецца, а ў мужыка лоб трашчыць.
Панам сеюць, жнуць і косяць, а сабе хлеба просяць.
Панская ласка на дохлым кані едзе.
Панскіх груш не руш: як пагніюць, паны самі дадуць.
Па тры грошыкі на дзень,— куды хочаш, туды дзень.
Рукі на мазалях, а ў торбе засохлы акрайчык.
Служачы хлеб — сабачы.
Сыты галоднаму не спагадае.
Сялянскаму роду няма пераводу.
Тады перастануць гараваць, як не будзе каму панаваць.
Такая доля: багатаму дбаць, а самому ў холадзе і голадзе паміраць.
Такой ласкі і ў пана дастанеш.
Толькі і гора пану, што жывот баліць.
Тым панам рукі паадсыхалі, што ад сябе гарнулі.
У пана горла — прорва: тысяча працуе, а ён адзін прагарцуе.
Уцякаў ад пана, а папаў на войта.
Хата чужая — як свякруха ліхая.
Хвалі хлеб у свірне, а ліхадзея ў труне.
Хлеб ды вада — батрацкая яда.
Хоць голы, ды вясёлы.
Хоць грошай ні гроша, затое слава хароша.
Хоць з вадою, абы не з бядою.
Хоць у вір галавою, то бяда за табою.
Часам з квасам, парою з вадою.
Чужая ніўка паядае сілку.
Чужая хата горш за ката.
Чужы кажух не нагрэе.
Чым багацейшы, тым сквапнейшы.
Што грамада скажа — і пан не паможа.
Шынкар п'яніцу любіць, ды дачкі за яго не аддасць.

Як памрэ беднячок — толькі поп ды дзячок, а памрэ багаты — па трое з хаты.
Вясковы сабака, а дваровы служака — усё роўна.
Груган гругану вока не выклюе.

За праўдаю суд не ідзе, а за падмазкаю.
Каза дзярэ лазу, казу дзярэ пастух, пастуха дзярэ пан, пана дзярэ юрыст, а юрыста — чарцей трыста.
Калі маеш хлеб, то будуйся, калі маеш грошы, то правуйся.
Кожны гад чужому грошу рад.
Мужыка ніжэй не разжалуеш.
На базары долі не купіш, а ў судзе праўды не знойдзеш.
Начальніку — і воўчы рот і лісіны хвост.
Не будзь ні войтам, ні сватам — не будзеш чалавекам праклятым.
Не так дакучна ад паноў, як ад падпанкаў.
Пан з панам пазнаюцца, а мы ў бядзе.
Праўда ў тых, хто грошы мае.
Суддзя не чакае свечкі, а мяшка.
У каго ў каліце, той і з панам на куце.
Хай багачы дзівяцца, чым беднага дзеці жывяцца.
Хоць галодны, але свабодны.
Чыя сіла, таго і праўда.

Бацька ў салдатах, а ў дзяцей кашуля ў латах.
Быў на вайне — спагадай і па мне.
Вайна — каму вяроўка, а каму — дойная кароўка.
Вайна кроў людскую п'е.
Грэўся француз у Маскве, а замярзаў на Бярозе.
Лепей дома хлеб аўсяны, як на вайне пытляваны.
Мора без вады, а вайна без крыві не бывае.
Мсціслаў не аднаго сціснуў.
Наша Бяроза чужых і генералаў тапіць можа.
Пякуцца французы, бы бульба ў прыску.
Салдат не баіцца і пекла.
Салдату і ў полі няволя.
Салдату трошкі трэба: солі драбок ды хлеба шматок.
Салдацкі сон усюды салодкі.

Абяцаў бог даць, але казаў пачакаць.
Алтарысты і арганісты на рукі нячысты.
Воўчае горла, а паповае вока — то нароўні.
Вяселле, хрысціны — ксяндзу добрыя гадзіны.
Даў бы рубель на малебен, ды самому патрэбен.
Дзе поп царкву ставіць, там гандляр карчму ладзіць.
За тым і божа, хто пераможа.

І бог ашуканствам жыве: у аднаго адбярэ, а другому дасць.
Кожны святы да сябе горне.
Ксёндз служыць не для Езуса, а для хлеба куса.
Ксяндзоўскі слуга сагнуўся, як дуга.
Людзі мруць — папова пшаніца красуе.
Марскую глыбіню, а ксяндзову кішэню не напоўніш.
На бога спадзявайся, але сам старайся.
На бога няма чаго спадзявацца, трэба самому дамагацца.
На бога спадзяешся — без кашулі астанешся.
Навошта нам богу маліцца, які на нас не глядзіць?
Над сіратою бог з калітою, ды з каліты ёй нічога не трапляе.
Неба ці трэба, а хлеба — трэба.
Ненадзейна, як з малітваю праз дрыгву.
Няма нікому так, як ксяндзу ды кату: абодва ляжаць ды хлеб задарам ядзяць.
Няма чаго богу маліцца: ён нашых малітваў не прымае.
Па богу — лёгкі будзеш.
Папоўскае вока, а воўчае горла.
Папу адна радасць — ці памінкі, ці хрысцінкі — усё роўна даюць.
Плакаў я плакаў, а бог быў аднакаў; пачаў танцаваць — пачало шанцаваць.
Поп з крыжам, чорт з чаркай, а мне — усё страты.
Поп і з жывога і з мёртвага бярэ.
У бога ўсяго многа, а ў таго, хто гаруе, нічога.
У кудлатага папа і ў голенага ксяндза адна праўда.
Царква гарыць, а людзі рукі грэюць.
Чакаць на богава — вельмі доўга да хлеба новага.
Як не пад'ясі, святых прадасі.

Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуецца.
Далёкая старонка без ветру сушыць.
Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
Для ўсякай птушачкі сваё гняздо мілае.
Жонка як жонка, але мілей родная старонка.
З'ехаў на чужыну — як зваліўся ў дамавіну.
Зямелька — матка наша: і корміць, і поіць, і адзявае нас.
Ідзі ў родны край, там — і пад ёлкаю рай.
Каб далі волечку, знайшоў бы родную старонeчку.
Калі ў школе з матчынай гаворкі пасмяецца, то на старасці ад маткі адрачэцца.
Кожнаму свой куток мілы.
Кожная птушка гняздо сваё ведае.
Лепей у сваіх людзях з голаду паміраць, чым у чужых людзях золата збіраць.

Мілы той куток, дзе рэзан пупок.
На радзіме і паміраць лягчэй.
На чужой старане і рак — рыба.
Не той перамагае, хто ў бядзе са сваёй зямелькі ўцякае.
Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.
Радзіма — матка, чужына — мачыха.
Родная зямелька — як зморанаму пасцелька.
Свая хатка — як родная матка.
У сваёй хаце і вуглы дапамагаюць.
У сваім краі, як у раі.
Усюды добра, а дома найлепей.
Усякая птушка сваё гняздо бароніць.
Хто мову і веру мяняў, той не то сябе — і суседа прадаваў.
Хто роднага краю цураецца, той і маткі сваёй адцураецца.
Чужая старана тугою арана, слёзкамі засявана.

Адзін — дасужы, ды не дужы.
Адзін дзесяцёх не спаможа, барзджэй згіне.
Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве — і ў полі не тухнуць.
Аднаму і ў кашы няспорна.
Адною рукою і вузла не завяжаш.
Адным калом плоту не падапрэш.
Будзе людзям, то будзе і нам.
Грамада — вялікі чалавек.
Гуртам і ў бядзе лягчэй.
Дзе дружна, там хлебна.
Дружнай грамадзе воўк не страшны.
Згода будуе, нязгода руйнуе.
Пчолкі па адной не селяцца.
У лесе людзі дзічэюць, а ў людзях люднеюць.
Што аднаму цяжка, тое гуртам лёгка.
Госць лавы не праседзіць.
Госць як госць, а валакіты досць.
Дарагі не абед, а прывет.
Добра было ў гасцях, толькі прынукі не было.
Добра, як сусед блізка і пералаз нізка.
Добрая слава даражэйшая за багацце.
Дурань недабачыць, а разумны прабачыць.
Дзе сварацца, там нішчымнае варыцца.
Жонка за маўчок, а муж кій у куток.
З якім спазнаешся, такім станешся.
І чорт літасць мае.
Іх і вада не размые.
Калі падмеўся грыбам, то лезь у каробку.

Кошка мышцы не таварыш.
Лепш зухаваты, чым тхараваты.
Лёгка пасварыцца, цяжэй памірыцца.
Любіць увесь свет лагодны прывет.
Мы з табою, як рыбка з вадою.
Нага нагу падпірае, рука руку абмывае.
Не пара сава да сокала.
Нікому вады не замуціць.
Новых сяброў набывай, а старых не забывай.
Няпрошанаму госцю лыжкі няма.
Прыглядай гасцей, каб хадзілі часцей.
Прыяцеля пазнаеш у няшчасці.
Слухаць добрай рады не шкодзіць.
Сэрца не камень, адляжа.
Сябра за грошы не купіш.
Сябрамі не кідаюцца.
Там добрая рада, дзе шчырая парада.
Той не можа быць другам, хто абыдзе ў бядзе кругам.
Ходзіць цішэй вады, ніжэй травы.
Хто ў бядзе не быў, той сапраўдных прыяцеляў не знае.
Цесната — не крывата.
Чым госць радзейшы, тым мілейшы.
Які госць, такое і частаванне.

Авёс кажа: кінь мяне ў гразь, то буду князь.
Ад цяплосці не баляць косці.
Адклад не ідзе ў лад.
Багата снегу — багата хлеба.
Без гною ці без лубіну хлеба не чакай.
Без клопату і без поту наш брат не пражыве.
Без працы не будзе шчасця.
Без працы няма чаго хлеба шукаці.
Бяроза распускаецца — сей авёс, сады цвітуць — бульбу, каліна цвіце — грэчку.
Варвара ноч уварвала.
Вішня не апала — зіма не настала, вішня апала — зіма настала.
Восень кажа: ураджу, а вясна кажа: яшчэ пагляджу.
Вясна красна, хоць галадна.
Вясну хваляць за дажджы і сонца, а лета — за снапы і вазы.
Гаспадарку вадзіць — не разінуўшы рот хадзіць.
Гнуткага дрэва вецер не зломіць.
Гумно плача без гаспадара, а хата без гаспадыні.
Гутарка гутаркай, ды за працу час!
Дождж у маі — будзе хлеба і на гультаі.

Дзе араты плача, там жняя скача.
Дзе няма ахвоты, там няма работы.
Дзе прыганятых многа, там поспеху мала.
Дзе сілаю не зробіш, то спосабам.
Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста.
Ён і паміраць часу не знойдзе.
Жураўлі ляцяць высока — зіма яшчэ далёка.
З адкладу няма ладу.
Запас бяды не чыніць.
Зямлю не ўгноіш — і хлеба не намалоціш.
Зямлю ўгноіш — хлеба падвоіш.
Каб не клін ды не мох, дык цесля б з голаду здох.
Калі гаспадар па гнаі ходзіць, тады ў яго хлеб родзіць.
Калі год сухі, купляй пчолку, а калі мокры — купляй кароўку.
Калі жыта ў сакавіку глядзіць на неба, не есці тады хлеба.
Калі здолееш узяцца за справу — і снег загарыцца, не здолееш — і масла не ўспыхне.
Калі ўлетку на сонцы не папячэшся, то ўзімку з холаду натрасешся.
Калі хочаш хлеб мець, то трэба зямліцы глядзець.
Кармі парсюка мукою — пойдзе рукою.
Кладзі гной густа, не будзе ў свірне пуста.
Кладзі гной у пару, збярэш збожжа гару.
Колькі адзін Мікола дасць снегу, столькі другі дасць травы.
Курачка па зярнятку збірае і сытая бывае.
Летні дзень год корміць.
Летнюю часінку зімовым тыднем не заменіш.
Лёгкі здабытак — лёгкі пражытак.
Люты наробіць плюты.
На дзень раней пасееш, на тыдзень раней збярэш.
На ранняй ралліцы родзіць жыта ды пшаніца, а на позняй ралліцы родзіць кукаль ды мятліца.
Насмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
Не ад красных слоў дабро на свеце стала.
Не вымем карова малако дае, а языком.
Не на адну хваробу праца — найлепшыя лекі.
Не пі, не еж і з хаты не лезь.
Не пытайся ці галоўка гладка, а пытайся ці падмеценая хатка.
Не работа сушыць, а турбота.
Не сей пшаніцы, калі дзеці ідуць у суніцы.
Не хочаш у маладосці працаваць, будзеш на старасці з торбачкай танцаваць.
Ніякая праца не ганьбіць чалавека.
Па кропельцы — рэчка, па травінцы — копка, а па копцы — стог.
Пакланіся кусту — дасць хлеба лусту.

Пасееш — то будзе капа, а не пасееш — то ні снапа.
Першы блін комам.
Піліпаўскі лёд кажа: хоць трашчу, але не пушчу.
Праца здароўя не адбірае.
Праца не паганіць чалавека, а корміць, і поіць, і вучыць.
Праца чалавека трымае і ўзбагачае, а гультайства псуе.
Работа не забота, забота — калі няма работы.
Рыбак рыбу вудзіць, ды век нудзіць.
Рыхтуй летам сані, а зімой калёсы.
Садок садзіць — жыццё харашыць.
Сей жыта ў прысак, авёс у гразь, то будзеш князь.
Сёння зробіш, заўтра як знойдзеш.
Слуцкія ткачыхі могуць увесь свет спавіць.
Сон на заўтра адлажы, а справу сёння зрабі.
Старога вераб'я на мякіне не падманіш.
Старога ліса не ашукаеш.
Стары вол баразны не псуе.
Сухі марац, мокры май, будзе жыта нібы гай.
Тады ад зямлі пазнаць смак можна, як на яе гною паложыш.
Трэба рана ўстаць, каб хлеба прычакаць.
У гаспадарцы і аборка спатрэбіцца.
У добрай гаспадарцы ёсць і сала і масла ў скрыні.
Увесну не прыслухоўвайся да болю.
Хлеб — усяму галава.
Хто дажджом косіць, той пагодаю сушыць.
Хто дбае, той і мае.
Хто заб'е бабра, не будзе мець дабра.
Хто не сее, той не вее.
Хто не шануе чужога, той і свайго не мае.
Хто палюе і рыбачыць, той хлеб рэдка бачыць.
Хто пытае, той не блудзіць.
Хто рабіць бярэцца, той і вучыцца.
Хто рана сее, той насенне не губляе.
Хто рана ўстае, таму бог дае.
Хто хлеба хоча, той мусіць быць у поце.
Шануй каня дома, а ён цябе ў дарозе.
Як дбаеш, так і маеш.
Як накорміш, так і надоіш.
Якая работа, такая і плата.

Адвагаю і пекла пярэйдзеш.
Баязліўца куля і ў акопе страчае; смелага і на акопе мінае.
Будзе пара — будзе трава.
Была б галава на плячах!

Дай бог чутае бачыць.
Калі не нажнём, дык назбіраем.
Лепей жартаваць, чымся гараваць.
Ліха перамелецца — дабро наступіць.
Мае лапці лазовыя пераносяць твае боты казловыя.
Не такі чорт страшны, як яго малююць.
Ператрэцца, перамнецца — мука будзе.
Прыйдзе, тата, і на нашу вуліцу свята!
Прыйдзе тая нядзеля, што будзе і маё вяселле!
Свет не без добрых людзей, казак не без долі.

Абы добрая гадзіна, то знойдзецца радзіна.
Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумнеюць.
Адна галава — не бяда, а калі і бяда, то адна.
Аднаго бацькі і адной маткі няроўныя бываюць дзіцяткі.
Ажаніўся, то і перамяніўся.
Бацька нажываў горбам, а дзеткі пражылі горлам.
Бацька няхай едзе араць: яго коні знаюць, а я пайду ў карчму: мяне там чакаюць.
Без гаспадара жонка — заўсёды сіротка.
Гарбатага выпрастае магіла, а ўпартага — дубіна.
Гаспадар за чарку — жонка ў сварку.
Гаспадар і жонка — найлепшая сполка.
Гні калінку, пакуль маладзенькая.
Гніся, бацька, ці не гніся, а за кішэню бярыся.
Горкая рэдзька, ды ядуць, кепска замужам, ды ідуць.
Дай дзецям волю, то сам улезеш у няволю.
Датуль нявестка была міла, пакуль бруд з хаты насіла.
Дзе сыноў лава, там бацьку слава, дзе дачок лава, там матцы слава.
З дзявочае красы вады не нап'ешся.
З кім жыць, таго не гнявіць.
З мілым па душы — рай і ў шалашы.
З разумнымі дзеткамі і без грошай хароша.
За багаццем пагонішся — дабра не будзе.
І ў харошай сям'і выпадак бывае.
Калі гаспадар з жонкаю сварыцца, тады ў гаршку трасца варыцца.
Калі гаспадар у карчме скача, то гаспадыня ў дварэ плача.
Калі на свет дзіця прыходзіць, новы кусок хлеба родзіць.
Калі ёсць дзед, ёсць і абед, няма дзеда — няма і абеда.
Лепей горкую рэдзьку есці, як з нялюбым за стол сесці.
Лепей у зямельцы гніць, чым з нялюбым жыць.
Любяць жонку здаровую, а сястру багатую.
Малыя дзеці — малы клопат, большыя дзеці — большы клопат.
Матка дзяцей вучыць, а мачыха сушыць.

На нявестку сем год грады брэшуць.
На скорую руку не жаніся.
Начная зязюлька дзённую перакукуе.
Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі.
Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі.
Не з прыданым жыць, а з чалавекам.
Не слухаеш добрых слоў — паслухаеш ліхога кія.
Не слухаў бацькі і маткі — няхай людзі вучаць.
Не тая маці, што спарадзіла, а тая, што выгадавала.
Не ўмееў гадаваць — умей дараваць.
Не ўсё ж на бацькавай шыі сядзець, пара і свой розум мець.
Ніхто не ведае, як сірата абедае.
Ніхто так дзецям не спагадае, як матка родная.
Нічые такія слёзы, як матчыны: яны і ўтопяць, яны і шчасця выпрасяць.
Няма тае крамы, каб прадаваліся мамы.
Паміраць збірайся, а пра дзяцей думай.
Прымачы хлеб — сабачы.
Самая балючая рана — ад свайго дзіцяці.
Свату першая чарка і першая палка.
Свой бацька насварыцца і пашкадуе.
Сіротка слёзкамі ўмыецца, кулачком вытрацца.
Сіраціне і ўзімку дзень доўгі.
Сірочае жыццё — як гарох пры дарозе: хто ідзе, той скубне.
Сірочая сляза і камень прабівае.
Старому з маладою жыць, што саве з ластаўкаю гняздо віць.
Тады сіраце нядзеля, як кашуля бела.
Як сіраце жаніцца, ноч кароткая.
Умееў гуляць — умей і дзіця забаўляць.
У каго дзеці, у таго шчасце.
У каго дачок сем, то ёсць доля ўсім, а ў каго адна — то і тая долі жадна.
У прымы збірайся, а жыта сей.
У роднага таткі цяплейшая хатка.
Хоць без хлеба пасяджу, але на мілага пагляджу.
Хоць пад лаўкаю сядзець, абы на харошага глядзець.
Хто бацькоў не слухае, той у пальцы дзьмухае.
Хто бацьку шануе, той і дзецям добрую долю гатуе.
Хто дзяцей да працы шкадуе, той сабе вяроўку гатуе.
Хто каго любіць, той таго чубіць.
Ці ж цаніць дзеўку па сукенцы ў нядзельку?
Шануй бацьку з маткай: другіх не знойдзеш.
Як да каханага ішла — то ўсё скачучы, а як дахаты — усё плачучы.
Як добрая свякроў, то добрая і нявестка.

Які Хомка, такая яго жонка.
Якое дрэва, такі клін,— які бацька, такі сын.

Ад старасці ды ад смерці няма лекаў на свеце.
Дай, божа, старым вочы, а маладым розум.
Для старой бабы і на печы ўхабы.
Пытае старасць, што прыгатавала маладосць.
Сівізна ў бараду, а чорт у рабрыну.
Старасць — не радасць, а смерць — не пацеха.
Старасць — не радасць, доўг — не карысць.
У дзеда адна бяседа: дзе быў, з кім піў, хто каго біў.
Хто з маладосці працуе, той на старасці не шкадуе.
Часам стары кажа на глум, а малады бярэ на вум.
Шануй старое, як дзіця малое.

Ад навукі галава не баліць.
Ад навукі дужэюць (спрытнеюць) рукі.
Без мукі няма навукі.
Без навукі і лапця не спляцеш.
Век жывеш, век вучыся.
Вучыся змоладу, то на старасць як знойдзеш.
Вучыцца ніколі не позна.
Гуляючы, розуму не прыдбаеш.
Дурнога вучыць, як мёртвага лячыць.
Жалеза куй — як гарачае, вучыся, як вучыцца.
За багацце розуму не купіш.
За разумнаю галавою і рукам лёгка.
Кніжка чалавеку — што грэчка пчолцы.
Навука вочы адчыняе.
Навука даражэй за ўсякае багацце.
Навука не мучыць, а жыць вучыць.
Не навучыцца, пакуль не намучыцца.
Нікому свайго розуму не ўставіш.
Разумны вучыць не спяшаецца.
Розум — найлепшае багацце.
Розуму на кірмашы не купіш і ў Слаўкаўшчыне не знойдзеш.
Розуму не прыкупіш.
Рукі — да работы, ногі — да ахвоты, галава — да ўсяго.
Сыта бруха да навукі глуха.
Тупы да навукі, няздатны на рукі.
Хіцер Зміцер, ды й Слаўка не дурань.
Цяпер без навукі і каровы не дояць.
Што дурань сапсуе, разумны паправіць, што разумны сапсуе, ніхто не паправіць.

Без прыказкі і з лаўкі не зваліцца.
Добрае слова не забываецца.
Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей.
Добрая слава ў кошыку ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць.
Дурнога салаўя — дурная песня.
Жарты і да бяды даводзяць.
З добраю песняй жыць весялей.
З мора вады не выліць, з песні слова не выкінуць.
З песні слова не выкінеш.
Конь на чатырох нагах — і то спатыкаецца.
Куляй пацэліш у аднаго, у двух, а трапным словам у тысячу.
Людскога языка не завяжаш.
На чужы раток не накінеш платок.
На языкі няма прывязі.
Не частуй мяне ні піўцом, ні вінцом, а прывітай мяне шчыранькім слаўцом.
Праўда вочы коле.
Праўда грубая, ды людзям любая.
Праўда даражэй за грошы.
Праўда наверх выйдзе.
Праўда не ўтоне і не згарыць.
Рана загоіцца, а злое слова ніколі.
Сказанага слова ніхто за хвост не зловіць.
Слова сказаў — сякераю адсек.
Слоўка як птушка: выпусціў — не вернеш.
Слухай многа, а гавары мала.
Тады слова — серабро, калі справы — золата.
Хлеб-соль еж, а праўду рэж!
Што праўда, то не грэх.
Які розум, такая і гаворка.
Абы здароўе, а работа будзе.
Абы зубы, то хлеб будзе.
Ад смерці не адкупішся і не адпросішся.
Адзін хоць з'еж вала — адна хвала.
Галоднай куме хлеб на вуме.
Галоднаму жывату і пушынка па нутру.
Галоднаму пасцель мулкая.
Голад не цётка — з'есць што папала.
Голад не свой брат.
Дзе стан, там і сіла.
Еж, пакуль рот свеж, бо як пойдзеш да гробу, то з'ясі хваробу.
Жыватом хлеба не вынасіш.
Калі ёсць хлеб і вада, то не бяда.
Кашы маслам не сапсуеш.

Лішняга і свіння не есць.
На лечаным кані далёка не заедзеш.
На ўсе хваробы ёсць спасобы.
Не бяда, што п'ецца вада.
Салаўя песнямі не накорміш.
Скрыпучае дрэва перастаіць здаровае.
Смерць не перабірае і не мінае.
Сытаму гора, а галоднаму ўдвое.
Хвароба нікога не красіць.
Хваробу не трэба клікаць, сама прыйдзе.
Чалавек галодны да нічога нязгодны.
Чорт без кухара памінаў, каб кухар з голаду паміраў.
Як прыйдзе бяда, то не палезе ў горла яда.
Якая сілка, такая і скібка.
Якая хада, такая і яда.

Апрануты, як пава, але брыдкая слава.
З вялікага грому малы дождж бывае.
З пустога збана ніхто не нальe.
Знаць пана па халявах.
Золата і ў балоце свеціцца.
Малы жук, ды вялікі гук.
На харошага глядзець хораша, а з разумным жыць лёгка.
Не адзенне чалавека, а чалавек адзенне харашыць.
Не слаўная хата вугламі, а пірагамі.
Не тое хораша, што хораша, а што да спадобы.
Не ўсё тое бяры, што хораша.
Не чын паважаюць, а чалавека па яго праўдзе.
Не чын чалавека падвышае, а чалавек чын.
Пад белым хусцем цела бруднае (душа чорная).
Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку.
Пазнаюць птушку па палёце.
Прыгожаму ўсё гожа.
Хоць кашуля чорная, але сумленне чыстае.
Хоць няскладна, абы ладна.
Ціхая вада грэблю рве.
Што танна, тое гніла, а што дорага, тое міла.
Якая на свінні шэрсць, такая ёй і чэсць.
Якія грошы, такі і тавар.
Ад яблыні яблык, ад ёлкі шышка.
Воцат не гарэлка, а кума не жонка.
Вялікаму каню — вялікі хамут.
Галавою столі не праб'еш.
Дзеля паповых цялят воўку ў лес не ісці?

Дроў у лес не возяць.
З аднаго вала дзвюх скур не дзяруць.
За вадою і саломінка паплыве.
І чорная карова белае малако дае.
Навошта лысаму грэбень, калі няма чаго часаць.
Не вучы акуня плаваць.
Не палкаю, дык кіем.
Прышый кабыле хвост,— у яе свой ёсць.
Савою аб пень ці пнём па саве.
Сляпога за павадыра не пашлеш.
Абы былі свінні, а карыта знойдзецца.
Баяцца воўка — у лес не хадзіць.
Без зачатку і канца не было б.
Без каманды войска гіне.
Без начыння і лапця не спляцеш.
Без падпалу дровы не гараць.
Без прычыны галава не баліць.
Быць бычку на лычку, а цялушачцы на вяровачцы.
Бяда бядзе не дапаможа.
Век пражыць — не поле перайсці.
Воўка ногі жывяць (кормяць).
Воўк сабакі не баіцца, а звягі не любіць.
Вышэй ад сваіх пят не падскочыш.
Галоднай курцы проса на думцы.
Галодны — пра хлеб, п'яны — пра хмель.
Гара з гарою не сходзяцца, а людзі сходзяцца.
Гарбатага адна (толькі) магіла спраміць.
Да пары збан ваду носіць.
Дабро пушыць, а ліха сушыць.
Дай сэрцу волю — зойдзеш у няволю.
Дараванаму каню ў зубы не глядзяць.
Дарма і каза не скача.
Дзіравае кішэні не напоўніш.
Добра сытага карміць, а голага галіць.
Добрае доўга помніцца, а кепскае (ліхое, дрэннае) ніколі не забудзеш.
Добры чалавек і сабакі не будзе дражніць.
Доўг не вяроўка: не парвецца, будзе цягнуцца.
Доўг не раве, але спаць не дае.
Другога слухай і свой розум май.
Дурню агню ў рукі не давай.
Жыве, як у бога за пазухай.
Жывы пра жывое і думае.
Жывому чалавеку ўсяго трэба.
Жыцце пражыць — не песеньку спець.

З разумным пагавары — розуму набярэшся, а з дурнем — і свой страціш.
З сваёю цаною на кірмаш не едуць.
З чужое бяды (з чужога гора) не смейся.
З шчасцем і ў грыбы добра хадзіць.
За грошы ўсяго не купіш.
За мухай не ганяйся з абухам.
Згубіўшы большага, не шкадуй меншага.
Каб пазнаць чалавека, трэба з ім пуд солі з'есці.
Калі б ведаў, дзе павалішся, то абышоў бы.
Кепскае адразу відаць, а добрае — убачыць трэба.
Кожны купец свой тавар хваліць.
Лепей хлеб з вадою, як пірог і мёд з бядою.
На вярбе грушы не растуць.
Не кайся, рана ўстаўшы і рана ажаніўшыся.
Не капай на людзей ямы: сам у яе ўвалішся.
Не рабі ліхога і не бойся нікога.
Не смейся чужой бядзе: свая наградзе.
Не спяшайся на шыбеніцу, яшчэ паспееш.
Не тады плаваць вучыцца, як вада ў рот плыве.
Чаго не згубіў, таго не знойдзеш.
Як топішся, то і за саломку ўхопішся.
Якое карэнне, такое насенне.
Абы тавар, купец будзе.
Агню ў шапцы не носяць.
Ад бяды кіем не абаронішся.
Ад добрага лепшага не шукаюць.
Ад зямлі адарваўся і да неба не дастаў.
Ад людскога вока не ўхаваешся.
Ад прыбытку галава не баліць.
Адкуль дым, адтуль і полымя.
Адсюль горача, адтуль — боляча.
Апарыўшыся малаком, і на ваду падзьмухаеш.
Аўчынка вырабу не варта.
Ахвота горш за няволю.
Баба з возу — каню лягчэй.
Бачыць вока, ды ляжыць высока.
Адна звычка гультаёў усіх: рабіць чужымі бакамі, а ляжаць на сваіх.
Гультай за работу — мазоль за руку.
За сном і свету не бачыць.
Рот нараспашку, язык на пляча.
Так, сяк, накасяк, абы не па-людску.
Хто ўлетку цяньку шукае, той узімку галадае.
Яму раніцою росна, у поўдзень млосна, а ўвечары камары кусаюць.

Ад яго як ад казла — ні воўны, ні малака.
Дзякуй богу, хлеб удаўся — пад скарыначку кот схаваўся!
Дурному закон не пісаны.
Дурняў не сеюць, а самі раджаюцца.
Не нашаму цяляці ваўка спаймаці.
Позна ходзіш — сабе шкодзіш.
Прадае скуру ў лесе.
У дурной птушкі дурныя песні.
У няўмекі рукі калекі.
У сляпога дарогі пытаеш.
У яго не то клёпкі, але і абруча няма.
Горла шырокае, ды кішка тонкая.
Завіднаму чужая бяда як цукар.
Насмяяўся шалудзівы з паршывага.
Не бачыць сава, якая сама.
Скупому рубель даражэйшы за душу.
Хто перабірае, у таго хамут гуляе.
Баба варажыла, пакуль галавою налажыла.
Баючыся трэску і ў лес не трэба хадзіць.
Баязліваму страх у вочы лезе.
Даўся запрэгчы, дасіся і паганяць.
Добрага сабаку на прывязі трымаюць.
Еж пірог з грыбамі, ды трымай язык за зубамі.
Ён навучыць на сабак брахаць!
Погаласку пусцяць, з ветру вяроўку саўюць.
Праўда Сідарава: кісялём бліны памазаны, на паркане сушацца.
Рэшатам золата мераюць, а рэшата няма за што купіць.
Язык без касцей, усё хвошча.
Языком матляй, ды рукам волі не давай.
Ён цябе прадасць і грошы палічыць.
Круцельствам свет пройдзеш, ды назад не вернешся.
Ласкавае цялятка дзве маткі ссе.
Не помніць карова зімы, дачакаўшы лета.
Як ратавалі — сякеру давалі, а як выратавалі — ані тапарышча.
Бачыў бог, што не даў свінні рог, бо ўвесь свет паарала б: што лычом — дык лычом, а рэшту рагамі.
Воўка як ні кармі — усё ў лес глядзіць.
Вядзі каня на аборачцы, а злодзея на ланцугу.
Злодзей злодзея па вачах пазнае.
Каб Кандрат ды вінават — у яго Агата вінавата.
Каб свінні рогі, не саступіла б з дарогі.
Калі просяць за стол, то не лезь на стол.
Пасадзі свінню за стол, а яна і ногі на стол.
Як па-панску гаўкаць навучыўся, то і ад вёскі адлучыўся.

Ад гарэлкі будзе розум мелкі.
Гарэлка весяліць, ды ад яе галава баліць.
П'янаму і мора па калена.
П'янаму і чорт з дарогі саступае.
П'янства — чалавеку паганства.
У галаве шуміць-шуміць! А ў кішэнях — ціха-ціха!
Як п'ян, дык капітан, а праспіцца, свінні баіцца.
Ведае кошка, чыё сала з'ела!
На злодзеі шапка гарыць.
Чые б цяляткі рыкалі, а вашы б маўчалі.
Шкадліваму кату пападае.

# ЗАГАДКІ

Загадка — кароткае паэтычна-вобразнае апісанне прадмета або з'явы, якое даецца, як правіла, у форме пытання і адгадваецца па другарадных адзнаках, па прыкметах падабенства.

Загадка, як і прыказка, прымаўка і частушка, адносіцца да фальклорных жанраў малых форм. Лічыцца, што галоўная функцыя загадкі — развіваць у чалавека мастацка-вобразнае мысленне, паэтычны погляд на рэчаіснасць. У мінулым загадка служыла сродкам выпрабавання разумовых здольнасцей, іншасказальная, загадкавая форма з поспехам выкарыстоўвалася ў ваенных і пасольскіх справах. Загадкі, песні-загадкі надзвычай шырока ўжываліся ў вясельных абрадах, напрыклад, з мэтай «праверкі» разумовай сталасці жаніха.

У побыце дарэвалюцыйнага сялянства загадка займала важнае месца. Доўгімі зімовымі вечарамі моладзь і старэйшыя людзі, сабраўшыся ў якойнебудзь хаце, арганізоўвалі займальныя спаборніцтвы загадачнікаў. Яна пашырала кругагляд чалавека, развівала яго фантазію, кемлівасць, назіральнасць, трэніравала памяць, прывучала да развагі, аналізу. Раскрыццё затоенага сэнсу загадкі было працэсам, які нёс вялікую выхаваўчую ролю: у чалавека складваліся, замацоўваліся і паглыбляліся пэўныя веды аб навакольным свеце. Загадка перадае змест праз высокі мастацкі вобраз, поўны часам нечаканых параўнанняў, супастаўленняў, збліжэнняў і паваротаў.

Цяпер гэты старажытны жанр страціў сваю сур'ёзную актыўна-грамадскую функцыю і стаў сродкам забавы і пацехі — творчасцю дзяцей і для дзяцей.

Каштоўнасць традыцыйнай загадкі ў тым, што яна ў высокапаэтычнай форме адлюстравала гаспадарчую і працоўную дзейнасць чалавека, яго жыццёвы вопыт, быт, працу, фауну, флору, будову сусвету і да нашых дзён мае вялікае эстэтычна-мастацкае значэнне для выхавання дзяцей.

### Літаратура

*Никифоровский Н. Я.* Простонародные загадки. Витебск, 1898.
*Рыбникова М. А.* Загадки. М.— Л., 1932.
*Загадкі.* Складальнікі М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мінск, 1972.
*Гілевіч Н. С.* Паэтыка беларускіх загадак. Мінск, 1976.

Сіняя дзяружка ўвесь свет накрыла. *(Неба)*

Вісіць сіта, залатое, навітое. *(Сонца)*

Усе яго любяць, чакаюць, убачуць — адразу заплачуць. *(Сонца)*

Як зойдзе ў дом — не выганіш калом, а пара прыходзіць — ён і сам уходзіць. *(Прамень сонца)*

З акна ў акно — залатое верацяно. *(Прамень сонца)*

Сярод поля ляжыць капыток. *(Маладзік)*

Лысы конь цераз вароты глядзіць. *(Месяц)*

На полі Ярох рассыпаў гарох; стала світаць — няма чаго сабіраць. *(Неба і зоры)*

Без кораня, а расце. *(Камень)*

Ляцелі тры галкі, селі на праталкі. Адна кажа — паляжым, другая — пабяжым, трэцяя — паківаемся. *(Камень, вада, трава)*

Без ног бяжыць, без воч глядзіць. *(Вада)*

Карова бяжыць, скура ляжыць. *(Вада і лёд)*

Дзед мост масціў без сякеры, без долата. *(Лёд)*

Бегла ліска каля лесу блізка: ні сцежкі, ні дарожкі, толькі залатыя рожкі. *(Маланка)*

Ішоў даўгавяз — у сырую зямлю ўвяз. *(Дождж)*

Мяне ўсе просяць, мяне ўсе чакаюць, як толькі з'яўлюся — хавацца пачынаюць. *(Дождж)*

Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай паміраe. *(Раса)*

Ляцеў птах, на ваду — бах. Вады не скалыхнуў, на дно патануў. *(Снег)*

Ляцелі сівыя галубкі, упалі на ваду; вады не скаламуцілі і самі не паляцелі. *(Снег)*

На вадзе ляжыць, ды не тоне; па агню бяжыць, ды не гарыць. *(Цень)*

Жыве без цела, гаворыць без языка; ніхто не бачыць, а ўсякі чуе. *(Рэха)*

Дванаццаць арлоў, пяцьдзесят дзве галкі знеслі адно яйцо. *(Год)*

Стаіць дуб, на дубе дванаццаць гнёзд, у кожным гняздзе па чатыры сініцы, у кожнай сініцы па чатырнаццаць яек, сем чорных і сем белых. *(Год)*

Пасцялю дзяружку, пасыплю гарошку, накладу акраец хлеба. *(Неба, зоры, месяц)*

Прыйшла чорная карова, усіх людзей пабарола. *(Ноч)*

Чорная карова ўвесь свет пабарола; белая ўстала — увесь свет пападымала. *(Ноч і дзень)*

Кроў маю п'юць, косці мае паляць, маімі рукамі адзін другога б'юць. *(Бяроза)*

Пайду ў лес, высяку цялеш; з таго целяша і века, і дзяжа, і булачка хлеба. *(Дуб і жолуд)*

Пайду я ў лес, вырублю цяльнеш, з таго цельняша — дзве плашкі дроў, двое начоў, адзін карэц і шыла канец. *(Жолуд)*

Не разаб'еш гаршчочка, то і не з'ясі кашы. *(Арэх)*

Стаіць певень над вадою з чырвонаю барадою. *(Каліна)*

Усю зямлю прайшоў, чорну шапачку знайшоў. *(Грыб)*

Хоць у капелюшы, а галавы не мае. *(Грыб)*

Як радзіўся, так за кій ухапіўся. *(Хмель)*

Загадаю загадку, закіну за градку; у адзін год пушчу, у другі выпушчу. *(Азімае жыта)*

На коніку сем саколікаў, кожны ў капаточку. *(Авёс)*

Длінней пана вусы. *(Ячмень)*

Прыйдзе восень — заб'ю лося: галаву з'ем, шкуру аблуплю, а мяса за плот выкіну. *(Лён)*

Білі мяне, білі, білі, калацілі, па полі цягалі, клоччамі ірвалі, на ключ запіралі і на стол саджалі. *(Лён)*

Косці на лагу, скура на таргу, а галава ў клеці. *(Каноплі)*

Чорная свінка мае тры спінкі. *(Грэчка)*

Сядзіць панна ў чырвоным кафтане. Як узялі разбіраць — сталі плакаць, наракаць. *(Цыбуля)*

Ляжыць грушка ў чырвоным кажушку. Хто яе ўкусіць, той плакаць мусіць. *(Цыбуля)*

Лата на лаце, ніткі не знаці. *(Капуста)*

Хата пуката, поўна вераб'ёў нагната. *(Гарбуз)*

Дзеўка ў каморы, а яе косы на дворы. *(Морква)*

Галава пляшывая, што ў ксяндза,— ды не ксёндз, барада калматая, што ў папа,— ды не поп. *(Рэпа)*

Была птушка брыкацён, віла гняздо за сем дзён, звіла гняздо за плотам, знесла яйцо за гняздом. *(Агурок)*

Поўна дзежачка круп, а наверсе струп. *(Мак)*

Пад адным брыльком семсот казакоў. *(Мак)*

Зранку ходзіць на чатырох нагах, удзень — на дзвюх, а ўвечары — на трох. *(Чалавек у розным узросце)*

Што любіш, таго не купіш, а чаго не любіш — не прадасці. *(Маладосць і старасць)*

Прыйшоў нехта, узяў нешта: ні яго дагнаць, ні ў яго адабраць. *(Смерць)*

За табою стаіць дуб, ніхто яго не абыдзе, ніхто яго не аб'едзе: ні цар, ні царыца, ні красна дзявіца. *(Смерць)*

Ляжыць калода пасярод балота: не гніе, не сохне. *(Язык)*

Каля прарубы стаяць белы галубы. *(Зубы)*

Цераз мяжу брат брата не бачаць. *(Вочы)*

Чатыры чатырнічкі: на кожным чатырнічку па пяць пяцернічкаў *(Рукі, ногі, пальцы)*

Дзве маткі маюць пяць сыноў, а кожны з іх аднаго імя. *(Рукі і пальцы)*

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся і ўсе з адным імем. *(Пальцы)*

Як родзіцца — у дудачкі грае, як вырасце — зямлю капае, як памрэ — дык у скокі ідзе, а ўсё не гуляе. *(Вол)*

Чатыры дзяды назад барадамі. *(Капыты)*

Каля бочкі качаюцца клубочкі. *(Парасяты каля свінкі)*

Па полі і лузе ходзіць у кажусе. *(Авечка)*

У цёмнай цямнушачцы сядзяць чарнушачкі і вяжуць вязаначкі — ні вузла, ні пяцелечкі. *(Пчолы)*

Выйшла панна з трасок, а на ёй сорак сарочак, а як вецер павее — гола цела віднее. *(Курыца)*

Ляцела пава, на белыя камені пала; камні разбіла — усіх мёртвых узбудзіла; мёртвыя ўсталі — у дудачкі зайгралі. *(Квактуха)*

Ані шпунта, ані дна, поўна бочачка віна. *(Яйцо)*

Ходзіць цар па гародзе, носіць два бліны ў барадзе, а трэці на галаве. *(Певень)*

На лапатах ходзіць, рогам траву есць. *(Гусь)*

Не кравец, а ўсё жыццё з іголкамі ходзіць. *(Вожык)*

Два разы нараджаецца, адзін раз памірае. *(Птушка)*

Даўжэй клеці зашчэпка. *(Сарока)*

Спераду шыльцы, ззаду вільцы, наверсе чорнае сукно, падысподам белае палатно. *(Ластаўка)*

Плача баба на ўвесь лес, а па ёй ніякі бес. *(Сава)*

Ва ўсіх дзетак адзенне з манетак. *(Рыба)*

На тым свеце жывы, а на гэтым мёртвы. *(Рыба)*

Ехаў не дарогай, сцёгаў не пугай, шыбаў не палку, злавіў не галку, шчыпаў не пер'е, еў не мяса. *(Рыба)*

Жывы — чорны, памрэ — чырвоны. *(Рак)*

Без станка і без рук, а кросны тчэ. *(Павук)*

Вісіць сіта, не рукамі звіта. *(Павуціна)*

Крыллі — арловы, хобат — слановы, грудзі — каніныя, ногі — ільвіныя, голас — медны, нос — жалезны, мы яго біць, а ён — нашу кроў ліць. *(Камар)*

Ляціць — вые, сядзе — зямлю рые. *(Жук)*

Семсот муляроў змуравалі царкву без вуглоў. *(Мурашкі)*

Лес сяку — лес вяне, на тым месцы горад стане. *(Сенакос)*

Тысячы брацікаў звязаны, адным поясам падпяразаны. *(Сноп)*

Ляжыць мужычок у залатым каптане, падпяразан, ды не поясам; сам устаць не можа, а людзі падымаюць. *(Сноп)*

Ляцяць гускі, дубовыя наскі, ляцяць і гавораць: «То-то я! То-то я!» *(Малацьба цапамі)*

Матка гладка, сыны-цакуны, дочкі-палізухі. *(Ток, цапы, мётлы)*

Бацька гарбаты, маці пляската, дзеці кручоныя, на суку павешаныя. *(Гумно, ток, цапы)*

Што ў вадзе сохне, а ў печы мокне? *(Воск)*

Баба Яга, віламі нага; увесь свет корміць, а сама галодная. *(Саха)*

Дзіравае радно ўсё поле збегла. *(Барана)*

Рыбка бялява хвосцікам віляла, лясы ламала, горы стаўляла. *(Каса)*

Бацька з сажань, матка з пядзень, а дзеткі па мязінцу. *(Граблі)*

Рота няма, а зубы маюцца. *(Граблі)*

Гарбаты дзядок усё поле аббегаў. *(Серп)*

Сам я тонак, як паясок, у мяне востранькі насок. Як выйду на поле ваяваці проціў высокенькіх панічоў у злаце, яны мяне паясаюць, а мае востранькія зубкі іх усіх перакусаюць. *(Серп)*

Аснова саснова, уток саламяны. *(Азярод)*

Хата рагата, вокан багата. Як узлезеш — не вылезеш. *(Рыбацкая сетка)*

Семсот варот, адзін уваход. *(Невад)*

Сама пад страхою, а хвост мокры. *(Кудзеля)*

Чым я больш вярчуся, тым я больш таўсцею. *(Верацяно)*

Пяць козак смокчуць стажок, а пяць у поле ідуць. *(Пальцы і кудзеля)*

Крыж на крыжы; хто ведае — не кажы. *(Клубок)*

Жоўценькі вепручоначак між загародак бегае. *(Чаўнок)*

Бегла свінка, залатая спінка, льняны хвосцік. *(Іголка)*

Б'юць мяне палкамі, пнуць мяне камнямі, рэжуць мяне нажамі. За тое мяне глумяць, за што мяне любяць. *(Хлеб)*

Жалезны ток, свінячы пераскок, аўсяная пасцель. *(Скаварада, падмазка і блін)*

У вадзе родзіцца, а вады баіцца. *(Соль)*

Вутка ў моры, а хвост на заборы. *(Апалонік)*

Худ канёк, а ўсё возера выпіў. *(Лыжка)*

Чатыры шчучкі, галоўкі ў кучцы, тулава па-рознаму. *(Сцены, вуглы)*

Сядзіць дзядок, на хату гарбок. *(Крук у сцяне)*

Маці таўстуха, дачка краснуха, а сын перабор выскачыў на двор. *(Печ, агонь, дым)*

Стаіць бычок, асмалены бачок. *(Засланка)*

Сізы Салівон пайшоў вон. *(Дым)*

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць, за пуп водзіць. *(Дзверы, вушакі і чалавек)*

Не брэша, не кусае, а ў хату не пускае. *(Замок)*

Поле шкляное, а межы дрывяныя. *(Акно)*

Чырвоны пеўнік па жэрдачцы сунецца. *(Агонь на лучыне)*

Сам голы, а сарочка за пазухай. *(Свечка)*

Пад адной страхой чатыры браты стаяць. *(Стол)*

Бабка-крываножка на золаце скача. *(Качарга)*

Быў я на капанцы, быў я на кружанцы, быў на пажары, быў на базары; малады быў — увесь свет карміў, а як стары стаў — пелянацца стаў; давялося ж паміраць — некаму касцей пахаваць. *(Гаршчок)*

За вушы два канцы дугі трымаюць мора берагі. *(Почапка вядра)*

Дзве галачкі сядзяць на адной палачцы. *(Каромысел і вёдры)*

Сам худ, а галава з пуд. *(Бязмен)*

У аднаго парсюка два лычы. *(Начоўкі)*

На той свет ідзе — скача, з таго свету ідзе — плача. *(Вядро ў студні)*

У лес ідзе — дамоў глядзіць, дамоў ідзе — у лес глядзіць. *(Сякера за поясам)*

Маленькі Данілка ў пяцельку ўдавіўся. *(Гузік)*

Сяджу на нагах, а хаджу на галаве. *(Цвік у ботах)*

Браты за братамі гоняцца, ды дагнаць не спаромяцца. *(Колы)*

Бягуць сычыкі, задраўшы лычыкі. *(Сані)*

Паўзулькі паўзуць, рагулькі вязуць, едуць пана калаціць, што на лузе стаіць. *(Сані)*

Еду, еду — ні дарогі, ні следу: конь без хваста, пуга без пасвіста. *(Лодка)*

Жывая жывулечка на жывым крэсле сядзіць і жывы абед абедае. *(Маці корміць дзіця)*

Сяло заселена, а пеўні не пяюць і людзі не ўстаюць. *(Могілкі)*

У лесе знята, да хаты ўзята, на руках плача, а не дзіця. *(Скрыпка)*

Хто з жывога і з мёртвага бярэ? *(Поп)*

Божжу хвалу за хвост цягаю: хвала крычыць, што хвост баліць. *(Звон)*

Хто ляціць без крылаў? *(Вецер)*

Што зімою камлём угору расце? *(Ледзяшы)*

Што без вады плавае? *(Воблака)*

Без чаго хлеб не спячэш? *(Без скарынкі)*

Хто гаворыць на усіх мовах? *(Язык)*

Без чаго чалавек не можа жыць? *(Без імя)*

Чаго нельга абнесці кругом хаты? *(Вады ў прыполе)*

На што каню хамут кладуць? *(На шыю)*

Які ў моры камень? *(Мокры)*

Пад якім кустом заяц сядзіць, як дождж ідзе? *(Пад мокрым)*

Без чаго хаты не пабудуеш? *(Без стуку)*

Чаму пастух пугу носіць? *(Бо сама не ходзіць)*

Што бывае пасля сямі гадоў? *(Восьмы год)*

Ляцела сарока, за ёю сорак. Колькі ляцела сарок? *(Дзве)*

Дзве дачкі, дзве маці і бабулька. Колькі ўсіх? *(Трое — бабка, маці і дачка)*

Ляцелі галкі, селі на палкі. Сядуць па адной — галка лішняя, сядуць па дзве — палка лішняя. Колькі было галак і колькі было палак? *(Тры палкі і чатыры галкі)*

Якая з'явілася новая зорка? *(Чырвонаармейская)*

Хто ўвесь век жыве маладым? *(Камсамол)*

# КАЗКІ

Важнае месца ў фальклорнай спадчыне беларускага народа належыць апавядальным жанрам — казкам, легендам, паданням, вусным сказам, анекдотам. Гэты разнастайны ў жанравых адносінах мастацкі матэрыял па характару мастацкай выдумкі, адносінах да рэчаіснасці і асаблівасцях яго адлюстравання ў розных творах можна падзяляць на тры групы. Да першай адносяцца казкі і анекдоты, да другой — легенды і паданні і да трэцяй — розныя віды вуснага народнага апавядання: вусныя сказы, успаміны і г. д.

Сярод апавядальных жанраў беларускай вуснапаэтычнай творчасці шырынёй ахопу жыццёвых з'яў, глыбінёй абагульнення, яркасцю створаных вобразаў вылучаюцца казкі. Тэрмін «казка» аб'ядноўвае розныя па форме і зместу апавядальныя творы: пра жывёл і птушак, пра фантастычных пачвар і непераможных асілкаў, пра кемлівага сялянскага сына Несцерку і ненажэрных крывасмокаў-паноў, пра хітруна-злодзея і служкаў культу, пра мудрую дзяўчыну і языкатую жонку і інш. Такая разнастайнасць матэрыялу вельмі ўскладняе задачу фалькларыстаў даць гранічна акрэсленае азначэнне гэтага жанру. Сярод розных, але ў асноўным блізкіх паміж сабой азначэнняў казкі, якія прыводзяцца ў навуковай літаратуры, найбольш прыдатным можна лічыць наступнае: казка — гэта мастацкае вуснае апавяданне сацыяльна-бытавога, фантастычнага або авантурна-навелістычнага зместу, якое адлюстроўвае рэчаіснасць пры дапамозе мастацкай выдумкі і заключае ў сабе дыдактычна-павучальны сэнс.

Казкі ўзніклі ў глыбокай старажытнасці і заўсёды былі непарыўна звязаны з шматгранным жыццём народа, яго барацьбой з сіламі прыроды, а ў класавым грамадстве — за роўнасць, сацыяльную справядлівасць. Казкі як творы сапраўднага мастацтва задавальнялі эстэтычныя запатрабаванні народа і ў той жа час былі важным сродкам пазнання навакольнага свету і абагульнення працоўнага вопыту многіх пакаленняў, а таксама сродкам выхавання.

Класіфікацыя казак даволі ўмоўная. Звычайна іх падзяляюць на казкі аб жывёлах, чарадзейныя або міфічныя і сацыяльна-бытавыя. Кожная з груп беларускіх казак вылучаецца сваімі асаблівасцямі зместу, сістэмай вобразаў, характэрнымі прыёмамі мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Усім ім уласціва высокае паэтычнае майстэрства. Беларускія казкі маюць шмат агульнага з казкамі іншых народаў, асабліва славян, але ў той жа час узбагачаюць казачны эпас славянскіх народаў новымі сюжэтамі, ідэямі, вобразамі.

Казкі аб жывёлах адрозніваюцца ад астатніх груп казачнага эпасу тым, што галоўнымі персанажамі ў іх з'яўляюцца жывёлы, птушкі і нават расліны: ліса, воўк, мядзведзь, заяц, дзік, кот, баран, певень і інш. Частка гэтых твораў узнікла вельмі даўно, калі чалавек быў амаль у поўнай залежнасці ад сіл прыроды і ў сваім уяўленні надзяляў жывёл, расліны, з'явы прыроды рознымі незвычайнымі якасцямі, а таксама некаторымі якасцямі людзей. У гэтых першых казках мы чуем, па словах М. Горкага, водгукі працы над прыручэннем жывёл, над адкрыццём лекавых траў, вынаходніцтвам прылад працы. Пазней, у класавым грамадстве, казкі аб жывёлах набылі новы змест. Разам з трапнымі назіраннямі над навакольнай прыродай у гэтых казках у алегарычнай форме правільна перададзены адносіны паміж людзьмі, асобныя рысы чалавечых характараў, выкрываюцца заганы грамадства, заснаванага на прыгнечанні чалавека чалавекам.

Чарадзейныя казкі таксама вельмі старажытныя па свайму паходжанню. За доўгі час бытавання ў народзе яны значна змяніліся, але захавалі вобразы міфічных асілкаў (Вярнідуб, Гарыня) і варожых сіл (шматгаловы змей — «Паганы цмок»). Разам з жывымі істотамі ў казках дзейнічаюць сонца, вецер, месяц, мароз, гром. Героям дапамагаюць цудадзейныя прадметы: тапор-самасек, дыван-самалёт, жывая вада, цудоўны збанок. У аснове многіх чарадзейных казак ляжыць сацыяльны канфлікт, які адлюстраваў спрадвечнае жаданне працоўных пазбавіцца ад эксплуатацыі. Характарам асноўнага канфлікта ў такіх творах абумоўлены некаторыя змены ў сістэме вобразаў: тут галоўнымі дзеючымі асобамі з'яўляюцца працоўныя сяляне і іх ворагі — паны.

Да сацыяльна-бытавых казак адносяцца ўласна бытавыя казкі, а таксама антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя творы. Уласна бытавыя казкі малююць селяніна ў яго паўсядзённым жыцці, услаўляюць працавітасць, глыбокі розум, дасціпнасць і сціпласць простага чалавека, асуджаюць гультайства, прагнасць, зайздрасць і іншыя заганы. Многія бытавыя казкі — гумарыстычныя, жартоўныя творы.

Антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі адлюстроўваюць барацьбу сялянства супраць сацыяльнага і рэлігійнага ўціску, рост іх класавай свядомасці. Працягваючы лепшыя традыцыі гераічнага эпасу, народ стварыў у іх каларытны вобраз народнага заступніка. Многія антыпрыгонніцкія і антырэлігійныя казкі — сатырычныя творы, яны выкрываюць сапраўдны твар прыгнятальнікаў-паноў і служкаў культу.

Па асаблівасцях адлюстравання рэчаіснасці, па характару мастацкай выдумкі да сацыяльна-бытавых казак набліжаюцца авантурна-навелістычныя. У шматлікіх варыянтах запісана на Беларусі вядомая многім народам свету авантурная казка. «Клімко» пра знаходлівага, кемлівага селяніна, які ўдала перамагае сваіх працiўнікаў і кпіць над імі, а таксама казкі аб верных і няверных жонках і іншыя падобныя творы.

У наш час казачная традыцыя паступова затухае, але многія казкі трывала захоўваюцца ў народным рэпертуары і па-ранейшаму выконваюць значную ролю ў выхаванні падрастаючага пакалення. У апошнія гады ў розных раёнах Беларусі было запісана шмат гэтых твораў, у асноўным казкі пра жывёл і чарадзейныя, якія карыстаюцца асаблівай увагай дзіцячай аудыторыі. Сучасныя запісы казак не толькі характарызуюць ступень распаўсюджання і захаванасці традыцыйных твораў, але, зробленыя з дапамогай гуказапісваючай апаратуры, даюць магчымасць данесці да чытача казку ў яе натуральным выглядзе, з усімі асаблівасцямі творчай манеры і паэтычнай мовы казачніка. Параўнанне класічных тэкстаў, запісаных у мінулым стагоддзі, з сучаснымі запісамі дапамагае вызначыць характар змен, што адбыліся ў змесце і мастацкіх асаблівасцях народных казак. У другое выданне хрэстаматыі ўключана некалькі казак, запісаных у апошнія гады ў час фальклорных экспедыцый Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

### Літаратура


*Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. 3. Витебск, 1887; вып. 4. Витебск, 1891; вып. 6. Могилев, 1901.

*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 2. Спб., 1893.

*Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej, t. 1. Kraków, 1897; t. 2. Kraków, 1902; t. 3. Kraków, 1903.

*Добровольский В. Н.* Смоленский этнографический сб[illegible] Спб., 1891.

*Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белору[illegible] Спб., 1911.

*Казкі* і легенды роднага краю. Рэдактар П. Ф. Глебка. [illegible], 1960.

*Казкі* пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мінск, 1971.

*Чарадзейныя* казкі, ч. 1. Мінск, 1973.

*Карский Е. Ф.* Белорусы, т. 3, ч. 1. М., 1916, с. 418—484.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967, с. 124—141.

*Кабашнікаў К. П.* Беларуская казка ў казачным эпасе славян. Мінск, 1968.

*Бараг Л.* Беларуская казка. Мінск, 1969.

*Новиков Н. В.* Образы восточнославянской волшебной сказки. Л., 1974.


## Лісічка-сястрычка і воўк

Была сабе ліска і вельмі галодная. Бяжыць яна дык бяжыць, аж едуць рыбаловы; яна прытаілася, лягла на зямлю і ляжыць. Тыя рыбаловы паглядзелі на ліску, і адзін, каторы ехаў ззаду, узяў тую ліску дый укінуў

у воз. Ліска, седзячы на возе, прагрызла дзіру і, выкідаўшы ўсю рыбу праз тую дзіру, сама выскачыла, пападбірала рыбу дый есць. Есць яна дык есць, аж прыходзіць воўк.

— Што ты, кумко-галубко, ясі?

— Рыбу, куме!

— Дай жа ж ты мне.

— Ото! Каб я табе давала! Пайдзі дый налаві!

— А дзе ж я буду лавіць, калі не ведаю дзе?

— Вот ідзі за мною, то я табе пакажу.

А тым часам дала ваўку адну рыбку, каб ён рассмакаваўся, і павяла яго.

Прыходзяць яны да аднаго возера замёрзлага. Ліска прабіла праломку дый кажа да ваўка:

— Усадзі свой хвост у гэту праломку, то набярэцца многа рыбы.

Воўк, паслухаўшы хітрай ліскі, усадзіў хвост у праломку і сядзіць. Лісіца, зрабіўшы тое, што хацела, зачала бегаць па возеры, крычаць:

— Мерзні, мерзні, кумаў хвост!

— Што гаворыш, кумко? — кажа воўк.

— Я кажу, каб бралася рыбка маленькая і вялікая!

Сядзеў воўк, сядзеў у праломцы, аж покі не прымёрз хвост.

Ліска, убачыўшы, што кумаў хвост прымёрз, пабегла ў сяло даць знаць, каб ваўка ішлі біць. Людзі, пачуўшы, што крычаць на ваўка, пабеглі зараз з кіямі, з булавамі біць ваўка. А кума пабегла ў хату, дзе мясілі хлеб, укачалася ў рашчыну, выбегла, села на стог дый сядзіць. А воўк, пачуўшы людзей, як зачаў рваццa, дый адарваў хвост і сам ледва ўцёк. Бяжыць ён дык бяжыць, аж бачыць, на стагу сядзіць ліска дый есць.

— Кумко-галубко, бачыш, якая ты благая! Ашукала мяне. Хоць за тое дай што есці.

— На, лізні раз,— сказала ліска дый пазволіла раз лізнуць.

Воўк, лізнуўшы, захацеў другі раз дый ізноў зачаў прасіць яшчэ.

— Не дам ужо больш, бо мне баліць, бо я ем свае мазгі; калі хочаш есці, разганіся галавой у сасну, разбі галаву дый ясі!

Той воўк ізноў паслухаў хітрай ліскі, пайшоў у лес дый як разагнаўся аб сасну галавой, дык і забіўся насмерць. Ліска, убачыўшы, што воўк забіўся, пайшла, з'ела ўсе мазгі ваўка дый схавалася ў нару.

### Каток, пеўнічак і лісічка

Былі сабе каток з пеўнічкам, зрабілі яны хатку. Коцік накарміў пеўнічка, а сам пайшоў на ўловы. Прыйшла лісічка і кажа:

— Пеўнічку, пеўнічку, адчыні мне!

Пеўнічак адчыніў, а лісічка ўхапіла яго і панесла да сваёй хаткі. А пеўнічак стаў крычаць:

Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па бору, па каменню,
Па ўсялякаму зеллю.



*Ю. Чарноў.* Казка

Коцік пачуў, прыбег, пеўнічка адабраў, прывёў да хаткі і сказаў яму:
— Глядзі ж, не слухай лісіцы, як яна прыдзе, бо я пайду далёка.
Коцік пайшоў, а лісічка зноў прыбегла і кажа:
— Пеўнічку, галубочку, адчыні мне! Я агню вазьму.
— Не адчыню, бо ты мяне ўхопіш.
— Не бойся, я не будуць хапаць.
Пеўнічак адчыніў, а лісічка ўхапіла яго і панесла да хаткі. Пеўнічак зноў крычыць:

Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па бору, па каменню,
Па ўсялякаму зеллю.

Коцік пачуў, прыбег, пеўнічка адабраў, набіў, прывёў да хаткі і сказаў:
— Ну, глядзі ж, больш не пускай яе ў хату, бо я пайду яшчэ далей.

Коцік пайшоў, а лісічка прыбегла і зноў гаворыць:

— Пеўнічку, галубочку, падай мне агню!

— Не падам, бо ты мяне ўхопіш.

— Не бойся, ну, падай праз дзірачку.

Пеўнічак падае, а лісічка хап яго і панесла да свае хаткі. Пеўнічак крычаў, крычаў — не пачуў коцік. А лісіца прынесла яго ў хатку і кажа сваім дочкам:

— Наварыце есці чэставаць госця.

Прыйшоў коцік, не бачыць пеўнічка. Зрабіў ён скрыпачку і стальную пушку, пайшоў, сеў над нарою і стаў граць:

А ў ліскі,
А ў ліскі
Новы двор,
Трое дочак,
Трое дочак,
На выбор,
Чацвёрты пеўнічак,
То-то мой!

— Ах, матка, як хтосьці хораша грае, пойдзем паглядзім.

Выйшлі дочкі паглядзець, а коцік з пушкі па іх — і забіў, каля сябе палажыў і зноў грае.

А лісіца кажа:

— Што гэта яны не ідуць есці?

Узяла дубца, выйшла, а коцік і яе забіў. І сталі яны з пеўнікам жыць у лісіцы ў хаце.

## Дзедава рукавічка

Жыў дзед з бабай. Паехаў дзед у лес і згубіў рукавічку. Прыскакала да рукавічкі лягушка і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

Ніхто не адгукаецца. Яна залезла ў рукавічку і стала жыць.

Трохі пагадзя паўзе рак. Прыпоўз да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

А лягушка гаворыць:

— Сама паня-пацягуня. А ты хто?

— А я рак-тарабун. Ці можна мне?

— Лезь!

Трохі пагадзя бяжыць зайчык. Прыбег да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня і рак-тарабун. А ты хто?

— А я па бярэзнічку прыгун. Палезу і я к вам?

— Лезь!

Трохі пагадзя бяжыць лісіца.

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун ды па бярэзнічку прыгун. А ты хто?

— А я лісіца, добрая маладзіца. Палезу і я к вам?

— Лезь!

Лісіца ўлезла і сядзіць. Трохі пагадзя ідзе воўк.

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун, па бярэзнічку прыгун і лісіца, добрая маладзіца. А ты хто?

— А я з-за куста хапун. І я палезу к вам?

— Лезь!

Улез і воўк. Трохі пагадзя сунецца мядзведзь. Падышоў да рукавічкі і пытаецца:

— Хто ў гэтай рукавічцы жыве?

— Сама паня-пацягуня, рак-тарабун, па бярэзнічку прыгун, лісіца, добрая маладзіца, ды з-за куста хапун. А ты хто?

— А я зверху прыціскун. Пусціце мяне к сабе!

— Не, ужо няма куды.

— Ну, я зверху сяду!

Узлез наверх, як ціскануў, так звяры і разбегліся ўсе.

## Зайчык і вожык

Быў зайчык. Ішоў ён у гарох, сустрэў вожыка і насмяяўся зайчык з вожыка:

— Куды ты, крывалапы, ідзеш?

Так вожык зазлаваўся на яго:

— Што гэта такое, што ты мяне назваў крывалапым?

Так кажа:

— Пойдзем мы навыперадкі!

Прыйшоў да дому вожык, да свае жонкі, кажа так:

— Ідзі ў тым і тым месцы стань.

А прыйшоў да таго зайца:

— Ну пойдзем навыперадкі ў такое і такое месца.

Так жонка стаіць вожыкава, а тут вожык стаіць сам з зайцам, і гаворыць яму:

— Пойдзем навыперадкі.

Той зайчык палажыў вушкі на плячах і кажа:

— Раз, два! — і пайшоў. Знайшоў, стаіць там жонка, а ён гэта думаў, што вожык сам прыляцеў, так зноў кажа вожык:

— Пойдзем яшчэ раз.

Так палажыў зайчык вушкі на плячах:

— Раз, два! — прылятае назад, застаў вожыка там. Так кажа:

— Пойдзем яшчэ раз.

Ужо не верыць заяц вожыку, што гэта ён яго выперадзіў, пойдзем яшчэ раз. Палажыў зайчык вушкі:

— Раз, два! — прыляцеў трэці раз й упаў.

Так вожык кажа:

— Хоць твае ногі даўгія, а мае кароткія, я цябе звеў такі з свету.

## Мужык, воўк і ліса

Быў сабе гаспадар і пайшоў гараць. Гарэ ён, дак гарэ, аж прыходзіць воўк.

— Чаго ты прыйшоў, воўча? — кажа гаспадар.

— Прыйшоў твае валы з'есці,— кажа воўк.

— Мой ты добранькі, мой ты галубок, пачакай хаця, пакуль я дагару, а пасля сабе з'ясі.

— Добра,— кажа воўк і пайшоў пад воз і там лёг.

Чалавек той гарэ і плача, аж прыходзіць ліска.

— Чаго ты плачаш, чалавеча? — кажа яму ліска.

— Я плачу таго, што прыйшоў да мяне воўк і хоча валы з'есці.

— Ну, калі дасі мне мех курэй, то праганю воўка.

— Добра,— кажа гаспадар.

Ліска пабегла на гару і крычыць:

— Тру-ру-ру-ру! Малады князь палюе! Што ў цябе, чалавеча, пад возам ляжыць?

Чалавек адказвае:

— Калода, пане, калода!

— Каб калода была, то на возе ляжала б.

Воўк як пачуў, як зачне прасіць чалавека, каб узлажыў яго на воз. Чалавек узлажыў воўка на воз і зачаў гараць. І зноў тая ліска пабегла на другую гару і зноў крычыць:

— Тру-ру-ру-ру! Малады князь палюе! Што ў цябе, чалавеча, на возе ляжыць?

— Калода, пане,— адказаў мужык.

— Каб калода была, то ўвязана была б.

Воўк зноў папрасіў чалавека, каб увязаў; і той чалавек, узяўшы вяроўку, так увязаў воўка, што ён пакруціцца не змог.

Лісіца зноў пабегла на трэцюю гару і таксама крычыць:

— Тру-ру-ру-ру! Малады князь палюе! Што ў цябе, чалавеча, на возе ляжыць?

Мужык таксама адказвае:

— Калода, пане!

— Каб калода была, то сякера ўрублена ў ёй была бы.

Воўк, пачуўшы гэтыя словы, пачаў прасіць чалавека, каб дзе сякеру

прычапіў, каб яна стырчала. Чалавек, узняўшы сякеру, прыйшоў да воза дый як рубне ў галаву воўка, дак яго і забіў насмерць.

А лісіца, убачыўшы гэта, прыбегла да таго мужыка і кажа:

— Я цябе абараніла ад воўка, прынясі ж мне мех курэй.

— Добра! — кажа чалавек ды, узяўшы таго забітага воўка, пайшоў дадому. Зняўшы шкуру з воўка, улажыў у мяшок заместа курэй двух сабак Серку і Берку і пайшоў у поле да лiскі, дзе яна яго чакала. Прыйшоўшы туды, ён палажыў мяшок на зямлю і кажа да лiскі:

— Ты раскарачся добра, каб магла палавіць усе куры, а я іх выпушчу.

Ліска раскарачылася, як той чалавек казаў, і чакае, пакуль ён выпусціць куры. А чалавек, развязаўшы мяшок, як выпусціць сабак, а тыя сабакі як зачнуць рваць ліску.

Ліска ледзьве вырабілася ад сабак і прыбегла да нары і пытаецца ў сваіх вачэй:

— Што вы думалі, як мяне рвалі сабакі?

— Мы думалі,— кажуць вочы,— каб як прэндзай уцячы да норкі.

— А вы, лапкі?

— І мы тое самае думалі.

— А ты, хвасцішча-дурнішча, што думаў?

— Я думаў, каб як найпрэндзай цябе злавілі і задушылі.

— Ах ты, хвасцішча! Аддам цябе сабакам!

Дый вылезла з норкі:

— На,— кажа,— Серка, Берка! На хвост!

Тыя сабакі парвалі ліскін хвост дый адарвалі. Ліска ўжо са злосці да мужыка лаіць — нашто ашукаў.

Бяжыць яна, дак бачыць: аж штось гудзе. Падбягае, аж дзюравы збан з ветрам.

— Ах ты, шэльма, пане збане! І ты страшыш! — кажа лісіца дый узяла зачапіла почапку на шыю дый панесла тапіць. Прыходзіць да ракі, усадзіла збан дый топіць. У той збан як налілося вады, дак той збан зачаў тапіцца і павалок за сабою ліску.

А той мужык гэта ўсё бачыў: пайшоў да ракі, выцягнуў ліску, абдзёр скуру дый прадаў.

### Лісічка-сястрычка, заяц, воўк і мядзведзь

Жыў дзед ды баба. У дзеда быў петушок, а ў бабы курка-рабушка. Пайшлі яны на шуметнічак. Петушок дзедаў капаўся, капаўся на шуметнічку і выкапаў бабінку. Курка бабіна капалася, капалася і выкапала гарошынку. Паняслі яны гэта дабро ў двор. Петушок сваю бабіну аддаў дзеду, а курачка сваю гарошыну — бабе.

Баба кажаць дзеду:

— Пасеем гэтыя зерні!

12 Зак. 3328

А дзед кажаць:

— Не, баба, трэба іх змалоць і спячы к святу піражок.

Ну і спяклі яны піражок. Баба палажыла яго на вакно, каб ён прастыў, і ўнучцы кажаць:

— Пілнуй, унучка!

Піражок ляжаў, ляжаў на вакне ды скок на стол!

— Пілнуй, унучка!

А ён, паляжаўшы, скок на лаўку!

— Пілнуй, унучка!

Скок на зямлю!

— Пілнуй, унучка!

Скок за парог!

— Пілнуй, унучка!

Скок за парог, і пакаціўся па дарозе...

Увідзеў яго заяц, гнаўся, гнаўся, а піражок кажаць:

— Я ад бабы ўцёк, я ад дзеда ўцёк, ад унучкі ўцёк, ад цябе ўцяку!

І не дагнаў заяц піражка.

Увідзеў яго воўк, гнаўся, гнаўся, а піражок кажаць:

— Я ад бабы ўцёк, я ад дзеда ўцёк, ад унучкі ўцёк, ад зайца ўцёк і ад цябе ўцяку!

І пакаціўся. Увідзеў яго мядзведзь і пагнаўся. Гнаўся, гнаўся, а піражок кажаць:

— Я ад бабы ўцёк, я ад дзеда ўцёк, ад унучкі ўцёк, ад зайца ўцёк, ад ваўка ўцёк і ад цябе ўцяку!

І ўцёк ад мядзведзя.

Напаследак увідзела яго лісіца і пабегла за ім.

Ён і той пачаў казаць:

— Я ад бабы ўцёк, я ад дзеда ўцёк, ад унучкі ўцёк, ад зайца ўцёк, ад ваўка ўцёк, ад мядзведзя ўцёк, ад цябе пагатові ўцяку!

А лісіца кажаць:

— Ай, піражок! Як твая песня прыгожа! Але тое жаль, што я не чую, бо ўжо стара. Спой яшчэ!

Піражок толькі стаў пець, а яна падбегла ды і ўхваціла. Ды ўзяла мякіш выела, а на места мякішу паклала туды пяску з граззю. Тады пайшла сабе далей. Ідзець, аж пастухі пасуць статак. Прыйшла яна к пастухам ды гаворыць ім:

— Пастушкі, пастушкі, вы мне дайце бычка-трацячка, а я вам аддам піражок.

Пастухі далі лісіцы бычка-трацячка, а лісіца пастухам аддала піражок. Аддала пастухам піражок ды і гаворыць ім:

— Не ешце яго, пакуль я з бычком зайду за гару!

Пастухі так і здзелалі. А лісіца як толькі зайшла за гару, дык скарэй і павяла бычка-трацячка ў барок. Прыйшла ў барок ды і давай сабе сані сеч, сячэць і прыгаварыець:

— Сяку, сяку раз! Сяку, сяку два! Сяку, сяку тры! Сяку, сяку чатыры! Сяку, сяку пяць! Сяку, сяку шэсць! Сяку, сяку сем! Сяку, сяку восем! Сяку, сяку дзевяць! Сяку, сяку дзесяць!

І высекла сані.

Запрагла ў сані свайго бычка-трацячка ды паехала.

Едзець, едзець, ажно бяжыць заяц:

— Лісічка-сястрычка, паеду і я з табою?

— Ах ты, касы заяц! Ці ты не відзіш, што мой конь плошанькі, сані мае плошанькія і сама я еду? Ну, але едзь сабе! Садзіся на сані!

Паехалі яны ўдваіх. Едуць, едуць, аж бяжыць воўк:

— Кумка-галубка! Пусці мяне на саначкі!

— Ах ты, ваўчышча-дурнішча! Ці ты не відзіш гэтага, што мой канёк плошанькі, сані мае плахія і мы ўдваіх едзем? А ты яшчэ просішся ў мяне ехаць! Ну, але едзь сабе! Садзіся на сані!

Паехалі яны ўтраіх. Едуць, едуць, аж бяжыць мядзведзь:

— Кумка-галубка, паеду і я з табою?

— Ах ты, мішка касалапы! Ці ты не ведаеш, што мой конь плошанькі, сані мае плахія і мы так ужо ўтраіх едзем? А ты яшчэ просішся са мной ехаць! Ну, але едзь сабе! Садзіся на сані!

І паехалі яны ўчацвярых. Едуць, едуць, аж бяжыць ліс:

— Лісічка-сястрычка, паеду і я з табой?

— Ці ты не відзіш, што мы і так едзем учацвярых? А конь мой плох, сані мае плахія. Каб яшчэ не паламаліся, як ты паедзеш? Ну, але едзь сабе, што дзелаць! Садзіся на сані!

І паехалі яны ўпяцярых. Ехалі, ехалі, ажно сані трэсь! і паламаліся. Яны ўсе і пазваліваліся далоў. Упала лісіца і давай сварыцца:

— А што, ці я не казала: мае сані плахія, каб не паламаліся! Ажно так і ёсць! А ўсе вы вінаваты. Панасядала поўны сані!.. Ну, але што дзелаць! Нада думаць ды гадаць, як бы бяду папраўляць!.. Ну, але што тут доўга думаць? Трэба зайцу ісці сані высякаць, бо ён першы прасіўся ехаць!

Пайшоў заяц у лес сані высякаць. Сек, сек, як прынёс, дык адну розку бярозавую!

Як пачала ж лісіца на зайца сварыцца:

— Табе, касы заяц, нейдзе і лесу не было! Ідзі, ты, воўк, сані сячы: ты сеў услед за зайцам!

Пайшоў воўк у лес сані высякаць. Хадзіў ён, хадзіў па лесу, пакуль знайшоў-такі карчошку. Ён узяў і прыносіць яе лісіцы. Як пачала лісіца на яго сварыцца:

— А ты, ваўчышча ты, дурнішча ты! Табе і лесу не было! Якія гэта сані? Ідзі ты, мядзведзь, сані высячы!

Пайшоў мядзведзь у лес сані высякаць. Вот ён як ішоў, так і вырваў ёлку і валачэць яе к лісіцы. Як прывалок ён к лісіцы, як пачала яго лісіца ругаць:

— Ах ты, мішка касалапы! Якія ж гэта сані?.. Ідзі ты, ліс, сані высячы!

Пайшоў ліс у лес сані высякаць. Хадзіў ён, хадзіў, сек, сек і высек ды палку альховую. Як толькі прынёс ліс палку альховую, лісіца давай на яго крычаць:

— Ці табе лесу не было? Ну, сам ты паглядзі: якія ж гэта сані?

Прыходзіцца самой ісці сані высякаць!

Пайшла лісіца ў лес высякаць.

Прыйшла ды гаворыць:

— Сяку, сяку раз! Сяку, сяку два! Сяку, сяку тры! Сяку, сяку чатыры! Сяку, сяку пяць! Сяку, сяку шэсць! Сяку, сяку сем! Сяку, сяку восем! сяку, сяку дзевяць! Сяку, сяку дзесяць!

І высекла сані. Ну, а пакуль яна секла, заяц, воўк, мядзведзь і ліс былі каля бычка-трацячка. Стаялі яны, стаялі, потым узялі ды кішкі ў бычка-трацячка і выпусцілі з сярэдзіны і паелі. А тады ўзялі ды саломай яго напхнулі і падперлі колічкам, каб не паваліўся. Аж прывозіць лісіца саначкі. Запрэгла ў іх бычка-трацячка ды кажаць:

— Ну, садзіцеся, паедзем!

Селі яны на саначкі. Лісіца стала паганяць:

— Но, бычок-трацячок! Но!

А бычок-трацячок а ні з места. Крычала яна, крычала, нокала, нокала, нічога не здзелала! Вось яна і гаворыць зайцу:

— Злезь ты, косенькі заінька, падгані бычка-трацячка.

Заяц, злезшы з санак, пайшоў наперад ды давай крычаць:

— Но! Но!

Нокаў, нокаў, крычаў, крычаў, нічога не здзелаў, не падагнаў каня! Пайшоў тады падганяць каня воўк. Ён таксама нокаў, нокаў — не падагнаў каня. За ваўком пайшоў падганяць мядзведзь касалапы.

Той таксама нокаў, нокаў — не падагнаў каня. Пайшоў за мядзведзем ліс — і той не падагнаў каня. Злезла тады з саначак сама лісіца. Падышла яна к бычку-трацячку ды давай зноў нокаць!

Нокала, нокала — нічога не здзелала. Калі яна глядзіць — аж у бычка-трацячка з боку саломіна тырчыць. Ухвацілася яна за гэту саломіну ды пацягнула, бычок-трацячок той час і зваліўся! Паглядзела яна: аж яе канёк бычок-трацячок саломай напхнуты. Дагадалася яна, што гэта здзелалі так заяц, воўк, мядзведзь і ліс і задумала яна іх са свету страціць.

Пайшлі яны далей. Ішлі, ішлі, прывяла іх лісіца к рацэ. Не знаюць яны, як перайсці ім раку. Лісіца тады і гаворыць зайцу:

— Зайчык, ты лёгенькі мальчык: табе перваму пераходзіць!

Заяц, не спорыўшы, і паплыў цераз раку. Плыў, плыў ды і ўтапіўся. Тады стаў пераходзіць раку воўк. Распусціў ён свае лапы і перайшоў. За ваўком трэба пераходзіць мядзведзю. Плыў ён, плыў ды і ўтапіўся. Стаў пераходзіць ліс, і той утапіўся.

Пасля ўсіх стала пераходзіць раку лісіца. Яна січас распусціла свой доўгі хвост — і пераплыла раку.

Стала яна тады думаць, як бы тут страціць са свету ваўка. Але надумалася-такі: падружылася з ім і пакумілась не ў кага.

Вот раз у дождж воўк хадзіў, хадзіў ды пазяб. Ідзець дарогай па лесу і трасецца. Ажно ідзець лісіца. Рад воўк стаў, што ўбачыўся з лісіцай:

— Здарова ты, кумачка?

— Здарова, кумок!

— Ах, каб ты ведала, як я пазяб! Вот ужо трэці дзень, як ішчу краўца, каб ён мне пашыў армячок або кажушок, а то цяпер дужа сцюдзёна! Але во няма нідзе краўца!

— Во, кумочак! Я табе пашыю кажушок, дай толькі і толькі мне авец.

— Ну, добра, кумачка! Я табе прынясу сколькі ты хочаш авец!

— Ну, а я тут у ельніку пасяджу, а ты, брат, скарэй нясі, а то, бываець, хто-небудзь памяшаець нам!

Воўк пабег скарэй к пастухам. Падкраўся, падкраўся, такі ўкраў найлучшую авечку ды прынёс к лісіцы. Лісіца січас тут стала мерку знімаць:

— Ай, кумочак, яшчэ ж многа трэба. Бяжы яшчэ прынясі авечку. Шыць дык шыць кажух ладны!..

Воўк пабег яшчэ авечку красці, а лісіца скоранька аўцу аблупіла, скуру павесіла сушыць, а мяса скарэй у сваю нару занесла ды прыбягаець і кроіць.

Ажно воўк нясець і другую аўцу. Лісіца і з гэтай таксама здзелала, а воўка паслала яшчэ авец насіць. Насіў, насіў ён, пакуль лісіца наклала поўныя норы мяса. Тады яна стала шыць ваўку кажушок. Пашыць пашыла, толькі не сыршыла. Як прынёс воўк паследнюю авечку, лісіца яму і кажаць:

— Ну, кумочак, я ўжо кажух пашыла, толькі яшчэ не сыршыла. А ты, кумочак, ідзі ды выбяры найлепшага каня... Але ты доўга будзеш іскаць таго каня; хадзі-тка, лучша я табе пакажу!

Воўк і пайшоў за лісіцай.

А лісіца завяла яго ў хульварак, у панскі сад. У тым садзе навязан быў найлепшы панскі конь. Як прыйшлі яны ў сад, лісіца і кажаць ваўку:

— Я цябе навучу, як прывесці гэтага каня, бо ён дужа здаровы. Ты вазьмі яго за вяроўку ды канец вяроўкі закруці на шыю сабе, а то ён бываець вырвецца ў цябе. А я табе буду яго падганяць.

Воўк так і здзелаў: ён узяў вяроўку, закруціў каля шыі ды і завязаў. Тады лісіца як распусціць свой доўгі хвост ды як кінецца к каню... А конь як спужаецца ды як пабяжыць спуду па полю, ды як павалачэць ваўка! А лісіца бяжыць ззаду ды крычыць:

— Упірайся, кумочак, у мяжу, упірайся!

Воўк паслухаў лісіцы ды ўпёрся ў мяжу. Конь як пабег, дык яго і задушыў.

Лісіца гэтым была дужа рада: яна толькі гэтага і хацела. Пабегла яна тады ў свае норы мяса ўплятаць, і доўгае ўрэмя яна ела. Паеўшы ўсё, яна зноў на раздабыткі, ды тут і сама галавой налажыла.

## Ліса-каталічка

Ішла сабе ліса, знайшла падсмажанае мяса ў пастцы. Дагадалася яна, што гэта яе хочуць злавіць. І не дакранулася да мяса. Пайшла яна далей, сустракае мядзведзя:

— Кумок-галубок, ці снедаў ты сёння?

— Не, кумка-галубка, не прыйшлося.

— Ну, пойдзем, я цябе завяду ў адно месца — слаўнае снеданне будзе! Сама б з'ела, ды сёння серада — мне нельга есці: я каталічка.

— Спасіба, кумка-галубка, пойдзем!

Вось ліса падвяла мядзведзя к гэтаму мясу. Як толькі ён дакрануўся, так яго абхваціла пастка і падняла ўгару. Лісіца ўзяла тады мяса ды й есць. А мядзведзь ёй:

— Кумка-галубка, табе ж серада.

— Э, кумок-галубок, няхай той серадзіць, хто ўгару глядзіць.

## Воўк, лісіца і аўца

Ганяў пастух авечак, і адбілася адна аўца ад стада. Засталася яна зімаваць у лузе. Прыходзіць да яе лісіца, сястра Мар'яна:

— Здарова, сястра Малання! Чаго ты тут засталася?

— Што засталася? Не знаю хазяіна.

— Я цябе, сястра Малання, выведу на вясну і к хазяіну завяду!

Сталі Малання з Мар'янай хадзіць разам: Малання сена есць каля стога, а Мар'яна мышэй капае.

Прыходзіць да іх воўк Мірон і кажа:

— Здароў, сястра Мар'яна! Што ты водзіш за сабой сястру Маланню?

А лісіца адказвае:

— Я Маланню выкармлю, на вясну выведу і к хазяіну завяду!

— І я буду за вамі хадзіць!

— У цябе, брат Мірон, паганыя мыслі.

— Ды не, сястра Мар'яна!

Цяпер яны ўтраіх хадзілі: лісіца мышэй капае, авечка сена есць, а воўк так ходзіць, як стоўб.

Аднойчы воўк Мірон кажа:

— Ляжам спаць!

Вот яны ляглі пад стагом, і сама Мар'яна лягла пасярод. Паляжалі яны, паляжалі, тады Мірон устае. А Мар'яна і пытае:

— Чаго ты, брат Мірон, устаеш?

— Холадна, сястра Мар'яна: хачу паўшубак садраць з сястры Маланні!

— Эх, брат Мірон! У цябе грахоў многа: дай павяду ўперад к споведзі!

Павяла яна ваўка к споведзі. Ведала яна, дзе зялезы стаялі. Прывяла к зялезам і кажа:

— Адбівай, брат Мірон, паклоны!

Воўк як пакланіўся,— зялезы і ўхвацілі яго.

Тады воўк пытаецца:

— Што гэта будзе, сястра Мар'яна?

— А вот, прыдзе поп з касой, дзяк з свячой і паламар — будзе свечы паліць!

Стала віднець. Ідуць глядзець зялезы. Воўк і пытаецца:

— Хто гэта ідзе?

А Мар'яна адказвае:

— Поп з касой, дзяк з свячой і паламар.

— Што ж яны будуць рабіць?

— Спавядаць цябе будуць.

Адзін прыйшоў з ружжом ды — бах! а другі колікам — і канец таму ваўку. Тады лісіца кажа:

— Кадуцы цябе бяры! Жыў ты не ў совесці!

Ды і пайшла.

Пракарміла сястра Мар'яна сястру Маланню зіму. На вясну выйшла ў поле, завяла яе к хазяіну і ўпусціла ў авечкі к пастуху.

## Вайна ваўка з сабакам

Жыў-быў багаты мужык. У яго быў добры сабака. Ён вельмі яго любіў, а як той сабака зусім пастарэў, то ён ужо і не даваў яму есці.

Жанкі гэтае хаты пайшлі жаць жыта і ўзялі з сабою малое дзіцятка. За імі ішоў стары сабака. Жанкі прыйшлі на поле, павесілі калыску і ўлажылі туды дзіцятка, а сабаку прагналі, каб ён не паеў іх хлеба. Сабака з гора адышоў і лёг пад кустом. Прыходзіць да яго шэры воўк і пытае:

— Што ты ляжыш?

— Адступіся, пракляты! Што ты лезеш ка мне ў вочы? Ты наеўся, а я яшчэ нічога не еў.

Воўк кажа яму:

— Дурань ты! Вот я цябе навучу! Я пайду і схвачу дзіця, а ты бяжы за мною, гаўкай і кусай мяне за лыткі.

Так ён і зрабіў. Жанкі як пачулі, што сабака гаўкае, азірнуліся назад і ўбачылі, што воўк панёс дзіця, а сабака адбірае. Яны прыбеглі і адабралі дзіця. І з гэтых пор сталі зноў даваць сабаку есці.

А хлопчык гэты расце ды расце не па гадах — па гадзінах, і дарос да васемнаццаці год, і бацька засватаў яго. У гэту самую пару прыйшоў той воўк пад гумно, каб пажывіцца. Сабака пачуў ваўка і стаў гаўкаць.

Воўк і кажа:

— Я ж табе даў хлеба, а ты мяне праганяеш!

— А, гэта ты, брат? — пытае сабака.

— Я.

— Ну, прыдзі ты, брат, к нам за дзве нядзелі: у нас будзе вяселле, і я цябе пачастую.

Настала вяселле. Сабака п'е, гуляе і забыўся аб сваім браце, а пасля падумаў:

— У мяне ж ёсць брат. Пайду пагляджу яго.

Выйшаў, глядзіць, а воўк ляжыць за гумном.

Сабака яму кажа:

— Што ты ляжыш тут? Пойдзем у хату!

— Як жа ты ўвядзеш мяне ў хату?

— Не бойся, пойдзем.

Прыходзяць яны к сенцам. Сабака і кажа:

— Ты пастой, а я ўпярод схаджу ў хату.

Сабака ўвайшоў у хату, мельнуў хвастом па лучыне, патушыў яе, пабег і сказаў ваўку:

— Бяжы борзда ў хату і лезь пад стол.

Сабака добра накарміў і напаіў ваўка. І ляжаць сабе абодва пад сталом. Зачалі каравайніцы спяваць:

У нашага гаспадара
Кудравая галава,
Ён кудзёркамі патрасе
І нам гарэлкі паднясе...

Сабака ляжыць сабе ціхенька — нічога, а воўк:

— Я, брат, не вытрываю, заспяваю па-свойму.

— Маўчы! Бо будзе табе і мне!

Другі раз каравайніцы заспявалі:

У нашага свата
Пабелена хата;
Печ яго кахляна,
Чэсць яго кахана...

Воўк зноў кажа сабаку:

— Не вытрываю...

І зачаў спяваць па-свойму. Людзі пазналі, што гэта воўк, і ўхваціліся хто за качаргу, хто за чапялу і зачалі біць ваўка і сабаку. Білі-білі і выгналі абаіх вон.

Воўк кажа сабаку:

— Я табе гэтага не дарую! Ты мяне добра ўгасціў.

А сабака яму:

— А чаго ты крычаў? Я табе казаў: «Маўчы!»

— Я на цябе пайду вайною і будзем з табою ваяваць пад хваінаю. Ты вазьмі сабе на помач трох, і я сабе трох.

Воўк узяў сабе дзікага вепрука, мядзведзя і льва, а сабака — качара, пеўня і ката. Воўк прыйшоў на месца напярод і чакаў іх гадзіны тры. Потым кажа мядзведзю:

— Лезь ты на дрэва і паглядзі, можа ўжо ідуць.

Мядзведь узлез і глядзіць.

Яго пытаюцца:

— Ці ідуць?

— Ідуць, браце.

Воўк кажа яму:

— Ну, злезь!

— Не злезу, страшна!

— І што там такі за страх, хто ж там ідзе?

— Адзін,— кажа,— з пікаю, а другі нясе дзве шаблі, а трэці ўсё кажа: «Таму так будзе, і таму так будзе!»

Дзік зарыўся ў мох.

Прыходзіць сабака з сваім войскам — і пачаў ваяваць. Зайшоў кот ззаду і хваць дзіка за хвост. Дзік і схваціўся.

А певень спалохаўся, падляцеў угару і закрычаў: «Кудах-кудах!» А мядзведзь думаў, што кажуць «падай-падай!»,— і проста з гэтага дзерава зваліўся на зямлю. Глядзіць леў, што мядзведзь і дзік ужо ўцяклі,— і ён кінуўся за імі. Застаўся воўк адзін.

З гэтай пары яны сталі жыць добра, мірна.

## Сачыўка

Жыў дзед і баба. Былі яны бедныя, мала ў іх было зямлі. Вось аднойчы вясной кажа баба дзеду:

— Дзед, дзед, узары ты лапічак жарствянкі, ды пасей сачыўку, можа і ў нас трохі дабра будзіць.

Дзед узараў той лабячок камяністай, пясчанай ды жарствяной зямелькі, пасеіў жменьку сачыўкі. Добрая вырасла сачыўка, выспела. Скасіў дзед сачыўку, змалаціў цэпам, пераваеіў. Сталі дзед з бабай сачыўку ў мех сыпаць — сачыўка ў мех ня лезе, дзеду з бабай бяда!

Сталі яны мышэй прасіць:

— Мышы, мышы, ідзіце сачыўку тачыць!

Мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны ката клікаць:

— Кот, кот, ідзі мышэй лавіць!

Кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны сабаку цкаваць:

— Сабака, сабака, ідзі ката ганяць!

Сабака ня йдзе ката ганяць, кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны воўка прасіць:

— Воўк, воўк, ідзі сабаку пужаць!

Воўк ня йдзе сабаку пужаць, сабака ня йдзе ката ганяць, кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны стральца прасіць:

— Стралец, стралец, ідзі ваўка страляць!

Стралец ня йдзе ваўка страляць, воўк ня йдзе сабаку пужаць, сабака ня йдзе ката ганяць, кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны лазу прасіць:

— Лаза, лаза, ідзі стральца біць!

Лаза ня йдзе стральца біць, стралец ня йдзе ваўка страляць, воўк ня йдзе сабаку пужаць, сабака ня йдзе ката ганяць, кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны казу прасіць:

— Каза, каза, ідзі лазу есці!

Каза ня йдзе лазу есці, лаза ня йдзе стральца біць, стралец ня йдзе ваўка страляць, воўк ня йдзе сабаку пужаць, сабака ня йдзе ката ганяць, кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны доўбню прасіць:

— Доўбня, доўбня, ідзі казу біць!

Доўбня ня йдзе казу біць, каза ня йдзе лазу есці, лаза ня йдзе стральца біць, стралец ня йдзе ваўка страляць, воўк ня йдзе сабаку пужаць, сабака ня йдзе ката ганяць, кот ня йдзе мышэй лавіць, мышы ня йдуць сачыўку тачыць, сачыўка ў мех ня лезе — дзеду з бабай бяда!

Сталі яны чарвей прасіць:

— Чэрві, чэрві, ідзіце доўбню тачыць!

Як пайшлі чэрві доўбню тачыць, як пайшла доўбня казу біць, як пайшла каза лазу есці, як пайшла лаза стральца біць, як пайшоў стралец ваўка страляць, як пайшоў воўк сабаку пужаць, як пайшоў сабака ката ганяць, як пайшоў кот мышэй лавіць, як пайшлі мышы сачыўку тачыць, з'елі ўсю сачыўку — дзеду з бабай бяда!

## Курка-рабушка

Быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць...

Ідзе воўк:

— Дзедка, чаго вы плачаце?

— Як жа нам не плакаць: жылі сабе мы з бабкай, была ў нас курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Я біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць... І воўк завыў.

Ідзе мядзведзь:

— Чаго ты, воўча, выеш?

— Як жа мне не выць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць — і я, воўк, выю.

І мядзведзь зароў.

Ідзе лось:

— Чаго ты, мядзведзь, раве́ш?

— Як жа мне не равець: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў — і я, мядзведзь, зароў.

І лось рогі паскідаў. Прыйшоў лось да калодзезя: папова чалядка ваду бярэ.

— Чаго ты, лось, свае рогі паскідаў?

— Як жа мне не скідаць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў, мядзведзь зароў — і я, лось, рогі паскідаў.

І чалядка вёдры пабіла, каромысел паламала і заплакала.

Ідзе дзяк:

— Дзеўка-дзявіца, чаго ты плачаш?

— Як жа мне не плакаць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі ляцяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў, мядзведзь зароў, лось рогі паскідаў — і я вёдры пабіла, каромысел паламала і заплакала.

І дзяк пайшоў ды кнігі папарваў.

Ідзе поп:

— Дзяк, чаго ты кнігі папарваў?

— Як жа мне не рваць: быў сабе дзедка, была сабе бабка. Была ў іх курка-рабушка, нанесла яец повен карабец. Дзед біў-біў — не разбіў, баба біла-біла — не разбіла, мышка бегла, хвосцікам матнула — і разбіла.

Дзед плача, баба плача, курачка кудахча, вароты скрыпяць, трэскі лящяць, сабакі брэшуць, гусі крычаць, людзі гамоняць, воўк завыў, мядзведзь зароў, лось рогі паскідаў, чалядка вёдры пабіла, каромысел паламала і заплакала — і я, дзяк, пайшоў кнігі папарваў.

Пайшоў поп і царкву запаліў.

## Кот Максім — сват

Жылі сабе дзед з бабай, мелі яны сынка і катка. Сын зваўся Марцінам Глінскім-Папялінскім, кот быў Максім. Жылі старыя колькі год, потым памёрлі. Засталіся сынок і каток. Некалькі часу прайшло, згніла гэта хата, засталася адна печ. Марцін Глінскі навучыўся гаварыць па-кашачаму, а кот — па-чалавечаму. Жылі яны некалькі гадоў. Марцін жаніцца захацеў, а кот кажа яму:

— Ты жаніцца захацеў, седзячы на гэтай печы, у цябе ж голас не чалавечы. Я цябе карміў, паіў, а ты сядзеў, нічога не рабіў, толькі попел перасыпаў.

— Ну, ідзі ты,— кажа Марцін Глінскі-Папялінскі,— да царэўны ў сваты.

Нанасіў кот есці яму вялікую кучу: мышэй, сала, мяса — усяго. Нанасіўшы есці, пайшоў у сваты. Ідзе ды ідзе, на палянцы сустрэў зайца.

— Куды ты, кот, ідзеш? — пытаецца заяц.

— Іду да цара на суд,— кажа кот.

— На які суд?

— Дзе што кошка парушыць сала, ці каўбасу, ці яшчэ што, прыдзе гаспадар у свіран, на каго падумае? На ката, і скажа на ката. А ката там зусім не было, а кошка. Як я буду цярпець гэтакай няславы.

А заяц падумаў ды і гаворыць:

— І я пайду з табой!

— Чаго ты пойдзеш?

— Ды вось дзе што зайчыха ў сад улезе, шчэпы паесць, яблынькі і грушкі,— усё кажуць на зайца; дзе зайчыху сабакі ганяюць,— усё кажуць на зайца. Як гэтакай няславы цярпець? Пайду і я з табой да цара на суд.

— Што ж ты,— кажа,— адзін?

— А ты ж чаму адзін?

— Эх, ты. У мяне ж там дзядзькі, бацькі, прадзеды, сёстры, брацця. Усе па слову кінуць, дык мне і веры дадуць. А ты што адзін! Каб вас з гэтага лесу палавіна, дык бы вам веры далі.

А заяц гэты паслухаў. Як пакоціцца, як наробіць крыку — дзе каторы заяц не дачуў, дык так бег на гук, а каторы чуў, дык прыйшоў і пасабляў крычаць. Сабралася іх некалькі тысяч, але не тое што некалькі тысяч, але некалькі мільёнаў. Што як ішлі цераз лес, дык там павыбівалі карэнні капытамі — што аж лес паўсыхаў, а як ішлі па полі, дык да вады зямлю ўбілі, каб яны піць не хацелі, дык бы ўвесь свет затапіла вада. Прыйшлі сяк-так да цара. Кот ім кажа:

— Зайдзіце вы ў гэты сарайчык, пастойце, як выйдзе мой суд, тады я вашу жалабу занясу і вас пазаву.

Як гэтыя зайцы ўскочылі ў сарай, так кот — хлоп! ды запёр іх і пайшоў сабе, песенькі пеючы, падскакваючы і ў ладкі плешчучы. Прыходзіць на ганак да цара і стукае:

— Адчыняйце!

Адчынілі.

— Пакажыце, дзе цар жыве.

Паказалі яму:

— Здрастуйце, ваша вялічаства!

— Здрастуй, каток, здрастуй! Што ж ты скажаш мне харошае?

— Прыслаў вам Глінскі-Папялінскі гасцінчыка.

Гасудар адказвае яму:

— Добра зрабіў, ды не дужа.

Пад'ехаў гасудар, паглядзеў у гэты сарай: «Мусіць у яго яшчэ больш ёсць, калі ён мне столькі прыслаў». Накарміў ён гэтага катка і меха наклаў, на дарогу даў.

Прыходзіць гэты каток да Марціна Глінскага-Папялінскага. Аж гэты Глінскі чуць жыве, а яшчэ пытаецца:

— Ці пойдзе яна за мяне, ці не?

— Годзе табе пытацца, калі ты не ўстаеш ужо.

— Ды ты адказвай, ды давай есці хутчэй мне.

Кот на самы першы выпадак пайшоў каля рэчкі, злавіў рыбу. Пасля стаў насіць, што дзе ні зарваў. Адкарміў яго, адпаіў, адхаяў. Пасылае яго Глінскі зноў да цара ў сваты. Кот яму нанасіў піцення-ядзення яшчэ больш.

Ідзе кот ды ідзе цераз лес, выходзіць на палянку, а насустрач яму воўк. Кот спалохаўся і скок на хвойку. А воўк і кажа:

— Ты не палохайся мяне, раскажы, куды ідзеш.

— Я б расказаў, але баюся.

Гэты воўк падскочыў, хваціў ката за каўнер і прыцiснуў да зямлі:

— Калі скажаш, дык не з'ем цябе, а не скажаш — з'ем.

— Не еж — скажу.

— Ну, кажы, не буду есці!

Адпусціў яго ад зямлі.

— Ну, ты ж ужо зусім пусці мяне, ужо скажу, не уцяку. Але ж ты не адкажыся, глядзі, а то табе вялікі сорам будзе.

— Чаму так? — пытаецца воўк.

— Калі зайцаў столькі хадзіла, дык вас трэба тры часткі гэтулькі.

— Куды?

— Куды і я іду.

— Куды ж ты ідзеш?

— Да цара на суд.

— І я пайду.

— Што ты адзін пойдзеш?

— А ты чаму адзін ідзеш?

— А ты не глядзі, што адзін іду. Мяне ўся царская фамілія ведае, а ад цябе і сабакі уцякаюць, як угледзяць, не то цар. Сабярыцеся трэцяя частка з гэтага лесу, дык паверыць цар вам.

— Ну, раскажы ж, на які ты суд ідзеш?

— Ото ж я наперад не скажу. Збяры ты з гэтага лесу трэцюю частку, каб былі сведкі, дык табе веры дадуць, і тады я раскажу, на які суд іду.

Гэты кот раззлаваў ваўка, што воўк аж падскочыў, аб зямлю ўдарыўся і стаў галасіць. Усе ваўкі пачулі, што гэтак воўк плача, і давай збягацца. Як назбіралася іх багата, сталі яны пытацца ў ката. Гэты кот адказвае:

— Нам стаяць ды гаварыць, дык многа дзён пройдзе; пойдзем па дарозе і будзем гаварыць ідучы.

Ішлі яны, ішлі, ён ім расказаў уловіну.

— Праўда,— кажа воўк,— і нам трэба ісці, ты не салгаў.

Кажуць ваўкі:

— Мы ўперад пойдзем на суд.

А кот ім:

— Як кажа вы ўперад пойдзеце, калі мая жалаба занесена? Як выйдзе мой суд, падам я вашу жалабу, тады я вас пазаву. Цяпер жа вы пастойце ў гэтым сараі.

Яны паслухалі, а кот — хляп! ды і запёр іх, а сам пайшоў, падскакваючы, пеючы, у ладкі плешчучы. Прыйшоў на ганак. Яму адчынілі.

— Здрастуйце, ваша вялічаства!

— А што, каток, скажаш?

— Ды вось вам Глінскі-Папялінскі прыслаў гасцінчыка.

— Добра зрабіў, ды не дужа.

Пад'ехаў гасудар, паглядзеў — ваўкі скачуць на бэльках, так кот набіў іх у той сарай. Цар ката напаіў, накарміў, на дарогу даў, а ваўкоў і зайцоў вялеў пабіць:

— Скажы Глінскаму-Папялінскаму, няхай прыязджае да маёй дачкі ў сваты.

Кот прыбег к Глінскаму ў поўнач і давай яго будзіць.

— Уставай, уставай, я ад цара прыйшоў.

— А што ён табе сказаў?

— Ды сказаў, каб ты ехаў жаніцца на яго дачцэ.

— Ты, кот, сватаў, сватаў, каб цябе бог са свету платаў. На чым жа я паеду, калі я голы, як бізун?

— Ты не плач, але прасі, каб я ўхітрыўся.

Пайшлі яны сярод ночы. Там каля цара салдатаў многа і ў кожнага салдата дзве шапкі, а кот у кожную хату ўлезе і ў кожнага салдата па шапцы ўкрадзе. І ўкраў ён яшчэ тонкага драпу. Наклалі яны два мяхі гэтых шапак, панеслі на мост. Паставіўшы шапкі на мосце і пакінуўшы Глінскага ля шапак, пайшоў кот піць ваду. П'е ён і ўбачыў ракаў. Адзін рак надта вялікі, кот яго і выцягнуў на бераг.

— Пусці,— кажа рак,— жыў не буду.

— Саслужыш ты гэтакую службу? — пытае кот у рака.

— На вадзе саслужу, якую ты хочаш, а на беразе, забі мяне, нічога не саслужу.

— Скапай жа ты гэты мост!

— Скапаю.

Кот, не верачы, прывязаў рака на дрот, а на Марціна Глінскага кажа:

— Як паплыве мост, дык ты раскідай шапкі па рацэ.

Кот цераз мост пераскочыў, а Глінскі на мосце. Мост паплыў, а Глінскі раскідваў шапкі па рацэ. Тым часам каток прыбег да цара і кажа:

— Ехаў Глінскі да цара жаніцца, уз'ехаў на мост, мост зламаўся, салдаты патапіліся, пяхота і конніца, астаўся ён адзін на мосце.

Паслаў цар салдат на лодках. Прывезлі яны Глінскага ў царскі дварэц. Згулялі вяселле. Цар даў ім войска, грошай, і паехалі яны ў Змяёўскі дварэц, дзе золата з стрэх капала.

**Казка пра падчарку**

Вот жылі дзед і баба. І было ў іх у дзеда дачка і ў бабы дачка. І баба дзедаву дачку не любіла і гаворыць:

— Дзед, вядзі яе куды хочаш, дзе хочаш дзень. А то маю жаніхі не будуць браць за яе. Будуць гэта яе наперад браць, а маю не будуць. Дык завязі яе куды хочаш.

Вот дзед узяў саначкі, пасадзіў сваю дачку на саначкі і павёз яе. Пасадзіў на лютым марозе.

Вот прыходзіць Мароз Красны нос і Сіні нос. Трышч, лышч! А яна сядзіць бедненькая і калоціцца, гэта дзевачка.

— Трубі, Марозік, твая пара. У Пятроўку не будзеш. Толькі я калачуся, змарозіш мяне.

Пашоў Мароз, прыносіць ёй валёнкі, шубу. Надзеў яе. Сядзіць яна і песеньку запела.

А мачыха гэта страпаіць ужо, пахароны па ёй правіць. Пячэць клёцкі, варыць поліўку і гаворыць:

— Ідзі прывязі ж яе. Бяры карзінку, костачкі ў кашалю не парассыпай, прывязі.

А сучачка пад сталом:

— Цяў-цяў, дзедаву дачку ў карэце прывязуць, а бабіну жаніхі не вазьмуць.

А яна яе чапялой, сучку.

— Вон! Я табе блін не дам. Гавары, што дзедаву костачкі прывязуць а бабіну жаніхі вазьмуць.

А ўсё роўна сучачка:

— Цяў-цяў! Дзедаву дачку жаніхі вазьмуць і ў карэце прывязуць, а бабіну жаніхі не вазьмуць.

Ну, паехаў дзед і вязець сваю дачку. Проста як пані якая, адзетая, абутая, красавіца ўсё. І тут народ сабраўся, усе глядзяць, што яе завезлі, а яна жывая і так адзетая. Ну баба гэтая на дзеда ўселася.

— Вязі і маю туды пасадзі, дзе твая сядзела, каб і яе надзелі так.

Ну вот дзед таксама ўзяў ужо яе. Сваю вазіў на саначках, а яе на кані павёз. Ну дачку ж завёз, пасадзіў таксама. Ажны прыходзіць Мароз Красны нос і Сіні нос. Трэшч, лэшч! А яна:

— Каб твая душа лопнула! Каб твой жывот лопнуў! Я сяджу, змерзла.

Гэты Мароз як трэснуў, як лэснуў і змарозіў гэту дачку бабіну. Ну, а баба ўжо к вяселлю ладзіцца, што жаніхі ўжо прыйдуць, усё прыданае ёй будзець. Ну сучачка тожа пад сталом:

— Цяў-цяў, бабіну дачку ў кашальку костачкі вязуць, а дзедаву жаніхі вазьмуць.

Ну, паехаў дзед, прывёз костачкі бабінай дачкі. А сваю дачку замуж выдаў за харошага хлопца.

## Бабіна дачка і дзедава дачка

Быў дзед ды з бабай, была ў дзеда дачка ды ў бабы дачка. Не ўзлюбіла баба дзедаву дачку. Дзед той гадзіў-гадзіў бабе — ніяк не ўгадзіць. Жалка яму сваёй дачкі, а баба адказвае:

— Дзень яе дзе хочаш.

Тады ён гаворыць:

— Адзявайся, дачушка, пойдзем з табой.

Пайшлі яны ў лес. Прыходзяць у лес — стаіць хатка на курыных ножках. Ён гаворыць:

— Хатка, хатка, стаяла па-новаму, стань па-стараму: ка мне акном, а к дочцы маёй дзвярмі!

Тая хатка абярнулася і стала па-стараму: к яму акном, а к дочцы яго дзвярмі. Тады ён гаворыць:

— Ідзі, жыві з богам, а я пайду дроўцы сеч.

Адсек венічак і пабаешачку, звязаў і павесіў на асіну. Венічак шась-шась, а пабаешачка стук-стук! Яна думае, што бацька дроўцы сячэ, і ўсё яго чакае. Вечар прыходзіць, бацькі яна чакала-чакала,— ніхто не прыходзіць. Тады яна гаворыць:

— Хто ў лесе, хто ў балоце, хадзі ка мне начаваць!

Мядзведзь адгукаецца:

— Я ў лесе, я ў балоце, прыду к табе начаваць!

А яна думае, што бацька ёй адказвае. Тады прыйшоў к ёй мядзведзь нанач:

— Ну, дзеўка, адмыкай дзверы!

Яна адамкнула і дужа спужалася.

— Ну,— гаворыць мядзведзь,— затапі печ, вары кашу, пячы бліны. Тады шчурка падскочыла і гаворыць:

— Дзеўка-дзявіца, красная красавіца, дай ложачку кашы аблізаць!

А яна гаворыць:

— На табе, шчурка, кашкі.

З'ела шчурка кашу і зноў прыбягае:

— Дзеўка-дзявіца, красная красавіца, дай мне блінка з печы, у худой гадзіне прыгажуся...

Яна кінула блінца, шчурка і пабегла пад печку.

Яны павячэралі.

— Ну,— гаворыць мядзведзь да дзеўкі,— пасцель пасцялі: рад камення, рад палення і ступу ў галовы.

Ён лёг і даў ключыкі, і прыказаў бегаць па хаце і бразгаць ключамі. А шчурка падскачыла і яе падмяніла.

— Дай,— гаворыць,— мне ключыкі, я цябе падмяню, а то цябе заб'е. Стаў мядзведзь кідаць паленні — нікога не забіў.

На другі дзень мядзведзь, устаўшы, гаворыць:

— Шчасце тваё. Ну, дзеўка, мы з табой ажэнімся.

Яны ажаніліся і сталі жыць добра. Ён ёй нанасіў і мёду, і коней, і ўсяго. У яе бацькі была сучка рабая,— яна выскачыла на вуліцу і стала брахаць:

— Гаў-гаў-гаў! дзедава дачка ў госці шасцёркай едзе і грошай многа вязе!

А бабе то не спадабалася. Яна сучку чапялой:

— Што ты, сучка, воўк це заеж, брэшаш! Дзедавай дачкі даўно на свеце няма!

А тут дачка і прыехала, і грошай бацьку прывязла. Бабе гэта не спадабалася, яна і кажа:

— Адвядзі і маю дачку туды, дзе твая была.

Нечага рабіць, дзед адвёў яе. Прыйшоў дзед у лес. Там стаіць хатка на курыных ножках. Ён гаворыць:

— Хатка, хатка, стаяла па-новаму, стань па-стараму: ка мне акном, а к дочцы маёй дзвярмі!

Тая хатка абярнулася і стала па-стараму: к яму акном, а к дочцы дзвярмі. Тады ён і гаворыць:

— Ну, дзіця, жыві тут, я пайду дроўцы сеч.

Адсек венічак і пабаешачку, звязаў і павесіў на асіну. Венічак шась-шась, а пабаешачка стук-стук! Яна думае, што бацька дроўцы сячэ, і ўсё яго

чакае. Вечар прыходзіць, бацькі яна чакала-чакала,— ніхто не прыходзіць. Тады яна гаворыць:

— Хто ў лесе, хто ў балоце, хадзі ка мне начаваць!

Мядзведзь адгукаецца:

— Я ў лесе, я ў балоце, прыду к табе начаваць!

А яна думае, што бацька ёй адказвае. Тады прыйшоў к ёй мядзведзь нанач:

— Ну,— гаворыць мядзведзь,— затапі печ, вары кашу, пячы бліны.

Тады шчурка падскочыла і гаворыць:

— Дзеўка-дзявіца, красная красавіца, дай ложачку кашы аблізаць!

А яна гаворыць:

— Мядзведзь, мядзведзь! Шчурка кашкі просіць.

— У лоб яе ложкай!

Яна яе ўдарыла, шчурка пабегла,— сама стала печ бліны...

— Дай мне блінка з печы, у худой гадзіне прыгажуся...

Яна:

— Мядзведзь, мядзведзь! Шчурка бліна просіць.

Ён:

— У лоб яе чапялой!

Яна яе ўдарыла, шчурка пабегла пад печку, і закацілася, і заваліласа. Яны павячэралі. Мядзведзь гаворыць:

— Сцялі мне пасцель: рад камення, рад палення і ступу ў галовы.

Ён лёг і даў ёй ключыкі, і прыказаў бегаць па хаце і бразгаць ключамі. Як ён стаў кідаць паленнямі, дык з першага разу яе і забіў. Дзедава сучка выскачыла:

— Гаў-гаў-гаў! бабінай дачкі даўно на свеце няма!

Бабе гэта не спадабалася.

— Што, сучка, брэшаш? Мая дачка шасцярнёй прыедзе, у карэце, грошы прывязе. Дзед! Што твая сучка на мяне брэша? Ідзі прывядзі мне маю дачку, а то сучку заб'ю.

Дзед узяў кашалёк на плечы, пайшоў за бабінай дачкой. Прыходзіць у тую хату — аж там дачкі няма, адны косці ляжаць, дзед падабраў косці ў кашалёк і пайшоў дамоў. Тады сучка:

— Гаў-гаў-гаў! бабіну дачку дамоў вязуць, у кашальку косці нясуць!

Бабе гэта не спадабалася.

— Што ты брэшаш? Мая дачка шасцярнёй прыедзе, у карэце, грошы прывязе.

Сучка зноў забрахала:

— Гаў-гаў-гаў! бабіну дачку дамоў вязуць, у кашальку косці нясуць!

Тады баба ўрабела і злегла ў пасцель. А каб дачка яе шчурцы блінок дала з'есці, то была б жывая.

**Аб трох братох і воўку**

Меў адзін бацька тры сыны: двох разумных, а трэцяга яны перазвалі дурнем, хоць чорта ён дурны быў. Анно ж трапілася, што кралеўна не магла за нікога замуж пайсці, бо усё ёй выдаваліся брыдкія, так кроль расказаў усім, хто хоча з кралеўнаю ажаніцца, каб упярож пайшоў да такої і такої крыніцы (а да яе не дапускалі нячыстыя) і ўмыўся таею вадою, то такім пекным стане, што адразу да душы ёй прыпадзе. Той бацька, даведаўшыся аб гэтым, напёк ламункаў да й выправіў найстаршага да тае крыніцы. Ідзе ён, так ідзе, анно ж спатыкае воўка, так воўк пытае:

— Куды ідзеш?

— Туды і туды.

— Што нясеш?

— Ламункі!

— Дай мне крыху.

— А хваробу табе ў бок! А мне што будзе?

Той воўк пабег. Ішоў ён так, ішоў, даходзіць да таго месца, а там горач такая, што проста не вытрымаць, так няма рады, мусіў назад вярнуцца. Так бацька зноў напёк ламункаў і выправіў сярэдняга сына. Той таксама спаткаў таго воўка да й не даў яму ламункаў, так і ён анно набільніцы прынёс дахаты. Ну, так бацька кажа:

— Цяпер трэба, каб наш дурны папрабаваў шчасця.

— Эх,— кажуць, куды ён, тату, пойдзе: ні з яго носам даля не дайшлі, а ён дойдзе!

— А што вам да таго, няхай ідзе, мо хутчэй дзе згіне.

— Хіба так.

Ну, так бацька напёк ламункаў да й выправіў яго ў дарогу. Ён пайшоў; ідзе так, ідзе, анно ж спатыкае таго воўка.

— Куды ідзеш?

— Да крыніцы!

— Што нясеш?

— Ламункі.

— Дай мне крыху з'есці.

— Добра,— і, гэта, сеў, наламаў, наклаў, накарміў таго воўка, і як сам наеўся, так устаў і кажа:

— Ну, братко, аставайся здаровы, мо ўжэ не ўгледзімся ніколі.

А воўк кажа:

— Седавіся на мяне!

Той сеў, як бач, так і ўгледзеў тую крыніцу. Тады воўк кажа:

— Злезь і ўлезь мне ў лева уха, а праз права вылезь.

Той так зрабіў: улез, вылез, калі гляне, анно ж сябе не пазнаў — стаўся такою мараю! Тады воўк кажа:

— А маеш бутэлечку?

— Маю.

— Ну, то ідзі да іх: ты будзеш такі сам, які і яны, яны це не пазнаюць. Анно глядзі, каб стаў задам да тае крыніцы, то і яны пастануць задам, так ты вазьмі спусці бутэлечку нізначне, набяры з між ног вады і пад паху падцягні леваю рукою, анно праваю не бяры, бо яны паадварочваліся б і ўгледзеўшы, што ты гэткі, укінулі б цябе туды.

Той так і зрабіў: прыйшоў, яны агледзелі, што чужы, усё яго пхаюць да тае крыніцы; калі падыдзе бліжай, анно ж там вада аж кіпіць да й плавае незлічона моц трупаў паразварваных, каторых яны туды накідалі. Так ён гэта адвярнуўся, і яны паадварочваліся да й пачалі шалець, а ён гэта хутчэй набраў вады, да дай божа ногі! Прыбягае, анно ж воўк жджэ:

— А што, як там?

— Людска!

— Лезь жа мне ў права уха, а праз лева вылезь.

Ён так зрабіў і як бач зноў стаў такім самым. Так воўк:

— Ну, то седавіся на мяне.

Ён гэта сеў, ажно як бач, так сталі каля хаты. Тады воўк кажа:

— Злезь і ідзі дахаты, а як чаго будзе табе патрэба, то анно падумай аб том, то мецьмеш.

Той уходзіць у хату, а тыя пытаюць:

— А што, як?

— Ці хто яго нат што бачыў — такая пеката!

— А што, дурню, анно дармо падбіўся — ідзі малаціць!

Той пайшоў, малоціць, после думае сабе:

— А мо гэта вада якая нядобра?

Так выняў гэта з-за пазухі, пырснуў на се і стаў такім харошым, якога яшчэ не было і не будзе на гэтым свеце, а адзежа тая на ём аж зыціць. Так гэта ўвайшоў у хату, а бацька з братамі шапкі з галоў пасхватвалі і думаюць сабе: «Скуль гэта з'явіўся гэтакі харошы паніч?» После бацька на старшага кажа:

— А закліч нашага дурня, няхай і ён пагледзіць.

А дурань не хацеў, каб яго пазналі, так пачуўшы, выбег і давай качацца па таку. Той прыходзіць, анно ж ён ляжыць:

— Уставай,— кажа, дурню, абач, які паніч да нас прыйшоў.

Яны прыходзяць, анно ж нікога нідзе няма і ніхто не ведае, дзе падзеўся. А, такое ім дзіва!..

У якісь час кроль расказаў, каб усе чыста сабраліся там і там. Так браты яго паехалі, а яго не ўзялі. Ён гэта падумаў аб кані, анно як бач, стаў і конь. Тады ён сеў да й заехаў яшчэ ўпярож ад братоў туды. Усё там пхаецца, то туды бяжыць, то сюды, людзі яго ганяюць, таўкуць:

— А ты,— кажуць,— куды гэта тут, шасталапо, прэшся!

А ён на гэта не зважае да й лезе смаліцаю. Нарэшце, выходзіць кралеўна: усе зараз гэта сталі ў шар, а кралеўна ідзе дай глядзіць на ўсіх. Як была ўжэ блізка яго, так ён пырснуў на се вадою, так стаў такім харошым, што аж людзі дзівам дзівяцца. Кралеўна падышла, глянула і кажа:

— Гэта будзе мой! — і дала яму аднаго пярсцёнка, а другі такі самы ў яе быў на пальцы.

Ну, так як ён пярсцёнка ўзяў, так няведама дзе згінуў; людзі яго шукаюць усюды — няма! А ён сеў на таго воўка да й паехаў. Прыязджаюць браты, а ён вылегуецца на печы:

— Ну, што ж ты тут, дурню, бачыў? Печ, а мы бачылі кралеўну і паніча харошага, каторы калісьці нашым кролем будзе, бо ўжэ заручыліся.

А ён таго пярсцёнка абвярцеў быў лапінкаю; так захацелася яму паглядзець, калі адверціць — анно ж цэла хата і заззяла. Так бацька давай крычаць:

— Што ты там, дурню, забаўляешся з агнём? Хочаш хату спаліць?

Браты таксама населі на яго: ты такі-гэтакі, і на гэтым скончылася. Пабыў ён у хаце якісь час, захацелася яму кралеўну ўгледзець, так паехаў на кралеўскі двор, стаў каля калодзезя і стаіць. Анно ж нібавам выбегла кралеўна з конавачкаю па ваду, а ён кажа:

— Няхай кралеўна пазволіць, то я выцягну.

Так яна, нічога не кажучы, паставіла конавачку, ён наліў і дае ёй, а яна не хоча браць, так ён ніўзнак укінуў туды пярсцёнка і адышоўся, тады яна ўзяла конавачку ў рукі. Тады ён кажа:

— Чаго мяне кралеўна гэтак гадзіцца, а то ж я ваш кавалер.

Яна анно заўстыдалася да й пабегла, вылівае воду, анно пярсцёнак бульт, і ўпаў! Тады яна пазнала і дагадалася ўсяго. Так выйшла да яго і кажа:

— Што гэта такое, я дала харошаму пярсцёнка, а ты такі брыдкі? Скуль у цябе гэты пярсцёнак узяўся? Мо ты ўкраў або дзе найшоў?

Тады ён усё расказаў, наліў з бутэлечкі тае вады, паўмываліся і сталі найхарошайшымі людзьмі ў свеце.

Нібавам было і вяселле. Па вяселлі непрыяцель увайшоў да гэтага краю, так ён паехаў разам з войскам на вайну, да й ссёк іх так, што ні адзін не выйшаў. Так кроль кажа:

— Гэта я і маё войска пабіла, а не ты.

А ён:

— Такой бяды,— кажа,— няхай будзе і так.

После зноў была вайна, так ён не паехаў, але як асталося разам з кролем з дзесяцёх ужэ, тады выляцеў да й пабіў непрыяцеляў дачыста. Тады кроль думае сабе: «Я ўжэ стары і то не дам рады, а ён малады, і то як бач паб'е: пачакай, трэба яго здрадзіць!» Так гэта казаў выкапаць шырокі і глыбокі роў да й кажа:

— Пераскоч ты конна праз гэты роў.

Так ён падумаў аб кані — як бач конь стаў. Так ён сеў і пераскочыў. Кроль думаў, што таксама пераскочыць, так гэта бабоўх — разам з канём і забіўся, а ён з кралеўнаю і цяпер яшчэ жыве.

## Два ў кораб арэшкі

Жылі-былі дзед і баба. Было ў іх тры дачкі. Гэтыя дочкі ўсё пралі ўтрох. Раз пралі яны ў лазні, а ехаў цар з фурманам. Едзець і кажаць:

— Што такое? Ніколі агню не было ў гэтай лазні, а цяпер аганёк гарыць. Пайдзі паглядзі.

Зайшоў гэты фурман у лазню. Глядзіць: тры дзеўкі прадуць. Пастаяў ён пад дзвярмі. Пастаяў ён пад дзвярмі, чуець, адна кажаць:

— Го, каб я за цара пайшла, нічога б не хацела, увесь бы свет абаткала.

А другая кажаць:

— А каб я пайшла за цара, так бы аднэй ба нітачкай увесь свет адзела.

А трэцяя кажаць:

— А я каб пайшла за цара, за пана круля, дык ба двух сынкоў прывяла: аднаго з-пад мясёнца, вакол гвяздачкі, а другога з-пад слонца, слонца б свяціла. На адным слонца, на другім месяц і звёзды свяцілі.

Гэты фурман пазваў караля. Падыйшоў гэты кароль, паслухаў, паслухаў.

— Ну,— кажаць,— як гэтак, паедзем дамоў.

Паехалі яны дамоў. Прыязджаець назаўтра кароль да іх у сваты. Прыехаў гэты ўжо кароль у сваты і кажаць:

— Дзе тая, каторая казала, што двух сыноў прывядзець: аднаго з-пад слонца, а другога з-пад месяца і звёздачкі.

Гэта была самая меньшая. Ну, і ўзяў ён ажаніўся ўжо, гэты кароль. Ажаніўся ён, кароль гэты, ну і жывець з ёй. Жывець. Прыходзіць яму аб'яўленне на вайну ехаць. Паехаў ён на вайну, а ў яе яшчэ не было гэтых сыноў. Прыйшлі ейныя дзве сястрыцы, старэйшых яна забрала к сабе, гэтых абедзвух, каб яны ўжо жылі і ёй весялей было. Нарадзіліся ў яе два сыночкі. Адзін — у лобе месяц свеціць і звёзды, а ў другога слонца над галавой. Як ён ідзець, так слонца свеціць, дзе ні йдзець, усюды слонца свеціць. Толькі як шапкі надзенуць — тады нічога не відаць. Як шапачкі здзенуць,— тады відаць.

Не панравілася гэтым сёстрам, што яна маладзейшая, а яна царыцай.

Напісала яна пісьмо ўжо цару гэтаму, каралю. Напісала яна пісьмо каралю, што ў яе два сыны нарадзіліся, што адзін ужо з-пад слонца, другі з-пад мясёнца. Паслала, слуга ж нёс, а сёстры яго паранялі, напаілі ў хаце там недзека. Узялі пісьмо, перапісалі ягонае і напісалі, што яна двух шчанючкоў прывяла, два шчанюкі ёсць у яе. Ну што ж. Пачуў цар гэта пісьмо, ну ўсё роўна, што ні ёсць, пускай будзець. «Да майго вяртання нічога штоб не дзелалі. Пусць яны гадуюцца, гэтыя самыя шчанючкі». Прынёс слуга зноў гэта пісьмо. Яны зноў пераняла яго, прачыталі пісьмо, зноў напісалі, каб выкінулі яе вон, вывезлі саўсём, дажа ў лес, штоб яе нагі не стала ў хаце. Ну што, узялі гэтыя слугі ўсе сабраліся, мусяць жа ж прыказ цара слухаць. Узялі яе, адзежу ейну царскую здзелі з яе ўсю, дзяцей гэтых саўсём павыкідвалі голенькіх на двор, не было нічога ў яе, што надзець. Тады яна

нейкіх там анучак знайшла рваных, паўкручвала гэтых рабятак ўжо і пайшла ў свет. Торбамі абчапілася на плечы і пайшла ўжо жабраваць. Ну, хадзіла яна доўга, жабравала, жабравала, гэтыя сынкі падраслі, настаяшчыя ўжо сталі, па пяць, па шэсць гадоў ім ужо. Вырaслі яны і ходзяць па свету ўсё і жабруюць.

Вярнууся гэты цар з вайны. Ну, сказалі яны, што яна сама кінула ўсё і ўшла за тое, што гэтакія шчаняты прывяла яму. Шчаняты ў яе. Ну, што ж ён будзець рабіць.

Тады яна ўжо раз ідзець каля возера. Прыйшла ўжо ў возера. Цяжка хадзіць, трудна жабраваць і кажаць:

— Мае вы дзеткі, я ўжо вас падгадавала, а я вазьму і ўтаплюся ўжо ў гэта возера.

Яны сталі плакаць:

— Мама, не тапіся, мы падрасцём, будзем жыць, тады і цябе будзем глядзець.

Ну, пайшлі яны.

— Пойдзем да бацькі да нашага, да цара свайго, пойдзем туды.

А там баль, сільна залажыў баль вялікую цар гэты. Гасцей сазваў са ўсяго свету, якія толькі былі госці, усіх гасцей паззываў ён туды на гэта ўжо, на баль. Ну, прыйшлі, прыйшлі яны ў кухню, у служанкі прасяцца:

— Можа вы пусцілі б нас ланач?

Дык яна:

— Ой, у нас нідзе месца няма сёння — гэтулькі многа людзей, не магу нідзе вас пусціць.

Дык яны:

— Ну, хоць мы пад краваццю, хоць дзе, пазвольце вы нам ужо хоць дзе-небудзь схавацца, то няма нідзе, ноч на двары.

Ну, служанка каець:

— Толькі схавайцеся і ціханька сядзіце, каб ніхто вас не ўвідзеў, бо, барані бог, хто ўвідзіць, дык і мяне выганяць вон за вас.

Ну, тады гэдак ужо схаваліся яны і ляжаць пад ложкам. Ну, балявалі, пілі яны там, гулялі, тады цар прынёс цэлы кораб арэхаў і кажаць:

— Хто разгадаець гэты кораб арэхаў, таму апішу палавіна свайго царства.

Усе разгадвалі, усе разгадвалі — ніхто не разгадаў. Тады гэтыя хлопчыкі просяцца:

— Мама, мы папросімся ў служанкі, мы разгадаем гэты кораб арэхаў.

Яна кажаць:

— Дурачкі, ён вас не прымець абадраных, гэтакіх страшных.

— Не, мы разгадаем.

І вот тады яны прасіліся, прасіліся, служанка гаворыць:

— Ну я схаджу, я схаджу, папрашу ў цара гэтага, ці прымець ён вас.

Пайшла, спыталася:

— У мяне жабрачка начуець, двое ў іх мальчыкаў, яны просяцца, яны кажуць, што яны разгадаюць ужо гэты кораб арэхаў.

— Ну, пускай ідуць.

Прыйшлі яны і сталі разгадваць абодва, адзін і другі. Вот адзін бярэць пару арэшкаў і кладзець у другі кораб арэхаў, у парожны кораб. І кажа:

— Два ў кораб арэшкі, быў стары, два ў кораб арэшкі, былі ў яго тры дачкі, два ў кораб арэшкі, яны пралі, два ў кораб арэшкі, і гаварылі, два ў кораб арэшкі: «Каб мы пайшлі за пана круля, два ў кораб арэшкі, адна казала, два ў кораб арэшкі,— я б аднэй ба нітачкай увесь свет бы абвязала, два ў кораб арэшкі». Другая казала, два ў кораб арэшкі: «Каб я выйшла за пана круля, два ў кораб арэшкі, я ўсім ба кросны ткала, два ў кораб арэшкі, я ўсіх ба аднэй ба адзежкай адзела, два ў кораб арэшкі». А трэцяя кажаць: самая меншая, два ў кораб арэшкі: «Я каб пайшла за пана круля, два ў кораб арэшкі, я б двух бы сынкоў прывяла, два ў кораб арэшкі, аднаго з-пад мясёнка кала звёздачкі, два ў кораб арэшкі, а другога з-пад слонца, два ў кораб арэшкі». Пан круль ехаў, два ў кораб арэшкі, пачуў што гэтак гаварылі тры сястры, два ў кораб арэшкі. Ён ажаніўся з гэтай, два ў кораб арэшкі, каторая гаварыла, два ў кораб арэшкі, двух сынкоў прывядзе, два ў кораб арэшкі. Пану крулю прыйшлося, два ў кораб арэшкі, ехаць на вайну, два ў кораб арэшкі, а крулёва нарадзіла двух сынкоў, два ў кораб арэшкі: аднаго з-пад мясёнца, два ў кораб арэшкі, а другога з-пад слонца, два ў кораб арэшкі. Напісала пісьмо, два ў кораб арэшкі, пану крулю, каб ён ведаў, два ў кораб арэшкі, што яна прывяла двух сынкоў, два ў кораб арэшкі. Паслала слугу, два ў кораб арэшкі, а слугу сёстры перанялі, два ў кораб арэшкі, пісьмо перапісалі, два ў кораб арэшкі, што прывяла двух шчанючкоў, два ў кораб арэшкі. Ён, цар, сказаў, два ў кораб арэшкі, што толькі ні прывяла, няхай гадуе, два ў кораб арэшкі. І адпісаў пісьмо, два ў кораб арэшкі. Яны перанялі, два ў кораб арэшкі, адпісалі, каб яна вон выхадзіла, два ў кораб арэшкі, каб яе выгналі, два ў кораб арэшкі. Яны выгналі яе з дварца, два ў кораб арэшкі. Яна пайшла жабраваць, два ў кораб арэшкі. Яна хадзіла, два ў кораб арэшкі, прыйшла да возера, два ў кораб арэшкі, хацела ўтапіцца, два ў кораб арэшкі, а сынкі сталі плакаць, два ў кораб арэшкі: «Не тапіся, мама, мы цябе глядзець будзем, два ў кораб арэшкі». У пана круля быў баль вялікі, два ў кораб арэшкі. Кажуць: «Мама, пойдзем да свайго папы, два ў кораб арэшкі, сходзім, паглядзім, які ён ёсць, два ў кораб арэшкі». І мы прыйшлі, два ў кораб арэшкі, а там служанка не пушчала, два ў кораб арэшкі. Папрасіліся нанач, два ў кораб арэшкі, а яна пусціла, два ў кораб арэшкі. Пад ложкам мы схаваліся, два ў кораб арэшкі. Мы паляжалі, два ў кораб арэшкі. Пан круль прынёс кораб арэшкаў і сказаў, два ў кораб арэшкі, хто разгадае гэты кораб, два ў кораб арэшкі, таму поўцарства, два ў кораб арэшкі.

Мы прасіліся ў мамы, два ў кораб арэшкі: «Пусці, мама, нас, два ў кораб арэшкі». Мама не пушчала, два ў кораб арэшкі, мы папрасілі служанку,

два ў кораб арэшкі, каб яна, два ў кораб арэшкі, папрасіла нас разгадаць гэты кораб, два ў кораб арэшкі. Пан круль пазволіў, два ў кораб арэшкі.

І яны шапачкі паздымалі: слонца засвяціла ў хаце, месяц, ўсё. І круль увідзеў і пазнаў сваіх сынкоў.

І тады сёстраў гэтых да конскіх хвастоў прывязаў і паганяў, і іх парарывалі. А тады выцягнулі яе з-пад ложка, прыбралі яе і яна стала царыцай і сыны сталі з імі жыць.

## Іван Іванавіч-царэвіч

У некаторым царстве, у іншым гасударстве жыў сабе адзін цар. Захацеў ён жаніцца і паехаў у чужыя землі нявесту выбіраць. Паехаў ён у адно царства; ездзіў-ездзіў — пад абычай жану не знайшоў. Вярнуўся дамоў. Пажыў колькі там дома ды й паехаў у другое царства. І там не знайшоў пад сваю натуру. Вярнуўся дамоў, пажыў мала-многа дома і паехаў у трэцяе царства. Ездзіў-ездзіў — тожа не знайшоў. Вярнуўся дамоў і заехаў у дзярэўню. Папрасіўся ў мужыка нанач у харошага і стаў там пытаць сабе нявесты.

Тым часам павёў кучар коней паіць і спусціў вядро. Аглянуўся — цёмна ва ўсіх хатах, а ў адной свеціцца. Ён пайшоў вядзерца прасіць туды. Падыходзіць пад вакошка, аж там сядзяць тры дзявіцы — сёстры і размаўляюць між сабой:

— Царэвіч гэты ездзіць ды сватаецца, ну толькі крашай нас трох не знойдзе!

Большая кажа:

— Калі б мяне ўзяў, то я б яго ўсю армію адным хлебам накарміла!

Сярэдняя кажа:

— Калі б мяне ўзяў, то я б яго ўсю армію адной іголкай абшыла!

А меншая кажа:

— Калі б мяне ўзяў, то я б яму радзіла дванаццаць сыноў, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Кучар той не стаў ўжо вядра прасіць,— вярнуўся дадому, пазваў царэвіча і стаў яму гаварыць:

— От, царскае вялічаства, як вадзіў я коней паіць, і спусціў вядро Аглянуўся — ва ўсіх хатах цёмна, а ў адной свеціцца. Пайшоў я вядра прасіць, аж там тры дзявіцы сядзяць і шыюць, і выхваляюцца між сабой: «Хай гэты царэвіч хоць усю зямлю аб'ездзіць, а крашай нас не знойдзе!» Большая кажа: «Калі б мяне ўзяў, то я б яго армію адным хлебам накарміла!» Сярэдняя кажа: «Калі б мяне ўзяў, то я б яго ўсю армію адной іголкай абшыла!» А меншая кажа: «Калі б мяне ўзяў, то я б яму радзіла дванаццаць сыноў, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!».

Выйшаў царэвіч са двара і пытае ў таго мужыка, што начуе:

— Што, ёсць у вас такія і такія дзеўкі?

— Ёсць!

— Ну, пойдзем у сваты!

От ідзе цар і думае:

— Якую мне ўзяць?

Думаў-думаў сам сабе і надумаўся:

— Хоць бы я большую і ўзяў — у мяне хлеб ёсць; сярэднюю б узяў — у мяне і адзежа ёсць. А вазьму меншую!

Узяў сабе меншую і паехаў у сваё царства. І жыў там ці мала, ці многа, і зацяжарала яго хазяйка. На гэту пару трэба было яму са свайго царства на паўгода адпраўляцца. І прашчаецца ён са сваёй жонкай і прыказвае ёй дужа:

— Мая мілая, калі бог дасць табе радзіны, каго б ты ні радзіла, дык бы мне напісала!

Тут жа і адправіўся ён, а яна праз месяцы два пасля яго радзіла дванаццаць сыноў, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры. Піша яна пакет і адпраўляе са свайго царства верніка і строга яму прыказвае, штоб пакет не даваў нікому ў рукі. Дачуліся яе сёстры пра гэта і ўзялі па бальшой дарозе паадкуплівалі сабе шынкі. Так жа ехаў той вернік з пакетам і папаў к большай сястрэ нанач. І пытае тая сястра:

— Куды цябе бог нясе?

— Еду к цару!

— Па якому случаю?

— Абрадзілася царэўна: дванаццаць сыноў радзіла, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Яна і кажа:

— А, то мая родная! Ах, дзеля такога госця трэба лазню стапіць, а то ты стаміўся-змарыўся!

Павялі яго ў лазню, а яна пакет выняла і сама напісала: «Радзіла табе, мой мілы, дванаццаць штук: кошкіны лапы, мышыныя хвасты, сабачыя раты».

Узяла запячатала і ўлажыла. Прыходзіць той з лазні, бярэ пакет і адпраўляецца па дарозе сабе. Случаецца другая ноч, заязджае ён нанач. Тут жа пытаюць у яго:

— Куды ты едзеш?

— Еду к цару!

— Па якому случаю?

— Абрадзілася царэўна: дванаццаць сыноў радзіла, ды ўсіх сокалаў: ва ілбе месяц, на патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры.

Вот гэта адказвае:

— Ах, гэта наша родная сястрыца!

А гэта ён к сярэдняй заехаў.

Яна і кажа:

— Ах, друг наш, трэба табе лазню вытапіць!

Павялі яго ў лазню, а яна пакет разламала, яшчэ горай падправіла. Прыходзіць той з лазні і адпраўляецца па дарозе. Прыязджае к цару на граніцу, аддае пакет. Разламаў цар і ўзяў чытаць. І стаў крэпка плакаць.

— Ах,— гаворыць,— божа міласцівы! Няўжо я перад богам саграшыў, што мне такі случай здарыўся?

І ўзяў ён пакет пісаць:

— Мая мілая, да майго прыходу нічога не рабі!

І запячатаў пакет. Уручыў свайму давернаму. І паехаў той назад. Так жа заязджае к сярэдняй сястрэ, дзе ён начаваў. Яна яго ўгасціла і лазню затапіла. Павялі яго ў лазню, а яна ўзяла пакет разламала і напісала: «Штоб, мая мілая, не бачыў я цябе ў вочы да майго прыезду!»

Прыйшоў той з лазні, узяў пакет і паехаў па сваёй дарозе. Так жа заязджае к большай сястрэ. І тая яго прыгасціла і павяла ў лазню. А сама пакет разламала і падправіла яшчэ горш. Прыязджае ён к царэўне і аддае пакет. Царэўна пакет чытае і крэпка плача: «Ах, мой мілы! Што ты са мной робіш? Я ж табе чым выхвалялася, то й здзелала».

Толькі ж думаць нечага, а царскае слова свята: што напісана, тое і нада дзелаць.

Гукнула бондараў і кавалёў:

— Зрабіце мне бочку, а вы, кавалі, набіце жалезныя абручы.

Бочку для яе зрабілі. Яна ўзяла адзінаццаць хлопчыкаў у бочку ўпусціла, закрыла і пусціла на мора:

— Плывіце! Калі я не грэшная душа, дык вы жывы будзеце!

А сама дванаццатага ўзяла і пайшла ў свет са свайго царства. Хадзіла яна, хадзіла па ўсіх царствах і знайшла сабе манастыр. Просіцца ў гуменшага:

— Прыміце мяне за чалядку!

Гуменшы прыняў яе за чалядку. А хлопчыка стала прасіць, штоб у школу. Той жа хлопчык вучыцца скорым поспехам. І так вывучыўся ён за год, што другія па дзесяць год вучацца.

Скора казка кажацца, ды не скора дзела дзелаецца.

І вырас той хлопчык. І стала яму праціўна: бачыць ён, што яго матка за чалядку служа. Ён гаворыць:

— Матушка, годзе табе служыць, а пойдзем мы ды збудуем на бальшой дарозе ля мора сабе дом!

От яны і пайшлі адтуль. Прыйшлі к мору і выстраілі сабе там дом, і сталі займацца рознымі таргоўлямі. Ішлі бальшой дарогай звозчыкі каля дома, і ажарабілася ў іх кабыла. Дык яны падарылі яму жарэбчыка.

Прыязджалі к яму карабельшчыкі,— ішлі морам. Так жа ён іх і ўгасціў. І пабылі ў яго карабельшчыкі, і адпраўляюцца яны к свайму цару. Хлопчык іх праважае і заходзіць к свайму каню. Кажа яму конь:

— Ах, хазяін мой любы, узлезь ты на мяне і ўпадзі з мяне, і станеш ты галубцом. І паляціш ты на той бок мора, і сядзеш ты карабельшчыку на

правае плячо, і занясе ён цябе ў царскія комнаты. І выслухаеш ты там, што будзе цар з царыцай гаманіць!

А цар той вярнуўся з воінства, дзе ён быў, і большую сабе сястру ўзяў сваёй жонкай.

Прыходзіць карабельшчык у комнату к цару:

— Найяснейшы, от па той бок мора што здзелалася: выстраіла ўдава дом сабе, і такі ў яе хлопчык, што крашай яго ў свеце няма: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Дрогнула царскае сэрца, і зараз жа адправіў карабельшчыка з свайго дому.

— Ах,— гаворыць,— мая мілая, паедзем, пасмотрым на той бок, што там за хлопчык — гэта дзіва?

— Э, мой мілы, ці гэта дзіва? Гэта не дзіва, а ёсць дзіва: за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, на моры, на лукамор'і, на востраве стаіць дуб, а на тым дубе дванаццаць кокатаў, а на тых кокатах па дванаццаць святліц, а ў тых святліцах па дванаццаць дзявіц ды шыюць адзежу дарагую, ды кідаюць далоў, і гніе тая адзежа ні к якой пользе!

Вылятае той галубец з царскага дому, прылятае ў свой дом, садзіцца на свайго каня, падае далоў — і стаў чалавекам. І пытае ў яго конь:

— Ах, хазяін мой любы, што там цар з царыцай гаварылі?

— А што ж яны гаварылі. Гэта, гавораць, не дзіва, а то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, на моры, на лукамор'і, стаіць дуб, а на тым дубе дванаццаць кокатаў, а на тых кокатах па дванаццаць святліц, а ў тых святліцах па дванаццаць дзявіц ды шыюць адзежу дарагую, ды кідаюць далоў, і гніе тая адзежа ні к якой пользе! Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва дастаць?

— Прасі ў маткі благаславення, і паедзем у пуць!

Дала яму матка благаславенне, сеў ён на свайго каня і паехаў у пуць! Прыязджае к таму дубу:

— Здрастуй табе, дубе!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— Эх, дубе, у якім ты ў нядобрым месцы стаіш! Калі б ты пайшоў у маю старану, там бы гэту адзежу насілі б і за цябе бога прасілі!

А той дуб адказвае яму:

— А што ж, будзеш ты маю адзежу знашваць?

— Буду!

— Ну, я з табой пайду!

Сеў царэвіч на свайго каня, а дуб услед за ім ідзе. Прыехаў ён дамоў, прывёз дуб з сабой і паставіў сабе ля дому. І пачулі пра гэта дзіва па ўсяму міру. Ідуць жа гэта дзіва глядзець. Ішлі карабельшчыкі морам, прывярнулі караб к яго двару не так аддыхаць, як гэта дзіва паглядзець. Адпраўляюцца карабельшчыкі. Правstatic хлопчык і заходзіць к свайму каню. Кажа яму конь:

— Вот, хазяін любы, скінься ты галубцом і ляці на той бок мора, і пачуеш ты, што будуць цар з царыцай гаварыць.

Ён узлез на каня, упаў з яго, скінуўся галубцом і паляцеў на той бок мора. Прылятае туды, садзіцца карабельшчыку на плячо, і ўваходзяць яны ў горніцы. Распісуецца цар з карабельшчыкам, і выхваляецца карабельшчык:

— Ах, цару найяснейшы, па той бок мора дзіва з'явілася: стаіць дуб, а на тым дубе дванаццаць кокатаў, а на тых кокатах па дванаццаць святліц, а ў тых святліцах па дванаццаць дзявіц ды шыюць адзежу дарагую.

Цар гэты выслухаў і карабельшчыка адсылае назад, і кажа царыцы:

— Ну, мая мілая, паедзем гэта дзіва паглядзім!

— Гэта, мой мілы, не дзіва, а то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць шчогла, а на шчогле зязюля. Што кукне,— дык салдат з яе выйдзе з канём і з сядлом, і на вайну гатоў. Ды есць там нечага, і народ паміpae галоднай смерцю!

От, цяпер жа вылятае той галубец з яго комнат і прылятае ў свой дом, ды пайшоў к каню. І пытае ў яго конь:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, што там цар з царыцай гаманілі?

Адказвае яму хазяін:

— Гаварылі, што то не дзіва, а от то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць шчогла, а на шчогле зязюля. Што кукне,— дык салдат з яе выйдзе з канём і з сядлом, і на вайну гатоў. Ды есць там нечага, і народ паміpae галоднай смерцю! Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можна мне гэта дзіва дастаць?

Конь яму адказвае:

— Прасі ў маткі благаславення, і паедзем у пуць!

Узяў ён благаславенне і паехаў у пуць! Прыязджае к шчогле, злез з каня і гаворыць:

— Здрастуй табе, шчогла!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— У якім ты ў нядобрым месцы стаіш! Калі б ты пайшла ў маю старану, там бы не паміраў гэты народ галоднай смерцю! Ці не пойдзеш ты са мной?

— Пайду!

Ён на свайго каня сеў, а шчогла ўслед за ім. Прыходзіць ён к свайму дому і становіць шчоглу ля дуба. Так жа салдат як упадзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе. То дзіва было, а гэтакага дзіва ніхто не бачыў. І збіраецца многа народу дзіва гэта глядзець. Ішоў карабельшчык морам і прываліў караб свой к берагу дзіва гэта глядзець. Пaглядзеў гэта дзіва і адпраўляецца ў землі ў свае. Хлопчык жа, правёўшы яго, пайшоў к каню. Кажа яму конь:

— Хазяін мой любы, узлезь ты на мяне і ўпадзі з мяне, скінься галубцом і паляці на той бок мора.

Садзіцца галубец карабельшчыку на плячо, і ўносіць ён яго ў дом. І распісуецца цар з карабельшчыкам, і гаворыць карабельшчык:

— Вот, царскае сіяцельства, як па той бок мора, дык то было дзіва, а цяпер яшчэ большае: стаіць шчогла, а на шчогле зязюля. Што кукне,— дык салдат з яе выйдзе з канём і з сядлом, і на вайну гатоў. Як упадзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе.

Адпраўляе ён карабельшчыка і кажа:

— Ах, мая мілая, паедзем гэта дзіва глядзець!

— Э, мой мілы, ці гэта дзіва? То дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, дзікі кабан лычам арэ, нагамі скародзіць, хвастом рассявае, і ў тры дні хлеб паспявае. Ды некаму яго з'ядаць, дык ён там і згнівае.

Галубец адправіўся дамоў і, не заходзячы ў свой дом, ідзе к каню свайму. Пытае ў яго конь:

— Ах, хазяін мой любы, хазяін мой мілы, што там цар з царыцай гаманілі?

— Што ж там цар з царыцай гаманілі. Гэта, гавораць, не дзіва, а от то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, дзікі кабан лычам арэ, нагамі скародзіць, хвастом рассявае, і ў тры дні хлеб паспявае. Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва дастаць?

Конь яму адказвае:

— Прасі ў маткі благаславення, і паедзем у пуць!

Ён узяў благаславенне, сеў на свайго добрага каня і паехаў. Прыязджае к кабану.

— Здрастуй табе, кабан!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— Эх, у якім ты месцы ў нядобрым сташ, хлеб сееш! От як бы ты пайшоў у маю старану, там бы мы гэта жыта зжыналі і гэты хлеб з'ядалі, і за цябе б бога прасілі! Ці не пойдзеш ты са мною?

— Пайду!

Ён сеў на свайго на добрага каня, а дзік услед за ім. Прыводзіць царэвіч яго к свайму двару і становіць на сцяпу. Так жа, як зязюля кукне,— салдат з яе выйдзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе — жыта жаць.

Скора казка кажацца, ды няскора дзела дзелаецца.

У яго ўжо здзелалася такое царства, што ўжо больш, чым у цара. То дзіва глядзелі, а то яшчэ больш сталі людзі глядзець.

Ішоў карабельшчык морам і прывярнуў караб гэтага дзіва паглядзець. Праводзіць хлопчык карабельшчыка і заходзіць к свайму каню. Кажа яму конь:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, скінься ты галубцом, ляці на той бок мора і паслухай, што цар з царыцай будуць гаманіць.

Ён скінуўся галубцом і паляцеў. Садзіцца карабельшчыку на плячо, і

ўносіць ён яго ў дом. І распісуецца цар з карабельшчыкам, і гаворыць карабельшчык:

— Вот, царскае сіяцельства, як па той бок мора, дык было дзіва, а цяпер яшчэ паболела: стаіць на сцяпу дзікі кабан, лычам арэ, нагамі скародзіць, хвастом рассявае, і ў тры дні хлеб паспявае. Салдат з дуба выйдзе, у адзежу надзяецца і на работу ідзе — жыта жаць.

Цар карабельшчыка назад адправіў і стаў з царыцай гаманіць:

— Ах, мая мілая, ну, паедзем гэта дзіва паглядзім!

А яна яму адказвае:

— Гэта дзіва не дзіва, а ёсць дзіва: за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве ёсць рака — кісялёвы берагі; прыдзі — пакушай і сумкі не рушай! Як паядаеш, яна зноў зарасце.

Адпраўляецца той галубец з царскага дому і прылятае к свайму дому. Не зайшоўшы ў дом, пайшоў к свайму каню. От, конь у яго пытае:

— Хазяін мой мілы, хазяін мой любы, што цар з царыцай гаманілі?

— А што гаманілі. Казалі, што гэта не дзіва, а от дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, ёсць рака — кісялёвы берагі; прыдзі — пакушай і сумкі не рушай! Як паядаеш, яна зноў зарасце. Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва дастаць?

Конь гаворыць:

— Вазьмі ў маткі благаславенне, і паедзем у пуць!

Ён узяў благаславенне, сеў і паехаў. Прыязджае к рацэ к гэтай.

— Здрастуй, рака — кісялёвы берагі!

— Здрастуй, Іван Іванавіч-царэвіч!

— Эх, у якім ты ў нядобрым месцы стаіш! Ці не пойдзеш ты са мной у маю старану? Там бы цябе з'ядалі, там бы цябе співалі, і ўсягды б ты свежая была.

— Пайду!

Сеў ён на свайго добрага каня, а рака ўслед за ім. І прывёз ён яе к свайму дому, і паставіў ля берага. Так жа дуб адзежу шые, зязюля кукне,— салдат выйдзе, адзежу надзяе, кабан хлеб засявае, салдат хлеб паесць, ідзе к рацэ. Прыйшоў, паядаў і пайшоў жыта жаць, і ў цагельню, у розныя работы там. То ж дзіва глядзелі, а то яшчэ больш сталі глядзець, з усяго свету прыязджаць. Так жа ішоў карабельшчык і прычаліў караб гэтага самага дзіва паглядзець. Паглядзеўшы гэта дзіва, правёў яго хлопчык гэты. І правёўшы яго, пайшоў к каню к свайму. І конь яму гаворыць:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, скінься галубцом і ляці на той бок мора, паслухай, што цар з царыцай будуць гаманіць.

Ён на каня ўзлез, з каня ўпаў і скінуўся галубцом. І паляцеў на той бок мора, сеў карабельшчыку на правае плячо, і ўнёс яго карабельшчык у царскія пакоі. Распісуецца цар з карабельшчыкам, і гаворыць яму карабельшчык:

— Вот, царскае сіяцельства, якое дзіва па той бок мора! То было дзіва, а цяпер яшчэ паболела. Цячэ рака — кісялёвы берагі; прыдзі — пакушай і сумкі не рушай! І як паядаеш, яна зноў зарасце. Так жа дуб адзежу шые, зязюля кукне,— салдат выйдзе, кабан хлеб засявае, салдат адзежу надзявае, хлеба пад'есць, ідзе к рацэ. Прыйшоў, паядаў і на работу пайшоў.

Цар адправіў карабельшчыка і гаворыць на царыцу:

— Ну, мая мілая, паедзем дзіва паглядзім!

Яна яму адказвае:

— Гэта дзіва не дзіва, а то дзіва, што дзесь, за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць кельня ля мора, і ў той кельні адзінаццаць братоў спасаюцца. І не знаюць яны, што яны браты адной маткі і аднаго бацькі. Дык от дзіва!

Адпраўляецца той галубец к свайму двару. Не пайшоў у дом, ды пайшоў к каню. Конь яго пытае:

— Хазяін мой мілы, хазяін мой любы, што цар з царыцай гаманілі?

— А што гаманілі. Казалі, што гэта не дзіва, а то дзіва, што за трыдзевяць зямель, у іншым царстве, у вялікім гасударстве, стаіць кельня ля мора, і ў той кельні адзінаццаць братоў спасаюцца. І не знаюць яны, што яны браты адной маткі і аднаго бацькі. Дык ці можам мы гэтага дзіва дастаць?

Гаворыць конь яму:

— Ідзі к маці і прасі, каб яна спякла праскуру!

Так жа ідзе ён ад свайго каня, хлопчык той, к маці сваёй:

— Матушка, спячы мне праскуру!

Яна паслухала яго і спякла праскуру. Ён жа ўзяў тую праскуру, сеў на свайго добрага каня і паехаў у пуць. Прыязджае к той кельні. І падказвае яму конь:

— Ступай ты ў кельню і вазьмі тую праскуру, што на стале будзе ляжаць, а гэту палажы, і сам схавайся!

Так жа ён увайшоў у кельню і ўзяў тую праскуру, а сваю паклаў, і сам схаваўся. Уваходзяць адзінаццаць братоў у кельню. Паселі за стол, і разламаў большы брат праскуру на адзінаццаць частак. І ўзялі яны па частачцы, і з'елі тую праскуру. Глянулі адзін на другога, заплакалі.

— Ах,— гаворыць адзін,— гэта ж мы браты ўсе!

І закрычалі:

— Хто тут ёсць? Адзавіся!

Ён жа і адазваўся. Яны ўзялі дружка дружку пацалавалі і ўзналі, што іх дванаццаць братоў родных. І пайшлі яны сабе дамоў, ужо ў хлопчыка гэтага ў гасподу. Яны селі ж у сваю бочку, а ён на свайго добрага каня. Прыязджае дамоў і кажа сваей маці:

— Эх, матушка! Найшоў я сваіх адзінаццаць братоў!

Тут жа і бочка к яму, к яго дому прыйшла. Устанавіўся круг, і выходзяць яны з круга, і выйшла маці процiў іх, і пазвала іх у дом. І сталі яны там піць і гуляць. Так жа збіраліся тое дзіва глядзець, а то стала ўжо збірацца нязметная сіла глядзець ужо на гэтых на хлопчыкаў. Так жа ішоў ка-

рабельшчык і прываліў гэта дзіва глядзець. Паглядзеўшы гэтага дзіва, і адправіўся ў свой караб. Праводзіць яго хлопчык. Заходзіць к каню. Кажа яму конь:

— Скінься ты галубцом і ляці к цару, што будзе цар з царыцай гаманіць?

Ён узлез на каня, упаў з яго, скінуўся галубцом і паляцеў. Прылятае к цару і садзіцца карабельшчыку на плячо, і ўносіць ён яго ў дом. Распісуецца цар. Цяпер карабельшчык яму адказвае:

— Ах, царскае вялічаства! От, па той бок мора то было дзіва, а то й паболела. То быў адзін хлопчык, а цяпер стала дванаццаць: ва ілбе месяц, у патыліцы звязда, па локаць рукі ў срэбры!

Так жа і дрогнула сэрца ў цара! І хутка адправіў карабельшчыка таго, і на сваю царыцу:

— Ну, мая мілая, гэтага дзіва паедзем паглядзім!

— Эх, мой мілы, як жа нам даехаць? Мы паедзем лодкай, хваля ўсхваціцца — мы патопімся. А калі б ад нашага крыльца ды да яго дварца выстраіўся мост — маснічка залатая ды сярэбраная, і стаўбы стаялі, і фанары гарэлі, і жаркі пціцы пелі, от тады мы паедзем!

Той жа галубец выляцеў з таго дому і прыляцеў дамоў. Не заходзіўшы ў дом, пайшоў к каню свайму. І пытае ў яго конь:

— Хазяін мой любы, хазяін мой мілы, што цар з царыцай гаманілі?

— А што гаманілі. Цар казаў: «Ну, паедзем, мая мілая, гэтага дзіва паглядзім», а царыца кажа: «Як жа нам ехаць? У човен сядзем, а хваля ўсхваціцца — мы патопімся. От калі б ад нашага крыльца да яго дварца выстраіўся мост — маснічка залатая ды сярэбраная, і стаўбы стаялі, і фанары гарэлі, і жаркі пціцы пелі, от тады мы паедзем!» Конь мой любы, конь мой мілы, ці не можам мы гэтага дзіва зрабіць?

Ён адказаў:

— Ідзі ты к сваім братам і скажы ім, каб яны старыя кнігі да свету чыталі. А ты ж бяры тапор ды ступай на двор, і так жа колікі цяшы, і ў зямлю бі, старайся, штоб кроў з цябе лілася, а ты верна работай, і чым больш, тым лепш!

Так яны і зрабілі: тыя кнігі чыталі, а ён узяўся гэту работу дзелаць. Стала на зару займацца, стаў на моры мост паднімацца. Сонца ўзышло — і мост гатоў — залатая маснічка і сярэбраная, і фанары загарэліся, і жаркі пціцы запелі. Цар устаў і ўбачыў, што мост стаіць. Тады ён:

— Ну, мая мілая, паедзем гэта дзіва паглядзім!

Зараз жа коней запрэглі і паехалі.

І спаткала яго хазяйка, матка гэтага хлопчыка, з хлебам, з соллю. І там сталі яны піць і гуляць. Пасля бяседы стаў цар збірацца дамоў. Так жа яна кажа:

— Не, царскае вялічаства, у нас так не адпраўляюцца! Наце-тка вам гэту кнігу, прачытайце.

А яна ў гэту кнігу пісала ўсё дзела, як з двара пайшла. Калі ж цар прачытаў гэту кнігу, загадаў адсеч другой жонцы галаву. І сталі яны там жыць.

І я там быў, мёд-віно піў, і ў роце не было, і па барадзе не цякло.

**Іванушка-дурачок і канёк-Гарбунок**

У аднаго чалавека было тры сыны: два разумныя, а трэці дурны. Бацька іх сеяў многа пшаніцы. Нехта ўнадзіўся пшаніцу есці, не так есці, як біць ды таптаць. Вось бацька гаворыць сваім сынам:

— Хто мне злодзея зловіць, таму я адпішу палавіну наследства.

На першую ноч адправіўся старэйшы сын. Ён зайшоў на поле, паглядзеў пшаніцы, зайшоў у сенавал і праспаў. Раніцой ідзе ён і стукае ў дзверы:

— Эй, вы, брацця, спіце? Дзверы адчыніце! Я ўвесь прамёрз, а злодзея не бачыў.

На другую ноч ідзе сярэдні сын, зайшоў на поле, паглядзеў пшаніцы, потым пайшоў к дзеўкам і правёў там цэлую ноч. Раніцой ідзе дамоў і стукае ў дзверы:

— Эй вы, брацця, спіце? Брату дзверы адчыніце! Я прамёрз увесь, а злодзея не бачыў.

На трэцюю ноч прыходзіць чарга да дурня, які нічога не рабіў, толькі на печы ляжаў ды попелам перасыпаўся. Ён стаў збірацца, а брацця яму і гавораць:

— Ну, ідзі, дурань! Убачым, што ты паймаеш.

Дурань набраў хлеба і пайшоў. Зайшоўшы на поле, ён сеў на мяжы, чакае злодзея. Тут чуе ён, што зямля дрыжыць, потым бачыць — бяжыць разнашэрсная кабыла; прыбегла ў пшаніцу і пачала есці і таптаць. Дурань падкраўся і схапіў яе за грыву. Тады стала кабыла прасіцца ў яго чалавечым голасам:

— Пусці, мяне, Іванушка-дурачок! Я прышлю табе трох сваіх сыноў: двух ты можаш прадаць, а трэцяга, канька-Гарбунка, не прадай,— ён табе будзе многа памагаць.

Іван пусціў кабылу. Тут чуе ён — бягуць трое коней: два добрыя, а трэці маленькі, гарбаты. Ён узяў і павёў іх дамоў. Прывёўшы, паставіў іх у парожні хлеў, запёр і, падышоўшы к дому, стаў у дзверы стукаць:

— Гэй вы, сабакі, спіце? Дзверы адчыніце! Ей-ей, я чорта бачыў.

Брацця адчынілі дзверы і гавораць:

— Вось калі дурань, то і робіць па-дурному.

Потым бачаць, што з таго дня дурань не ляжыць на печы, а ходзіць некуды. Яны сталі глядзець, бачаць — стаіць трое коней у хлеве. Яны згаварыліся ўкрасці двух лепшых — і ўкралі. Павялі іх прадаваць. Агледзеўся дурань, прыйшоўшы ў хлеў, як заплача! А канёк-Гарбунок гаворыць:

— Не плач, Іванушка, коней тваіх укралі твае браты. Калі ты хочаш, садзіся на мяне, мы іх дагонім.

Іван сеў, і паімчаліся. Убачыўшы братоў, Іван крычыць:

— Ах вы, сукіны сыны! Нашто вы ўкралі маіх коней?

Брацця гаворацъ:

— Не крычы, Іван, мы купім табе за коні многа булак.

Іван згадзіўся, і паехалі разам. У лесе яны ўбачылі — нешта блішчыць; разумныя брацця гаворацъ дурню:

— Едзь, паглядзі, што там: калі хата, то заедзем аддыхнуцъ.

Дурань паехаў, бачыцъ — Жар-пціца. Ён за пяро, а Гарбунок яму і гаворыцъ:

— Не бяры гэта пяро, цераз яго прымеш многа гора.

Іван не паслухаў і ўзяў. Калі ён пад'ехаў к братам, яны сталі яго спрашываць:

— А што там?

— Нічога, гнілая калода.

— Вось дурань, не хоча сказацъ.

Яны і паехалі далей. Прыехаўшы ў горад, яны ўз'ехалі на базар і сталі. Тут падыходзіць к ім генерал, каторы закупаў цару пару коней і пытае:

— Што хочаце за пару коней?

А дурань гаворыцъ:

— Восем тысяч.

Генерал паглядзеў, паглядзеў і пайшоў далей. Абхадзіў ён увесь базар і не бачыў такіх харошых коней, як у дурня. Ён другі раз падышоў, даў восем тысяч за пару коней і ўзяў дурня к цару ў конюхі. Там усе чысцілі коней пры агні, а дурань возьме пяро Жар-пціцы, уткне ў сцяну, пачысціць каня і зноў схавае пяро. Потым, падпіўшы з другімі конюхамі, дурань сказаў:

— Ёсць такая пціца, ад каторай відна, як ад агню, і калі цар захоча, то я яе дастану.

Потым ён пасварыўся з адным конюхам, і той сказаў цару, што гаварыў Іван. Цар зараз прызывае Івана і гаворыцъ яму:

— Калі ты мне не дастанеш Жар-пціцы, то мой меч — твая галава з плеч.

Дурань пайшоў к каньку-Гарбунку і плача. А канёк-Гарбунок тады яму і кажа:

— Я табе гаварыў: не бяры пяра, а ты ўзяў. Яшчэ горшае гора табе будзе, а гэта не гора; лажыся спацъ — утра вечара мудраней.

На другі дзень Гарбунок сказаў Івану, штоб ё[illegible] у цара віна, пшаніцы і карыта. Цар яму ўсё гэта выдаў. Т[illegible] сеў на Гарбунка і паехаў у поле. Там ён пшаніцу рассыпаў у карыта, віном паліў, а сам схаваўся пад карыта. Тут прылятае цэлая стая жар-пціц і пачалі кляваць пшаніцу, а Іван з-пад карыта — цап! адну за ногі і стаў звацъ Гарбунка. Гарбунок скарэй падбег, Іван сеў на яго — і паімчаліся. Прыехаўшы, Іван панёс цару Жар-пціцу. За такую ўслугу зрабіў цар Івана старшым конюхам.

Не забыўся яшчэ Іван Жар-пціцы. Ён, падпіўшы, стаў гаварыцъ конюхам казку пра Цар-дзявіцу.

— Калі б цар захацеў,— гаварыў ён,— то я б яе дастаў.

Конюхі данясді цару, што Іван хваліцца дастаць Цар-дзявіцу. Цар прызывае Івана і кажа:

— Калі ты мне не дастанеш Цар-дзявіцы, то мой меч — твая галава з плеч.

Іван пайшоў к свайму каню і плача.

— Чаго ты плачаш, Іванушка? — пытае яго конь.

— Цар казаў, што калі не прывязу Цар-дзявіцы, то адсячэ мне галаву.

— А што, Іванушка, гэта ўсё пяро нарабіла: не браў бы пяра, не паехаў бы за Цар-дзявіцай. А цяпер лажыся спаць — утра вечара мудраней.

Назаўтра канёк сказаў Івану:

— Ідзі і папрасі ў цара каснікоў, цукерак і розных штук.

Іван пайшоў і прынёс ўсё, што канёк гаварыў, сеў на канька і паімчаўся. Прыехаўшы к мору, канёк сказаў Івану зрабіць столік. Іван зрабіў. Тады ён кажа Івану:

— Ну, цяпер ты схавайся пад столік і выжыдай: яна пад'едзе, выйдзе на бераг і будзе разглядваць, што на століку. А ты схвацi яе за касу і заві мяне.

Іван так і зрабіў — і паймаў Цар-дзявіцу; прывёз ён яе к цару. Цар, наградзіўшы за гэта Івана, адпусціў яго. Тады цар уздумаў жаніцца на Цардзявіцы, а яна і сказала:

— Адвязі к майму бацьку-Месяцу пісьмо і папрасі яго на вяселле; калі ён пазволіць, то я выйду за цябе.

Цар зноў прызывае Івана, дае яму пісьмо і гаворыць, штоб адвёз к Месяцу. Іван пайшоў к каню і плача.

— Не плач, Іванушка,— кажа конь,— мы гэтаму гору пасобім. Лажыся спаць — утра вечара мудраней.

На другі дзень Іван устаў раніцой і паехаў. Па дарозе ён ехаў цераз кіта, выкінутага на сушу. Іван і пытае ў кіта:

— За што ты так наказан?

— Я сам,— кажа кіт,— не ведаю, за што; гэта мяне выкінуў Месяц.

Іван даехаў да Месяца і аддаў яму пісьмо. Месяц прачытаў пісьмо і кажа:

— Я з ёю бачыцца хачу.

Тады Іван стаў спрашваць, за што ён выкінуў кіта. Месяц сказаў:

— Калі ён выпусціць тры караблі з людзьмі, то я яго спушчу ў мора.

На абратным пуці Іван сказаў кіту, што калі ён выпусціць тры караблі з людьмі, то апусціцца на дно.

Раздаўся шум. Бачыць Іван — выходзяць адзін за другім караблі з кіта. Кіт тут абяцаў памагчы Івану ў горы. Іван, прыехаўшы, усё расказаў Цар-дзявіцы. Тады Цар-дзявіца гаворыць цару:

— Калі ты дастанеш з мора шкатулку, а ў гэтай шкатулцы мой персцень, то выйду за цябе замуж.

Цар зноў вялеў пазваць Івана. Іван вызваў кіта і папрасіў яго, штоб ён адшукаў шкатулку. Кіт як апусціўся ў мора, як даў указ, дык усе рыбы раз-

беглiся шукаць шкатулкі; аказалася, што шкатулка найшлася ў ярша. А ёрш не падыме шкатулкі. Тады прызвалі сома, і ён вынес шкатулку Івану. Іван даставіў шкатулку і персцень. Тады Цар-дзявіца гаворыць цару:

— Калі ты скупаешся ў кіпячай вадзе, малацэ і халоднай вадзе, тады выйду за цябе замуж.

Цар прыказаў нагрэць вады, малака. Калі ўсё было гатова, цар сказаў Івану:

— Ну, Іванушка! Сягоння мы з табою будзем купацца.

Цар думаў: «Калі Іван скупаецца, тады і я». А Іван пайшоў к каньку і плача.

— Чаго ты плачаш, Іванушка?

— Як жа мне не плакаць? Цар сказаў купацца мне ў кіпені.

— Нічога! Як усё будзе гатова, то ты скажы, штоб прывялі мяне к табе папрашчацца.

— Добра,— кажа Іван.

І калі ўсё было гатова, то ён сказаў:

— Прывядзіце майго коніка, я хачу з ім папрашчацца.

Цар прыказаў прывесці. Прывялі коніка. Іван стаў раздзявацца. Калі раздзеўся, конь панюхаў адзін кацёл з малаком — Іван туды, потым конь у другі кацёл — Іван туды, а халодную ваду конь не нюхаў. Тады Іван туды ўвайшоў, выкупаўся, а як выйшаў адтуль, зрабіўся такім харошым, што другога не было. Калі Іван купаўся, то і Цар-дзявіца глядзела, а як стаў купацца цар, то яна адвярнулася. Цар як ускочыў у адзін кацёл, так там і астаўся. Тады Цар-дзявіца сказала народу:

— Калі хочаце, штоб я была вашаю царыцай, то дазвольце мне жаніцца з гэтым маладцом.

Усе згадзіліся, Іванушка-дурачок ажаніўся з Цар-дзявіцай, і ўстроілі пір на ўвесь мір.

І я там быў, мёд-піва піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала.

## Рогі

У некатарым царстве, у некатарым гасударстве, ці можа ў тым, што мы жывём, жыў сабе чалавек. І было ў яго тры сынкі, як саколікі. Ён іх парасціў, пагадаваў, пуць ім падаваў, а дзяліць ніводнага не дзяліў да смерці да сваё. Колькі там часу прайшло, старык сваіх сыноў сабраў і гаворыць ім:

— Мае сынкі, я ўжо збіраюся ўміраць, і трэба мне вас раздзяліць. Вазьміце вы мяне на бераг к сіняму мору, ды перанясіце цераз мора на востраў пад зялёны дуб: я вас там раздзялю.

Яго сыны ўзялі і панеслі. Неслі напераменку, кажан панямногу. Можа яны пранеслі яго тры дні, можа больш, пакуль данеслі да месца. А пад зялёным дубам ды стаяла ў яго скрынка. Ён вынімае з тае скрынкі торбачку, дае большаму сыну і пытае:

— Ці даволен ты, мой сын, маёй наградай?

Ён адказвае:

— Дзелаць нечага, даволен!

А сам бачыць, што няма нічога ў ёй, у торбачцы — пустая. І недаволен, і баіцца бацьку сердзіць.

Вынімае бацька другому сыну, сярэдняму, ражок, што трубяць, і зноў кажа:

— Ну, ці даволен ты, мой сын, маёй нāградай?

Ён адказвае:

— Дзелаць нечага, даволен!

Тады бацька вынімае меншаму сыну, халастому — а тыя два жанатыя — рушнічок і зноў пытае:

— Ці даволен ты, мой сын, маёй нāградай?

І ён адказвае, як браты.

Тады ён і расказвае сынам.

Большаму сыну кажа:

— Вось, мой сын! Ты пры хазяйстве жывеш, у цябе ўсякія расходы хазяйскія. Ты гэту торбачку, калі нада, скалатні — будзе яна табе поўная. Выбярэш з яе, што нада, і павесіш. А калі яшчэ нада, зноў скалатні — зноў яна будзе поўная. І пакуль твая жысць — будзе з цябе!

А другому, сярэдняму:

— А ты, мой сын, па лясніцкай часці ходзіш, па лясах; случай табе ўсякі бывае. Стрэціць цябе непрыяцель, ці ўдвух, ці ўтрох — колькі случыцца,— дык ты ў адзін канец ражка затрубі, дык табе помач і будзе, колькі табе трэба. А ў другі кончык затрубіш, дык яны зноў убяруцца ў ражок!

— А ты, меншы мой сын,— халасты; табе яшчэ нічога не трэба; табе трэба толькі, каб з дзеўкамі пагуляць. Дык ты вазьмі рушнічок раскаці ды скажы: «Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне туды і туды,— куды хочаш!»

Тады і пытае ў іх:

— А што, мае сынкі, ці давольны вы маёй нāградай?

Яны яму гаворацьь:

— Давольны!

Яны з радасці ўзялі свайго бацьку ды панеслі дамоў. Туды неслі тры дні, а адтуль за паўтара справіліся. Прынеслі яго дамоў. Ён колькі ўрэмя пажыў ды і памёр. Сыны сталі жыць разам, брат з братам.

І праявілася за дзевяць зямель, у дзесятым царстве, у цара дачка, такая прыгожая і карцёжніца бальшая. Колькі к ёй кавалераў наязджала, дык яна ў карты абыграе, ды тады і выб'е. Пачуў пра гэта халасты і давай у большага брата прасіць торбачкі. Большы брат не хацеў яму даць:

— Перавядзеш і нічога з цябе не будзе!

Доўга цягаліся, а ўрэшце брат торбачку даў. Ён выйшаў на двор, выняў рушнічок ды кажа:

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне к той царэўне!

Прыляцеў туды, увайшоў у горад, купіў сабе харошую адзежу, купецкую, адзеўся ды і ходзіць па горадзе, і пытае ў тых людзей:

— Як бы мне к вашай княжне падысці?

Яны яму кажуць:

— Не гэткія былі, яна іх абыгрывала, а цябе нечага абыгрываць!

— А ўжо ж паспрабуем, што з гэтага будзе!

Яны яго і прывялі да часавых. Часавыя прапусцілі. Ён увайшоў у горніцу, паздраствауся і сеў піраваць. Папілі-пагулялі і давай у карты граць. Гралі некалькі дзён, некалькі сутак: яна ўсё адбірае грошы, а ён усё з торбачкі калоціць. Яна ў яго пытае:

— Вот што, мой мілы друг, любезны! З кім я грала — абыгрывала, ну цябе не абыграць. Адкуль ты гэтыя грошы бярэш? Відна, я твая!

— А ўжо ж мая.

Ну, бросілі ў карты гуляць і селі хлеб-соль есці. Яна яго харашэнька напаіла і стала пытаць.

— Усё роўна, я твая! Скажы мне праўду, адкуль ты гэтыя грошы бярэш?

Чалавек выпіў — розум паслабеў — і сказаў, адкуль грошы ён бярэ:

— У мяне ёсць такая бацькава торбачка; не мая, а большага брата. Дык я яе буду калаціць, а яна ўсё будзе поўная...

Яна тады яму яшчэ крапчэйшага напітку дала, каб ён упіўся болей.

Піў ён, піў, пакуль напіўся, ды і з ног зваліўся. Царэўна яго тады абабрала, торбачку ўзяла, гукнула сваіх часавых, ды як дала яму казацкіх нагаяў! Выбіла харашэнька, ды і за дзверы выпіхнула. Ён праспаўся, прачхнуўся, паглядзеў — няма торбачкі, толькі рушнічок! Ён рушнічок выняў, разаслаў.

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне дамоў!

Прыскочыў дамоў, стаў у сярэдняга брата прасіць ражка. Сярэдні брат стаў на яго сварыцца:

— Што? Перавёў большага брата награду, перавядзеш і маю!

— Што бог дасць, тое і будзе: можа вярну і тую — і тваю, і сваю.

Сярэдняму брату дзелаць нечага: даў яму ражок. Малодшы брат выйшаў на двор, рушнічок выняў, разлажыў:

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне к той царэўне!

Ён зноў на месцы. Ля таго горада астанавіўся на полі і стаў у ражок граць. Датуль граў, пакуль увесь той горад войскам абняў. У таго цара няма столькі сілы, а ў яго рознае войска: і казакі, і жандары, і якое толькі на свеце ёсць. Распяў белы шацёр, паставіў часавых, абняў увесь горад пушкамі, розным прыпасам і смаліць у горад!

І кажа меншы брат:

— Разару ўсё царства, горад, затым што тут жывуць не цар з царэўнай, а зладзеі. Як ім можна было мяне абкрасці!

Цар той выйшаў на двор, глянуў у празорную трубу і спужаўся, што няма яму сілы, няма ў яго столькі войска, нечым яму бараніцца. Ён стаў на сваю дачку, на царэўну, сварыцца:

— Ідзі, мая дачка, перапрасі, бо цераз цябе нам усім галовы пакласці. Не трэба было табе чапаць тую торбачку.

Царэўна зараз жа надзелася ў харошае плацце, узяла з сабою прыслугу і пайшла да яго з просьбай. Падыходзіць да яго шатра — часавыя яе не пускаюць:

— Куды ідзеш, караўка нямытая? Ты яго раз ababрала.

Яна горка плача і просіць, як можна просіць, каб яны яе прапусцілі.

А ён не спіць, усё чуе ды толькі яе муштруе. Падаждаўшы, яна падыходзіць другі раз:

— Здзелайце міласць, прапусціце мяне к свайму гаспадару!

Яны яе ў грудзі, не пускаюць, кажуць, што гасудар яшчэ спіць, не ўстаў.

А ён не спіць, ды ўсё яе так муштруе.

За трэцім разам прыйшла, ён вялеў прапусціць часавым. Яна падышла к яму, укленчыла, стала плакаць, стала прасіць:

— Друг мой любезны, прасці мяне! Пасля гэтага не буду ўжо так рабіць. Усё роўна ты мой, я твая!

Ён сеў, давай яе гасціць з сваімі часавымі, і яе прыслугу прыняў. Папіравалі-пагулялі, і стала яна прасіць яго ў свой дом з яго дружынаю. Ён узяў сваю дружыну і яе прыслугу і пайшлі ў яе дом, і сталі там піць і гуляць. Пілі-гулялі некалькі ўрэмя. Тады царэўна зноў яму харошых напіткаў паднесла, каб ён ап'янеў, і зноў давай у яго спрашваць.

— Адкуль ты набраў столькі войска, што ў майго бацюшкі столькі няма, і як гэта ты ка мне прыстаўляешся з далёкай стараны?

Ён, выпіўшы добра, ды і прызнаўся ёй:

— У мяне ёсць такі ражок, што як у яго затрублю, дык яшчэ ў пяць разоў набярэцца столькі. У адзін канец затрублю,— яно набярэцца, а ў другі канец затрублю,— яно зноў убярэцца ўсё. І ёсць у мяне такі рушнічок: куды ўгодна ён мяне занясе і зноў дамоў прынясе.

Яна яго яшчэ больш падпаіла крапчэйшымі напіткамі. Ён датуль піў, пакуль і заснуў. Яна яго харашэнька ababрала: узяла ражок, узяла рушнічок, выйшла на ганкі і давай трубіць у ражок у другі канец. Патуль трубіла, пакуль ўсё войска ўтрубіла і часавыя яго паўцякалі. Толькі засталіся яе часавыя, яе слугі, а яго няма нікога. Яна сваіх часавых гукнула, яго ўзбудзіла, вывела на двор, ды дала яму такіх нагаяў казацкіх, колькі яму ўлезла. Выцягнулі яго за горад ды і ўкінулі ў балку. Ён колькі ўрэмя праляжаў, пакуль прачухаўся пасля чэсці, тады папоўз кой-як ровам тым і пайшоў, не чаяў ужо жывым быць. Нельга яму і дамоў ісці, патаму абкрадзен увесь. Дык ён сабе думае: «Пайду, ці не найду дзе якую пропасць — упрапасціцца, бо мне дамоў нельга вярнуцца: і братоў баюся, і не з чым».

Ішоў ён колькі ўрэмя — ці дзень, ці два, ці можа і тры берагам, паўз

балота, чуе — яблыкамі пахне. Ён сабе думае: «Пайду, ці не найду дзе яблычка смáгу прагнаць — бо ўжо рот заросшы смагай — недзе ані напіцца, ані ўкусіць чаго».

Найшоў яблыню рагатую, кашлатую; сарваў яблычка і ўкусіў таго яблычка. Як параслі на ім рогі! Такія, як на яблыньцы! Было яму ліха, ды і пагорала! То ішоў, дык нічога хоць не чапаў, а то ідзе, дык бярэзнік скобліць рагамі!

Прайшоў колькі ўрэмя — ці дзень, ці два, ці можа тры, паскабліў рагамі бярэзнік, ужо чуе зноў яблычны дух. Ён сабе думае так: «Пайду, ці не з'ем ужо такога яблыка, каб ужо прапасці!»

Стыдна ўжо выйсці і на свет божы з гэтакай карай. Адна кара, што рогі, другая кара, што пабіты крэпка бізунамі.

Найшоў яблыню, харошанькую яблыню, сарваў яблычка, укусіў — і адпалі ўсе яго рогі. І стаў ён яшчэ лепшы за таго як быў: і здаровы, і боль уся ўнялася. Ён яшчэ нарваў яблык, дастаў хустачку — была ў яго ў карманіку,— завярнуў іх ды і пайшоў тым следам, каторым скабліў бярэзнік рагамі. Прыйшоў да той яблыні да рагатай, нарваў і тых яблык ды ў другое месца паклаў. Ды і пайшоў у горад у той самы зноў. Ажно нанімае цар работнікаў засаджваць сад у сябе. Колькі ўрэмя ён яго засаджвае, а сад ўсё сохне. Нанімае цар садоўнікаў. Ён і аб'явіўся:

— Я магу сад садзіць!

Данеслі гэта цару, што такі і такі хлопец паднімаецца быць за садоўніка. Выклікае цар яго і пытае:

— Можаш ты сад садзіць?

— Чаму не, магу.

Цар яго прыстаўляе к народам, а той гаворыць:

— Я не хачу з людзьмі садзіць, адвядзіце мне ў другім месцы, з другога крыла!

Паказалі яму другое месца, ён і стаў займацца работай.

Гэта казка скора кажацца, ды няскора дзела ішло.

Народ садзіць сад — ён сохне, а ён садзіць — расце, і цвіце, і яблыкі растуць.

Па заканчэнні дзела пайшлі глядзець работу. Пайшлі, дзе садзілі народы — няма нічога, як было, так і ёсць — пасохла ўсё. Яны пасмяяліся і кажуць:

— Пойдзем глядзець новага садоўніка работу,— у яго работа добрая: і расце, і цвіце, і яблыкі растуць, і польза вялікая.

Данеслі яны самому цару, што не трэба больш нікога браць і плаціць, акрамя новага садоўніка: няхай жыве і садзіць сад. Цар выстраіў яму святлічку і прыставіў к яму дзявіцу, каб яму служыла, пішч гатавала, падносіла кушанне, прыбірала, абмывала. Ён і заняўся работай. І пачала царэўніна служанка хадзіць да яго на гулянкі, і ён пачаў яе прывучаць да сябе і кажа:

— Ты красівая дзявіца, а то б яшчэ пакрасівела, калі б з'ела майго яблыка, што я табе дам. Мудрэй бы была за сваю царэўну!

Ну, гэта просіць:

— Пажалуста, дай мне яблычка!

Ён ёй яблычка харошае выняў і даў. Яна яго з'ела — то была красівая, а то яшчэ пакрасівела, што яе і царэўна не ўвазнала. І пытае ў яе:

— Дзе ты такой масці набрала, нарумянілася?

— Гэта мне даў садоўнік новы яблыка, дык я як з'ела, дык і падужэла, і папрыгажэла, і павесялела.

Царэўна кажа:

— Хадзем жа мы патаргуем і мне яблыка!

Ну, і пайшлі таргаваць яблыка. Прыходзяць к садоўніку і таргуюць. Ён дае не тое яблыка, а другое — рагатае — і просіць за яго, што сам хоча. Садоўнік яблычка ёй паклаў, грошы ад яе ўзяў і гаворыць:

— Ты ж не еж яго цяпер, а з'ясі заўтра ўранні.

А для таго ён ўрэмя прадаўжае, каб уцячы адтуль. Узяла яна яблычка, пайшлі яны з святліцы. Ён святліцу зачыніў, усё сваё сабраў, ды сам — марш!

Гэта казка скора кажацца, ды няскора дзела ішло.

Пакуль царэўна пераначавала, ды садоўнік скрыўся ў горадзе, і няма нікога ў святліцы. Назаўтра ўранні памылася царэўна і з'ела таго яблыка. Як параслі на царэўне рогі, дык не месцяцца і ў комнаце. Што хоча каторы зламаць — баліць; хоча сарваць — баліць; і не ўходзіць у дзверы, не можна выйсці вон. Цар кажа:

— Вось, мая дачка! Гэта, верна, ён самы! Будзеш ты цяпер гараваць, было табе не дзелаць такіх праступкаў!

Здзелалі вобыск па ўсіх гарадах, ці не знойдуць якога знахара, якога чалавека, каб ён збавіць мог. Той жа самы хлопец купіў ксяндзоўскае плацце, надзеўся так, як ксёндз, навучыўся маленька грамаце і аб'явіўся:

— Я магу вычытаць ёй ўсё, толькі каб яна сазналася ў сваіх грахах. Прыставілі яго к ёй. І стаў пытацца грахоў.

— Дзіцятка, можа ты каго абідзела? Можа хто на цябе плачацца? Ну, яна і прызналася:

— Торбачку ўзяла ў такога і такога кавалера.

Ён кажа:

— Аддай, дзіцятка, гэта мне, гэта трэба на касцёл аддаць!

Яна аддала яму торбачку. Ён тады стаў чытаць малітву — што чытае, а што маніць, патаму грамаце знаў мала, а гэта толькі так, каб як-небудзь ды сваё ўзяць яму.

— Не, дзіцятка: яшчэ не ўсе грахі! Яшчэ нешта заняла ў людзей, і тое аддай на касцёл!

Яна і ражок аддала яму і рушнічок аддала. Ён тады вялеў тапіць лазню і вялеў прыставіць шэсцьдзесят музыкаў. Вытапілі лазню, прыставілі музыкаў, узялі царэўну пад рукі і павялі ў лазню. Ён узяў з яе рукі персцень і ўбіў пад брусам. Раздзеў яе і крыкнуў на музыкаў:

— Грайце!

Музыкі зайгралі, ён як яе ўзяў нагаем, дык зняў ёй радзімую шкуру з пят і да галавы. Тады вакно расчыніў:

— Рушнічок, раскаціся, добры маладзец, садзіся, нясі мяне к братам!

А яе так і кінуў. Тыя музыкі гралі-гралі, ды і стаміліся. І няма ніякага адзыву з лазні. Яны пайшлі, дзверы разламалі, ажно царэўна вісіць пад брусам. Яны адвязалі, адтуль яе вывелі — кроў з яе цячэ... Ну, прыслугі яе абмылі, абчапурылі тыя раны. Бацька і выслаў яе ў свет.

— Ідзі,— кажа,— бо гэта ён сам. Шукай яго, можа дзе знойдзеш!

А ён явіўся к братам. Браты гавораць:

— Годзе табе бадзяцца па свету! Жаніся ўжо тут, ды будзем жыць,— добра, што сваё паўзыскваў!

— Не, брацца, не буду жаніцца, падажду!

Пражыў можа год-паўтара, а можа паўгода — невядома колькі — выехалі яны ўсе ўтраіх з сахамі на поле работаць. Работаюць яны — ажно яна ідзе шляхам. Малодшы і кажа:

— Вы казалі, каб я жаніўся,— во мая жонка ідзе!

Яны засмяяліся,— ведама, бачаць, гэтакае цуда. Падыходзіць яна да яго, абняла яго ногі, стала цалаваць, стала прасіць:

— Прасці мяне! Што было, тое прайшло, а цяперака я твая, што хочаш, то са мной і дзелай, бо мне ўжо дамоў не варочацца адсюль!

Яны сабраліся, паехалі дамоў, узялі яе з сабою. Едуць дзярэўняй, хто ўбачыць — смяюцца. Прыехалі. Прыняў яе за госця і даў ёй яблычка харошае. Яна як з'ела,— дык то была прыгожая, а то яшчэ ў пяць разоў папрыгажэла! Рогі з яе спалі, і боль унялася. Ну і пачалі вяселле гуляць. Згулялі вяселле і паслалі к бацьку паклон, што благапалучна ўсё. Бацька даў многа прыданага. І цяпер жывуць.

І я там сляпуючы быў, мёд-віно піў, па губах цякло, а ў рот не папала

## Івашка-мядзведжае вушка

Жыў сабе чалавек, і была ў яго хазяйка. І пайшла яна ў лес у грыбы, і заблудзілася. Налучыўся на яе той жа час мядзведзь. Ён яе ўзяў ды і занёс к сабе. Пажыла яна гады тры і радзіла сына. Дала яна яму імя-празванне Івашка-мядзведжае вушка. Пабыў ён гады тры і рос не па гадах, ды па часах, не па часах, ды па мінутах. Вырас ён і гаворыць:

— Маці, я не буду з табой жыць і з мядзведзем, я пайду ад цябе.

Пайшоў сабе, ідзе дарогай і сустракае чалавека. Той гаворыць:

— Здрастуй, Івашка-мядзведжае вушка!

— Добрае здароўе, Дуб-Дубавік!

— А куды ты ідзеш? — пытае Дуб-Дубавік у Івашкі-мядзведжага вушка.

— Пайду ў свет.

— Ах, брат, пайду і я з табой!

— Ну, пойдзем!

Колькі яны там ішлі, бачаць — стаіць чалавек. Яны гавораць:

— Здрастуй, Гара-Гаравік!

— Добрае здароўе, Івашка-мядзведжае вушка і Дуб-Дубавік! Куды вы ідзеця?

— Ідзём у свет!

— Пайду і я з вамі!

— Ну, хадзі,— гаворыць Івашка-мядзведжае вушка.

Ну, яны пайшлі ўтрох. Ішлі, ішлі і нашлі яны сабе дом.

— Вот, браццы, тут цяпер і будзем жыць. Ты, Гара-Гаравік, аставайся абед варыць, а мы пойдзем на ахоту.

Той січас узяў вала зарэзаў, аблупіў, у кацёл уклаў, цяпло расклаў і давай варыць. Толькі гэта гавядзіна закіпела, нехта ідзе, стукае ў дзверы і кажа:

— Адчыні, хто ў маім доме ёсць!

Гэта Бяссмертны Кашчэй, ён сам з кокаць, барада з локаць. Ён яму адчыніў.

— Уссадзі мяне на лаўку!

Ён узяў і ўссадзіў яго.

— Ну, дай мне есці!

Ён яму і даў вала. Кашчэй гэтага вала з'еў, тады ўзяў паласу ў яго выкраіў з плячэй і ўляцеў. Ну, таму некалі дажыдацца, а трэба другога рэзаць вала — абед трэба гатаваць. Толькі што ён закіпеў, прыходзяць яго таварышы.

— Ну,— кажуць,— брат, давай абедаць!

Ён выняў зусім яшчэ сырое мяса. Яны сталі есці:

— Як ты варыў? Зусім яно ў цябе сырое!

— Ах, браццы, пакуль дровы нарубіў, спазніўся.

Ну, аднака, ён таго не сказаў ім, што яму такая штука здзелана. Івашка-мядзведжае вушка гаворыць:

— Эх, брат, не стоіць табе! А ну-тка ты, Дуб-Дубавік, аставайся тут, ці не лепш ты згатовіш!

Дуб-Дубавік начаў пачышчы варочацца. Вала зарэзаў, аблупіў, у кацёл уклаў, цяпло расклаў і стаў варыць яго і думае: «Як бы паскарэй». Тут жа і ляціць той самы змей, сам з кокаць, барада з локаць — Кашчэй Бяссмертны, і стукае ў дзверы:

— Хто ў маім доме ёсць, адчыні!

Ён яму адчыніў.

— Перасадзі мяне цераз парог!

Ён перасадзіў.

— Ну, уссадзі мяне на лаўку!

Ён уссадзіў.

— Дай мне есці!

Ён яму даў есці. Кашчэй вала з'еў, паласу выкраіў з яго і паляцеў. Той

думае: «От гора!» Пачаў шчэ хутчэй варочацца, зарэзаў другога вала, стаў гатаваць. Ды січас яны і прыходзяць:

— Давай, брат, абедаць!

Ён вынімае зусім сырое мяса. Івашка-мядзведжае вушка і гаворыць:

— Ах, брат ты мой! Я ж думаў, што ты лепш згатуеш, ажно ты яшчэ горш! Аднака ідзіце вы сабе, брацця, на ахоту, а я застануся гатаваць; ці не лепш я вас згатую!

Івашка-мядзведжае вушка вала зарэзаў, уклаў у кацёл і гатовіць. Развёў цяпло. Ды толькі ён згатаваў — ляціць Кашчэй і гаворыць:

— Хто ў маім доме ёсць, адчыні мне!

— Рукі не паадсыхалі, калі трэба, дык адчыніш!

Ён адчыніў.

— А ну, перасадзі мяне цераз парог!

— Ногі не паадсыхалі, пералезеш і сам!

— Уссадзі мяне на лаўку!

— Ногі не паадсыхалі, сам узлезеш!

— Дай мне,— кажа,— паесці!

— Калі нагатаваў, дык паеш! Я нагатаваў не для цябе.

Кашчэй схваціўся ды на яго. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўхапіў яго за бараду ды пацёг прама ў лес. Узяў расколоў дуб, засадзіў яго бараду ў дуб ды і забіў клінам.

— Вот ты,— кажа,— тут пасядзі, пакуль таварышы прыдуць!

Прыходзяць таварышы.

— Ну, давайце-ка, брацця, абедаць! Я зварыў не так, як вы. А хочаце, брацця, паабедаўшы паглядзець, што я ўсадзіў у дуба,— бараду ўшчаміў.

Прыйшлі яны ў тое месца, пасматрэлі, ажно яго нету. Вырваўся і паляцеў Кашчэй — барада ў дубе засталася.

— Пойдзем-ка, брацця, паглядзім, куды ён пайшоў, ведзь кроў ёсць!

От яны ўзялі і пайшлі. Увайшлі ў лес у агромны. Тады Івашка-мядзведжае вушка кажа:

— Ну, Дуб-Дубавік, давай дарогу!

Пачаў Дуб-Дубавік іграць дубы, дарогу прабіраць.

Прабралі дарогу, прыйшлі к вялікай гарэ.

— А ну, Гара-Гаравік, раскапай гару!

Гара-Гаравік раскапаў. Перайшлі яны гару, бачаць — ляжыць вялікі камень. І пад той камень нара. Івашка-мядзведжае вушка кажа:

— Вот, брацця, во ён куды палез! Ну, давай валоў рэзаць і пас сшываць. І ўпусціце мяне туды. Я пайду яго шукаць. Ну, а тады, брацця, як год выйдзе, вы далжны прыбыць сюда, і я пас гэты скалатну, і вы мяне выцягніце.

Тады яны ўзялі валоў штук пятнаццаць зарэзалі, зрабілі пас, пачапілі камень і ўпусцілі туды. І яшчэ не хапае.

— Давай, брацця, яшчэ зарэжам штукі тры ды пас надвяжам!

Нашылі і ўпусцілі яго туды. Дасталі глыбіню.

— Ну, вот, цяпер, брацы, спушчайце мяне туды! Толькі глядзіце ж, цяпер я вас прашу, штоб вы былі ў той час, як мяне апушчаеце, цераз год!

Упусцілі яго туды, ён і пайшоў. Бачыць — стаіць дом медны. Прыходзіць ён у той дом, сядзіць там дзявіца.

— Ах — гаворыць,— здрастуй, Івашка-мядзведжае вушка! Слыхам было слыхаць, а цяпер і ў глазы відаць, зачым ты ходзіш сюды. Мы колькі тут жывём, а рускага чалавека не бачылі. Ну, аднака, ты сваю галаву занёс сюды,— мы жывём у Бяссмертнага Кашчэя.

— Ну, я таго і шукаю!

— Давай мы з табой жаніцца!

Ён гаворыць:

— Я пайду Бяссмертнага Кашчэя шукаць!

— Эх, ты як пойдзеш, там яшчэ крашай мяне ёсць, ты на мяне забудзеш.

— Не, кажа,— я й цябе вазьму адсюль.

Ну, ён пераначаваў, назаўтра ўстаў, памыўся, богу памаліўся і пайшоў. Ідзе, аж стаіць другі дом — сярэбраны.

— Здрастуй,— гаворыць,— дзеўка!

— Здрастуй, здрастуй, Івашка-мядзведжае вушка! Слыхам было слыхаць, а цяпер і ў глазы відаць, зачым ты ходзіш сюды. Мы колькі тут жывём, а рускага чалавека не бачылі. Ну, аднака, ты сваю галаву занёс сюды,— мы жывём у Бяссмертнага Кашчэя!

— Ну, я таго і шукаю, я за ім і іду, за [паганым] Бяссмертным Кашчэем.

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка, давай,— кажа,— з табой жаніцца!

— Не, пайду Бяссмертнага Кашчэя шукаць!

— Ах, ты як пойдзеш, там яшчэ крашай мяне ёсць, ты і на мяне забудзеш.

— Не, я не забуду, я і цябе вазьму.

Ды і пайшоў, пераначаваўшы. Стаіць трэці дом — ды залаты. Ён заходзіць у той дом — сядзіць красівая дзеўка, вышывае.

— А, здрастуй,— гаворыць,— Івашка-мядзведжае вушка! Ці па волі, ці па няволі зайшоў сюды, буйну галаву занёс? Здесь Бяссмертны Кашчэй, дык ён цябе з'есць!

— Ну, я яго шукаю!

— Ды ці шукаеш, ці не шукаеш, а ён тут не такі, як на тым свеце — на гэтым свеце ён сільней! Ну, на ж ты, паеш, і зраблю я цябе булаўкай і ўторну ў падушку.

— Ну, пажалуста, і распрасі, дзе яго смерць.

У скорым урэмю прылятае Бяссмертны Кашчэй і кажа:

— Фе, русь-кось пахне!

Ну, яна яму адказвае:

— Ах, душанька, ты па Русі лятаў, Русі набраўся, так табе бытта аддае тут.

— Я тут колькі жыву, а рускага чалавека не бачыў!

Унясла яна яму гарачых карцеч, ён наглытаўся. Лёг сабе і ляжыць. Яна кажа:

— Душанька, колькі мы з табой жывём! Ну, крый бог, нас хто абідзе — крый бог, твае смерці.

Ён зарагатаў:

— Ха-ха-ха! Маёй смерці нету. Мая смерць: у моры скрыня, а ў скрыні заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцы яйцо — вот то мая смерць!

Устаў і паляцеў гэты Бяссмертны Кашчэй. Яна тады яго і выпусціла, Івашку-мядзведжае вушка, і кажа:

— Знаеш, друг мой, дзе яго смерць? Яго смерць: у моры скрыня, а ў скрыні заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцы яйцо: штоб яйцо ты тое дастаў ды ўдарыў яму ў лоб, от яму і смерць — дык дзе ты дастанеш?

Ён узяў сабе ружайцо і пайшоў.

Сколька ён урэмя ішоў, што баліць ажно яго шкура; есці хоча. Бяжыць воўк. «Ах,— думае,— вазьму ўб'ю, хаця ваўка наемся». Толькі ён злажыўся біць, а воўк і кажа:

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка, не бі мяне, я табе пры злой гадзіне знадаблюся!

Так Івашка-мядзведжае вушка і пайшоў, не стаў біць ваўка. Ішоў, ішоў, аж шкура яго баліць. Думае: «Ну, хто стрэнецца, уб'ю ды з'ем». Бача — ляціць коршык. Ён склаўся. А коршык яму кажа:

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка, не бі мяне, я табе знадаблюся пры злой гадзіне!

Так ён і пайшоў і яго не стаў біць. Колькі ён там ішоў, прыходзіць к мору, аж ляжыць рак такі агромны. Івашка думае: «Адсяку яго палавіну ды з'ем. Вот жа папраўлюся!»

Рак кажа:

— Ах, Івашка-мядзведжае вушка! Ты бачыш, што я гарую — палавіна на беразе, палавіна ў вадзе. Вот ты вазьмі кол ды спіхні мяне ў ваду. Я табе ў злой гадзіне знадаблюся.

Івашка-мядзведжае вушка ўзяў кол і скаціў яго ў ваду. Рак гаворыць:

— Ну, благадару табе, Івашка-мядзведжае вушка, што табе трэба, сказывай!

— А вот што мне трэба. Я прыйшоў сюды за смерцю Кашчэя Бяссмертнага. Ёсць у моры скрыня, а ў скрыні заяц, а ў зайцы вутка, а ў вутцы яйцо!

— Я табе яе дастаўлю.

Так ён папоўз і цягне скрыню перад сабою. Івашка ўзяў гэту скрыню, разбіў крышку, толькі адчыніў — заяц выскачыў і пабег.

— Ах, бог мой, дзе воўк дзеўся, што казаў «я табе пры злой гадзіне знадаблюся»,— каб ён мне ўлавіў гэтага зайца.

Так той жа час воўк і схваціў яго. Івашка ўзяў яго разадраў. Вутка з яго пыр! — і паляцела. Ён, стоючы, і гаворыць:

— Дзе гэта дзеўся той коршык, каб ён мне яе ўлавіў.

Толькі ён сказаў, адкуль узяўся коршык, улавіў тую вутку. Івашка ўзяў разадраў вутку, дастаў яйцо. Ну, яно грознае: «Ах, панясу ў мора, памыю». Стаў мыць, яйцо гэта пакацілася прама ў мора. Ён, стоючы, і кажа:

— Ах, божа мой, божа, што як бы той рак ды мне гэта яйцо падаў!

Так і нясе той рак яйцо яму. Ён узяў і пайшоў. Прыходзіць прама к самаму Бяссмертнаму Кашчэю. Так як ішоў, так прама ў дом. Бяссмертны Кашчэй, як толькі ён увайшоў,— глядзь на яго і кажа:

— Тут Івашка-мядзведжае вушка?

— А ўжо ж тут!

Так Кашчэй усхваціўся, прама к яму і кінуўся. Івашка яго ўдарыў тым яйцом прама ў лоб. Так Бяссмертны Кашчэй кажа:

— Ах, вот мая смерць!

Забіў Івашка Бяссмертнага Кашчэя. Тады кажа:

— Ну, красная дзеўка, я цябе вазьму, а дома гэтага жалка, як мы дом забярэм.

— Я, кажа,— зараз забяру!

Узяла яйцо, абкатнула кругом, так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўзяў яго ў кішэню уклаў, і пайшлі. Прыходзяць к другому дому. Той залаты ўзялі, і шчэ прыходзяць к сярэбранаму.

— Што ж,— кажа,— красная дзеўка, я цябе забяру, а як жа дом забраць?

— Я дом гэты січас забяру!

Узяла яйцо, абкатнула кругом, так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўклаў яго ў кішэню, і пайшлі. Прыходзяць яны к трэцяму дому, к меднаму. Івашка-мядзведжае вушка і кажа:

— Ну вот, я цябе забяру, а як жа ты дом забярэш, дома шкада!

— Эх,— кажа,— я дом січас забяру!

Яна ўзяла яйцо, абкатнула кругом, так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка-мядзведжае вушка ўклаў і яго ў кішэню, і пайшлі. Прыходзяць на тое месца — акурат год прайшоў. Узяў ён і пасадзіў гэту, з з меднага дому, і тарганууў той пас. Яны і пацягнулі. Выцягнулі і пачалі адзін з адным біцца. Той гаворыць:

— Мне.

А той:

— Гэта мне.

А дзеўка гэта кажа:

— Стой, не біцеся, там яшчэ крашай мяне ёсць!

Тады яны ўзялі, спусцілі зноў пас. Івашка пасадзіў з сярэбранага дому дзевушку. Яны пацягнулі. Выцягнулі і сталі зноў біцца. Адзін гаворыць:

— Мне.

А другі:

— Гэта мне.

А дзеўка гэта кажа:

— Стой, не біцеся, там яшчэ дзевушка крашай мяне ёсць!

Яны ўпусцілі пас: ён пасадзіў і трэцюю, што з залатога дому. Тады выцягнулі.

— Ну,— кажуць,— гэта нам па адной, а трэцяя будзе нам за чалядку, служыць будзе нам. А яго, брат, упусцім пас, уцягнем упол і перарэжам — няхай ён уб'еццa.

Упусцілі пас. Ён тады зноў узяў пудоў ля сто зачапіў камень і таргануў пас, і сам адышоў дужа далёка. Яны і пацягнулі яго. Толькі ўпол света ўцягнулі, пас перарубілі, і гудзе той камень назад. Івашка кажа:

— Ах, божа мой, вот бы гэта было мне!

Зажурыўся і пайшоў адзін: «Як ба мне на той свет дастацца?»

І надышла дужа хмара вялікая. Ён і думае: «Пайду я пад дуб схаваюся, што б я не змяк». Прыходзіць пад дуб, стаў і чуе: крычаць пціцы дужа крэпка. Ён тады:

— Ох, божа мой, як пойдзе хмара, засячэ іх дождж! Узлезу я ды іх прыкрыю.

Ён узлез на дуб і распяўся над гняздом, і прыкрыў гэтых дзяцей, пакудава хмара не прайшла.

Калі распагодзілася, ён узяў злез і схараніўся [пад тым дубам]. Не па доўгім часе ляціць пціца-Полугрыца і пытае:

— Ах, дзеткі мае, хто вас прыкрыў ад гэтай хмары? Я ўжо думала, што вы жывы не будзеце.

Яны кажуць:

— Якісь чалавек!

Яна і крычыць:

— Ах, чалавек, што ты за гэта хочаш?

Ён адказвае пціцы-Полугрыцы:

— Я нічога з цябе не хачу, толькі штоб ты мяне даставіла на той свет!

Яна яму і кажа:

— Ідзі набі дзве бочкі мяса, дык я цябе дастаўлю!

— Толькі чым жа мне, якім мясам?

— А вот бы лягушак, мышэй, гадаў, якую звярыну пападзеш, такую бі — і складай у бочкі. Тады мне і скажаш, я цябе панясу.

Пайшоў Івашка-мядзведжае вушка і пачаў біць розныя рознасці: і вужоў, і лягушак, і мышэй — што толькі на свеце ёсць — і складаў у бочку. Набіў і прыходзіць.

— Ну, я ўжо набіў.

Апускаецца пціца-Полугрыца.

— Ну,— кажа,— надзявай мне на адно крыло бочку і на другое, а сам садзіся пасярод. І глядзі: управа гляну — з правай бочкі падай, улева гляну — з левай бочкі падай, і як гляну, так і кідай!

Ну, і панесла яна. Стала пціца-Полугрыца што далей, то вышэй угару падымацца. Як яна на бакі пазірае, так ён гавядзіну кідае. Так ён кідаў, і не даляцелі яны больш як сажань на пяць — ужо гавядзіны не стала. Пціца-Полугрыца ў адзін бок зірнула — няма, у другі бок зірнула — няма, пачала маленька ўніз апускацца. Івашка-мядзведжае вушка ўрабеў. Узяў адрэзаў свае ікры. Як яна зірнула, ён і ўкінуў — так яна зразу сажані на два ўгару ўсхвацілася. Зірнула яна ў другі бок, ён адрэзаў другія ікры і ўкінуў іх у рот. Ну, яна яго ўжо вынесла і пытаецца:

— Скажы, колькі ты мне гавядзіны даваў — ну смашней гэтыя не было. Што гэта за гавядзіна?

А ён кажа:

— Я адрэзаў свае ікры.

— А ну, пакажы!

Ён узяў выставіў. Яна хакнула, яно зразу прырасло. Ён другую выставіў — яна зноў хакнула, і другая болька загаілася.

— Ну, цяпер ідзі паскарэй, ужо твае таварышы скора будуць жаніцца. Яны б даўно жаніліся, толькі без цябе нічога не будзе!

Ён пайшоў — прыходзіць у горад. Сказаўся масцеравым і сапожнікам, шаўцом, значыцца. Ну, аднака ж, ён шыць не ўмее — толькі ён стаў у шаўца кваціраваць. А тая дзевушка самая паследняя, што была ў залатым доме, кажа:

— Калі ты мне пашыеш такія чаравічкі, як у мяне былі ў тым залатым доме, дык я тады ўжо, так таму і быць, з табой буду жаніцца.

Так гэты Дуб-Дубавік выйшаў на вуліцу і пытае:

— Хто такія чаравічкі пашые, во столькі грошай дам!

Шавец і кажа Івашку:

— Ах, Іванічка,— а ён называўся ўжо Іванічка-п'янічка — ах, Іванічка-п'янічка, за адзін заказ штоб чаравічкі такія і такія былі, як у гэтыя барыні,— дужа багата грошай дасць!

А ён яму гаворыць:

— Ідзі бяры задатак і гавары, што я спраўлю.

Ён пайшоў, узяў задатак, даў гэтаму Іванічку. І сказана так: штоб к такому-та часу былі чаравічкі гатовы. А Іванічка напіўся, аб гэтым не думае. Гэты шавец і кажа:

— Ах, Іванічка, што гэта будзе?

— А што?

— А як жа? Згадзіўся: калі ўмееш шыць, дык і шый! Мне за гэта,— кажа,— галаву знімуць!

Ванька пайшоў дом раскаціў, чаравічкі ўзяў і аддаў:

— На, нясі, і будуць у цябе пытацца, хто табе іх шыў, ты скажы, што ў мяне ёсць Іванічка-п'янічка!

Ён і панёс. Узялі гэтыя чаравічкі, і дабраў ён сваю астатнюю плату. Яна гаворыць:

— Во гэта акурат, як мае! Во цяпер я табе яшчэ скажу: «Калі ты справіш мне такое плацце, як у мяне, так таму і быць, будзем жаніцца з табою».

Ён, Дуб-Дубавік, выйшаў на базар і гаворыць:

— Эй, вы, партныя, гаспада, ці не можа хто з вас зрабіць такое і такое плацце!



Казачнік з Браслаўшчыны. Фота І. К. Цішчанкі

Іванічка-п'янічка і гаворыць:

— Паднімайся, бяры задатку пабольш.

Ён узяў задатак і прыходзіць.

— На табе грошы, ну толькі ці зробім, Іванічка?

— Зробім, не бойся!

Ужо гэтаму шаўцу трэба несці, а тут плацце не гатова.

— Ах, Іванічка, што будзем рабіць?

— Я не знаю! Што ўмеў, то і зрабіў, ты паднімайся!

Пайшоў Іванічка, раскаціў дом і ўзяў плацце.

— На, нясі, дабірай астатнія грошы!

Прынёс і аддаў.

— Вот гэта,— кажа царэўна,— маё! От цяпер харашо! Толькі каб у

мяне такі вянок быў! Калі скуеш, то ўжо пэўна, што мы з табой будзем вянчацца!

А Іванічка перайшоў у кузніцу. Выйшаў Дуб-Дубавік на базар і кліча:

— Гаспада кавалі, ці не можаце зрабіць вянок такой-та, як у маёй нявесты быў!

А пачым хто знае, які ён быў. А Іванічка кажа кавалю:

— Кузнец! Ступай, паднімайся!

— Ох, Іванічка, як жа скуём? Мы зробім, які хочаш, толькі як жа не бачыўшы? Ліцо пад ліцо не падвядзеш!

Ён гаворыць:

— Не бойся, бяры грошай паболі!

— Ну, харашо.

Ён пайшоў і падняўся.

— Я,— кажа,— зработаю.

— Зработаеш?

— Зработаю!

— Вот табе грошай столькі-та! Ды глядзі, штоб зрабіў.

Прыходзіць у кузніцу.

— Давай, Іванічка, работаць! Я, брат, гэтага не ўмею, што ўмеў, то рабіў, а гэтага не знаю.

— Ты ж каваль, дык доўжан усякае работаць.

Напіўся Іванічка ды спіць.

— Што, Іванічка, прачынайся, а то галава прапала мая!

Іванічка дамок раскаціў, вянок узяў, прыносіць:

— На, аднясі ды астатнія грошы забярэш!

Каваль панёс гэты вянок. І пытаецца ў яго царэўна:

— Хто ў цябе работае?

— Іванічка-п'янічка!

Запрагае коней, едзе Іванічку глядзець.

— Дзе Іванічка-п'янічка?

Іванічка гэта ўслыхаў — ён узяў лёг да сцяны. Пайшла яна зноў к кавалю і пытаецца ў яго:

— Скажы праўду, ці іменна гэта ён работаў?

— Я вам не скажу — работаў ён ці не, толькі ён мне падае.

Яна зноў к яму. Ён так і ляжыць. От яна прама ў ліцо яму паглядзела.

— Вот,— кажа,— друг мой любезны, я цябе колькі лет ажыдала!

Ну, вот яны і павянчаліся. А Дуб-Дубавік і Гара-Гаравік павянчаліся з меншымі. І сталі жыць ды пажываць кожныя ў сваім доме.

### Жораваў кашалёк

Жылі сабе дзед з бабай. Не мелі яны пры сабе ні дзяцей, ніякіх сродственнікаў, так сабе жылі ўдваіх у хатцы. Жылі яны крэпка бедна. Вядома, былі старыя, гадоў па восемдзесят, а можа й болей — старыя людзі доўга

жылі. Дажылі яны да таго, што і есці нечага. Толькі тым і піталіся, што дзед дастане якіх-небудзь сухаркоў па міру.

Дaждaліся яны вясны-красны. Баба дзеда і настаўляе:

— Дзедка, людзі дык усе сеюць, хоць бы ты пасеяў пшана, у нас недзе гарчык ёсць! Хоць бы мы, бяззубыя, на старасці паспыталі кашкі ці крупнічку цёплага, а то гэтыя сухаркі ўжо абрыдлі!

Дзед бабы паслухаўся і пасеяў пшана па вясне-красне. Высек лядцо, і на лядцы пасеяў. Пасеяўшы, дзед не пайшоў глядзець цэлую нядзелю яго ўсходаў. На другую нядзелю пайшоў — вырасла пшано аж па пояс.

Так бог паспяшыў, каб яно расло на старых, на бедных, што есць нечага.

Прыходзіць ён к пшану свайму, бачыць — стаіць у яго пшане журавель, ды такі бальшы, агромны. Як прыхадзіць к таму пшану, узяў дзед палку і шыбнуў у жорава. Жораў падняўся і паляцеў. Стаў глядзець дзед таго пшана, аж яно ўсё чыста збіта, патаптана, паламана. Ён тады прыходзіць дамоў і кажа бабе:

— Вот, бабка, даў нам бог харошую ўроду пшана, ды не даў спажыць: унадзіўся жораў у пшано і прама есць, косіць — усё чыста пабіў, паламаў!

— А, мой дзядулька, а ты ж быў колісь стральцом, вазьмі стрэльбачку, пачысці яе, падпаўзі ды й забі яго. Вот будзе нам і мяса!

Той дзед паслухаў, узяў стрэльбу, пачысціў яе і пайшоў к пшану. А журавель ды прылятаў перад поўднем. А ён які, значыцца, жораў — сам змей. Дзед толькі падышоў, а жораў тут і скінуўся: то быў пціцай, а то стаў панам — аж ззяе, пры ўсёй хорме, у твары красны. Адвяшчае той пан дзеду.

— Стой, дзядулька, не бі мяне. Гэта тваё пшано?

— Маё.

— Што ж хочаш за сваё пшано?

Той дзед спужаўся; бача — такі пан, а ён такі шкут, абадраны, залатаны, укураны, як у лазні ў якой!

— Што,— кажа,— я хачу: няма ў мяне нікога — ні дзяцей, ні сродственнікаў — карміць мяне некаму!

— Ну, дзядулька, калі ў цябе нікога няма і некаму цябе карміць, дык ідзі ты за мной зялёнай трапой, шаўковай травой, выйдзеш ты на паляну, там будзе мой двор. Не ідзі ты на захад сонца к майму ганку, зайдзі ты наўпроці поўдня. Там будзе другі ганак: ты на яго і ідзі ў мой дом. Там будзе часавы стаяць; ён спросіць у цябе: «Куды ты ідзеш?» А ты скажы: «К жураўлёваму». Ён цябе пусціць. А тут я, можа, пачую, а можа, у вакно ўбачу — сам адчыню табе дзверы і ўпушчу ў свой дом!..

Сказаўшы гэта, ён троп-троп! — Здзелаліся ў яго рукі крылушкамі, ён узняўся і паляцеў.

Той дзед і пайшоў зялёнай трапой, шаўковай травой. Ісці яму, ісці — выходзіць на паляну і бача дом сярод паляны. Такое страенне — гэта ні здумаць, ні згадаць, толькі ў казках сказаць; можа такога і ў цэлым нашым

царстве няма — так і ззяе! Цяпер прыходзіць той дзед к дому, падыходзіць к таму ганку, што ад поўдня. Стаіць часавы яго, таго жураўлёвага.

— Ты куды,— кажа,— ідзеш, шкут ты гэтакі?

А той пачуў, жораў, лоп-лоп, адчыняе адну комнату, а тады другую:

— А пайдзі, пайдзі сюды!

Часавы адступіўся набок. Вот дзед прайшоў адзін пакой, другі пакой, уваходзіць у трэці. Жораў пасадзіў яго ў крэсла і паставіў яму ядзення-піцення, віна ўсякага, прадухтаў, хрухтаў — адкрыў яму свой увесь стол, толькі малака пташачага не было. Угасціў таго дзеда, тады спрашвае:

— Што ты, дзядулька, хочаш за сваё пшано?

— Мой панок, мой залаты, не магу сказаць, што ваша ласка, то й дасцё!

Той жораў пайшоў у другі пакой, выносіць яму кашалёк і гаворыць:

— Ну, дзед, калі ты, ідучы па дарозе, захочаш есці, скажы: «Кашалёк, кашалёк, дай мне піцення-ядзення!» Ён адкрыецца, і з таго кашалька будзе і стол, і крэсла, і тыя самыя кушанні, што ты ў мяне еў. А як пад'ясі, нап'ешся, тады скажы: «Піценне-ядзенне, хараніся ў кашалёк!» Тады яно ўсё скрыецца, ты згарні і ідзі сабе дамоў. Толькі па многу не пі, а то ўвап'ешся, і хто-небудзь украдзе кашалёк!

Той дзядулька, прайшоўшы па дарозе дамоў, захацеў паспрабаваць: ці праўда гэта будзе, што мне жораў адвясціў? Адышоў паўдарогі, сеў, выняў кашалёк, раскрыў і кажа:

— Кашалёк, кашалёк, каб мне было піцення-ядзення!

Дзед той паспытаў сяго-такого па малай частачцы, тады кажа:

— Піценне-ядзенне, хараніся ў кашалёк!

Усё і схавалася. Прыходзіць ён к свайму сялу, к сваёй хатцы. Уваходзіць у яе:

— Дзень добры! — кажа.— Ці жыва тут баба мая?

— А жыва, дзядулька! А ты ці жыў?

— Я жыў-здароў!

— А я ж думала, што цябе ці ваўкі з'елі, ці мядзведзі забілі, у мох зацягнулі, закапалі і калоддзем завярнулі.

— Не, бабулька, ваўкі не з'елі, мядзведзі не забілі, а прынёс я хлеба-солі, будзе з нас па нашай жысці! Садзісь-ка, бабка, за стол і я сяду,— можа ты з месяц не ела. Будзе нам піцення-ядзення!

— Што ты, дзядулька? Адкуль ты возьмеш піцення-ядзення?

— Садзісь-ка, садзісь!

Селі яны за стол, выняў дзед кашалёк, паклаў на стол. А стол той каравы, вядома, у курніцы. Раскрыў ён кашалёк:

— Ну, кашалёк, кашалёк, каб было нам піцення-ядзення!

І тут адкуль што ўзялося! То была курніца, а тут сталі пакоі, можа лепш гэтых, ды што гэтыя — можа і ў цэлым царстве няма такіх. І рознае-рознае піценне-ядзенне: тут і віны, і бабкі, і пірагі — усяго было. Баба тая здзівілася!

— Божа мой, божа мой, адкуль усё гэта?

— А вот, бабка, як паслала ты мяне забіць жорава, дык я прыхаджу к свайму пшану, а ён там. Толькі я злажыўся, каб яго забіць, а ён скінуўся панам, такім панам, што ажззяе. «Што ты,— кажа,— хочаш з мяне за сваё пшано?» Я яму кажу: «У мяне няма нікога, карміць мяне некаму!» Тады ён кажа: «Ідзі ты ка мне ў мой двор зялёнай трапой, шаўковай травой, там я цябе награджу». Пайшоў я туды, у двор к яму, ён мяне накарміў, напаіў і кашалёк гэты даў.

Тая бабка выпіла, абняла дзеда, пацалавала:

— Ну, спасіба ж табе, дзедка, я рада табе: ты ўсё роўна як з таго свету явіўся! Ці ведаеш ты што, дзедка? Мы адны жывём, ні ў людзей не бываем, ні людзі ў нас. Пазавём мы к сабе войта і старасту ў госці! У нас гэткі стол, і хата наша ад стала правіцца!

— А як, баба, сабе, хочаш; можаш і пазваць сабе, няхай і пабудуць у нас!

Тая баба закухліла намятку, пайшла на сяло і пазвала войта і старасту.

— Хадзіце,— кажа,— мае дзеткі, ка мне ў госці!

— Што ты,— кажуць,— старая карзіна, якія ў цябе госці? Жыве ў западной хаце, можа, есці нечага, а яна ў госці заве!

— Не, мае дзеткі, тады будзеце нас ругаць, як пабываеце, ды не будзе ў нас накрытага стала. А напярод нечага ругаць!

Тады тыя адумаліся: «Ну, няхай сабе і так, пойдзем сабе!» І пайшлі яны ўдваіх у госці. А яны ахвочы папіваць, калі хто заве. Уваходзяць у хату:

— Дзень добры, дзед!

— Здароў!

— Што скажаце нам?

— А во сядзьце, пасядзіце на лаўцы: і скажам і пакажам!

Тыя селі. Адзін кнут дзержыць — пугу, а другі — бізун. Вядома, войты і старасты былі граза для сялян — заўсёды з кнутамі хадзілі па сялу, з хат выганялі на баршчыну. Тады дзед выняў кашалёк:

— Кашалёк, кашалёк, каб было піцення-ядзення!

Адкрываецца з таго кашалька піценне-ядзенне, усякае ўгашчэнне для ўсяго засядання, колькі будзе, ці пяць, ці дзесяць. Стаў дзед угашчаць войта і старасту. Тыя п'юць і ядуць, і не надзівуюцца, што гэта такое: і піцення, і ядзення, і хата пасвятлела? Ці не бог гэта з неба скінуў рай? Гэта і ў пана няма такога ўгашчэння, стала, украшэння! Напіліся яны, наеліся — лоўка нахлябаліся і зялёнага і вішнёвага, якое толькі ёсць на свеце, і пайшлі. Баба і гаворыць:

— Ці ведаеш што, дзядулька?

— А што?

— Пазавём мы пана к сабе ў госці?

— Што ты, баба дурная! Во, праўда,— хто бабы слухае, заўсёды пагібае. Пойдзе к нам пан, к старцам к такім! Ідзі-тка, ён табе кнутам уздасць!

— А што будзе, ды будзе — пайду!

— Ну, ідзі сабе!

Пайшла баба. Прыходзіць к пану ў пакой. Выходзіць пан:

— А што, старая бабка, скажаш?

— А што, паночак, скажу: прасіў дзед, прашу і я вас к сабе ў госці!

— Што? Ах ты, быдла! Ты мяне завеш у госці? Я пайду к старчысе?

— Не, паночак, не ймеце вы веры мне, запытайцеся ў сваіх верных людзей. Ёсць у вас войт і стараста: спрасіце ў іх, ці можна ісці к нам, ці не?

Пазваў пан лакеяў, кучароў:

— Схадзіце, пазавіце ка мне на часок войта!

Слугі тыя пайшлі к войту:

— Казаў пан, каб к яму йшлі!

Прыходзіць войт к пану:

— Заве ведзьма мяне ў госці,— кажа пан,— дык ці можна к ёй ісці?

— А, паночак, можна, можна: мы ў пана не бачылі такога стала, як у іх. Ёсць у дзеда кашалёк, і з яго ўсё адкрываецца: і гарэлка, і віны, і стол. Можна пайсці!

Той пан паслухаў войта, вялеў сваім кучарам, каб заклалі коней. Пан з паняй адзеліся і паехалі не так піць-есць, як тыя праўды ўзнаць: ці іменна праўда, ці можа ложна, што старуха гаворыць. Прыязджаюць к той хатцы і злазяць з хвальтона. Тады дзед той выходзіць:

— Не гневайцеся, паночак, мая хатка знаружы не чыста, а ў сярэдзіне будуць вам і стуллі, і кваты, і ўсё.

Уваходзіць той пан у хату, і стаў у парозе. Тады той дзед выняў кашалёк і гаворыць перад панам:

— Кашалёк, кашалёк, каб было тут піценне-ядзенне і ўсякае ўкрашэнне ў маёй хаце!

Тут зараз усё адкрылася: і піценне, і ядзенне, і ўсякае ўкрашэнне, што і ў цэлым царстве няма такога стала, як у яго! Вось той пан бача, не стыдна сесць.

— Просім, паночак, на свой на хлеб-соль!

Стаў пан разбіраць тыя віны, бачыць, што самыя дарагія. Сталі піць і есці. Папілі-паелі, пан і кажа:

— Дзядуля, табе совесна мець такі кашалёк; ты такі шкут, а ў цябе дом і стол лепш майго. Мне совесна проці сваіх другаў. Я цябе прашу па ласцы: аддай ты мне гэты кашалёк. Дам табе правізію супоўную: крупы, муку, закрасу — усё, што трэба, усё табе буду прыстаўляць. І слугу табе дам, і карову, і свінню — усё. Нашто табе кашалёк? Я цябе пахаваю і сыботнікі адпраўлю, уцешу, па манастырах пазаводжу!

Той дзед пагаварыў з бабай:

— Ну, то ж, дзед, пан просіць — трэба паслухаць. Нам усё будзе: і слуга будзе, адзежда — і памыта, і пададзена!..

Паслухалі, аддалі і асталіся ў сваёй у дзіравай хатцы, як былі. Той пан узяў кашалёк і паехаў. Тады даў ім і правізію, і слугу: пуд мукі, пуд гаро-

ху, пуд круп яшных драных, пяць хунтаў сала, тры хунты масла, дзесяць хунтаў солі — выдаў ім паёк. З'елі яны той паёк у колькі дзён. З'еўшы паёк, паслалі яны сваю слугу ў хальварак к пану:

— Пане, прыслалі дзед ды баба па паёк,— той паёк выйшаў!

Тады той пан не даў пайка і слугу не пусціў.

— Поўна,— кажа,— даваць, у мяне ёсць гэткіх многа, што трэба даваць. Мне трэба карміць тых, хто работае, а яны на баршчыну не ходзяць. Хай па міру сабіраюць і ядуць: з міру па нітцы — голаму рубашка; з міру па крошцы — дваім прапітацца можна!

Так пан і зняверыў, слова змяніў. Пайшла тая слуга і адвясціла гэта дзеду:

— Казаў пан, што ў яго ёсць такіх многа, што трэба даваць; трэба карміць тых, што работаюць. А вам казаў па міру сабіраць і есці. І мне назад у двор ісці!

І пайшла назад. Асталіся тыя дзед з бабай, як былі: і каравыя, і дзіравыя, і ў нудзе ў вялікай.

Дзед думаў-думаў, думаў-думаў думу: «Што тут рабіць? Як хлеб даставаць?» І надумаўся: «Пайду-тка я к таму жораву, пажалюся яму, ці не памілуе, ці не дасць ён другога кашалька. Той баба звяла. Сказана: хто бабы слухае, той заўсёды загібае. З бабай жывеш, праўды не кажы ніколі!»

— Пайду,— кажа,— баба, к жораву, ці не дасць ён нам другога кашалька?

— Ну, схадзі, дзед. Дасць, не дасць, а схадзі!

Ну, ён пайшоў зялёнаю трапою, шаўковаю травою. Ішоў, ішоў, прыходзіць на палянку. На той палянцы жораваў дом. Прыходзіць ён к таму дому, падыходзіць пад яго ганак. Часавы на яго крычыць:

— Ты куды, шкут, чаго табе тут трэба?

А жораў пачуў, лоп-лоп,— дзверы адчыніў:

— А, хадзі, хадзі сюды!

Часавы сычас набок. Увайшлі яны ў пакоі; адзін прайшлі, другі, увайшлі ў трэці. Жораў пытаецца:

— Ну што, дзядулька, можа хто абідзеў?

— Што, паночак,— пан абідзеў. Пазвала баба войтаў у госці, напаіла, накарміла, а тады кажа: «Пазавём мы пана!» Я не хацеў, але сатана звядзе і сакала. Пайшла яна, пазвала. Прыехаў пан з паняй. І падлёг ён мяне, каб аддаў яму кашалёк, падлёг і падлёг. «Я,— кажа,— усё табе буду прыстаўляць». Мусіў я ў бабы папытацца. А баба кажа: «Аддай, дзед, трэба пана паслухаць, ён жа ўсё нам будзе прыстаўляць». Аддаў я кашалёк, а пан прыслаў нам паёк.

Тады як той паёк выйшаў, ён і зняверыў. «Хай,— кажа,— па міру ідуць сабіраць ды й кормяцца!..»

Ну, жораў пасадзіў яго за стол, угашчае, а той за слязамі і не есць...

— Ці не дасцё вы мне,— кажа,— шчэ такога кашалька?

— Добра, дам, дам! Будуць знаць усе! Не дам я табе кашалька, але дам табе бачоначак!..

Пайшоў ён у другі пакой, выносіць бачоначак і вуча яго:

— Прыходзь ты дамоў, скажы: «Баба, лезь-ка з печы. Не прынёс я кашалька, а прынёс бачоначак!» Як баба злезе з печы, ты і скажы: «Ну-ка, дванаццаць молайцаў, лезьце з бачоначка, расцяніце гэту бабу, улініце ёй кнутамі харашэнька!» Дадуць яны бабе, тады скажы: «Ну-ка, дванаццаць молайцаў, лезце ў бачоначак!» Ну, тады скажы бабе, каб яна закухліла сваю намятку і пайшла к пану, ды не сказала, што ты прынёс бачоначак, а сказала б, што прынёс другі кашалёк, шчэ лепш таго. Пазаві пана з паняй, і войтаў, і дваран усіх. І як сабяруцца ўсе, пасадзі пана з паняй на куце, а тых усіх на дварэ. Тады скажы: «Нуце-тка, дванаццаць молайцаў, лезьце-ка з бачоначка, улініце ім усім!» Як дадуць, тады скажы: «Нуце-тка, дванаццаць молайцаў, стойце ў парозе!» І патрабуй назад свайго кашалька!..

Падзякаваў дзед, пайшоў дамоў. Як улінуў бабе! Баба пабегла, пазвала пана, паню, і войтаў, і дваран усіх. Як улінулі ўсім, і дваранам, і войтам, і кучарам, і ўсім!

— Дванаццаць молайцаў, стойце ў парозе! Ну, пане, палож тут кашалёк, а то будзе і табе такое ўгашчэнне, якога ты ніколі не бачыў, і дзяды твае, і прадзеды не бачылі!

Грозя, бач! А што грэзіць, калі той і сам усё відзеў, і стаяць у парозе дванаццаць молайцаў з кнутамі! Пан той відзіць, што плоха, ды прызапомніў кашалёк узяць з сабою. Адвяшчае дзеду:

— Аддаю, дзядулька, табе кашалёк твой, толькі пусці жывога! Многа-мала мне жыць, будзе з мяне і свайго дабра. Прызавіце мне майго слугу!

Прызвалі таго слугу, пусцілі яго к пану.

— Пажалуйста, галубчык, едзь скарэй у двор, і там у шахве, ці можа ў скрыні, ляжыць кашалёк. Вазьмі яго і прыстаў мне сюды ў скорым урэмю, а то мне тут плоха знаходзіцца!

Чаму! Калі дванаццаць д'яблаў стаяць у брылях, стаяць з кнутамі!

Даў ключыкі — пры сабе меў у кішэні. Той паехаў, узяў кашалёк, дзе было сказана, і даў пану. Пан кажа:

— На, дзедушка, твой кашалёк, толькі пусці мяне!

Дзед узяў кашалёк і кажа:

— А дайце-тка яму! Ён мужыкоў б'е і не верыць, што больна, хай жа і ён пазнае, як нам больна!

Ну, узялі дванаццаць молайцаў, аддзюбашылі троху, тады дзед кажа:

— Дванаццаць молайцаў, лезьце ў бачонак!

Пан тады ходу! Ці ўзяў шапку, ці не, а шубу пасеклі ў кускі! Той дзед астаўся тады жыць з сваім кашальком, з сваёй сілы ды абароны. І ніхто ўжо яго не тронуў.

## Дзіва

Жыў сабе чалавек вельмі бедны, не было ў яго чаго есці. Пакінуў ён сваю жонку дома, а сам пайшоў у свет. Ідзе ён дзень, ідзе другі і прыходзіць у лес. У лесе стаіць хатка; ён зайшоў у гэту хатку, а там сядзіць нейкі старычок. Вот ён і пытае:

— Ці можна ў цябе, старычок, пераначаваць?

А старык адказвае:

— Чаму ж? Начуй!

Сядзяць яны час, а можа і два, пара ўжо вячэраць, а на стале і хлеба ні куска. Вот старык і гаворыць:

— Мый, брат, рукі!

І сам памыў. Селі за стол, а хазяін і гаворыць:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва! Сячыся, рубайся, у гаршчок накладайся, да агню прыстаўляйся і на стол падавайся!

Вот уваходзіць у хату нейкі індык, сам зарэзаўся, аскубся, да агню прыставіўся, зварыўся і на стол падаўся. Хазяін і кажа госцю:

— Еж, брат, толькі касцей не грызі!

З'елі яны ўсё мяса, косці палажылі на стол, а хазяін кажа:

— Дзіва, сабірайся, ды і за парог выбірайся!

Дзіва сабралася, ды і за парог выбралася. Вось госцю стала зайздросна,— ён і просіць:

— Прадай мне, добры чалавек, гэта дзіва!

А старычок адказвае:

— Я не прадаю нікому за грошы, а добрым людзям і так даю.

І падарыў гэта дзіва чалавеку. Чалавек узяў яго к сабе, занёс дамоў і кажа жане:

— Вот я прынёс дзіва, ты толькі паглядзі, што тут будзе!

І загадаў накласці дроў у печку, а сам з жаною сеў за стол. Індык стаіць у сенях. Вот хазяін кажа:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва! Сячыся, рубайся, у гаршчок накладайся, да агню прыстаўляйся і на стол падавайся!

Дзіва заходзіць, само зарэзалася, аскублася, да агню прыставілася і на стол падалося. З'елі яны ўсё мяса, а косці палажылі на стол, і кажа хазяін:

— Дзіва, сабірайся, ды і за парог выбірайся!

Сабрала яно ўсе свае косці, саскочыла са стала і пайшло, як прыходзіла. Пабылі яны з дзень, і выйшлі ў іх усе дровы. Хазяін паехаў у лес па дровы, а к жане яго прыходзіць поп і заве к сабе мыць бялізну. Вось яна і хваліцца:

— Ох, мой бацюхна! Што ў нас ёсць за дзіва! Садзіцеся за стол.

Селі. А яна і заве:

— Дзіва, ідзі ў хату жыва!

А дзіва ўсё не слухае. Узяла баба качаргу і крычыць:

— Вось, я ж табе!

Ды як дасць па ім качаргою — качарга так і ўрасла к дзіву, а баба к качарзе. Крычыць баба на ўсё горла:

— Ой, бацюшка, памажы ад качаргі адарвацца!

Прыйшоў поп і гаворыць:

— Ды што гэта такое?

Узяўся спасаць бабу і сам прырос. Прыходзіць дзяк і кажа:

— Бацюшка! Ды што так доўга сядзіце? Трэба абедню служыць.

А поп гаворыць:

— Відзіш, што не магу адарвацца.

Дзяк стаў памагаць папу адрывацца — і сам прырос. Прыходзіць стараста і тожа стаў спасаць бацюшку, ды і ён прырос. Прыйшла матушка, а поп крычыць:

— Не бярыся, а то прырасцеш,— пайдзі пазаві шаптуху, штоб памагла нам.

Прыйшла шаптуха, стала шаптаць, ды як возьмецца за качаргу, ды і сама прырасла. Дзіва павалакло іх усіх у лес, к хазяіну, цераз грэблю, дзе быў мост. Выскаквае з-пад маста чорт і гаворыць папу:

— Калі пусціш за царскія дзверы, то я цябе адарву.

Поп абяцаў пусціць. Чорт ўзяўся адрываць папа ад качаргі — і сам прырос. Ідуць усе яны к хазяіну. Прыйшлі на месца, а хазяін высек шэсць дубін — на чорта самую тоўстую, ды і гаворыць к яму:

— А ты чаго тут?

Ды як стаў даваць! Біў-біў, а потым сам узяўся за качаргу — і чорт адстаў. Адарваўшыся, ён пусціўся на сваё месца, адкуль выскачыў, толькі лінію леса выламаў па дарозе. Прыйшла чарга і да папа.

— А ты чаго? — пытаецца хазяін, ды і аб папа пабіў дубіну.

Пусціўся поп бегчы дадому — аж рукавы ды полы матаюцца. Так усіх ён угасціў дубінамі, і ўсе паўцякалі дамоў. А хазяін узяў сваё дзіва на воз, прывёз яго дадому. І цяпер ён жыве з жаной і не нуждаецца ні ў якой страве.

## Каток-залаты лабок

Жылі дзед з бабаю. І былі яны дужа бедныя: не было ў іх ні хлеба, ні капусты. Тады баба кажа дзеду:

— Едзь ты, дзедка, у лясок, ссячы дубок, вязі на месца, прадай і купі хунцік мукі!

Прыехаў дзед у лес, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, паслала мяне баба ў лес з'ездзіць, ссеч дубок, везці на месца, прадаць і купіць хунцік мукі!

— Едзь, дзед, у двор: будзе мука!

Прыехаў дзед у двор, ажно ў яго мукі поўныя засекі. Пад'еў дзед хлеба, тады баба кажа яму:

— Вот, дзядулька, вывастры тапарок, едзь у лясок, ссячы дубок, вязі на месца, прадай і купі хунцік солі!

Вывастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, хлеб ёсць, солі няма! Паслала мяне баба ссеч дубок, адвезці на месца, прадаць, купіць хунцік солі!

— Едзь, дзед, у двор: будзе соль!

Прыехаў дзед у двор, ажно ў яго солі поўныя засекі. Пад'еў дзед хлеба з соллю, тады баба кажа:

— Вот, дзядулька, вывастры тапарок, едзь у лясок, стукні ў дубок, выскачыць каток — папрасі ў яго капусты!

Вывастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, хлеб ёсць, соль ёсць — капусты няма!

— Едзь, дзед, у двор: будзе капуста!

Прыехаў дзед у двор, а ў яго капусты поўны склеп. Наварыла баба капусты, дзед пад'еў. Тады баба кажа:

— Вот, дзядулька, каб цяпер сальца!

Вывастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, ударыў у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, просіць баба сальца!

— Едзь, дзед, у двор: будзе сальца!

Прыехаў дзед у двор, ажно ў яго сала поўная клець. Наварыла баба капусты з салам, дзед пад'еў. Тады баба кажа:

— Вот, дзядулька, каб цяпер нам мукі пшоннай! Вот ба я пражанінкі зварыла б! Вывастры тапарок, едзь у лясок і ўдар у дубок!

Дзед вывастрыў тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, чаго табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, трэба бабе мучыцы пшоннай!

— Едзь, дзед, у двор: будзе мучыца!

Прыехаў ён у двор, ажно ў яго мукі поўныя засекі. Наварыла баба пражаніны, дзед пад'еў.

Тады баба гаворыць:

— Вот, дзядулька, каб цяпер мяса! Вазьмі тапарок, едзь у лясок, удар у дубок!

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, просіць баба мяса!

— Едзь, дзед, у двор: будзе мяса!

Прыехаў дзед у двор, ажно ў яго шасты ад мяса ломяцца. І сталі яны жыць, як трэба. Пажылі можа з год, можа з два, баба зноў кажа дзеду:

— Вот, дзядулька, каб ты быў войтам, а я вайціхаю! Вазьмі, дзядулька, тапарок, едзь у лясок, удар у дубок!

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, хоча мая жонка, каб я быў войтам, а яна вайціхаю!

— Едзь, дзед, у двор: будзеш ты войтам, а баба вайціхаю!

Прыехаў дзед у двор: ажно яго баба як вайціха, а ён як войт. Пажылі яны колькі-небудзь, баба зноў кажа:

— Вот, дзядулька, хачу я, каб ты быў шляхцічам, а я шляхцянкаю!

Вывастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, хоча мая баба, каб я быў шляхцічам, а яна шляхцянкаю!

Прыехаў ён у двор, ажно яго баба як шляхцянка, а ён як шляхціч. Жылі яны шляхтамі, жылі.

— Не, дзядулька, дрэнна нам быць! Вот, дзядулька, каб ты быў панам, а я паняй! Вазьмі тапарок, едзь у лясок, удар у дубок!

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — выскаквае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, баба мая хоча, каб я быў панам, а яна паняй!

— Ну, едзь, дзед, у двор: будзеш ты панам, а баба паняй!

Прыехаў дзед у двор, ажно баба яго як паня, а ён як пан. Пабылі яны панамі, тады баба кажа:

— Вот, дзядулька, хачу я быць царыцай, а ты каб быў царом!

Вывастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — ажно выскак-

вае каток-залаты лабок, срэбранае вушка, залатое вушка, срэбраная шарсцінка, залатая шарсцінка, срэбраная лапка, залатая лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, мая баба хоча, каб я быў царом, а яна царыцай!

— Ну, едзь, дзед, у двор: будзеш ты царом, а баба царыцай!

Прыехаў дзед у двор, ажно яго баба як царыца, а ён сам як цар. Пабылі яны трохі царамі, тады баба кажа дзеду:

— Вот, дзядулька, едзь ты ў лясок, удар у дубок: хачу я, каб ты быў богам, а я бажыхай ці багародзіцай, а дзеці бажанятамі!

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок — ажно выскаквае каток-залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе нада?

— Ды вот, каточак, мой галубочак, мая баба хоча, каб я быў богам, а яна бажыхай, а дзеці бажанятамі.

— Ну, едзь, дзед, у двор!

Прыехаў ён у двор, ажно ляжыць сучка з шчанятамі. Злез ён з калёс і стаў сабакам.

## Асілак

Жылі сабе дзед ды баба. Жылі яны ў згодзе: разам гаравалі, працавалі, разам аддыхалі. І былі шчаслівыя, толькі ў адным не было ім уцехі: пражылі ўвесь век і не мелі дзяцей.

— Хто нам на старасці вады падасць? — часта гаварыла баба і хвартухом выцірала слёзы.

— Не плач, баба,— разважаў яе дзед,— мо' яшчэ і парадуемся на старасці...

Але вось і радзіўся ў іх такі гожы хлопчык, што ўсе і надзівіцца не могуць.

Расце хлопчык ды сілы набіраецца. І скора ён стаў такі дужы, што яго ні адзін самы здаравенны мужчына не можа пабароць. Вырас Асілак, вабраўся ў сілу і давай збірацца ў свет. Як ні ўпрашвалі дзед з бабаю, каб ён не пакідаў іх на старасці,— куды там!

— Няма чаго мне тут з вамі сядзець ды курэй заганяць. Я пайду шукаць ворагаў і ці сам загіну, ці ворагаў загублю.

Няма чаго рабіць,— прыбралі дзед з бабаю свайго сынка ў вялікую дарогу і з плачам правялі яго за сяло. Тут яны папрашчаліся і вярнуліся да гасподы, бо далей не маглі ісці, вельмі ўжо былі старэнькія. Увайшоў Асілак — так яго ўсе называлі — у цёмны лес ды так засвісцеў, што аж лісце пасыпалася. Спалохаліся птушкі, пахаваліся ў галіны або ў лом. Спалохаліся дзікія зверы, пахаваліся, хто куды мог. Было ў гэтым лесе сем братоў, сем разбойнікаў. І ніхто не смеў прайсці або праехаць праз той лес. Жылі яны так і нікога не баяліся. Пачулі разбойнікі той свіст і пайшлі про-

ста на Асілка. Тым часам Асілак выйшаў на парасельку, наклаў агню, сядзіць сабе ды на ражэньчыку пячэ сала. Тут яго разбойнікі і абступілі адусюль.

— Якія вы людзі і што вам трэба? — пытае Асілак.

— Хто ты такі, што пасмеў прыйсці ў наш лес? — пытае старшы разбойнік.

— Хто я — пазнаеш, як памераешся са мною сілаю, а лес не твой!

— Гэта наш лес, гэта наша панства. Мы тут тубыльцы з даўніх часоў.

— Вы разбойнікі. Вы разбоем запанавалі гэтым лесам. А я прыйшоў, каб адабраць у вас пушчу і даць усім людзям.

— Гэ, які ты моцны. Давай перша паборяемся, хто з нас дужэйшы.

— Давай.

Узяў старшы разбойнік жалезную булаву ў дзесяць пудоў і стаў перад Асілкам. Асілак азірнуўся кругом, бачыць — непадалёчку стаіць велізарны дуб, што ўтрох не абняць. Ухваціў Асілак таго дуба і вырваў з коранем. Убачылі тое разбойнікі, спалохаліся, давай прасіцца, каб ён не губіў іх.

— Будзь у нас старшым, і тады мы над усім светам запануем.

— Не,— кажа Асілак,— не затым я прыйшоў, каб светам панаваць, а затым, каб аслабаніць свет ад паноў. А хто хоча быць панам над другімі людзьмі, той мой вораг.

І давай тыя сем братоў, сем разбойнікаў, прасіцца, каб Асілак узяў іх к сабе ў таварышы.

— Добра,— кажа Асілак.

І пайшлі яны разам. Ідуць яны сабе ды ідуць ад аднаго сяла да другога. І ўсюды Асілак адно кажа: што ўсе людзі павінны быць вольнымі. У яго адна прымаўка была. Ён яе заўсёды гаварыў:

— Еж хлеб і людзям дай. І — жыві, спажывай, ды людзей не ўжывай...

І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе ды ў ласцы.

— Тады,— кажа,— ніякае ліха з імі не справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэйшы ўсіх багатыроў.

Пайшла тая прачутка па ўсяму свету. Спужаліся паны і давай лавіць Асілка. Доўга яны шукалі яго, ды ўсё не маглі знайсці. Але вось тыя сем братоў, сем разбойнікаў, захацелі самі быць панамі. Згаварыліся яны і выдалі Асілка. Паны рады, называюць разбойнікаў сваімі братамі, чапкуюць перад імі і даюць ім маёнткі, многа грошай і ўсялякага дабра. Давай гэта разбойнікі падмаўляць людзей, каб яны выдалі мяцежніка Асілка. Адных падмовілі, другіх застрашылі, а трэціх падпаілі. Ведама, заўжды знойдуцца дурныя людзі, што яны гатовы самі ў вяроўку лезці. Яны і сказалі панам, дзе жыве Асілак. Асілак тым часам нічога не ведаў і лёг на адпачынак. Тут напалі на яго, скрампавалі вяроўкамі і вядуць. Сабралася многа людзей, шкода ім Асілка, ды няма чаго рабіць. Не могуць адабраць у маскалёў добрага чалавека. Вядуць Асілка ў двор, а людзі цягнуцца ззаду. Мужыкі маўчаць, апусціўшы галовы, а бабы плачуць ды божкаюць.

— На каго ж ты нас пакідаеш? Хто ж нам скажа добрае слаўцо?

Тым часам сабралася паноў, што хоць гаць гаці ды па галовах хадзі. Бы ваўкі над падлам завылі, што Асілка злавілі. Смяюцца, жупяць, рукі пацірають ды якую прыдумаць кару выбіраюць. Адзін кажа — скуру з жывога садраць; другі кажа — ганталёў у цела пазаганяць; трэці кажа — павесіць за язык, каб увесь свет знаў, што пан, то не мужык; чацвёрты кажа — язык адрэзаць ды ногі перабіць, каб не мог па свету хадзіць, не мог гаварыць ды людзей вучыць. Пакуль яны крычалі ды кару прыдумлялі, Асілак страпянуўся, вяроўкі парваў ды й на людзей сказаў:

— Браткі, калі б паноў чорт узяў, тады б свет бяды не знаў, а без гарапашнікаў-мужыкоў не было б ні хлеба ні асьмакоў. А каб гэта ліха зламаць, трэ ўсім, як адзін чалавек, стаць: не грызціся паміж сабою, ды ад ворагаў бараніцца гурбою.

Так сказаў Асілак і знік; толькі клубок агню з таго месца пакаціўся па зямлі.

Спалохаліся паны, стаяць ды дрыжаць. Ачухаліся яны, азіраюцца, бы ваўкі ў ваўкоўні. А Асілак, кажуць, і да тых часоў па свеце гуляе ды людзей навучае... Але, пэўна, хутка тое будзе, што кожны сам сабе панам будзе. Усе людзі будуць роўна гараваць, будуць роўна панаваць.

**Іванка-прастачок**

У яком-та краю жылі людзі, бы ў раю: гаравалі, працавалі, ды і бяды не мелі. Свет вялікі, зямлі многа, усюды вольна, працуй на хлеб, рабі ды бога хвалі. І жылі там людзі ў ласцы, у згодзе, увесь дзянёчак працавалі, а аб ночы аддыхалі. А прыдзе бяда,— у згодзе ратаваліся ў прыгодзе: бедным, хворым памагалі, дык і ўсе бяды не мелі.

Толькі вось адкуль узяўся і пачаў сюды лятаць страшны Змей; пачаў лятаць, пачаў дабро цягаць, а нарэшце і людзей хватаць ды к сабе цягаць. Нахватаў ён людзей і давай будаваць сабе харомы. Нахватае адусюль людзей, згоніць іх у адно месца ды і прымушае будаваць харомы, акопваць іх канавамі, абсыпаць валамі ды абгароджваць частаколам, каб ніхто не мог туды ўлезці.

Будуюць людзі, капаюць канавы, насыпаюць валы зямлі, бы горы, і патуль гаруюць, пакуль там і загінуць.

А Змей хватае ды валочыць туды ўсё новых ды новых людзей. Вот набудаваў ён многа такіх агародаў, пралажыў паміж імі шляхі, лятае па іх ды цягае ў агароды і людзей, і людское дабро.

Працуюць людзі, загаруюць што кольвек, а тут наляціць Змей, абярэ ўсё, бы пажар, ды і запрэ ў сябе ў агароды, а людзі пухнуць ад голаду ды мруць, бы мухі. І чым далей, тым горай: няма спосабу, няма ратунку ад ліхога Змея. Тым часам тыя людзі, што іх Змей навалачыў у свае харомы, жаруць сабе людское дабро, нічога не робяць ды толькі сала гадуюць. Дык

14 Зак. 3328

вот не толькі Змей, але і яны, забыўшы бацькоў ды братоў, пачалі па шляхах вылазіць з агародаў, бы мурашкі з мурашейніка, пачалі хадзіць па свету ды адбіраць у людзей іх дабро.

І стала людзям горай ад людзей, як ад Змея, бо ведама, гэтых ліхіх слуг Змея вельмі многа. Яны, бы плойма, усюды находзяць людзей і адбіраюць у іх, што ўбачаць. Няма ў іх літасці — з жывога скуру дзяруць. І пачалі яны лічыць людзей горай гаўяда, пачалі саромецца, што самі яны людзі, пачалі выдумваць сабе ўсялякія назвы. Хто назваў сябе змеем, хто ваўком або мядзведзем ці другім зверам, хто арлом, коршунам ці другою птушкаю, хто якім кольвек дзеравам. Толькі людзей яны называюць проста людзьмі, быццам гэта самае горшае імя. Дык от скуль узяліся паны Свінскія, Ваўкі і другія.

Але вось радзіўся ў тым краю хлапчук. Быў ён вельмі благенькі, вельмі худы: як заняпаў з маленства, дык так і астаўся на ўсё жыццё.

Ні паны, ніхто яго не чапае, бо ён такі нехлямяжны, што нікому непатрэбны. От ён і вырас ужо, але ўсё грае з дзецьмі, бы маленькі. І празвалі яго людзі Іванкам-прастачком.

От узімку сядзіць сабе Іванка-прастачок на печы ды з лучыначак цацкі складвае, а ўлетку пясочак перасыпае з дзецьмі. Так пражыў ён гадоў трыццаць.

От раз сядзіць Іванка-прастачок на зямлі каля прызбы ды перасыпае пясочак, аж ідуць тры старцы. Прыйшлі яны к хаце ды і селі на прызбе аддыхаць. У сяле ні жывой душы — пан усіх выгнаў на работу. Пуста, хоць падпалі. Сядзяць старцы на прызбе, аддыхаюць ды насыпаюць у люлькі тытуню. Хапіліся яны — аж няма агню ды і просяць Іванка, каб ён дастаў агню люлькі закурыць. Пабег Іванка ў хату, набраў у прыгаршні жару ды і прыносіць старцам. Закурылі тыя люлькі, падзякавалі Іванку ды і пытаюць яго, што ён робіць.

— Пясочак перасыпаю,— кажа Іванка,— бо што ні рабі, то ўсё на паноў. А нашы людзі дурныя, цягнуць жылы ды са ўсёй сілы гнуцца, дзела спраўляюць, а ліха маюць, бо паны ўсё к сабе грабуць, з мужыкоў скуры дзяруць, а то і зусім іх к сабе бяруць, за свет заганяюць, б'юць, калечаць, мучаюць, забіваюць і літасці не маюць.

Паслухалі тое старцы, галавамі паківалі, узяліся за струманты ды і зайгралі. Першы раз зайгралі — Іванку розум далі; другі раз зайгралі — у сэрца жаласці нагналі; трэці раз яны зайгралі — язык Іванку развязалі.

Зніклі старцы, а Іванка-прастачок стаў ужо не дурачок, стаў за дзела брацца ды і ў свет збірацца. Зрабіў дудку-весялушку ды зайграў сабе так жаласліва ды так гожа, што не толькі людзі, а зверы і птушкі сталі яго слухаць, сталі ўкруг збірацца.

І пачаў Іванка-прастачок па свеце хадзіць, у дудачку граць, людзей збіраць ды ім праўду казаць. Як зайграе, дык і ўбачаць людзі, што вялікая крыўда на свеце, што адны пануюць, другія гаруюць; адны багаццю лічбы не маюць, другія з голаду паміраюць. І разнёсся ад Іванкавай дудкі голас

па ўсяму свету. Пачалі людзі к таму голасу прыслухоўвацца ды розуму набірацца; пачалі думаць ды гадаць, як за праўду пастаяць.

От учулі па палацах той вялікі голас ды і спалохаліся слугі Змея, пачалі яны войска збіраць ды Іванка-прастачка шукаць. Чуюць голас на ўсходзе — шамялях яны туды. Палашы блішчаць, пікі, бы лес, тырчаць, гарматы грымаццяць, а Іванка не відаць. Стануць ціха, бы на паляванні, слухаюць, стаяць. Аж тым часам чуюць голас на захадзе — грае дудка-весялушка, грае, людзей навучае. Ідзе пошчак ад сяла да сяла, па полі, па лесе, ад краю да краю. Кінуцца яны на захад, гоняць коней, бягуць самі, шаблямі звіняць, ды Іванка не спаймаюць. Гудзе дудка, грае: то засвішча, то, бы бусел, заляскоча, то зацягне тонка-тонка, от бы павуціна, то так дробненька шчабеча, што ў паноў аж лыткі затрасуцца, а мароз бяжыць па спіне, быццам мышы туды залезлі ды і скрабуцца пазурамі.

От з тых часоў слугам Змея ні ўдзень, ні ўночы няма спакою, бо бяды яны сабе чакаюць, бы вол доўбні. Дудка свішча, дудка грае; пошчак па свету гуляе, людзей навучае. Яго ні злавіць, ні з гармат не забіць. Ён вольна па свету гуляе, ніякіх загародак не знае; хоць сам без цела, ды вялікую сілу мае. Грае-грае, а як прыдзе час, дык усіх ён параўнае.

Ой, ты дудка мая, весялушка мая!

## Каваль і аднавокае гора

Быў сабе каваль, а ў яго было тры сыны; адзін — шавец, другі — кравец, а трэці — каваль. Зжылі яны ўжо і век свой, а ніколі не бачылі гора. Вот і пайшлі яны шукаць ды пытацца, што гэта за гора.

Пайшлі. Прыходзяць яны ў адну карчму. У карчме знайшлі яны многа людзей; яны бедавалі ды гаравалі; адзін кажа:

— Бяда — хлеба нямашака.

Другі:

— Кароўку задавілі ваўкі.

Трэці:

— Мядзведзь выдраў пчолкі.

А кавальчукі глядзяць, слухаюць ды дзівяцца, чаго гэта людцы гаруюць ды бядуюць, бо ўсё ў іх дужа добра вялося, і не бачылі яны ніякага гора.

Пасядзеўшы трохі ў карчме, пайшлі яны далей шукаць гора. Прыйшлі ў лес; ажно ў лесе, па дарозе, напалі на іх разбойнікі. Бяда! Але неяк ад іх адбараніліся, хоць і ім трохі давялося.

Пайшлі яны далей па дарозе, а там звярнулі зусім у лес. Хадзілі яны па лесе, хадзілі, аж глядзяць — стаіць хата, а ля дзвярэй ляжыць дужа вялікі камень. Яны ў хату — ажно там ні духу. Паглядзелі ў печ, аж там пячэцца авечка, а пад лаўкаю і пад сталом ходзяць тры авечкі.

Яны гэта дасталі з печы пячыстую ды і давай есці; аж тым часам глядзяць — прыйшоў у дзверы нейкі дужа вялікі чалавек з адным вокам. Убачыўшы іх, аднавокі боўдзіла кажа:

— Добра ж, пачакайце, добра мне будзе паабедаць вамі.

Сказаў ён гэтак ды і заваліў каменем дзверы, а сам пайшоў, чорт яго ведае куды. А гэта было Гора.

Бедныя кавальчукі адцураліся ўжо і пячэні; стаяць ды й кажуць:

— Во дзе Гора! Чаго нас пагнала нячыстая з дому? Што тут рабіць? Як гэта тут вылезці?

Папрабавалі яны, каб яклель адкаціць камень ад дзвярэй,— дык дзе ж! — а ні блізка: дужа вялікі, каб яго маці прапала! А тут вылезлі б, можа, у вокны, дык дужа малыя: і галава не ўлазіць. А, мабыць, прыходзіцца прападаць!

Аж чуюць — ідзе той саменькі, што заваліў каменем дзверы, Аднавокае Гора, і кажа ім:

— Во якое шчасце; нікога не пакінуў, як выходзіў, аж тут разам знайшоў трох — будзе чым закусіць! Хто ты? — пытаецца яно ў аднаго.

— Я шавец.

— А, у мяне боты шчэ цэлы, не трэба мне шаўца! — сказаў,— ды шаўца за ногі, ды ў гарачую печ і пасадзіў яго.

Пячэцца той небарака ў печы, а гэтыя два стаяць ды і калоцяцца, як асіны.

— А ты хто? — пытаецца Аднавокае Гора ў другога.

— Я кравец.

— Не трэба ж і ты мне! — сказаў,— ды й таго ў печ.

Пякуцца ўжо два; астаўся трэці.

— А ты ж хто? — пытаецца Гора ў трэцяга.

— Я каваль.

— А добра, калі ты каваль,— кажа яму Аднавокае Гора.— Ці не ўставіў ба ты мне адно вока?

— А чаму? Калі трэба, дык устаўлю. Толькі ты прынясі мне вяровак і зялезны штых, бо мне трэба звязаць цябе, каб можна было ўставіць вока; а то ты не будзеш стаяць спакойна.

Трэба ведаць, што гэты каваль быў дужа хіцер.

Пайшло некуды Аднавокае Гора, прынесла вяровак і зялезны штых. Каваль узяў ды й прывязаў Гора вяроўкамі, ды і кажа яму:

— Страпяніся!

Гора страпянулася ды так, што і вяроўкі не судзержылі. Каваль нанава прывязаў Гора; яно як ні трапяталася, але ніяк не адарвалася. Мабыць, каваль крэпка прывязаў яго. Тады каваль узяў ды нагрэў чырвона-чырвона зялезны штых. Выняўшы з цяпла гарачы штых, каваль і кажа Гору:

— Ну, глядзі ж, стой ціха, я табе ўстаўлю другое вока.

Ды і сунуў штых у відушчае вока...

— А бра...— як рванецца Гора, як закрычыць,— а што ж ты гэта зра-

біў!.. Навошта ж ты выкалаў мне відушчае вока? Стой жа, вырадак, не выйдзеш жа ты адсюль, абмацаю ж я цябе як!

Ды й пачало мацаць і лавіць каваля па хаце. А каваль чуць жыў забіўся ў куточак ды й сядзіць моўчыкам. Гора мацала-мацала па хаце, лавіла-лавіла ды не злавіла каваля, а толькі абмацала сваіх авечак; яны былі пад сталом і пад лаўкай. Тады Гора села на парог дый кажа:

— Ну, нідзе ж ты не дзенешся: праз дзверы будзеш выходзіць,— не дажджэш, каб я цябе не злавіла.

Каваль вылез тады ціхенька з куточка, злавіў адну авечку ды кідзель сляпому Гору на ўлонні. Гора памацала, бачыць — авечка, узяла ды й выкінула яе за дзверы. Каваль таксама і другую авечку кінуў на ўлонні Гору. Гора і гэту авечку выкінула за дзверы. Тады каваль узяў, вывернуў кажух, надзеў яго ды і бабух на ўлонні Гору. Гора думала, што гэта трэцяя авечка, узяло ды замест авечкі выкінула каваля за дзверы.

— А дзякуй жа ж табе, Гора, што ты хоць аслабаніла мяне! — закрычаў каваль здалёку.

— А, ліха ж тваёй матары і бацьку твайму, калі гэта я цябе выкінула!.. Ну, злодзей, маеш шчасце, не жыў ба ты болей! Глядзі ж, будзеш ты ісці ў лесе ля калоды, не вазьмі ты там хацяя мае сякеркі — залатое лязо, срэбны абушок, што ўткнута ў калодзе!

— Трасца табе ў бок, хвароба ў жывот, ды не сякерка! Выхвараеш ты, пакуль я не вазьму! Абы толькі знайшоў!

Ідзе, аж бачыць — ляжыць вялізная калода, а ў калоду ўткнута сякерка — залатое лязо, срэбны абушок. Каваль яго хоп за тапарышча,— аж рука прыстала к тапарышчу. Ён і так і сяк, а тут ужо і Гора блізка.

— Вот жа ж цяпер не выскрабешся ты ад мяне! — крычыць Гора.

Што тут рабіць... Абмацаў каваль каля сябе ў кішэні нож, дастаў яго скарэй ды чырых — адрэзаў руку, ды скарэй наўходала: некалі было ўжо разінькі прадаваць. І яшчэ рад быў, што хацяя і так адкупіўся.

Пасля ж таго годзе ўжо і Гора шукаць, бо ўжо бачыў, якое яно.

## Мена

Жыў сабе дзед з бабай. Пасеялі яны боб пад палом. Той боб як расці дык расці — вырас пад самы пол. Яны ўзялі — пол раскінулі. Той боб як расці дык расці — вырас пад самую столь. Яны ўзялі — столь раскінулі. Той боб як расці дык расці — вырас пад самае неба. Паглядзеў дзед на бабу і кажа:

— Палезу па струччу на неба!

І палез. Лез, лез і ўзлез на самае неба. Там яму бог падарыў залатую цяцёрку. Узяў дзед цяцёрку і пайшоў дамоў. Бачыць — пасуць конюхі коней.

— Дзень добры, дзедка! Дзе ты быў?

— На небе ў бога!

— Што табе бог даў?

— Залатую цяцёрку!

— Памяняйся з намі на коніка!

Дзед памяняўся, уссеў на каня і едзе дамоў. Бачыць — пасуць пастухі валоў.

— Дзень добры, дзедка! Дзе ты быў?

— На небе ў бога.

— Што табе бог даў?

— Залатую цяцёрку!

— А дзе яна?

— Памяняў на коніка!

— Памяняй з намі коніка на воліка!

Дзед памяняўся, узяў вала і пайшоў. Бачыць — пасуць бараноў.

— Дзень добры, дзедка! Дзе ты быў?

— На небе ў бога!

— Што табе бог даў?

— Залатую цяцёрку!

— А дзе яна?

— Прамяняў на коніка!

— А конік дзе?

— Прамяняў на воліка!

— Прамяняй нам воліка на барана!

Дзед памяняўся, узяў барана і пайшоў. Ідзе, бачыць — пасуць індыкоў.

— Дзень добры, дзедка! Дзе ты быў?

— На небе ў бога.

— Што табе бог даў?

— Залатую цяцёрку!

— А дзе ж яна?

— Прамяняў на коніка!

— А конік дзе?

— Прамяняў на воліка!

— А волік дзе?

— Прамяняў на барана!

— Прамяняй нам барана на індыка!

Дзед прамяняў барана на індыка і пайшоў. Ідзе, ідзе бачыць — дзецці гуляюць на вуліцы, ездзяць на качарэжках.

— Дзень добры, дзедка! Дзе ты быў?

— На небе ў бога.

— Што табе бог даў?

— Залатую цяцёрку!

— А дзе ж яна?

— Прамяняў на коніка!

— А конік дзе?

— Прамяняў на воліка.

— А волік дзе?

— Прамяняў на барана!
— А баран дзе?
— Прамяняў на індыка!
— Прамяняй нам індыка на качарэжку!
Дзед прамяняў, уссеў на качарэжку і прыехаў на качарэжцы дамоў. Баба ў яго пытаецца:
— Ці быў ты на небе ў бога?
— Быў!
— Што табе бог даў?
— Залатую цяцёрку!
— А дзе ж яна?
— Прамяняў на коніка!
— А конік дзе?
— Прамяняў на воліка!
— А волік дзе?
— Прамяняў на барана!
— А баран дзе?
— Прамяняў на індыка!
— А індык дзе?
— Прамяняў на качарэжку!..
Усердзілася баба на дзеда, давай яго качарэжкай біць. Забіла да смерці і пахавала пад загнетам.

### Мужык, яго жонка і пан

Жыў сабе ў адным сяле Сенька, і была ў яго жонка, але надта лянівая. Пайшла аднаго разу жаць, нажала сноп і лягла спаць. Выспалася і пайшла дадому. Сенька стаў пытацца:
— Колькі ж ты нажала?
— Капу, ды і злажыла капу.
Пайшла на другі дзень, нажала столькі ж і на трэці дзень нажала столькі ж — усяго за тры дні нажала тры снапы.
Паехаў Сенька забіраць жыта. Прыехаў туды, глядзіць — ажно жонка яго спіць, а жыта нажата ўсяго тры снапы. Ён забраў снапы, жонкі не будзіў, абмазаў яе смалою, абсыпаў пер'ямі і паехаў дадому. Сеньчыха ўстала, паглядзела на сябе, спужалася і сказала сабе: «Гэта ж не Сеньчыха, аднака ж пайду на сяло, калі будуць сабакі брахаць ды дзеці палкамі кідаць, то я ўжо не Сеньчыха». Прыйшла яна на сяло — сабакі не брэшуць, дзеці палкамі не кідаюць; стала считаць хаты: «Гэта кумава, гэта Навумава, гэта сватава, гэта братава, а гэта Сенькава». Падышла пад вакно і пытаецца:
— Сенька, а Сенька! Чы Сеньчыха дома?
— Дома,— ляжыць на ложку, як ступа.
Пайшла далей. Ніхто ў хату не пускае; зайшла ў пусты млын, села ў кош, сядзіць. Прыйшлі ўночы зладзеі і сталі дзяліць грошы. Адзін кажа:

«Мне!» Другі: «Мне!» І трэці кажа: «Мне!» Тады яна бачыць, што ёй усё роўна — бяда ёй прыйшла, і кажа:

— А дзе ж мне?

Зладзеі папужаліся, думалі, што чорт, і разбегліся. А яна набрала грошай і пайшла дадому. Прыйшла і кажа:

— Сенька, Сенька! Адчыні!

— Хто там?

— Я, Сеньчыха!

— Не трэба! У мяне ёсць свая Сеньчыха.

— Не, Сенечка, адчыні, я грошы нясу.

Сенька адчыніў і кажа:

— Дзе ж ты ўзяла?

Яна расказала, як было, ды і кажа, што яшчэ ўсіх не забрала. Сенька пайшоў наперад на раку, усадзіў у нерат зайца, а ў жалезы занёс шчуку, пасадзіў і пайшоў за ёю. Прыйшлі, забралі грошы і пайшлі дадому. Ішлі цераз мост. Сенька кажа ёй:

— Зайдзём, паглядзім нерата на рацэ.

Пайшлі, глядзяць — сядзіць заяц.

— Вот шчасце! — кажа Сеньчыха.

— Пойдзем жа яшчэ,— кажа Сенька,— паглядзім жалезы!

Пайшлі, глядзяць — сядзіць шчука.

— А-а! Вот шчасце! Але разам шчасце,— кажа Сенька.

Прыйшлі дадому і схавалі грошы.

— Ну, глядзі ж, цяпер жа як прыдзеш на месца, дык купі мне шубу янотаву.

— Добра, куплю, як паеду.

Паехаў ён на месца, накупляў абаранкаў, начапляў на дугу, на аглоблі і едзе дадому. Толькі што Сенька прыехаў, Сеньчыха выбегла на двор і пытаецца:

— Ну, што ж, прывёз шубу?

— Ды не!

— Чаму?

— Што было рабіць? Як зайшла абаранкава хмара, было забіла — насілу ўцёк.

— Ну, глядзі, як паедзеш у другі раз, дык ужо купі!

— Куплю.

Паехаў Сенька ў другі раз і ізноў прыехаў без шубы.

— Чаму ж не купіў? — пытаецца Сеньчыха.

— Калі пан на месцы ўкраў кілбасу, дык яго білі па насу, дык і я спужаўся і насілу ўцёк.

— Ах, няшчасце! Ну, глядзі ж, як паедзеш ізноў, дык ужо, канешне, купі! — прыказвае Сеньчыха.

Паехаў Сенька трэці раз, купіў валову шкуру і прыехаў дадому. Сеньчыха выбегла на двор і пытаецца:

— А што ж? Купіў?.. Дзе?

— А вот я нясу ў хату.

Прынёс, надзеў на яе валову шкуру, і яна пайшла ў царкву. Усе людзі там разбегліся па кутках. Яна глядзіць і дзівіцца,— падышла к сваёй куме і кажа:

— Што гэта, кумка, людзі ад мяне ўцякаюць?

— Але, кумка, гэта ж ты валову шкуру надзела.

— Гэта ж мне Сенька купіў, казаў, што янотава шуба. Пайду ж скажу пану, што ў яго ёсць багата грошай.

Пайшла і сказала. Пан прызваў к сабе Сеньку з Сеньчыхай і гаворыць:

— Што ж ты, Сенька, грошы маеш, а падаці не плаціш?

— Дзе ў мяне, пане, тыя грошы? Мала што яна наманіла!

— А я кажу прыметы,— кажа Сеньчыха,— як мы неслі грошы ды бачылі...

— От слухай, пане, што яна, шалёная, будзе гаварыць.

— А што ж, не выцяглі мы зайца з нерата на рацэ, а шчуку з жалез?

— Бач, пане, што яна кажа.

— А ты ж казаў, як ты ездзіў на месца купляць шубу, ды як абаранкава хмара найшла, дык ты насілу ўцёк, ды як пан быў на месцы, украў кілбасу і яго білі па насу; ды ты мне гаварыў?

— Чуеш, пане, чы гэтаму была праўда, што яна, шалёная, кажа?

Раззлаваўся пан, казаў набіць Сеньчыху і прагнаць яе вон. Прапалі яе і грошы, і шуба. А Сенька спажыў яе грошы і пасля яе смерці ўзяў сабе маладую і разумную жонку.

## Мужык і паніч

Ехаў мужык, спатыкае ён нейкага паніча. Ідзе той дарогай і просіцца:

— Падвязеце.

— Добра,— кажа мужык,— садзіся!

Ён сеў, і яны паехалі. Дарогай мужык пытае:

— Хто ты і куды йдзеш?

— Я,— кажа,— скубэнт, вучуся ў гімназіі, а цяпер нас пусцілі на вакацыю, дык іду дамоў.

— А чаго вас там вучаць?

— Ды ўсякіх навук, во, напрыклад, гром і бліскавіца, гэта значыць — ляктрычаства такое яно...

— Не, брат, відаць, што вучан ды не давучан: гэта божжа моц называецца, а не ляктрычаства тваё нейкае. Во што!

І так яны, спорачы,— той сваё, а той сваё — ехалі ўброд, дык чалавек спіхвае скубэнта з возу і кажа:

— Калі ж ты такі мудры, дык перайдзі ж цяпер цераз брод не намачыўшыся.

А той кажа:

— Пастой, перайду, пазволь мне толькі падлезці па каню к дузе, а там і перайду суха.

Узяў ды й узлез на каня, выняў ціханька з кішэні сцізорык і чарах па гужам — каламажка з аглоблямі і асталася ў бродзе, а ён на кані і праехаў на сухое, кінуў каня і пайшоў сабе. І пакуль чалавек, па бруха ў гразі, прыладзіў зноў каня, скубэнт ужо дайшоў да якога-та засценка. Зайшоў у адну хату. Там маладзіца бліны пякла. Ён просіць:

— Пусці начаваць!

— Добра! — кажа.

Ну, ён січас і лег на тапчане. Можа цераз гадзіну ці болей прыязджае гаспадар. Маладзіца яму:

— Чаго ты марудзіў доўга? Суседзі пэўна ўжо вячэраюць, а я цябе ўсё чакаю.

— Я б даўно быў бы, але прычапіўся ка мне нейкі скубэнт і падстроіў мне штуку, каб яго паветрые!.. А хто гэта ў цябе на тапчане ляжыць?

— А нейкі паніч папрасіўся начаваць.

Чалавек падышоў к яму:

— А, ты тут? Нашоўся ж, брат... Ну, але пакуль што якое, хадзі павячэраем перш: сягоння ў нас дзяды!

Пасадзіў яго за стол, сталі вячэраць. Чалавек з жонкай вынялі кварту гарэлкі — ён па яе гэта і ездзіў у карчму. Павячэралі, гаспадыня паслала скубэнту пасцель на тапчане, пад палацамі. Той было ўжо хацеў укласціся, але гаспадар узяў бізун у рукі ды кажа:

— Пастой-тка, паўчу цябе трохі, калі ўсё ў тахт скажаш, то будзеш цэл, а калі не — пападзеш бізуна.

І паказвае на цяпло, што гарэла на комінку, кажа:

— Што гэта?

Скубэнт адказвае:

— Звесна — агонь!

Той яго сцёб бізуном:

— Не, брат, прашыбся! Гэта называецца не агонь, а красата!

І паказвае на ката, што сядзеў на прыпечку і мыў сабе лапкай мордачку:

— А гэта што?

Скубэнт кажа:

— Кот!

Ён узяў яго сцёб бізуном.

— Не,— кажа,— гэта чыстата!

А далей паказаў на палаці:

— А гэта што?

Той кажа:

— Палаці!

— Не, брат, гэта высата, помні,— ды бізуном.

— Ну, а цяпер,— паказвае яму на ваду,— у пасследні раз угадай, што гэта?

Скубэнт кажа:

— Звесна — вада!

Мужык яму зноў бізуном:

— Не, брат, прашыбся, гэта называецца благадаць!

Пасля гэтых навук мужык палажыў бізун, палез на палаці спаць, гаспадыня лягла на печы, а скубэнт на тапчане — і заснулі. Пад дзень мужык з жонкай усталі і пайшлі ў ёўню малаціць. Прачнуўся скубэнт, агледзіўся — нікога няма ў хаце. «Ну,— думае,— зраблю штуку!» Узяў злавіў ката, прычапіў к хвасту галавешку з агнём і ўскінуў на палаці; а там лён сушыўся. Тады скубэнт пайшоў у ёўню к гаспадару і кажа:

— Дзякуй табе за хлеб-соль, начлег і навуку, але вот: чыстата ўхапіла красату і панесла на высату, а калі не ўжывеш благадаці, то не будзеш сядзець у хаце!

І пайшоў сабе.

Мужык гэта адумаўся, што скубэнт пэўне штуку зрабіў, пабег у хату, бача — лён гарыць на палацях. Ён давай заліваць і скубэнта памінаць.

## Як мужык хітра гуся падзяліў

Адзін бедны мужык прынёс да пана гуся і просіць, каб пан даў за яго шуфель жыта. Дык пан кажа:

— Ну, нас семера: я, пані, двое сыноў і двое дачок. Падзеліш ты на нас усіх гэтага гуся?

Той падумаў:

— Добра,— кажа,— пан галава ў даму, то пану будзе галава: пані будзе шыйка, бо першая за панам; паненкам будзе па ножцы, каб лёгка танцавалі, панічам па крылышку, каб красіва пісалі, а я, мужычышча, вазьму сабе кадлубішча.

— Ну,— кажа пан,— хітры!

Гуся яму аддаў і ўжо не адзін шуфель жыта, але можа якіх даў з пяць. Прынёс мужык жыта, а брат як даведаўся, дык узяў дзве гусі, занёс да пана і просіць таксама жыта. Пан кажа:

— Добра, але падзялі ж ты нас.

Той падумаў і кажа:

— Пану будзе гусь і пані будзе гусь.

— А маім дзецям?

Дык той і не ведае, што рабіць.

— Ідзі ж,— кажа пан,— па свайго брата, ён нас раздзеліць.

Пайшоў ён па таго, прыходзяць, дык пан кажа:

— Падзялі ты нас, бо твой брат дурны якісь, не дасць рады.

Той падумаў трошкі і кажа:

— Ці пан верыць у святую тройцу?

— Цо табе гэта, альбо ж я не католік?

— Ну, калі так, то пан, пані і галоўка — то святая тройца; дзве паненкі і ножка — і то святая тройца; двое панічоў і скрыдэлька — і то будзе святая тройца, а мужык і дзве гусі, то таксама святая тройца.

Так пан аддаў яму гусі і жыта, колькі ён хацеў, а брата прагнаў вон. От які мужык быў мудры!

## Кацярына

Жыў-быў дзед. У яго была дачка Кацярына. Адзін раз дзед пайшоў у лес і найшоў там залатую ступу, прынёс дамоў і кажыць дачцэ:

— Дачушка! Я гэту ступу аднясу пану.

— Не нясі, татулька, пану, бо пан, узяўшы яе, захочыць і таўкачы.

Толькі дзед не паслухаў дачкі, панёс ступу пану. Калі дзед прынёс ступу, пан выйшаў на двор, паглядзеў яе і сказаў дзеду, каб к ступе былі таўкачы. Дзед заплакаў і пайшоў.

Прыйшоў дзед дамоў і кажыць дачцэ:

— Праўду ты казала, што пан захочыць і таўкачоў.

Тады Кацярына гаворыць бацьку:

— Ідзі, бацьку, і скажы пану трох дуракоў: адзін, што пацяраў ступу, другі, што знайшоў, а трэці — ты пан, што ўзяў ступу і хочаш яшчэ таўкачоў.

Дзед пайшоў і сказаў. Тады пан гаворыць:

— Дзед, твая дачка Кацярына разумна. На табе жменьку лёну, знясі яго сваёй дачцэ, няхай яна мне гэты лён спрадзець, саткець і здзелаець мне к вечару рубашку.

Дзед заплакаў і пайшоў дамоў.

Прыйшоўшы, ён сказаў дачцэ, што прыказаў пан. Тады дачка дала дзеду палачку і сказала:

— На табе, татулька, гэту палачку, аднясі яе к пану і скажы яму, штоб ён мне перша здзелаў усе прыпасы для таго, штоб можна было ткаць.

Дзед пайшоў і аддаў пану палачку. Пан узяў яе і сказаў:

— Разумна, брат, твая дачка Кацярына.

Пасля гэтага пан узяў дзесятак яец, звmanaged:

— Штоб твая дачка пасадзіла курыцу на гэтыя яйкі і штоб цераз дзве нядзелі былі цыпляты.

Дзед заплакаў і пайшоў дамоў.

Прыйшоўшы, аддаў дачцэ яйкі і сказаў, што пан прыказаў.

Тады дачка ўзяла гарнец ячменю, зварыла яго і сказала бацьку, штоб ён яго аднёс пану, штоб ён яго пасеяў, зжаў, змалаціў і надраў круп, каб было чым карміць цыплят.

Дзед пайшоў і аддаў ячмень пану. Пан тады сказаў:

— Разумна твая дачка Кацярына, але ты ёй скажы, штоб яна ка мне ні прыйшла, ні прыехала, ні сытая, ні галодная, ні голая, ні адзетая.

Дзед пайшоў і кажа гэта Кацярыне. Яна тады ўзяла наварыла жыдкага кісялю, нахлябалася яго, укруцілася ў сетку, узяла труса, села на казла і паехала к пану. Толькі што пан з акошка ўвідзіў Кацярыну, вялеў напусціць на яе сабак. Як толькі сабакі кінуліся на яе, яна зараз кінула ім труса, а сама на казле пад'ехала пад крыльцо к пану. Пан выйшаў к Кацярыне, гаворыць:

— Я ж табе казаў, штоб ты ні прыйшла, ні прыехала, ні сытая, ні галодная, ні голая, ні адзетая.

— А я ж так кісялю паела, сець надзела і на казле прыехала.

— Ну, будзем, Кацярына, жаніцца — сказаў пан.

— Будзем, паночак.

— Толькі ты, Кацярына, мой суд не перасуджвай.

— А пан на мяне «брэдзіш» не скажа.

Вот яны і ажаніліся і жывуць. Толькі раз, у навозную талоку, у аднаго мужыка жарабілася кабыла, а жарабёнак падкаціўся пад калёсы. Тады мужыкі началі спорыць. Адзін гаворыць: «Мая кабыла жарабілася», другі: «Мае калёсы». І пан гаворыць: «Калёсы жарабіліся».

Тады Кацярына сказала, штоб калёсы і кабылу пусцілі з гары, за кім пабяжыць жарабёнак, таго кабыла. Пан кажа:

— Кацярына! Ты мой суд перасудзіла.

— На ночы ў майго бацькі,— сказала Кацярынка,— куры, узлезшы на дом, клювалі звёзды, а шчукі, вылезшы з вады, сабіралі гарох.

— Што ты брэдзіш?

— Во, пан, на мяне сказаў «брэдзіш».

— Будзем, Кацярына, разжэньвацца.

— Будзем, паночак.

Тады Кацярына ўзяла напаіла гарэлкай пана, палажыла яго ў лодку і паехала з ім па рацэ.

Толькі пан прачнуўся і гаворыць:

— Вернемся, Кацярына, у двор.

Пасля гэтага пан і Кацярына сталі жыць і пажываць умесце.

### Пану навука

Слухайце, бо скажу вам не казку, а шчырую праўду. Дзе тое было, цяпер я забыўся, бо ўжо, бачыце, старасць. А ведама, калі з чупрыны гінуць валасы, то і памяць з галавы. Вось я забыўся, што сёння абедаў. Не памятаю. А мо' і нічога. Трапляецца і гэтак. Кажуць жа: «Часам з квасам, а парою з бядою, ці то з вадою». Цяпер ліха, жалюцца маладзічкі, а даўней было гарэй. Вы таго не памятаеце. Не вельмі даўно тое было, яшчэ за паншчыну.

Добра, калі трапляўся добры пан. Але дзе траплялісе такія добрыя паны? Больш былі не паны, а звяр'ё паганае. Як трапіцца такі паганы пан, то хоць лажыся ды памірай,— нічым яму не ўгодзіш. Кажуць жа: «Зачыні чорту дзверы, то ён праз вакно». Гэтакі люты пан. Ты яму годзіш, шчыра

робіш, а ён табе ўсё крычыць: «Не так, шэльма, не так, галган, не так, псякрэў»,— і есць цябе поедам, есць, зневажае, здзекваецца. А чуць што — жыўцом скуру злупіць. Ой, цяжка, вельмі цяжка было за лютымі панамі. А ліхія паны былі ўсе.

Вось жа ў адным двары быў такі ліхі пан. Чаго толькі ён ні вычвараў! Як толькі ён ні здзекваўся над людзьмі! Сек ён і мужыкоў і баб, старых і малых. Расцягнуць маладзіцу або дзеўку, камісар тыча пальцам ды й кажа: «Лупі!» Хурман пачне пярэсціць, што аж пара валіць. Не аднаго ён засек насмерць і нікога не баяўся. А людзей ён лічыў гарэй сабак. Што ён вычвараў над маладзіцамі ды дзеўкамі, дык сорам казаць... Не мог той паганы пан ужо больш нічога прыдумаць, каб паздзеквацца над людзьмі, вось і вялеў ён, каб мужыкі прыводзілі на продаж валоў толькі ў двор. А па канцах сяла паставіў рагаткі ды не пазваляў праехаць к мужыкам ніякаму купцу. Вось і павялі людзі ў двор валоў на продаж. Але прывядзе хто вала, а пан і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл.

І заплаціць бы за казла, а то яшчэ пашле на стайню ды ўсыпле паўсотні гарачых. Доўга мучыліся бедныя мужыкі з такім панам. Доўга цярпелі, бо што зробіш, каму пажалішся. Ведама, паны за панамі і цягнуць. Але вось знайшоўся адзін чалавек, што адплаціў таму пану за ўсе людскія слёзы ды за крыўду. Вось як тое было.

Быў там удалы, здатны хлопец. Рана ён асірацеў, але і адзін-такі ўзбіўся на гаспадарку. Горды быў хлопец. Ніхто яго ніколі і пальцам не зачапіў. Толькі вось ён прыводзіць у двор на продаж вала. Убачыў пан, выйшаў на ганак ды і кажа:

— Што ж ты прывёў, асёл? То ж не вол, а казёл.

Пазірнуў той дзяцюк, што блізка нікога няма каля пана, паказаў яму паплíску ды і пытае:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? Я ж прывёў табе вала, не казла.

І давай пярэсціць, давай дубасіць пана тою паплíскаю. Рэзаў-рэзаў, пакуль сам здаволіўся.

— Вось жа табе, пане, за тое, што ты людзей мучыш. Калі вычухаеш гэта, то чакай мяне яшчэ другім разам, тады здыму з цябе скуру.

Сказаў гэта дзяцюк ды і ўцёк у лес. А ведама, якія даўней былі цёмныя ды густыя лясы. У іх жыві, колькі хочаш, ніхто цябе не трапіць. Знайшла дворня пана без памяці — так вымесіў той дзяцюк. Толькі на трэці дзень трохі ачухаўся пан і вялеў злавіць Рымшу — так звалі таго дзецюка. Ды куды там, яго і след ветрам замяло. Амаль тыдняў сем пракачаўся пан, чуць чорту душу не аддаў. Якіх толькі дактароў не спраўджалі — нічога не парадзяць, бо яму, мабыць, Рымша адсадзіў печанцы. А што ўложыць хам, то не выйме і пан.

Але вось па немалым часе прыехаў у двор якісьці венгерац. У яго ўсялякіх зелляў, усялякае лякобы! Рад пан, чапкуе, просіць таго доктара, каб яго палячыў. Пагасцяваў доктар у двары і давай лячыць пана. Вялеў гэта

ён напаліць лазню. Павёў пана туды. Пасадзіў яго на лаўцы і казаў аберучкі дзяржацца за жэрдачку, а сам пачаў націраць пана ўсялякімі мазямі. Сядзіць пан, трымаецца аберучкі за жэрдачку ды толькі крэкча. Але нядоўга ён так сядзеў: выцягнуў доктар з кішэні сыромец, прывязаў ім к жэрдачцы панскія рукі, заткнуў пану вехцем горла, узяў хварасціну ды і кажа;

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, не казла.

Бачыць пан, што гэта Рымша, а не доктар, хоча крычаць, ды не можа, бо вехаць у роце. Круціцца пан, бы ўюн на гарачай скавародзе, а Рымша дастаў з-пад палы канчук і давай хрысціць паганага пана па чым папала. Лупіў-лупіў, амаль не ўсю скуру садраў, ды і давай пасыпаць пана соллю. Самлеў пан ад болю. А Рымша сеў на коней ды паехаў сабе. Толькі яго і бачылі. Доўга хварэў пан, чуць не паўгода пракачаўся. Усе думалі, што ўжо яму прыйшлі канцы, але ліхога і смерць не бярэ: к вясне вычухаўся пан і хацеў ехаць за граніцу на воды, ды бачыць — грошай няма. От уздумаў ён прадаць лес. Пайшла пагалоска, і пачалі купцы аглядаць лес. Таргаваліся яны, таргаваліся, ды не сходзяцца аб цану, бо пан вельмі даражыўся. Толькі вось прыехаў якісьці вельмі багаты купец. Павёў яго пан аглядаць лес. Хваліць пан лес, а купец толькі ўсё адводзіць пана ў гушчарню ды ў нетру. Забраліся яны ў такую гушчэчу, што і свету божага не бачна. Купец давай абнімаць хвоі, сажнем мерыць таўшчыню. Абхапіў і пан адну хваіну, а купец хуценька выхапіў з кішэні сыромец ды і прывязаў пана да хвоі. Бачыць пан, што тут не пярэлівкі і хацеў крычаць, зваць на ратунак, але так спалохаўся, што няма голасу. Паказаў яму купец папліску ды і пытае:

— Што гэта, бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, не казла.

Дагадаўся пан, што гэта Рымша. Тым часам Рымша запхаў пану мохам рот ды і давай пярэсціць па чым папала ды прыказваць, каб больш не здзекваўся над людзьмі. Біў-біў Рымша пана — чуць насмерць не забіў, ды так і кінуў прывязаным да хвоі. Так да вечара і ўсю ноч правісеў пан на хвоі, пакуль дворня знайшла. От тут ужо пан цэлы год пракачаўся: усё не можа выздаравець. Няма ачунку, вось і радзяць пану ехаць на воды. Прадаў пан гэты лес, прадаў збожжа ды гаўяда, сабраў многа грошай ды і давай выладжвацца на воды. Тым часам Рымша ўсё цікуе за панам. Толькі пан выехаў з двара ды ўехаў у лес, як Рымша ўжо зрабіў на яго пастку. Паставіў ён на дарозе ганоў на трое адзін ад другога двух конных хлапчукоў з доўгімі папліскамі. Толькі пад'ехаў пан, як першы хлапчук трасе папліскай ды крычыць:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза?

А сам па каню ды наўцекача.

— Лапайце, лапайце! — крычыць пан,— то ж галган Рымша!

Фурман адрэзаў пастронкі, сеў на каня ды і пагнаўся за хлапчуком. Але той сунуў у лес і, чорт ведае, куды дзеўся. Фурман папёр дарогаю ўперад мо' вёрст дзесяць. Тым часам заехаў упярод перад панам другі хлапчук, паказаў папліску ды і пытае:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза?

— Лапай, лапай яго, галгана! — крычыць пан на лакея,— то ж Рымша!

Ускочыў лакей на другога каня ды і пагнаўся за хлапчуком. Астаўся пан адзін. Тут Рымша высунуўся з-за выскаці ды і паказаў пану папліску:

— Што гэта, пане, бяроза ці лаза? Я ж прадаў табе вала, а не казла.

І давай дубасіць ды пярэсціць пана тою папліскаю. Збіў Рымша пана на горкае яблыка, забраў усе грошы ды і пайшоў сабе ў лес у сваю зямлянку. Кажуць, потым Рымша многа дабра рабіў людзям. Яшчэ да гэтых часоў у цёмным лесе сярод балота стаіць гара. Яе называюць Рымшаваю гарою. Гэта паміж Заполлем і Навасёлкамі. Дык, кажуць, там жыў той Рымша. Ён дзесь схаваў многа грошай, але нельга знайсці. Зямлянку тую я сам бачыў, як хадзіў туды ад пана з картаю. Каб пашукаць, мо, і грошы ёсць.

## Мужык і пан

Адзін мужык убачыў у памешчыка харошую свінню з парасятамі. Ён пайшоў і стаў кланяцца свінні. Гэта відзела пані з балкона. Яна паслала лакея спрасіць, чаму ён свінні кланяецца. А той кажа:

— Гэта мая Рапка жэніцца, а ваша Белка маёй Рапцы родная цётка, дык я заву на вяселле, а яна ўсё кажа: «Не хачу!»

Лакей пайшоў і расказаў пані. Тая рассмяялася і сказала прызваць мужыка. Мужык прыйшоў. Тады пані і кажа:

— Што ты нашай свінні кланяешся?

— А во што: у мяне ёсць Рапка, а ваша Белка ёй родная цётка, дык мая Рапка жэніцца і просіць вашай Белкі на вяселле,— вот я і прыйшоў прасіць, а яна кажа: «Не хачу!»

— Ха-ха-ха!.. Ну дык як жа ты яе павядзеш,— кажа пані,— ці павязеш?

— Не, павяду, калі пойдзе,— я прыйшоў.

— А парасяты як будуць?

— І з дзеткамі, прасіла Рапка, штоб пусцілі.

— Ну, дык я скажу, штоб запрэглі каня і палажылі Белку, а калі не захоча ляжаць, то прывязаць, а парасят у мяшок.

Пані прыказала запрэгчы каня, палажыць на воз свінню і парасят і даць мужыку.

— Ці скора ты назад прывязеш?

— Скора, мая панічка.

Мужык сеў і паехаў. Пана не было ў двары. Як прыехаў пан, так пані яму кажа:

— У нас быў мужык, ён нашай Белцы кланяўся, прасіў на вяселле. Я яе пусціла і каня дала ехаць.

А пан кажа:

— Во дурная, мужык абманіў: прападзе і конь, і свіння з парасятамі. Скарэй коней давайце!

Далі тройку з колакалам. Пан сеў і пытае:

— Куды мужык паехаў?

— А во сюды,— кажуць людзі,— і паказалі пану дарогу. Пан туды і паехаў. А мужык пачуў колакал, звярнуў у лес. Там забіў свінню з парасятамі, каня прывязаў, а сам выйшаў на дарогу, наклаў кучу памёту накрыў шапкай і сядзіць. Едзе пан.



*З. Паплаўскі.* Колас запісвае казкі

— На бок! — крычыць панскі кучар.

— Не, паночак, не! Едзьце вы сабе на бок,— мне не можна!

Пан сказаў кучару аб'ехаць мужыка. Мінуўшы мужыка, пан астанавіўся і спрашвае:

— Ці не бачыў ты, мужычок, тут мужыка, едучы і везучы свінню з парасятамі?

— Бачыў, паночак, ён тут нядаўна ехаў.

— А ці знаеш, куды ён паехаў?

— Знаю.

— Пакажы ж нам дарогу.

— Не, паночак, не! Мне і з месца няможна сыйсці. Калі хочаш, то я

вам дарогу скажу: вы будзеце ехаць прама, потым завароціце крута-крута ўправа, а там крута-крута ўлева і так далей.

Пан і спрашвае ў кучара:

— Ці паняў ты?

— Не, пане!

— І я не паняў.

Тады пан спрашвае ў мужыка:

— Ці дагнаў бы ты яго?

— Чаму не, пане? Я яго зараз бы прыцяг к вам.

— Ну, дагані, я табе заплачу.

— Не, божа сахрані! Мне з месца няможна сыйсці.

— Чаму ж табе няможна сыйсці? Што ты тут робіш?

— Гэта, паночак, ехаў мой пан і сустрэўся з знакомай паняю, і тая пані падарыла яму шчыгла. Дык пан сказаў мне яго дзяржаць, пакуль ён будзе ехаць назад.

— Ну, дык ты едзь з маім кучарам, а я буду вартаваць.

— Не, пане, не хачу; тады мне ад пана жыцця не будзе, як ты ўпусціш шчыгла.

— Я не ўпушчу.

— Не, пане, не паверу.

— Ну, дык я буду вартаваць з фурманам, а ты едзь адзін.

— Не, не хачу!

— На табе сто рублёў, едзь!

— Не, баюся, пане: вы пусціце шчыгла.

— Ды не пусцім жа!

Мужык узяў сто рублёў і сеў ехаць. А пан спрашвае:

— Ці скора ты вернешся?

— Цераз час, паночак, я тут буду.

Мужык паехаў. Па дарозе ён адчапіў колакал, заехаў у лес, узяў каня з свіннёю і парасятамі і паехаў.

Пан з кучарам прачакалі час — мужыка няма, прачакалі другі — яго няма. Тады кучар кажа:

— Пані была дурная: аддала каня з свіннёю і парасятамі, а пан яшчэ дурней: аддаў тройку коней і сто рублёў.

А пан кажа:

— Што ты, мужык, дурню! Як я зраблю аб'яўленне, чый шчыгол, так і найду вара.

Стала сонца заходзіць, а кучар кажа:

— Не хачу ўжо сядзець,— я есці хачу, хадзем у двор. А пан кажа:

— Ну, дык ты бяры шчыгла, а я буду падымаць шапку.

Трохі падумаўшы:

— Не, ты ўпусціш; ты падымай шапку, а я буду браць шчыгла.

Кучар узяў за вяршок шапкі, а пан абедзве рукі падсунуў пад шапку.

Кучар як падыме шапку, дык пан разам абоймі рукамі як хваціць,— дык прама ў памёт. Тут як закрычыць:

— А дурань! а галган! во шчыгол!..

Кучар кажа:

— Я гаварыў, што пані дурная, а пан дурней.

А пан крычыць:

— На адсячы мне рукі! Што мне зрабіць?

— А што вам, пане, зрабіць — абатрыце аб траву.

Пан так і зрабіў, і пайшлі яны ў двор. Прыйшоўшы, пан і кажа пані:

— Ты дурная: аддала каня і свінню з парасятамі, а я дурней: аддаў трох коней і сто рублёў, а яшчэ рукі ўпэцкаў, хоць адсеч трэба.

Пані рассмяялася. А мужык і цяпер ездзіць на панскіх конях.

## Асцярожны пасланец

Быў сабе адзін пан ды такі паганы, злосны, што проста бяда — ніхто не мог яму ўгадзіць. Усе яго баяліся, бы чорта. Бывала, як прыдзе к яму хто чаго кольвек прасіць, а ён раптоўна як крыкне:

— Што скажаш?

Дык той кажа:

— Усё добра, паночку.

А сам дрыжыць, бы асіна.

— А па добрым што? — закрычыць пан.— На канюшню яго, галгана!

От так не дасць і слова прамовіць. Іначай ён і не ўмеў з людзьмі гаварыць. І баяліся ж людзі гаварыць таму пану што-небудзь кепскае, не пад гумар — засячэ, усю скуру зніме, калі хто не патрапіць сказаць яму так, як ён хоча, а скажа не па шэрсці. Толькі быў адзін нехлямяжны мужычок, звалі яго Стопкам; той умеў з тым панам гаварыць.

Раз той пан граў у карты ды і выйграў вельмі харошы маёнтак. От гэтак вясною, каля Міколы, паехаў пан аглядаць той маёнтак ды і астаўся там на ўсё лета. Бачыш, яму вельмі спадабаўся той маёнтак. Праўду ж кажуць, што новае сітка на калочку вісіць, а старое пад лаваю ляжыць. Бачыць аканом, што доўга пана няма, а тут у дварэ бяда на бядзе едзе ды бядою паганяе. От ён стаў думаць, як бы паведаміць пану. Думаў-думаў ды і надумаўся паслаць к пану пасланца. Толькі не ведае, каго паслаць, каб ён добра расказаў пану пра ўсё няшчасце. Каго ні пашле, усе не слухаюць, баяцца пана, каб за праўду не засек. Абяцаў ён вялікі гасцінец таму, хто пойдзе к пану. Перабраў усё сяло — няма ахвотнікаў. Не знае аканом, што рабіць — сядзіць ды ломіць рукі. Прачуў пра тое Стопак, пайшоў к аканому і кажа:

— Я пайду к пану і ўсё яму скажу: я ўмею з ім гаварыць.

Рад аканом, чуць не цалуе Стопка. От аканом даў Стопку цэлую жменю грошай, чобаты з сваіх ног і пасылае яго к пану ў новы маёнтак. Ідзе Стопак і ні аднае карчмы не мінае.

Ці доўга ён ішоў, ці мала, толькі вось прыйшоў у новы двор. Падыходзіць к пакоям, аж там сустракае яго лакей.

— Ты чаго тут шляешся, валацуга? — крыкнуў лакей на Стопка,— і давай яго цкаваць сабакамі.

Стопак дастаў з вярэнькі кусок сала і кінуў яго сабакам. Сабакі годзе брахаць. Тым часам Стопак узышоў на ганак.

— Што табе трэба? — пытае лакей зноў.

— Мне трэба бачыцца з панам,— кажа Стопак,— прыйшоў я, паночку, з старога панскага двара.

— Добра,— кажа лакей,— я скажу пану аб табе, але скажы ж ты мне, адкуль ты знаеш, што я пан.

— Адтуль знаю, бачу: ты пан, не пан, а так сабе палупанак, бо ў цябе нос нізкі, лоб слізкі, от і бачна, што лізаў панскія палумiскі.

Хацеў лакей схапіць Стопка за каўтуны ды, як кажуць, пасдаць яго з валасянога ўпраўлення ды ў земскі суд, але тут якраз лакея пазваў к сабе пан.

— Які там хлоп? — пытае лакея пан.

— То пасланы ад пані з панскага маёнтка.

— А пакліч яго.

Пабег лакей зваць Стопка к пану, а Стопак тым часам дастаў капшук, напхаў у люльку тытуню, выняў з магалейкі губку і крамянец, узяў цагало і давай красаць агонь. Выкрасаў ён агню і давай курыць люлечку. Курыць сабе ды паплёўвае на чысты памост.

— Ідзі, цябе пан кліча,— кажа лакей.

— Не трасца трасе, хай абажджэ,— кажа Стопак і пакурвае сабе люлечку.

— Прэндзей ідзі!

— Зараз, зараз, толькі люльку дакуру.

Ждаў, ждаў пан Стопка, не даждаўся. Гоніць зноў лакея па Стопка. А Стопак агінаецца ды шавеліцца, бы мокрае гарыць.

Дакурыў ён люльку, выбіў з яе попел, схаваў за пазуху і толькі тады памаленьку пасунуўся к пану. Лакей, бы сабака, бяжыць наперадзе ды адчыняе дзверы. Улез Стопак к пану ды і закашляўся. Кашляе Стопак, а пан чакае ды толькі вусы круціць.

— Дзень добры, паночку!

— А цо повеж? — пытаецца пан.

— Усё добрае, паночку.

— А па добрым цо?

— Ды от, паночку, мяне прыслаў аканом. Панскі сцізорык зламаўся.

— Які сцізорык?

— Ды гэта ж той, што пану пер'і рабілі.

— Як жа яго зламалі?

— Кажуць жа, пане, што без нажэндзя і вошы не заб'еш. Але ўсялякае нажэндзе пры рабоце псуецца, от так і панскі сцізорык. Хацелі пану

на боты злупіць з выжла скуру, узялі сцізорык, але на панскім выжлу вельмі моцная скура — сцізорык і зламаўся.

— Якего выжла — цо ты пляцеш, галган?

— Панскі выжал, той самы, можа пан памятае, ён яшчэ ўскочыў у калодзеж, а Мікіту паслалі даставаць, ды ён і ўтапіўся там. Эге ж, той самы выжал, што пан любіў яго браць на паляванне. Э-э-ж, дай божа памяць, здаецца мне, што пан аддаў за таго выжла суседняму пану трох мужыкоў.

— Цо ж, мой выжал здэх?

— Здох, пане.

— З чаго ж ён здэх?

— Кажуць, паночку, быў здароў, але як каніны аб'еўся, дык разам і ногі выпруціў.

— Якой каніны?

— Ды мяса ж жарабца.

— Якога жарабца?

— Панскага буланага жарабца, з лысінаю.

— Цо ж, і ён здэх?

— Здох, паночку... А шкода, добры быў жарабец.

— О, я няшчэнслівы!

— Э, пане, чаго вельмі турбавацца? Ужо ж ведама, калі жарабятка ўродзіцца з лысінаю, то яно ці здохне, ці яго воўк з'есць.

— А чаго ж жрэбец здэх?

— Падарваўся, мабыць.

— Цо ж на нім робілі, прэнтко ездзілі, чы цо?

— Не, пане, на ім не ездзілі, заўсёды ён стаяў на стайні.

— А цо ж?

— Ваду, пане, вазілі.

— Але ж на цо была та вода?

— Людзі ж кажуць, паночку, што як топішся, то і за брытву хопішся. Як загарэўся ў двары свінух, дык аканом вялеў і на жарабцу ваду вазіць.

— Цо ж і свінух спалілсе?

— Згарэў, паночку.

— Як жа ён запаліўсе?

— Бачыш, пане, ён быў блізка каля аборы, от ад яе і загарэўся.

— То і абора спалілась?

— Гарэла, пане, як свечка.

— З чаго ж яна запалілась?

— От гэтага, паночку, добра не ведаю: ці ад абозні, ці мо' ад пакояў.

— Езус, Мар'я, то і пакоі спаліліся?

— Згарэлі, пане, суздром усё знікла, от як бы хто языком злізаў.

— І вшыстэк двор спаліўсе?

— Увесь, пане; чыста, гладка, хоць рэпу сей.

Ухваціўся тут пан за галаву і давай божкаць.

— Але з чаго запаліліся пакоі? — пытае зноў пан Стопка.

— Ад свечак, пане.
— Для чэго ж палілі свецы?
Ну, як жа, пане, ведама, заўсёды свечкі паляць, як хто памрэ.
— Цо?.. Хто ж там змарл?..
— Вечны пакой, каб ёй на тым свеце лёгка ікнулася,— пані памёрла.
— Цо-цо-цо ты гадаеш, пані змарла?.. О, я няшчэнслівы!
— Чаго ж пан плача? Пану ж бог даў і прыбытак.
— Які? Гадай прэндзей!
— Пану бог даў унука. Большая паненка сына мела. Гожы, кажуць, хлапчук, ці то паніч, выліты панскі хурман Мікіта.
...Пачуўшы тое, пан зваліўся з крэсла, а Стопак пайшоў сабе ў пякарню падвячоркаваць. Дык вот які быў Стопак і як ён умеў з панамі гаварыць.

### Не люба — не слухай

Адзін пан дужа любіў слухаць казкі. Раз і прызваў ён мужыка гаварыць казкі. І кажа яму пан:
— Вот талерка золата; калі скажаш ты мне такую казку, каб не было ў ёй ні слова праўды, каб я сказаў на цябе «лжэш», дык тады аддам табе гэту талерку з золатам.
І пачаў мужык.
— Чаго, паночак, на свеце не бывае. Вось са мной раз такая прыгода здарылася. Было гэта, як я яшчэ не радзіўся. Наняўся я ў аднаго гаспадара пчол пасціць,— пяцьдзесят раеў пчол. Кожны дзень трэба было іх сашчытаць і выпусціць за пажыўнасцю; вернуцца — трэба пералічыць іх, выдаіць і ў вуллі пазаганяць.
— Свет вялік, можа быць, праўда,— кажа пан.
Глянуў мужык на золата і гаворыць далей.
— Раз ранкам выпусціў я пчол на пасту. Вярнуліся яны дамоў — дванаццаць пчол няма. Што тут рабіць? Можа дзе ў балоце завязлі... Кінуўся я іх шукаць. Як ісці, дык ісці... аж бачу — адзінаццаць пчол ляцяць, акрываўленыя, параненыя, а дванаццатай няма. Будзе бяда!.. Я ісці далей. Бачу — за ракой стада ваўкоў, апанавалі маю пчалу і душаць; яна адбіваецца, не паддаецца ім. Я ну бегчы шпарчэй на помач. Прыбег к рацэ — перавозу няма. А бачу, што яшчэ часінку — і ваўкі яе разарвуць. Я, гэта, схваціў сам сябе за чупрыну, размахаў-размахаў,— як штурхну, так і перакінуўся на той бок ракі.
— Можа быць,— кажа пан.
— Але з разгону як гопнуў я аб зямлю, дык па пояс і ўвяз. Я і туды, я і сюды — не вылезці. Без рыдля нічога не зробіш, думаю сабе. Я, гэта, кінуўся як мага дадому, схапіў рыдзель ды і назад; адкапаў сябе, тады кінуўся к пчале на помач.
— Свет вялік, можа быць, і праўда,— кажа пан.
— Прыбег я к пчале, адагнаў ваўкоў, бачу, што ёй ужо не жыць: па

баках боўтаецца мяса, як шмацце, а крыві-крыві!.. Я, нядоўга думаючы, шась яе нажом па горлу і прырэзаў: потым абяліў яе і прывёз мяса дадому: дванаццаць кадзей мяса наклаў!

— Свет вялік, можа быць, і праўда.

— Тут я ўспомніў, што косці засталіся на пожні. Думаю сабе: «Лаяць будуць людзі, што заграмаздзіў касцямі больш дзесяціны сенажаці. Пабягу ды скіну іх у раку». Прыбег, стаў паднімаць хрыбет з рабрáмі. Падняў я яго, потым як штурхну ад сябе! Я думаў, што ён упадзе ў раку, а ён адным канцом стаіць на зямлі, а другім у неба ўпёрся.

— Свет вялік, можа быць, і праўда.

— Палез я па гэтым хрыбце на неба. Як лезці, дык лезці — і ўзлез. Бачу — у адной хаце пірушка, святыя гуляюць: п'юць гарэлку і віно, закусваюць, песні такія прэпадобныя пяюць... Ну, думаю сабе, з п'янымі, чалавеча, не займайся, а то яшчэ ненарокам бокі намнуць. Іду далей. У другой хаце святы Мікола набраўся гарэлкі, як пучок, ляжыць пад лавай і храпіць, як пшаніцу прадаўшы.

— Можа, і праўда.

— Каля яго ляжыць шапачка, сама залатая з дарагімі каменнямі. Я гэту шапачку за пазуху ды і назад; аж тут святы Мікола прачнуўся, стаў шукаць сваю шапку. Падняўся крык... Ну, думаю, калі зловяць,— будзе кепска. Я тут ніяк не найду таго месца, дзе стаяў хрыбет. Бачу — ляжыць пілавінне. Я давай з яго вяроўку віць.

Звіў доўгую вяроўку, прывязаў адзін канец яе і стаў спускацца з неба па вяроўцы. Спусціўся да самага канца вяроўкі, а яшчэ зямлі няма. Што тут рабіць? Я, гэта, вазьму ды адрэжу зверху кусок вяроўкі, а знізу надтачу і спускаюся далей.

— Свет вялік, можа быць, і праўда.

— Стаў, гэта, я на зямлю. Бачу — не наша зямля. Ну, думаю сабе, гэта, пэўна, пекла. Іду далей. Аж бачу — панскі бацька, пакойнік, абарваны, абшарпаны, босы, пасвіць свіней.

— Лжэш, хаме!

Мужык цап за талерку з золатам ды і за дзверы.

## Несцерка

Жыў сабе так Несцерка, меў дзетак шэсцерка. Рабіць ляніцца, красці баіцца, папрасіць не пасмее — не з чаго яму пражыць. Вот ён узяў ды й пайшоў к богу. Ідзе, ажно ідзе Юр'я-залатое сядло.

— Здароў, святы Юр'я!

— Здароў! Хто ты такі?

— А я,— кажа,— Несцерка, маю дзетак шэсцерка, рабіць ленуюся, красці баюся, папрасіць не пасмею!

— Куды ты ідзеш?

— К богу!

— Чаго?

— А вот чаго: не з чага мне пражыць, дык пайду к богу спрашу, чым мне займацца: ці чытаць, ці пісаць, ці з гаршкоў хватаць? А ты куды, святы Юр'я?

— К богу й я!

— Зачым?

— А пра свае надабнасці!

— Ну успомні там, святы Юр'я, пра мяне!

— Добра, успомню!

— Спытайся ў бога, святы Юр'я, чым мне займацца?

— Добра, спытаюся!

— Забудзеш, святы Юр'я?

— Не, не, спытаюся!

— Не забудзеш? Дай мне ў заставу сваю залатую страмяну, што не забудзеш!

— А як жа я паеду?

Несцерка ўзяў лазінку, зрабіў страмяну і прывязаў, а залатую ў заставу ўзяў. Паехаў той Юр'я к богу, а Несцерка дажыдае, пакуль ён вернецца. Тады святы Юр'я распрасіў у бога пра свае надабнасці і стаў садзіцца на каня. А бог убачыў лазовую страмяну і пытаецца:

— А дзе твая страмяна?

— А, господзі, Несцерка атабраў,— мае дзетак шэсцерка, рабіць ляніцца, красці баіцца, папрасіць не пасмее, з чаго яму пражыць?

— А няхай круціць ды матае і душу пітае!

Юр'я і паехаў. Пад'ехаў ён к Несцерку, той Несцерка пытае:

— А што, святы Юр'я, што табе бог казаў?

— А вот што бог казаў: «Няхай круціць ды матае і душу пітае!» Ну, дай жа, Несцерка, маю страмяну, што ты ў мяне ўзяў у заставу залатую!

— А калі я ў цябе яе браў? Я яшчэ сам табе даў страмяну лазовую. Падавай яе мне назад! Во мая страмяна, ля сядла!..

Што той Юр'я набраўся з Несцеркам, але-ткі мусіў заплаціць за лазовую страмяну.

Той Несцерка пабег у хату:

— Троху пажытку ёсць, слава богу! Мне-ткі не напрасна бог сказаў, што як салгу, дык жыў буду і з таго хлеба!

Пражыў тое, што заплаціў яму Юр'я за лазовую страмяну, тады ўзяў і павесіў залатую страмяну на варотах. Ажно едзе пан багаты. Убачыў страмяну, што вісіць на варотах, і кажа свайму кучару:

— Зайдзі, папытайся, ці не ёсць у яго прадажныя сёдлы?

Кучар зайшоў у хату і спрашвае:

— Што, ты сёдлы дзелаеш?

— Дзелаю,— кажа Несцерка,— ды толькі на заказ, патаму я дзелаю сёдлы дарагія — сярэбраныя, залатыя!

Кучар пайшоў і сказаў пану. Той пан злез і стаў дагаварвацца. Дагаварыліся, каб ён здзелаў яму сядло за сто рублёў і з гары-грошы. Узяў Несцерка грошы ды і сядзіць на печы. Прыязджае той пан за сядлом, а ён ляжыць босы на печы.

— Дзе сядло?

— Якое сядло, паночак?

— Ды тое, што я табе даваў грошы.

Несцерка толькі ксціцца:

— А вой, а вой! Якое ў мяне сядло? Я не ўмею лапцей сплесці...

Пан той крычаў, крычаў ды і кажа:

— Адзявайся, пойдзем на суд!

А Несцерка кажа:

— А што, ці я босы пайду?

— Ах, д'яблы яго вазьмі! Кучар, дай яму мае валенцы! Ну, адзявайся, пойдзем!

— А што, ці я голы пайду?

— А, нех ці, пане, д'яблы ўзялі! Дай яму, кучар, маю хутру!

Кучар прынёс хутру, Несцерка абуўся, адзеўся. Выйшлі вон. Пан стаў садзіцца на каня. А Несцерка паглядзеў ды кажа:

— А што я ці сабака, ці што, што я пяшком пабягу!

— А, нех ці д'яблы, пане, узялі! Дай яму, кучар, прысцяжнога каня!

Сеў той Несцерка, і паехалі на суд.

Прыехалі туды. Сталі іх судзіць.

— Ну, што ты, Несцерка, грошы пану не аддаеш?

— Ды я ж яму не вінават! Ён ка мне вяжацца, сам не ведаю чаго. Хоча, мусіць, сарваць што-небудзь! Зараз скажа, што гэта і боты яго на мне!

Пан той кажа:

— Дурань ты! Дык гэта ж мае боты!

— Ну вот, бачыце! Ён во кажа, што боты яго на мне. Можа, ён скажа, што і хутра гэта яго!

Пан зноў:

— Ах, каб цябе д'яблы, пане! Гэта ж мая хутра!

— Ну во, бачыце, гаспадзіны суддзі: ён ужо прызнаецца і к хутры! Можа, зараз скажа, што і конь гэта яго!

Пан той зноў крычыць:

— Ах, каб цябе д'яблы, пане! Гэта ж і конь мой!

— Ну вот, бачыце, гаспадзіны суддзі: ён ужо кажа, што і конь яго!

Суддзі тыя думалі, думалі ды і кажуць пану:

— Не, брат, відаць, што ты маніш, што гэта ўсё тваё: і хутра, і боты, і конь, і грошы!

І нічога не прысудзілі Несцерку. Сеў той Несцерка на каня і паехаў у двор. Засталіся яму і конь, і хутра, і боты, і грошы. І цяпер ён жыве з тых грошай.

## Завідны поп

У аднаго вельмі беднага чалавека памёрла дзіця. Просіць бедны чалавек суседзяў зрабіць дамавіну і выкапаць магілу для дзіцяці. Але ведама, калі чалавек багаты, дык усе яму памагаюць, а беднаму — ніхто. Прасіў, прасіў бедны чалавек, але ніхто не пайшоў капаць яму. Горка яму, слёзы так і цякуць, бы з бярэзіны сок. Няма чаго рабіць, трэба ісці самому капаць яму для свайго дзіцяці. Кажуць, гэта вялікі грэх, але што зрабіць, калі ад беднага й людзі адступіліся. Узяў бедны чалавек заступ і пайшоў, але перш зайшоў к папу й просіць, каб пахаваў дзіця.

— Добра,— кажа поп,— толькі ты мне перш прынясі дзесяць злотых і паўасьміны аўса.

— Няма,— кажа,— бацюшка, у мяне ні аўса, ні грошай.

І давай прасіць, каб поп пахаваў дзіця так, а ён ужо потым адробіць. Куды там! Поп не хоча і слухаць. Як ні прасіў бедны чалавек, поп стаіць на сваім ды й толькі. Заплакаў бедны з жалю і пайшоў капаць магілу.

Ось капае ён, капае і выкапаў гаршок з грашыма: чырвонцы аж ззяюць... Панёс гэты бедны чалавек гаршок з грашыма да гасподы і схаваў пад печ, а адзін чырвонец прыносіць папу. Здзівіўся поп, адкуль гэта ў беднага чалавека золата, і давай выпытваць. Бедны ўсё і расказаў, як было. От пахавалі ў беднага чалавека дзіця. Сама пападдзя з папом потым зайшлі ў хату к беднаму на памінкі. Толькі позна разышліся ўсе. Астаўся бедны чалавек адзін з жонкаю. Прыйшоў поп дамоў, і хочацца яму адабраць у беднага грошы. Зарэзаў ён казла, абвярнуўся ў казліную скуру, прыладзіў рогі ды й пайшоў у самую глупась к беднаму пад вакно. Прыйшоў, высунуў у вакно галавішчу з рагамі і кажа нямым голасам: «Аддай мае грошы!»

Спалохаўся бедны чалавек і аддаў гаршок з грашыма. Ухапіў поп аберучкі гаршок і пабег дамоў. Прыбег, хоча паставіць гаршок на стол, ды нельга — рукі прыраслі. Паспрабавала пападдзя садраць з папа казліную скуру. Куды там! І скура, і рогі прыраслі. Што ні рабіў завідны поп, нічога не ўрадзіць. Прыйшлося прасіць беднага чалавека, каб ён забраў свае грошы.

Сабраліся людзі, дзівяцца на папа, а ён толькі казлінаю барадой трасе. Ось, прыйшоў бедны чалавек і як узяў свае грошы, дык і скура з папа звалілася, ды не толькі казліная, але й свая.

От які быў завідны поп.

## Поп і дзяк

Былі сабе ў адным сяле поп і дзяк. Абодва п'яніцы. Хочацца ім піць, ды няма за што. От дзяк і кажа папу:

— Ёсць у цябе, бацюшка, кніга тоўстая, ты будзеш на гэтай кнізе гадаць, а я пайду красці, то нам і будзе з чаго выпіваць.

— А куды ж ты, дзяк,— гаворыць поп,— пойдзеш красці?

— А ў нашага Апанаса ў сяле валы добрыя, то я пайду вала ўкраду,

у лес павяду ды к бярэзіне прывяжу: дык ён к табе прыбяжыць зараз, бацька, пытацца, а я прыстаўлю хлопца пільнаваць, каб і ад нас хто не ўкраў.

Як сказаў дзяк, так і зрабіў. Ось прыходзіць Апанас ды плюсь бацьку ў руку.

— А чаго ты, свет, прыйшоў да мяне?

— Гэта я, бацюшка, сказаць вам пра сваё няшчасце — вала ў мяне ўкралі.

— А што ты, свет, дасі, калі я вываражу твайго быка: у мяне кніга такая ёсць, то як я яе прачытаю, то і ўзгадаю.

— Каб то ды была праўда, бацюшка, то я што захацелі, то даў ба.

— Я табе сказаў, што вычытаю: дасі пяць рублёў ды гарнец гарэлкі, то і вол табе будзе.

— Ды я, бацюшка, не буду спорыць за гэтым, зараз пайду ды і прынясу.

— Прынясі ж перш гарнец гарэлкі, а пяць рублёў пасля, як вала вычытаю.

От мужык і паплёўся па гарэлку. Прынёс гарнец. Поп з дзякам селі ды п'юць. П'юць ды і ў кнігу поп глядзіць, і кажа мужыку:

— От ведаеш, Апанас, я ўжо выгадаў, дзе вол. Ідзі ты ў лес, каля нашай палянкі, там і вол твой прывязаны к бярэзіне, ужо яго хочуць весці, ды баяцца, што дзень.

А дзяк хлопцу сказаў яшчэ наперад: «Калі хто будзе ісці па вала, то ты ўцякай».

Мужык пайшоў, куды бацька казаў, і знайшоў свайго вала. Знайшоўшы, прыйшоў к папу, падзякваў яму і пяць рублёў аддаў. Поп з дзякам, узяўшы грошы, давай папіваць. Як грошай няма, а выпіць трэба, то дзяк і пойдзе на промысел: у аднаго авечку ўкрадзе, у другога — свінню, а поп усё вычытвае. Так доўгі час пражывалі ды гарэлку папівалі.

Вось раз фурман, лакей ды кухар укралі шкатулку з грашыма ў свайго пана. Пан, пачуўшы, што поп усім вычытвае, загадаў запрэгчы трое коней у буду ды і пасласць па папа. Прыязджаюць. А поп п'яны, аж вочы пачырванелі ад гарэлкі, як буракі.

— Прасіў пан, каб бацюшка прыехаў к нам у двор,— гаворыць фурман.

Поп зараз свае кудлы прычасаў, раску надзеў святочную, сеў у буду ды і паехаў. Прыязджае. Пан стаў яго частаваць ды і кажа:

— Я чуў, бацюшка, што вы памагаеце людзям у няшчасцях, памажэце і мне. У мяне грошай многа ўкралі. Калі толькі вы, бацюшка, іх мне выявіце то я дам вам за гэта пшаніцы вазоў два і тысячу рублёў грошай.

— Цяпер, пане, я не магу: дома кніга ў мяне, прыдзецца, можа, і цэлую ноч сядзець.

А сабе і думае: «Як бы хутчэй з двара ўцячы, бо дзяк не ўкраў, то і гадаць не можна».

Пан сказаў:

— Во добра, заўтра я прышлю за вамі.

І загадаў адвезці папа дамоў. Прыехаў поп дамоў, паклікаў к сабе дзяка, расказаў яму ўсё ды і кажа:

— Прапалі мы цяпер з сваёю штукаю — мы ж не можам гадаць, хто ў пана грошы ўкраў. Трэба ўцякаць, нам, дзяча, з гэтага сяла.

Дзяк і пытае:

— А калі ж мы будзем уцякаць?

— От, да вечара пасядзім, ды дап'ём гарэлку, а як заспявае певень раз, ды другі раз, ды трэці, дык мы і дадзім цягу з сяла, бо пан як данясе архірэю, што мы людзей абманваем, то будзе нам абодвум.

— Добра,— кажа дзяк,— ты зноў там будзеш папом, а я дзякам.

Прыйшла і ноч. А поп з дзякам сядзяць за гарэлкаю ды гамоняць.

Фурман, лакей ды кухар бачылі, што поп быў у двара, дагадаліся, што поп будзе варажыць, ды і зачалі змаўляцца пайсці к папу, як паны ўлягуцца, ды і папрасіць яго, каб нічога не гаварыў пра тое, што яны ўкралі грошы ў пана. Як толькі паны заснулі, дык яны ў двор к папу і ўвайшлі. А поп з дзякам папіваюць сабе гарэлку. Фурман і падышоў да акна, а певень: «Ку-ка-рэ-ку!» Вось поп і кажа:

— Дзяча, дзяча, ужо ёсць адзін.

А фурман, пачуўшы гэта, падумаў, што поп пазнаў яго. Прыбег к таварышам ды і гаворыць:

— Поп прызнаў нас ды гаворыць, што ўжо ёсць адзін.

— Пайду і я паслухаю,— гаворыць лакей.

Вось яны ўдвух пайшлі пад акно. Падыходзяць, а певень: «Ку-ка-рэ-ку!» другі раз. Поп і кажа:

— Дзяча, дзяча, ужо два.

Фурман і лакей са страху к трэцяму ды і кажуць, што пазнаў, што і абодва прыйшлі.

— Хадзем утрох,— гаворыць кухар,— паслухаем.

Падышлі яны ўсе тры, а певень: «Ку-ка-рэ-ку!» у трэці раз. А поп і кажа:

— Дзяча, дзяча, ужо ўсе тры.

Вось яны цоп — ды ў хату. Поп спалохаўся: думаў, што гэта па яго прыслалі з двара, а яны яму бух у ногі:

— Бацюшка, не выказвайце пану, што грошы ўкралі, мы вам дамо за гэта па трыццаць рублёў усе ўтрох, толькі не выказвайце нас.

Поп уцешыўся ды і пытаецца:

— А дзе ж вы дзелі грошы?

— Мы іх закапалі ў стайні ў другім стаянку, ля дзвярэй.

— А вы ж грошай нічога не ўзялі, цэлы ўсе? — пытае поп.

— Нічога, бацюшка, усе цэлы, як мы іх укралі, так і закапалі.

— Ідзіце ж вы дадому, а я вас не выкажу.

Пацалавалі яны ўсе ўтрох руку папа і выйшлі з хаты. Поп сабе і думае: «Папаў-ка я шчасце», ды і будзіць дзяка, каторы заснуў пад сталом:

— Уставай, дзяча, будзем піць гарэлку да самага дня — наша ўзяла.

Назаўтра поп яшчэ спіць, а ўжо пан прыслаў чацвёрку коней з будаю. Прачнуўся поп, памыўся, узяў кнігу тоўстую ды і паехаў у двор. Прыходзіць поп у пакоі ды і кажа:

— Вычытаў, пане, знайшліся грошы панскія.

Пан ад радасці давай папа частаваць, а поп не стаў і гарэлкі піць ды кажа пану:

— Дайце мне двух работнікаў.

Далі. Пайшоў ён з імі ў стайню, разлажыў сваю кнігу тоўстую, паглядзеў, пабарматаў ды і кажа:

— Ну, капайце тут, у другім стаянку.

Пракапалі. Грошы знайшліся. Пану ўжо трэба даваць два вазы пшаніцы і тысячу рублёў грошы. Пшаніцы то ніштто, а тысячу рублёў шкода зрабілася пану. «Як бы тут зрабіць,— думае пан,— каб тысячу не даць». Ляціць жук, пан і ўхапіў жука ў руку. Вярнуўся ў пакоі і гаворыць папу:

— Бацюшка, згадайце, што ў мяне ў руцэ. Як адгадаеце, то я тады аддам ужо ўсё, што дакляраваў, ды яшчэ і гарэлкі прыбаўлю.

— Падрапаў поп сабе галаву ды гаворыць:

— Ото ж папаўся жучку ў панскую ручку.

А пан і не знаў, што поп Жукоўскім завецца, ды і кажа:

— Справядлівы вы, бацька-ўгадзька.

Паказаў жука ды і кінуў на зямлю. Нечага рабіць пану, трэба аддаваць тое, што дакляраваў папу. Насыпаў пшаніцы два вазы, даў тысячу рублёў грошы, некалькі вёдзер гарэлкі, падзякаваў яму ды адправіў папа дамоў. Поп, прыехаўшы дадому, пазваў дзяка ды і гаворыць:

— Удалася і гэта нам штука, будзем цяпер піць ды гуляць, ды панскую шкатулку памінаць.

## Шаптуха

У якомсь сяльцы жыла старэнькая баба. Была яна адна, бы тая былінка ў полі. Усе яе крэўныя да сваякі даўно паўміралі, а яна як асталася, так і ліпіць, як тое гнілое да старое дзерава. Сяльцо было маленькае, мо' якіх дамоў дзесяць. На самым канцы стаяла бабіна хатка. Яна была такая старэнькая, як і сама баба... Знайшоўся якісь добры чалавек, што нарабіў у бабінай хатцы падпорак, да аблажыў яе загатай; от і стаіць старэнькая, абросшая мохам, бы яе хазяйка, хатка...

Назбірае баба шчэпачак, падтопіць у печцы да й апякаецца перад полымем. Ведама, на старасці дак і ўлетку холадна. Вот так і жыве сабе старэнькая баба: калі ёсць што, то з'есць, а калі няма, дак і так абойдзецца. Да й колькі ёй трэба? Дасць хто кольвек асушкаў хлеба або бульбы, от баба размочыць скарынку да й пасмокча яе трохі бяззубым ротам, а бульбу спячэ ў прыску да й есць. От гэтым і жывілася тая баба ўжо пэўне гадоў з сарачню. Бачыце, ёй ужо было мо' больш як гадоў сто.

Мо' яшчэ доўга б пражыла так тая баба, але от раз ехаў праз тое сяль-

цо тамашны пан, убачыў ён старэнькую бабу і здзівіўся, што яна так доўга жыве.

— Хіба ж ты, бабка, яшчэ жыва? — пытае пан.

— Жыва, паночку... От не дае бог смерці...

— Як жа ты жывеш?

— Якое маё жыццё, паночак! Як так жыць, дак лепей гніць: зарабіць — не ўздолею, а дзеткі і ўнукі ўсе даўно паўміралі. Некаму і вады падаць.

— Чаму ж ты, баба, не шэпчаш або не варожыш?

— Не ўмею...

— Слухай, баба, я цябе навучу.

— Навучы, паночак, навучы, каб і я недарма свет займала.

Пан прыхіліўся к вуху ды й кажа бабе:

— От як пазавуць цябе к хвораму, дык ты пахукай трэйко на яго ды й шапчы: «Сіголаў жыў, сіголаў не». Пашапчы о гэ трохі, дай яму выпіць вады, ён і паправіцца. А калі памрэ, сіголаў яго бяры. От за тое цябе будуць карміць і паважаць.

Падзякавала баба пану, ды й пачала шаптаць...

Пайшла чутка, што аб'явілася такая баба, такая шаптуха, што вельмі добра шэпча... Паваліліі к той бабе адусюль, нясуць і вязуць усякага дабра. Жыве сабе баба ані гаткі. Тым часам той пан, што навучыў бабу шаптаць, чуе аб тым ды толькі смяецца сабе ціхенька з дурных людзей.

Але вось пайшоў той пан на паляванне, спацеў ды пакрычаў проці ветру, от і зрабілася ў яго ў горле скула. Пан к дахтурам — куды там — от-от скула задавіць. Жонка кажа, каб пазвалі тую бабу, а пан і слухаць не хоча, але, нарэшце, як прыпёрла ліха, так згадзіўся. Прыйшла баба, а пан ўжо чуць дыхае. От давай баба хукаць да шаптаць: «Сіголаў жыў, сіголаў не».

Прыслухаўся пан, ды як учуў, што баба шэпча тое, што ён яе вучыў, дак яго апанаваў такі смех, што не можа вытрымаць. А баба шэпча і шэпча. Слухаў-слухаў пан, ды як зарагоча — скула і трэснула. Выздаравеў ён, да й пытае ў бабы:

— Ці ж ты, бабка, усё так лечыш?

— Эгэ ж, мой саколіку, усё так...

Дык вось як шаптала ды варажыла тая баба.

### Як я з дзедам пакутваў

Я жыў з дзедам, а бацькі яшчэ не было. Былі ў нас з дзедам пчолы па сабаку, насілі мёд рэзгінямі. Адна пчаліна несла мёд цераз возера і ўпусціла рэзгінь мёду ў возера; гэта возера стала салодкае. Хадзіла там мая кабылка і выпіла гэту ваду, так што аж упілася, і ляжала без ума, п'яная. Толку не маглі мы даць з дзедам (а бацькі яшчэ не было). Узяў мой дзед ды шкуру здзёр з яе. Праспалася гэта кабылка і ўстала. Як напалі на яе авадні з мухамі, а яна ж без шкуры. Я ж узяў з дзедам (а бацькі яшчэ не было)

абсыпаў яе грэчкай дзеля таго , штоб была гнедая. Як парасла грэчка на кабыле, ды як унадзіліся ў тую грэчку цецярукі, то і тут мала з яе толку. Дзед мой кажа (як бацькі яшчэ не было):

— Надабе звязаць дзве вяровачкі і перакінуць цераз кабылу, прывязаўшы каробачку, а к хвасту прывязаць даўбешачку: цецярукоў як наляціць, яна хвастом як махне, то цецярука і заб'е.

Зрабілі мы так з дзедам (як бацькі яшчэ не было). Стала гэта кабыла біць цецярукоў і набіла поўну каробачку, так што стала цяжка, і перарэзала павадком кабылку. Трэба ж тут даць ратунак,— як жа жыць без кабылкі? Мой дзед кажа (як бацькі яшчэ не было):

— Нада адсеч дзве дубінкі і сшыць кабылку.

Мы так і зрабілі. Параслі дубы на кабыле з гэтых галіц дубовых, так што не магла яна і хадзіць: возьмуць і абернуць яе набок. Што нам тут рабіць з дзедам? (а бацькі ўсё яшчэ не было). Давай мы ўжо бычкамі пасеку араць. Пааралі, пасеялі мы з дзедам (як бацькі яшчэ не было) пшаніцы, ячменю. Як парос ячмень — старому вераб'ю па калена, а маладому па бруха, колас ад коласа — не чуць голаса. Зжалі мы з дзедам (як бацькі яшчэ не было) ячмень гэты, а як ужо злажылі, дык капа ад капы — на дзень язды. Перавезлі мы яго з дзедам дамоў і злажылі сторану ў хаце на стаўпе, што каля печы стаіць, і сталі мы ўжо з дзедам малаціць (а бацькі ўсё яшчэ не было), так што страты не было; ложкамі мералі, коўшыкамі зносілі, з току гэта ўжо збіралі. Цяпер сталі мы з дзедам (а бацькі яшчэ не было) гэтым ячменем кабана карміць і выкармілі вочынь бальшога, што якраз падлезе пад чыгун і схаваецца. Выгналі мы яго з дзедам вон ужо на двор. Ухваціла яго варона, можа яшчэ маладая, узяла ў дзюбу і раздзяўбла, на калé седзючы.

Няма ў нас з дзедам (а бацькі ўсё яшчэ не было) гавядзіны, дык мы кол гэты рубім і ў гаршок брасаем: кабан наш вочынь жырны быў, так што і кол жыру набраўся і ад яго ў гаршку накіпаець. А цяпер, слава богу, мы і лепш жывём, бо радзіўся мой бацька. Мы з дзедам пастарэлі і пасівелі, ды і бацька ўжо цыбук парадашны вырас.

Я там быў, мёд-віно піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала; далі мне барану,— я адтуль смаргануў, далі мне смаляную кабылу: ехаў я, ехаў на ёй,— стала мне холадна; разлажыў я агонь, начаў грэцца, а кабыла мая і растала, звеснае дзела: смаляная.

## Кулак і батрак

Жыў адзін кулак, ды такі ён быў скнара, што з батракоў выціскаў апошнія сокі. Прымушаў працаваць ад цямна да цямна, плаціў грашы ды яшчэ карміў упрогаладзь.

Хітры быў кулачуга. Каб батрак нямнога з'ядаў, ён прыдумаў такую штуку: дасць батраку паснедаць і пытае: «Можа, і паабедаеш разам?» Батрак, не паснедаўшы добра, згаджаецца і паабедаць.

Як толькі батрак канчае абедаць, кулак зноў пытае: «Можа, і павячэраеш разам?» Галодны батрак згаджаецца і павячэраць.

Ну, вядома , чалавек, як ты ні называй тую яду, ці снеданнем, ці вячэрай, а з'есць столькі, колькі трэба з'есці за раз. А гэта і на руку кулаку. Пасля батраку прыходзіцца працаваць цэлы дзень галоднаму, а паколькі ён ужо і павячэраў, дык галодным і спаць лажыўся.

Многа перабыло ў кулака батракоў. Больш трох дзён ні адзін не вытрымліваў — уцякаў. Нарэшце, знайшоўся такі, што узяўся перахітрыць кулака.

Наняўся ён да кулака.

Першым чынам кулак запрасіў батрака паснедаць. Той паснедаў. Кулак прапануе паабедаць, а потым і павячэраць. Батрак згаджаецца на ўсё. Як толькі ён пад'еў добра, устае, пазяхае і пытае ў кулака:

— Дзе тут у вас можна легчы паспаць?

— Як паспаць! — здзіўлена закрычаў кулак,— а працаваць калі будзеш?

— Што ты, гаспадар, з глузду з'ехаў, ці што? Дзе ты чуў, каб пасля вячэры добрыя людзі працавалі? Павячэраўшы, трэба спаць лажыцца.

Як ні лаяўся кулак, як ні пагражаў, але батрак расцягнуўся на ўслоне і заснуў.

# ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

Да легенд звычайна адносяць трывала замацаваныя ў фальклорнай традыцыі вусныя апавядальныя творы, у аснове якіх ляжыць фантастычны вобраз або ўяўленне, звязаныя з гісторыяй працоўных або тлумачэннем розных прыродных і грамадскіх з'яў. Легенды — мастацкія творы, але дамінантнай у іх з'яўляецца не эстэтычная, як у казках, а пазнавальная функцыя.

Беларускія легенды разнастайныя па тэматыцы. У апублікаваных запісах прадстаўлены легенды касмаганічныя, этнагенічныя, гістарычныя, апакрыфічныя і інш. У іх адлюстраваны розныя ўяўленні народа, спробы растлумачыць паходжанне сусвету і зямлі, чалавека і жывёл, сутнасць розных з'яў прыроды і грамадскага жыцця. Часам у легендах адчуваецца рэлігійны ўплыў, але ў той жа час многім легендам уласцівы элементы стыхійнага матэрыялізму, у іх асуджаецца эксплуатацыя чалавека чалавекам, сацыяльная няроўнасць, выказваюцца крытычныя адносіны да рэлігійнага вучэння. Асабліва выразны крытычны пачатак у апакрыфічных легендах, якія апавядаюць, як бог і святыя нібыта некалі хадзілі па зямлі. Гэтыя творы поўныя іроніі, у іх персанажы пазбаўлены арэолу святасці, бог і святыя паказваюцца несправядлівымі, помслівымі, амаральнымі («Ілья і Пятро», «Бог і ўгоднікі», «Як п'яніца ў рай папаў» і інш.). Па сваёй ідэйнай накіраванасці яны вельмі блізкія да сатырычных антырэлігійных казак і анекдотаў. Ідэйным зместам і высокім мастацкім майстэрствам прыцягвае ўвагу легенда «Вялікі грэшнік», у якой забойства грэшнікам лютага ворага сялян — войта расцэньваецца як справядлівы, гуманны ўчынак, як неабходная і нават святая справа.

У некаторых беларускіх легендах распрацоўваюцца розныя маральна-этычныя праблемы, сцвярджаецца неабходнасць добрасумленных адносін да працы, справядлівых і добразычлівых адносін паміж людзьмі, але часам гэтыя станоўчыя ідэі атрымліваюць рэлігійную афарбоўку.

Нягледзячы на агульную тэндэнцыю затухання гэтага жанра, у часы Вялікай Айчыннай вайны ўзніклі легенды пра мужных абаронцаў нашай Радзімы, пра партызанскіх камандзіраў Герояў Савецкага Саюза К. С. Заслонава, А. С. Каўпака і іншых.

Па сваёй асноўнай функцыі — перадачы выпрацаваных папярэднімі пакаленнямі пэўных ведаў або ўяўленняў — да легенд набліжаюцца паданні. Але калі легенды заўсёды фантастычныя па зместу і ў сувязі з гэтым маюць адпаведную паэтыку, паданні даюць звесткі аб рэальных асобах і сапраўдных падзеях, хаця, натуральна, пры перадачы з вуснаў у вусны аддаляюцца ад першаасновы, жыццёвы матэрыял набывае ў іх паэтычную інтэрпрэтацыю.

Найбольш распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры паданні гістарычныя і тапанімічныя, многія з якіх маюць гістарычную афарбоўку. З вуснаў у вусны перадаваліся паданні аб асілках, якія нібыта некалі жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і пакінулі пасля сябе старажытныя гарадзішчы ды велізарныя камені з адбіткамі сваіх пальцаў ці рук. Тэма многіх паданняў — барацьба беларускага народа з іншаземнымі захопнікамі. Вядомы таксама шматлікія паданні аб заснаванні розных населеных пунктаў, паданні аб рэках, азёрах, урочышчах і нават асобных збудаваннях. Гістарычныя паданні складаюць важную частку беларускага гераічнага і гістарычнага эпаса, іх узоры змешчаны ў адпаведным раздзеле «Хрэстаматыі».

### Літаратура

*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 2. Спб., 1893.

*Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. 4. Віцебск, 1891.

*Federowski M.* Lud bialoruski na Rusi Litewskiej, t. 1, Krakow, 1897: t. 2. Krakow, 1902, t. 3, Krakow, 1903.

*Кабашников К. П.* Прозаические жанры белорусского фольклора.— У кн.: Прозаические жанры фольклора народов СССР. Минск, 1974.

## Вялікі грэшнік

Даўно гэта дзеялася... Чула я ад старых людзей — а яны лгаць не будуць — значыць, праўда была. Жыў на свеце дужа вялікі грэшнік. Такі грэшнік, што не было таго граха, каб ён не саграшыў. Такі быў злодзей, якога і свет не бачыў: ён і краў, і чыніў разбоі, губіў людзей без пакаяння... Нават чорту душу запрадаў; чараваў, калі краў, абарачваўся ваўкалакам, пушчаў моравае паветрые — і не было ліку яго грахам.

Прыйшлося яму паміраць. Тут такі страх яго агарнуў, што не магла яго душа пакінуць цела. Няма яму смерці, ды й годзе. Тут успомніў ён на бога. Захацеў паспаведацца, душу ачысціць. Сколькі не прыводзілі к яму папоў, ксяндзоў,— як раскажа ім свае грахі,— не даюць адпушчэння. Такі ён быў

грэшнік. А смерць не прыходзіць, а душа яго мучыцца, з целам не можа разлучыцца.

Раздаў ён сваё багацце ўбогім і пайшоў па свету шукаць таго ўгодніка, каб замаліў яго грахі, разлучыў душу з целам. Ідзе, распытвае...

Параілі яму людзі даведацца к аднаму пустэльніку, што цэлае жыццё жыў у пушчы, еў толькі хлеб з вадой, маліўся, душу спасаў і ўгодны быў богу. І пайшоў ён к яму. Прыходзіць — так і так,— кажа,— я дужа вялікі грэшнік, ратуй мяне,— выспаведуй. Ты ўгодны богу,— можа адпусціяць мае грахі. Стаў спаведацца. Выслухаў яго той пустэльнік, кажа:

— Ты такі грэшнік, што цябе смерць не возьме, зямля не прыме, пакуль ты свае грахі на гэтым свеце не адпакутуеш, пакуль ты не зробіш столькі дабра, каб яно твае грахі пераважыла. А датуль ты будзеш мучыцца.

І пайшоў той грэшнік заслужваць спасення. Хадзіў ён на афяры, і хадзіў на каленях, марыў голадам сваё цела, нанімаўся к сярдзітым гаспадарам на работу, каб яго білі, лажыўся за другіх пад розгі, служыў хворым і ўбогім — смерць не прыходзіць. Хацеў на сябе рукі налажыць: тапіўся, вешаўся і рэзаўся — усё няма смерці, толькі мукі прымаў надарэмна.

І так прайшло многа год. Раз ідзе ён полем. Ідзе і праклінае сваю долю. Узяла яго злосць, што няма яму смерці. «Дакуль я буду мучыцца?» — думае ён сабе. А быў першы дзень вялікадня. Ідзе ён і бачыць многа-многа народу на полі — пашуць, барануюць. «Што ж бы гэта значыла? — думае ён,— першы дзень вялікадня такое свята, што і птушкі святкуюць — гнёзды не ўюць, а тут народ марудзіцца». Падыходзіць бліжэй, бачыць — войт пахаджвае паміж работнікамі і бізуном іх падганяе. Тыя плачуць, жалюцца:

— Што гэта,— кажуць,— ты насміхаешся над намі? Хіба няма ў цябе бога ў сэрцы? Б'еш нас, катуеш у будні, у свята не даеш адпачынку... І нават сягоння, на вялікдзень, выгнаў на прыгон!

А войт раве, як апантаны, бізуном лупіць. Глядзеў, глядзеў той грэшнік. «Во,— думае, акаянны, ні папушчы мяне! Падумаць гэта, як народ мардуе!» Падышоў ён к войту і кажа:

— Што ты робіш? За што ты людзей мучыш?

А войт, ні слова не кажучы, як нахлысне бізуном цераз лоб,— аж іскры з воч пасыпаліся. Азвярэў наш грэшнік, схваціў камень, як пусціць ім у войта... І разбіў яму чэрап. Войт не айкнуў — сасвяжыўся. А грэшнік і скончыў сваю пакуту.

## Як чалавек зрабіў агонь

Першы агонь к нам прыляцеў з Перуном, да як загарэўся адзін хварастовы курэнь, дак людзі збегліся адусюль хапаць галавешкі, да па сваіх курэнях і зямлянках у попелі пераховываць. Аднача гэты агонь не шанцаваў нікому, аж пакуль аднаму старому калёсніку, каторы акрамя калодак тачыў

і верацёна, не паслаў шчаслівае думкі, штоб ён папрабаваў кружкі на верацёнах вышпульваць ясянёвым клінком да не нажом вырэзваць як досі.

— Чаму не,— кажа калёснік сам сабе,— ясень цвярдзей, дак павінен узяць мякчэйшую бярозу, і давай ось папробуем.

Застругаўшы ясянёвы клінок, прыставіў яго к верацяну, моцна прыжымаючы, і зачаў смычком шморгаць то сюды, то туды, што раз скарэй, аж палянь — пашоў дым з верацяна, да так пахне бы з вогнішча. Ён гэта далей шморгаць да яшчэ скарэй да хутчэй, аж покуль лоб стаў мокры да з верацяна іскры пасыпаліся. Дак вось як чалавек знайшоў справядлівы агонь, тагда людзі ўсюды патушылі перуновае цяпло да завялі свойскі агонь і з тых пор сталі лучшэй жыць.

## Адкуль сяляне і паны

Бог першага чалавека вылепіў з гліны, да, паставіўшы пад плотам, штоб сох, сам кудысь пайшоў; тагды прыбег чорт, да з тае гліны, што асталася, вылепіў такога самюсенькага другога чалавека, да й кажа сам да сябе:

— Як жа я пазнаю, калі бог ажывіць абодвух, каторы яго, а каторы мой? Трэба неяк свайго назначыць.

Зірнуў ён кругом, ці няма якое ламакі, ды не знайшоў нічога, а тут чуе, што бог падыходзіць, дык барджэй плюнуў сваёй леплёнцы ў лоб ды й пабег. Бог прышоў ажыўляць ды бачыць, што стаяць дзве леплёнкі, як адна, начэ дзве краплі вады.

— Хіба ж,— кажа,— я дзве вылепіў? Здаецца адну... а мо і дзве? Не прыпомню.

Узяў да й ажывіў абедзве, а як яны заварушыліся, то з божае выйшаў хадзяін-пахар, а з чортавае — нейкае благароддзе ў казённай шапцы, з кругленькаю бляшкаю, акурат на тым месцы, дзе чорт плюнуў. Тагды хадзяіну бог сказаў:

— Ідзі да гасподы!

А благароддзю, узяўшы за шыварат, даў каленам... Начэ выгнаў, не даўшы ніякага спосабу.

## Чаму варагуюць сабака, кот і мышы

Перш і сабака меў шляхэтскія паперы. Ну вядомо: дзе яму з імі насіцца. Аддаў ён кату і просі:

— Схавай, братко, (перш сабака, кот і мышы былі з сабой у дружбе) пад страху дзе высока, там цалей будзіць.

Кот узяў ды аддаў мышам схаваць пад падлогу, бо баяўся, што пад страхой найдзе хто. Адылі, бача сабака, што яго ніхто не шануе,— акрыўдыўся, мысля: «Я ж ім пакажу, хто я такі!» Пашоў к кату, просі дастаць паперы. Той палез к мышам,— аж яны даўно іх з'елі. Ну з тых пор у іх і пашлі гэта нінавісць адзін к другому: сабака на ката, а кот на мыш.

## Салдат Дзяніс і смерць

Як сатварыў бог людзеў і пабачыў, што іх напладзілась на зямлі вельмі многа і што яны з кожным годам ўсё прыбываюць і прыбываюць, ажно ў скорасьці ўсю землю займуць і ня будзе нігдзе пустога места,— ён задумаўся. Доўга ён думаў і прыдумаў смерць і паслаў яе на землю, каб яна забірала людзей. Пакуль смерць прышла на землю, яна забыла, што ёй трэба рабіць. Вот яна зайшла ў першую хату, што была з краю сяла, а тамака жыў маскаль, зваўся ён Дзяніс, дак яна і просіць яго, штоб ён схадзіў к богу і папытаўся, што ёй рабіць, бо, бач, ёй было вельмі стыдна, што так скора забыла.

Пашоў Дзяніс к богу і пытаецца ў яго, што трэба рабіць смерці? А бог атвячае:

— Няхай бярэ малых дзяцей 7 гадоў.

Прышоў Дзяніс дамоў, бачыць — смерць яго ажыдае. Шкода яму стала дзяцей; дак ён ёй і кажа:

— Ідзі ў лес і грызі маладыя дрэвы.

Як прайшло 7 гадоў, то смерць зноў прыходзіць к Дзянісу і просіць яго схадзіць к богу, папытацца, што ёй цяпер рабіць. Дзяніс пашоў к богу. Прыходзіць туды і пытаецца, што трэба рабіць смерці цяпер? Бог і кажа:

— Няхай бярэ старых людзей.

Прыходзіць Дзяніс к смерці і кажа:

— Бяры і грызі старыя дубы і сосны цэлых сем гадоў.

Смерць пашла ў лес і стала грызць. Як прайшло 7 гадоў, то яна зноў прыходзіць к маскалю і просіць схадзіць к богу, каб указаў больша работы. Як прышоў Дзяніс к богу і папытаўся, што рабіць смерці, то бог прыказаў браць срэдніх людзей 7 гадоў. А Дзяніс, прышоўшы, ёй сказаў, штоб яна грызла срэднія дрэвы сем гадоў. Як прайшлі і гэты 7 гадоў, то смерць зноў прыходзіць к Дзянісу і просіць яго схадзіць к богу папытацца, што ёй рабіць. Дзяніс пашоў і як запытаўся, то бог кажа:

— Няхай ужо цябе возьме.

Задумаўся Дзяніс і пашоў дамоў. Дарогаю ён зайшоў у лес, знайшоў арэх з дзірачкаю і пашоў. Як прышоў ён у сваю хату, смерць і стала пытацца, што рабіць? А Дзяніс як раз дзяржаў у руках дзіравы арэх, павярцеў яго перад носам смерці і кажа:

— Бог прыказаў табе лезць у гэты арэх.

Смерць зморшчылась да і палезла, а Дзяніс, заткнуў дзірку паклей, палажыў арэх у шапку і думае сабе: цяпер жа буду жыць, сколькі захачу. Доўга ён жыў, потым яму дадзела. Вот ён і думае, гдзе гэта смерць мая дзелась? І пайшоў к богу пытацца. Тады бог кажа яму:

— А нашто ж ты яе засадзіў у арэх?

Тут Дзяніс успомніў пра сваю штуку, зняў шапку, выняў арэх і выпусціў смерць,— дак на ёй асталісь толькі косці і йна не магла стаяць на нагах. Тады бог кажа Дзянісу:

— Калі ты яе так высушыў, то і насі яе на сабе.

Вот чаму як малююць смерць, то ставяць толькі косці, а ззаду так, як цень чалавека: гэта Дзяніс, маскаль, катораму бог прыказаў насіць яе.

### Аб Воўгі, Дняпры і Сажы, і бацькі іх Нівісном

Сож і Воўга былі раднэя сёстры, а брат Днепр. Ацец іх быў Нівіснэй. Вазврашчаліс яны. Воўга Нівісному была любезная дочка, а Днепр быў яму ўпраціўнік. Прызваў к сабе Нівіснэй Воўгу і Сож, а Днепр, хоць яго бацька ні зваў, пад дзвярамі слушаў, што будзіць ацец дачкам гаварыць:

— Вот вы, мае дочкі любімыі! Вот ты, Воўга, прыхадзі ка мне ў паўноч! Я цібе пашлю прыкраснымі гарадамі; прыкрасныя баркі па табе будуць хадзіць. Ну, і ты, Сож, прыхадзі! Пашлю цябе прыкраснымі мястамі, а Дняпра пашлю махамі, балатамі.

У паўноч Воўга ўскочыла і прыбіжала к атцу:

— Бацюшка, пара пасылаць!..

— А, ета ты, Воўга?

— Я.

— Падайдзі, дачушка, бліжый!

(Дачушкі былі касматы — шчасліві.)

Пашчупаў яе.

— Благаслаўляю цябе прыкраснымі мястамі іцці: сяленіямі і гарадамі!

Загрымела — пашла.

А Днепр прашнуўся, пабег, пасматрэў на крываці: Воўгі нету, а Сож спіць. Нільзя Дняпру пад'явіцца замест сястры: у яго было цела чыстае — пашчупаюць і ўзнаюць.

Абвярцеў рукі пасканнямі, бягіць к атцу:

— Бацюшка, бацюшка, пара іціць!

— Ты, Сож?

(Пірымяніў гаворку, як сістра.)

— Ну, падайдзі сюда, дачушка!

Падайшла. Апяць спрасіў:

— Ты, Сож?

— Я, бацюшка.

— Пара пушчаць: а то скора свет будзіць.

Рукі падзіржаў, відаць, што касмата.

— Благаслаўляю цябе, дачушка, іцці прыкраснымі гарадамі — мястамі!

Днепр, як махнуў — знаіць, што сістра прашнецца — ірваў горы, дзелаў калены.

Прашнулась Сож — нет ні воднава на краваці, усхвацілась біжаць к бацюшкі пад благаславенія.

— Бацюшка, пара пушчаць!

— Ты ж хто?

— Ды Сож.

— Я ж цібе паслаў.

— Даўжно Дніпра і Воўгу — я праспала!

— А, дачушка, верна, Днепр-машэннік, абманіў мяне — пашоў на тваім месці... Ну, дачушка, відна, пойдзіш на Дняпровым месці — ідзі уж махамі-балатамі!..

Усё махамі-балатамі ідзець Сож.

## Пра Нёман і Лашу

Гэтых рэчак яшчэ не было. І ў тым месцы, дзе яны цяпер выцякаюць, стаяў у балоце стары корч, а пад карчом біла крыніца. Яна ўсё біла і біла...

І вось вада ўсё расцякалася, і ўжо выцягнулася ў маленькую канаўку... Гэта канаўка раз пабегла і пабегла па лугах. Гэта радзіліся Нёман і Лаша.

Нёман быў хлопец, а Лаша — дзяўчына. Нёман крэпка палюбіў Лашу. І вось яны беглі цэлы дзень, а сонца пячэ, і затаміліся яны. І вечарком ляглі яны спаць. А назаўтра, яшчэ раненька, устала Лаша, Нёман не пабудзіла і пабегла сабе ціханька.

Прачнуўся Нёман — няма Лашы. Ён усхапіўся і — напрамік, шукаць Лашу. І саўсім у бок пабег, праз усё: і лугі, і горы і, як кажуць, праз каменні да паленні...

І вось цяпер Лаша ціханька сабе, ціханька плыве, а Нёман ляціць і ляціць напрамік.

## Пра чайку і возера Нарач

Даўным-даўно ў адной з нарачанскіх вёсак жылі чароўная дзяўчына Галя і прыгожы юнак Васіль. Моцна кахалі яны адзін аднаго. Хлопец — майстар на ўсе рукі. Ён зрабіў незвычайнае люстэрка і падарыў яго сваёй каханай. Толькі нядоўга былі шчаслівыя Васіль і Галя. Ненавісны багацей Барына захацеў завалодаць прыгажуняй. Бацька Галі заступіўся за дачку і загінуў ад рук прыгнятальніка. На выручку ёй прыйшоў Васіль. Ён забіў ненавіснага Барыну, вызваліў каханую, але ў няроўнай стычцы загінуў сам. Гэта бачыла Галя. Яна траціць прытомнасць і выпускае з рук люстэрка. На часткі разбілася яно. І на месцы, дзе ўпалі срэбныя асколкі, утварылася возера.

І з тае пары дзяўчына крылатай чайкай над Нараччу кружыць, спявае для любага.

## Ад чаго Нясвіж пашоў

Тут, дзе цяперака замак стаіць і аж да Качаноўскага лесу, некалі было паросшы ўсё лесам. А ў тым замку, што на высокай гары, жылі паны. Яшчэ пры паляках там былі муры, людзі цэглу бралі. Дык вось з гэтага замка

і пашлі яны на паляванне на тое месца, дзе цяпер Нясвіж. А тады яны палявалі на мядзведзяў. Я яшчэ помню, як Радзівіл біў мядзведзя, дзе цяпер лагчына глыбокая, што як на Качановічы ісці і на лінію. Ён тады аднекуль прыводзіў мядзведзя, выпусціў яго, а пасля з усёю світаю забіў.

Ну, дык, значыць, як паехалі паны на паляванне, так паспорылі, хто пяройдзе цераз балаты, што там былі. А балаты вялікія. Ну, і паспорылі



*Я. Драздовіч.* З-пад Галубіцкай пушчы

яны. Дык адзін з іх ішоў, дык забіў мядзведзя. Потым прашоў і прышоў назад у гэты замак. Ну, яго пытаюць, як, што? Ён кажа, што прайшоў усё балота і мядзведзь папаўся, вось я яго і забіў.

Ну, яны потым пашлі правяраць. Доўга хадзілі па балоце, наканец нашлі мядзведзя. А летам было, дак мядзведзь трохі прыпах.

— Не свеж,— кажа адзін з іх.

Вот ад гэтага і пачалі зваць Нясвіж.

Потым тут замак зрабілі, людзі пачалі жыць.

Кажуць, што нават падземным ходам злучаецца ён з тым, што на высокай гары стаіць. Казалі некаторыя, што з Мірскім замкам тожа быў ход.

Каб што ў кнігах пачытаў, то і знайшоў бы што-небудзь, а так што — людзі ўсяляк гавораць.

## Пра скарб

Там, дзе ад шляху пашла паваратка на Зялёную Параслю, у правую руку, як ісці ад Рэчыцы к Хвайнікам, у калодзезі е вялікі браварны казан, поўны грошай, накрыты млінавым каменем. Скольki раз людзі хацелі выкапаць тыя грошы, да як толькі дакапаюцца да таго каменя, каторым пакрыты кацёл, так зараз з Рэчыцы і ляцяць казакі з голымі шаблямі. Людзі паўцякаюць, то і казакі шчэзнуць, а далей і места зараўняецца, як бы нічога ніколі.

## Чаму бабы работаюць не аддыхаючы

Ну, а калі слухаеш, дык і скажу табе яшчэ пра тое, за што баба ўсёды работае і ні ў будзень, ні ў празнік ёй век няма ўгамону. Ідзе раз бог па полю і бача: маладзіца нешта жне.

— Здароў, галубка!

— Здароў!

— Хадзі-ка ты сюды, раскажы мне тут адно дзела.

— А, ідзі ты! Мне без цябе некалі, глядзі, во не дажнеш да тавару.

— Ну, каб жа табе і павек некалі было!

Сказаў ды й пайшоў далей. Арэ мужык паласу. Падышоў ён.

— Здароў,— гаворыць,— добры чалавек! Ты, брат, як бачу, дужа стаміўся; хадзі, брат, трохі пасядзі, табакі панюхай ды мне тут пра дзела раскажаш.

Падышоў мужык, панюхаў табакі і сеў. Пагаманілі колькі там яны, устаў бог, устаў і мужык.

— Ну, прашчай, брат, спасіба табе, дай бог у пару справіцца, у пару праклажацца.

Пайшоў ён, а з той пары мужык у пару заўсёды паработае, у пару і аддыхне, а баба к аднаму кінецца, другое справіць, а аддыхнуць некалі, глядзі, што яшчэ што-небудзь найдзецца.

## Ільля і Пятро

Даўно тое было, як яшчэ сам бог па зямлі хадзіў. Аддаў бог увесь свет Ільі й Пятру. Але, ведама, дзе два паны, там ніколі ладу няма. Адзін пасылае дождж, а другі — пагоду. Плачуць хмары, не ведаюць, што рабіць, каго слухаць. Пойдзе дождж, то Пятро бяжыць ды крычыць, лаецца, на чым свет стаіць:

— Што вы робіце, нашто мочыце сена, цяпер жа людзі косяць!

— Нам,— кажуць хмары,— Ільля прыказаў.

— Ах, вы,— лаецца Пятро,— я вам пакажу Ільлю! Ільля заўсёды наробіць гнілля.

Ухваціць Пятро мятлу і паразганяе хмары па кутках, а неба чысценька падмяце. Ды ось, адкуль ні вазьміся, тарахціць, едзе Ільля, крычыць, як на жывот, аж неба і зямля дрыжыць. Хмары таўкуцца, як непрытомныя, выла-

зяць з куткоў, і ўжо ліне такі дождж, што не толькі берагі, але і груды паплывуць. Жаляцца людзі богу, што паны дзяруцца, а ў мужыкоў чубы трасуцца, жаляцца і просяць, каб бог даў пагоду. Прызаве бог Ілью, насварыцца на яго, а той кажа, што столькі развялося нечысці-чарцей, што трэба іх громам пабіць, бо ўвесь свет запаганяць. Прызаве бог Пятра і кажа, што няхай Ілья трохі папалюе чарцей. А Ілья тым часам падымае такія грымоты, што аж зямля стогне: няма ні дня, ні ночы; хмары таўкуцца, як уюны ў рэшаце; на небе кіпіць, як у гаршку; маланка бліскае, аж у вачах цёмна становіцца, а пярун смаліць раз-поразу, паласуе хвоі і дубы, ды паліць будоўлю альбо стагі. А Ілья ездзіць сабе па небу ды камандуе:

— Так-так-так! Го-го-го! Яшчэ, яшчэ... Лупі, лупі яго... От так-так... Го-го-го! Трэсні яго па затылку! У патыліцу, у патыліцу лупі яго, гада! Трах-трах! Так-так-так! Го-го-го!

Просяць людзі на прамілуй бог, каб уняліся грымоты, а Ілья не слухае. Ходзіць Пятро ды плюецца бяззубым ротам ад злосці. Нацешыцца Ілья, пачысціць сваю каляску і паедзе к сонейку ў госці. Тут Пятро падмяце неба ды давай сушыць зямлю. От ужо падыходзіць пара сеяць жыта, а зямля сухая, як прысак — зноў бяда! Бяда ўжо, што няма дажджу. А Ілья своволіць сабе з сонейкам, а пра зямлю забыўся. Не маюць вока адзін на другога Ілья і Пятро, сярдзітыя, баяцца, каб не сустрэцца. Але от раз уздумалі яны пахадзіць па зямлі, папытаць людзей, каго яны больш любяць: Пятра ці Ілью. Як сышлі яны на зямлю, так па немалым часе і сустрэліся. Ідуць яны разам і спораць; Пятро кажа, што яго больш любяць людзі, а Ілья кажа, што яго. Як даканацца, чыя праўда? Бачаць яны, аж чалавек сее грэчку.

— От,— кажа Пятро,— давай папытаем, каго мужыкі больш любяць?

— Папытаем,— маўляў Ілья.

— Памагай бог! — кажа Пятро.

— Дзякаваць.

— Скажы, добры чалавеча, каго вы больш любіце, Пятра ці Ілью?

Мужык зняў з плеч сявок, паставіў яго на зямлю, пачасаў патыліцу ды і кажа:

— А багі яго знаюць, каго мы больш любім: мо' Ілью, мо' Паўла-Пятра.

— Ты не гарадзі плота,— кажа Пятро,— а кажы проста.

— Ілья і Павел-Пятро — добрыя святкі; мы іх і любім.

— А каго больш?

Бачыць мужык, што тут не выкруціцца, і кажа:

— Пэўне ж Паўла-Пятра.

Аж затросся Ілья ад злосці. Пайшлі яны далей, а Ілья і кажа:

— Ото ж спяку за гэта яму ніву — нічога не зародзіць.

— А я намачу і зараджу,— кажа Пётр.

— Калі так, дык я зраблю ось як: хто першы ўкусіць з гэтай нівы перапеч, той падавіцца.

Ухмыліўся Пятро, і пайшлі яны далей.

Было вельмі добрае тое лета: аб дзень пагода, цяпло, а ўначы ці цёплая раса, ці ціхенькі цёплы дождж. Расце ўсё, як на дражджах; здаецца, пасадзі на полі дзіця, дык і тое вырасце. Зарадзіла грэчка па пояс. Набіў мужык паўгумна.

От намалаціў ён грэчкі, намалоў, і напякла баба свежых перапеч поўну печ. На той час прыходзяць у сяло Ілья з Пятром і заначавалі ў таго мужыка. Забыўся Ілья, не пазнаў яго.

От селі яны вячэраць.

— От жа, дзякаваць богу,— кажа мужык,— зарадзіла цяпер грэчка, папробуйце, госцікі, свежых перапеч.

А Ілья такі добра прагаладаўся. От ён як хваціць перапеч,— так і падавіўся. Туды-сюды ён, і вадою запіваць, і кулаком біць у грудзі і ў спіну — от хоць бы што. Дагадаўся ён, што гэта праклятыя ім перапечы, і давай прасіць мужыка і Пятра. Насілу ачухаўся.

З тае пары годзе Ілья мяшаць людзям сена касіць. Але ўсё было б добра, каб Пятро не быў такі стары і глухі. Бог кажа:

— Пасылай тады дождж, як людзі просяць.

А ён не дачуе, ды пасылае дождж, як людзі косяць.

## Як п'яніца ў рай папаў

Прыходзіць п'яніца к царству нябеснаму і ў дзверы стукае:

— Адчыніце!

У апостала Пятра ключы ад царства нябеснага; дык ён чуе стук, падыходзіць к дзвярам:

— Хто тут?

— Ды я.

— Хто ж ты?

— Ды п'яніца. Пусці мяне ў царства нябеснае!

— Ну, тут п'яніц няма — нельга!

— А ты хто, што мяне не пускаеш?

— Я апостал Пётр!

— Я знаю цябе: гэта той, што ад Хрыста адракаўся, не паспеў пятух тры разы прапець, а цяпер ты ў міласці ў бога! А я, хоць і п'яніца, а Хрыста не забываю: калі пападзецца чарка гарэлкі, то гавару: «Госпадзі, благаславі!» А ад Хрыста я ні разу не адракаўся, як ты. Я ўсё, брат, знаю.

Няма чаго гаварыць Пятру супроць гэтага, назад вярнуўся, падышоў к Паўлу:

— Ідзі, Павел, пагавары ты з ім!

Падыходзіць Павел к дзвярам.

— Хто тут?

— Я, п'яніца; пусці мяне ў царства нябеснае!

— Тут п'яніц не прымаюць.

— А ты хто, што мяне не хочаш пусціць?

— Я апостал Павел.

— А, Павел! Знаю: гэта той самы, што гнаў Хрыста ад Ерусаліма да Дамаска; а цяпер ты ў яго ў міласці! А я ж ніколі Хрыста не гнаў, а калі прыдзецца чарачка гарэлкі, то зараз жа: «Госпадзі, благаславі!» А не гнаў Хрыста па-твойму.

Нечага адказваць Паўлу супроць гэтага: вярнуўся назад і расказаў Пятру пра ўсё.

Гаворыць Пётр:

— Ну, пашлём евангеліста Івана: ён ад Хрыста ні разу не адракаўся — няхай-ка з ім пагаворыць.

Падыходзіць к дзвярам Іван:

— Хто тут?

— Я, п'яніца; пусціце мяне ў царства нябеснае!

— А, ты п'яніца і просішся! Такіх сюда не прымаюць.

— А ты хто такі, што не хочаш мяне ўпусціць?

— Я евангеліст Іван!

— А, ты евангеліст! Навошта ж вы абманваеце людзей! Вы напісалі ў евангеллі: стучыце — і адчыняць вам; прасіце — і атрымаеце! Хіба гэта не абман! Я гадзіны дзве стаю і стукаю, а мне не адчыняюць. Калі ты мяне не ўпусціш у царства нябеснае зараз жа, то я вярнуся на белы свет і раскажу людзям, што вы напісалі ў евангеллі няпраўду.

Спужаўся Іван сораму і ўпусціў п'яніцу ў царства нябеснае.

## Машэка

Па ўсёй амаль Магілёўскай губерні вядома імя Машэкі, нейкай страшэннай пачвары, якой палохаюць дзяцей. Ці заплача малое, ці закапрызіць, звычайна кажуць яму: «А вунь Машэка! Машэка ідзе! Машэка пачуе!» Або хто зробіць непрывабную, пачварную грымасу, таксама крычаць на яго: «Машэка! Машэка!»

Народнае паданне сведчыць, што імя гэта гістарычнае і звязана з гісторыяй Магілёва. Вось паданне, як яно захоўваецца ў вуснах нашага народа.

На тым месцы, дзе зараз Магілёў, стаяў цёмны непраходны лес, скрозь гушчар якога не мог прабіцца нават промень сонца. Ад гэтага лесу і Дняпру было цесна, а Дняпро ў тыя часы быў шырокі і злосны. У лесе, у чашчобе быў страшэнны разбойнік, якога звалі Машэкам. Ён быў дужы, як волат: адной рукой спыняў васьміконны экіпаж на ўсім скаку і адным разам вырываў з карэннямі вялікія сосны. А хадзіў ён у мядзвежай шкуры поўсцю наверх. Не такі тады быў народ, як зараз, шмат было асілкаў, але ўсе дрыжэлі перад Машэкам, і пяць дзесяткаў нічога не маглі зрабіць супраць аднаго. Машэка наводзіў жах на ўсе навакольныя вёскі. Хаця людзі жылі тады вялікімі паселішчамі, ён бязбоязна ўваходзіў у кожную вёску і браў, што яму было трэба. Усюды самі адчынялі яму вароты, каб толькі пакінуў

жывога. Не раз выходзілі супраць Машэкі вялікімі дружынамі, але ён жыў у такой непраходнай глухамані, што ніхто не знаходзіў не толькі логава, але нават дарогі назад, і ўсе або паміралі з голаду, або былі забіты кісцянём.

Але і на Машэку прыйшла пагібель. Чаго не маглі зрабіць сотні людзей, зрабіла адна жанчына. Аднойчы па дарозе праз лес ехала плеценая васьміконная брыка, у якой сядзеў малады мужчына з прыгожай жанчынай. Раптам з'явіўся Машэка з-за вялізнай яліны, у адзін міг спыніў брыку і адправіў на той свет кучара, так што той і азірнуцца не паспеў. Убачыўшы, што тут не да жартаў, мужчына, што сядзеў у брычцы, выхапіў шаблю і з усяго размаху ўдарыў Машэку па галаве, але шабля пераламалася аб стальную шчэць, а мужчына прырос да свайго месца ад аднаго ўдара разбойніка. Але глянуўшы на жанчыну, Машэка аслупянеў.

Ён пазнаў у ёй старую знаёмую. Яна, не прыняўшы кахання Машэкі, прымусіла яго пасябраваць з буйным ветрам. Калі прайшло здзіўленне, Машэка ўзяў у свае лапы паўмёртвую ад перапугу прыгажуню і аднёс у сваё логава. Тут яна апрытомнела, адразу зразумела сваё становішча і склала план, як бы звесці са свету вылюдка. Яна прыкінулася лагоднай, так што разбойнік цалкам паверыў ёй. Аднойчы ён бестурботна заснуў пры ёй крэпкім сном. Яна асцярожна дастала вялізны нож — і кроў палілася ракой з перарэзанага горла вылюдка. Зрабіўшы гэту справу, прыгажуня неяк выйшла на дарогу, прыйшла да сваіх і паказала ім праклятае месца, дзе з вялікім ганьбаваннем закапалі таго людаеда і назвалі гэтае месца магілай льва.

Недалёка ад таго месца знайшлі вялікі бугор ці гару, якая ўся была абліта крывёю і ўсыпана касцямі нявінных ахвяр Машэкі.

Пасля Машэкі тут жыло яшчэ шмат разбойнікаў, дзеля знішчэння якіх мясцовыя ўладары-князі прызначылі тое месца для высылкі злачынцаў. Злачынцы паволі вырубілі лес і праз гэта прагналі разбойнікаў. З цягам часу на тым месцы быў заснаваны горад, які, ці то ад мноства магіл забітых разбойнікамі людзей, ці ад магілы льва Машэкі, назвалі Магілёвам.

### Нарач

У гушчары старых бароў, як сляза, упаўшая з неба, блішчэла вялікае возера. Вельмі прыгожым яно было. Расказы пра яго чароўнасць ішлі ад паселішча да паселішча і нават у далёкія краіны заходзілі.

А яшчэ казалі людзі, што ў вёсцы, што прыляпілася да аднаго з берагоў возера, жыла дзяўчына-сіраціна па імені Найрыта, а аднавяскоўцы звалі яе Нарай. Вочы яе блакітныя, колеру азёрнай хвалі, заўсёды весела ўсміхаліся. Залацістыя валасы тугой касой абкручвалі галаву. Голас у яе быў высокі і гучны.

Бывала сядзе на беразе пад разлапістым клёнам, дзе збіралася звычайна моладзь, на гусельках грае і спявае. Спачатку голас павольна плыве, а пасля ўзлятае высока і ляціць над пабярэжжам. У гэты час і птушкі спынялі свой спеў. Людзі забываліся пра сваё гора.

Аднойчы, калі Нара спявала, праязджаў вёскай пан, стары ўдавец. Пачуў ён дзівосную песню і загадаў спыніць каня. Слухаў, слухаў і сказаў Нары: «Прыгожая кветка вырасла ў дзікім краі. Табе толькі спяваць у маіх пакоях».

— Кепская з мяне будзе служанка,— прамовіла Нара.

— Ты будзеш гаспадыняй, жонкай маёй,— зазначыў пан.

Вакол Нары сядзелі на зялёнай мураве хлопцы і дзяўчаты Адзін з іх, чарнявы хлопец, падыйшоў да пана.

— Гэта мая нявеста,— сказаў ён,— а пан няхай сярод паноў жонку шукае.

— Ці не сын ты таго Пятра, што бунтаваў мне народ? — успомніў пан, чырванеючы ад злосці. І залемантаваў: «Узяць яго!»

Прыслужнікі звязалі Андрэйку і павезлі ў маёнтак. Больш яго ніхто не бачыў. Праз некаторы час пасля гэтага здарэння пан зноў прыехаў да Нары даведацца, ці згодна яна да шлюбу. Дзяўчына зрабіла выгляд, што згадзілася. Тут жа дамовіліся пра вяселле.

Надышоў гэты дзень. Злосны вецер гнаў цёмныя хмары, а лес спяваў жалобныя песні. Нара ехала на фурманцы ў маёнтак, у руках трымала пакунак. Сустрэлі яе служанкі. Завялі ў панскія пакоі і апранулі ў шлюбнае адзенне. І Нара выйшла такой прыгажуняй, што ні пяром апісаць, ні ў казцы расказаць. Пакланілася яна пану ды папрасілася перад шлюбам крышку адной пабыць у пакоях. Пан згадзіўся. Ходзіць ён па двары, на служанак пакрыквае і на дзверы паглядвае.

А Нара тым часам з пакунка дастала смалякі ды падпаліла пакоі адзін за другім. І калі шугануў чорны дым з вакон, а па даху заскакалі чырвоныя языкі полымя, выскачыла праз вакно і на сваёй фурманцы, паганяючы каня, паехала ў вёску. Прыйшла на тое месца, дзе з Андрэйкам часта сустракала ўсход сонца, прыхілілася да клёна і горка заплакала.

Да тут пачуўся конскі тупат. Прыехалі панскія служакі. Бегалі па ўсёй вёсцы. Людзей бізунамі білі. Дапытваліся, дзе Нара.

— Вось яна,— закрычаў адзін з іх.

— Жывую не возьмеце,— крыкнула ворагам дзяўчына і кінулася да возера.

Цёмныя хвалі з белымі грабянямі ішлі адна за другой, а на беразе калыхаўся човен. Той човен, у якім Нара з Андрэйкам не раз каталіся. Спрытна і ўмела ўхапілася яна за карму і, адштурхнуўшыся ад берага, села ў човен.

— Я адпомсціла, пан, за Андрэйку, за яго бацьку і за ўсіх тых, хто загінуў ад тваіх рук у тваім маёнтку,— прашаптала Нара.

Ад злосці панскія служакі кінулі гуслі ў возера. А човен адплываў усё далей і далей, потым зусім знік у хвалях. Усю ноч бушавала возера. Стагналі хвалі...

З таго часу і назвалі людзі возера імем смелай дзяўчыны. Да нашых дзён дайшла назва Нарач.

# АНЕКДОТЫ

Анекдот (ад грэч. anekdotos — нявыдадзены, неапублікаваны) — невялікае вуснае апавяданне з нечаканай дасціпнай развязкай. Да сярэдзіны XIX ст. анекдотам называлі апавяданне аб цікавым здарэнні з вядомай гістарычнай асобай, пазней і ў цяперашні час да анекдота адносяць любое кароткае вуснае апавяданне жартоўнага характару з нечаканай камічнай развязкай.

Анекдот — адзін з тых папулярных у народзе жанраў, якія бытуе і цяпер. Як і многія іншыя фальклорныя творы, анекдоты характарызуюцца разнастайнасцю адлюстравання сацыяльных з'яў. Сваім зместам, а часам і структурай анекдоты вельмі блізкія да сатырычных казак і не заўсёды іх лёгка адрозніць. Важнейшымі спецыфічнымі рысамі анекдота з'яўляюцца яго аднаэпізадычнасць і нечаканасць развязкі, якая заўсёды бывае камічнай і дасціпнай. У сатыры і гумары анекдотаў выяўляецца непрымірымасць народа да ўсяго адмоўнага ў грамадстве і побыце людзей. У дакастрычніцкі час у творах гэтага жанру выкрываўся дэспатызм і жорсткасць, крывадушша і прагнасць паноў, папоў і іншых прыгнятальнікаў працоўных.

Дасціпным гумарам напоўнены шматлікія анекдоты пра палешукоў і маркаўцаў. Па форме і змесце яны нагадваюць рускія анекдоты пра пашахонцаў. Героі гэтых твораў няздатны да самай звычайнай працы, не разумеюць элементарных жыццёвых і бытавых ісцін. Насмешка з герояў носіць мяккі добразычлівы характар. У цяперашні час анекдоты гэтай тэматычнай групы амаль не бытуюць.

Гратэск, карыкатура, эксцэнтрызм («алагізм звычайнага») шырока ўжываюцца ў анекдотах як сродак высмейвання эксплуататараў (напрыклад, у анекдотах тыпу «Ці была ў папа галава»).

Важнейшай зброяй анекдота з'яўляецца смех, роля якога залежыць ад аб'екта асмяяння: бязлітасна-з'едлівы, калі крытыкуюцца класавыя ворагі, дабрадушна-мяккі, калі крытыкуюцца недахопы саміх працоўных. У анекдоце яскрава адлюстравана мудрасць, дасціпнасць, удаласць беларускага

працаўніка, які валодае пачуццём гумару і трапным сатырычным словам змагаецца супраць прыгнёту і амаральнасці.

У дакастрычніцкі час быў апублікаваны невялікі зборнік беларускіх анекдотаў і жартаў «Беларускія жарты» (Мінск, 1915). Шмат беларускіх анекдотаў было змешчана ў зборніках П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава, У. М. Дабравольскага, М. А. Федароўскага, А. К. Сержпутоўскага і іншых фалькларыстаў. У савецкі час асобнай кніжкай выдаў анекдоты З. Бяспалы (1970 г.).

### Літаратура

*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 2. Спб., 1893.

*Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej, t. 1, Kraków, 1897; t. 2. Kraków, 1902; t. 3, Kraków, 1903.

*Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белорусов-полешуков. Спб., 1911.

*Беларускія* народныя жарты. Склаў З. Бяспалы. Мінск, 1970.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967.

*Беларуская* вуснапаэтычная творчасць. Пад агульнай рэдакцыяй М. Р. Ларчанкі. Мінск, 1966.

*Кабашнікаў К. П.* Нарысы па беларускаму фальклору. Мінск, 1963.

## Віншаванне

Жыў-быў адзін пан і ў яго радзіўся сын. Уся дворня задумала, як найлепш пакланіцца пану, а іх аканом так навучае:

— Я буду ісці першы, гасцінца яму прынясём, я буду на галаве нясці яму поўную карзіну яец, старшына варону, а стараста маслёнку. Як прыдзем, я буду першы гаварыць. Ты, старшына, скажы: «Са ўсім дваром»; а ты, стараста, скажы: «З дзяцьмі і з жонкай»; а ты, парабак, скажы: «З усім набыткам».

Яны прышлі скора к пану ў пакой. У аканома вяроўка адвязалася ад лапця і, як парабак увайшоў і нагой прыдзяржаў, няўмысля, вяроўку, аканом паваліўся і крычыць:

— Бадай ты прапаў.

Старшыня не пачуў, што аканом гаворыць, і кажа:

— Са ўсім дваром.

А стараста кажа:

— З дзяцьмі і з жонкай.

Парабак кажа:

— Са сваім ўсім набыткам.

Пан, як пачуў гэта, прагнаў іх кіем, як сабак, вон.

## Скупы пан

— Даў табе, дзедку, грош?
— Даў, пане!
— Дык помні, што даў табе, дзедку, грош!
— На табе, паночку, другі, толькі ўжо не кажы нічога!

## Сваю службу знае

Адзін пан пытаецца раз у свайго фурмана, ці той паедзе з ім у вялікую дарогу.

— За вамі, пане, усюды,— адказвае фурман.
— Як гэта ўсюды? Нават у пекла?
— Нават у пекла!
— Але падумай сабе, што ў пекле надта ж горача, агонь.
— Нічога, пане,— кажа фурман,— я сваю службу знаю, высаджу пана ў пекле, а сам, як заўсёды, буду чакаць перад брамай.

## Самыя лепшыя грушы

Адзін пан паслаў слугу за грушамі і сказаў:

— Купі мне самых лепшых.

Слуга прышоў у краму і папрасіў груш. Купец падаў яму. Але слуга сказаў:

— Не, дайце мне самых лепшых.

Купец кажа:

— Папрабуй адну, тады пазнаеш, што ўсе добрыя.
— Як я пазнаю,— кажа слуга,— што яны ўсе добрыя, калі паспрабую толькі адну?

І слуга паадкусваў патрохі ад кожнай і прынёс іх пану.

## Хітры хлапчук

Хлапчук вёў на вяроўцы цяля, якое кідалася ва ўсе бакі. А тут якраз ураднік праязджаў.

— Ты чаму перада мною шапкі не знімаеш, хам?! — закрычаў ён на хлапца.
— Калі ж мае рукі заняты, пане ўраднік. Злезце, калі ласка, з воза, патрымайце цяля, а я шапку зніму.

## Рахунак шаўцоў

Шавец, адрабіўшы ў пана, падаў такі рахунак за сваю працу:

«Пану падбіў падноскі і прышыў вушы.

Панскай жонцы паправіў нос і расцягнуў на капыле.
Цётцы прышыў два язычкі.
Наймічцы перашпількаваў падэшвы і перацягнуў заднік».

### Рапарт пану

Пан пад наглядам старшага конюха адсылаў свайго любімага каня на выстаўку. Па дарозе жарабец здох, і конюх рапартуе пану:

— Міласцівы пан, сівы жарабец здох, скуру вашу панскую здзёр і прадаў, а за грошы для вашай міласці хамут моцны купіў, аб чым данашу і шчыра дзякую.

### Разышоўся, як заечае сала

Едуць пан з кучарам. Пан і гаворыць:
— Во, убіў я зайца, дык з яго сала было з цэлы пуд.
А кучар яму:
— Во, пане, будзем ехаць праз мост, дык там чорт брахуноў хапае.
— А далёка той мост?
— Ды не,— кажа кучар,— во за гэтым лесам, дзе горка, а там луг, а там ужо зусім блізка.
Як уехалі яны ў лес, пан зноў кучару:
— Каб ты бачыў таго зайца! Аднаго сала яго было хунтаў з дзесяць.
Едуць яны далей, праехалі ўжо лес, дык пан:
— Ну, можа, не дзесяць, але ж хунтаў пяць з таго зайца сала было.
А як пайшла дарога лугам, дык пан ужо:
— Ну, хоць сала на ім не было, а ўсё ж заяц быў і не такі худы.
Едуць яны далей. Праехалі луг, грэблю, а моста ўсё няма.
— А дзе ж той мост? — пытае пан.
— А разышоўся, як заечае сала.

### І пану дасталося

Падгаладаўшы пан завітаў у леснічоўку — падсілкавацца... Леснічыха спякла яечню і паставіла пану.

Пачуўшы гэткі смачны пах, пяцігадовы Гаўрык клубком скаціўся з печы і палез пальцамі ў патэльню.

— Не руш,— прашыпеў пан, ляпнуўшы нажом хлапчуку па пальцах. Гаўрык пацягнуўся другою рукою, але атрымаў тое ж.

— Мама, пан — нажом! — зарумзаў хлапчук.

— А ты — лыжачкай, сынок, а ты — лыжачкай! — гукнула маці ад печы.— Ты ж не пан, каб нажом дзяўбаць.

— А, пся крэў, галган! — зароў пан, калі Гаўрык, не пазнаўшы жартаў, здзяжыў яму драўлянай бацькавай лыжкай па лбу.

## Суддзя і селянін

Лысы суддзя дапытвае селяніна.

— Што прымусіла цябе не заплаціць падатак?

— Нічога не вырасла, паночку,— адказаў селянін,— зямля пустая.

Суддзя паказаў пальцам на зямлю і дадаў:

— Калі б ты, гультай, захацеў, дык і на пустой зямлі вырасла б штонебудзь!

Селянін паказаў пальцам на лысіну суддзі і запытаў:

— А хіба на тваёй галаве, паночку, што-кольвечы расце, калі яна зусім пустая?

## Дурны суддзя

— Вы прызнаеце сябе вінаватым у тым, што абразілі пана Казлоўскага, назваўшы яго дурнем?

— Якая ж гэта абраза, пане суддзя, калі ён сапраўды дурны?

— Усё роўна няможна, гэта абраза асобы.

— А калі дурня ды назавеш разумным — гэта можна, пане суддзя? Гэта не будзе абразай?

— Гэта можна.

— Які ж вы разумны, пане суддзя.

## Добра зразумеў

Пані з брыдкім і страшным тварам, наняўшы фурманку, пытаецца ў фурмана:

— Ваш конь не выверне, ён не баязлівы?

— Нічога, сядайце: ён не будзе назад аглядацца.

## Свінка паела

Да войта прынесла баба пірагоў. Ён ёй кажа:

— І навошта было несці. Твае дзеткі зласавалі б.

— Ды ежце, пане начальнік,— адказвае бабка,— я дзеткам скажу, што свінка паела.

## Жартаўлівы гаспадар

— Гаспадарыку, гаспадарыку,— кліча парабак,— конь захварэў!

— А што ж там яму?

— А бог яго ведае,— чыста пахмурнеў,— нат піць не хоча.

— Ну,— кажа,— калі піць не хоча, зробім яго старшынёй, то, нябось, навучыцца!

## Жартаўлівы парабак

Гараў адзін парабак вельмі шутлівы, ажно едзе неякі пан дый пытае ў яго:

— Чалавечку, чый гэта двор?

— Гэта,— кажа,— пане, мой чорны вол!

— Да я пытаюся, чый гэта паліварак?

— Гэта,— кажа,— пане, мая саха і падпалак!

Той пан, няма рады, сеў дый паехаў да таго двара. Прыехаўшы, кажа да таго пана:

— Але ж у пана парабак мудры, як махляваць умее!

А той пан кажа:

— То цо, жэ ўме: няхай он мне абшука, то дам сто рублі, але недачакане!

Добра. Паклікаўшы яго, а ён ужо дагадаўся на што, та прэндзэй злажыў торбу, да й то засопшыся, убягае да пакою. Так пан кажа:

— Ну, абмані мяне, то дам сто рублёў.

— Ай,— кажа,— паночку, мне тут няма часу пану махляваць: унь,— кажа,— з таго і з таго озера ўся рыба вышла наверх, усе з'язджаюцца, бяруць, то і я хоць з гэту торбачку ўхаплю.

І пабег. Пан гэта хутчэй казаў закладваць коні, паехалі, прыязджаюць — нічога няма! І тады пан мусіў заплаціць сто рублёў. А што, ці не хітры?

## Шануй старога, як дзіця маленькае

Быў сабе стары чалавек, а меў ён сына жанатага, так сын як бацька ўжо стаў не спасобны да жаднай работы, купіў яму дзеравяную міску, дай кажа:

— Сядзі сабе за печчу, еш, а на хату ніколі не вылазь!

Той стары, што рабіць, сядзіць сабе бедны. Ажно ж, аднаго разу ўнук яго прынёс калодачку, дай давай даўбсці. Ажно ж прыходзіць бацька, дай кажа:

— Што ж ты, сынку, робіш?

— Нічога, татачку: тата ўжо зараз будзе стары, то я раблю місачку, бо дзедава ўжо пакалолася.

Той, яго пачуўшы, спалохаўся да бацька з-за печы, да на стул:

— Еш,— кажа,— татачку, што хочаш, і рабі, што хочаш. А ад тае пары глядзеў бацька, як сам сябе.

## Тату на старасць

У аднаго чалавека быў стары тата вельмі, яны лічылі, што ён ужо не патрэбны ў хаце, так парадзіліся з жонкаю, каб яго вывезці на поле, няхай

там змерзне. Прыцягнуў той чалавек саначкі дахаты, пасадзіў старога, а жонка кажа:

— На табе дзяружку, накрый яго.

А сын іх маленькі кажа:

— Раздзяры, тату, напалову дзяружку.

Ён пытае:

— На што?

А ён кажа:

— Каб і я меў чым накрыць цябе, як буду вывозіць на поле.

Так той чалавек спалохаўся і кажа:

— То і мне так будзе, ну то лепей няхай стары ў хаце дажывае да смерці.

Зняў з санак і пасадзіў каля печы. І то такі людзі праўду кажуць:

— Хто што кіне за сабою, то знайдзе перад сабою.

## Пан і мужык

Жыў у вёсцы пан. Такі быў ён зайздросны і злосны, сялян біў, здзекваўся з іх. І вот задумалі яму адпомсціць. Сабраліся хлопцы і пайшлі ў лес.

Адзін — Не руш, другі — Не чапай, а трэці — Якая табе справа.

Едзе пан куда-та лесам. Хлопцы злавілі яго і давай лупцаваць.

Збілі яго, раздзелі і прывязалі да дуба.

Пан просіць:

— Раскажыце хаця, як вас зваць.

Адзін гаворыць:

— Не руш.

Другі:

— Не чапай.

А трэці:

— Якая табе справа.

Стаіць пан дзень, стаіць два, а камары яго рэжуць.

Ідуць сяляне лесам. Увідзелі гэтага пана і хацелі яго адвязаць.

Пытаюцца:

— Хто цябе, пане, прывязаў?

— Не руш, не чапай, якая табе справа!

Сяляне завярнуліся і пашлі сабе дамоў.

А пан стаяў, пака не раскісся.

## Няхай

Алёкса быў вельмі нядбалы, гультаяваты мужык. Суседзі кажуць яму:

— Алёкса, што ты не залапіш дзіркі ў страсе? Бачыш — хата цячэ!

А Алёкса смокча сабе люльку дай кажа:

— Няхай цячэ.

Ці кажуць:

— Алёкса, бачыш,— свінні лазяць у агарод.

— Няхай лазяць,— кажа Алёкса.

Пайшоў раз Алёкса ў лес драць луцце, забраўся ў гушчэчу, дзярэ і не бачыць, што стражнік крадзецца. А стражнік ціханька падкраўся ззаду да й цап Алёксу за рукі. Круціўся, круціўся Алёкса — нічога нейме: трымае стражнік, як кляшчамі. Давай Алёкса зневажаць стражніка на чым свет стаіць. Слухаў, слухаў стражнік, перш маўчаў, але як стаў Алёкса праклінаць яго матку, не вытрымаў, прывязаў гада к дзераву і ну яго дубасіць луццямі. Паласаваў, паласаваў да й кажа:

— Ну, гад, здыхай тут у лесе, а калі хто трапіць, дык скажы, што цябе прывязаў Няхай.

Пайшоў стражнік, а Алёкса паспрабаваў адвязацца, але нічога не зробіць: вельмі моцна яго ўкрампаваў стражнік. Пачаў гэта Алёкса крычаць на праміла бог. Ішлі тут дзецюкі, пачулі, што хтось крычыць і пайшлі па голасу цераз гушчэчу. Падыходзяць к Алёксе, пытаюць, хто яго прывязаў, а ён кажа:

— Няхай прывязаў.

Плюнулі дзецюкі і пайшлі далей. Стаіць Алёкса, плача, а тут камарэча апанавала — вочы выядае. Давай Алёкса зноў крычаць, зваць людзей на помач. Учулі пастухі, думаюць, што мо' каго мядзведзь дзярэ; бягуць туды; бачаць — стаіць Алёкса пад дзеравам ды толькі галавою матае. Зірнулі яны бліжэй, ажно Алёкса прывязаны к дзераву.

— Хто цябе, дзядзька, прывязаў? — пытаюць пастухі.

— Няхай прывязаў, — кажа Алёкса.

Хацелі ўжо й пастухі пакінуць Алёксу, але ён зноў пачаў крычаць:

— Ратуйце, хто ў бога верыць, адвяжыце рукі!

— Хварэць жа тваёй мацеры,— кажуць пастухі,— чаму ж ты не хочаш, каб цябе развязалі, да ўсё кажаш, што няхай прывязаў.

Адвязалі гэта пастухі Алёксу; ухваціў ён сваю сякерку да й сунуў да гасподы, як воўк. З той пары годзе Алёкса казаць за кожным словам «няхай».

### Асцюкі

Убачыўшы Аўдоццю, якая дажынала пшаніцу, Марфа кінула ёй:

— Добры дзень, кумка! Памагай бог!

— Можа б ты, кумка, мне і сапраўды памагла,— адказала Аўдоцця.

— Я і рада б, кумачка, але ў тваёй пшаніцы шмат асцюкоў, баюся пакалоць рукі!

Прыйшла зіма. І акурат у Марфы выйшла мука. А без мукі ні блінчыка спячы, ні заціpачкі згатаваць. Прыхапіла яна мяшэчак і — да Аўдоцці:

— Каб табе не зманіць,— яшчэ на парозе схітравала яна,— ішла ў краму купіць мукі, ды яе ўсю разабралі. Можа ты пазычыш?

— А ёсць у што?

— Але, кумачка, я і торбачку прыхапіла.

Аўдоцця ўзяла торбу і выйшла ў сені. Не мінула і хвіліны, як выбягае яна адтуль:

— Каб ты ведала, кумачка! Як толькі я за муку, асцюкі — за руку, толькі я за муку, асцюкі — за руку!.. Так і не змагла насыпаць.

## Сын Хвядос

Быў у бацькі сын Хвядос. Бацька хацеў яго жаніць, паехаў у сваты, а сыну сказаў паставіць снапоў у восець, каб, знача, раніцой можна было змалаціць. Пайшоў Хвядос стаўляць снапы ды ўвесь ток і спаліў.

Прыязджае ноччу бацька, будзе Хвядоса:

— Пойдзем малаціць!

Той адказвае:

— А чым, калі цапы пагарэлі?

— Як пагарэлі?

А так.

— Няўжо ж хто зрабіў, сам згарэў і цапы папаліў. Нечага рабіць. Бацька пабедаваў, пабедаваў, потым думае:

«Ажаню яго, тады можа паразумнее».

Паслаў гэта Хвядоса к папу ў споведзь. Па дарозе ён спатыкае чалавека, той пытае:

— Куды, Хвядос, воліш?

— Жаніцца буду, у споведзь іду!

— Дай бог шчасліва!

— Так і будзець,— адказаў Хвядос.

Прыйшоў у клібанію. Поп пытае:

— Ты жаніцца хочаш? А ці ўмееш пацяры?

Хвядос кажа:

— Не, я іх ніколі не чуў і не бачыў, а ёсць Кандрат, меншы брат — во дык той на пацяры, як гад!

Ну, поп хацеў ужо яго прагнаць, аж бача, ён нешта трымае.

— Што гэта ў цябе пад палой?

— А гэта я, бацюшка, гасцінца прынёс, троха із быдла, а трохі із збожжа. І палажыў вянок цыбулі і курыцу.

Паслаў поп Хвядоса са сваёй кабылай на начлег.

— А заўтра,— кажа, я з табой распраўлюся.

Назаўтра рана прыходзіць Хвядос к папу, надуўся і стаіць у кутку. Поп кажа:

— Чаго ты надуўся, Хвядос?

— І ты б надуўся, каб на начлезе быў.

— А што там?

— А тое, што тваю кабылу воўкі ўкусілі.
— А ці многа ўкусілі? Будзе жыва?
— А дзе там, застаўся толькі хвост ды грыва.

### Ото ж добрая пасудзіна

Жыў сабе адзін чалавек. Было ў яго двое сыноў. Адзін просты, шчыры да работы хлопец, а другі якісь шарахвост. Ён многа шляўся па свету, дзесь быў у месце, дак лічыў сябе вельмі разумным і не хацеў рабіць простага мужыцкага дзела. Перш бацька сварыўся, але бачыць, што нічога не памагае, дак плюнуў да й думае сабе:

«Ну, няхай толькі чорны вол наступіць на нагу, та ён кіне сваё вымышлянне да будзе, як усе людзі».

От па немалым часе ажаніўся той гультаяваты хлопец і ўзяў сабе жонку да пугу такую ж, як і сам. Няма чаго рабіць, жонка старога даўно памерла, стала маладзіца поўнаю гаспадыняй у хаце. Але яна, што запарве, та ўсё цягне сабе, ці свайму гаспадару, а стары да працавіты дзевер як сабе хочуць, няхай жывуць абы-як. Ведама, людзі заўжды садзяцца за стол кожын на сваё месца. От так раз і тыя людзі селі абедаць. Стары сеў на куце ў канцы стала, каля старога на зэдліку сеў стаpанны сын, а каля другога канца стала — жанаты сын. Каля яго прысела жонка. Яна та сядзе, та ўстане да прынясе другую страву. Нарэшце прыносіць яна поўную місу кашы; прынесла, паставіла пасярод стала, а сама падсела к гаспадару. Узяліся мужчыны за ложкі да давай аплятаць кашу. Жанаты сын з жонкаю ядзяць да толькі аблізваюцца, а стары да яго старанны сын насілу глытаюць посную кашу. Дагадаўся тут старанны сын, што, мабыць, братавая зрабіла якіясь кпінкі, от ён узяў місу з кашаю да давай яе круціць.

— Ото ж добрая пасудзіна,— кажа ён,— дзе толькі яна зроблена.
— Мабыць у Капылі,— кажа стары,— бо там робляць добрую паліву.

Пахвалілі яны місу дай пакруцілі яе так, што к ім абярнулася каша з маслам, а к жанатаму сыну — посная. Папробавала жанчына кашы да й ложку палажыла.

— Еж, галубка,— кажа стары,— каша смачная, з маслам.

Годзі яна з тае пары падаваць на стол няроўную страву.

### Што бог злучыў, таго не разлучай

Ці ведаеце вы, як ліха жыць на свеце, калі ўсю жытку трэ служыць другім людзям і ніколі няма табе слабоды, няма свайго вугла. Хоць ты служы ў палацах, да яны чужыя, а хатка хаць курная да брудная, да свая. Праўду людзі кажуць, што як век служыць, та лепей не жыць. Які б там не быў добры хаджаін, та ці хаджайка ліхая, ці яго дзеці, або радня, дак ніколі няма табе супакою. Як ты ні рабі, як ні старайся, та людзі ўсё ж скажуць, што, ведама, парабак, якая ад яго карысць.

От быў такі няшчасны адзін чалавек, што яму ўсё прыходзілася парабкаваць. Як ні стараўся ён выбіцца на сваю гаспадарку, нельга ніякім правам, бо як тут гаспадараваць, калі ў цябе ні кала, ні двара, калі няма за што рук заціяць. Перш ён часта мяняў гаспадароў, але нарэшце пазнаў, што гэта гарэй, чым жыць у аднаго. Бо ўсім гадзіць, усім рабіць шчыра да добра, то



*М. М. Пушкар.* Паляшук са ступай

і сілы не хопіць; а жывучы ў аднаго, то можна яму нарабіць шмат так, што е чым пахваліцца. От так і служыў ён у аднаго гаспадара, служыў верна, шчыра працаваў, дак і гаспадар як бы лічыў яго сваім сем'янінам. От прышлі Каляды, накалолі людзі свіней, нарабілі каўбас да й балююць. А той парабак пазірае, пакуль дадуць, да яшчэ мо й не дадуць. Дак ось якраз жа тое і вышла. Напрагла гаспадыня на скаварадзе сала, палажыла туды цэлае лычка каўбас да й падае на стол. Каўбаса была парэзаная на кускі, але яны не саўсім адрэзаны. Дзяўбануў гаспадар кусок каўбасы да так усю й пацёг к сабе.

— Прытрымай,— кажа ён жонцы, а тая адмаўляе:

— Што бог злучыў, таго не разлучай.

Управіў гаспадар адзін усю каўбасу, а парабак толькі аблізаўся, дарам што разам сядзеў пры стале. От на свята пайшла гаспадыня ў госці, там трохі падпіла да й замарудзіла. Вярнуўся з карчмы гаспадар да й давай лаяць жонку, а тая як пачала яго зневажаць, дак яны слова за слова да й спляліся біцца. Сядзіць парабак на лаве да толькі пазірае. Горача прышлося жанчыне, от яна й просіць парабка, каб ён іх развёў. А той і кажа:

— Што бог злучыў, таго не разлучай.

От з тых час кінуў ён парабкаваць да пачаў сам гаспадараваць. Перш зрабіў будан, потым курэнь, а нарэшце і хатку, хоць маленькую, да дарагенькую.

## Набожны ксёндз

Быў сабе адзін ксёндз вельмі набожны. Ён раз сказаў усім людзям, што ў другую нядзелю прыляціць у касцёл свенты дух. Ужо ксёндз маліўся цэлы тыдзень, ажно яму прыснілася, што дух свенты не явіцца яму за тое, што ён пахваліўся. Ён не хацеў, штоб у другую нядзелю было гэтак. Паслаў ён свайго парабка на сяло, каб ён купіў белага галубка і ў нядзелю рана занёс яго ў касцёл на гару (чардак). А там у столі былі маленькія дзверцы. У нядзелю рана прышло да касцёла шмат людзей і паноў. А ксёндз паслаў свайго парабка на гару касцёла і сказаў:

— Як толькі я ў касцёле скажу: «Духу свенты, зэйдзь на мене!», дык ты ўпусціш гэтага галубка ў касцёл.

Ксёндз пашоў у касцёл, а парабак палез угору. Там ён паглядзеў, ажно галубка няма, з'еў кот. А тым часам ксёндз у касцёле казаў казанне і, падняўшы рукі да неба, кажа:

— Духу свенты, зэйдзь на мене!

А парабак з гары крычыць:

— Немаш, дабрадзею, кот з'ядл!

## Ці ведаеш, што гэта тройца?

Ішоў мужык на святую тройцу ў царкаў, а насустрач яму едзіць пан.

— Куды ты ідзеш, мужычок?

— У цэркаў маліцца богу.

— Якое сягоння свята?

— Тройца.

— Ці ведаеш, што гэта тройца?

— Не, паночак мой, не ведаю.

— Вот я табе расталкую.

Пан зняў з галавы шапку і кажыць:

— Бачыш: шапка мае верх, сяродку і падкладку, так і бог — адзін, да ў трох ліцах. Ці паняў?

— Паняў.

Пайшоў мужык далей, сустрэўся яму другі пан і пытае таксама, як той, што ўперад ехаў.

— Куды ідзеш?

— У цэркаў маліцца богу.

— Якое сягоння свята?

— Святая тройца.

— А ведаеш ты, што гэта тройца?

— Чаму не ведаю? — Як панава шапка.

### Пропаведзь

Даў адзін мужык сына на папа вучыць. Пабыў ён недзе колькі гадоў, у бацькі грошы набраўшы, ажаніўся ды й прыехаў дадому. Тым часам мужыкі паставілі царкву і такія радыя, што свайго папа маюць. Ну, заказаўжа ён ім у нядзелю на пропаведзь прыходзіць. Папрыходзіў народ, ён вышаў з кніжкай ды й пытае:

— Людзі, людзі, ці вы ведаеце, што ў гэтай кніжцы напісана?

— Не,— кажуць,— не ведаем, ойчэ духоўны.

— То вам і казаць нечага, калі вы такія дурні,— ды і сам пайшоў за райскія дзверы і больш не паказаўся. Пастаялі людзі, пастаялі, пажурыліся і разышліся... На другую нядзелю зноў наказвае сходзіць на пропаведзь, та ужо мужыкі сышліся пад царкву, ды й урадзілі, як адказаць бацюшку. Увайшлі ў царкву, ажно і поп выходзіць:

— Людзі, людзі, ці вы ведаеце, што ў гэтай кніжцы напісана?

— Ведаем, ойчэ духоўны!

— То што,— кажа,— буду язык аб зубы біць, калі вы самі ведаеце — ды й завярнуўся і пайшоў. І зноў мужыкі пастаялі, як мыла з'еўшы. Потым, вышаўшы з царквы, пабедавалі што занадта папа разумнага маюць, бо ўжо і невядома, як цяпер яму адказваць, ды й тым абышлося.

### Поп і запаведзі

Аднойчы дзяк прапанаваў прыгадаць некалькі запаведзей, якіх, на яго думку, не прытрымліваюцца парафіяне.

— Гарэлкі не піць,— цягне дзяк.

— Амінь,— гугнявіць святы айцец.

— Не красці.

— Амінь.

— Чужых жонак не спакушаць.

— О! — усклікнуў пры гэтых словах поп, стукнуўшы пальцам сабе ў лоб, і, як ашалелы, памчаўся з царквы.

— Што з вамі, бацюшка?! — закрычаў перапалоханы дзяк.

— Успомніў, дзе я ўчора галёшы забыў,— пачулася ў адказ.

## Карась

Памёрла ў адной вёсцы жанчына ў пост. Сталі спраўляць памінкі. Рашылі купіць рыбы. Кінуліся сюды, туды,— а рыбы няма. Што рабіць? Закалолі парася, паставілі на стол, запрасілі папа на вячэру. Прыйшоў поп, і давай яны прасіць літасці, што не посная страва. А поп сам рад у пост свежанінкі з'есці. Ён рукой махнуў, падышоў да парася ды кажа:

— Ператвары, гасподзь, парася ў карася.

А потым звярнуўся да іх і кажа:

— Ешце на здароўе. Карась добры.

І сам прыняўся есці.

## Пра аднаго дзеда і Міколу

Прышоў стары дзед у царкву, купіў свечку, але яшчэ не рашыў, каму свечку паставіць. Пастаяў ён, пастаяў ды пайшоў шукаць якую-небудзь найбольш карысную ікону, а свечку ў карман палажыў. Пастаіць дзед на каленях перад адной іконай, памоліцца і далей ідзе. Так дайшоў ён да Міколы. Стаў дзед на калені, моліцца і думае: «Ну, Міколе свечку і пастаўлю». Палез ён у карман, аж свечкі няма. Раззлаваўся дзед ды як крыкне на Міколу: «А ты, стары чорт, за чым глядзеў? Вось табе хвіга, а свечку ўкралі».

## Споведзь шляхціча

Спавядаўся шляхціч перад бернардынам і гаварыў пра тое, пра гэта, аж, нарэшце, кажа:

— Цалаваў чужую жонку,— але ў сваё апраўданне дадае, што не рабіў бы гэтага, ды людзі яму дарадзілі, што гэта ад хваробы вачэй памагае.

А бернардын на тое кажа:

— Не вер, калі б то праўда была, я ўжо праз сцяну бачыў бы.

## Папоўская пропаведзь

Гаварыў поп у царкве пропаведзь. Наракаў усё на людзей, каб многа не клапаціліся.

— Паглядзіце,— кажа ён,— як жывуць птушкі і звяры, нічога не робяць: не сеюць, не жнуць, а бог корміць іх.

— Эх, бацюшка! — кажа мужык.— Калі яны нічога не робяць, то гэткае іх і жыццё: ходзяць зімою па дарозе ды памёт дзяўбуць альбо падлу ядуць.

## Разжаліў

Паганы ў нашым сяле быў дзяк: не ўмеў ён пець ні каліва. Як запяе, бывала, дык і слухаць нельга, хоць з царквы ўцякай. Якся раз пеў ён вельмі

жалабна. Пяе, а сам аглядаецца: ці не разжалабіць ён каго? Аж і бачыць: стаіць чалавек ля бабніку ды й плача. Па шапачным разборы падыходзіць дзяк к таму чалавеку і пытае:

— А што ты, чалавек добры, сёння плакаў?

— Ай, дзядзечка, як жа мне не плакаць: ты сёння якраз так пеў, як мая каза бляяла, калі яе ваўкі рэзалі.

## У пекле

— Ну ж, брат Андрэй, і папаспаў жа ты!

— Вот галава! Ці ж той свет пад бокам?

— Ці ж ты быў на тым свеце?

— Быў. Бачыў рай і пекла.

— Што ж ты бачыў у пекле?

— Што бачыў? Нашага брата ні аднаго не бачыў там.

— Ну, а каго ж?

— Паноў ды папоў.

## Бедная баба

— А чаго вы, бабка, плачаце?

— Як жа мне, галубок, ні плакаць, калі чыталі ў цэркві, што на тым свеце будзе «плач і скрыгат зубамі»...

А чым жа я буду скрыгатаць, калі ў мяне ані аднюсенькага зуба няма?

## Мужчына за мужчыну цягне

Адна баба хацела даць на імшу да пана Езуса, каб пан Езус украў яе мужыка, што ён з яе здзекваўся. Ну, так ідзе ды спатыкаецца з кумою, ды кажа так і так, а кума кажа:

— Не давай да пана Езуса, лепш да найсвентшай маткі, бо такі вядома, што мужчына за мужчыну цягне.

## Дзіцятка

Аднаго разу сядзелі купцы ў заезджым двары. Гаспадыня выйшла з хаты, а хлопчык яе пачаў крычаць па матцы. Крычаў, покуль не змарыўся, а тады змоўк.

— Ну, дзякуй богу, перастаў,— кажа адзін купец.

А хлопчык, пачуўшы гэта, адказвае:

— Ага, перастаў, адпачну, ды зноў буду.

## Не тутэйшы

Праз кірмашны пляц праходзіць п'яны і, убачыўшы незнаёмага, пытаецца:

— Ска-ааа-жыце, якая цяпер пара: ці на небе свеціць месяц ці сонца.

— Не ведаю, браце, бо я не тутэйшы.

## Колькі год

— Адкуль мне ведаць, каторы мне год ідзе? Як нарадзіўся — быў без памяці; як рос — розуму не меў; а як ужо да розуму дайшоў, то тады б і лічыў, але ўжо шмат год прайшло.

## Вялікі чын

— Твой сын у маскалёх? — пытае дзед старой бабы.

— Але! І не простым ён салдатам служыць, а такога чыну дабіўся, што ўсе яго слухаюцца.

— Значыць, ён унтар?

— Куды вышэй!

— Фальдфэбель?

— Э, шчэ вышэй: барабаншчык.

## Немажлівая рэч

— Калі гляджу на вас, не інакш як асла бачу перад сабой.

— Не, гэта не можа быць, бо я не люстра.

## Калі селянін есць курыцу?

— Калі селянін есць курку?

— Калі селянін хворы, або курка хвора, або часам на вялікдзень.

## Пакаштаваў

Селянін прыехаў з гораду і кажа свайму суседу:

— От жа ў горадзе смачныя булкі!

— А ты каштаваў?

— Ды не, я якраз бачыў, як адзін паніч еў.

# ГЕРАІЧНЫ І ГІСТАРЫЧНЫ ЭПАС

Гераічны і гістарычны эпас розных народаў свету мае свае асаблівасці. У адных народаў эпас прадстаўлены такімі класічнымі жанрамі, як руны, быліны, думы, гайдуцкія і юнацкія песні, для іншых — такія жанры не характэрны. У беларускім фальклоры няма адзінай, толькі яму ўласцівай формы эпасу. Беларускі гераічны і гістарычны эпас аб'ядноўвае творы розных жанраў: казкі і паданні аб асілках і былінных героях, гістарычныя паданні, песні, у якіх адлюстраваны ўяўленні нашага народа аб мінулым, дадзена народная ацэнка розных гістарычных падзей.

Беларускі эпас развіваўся на аснове здабыткаў эпічнай паэзіі старажытнарускай дзяржавы у цеснай узаемасувязі з эпасам іншых славянскіх народаў, асабліва рускага і ўкраінскага, што адбілася на яго форме і змесце.

Найбольш ранніміі формамі эпасу славянскіх народаў можна лічыць паданні і казкі аб волатах і асілках, прама ці ўскосна звязаныя са славянскай міфалогіяй, якія шырока прадстаўлены ў беларускім фальклоры.

Другі этап развіцця эпасу ўсходніх славян адносіцца да эпохі старажытнарускай дзяржавы і прадстаўлен былінамі, якія сталі жанрам уласна рускага фальклору. Быліны бытавалі на тэрыторыі Беларусі і аказалі ўплыў на беларускую вуснапаэтычную творчасць, у якой захаваліся казкі на былінныя сюжэты, асобныя фрагменты былін і песні быліннага складу.

Наступны перыяд развіцця гераічнага і гістарычнага эпасу ўсходніх славян пачынаецца разам з працэсам фарміравання рускай, украінскай і беларускай народнасцей. У гэты час былі створаны рускія гістарычныя песні, украінскія думы і беларуская гістарычная паэзія, якая адлюстравала барацьбу беларускага народа з татара-мангольскім нашэсцем, з польска-каталіцкай агрэсіяй, сялянска-казацкія паходы, вайну са шведамі, Айчынную вайну 1812 г. і іншыя падзеі, у якіх самы непасрэдны ўдзел прымаў беларускі народ.

Беларускім гістарычным песням уласцівы патрыятызм, імкненне да свабоды і незалежнасці, пачуццё адзінства з рускім народам.

**Літаратура**

*Беларускі эпас*. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі і І. В. Гутарава. Мінск, 1959.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967, с. 104—124.

*Кабашнікаў К. П.* Нарысы па беларускаму фальклору. Мінск, 1963, с. 53—65.

## КАЗКІ НА БЫЛІННЫЯ СЮЖЭТЫ

### Ільля

Жылі сабе муж з жонкай, і нарадзіўся ў іх сын Ільюшка. Пражыў ён больш дваццаці гадоў, і ляжаў дваццаць тры гады на адным баку. Прыходзіць раз к яму дзядуля.

— Што ты, Ільюшка, вады б напіўся ці квасу?

— Магу напіцца вады!

І сказаў яму дзядуля прынесці вядро вады. Той як унёс, так ён і выпіў.

— Як ты, Ільюшка, маешся сам сабою?

— А во, дзядуля, маюся так: магу ад зямлі неба дастаць і ад неба зямлі!

Тады дзед гавора, каб ён унёс вядро квасу. Той як унёс, так ён і выпіў. Дзядуля пытаецца:

— Як ты маешся, Ільюшка?

— Не, дзядуля, чую, што крэпак, ды ўжо так не магу здзелаць — ад зямлі неба дастаць!

— Жыві ж, Ільюшка, на здароўе і ачышчай свет. Прашчай!

А яго матка з бацькам пайшлі ляда сеч. Тады Ільюшка зняў вароты, паставіў на іх бочку вады і дванаццаць булак хлеба і панёс ім на галаве абедаць. Падыходзіць ён к ляду, бацька ўбачыў, гавора:

— Наш Ільюшка ідзе!

— Во,— кажа матка,— ці наш Ільюшка зробіць? Гэта так нехта ідзе. Ён толькі часу дажыдае!

— Не,— кажа бацька,— гэта наш Ільюшка!

Прыходзіць Ільюшка:

— Памагай бог вам!

Тады бацька з маткай узрадаваліся, што прыйшоў іх сын Ільюшка. Ён гавора:

— Ну, ацец і маці, абедайце, лажыцеся аддыхаць, а я пасяку ляда!

Ацец-маці паабедалі і ляглі аддыхаць, а ён стаў ляда сеч, ды не сеч, а так ірваць з карэннем. І стаў Ільюшка той лес кідаць на адзін бок і на другі, на сем вёрст і загаціў тым лесам раку Дунай на сем вёрст. Тады разлілася тая рака і пайшла па ўсіх старонах, хацела ўвесь свет затапіць — крэпка загаціў. Прачнуліся яго ацец-маці, убачылі, што ён нарабіў, і гавораць:

— Ах, Ільюшка, не ладна зрабіў — свет затопіш!

Тады пайшоў Ільюшка к Дунай-рацэ і зноў стаў раскідваць лес на сем вёрст, расчышчаць раку. Расчысціў раку і пайшоў дамоў. Рака як была, так і пайшла зноў гуляць. Прыходзяць бацька з маткай дамоў. Ільюшка паслаў бацьку свайго к папу.

— Ёсць у яго такі конь, купі ты мне яго за пяць злотых!

Ён пайшоў к папу:

— Бацюшка, ёсць у вас конь за пяць злотых?

— Ёсць,— гавора,— прадам!

Ён і купіў.

Прыводзіць к сыну дамоў. А конік быў нячысты, карослівы, маленькі. Тады Ільюшка пускае яго, таго каня, у чыстае поле на дванаццаць сутак, штоб дванаццаць травін з'еў за дванаццаць дзён. А сам пайшоў у кузню к кавалю зрабіць дванаццаць пудоў булаву жалезную. Тады выйшаў на чыстае поле добры маладзец, Ільюшка, раскруціў тую булаву і шыбнуў угару. Яна ляцела дванаццаць часоў, палавіна сутак, і як узварачалася, падставіў ён калена. Яна як ляцела — дзёр аб калена, і рассыпалася.

— Не,— гавора,— трэба крапчэйшую зрабіць!

Зноў пайшоў да каваля ў кузню і зрабіў булаву дваццаць пяць пудоў. Пабалаваў яе ў руках:

— Вот гэта будзе мне хараша!

Зрабіў яшчэ сабе піку, шаблю войструю здзелаў. Тады выйшаў добры маладзец Ільюшка на чыстае поле і крыкнуў па-маладзецку, свіснуў пазацку:

— Каб мой конь зараз тут быў!

Ён прыбягае. Бяжыць — зямля дрыжыць, сам увесь калоціцца — крэпка сілен стаў. Прыбягае і стаў — шарсціна залатая, шарсціна срэбраная. І пытае:

— Чаго Ільюшка, жалаеш?

— А паедзем белы свет ачышчаць, нягіднага Сокала пабіваць!

І просіць ён у аціа-маці благаславення:

— Благаславіце, ацец-маці, у белы свет ехаць мне!

Ацец гавора:

— Бог благаславіць і мы благаславім. Куды надумаўся, адпраўляйся сабе.

Тады ён увабраў каня ў залатое сядло, узяў з сабою ўвесь струмант бойны — булаву і піку — і паехаў у белы свет. Ехаў ён, ехаў троя сутак і прыехаў у царства цара Пражоры. Ён па дзесяць чалавек еў на дзень, а нягідны Сокал яму дастаўляў есці. Ён, нягідны Сокал, як свісне, дык на дванаццаць вёрст кругом чалавек упадзе — крэпка сілен быў. І сядзеў той нягідны Сокал на дванаццаці дубах адзін, і ў яго дванаццаць рагоў. Пад'язджае к яму Ільюшка, ён і гавора:

— Здрастуй, Ільюшка, добры малойца! Чаго ты сюды зайшоў?

— Сам добры малойца ахвотаю зайшоў!

— Што ж, Ільюшка, ці біцца будзем, ці мірыцца?

— Не на тое я йшоў, штоб мірыцца, а на тое, штоб біцца з табой!

Тады як хваціў добры малойца Ільюшка булаву, як дзёрнуў яго па галаве — на месцы і палажыў. Адрубіў яму галаву і ўстыкнуў яе на піку, і пасек яго тулава на дробны мак, кінуў у асінавы груд і спаліў. Крыкнуў па-маладзецку, свіснуў па-казацку:

— Ну, мой конь, паедзем к нягіднаму цару Пражору!

Ну, й паехалі — галаву Сокала на піку! Пад'язджае туды і выстаўляе тую галаву нягіднага Сокала на пікі ў цара пад ганкам. Услыхаў той цар Пражор, што нехта едзе, і гавора:

— Хто там едзе? Каго гэта мой нягідны Сокал дапусціў?

А таго не знае, што нягіднага Сокала галава ў яго пад ганкам на пікі!

— А едзе,— кажа,— Ільюшка! Будзе тое і табе, што твайму Сокалу!

А ён быў крэпка жыран; дык вочы ў яго заплылі і бровы зараслі, і ён нічога не бачыў. Дык ён кажа:

— Слугі мае верныя, падніміце мне вілкамі бровы!

Хацеў ён паглядзець на Ільюшку. А добры маладзец Ільюшка ўзяў булаву і ідзе к яму ўжо, аж ганкі трашчаць над нагамі. Цар Пражор пытае:

— А дзе ж мой Сокал?

Ільюшка хутка ідзе на ганкі, бярэцца за піку і паказвае:

— А во дзе твой Сокал!

— Слугі мае верныя! Дайце нам піцення-ядзення, пап'ём мы з Ільюшкай!

Тады завялеў цар Пражор прыгатаваць для Ільюшкі залатое крэсла,— з сабой пасядзець.

Не хоча Ільюшка нічога, садзіцца ні быццам-та піць-есці з ім, ды, нічога не кажучы, схапіў з галавы сваю шапку — дванаццаць пудоў, як ударыў таго нягіднага цара Пражора, дык на тры аршыны сцяну каменную прабіў і яго наскрозь сцяны прабіў... Убіў ён нягіднага Сокала і цара Пражора і ачысціў свет. Тады ўбіраецца ён у белы свет, ехаць пуцём-дарогаю. І ўязджае ён у такія лясы, у такую пушчу-драмушчу, што ні ўздумаць, ні ўзгадаць, толькі ў казках казаць. Прыязджае ён у такое царства, не ў гэта, дзе мы жывём, а ў другое, і стаўляецца ў тым царстве пруд на дванаццаць камянёў. Пад'язджае ён туды і гавора:

— Бог помач вам! Ці не ёсць у вас, рабяты, вады папіць?

Яны адказваюць:

— Чаму, можна вадзіцы папіць, ёсць харошая!

Папіў ён вады, падзякаваў:

— Ну, спасіба вам за харошую ваду!

І разгаварыліся яны. І пытаюцца яны ў яго:

— Ці не параіш ты нам, ці не паможаш ты нам дванаццаць камянёў узлажыць? Мы б табе, што ты хочаш, заплацілі б.

Тады гавора Ільюшка:

— Я вашыя платы не хачу, а пасабіць магу. А ці крэпкі вашы ганкі?

— Крэпкі — можаце ўзысці!

А таго яны не знаюць, што ён такі крэпкі багатыр! Тады ён узяў на адну руку камень надзеў і на другую надзеў і стаў ступаць на ганкі. Ступіў — тыя ганкі ломюцца.

— Не,— гавора,— не магу ўзнесці па гэтых ганках,— ламаюцца яны. Ну, ды мне вашы ганкі не трэба, я магу і так паўскідаць!

Узяў адзін камень у адну руку, а другі ў другую і паўскідаў іх наверх, туды, дзе трэба іх класці. Ну, тады яны гавораць:

— Ну, просім мы цябе, каб ты ўсе паўскідаў!

Так ён узяў і ўсе паўскідаў.

— Хто ты такі,— пытаюцца,— добры малойца?

— Я Ільюшка Іванаў.

— Што ж ты з нас хочаш: ці грошы, ці што?

— Нічога я з вас не хачу, хачу толькі каб вы мяне заўсёды благадарылі.

— Можа хочаш, мы цябе пачастуем харошымі напіткамі?

— Ну, мне гэта ваша не трэба! Прашчайце, брацца! Ачысціў я ўвесь белы свет! Жывіце на здароўе! Вот вы не зналі, а цяпер я скажу, што я сільны, магушчы багатыр, Ільюшка Іванаў, і маліцеся богу за маё здароўе пагэтаму...

Тады паехаў ён у сваё царства. Прыязджае туды, прыходзіць у свой двор к аццу, к маці. Так яны ўзрадаваліся!

— Ах,— гавораць,— Ільюшка! Мы ўжо думалі, што цябе на свеце няма!

— Слава богу,— кажа,— жыў і здароў, і вясёл, і ачысціў увесь свет!

## Аб Ілюшку

Жыў сабе старык са старухаю. Багатыя. На хутары жылі. Нарадзіўся ў іх сын Ілюшка і сеў у седнях — папрыгінала рукі і ногі. Прасядзеў трыццаць тры гады. Вот надась пайшоў бацька і матка ў ляда, а к яму прышлі тры старцы і гавораць:

— Ілюшка, падары-ка нам чаго-небудзь.

— Рад бы я вас дарыць, дык я не магу ўстаць.

— Э,— гавораць,— ты прытвараешся.

Не можа ўстаць ён.

— Пацягні-ка,— гавора,— нагу.

Выцягнулась.

— Пацягні другую.

І гэта выцягнулася. Ну і рукі так. Устаў.

— Чым вас адарыць?

— Бяры той таз, ідзі ў падвал і засілі віна нам.

Ён пабег, засіліў, унося. Яны гавораць:

— Выпі.

Ён выпіў.

— Ідзі другі засілі.

Ён другі прыношае.

— Выпі і гэты. Ідзі трэці засілі. Нас жа тры. Гэта ты як нам дорыш.

Ён уносіць і трэці.

— Выпі і гэты.

Ён і гэты выпіў.

— Ну як, ты цяпер чуствуеш сілушку ў сябе?

— Калі б у неба і ў зямлю стоўб і штоб было ў ім калясо, дык бы ўвесь свет перакруціў рукою.

Так яны глянулі адзін на аднаго:

— Ідзі,— гавора,— шчэ прынясі таз таго віна.

Ён уносіць.

— Выпі і гэты.

Ён выпіў.

— Ну цяпер, як чуствуеш сілушку?

— Палавіну,— гавора,— таго.

— Ну, хопіць з цябе. У баю нідзе не загінеш. Дажджэшся будучай нядзелі, папросіш сто рублёў у бацькі грошай і ідзі ў горад. Дайдзеш да раскрэсаў недалёка ад горада, дык будзе старык весці касматага лашонка, дык ты яго штоб купіў. Ён запросіць з цябе сто рублёў. То будзе твой конь. Прывядзеш дамоў яго, пакорміш тры дні белаярай пшаніцай і тры зары на шоўкавую траўку будзеш выводзіць, каб ён пакачаўся. Тады ты ўбачыш, што гэта за конь.

Ён просіцца ў бацькі:

— Пусці мяне ў свет пагуляць.

Вот ён сеў і паскакаў.

Ехаў, ехаў, вот раскрэсы, стаіць стоўб, на стаўбе табліца напісана: «Гэтай дарогай паедзеш — будзеш жанат, а гэтай паедзеш — будзеш багат... гэтай паедзеш — будзеш убіт». Ён падумаў: «Жаніцца я не хачу, багацтва мне не нада, паеду сюдой, дзе буду ўбіт. Мне старцы гаварылі, што я ў баю не пагібну». І пусціўся гэтай дарогаю. Ехаў-ехаў, выязджае на паляну і выходзіць к яму дванаццаць разбойнікаў.

— Стой!

Ён стаў.

— Дзеньгі!

— У мяне мала дзенег. Усяго чатырыста рублёў. А сертучок мой каштуе тысячу рублёў. А каню майму цаны няма.

— Ета нам,— гаворацъ,— і нада.

— Ета вам і нада?

Дмух на іх, так яны сып аб зямлю, без памяці ляжаць. Ён злез з каня, пападымаў іх.

— Вот што: еслі будзеце яшчэ ета дзелаць, то жывых вас у другі раз не астаўлю.

Яны перад ім ком зямлі з'елі:

— Век болей дзелаць гэтага не будзем.

— Ну ідзіце.

Сам пусціўся далей. А там Салавей Разбойнік звіў гняздо на дванаццаці дубах і жывець там. Ён свістам убіваў за тры вярсты людзей. Як толькі замеціў каго, так свісь і няма яго.

Вот Салавей бача ўсаднік едзе не абы які. Падпускае яго бліжай. Як свіснуў, дык конь на калені ўпаў. Ён [Ілля] спрыгнуў з каня: «Стой, конь, не падай». Нацягнуў свой лук і як рэзнуў яго [Салаў'я Разбойніка] прама ў правае вока. Выбіў. Ён вобаратам на зямлю. Ён [Ілля] пад'вязаў яго к сядлу і паехаў у Кіеў у горад. Прыехаў туды к князю. Князь і спрашвае:

— Што гэта за звер?

— Гэта Салавей, каторы ўбіваў людзей.

— А... мы наслышны былі аб ім. Загадай-ка яму свіснуць.

— Не, еслі загадаю, дык вас на свеце не будзе і ўвесь горад разрушыцца. Захавайцесь, калі хочаце пачуць, у падвал за трое дзвярэй. Дык я яму толькі на дзесятую долю загадаю прасіпець, а не пець.

Ён як засіпеў, не асталося ў цераме ні аднаго вакна. І яны ў падвале былі паглохлі. Тады ён узяў яго, як падшыбнуў угару, так ён упаў і разбіўся. А тут у князя два багатыры служаць Алёша Паповіч і Дабрыня Нікіціч. Вот і Ілюшка к ім. Сталі ўтраіх тут служыць. Вот прыязджае сюды багатыр і раз'язджае па ўсіх іх палатах.

— А ну вылазь на бой каторы!

Алёша Паповіч выяджае к яму. Ён як чувікнуў Алёшу, дык той, як сноп. Выяджае Дабрыня Нікіціч. Ён і гэтага таксама ўбіў.

Выязджае Ілюшка. Як дзвігнуў, дык той, як сноп, пакаціўся. Сам астаўся служыць. Доўга ці каротка ён паслужыў там, прысылае бацька пісьмо.

— Едзь дамоў. Мы паміраем. Некаму дабром будзе пользавацца.

Ён сеў на каня і паехаў дамоў. Ажаніўся і стаў жыць. Пражыў да старасці лет, стаў сівы.

Вот заехаў багатыр у Кіеў-горад такі, што адна галава з сянны стог. Князя ў цюрму засадзіў, а яму прарэзалі ў цераме сцяну (у дзверы не пралазіў).

Ён прыказвае гораду, штоб дванаццаць печаў пяклі хлеба і падцёлка каб зажарылі, і кабана, і гуску, і вутку, і індыка, курыцу і бачонак віна. Гэта ён за дзень з'ядаў. Штоб гэта было кожны дзень. Так ён і жыве. Прыказаў, каб усе старцы ішлі к яму, ён іх будзе дарыць. Дачуўся аб гэтым Ілюшка, сабраў сабе старцаву сумку, сеў на каня, паехаў апяць у Кіеў.

Прыязджае туды, каня паставіў, сам пайшоў к цераму і просіцца:

— Адчыніце і падарыце старцу.

Ён з-за стала вылез, адчыніў яму дзверы, сам ізноў за стол і есць.

— Адкуль ты, брацец?

— Адтуль і адтуль.

— Во мне гэта і нада. Вот скажы, брацец, там, гаворáць, у вас ё багатыр Ілюшка. Раскажы, я цябе адару.

— Ёсць.

— Які ж ён? Такі, як я?

— Да не! Ён такі, як я. Каб у пару нас паставіў, дык сказалі б — гэта браты. Не разгадаць.

— Гэ... такі багатыр. А гаворáць, сільны. Вот я бачыш па колькі ем і п'ю?

Ілюшка і гавора:

— У нас у канцы вёскі пан жыве, у яго многа кароў. Адна карова большая за ўсіх. Тры трэба каровы ўместа. Дык яна выпівае па тры бочкі брагі. А надысь узяла ды і чацвёртую выпіла. Узяла і лопнула. Каб і з вамі гэтага не здарылася.

Ён цап кінжалам і так туды ў яго. А ён кіў галаву — кінжал праляцеў міма. А ў Ілюшкі была сорак пудоў шапка. Ён цап тую шапку і як стукнуў яму, дык галава ўліпла ў сцяну. Выпусціў князя. Князь не знае, што яму рабіць. Сталі піць і гуляць. Князь і гаворыць:

— Вось тут у нас у лесе на паляне сільны-прасільны багатыр. Ён паша тую палянку.

Ён пашоў туды на палянку і бачыць: паша чалавек. Ад'ехаў недалёка ад дарогі, з сахой паша.

— Пачакай,— гавора,— хадзі-ка сюды. Скажы ты мне, тут гаворáць, што на паляне ёсць сільны багатыр.

А ён адказвае:

— Я багатыр.

— Э-э-э, такі багатыр.

— Такі багатыр.

— Я ж цябе б як узяў, на ладоню пасадзіў і падшыбнуў пад хмару.

— А можа б я цябе падшыбнуў. Ідзі к маёй сошцы і папробай яе вытрусіць.

Ён падыйшоў к гэтай сошцы, ды і з месца не кране.

— Да,— гавора,— праўда твая, ты б мяне падшыбнуў.

Вот ён апяць пашоў к князю і давай зноў пір піраваць. Прышлі з Кіева к князю пасланцы:

— Прыляцеў змей з дванаццацю галовамі і пасяліўся каля Лаўраў.

Ілюшка пашоў туды. Узяў меч свой і як стаў біцца са змеем гэтым, да рады няма. Ссячэ галаву, а яна зноў нарастае. Патуль біўся, пакуль сам па калені ўехаў у зямлю і зрабіўся каменем. Ён і цяпер стаіць там. Я сам там відаў яго.

І так расказваюць людзі, як ён уедзе ўвесь у зямлю, то і свету канец.

### Бязногі багатыр

У нейкім царстве, нейкім гасударстве жыў-быў каваль ды кавалiха. Спарадзiла кавалiха, на яе лiха, гожага хлапчука, ды бязногага. Расце хлапчук не на радасць, а на гора. Вядома, калека з роду, якая радасць бацькам. Гадуецца ён, як пакiдзiшча. Управiцца кавалiха каля печы ды й бяжыць у поле, цi ў агарод, а хлапчук валяецца па зямлi ды смокча скарынку або жуе параную картоплю. Кiнула яго раз кавалiха на дзядзiнцы, дык чуць яго свiннi не з'елi. Не шкадуе кавалiха, на яе лiха, свайго дзiцяцi.

— Бо,— кажа,— якая з яго карысць. Калека не памога, а толькi абуза. Хаць бы яго бог з свету прыбраў.

А тут ён наперакор расце ды таўсцее. Вырас ужо хлапчук нелапы, але не ходзiць ды толькi поўзае. Кармiць яго кармi, а карысцi з яго нiякае няма. Яшчэ гарэй пачала яго праклiнаць матка ды наракаць на бога, што даў ён сына не на ўцеху, як людзям, а на бяду. Слухаў, слухаў каваль праклёны дурное бабы, але нiчога не можа парадзiць. Шкада яму хлопца, але ад бабы жыткi няма. От нарэшце не вытрымаў ён, запрог кабылку, пасадзiў на воз сына ды й павез яго ў лес. Завёз ён далека ад вёскi, ды й хацеў там пакiнуць на страту, але ўбачыў у лесе маленькую хатку. Улез ён у хатку, аж там нiкога няма. Зiрнуў ён туды-сюды — у хатцы ўсё ёсць, а гаспадынi няма. От ён унес сына ў хатку ды там i пакiнуў, а сам сеў на воз ды па кабылцы, ды па кабылцы. Патарахцеў ён хутчэй, не аглядваючыся, каб нiхто не дагнаў. Сядзiць хлапчук адзiн у хатцы ды разглядае, што там ёсць.

Толькi вось прыходзiць старэнькi дзядок i просiць напiцца.

— Рад бы я даць табе напiцца,— кажа хлапчук,— ды не магу хадзiць.

— Прашкi,— кажа дзядок,— зачарпнi ды перш закаштуй сам, цi харошая вада.

А хлапчуку даўно пiць хацелася, хлебануў ён ды й выдундзiў амаль поўны корчык. Як выпiў, дык адразу пачуў у сабе такую сiлу, што, здаецца, усю зямлю перавярнуў бы, каб толькi было аб што ўперцiся нагамi. Напiўся дзядок ды й кажа:

— Пi больш, бо табе трэба вялiкая сiла,— ды й знiк, бацца яго й не было.

Падзiвiўся хлапчук, думаў, што гэта яму прыснiлася, але бачыць, што ў яго здаровыя ногi, што ён так iдзе, што пад сабою зямлi не чуе. Напiўся ён яшчэ тае вады, дык i чуецца, што яму няма раўнi на ўсiм свеце. Хацеў ён яшчэ больш налiць вады, ды як узяўся за жбан, дык i разгнеў яго, а вада вылiлася. Схапiў ён вядро дый пабег да крынiцы. Шукаў ён яе, шукаў — няма, от бы ў зямлю правалiлася. Варочаецца ён да хаткi, аж i тая прапала. Ён туды, ён сюды, ды так заплутаўся ў гушчэчы, што не ведае, куды iсцi. Пастаяў ён трохi ды й пайшоў проста. Iдзе ён, а спераду пападаецца тоўстая хвоя або дуб, як печ. От схопiць ён адной рукою дрэва,

дык тое й хрусне, бы саломіна. Ідзе ён ды варочае дзераўлякі, быццам там віхар праляцеў. А ён ломіць лес дзеля таго, каб зрабіць метку ды ў другое туды не прыйсці. Доўга ён так ішоў, пакуль вышаў на дарогу. А там паабапал дарогі ляжалі вялізарныя каменні, быццам валы. От і пачаў ён перакідаць тое каменне на дарогу, бы картоплю. Толькі вось едуць багатыры. Пад'ехалі яны ды супыніліся, бо нельга ехаць далей, каменне мяшае.

— Здароў, дзяцюк,— кажуць багатыры,— што ты робіш?

— Граю сабе,— кажа той хлапчук.

От багатыры злезлі з каней ды хацелі апрастаць дарогу: узяліся яны за адзін камень, але не могуць яго й крануць. Падышоў той хлопец ды й згроб тое каменне ў роў.

— Паедзем з намі,— кажуць багатыры.

— Як жа я паеду, калі ў мяне няма каня,— адказвае хлопец.

— Выбірай сабе каня з нашых.

Пайшоў хлопец выбіраць сабе каня, але толькі паложыць каню на спіну руку, дык той і ўпадзе на пярэднія каленкі. Перабраў ён так усіх каней, а сабе не выбраў ніводнага. От пайшоў ён з багатырамі, тыя на конях, а ён пешкі. Толькі вось бачыць ён, што каля дарогі мужык скародзіць поле. Кабылка ў яго худая, маленькая, але жылістая. Палажыў ёй хлапец руку на спіну, а яна й не ўхмылілася. От пачаў ён таргаваць тую кабылку, але мужык не хоча аддаваць ні за якія грошы.

— Навошта мне грошы,— кажа ён,— яшчэ хто заб'е, а без канякі як я ўпраўлюся з гаспадаркаю. Без канякі й чалавек не чалавек.

— Памяняй сваю кабылку на каня,— кажуць багатыры.

— Бяры сабе на выбар, якога хочаш.

— Хто мяняе, у таго хамут гуляе,— кажа мужык.

Насілу багатыры ўламалі мужыка, ды за пару самых лепшых коней вымянілі хлопцу тую кабылку. Сеў ён на кабылку, і паехалі яны далей. Толькі вось пад'ехалі яны к той вёсцы, дзе жыў бацька хлопца, ды й сталі каля кузні каваць коней. Не пазнаў каваль сына, так ён змяніўся, ды падкаваў і яго кабылку. Вось і просіць кавальчук, каб бацька выкаваў яму булаву. Сабраў каваль усё жалеза ды й выкаваў такую булаву, што ўтрох насілу яе варочаюць. Узяў кавальчук тую булаву, пакруціў яе адной рукою ды як шыбануў угару, дык яна няведама й дзе дзелася. Стаяць багатыры да дзівяцца. Але вось па нямалым часе ляціць булава, бы гром грыміць, ляціць уніз. Падставіў кавальчук калена. Ударылася булава аб калена ды толькі скрывілася. Прыбавіў каваль яшчэ з пуд жалеза ды й выкаваў мацнейшую булаву. Падзякваў кавальчук, узяў булаву ды й паехаў з багатырамі ў свет.

Прыехалі яны к аднаму цару й наняліся на службу. Па немалым часе аб'явіўся там дужы змей і пачаў прылятаць ды цягаць к сабе людзей. Багацько пахватаў ён людзей ды й паеў іх. Нарэшце захацелася яму царскага мяса, вось і схапіў ён царэўну ды й запёр к сабе ў лёху, але не есць, а трымае на закуску. Аб'явіў цар па ўсяму царству, што дасць таму паў-

царства й аддасць замуж царэўну, хто яе выбавіць ад змея, а яго заб'е. Многа парывалася сільных багатыроў біцца з тым змеям, але ўсе яны згубілі там свае костачкі. Нарэшце вызваліся й тыя багатыры, што прыехалі з кавальчуком.

— Паедзем з намі,— кажуць яны кавальчуку.— Ты яшчэ малады, пара й табе шукаць славы. Паедзем, та мы цябе навучым, як біцца.

Згадзіўся кавальчук, і паехалі яны разам. Вось едуць яны ды едуць ды пад'язджаюць, аж растанцы на дарозе й стаіць слуп, а на ём штось напісана. Быў з іх адзін пісьменны, вось і пачаў ён чытаць. Вось і перачытаў ён, што хто паедзе направа, той дабудзе сабе славу, хто налева — знойдзе багатства, а хто проста — таго спаткае смерць. І пачалі тут багатыры выбіраць, куды хто ахвоч ехаць. Выбралі яны ўсе дарогу направа й паехалі шукаць славы, толькі адзін кавальчук кажа, што ад смерці не адперці, ды лепш ехаць проста. Як ні адмаўлялі багатыры, а кавальчук уперся ды-такі адзін паехаў проста. Праехаў ён трохі ды й трапіў на тую самую хатку, куды яго завёз бацька бязногага. Прывязаў ён кабылку ды й ўлез у хатку. Зірнуў ён у кут, аж там у запечку сядзіць вельмі старэнькая баба.

— Здарова была, бабка!

— Дзякуй табе, дзецючок. Куды бог нясе? — пытае яна.

— Паеду, бабка, проста.

— Не едзь, дзетка, бо згінеш, там змей з'есць.

— Не, бабка, паеду, хоць згіну.

— Шкода мне цябе, дзетка; ты быў у маёй хатцы, дык ты мне быццам родны ўнук. Дык вось жа слухай мяне. Што ты не сустрэнеш на дарозе, дык не забівай, то яно табе ў дарозе ды ў бядзе паслужыць.

Падзякваў хлопец бабе ды й паехаў далей. Толькі ён ад'ехаў ад хаткі, аж выскачыў заяц. Хацеў ён швырнуць у яго булавою, але той кажа: «Не бі мяне, я табе ў бядзе паслужу».

Паехаў ён далей, а заяц бяжыць за ім назіркам. Толькі вось выскачыў воўк. Ён за булаву, а воўк кажа: «Не бі мяне, буду патрэбен у бядзе».

Апусціў ён булаву ды й паехаў далей. Бяжыць воўк назіркам. Вось пад'ехаў ён к каменнай гары. Няма як ехаць далей. Злез ён з кабылкі, пусціў яе на пашу, а сам пайшоў шукаць дарогі. Тым часам змей вылез з лёху жыраваць ды якраз трапіў туды, дзе была кабылка. Бачыць воўк, што з'есць змей кабылку, вось ён як напалохаў яе, дык яна й пусцілася наўцекача з усіх ног, ды тым часам і ўцякла ад змея. Пажыраваў змей ды й вярнуўся к сабе ў лёху. Вось прыбег к хлопцу заяц ды й паказаў яму тую шчыліну, дзе змей зачыніў царэўну. Пагрукаў хлопец булавою ў каменную сцяну, вось там і паказалася царэўна ды й кажа: «Уцякай, бо змей з'есць». А тут хлопец размахнуўся ды як трэсне булавою аб сцяну, дык яе й высадзіў. Кінулася к яму царэўна на шыю ды давай прасіць, каб давёз яе к матцы ды к бацьку. Тым часам змей высунуў голаў праз шчыліну ды й хацеў з'есці таго хлапца. Тут хлопец схваціў булаву ды як рэзне па галаве змея, дык з яе й мазгі пацяклі. Вось адрэзаў ён у змея язык ды й палажыў яго

сабе ў кайстру. Тым часам змей высунуў другую галаў. Хлопец і тую размазджыў ды выразаў язык. Такім парадкам расквасіў ён змею ўсе дванаццаць галоў. Рада царэўна, што такі знайшоўся багатыр, ды й страціў ліхога змея. Спадабаўся ёй той хлопец і абяцала яна, што пойдзе за яго замуж, як ён завязе яе к бацьку ды к матцы. А што гэта праўда, дык яна разарвала хустачку ды й дала хлапцу адну палавінку. Палажыў хлапец хустачку за пазуху ды й лег спаць, бо вельмі стаміўся, пакуль ухадзіў змея. Спіць хлапец багатырскім сном і не чуе, што бяда блізка. Тым часам тыя багатыры пад'ехалі туды, убачылі царэўну ды й пачалі яе пытаць, як тое ўсе было. Расказала яна ўсё, як было, ды й кажа, што пойдзе замуж за таго хлапца. Пазавідувалі яны хлопцу, падбеглі к яму соннаму ды й забілі яго. Потым пачалі яны спрачацца, каму павінна дастацца царэўна. Доўга спрачаліся яны, нарэшце, пачалі яны біцца, пакуль пазабівалі адзін аднаго. Застаўся толькі адзін самы дужы ды спрытны. Вось ён прымусіў царэўну, каб яна сказала бацьку ды матцы, што гэта [ён] багатыр забіў змея й выбавіў яе з няволі. Няма ей чаго рабіць, трэ згаджацца, бо яе каханага хлопца няма ў жывых. Вось той багатыр пасадзіў царэўну на каня ды й павёз яе к цару. Тым часам заяц пабег да крыніцы, набраў там жывое вады ў рот, прынёс ды й пырснуў хлопцу ў вочы. Ажыў той ды й прахапіўся. Зірнуў ён, аж царэўны ўжо няма. Дагадаўся ён, што тут было ліха, ды чуць не заплакаў ад жалю. Хацеў ён хутчэй бегці к цару ды расказаць там усю праўду, дык вядома, пешкі далёка не забяжыш хутка. Тым часам воўк пабег па лесе ды й трапіў яго кабылку. Напужаў ён яе ды й прыгнаў туды. Сеў гэта хлопец на кабылку ды й паехаў хутчэй к таму цару. Прыязджае ён туды, аж там ужо ўсе гатовяцца к вяселлю. Пайшоў ён к цару дый расказаў яму ўсю праўду. Не мае цар веры ды й пытае ў дачкі. Але, вядома, тая кажа толькі тое, што ёй вялеў казаць той багатыр. От цар вялеў за паклёп павесіць таго хлапца. Тут толькі пачалі яго пытаць, хто ён такі.

— Я,— кажа,— бязногі багатыр, а больш я вам нічога не скажу.

Вось ужо вядуць таго бязногага багатыра вешаць. А тым часам царэўна пайшла ў сад гуляць. Ідзе хлопец ды й бачыць, што каля плоцця туляецца заяц. Вось ён выняў з-за пазухі тую хустачку ды й кінуў зайцу. Схапіў заяц хустачку ды й прымчаў к царэўне. Зірнула тая ды й чуць не абамлела.

— Чаго ты? — пытае цар.

Тут яна кінулася цару-бацьку ў ногі, расказала ўсю праўду ды й пачала прасіць, каб не вешалі таго хлапца, каторы збавіў яе ад змея. Вось цар вялеў не вешаць таго хлапца, а прывесці яго ў палац. Прыйшоў ён са сваею кайстраю ды й стаіць. Пачаў тут цар пытаць яго, як тое было. Расказаў ён усё, як было. А той багатыр кажа, што гэта няпраўда. Тады бязногі багатыр выцяг з кайстры змяіныя языкі ды й пытае: «А што гэта?»

Змяшаўся той багатыр, а царэўна паказала бацьку абедзве палавінкі хустачкі. Тады ўсе паверылі. Таго ліхога багатыра павесілі, а бязногі ба-

гатыр жаніўся з царэўнаю ды й заўладаў паловай царства. Справілі гучнае вяселле.

Я там быў і мёд піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала.

## Іван Пракрасны і князь Ладымяр

Жыў-быў сабе Іван Пракрасны, сірата няшчасны, і служыў ён па князям, па панам і па ўсем багатырам; не імеў ён сабе ні плацця цветнага, ні слова добрага. Наняўся ён к князю Ладымяру, Кіеўскаму садзяржацялю, многаміласціваму. Праслужыў ён у князя тры года,— тожа не меў ні плацця цветнага, ні слова добрага.

Даждалі праздніка светлага васкрасенія. Князь Ладымяр стаў сваіх прыслуг суражаць, каторыя былі ў яго. Быў у яго Алёшка — лёгак на язык, сладак на слова.

Князь Ладымяр спрашваець у Алёшкі:

— Ніхто на нас не абіжаецца,— ні адна душа?

— Ёсць у нас Іван Пракрасны, сірата няшчасны,— тот абіжаецца.

Прызваў князь Ладымяр к сабе Івана, даець яму куні нячыняны і шубу няшытую:

— Вот табе куні нячыняны і шуба няшытая, штоб гэтыя куні пачыніў і сабе шубу пашыў і штоб ты са мною на завутрань паспеў.

Палучыў Іван Пракрасны, сірата няшчасны, горка заплакаў. Пашоў ён к раке Дняпру і думае сам сябе пагубіць. Яўляецца к яму баба, як сянная капа:

— Аб чым ты, Іван Пракрасны, сірата няшчасны, журышся? Я тваймy гору памагу. Будзеш мяне маткай зваць?

— Буду!

— Садзісь на мяне!

Баба старая перавязла Івана на той бераг ракі. Там стаіць дом — не ўздумаць, не ўзгадаць, толькі пяром напісаць. Прыносіць баба к варотам, бразнула ў кальцо. Выскаквае к нім дзевушка, Алёна Сівалобаўна.

— Вот табе друг! Будзеш ты яго сваім мужам называць?

— Буду!

— Вот жа ты яму куні пачыні, шубу пашэй і выправі з князем Ладымярам на завутрань.

— Лажысь, друг мой, Іван Пракрасны, спаць,— гаворыць Алёна Сівалобаўна, а сама вышла на крыльцо, крыкнула багатырскім голасам. Ідуць к ёй усе яе слугі.

— Аб чым ты нас спрашваеш?

— А вось наце, каб вы куні пачынілі і шубу сей час жа пашылі.

Алёна Сівалобаўна стала Івана будзіць:

— Уставай, мой друг! Вот шуба гатова,— на завутрань звоняць.

Іван Пракрасны, сірата няшчасны, надзеў шубу тую. Тады Алёна даець яму тры яечка:

— Адным ты яечкам князя Ладымяра пахрыстосуй, другім папа, а грэцяе вязі ў двор.

Пасля завутрані Алёшка — лёгак на язык, сладак на слова, і кажа Івану:

— Пахрыстосуй, брат, і мяне.

Пахрыстосаваў Іван і яго.

Прыязджае Іван у дом, Алёна гаворыць яму:

— Пахрыстосуй і мяне!

— Я,— гаворыць Іван,— Алёшку пахрыстосаваў.

— Ты дурак, хам! Сабе безгалоўе палучыш.

Князь Ладымяр сабіраў багатых і ўбогіх на абед. Ён спрашваў у багатых:

— Хваліцесь багацтвам! Буду за багацтва хваліць, а ўбогіх надараць.

Іван Пракрасны сядзіць, нічога не адказвае. Алёшка — лёгак на язык, сладак на слова, запышэў * і гаворыць:

— Іван сабе жану нажыў, крашэ ў свеце нет.

Ладымяр на гэта і кажа:

— Паслаць яго к Воўку Мінчыгрэю за самаграйнымі гуслямі — Мінчыгрэй яго страціць, а жана яго ў нас астанецца.

Напісалі пісьмо і паслалі Івана к Воўку Мінчыгрэю і сказалі яму:

— Еслі ты не прыставіш нам самаграйных гусель, то табе плаха і меч і голаву з плеч.

Палучыў тое пісьмо Іван Пракрасны, сірата няшчасны, заплакаў. Прыходзіць ён у дом Алёны Сівалобаўны. Яна гаворыць:

— Я табе гаварыла, што будзе табе безгалоўе. Ну, на табе шырынку, рубашку і порткі. Калі ж табе будзець прытуга, успамяні мяне тры разы.

Прыехаўшы к Воўку Мінчыгрэю, Іван падаў яму пісьмо. Воўк Мінчыгрэй прачытаў пісьмо, гавора:

— У мяне нет гатовых, нада каваць, а табе, Іван Пракрасны, дуць, не аддыхаючы, трое сутак.

Іван Пракрасны за трое сутак тры разы аддыхаў, а Воўк Мінчыгрэй на яго сільна асярчаў і хацеў з'есць. Іван Пракрасны папрасіў у Воўка Мінчыгрэя сабе баню, штоб на смерць памыцца. Памыўшысь, ён стаў рубашку надзяваць і Алёну Сівалобаўну памінаць:

— Спасіба, Алёна Сівалобаўна, што ты на смерць маю рубашачку дала.

Воўк Мінчыгрэй спрашвае ў яго:

— А што табе Алёна Сівалобаўна?

— Жана мне,— кажа Іван.

— Чаму ж ты мне раньша гэтага не сказаў? Яна сястра мне. У мяне ёсць гуслі гатовыя.

---

* Раззлаваўся.

Воўк Мінчыгрэй даў Івану гуслі. Ён іх прывёз і аддаў князю Ладымяру. Праз Алёну Сівалобаўну астаўся жывы. І цяпер яны жывуць, мёд-віно п'юць. І я там быў, мёд-віно піў, па вусам цякло, а ў рот не папала.

## Курыла Кажамяка

Была недзе вялікая гара, а ў той гары жыў цмок. Гэты цмок украў у цара дачку. Жыла яна год у той гары з цмокам, жыла два. А ў той гары была дзюрка, куды лятаў цмок. Раз, як паляцеў цмок, улятае ў тую дзюрку голуб. Тады яна напісала картачку к свайму бацьку, на нітачку прывязала і начапіла на шыю голубу. Як начапіла картачку, дык выпусціла голуба вон. Голуб паляцеў у той горад, адкуль цмок узяў царэўну, і сеў на даху. Людзі ўбачылі, што ў таго голуба нейкая картачка на шыі, і сталі яго лавіць. Улавілі, адвязалі картачку ад шыі і сталі чытаць. А ў той картачцы напісана:

— Ацец мой любезны, дастаньце мяне з такой і з такой гары. І больш мяне ніхто не дастане, апроч Курылы Кажамякі. І вот як вы можаце яго ўзнаць: як толькі будуць тапіцца печкі і будзе ісці дым, дык ва ўсіх дамах дым пойдзе на бок, а ў яго прама. Ён сільней цмока, і калі хочаце дастаць мяне адсюль, дык упрасіце Курылу!

Тады цар сабраў старыкоў паважаных і паслаў іх к Курылу прасіць, каб ён дастаў яго дачку з гары ад цмока. Пайшлі тыя старыкі к Курылу і сталі яго прасіць. Прасілі, прасілі і кланяліся — не ўпрасілі. Сабраў тады цар сярэдніх людзей і паслаў іх к Курылу прасіць, каб ён дастаў яго дачку з гары ад цмока. Пайшлі яны к яму, кланяліся, караліся, усе, усе прасілі — не, не ўпрасілі. Засмуціўся той цар і не ведае, што яму цяпер рабіць, як бы-та яго ўпрасіць. Тады яму параілі:

— Вазьмі ты паспрабуй пасляць малых рабят, можа ён над імі і змілуецца.

Ён паслухаў той рады іхняй, сабраў малых дзяцей і паслаў іх к Кажамяку прасіць, каб ён схадзіў к цмоку за дачкой за царскай. Пайшлі тыя дзеці к Кажамяку, а ён на возеры кожы мые. Сталі яны перад ім плакаць, кланяцца. Тады яго быццам-та ўзяў жаль. Разарваў ён тыя кожы на чатыры часці і ўкінуў у возера. І паслаў сказаць цару, каб ён купіў дванаццаць пудоў пянькі і шэсць пудоў смалы і даставіў яму. Курыла абвярцеўся пянькою, абсмаліўся смалою і пайшоў на тую гару.

Прыходзіць ён на тую гару, ажно цмок вылятае к яму.

— Што,— гаворыць,— Курыла, за чым прыйшоў сюды?

— А прыйшоў за царскай дачкой. Аддай мне яе!

— Не, я не аддам царскай дачкі!

— А не аддасі, дык мы з табою разбярэмся!

І схапіліся яны біцца. Біліся, біліся з самага рання да самага паўдня.

Цмок убіў Курылу па пяты ў зямлю, а Курыла цмока ўбіў па калені. Тады цмок кажа:

— Аддышам, Курыла! Цары з царамі б'юцца, і каралі з каралямі б'юцца і то аддышку маюць, а мы з табою біліся палавіна дня і не аддыхаем!

А Курыла кажа:

— Не, я не хачу аддыхаць, біцца дык біцца!

Сталі яны зноў біцца. Біліся, біліся ад самага паўдня да самага вечара. Курыла цмоку галаву зняў, а цмок убіў Курылу па калені. Забіўшы праклятага цмока, Курыла раскапаў гару і дастаў царэўну. І, дастаўшы царэўну, прыставіў яе к аццу. Цар, убачыўшы сваю дачку перад сабою, крэпка ўзрадаваўся, угасціў Курылу як можна лепш і даў яму дужа многа грошай.

Вярнуўся Курыла дамоў і лёг спаць на дванаццаць сутак. І прыставіў ля дзвярэй часавога, прыказаў яму так:

— Каторыя хочуць паглядзець на мяне мужчыны, ты пускай, ну жанчыны ні адной не пускай!

Як лёг ён спаць, тады яго матцы крэпка захацелася на яго паглядзець. Узяла яна адзелася ў мужчынскую адзежу і прыходзіць. Часавы думаў, што гэта мужчына, і прапусціў яе ў пакой. Увайшла яна туды, дзе ён спаў, і як толькі глянула на яго, так ён і памёр...

## ПАДАННІ

### Асілкі

Даўно, даўно, калі яшчэ людзі жывалі па лясах драмучых, прышлі ў цяперашнюю Утужыцкую абшчыну асілкі і занялі яны два места, адно на рэчцы Вараухе, у Забарышчах, а другое — на Іваніхе пры той жа рэчцы. У тых мястах у тое ўрэмя ніякага народу не было, мяста былі вольныя па ўсёй Жанвіль-Утужыцкай старане. У лясах той стараны жылі звяры ўсякія: мядзведзі, воўкі, ласі, кабаны, лісіцы, рысі, а па рэках і азярах жылі выдры: рыбы ў вадах было такое мноства, хоць палоўнікам чэрпай.

Асілкі тыя былі людзі здаровыя, росту ў касую сажань, у плячах аршына з два, голас мелі, як звон немалы, бывала калі крыкнець ва ўвесь голас, ды свіснець, дык якое б дзерава не было бальшое, а заваліцца. Вот якія былі яны людзі, тыя асілкі.

Хазяйства яны ніякага не трымалі, не было ў іх ні якой худобы, ні скацінкі дамашняй, ні прыпасу, ні запасу. Ні хлеба, ні лёну не сеялі. Карміліся яны тым, што лавілі па лясах звярэй ды па вадах рыбу. Адзежу сабе яны строілі з звярыных шкур. Вот так і жылі. Мусіць пра бога яны саўсім не зналі, бо ніхто не чуў ад старыкоў, штоб яны мелі дзе-небудзь царкву

алі папа. Асілкі, пажыўшы на рацэ Вараухе, спадабалі Жанвіль-Утужыцкую старонку, бо тут ім усяго досыць было. Звяр'я па лясах было відзіманявідзіма і рыбы ў водах тожа, а ім больш нічога і не трэбавалась. Вот і задумалі яны абсяліцца і пачалі сразу строіць два гарадзішча — Забыркі і Іваніху. Народу тут было многа, шутка сказаць, кажынны год бабы прывадзілі па два ды па тры рабёнкі.

Струменту ў іх амаль ніякага не было. Кажуць, што ў іх быў на ўсіх адзін тапор, ды і той не жалезны, а якісь медзяны, а можа і жалезны, пра гэта дзяды не сказывалі, мусіць, запомнілі. Адно звесна, што асілкі не мелі струменту, а гарадзішчы строілі. Гарадзішчы гэтыя і цяпер ёсць на Варауce, вот зараз ідзі і паглядзі. Не меўшы досыць струменту, асілкі перабрасывалі тапор з гарадзішча і на гарадзішча, бо не хацелі траціць часу на хаджэнне. Зыкнець, бывала, асілак з аднаго гарадзішча ў другое, тапор давай, той возьмець тапор ды й кінець яму. Такая была ў іх сіла, за то і прызывалісь асілкамі. Гэта яшчэ нешто тапор перакінуць, вярсты за тры, а то, бывала, нада на пастройку дзерава, пойдзець у лес, вырвець дзерава з карнём ды так і прэць на гарадзішча, а то камень прыдзецца прыставіць, дык ён возьмець яго ды й кінець за вярсту і больш прама на гарадзішча. Другія кідалі такія бальшушчыя камні, што будзець у полсажня вялічынёю, алі такія камні не ўсягды дакідывалі да гарадзішча. А то ёсць такія мясціны, што саўсім закіданы камнямі. Дзяды казалі, што на гэтых самых мясцінах асілкі друг супроць дружкі ваявалі, кідаясь камнямі. Яны і звярэй убівалі камнямі, адтаго камні і ляжаць аж да сягодня па лясу. А далі сказывалі старыкі, што асілкі ўшлі адсюль, як толькі перавяліся ў лясах звяры і пазменшала рыбы ў вадзе, бо ім не з чаго стала жыць. З тых пор і гарадзішчы іхныя запусцелі, бо пасля іх не скора прышлі сюды нашы дзяды, каторыя абабралі сабе другія мясціны, каторыя больш спасобны для хлебапашаства і для разводу скацінкі.

## Адкуль Рубеж

Пра войны тыя нам дзяды расказвалі, ну а ў кніжках можа і ні так, як мы знаім. Тут і шведы былі, і палякі, і французы, ну, усіх іх і пабілі. Во, можа слыхалі, тут недалёка Рубеж, дак то шчэ ад татар. Прышлі яны і сталі супроць нашага войска. А раней дак перш біліся князі ці багатыры, а за імі ўжо войска. Вышлі на поле татарын і рускі, біліся конныя, потым пешшы, ну ніхто не пераможа. На другі дзень, аддыхнуўшы, зноў сышліся. І зноў таксама ніхто не пабядзіў. Так і прастаялі сем дзён, пакуль не знайшоўся такі малады хлопец, што як схапіў таго татарына, да як кінуў яго вобземлю, так і ўбіў. А за ім і ўсё войска на татар пайшло, пабілі іх многа, каторых пабралі да паразганялі.

Дак ад таго і Рубеж завецца, што доўга на ім стаялі. А ў капцах недалёка татары закапаны.

### Пра вайну са шведамі

У 1709 годзе, калі Пётр Вялікі атрымаў вядомую перамогу пад Палтаваю над шведскім каралём Карлам XII, шведы па дарозе назад пераходзілі праз Валожын, абрабавалі і разарылі тутэйшых жыхароў. Яны ўварваліся таксама ў царкву.., забралі там усё... і паставілі ў ёй коней. Некаторыя з шведскіх салдат пачалі былі страляць у абраз святой Параскевы... і за тое... асляплі.

Услед за шведамі прышоў атрад рускіх войск, а з ім і сам рускі цар, Пётр Вялікі. Ён асабіста аглядаў аграбленую непрыяцелямі царкву.

### Бітва пад Лясной

Швед, разбіты пад Лясной, трапіў у балота Чыстая Лужа. Там патанулі ў дрыгве яго гарматы, коні, людзі, а галоўны начальнік іх — Левенгаупт — кінуўся цераз Брадзілаў мост на Прапойск. Прапойскія перавозьнікі на вачах у шведаў хутка знішчылі паромы на Сожы. У той жа час на левым баку Сожа, у Старынцы і Краснаполлі, з'явіліся казакі. Яны не дапусцілі шведаў да пераправы і пагналі іх далей, на Рудню... Тут шведы пакідалі сваё ваеннае снаражэнне ў балота і разбегліся па лясах, ратуючыся ад пагоні рускіх... Начальнікі шведскія кінуліся да Сожа, закапалі там пад сасновым крыжам купу золата і срэбра... І давай уцякаць па слядах свайго караля.

### Вайна шведска

Як то было кедысь цяжка на свеце, неспакой, от шведска вайна была, мноства featuring рознага войска цягалася па свеце. От тады ішлі якіясьці Сасы, Тарантасы, не зналі нашай мовы, а мы іх. Бог іх ведае, як яны гаварылі, только ўвойдзе да хаты і крычыць: «Пекі ку́рка!», то ледзьве дамысліліся, што ён кажа — палі печ. Забіралі людзям хлеб, авёс, на хвурманкі гналі, а некаторыя як паехалі, то і прапалі з імі зусім. От, кажуць, з Дрыгі неякі Баран Мацей і Балдыка стары прапалі. А возьмуць дзяцей, пазасаджаюць шыямі за лаву, прыцісну́ць лаваю і падушаць. А старшыя паўцякалі да лесу, дзеўкі ўсе ў лесе сядзелі, бо не можна было быць дома. Так, бывала, яны падходзяць пад лес і крычаць: «Крыся, Марыся, жані валэ да дому, жані!» А як катора выйдзе з леса, то ўжо яе ўхопяць і робяць, што хочуць, з ёю.

### Платон-казак

У дванаццатым гаду падняўся на белага рускага цара француз Напальён. Нагнаў ён сюды войска, бы цёмная хмара, ды й пачаў паліць вёскі, гарады ды забіваць людзей. Пахаваліся людзі, хто паспеў у лес ці за балота, загналі туды ўвесь свой статак, а дабро закапалі ў зямлю. Знішчы-

лі французы ўвесь край, змарнавалі ўсё дабро, так што й самі пачалі падыхаць з голаду. Пераелі паганыя сабак ды катоў, палавілі мышэй ды пацукоў, пастралялі ўсіх варон ды й паелі ўсялякую погань. Сам Цар Напальён ходзіць сабе на балоце ды ловіць жабы або чарапахі, каб пасілкавацца, бо голад не свой брат, кожнага як засмокча, дык гатоў сам сабе руку адгрызці. Соўваюцца галодныя французы, бы сонныя мухі, ды збіраюць чарвякоў, жукоў ды ўсялякіх слізнякоў, каб хоць гэстаю пошкуддзю набіць сабе лантух. От і пачалі людзі памаленьку вылазіць з лесу ды дабіваць тых гадаў. Збяруцца яны дзе-небудзь грэцца ў хату, а тут бы з зямлі вынырне Платон-казак да й запаліць адусюль тую хату. Пякуцца французы, бы картопля ў прыску, пякуцца, а вылезці з хаты не могуць, бо дзверы калом падпёрты. Гуляе Платон-казак то тут, то там і ніяк яго не могуць злавіць французы. Абяцаў Напальён вялікі гасцінец таму, хто зловіць Платона-казака, ці хоць скажа, дзе ён. Але ніхто не можа таго сказаць, бо Платон-казак лятае, бы арол, плавае, бы шчупак, бегае, бы хорт. От пераадзеўся ён за купца ды й прыехаў к Напальёну, нібыта прадаваць хлеб. Прымае яго Напальён ды й пытае:

— Ой ты, слаўны купец-маладзец, ты ўсюды па свету бываеш, усё бачыш, усё знаеш, мо Платона дзе стракаеш?

— Ну, няма таіць чаго,— добра знаю я яго.

Цар тут разам схамянуўся, на Платона азірнуўся. Дак казак той не дурак, паказаў яму канчак. Замахнуўшыся з пляча, рэзнуў трэйко згарача, аж звалілася карона: сам ускочыў у стрымёна дый крычыць:

— Лаві Платона!

От такі то быў казак, што французам даўся ў знак. Ён па полю раз'язджае, страх на армію наганяе, паліць генералаў хаты да бярэ ад іх гарматы; забягае на дарозе, топіць войска ў Бярозі. От адзін стаў Напальён, хоць прывёў да нас мільён. От і едзе той казак па полю, смела даў каняцы волю. Жыта поруч каласіцца, крыж за горкаю ласніцца. Сонца грэе, аж пячэ, толькі пот з ілба цячэ. От ён шапачку здымае, бога шчыра праслаўляе, што памог француза раць з края роднага прагнаць. Толькі ў жыце зашумела, раптам сэрца бы згарэла. Толькі ён перахрысціўся да й на карак да каня схіліўся. Казакоў падбегла двое.— Мабыць, месца тут ліхое.— Перш француза тут забілі, а Раманава мястэчка на жалобу запалілі. Бы свяча, дамы палаюць,— то Платона памінаюць. Слёзанькі з вачэй цякуць, песню ж казакі пяюць, як вялікі той казак згінуў дарам небарак.

## ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕСНІ

### Вох вы, людзі, людзі старыя...

Вох вы, людзі, людзі старыя,
Мужыкі вы праваслаўныя,

Ох вы, братцы, да вы слушайце,
Во што я буду і сказываці,
Разгаворы разгаварываці,
Во што была пры старому цару,
Пры цару Івану Васільевічу,
Пры блажэннай яго памяці.
Як задумаў цар жаніцца сябе,
Ён ізволіў ён і сватаціся,
Маладую ён Чаркасініцу,
Ён і первую імператарніцу,
Ён і Марыю Дзяменцьеўну,
Ён і многа і прыданага бярэць:
Гарады з прыгародачкамі,
Яшчэ сёлы і з прысёлачкамі,
А дзярэўні і з памешчычкамі;
Ён і многа да ён півушка варыў,
Ён і многа зелена віна курыў,
Ён і многа ён гасцей запрасіў,
Ён і многа князей пазазваў.
Усе госці паз'ехаліся,
Усе князі пасабраліся,
За столікі пасажаліся,
За столікі за цясовенькія,
За скацерці за набельчатыя;
Аднаго ж таго і нетуці
Да і большага і шурына.
Прыязджаець ён апосле ўсех,
Ён садзіцца павыша ўсех,
Хлеба-солі ён не кушаець,
Бела лебедзя не рушаець.
Зелена віна і ў рот не бярэць,
Толькі жостка выхваляецца.
Як скоча наш цар-гасудар
На сваё красна крылечушка,
Як і свіснець на Волгу-раку,
А сы Волгі на Остраханю,
Сы Острахні ў камянную маць Маскву,
З камянной маці Масквы на ціхай жа Дон:
— Сабірайцесь з татар і з баяр,
Яшчэ сы Данскіх казакаў,
Яшчэ да з найлучшых маладцоў,
Яшчэ сы дваровых людзей!
Выхадзілі два брата Андрэі да й Андрэевічы:
Яны самі-то малёшанькі,

На каленушках нізёшанькі,
На язык прышапётываюць,
Адзін на аднаго паглядываюць,
Усы за усы закладываюць.
Як узяўся ж і меншы брат,
Як і скоча праз семдзесят сталоў,
Ён і семдзесят татарынаў убіў летучы,
— Ох, і з кім толькі сахвачусь,
Ох, і з кім толькі я пабарусь,
Сваёй сілушкі праведуюсь?
Як і хваціць ён за правую руку,
Метанёць яго об землю:
На ім плацьіца палопалась,
І сапажонкі папалопаліся,
І шатанёнкі далоў спаўзлі.
Выхадзіла й Марья Дзяменцьеўна,
Выхадзіла на крылечушка,
Выхадзіла са высокага церама,
Гаварыла славечушка:
— Ты, мужык, ты, мужычы сын,
Ты, крапіўнае семечка!
Ой, і многа б цябе сеілась,
Да і мала ўрадзілася!
Што не браць было за правую руку,
Не мятаць было аб зямлю,
Не мараць было плацця цветнага,
Не пазорыць ліца белага!

### Як белы свет завадзіўся...

Як белы свет завадзіўся,
Маладой Шаўрук нарадзіўся.
Ох, служыў ён цару, каралю,
А царыцы, імператрыцы.
Ох, яна ж ажаніла яго,
Яна абкружыла яго.
Узяла яму жонку,
Узяла не пароўні яго:
Ні спячы, ні зварыць,
Ні з людзьмі гаварыць.
Ох, рассердзіўся Шаўручаньку
Да выйшаў на крутую гору,
Да крыкнуў Шаўручанька,

Да крыкнуў на ўсю галаву:
— Ох, Масква ж ты мая, Масква,
Ох, прабелая ты Літва,
Дай жа ты мне двух барцоў сюда!
Не дасі мне двух барцоў сюда,
Я цябе ўсю вытаўку!
Я цябе ўсю вымазчу!
Да на сваю староначку,
Занясу ж я галовачку.
Узяў цар пісьма пісаць,
Па ўсіх гарадох рассылаць,
Маладому Шаўручаньку
Барцоў іскаць.
Абазвалася два...
Два родных брата.
На іх сапожкі шаўровенькія,
Шапкі бабровыя,
Лясачкамі папіраюцца,
Самі сабе ўдзіўляюцца:
— Здраствуй ты, Шаўручаньку!
Вот цібе хлеб да соль на стол,
Вот цібе двух барцоў за стол!
Да спужаўся Шаўручаньку,
Да спужаўся маладзёшанькі.
Да ступіў ён на ножанькі,
Пакаціліся ў яго слёзанькі.
Сталі яны піць да гуляць,
Стаў ён да барцоў спрабаваць.
Звечара да апоўначы,
З апоўначы да да белага дня.
Сталі яны, паздароўкаліся.
Стаў дзень рассвітаць,
Стаў ён барцоў спрабаваць.
Ах хапіў ён младшага брата,
Падкінуў яго ўгору высако!
Яго косткі патрэскаліся,
Яго сустаўцы паразляталіся.
— Ох, гаворыць старшы брат,
— Ох, брат ты мой радной,
А мы мамкі адной.
Ты на сілу да не чаешся,
А папераду хватаешся!
Да схапіў ён Шаўручаньку
Да пад белыя ручанькі.

Да падняў высако,
Па калена ў зямельку ўбіў!
Косткі патрэскаліся,
А суставы паразляталіся,
А шкурачка палопалася.
Ходзіць Шаўрукова маць
Рукі-ногі ломіць,
Бога просіць:
— Кеб вы такія, барцы,
Густа сеяліся,
А рэдка ўсходзілі.
Майго сына Шаўручаньку
З свету зводзілі.

**Сяўрук**

Ой, хто ж таго не знаў,
Як белы свет настаў?
Як і соўнушка ўзайшло,
Як і яркі месячка,
Як і частыя звёздачкі,
Як і цёмныя хмарачкі,
Як і сільныя дождж ачкі?
Як цар да сыноў пажаніў,
Як цар дачарэй пааддаў?
Сяўрук на вяселлі бываў,
Сяўрук і гарэлкі піваў,
Сяўрук пазыватым бываў.
Як пайшоў жа то Сяўрук —
Семсот гарадоў прайшоў,
Семсот казакоў сазваў,
Семсот да баярынаў,
Семсот да татарынаў,
Семсот палкоў Данскіх казакоў.
Як крыкнуў то Сяўрук,
Як свіснуў то сільной,
Да на свой двор шырок,
Да на свой церам высок.
Як бягуць к яму барцы,
Із барцоў да на выборца,
Як да ўдалыя Калужанцы,
По бацюшку Мікітавічы,
По матушцы Марыніны сыны;
Яны вусікі зажымаючы,

І рукавікі засучываючы,
І сапожанькі падцягіваючы,
І чулочыкі падвязываючы.
Ухваціў жа то Сяўрук
Ён найбольшага брата,
Як за левае плячо,
Як за правую пашку,
Як за тонку рубашку;
Як падняў жа то повыша сябе,
Як ударыў жа паніжа сябе,—
Зямля страхнулася,
Вада спляснулася,
Масква ўлякнулася,
Яго пугавіцы палопаліся,
І пяцелікі патрэскаліся,
І жалудкі павыскачылі,
І пячонкі павыкаціліс;
Па каленкі ў зямлю ўбіў,
Ох, што жана яго, Сяўрушаніца,
Бела-ўдалая Чаркашаніца,
Яна па двору ходзя,
Белы ручанькі ломя.
Як пайшла жа то Сяўрушаніца,
Бела-ўдалая Чаркашаніца,
Семсот гарадоў прайшла
Па сябе барца не найшла...

### Прыехаў дзед на паляначку...

...Прыехаў дзед на паляначку
І пусціў коніка на папасачку,
А сам лёг на аддыханнійка.
І прышло к дзедушку сорак молайцаў,
Сорак молайцаў, усе разбойнічкі.
Хочуць дзеда у палон забраць,
Яго коніка у табун загнаць.
А стары дзедзя не ўлякаецца,
К сырому дубу прыграбаецца.
Узяў дуба за вярхушачку,
Прыгнуў дуба к сырой зямлі.
Сырая зямля здрыганулася,—
Сорак молайцаў улякнулася:
— Ах ты, дзедушка, родны бацюшка,

— Не будзем цябе у палон браць
І твайго коніка у табун гнаць,
А будзем цябе аццом зваць.

### Падыймаліcь чорны хмары...

Падыймаліcь чорны хмары,
Неба пакрывалі,—
Прыхадзілі злы татары,
Пад Крычавам сталі.
Запалілі стары Крычаў,—
Канцы запылалі...
Наш Івашка падыймаўся,
Людзі ў рады сталі.
Палілася кроў, змяшалась
З чорнаю зямлёю,—
Злы татары падаліся
Уцякаць гурбою.
А Івашка гоніць, гоніць,
Голасна смяецца,
Што татарва уцякае,
Аж хахол трасецца.

### Вох ты, ёлка, ялінка...

Вох ты, ёлка, ялінка,
Прынадобнае дрэўца,
А стаяла там ёлка,
А стаяла ялінка,
Пры пуці, пры дарозе,
Бліз прыбойнага гасцінца.
Во пад той жа ёлкай,
Кравапь цісавая,
А на той жа краваці
Да пярына пухавая,
А на той жа пярыні
Добры моладзец ляжыць,
Добры моладзец ляжыць,
Ён ні зарэзан, ні ўбіт.
На ём рубашачка,
Яна тонка, палатняна,
Яна таненька і бяленька,
Уся кроўю скіпела.
А не шыла матушка,

Не страчыла сястрыца —
Вох і шылі татары,
А страчылі калмыкі;
Вох і шылі татары
Вострымі мячамі,
Страчылі калмыкі
Залатымі штыкамі.

### Каля лесу, каля цёмнага...

Каля лесу, каля цёмнага,
Пралягла там дарожанька шырокая.
Па той дарожаньцы бяжыць конік варанюсенькі,
На тым коніку сядзіць малойчык маладзюсенькі.
Бяжыць конік — разлягаецца,
Сядзіць малойчык — хістаецца.
Яго мамка пераймаець, у яго пытаець:
— Ох ты, сынку мой, сынок.
Нашто так ківаешся,
Што на коніку хістаешся?
— Ох ты, маці мая, матулька,
Не сам я ківаюся,—
Упаіў мяне татарскі сын:
Тром ножыкам вараўскім,
А чацьвертай шабляй вострай,
А пятай — куляй простай.

### Ой, лятаў-палятаў ды сівы гарол...

Ой, лятаў-палятаў ды сівы гарол,
У кіпцях ён нясе руку белую,
Руку белую малайцоўскую;
А ў дагон яму ясен сакол:
— Пагадзі-пастой ты, сівы гарол,
А дзе ж быў-жыраваў ты, сівы гарол?
— А я быў-жыраваў на пабоішчы,
Над шырокай ракой каля Клецііўска!
А там послынь сцелена ды галовамі,
Усё галовамі малайцоўскімі;
А там кроў плыве ды Дунай-ракой,
А ваўкі грызуць белы костачкі;
Там агні гараць, там катлы кіпяць,
І татары стаяць, палон дзелючы,
Палон дзелючы, падзяляючы,

Дзяцей з маткамі разлучаючы.
Дасталася сястра брату патурчаніну,
Сястра брату, цешча зяцю басурманіну.
А брат сястру дамоў пусціў,
Дамоў пусціў, добра слоўца казаў:
— Ты вяртай, сястра, бордза да дому;
Прыдуць татары налета ўзнову,
Прыдуць узнову хмарай страшнаю,
Стануць абозам ля нашага двору.
А прывёз зяць цешчу маладой жане:
— Вось табе, мая малада жана,
Вось табе з вайны паланяначка,
Будзе яна табе, мая верна жана,
Векавечная твая работніца,
А вам, дзеткі мае, будзе нянькай яна.
А ты дай ей, жана, тры работанькі:
Перша работа — тонкі кужаль прасці,
Другая работа — гусей у лузе пасьці,
Трэцяя работа — дзіцё калыхаці...
Ножкамі маці дзіцё калыхае,
Дзіцё калыхае, сціха падпявае:
— Ой, люлі, люлі, дробна дзіцятка,
Ой, люлі, люлі, маё ты мілае.
А па бацьку — ты мне татарчатка,
А па маці — ты мой унучатка.
Як учула дачка песню з пакою,
Бяжыць у сені бордзай стралою:
— Ой, кінь, кінь, маці, дзіцё калыхаці,
Хадзем у пакоі, а сядзь за столам,
Бяры ў мяне, маці, ключы залатыя,
Адмыкай жа імі скрыні дубовыя,
Бяры золата-срэбра, сколькі табе трэба,
А будзь ў мяне, родна, як у сябе дома.
— Дзіцятка маё, Алёнка мілая,
Не нада мне грошы, пусці дадому,
Пусці дадому ў Клецькі староны.

### Із-за Слуцка, із-за Клецка...

Із-за Слуцка, із-за Клецка
Едзе дружба маладзецка,
Ад княжаці із-пад Мінска
Ваяваці места Пінска.
Места Пінска ваяваці,

Ад ляхаў абараняці.
Хоць прышлі — не далі рады.
Пагінулі ўсе ад здрады,
А я пайду ў пост вялікі
Да Турава, да ўладыкі,
Штоб малебен адслужылі,
Да й пакаюсь за грахі.
Дзень і ноч буду маліці,
Дзень і ноч буду прасіці,
Штобы згінулі ляхі.

### Ой, у горадзе Магілеве дымам пацягнула...

Ой, у горадзе Магілеве дымам пацягнула,
Як то войска Запарожска з гармат да раўнула.
Ой, у горадзе Магілеве да сталася пуста,
Як павеялі казакі з самапалаў густа.
Ой, у горадзе Магілеве арлы да гадзюкі,
Ляцкім целам згадуюцца, ляцку дзелу радуюцца.
Ой, у горадзе Магілеве што пні да калоды...
Прылучылася, бач, ліха ляцкай пародзе.
Не такое яшчэ б ліха, як тая пазора,
Што ходзіць па белу свету з двора да да двора.
Не так тая пазора, як казакам парада...
Што краўчыну шануючы, ляхам далась зрада.
Далась ляхам зрада із самага рана,
Ад гецьмана Налівайка, шаноўнага пана.

### Хранцуз бераг заступіў...

Хранцуз бераг заступіў
Астаёмся ні пры чым.
За граніцаю стаялі,
Мы ні'б чым ні гаравалі,
Толькі думалі адзецца,
Прывубрацца харашо.
Не паспелі прывубрацца,
У барабаны сталі біць,
Білі, білі ў барабаны,
Мы паходамі пашлі.
Прыхадзілі к Вішні-рэчцы
Пераходу не нашлі,
Не паспелі перайсці,
Выступіў з-пад гор туман:

Арцілерыя грыміць,
Слоўна туча грозная,
Як ударылі карцеччу,
Роўна з неба сіні град.
Як ударылі,— народу,
Роўна ляда цёмны лес,
Міжда бітага народу
Чалавеку негдзе стаць.
Са таго та са народу
З руды рэчка працякла,
А на той жа на рачушцы
Белы лебедзі плывуць,
А па крутым беражочку
Родны матушкі ідуць.

**Каля рэчачкі Дняпра...**

Каля рэчачкі Дняпра
Там хадзіла удава,
Там хадзіла удава
Да й забачыла яна
Да й на явары арла,
Да й на явары арла.
— Ох ты, ворлю мой, ворлю,
Да ты, чорна варона,
Ты высока лятаеш
І далёка відаеш.
Ці ня відзеў ты, орлю,
Майго мілага дружка?
Ох, мой-та то міленькі,
Ён із туркам ваюе,
Ён із туркам ваюе
Па каленічкі ў крыве
Ды й па пашачкі ў трупе,
А на нём рубашоначка
Ўся ўскіпела ў крыве.
Ох, ты, ворлю мой, ворлю,
Ох, ты, чорна варона,
Ты высока лятаеш
І далёка відаеш.
Прынясі-ка ты, ворлю,
Мне рубашачку ад яго.
Выпяру я рубашачку
Сваімі гаручымі слязамі,

Высушу я рубашачку
Сваёю сухатою,
Перашлю я рубашачку
Сваёю красатою.

**Спомнім, братцы, пра былое...**

Спомнім, братцы, пра былое,
Як мы ў Турцыі былі,
Троя сутак прастаялі,
Дажыдалі мы вайны.
Грыміць слава трубой,
Мы дралісь, турак, з табой,
Па гарам тваім Балканскім
Раздалась слава аб нас.
Утрам рана на зарэ
Ехаў турак па гарэ.
Бліз дзярэўні пад'язджаў,
Нас, армейцаў, не відаў:
Коні серыя ліхія
Беглі, беглі, усталісь,
Там і туркі праклятыя
Усе валяліся ў крыві.
Грыміць слава трубой,
Мы дралісь, турак, з табой
Па гарам тваім Балканскім
Раздаёцца слава аб нас.

# ПАЗААБРАДАВЫЯ ПЕСНІ

Пазаабрадавыя песні, як відаць з самой назвы,— гэта песні, якія выконваюцца незалежна ад абраду ці календару, у любы час і ў розных канкрэтных жыццёвых абставінах. У народзе пра гэтыя песні гавораць, што яны спяваюцца «абы калі», «калі давядзецца», «калі надумаешся», «хоць дзе», «дзе можна» і інш. Спяваюць іх у час адпачынку і на рабоце, дома і ў полі, «на міру» і самнасам. Песні гэтыя не звязаны ні з гульнямі, ні з дзеяннямі.

Мелодыя ў пазаабрадавай песні замацавана непасрэдна за адным тэкстам (рэдка адзін тэкст выконваецца на некалькі мелодый), тады як у каляндарна-абрадавай паэзіі на адзін і той жа напеў (асабліва ў вясельнай песнятворчасці) спяваецца многа тэкстаў.

Пазаабрадавыя песні ў адрозненне ад каляндарна-абрадавых характарызуюцца большай актыўнасцю, што дало ім магчымасць шырока адлюстраваць самыя розныя бакі побыту народа.

Пазаабрадавыя песні часта называюць проста лірычнымі, бо лірычны пачатак (а ён уласцівы таксама каляндарна-земляробчым і сямейна-абрадавым песням) у пазаабрадавых з'яўляецца дамінуючым. Гэта песні пра асабістыя пачуцці і перажыванні чалавека, пра яго адносіны да акаляючай рэчаіснасці.

Сіла ўздзеяння пазаабрадавай лірычнай песні ў тым, што яна перадае пачуцці і перажыванні, сугучныя, блізкія, зразумелыя многім людзям, вылучаецца глыбінёй, багаццем і разнастайнасцю чалавечых эмоцый. Тут радасць і гора, любоў і нянавісць, весялосць і смутак чалавека. У гэтых песнях выяўляюцца лепшыя рысы нацыянальнага характару беларусаў: смеласць, адвага, праўдзівасць, працавітасць, гасціннасць, гуманізм, чуласць, сціпласць, імкненне да свабоды і ненавісць да прыгнятальнікаў. У іх знайшла адлюстраванне народная мараль, светапогляд працоўных. Пазаабрадавая песенная лірыка дае шырокую карціну жыцця народа, яго сямейна-бы-

тавых і сацыяльна-грамадскіх адносін, таму невыпадкова яе называюць энцыклапедыяй жыцця народа.

Цяжкае мінулае, невыносныя ўмовы жыцця нарадзілі нямала песень, поўных горычы, болю і скаргі. Гэта — песні-жальбы, у якіх адлюстравана горкая доля працоўнага чалавека. Але ёсць і іншыя матывы ў беларускай народнай пазаабрадавай лірыцы. Многа твораў прасякнута рашучым пратэстам супраць прыгнёту, гвалту, бяспраўя. Народ праклінае сваіх крыўдзіцеляў, кліча на барацьбу, верыць у шчаслівую будучыню.

Больш за ўсё ў пазаабрадавай лірычнай песні гаворыцца пра жанчыну, пра яе перажыванні, каханне, долю. Тлумачыцца гэта тым, што стваральнікам і выканаўцам беларускай пазаабрадавай лірыкі была ў асноўным жанчына, і песня — гэта споведзь жанчыны, мастацкая біяграфія, расказаная шчыра, непадробна, з хваляваннем.

Пазаабрадавая лірычная песня захапляе нас высокай мастацкасцю, здзіўляе паэтычнай вобразнасцю і прыгажосцю мелодыі. Ні ў адным фальклорным жанры так шырока і магутна не вылілася душа народа, як у песні. Таму яе і называюць душой народа. Талент народа — паэта і кампазітара тут паўстае ва ўвесь рост.

Адной з нявырашаных праблем у даследаванні пазаабрадавай лірыкі з'яўляецца пытанне класіфікацыі. Пры класіфікацыі песні можна ўлічваць розныя аспекты: і жанравы, і музычны, і тэматычны, і функцыянальны. Пазаабрадавыя песні падзяляюцца на антыпрыгонніцкія, рэкруцкія, салдацкія, казацкія, бурлацкія, чумацкія, сямейна-бытавыя, любоўныя, жартоўныя, песні-балады, песні рабочых і песні рэвалюцыйнага змагання. Да пазаабрадавай паэзіі адносяцца і песні гістарычныя, дзіцячыя калыханкі, гульнёвыя і танцавальныя. У кожным з гэтых песенных відаў вылучаюцца падвіды і тэматычныя групы.

Беларуская народная песня жывіла і жывіць прафесійную нацыянальную музыку, ёю захапляліся і звярталіся да яе ў сваёй творчасці вялікія рускія, украінскія і польскія кампазітары. Народная песня магутна ўплывае наогул на прафесійную паэзію, на культуру ў цэлым.

**Літаратура**

*Гісторыя* беларускай савецкай музыкі. (Дапаможнік для кансерваторыі). Аўт.: Глушчанка Г. С., Мухарынская Л. С., Нісневіч С. Г. Мінск, 1971, с. 11—35.

*Гілевіч Н. С.* Наша родная песня. Мінск, 1968, с. 123—182.

*Гілевіч Н. С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мінск, 1975.

*Можейко З. Я.* Песенная культура белорусского Полесья. Мінск, 1971, с. 90—106.

*Песні* беларускага народа, т. 1. Пад агульнай рэдакцыяй Нікольскага М. М. і Грынблата М. Я. Мінск, 1940.

*Шырма Р. Р.* Беларускія народныя песні, т. 1. Мінск, 1959; т. 2, 1960; т. 3, 1962.

*Анталогія* беларускай народнай песні. Укладанне і каментарый Г. І. Цітовіча, Мінск, 1968.

*Лірычныя* песні. Укладанне і рэдакцыя Н. С. Гілевіча. Мінск, 1976.

# АНТЫПРЫГОННІЦКІЯ ПЕСНІ

## Ах ты сонца-сонейка...

— Ах ты сонца-сонейка,
Я на цябе віну маю,
Віну маю вялікую:
Што ты раненька ўсходзіш,
Што ты позненька заходзіш.

— Ах ты дзеўка-дзеванька,
Не вінуй жа ты мяне,
Вінуй жа свайго пана:
Хоць я раненька ўзыйду,
Цябе на ніўцы знайду,
Хоць і позненька зайду,
Цябе на ніўцы пакіну.

## Не плач, маё дзіцятка...

— Не плач, маё дзіцятка,
Не плач, маё роднае.
Вунь дзе войт ідзе,
На татку, на мамку
Ён бізун нясе.
У тым бізуне
Скураты ўвіты,
На тым бізуне
Слёзкі паліты.
Тыя слёзкі крывавыя
З сэрца раненага...
Схавайся ты, дзетка,
На божу пасцельку.
Няхай твае вочкі
Заплюснуць навекі.
Не бачыў бы ты гора,
Гора мужыкова,
Не ўзнаеш ты долі,
Kроўкай палітое...

## А ў бары зязюлька кукуе...

А ў бары зязюлька кукуе,
Мой сыночак на полі начуе.

Сыру зямельку ён арэ,
На худыя шчочкі слёзы лье.

А заўтра да сонца рана
Трэба ехаць араць на пана.

Ах мая ты галованька бедная,
Ах маё ты гаранька горкае!

Што ж мне заўтра раненька ды зварыць,
Чым жа мне сынка свайго накарміць?

Накармлю сыночка лебядою,
Пасалю я лебяду сваёю слязою.

— Еш, мой даражэнькі, ды спяшы,
А то прыганяты ўжо бяжыць,

Каб нашаму пану трасца ў бок,
Як ён цябе сушыць, мой сынок.

### Добры наш пан, добры наш пан...

Добры наш пан, добры наш пан,
Добры да работы:
Ой, як зойме з панядзелку,—
Рабі да суботы.
А ў нядзельку раненька
Усе званы звоняць,
А атаман з дзесятнікам
Насіць снапы гоняць.
Ой, насілі, панасілі,—
Селі спачываці,
А глянуць назад сабе,
Ажно сам пан скача
Да каго б'е, каго лае,
Каго так пытае:
— Ой, чаго вы, хлопцы, селі,
Чаму снапоў вы не насілі?
— Ой, тым жа мы не насілі,
Што ўжо ніўка мокра.

### У там той вёсцы вецер вее...

У там той вёсцы вецер вее,
А ў той вёсцы ціха,

У нашай вёсцы дабра няма,
А ў суседняй ліха.

У нашых войтаў, аканомаў
Ядвабныя хусткі,
А гдзе былі гаспадары,
То ўсе хаты пусткі.

У нядзелю ранюсенька
У два званы звоняць,
А нас войты, аканомы
На паншчыну гоняць.

Як за старым было панам
Лёгка на работу:
А ўвесь тыдзень сядзі дома,
Шарварка ў суботу.

Цяпер за маладым панам
Цяжка на работу:
Увесь тыдзень на паншчыне,
Шарварка ў суботу.

**Ой, со дома, пане брацe...**

Ой, со дома, пане брацe,
Со дома, со дома.
Няма хлеба, пане брацe,
Ні ў полі, ні дома!

Была ж у мяне паляначка
Зелена, зелена,
Да пажалі ўражжы ляхі
Без мяне, без мяне.

Як пайшоў я, пане брацe,
К пану па зарплату;
А ён мяне выбіў, выбіў,
Да й выгнаў з хаты.

Цяпер сталі ўражжы ляхі
Шчэ горш на работу,
Увесь тыжджань на паншчыне,
Шарваркі ў суботу.

Ой, ждом жа мы нядзелечкі,
Як самога бога,

Да штоб наша аддыхала
Малая нябога.

Ой, у нядзелю параненьку
Ва ўсе званы звоняць.
Асаул жа з казакамі
На паншчыну гоняць.



*І. Рэпін.* Беларус

Мужчын у гумно малаціці,
А баб валоў пасці,
Малых дзяцей да цюцюну
У папушы класці.

Бадай жа вам, ўражжы ляхі,
Важка ў свеце жыці,
Як вы нашы памучылі
Маленькія дзеці.

## Бадай пану ў дварэ страшна...

Бадай пану ў дварэ страшна,
Як нам ў полі сонца зайшла.
Сонца зайшла — мы шчэ жнемо,
Пры месяцы снапы носімо,
Пры зораньках копы кладземо,
А паўночы дадому ідземо,
На світанні вячэраемо,
У дзень белы знову йдземо.
Бадай пана не схавалі,
Каб сабакі разарвалі;
Пахавалі пры даліне,
Каб па ёму воўкі вылі.
Бадай пана громы ўбілі,
Як мы ручкі патамілі.

## Ой, закурэла, ой, ды задымела...

Ой, закурэла, ой, ды задымела
Ды сырымі дрывамі.
Ой, няма як выйсці ды на свет белы
Нам за варагамі.

Сонейка ўзыйдзе, сонейка зайдзе
Ды за лесам дубовым,
А ты сееш не прысядзеш
На полі скарбовым.

Ой, вяльможныя спаць палягуць,
А ты йдзі араці.
І ў нядзелю маеш дзела,
Некалі згуляці.

Сабе ж сееш жыта жменю,
Ячменю другую;
Спадзявайся панскай ласкі,
Пан табе ўслугуе.

Зарадзіла ў пана жыта,
Павілося ў трубы,—
Толькі ты ці будзеш сыты
На сваім атрубе?

Накалоціш, намалоціш
Возам не павезці,
А прыйдзецца за каляды,
Няма чаго есці.

Зноў у хаце закурыцца
Асінай-дрывамі,
Годзе, брацца, трэба біцца
За зямлю з панамі.

### Ой, ты, дуб-дубіна...

Ой, ты,дуб-дубіна,
Сенажаць куміна,
На адным берагу
Сем вазоў мурагу.

Трэба сена касіць,
Пану копы вазіць,
Сенакос убіраць,
Жыта-хлеб дажынаць.

Трэба дзень работаць,
Да й начы пакідаць,
Усё на паншчыну,
На дарэмшчыну.

Толькі знай — рабатай,
Мазалі нажывай,
На работах цяжкіх,
Да ўсё гаспадарскіх.

Пойдзе войт з бічуком,
За ім пан з бізуном,
Аканом за скарбам,
Паня за падаркам.

Не баюся пана,
Войта-аканома,—
Шэсць дзён на прыгоне,
А ў нядзельку дома.

На загады пані,
Пані гаспадыні,
Аднясу падаркі —
Тонкай кужаліны...

### Прывыкайце, чорны вочы...

Прывыкайце, чорны вочы,
Адны начаваці:
Няма майго міленькага,
Не з кім размаўляці.

Няма майго міленькага,
Няма гаспадара,—
Каму бы я пасцелячку
Пухову заслала.

Даўно свайго міленькага
У паход выпраўляла,—
З тых пор свае чорны вочы
Слязьмі выцірала.

Пасляпіла свае вочы
Горкімі слязамі,
Няма жыцця, няма рады
Усё за варагамі.

Паны дзяруць, паны скубуць,
А багач за імі,—
Пасьледнія манатачкі
Ужо мы пазнасілі.

Выхадзіла на дарогу,
Выхадзіла ў поле,
Нідзе следу не відала
Тут свайго мілога.

— Навярніся, мой міленькі,
Да з таварышамі,—
Калатніце міраедаў,
Каб яны не ўсталі.

**Каліна-маліна...**

Каліна-маліна
У лузе стаяла,
У лузе стаяла,*
Стоючы завяла.

Каліна-маліна,
Што не зелянееш?
Ці ветру баішся,
Ці луга жалееш?

Дзяўчына-рыбчына,
Чаго смутна ходзіш?
Ці свет у няволі,
Ці горкая доля?

Мне свет не ў няволі,
Ні горкая доля,—
Не дай жа мне, божа,
Заслужнага хлеба.

Бо хлеб той заслужны,
Вельмі ён патужны:
Як я стану кроіць,
Пані мне вымовіць.

Як я стану кроіць,
Пані мне вымовіць,
Як я яго ўкушу,
Заплакаці мушу.

**Ты запей, запей, жавароначак...**

Ты запей, запей, жавароначак,
Падай галасок за цёмны лясок.

Падай галасок за цёмны лясок,
За цёмны лясок, у каменны астрог.

Усе людзі жывуць, як цвяты цвітуць,
Мая галава вяне, як трава.

Айцец з маткаю атракаюцца,
А сястра з мужам насмяхаюцца.

Прадай ты, жана, ды свайго каня,
Выкуп ты свайго мужа з астрога.

Прадала жана ды свайго каня,
Не выкупіла мужа з астрога.

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

## РЭКРУЦКІЯ ПЕСНІ

### Зашумела дубровачка зялёная...

Зашумела дубровачка зялёная,
Заплакала малодачка маладая.

— Не шум, не шум, дубровачка зялёная,
Не плач, не плач, малодачка маладая!

— О як жа мне, маладзенькай, ды не плакаць —
Наехалі казачэнькі рэкрутаў браці.

Калоцяць у барабаны, песенькі пяюць,
Малодзенькіх рэкрутаў набіраюць.

Каторыя ахвотнічкі, тыя самі ідуць,
Каторыя нявольнічкі, тых сілай вядуць.

Малойчыкі весяляцца, п'юць, скачуць,
Толькі адны жанатыя сільна плачуць:

— Застаюцца нашы жоны ўдавамі,
Застаюцца нашы дзеці сіротамі.

— Забылася я ў мілага запытаць,
Ці пазволіць мой міленькі мне пагуляць.

— Ой, гуляй ты, мая міла, як гуляла,
Наймай сабе скрыпкі, дудкі, як наймала.

Ды не гуляй, мая міла, з маладымі,
Ды гуляй жа, мая міла, са старымі.

Бо старыя, мая міла, раду радзяць,
Маладыя ж, мая міла, з свету збавяць.

### Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага...

Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага,
З-пад явара з-пад зялёнага

Вылятала хіжа пташачка,
Вынасіла гасударскі прыказ.

Чутно-відно, будуць набор набіраць,
Каторага нам сыночка аддаць:

Ці старшага, селядоршага,
Ці самага наймалодшага?

У старшага ды дзяцей чарада,
У селядоршага жана малада.

У наймалодшага нікога няма —
Ні дзяцей ды ні жаны маладой.

Старшы братка адкупляецца,
Селядоршы адмаўляецца,

Наймалодшы прыбіраецца,
З айцом, з мамкаю прашчаецца.

З айцом, з мамкаю прашчаецца,
А з сястрыцай не расстанецца:

— Прашчай, прашчай, айцец, маманька
І сястрыца маладзенькая.

— Пастой, брацец, я кудзёркі расчашу.
— Ой, расчэша вецер буйненькі.

У чыстым полі за гарматамі,
Варанога каня дзержачы,

Варанога каня дзержачы,
Залатое сядло носячы.

### З-пад зялёнага дуба...

З-пад зялёнага дуба
Загарэлася гара.

Ох, га-га-га-га,
Загарэлася гара!

А з-пад тае горушкі
Вышла тры маёрушкі.

Як ішлі, так ішлі
Гасудара не знайшлі,

Сталі жалабы пісаць,
Па губернях рассылаць.

Па губернях рассылаць,
Каго ў салдаты аддаць.

Абабралі старыка,
Старык не гадзіцца.

Абабралі багача,
Багач выплаціцца.

Абабралі малайца,
Што без маткі, без айца...

Ой, укінулі на вазок,
Ды й павезлі ў гарадок.

Вязуць яго праз сяло,
Стала людзям весяло.

Вязуць яго да двара,
Забалела галава.

Вязуць яго да прыёму,
А ён думаў, што дадому.

Пасадзілі на столачку,
Абгалілі галовачку.

Паставілі ў куточку:
Скідай майткі і сарочку.

Далі шаблю і палаш:
Цяпер, братцы, я не ваш.

Далі шаблю і муніц'ю:
Ідзі, браце, за граніцу.

**Цёпла восень і з дажджом...**

Цёпла восень і з дажджом,
Мы ў Расеюшку пайдзём.

Мы набяром малайцоў,
Ад матушак, ад атцоў,

Ад жоначак маладых,
Ад детушак маленькіх.

Як жанатых вязуць —
За імі жоначкі ідуць.

За імі жоначкі ідуць
І ў тры руч'і слёзы льюць.

Як халастых вязуць —
За імі дзевачкі ідуць.

За імі дзевачкі ідуць,
Слаўну песеньку пяюць.

— Ох, мае вы, дзеўкі, дзеўкі,
Павярніцеся назад.

Цяпер жа нам не да вас,
Разлучаюць нас ад вас.

Ох, пайдзем мы на сражэнне,
Станем ў праваму крыле.

Станем ў праваму крыле,
На турэцкай на зямле.

А турэцкая зямля —
Многа слёзак праліла.

**У канцы садзіку зялёнага...**

У канцы садзіку зялёнага,
Зялёнага ўсё й вішнёвага.

Пралягала там дарожанька,
Дарожанька запушчоная.

Шлях-дарожанька не торная,
Не торная, не праезжая.

Уся калодамі завалена,
Калодамі ўсё рэкруцкімі.

Той доражанькай рэкрут вядуць,
З калодамі да замкнёнымі.

А за імі ўслед — жанок табун,
Жанок табун да з дзіцяткамі.

Стогнуць рэкруты з калодамі
Дубовымі закаваныя,

Плачуць гоманам дарожанькай
Рэкруцкаю праважатыя.

### Баравая ягадачка...

Баравая ягадачка
Вельмі саладкая,
Салдацкая горка служба,
Горка праклятая.

Каторыя халастыя,
То п'юць і гуляюць,
Каторыя жанатыя,
Плачуць і рыдаюць:

— Тут мы, братцы, тут мы, братцы,
Тут мы ўсе самыя,
Нашы жоны-рэкрутачкі
Дома, маладыя.

Каторая добра жона,
Мужыка праводзіць,
У чыстым полі пад крушынай
Стоячы гаворыць:

— Бадай жа ты, крушынанька,
Болей не вырасла,
Як ты майго міленькага
У чужы край занесла.

Бадай жа ты, крушынанька,
Болей не ўрадзіла,
Як ты майго міленькага
Навек разлучыла.

## САЛДАЦКІЯ І КАЗАЦКІЯ ПЕСНІ

### А ў нядзельку рана стала рассвітаці...

А ў нядзельку рана стала рассвітаці,
Прыляцела зязюлечка да й стала каваці.

Прышла родна маці сына ратаваці,
Сына ратаваці і з прыёму вызваляці:

— Ой, наце вам, паны, каня і сядзельца,
Ой, выпусціце майго сына, баліць маё сэрца.

Ой, наце вам, паны, каня варанога,
Ой, выпусціце майго сына з прыёму дадому.

— Не хочам мы браці каня і сядзельца,
Не выпусцім твайго сына, няхай баліць сэрца.

**Цёмна ночка да нявідная...**

Цёмна ночка да нявідная,
Дарожанька да не трапная,
Каменем да пабітая,
Слёзанькамі да палітая.
Палівала да старая матка,
Свайго сына да гадуючы,
Да войска выпраўляючы.
За ім ідзе дзве сястроначкі,
За ім ідзе дзве жалобначкі:
— Ой, вярніся ты, наш родны браток,
Пакажыма дзве дарожанькі ў садок,
Вымыема да галаваньку,
Расчашыма жоўты косанькі.
— Не вярнусь, дзве сястроначкі,
Не вярнусь, дзве жалобначкі,
Вымыюць мяне дробны дожджычкі,
Расчэшуць мяне буйныя ветрыкі.

**Гэй, зашумела зялёна дуброва, шчыры бор...**

Гэй, зашумела зялёна дуброва, шчыры бор,
Эй, бяруць, бяруць мяне, маладзенькага, ў набор.

Эй, бяруць, бяруць мяне, маладзенькага, ў набор,
Эй, заплакала ўся радзіначка па ём, эх, па ём.

Эх, мамка плача, гасцінчыкі печучы,
Эх, татка плача, сыну грошы лічучы.

Эх, татка плача, сыну грошы лічучы,
Эх, братка плача, каня з поля ведучы.

Эх, братка плача, каня з поля ведучы,
Эх, другі плача, павозачку строячы.

Эх, другі плача, павозачку строячы,
Эх, сёстра плача, гасцінчыкі пекучы.

Эх, сёстра плача, гасцінчыкі пекучы,
Эх, жонка плача, малютачку дзержучы.

Эх, жонка плача, малютачку дзержучы:
— Эх, куды, мілы, ты ад'язджаеш?

Эх, куды, мілы, ты ад'язджаеш?
Эх, на каго малютку пакідаеш?

Эх, на каго малютку пакідаеш?
— Эх, няма, няма ціхаму Дунаю канца,

Эх, няма, няма ціхаму Дунаю канца,
Эх, бяруць, бяруць мяне ў салдаты, малайца,

Эх, бяруць, бяруць мяне ў салдаты, малайца,
Эх, няма, няма гэтаму малютку айца.

### Як я молада была...

Як я молада была,*
Дык я рана ўставала.

Я каўнер вышывала
Свайму большаму брату.

Па дарогах хадзіці,
Гасудару служыці.

У каўнярочку вышыла
А я жаркае сонца.

У рукавочку вышыла
А я ясён месячык.

У падалочку вышыла
А я дробныя звёзды.

Ад сонейка, браточак,
Табе цёпленька будзіць.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Ад месячка, браточак,
Табе відненька будзіць.

Ад звёздачак, браточак,
Табе весела будзіць.

Па дарогах хадзіці,
Гасудару служыці.

**У нядзельку раненька...**

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька.
Татка коніка корміць,
Дужа жаласна плачэць.

Прыйшоў сынок, пытаець:
— Чаго, татка, так плачэш?
Ды нашто ж, каму рана,
Татка, коніка корміш?

— Табе, сыночку, табе.
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш,
Ах! адтуль не прыедзеш.

Панясеш ты галоўку
Ды ў чужу старонку,
Занясеш свае плечы
Пад турэцкія мечы.

— Не плач, татачка, пры мне:
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як не ўвідзіш ніколі.

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька.
Мамка есцікі варыць,
Дужа жаласна плачэць.

Прыйшоў сынок, пытаець:
— Чаго, мамка, так плачэш?
Дык нашто ж, каму рана,
Мамка, есцікі варыш?

— Табе, сыночку, табе.
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш,
Ах, адтуль не прыедзеш.

Панясеш ты галоўку
Ды ў чужу старонку,
Занясеш свае плечы
Пад турэцкія мечы.

— Не плач, мамачка, пры мне:
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як не ўвідзіш ніколі.

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька,
Сястра хустачкі рубіць,
Дужа жаласна плачэць.

Прыйшоў браток, пытаець:
— Чаго, сястрычка, плачэш?
Ды нашто ж, каму рана,
Сястра, хустачкі рубіш?

— Табе, брацітка, табе.
На вайну ты паедзеш,
На вайну ты паедзеш.
Ах, адтуль не прыедзеш.

Панясеш ты галоўку
Ды ў чужу старонку,
Занясеш свае плечы
Пад турэцкія мечы.

— Не плач, сястрычка, пры мне:
Наплачашся без мяне,
Наплачашся даволі,
Як не ўвідзіш ніколі.

### Ды на нашым гародзе...

Ды на нашым гародзе,
Гэй, гэй, ды на нашым гародзе

Ды стаяла бяроза,
Гэй, гэй, ды стаяла бяроза.

Яна тонка, высока,
Гэй, гэй, яна тонка, высока

І ў карэнні глыбока,
Гэй, гэй, і ў карэнні глыбока.

І на лісця шырока,
Гэй, гэй, і на лісця шырока,

І на сучча бахмата,
Гэй, гэй, і на сучча бахмата.

А на тэй жа бярозе,
Гэй, гэй, а на тэй жа бярозе

Дробны пташкі шчабечуць,
Гэй, гэй, дробны пташкі шчабечуць.

Шчыру праўдачку кажуць,
Гэй, гэй, шчыру праўдачку кажуць,

Што малойчыка звяжуць,
Гэй, гэй, што малойчыка звяжуць.

А ў нядзельку паранку,
Гэй, гэй, а ў нядзельку паранку

Загадалі ў хурманку,
Гэй, гэй, загадалі ў хурманку.

І коніка варанога,
Гэй, гэй, і коніка варанога,

Ізвозчыка маладога,
Гэй, гэй, ізвозчыка маладога.

А як селі, запелі,
Гэй, гэй, а як селі, запелі,

Бел малойчык заплакаў,
Гэй, гэй, бел малойчык заплакаў:

— Старана мая, старонка,
Гэй, гэй, старана мая, старонка,

Не магу цябе забыці,
Гэй, гэй, не магу цябе забыці.

Ні матулькі старэнькай,
Гэй, гэй, ні матулькі старэнькай,

Ні жаны маладзенькай,
Гэй, гэй, ні жаны маладзенькай,

А ні дзетак маленькіх,
Гэй, гэй, а ні дзетак маленькіх.

### Каліна-маліна...

— Каліна-маліна,
Што не расцвітаеш?
Малада дзяўчына,*
Эй, што сядзіш думаеш?

— Я сяджу думаю
І думаці буду,
Палюбіла Колю,
Эй, павек не забуду.

А ў нядзелю рана
Ясна сонца ўсходзіць,
Там, пэўна, Коля,
Эй, па казарме ходзіць.

Па казарме ходзіць,
У руках шаблю носіць.
У руках шаблю носіць,
Эй, камандзіра просіць:

— Камандзір ваенны,
Адпусці дадому,
Пакінуў дзяўчыну,
Эй, сам не знаю кому.

### Зазвінелі новы ключы...

Зазвінелі новы ключы,
У мора плывучы;
Заплакалі малойчыкі,
На вайну ідучы.

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Заплакалі маладыя,
А потым старыя:
Пакідаюць жонкі дома
І дзеці малыя.

Зляталіся чорны галкі
Ды ўсё поле ўкрылі,
Заплакалі малойчыкі.
Жалю нарабілі.

— Злятайцеся, чорны галкі,
Злятайцеся ўгору,
А вы, млоды малойчыкі,
Ступайце дадому.

— Рады былі б мы ступаці,
Туман наступае,
Рады былі б вярнуціся,
Нас цар не пускае.

**Ах ты, зорка мая...**

Ах ты, зорка мая,
Зара ясная,
Не парою ты, зара,
Занімаешся.

Не парою ты, зара,
Занімаешся,
Рана, рана ты, дзянёк,
Пачынаешся.

Ад'язджае мой мілы
У дарожаньку,
Панясе ён пад мячы
Ды галаваньку.

Астаюся малада
Удавіцаю,
Як асіна-дзераўцо
Над крыніцаю.

**Зялёная ды дуброванька...**

— Зялёная ды дуброванька,
Чаго шумна ды зашумела?

— А як жа мне ды не шумеці,
Каля мяне ўсе паходы йдуць.

Каля мяне ўсе паходы йдуць,
Усё маё ды карэннейка б'юць.

— Маладая ды ўдованька,
Чаго горка ды заплакала?

— Ой, як жа мне ды не плакаці,
Усе мужы дадому ідуць,

Усе мужы дадому ідуць,
А мой мілы ды ўбіт ляжыць.

А мой мілы ды ўбіт ляжыць,
У правай ручцы ды каня дзяржыць.

У левую ды расу бярэ,
Расу бярэ ды на сэрца лье:

Раса мая ды краплюшчая,
Душа мая ды жывушчая!

Тудою ішлі тры касцы,
Ой, тры касцы ды мае браткі.

Накажыце ды маёй жане,
Няхай яна ды мяне не жджэ,

Няхай яна ды мяне не жджэ,
А няхай яна замуж ідзе:

Калі добра — праклінаць будзе,
Калі ліха — успамінаць будзе.

**Шчука-рыба ў моры...**

Шчука-рыба ў моры
Гуляе даволі.
Ёсць у ўдовы адзін сын,
Да не даў бог долі.

— Ой, прадай, матка,
Каня майго варанога,
Ой, ажані мяне, матка,
Сына маладога.

— Ой, не вяляць, сынку,
Каня прадаваці,
А ўжэ цябе запісалі
У салдаты аддаці.

Маці гадавала,
Слёзы разлівала,

Ляцеў арол з чужых старон
Да й таго пытала:

— Ой, ты сівы орле,
Высока лятаеш,
Ой, ці часта майго сына
А ў войску відаеш.

— Ой, ці то твой сын
У войску спачывае,
Яму сівы саболенька
Галоўку ціскае.

Не дай, божа, смерці,
У салдатах умерці,
Дзе некаму даглядаці
Салдацкае смерці.

Ой, воран лятае,
Смерці даглядае,
Бела цела абірае,
Косці пакідае.

**Ой ты, поле маё...**

Ой ты, поле маё,
Не радзімае,
Да нішто ў тым полі
Ніколі не расце.

Толькі вырас адзін
Куст ракітавы,
Без вады, без расы
Ён пакінуты.

Там ляжыць пад кустом
Цела белае,
Цела белае,
То салдацкае.

Маладзенькі салдат
Увесь паранены,
Перад смерцю ляжыць,
Як пласт беленькі.

А над ім ў галавах
Стаіць конічак,
Галавою панік
Над салдацікам.

Ой ты, конь вараны,
Друг-таварыш мой,
Не пакінуў мяне
У чужой старане.

Ой, бяжы ты, мой конь,
На старонучку,
Дзе жывуць ацец-маць,
Да ўсе родныя.

Накажы ты, мой конь,
Атцу-мацеры,
Да славечка скажы
Маладой жане,

Што я ранен ў баю
Стрэлай каленай,
Паміраю ў сцяпу
Пад ракітаю.

Памяніце мяне
Добрым словечкам,
Падгадуйце маіх
Дробных дзетачак.

**Памёр, памёр салдацiку...**

Памёр, памёр салдацiку
У нядзелечку рана,
Палажылі салдацiка
У святліцы на лаве.

Ой вы, добрыя малойцы,
Учыніце волю:
Вы пусціце сівы коні
За целам, за мною.

Няхай заржуць сівы коні,
Ідучы за мною,
Няхай чуюць ацец-маці
Са ўсёю раднёю.

Як пачула матуленька,—
Залілась слязамі,
Узгаласіла родна маці
Горкімі славамі:

— Каб я была зязюленькай
Да ўмела лятаці,
Паляцела б я па свету
Сыночка шукаці.

Прыляцела б на магілу,
Да сказала б «ку-ку»,
Падай, падай, мой сыночак,
Мне правую руку...

— Ой, рад бы я, матуленька,
Абедзве падаці,
Сырой зямлёй засыпалі,
Не магу падняці.

Памяніце добрым словам
У магіле салдата,
Накажыце жане маёй
Дзяцей гадаваці.

### Прыляцелі гусі...

Прыляцелі гусі
З далёкага краю,
Узмуцілі ваду
На ціхім Дунаю.

— Ён жа не запіўся,
Ён не загуляўся,
З гора ды печалі
У чужы край забраўся.



Лірнік

— Пачакайце, гусі,
Я ў вас запытаю,
Ці не з таго краю,
Скуль мужа маю?

Ці ён там запіўся,
Ці ён загуляўся,
Ці з гора-печалі
У чужы край забраўся?

Ой, у полі жыта
Золатам абліта,
Пад белай бярозай
Ляжыць казак ўбіты.

Ой, ён жа ўбіты,
На смерць не забіты,
Чырвонай кітайкай
Вочанькі накрыты.

Ды прышла дзяўчына,
Ды загаласіла,
А прышла другая,
Зусім не такая.

Адкрыла кітайку
Ды пацалавала,
— Уставай, казача,
Устань, маладзенькі.

### За гарою трава шуміць...

За гарою трава шуміць,
За другою казак ляжыць,
Ляжыць казак за гарою,
Пад купіну галавою,
Накрыў вочкі сукніною,
Казацкаю заслугою.
За гарою воран крача,
Над казакам сіў конь плача.
Не плач, коню, нада мною,
Сам ты бачыш шчырасць мою;
Бяжы, коню, беражкамі,
Салдацкімі дарожкамі,
Ды прыбяжы ў маю браму,
Стукні, бразні падковамі,
А там выйдзе мая маці,
Будзе цябе распытваці:
Ой, конік мой вараненькі,
Дзе мой сынок маладзенькі,
Ці ты забыў, ці ты згубіў?
Я не забыў, я не згубіў;
Ен на месце ажаніўся,
Узяў жонку варшавянку,—
У чыстым полі жоўту ямку;
Узяў жонку на рыначку,—
У чыстым полі магілачку.

### Ой, у полі пад вішанькаю...

Ой, у полі пад вішанькаю
Там казачок забіты ляжыць,
Над ім конік вараны стаіць,
Капыцейкам землю сячэ,
Свайму пану ваду дастае.
— Табе, коню, вады не дастаць,
А мне, маладому, ад зямлі не ўстаць.
Бяжы, коню, да новага двара,

Выйдзе да цябе старая жана,
Старая жана, то матка мая.
Будзе ў цябе сынка пытаці.
Не кажы, коню, што забіт ляжу,
Да скажы, коню, што ажаніўся.
— Што ж ў яго коню, за сваты былі?
— Былі ў яго сваты — зялёны дубы.
— Што ж у яго, коню, за музыка быў?
— Быў у яго музыка — зялёны явар.
— Што ж у яго, коню, за сватанька была?
— Была ў яго сватанька — чырвона каліна.
— Што ж у яго, коню, за дружкі былі?
— Былі ў яго дружкі — белы бярозы.
— Што ж у яго, коню, за млода была?
— Была ў яго млода — арабіначка,
У чыстым полі да магілачка.

## Дзе крыніца глыбокая...

Дзе крыніца глыбокая,
Там вадзіца сцюдзёная
І травіца зялёная.

На травіцы казак убіт,
А ў галоўцы конік стаіць,
А ў галоўцы конік стаіць.

Конь з казаком размаўляе:
— Ці ты на мне сам паязджай,
Ці ты мяне ў поле пушчай!

— Бяжы, косю, дарогаю,
Бяжы, косю, шырокаю,
Бяжы, косю, шырокаю!

Як прыбяжыш к вароцечкам,
Стукні-грукні капыцікам,
Стукні-грукні капыцікам!

Ой, там выйдзе стара жана,
Стара жана — мамка мая,
Стара жана — мамка мая.

Будзе цябе аўсом вітаць,
Будзе цябе сынка пытаць,
Будзе цябе сынка пытаць:

— Ой ты, косю сівусенькі,
Дзе мой сынок малюсенькі,
Дзе мой сынок малюсенькі?

Ці ты яго ў полі згубіў,
Ці ты яго ў вайне забіў,
Ці ты яго ў вайне забіў?

— Мамка мая старэнькая,
Скажу слоўца вярненькае,
Скажу слоўца вярненькае:

Ні я яго ў полі згубіў,
Ні я яго ў вайне забіў,
Ні я яго ў вайне забіў!

Ой, забілі цёмны ночы,
Дзяўчыніны чорны вочы,
Дзяўчыніны чорны вочы.

Мяне вяжа да бярозы,
А сам ідзе к белай ложы,
А сам ідзе к белай ложы.

Мяне вяжа да ляшчыны,
А сам ідзе да дзяўчыны,
А сам ідзе да дзяўчыны.

Мяне вяжа да сасонкі,
А сам ідзе да карчомкі,
А сам ідзе да карчомкі.

З карчмы ідзе — хіляецца,
Аж на мне поўсць мяняецца,
Аж на мне поўсць мяняецца!

— Каб це, косю, ваўкі з'елі,
Каб це, косю, разарвалі,
Як на сынка досыць жалю!

Каб ты, косю, утапіўся,
Як мой сынок не жаніўся,
Як мой сынок не жаніўся!

Каб це, косю, лясы ўбілі,
Каб це, косю сівусенькі,
Дзе ж мой сынок малюсенькі?

Мяне, мамка, лясы знаюць,
Як я бягу — шум сціхае,
Як я бягу — шум сціхае.

Мяне, мамка, рэкі знаюць,
Як я бягу — высыхаюць,
Як я бягу — высыхаюць.

Мяне, мамка, ваўкі знаюць,
Як я бягу — уцякаюць,
Як я бягу — уцякаюць!

**Цёмна ночка наступае...**

Цёмна ночка наступае,
Жаўнер коніка сядлае;

Асядлаўшы, уздыхае,
На ваёнку выязджае.

— Еду поле і другое,
На трэцяе уз'язджаю.

Верны конік паклыпае,
Сон галоўку абымае.

Пушчу каня на далінку,
А сам лягу на гадзінку.

Сплю гадзінку, сплю другую,
І трэцюю не буджуся.

Шчаслівая гадзінанька,
Скуль узялася дзяўчынанька:

— Уставай, жаўнер, досі спаці,
Твайго каня не ідаці.

Ідзе войска незмярное,
Незлічонае, страшное.

Возьмуць каня варанога,
Заб'юць цябе, маладога.

Каня возьмуць — другі будзе,
Цябе заб'юць — мне жаль будзе.

— Ці ты мяне, дзеўка, любіш,
Што мяне так рана будзіш?

— Каб я цябе не любіла,
То б я рана не будзіла.

## ЧУМАЦКІЯ, БУРЛАЦКІЯ І ПРЫМАЦКІЯ ПЕСНІ

**Чумак рана ўставае...**

Чумак рана ўставае,
Сваіх хлопцаў пабуджае:
— Уставайце, хлопцы, рана,
Уставайце, вазы мажце,

Новы ёрмы закладайце,
Сівых валоў запрагайце,
У Крым-горад выязджайце.
Чумак з двара выязджае,
Жану дома спакідае:
Заставайся, жана, дома,
Рубай дровы і лучыну,
Цярпі гора і кручыну;
Рубай дровы на парозе,
А лучыну на услоне.

**Валы мае палавыя...**

— Валы мае палавыя,
Чаго вы памарнелі?

— Ад таго мы памарнелі,
Што не пагожае сена елі.

Не гожу воду пілі
І сем раз у Крым схадзілі.

У Крым ішлі да рыкалі,
А з Крыма ішлі — цяжка вязлі.

Пад горачку да падганяе,
А з горачкі сам сядае.
Ох, ад таго памарнелі...

**Ты чумача, чумача...**

— Ты чумача, чумача,
Жыццё тваё лядача:
Ты не косіш, не арэш,
Чаго рана з Крыму йдзеш,
Усіх тварышаў вядзеш?
— Вяду, вяду да не ўсіх,
Толькі нету аднаго,
Братца майго родненькага,
Самага большанькага.
Ён застаўся ў Крыму:
Прабіла соль галаву;
Не соль прабіла — вясы,
Клаўшы соль на вазы.

**Дзе ж ты, бурлак, валачыўся...**

Дзе ж ты, бурлак, валачыўся,
Што й па пояс намачыўся,
Эй, эй, да што й па пояс намачыўся?..

— За таварам, за валамі.
— Брэшаш, бурлак, прышлі самі,
Эй, эй, да брэшаш, бурлак, прышлі самі.

Бурлак доўга не спрачаўся,
Скінуў світку ды паслаўся,
Эй, эй, да скінуў світку ды паслаўся.

Яшчэ бурлак не паслаўся,
Як хазяін ўжэ праспаўся,
Эй, эй, да як хазяін ўжэ праспаўся.

Яшчэ бурлак не лажыўся,
Як хазяін нарабіўся,
Эй, эй, як хазяін нарабіўся.

Устань бурлак, годзе спаці,
Пара сівы й валы гнаці,
Эй, эй, да пара сівы валы гнаці.

Бурлак валы выганяе,
Слязьмі сляды залівае,
Эй, эй, да слязьмі сляды залівае.

Слязьмі сляды залівае,
Айца з маткай праклінае,
Эй, эй, да айца з маткай праклінае:

— Нашто было так ражаці,
Шчасця-долі не даваці,
Эй, эй, да шчасця-долі не даваці?

**Да сядзіць пугач у лузе на каліне...**

Да сядзіць пугач у лузе на каліне,
Дзе совае пер'е ўецца.

Дзе совае пер'е ўецца...
Да косіць косар шоўкавую траўку,
Эй, гарачы пот івьецца.

Эй, гарачы пот ільецца...
Да сядзеў бурлак ў холадку пад дубам,
Да з касарыка смяецца.

Да з касарыка смяецца...
Ой, хоч смейся, ой-эй, хоч не смейся,
Не смех табе,— праўда й будзе.

Не смех табе,— праўда будзе...
Да прыдзе зіма, лютыя марозы,
Ай, у бурлака сена не будзе.

Ай, у бурлака сена не будзе...
Прышла зіма, лютыя марозы,
А бурлак ішчэ ў дарозе.

А бурлак ішчэ ў дарозе...
Прыехаў бурлак з вялікай дарогі,
Да нечым валоў гадаваці.

Нечым волаў гадаваці...
Да бярэ бурлак раменны налыгач,
Да ідзе сена набываць.

Ідзе сена набываць...
Да ідзе сялом, вуліцаю,
Аж налыгач валочыцца.

Аж налыгач валочыцца...
А касарык ў новых вароцех,
Эй, да з бурлака смяецца.

Эй, да з бурлака смяецца...
Хоць ты смейся, касарыку-дзядзьку,
А прадай хоць сена вязку.

**Ой, хто не служыў, братцы, у багатыра...**

Ой, хто не служыў, братцы, у багатыра,
Той і гора не знае.*

Ой, як я служыў, братцы, у багатыра,
Я ўсё горачка знаю.

* Кожны другі радок паўтараецца двойчы.

Ой, рана ўстану, ды позненька лягу,
Усё раблю й не гуляю.

Ой, запрагаю пару серых валаў
Еду полечка араці.

Ой, бяру з сабой бедну сірацїну
Ды валоў падганяці.

Ой, цоб-цобэ, вы серыя волы,
Ды й да самага абеду.

Ой, усе жоны абедаць прыносяць,
А хазяюшкі нету.

Ой, распрагаю пару серых валаў
Ды пушчу ў дубраву.

Ой, бяру з сабой бедну сірацїну
Ды іду дадому.

У варот стаіць стары старычышча,
Ды й Дуняшу гукае:

— Ой, ідзі, ідзі, Дуняшачка, сюды,
Вот ідзе парабчышча.

Ой, налій яму ўчарашняга баршчу,
Ён й не тое пахлешча.

## А нікому, а нікому...

А нікому, а нікому,
Як батраку маладому,
Эй! *

Батрак робя, рабатае,
Аж пот вочы залівае,
Эй!

Прышоў батрак на кватэру:
— Падай, хазяйка, вячэру,
Эй!

— А я ў печы не тапіла,
Вячэраці не варыла,
Эй!

Еж, батрачок, хоць галушкі,
Лажыся спаць без падушкі,
Эй!

Яшчэ батрак не разуўся,
А ўжо пан абачнуўся,
Эй!

Яшчэ батрак не лажыўся,
А ўжо пан станавіўся,
Эй!

— Уставай, батрак, падымайся,
Займай валы, выганяйся,
Эй!

* Кожная страфа паўтараецца двойчы.

Валы мае палавыя,
Лугі мае зеляныя,
Эй!

Ежце траву зялёную,
Піце ваду сцюдзёную,
Эй!

Маці мая радзімая,
Нашто мяне спарадзіла?
Эй!

Нашто мяне спарадзіла
І ў батракі налажыла?
Эй!

**Расцвілася чарэшанька...**

Расцвілася чарэшанька,
Ды ягад не мае.
А хто ў прымах не бывае,
Той гора не знае.

Бо я прымак, бо я прымак,
Бо я гора знаю:
Кулачонькі пад бачонькі,
Сам спаці лягаю.

Ідзе Дуня, ідзе Дуня,
Ідзе абуджаці:
— Уставай, уставай, прымачэнька,
Ідзі ў поле гараці.

Пашоў прымак, пашоў прымак
У поле гараці.
Ён забыўся, нешчаслівы,
Куска хлеба ўзяці.

Гараў прымак, гараў прымак,
Стаў ды паглядае:
— Усе жонкі абед нясуць,
А мая не дбае.

Нясе Дуня, нясе Дуня,
Нясе хлеб з вадою.
— Калі хочаш абедаці,
То еж хлеб з вадою.

Гараў прымак, гараў прымак,
Дагараў да дому.
Распрагае сівы коні,
Сам ідзе дадому.

Ідзе прымак, ідзе прымак,
На дудачку свішча.
— Хавай, маці, абед, сала,
Едзе прымачышча.

Ішоў прымак, ішоў прымак,
Зашоў на падворы,
А тут цешча прыказала:
— Рубай, прымак, дровы.

Рубаў дровы, рубаў дровы,
Разрубаў калоду.
Яму цешча прыказала:
— Ідзі, прымак, па воду.

Прынёс вады, прынёс вады,
Захацеў ён есці.
Яму цешча загадала:
— Нясі свінням есці.

— Бадай вашы свінні здохлі,
А цешча згарэла,
Як мне гэта прымацкая
Служба надаела.

Як зышлася кума з кумой,
Сталі гаварыці:
— І твой прымак, і мой прымак
Не хочуць рабіці.

І твой прымак, і мой прымак
Не хочуць рабіці,
А як жа нам разлічыцца,
Каб не заплаціці.

Стаяў прымак, стаяў прымак
У сенях пад дзвярыма,
Як учуў ён гэты словы,
Абліўся слязіма.

І ты прымак, і я прымак,
Нечага стыдзіцца.
Сабраліся ўсе прымакі
Ды пайшлі тапіцца.

Прыйшлі бліжэй да рэчачкі —
Мелкая вадзіца.
Ой, і доля прымацкая,
Недзе ўтапіцца.

Ах вы, хлопцы маладыя,
Не йдзіце ў прымы,
Жаніцеся ў сваёй хаце
На чвэрць дзесяціне.

## СЯМЕЙНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

### Піце, піце, госцейкі, піце...

Піце, піце, госцейкі, піце,
А на мёд не дзівіце.

Ой, нашы пчолачкі
Паляцелі за брод па мёд.

Прыляцяць жа з-за броду,
Прынясуць гасцям мёду.

Будзем чары наліваць,
Усіх гасцей частаваць

І віном, і гарэлачкай,
І мёдам салодзенькім.

### Ах вы, столікі мае...

Ах вы, столікі мае,
Вы, цясовыя мае,
Чаго жа вы стаіцё
Не засланы ў мяне?

Ой вы, кубачкі мае,
Пазлачоныя мае,
Чаго жа вы стаіцё
Не наліты ў мяне?

Ах вы, госцікі мае,
Ах вы, любыя мае,
Чаго жа вы сядзіцё
Не вясёлы ў мяне?

Ці мой хмелю не хмялён,
А ці хлеб мой не пушон?
Скажу хмелю падалліць,
Скажу хлеба падлажыць.

### На гарэ вярбіца...

На гарэ вярбіца,
Пад гарой карчомка.

А ў той жа карчомцы
Увесь мой род гуляе,

Увесь мой род гуляе,
Мяне ўспамінае:

— Знаць, наша сястрыца
Горку долю мае,

Горку долю мае,
З намі не гуляе.

А я к свайму роду —
Па шыечку ў воду.

Хоць я абмачуся,
Да роду даб'юся,

З родам насяджуся,
Гарэлкі нап'юся,

Гарэлкі нап'юся
Дый нагаваруся.

**Ой, за бор, за бор...**

Ой, за бор, за бор,
Сонца коціцца,
Мне да матанькі
У госці хочацца.

Да мужа звярнусь,
Часам здарыцца,
Папрашу яго,
А ён сварыцца.

За бор сонейка
Закацілася,

А я ў маманькі
Нагасцілася:

У канцы століка
Настаялася,
Горкіх слёзак я
Наўлівалася.

І за столікам
Насядзелася,
З палыном рэдзькі
Там наелася.

**Ды ўжо сонейка за лес коціцца...**

Ды ўжо сонейка за лес коціцца,
Мне да матанькі ў госці хочацца.

Дзе мяне мама спатыкаць будзе,
Чым мяне мама частаваць будзе?

Частуе мяне мёдам ды віном:
— Якаво ж табе за чужым сталом?

— Ці ела, мамка, рэдзьку з палыном?
Такаво ж і мне за чужым сталом.

Я ў канцы стала настаялася,
Лічаных кускоў наглыталася.

Цераз хату йду,— думу думаю,
Цераз сені йду,— слёзанькі лію.

Цераз сені йду,— слёзанькі лію,
Як на двор выйду,— свету не віджу.

**Ты каліна, ты, маліна...**

Ты, каліна, ты, маліна,*
Над вадою схілілася.

Над вадою схілілася,
Я молада журылася.



Ганчары. З фатаграфіі І. Сербава 1910 г.

Я молада журылася,
Што ад роду адбілася.

Што ад роду, ад радзімы,
Цяжка жыці на чужбіне.

Цяжка жыці, цяжка быці,
З чужым родам гаварыці.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Цяжка саду без зязюлі,
Цяжка дочцы без матулі.

Ой, пайду я гукаючы,
Сваёй долі шукаючы.

Адгукнулась мая доля
Каля сіненькага мора.

Адпушчу я сваю долю
Та й па сіняму па мору.

Плыві, доля, ты з вадою,
А я следам за табою.

**Чырвоная каліначка...**

Чырвоная каліначка,*
Чаго ў лузе схілілася?

Маладая дзяўчыначка,
Чаго яна журылася?

— Ой, таму я журылася,
Што ад роду адбілася.

Адбілася ад радочку,
Цяжка майму галасочку.

Ой, пайду я гукаючы,
Сваёй долі шукаючы:

«Адгукніся, мая доля,
На тым баку сіня мора.

Ды прыплыві к беражочку,
Ды к ліповаму кусточку».

Ой, вырвем мы па лісточку
Ды напішам па пісьмочку.

Каб радзіма не тужыла,
Ка мне ў госці прыхадзіла.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

18 Зак. 3328

## Стуку-груку...

Стуку-груку,
Стуку-груку на памосце,
Едзе к брату сястра ў госці.

Братавая,
Братавая хлеб саджае,
Братка сядзіць абедае.

— Прымай, жонка,
Прымай, жонка, хлеб і сала,
Едзе ў госці сястра мая.

Сястра гэта,
Сястра гэта як зачула,
Назад коні павярнула.

— Я ж не еду,
Я ж не еду піць, абедаць,
Толькі цябе праведаць.

Ёсць у мяне,
Ёсць у мяне хлеб у возе,
Пабедаю я ў дарозе.

Прыедзь, братка,
Прыедзь, братка, ка мне ў буду,
Я й гэтаму рада буду.

Хлеба-солі,
Хлеба-солі прыпазычу,
А ўсё ж табе дабра зычу.

## Што на свеце пачуваецца...

Што на свеце пачуваецца?
Брат сёстрамі не цураецца,
Папрасіў брат сёстраў у госцікі:
Багатую — у суботачку,
А бедную — у нядзелечку.
Багатая за сталом сядзіць,
А бедная — у канцы стала.
Багатая мёд, гарэлку п'е,
А бедная і чысту вадзіцу.

Багатая песенькі пяе,
А бедная слёзачкі ліе.
— Чаму, сястра, песень не пяеш?
Ці ты, сястра, ноты не маеш?
Ці ты, сястра, песень не ўмееш?
— А я, сястра, нотачку маю,
А я, сястра, песенькі ўмею:
З багатымі пяяць не смею!

### Ой, зелена, зелена...

Ой, зелена, зелена
Траўка на мяжы,
Затым яна зелена,
Што ідуць дажджы.

Ой, молада, молада
Жонка ў мужыка,
Затым яна молада,
Што доля така.

Ой, спіць у пярыначцы
Да белага дня,
Пакуль збудзіць свёкарка
Не сваё дзіця:

— Уставай, нявестачка,
Доўга так не спі,
Рыжыя каровачкі
У поле не пашлі.

Кужалёк непрадзены
Кудзелькай ляжыць,
А жытцо, пшанічанька
Не жата стаіць.

А мужык заступіцца:
— Татачка ты мой!
Не маеш ты волечкі
Над жонкай чужой.

Рыжанькіх каровачак
Я й сам напасу,
Белы кужалёчак
Спрасці прыкажу.

На жытцо, пшанічаньку
Жнеяк я найму,
А сваю міленькую
Я й сам пабуджу.

Уставай, міленькая,
Досыць табе спаць!
Вараныя конікі
Упрэжаны стаяць.

Садзіся, міленькая,
К жнейкам павязу,
Усіх іх, галубачка,
Табе пакажу.

Золатам, дукатамі
Будзем ім плаціць,
К сабе на дажыначкі
Будзем іх прасіць.

### Як пайду я ў каморачку...

Як пайду я ў каморачку
Ды прылажу галовачку.
Спаць хачу, спаць!
Спаць хачу, спаць!
Ідзе свёкар, гаворачы,
Каля маёй каморачкі:
— Спі, шэльма, спі,
Спі, не рабі!

І цыляткі не поены,
І кароўкі не доены,
Спі, шэльма, спі,
Спі, не рабі!

Як пайду я ў каморачку
Ды прылажу галовачку.
Спаць хачу, спаць!
Спаць хачу, спаць!

Ідзе мілы, гаворачы,
Каля маёй каморачкі:
— Спі, жонка, спі,
Спі, не рабі!

І цыляткі напоены,
І кароўкі падоены.
Спі, жонка, спі,
Спі, не рабі!

### Я ўчора ў піру была...

Я ўчора ў піру была,
П'яненька дамоў прышла,
Ой, ёй-ёй-ёй, божа мой,
П'яненька дамоў прышла.*

У вароты пастукала,
У ваконца паслухала.

Па хаце свёкар ходзіць,
У руках бізун носіць.

Ён у руках бізун носіць,
Залоўку набіць вяліць.

Мой мілы ўслед ходзіць,
Ён свайго татку просіць:

— Татанька раднюсенькі,
Не бі ты хмяльнюсеньку.

Бі жану цвярозую
Белаю бярозаю.

Бярозанька беленька,
А мне жонка міленька.

Бярозанька з веткамі,
Мая жонка з дзеткамі.
Ой ,ёй-ёй-ёй, божа мой,
Мая жонка з дзеткамі.

* Прыпеў «Ой, ёй-ёй-ёй, божа мой» паўтараецца з 2-м радком кожнай страфы.

## Бяда салаўю, бяда...

Бяда салаўю, бяда,*
Што халодная вясна:

Ні яму гнязда звіці,
Ні яму яйка знесці.

Гняздзечка завівае,
Яечка замярзае.

Бяда малайцу, бяда,
Што нялюба жана:

Ні яму з сабою браці,
Ні яму пакідаці.

У доме пакінуўшы,—
Матуля журлівая.

Матуля журлівая,
Жана бедурлівая.

Матуля журыць будзе,
Жана бедаваць будзе.

## Ой, запяю песню вясёлую...

Ой, запяю песню вясёлую,
Вясёлую.
Да развею бяду сваю,
Бяду сваю.

Бяда свая, бяда свая
Прабедзенька.
Прабедзенька, ды ўсё не сукроўна,
Не сукроўна.

Радзіначка пайшла, пайшла маці
У сад гуляці.
Да свайго сыночка пазнаваці,
Пазнаваці.

* Кожны першы радок паўтараецца двойчы.

Не пазнала сынка і ў народзе,
І ў народзе.
Да пазнала сынка і ў паходзе,
І ў паходзе.

— Ой сынку мой, сынку Іванюша,
Іванюша.
Я цябе насіла, галасіла,
Галасіла.

Я цябе раджала, абмірала,
Абмірала.
Да сорак жа ночак не спала,
Не спала.

Да сорак ночак не спала,
Не спала.
Да к сырой зямліцы прылягала,
Прылягала.

**Ой, палын — трава горкая...**

Ой, палын, палын,—
Трава горкая,
А доля мая
Яшчэ горшая.

Ой, пайду ў садок,
Вінаградачак,
К свайму татачку
На парадачку:

— А мой татачка,
Ды дарадзь ты мне,
Што мой міленькі
Не любіць мяне.

Робе краватку
Адзінокую,
Кладзе дошчачку
Нешырокую!

— Ой, гаруй, гаруй,
Мае дзіцятка,
Спацькі лажыся,
К сценцы хініся!

Гаруй горачка,
Не кажы людзям,
Насі золата,
Не хіні к грудзям!

— Мае золата
Перавязана,
Мае горачка
Усё расказана!

**Ой, гаю мой, гаю...**

Ой, гаю мой, гаю,
Гаю мой зялёны,
Ды праз цябе, гаю,
Ветрык павявае.

Ветрык павявае,
Лісточкі калыша,
А брат ды сястрыцы
Усё лісты піша.

Ой, піша ён, піша,
З паўночы чытае:
— Ой, чаму ж, сястрыца,
У гасцях не бывае?

Ой, ці ты, сястрыца,
Коніка не маеш,
Ды ці ты, сястрыца,
Дарожкі не знаеш?

— Ой, браце мой, браце,
Я й коніка маю,
Я й коніка маю,
Я й дарожку знаю.

Я й коніка маю,
Я й дарожку знаю,—
Ды за сваім горам
У гасцях не бываю.

**Чырвоная каліначка...**

Чырвоная каліначка *
На зялён луг схілілася,

Я, малада, журылася,
Што ад роду адбілася.

Ой, ад роду, ад радочку,
Цяжка мне жыць сіротачкай.

Цяжка жыці, цяжка быці
На чужыне маладзіцы.

Цяжка саду без зязюлі,
Мне ж цяжэле без матулі.

Цяжка рыбцы без вадзіцы.
Мне ж цяжэле без сястрыцы.

Цяжка дрэўцу без лісточка,
Мне ж цяжэле без браточка.

Ой, пайду я гукаючы,
Сваёй долі шукаючы.

Адгукнулась мая доля
На тым баку сіня мора.

Ой, пайду я к беражочку
Да к ліповаму кусточку.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Да вышчыкну па лісточку,
Да напішу па пісьмочку.

Ой, напішу па пісьмочку,
А пашлю я да радочка.

Няхай радня прачытае,
Назад весці прысылае.

**Ой, горкая я і доля мая...**

Ой, горкая я і доля мая,
За п'яніцу замуж выйшла.

П'е п'яніца ноч, другую,
На трэцюю ноч у двор прыходзіць:

Бярэ мяне за ручэньку,
Вядзе на Дунай-рачэньку.

Хоча мяне ўтапіці,
Маю душу загубіці.

А я стала ды сказала:
— Чым я табе не ўгаджала.

А я ж бела ды румяна,
На работу хаджу рана.

На работу хаджу рана,
Хлеба-солі бяру мала.

А я й тога не з'ядаю,
Сваім дзеткам прыблюдаю.

**Вярба, вярба, дзе ж ты расла?..**

Вярба, вярба, дзе ж ты расла?
Ужо ж тваё лісцё вада знясла.

А я, млода,— як я жыла,
Што мая краса дарма прайшла?

Не йшла замуж ні год, ні два
І на трэці год не думала.

Аддалі замуж на пятаму
Ды п'янічаньку праклятаму.

Прапіў каня варанога
Ды ідзе дамоў па другога.

А я, млода, проці яго:
Нясу рубліка залатога.

Нясу рубля залатога
Выкупляць каня варанога.

Ні раз, ні два выкупляла,
У вішнёвым саду начавала.

Салавейкі «цяху-цяху»,
А я, молада, цярплю муку.

**О, не кукуй, зязюленька, рана...**

О, не кукуй, зязюленька, рана.
    Гэй, гэй, зязюленька, рана.

Ды не кажы, што ночанька мала.
    Гэй, гэй, што ночанька мала.

Я, молада, ўсю ночаньку не спала.
    Гэй, гэй, усю ночаньку не спала.

Міленькага з дарожанькі чакала.
    Гэй, гэй, з дарожанькі чакала.

Мой міленькі прыехаў так позна.
    Гэй, гэй, прыехаў так позна.

Параскідаў падушачкі розна.
    Гэй, гэй, падушачкі розна.

— А на каго ж, мой міленькі, злуеш?
    Гэй, гэй, мой міленькі, злуеш?

Што мае падушачкі псуеш?
    Гэй, гэй, падушачкі псуеш?

— Злую на тваю мамку старую.
    Гэй, гэй, на мамку старую.

Што аддала цябе маладую.
Гэй, гэй, цябе маладую.

— Было не сеч зялёнага дуба
Гэй, гэй, зялёнага дуба.



*П. Сергіевіч.* Уладзіслава Луцэвіч (жонка Янкі Купалы) у нацыянальным касцюме

Было не браць, калі я не люба.
Гэй, гэй, калі я не люба.

О, не кукуй, зязюленька, рана.
Гэй, гэй, зязюленька, рана.

**Белая бярозачка...**

Белая бярозачка,
Ці не цёмненька табе
Сярод бору стоючы,
У роўна поле гледзючы?

Малада малодачка,
Ці не сумненька табе
З ліхім мужам жывучы,
На добрыя гледзючы?

— Жоначкі-суседачкі,
Парадзьце параданьку,
Як мне мужа навучыць,
Як ад п'янства адлучыць?

— Вазьмі ячменю жменю,
А другую — ды хмелю,
Звары піва п'янога,
Напой мужа ліхога.

Выведзі ў роўна поле,
Прывяжы да таполі,
Аблажы саломкаю,
Падпалі лучынкаю.

Бяжы ў дом гукаючы,
Ручанькі ламаючы:
— Здаецца, і гром не быў,—
Мілага пярун спаліў!

## ЛЮБОЎНЫЯ ПЕСНІ

### Ой, у полі верба расла...

Ой, у полі верба расла,*
Там стаяла дзеўка красна.
Не так красна, як ўрадліва,
Яе доля нешчаслівa.

Ой, у полі тры дарожкі,
Пайшла дзеўка да варожкі,
А варожка захварэла,
Варажыць не захацела.

— Не плач, дзеўка, не траць века,
Будзеш мець ты чалавека,
Не старога, не малога,
Казачэньку маладога.

### Ой, зарадзілі сільна, буйна...

Ой, зарадзілі сільна, буйна
Ягады ў бары,
Ой, там хадзіла красна дзеўка,
Ягады брала.

Ой, заблудзіла красна дзеўка
У сырым бары,
Ой, прыблудзіла красна дзеўка
К круту берагу.

---

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Ой, гукала, выклікала
Перавознічка:
— Ой, перавознік, бел малойчык,
Хлопец малады.

Перавязі ты красную дзеўку
На той бок ракі,
Ой, што захочаш, што запросіш,
Усё я заплачу.

— Ой, не хачу я, красна дзеўка,
Нічога з цябе,
Ой, ці пойдзеш, красна дзеўка,
Замуж за мяне.

— То воля бацькі, воля маткі,
Воля не мая,
То воля бацькі, воля маткі,
Воля не мая.

## А ў полі вярба...

А ў полі вярба,
Пад вярбой вада,
Там хадзіла, там гуляла
Дзеўка малада.*

Дзеўка ад вады,
Хлопец да вады:
— Пастой, пастой, дзяўчыначка,
Дай каню вады.

— Рада б пастаяць,
Каню вады даць,
Мае босенькія ножкі,—
Сцюдзёна стаяць.

— Я зніму парчу,
Ножкі уварчу,
А назад як я вярнуся,
Боцікі куплю.

— Не купляй ты мне,
А купі сабе:
Ёсць у мяне татка, мамка,
Яны купяць мне.

## Ой, рабіначка...

— Ой, рабіначка,
Ты зялёная,
Ой, калі ж ты ўзышла,
Калі вырасла?

— Я вясною ўзышла,
Летам вырасла,
На высокі цярэм
Пахілілася.

— Ой, дзяўчыначка,
Ты прыгожая,
Дзе ты, красна, расла,
Гадавалася?

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

— Я у мамкі расла,
Гадавалася,
Як вішэнька ў саду
Красавалася.

— Ты, дзяўчына, скажы,
Не утоівай,
Скажы праўданьку ўсю,
Дзе ўзяла красу?

— Я спаткала красу
У зялёным лясу,
У зялёным лясу
Пад рабіначкай.

— А дзявочу красу
Не знайсці ў лясу,
Не знайсці, не купіць,
Ды прыгожай быць!

**Ляціць галка цераз балку...**

Ляціць галка цераз балку,
Лятаючы, крача.
Маладая дзяўчыначка
Ходзіць гаем, плача.

Не пускае яе маці
Рана да крыніцы,
Ні жыта жаці, ні лён рваці,
Ні на вечарніцы.

А раз вечарам пазненька,
Як маці заснула,
Выйшла слухаць салавейку,
Бо зроду не чула.

Выйшла, стала пад вярбою
Ды дзівіцца ў воду.
— Цяжка, маці, важка, маці,
Што й дала ўроду.

Нашто дала кары вочы,
Малёваны бровы.
І ўсё дала, і ўсё дала,
Да не дала долі.

Трэба было, мая маці,
Тых броў не даваці,
А лепш было б, мая маці,
Шчасце, долю даці.

### Чаму не прыйшоў, ці не прыехаў...

Чаму не прыйшоў, ці не прыехаў,
Як я цябе прасіла?

Ці каня не меў, ці сам не пасмеў,
Ці матка не пусціла?

— Я й коніка меў і ехаць хацеў,
Мамачка выпраўляла,

Меншая сястра, лет не дарасла,
Яна мяне не пускала.

— Не едзь, брацетка, не едзь, родненькі,
Бо туды не даедзеш.

Дзеўкі не зап'еш, коніка заб'еш,
Дадому не вернешся.

З'ездзіш коніка вараненькага,
Па полі гарцуючы,

Стопчаш боцікі казловенькія,
З дзеўкамі танцуючы.

Сатрэш шапачку баброве нькую,
З галоўкі знімаючы,

А хусцінацку шаўковенькую,
Слёзкі ўціраючы.

### Ці свет, ці світае...

Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае?
А мой міленькі,
Голуб сівенькі,
Коніка сядлае.*

Сядлай, мілы, каня,
Каня вараненькага,—
Прыязджай, мілы,
Не кідай, мілы,
Мяне маладзеньку.

Ці ж я не такая,
Як і тая, другая,—
Я харошая,
Я прыгожая,
Толькі доля ліхая.

У полі асінку
Вецярок калыхае,
А мой міленькі,
Чорнабрывенькі
Ад мяне уцякае.

* Апошнія тры радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

У полі дубочак,
На вярху жалудочак.
Як не бачу я
Цябе, міленькі,
Невясёлы дзянёчак.

У полі азерца,
Там плавала вядзерца.
Ой, прыйдзі, прыйдзі,
Ды парадзімся,
Маё мілае сэрца.

Ты пойдзеш гарою,
Я пайду даліною.
Людзі кажуць мне,
Ды сама знаю,
Што не жыць мне з табою.

**Зялёны дубочак...**

Зялёны дубочак,
Шырокі лісточак.
Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.*

Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.
Па ветру да мілай
Усе весці нясуцца.

Сягоння субота,
А заўтра нядзеля,
— Чаму ў цябе, хлопча,
Кашуля не бела?

— Як жа будзе бела,
Хоць заўтра нядзеля:
Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала.

Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала,
Дзяўчына кахана
Любіць перастала.

Пераплыву рэчку,
Сяду на брусочку.
Ці не прыйдзе міла
Памыць мне сарочку?

**Ляціць сарока ды скрай аблока...**

Ляціць сарока ды скрай аблока,
Усё крача.
Ходзіць Ясенька ды скрай ваконца,
Усё плача:

— Выйдзі, дзяўчына, сэрца адзіна,
Да мяне,
Сінія вочы спаці не хочуць
Без цябе.

— Свеча чуць гарыць, матуля не спіць,
Ах, баюсь.
Свечачка згасне, матуля засне,
То прыйду.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Параўнюй, божа, горы, даліны
Роўненька,
Прынясі, божа, майго мілога
Раненька.

А хоць раненька, а хоць пазненька —
Не баюсь,
Свайго мілога па ціхай мове
Пазнаю.

**Пайду я ў садочак...**

Пайду я ў садочак,
Сарву я лісточак
Ды павысцілаю
Мілага слядочак.

Ды павысцілаю,
Каб пташкі не ўбілі,
Каб майго мілога
Другія не любілі.

Адна палюбіла
Ды прычаравала:
Нясоленай рыбы
Вячэраць давала.

— Вячэрай, казачэ,
Ды не сумнявайся,
Як не маеш жонкі,
Са мною кахайся.

— Ой, маю я жонку
Ды на Украіне.
Разбітае сэрца
На дзве палавіны.

Ой, маю я жонку
Ды дзетачак двое,
Ды дзетачак двое,
Чарнявых абое.

**Ці не быстрая рэчка...**

Ці не быстрая рэчка ваду засмуціла.
Ды чаго плачаш, дзяўчыначка,
Ці не матуля біла?

— Ой, біла не біла, сама засмуціла,
Што не даў мне бог, не судзіў мне бог
Каго верна любіла.

Ты пойдзеш гарою, а я даліною,
Я сама знаю, людзі гавораць,
Што не быць мне з табою.

Няхай жа гавораць усялякае ліха,
А мы з табой, дзяўчыначка,
Любімося ціха.

## Ты, чырвоная каліна...

— Ты, чырвоная каліна,
Ах, і што цябе зламіла?
— Зламілі мяне буйныя ветры
Са лютымі маразамі.*

— Ой ты, беленькі малойчык,
Ах, і што цябе ссушыла?
— Ссушыла мяне дзяўчына тая,
Што із чорнымі брывамі.

Стаю я пад канвою,
Хаджу я за табою;
Выйдзі, дзяўчына, выйдзі, рыбчына,
Пагаворым мы з табою.

— Ах, і рада б выхадзіці,
Ды з табою гаварыці:
Ляжыць нялюбы на правай ручцы,
Я ж баюся разбудзіці.

— Дзяўчыначка мая люба,
Адкаціся ад нялюба,—
Буду страляці, буду лучаці
З-за зялёнага дуба.

Буду, буду лучаці
З-за зялёнага дуба:
Заб'ю нялюба з тугога лука,
Як сізога галуба.

— А ці ўлучыш, ці не ўлучыш,
Ужо з нялюбым не разлучыш.
Сядлай жа каня, з'язджай са двара,
Ты не мой, а я не твая.

## На гарэ дубочак...

На гарэ дубочак,
Зялёны лісточак.
Не бачыла міленькага
Ужо другі дзянёчак.

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

Учора панядзелак,
Сягоння аўторак.
Я думала, маладзенька,
Што нядзелек сорак.

Па садочку хаджу,
Руту-мяту саджу.
— Выйдзі, выйдзі, мой міленькі,
Штось я табе скажу.

— А я табе скажу,
Што людзі гавораць,—
Што да цябе, мая міла,
Кавалеры ходзяць.

Чатыры хадзілі,
Няверна любілі,
Стаў пяты хадзіці,
Стаў верна любіці.

— Перастань, міленькі,
Да мяне хадзіці,
Як дазнае мая маці,
Будзе мяне біці.

— Ой, я не пакіну,
Я не перастану,
Пакуль жа ты, мая міла,
На шлюбаньку станеш.

— Ёсць у мяне зелле
Ніжай пералазу,
Як дам табе напіцеся,—
Пакінеш адразу.

**Усе хмарачкі ды па парачцы...**

Усе хмарачкі ды па парачцы,
Адна хмарачка розна.
Адна хмарачка розна.

А не сварыся, мая мамачка,
Што прыходжу я позна,
Што прыходжу я позна.

А хоць сварыся, хоць не сварыся,
Ты мяне не навучыш,
Ты мяне не навучыш.

Каго я люблю, каго кахаю,
Ты мяне не разлучыш,
Ты мяне не разлучыш.

Дай волечку мне, да мне, маладой,
Дык помніці буду,
Дык помніці буду.

Замуж выйду, хоць як жыць буду,—
Цябе не забуду,
Цябе не забуду.

**Ой, крушына, крушына...**

Ой, крушына, крушына,
Ты мяне засушыла.

Ты вырасла ў полюшку
На маю нядолюшку.

Як ты распускалася,
Я з мілым спаткалася.

Як ты ягадзілася,
Я з мілым схадзілася.

Як ты асыпалася,
Я з мілым рассталася.

Праз твой зелен кусточак
Я згубіла вяночак.

**Ой, ці ўсе лугі пакошаны...**

Ой, ці ўсе лугі пакошаны,
Ці ўсе сенажаці.
Ой, пытаецца сын у матулі,
Каторую замуж браці.

Ой, ці тую багатую,
Што хораша ходзіць,

Ой, ці бедную сіраціначку,
Што ні возьме, то ўсё зробіць?

А багатая, няўдалая
У садочку гуляла,
Тая бедная сіраціначка
Тры капы жыта нажала.

У багатае, няўдалае —
Валы да каровы,
А ў беднае сіраціначкі —
Толькі чорныя бровы.

У багатае, няўдалае
Валы паздыхаюць,
А у беднае сіраціначкі
Бровы не зліняюць.

**Ой, белая бярозанька...**

Ой, белая бярозанька
Голлечкам да сонца.
Заплакала дзяўчыначка,
Гледзячы ў ваконца.

Ой, белая бярозанька
Шумна зашумела,
Маладзенькай дзяўчынаньцы
Галоўка балела.

Ой, балела, не балела,
Самі слёзы льюцца,
Што да мяне, маладое,
Няўдалыя шлюцца.

Хоць шлецеся, не шлецеся,
Я ваша не буду,—
Каму дала белу ручку,
То з тым жыці буду.

Адзін стаіць на ганачку,
Другі — за плячыма,
Адзін сыпле дукатамі,
А другі слязіма:

— Ой, каб табе, таварышу,
Дукатаў нястала,
Як я любіў дзяўчыначку,
Табе шкода стала.

Ой, каб жа ты, таварышу,
З ёю не разбыўся,
Як я любіў дзяўчыначку,
А ты ажаніўся.

Ой, бадай жа, таварышу,
Маё ліха табе,
Як я любіў дзяўчыначку,
А ты забраў сабе.

### Ой, пад гаем зеляненькім...

Ой, пад гаем зеляненькім
Слала ўдова лён бяленькі.
Яна слала, выглядала,
Тонкі голас падавала.
Там Васілька сена косіць,
Тонкі голас пераносіць.
Кінуў касу на далінку,
А сам пайшоў дадоманьку.
Выйшла маці яго з хаты,
Стала Васіля пытаці:
— Ты, Васілька, што думаеш,
Чаму не п'еш, не гуляеш?
— Дазволь, маці, ўдаву ўзяці,
Тады буду піць, гуляці.
— Не дазволю ўдаву браці,
Удовы ўмеюць чараваці.
Чаравала мужа свайго,
Прычаруе сына майго.
— А я чараў не баюся,
Ды на ўдаве ажанюся.

### Цякла рэчка з-пад мястэчка...

Цякла рэчка з-пад мястэчка,
З вішнёвага саду.
Кліча хлопец дзяўчыначку
К сабе на параду.

— Парадзь, парадзь, дзяўчыначка,
Як родная мацi,
Цi мне цяпер жанiцiся,
Цi восенi ждацi?

— А я табе, бел малойчык,
Раю i не раю,
З табой стаю, размаўляю,
Пра другога дбаю.

— А каб жа ты, дзяўчыначка,
Тады замуж пайшла,
Як у млыне на каменi
Пшанiчанька ўзышла.

— А каб жа ты, мой малойчык,
Тады ажанiўся,
Як у полi пры дарозе
Сухi дуб развiўся.

**Туман, туман па далiне...**

Туман, туман па далiне,*
Шырокi лiст на калiне.

Яшчэ шыршы на дубочку,
Клiча голуб галубачку.

Хоць не сваю, дык чужую:
— Хадзi, мiла, пацалую.

— Нашто ж маеш цалавацi,
Сэрцу тугi задавацi?

Не задавай сэрцу тугi,
Не возьмеш ты, возьме другi.

Возьме другi i харошы,
Майму сэрцаньку прыгожы.

— Не плач, дзеўка, не журыся,
Я ж шчэ не ажанiўся.

Во, як буду жанiцiся,
Прашу пiва напiцiся.

* Кожны радок паўтараецца двойчы.

Майго піва напіціся,
Майму дзіву дзівіціся.

— Тваё піва мне не піва,
Тваё дзіва мне не дзіва.

Толькі дзіўна слава тая,
Што на людзях пахаджае.

Твая маці чараўніца,
А сястрыца разлучніца.

Разлучыла нас з табою,
Як рыбаньку з вадою.

Цяжка рыбцы без вадзіцы,
Так мне, беднай маладзіцы.

Цяжка рыбцы на пясочку,
Так мне, беднай, без дружочка.

**А дзе тая крынічанька...**

А дзе тая крынічанька,
Голуб што купаўся?
А дзе тая дзяўчынанька,
З каторай кахаўся?

А ўжо тая крынічанька
Даўно замучона,
А ўжо тая дзяўчынанька
З другім заручона.

Ой, я тую крынічаньку
Тыччам ператычу,
Ды я сваю міленькую
К сабе пераклічу.

Ой, я тую крынічаньку
Чаўном пераплаўлю,
Ды я сваю міленькую
К сабе перабаўлю.

Вой, стаяла калінанька
На заходзе сонца,

А плакала дзяўчынанька
Гледзячы ў ваконца.

Зажурылі, засушылі
Мяне, маладзеньку,
Яшчэ з войскам у свет далёкі
З'ехаў і міленькі.

Не плач, не плач, дзяўчынанька,
Я к табе вярнуся.
Усёй душою, шчырым сэрцам
К табе прыхілюся.

Зажывём мы, запануем,
Як галубкоў двое,
І раздзелім з табой шчасце,
Долю і нядолю.

### Здрада, здрада, чорны бровы, здрада...

Здрада, здрада, чорны бровы, здрада!
А ўсё ж твая, мой мілы, няпраўда.

Як жаніўся, любіці маніўся,
А цяпер ты ад мяне ад'язджаеш.

А куды ж ты ад мяне ад'язджаеш,
Каму, маладую, мяне пакідаеш?

Рана ўстаеш, каню аброк даеш,
На повадзе к вадзе каня вядзеш.

Як белы свет, коніка сядлаеш,
У абед дык з двору выязджаеш.

Я пастаўлю стоража ў парозе,
Сама лягу на цісовай ложы.

Чую, чую, сторaж мой гаворыць,
Што мой мілы ўжо ад'язджаіць.

— Зламі, конік, нагу варaную,
Скруці, мілы, галаву змянную.

Скруці, мілы, галаву змянную,
Як ты змяніў мяне, маладую.

## Ой, ляцелі гусі...

Ой, ляцелі гусі
Ды з-пад Белай Русі,
Селі яны, палі,
На ціхім Дунаю.

Селі яны, палі,
Ваду замуцілі,
А нас, маладзенькіх,
З табой разлучылі.

Бадай тыя гусі
Марна запрапалі,
Як мы кахаліся,
Цяпер перасталі.

Як мы кахаліся,
Як ластаўкі ў стрэсе,
Цяпер разышліся,
Як дарожкі ў лесе.

Як мы кахаліся,
Нас бяда не знала,—
Цяпер разышліся,
Як цёмная хмара.

## Паехаў мой мілы...

Паехаў мой мілы,
Не чуць, не відаці.*

Выйду за вароты —
Два слядочкі знаці.

Ой, адзін слядочак —
Каня варанога,

А другі слядочак —
Майго міленькога.

Ой, пайду я, пайду
У вішнёвы садочак.

Вышчыплю, выламлю
З каліны лісточак.

Вышчыплю, выламлю
З каліны лісточак,

Буду прыкрываці
Мілага слядочак,

Каб па яго следу
Людзі не хадзілі,

На чужой старонцы
Дзеўкі не любілі.

На чужой старонцы
Дзеўкі не любілі,

Мяне, маладую,
За ім не судзілі.

Судзілі, судзілі
Старыя й малыя,

Цяпер пачынаюць
Хлопцы маладыя.

Хоць вы гаварыце,
Хаця перастаньце,

Мяне маладую,
Болей не чапайце.

## У агародзе вярба расла...

У агародзе вярба расла,
Там стаяла дзеўка красна.

* Другі радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

Яна красна ды й красіва,
Доля ж яе нешчасліва.

Доля ж яе нешчасліва,
Няма таго, што любіла.

Няма яго ды й не будзе,
Разлучылі злыя людзі.

Разлучылі, разлучылі,
Каб у пары не хадзілі.

**Ці свет, ці світае...**

Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае?
Ці мой міленькі, галуб сівенькі,
Коніка сядлае?

Сядлай, мілы, каня,
Каня вараненькага,
Прыязджай, мілы, не кідай, мілы,
Мяне, маладзеньку.

Ці я не такая,
Як і гена другая?
Я й харошая і прыданая —
Доля ж няшчасная!

Ой, у полі азерца,
Там плавала вядзерца,
Ой, прыдзі, мілы, да й парадзімся,
Маё мілае сэрца!

Чырвона каліна
Да ў полі павяла,
Не суверная да дружынька
Мне свет завязала.

Ты пойдзеш гарою,
А я даліною,
Кажуць мне людзі, дай сама знаю,
Што не жыць мне з табою.

## Ой, хадзіла Машанька...

Ой, хадзіла Машанька
Па садочку,
Пакалола ножачку
На вішнёчку.

Баліць, баліць ножачка,
Ды не больна.
Любіў казак дзеўчыну,
Ды не доўга.

А забралі казачэнька
У салдаты,
Забыла дзяўчыначка
Папытаці.

Забыла дзяўчыначка
Папытаці,
Ці ёй замуж выхадзіці,
Ці гуляці.

— Гуляй, гуляй, дзяўчыначка,
Як гуляла,
Тапчы, тапчы чаравічкі,
Як таптала.

Тапчы, тапчы чаравічкі,
Як таптала,
Не кажы ты хлопцам праўды,
Як казала.

Не кажы ты хлопцам праўды,
Як казала,
Не сцялі ім пасцель белу,
Як ты слала.

Яны тваю пасцель белу
Перакінуць,
Яны цябе любіць будуць,
Ды пакінуць.

## Ой, заржы, заржы, сівы коніку...

Ой, заржы, заржы, сівы коніку,
Рана з поля ідучы.

Ці не пачуе мая міла,
Пасцельку сцелючы?

Яна пачула, цяжка ўздыхнула,
Сільна заплакала.

Няма мілога, чарнабрывога,
Што верна кахала.

Ой, стаіць явар ды над вадою,
Кудравы да долу.

Ах мой міленькі, з Украіненькі
Вярніся дадому.

Ой, стаіць явар дый над вадою,
Явар вада мые.

Ах мой міленькі, з Украіненькі
Сэрца ж маё ные.

Ой, стаіць явар дый над вадою,
Каб не абярнуўся.

Ах мой міленькі, з Украіненькі
Каб скора вярнуўся.

**Сядзіць галуб пры дубку...**

Сядзіць голуб пры дубку,
Галубка на вішні,
Скажы, скажы, дзяўчыначка,
Што ў цябе на мыслі?

— Як не хочаш, мой міленькі,
Ты мяне любіці —
Парай, парай ты мне зелля,
Каб скарэй забыці.

— А я знаю тое зелле
Блізка пералазу,
Як папарыш і нап'ешся,—
Забудзеш адразу.

— Буду парыць, буду піці,
Каплі не апушчу,
Тады я цябе забуду,
Як вочы заплюшчу.

### Што за месяц, што за ясны...

Што за месяц, што за ясны,—
Уночы свеціць, а ўдзень не.
Што за міленькі дружочак,—
Калі прыйдзе, калі не.

Усе людзі, людзі кажуць,
Усе людзі гавараць:
— Сорам, дзеўка, сорам, красна,
Позна з вечара гуляць.

Дзяўчыначцы кепска стала,
Стала плакаць ды ўздыхаць,
Хлапчыноньку шкода стала,
Стаў дзяўчынку суцяшаць.

— Не плач, дзеўка, не плач, красна.
Прыйду ў госці да цябе,
Разгарыцца кроў гарача —
Вазьму замуж за сябе.

## ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ

### Ой, у полі крынічанька...

Ой, у полі крынічанька,
Там халодна вадзічанька.

Ой, там Раман валоў пасе,
Кацярына ваду нясе.

Стаў Раманку жартаваці,
З вядзёр ваду выліваці.

— Ой, Рамане, маё сэрца,
Пакінь вады хоць вядзерца.

Мая вада халодная,
У мяне маці няродная.

Я няродну маці маю,
Будзе біці, добра знаю.

Будзе біці і караці
І шэльмаю называці.

«Дзе ты, шэльма, спазнілася,
Бо вячэра зварылася».

— Навучу, дзеўка, збрахаці,
Каб не біла цябе маці.

«Наляцелі гусі з броду,
Памуцілі з пяском воду.

Я стаяла, прастаяла,
Пакуль вада састаяла».

— Брэшаш, доню, збрахалася,
Ты з Раманам кахалася.

— Цяпер, маці, прызнаюся,
Што з Раманам кахаюся.

Ён чарнявы, я бялява,
Будзе пара кучарава.

Ён высокі, а я нізка,
Будзе нам радзіна блізка.

Ён багаты, а я бедна,
Будзе пара адпаведна.

Ой, у полі крынічанька,
Там халодна вадзічанька.

**Ой, пасею я рамоню...**

Ой, пасею я рамоню
Да ў гародзе пры дарозе.
А там малады коні пасе
Ды да мяне на нач ідзе.
А я яго палюбіла,
На покуце пасадзіла.
Мёдам, вінам напаіла,
Калбаскаю накарміла.
А я яму пасцель слала:
Адзін радочак падушачак,
Другі радочак пярынаў,
А пад галоўку пухоўкі.

А я яго пакрывала
Ядвабным коўдрам.
А заўтра я яго выпраўляла

З музыкамі і скрыпкамі.
Ой, я на яго слядочак
Пакаціла талярочак.

Ой, пасею я рамоню
Да ў гародзе пры дарозе,
А там стары валы пасе
Ды да мяне на нач ідзе.
А я старога не любіла,
Пад печаю пасадзіла,
Дзёгцем, смалой напаіла.
Я яму пасцель слала:
Адзін радочак камячоў,
Другі радочак палячоў,
Жэжнавы камень пад галоўку.
А я яго пакрывала старою бараною.
А назаўтра выпраўляла,
Сабакамі цкавала,
А на яго слядочак
Пакаціла камушочак.

**Ой, паслала мяне маці...**

Ой, паслала мяне маці,
Ой, паслала мяне маці,
Ой, паслала мяне маці
Яравое жыта жаці.

А я жыта не жала,
А я жыта не жала,
А я жыта не жала,
У баразёнцы ляжала.

Баразёнка вузенька,
Баразёнка вузенька,
Баразёнка вузенька —
Не памесцілася.

Цёмна ночка каротка,
Цёмна ночка каротка,
Цёмна ночка каротка —
Не нацешылася.

А я дзень укарачу,
А я дзень укарачу,
А я дзень укарачу,
Цёмну ночку падтачу.

Вунь Мікіта ідзе,
Вунь Мікіта ідзе,
Вунь Мікіта ідзе,
Мне арэшкі нясе.

Я не знаю, што рабіць,
Я не знаю, што рабіць,
Я не знаю, што рабіць:
Ці пакінуць, ці любіць?

Ці арэшкі лускаць,
Ці арэшкі лускаць,
Ці арэшкі лускаць,
Ці Мікіту цалаваць?

Я й арэшкі лускала,
Я й арэшкі лускала,
Я й арэшкі лускала
І Мікіту цалавала.

**Ой, хацела ж мяне маці...**

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за першага аддаць,
А той первы,
Первы няверны,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за другога аддаць,
А той другі
Ходзіць да падругі,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за трэцяга аддаць,
А той трэці
Як у полі вецер,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
За чацвёртага аддаць,
А той чацвёрты
Ні жывы, ні мёртвы,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за пятага аддаць,
А той пяты
П'яніца пракляты,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за шостага аддаць,
А той шосты
Малы, недарослы,—
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маці
Ды за сёмага аддаць,
А той сёмы
Прыгожы ды вясёлы...
Ён не схацеў мяне ўзяць!

## Сам не знаю, не ведаю....

Сам не знаю, не ведаю,
Што рабіці маю.
Людзі кажуць жаніцеся,
А я і не думаю.

Ой, што ж мне жаніцца,
Ой, нашто ж мне жонка?
Ёсць у мяне суседачка,
Добра прыяцелька.

Маладзіцы, удавіцы
На мяне маргаюць,
То ў нядзелю, то ў свята
К сабе зазываюць.

— Прыдзі, прыдзі, мой міленькі,
Ка мне на хвілінку,
А я вышлю свайго дзеда
У лес па малінку.

Ідзі, стары, барадаты,
У лес па малінку.
А не пойдзеш у маліну,—
Любіці пакіну.

## Хлопец пашаньку пахае...

Хлопец пашаньку пахае, ой-ёй-ёй!
У яго сошанька крывая, ой, божа ж мой! *

Прышла к яму чарнявая:
— Вазьмі ж мяне, хлопец, замуж.

Дзеўка замуж захацела,
Ледзь уся не абамлела.

Хлопец здуру ажаніўся,
Навек жонкай падавіўся.

Ані лыжкі, ані міскі,
Павесілі тры калыскі.

* Прыпевы «Ой-ёй-ёй» і «Ой, божа ж мой!» паўтараюцца адпаведна пасля 1-га і 2-га радкоў кожнай страфы.

19 Зак. 3328

Ля калыскі трэба нянькі,
А ля печы кашаваркі.

Даў ёй хлопец тры капейкі:
— Пайдзі купі хлеба, солі.

Хлеба, солі не купіла,
На базары заблудзіла.

**Ой, пайду я лугам...**

Ой, пайду я лугам, лугам, ну ды я, ну ды я,
Дзе мой мілы арэ плугам, ну ды я, ну ды я.

Панясу я яму есці, ну ды я, ну ды я.
Ці не скажа радам сесці, ну ды я, ну ды я.

Ён наеўся і напіўся, ну ды я, ну ды я,
Сеў на плуг і засмуціўся, ну ды я, ну ды я!

— Чаго сядзіш і не арэш, ну ды я, ну ды я,
Чаго, мілы, не гаворыш, ну ды я, ну ды я?!

— А я сяджу і думаю, ну ды я, ну ды я,
Што ліхую жонку маю, ну ды я, ну ды я.

— Ці ж ты сватаў мяне ўночы, ну ды я, ну ды я,
А дзе ж былі твае вочы, ну ды я, ну ды я?

— Каб жа ты была такая, ну ды я, ну ды я,
Як і мая братавая, ну ды я, ну ды я!

— А я бровы ў сажу ўмажу, ну ды я, ну ды я,
Братавую пераважу, ну ды я, ну ды я!

**Чабарок, чабарок...**

Чабарок, чабарок
Ды каля дарожкі,
Харошанькі мой міленькі,
Ды крывыя ножкі.
Ох, ох, ды крывыя ножкі. *

А мой жа ты даўганосы,
Ой, які ж ты нехарошы,

* Апошні радок кожнай страфы паўтараецца з воклічам «Ох, ох!»

Каб ты быў такі, як я,
Дык даўно была б твая.

Каля саду я хадзіла,
Ды шчыпала вішні.
Дай жа, божа, кавалера
Ды пад мае мыслі.

Каб і люльку не курыў,
Табакі не нюхаў,
Чужых жонак не любіў,
Адну мяне слухаў!

## Чаму ж мне не пець...

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатаньцы
Парадак ідзець?

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Мушка на вакенцы
У цымбалкі тнець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Павучок на сценцы
Кросенцы снуець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Мой сынок ў калысцы,
Як бычок, равець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Парсючок пад лаўкаю
Бульбачку грызець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Жонка на печы
Прусакоў таўчэць.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Петушок на сметнічку
Зерняткі дзяўбець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець?
Сучачка на лычку
Хатку сцеражэць.

## На дварэ дожджык...

На дварэ дожджык,
А ў хаце лужа.
Разгневалася жонка
Ды на свайго мужа.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Разгневалася жонка
Ды на свайго мужа,
Залезла на печку,
Сказала: нядужа.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Прынёс табе піва.
— Дай жа мне спакой,
Я ледзьве жыва.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Я прынёс гарэлкі.
— Чорт цябе забяры,
Шукай сабе дзеўкі.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Прынёс табе мёду:
— Дай жа мне спакой,
А не ем яго зроду.

Міленькі ходзіць,
Ручанькі ломіць:
— Чаго ж мая любка
Са мной не гаворыць?

Устань, устань, міла,
Прынёс я дубінку —
Тонкую, гібкую
Ды й на тваю спінку.

Мілая ўстала
Як бы не ляжала,
Абняла мілога
Ды й пацалавала.

— Дзякуй табе, мілы,
Што ты здагадаўся,
Ад маёй хваробы
Зелля расстараўся.

Не балела цела,
Не балелі косці.
Гэта ж я ляжала
З вялікае злосці.

## А мой мілы захварэў...

А мой мілы захварэў,
Кіселіку захацеў.
Ох, ну, ды ох, ну! *
Кіселіку захацеў.

Ой, цыц, мілы, не ўмірай,
Кіселіку дажыдай.

Пайшла баба па сялу
Даставаці кісялю.

Не дастала кісялю,
Ды дастала аўса.

Намачыла кісель
На дванаццаць нядзель.

На баране цадзіла,
А на лёдзе варыла.

Пакуль кісель укіпеў,
Мой міленькі адубеў.

Як на покуці ляжаў,
Яшчэ было трошкі жаль.

Цераз сяло як вяла,
Яшчэ трошкі загула.

Як вывела за сяло,
Ужо стала весяло.

---

* Словы «Ох, ну, ды ох, ну!» паўтараюцца ў кожнай страфе з паўторам другога радка тэксту.

**Было ў цёшчы сем зяцёў...**

Было ў цешчы сем зяцёў:
Вот і Цішка зяцёк,
І Мікіта зяцёк,
І Захарка зяцёк,
І Макарка зяцёк,
І Дзяменцій зяцёк,



*М. Мікешын.* З серыі «Беларускія малюнкі»

І Кліменцій зяцёк,
Ай, Ванюша луччы ўсіх.

Прыехалі зяці ў госці:
Вот і Цішка прыехаў,
І Мікітка прыехаў,
І Макарка прыехаў,
І Захарка прыехаў,
І Дзяменцій прыехаў,

І Кліменцій прыехаў,
Ай, Ванюша ўперадзі ўсіх.

Стала цешча зяцёў частаваці:
Вот і Цішку стакан,
І Мікітку стакан,
І Захарку стакан,
І Макарку стакан,
І Дзяменцю стакан,
І Кліменцю стакан,
Ай, Ванюшу стакан мёду.

Стала цешча закуску даваць:
Вот і Цішку ляпёшку,
І Мікітку ляпёшку,
І Захарку ляпёшку,
І Макарку ляпёшку,
І Дзяменцю ляпёшку,
І Кліменцю ляпёшку,
Ай, Ванюшку гарачы блін.

Стала цешча зяцёў спаці класці:
Вот і Цішку на пол,
І Мікітку на пол,
І Захарку на пол,
І Макарку на пол,
І Дзяменцю на пол,
І Кліменцю на пол,
Ай, Ванюшку на куце.

Стала цешча напрадкі даваці:
Вот і Цішку дзяружку,
І Мікітку дзяружку,
І Захарку дзяружку,
І Макарку дзяружку,
І Дзяменцю дзяружку,
І Кліменцю дзяружку,
Ай, Ванюшку адзіяла.

Стала цешча зяцёў праважаці:
Вот і Цішку дубінкай,
І Міколку дубінкай,
І Захарку дубінкай,
І Макарку дубінкай,

І Дзяменцю дубінкай,
І Кліменцю дубінкай,
Ай, Ванюшка хай тут.

**Спарадзіла чачотачка семера дачок...**

Спарадзіла чачотачка семера дачок,
Спарадзіла невялічкіх, семера малых:
Аўгіння і Аксіння,
І Тацюха, і Насцюха,
І Макрына, і Грыпіна,
Сёмая — Хімка.

Спарадзіўшы і ўзрасціўшы, замуж аддала:
Аўгінню за Мірона,
Аксінню за Сапрона,
Тацюху за Дзяміда,
Насцюху за Свірыда,
Радзівону — Макрына,
А Хрытону — Грыпіна,
Хімку — за Кузьму.
Як пачала чачотачка пасагі даваць,
Як пачала невялічкім усім даравань:
Аўгінні — кажушок,
Аксінні — фартушок,
Тацюсі — пялёнкі,
Насцюсі — суконкі,
Макрыні — дзве кошкі,
Грыпіні — панчошкі,
Хімцы — падвязкі.

Зазывала чачотачка дзесяцёх мудрых,
Зазывала чачотачка братцоў родных:
Адзін быў Савацей,
Другі быў Цілямей,
Трэці быў Атрахім,
Чацвёрты — Гарасім,
Быў Барыс і Дзяніс
І арганец, пузанец,
І слуга Карпец.

Былі дзеўкі на вяселлі і маладзіцы,
Былі старынькія бабкі і ўдавіцы:
Яся, Кося і Скірпуся,
Была Хадора і Барбуся.

Нанімала чачотачка многа музыкі,
Нанімала чачотачка ўсю капэлю:
Верабей на скрыпцы,
Салавей на прытыцы,
А сарокі у прыскокі,
А вароны у далоні,
Чорны галкі на цымбалкі,
Дробны пташкі насунулі,
Люба слухаць, як зайгралі.

А чачотка не гуляла,
Чорну блаху гатавала.
Тры дні госці банкет мелі,
Пакуль чорну блаху з'елі.
А на трэцюю нядзелю
Госці дамоў захацелі,
За вяселле дзянкавалі,—
Пара дамоў!

**А як дзед з бабай пайшоў па каліну...**

А як дзед з бабай пайшоў па каліну,
Цераз рэчку, азярцо пераходзіць дзеду.
— А дзеду мой, дзеду, наламай каліны,
Не наломіш каліны — люблю ды й пакіну. *

А ўжо дзеду вада па калена паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада ды па пуза паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада па пояс паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада па грудзі паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзеду вада ды й па глотку паняла,
Сядзіць баба на беражку, дзеду веры не няла.

А ўжо дзед патануў, толькі задам баўтануў,
Рада баба, рада баба, што дзед утапіўся:
— Ды паднялась пранца-хваля, за куст учапіўся.

* Два апошнія радкі паўтараюцца як прыпеў пасля кожнай страфы.

### Пасеяў мужык грэчку...

Пасеяў мужык грэчку,
Жонка кажа: «Мак, мак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з грэчкі будзе мак.

Пасеяў мужык жыта,
Жонка кажа: «Мак, мак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з жыта будзе мак.

Пасеяў мужык рэпу,
Жонка кажа: «Мак, мак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай рэпа будзе мак.

Злавіў мужык рыбу,
Жонка кажа: «Рак, рак!»
Няхай так, няхай сяк,
Няхай рыба будзе рак.

Купіў мужык бізуна,
Жонка кажа: «Пастарнак!»
— Калі гэта пастарнак,
Пакаштуй жа яго смак.

### А ў верасні месяцы...

А ў верасні месяцы
Выпала пароша.
Дзед бабу палюбіў,
Бо яна хароша.

І крывая, і сляпая,
Яшчэ к таму злая:
І крычыць, і бурчыць,
Слова дзеду не змаўчыць.

— Убярыся, бабка,
У белае белле:
Я ж цябе павяду
З сабой на вяселле.

Убралася бабка
Ды ў белае белле.

— Цяпер вядзі, дзед, мяне
З сабой на вяселле.

Узяў дзед ды бабку
За белую ручку,
І спіхнуў дзед бабку
З моста ды ў рэчку.

— Цяпер, бабка, кайся,
Крыху пакупайся.
А як бабка панырне,
То дзед кіем папіхне.

Прыйшоў дзед дадому
І стаў ён бажыцца:
— І ё-ёй, і яй-богу,
Не буду жаніцца.

Раздумаўся дзедка
Ды ў далоні плешча:
— Калі буду жыў-здароў,
Ажанюся яшчэ!

**Ах, ты дуй, ах, ты дуй...**

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй,
Па маёй галаве,
Астанецца ўсё табе.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй,
І таўкач, і мялён,
І старожа, і прыгон.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй.
Астанецца ўсё табе,
І сарочка з мяне.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй.
У сарочцы гніды, вошы,
І калітачка без грошы.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла не бядуй,
І хамут, і дуга,
І я табе не слуга.

Ах, ты дуй, ах, ты дуй,
Мая міла, не бядуй,
Не бядуй, не бядуй,
Мая міла, не бядуй.

### Захацела бабусенька...

Захацела бабусенька
Ды разбагацеці,
Цып, цып, цырура. *

Пасадзіла курапатку,
Каб вывела дзеці.

Выпусціла бабусенька
На падвор'е пасці.

Сама села на улачку
Кудзелечку прасці.

Шура-бура наступае,
Дожджык пакрапляе.

— Пара, пара, бабуленька,
Курчат збіраці.

Яшчэ курчат не сабрала,—
Дзве растаптала.

Сюды-туды павярнула —
На трэцяе ступнула.

— Ой, да божа, божа, божа,
Ды што ж мне рабіці?

Ёсць у мяне стары дзедка,
Будзе мяне біці.

А як прышоў стары дзедка
Із лесу да хаты:

* Прыпеў «Цып, цып, цырура» паўтараецца пасля кожнай страфы.

— Чаму, чаму, бабуленька,
Курчат не чуваці?

— Выпусціла на падвор'е,
Празарылі людзі.

Ой, як узяў, як узяў дзедка
Сырую дубінку.

Пабіў бабе, пакалаціў
Галаву і спінку.

— Бадай табе, стары дзедку,
Барада аблезла.

Забіў, забіў, закалаціў,
Аж на печ не ўзлезу.

**Ой, у лесе пры даліне...**

Ой, у лесе пры даліне,
Ой, там сталася бяда!
Гэй, гэй, у лесе, у лесе,
Ой, там сталася бяда! *

Пры даліне, у гушчары
Калыхаліся камары.

Дуб да дуба пахіліўся,
Камар з дуба зваліўся.

Пабіў камар патыліцу
Аб дубову караніцу.

Ой, пабіў камар бакі
Ды аб дубовыя сукі.

Ой, пабіў камар калені
Аб дубовыя карэнні.

Высыпаліся ўсе зубы
З камарыкавай губы.

Прылятала муха-сваці
Камарыка ратаваці.

* Два апошнія радкі паўтараюцца пасля кожнай страфы.

— Пасылайце да аптэкі,
Ці не будзе крыху лепей?

У бальніцу завязіце
І мяне там палажыце.

Там добрыя дактары —
Вымуць душу без пары.

— Камарыку, мой ты браце,
Дзе ж нам цябе пахаваці?

— Не хавайце край дарогі,
Бо патопчуць мяне ногі.

Не хавайце пры даліне,
Бо вырыюць мяне свінні.

Пахавайце ў цёмным лесе
Пры зялёненькім гарэсе.

Будуць гарэхі шчыпаці,
Камарыка ўспамінаці.

— А чый жа гэты помнік —
Ці маёр тут, ці палкоўнік.

— Не маёр тут, не палкоўнік,
А сам камар супакойнік.

Гэй, гэй, у лесе, у лесе,
А сам камар супакойнік.

## ПЕСНІ ДА ТАНЦАЎ, СКОКАЎ І ГУЛЬНЯЎ

### Юрачка

Ах, ты, Юрачка,
Што не жэнішся,
Прыдзе зімачка,—
Куды дзенешся?

Што ты, Юрачка,
Азіраешся,
Палюбіць каго
Сабіраешся?

Ты напрасна не хадзі,
Доўга дарма не
глядзі.
Ах, ты, Юрачка,
Што не жэнішся?
Ах, ты, Юрачка,
Што сутулішся,
У каго зімой
Ты прытулішся?

На каго жа ты
Тут любуешся,
Ночкай цёмнаю
Ты цалуешся?

Ты напрасна не хадзі,
Доўга дарма не
глядзі.
Ах, ты, Юрачка,
Што сутулішся?

**Кадрыль**

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
Рукі, як бячоўкі,
Ногі, як начоўкі.

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
Спадніца ў кружкі,
Чатыры падушкі.

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
Хвартух у ёлкі,
У чатыры полкі.

А ці я не дзеўка,
Ці я не паненка,—
І спаднічка ў радна,
Я з мордачкі ладна.

**А Мікіта жыта носіць...**

А Мікіта жыта носіць,
Мікіціха дзяжу месіць.
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба сашыта. *

А Мікіта кучу веіць,
Мікіціха муку сеіць.
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба сашыта.

А Мікіта дровы сячэць,
Мікіціха есці нясець.
Мікіта, Мікіта,
Клінам шуба сашыта.

**Антон маладзенькі...**

Антон маладзенькі
Піў мёд саладзенькі,
Антоніха прыбягала,
Свайму мужу падсабляла.

Антон казу вядзець:
Тпру! Ну! Каза няйдзець,
Антоніха падсабляла,
Казу ззаду падпіхала.

— А ты, каза, стой, стой!
А ты казу дой, дой!
А я казу кулаком,
Ідзі сабе з малаком.

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

## Падушачка, падушачка...

Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Адна ў мамкі дачушачка,
Дзеўка маладая.
У нядзелю на кірмашы
Шоўку прыкупіла,
Падушачку пухавую
Міламу пашыла.

— Сёння прыйдзе мой міленькі —
Вымяту падлогі,
Падушачку пухавую
Пасцялю пад ногі.
— Калі, дзеўка, мяне любіш
Ды шчыра шануеш,
Падушачку пухавую
Ты мне падаруеш.

— Падушачку пухавую
Не магу аддаці:
Прыйду позненька з вячорак —
На чым буду спаці?
— Вазьму, дзеўка, цябе замуж
Гэтаю вясною,—
На падушачцы пуховай
Будзем спаць удвое.
Падушачка, падушачка,
Мая пухавая,
Адна ў мамкі дачушачка,
Дзеўка маладая...
На пуховай падушачцы
Мякусенька спаці,
Прыгожую дзяўчынаньку
Люба цалаваці.

## А Лявоніху Лявон палюбіў...

А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявонісе чаравічкі купіў;
Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі пaляскiвала.

Як я молада ў матулькі была,
Як вішэнька у садочку цвіла;

Цвіла, цвіла ды пацвітывала,
З малайцамі ды пагулівала.

Папалася злому духу — мужыку,
Ссушыў мяне, як лісцінку у духу,—
А чаму ж цябе пярун не забіў,
Як ты мяне маладую палюбіў.

Наехала повен двор казакоў,
Узялі, ўзялі майго мужа у палон.
Ой, не жаль мне, што яго узялі,
Толькі жалка, што не моцна звязалі.

Ой, не жаль мне, што яго узялі,
Толькі жалка, што не моцна звязалі.
Ён, паганец, уцячэць, уцячэць,
Мне галоўку натаўчэць, натаўчэць.

А Лявоніха не жонка была,
Не мытую мне кашулю дала,—
Не мытую, не качаную,
У суседа пазычаную.

Ай, Лявоніха, Лявоніха мая,
Несалёную капусту дала,
А Лявона дык і чорт не бярэць:
Несалёную капусту жарэць.

### А у полі ніўка...

А у полі ніўка,
Жыта палавінка,
Там дзяўчынка жыта жала,
Сама чарнабрыўка.*

Жала яна, жала,
У снапы вязала.
Ехаў казак дарожанькай:
— Здраствуй, дзеўка-жнейка.

Гэта — тая слава
Па ўсім свеце пала,
Што дзяўчына казачэньку
Сэрданькам назвала.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца двойчы.

У гародзе буракі,
Чырвоная жычка,
Любяць мяне, мама, хлопцы,
Хоць я невялічка.

Хоць я невялічка,
Хоць я нехароша,—



Дудар

Возьмуць мяне, мама, хлопцы
Без аднаго гроша.

Хоць я невялічка —
На лавачку стану,
А ўсё ж таму казачэньку
Да сэрца прыстану.

### Гэй, гэй, таўкачыкі...

Гэй, гэй, таўкачыкі!
Гэй, гэй, дубовыя!
Гэй, гэй, дубовыя,
На работу гатовыя!

Сем год бадзяліся,
У адну ступу сабраліся.
Гэй, гэй, таўкачыкі!
Гэй, гэй, дубовыя!

### Песеялі дзеўкі лён...

Пасеялі дзеўкі лён,
Пасеялі дзеўкі лён,
Дзеўкі лён,
Дзеўкі лён.
Пасеялі дзеўкі лён.

Пасеяўшы палолі,
Пасеяўшы палолі,
Палолі,
Палолі.
Пасеяўшы палолі.

Белы ручкі калолі,
Белы ручкі калолі,
Калолі,
Калолі.
Белы ручкі калолі.

Унадзіўся сівы конь,
Унадзіўся сівы конь,
Сівы конь,
Сівы конь.
Унадзіўся сівы конь.

Памяў, стаптаў дзеўкам лён,
Памяў, стаптаў дзеўкам лён,
Дзеўкам лён,
Дзеўкам лён.
Памяў, стаптаў дзеўкам лён.

### Старэнькі дзедка...

Старэнькі дзедка
Па гародзе ходзіць,
Па гародзе ходзіць,
Канапельку сее.
Люшачкі, люшачкі,
Люлі, люлі, люлі.*

— Шугі, галубы,
На каноплі к дзеду,
На дзедавы градкі,
Канапель клявацi.

Малада малодка
У варатах стаяла,
У варатах стаяла,
Галубоў зманяла:

Каб мне, младзенькай,
Канапель не брацi,
Каб белых ручак
Да мне не марацi.

### Ой, да прадай, бабушка, бычка...

— Ой, да прадай, бабушка, бычка.**
Вот бычка, вот бычка, вот бычка, бычка, бычка.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы двойчы.
** Першы радок кожнай страфы паўтараецца двойчы.

— Ну якога?
— Палавога.
— Ён у мяне палавы, ён у мяне дарагі:
Яго не прадам!

— Ой, да прадай, бабушка, бычка.
Вот бычка, вот бычка, вот бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Рабога.
— Ён у мяне рабы, рабы, ён мне робіць вілы, граблі;
Ён у мяне палавы, ён у мяне дарагі:
Яго не прадам!

— Ой, да прадай, бабушка, бычка.
Вот бычка, вот бычка, вот бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Шэрага.
— Ён у мяне шэры, шэры, зачыняе вокны, дзверы;
Ён у мяне рабы, рабы, ён мне робіць вілы, граблі;
Ён у мяне палавы, ён у мяне дарагі:
Яго не прадам!

— Ой, да прадай, бабушка, бычка.
Вот бычка, вот бычка, вот бычка, бычка, бычка.
— Ну якога?
— Лысага.
— Ён у мяне лысы, лысы, ён памые лыжкі, місы;
Ён у мяне шэры, шэры, зачыняе вокны, дзверы;
Ён у мяне рабы, рабы, ён мне робіць вілы, граблі;
Ён у мяне палавы, ён у мяне дарагі:
Яго не прадам!

— Ой, да прадай, бабушка, бычка.
Вот бычка, вот бычка, вот бычка, бычка, бычка.
— А якога?
— Бурага.
— Ён у мяне буры, буры, заганяе свінні, куры;
Ён у мяне рабы, рабы, ён мне робіць вілы, граблі;
Ён у мяне шэры, шэры, зачыняе вокны, дзверы;
Ён у мяне лысы, лысы, ён памые лыжкі, місы;
Ён у мяне палавы, ён у мяне дарагі:
Яго не прадам!

**Жаніцьба Цярэшкіна...**

Цярэшка, бяда, бяда,
Далі мне старога дзяда.
Мой жа ж ты дзядулечка,
Я ж твая бабулечка.

Цярэшка, Цярэшухна,
Цераз бор дароржанька
Бітая, таптаная,
Я ў мамкі каханая;
Я ў мамкі каханая,
У татулькі прыбраная.

Божа ж мой, вяліка бяда,
Далі мне старога дзяда.
Дзед бабу тапіць вядзець,
А баба крычыць, не йдзець:
— Мой жа ты дзядулечка,
Я твая бабулечка!
Не ўсхадзі, зоранька, рана,
Можа, каму ночанька мала.
Мне, маладзе, ночка надаела,
Што з мілым усю ночку сядзела.
Пайду я у ток, у ток,
Знайду я курэй куток,
Пеўніка ніводнага,
Усе курачкі зводныя.
Вы, куркі, не сакачыце,
Галовак не клапачыце:
Маю я рэшата пер'я,
Куплю вам пеўніка-пеўня.
Маю я ад бога надзею,—
Прыйдзе мой мілы ў нядзелю.
Не ў гэту, ў другую,
Для яго абед згатую.
На стаўпе каплун пячоны,
А ў ступе перац таўчоны,
На стале пляшка гарэлкі,
За сталом паніч з паненкай.

Пайду я прасты глядзець,
Як мая міла прадзець
Тоненька-танюсенька,
З пальчыкам раўнюсенька.

Пасядзі, мой мілы, у кутку,
Пакуль я штонікі вытку,
Выткаўшы, ды пашыю
На сваю белу шыю.
Пайду я кароў даіць,
А за мной Давыд бяжыць.
Бадай це, Давыдзіла,
Як я цябе не відзела,
Бадай це качук узяў,
Як ты мой хвартух падраў.

Мой жа ж ты татулечка,
Прадай ты каровачку,
Прадай ты каровачку,
Купі мне шнуровачку.
Прадай ты каровачку,
Купі мне шнуровачку.
Дзевачкі, чаху, чаху,
Што ў нашым мяху, мяху?
Шпілечкі, іголачкі,
Залатыя пярсцёначкі.
Пасядзі, дзедка, у кутку,
Пакуль я кросенцы вытку.
Выткаўшы, бяліць буду,
Выбеліўшы, шыць буду.
Прышыю белы каўнер,
Каб мой дзедка быў жаўнер.

Раскажу вам, дзеўкі, расказ.
Ездзіў мой татка на кірмаш.
Ён жа мне сукенку купіў,
Каб мяне дзядулька любіў.
Купіў мне белы варатнік,
Каб ад мяне дзедка не адвык,
А хустачку — цветную,
Каб была заметная,
Каб мяне дзядулька пазнаў,
Каб мяне бабулькай зваў.
А ў нашай вулачцы
Стаіць конь вараненькі.
А на гэтым коніку
Прыехаў мой міленькі.
Я свайго дзедку не знала,
Я яго тады не ждала.

Як буду цяпер яго знаць,
Буду я яго праважаць.
Дам яму букецік цвятоў,
Каб ка мне ў нядзельку
прыйшоў.
Дам яму руцяны вянок,
Каб ён помніў, дзе мой дамок,
Скажу яму некалькі слоў:
— Гуляй, мой дзядулька,
здароў!
Я свайго дзядульку люблю,
Я яму падарак куплю,
Куплю залатое кальцо,
Каб сказаў мне адно слаўцо.
Скажы слаўцо слаўнае,
Ці буду нараўная.
Скажы слаўцо смелае,
Ці буду я мілая.
Падайся, дзядулька, падайся,
На другіх не заглядайся.
Хоць жа я няладная,
Хустачка ядвабная,
Хвартушок картуновы,
Падайся, дзядулька чарнабровы.
Пад акном явор, явор,
Мой дзедка не ровен са мной.
Прыміце явар з-пад акна,
Дайце мне дзядульку, як я,
Хоць росту ніжэйшага,
Гонару вышэйшага.

Пайду я каля саду,
Выламлю вінаграду.
Вінаград не ломіцца,
Дзядулька не ловіцца,
Пайду я ў сад глядзець,
Дзе мая рожа расцець.
Расцець рожа і каліна,
Мой дзядулька, як маліна:
На нагах боцікі блішчаць,
У кішэні грошыкі бразджаць,
У яго кудрачкі ўюцца,
За яго дзевачкі б'юцца.
Цвіцела рожа, цвіцела,

Далі мне, каго хацела.
Цяпер жа пагуляю,
Як рыбка па Дунаю,
Выйшаўшы, страхануся,
Дзядульку наругнуся.
Пайду я глядзець, глядзець,
Як мая бабулька прадзець.
Прадзець жа танюсенька,
З пальчыкам раўнюсенька.
Зялёна рутачка на акне,
Не ровен мой мілы ка мне:
Ён росту вышэйшага,
Гонару ніжэйшага.

Прыміце рутачку вы з акна,
Дайце мне мілага, як я:
Хоць росту ніжэйшага,
Гонару вышэйшага.
Пастаі, мой мілы, ў кутку,
Пакуль я кашульку вытку
Белу-бяленькую.
Тонкую-таненькую.
Шыючы, пакараціла,
Золатам надтачыла.
Пайду я каля саду,
Найду я курэй стада,
Найду я курэй стада,
Пеўніка ніводнага.
Вы, куркі, не сакачыце,
Галовак не клапачыце:
Маю я рэшата пер'я,
Куплю вам пеўніка-пеўня.
Смачная рыбачка шчучка,
Мяккая мілага ручка;
Смачная рыбачка акунь,
Ды скажы мне, мілы, адкуль;
Смачная рыбачка карась,
Пацалуй, мой мілы, хоць раз.

### Яшчар...

Сядзі, сядзі, яшчар,
　　Гэй, нам, гэй!
На залатым крэсле,

На ліпавым дзенцы
У руцяным венцы.
Бяры сабе панну,
Каторую хочаш,
Каторую любіш:
Ці ту, што ў панчошках,
Ці — што ў чаравічках,
Ці за русу коску,
Ці за белу ручку!
Яшчар салгаў,
Панну не ўзяў:
Ні ту, што ў панчошках,
Ні — што ў чаравічках,
Ні за русу коску,
Ні за белу ручку!
Сядзіць яшчар на куце,
Дзяржыць вянок на руцэ.
— А яшчар-паночак,
Проша мне аддаць вяночак,
Я па расе хадзіла,
Па красачцы збірала,
Я вяночак звівала.

## БАЛАДЫ

### На бітым гасцінцы...

На бітым гасцінцы...
Карчомка стаяла,
Карчомка стаяла,
Тынам тынавана.

А ў той карчомцы
Дзве музыкі йгралі,
Дзве музыкі йгралі,
Малойцы гулялі.

Ой, адзін малойчык
Не п'е, не гуляе,
Не п'е, не гуляе,
Дзеўку намаўляе:

— Ой, едзьма, дзяўчына,
З намі, малайцамі,
Будзе табе лепей,
Як у тваё мамы.

А ў свае мамы
Работу рабіці,—
З намі, малайцамі,
Мёд, гарэлку піці.

А ў свае мамы
Кашулі латаны,
У нас будзеш насіць
Шоўкам вышываны!

Дзеўка паслухала,
Села паехала,—
Павязлі дзяўчыну
Гарамі, лясамі.

Павязлі дзяўчыну
Гарамі, лясамі.
— Варочайся, дзеўка,
Ты да свае мамы!

— Ой, я не вярнуся,
Сораму баюся,
Каго палюбіла,
Таго пільнуюся!

Ехалі казакі,
Гарамі, лясамі,
Прывязалі дзеўку
Да сосны касамі.

Выкрасалі агню
Трыма палашамі,
Запалілі сосну
Зверху з каранямі.

Ой, тая сасонка
Ды стала гарэці,
Малада дзяўчына
Стала гаварыці:

— А хто тут начуе,
Няхай голас чуе,
Мяне, маладую,
З агню выратуе.

А хто дзеці мае,
Няхай навучае,
Да тае карчомкі
Гуляць не пускае,

Бо тая карчомка —
Вяліка здрадніца,—
Была дзеўка добра,
Стала паскудніца.

### Гэй, там пры дарозе...

Гэй, там пры дарозе
Каліна стаяла,
А на той каліне
Зязюля кукавала.

Яна кукавала,
Усю праўду казала,—
Маці свайго сына
У войска выпраўляла:

— Ідзі, мой сыночак,
Доўга не бадзяйся,
Цераз два гадочкі
Дамоў варачайся.

Вось праходзе годзік,
Другі наступае,
Маці свайго сына
З войска дажыдае.

А на трэці годзік
Прышоў ён дадому,
Прышоў ён дадому
З сваёю жаною.

Пасадзіла сына,
Дала піці, есці,
Нялюбай нявестцы —
На парозе сесці.

Дала маці сыну
Чырвонага віна,
А чужой нявестцы —
Горкую атруту.

Сын віна не выпіў,
Пад столічак выліў,—
Горкую атруту
Напалам ён выпіў:

— Вось, не ўмела ж, маці,
Ты нас сустракаці,
Дык сумей жа, маці,
Ты нас пахаваці!

Пахавала сына
Ў вішнёвым садочку,
А чужу нявестку —
Ў лазовым кусточку.

Пасадзіла сыну
Чырвону каліну,
А чужой нявестцы —
Горкую асіну.

Чырвону каліну
Слязьмі палівала,
Чужую нявестку
Штодзень праклінала.

### А дзе месяц, дзе зара...

А дзе месяц, дзе зара,
Там гуляла ўдава,
Ой, люлі, люлі,
Там гуляла ўдава.

Там гуляла ўдава,
Парадзіла сыны два,
Ой, люлі, люлі,
Парадзіла сыны два.

Ў чорны полак спавіла
І ў карабец злажыла,
Ой, люлі, люлі,
І ў карабец злажыла.

І ў карабец злажыла,
У ціхі Дунай пусціла,
Ой, люлі, люлі,
У ціхі Дунай пусціла.

Ах ты, ціхенькі Дунай,
Маіх двух сынкоў прымай,
Ой, люлі, люлі,
Маіх двух сынкоў прымай!

На дваццатым на гаду
Пайшла ўдоўка па ваду,
Ой, люлі, люлі,
Пайшла ўдоўка па ваду.

Стала ўдоўка ваду браць,
Стаў карабец падплываць,
Ой, люлі, люлі,
Стаў карабец падплываць.

А ў тым у карабцы
Два ўдалыя малайцы,
Ой, люлі, люлі,
Два ўдалыя малайцы.

Адзін стаіць на часу,
Чэша русую касу,
Ой, люлі, люлі,
Чэша русую касу.

Другі стаіць у чаўне,
Падганяе воду мне,
Ой, люлі, люлі,
Падганяе воду мне.

Падганяе воду мне
І пытаецца ў мяне,
Ой, люлі, люлі,
І пытаецца ў мяне.

І пытаецца ў мяне:
— А ці пойдзеш за мяне?
Ой, люлі, люлі,
А ці пойдзеш за мяне?

— Я за цябе сама йду,
За другога доч даю,
Ой, люлі, люлі,
За другога доч даю!

— Яшчэ ж мяне бог сцярог,
Што з мамкаю спаць не лёг,
Ой, люлі, люлі,
Што з мамкаю спаць не лёг!

— Яшчэ ж мяне бог укрыў,
Што я сястры не накрыў,
Ой, люлі, люлі,
Што я сястры не накрыў!

**Бандароўна...**

1

Хадзіў, блудзіў Бандарэнька
Сем лет па Валыні,
Прыблудзіўся Бандарэнька
І к ліхой гадзіне.
Не хацеў жа Бандарэнька
На Ўкраіне жыці,
Ды пайшоў жа на Палессе
Панкоў-ляшкоў біці.
Узыграйце, музыканты,
А я пайду ў танцы,
Адступіцеся, ўражы панкі,
Каб вас з'елі пранцы!

2

У Кіеве на базары
Дзеўкі табуном ходзяць,
Маладую Бандароўну
Пад ручанькі водзяць.
Скуль узяўся пан Канеўскі,
Тупае нагою,
— Пойдзем, пойдзем, Бандароўна,
Гуляці са мною.
— Ой, хоць тупай, хоць не тупай
Праваю нагою,
Недастоен, пан Канеўскі,
Гуляці са мною.

3

У Кіеве на базары
Гаварылі ціха:
— Уцякай, уцякай, Бандароўна,
Бо будзе табе ліха.
Пабегла Бандароўна
З места ўцякаці,
А за ёю два лакеі
Яе дагнаці.
Пабегла Бандароўна
З высокага мосту,

Азірнулася кругом сябе,
Ці вялікага росту.
Пабегла Бандароўна
К глыбокаму броду,
Азірнулася кругом сябе,
Ці харошага роду.
Хутка ўзялі Бандароўну
За правую руку
Ды павялі, нешчасліву,
На вялікую муку.

4

Пасадзілі Бандароўну
На залатым крэсле,
Каб спявала Бандароўна
Жаласныя песні.
Ох, як стала Бандароўна
Песенькі спяваці,
Дык стаў пан Канеўскі
Ружжо заражаці.
Як ударыў Бандароўну
Пад правае вуха,
Дык і стала Бандароўна
І нема і глуха...
Як загадаў пан Канеўскі
Дол ёй капаці,
Для маладой Бандароўны
Мурам мураваці.
А як прышла Бандарыха,
Спляснула рукамі,—
Прапала ж ты, мая дачушка,—
Залілася слязамі.
А як прышоў стары Бондар,
Траснуў барадою,—
Прапала ж ты, мая дачушка,—
Заліўся слязою.

**Наляцелі жураўлі...**

Наляцелі жураўлі,
Селі-палі на раллі.
Сталі раллю капаць
І ў раллі пытаць.

Лепі сяўба ранняя,
Нечым тая позная;
А на ранняй пшаніца,
А на позняй мятліца.
Лепі жонка першая,
Нечым тая другая.
З першай жонкай дзяцей меў,
З другой жонкай гадаваў,
А з трэццяй разагнаў:
— Ідзіце, дзеці, служыці,
Чым мачысе гадзіці.
А ў Полацку на рынку
П'ець казачак гарэлку
З маладой дзяўчынай.
— Шынкарачка молада,
Дай мне мёду гарцы два.
— Застаў жа мне свой жупан,
Тагда мёду табе дам.
— Нашто табе мой жупан,
Калі ў мяне грошай жбан.
— Я за цябе дзеўку аддам.
У карчомцы згукалі,
А ў царкве абвянчалі,
У пасцелі спаць клалі.
Пытаецца дзяціна:
— Адкуль родам дзяўчына?
— А я з сяла сялянка,
Я з горада мяшчанка
Па прозвішчу Карпанка.
Пытаецца дзяўчына:
— Адкуль родам, дзяціна?
— Я з сяла селянін,
Я з гораду мешчанін
Па прозвішчу Карпін сын.
Яшчэ ж мяне бог сцярог,
Што з сястрою спаць не лёг,
Яшчэ ж мяне бог укрыў,
Што я сястры не накрыў.
— А брацітка мой радной,
Як мы будзем цяпер жыць?
— А сястрыца, родная!
Пойдзем мы гарою
Пойдзем мы гарою,
І рассеемся травою.

— А на Івана Купалу
Пойдуць дзеўкі траву рваць,
Пойдуць дзеўкі траву рваць
І нас з табой успамінаць:
— А вот тая травіца,
Што брацітка з сястрыцай.

**Крапіўка мая стрыклівая...**

Крапіўка мая стрыклівая,
Свякроўка мая журлівая,
А журыць мяне як дзень, так ноч.
Пасылаець мяне сквозь ноч упроч.
— Не ідзі, нявестка, дарогаю,
А ідзі, нявестка, далінаю
І стань, нявестка, калінаю.
Будзіць мой сынок з вайны ісці,
Будзіць над калінкай дзівавацїся,
Прыдзе ў двор, будзе пытацїся:
— Ай маць мая раднюсенька,
Ой, відзеў я дзіва дзіўнюсенька:
Стаіць каліна чырвоная,
Без ветру яна шатаецца,
Без дажджу яна абліваецца.
— Вазьмі, сыночак, тапарочак,
Ссячы калінку пад каранёчак.
Ён раз секануў — пахілілася,
У другі раз секануў — трэскі пашлі,
А ў трэці секануў — прамовіла:
— Не калінку сячэш — жану сваю,
Не трэскі ляцяць — дзеткі твае.
Прыйшоў ён у двор, пытаецца:
— Ой маці мая раднюсенька,
А дзе мая жана ды мілюсенька?
— У кароўнічку яна кароў доіць.
Пайшоў паглядзеў — яе там нет.
— Ой маць мая разлучніца,
Разлучыла мяне з жаной маёй.
Лежачы пад сонцам, не піці мне вады,
А слухаючы матку, не мець мне жаны.

## Жыла ўдоўка на адзіноцы...

Жыла ўдоўка на адзіноцы,
Жаркае соўнінька ўзыходзіць! *
Было ў яе дзевяць сыноў,
Дзевяць сыноў, дзесята дачка,
Дачушка Настулечка.
Сыны ўзраслі — ў разбой пашлі,
Дачка ўзрасла — замуж пашла.
За купчыка, за галубчыка.
Жыла гадок, жыла другі,
На трэці гадок заташнелася,
К мамцы ў госці захацелася.
— Ах ты, купчык, ты галубчык,
Паедзем жа к мамцы ў госці.
Ён жа коні запрагаіць,
К мамцы ў госці ад'язджаюць.
Едуць поле і другое,
На трэцяе ўз'язджаюць,
Цёмная ночка абнімаіць.
Яны шатры распінаюць,
Яны кастры раскладаюць,
Купчанятка спаць укладаюць.
Стучыць, гручыць дарожанька,
Шуміць, шуміць дубровачка,
Едуць, едуць разбойнічкі.
Яны купца загубілі,
Купчанятка зарэзалі,
А купчавую спаць палажылі.
Восем разбойнікаў спаць уляглося,
А дзевяты не ўсыпаіць,
У купчыхі распытываіць:
— Адкуль, адкуль, купчышачка,
Ці багата атца-маці,
Ці вялікага ты роду?
— Атца-маці небагатага,
Жыла ўдоўка на адзіноцы,
Было ў яе дзевяць сыноў,
Дзевяць сыноў, дзесята дачка,
Дачушачка Настусечка.
Сыны ўзраслі — ў разбой пашлі,
Дачка ўзрасла — замуж пашла

* Прыпеў «Жаркае соўнінька ўзыходзіць!» паўтараецца пасля кожнага радка.

За купчыка, за галубчыка.
Жыла гадок, жыла другі,
На трэці гадок заташнелася,
К мамцы ў госці захацелася.
Я купчыка ўгаварыла,
Мы паехалі к сваёй мамачцы.
Едзем поле і другое,
На трэцяе узʼязджаем...
— Устаньце, ўстаньце, мае братцы,
А што жа мы надзелалі,
А мы швагру загубілі,
Племянятку зарэзалі,
Мы сястру асірацілі.

### Пайшла Ціхоня ў места...

Пайшла Ціхоня ў места,
Там яе малойцы палюбілі,
Мёдам, віном напаілі.
Старшы братка увідзеў,
Прыйшоў мамцы паведаў:
— Мамка мая родная,
Ужо наша Ціхоня ў месце,
Там яе малойцы палюбілі,
Мёдам, віном спаілі.
Прыйшла Ціхоня дадому,
Стала яе маці караці:
— Лепей бы ты, Ціхоня, утанула,
А я бы ручкамі спляснула.
Пайшла Ціхоня па ваду,
Паставіла вёдра на ляду,
Сама ў Дунай утанула.
Младшы братка ўвідзеў,
Прыйшоў мамцы паведаў:
— Мамка мая родная,
Ужо наша Ціхоня ўтанула.
Мамка ручкамі ўспляснула
Каля Дунаю ходзячы,
Белы ручкі ломячы.
— Мае ж вы белыя абрусы,
Мае беленькія ручнічкі,
Што ж мне з вас рабіці:
Ці дарожку усцілаці
К свайму міламу дзіцяці?

## Ой, ў Слуцку на рыначку стала навіна...

Ой, ў Слуцку на рыначку стала навіна —
Маладая дзяўчыначка сына павіла.
А спавіўшы, яна сына ў Дунай пусціла.
Ой, плыві ты, шчука-рыба, і маё дзіця,
А я ешчэ пагуляю за млода дзяўча.
Аж там ідуць рыбалоўцы рыбачку лавіць,
Не злавілі шчучкі-рыбы — злавілі дзіця.
Ой, панеслі тое дзіця да Атманіхі.
Й Атманіха — велька пані, яна раду дасць.
Заказала ўсім дзевачком на гулянне стаць.
Усе дзевачкі ідуць, на галоўках вяночкі нясуць.
Адно тая дзяўчыначка адна ззаду ідзе
І на галаве вянка не нясе.
Узялі дзяўчыначку пад белыя бокі,
Ой, панеслі дзяўчыначку да горшай мукі.
Да за ёй яе матка плачучы ідзе:
— Дзіця таё радчона траціці вядуць.
— Матка ж мая радненька, маеш дома пяць,
Не пускай жа на гулянне, няхай дома спяць.
Матка мая родненька, маеш дома дзве,
Не давай жа ім патолі так, як дала мне.
Ой, дала мне патолі, дала змалку,
Цяпер цярпі, мая матка, па мне зняслаўку.
Гэта ж табе, матка, перша навука:
Не спраўляўшы вяселля, да гадуй унука.

## Ой, загадалі на вайну...

Ой, загадалі на вайну
Нашаму сялу ўсяму,
Нашаму войту самому.
У нашага войта сыноў нет,
Адна дачушка на раду,
І тоя ехаці на вайну.
— Да спраў жа мне, бацька, востры меч,
Каб доўга было войска сеч.
Скора вайтоўна ўступіла,
Палавіна войска уныла,
Скора вайтоўна махнула,
Дак тоё войска уснула.
Адазваўся каралевіч:
— Ой, каб я ведаў, чый то сын,

Аддаў бы дачку каралеўначку!
— Ой, не пытай, каралевіч, чый то сын,
Я сама панна вайтоўна.
— Калі ж ты есць вайтоўна,
Я ж цябе за сына вазьму,
Я ж табе палавіну каралеўства апішу!
Ой, вайтоўну бацька выпраўляў,
Вайтоўне бацька прыказваў:
— Да не едзь, вайтоўначка, наперадзе!
Вайтоўна бацькі не слухала,
Наперад войска паехала.
Прыехала к сіняму мору,
Трэба таму войску ўплаў плысці...
Скора вайтоўна паплынула,
Пасярод мора ўтанула.
Усе казакі з вайны едуць,
Вайтоўны каня ў руках вядуць:
Вайтоўна бацькі не слухала,
Да ўніз галоўку палажыла.

## Прыехалі да Марусі госці...

Прыехалі да Марусі госці,
А ў Марусі хата на памосце,
А Маруся хворая ляжала,
Чорным шоўкам галоўку звязала.
Адзін кажа: «Я Марусю люблю»,
Другі кажа: «Я Марусю вазьму»,
Трэці кажа: «На каберцу стану».
— Ой, хто ж бо мне трызелле дастане,
Той за мною на каберцы стане.
Адазваўся казак маладзенькі,
Пад ім грае конік вараненькі:
— Ёсць у мяне тры кані на стайні.
Адзін конік, як галка чарненькі,
Другі конік, як голуб сівенькі,
Трэці конік, як лебедзь бяленькі.
Чорным канём мора пераплыву,
Сівым канём войска пераеду,
Белым канём трызелле дастану.
Як стаў казак трызелле капаці,
Стала над ім зязюлька каваці:
— Пашла Маруся із іншым шлюб браці.
Яно шчо казак з лесу выезджае,

Яго Маруся з вяселлем страчае.
Да стаў казак музыкі наймаці,
Узяў Марусю, пайшоў танцаваці.
Узяў Марусю пад левую руку,
Шаблю востру пад правую руку.
Думаў казак, што шабля звінела,
А то ж Марусі галоўка зляцела.
Ото ж табе, Маруся, вяселле,
Не пасылай казака ў трызелле.

### Жана з мужам не ў любосці жыла...

Жана з мужам не ў любосці жыла,
Жана мужа загубіла узяла.
Загубіла, схараніла яго,
Схараніла ў святліцы пад акном,
А пакрыла белым тонкім палатном.
Як пачулі яго брацяткі,
Як пачулі яго родныя:
— Ты, братоўка, ты галубка наша,
А дзе ж дзела ты брацятку нашага?
— Учора ў мяне любы госці былі,
Ён паехаў тых гасцей праважаць.
— Ты, братоўка, ты галубка наша,
А падай нам залатыя ключы,
А пойдзем мы ўсе святліцы адчыняць,
А будзем мы свайго брацііткі шукаць.
— Дзевярочкі, галубочкі мае,
Пацерала залатыя ключы
Ад святліцы да цямніцы ідучы.
— Ты, братоўка, ты галубка наша,
А мы будзем усіх людзей сабіраць,
А мы будзем залатых ключоў іскаць.
— Дзевярочкі, галубочкі мае,
А нашто ж нам ўсіх людзей турбаваць,—
Буду я вам усю праўдачку казаць:
А я з мужам не ў любосці жыла,
А я мужа загубіла узяла.
А выведзіце на вулачку,
А здыміце з плеч галовачку,
Старым-малым на ўдзіўленнейка,
Маладым — на пакаяннейка.

## А з-пад гаю галка вылятала...

А з-пад гаю галка вылятала *,
У каморы мацi сына навучала:
— Чаму жонкі не б'еш, не караеш.
А йдзі, сынку, у новую клетку.
Бяры, сынку, раменную плетку,
Збі, сын, жонку, як чорную галку.
Учора звячора камора звінела,
Ночы спаўночы нагайка гудзела.
Усю ночку жоначка стагнала,
Чуць на зорку — жоначка сканала.
— А маці, маці, парадніца ў хаце,
Парадзіла, маці, як жану скарацi,
Парадзь, маці, дзе яе схавацi.
— А бяры, сынку, варану кабылку,
Уцякай, сынку, на Русь, на Украінку.
— А чаго, маці, я буду ўцякацi.
Я забіў жонку — буду й атвячацi.
— Дык бяры, сынку, сівую кабылку,
І вязі, сынку, жонку у магілку.
Схавай яе, сынку, ў вішнёвым садочку.
Пасадзі ў галоўцы чырвону калінку,
А ў ножках — зялёну яблынку.
Будуць дзеткі цвяточкі ламацi.
Будуць дзеткі мамку ўспамінацi.
Будуць дзеткі яблычкі шчыпацi,
Будуць дзеткі мамачку гукацi.
— Уставай, мамка, малы сынок плачыць.
— Хай жа не плачыць, хай перастаніць,
Няхай жа знаіць, што мамкі не маіць.
— Уставай, мамка, калінкі паспелі.
— Няхай жа спеюць, хай паспяваюць,
Хай калiначку птушкі абіраюць.

---

* Кожны радок паўтараецца.

# ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

*Дзіцячы фальклор* уключае самыя розныя вуснапаэтычныя жанры славеснай і музычнай народнай творчасці — казкі, песні, прыпеўкі, загадкі, калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, скорагаворкі, заклічкі, гульні і іншае, складзеныя самімі дзецьмі або дарослымі для дзяцей. У дзіцячы рэпертуар перайшлі і некаторыя творы, складзеныя дарослымі для дарослых. Жанравая разнастайнасць і асаблівасці дзіцячага фальклору абумоўлены функцыяй, якую ён выконвае як сродак разумовага і фізічнага выхавання дзіцяці ў розныя перыяды яго жыцця. Творы дзіцячага фальклору вельмі простыя па форме і зместу, і ў іх звычайна прысутнічае элемент займальнасці.

Прынята дзіцячы фальклор дзяліць на некалькі груп: 1) калыханкі; 2) творы, звязаныя з гульнёй; 3) творы, не звязаныя з гульнямі і рухам.

*Калыханкі* — адзін з самых старадаўніх відаў творчасці, вядомы усім народам. Галоўная функцыя калыханак — супакойванне дзіцяці, каб яно хутчэй засынала, таму іх мелодыя плаўная, спакойная, рытм найболей адпавядае рытму гушканняў калыскі, змест песенек часта аблямаваны характэрнымі запевамі і прыпевамі «а-а-а», «люлі-люлі», «лялі-лялі», «баю-баю» і інш.

Будучы старадаўняй творчасцю, калыханкі багата захавалі элементаў язычніцтва, магіі. Прырода ў іх адухоўлена, птушкі, звяры і жывёлы надзелены чалавечымі якасцямі. Часцей за ўсё ў калыханках сустракаюцца вобразы ката, мышкі, куркі, голуба, сарокі, зайкі. Характэрнай рысай калыханак з'яўляецца пачуццё пяшчоты, у іх багата матчынай ласкі і любві, цеплыні і замілавання дзіцем. Калыханкі хаця і манатонныя, але светлыя песні. У іх адбілася душа маці, цэлая карціна чалавечага жыцця. Гэта песні і аб сне, які малюецца жывой істотай, што ў выглядзе зморанага спадарожніка блукае па хатах, шукаючы прытулку.

У гульнёвым дзіцячым фальклоры адпаведна ўзросту дзіцяці можна вылучыць розныя творы. Тыповую групу складаюць забаўлянкі, якімі маці

ці бабулькі, перабіраючы пальчыкі ручак і ножак маленькіх, супакойвалі ці пацяшалі іх. Функцыя забаўлянак процілеглая калыханкам: яны павінны весяліць, забаўляць дзіця, узбуджаць яго, рабіць бадзёрым. Пацешкі выконвалі і вялікую педагагічна-выхаваўчую ролю, прывучалі дзяцей разумець дабро, быць праўдзівымі, добрасумленнымі, працавітымі. Праз забаўлянкі дзеці атрымлівалі першыя ўрокі маральна-этычных паводзін чалавека ў грамадстве, засвойвалі мараль, выпрацаваную народам на працягу стагоддзяў.

Найболей народная педагогіка выявілася ў гульнях-песнях з прыпеўкамі, жараб'ёўкамі, лічылкамі, скорагаворкамі. Песні-гульні развівалі ў дзяцей сілу, спрыт, трапнасць, прывучалі да кемлівасці, увагі, разважлівасці, назіральнасці; яны аб'ядноўвалі дзяцей, выпрацоўваючы ў іх пачуццё сяброўства, таварыскасці, калектывізму і справядлівасці. Песні-гульні мелі велізарнае значэнне ў мастацка-спартыўным выхаванні дзяцей.

Дзіцячыя песні тэматычна вельмі разнастайныя, што абумоўлена іх функцыяй і паходжаннем. Асабліва вылучаюцца жартоўныя песні і песні-небыліцы, якія ў сваіх вытоках узыходзяць да фальклору дарослых — песень сацыяльных, сямейна-бытавых, хрэсьбінных, гумарыстычных і сатырычных твораў. Дзівосны свет птушак, жывёл, звяроў, якімі населена жартоўна-сатырычная песнятворчасць, захапляў дзяцей неверагоднасцю падзей, незвычайнасцю паводзін персанажаў. Параўноўваючы, супастаўляючы незвычайнасць ці недарэчнасць паводзін фальклорных персанажаў з акаляючай рэчаіснасцю, дзеці, такім чынам, уцягваюцца ў працэс актыўнага мыслення: самастойна адкрываюць, устанаўліваюць заканамернасці, лагічную сувязь рэчаў, іх рэальны стан.

Творы, не звязаныя з гульнёй, уласна, таксама гульнёвыя творы. Іншая справа, што ў іх увага накіравана не на рухі і дзеянні, а на выяўленне сэнсу, зместу. Характэрнымі для пазагульнёвага фальклору з'яўляюцца заклічкі, кароценькія вершыкі, песенькі, прыгаворкі, з якімі дзеці звяртаюцца да сонца, дажджу, вясёлкі, ветра, раслін, жывёл і г. д. У іх, як і ў калыханках, прыкметна захаваліся элементы магіі, сляды язычніцтва.

Скорагаворкі і лічылкі — гэта чыста славесныя гульні. Характэрнай рысай уласна гульняў з'яўляецца тое, што яны цесна звязаны з вытворчай дзейнасцю чалавека і асабліва з яго земляробчай дзейнасцю. Класіфікацыя гульняў яшчэ канчаткова не выпрацавана, бо іх можна дзяліць у залежнасці і ад зместу, і ад формы, і ад колькасці ўдзельнікаў. У апошніх працах беларускіх даследчыкаў прапануецца дзяліць дзіцячы фальклор на два раздзелы: гульні як мастацка-драматычнае дзеянне і гульні як сродак фізічнага выхавання.

Дзіцячыя гульні — жывая фальклорная з'ява. І раней і зараз яны перажываюць пастаянныя змены (пад уплывам часу, грамадскага і сямейна-бытавога ўкладу), якія адбіваюцца на іх бытаванні, функцыі і змесце.

**Літаратура**

*Грыневіч А.* Беларускі дзіцячы спеўнік. Вільня, 1925.
*Дзіцячы* фальклор. Складальнік Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1972.
*Барташэвіч Г. А.* Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мінск, 1976.
*Гілевіч Н. С.* Наша родная песня. Мінск, 1968, с. 172—178.

## КАЛЫХАНКІ

### А-а, а-а, каткі два...

А-а, а-а, каткі два,
Шэры, белы — абадва.
Адзін, лысы, ловіць мышы,
Другі, буры, ловіць шчуры.
Адзін пайшоў па капусце,
Носіць Свеце сон у хусце.
Апсік, каток, на кірмаш,
А Светачка спацькі ляж.

### Люлі-люлі-люлі...

Люлі-люлі-люлі,
Палез кот па дулі,
Памарозіў лапкі,
Узлез на палаці.
Сталі лапкі грэцца,
Недзе кату дзецца.
Дайце кату папкі
У абея лапкі.
Няхай каток не вурчыць,
А малютка спіць, маўчыць.
Пайшоў каток на вулку,
А ты, дзіця, у люльку.
А я буду калыхаць,
Дзіця будзець спаць.

### Пайдзі, коця, на вулку...

Пайдзі, коця, на вулку,
А дзіця у люльку.
На ката варкота,
А на дзіця дрымота.
На ката безгалоўе,

А на дзіця здароўе.
На ката ўсё ліха,
А ты, дзіця, спі ціха.
Ты, коця, не вурчы,
А ты, дзіця, спі-маўчы.

**Ах ты, коцік, мой каток...**

Ах ты, коцік, мой каток,
У цябе сёранькі хвасток.
Прыйдзі ў хату начаваць,
Маю Волечку качаць.
А я табе заплачу:
Да́м кусочак піражка
І кушынчык малачка.

**Люлі-люлі-люлі...**

Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі куры
З вялікае буры.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі куры сакатаць,
Трэба курам чаго даць.
Ці ячменю жменю,
Ці жыта карыта,
Ці бобу каробу,
Ці гароху троху,
Ці ярыцы паўмяліцы,
Ці грыкі чаравікі,
Ці пшаніцы паўдайніцы,
А дзіцяці — цыцы.

**А-а, люлі-люлі-люленькі...**

А-а, люлі-люлі-люленькі,
Да ляцелі куранькі.
Да ляціце, куранькі, вон, вон,
Да нясіце хлопчыку сон, сон.
Да ляціце, куркі, на вароты.
Да селі-ўпалі на вароцях
У чырвоненькіх чабоцях.
А-а, баю-баю, баю-баю.

### Баю-баю-баінькі...

Баю-баю-баінькі,
Прыбяжалі заінькі.
— Ці спіць ваша дзевачка,
Дзевачка-прыпевачка?
— Ухадзіце, заінькі,
Не мешайце баінькі.

### А-а-а, люлі-люлінькі...

А-а-а, люлі-люлінькі,
Да пабег зайчык у лясочак,
Да знайшоў зайчык паясочак.
Трэба зайчыка паймаці,
Да паясочак адабраці
І хлопчыку аддаці,—
Стане хлопчык спаці.
Да пабег зайчык пад ліпку,
Да знайшоў сабе скрыпку.
Трэба зайчыка паймаці,
Скрыпачку адабраці,—
Стане хлопчык спаці.
Да пабег зайчык пад грушку,
Да знайшоў сабе падушку.
Трэба зайчыка паймаці,
Да падушку адабраці,—
Стане хлопчык спаці.
А-а-а, люлі-люлінькі.

### Ой, баю-баю-баю....

Ой, баю-баю-баю,
Не лажыся на краю.
А ты з краю упадзеш
І галоўку разаб'еш.

### А-а, а-а, малое...

А-а, а-а, малое,
А налета — другое.
Гэта будзе нянька,
А другое — лялька,

Гэта будзе калыхаць,
А малое будзе спаць.
Гэту будзем малаком,
А другую — кулаком.

### Люляй-люляй, дзіця, спаць...

Люляй, люляй, дзіця, спаць,
Няма каму калыхаць,
А я, маладзенька,
Пагуляць радзенька.

### Люлі, малое дзіця...

Люлі, малое дзіця,
Люлі, дарагое.
Бадай жа ты, дзіцятачка,
З калыбелі ўпала,
За табою, дзіцятачка,
Мне гульба прапала.
Мне гульба прапала,
Гуляць волі не стала.

## ЗАБАЎЛЯНКІ

### Ладу-ладу-ладкі...

Ладу-ладу-ладкі.
— А дзе былі? — У бабкі.
— А што елі? — Кашку.
— А што пілі? — Бражку.

Бабулька казала,
Як нас частавала:
— Прыхадзіце часцей,
Пачастую ляпей:

Дам вам сыраквашкі,
Бярозавай кашкі,
Піражкоў у маку
І розных прысмакаў.

## Лады-лады-ладкі...

Лады-лады-ладкі,
Малыя рабяткі
Гарох малацілі —
Цапы паламілі.
Лады-лады-ладкі!
— Дзе былі? — У бабкі!
— Што елі? — Кашку!
— А што пілі? — Бражку!
Кашка — масляная,
Бражка — смашненькая.
Папілі, паелі —
Дамоў паляцелі,
На вароты селі,
«Ладушкі» запелі.

## Кацюты, кацюты...

Кацюты, кацюты,
Ладушкі-ладкі.
— Дзе былі?
— У бабкі.
— Што рабілі?
— Муку малолі.
— Дзе падзелі?
— Мышкі з'елі.
— Куды паняслі?
— Сюды, сюды, сюды.

## Чук-чук, чукавала...

Чук-чук, чукавала,
Пад рэшатам начавала.
Рэшата радзенька,
Дзіцятка маленька.

## Кую, кую ножку...

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Куплю чаравічкі
На ножкі вялічкі.

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
За чатыры мілі
Падковачкі збілі.




*А. Паслядовіч.* У каго дзеткі, у таго і ягадкі

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Дарожка ліхая,
Кабылка кульгае.

**Мышка, мышка, дзе была...**

— Мышка, мышка, дзе была?
— Была ў пана караля.
— Што рабіла? — Лыжкі мыла.
— А што далі? — Кусок сала.

— Дзе паклала? — Пад лаўкаю.
— Чым накрыла? — Халяўкаю.
— Дзе падзела? — Кошка з'ела.

### Ішоў бай па сцяне...

Ішоў бай па сцяне
У чырвоным жупане.
Ці баіць, ці не? — Баіць.
— І ты кажаш — баіць,
І я кажу — баіць.

Ішоў бай па сцяне,
Насіў лапці ў кішане.
Ці баіць, ці не? — Не.
— І ты кажаш — не,
І я кажу — не.

## ПЕСНІ

### Пайшоў конік да вады...

Пайшоў конік да вады,—
Шаўковыя павады,
Вады не напіўся.
— Чаму не напіўся?
— Калодзіцы няма.
— А дзе тая калодзіца?
— Чэрві патачылі.
— А дзе ж тыя куры?
— Каршуны падралі.
— А дзе тыя каршуны?
— У поле паляцелі.
— А дзе тое поле?
— Кветкамі зарасло.
— А дзе тыя кветкі?
— Дзеўкі пашчыпалі.
— А дзе тыя дзеўкі?
— Панічы пабралі.
— А дзе тыя панічы?
— Пайшлі на вайну.
— А дзе тая вайна?
— Пасярод гумна.

### Зайчык маленькі...

— Зайчык маленькі,
Чым ты жывенькі?
— Я і сам дзіўлюся,
Чым я жыўлюся.
Пасадзіў капусту
Ні рэдка, ні густа.
Пайду я рана,—
Капуста парвана,
Пайду я позна,—
У капусце росна.

### А шэрая козанька...

А шэрая козанька,
Тапу-тапу скоранька,
Пераскочыла праз плот
Ды пабегла ўва гарод.
Аб'елася цыбуліцы,—
Крычыць, бяжыць па вуліцы;
Аб'елася часнаку,—
Крычыць, бяжыць па таку.

## ЗАКЛІЧКІ, ПРЫГАВОРКІ

### Сонейка, сонца...

Сонейка, сонца,
Выглянi ў аконца,
Пасвяці нам трошку,
Дам табе гарошку.

### Дожджык, дожджык, секані...

Дожджык, дожджык, секані,
Я паеду на кані.
Дожджык, дожджык, перастань,
Я паеду на Растань.

### Дожджык, дожджык, крапані...

Дожджык, дожджык, крапані,
Бабу з поля прагані.

### Не йдзі, не йдзі, дожджыку...

Не йдзі, не йдзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку.

Ай, люлі-люлі,
Люленькі-люлі.

Пастаўлю пад лаўкаю,
Накрыю лапаткаю.

Пастаўлю пад сенцамі,
Накрыю паленцамі.

Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю.

Талерачка здымецца,
А дожджык унімецца.

### Гары, гары гарка...

Гары, гары гарка,
Прыедзе кухарка.
Кухарка — на карове,
Кухар — на кабыле,
Дзеці — на цялятах,
Слугі — на шчанятах.

### Калода, калода...

Калода, калода,
Калі будзе пагода?
Як цяпер, то ляці,
Як у чацвер, то сядзі.

### Слімак, слімак...

Слімак, слімак,
Выпусць рожкі,
Дам мукі
На пірожкі.

### Калека, калека...

Калека, калека,
Нагрэй чалавека!
Калі не нагрэеш,—
Сама акалееш.

### Каза, каза, дай малака...

Каза, каза, дай малака!
Казёл, казёл, дай дзёгця!

### Жылі-былі мужыкі...

Жылі-былі мужыкі,
Бралі грыбы рыжыкі.

### Да вілася пчолачка...

Да вілася пчолачка,
Пчолачка, пчолачка
У вяршэчку сосанкі,
Сосанкі, сосанкі.

### Ехала ікаўка...

Ехала ікаўка
На сівой кабыле.
Кабыла пала,
Ікаўка прапала.

## ДРАЖНІЛКІ

### Мі-кі-та! Ці ты та?..

— Мі-кі-та! Ці ты та?
— Не я то, мой та-та.
Мікіціха дзяжу месіць,
А Мікіта спіну чэшыць.
Мікіта дровы сячэць,
А Мікіціха бліны пячэць.

Сячэць дровы яловыя,
Пячэць бліны паловыя.
Касы заяц нанёс яец,
Вывеў дзяцей — касых чарцей.

### Наталля — пралля...

Наталля — пралля,
Кузьма-вераценнік.
Пайшоў у бярэзнік,
Сабакі дагналі,
Нагу адарвалі.

### Дзілінь-дзілінь-баў...

Дзілінь-дзілінь-баў!
Саўка прапаў!
Палажылі Саўку
На белую лаўку.
Лаўка трасецца.
Саўка смяецца.
Курачка сакоча —
Савачка рагоча.
Дзілінь-дзілінь-баў!
Саўка прапаў!

### Віця, Віця, Віцяля...

Віця, Віця, Віцяля,
З'еў карову і цяля
І дванаццаць парасят,
Толькі хвосцікі вісяць.

### Сяргей-верабей...

Сяргей-верабей
На кані катаўся,
Рукі, ногі паламаў,
Без штаноў застаўся.

## ЛІЧЫЛКІ

### Раз, два, тры, чатыры...

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

### Раз, два — булава...

Раз, два — булава,
Тры, чатыры — прычапілі,
Пяць, шэсць — кашу есць,
Сем, восем — сена косім,
Дзевяць, дзесяць — сена весіць.

### Раз, два, тры, чатыры...

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Выйшла баба з доўгім носам,
А за бабай сівы дзед,
Запытываець, колькі табе лет.

### Сядзіць немец на паліцы...

Сядзіць немец на паліцы,
Лічыць дзеці на вуліцы:
Айн, цвай, драй —
Міша, вылятай.

### Сядзіць зайчык на прыпечку...

Сядзіць зайчык на прыпечку,
Лічыць дзеці па-нямецку:
— Сцяпан, Лявон,
Выйдзі з хаты вон.

### Первенчыкі...

Первенчыкі,
Другенчыкі,
Кругі,

Другі,
Вон!
Дружэньчыкі,
Бярвеньчыкі,
Я шышаў,
А ты выйшаў.

### Сем семярэй...

Сем семярэй
І сямёра свіней.
Свінка і свінчын брат
І сямёра парасят.

### Саломінка...

Саломінка,
Яромінка
Прэла,
Гарэла,
На мора
Ляцела.
Касцюк,
Масцюк,
Радзівон,
Пайдзі вон.

### Чыкі-чыкі-чыкарок...

Чыкі-чыкі-чыкарок,
Паня, Фёдар-Федарок.
Тлела, гарэла, замуж хацела.
Чырык, башмак,
Барада, лаві.

### Цок-цыгірок...

Цок-цыгірок,
Пана фіда-футарок.
Прэла, гарэла,
Замуж ляцела.
Вусь, барадусь,
Кіслы квас,
Лаві нас!

**Каціласяя торба...**

Каціласяя торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, паляніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?



*Т. Агафоненка.* Лялькі

**Эна, бэна, рэсь...**

Эна, бэна, рэсь,
Кэнтар, мэнтар, жэсь,
Эна, бэна, раба,
Кэнтар, мэнтар, жаба.

**Э-ката, пэ-ката, мэ...**

Э-ката, пэ-ката, мэ,
Абель, дабель, далінэ,
Ікі, пікі, гамацікі,
Клёнц, бонц, заёнц.

### А ты, коцік, не гуляй...

А ты, коцік, не гуляй,
Начовачкі прыбірай!
Начовачкі слізкі,
Вядзёрачкі блізкі.
Круг абарваўся,
А ты так астаўся.

## ГУЛЬНІ

### Палачка-шукалачка

Збіраецца група дзяцей. Выбіраюць аднаго, які будзе ўсіх шукаць (шукальнічак). Рэшта хаваюцца хто куды. Калі ўсе схаваюцца, шукальнічак на ўмоўленым месцы стукае палачкай і голасна гаворыць:

Палачка-шукалачка,
Я йду шукаць.
Каго я першага знайду,
Таго за палачкай пашлю!

Каго першага знаходзіць, той пасля таго, як усе знойдзены, становіцца на месца шукальнічка.

### Гарлачыкі

Збіраюцца дзеці і садзяцца кружком. Выбіраюцца дзеючыя асобы: матка, дачка і кот. Матка ідзе ў поле жаць, а дачка пільнуе ад ката гарлачыкі (гаршчэчкі). Кот падкрадваецца і куляе ўсе гарлачыкі. Прыходзіць дадому матка, бачыць перакуленыя гарлачыкі і гаворыць:

— Божа мой, хто гэта пабараціў гарлачыкі? А знаць жа, гэта прыходзіў кот?

Потым матка лае дачку:

— А ты куды глядзела, куды глядзела?

І б'е дачку. Гульня працягваецца такім чынам да трох разоў. Матка ідзе ў поле, кот куляе гарлачыкі, а матка карае дачку. За трэцім разам матка кідаецца шукаць ката, які ўцякае. Матка, дагнаўшы ката, карае яго для віду.

### У яркі

Для гульні расчышчаюць гладкую пляцоўку і на ёй робяць пяткамі невялікія ямачкі, якія і называюцца яркамі. Яркі размяшчаюцца ў адзін рад, і лік іх залежыць ад ліку ўдзельнікаў. На адлегласці трох крокаў ад

ярак праводзіцца «агонь» — лінія. Потым кожны па чарзе павольна коціць па ярках мячык. Як толькі мячык упадзе ў чыю-небудзь ярку, усе стрымгалоў кідаюцца бегчы ад іх. Гаспадар яркі хапае з яе мячык, падбягае да агню і стараецца «застукаць» каго-небудзь мячыкам.

Каго застукае, таму залічваецца ярка; у адваротным выпадку ярка лічыцца таму, хто кідаў мячык. Калі такіх штрафаў збярэцца столькі, колькі ярак у радзе, тады штрафнога ставяць тварам да сценкі і караюць яго ўдарамі па спіне кулакамі, канешне, не моцнымі, пад такт песні:

Ярка, палка!
Каралёва жонка!
Лезь на палаці,
Стань казыраці,
Будзем у карты граці,
І вечара дажыдаці.

Б'юць мацней і разбягаюцца. Калі прайграўшы каго-небудзь зловіць, гульня пачынаецца зноў з самага пачатку.

## У пераскочкі

Удзельнікі гульні здымаюць шапкі і кладуць іх адна на другую слупікам. Потым у тым жа парадку, як складзены шапкі, пачынаюць скакаць цераз іх, каб не зачапіць шапак нагамі. Калі хто-небудзь зачэпіць шапкі, яго гоняць «скрозь строй». Робіцца гэта так. Усе становяцца адзін за другім і шырока расстаўляюць ногі, а вінаваты паўзе ў іх пад нагамі. Яго ў гэты час б'юць шапкамі.

## У каваля

Выбіраюць з удзельнікаў гульні каваля. Каваль мае скручаную пытку з хусткі або ручніка. На лаве пад шапкай ці яшчэ пад чым хавае якую-небудзь рэч, напрыклад арэх, цыбуліну, гарошыну і г. д. Да каваля падыходзяць па чарзе дзеці і адгадваюць, што схавана. Хто не адгадае ад першага разу, таго каваль б'е пыткай. Так праходзяць усе ўдзельнікі гульні. Калі ніхто з удзельнікаў не адгадае, які прадмет схаваны, тады ўсе б'юць каваля.

## У казу

У казу гуляюць галоўным чынам у полі, у час пасьбы коней — «кала коней». Перш за ўсё выбіраюць пастуха. Робіцца гэта так: шырока расстаўляюць ногі і, схіліўшыся, кідаюць праз іх шапкі назад ад сябе. Чыя шапка ўпадзе бліжэй, той і павінен пасвіць коз. Тады ўдзельнікі ўбіваюць у зямлю слупок, прывязваюць да яго аброць з повадам і даюць пастуху канец пова-

да ў рукі. На такой адлегласці павінен пастух знаходзіцца ад слупка. Потым удзельнікі складваюць ля слупка свае шапкі, якія называюцца козамі.

Пастух бярэ ў рукі дубец або пугу і пасе козы, гэта значыць стараецца не дапусціць, каб нехта падбег да слупка і ўхапіў сваю шапку. Калі ж удасца ўхапіць тры казы (шапкі), пастуха гоняць скрозь строй. Усе ўдзельнікі зноў шырока расстаўляюць ногі, а пастух павінен на карачках бегчы паміж імі. Пры гэтым яго б'юць шапкамі.

### У караля

Перад пачаткам гульні хлопчыкі збіраюць маленькія каменьчыкі. Кожны з удзельнікаў гульні выбірае сабе прыгожанькі каменьчык, які называецца «каралём». Потым яны дамаўляюцца, хто будзе лавіць «пару» — цотную колькасць каменьчыкаў і «лішку» — няцотную колькасць. Пасля гэтага пачынаецца гульня. Адзін з хлопчыкаў бярэ ўсе камні ў руку і падкідвае ўверх; у той момант, калі камні ў паветры, ён паварочвае руку далонню ўніз і ловіць іх верхняй часткай рукі; потым зноў падкідвае каменьчыкі і пераварочвае зноў руку, пры гэтым стараецца злавіць «пару», або «лішку» ў залежнасці ад умоў гульні. А тады каменьчыкі перадаюцца па чарзе ўсім дзецям. Мэта гульні ў тым, каб злавіць болей камняў, пры гэтым кожны кароль пры падліку ацэньваецца ў шэсць камняў. Той, хто больш злавіў іх, мае права першым пачаць гульню ў наступны раз. Удзельнічаць у гульні могуць два-пяць чалавек.

### Прарок

Гульцы выбіраюць паміж сябе прарока і садзяць яго пасярод хаты на ўслоне; тады прароку накрываюць хусткай галаву і ўсе, пабраўшыся за рукі, ходзяць наўкола яго. Па чарзе кожны з гуляючых кладзе руку на галаву прарока, а яшчэ абы-хто выбраны з чарады, калі пакладзе на галаву прарока руку хлапец, кажа «Адам», а калі пакладзе дзяўчына, то кажа «Ева». Тады прарок вяшчуе, што спаткае ў жыцці: аднаму кажа, што будзе багатым, другому, што будзе ўсё жыццё плакаць і г. д.

У гэтай гульні, калі прарок умее добра жартаваць, бывае шмат смеху, весялосці.

### У чыжыка

Гуляюць двое, абодва з палкамі, якія называюцца лаптою. Акрамя таго, робяць яшчэ кароценькую палачку, у чвэрць аршына, і завастраюць у яе канцы. Гэта палачка завецца чыжыкам. Затым на зямлі чэрцяць круг або квадрат і адзін з ігракоў, каму прыйдзецца верх на палцы, становіцца з чы-

жыкам у круг, а другі ідзе ў поле. У кругу чыжык кладзецца на зямлю; ігрок б'е лаптой па востраму канцу яго, і чыжык падскоквае ўверх. У гэты час ігрок павінен ударыць яго так, каб ён паляцеў далёка ў поле. Калі ігрок прымусіць чыжык падскокнуць тры разы і не здолее загнаць яго ў поле, ён прайграў і сам ідзе з круга ў поле, а на яго месца становіцца палявы. Калі ж ён выганіць чыжыка ў поле, палявы павінен пераняць яго на ляту сваёй лаптой. Тады ён ідзе ў круг. Калі ж гэта яму не ўдасца і чыжык упадзе на зямлю, тады ён паднімае яго з зямлі і кідае ў круг. Калі пападзе, сам ідзе ў круг і выбівае чыжыка ў поле.

Дагаворваюцца звычайна на 50 udараў. Хто першы выканае такі лік, ён мае права прымусіць прайграўшага праскакаць на адной назе адлегласць ад поля да мяжы столькі разоў, колькі не выканана ім udараў.

# ЧАСТУШКІ

Частушка — невялікая лірычная песенька з разнастайным зместам, якая складаецца з чатырох (радзей з двух, шасці, васьмі) радкоў і выконваецца на які-небудзь сталы матыў. У народзе частушкі найчасцей называюцца прыпеўкамі. Вядомы і іншыя назвы гэтага жанру: вытанкі, скакушкі, брандушкі, выдрыганцы і інш. Тэрмін «частушка» запазычан з рускай навуковай тэрміналогіі і ўпершыню ў навуковую беларускую літаратуру ўведзен В. Астаповічам.

У сваіх вытоках частушка ўзыходзіць да танцавальных прыпевак, а таксама да прыпевак вясельных і дударскіх. У частушках адлюстраваны многія бакі жыцця дарэвалюцыйнага сялянства. Аднак асноўная тэма гэтага жанру — любоў. У савецкіх частушак прыкметнае месца займае грамадска-палітычная тэма.

Сярод фальклорных жанраў, якія адлюстроўваюць сучаснасць, адно з першых месц належыць частушцы.

Першыя публікацыі беларускіх частушак адносяцца да 40-х гадоў XIX ст.

**Літаратура**

*Карский Е. Ф.* Белорусы, т. 3, вып. 1. М., 1916, с. 379—386.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967, с. 209—225.

*Цішчанка І. К.* Беларуская частушка. Пытанні генезісу жанра. Мінск, 1971.

*Никифоровский Н. Я.* Белорусские песни-частушки. Вильна, 1911.

*Кабашнікаў К. П., Цішчанка І. К.* Беларускія частушкі. Мінск, 1960.

Скора, скора снег растане,
Скора рэчкі паплывуць,
Скора мілага майго
У салдаты забяруць.

Ах ты, міленькі ты мой,
Мы апошні год з табой:
Цябе ў салдацікі здадуць,
Мяне замуж аддадуць.

Гуляй, гуляй, маё дзіцятка,
Астатняе лецечка:
У салдаты аддадуць —
Такой волі не дадуць.

Кіну каменьчык у рэчку,
Не магу яго дастаць,
Гоняць мілага ў салдаты,
Не магу яго даждаць.

Выйду, выйду за вароты,
Пакачаю галавой;
Здалі мілага ў салдаты,
Засталася сіратой.

Вышывала я платочак
Ды не знала каму даць.
Бяруць мілага ў салдаты,—
Яму слёзы выціраць.

Там ты будзеш ваяваці,
Тут я — гора гараваці.
Табе сінія палаці,
Мне цясовыя краваці.

Лясок маленькі з прагаленкай,
З усходу вецярок.
Пагаворым, мой міленькі,
Хоць апошні вечарок.

Наша вуліца шырока,
Уся пасыпана пяском,
Здалі мілага ў салдаты —
Галасіла галаском.

Найдзі, хмара, найдзі, гром,
І разбі казённы дом
І начальніка таго,
Што ўзяў мілага майго.

Усё б я пела, усё б я пела
Розныя прыпевачкі,
Ды цяпер мне не да песень,
Дарагія дзевачкі.

А не ўсё па гору плакаць,
А не ўсё па ім тужыць,
Трэба ж хоць адну часінку
Ды ў вясёласці пажыць.

Пайду скакаць,
Дома нечага кусаць —
Сухары ды коркі,
На нагах апоркі.

Танцуй, Мацвей,
Не шкадуй лапцей.
Лапці новенькія
Дый лазовенькія.

Ой, без дудкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды,
А як дудку пачуюць —
Самі ногі танцуюць.

Не буду плакаць, бедаваць,
Слязамі мора naліваць,
Слязамі мора не нальеш,
А толькі сэрца надарвеш.

Зайграйце, музыкі,
Мае лапці вялікі,
Мне татулька іх сплёў
На святы пакроў.

Як удару трапака —
Лапаткі дзяруцца.
Як прыскочу казака —
Аборачкі рвуцца.

Я і стар — не магу,
Я і слаб — не магу.
Як зайграюць лявоніху,
Ашалеўшы бягу.

А скрыпачка, далі бог,
Не жалей жа маіх ног!
Мае ножкі не баляць,
Яны хочуць пагуляць.

Эх, колькі ж нас —
Адна жменечка!
Пагуляем жа
Харашэнечка.

Пайшла б я казачка,
Ды баюся мужычка,
Жонка скача і пяе,
Мужык плача і кляне.

А чучыла, чучыла,
Мяне маці мучыла,
Як парадак навадзіць,
Бліны ў рэшаце насіць.

Я дадому йшла,
Самавар знайшла;
Любі мяне, панамар,
Падарую самавар.

Каля кузні йшла,
Малаток знайшла,
Любі мяне, кавалёк,
Што знайшла я малаток.

Во цяпер мне пагуляць,
Пакуль грае скрыпка:
Ручкі, ножкі не баляць,
Серадзінка гібка.

А сягоння серада,
Я мяса не ела,
Не цалуйце мяне, хлопцы,
Каб я не самлела.

Танцавала рыба з ракам,
А пятрушка з пастарнакам,
А цыбуля з часнаком,
Красна дзеўка з дзецюком.

Я ля кузні йшла,
Вугалёк знайшла.
Любі мяне, кавалёк,
Падарую вугалёк.

Як пайду я па ваду
І старога прывяду:
У пролубку галавой —
Пагуляю удавой.

Рада, рада была баба,
Што дзед утапіўся.
Ліха ж яму нагадзіла —
За куст ухапіўся.

Каб я сваю жонку меў бы,
Ані піў бы, ані еў бы;
Ані еў бы, ані спаў бы,
Толькі жонку цалаваў бы.

Бацька руды, матка руда,
Браты руды, сястра руда,
І я руды, руду браў,
І руды нас поп вянчаў.

Я па беражку бягу —
Бераг асыпаецца.
Я бяззубага люблю —
Бяззубы не кусаецца.

Дзяўчыначка, люблю цябе,
Не еж хлеба — вазьму цябе.
Не еж хлеба, не пі воды,
Вазьму цябе для выгоды.
— Няхай не есць твая маці,
Калі хочаш мяне ўзяці.

Пашла Гандзя па цыбулю:
— Пастой, Гандзя, пацалую!
Пацалую, не ўкушу,
Бо люблю цябе, як душу!

Не судзіце, добры людзі,
Што я абшарпаўся.
Мой татулька такі быў,
Я па ім удаўся.

А мілашачка мая,
Стаў я разжывацца.
Прадаў сенцы, купіў дзверцы,
Пачаў зачыняцца.

Чаго мілы не вырос,
Чаго малаваты?
— Прыхапіў мяне мароз
Каля тваёй хаты.

Пастарайцеся, дзяўчаты,
Усе канавы засыпаць,
Бо такія хлопцы ходзяць,
Што з канавы не відаць.

А на печы пры лучыне
Дзеўкі грошы палічылі,
Налічылі паўталера
Ды й купілі кавалера.

А ў гародзе грушкі дзічкі,
Мой кавалер невялічкі.
Буду грушкі абіраці,
Кавалера гадаваці.

Мой мілёнак, як цялёнак,—
Толькі б венікі вязаць:
Праводзіў мяне дадому
І не змог пацалаваць.

На гары на хутары
Хлопцы коней путалі.
Путалі, стараліся,
У сваты збіраліся.

Божа, божа, божа мой,
Хто прыгожы, ды не мой,
А хто брыдкі, абшарпаны,
Гэта, мабыць, мой каханы.

А мой мілы хударлявы,
Мне не падабаецца,
Навяжу я на папары,
Няхай ад'ядаецца.

Мой мілёначак харош,
Хоць за пазуху палож.
Палажыла б за душу,
Ды баюся — задушу.

Мы чужыя хаты крылі,
А свае някрытыя.
Чужых дзевак мы любілі,
А свае — забытыя.

Ой, Васілю, Васілю,
Баравое зелле!
Яшчэ замуж не пайду,
Не спраўляй вяселля.

Прыкацілі ка мне сваты
На сівой кабыле,
Завярнуліся назад —
Жаніха забылі.

Ішла дзеўка з Барысава.
— А чыя ж ты? — Дзянісава.
— А як завуць? — Ганусяю.
— А што робіш? — смяюся я.

— Скуль ты, дзеўка? — З-пад Янова.
А чыя ж ты? — Кавалёва.
Ой, я дзеўка над дзяўкамі,
Чаравічкі з падкаўкамі.

Татулечка родненькі,
Купі платок модненькі,
Ды як можна памадней —
Любіць Віцебскі Андрэй.

Дзяўчыначка, мая люба,
Мядовая твая губа.
Адзін разок пацалую —
Тры дні ў роце мядок чую.

А ў майго мілёначка
Худая кабылёначка.
Не даехаў да гары,
Кабылу з'елі камары.

Не хадзіце, дзеўкі, ў лазню,
Не хадзіце парыцца.
Ад гарачае прыпаркі
Пудра ўся адваліцца.

Прадай, мілы, каровачку,
Купі, мілы, шнуровачку.
Без кароўкі прабуду,
Без шнуроўкі не буду.

Мне не трэба камяніцы,
Мне не трэба і святліцы.
Калі мілы па душы,
Пражывём і ў шалашы.



*Р. Кудрэвіч.* Беларускія прыпеўкі

— Ой, чаму ў цябе, дзяўчынка,
Вусны саладзенькі?
— Пакрапіла маці мёдам
Для цябе, міленькі!

Ох ты, міла чарнабрыва,
Чым ты бровы начарніла?
— Я чарніла купарвасам,
Каб любілі хлопцы часам.

Мне не трэба пуд фасолі,
Мне адну фасоліну.
Мне не трэба дзевак многа,
Мне адну вясёлую.

Цалуй раз, цалуй два,
Хоць і дзесяць — не бяда.
Цалавацца усім можна,
Толькі трэба асцярожна.

А мой мілы, кажуць людзі,
Непрыгожы, маленькі
У нядзелю паглядзела,
Ён як кветка аленькі.

Каму Вася, проста Вася,
А мне Васечка.
Каму Вася нехарошы,
А мне красачка.

Мне не трэба пуд гароху,
Толькі дзве гарошынкі,
Мне не трэба многа хлопцаў,
Мне адзін харошанькі.

Мне не трэба пуд мукі.
Мне не трэба сіта.
Мяне мілы пацалуе,
Цэлы тыдзень сыта.

— Ой ты, дзевачка Улляна,
Чаго любіш ты Мілляна?
— Чаго ж яго не любіць,
Ён умее галубіць!

Колькі лесам не хадзіла,
Мацней дуба не знайшла.
Колькі хлопцаў не любіла,
Лепей Вані не знайшла.

Мама, гора, мама, гора,
Аддай мяне за Рыгора:
А ў Рыгора кудры ўюцца,
За Рыгора дзеўкі б'юцца.

На вуліцы скрыпка грае,
Мяне маці не пускае.
— Пусці, маці, паглядзець,
Будзеш сабе зяця мець.

Ты зайграй, мая тальянка,
Трыццаціладовая!
З-за цябе, мая тальянка,
Любіць чарнабровая!

Ванька з Піцеру прыехаў,
Гармонь новую прывёз.
Гармонь новая раве,
Бацька хлеба не дае.
Гармонь мая матушка,
Лепей хлеба-мякушка.
На гармонь як закачу,
Тры дні хлеба не хачу.

Хто ў гармоніку іграе,
Той каровачкі не мае,
Ні кароўкі, ні бычка,
Не хлябае малачка.

Хораша табе, каліна,—
На табе шырокі ліст,
Хораша табе, падруга,—
Цябе любіць гарманіст.

Ты іграеш весяло,
Цябе хваліць ўсё сяло,
Цябе хваліць мая маць:
— Расхарошы будзе зяць.

А гармонька-матушка!
Няма хлебца-мякушка,
Пап'ю кіслага кваску —
Разганю сваю таску.
А гармонька-матушка,
Лепей хлеба-мякушка.

Я ў гармонь як закачу,
Тры дні хлеба не хачу.
А як хлеба не з'ясі,
Дык гармонік прадасі.

Колькі раз я заракаўся
Гэтай нівай не хадзіць;
Спалюбілася дзяўчынка,
Не магу яе забыць.

Колькі зорачак на небе,
Адна зорачка гарыць;
Ёсць і гожых і прыгожых —
Па адной сэрца баліць.

Расці, расці, рабіначка,
Расці, неківайся,
Любі, мяне, дзяўчыначка,
З другім не кахайся.

Я тады цябе забуду,
Дарагая ты мая,
Калі вырасце на камені
Зялёная трава.

Ах ты, Ваня, Ванечка,
Я табе не парачка.
Ты — вялікі, я — маленька,
Ты — мужык, а я — паненка.

Мяне мамачка будзіла,
Нада мною плакала:
— Уставай, мая дачушка,
Я цябе засватала.

Ты не сватайся, Мікіта,
Я прасватана, прапіта,
Плачу, лёс свой праклінаю,
За каго іду, не знаю.

Давай, мілка, сядзем побач,
Давай прыгалубімся,
Усяроўна людзі кажуць,
Што мы з табой любімся.

А божа ж мой, сэрца рвецца,
Што дзяўчына не гарнецца.
А божа ж мой, што рабіць,
Ці пакінуць, ці любіць.

Ваня, Ваня, Ванечка,
Я табе не парачка,
А таму не парачка,
Што жанат ты, Ванечка.

Каб я знала, каб я знала,
Дзе мне замужам бываць.
Памагла б я той свякроўцы
Хоць капусту паліваць.

Не кукуе то зязюленька,
Не саловачка пяе.
Плача то мая матуленька,
Мяне замуж аддае.

Я зато смутна хаджу,
Што я замуж выхаджу.
Ў старонку незнаёмую,
Ў дзярэўню невясёлую.

Я скакала, драпацела,
За старога не хацела,
Бо ў старога барада,
А я — дзяўчына малада.

Ах, ты дуб — я бяроза,
Ах, ты п'ян — я цвяроза,
А ты п'еш, а я плачу,
Маладосць сваю трачу.

Чужа матка ліхадзейка,
Чужы бацька ліхадзей,
На работу гоняць рана,
А з работы — папазней.

Пейце, дзеўкі, як пяецца,
Замуж пойдзем, ўсё мінецца,
Не прыдзецца болей пець —
Нада горушка цярпець.

Не любіцеся, дзяўчаткі,
Налюбілася ўжо я,
За паўгодзіка завяла,
Як кашоная трава.

З неба зорачка упала
У халодную ваду.
Я за п'яніцу папала,
Ей жа богу, прападу.

Ой, вялікае мне гора,
Пайшла замуж маладой.
Чужой матцы на паругу,
Чужым дзецям за прыслугу.

Пей тады, калі пяецца:
Замуж выйдзеш — не
прыдзецца,
Гора шыбне — загаруеш,
Усе песенькі забудзеш.

Пейце, дзевачкі, прыпеўкі,
Як жылося ў мамачкі,
Піла, ела, што хацела.
Спала да заранаčкі.

Цвецікі-букецікі,
Пасохніце, павяніце,
Дзевачкі-падружачкі,
Не раз мяне памяніце.

Мяне мамачка радзіла
Ў полі пад асінаю,
Прыгажосці дала мала,
Долю — нешчасліваю.

Мамачка няродная —
Вячэрачка халодная.
Калі б родная была,
Падагрэла б, падала.

А мой татачка ласкаў,
На вулачку не пускаў.
— Не пушчу, балуешся,
З мальцамі цалуешся.

Ад судніка да судніка
Палюбіла паскудніка.
І не знаю, што рабіць,
Ці пакінуць, ці любіць.

Ой, пайду я на гару,
Нарву зелля румяну,
Хоць сама я непрыгожа,
Прыгожага падману.

Ой, ду-ду, ду-ду,
Радзілася на бяду,
Бог мне долі не дае,
Ніхто замуж не бярэ.

Мяне татка гадаваў,
Хлеба ўволю не даваў,
Каб я шыбка не расла,
Скора замуж не пашла.

За то мяне маці біла,
Каб я хлопцаў не любіла.
Ой вы, хлопцы, любіцеся,
Ды за мяне ляпіцеся.

Каля рэчкі я хадзіла,
Утаптала беражок,
Выбірала тую кветку,
Каб любіў мяне дружок.

Непрыгожая сасна —
Прыгожы падсасоначак,
Непрыгожая сама —
Прыгожы мой мілёначак.

Не глядзіце на мяне,
Што я маленька,
Надзенуся, прыбяруся —
Буду краленька.

А па лесе я хадзіла,
Улюбіла ёлачку:
Ці паверыце, падружкі,
Сохну па мілёначку.

Наша возера шырока,
Птушка кружыць над вадой.
Па вачах мілёнка бачу,
Што смяецца нада мной.

Калі косіш, дык касі
Зялёную траўку,
Калі любіш, дык любі,
Не пускай паслаўку.

Калі любіш, любі дружна,
А не любіш, не жартуй жа.
Не задавай сэрцу тугі,
Ты не возьмеш, возьме другі.

Цераз рэчку, цераз тын
Палюбіў мяне Юстын,
Палюбіўшы, не бярэ,
Толькі жалю задае.

На зялёненькім лужку
Напішу пісьмо дружку,
Напішу па тайнасці,
Што люблю да крайнасці.

А з крыніцы вада льецца,
Бяры, міленькі, на чай.
Як не думаеш жаніцца,
То прашу не прывучай.

Калі любіш, дык любі,
Не кажы нікому.
Цяпер людзі разнясуць,
Як вецер салому.

Не звівайся хмель з ялінай,
Не звыкайся ты з дзяўчынай:
Хораша будзе звыкацца,
Цяжка будзе расставацца.

Каб я знала, не купляла
Зонціка квяцістага.
Каб я знала, не любіла
Мілага фарсістага

А на вуліцы мароз,
Па пяці рублёў авёс,
А пшанічка па рублю,
Адступ, дурань, не люблю.

Не табой трава памята,
Не табе яе касіць.
Не табою я занята,
Не табе мяне любіць.

Колькі печы не паліла
Ды ўсё трэсачкамі.
Колькі хлопцаў не любіла,
Ды ўсё смешачкамі.

У падружкі фартук белы,
А ў мяне ружовенькі.
У падружкі мілы сумны,
А ў мяне вясёленькі.

Сама хатку я зрубіла,
Сама подруб я дала,
Сама мілага любіла,
Сама й ганьбу я дала.

Сядзіць голуб на дубе,
Галубка на вішні.
Скажы, скажы, мой міленькі,
Што ў цябе на мыслі.

Я па кладачцы хадзіла,
Кладачка ўгіналася.
Аднаго толькі любіла,
Восем набівалася.

А ўсе цвецікі жаўценькі,
А мой найжаўцейшы,
А ўсе дружкі міленькія,
А мой наймілейшы.

У мяне голаса не стала,
У дзяўчыны маладой:
Напаіў мяне мілёначак
Халоднаю вадой.

Няма яблынькі пры плоце —
Недзе яблычак сарваць.
Няма мілага на ігрышчы —
Няма з кім і пагуляць.

А божа ж мой, ядыненькі,
Не гаворыць мой міленькі;
А божа ж мой, што рабіць,
Перастаў мяне любіць.

Не капай, тата, карэнні,
Не сушы зялёны сад,
Маё шчасце уляцела
І не вернецца назад.

21 Зак. 3328

Я на лузе дзень касіла,
Касу ў лесе палажыла,
Пад самую пад ёлачку,
Сама пайду к мілёначку.

Закацілась ясна сонца,
Перастала яно грэць,
Аддаліўся мой мілёнак,
Перастаў мяне жалець.

Не знайсці такой бярозы,
А каб дождж не памачыў;
Не знайсці такой любові,
А каб хто не разлучыў.

Ну, няўжо ж не расквітнее
На гары зялёны сад?
Ну, няўжо ж ка мне не вернецца
Мілёначак назад?

Па садочку я хадзіла,
Па саду цвітучаму.
Аддала сваю любоў
Салаўю лятучаму.

Ночка цёмная лягла,
Не пайду дамоў адна.
Дайце правапсатага.
Хлопца нежанатага.

Рана сонейка заходзіць,
За лесам хаваецца.
Рана, мілы, пакідаеш,
Потым будзеш каяцца.

Была торная дарожка,
Стаў зялёненькі лужок.
Была дзеўчына прыгожа,
Ды ссушыў яе дружок.

Ой, пайду я ў лавачку,
Куплю мёду баначку.
Няхай мілы мажацца
І к другім не вяжацца.

Дзе мы з міленькай стаялі,
Там растаялі снягі.
А дзе з ёю мы сядзелі,
Там пралескі зацвілі.

К сіню мору падхадзіла,
Сіне мора пеніцца,
Сіне мора адказала:
— Твой мілёнак жэніцца.

Штосьці мне не верыцца,
Што мой мілы жэніцца,
Жэніцца, вянчаецца —
Любоў мая канчаецца.

З неба зорачка упала
На жалезны сундучок.
Ўся любоў мая прапала
З-за падружчын язычок.

Я на рэчцы хустку мыла,
На бярозу вешала.
Я мілога не любіла,
Загаворам цешыла.

# НАРОДНЫ ТЭАТР

Батлейка, або лялечны тэатр,— самабытны і цікавы від народнай творчасці, якая вядома ў Беларусі з XVI ст. (зараз у жывым бытаванні не сустракаецца). У сваіх вытоках батлейка ўзыходзіць да інтэрмедый школьнага тэатра, абрадавай паэзіі, народных гульняў і танцаў, творчасці скамарохаў. Першапачатковыя паказы батлейкі насілі чыста рэлігійны характар. Пазней, калі яна адышла ад уплыву царквы, рэлігійна-біблейскі змест амаль знікае. Галоўнымі ў паказах становяцца сцэны з гарадскога і сельскага жыцця. Многія беларускія варыянты батлеечных прадстаўленняў насычаны рознымі бытавымі сцэнамі з народнымі песнямі, прыпеўкамі, музыкай, танцамі, анекдотамі, жартамі. Гэта дэмакратызавала прадстаўленні, «абміршчала», надавала ім свецкі характар. Асаблівую ролю ў беларускай батлейцы адыгрывалі сацыяльна завостраныя сцэны, накіраваныя супраць прыгнятальнікаў.

Прадстаўленне складалася з дзвюх частак. Першая — паказ біблейскага эпізоду, звязанага з нараджэннем Хрыста. Другая — жартоўна-сатырычныя сцэны з народнага жыцця, у якіх удзельнічаў звычайна беларускі мужык Мацей з жонкай, казак, шляхціц, яўрэй, цыган, доктар і інш. З пачатку XX ст. некаторыя сцэны (напрыклад, Мацей і доктар) выконвалі не толькі лялькі, але і людзі. Такое прадстаўленне вядома пад назвай «батлей». У гэты час асаблівую цікавасць праяўляла да батлейкі гарадская і вясковая інтэлігенцыя, якая і апрацоўвала тэксты ў адпаведнасці са сваім светапоглядам.

Народныя драмы «Цар Максіміліян» (яе яшчэ называюць «Цар Мамай»), «Лодка» прыйшлі ў беларускі фальклор з рускай народнай творчасці. Яны трапілі ў Беларусь праз салдат, што адбывалі царскую службу, рамеснікаў, сялян-адыходнікаў. «Цар Максіміліян» — сапраўды народная драма, у якой спалучаны элементы літаратурнай творчасці і традыцыйнага народнага драматычнага дзейства.

Аснову канфлікту складае сутыкненне паміж царом Максіміліянам (язычнікам) і яго непакорным сынам Адольфам (хрысціянінам). Цар патрабуе ад сына вырачыся сваёй веры і пакланіцца «кумірскім багам». Пратэст супраць дэспата-бацькі знаходзіў водгук у сэрцы народнага гледача, для якога драма на сцэне асацыіравалася з барацьбой супраць прыгнятальнікаў — духоўных і сацыяльных. Беларускаму гледачу вобраз цара Максіміліяна жыва нагадваў ненавісных ворагаў — езуітаў, духоўных айцоў каталіцкай і ўніяцкай царквы.

**Літаратура**

*Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 3. Спб., 1902, с. 122—131, 132—139, 141—144.

*Барышаў Г. І., Саннікаў А. К.* Беларускі народны тэатр батлейка. Мінск, 1962.

*Усікаў Я. К.* Беларуская камедыя. Ля вытокаў жанру. Мінск, 1964.

## Апісанне батлеечнага прадстаўлення, якое адбывалася ў Рэчыцы, Мозыры, Капаткевічах і Парычах

Прышоўшы ў дом гаспадара перад пачаткам прадстаўлення, адзін з больш спрытных і практычных хлопцаў-удзельнікаў хаджэння з вяртэпам садзіцца ззаду яго і аб'яўляе, што пачынаецца прадстаўленне з Новага запавету аб нараджэнні спасіцеля. Прадстаўленне адбываецца ў верхнім ярусе вяртэпа. Спачатку з'яўляюцца два мужыкі (пастухі віфлеемскія) і кланяюцца нованароджанаму дзіцяці ў пояс і, павярнуўшыся да гледачоў, гавораць: «Мы — пастухі віфлеемскія, знаходзіліся сію ноч на стражы, паслі свой скот; вдруг пры бальшой цемнаце асіяў нас неабыкнавенны свет. Мы іспугаліся, но анёл гасподзен сказаў нам: «Не пугайцеся! Гэта радзіўся цар славы; вы ідзіце і пакланіцеся яму; ён у Віфлееме». Множаства анёлаў увідалі паюшчых: «Слава ў вышніх богу...» Гэта царкоўная песня выконваецца хорам пеўчых пры вярцепе.

Пасля заканчэння спеваў «Слава ў вышніх богу...» пастухі выходзяць. Прыходзяць вешчуны, цары персідскія, кланяюцца нованароджанаму дзіцяці і прыносяць падарункі. Потым яны звяртаюцца да народа са словамі: «Мы валхвы, цары персідскія — з далёкіх стран, не пажалелі сваіх царскіх трудоў і прышлі пакланіцца нованароджанаму младзенцу; мы гэта ўзналі па звяздзе на вастоку, катора нам сапуцтвавала». (Пры гэтых словах спяваецца царкоўная песня: «Волхвы, цари персидския, познаша яве на земли рожденного царя небесного...») Вешчуны кланяюцца і выходзяць. Пасля заканчэння ўсяго гэтага пачынаецца прадстаўленне ў ніжнім ярусе вярцепа аб Ірадзе. Свечка пераносіцца з верхняга ярусу ў ніжні. Павольна паказваецца з-за фіранкі адзін з цароў, які садзіцца на трон, і тут падбягае да яго воін і пытаецца: «Што прыкажаце, ваша вялічаства?» (Цар прыказвае паклікаць

граданачальніка. Воін адразу выходзіць. Уваходзіць граданачальнік.) «Што слышна ў нас?» — пытаецца цар.— «Нічога асобеннага, ваша вялічаства!» — «Як жа нічога! Нарадзіўся новы цар, і я, апасаючыся, штобы ён не заўладзеў маім царствам, павеляваю ўбіць усіх celanародж... 

Праз дзве-тры секунды ўваходзіць воін з дакладам, што дзяцей усіх забілі, плача адна Рахіль і просіць аб памілаванні адзінага сына, што застаўся ў жывых. Воін адпраўляецца за заслону і прадстаўляе жанчыну, якая плача і просіць злітавацца. «Ваша вялічаства,— просіць жанчына,— я паручаю вам свайго сына, вазьміце яго ў сваі палаты, не распітывайце, толькі ліш бы ён быў жыў».— «Да,— адказвае цар,— былі случаі, знаем ужо: і фараон кагда-то распітываў Маісея, а ён потым лішыў яго царства». (Жанчына выходзіць з жаласнай песняй. Хор пеўчых спявае.)

О, Ірадзе ты пракляты! *
Не пашчадзіў ты ў Віфлееме
Ні адзінага дзіцяці;
Ты хацеў убіць Марына сына,
Нашто цябе сатана ўскусіў.
Но божая сіла
Да сяго не дапусціла;
Ты ўбіць Хрыста рашыўся,
А Іосіф з Марыяю
У Егіпет удаліўся.
О, Ірадзе ты пракляты!
Ты яшчэ на свет божы не радзіўся.
У тваім сэрцы сатана пасяліўся.
О, Ірадзе ты пракляты!

(Ірад сыходзіць з трону; уваходзіць яўрэй Бэрка, у старым сваім нацыянальным адзенні, разглядае палацы Ірада, звяртаецца да гледача са словамі: «Ві знаеце, гаспада, сто тут цар зыў, а ціпер уз я купіў гэтые палацы, а сам цар узэ памьёр, гэта яго бог скарау, сто ён насых целых цатырнаццаць тысяч дзетацак перабіў. Я думаю,— працягвае яўрэй,— у гэтым палацы аткрыць тракцір: от тут бацонацак пастаўлю, а тут крэсялька». Потым сам садзіўся на трон і пачынаў танцаваць ад радасці. У хуткім часе з'яўляецца мужык і звяртаецца да гледача са словамі: «Вы не знаеце, гаспада, майго гора. Я ж як наеўся куцці, так ні магу і пайсці: от я ўжо ішоў у волась ік хвершалу, аж едзе валасны пісар, пытаецца ў мяне: «Куды ты едзеш, Змітро?» — У воласць ік хвершалу: баліць, паночак, вельмі мой жываточак. Я ж учора як наеўся куцці, дак не магу пайсці». А пісар кажа: «Хвэршала цяперака няма; ты лепей ідзі ік Бэрку і выпі гарэлкі чвэртку, укінуўшы дроб

* Прыпеў паўтараецца два разы.

канхворы, так не будзеш хворы». Нарэшце мужык звяртаецца да яўрэя: «А, здароў, Бэрка, ну — але ж у цябе і палацы, і чаго ж тут у цябе няма! Аднаго толькі бацькі з мацяраю тут нямашака! Дай жа мне гарэлкі чарку выпіць!» — «Давай зэ гросы!» — «Да я ж ня ўзяў з сабою з дому».— «Цагоз ты ісоў, на веру думаес? Ісцэ я толькі пацын раблю, а ён узэ... музык,



Агульны выгляд Магілёўскага батлеечнага тэатра

трасца яго матары, прысоў і дай яму на веры: прынёс бі цаго мерацку!» — «Пагадзі ж ты, пракляты.., я ж табе наслю, я табе ізраблю, што цябе чорт ухваціць». Мужык выходзіць. «Так п'яніца ўсё страсцае: я табе наслю! Дзе ві бацілі, гаспада, той цорт, дзе ён ес на свеці, хто гэта даказэ!» У гэтую мінуту з'яўляецца чорт, вельмі страшны з выгляду, на ім адзенне з тхаровага меху, твар чорны, з хвастом, на галаве рогі. Чорт хапае Бэрку і нясе з сабой; Бэрка крычыць: «Гвалт!» Гледачы смяюцца. У канцы ўсяго прыходзіць яўрэйка, жонка Бэркі, звяртаецца да гледачоў з пытаннем: «Цы не бацылі мая Бэра?» — «Яго ж чорт ухваціў»,— гаворыць той, хто выконваў увесь час славесныя ролі дзеючых асоб.)

## Апісанне батлеечнага прадстаўлення былой Мінскай губерні

Яшчэ пры цары, калі мы былі малыя, прыязджаў да нас Тумаш з-пад Мсціжа і паказваў лялькі. Помню я, што адну ляльку называлі Ульяна. Лялькі гэтыя ён паказваў са скрыні, у якой было два палы: верхні і ніжні. Спачатку пакажа ў ніжнім, а затым — у верхнім. У скрыні было выразана акенца, каб людзі глядзелі. Перад прадстаўленнем сабіраў грошы, або яйкі ці сала. Людзей ішло вельмі многа, як цяпер у кіно ідуць. Запомнілася мне, як аднойчы паказваў бабу. Баба таўкла масла. Затым падбягае мужык, і таўкуць удвух. Затым падбягае чорт, і так ужо таўкуць, што ўсё разлятаецца. Помню яшчэ, выязджалі на конях гусары і рубалі адзін аднаго. У аднаго адлятала галава і качілася па полу, затым вылазіла змяя і адцягвала мёртвага.

Яшчэ помню, што мужык прыбягаў да бабы, якая таўкла масла, і не памагаў таўчы, а пачынаў сварыцца. Тады прыбягаў чорт і пачынаў іх мірыць. У той час, калі Тумаш паказваў лялькі, яго сын граў на скрыпцы. Быў з імі чалавек, які граў на цымбалах.

Перад прадстаўленнем Тумаш казаў: «Зараз пакажу вам батлейчыкаў». Жонка Тумаша была з нашай вёскі. Гэта Тарасевіч Ульяна Дзям'янаўна. У нашай вёсцы дзеці называлі Тумаша «слепчык», і заўсёды, калі ён прыязджаў, дзеці крычалі: «Прыехаў «слепчык» — прывёз батлейчык».

## Цар Ірад

Вярцеп быў двух'ярусны; верхні паверх уяўляў пячору нараджэння Хрыстова. У ніжнім ярусе адбываліся зямныя дзеянні, пачынаючы з паяўлення Ірада. Ірад сядзіць на троне: да яго з'яўляюцца тры вешчуны. Ён загадвае ім на адваротным шляху з Віфлеема прыйсці да яго і расказаць падрабязна аб нараджэнні спасіцеля. Ірад дарэмна чакае вешчуноў.

Ірад *(звяртаецца да свайго воіна)*

Воін мой, воін,
Воін вааружонны,
Стань перада мною,
Як ліст перад травою,
І слушай мае прыказання.

Воін *(уваходзіць)*

О, грозны цар Ірад!
Пашто свайго вернага воіна прызываешы
І якія грозныя прыказы павеляваешы?

Ірад

Пайдзі ў Віфлеем
І ізбей усіх младзенцаў
Ад двух лет і ніжа.

Воін *(выходзіць і вяртаецца зноў)*

О, грозны цар Ірад!
Па твайму прыказу
Я схадзіў у Віфлеем
І ізбіў усіх младзенцаў
Ад двух лет і ніжа;
Толькі адна старая баба Рахіля
Не дае свайго дзіцёнка біць.

Ірад

Прывядзі яе сяйчас сюды.

Воін выходзіць і зараз жа прыводзіць Рахіль, у чорным з галавы да ног адзенні, з дзіцём на руках, якое жаласна пішчыць.

Ірад

Як ты, старая баба Рахіля,
Смееш не даваць свайго дзіцёнка біць
Маяму вернаму воіну,
Кагда я гэта прыказаў?

Рахіль *(вые)*

Да ён жа у мяне адзін,
Да такой маленькі,
Да ад яго нікому нет зла!

Ірад

А, дак ты мне яшчэ смееш грубіць!
*(воіну)* Калі яе рабёнка!

Воін заколвае дзіця, якое страшэнна крычыць. Рахіль моцна плача.

Хор

Не плач, не плач, Рахеля,
Твае дзіця цэла.

Яно не ўмірала,
А адцвятала.

Ірад *(звяртаючыся да воіна)*

Гані атсюда старую бабу!

Воін праганяе яе ў адзін бок, а з процілеглага ходу з'яўляецца Пустэльнік.

Пустэльнік

О, Ірадзе, Ірадзе,
Полна табе грашыці,
Пара смерці прасіці.

Ірад *(заве воіна)*

Воін мой, воін,
Воін ваaружонны,
Стань перада мною,
Як ліст перад травою,
Слушай мае прыказання!

Воін *(уваходзіць з мечам і спыняецца перад Ірадам)*

О, грозны цар Ірад,
Пашто свайго вернага воіна прызываешы
І якія грозныя прыказы павеляваешы?

Ірад

Прагані адсюда сего старога брадзягу!

Воін праганяе Пустэльніка ў адзін бок, а з другога боку з'яўляецца Смерць з касою і пачынае рэчытатыў.

Смерць

О, Ірадзе, Ірадзе,
Пално табе грашыці,
Пара смерці прасіці!

Ірад з жахам устае з трону, хутка і парывіста.

Вот я к табе прышла —
Настаў твой смертны час:
Склані сваю галаву на маю касу.

І р а д *(просіць адтэрміноўкі)*

Дай атсрочкі адзін год!

С м е р ц ь

Ні на адзін месяц!

І р а д

Дай на адзін дзень!

С м е р ц ь

Ні на адзін час!

І р а д

На адну мінуту!

С м е р ц ь

Ні на адну секунду!

Ірад пакорна схіляе галаву на касу, а Смерць, адсекшы галаву, плаўна выходзіць адным ходам, а з другога — убягаюць чэрці, з візгам і рогатам акружаюць цела Ірада і на чале з вялізным чортам цягнуць яго ў пекла.

Х о р *(паказвае кіпенне пякельнай смалы)*

Жжж... Ззз... Ссс...

Трон стаіць пусты.

А р ы ш а н ь к а *(выходзіць і звяртаецца да гледачоў)*

Ах, ішла з гары — утамілася;
Ішла пад гару — спатыкнулася.
Дайце на царскім месце пасядзець *(садзіцца)*.

С т а р ы *(з мехам за плячамі)*

Ах, Арышанька, дружочак,
Я прынёс це дзеняжак мяшочак,
Толькі дай на тваіх каленях пасядзець,
А ты ў мяне з мяшочка дзеняжкі выбірай.

Арышанька

Садзіся, старычок,
Садзіся, дарагой.

Стары садзіцца ёй на калені. Арышанька выбірае ў яго грошы.

Франт *(з'яўляецца і звяртаецца да гледачоў)*

Ах, пачценняйшыя гаспада,
Как гэта не стыдна,
Как гэта не абідна,
Што стары хрыч з барадой
Сядзіць на каленях у маладой?!

Стары

Ах ты, хрант,
У цябе сапагі ў рант,
Жылетка піке,
А нос у табаке;
Сапог скрыпіць,
А ў кармане трасца кіпіць!
А я хоць стары сядой,
Да дзеняг у мяне мяшок бальшой.
Ступай адсюда прэч!

Стары і Арышанька *(крычаць разам)*

Ступай прэч.

Франт, сканфужаны, выходзіць.

Арышанька *(за кулісамі гаворыць)*

Мілыя музыканцікі,
Сыграйце нам танцікі!

Музыканты іграюць «Па вуліцы маставой...» Арышанька скача рускага. Стары па яе загаду таксама скача, знясілены, ён ледзь не падае. Арышанька, нарэшце, вядзе са сцэны вельмі стомленага старога. Стары кульгае і кашляе на пацяшэнне і смех гледачам.
На сцэне з'яўляюцца Максімка (шукальнік грыбоў) і яго бацька.*

Мужык *(з'яўляецца на сцэне)*

Куды жа гэта я заброў?
Во це на!

* Герой 1812 года.

А гдзе жа Максімка? *(кліча)*
Сын Максім,
А, сын Максім!

Максімка *(за сцэнай)*

Ау, татка!

Мужык

А гдзе жа ты?

Максімка

Да ў лясу!

Мужык

Зачым ты туда папаў?

Максімка

Да грыбы сабіраю!

Мужык

Да што ты, адурэў алі п'яны: якія ноне аб растве грыбы?

Максімка

Да яшчэ якія, падасінавікі!
Хадзі ка мне сабіраць,
А то ўсех аднаму не набраць!

Мужык

У такі-та мароз мне к табе іціць! Не, уж ты выхадзі ка мне скарэй — пара дамоў, а то замерзнем!

Максімка

Не, мне ў лясу цяпло! Да я нікак і заблудзіўся — так і ёсць, заблудзіўся.

Мужык

Дак чытай за мной малітву «Да васкрэсне бог».

Максімка

Да растрэсніць лоб твой, цяцька! Так сцямнела, што ні згі ні віджу.

Мужык

Ну, дак чытай за мной другое!..

### Батлеечнае прадстаўленне на Навагрудчыне

Жаўнер

Здравія жалаем, гаспада, паздраўляем вас з празнікам ражаства Хрыстова, з трыма царамі, я разам з вамі, как будзе круль Гэрад выходзіць, штоб музыка іграла каралеўскі марш, налева кругом! *(Музыка, марш.)*

Гэрад

Ото, выходзіць круль Гэрад, з поколеня юдовэго, ктуры ма под собой чтэры чэнсьці свята: Эўропа, Азыя, Афрыка і Амерыка і ото, засяда на свой трон монарфічны і выдае дэкрэт, жэ цалы сьвят пад моей рэнкай застае... Хто можа быць старшым крулем, нежэлі я? *(Садзіцца на трон. Выходзяць тры каралі.)*

Тры каралі

Тры крулеве, манархове з всходніх краёв пушчаён, сэрца фяры, тшыма, дары, пану дары отдаём... Дарымысень кантантуе, бардзо сэрцэ іх шацуе, за цо нех небо маён... *(Выходзяць.)*

Гэрад

Жаўнежу, жаўнежу, бітны рыцэжу, о заволай мне Ёселя, добрэго фактора...

Жаўнер

Слушаем прыказ! *(Выйшаўшы, вяртаецца з Ёселем.)*

Гэрад

О, Ёселю, Ёселю, добры фактору, о не слыхалэсь о народзэню Мэсыяша?..

Ёсель

Есцэ, крулю найяснейся, не слысалам, есцэ в свое біблі не пацсалам...

Гэрад

А ідзь, попатш, і чым прэндзэй назад повруцай! *(Ёсель выходзіць і зараз жа прыходзіць.)*

Ёсель

Слысалам, найяснейся крулю! Народзілся Мэсыяш в Батлее месцы і бэндзэ цалым светам владоваць...

Гэрад

А то добжэ, о ідзь собе і заволай мне жовнежа, бітнэго рыцэжа... *(Да жаўнера.)* О, жаўнеж, жаўнеж, бітны рыцэжу, ідзь до Батлеі месца, усім дзяткам гловы ўцінай, маему сынові пардона не давай...

Жаўнер
*(выходзіць і зараз жа ўваходзіць)*

Усех пасек-парубаў, вашаму сыну галаву з плеч зняў!..

Гэрад

Маўчы, дурань, стой на часах, як будзе якая пачвара ісці, каб збавіў ад смерці, лепшы чын заслужыш!.. *(Уваходзіць каралева.)*

Каралева *(уваходзячы, плача)*

О, крулю, Гэродзе, велька твая віна! Мендзы дзеткамі сын забіты лежы, цо там за прычыны? Маскі сень плачон, лзы вылевён, вельмі жаль маён, глосэм небо пшэбіваён...

Гэрад

Прэч, прэч з очы моіх, я на то ніц не ўважам, хоц свэго сыночка з свету згладзіў, але за тое сам сябе з крулеўства не зсадзіў...

Каралева

Паментай, крулю-акрутніку, жэ на цэ пан бог смерць нашле!..

Гэрад

Часавой, правадзі барыню дамой!..

Жаўнер

Ступай, ступай, барыня! *(Пайшлі. Уваходзіць Смерць.)*



Батлеечныя лялькі

Гэрад

О, яка то пшэчвара стоі пшэд маімі вачыма?

Смерць

Я смерць касціста,
Маю косу сталісту,
На то косу выострыла,
Жэбы круля до гробу спровадзіла...

Гэрад

О, не фатыгуйся, мая панначка, не фатыгуйся! За твэ злосці дам ці пурпуры злота, пшыкрый свое сухі косці...

Смерць

Чакалам час не малы, чакалам час не длугі, ідзь, крулю, на мое пекельнэ паслугі! *(Смерць здымае касой галаву Гэраду і знікае. Гэрад ляжыць, уваходзіць жаўнер.)*

Жаўнер

Немножэчка паплясаў; свайго барына праспаў, прашчайце, гаспада, усякаму жывому чалавеку смерць страшна! *(Выходзіць. Улятае Чорт.)*

Чорт

О, крулю, крулю зацны, быў над сваім дзяцёнкам бацны, казаў казакам-рыцэжам усім дзяткам гловы ўцінаць, свэму сынові пардону не даваць... *(Захроп, схапіў і панёс Гэрада. Уваходзіць жаўнер.)*

Жаўнер

Пазбыў свайго пана,
Буду піць віно збанам,
Буду піць і гуляць,
Бацьку з маткай успамінаць!
Ці не відалі вы маёй жаны Ганюшы?
Ганюша, душа, пахадзі-ка сюды!
*(Уваходзіць Ганюша.)*

Ганюша

А вот і яна!

Жаўнер *(пяе)*

А хто любіць гарбуза,
А я люблю дыню,
А хто любіць гаспадара,
А я гаспадыню!
Маладыя малодачкі,
Прыхадзіце да мяне,
Запрагайця коні вроны,
Я паеду з вамі!

*(Пяюць гэта ж у другі раз і скачуць. Выходзяць. Уваходзіць 2-гі жаўнер.)*

2-гі жаўнер

Я естэм жовнер з-пад ружнэго вуйска,
Мял собе жона, Анця кохана...
Она мене біла і лаяла, на мне кія шукала...
Я як схвыціў за чупрыну,
Так і жуціў пад пярыну...
Леж там, Анця, ціхо,
Нех ці вэзьме ліхо...
Пуйдзем да Хайкі,
Напіемся гожалкі,
Пару келбас печоных,
Ото называся моя Анця, кохана жона!
Не відзелі вы моей коханэчкі?
*(Уваходзіць Анця.)*

Анця

А вот яна і тут. *(Музка-варбунка, пяюць і скачуць.)*

2-гі жаўнер

Пшыстань, Юрка, да варбунку,
Бэндзем есьці з масла курку,
Бэндзем есьць, бэндзем піць,
Бэндзем хораша хадзіць!..

Анця *(пяе)*

Як пшыстанеш — улан бэндзеш,
Не пшыстанеш — дурэнь бэндзеш...
Дамо каня, мундзір новы
І на спіну кій дубовы...
Дамо каня і кульбаку
І прагонім, як сабаку...

2-гі жаўнер

Анця, Анця, што ты робіш,
За сабою хлопцы водзіш...
За сабою, маладою,
Водзіш хлопцы чарадою...

Анця

Каб я хлопцаў не вадзіла,
Так я босая хадзіла б...
Мяне хлопцы палюбілі,
Чаравічкі мне купілі...

*(Уваходзіць 3-ці жаўнер. Анця ўцякае.)*

3-ці жаўнер

Як ты смееш з маёю жаною плясаць?

2-гі жаўнер

Звініце, гаспадзін,
Хоць я з вашай жонкай паплясаў,
Затое празнічка пазвелічаў,
А за гэта румачку гарэліцы паднясу!

3-ці жаўнер

Я ў вас не спрашваю водачкі, у мяне свае тры грошы ёсць у кішэні. Вот вам!.. *(Ударыў 2-га жаўнера.)*

2-гі жаўнер

Ды вот і вам! *(Ударыў 3-га жаўнера.)*

3-ці жаўнер

Як вам? Я не хлопчык сярод вамі,
Я адлічан галунамі,
Міне гэнэралы знаюць,
Гасудару прэдстаўляюць!..
А ты хто такі, пузаты інвалід?
Не знаеш, як з пораху паліць...
Табе толькі памойніцу чысціць!..
Вот табе, вот табе!
*(Прыбівае жайнера і сам выходзіць.*
*Уваходзіць венгерац.)*

Венгерац

Сянкер, Вэнгер, Ворытанці —
А цо лежы мосі панці?..

Купіл, не купіл,
А потарговаць можна...
Вставай помалюсеньку,
Занюхай моего вэнгерского спірытусу,
Ожывіш сваю душу!.. Нюхай ту...

2-гі жаўнер

Ап-ч-хэ!

Венгерац

Ешчэ раз!

2-гі жаўнер

Ап-ч-хэ!

Венгерац

Ешчэ раз!

2-гі жаўнер

Ап-ч-хэ!

Венгерац

А цо, і на здрове паздравіл,
І не очкі повесэліл! А скажы ж
Ты, мой міленькі, за што ў вас драка
Случылася?

2-гі жаўнер

Як пашлі мы на паядынку,
За сваю собствену жынку,
Як ён ударыў мяне куляю ў бок,
Дык я і зваліўся з ног...

Венгерац

А што табе баліць?

2-гі жаўнер

Галава!

Венгерац

Баліць табе галава,
Абрыць яе дагала,
Тры разы паленам прыўдарыць,
Гарачай вадою ашпарыць,
Вот табе й галава
Будзе здрава! А больш што табе баліць?

2-гі жаўнер

Зубы!

Венгерац

Баляць табе зубы,
Аббіць табе і губы...
Лішку крові не пусціць,
Ялову шышку ў рот забіць...
Вот табе і зубы будуць здаровы!.. Што больш баліць?..

2-гі жаўнер

Жывот, паночку!

Венгерац

Дуб рэж,
Піловіны еш,
Бярозаву кару
Кладзі к жывату...
Не будзеш хварaць.
Будзеш даход браць,
Вазьмі доўбню,
Пайдзі на лядоўню...
На баране ляж,
Невадам накрыйся,
Выпацеіш,
Будзеш здароў...
А за мае труды
Даш два чырванцы!..
Ступай за мною
Пад Бычыху

За Хар'яшыху,
Дзе Хруцкі скасаваў,
За тое сам прапаў...
*(Пайшлі. Уваходзіць 1-я кракавянка.)*

1-я кракавянка

Добры вечар, мое панства,
За выкрэнтасам хадзіла,
Тарбэчку згубіла...
Не жаль тэй тарбэчкі,
Як там было тры перапечкі,
Не тры коноплянэго помэнзаня.
Не відзелі моей товажышкі?
*(Уваходзіць 2-я кракавянка.)*

2-я кракавянка

А вот і яна.

1-я кракавянка

Сконт паненка?

2-я кракавянка *(пяе)*

З Кракова. А паненка?

1-я кракавянка

З Вальбова!
Ці з Кракова,
Ці з Вальбова,
То вшыстко еднакова...
Прошэ паненцы які тэксцік заспеваць!..

2-я кракавянка *(пяе)*

Я в Кракове і бывала,
І бываць я бэнда,
Млодых хлопцаў я кохала,
Так і кохаць бэнда...
Влязэ нагур,
Спуйжэ надол

Обачэ мілэго,
А да бога путрымайце...
Даскачу да него...
Прошэ паненцы!

1-я кракавянка *(пяе)*

А бадай вас
Д'яблы взелі,
Цо вы мне робеце,
Атдаеце до кляштожу,
Так мале дзеце...
А в кляштоже
Тварда ложэ,
Вісі дысцыпліна,
Встае в ночэ,
А полночэ,
А першай гадзіне...
Пане музыканце, проша заграць нам полечке!

*(Музыка грае польку. Патанцаваўшы, яны выходзяць. Уваходзяць Антон, Антоніха. Антон вядзе казу.)*

Антон

Антон, Антон...
Казу вядзе...
Тыц-мыц, тыц-мыц,
Каза ня йдзе...
Антоніха папіхае,
На табаку зарабляе...
*(Да казы.)*
Вадзіў я цябе па Стаўпішчы
І па Гарадзішчы,
Прывёў на Міколу да Міра,
Ці не дасць бог купца якога,
Галёндара...
*(Уваходзіць Ёсель.)*

Ёсель

Добры вечар, пане Антон!..

Антон

Добры вечар, пане галендару!..

Ёсель

Ці прадаеш сваю козачка?

Антон

Прадаю.

Ёсель

А што ты хочаш за яму?

Антон

Тры таляры і паўкварты гарэлкі...

Ёсель

А дойная твая козачка, плодная?

Антон

Каб твая жонка так пладзілася і даілася... Па тры гарцы малака дае і па чэцвера казянят у год водзіць...

Ёсель

А можна яе паштурхаць, пабурхаць пад бок?

Антон

Штурхай, няхаў цябе хвароба бурхае...
*(Ёсель штурхае казу, а яна б'е рагамі яму пад бакі.)*

Ёсель

Антон, Антон, ліха матары! Каза мне два рэбры выбіла, прымі сваю казу... *(Уцёк.)*

Антон *(беручы казу)*

Вадзіў я цябе па Стаўпішчы
І па Гарадзішчы,
Прывёў на Міколу да Міра,

Даў бог купца-галяндара
І таго адбіла...
Вось упрагу цябе я ў баляскі
Ды насцёбаю!..
Пашла за мной!..

*(Антон, Антоніха і каза выходзяць. Уваходзіць важаты з мядзведзем.)*

В а ж а т ы

О, варвуля, Максімуля, патанцуй! Пакажы,
Як малыя дзеці на паншчыну йдуць...
О, пакланіся пану гаспадару,
Пані гаспадыні,
Нех дасць пару келбас
І ковал сланіны,
І на рэнчку з пенць рубэльку!..

М я д з в е д з ь

А-у-у-у... А-у-у-у...

*(Выходзяць. Уваходзіць Пельгжым са скарбонкай.)*

П е л ь г ж ы м

Я естэм Пельгжым,
По цалым свеце пельгжымовал,
Сам собі дзівовал...
Прошэ, панове... *(збірае грошы)*. Прошэ панове...

*(Апускаецца заслона.)*

**Слуцкая батлейка**

Лялечны тэатр батлейка на Случчыне — даволі старая з'ява. Ён быў прыстасаваны да калядных святкаванняў. Праўдападобна, што першымі батлеечнікамі былі езуіты, якія ў канцы XVII ст. пачалі выкарыстоўваць батлейку ў сваіх манастырскіх школах пры выхаванні моладзі ў такіх гарадах, як Полацк, Гродна, Слуцк, Мінск і іншых месцах. У XVIII ст. школьнікі большасці школ на Беларусі ходзяць па хатах з батлейкаю і са звяздою, пры гэтым яны спяваюць хорам калядныя кантаты, а часамі ў шэрагу набожных песень выконваліся і гістарычныя песні. Пры выкананні песень выкарыстоўваліся папулярныя тады на Случчыне інструменты — скрыпка, дуда і часамі гармонь. Батлейка праіснавала ў нас аж да пачатку XX ст., і мы асабіста добра яшчэ памятаем яе, калі і нам прыходзілася хадзіць з ёю у Слуцку.

У нас батлеечны тэатр меў форму скрыні на лёгкіх ножках (паннах), кіравалі ім два чалавекі — гаспадар і яго памочнік, якія і гаварылі ў час калядавання сваімі галасамі за лялек. Лялькі рабіліся з дрэва, каляровай паперы і матэрыі. Батлейка звычайна супра-

ваджалася шматлікай моладдзю, якая прымала ўдзел у выкананні як рэлігійных кантат, так і розных другіх песень, а таксама батлеечнага тэксту, які быў даволі рэалістычным, ад чаго справа часамі канчалася дрэнна паміж асобнымі ўдзельнікамі.

Пачатак і антракты мелі сваю музыку, але выкананне яе адбывалася яшчэ лепей, калі меўся тут рэгент.

Персанажы тэатра былі больш блізкімі народнаму гледачу асобамі: шляхта, селянін, вандроўца, венгерац, чорт, карчмар і інш.

Дзеючыя асобы:

Ц а р І р а д: доўгія валасы і барада, плашч пурпуровы, на галаве залатая карона, у правай руцэ жазло.

Ц а р ы ц а: доўгія распушчаныя валасы, уся ў белым адзенні, на галаве карона.

Г е т м а н: белы кунтуш, зялёныя штаны, на нагах боты, на галаве белая казачая шапка з пяром, у руцэ шабля на «караул».

Ч у ж а з е м е ц: чорны суртук, белыя штаны, адна штаніна адарвана да калена, чырвоная шапка, у правай руцэ белая хустачка, у левай — тростачка.

С е л я н і н: доўгія светлыя валасы і барада, шэрая світка, чырвоны пояс, шапка зімовая з аўчыны, высокая, сіняя з зялёным аколышкам на версе, на нагах лапці з лык.

Ш л я х ц і ц: даматканае карычневае верхняе адзенне, белы саламяны капялюш, боты з лакіраванымі халявамі, у зубах люлька, пузаты.

В е н г е р а ц: чорнае адзенне, магерка (круглы капялюш з пяром павы) з казырком, за плячыма сундук з таварамі.

Ш л я х ц я н к а - б а б ы л ь к а: (асоба з вялікімі прэтэнзіямі — гэта відаць па яе адзенню) блакітны гарсэт, чырвоная спадніца ў латкі, жоўты капялюш таксама з пяром, ногі апрануты ў чаравікі з высокімі шнураванымі халяўкамі.

Д о к т а р: чорны фрак, белы гальштук, на нагах шчыблеты, у руках палка з булавой.

К а з а к: чырвоны мундзір, зялёны пояс, штаны шырачэзныя, блакітныя з чырвонымі лампасамі, чорная шапка з аўчыны з чырвоным верхам, боты высокія са шпорамі, у руцэ нагайка.

С а л д а т: белая сарочка, падпаясаны скураным поясам, чорныя штаны, шапка белая з чырвонаю акантоўкаю, боты высокія, у руцэ шабля.

Я ў р э й: на галаве рыжыя валасы з пэйсамі і гэтакая ж рыжая барада, доўгі чорны замызганы халат (лапсардак), шапка зімовая з ліса, верх аксамітны, відаць белыя шкарпэткі, туфлі з задзёртымі насамі, гарбаты.

Я ў р э й к а: парык, чорная атласавая сукенка, чорныя валасы, жоўтая хустка.

Б а б а: шарачковая спадніца, вялікі жоўты гарсэт, на галаве вялікая цёплая хустка (баранаўка), у лапцях.

А н ё л: белая сукенка да споду з крыламі, у руцэ зялёная яловая галінка.

Д'я б а л: з хвастом, чорны, зграбны, з доўгімі вушамі і доўгімі рагамі, зубы белыя і бялкі вачэй пачырванеўшыя.

В о ў к, к а з ё л, і а в е ч к а.

Т р ы к а р а л е в ы: у каляровых плашчах, залатыя кароны, у руках трымаюць залатыя скрынкі.

Музыка — гармонь, скрыпка і дуда.

Сцэна — вялікі пакой, абабіты чырвоным паркалём, двое дзвярэй на процілеглых баках.

Па сярэдзіне сцэны, каля задняй сцяны, стаіць залаты трон.

Ч у ж а з е м е ц *(уваходзіць з нізкім паклонам да публікі)*. Пахвалёны Езус Хрыстус! Вітаю, вітаю маіх паноў дабрадзееў. Таму што я вандрую па чужых краёх і гарадох, я маю расказаць паном пра цікавае здарэнне. Меў

я бацьку чужаземца ў чырвонай макавай сукенцы. Вось вышаў неяк я на рынак прадаваць кніжачкі і спаткаў трох трубачоў, і давай яны мяне нагаворваць. І вось прыстаў я да аднаго, але вельмі няўдалага, хацеў навучыцца ад яго навукі, а вывучыў ён мяне гусей красці, курэй біць і болей нічога. Але быў я хлопцам да гэтага скрытным, украў гусака і здохлую курыцу і прынёс да свайго пана, але ён мне так падзякваў, што ляцеў я з хаты аж у сенцы. І быў я за граніцай, і там мяне дужа паненкі любілі, але мне за гэтае нічога не дарылі. І быў я ў аднэй каралеўны, і яна мяне так моцна любіла, што нават кветкі да шлюбу падарыла; але як я ёй надакучыў, дык яна мне бачкі і вусы выдрала і вон выгнала. Маю палку з каралеўства, чым ганяюць чужаземцаў, ёсць на шыі чатыры хусткі, а ў кішэні адны пусткі, а пятая ў руцэ пазычаная, і тая ў свой бок паглядае. Маю шапку калярову, што ў матчынай скрынцы мае схову, чатыры рогі дагары і аўчынку са свіной скуры.

Казак *(раптоўна ўваходзіць)*. Прывітанне табе, Цімоша!

Чужаземец. Здароў, брацішка!

Казак *(строга)*. Ты што тут дурыш?

Чужаземец. А ты што кажаш?

Казак. Гавары мне па латыні.

Чужаземец. Косту-мосту, салігру-малігру, прыплескантусцыатантус.

Казак. Ды што ты гаворыш па латыні, як бацвінні! Так я табе скажу рускім языком, што сёння Ісус Хрыстос нарадзіўся, таму і я тут апыніўся. Быў такі-та бакаляр*, узяў пікі ў дзве рукі, ды ідзі, дурань, да распукі. *(Б'е чужаземца нагайкаю.)*

Чужаземец. Ой, пачакай, казачка-лайдачка, я табе па-польску вытлумачу!

Казак *(крычыць)*. Ня трэба па-польску! Ідзі вон! *(Выкідае яго за дзверы, потым звяртаецца да публікі.)* Прашу, панове, пастараніцца, будзе цар на трон садзіцца.

Цар *(уваходзіць, сядае на трон і ўрачыста звяртаецца да публікі)*. Сядаю, сядаю на трон адзіны, каб цара і голас не абмінуў. Я цар Ірад, я ў царскім пурпуры і ніхто не павінен пярэчыць маёй царскай натуры. А паклікаць да мяне Лейбу. Таму што ў яго мудрая галава, хай ён сёння прыйдзе і пагаворыць.

Казак хутка выходзіць і вяртаецца з яўрэем.

Яўрэй *(з нізкім паклонам, прыніжана)*. Іцах-міцах, манарх-гіцах, бег я з павагаю і радасцю праведаць цара. А што пану цару ад мяне патрэбна?

Цар. Адкажы мне, Лейба, мой любы, колькі месяцаў таму назад нарадзілася тваё дзіця?

Яўрэй. Калі пан цар хоча ведаць, бо я без сваіх талмудаў не магу сказаць. *(Крычыць да жонкі.)* Сора Езермоўс нойдзем талмуд гроўс.

Яўрэйка ўваходзіць з талмудам.

---

* Настаўнік, які праводзіў заняткі па хатах.

Я ў р э й *(чытае).* Барухаты едыной, елегэйну налегой, цібэлэ татэ, нібэлэ мамэ, і ліпа высока і на корань глыбока, а хто гэту ліпу будзе капаць, той будзе век панаваць. *(Набліжаецца да цара.)* Ясны цар, ужо дзевяць месяцаў мінулася, як тое дзіця нарадзілася. Што знаў, тое і сказаў, няхай мне цар прабачыць. Падаю да ног. *(Кланяецца цару ў ногі і адыходзіць.)*

Цар адразу засынае і моцна храпе.

Д ' я б а л *(уваходзіць і нахіляецца да цара і штосьці шэпча яму на вуха).* Менге-уш слаўны манарх, не будзь такі няўважны. Кажы рыцарам ісці да Віфліему і пабіць усіх securities новананароджаных, белых (г. зн. дзяўчынак) няхай не чапаюць, а хлопчыкаў усіх знішчаць і сына свайго не мінай, а ўсіх да аднаго забівай. *(Адыходзіць.)*

Ц а р *(прычынаецца, да публікі).* Раскажу я вам аб тым, што мне сёння прыснілася. Быў я з адным сваім прыяцелем у адным месцы, і ён мне даў добрую параду. Паклічце да мяне гетмана — слаўнага пана!

Казак адыходзіць і вяртаецца з гетманам.

Г е т м а н *(уваходзячы, паважна).* З'явіўся па загаду, найяснейшы пане, і магу выканаць тваё заданне.

Ц а р *(паволі, павучальна).* О, пайдзі, рыцар, да Віфліему і знішчы ўсіх нованароджаных, белых не чапай, а хлопчыкаў забівай і сына майго не мінай, і ўсіх да аднаго знішчай.

Гетман спешна адыходзіць.

А н ё л *(уваходзіць смутны).* Ах, цар, цар Ірад, што робіцца ў тваім родзе! Загінуў ты бяспечна, страціў неба навечна.

Ц а р *(задзірлівым тонам).* А што мне да неба, калі шкада кароны! Лепш быць каранаваным, чым выратаваным.

Ц а р ы ц а *(уваходзіць панура).* Ах, цар, цар, мой мілы пане, навошта так мяне засмуціў і ўсіх нявінных дзетак папаліў? Адных папаліў, другіх забіў і нікога з іх не ажывіў.

Ц а р *(голасна і з гневам).* Ідзі, адкуль прышла, не слухаю тваю параду, толькі на сваё сумленне маю ўвагу.

Ц а р ы ц а *(заклапочаная, са слязамі).* Ах, пайду, пайду я ў цёмны лес, у высокія горы, каб мае вочы нічога не бачылі і вушы не чувалі, спаткаю якога звера, каб ён у мяне жыццё забраў.

Ц а р *(сурова).* Ідзі, ідзі паспяшай, сама сябе тым суцяшай.

Г е т м а н *(раптоўна ўваходзіць, на канцы шаблі нясе ўрачыста галаву каралевіча-дзіцяці).* Вось выканаў твой загад, знішчыў усіх дзяцей і сына твайго не мінуў! От маеш дакумент — галаву сына твайго.

Ц а р *(смутна, мякка).* Ах, галава, галава сына майго, бачу яго забітага. Бывай, мая любая жонка! О, дайце, дайце мне чым сябе забіць, не хачу я ні аднаго дня, ні адной мінуты на свеце гэтым жыць. *(Падае з трона на падлогу, на бок — нежывы.)*

Я ў р э й *(асцярожна ўваходзіць і гаворыць са злосцю).* Яснавяльможны свіняны кныр! Што ж, васпану зрабілася, уся вантроба кроўю залілася. Я думаў, што ты спіш, аж бачу што ты смярдзіш. Браў ты з нас і драў ты з нас і крупавыя, і млынавыя, і мякіну, і смяціну, але ўжо цяпер як вазьму я тваю карону ды сяду на трону і буду каралём над яўрэямі, а ты свіннею над свіннямі. От каб цяпер мая Сора знала, што я тут круллю і над усімі яўрэямі пануючы. Сора, кум панцен маёхес.

Яўрэйка ўваходзіць, музыка грае народны танец — польку. Яўрэй і яўрэйка ў пары танцуюць.

Д'ябал раптам уваходзіць і моцна храпе.

Я ў р э й *(са страхам).* Ой, які страх! Няхай лепш бярэ маю карону прах.

Д ' я б а л *(паважна).* Прышоў, прышоў як па сваёга, бо добрага не зрабіў нічога. О, нясем, нясем туды, дзе бацька Люцыфер чакае твайго прыбыцця. О, нясем, нясем ды паспяшаем, дзе золата і серабро нас чакае. *(Душыць яўрэя, адыходзіць і цягне яго цела за сабою. Яўрэйка ўцякае.)*

К а з а к *(застаўшыся, сам да сябе).* Як вызвалімся ад свайго пана, будзем піць гарэлку са збана, будзем піць і гуляць і ўсіх ляхаў з Расіі выганяць. *(Да музыкаў.)* Іграйце мне барыню. *(Музыкі іграюць «казачка», казак скача).*

С е л я н і н *(паволі ўваходзіць і кланяецца да публікі).* Няхай будзе пахвалёны, шапка сіня, верх зялёны. *(Аглядаецца навакол.)* Але ж, мае паночкі, і папаў жа я, як на неба: і сіня, і зялёна, і папялята, і хораша, і харашавата. *(Са здзіўленнем).* А-ей, а во яшчэ і царскі трон, сеў бы на ём, але баюся, што стаіць салдатаў ром. *(Сядае на трон.)*

К а з а к *(сурова).* Ты чаго, мужык, сюды зайшоў?

С е л я н і н *(ласкава).* Чаму ж, мой панок, не пасядзець трошкі.

К а з а к. Ды ты не ведаеш, што тут царскі трон?

С е л я н і н *(са здзіўленнем).* Што «трон», дзе ж трон, калі аднаму няма дзе сесці, а ты кажаш трон.

К а з а к. Маўчы, мужык, не балакай. Уставай, дурань, тут месца, дзе цар сядзіць, гэта яго прастол.

С е л я н і н. Прастол, дык прастол, што я сабака лезці пад стол. Сам лезь пад стол. *(Устае.)*

К а з а к. Ідзі, дурань, вон! *(Б'е яго нагайкаю.)*

С е л я н і н *(жаласна).* Ой, мой панок, не бі мяне па карку, мы ж з табою родныя браты, лепш пойдзем мы з табою ў карчму, ды вып'ем там чарку.

Казак выпускае яго.

С е л я н і н *(да публікі).* От, мае ж панкі, што мне гэта першая куцця нарабіла. Мая Агата як наварыла поснае верашчакі *, дык я як намакаўся

* Верашчака посная ў процілегласць скаромнай, якая рабілася са свіных скабак і калбасы, рыхтавалася на куццю калядную з пшанічнае мукі, селядцоў, грыбоў і алею, якую елі з блінамі.

блінамі, дык ледзь ад стала адарваўся. Ой, ой, а пакуль жа я да парога дабег, дык мой жывот зрабіўся, як мех; зрабілася, мае панкі, каля пупа, як ступа, а каля жывата, то як добрая скаварада. Тут яшчэ мая Агата кажа: «Сымон, Сымон, вазьмі, кажа, па боскаму прыказанню тры лыжкі куцці». А мае ж паночкі, панкі, як узяў я гэтыя тры лыжкі куцці, то не пайсці і не пасапці. Ой, што ж мая Агата не вырабляла: ды напарыла мне моху, ды чартапалоху і курынай жоўці троху дый кажа: «На, Сымон, выпі, можа і паможа». А я ж, мае паночкі, панкі, як выпіў гэта, дык не памагло, а яшчэ горш прыпякло. Да, мае ж панкі, дзе я не бываў ужо, ды нічога не памагае, яшчэ горай забірае. Каб гэта бог прынёс каго і каб хто мяне палячыў, то я не ведаю, чым бы я заплаціў.

Д о к т а р *(уваходзіць)*. Ты што мне, мужык, дасі, калі я цябе палячу?

С е л я н і н *(сур'ёзна)*. А што пану даць?

Д о к т а р. Ты мне дасі чырвоны слуцкі паясок і сіненькі каўпачок.

С е л я н і н. Мой панок, не магу я пояска даць, бо будзе мая жонка сварыцца, бо гэта яна мне на свята выткала яго. Але ведаеш, што я дам табе? Дам табе на перапечкі асьміну * грэчкі.

Д о к т а р. Не патрэбна яна мне.

С е л я н і н. Ну, мой пан, хаця гэта я і страчу, але ўсё ж здароўя сабе дабуду.

Д о к т а р. Кладзіся.

Селянін кладзецца на адзін бок.

Д о к т а р. Не, не так!

Селянін пераварочваецца на другі бок.

Д о к т а р. Не на гэты! Кладзіся так, як кладуцца маладыя дзеўкі.

Селянін кладзецца жыватом дагары. Доктар б'е яго наводмаш па жываце палкаю з булавою.

С е л я н і н *(устае)*. От, як даў булавою, дык як рукою зняў. А цяпер, каб мая Агата ведала, што я ўжо тут здароў. *(Кліча)*. Агатка, хадзі, хоць мы з табою пойдзем у скокі.

Жонка ўваходзіць і танцуе з мужыком «Лявоніху».

С е л я н і н *(скача і прыпявае)*.

Пайшоў бы я ў скокі,
Лапці валакуцца,
Прыўдарыў бы драпака,
Аборы парвуцца.

Скачэце ж, дзеткі, скачэце ж, не шкадуйце лапцяў. Як гэтыя парвуцца, бацька новыя спляце. *(Перастае скакаць і пачынае жуліць.)* Як калісьці мужык быў у Рыме, як там хораша, як там прыгожа!

---

* Мера сыпучых цел у Беларусі ў дарэвалюцыйныя часы, роўна з пудам.

Шляхціц (*якi стаяў тут жа ў натоўпе, са злосцю пытае ў яго*). А папу рымскага ты тожа там бачыў?

Селянін. А як жа, паночку, далібог бачыў! Быў нават на набажэнстве ў касцёле святога Паўла.

Шляхціц. А ці пацалаваў ты яго ў месца, што ніжэй паясніцы?

Селянін. Не, паночку, з-за шляхоты не мог дабіцца.

Раптам уваходзіць венгерац і крычыць зычным голасам да публікі, як бы перашкаджае расказу селяніна.

Венгерац. А сам-басам, я венгерац, у гэтым часе, маю алей, пралей ад зубных балей, ад парушэння жывата, прашу ў мяне купляць, я за гэта не буду грошай браць, абы мне толькі з харошай дзяўчынаю ўдосталь патанцаваць.

Шляхцянка-бабылька (*уваходзіць, звяртаючыся да доктара*). Прывітанне пану-доктару. Я ні хвора, ні здарова, але хачу параіцца з панам доктарам.

Доктар. А можа пані па дварэ хадзіла ды прастыла?

Шляхцянка-бабылька. Здаецца, не хадзіла.

Доктар (*хітра*). Можа пані панчошкі падрала і рэўматызм у пяткі дастала? (*Нахіляецца да яе ног.*)

Шляхцянка-бабылька. Ці цэлыя, ці падраныя, але рэўматызму ў пяткі не дастала.

Венгерац (*забягае як бы наперад доктару*). Няхай толькі музыка заграе «казачка», як мы з паняй да поту паскачым, дык у пані ўсё пройдзе.

Шляхцянка-бабылька. Але ж я не такая прастачка, каб скакаць з панам «казачка». Але як дасць ён мне талеру *, дык буду скакаць хоць усю ноч.

Венгерац (*да музыкаў*). Прашу заіграць «вянгерку».

Венгерац і шляхцянка-бабылька танцуюць «венгерку», а потым адыходзяць.

Салдат (*уваходзіць і звяртаецца да публікі*). О, паслухайце, мае дарагія, якое мяне няшчасце спаткала. Я маю ножны пры боку і палаш голы ў руцэ, і не адзін сёння будзе ляжаць у вялікай пакуце.

Гетман раптоўна ўваходзіць і забівае яго шабляю.

Доктар (*уваходзіць*). Што тут такое? Трэба яго палячыць, трэба даць яму камарынага сала, падкову ад мухі ды заячага кроку ад дзявочага скоку. Гэта ўсё ў адным гаршку зварыць і даць яму піць, і будзе здароў, як бык.

Анёл (*спускаецца зверху на нітачцы і спявае*).

---

* Талер — срэбраная манета, якая мела даволі шырокае распаўсюджанне ў Заходняй Еўропе.

Анёл пастухам з'явіўся
І сказаў, што Хрыстос нарадзіўся.
У Віфліеме, у страшным месцы,
Нарадзіўся ў велькай нэндзы.
Пан ўсяго жывучага...

Б а б а *(уваходзіць, таўчэ ў ступе і спявае).* Пан бог сёння нарадзіўся. *(Уваходзіць д'ябал і страшыць яе храпам. Баба б'е яго таўкачом і забівае. Потым працягла спявае.)* Пан бог сёння нарад...

К а з а к. Ты што, баба, робіш?

Б а б а. Таўку куццю, панічку.

К а з а к. Хіба ты не ведаеш, што сёння свята ражаства Хрыстова і нельга працаваць. Ідзі адсюль.

Б а б а. А што ты, мой служывенькі, за пан такі, што я не магу працаваць. Як табе свята, то ты і святкуй, а я павінна сабе куцці натаўчы.

Казак здзірае з бабы хустку.

Б а б а. Ідзі, паніч, у балота, падраў хустку за дзве залатоўкі.

К а з а к. Пайшла вон!

Б а б а *(б'е казака таўкачом).* Ад чорта абаранілася, а хіба ж ад цябе, казака, не абаранюся?

Казак б'е яе нагайкаю.

А в е ч к а *(уваходзіць, скача і спявае).*

Авечачка, касматачка,
А хто мяне напасе,
Мая матачка?
Матка стара, дочка мала,
А я, маладзенька, кросны ткала.
Кросны ткуцца, ніткі рвуцца,
А за мною, маладою, хлопцы б'юцца.
Не біцеся, не сварыцеся,
А за мяне, маладую, пагадзіцеся.
*(Уваходзіць Казёл.)*

А в е ч к а *(да яго).* Ты казёл барадаты, ды чаго ж ты прышоў да мае хаты?

К а з ё л. Я прышоў да цябе, спадабаў я цябе, хачу цябе спадабаць ды за жонку ўзяць. Ці няма ў цябе гарэлкі? *(П'е гарэлку ў куце з вядра.)*

А в е ч к а. Не хачу, не люблю, бо барада шоў-шоўка, бо нашлю на цябе шэрага воўка. *(Адыходзіць.)*

Казёл скача, раптам убягае воўк, хапае казла і ўцякае.

К а з ё л *(у зубах у ваўка).* Не мяне, не мяне ты ўзяў.

Спускаецца зверху калыска са святым дзіцяткам.

Тры каралевы *(уваходзяць і спяваюць)*.

Тры каралевы добрай веры
На каляды носяць дары.
Прынеслі яму ў дар золата,
Мір, кадзіла і золата.

Потым кожны паказ заканчваецца пажаданнямі дабра гаспадарам дому ў залежнасці ад іх заможнасці. Звычайна складаюцца яны з такой развітальнай песні:

З калядою мы прышлі да вас,
Вельмі міла будзе нам бога васпяваці.
Хто меў злую долю і быў смуткам апавіты,
Няхай па калядзе будзе іх пазбыты.
Няхай бога ўсемагутнага ўлада
Шчасцем і доляю ўсіх не мінае.
Промень на небе трацідь святло,
Няхай ён набудзе для людзей дабро.
Промень на небе тысячы просіць,
А што за каляду нам гаспадар падносіць?

## Цар Мамай

Дзеючыя асобы:

Цар Мамай
Сын Адольф
Скаравод-фельдмаршал
Казак
Гусар
Храбры воін Ніка
Стары цар Бармуіл
Задонскі лекар
Смерць
Палач

Мамай. Здрастуйце, гаспада генералы! Для каго сей трон зроблены? Няўжо для мяне, грознага цара Максіма Амельянавіча?

Світа. Для вас, для вас, Ваша Вялікасць.

Мамай. Саджуся на гэты трон і буду судзіць па закону цароў-царэвічаў і разам з імі свайго непакорнага сына Адольфа. Скаравод слуга, з'явіся сюды.

Скаравод. Навошта мяне клічаце, якія справы-указы загадаеце?

Мамай. Не чуў ты пра маіго сына Адольфа?

Скаравод. Чуў. Кажуць, кінуўся ў ерась і нашым багам не верыць.

Мамай. Ідзі прывядзі яго сюды.

Адольф. Здравія жалаю гасудару бацюшку! Навошта мяне выклікаеце, якія справы-указы загадаеце?

М а м а й. Ты ведаеш, сын мой любы, я застаўся ўдаўцом, а ты сіратою. Я хачу жаніцца на кумірскай княгіне і хачу прыняць кумірскія багі і законы.

А д о л ь ф. Я Вам веру, а Вашым кумірскім багам не паверу, пад ногі тапчу, ім верыць не хачу.



«Цар Максімільян». Прадстаўленне ў в. Бялевічы Слуцкага раёна (1959 г.). Фота Д. Мазаніка

М а м а й. Скаравод-фельдмаршал, з'явіся сюды! Адвесці непакорлівага сына ў цямніцу і пасадзіць на хлеб-соль да таго часу, пакуль не абразумецца і нашым багам не пакланіцца.

К а з а к. Ах гора, гора! Я ёсць казак чыстага поля, я яшчэ казаковай натуры не абучаўся, як з галавы да ног прапіўся. Былі ў мяне талеры, усе патаялі, былі бумажкі — пакінуў у Машкі, быў мундзір на семдзесят сем дзір, лату на лату саджу, а грошы на гарэлку шчаджу. Ах, што за слаўны горад Кіеў! Галушкі самі ў рот валяцца, а паненкі-прыгажуні на позірк не мяняюцца *(выходзіць)*.

Г у с а р. Я ёсць гусар прысяжны, быў у баі адважным, мая шабля ліхадзейка была ўсім туркам і французам зладзейка, яна мне так верна служыла, што многа турэцкіх і французскіх галоў палажыла. І за гэта ўслужэнне ат-

22 Зак. 3328

рымаў я ад цара ўзнагараджэнне. Узнагародзіў мяне гасудар медалём і крыжом, так што ніхто не мае права ўтрымаць пярстом.

Мамай. Відаць, гусар, ты не простага роду?

Гусар. Не-не, муляр, пастухоў сын *(выходзіць)*.

Мамай. Скаравод-фельдмаршал, з'явіся сюды! Стань перад мною, як ліст перад травою.

Скаравод. Што пажадаеце? Якія справы-указы загадаеце?

Мамай. Ідзі ўгавары майго непакорлівага сына, каб ён нашым багам паверыў. І калі паверыць — казной узнагараджу і з прыгожай Венерай ажаню.

Скаравод *(да Адольфа)*. Наша Вялікасць, паверце, нашы багі добрыя, бацькам нашым дапамагалі ў барацьбе з ворагам.

Адольф. Не, не паверу.

Скаравод. Ваша Вялікасць, ніяк не магу ўгаварыць вашага сына.

Храбры воін Ніка. Я ёсць храбры воін Ніка, хадзіў-гуляў па усіх землях, нідзе не знайшоў такога саперніка, які мог бы памерыцца сіламі. Чые грудзі шырэй, чый меч вастрэй, той таго адолее.

Насупраць выходзіць Стары цар Бармуіл.

Бармуіл. Ты што за воін храбры, бадзёры Ніка? А я — Стары цар Бармуіл. Адна зямля непакорана, і там чуецца якаясьці смерць.

З'яўляецца да рыцара Смерць з касою.

Бармуіл. Ты што, злая баба, бадзяешся? Мне, герою, матляешся? Як выму свой булатны меч — паляціць твая галава з плеч.

Смерць. А я як выну косы ды пілы, падрэжу табе суставы ды жылы *(выцягвае касу)*.

Бармуіл. Смерць мая маці, пажэнімся мы з табою, не будзе нам сапернікаў на белым свеце, ні на сырой зямлі.

Смерць. Я не хачу за цябе замуж ісці, хачу той злой смерці прыдаць.

Бармуіл. Дазволь мне пажыць хоць год.

Смерць. Ні паўгода.

Бармуіл. Дазволь мне маёмасць распрадаць ды жабракам-братам аддаць.

Смерць. А ці вялікая твая маёмасць?

Бармуіл. Вялікая! З быдлы — певень ды курыца, а з меднага посуду — крыж ды гузік.

Смерць адпускае Бармуіла.

Мамай. Скаравод-фельдмаршал, з'явіся сюды!

Скаравод. Навошта мяне выклікаеце, якія справы-указы загадаеце?

Мамай. Ідзі прывядзі непакорлівага сына.

Скаравод *(звяртаючыся да сына)*. Ваша Высокасць, з'явіцеся да гасудара-бацюшкі.

А д о л ь ф. Здравія жалаю гасудар-бацюшка, навошта выклікаеце, якія справы-указы загадаеце?

М а м а й. Любы сын, павер нам і нашым багам. Калі паверыш — прастол дам і з прыгожай Венерай жаню; калі не паверыш — маладога цябе знішчу.

А д о л ь ф. Дзякую, бацюшка, за прастол і Венеру, а вашым багам не паверу.

М а м а й. Вывесці непакорлівага сына ў чыстае поле і ссекчы далоў галаву і толькі песняй павесяліцца.

Гусары выводзяць Адольфа.

М а м а й. Скаравод-фельдмаршал, з'явіся сюды! Пакліч палача, каб ссек галаву непакорліваму сыну.

С к а р а в о д. Зараз паклічу. Адна нага тут, другая там, раніцай на сабаках з'яўлюся да Вас.

М а м а й. Як-як?

С к а р а в о д. Зараз пайду прывяду.

Уваходзіць палач.

С к а р а в о д. Дазволь адсекчы галаву непакорліваму сыну Адольфу.

П а л а ч. Я магу і ўсім адсекчы.

А д о л ь ф. Бывай, усход, бывай, захад, бывай, поўнач, бывай, поўдзень, бывайце, усе мае сябры!

П а л а ч. Хай мая шабля зробіцца цесаком!

Шабля робіцца цесаком, а ім галавы не ссекчы.

С к а р а в о д. Ваша Вялікасць, палач не адсек галавы вашаму сыну.

М а м а й. Паклікаць сюды Смерць!

З'яўляецца Смерць, выстаўляе касу, махае ёю. Адольф падае, цячэ кроў (чарніла), а слуга бярэ маску-галаву і нясе.

С к а р а в о д. Вось галава вашага сына.

М а м а й. Так, я бачу. А што ж будзем рабіць, калі дажывем да старасці?

С к а р а в о д. Пойдзем па свету.

М а м а й. А добра хадзіць па свету, будучы гусарамі.

С к а р а в о д. Трэба пытаць у добрых людзей парады, што з сынам сваім рабіць (*выходзіць*).

М а м а й. Скаравод-фельдмаршал, з'явіся сюды!

С к а р а в о д. Што загадаеце, Ваша Высокасць?

М а м а й. Ці не чуў ты лекара такога, каб мог зрабіць нежывога жывым?

С к а р а в о д. Чуў, не ў нашым царстве, у Задонскім гасударстве ёсць такі лекар, які можа зрабіць нежывога жывым.

М а м а й. Зараз адшукаць яго!

Слугі выходзяць і прыводзяць лекара.

С к а р а в о д. Вы Задонскі лекар?

Л е к а р. Я.

С к а р а в о д. З'явіцеся да гасудара.

Л е к а р. Здравія жалаю, гасудар-бацюшка, што рабіць загадаеце?

М а м а й. Ты можаш нежывога жывым зрабіць?

Л е к а р. Магу.

М а м а й. Калі зробіш — казной узнагароджу, а не зробіш — мой меч — твая галава з плеч. .

Л е к а р. Не маеце права.

М а м а й. Чаму?

Л е к а р. Таму што я не вашага царства (*бярэ галаву і ідзе да забітага*). Ах, дрэнна. Ваш сын акалеў (*топчыцца ля яго, прыстаўляе галаву, дастае з сумкі бутэлечку і дае тройчы панюхаць*). Адольф, Адольф, што у цябе баліць?

А д о л ь ф. Галава.

Л е к а р. Баліць галава, трэба агаліць дагала і прыкласці пляструі будзя галава як ляпёшка, абвесці дзесяць разоў дубінай і паслаць гаспадара за гарэлкай. А ну-ка ўставай!

А д о л ь ф. Ах, лёг не на шутку, праспаў мінутку.

С к а р а в о д. Спаў бы ты цэлы век, калі б не Задонскі чалавек.

Мамай цалуе сына, грае музыка, усе танцуюць і спяваюць.

Вось прайшоў-прышоў вясёлы час,
Раз-два-тры — люлі,
Прышла наша гульба.
Раз-два-тры — люлі.

# ФАЛЬКЛОР РАБОЧЫХ. ПАЭЗІЯ ЗМАГАННЯ

Узнікненне і развіццё фальклору рабочых і паэзіі змагання на Беларусі звязана са зменамі ў эканамічным, палітычным і духоўным жыцці народа, якія былі выкліканы новай сацыяльна-эканамічнай фармацыяй — эпохай капіталізму. Ужо ў традыцыйных жанрах беларускага фальклору можна заўважыць пачатак рабочай тэматыкі: у казках і песнях ствараюцца малюнкі катаржнай працы на панскіх броварах, у кузнях, на цукровых заводах, на будаўніцтве чыгункі і г. д.

Фальклор рабочых Беларусі прадстаўлены пераважна песеннай творчасцю, частушкамі, вуснымі сказамі, анекдотамі, прымаўкамі, прыказкамі. Ён моцна звязаны з традыцыйнай вуснапаэтычнай творчасцю, выкарыстоўвае яе мастацкія здабыткі. Не менш важным фактарам развіцця фальклору рабочых з'явіўся уплыў рэвалюцыйнай паэзіі, прафесійнай літаратуры, а таксама цесная сувязь с рабочым фальклорам рускага і ўкраінскага народаў.

У пераважнай большасці песень створан вобраз знясіленага працай рабочага, які ва ўмовах капіталістычнага грамадства асуджаны на пакуты. Некаторыя песні апавядаюць аб цяжкім лёсе жанчыны-работніцы. Паэзія рабочых адлюстравала таксама і розныя формы пратэсту супраць эксплуататараў, пачынаючы са стыхійных выступленняў, калі рабочыя псавалі машыны, і да свядомай барацьбы з існаваўшым грамадска-палітычным ладам.

Лепшыя творы рабочага фальклору па сваёй ідэйнай накіраванасці набліжаюцца да рэвалюцыйнай паэзіі, якая найбольш поўна і ярка выказала мары і спадзяванні працоўных аб канчатковай перамозе над эксплуататарамі і з'явілася неад'емнай часткай духоўнай культуры працоўных горада і вёскі.

Рэвалюцыйны рух у Расіі, па вызначэнню У. І. Леніна, прайшоў тры асноўныя этапы, і кожнаму этапу была ўласціва свая паэзія змагання. Песні барацьбы складвалі дзекабрысты, мужныя дзеячы «Народнай волі», палымяныя рэвалюцыянеры-бальшавікі. На Беларусі таксама дзейнічалі дзекабрысты, рэвалюцыянеры-разначынцы, шырокі размах набыла дзейнасць

РСДРП, і таму, натуральна, паэзія змагання, рэвалюцыйныя песні, гімны і маршы знаходзілі шлях да народа.

Як сведчаць дакументы, ужо з 70-х гадоў мінулага стагоддзя працоўным масам Беларусі былі вядомы «Марсельеза», «Дубінушка», у пачатку XX ст.— «Варшавянка», «Чырвоны штандар», «Інтэрнацыянал» і многія іншыя рэвалюцыйныя гімны і маршы. Распаўсюджваюцца таксама песні на словы А. С. Пушкіна, М. А. Някрасава, Т. Р. Шаўчэнкі, А. М. Горкага, якія заклікалі народ да змагання за лепшую долю.

У рэвалюцыйнай паэзіі знайшла водгук руска-японская вайна 1904—1905 гг., падзеі 1905 г., першая сусветная вайна. На Беларусі распаўсюджваліся песні «Дзела была пад Артурам», «Трэпаўскі маніфест», «Салдацкая марсельеза» і інш. Акрамя твораў на рускай мове, бытавалі таксама і беларускія песні, складзеныя народам або прафесійнымі паэтамі і прыбліжаныя па зместу да рэвалюцыйных гімнаў і маршаў. Да іх ліку трэба аднесці песні на словы Я. Купалы «Не пагаснуць зоркі ў небе», «А хто там ідзе?», Ц. Гартнага «Да Нёмна» і іншыя творы на словы беларускіх паэтаў, а таксама песня «Адпусцілі сялян на «свабоду» і рад твораў першай сусветнай вайны, якія выкрываюць злачынствы цара і генералаў, што ўцягнулі краіну ў крывавую бойню: «Поўна, братцы, нам крушыцца», «Мы ж не зналі, братцы-таварышы», «Жыў у Петраградзе адзін негадзяй» і інш.

Шырокае распаўсюджванне на Беларусі рэвалюцыйнай паэзіі падкрэслівае яе інтэрнацыянальны характар і сведчыць аб значным росце класавай свядомасці працоўных.

У гэтым раздзеле змешчаны творы сацыяльнага пратэсту, якія ўзніклі яшчэ ў нетрах традыцыйнага фальклору, некаторыя ўзоры фальклору рабочых, а таксама тыя беларускія песні, якія адлюстравалі новы этап рэвалюцыйнага руху. Складальнікі палічылі магчымым не змяшчаць у хрэстаматыі агульнавядомыя рэвалюцыйныя песні, гімны і маршы, хаця яны трывала ўваходзілі ў песенны рэпертуар працоўных Беларусі.

### Літаратура

*Песні* беларускага народа. Пад агульнай рэдакцыяй М. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата, т. 1. Мінск, 1940.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967.

*Кабашнікаў К. П.* Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі. Мінск, 1969.

## Прывыкайце, чорны вочы...

Прывыкайце, чорны вочы,
Адны начаваці:
Няма майго міленькага,
Не з кем размаўляці.

Няма майго міленькага,
Няма гаспадара,
Каму бы я пасцелечку
Пухаву заслала.

Даўно свайго міленькага
У паход выпраўляла,
З тых пор свае чорны вочы
Слязьмі выцірала.

Пасляпіла свае вочы
Горкімі слязамі,
Няма жысці, няма рады
Усё за ворагамі.

Паны дзяруць, паны скубуць,
А багач за імі,
Паследнія манатачкі
Мы паізнасілі.

Выхадзіла на дарогу,
Выхадзіла ў поле,
Нідзе следу не відала
Тут свайго мілога.

Навярніся, мой міленькі,
Да з таварышамі,
Калатніце міраедаў,
Штоб яны не ўсталі.

**Ой ты, доля, наша долечка...**

Ой ты, доля, наша долечка,
Агарнула нас жа горачка,
З-за чаго жа мы так мучымся,
А нідзе мы не навучымся.

Ідзем да пана мы да сонейка,
А прыходзім у ноч позненька.
На каго мы так стараемся,
Да зямелькі прыгінаемся.

Забалелі ўжо ў нас ручачкі,
З-за чаго жа нашы душачкі
Паны жадныя так катуюць,
Нашу душачку выматваюць.
Ці мы пану запраданыя,
Ці навек яму адданыя?

Ды калі ж мы дачакаемся,
Ды з панамі паквітаемся,
Ды з панамі пазмагаемся
Ой, за долю, за шчаслівую.

**Горка, доля ты батрацкая...**

Горка, доля ты батрацкая,
Гарапашная, жабрацкая,
Праца цяжкая, нязмерная,
Мазалёвая, сіберная.
На прыбыткі ды на панскія,
На папоўскія, дваранскія,

Гей, збірайся, хлопцы жвавыя,
На расправы на крывавыя,
На расправы — пажарышчамі,
Ад маёнткаў — папялішчамі.

**Ой, ляцелі гускі...**

Ой, ляцелі гускі
З далёкага краю,
Пачакайце, гусі,
Я вас папытаю.

Пачакайце, гусі,
Я вас папытаю:
Ці не з той краіны,
Дзе я мужа маю.

Туды ж ён запратан
З брытай галавою,
Пакінуўшы дзетак,
А мяне ўдавою.

За паноў-зладзеяў
Яго каталі,
Ў калодкі забілі
Ды ў Сібір паслалі...

Падняліся гускі
Дай загагаталі:
— Многа там ў Сібіры
Ў калодках відалі.

Катаржан таўпою
З краю ў край ганялі,
А хто спатыкнецца,
Ў зямлю зарывалі...

**Не па ўласнай мы ахвоце...**

Не па ўласнай мы ахвоце
Былі ў катаржнай рабоце,
Сібірскай тайзе.
Мы пясок там прамывалі,
Цару золата шукалі,
Сабе не знайшлі...
А бывала хлеба корка
У горле стане, як распорка,
Што не праглынеш.
Шчы хлябалі з тухлым мясам,
Запівалі брудным квасам,
Мутнаю вадой.

**Салавей мой сізакрылы...**

— Салавей мой сізакрылы,
Скажы праўду, дзе мой мілы?
— А твой мілы ходзіць на работах
Па сахарных па заводах.
А ён робіць, робіць, рабатае,

А пот ліцо яму залівае,
А хазяін 'шчэ яго ругае:
— Чаму ты дзелачка не робіш?
Як паехаў хазяін дадому,
Нарабілі хлопцы лому,
Паламалі ўсю цэрку і прасову,
Пашла пара па ўсяму заводу,
Пашла слава па ўсяму народу...

**Ой ты, салавейку, ой ты, рабакрылы...**

— Ой ты, салавейку, ой ты, рабакрылы,
Скажы, салавейку, дзе жыве мой мілы?

А твой міленькі ў сахарным заводзе,
У сахарным заводзе, штодзень на рабоце.

Штодзень зарабляе, дзенюшкі збірае,
Прыдзе ваcкрасенне — прап'е, прагуляе.

Пойдзе на кватэру, хазяйку ругае,
Хазяйка браніцца, яго не баіцца.

Хлопцы мае, хлопцы, хлопцы маладыя,
Паламалі трубы ды ўсе медзяныя.

Нарабілі шкоды ў сахарным заводзе,
Разнясьлі няславу па ўсяму народзе.

**А хто не быў на чыгунцы...**

А хто не быў на чыгунцы,
Той гора не знаець.

А мы былі, прабавалі,
Пра ўсё гора зналі:

І холаду, і голаду,
Усяго напрымаліcь,

І холаду, і голаду,
Усяго навідаліcь.

З Масквы мы выязджалі
З поўнымі вазамі,

Ад Масквы, што да Канбова
Вялікія вёрсты,

Сазнабілі рабочыя
На руках напёрсты,

На руках, руках напёрсты,
Шчытаючы вёрсты.

## Дзе работаюць шахцёры...

Дзе работаюць шахцёры,
Панарыты ямы, норы
Па тры сажні шырынёй
Паўтараста глыбінёй...

Нас па клетачках садзілі
Па дванаццаць чалавек.
Клетка дзёрнула, рванула,
Ажно ў сэрца кальнула...

Не паспеў слова сказаць,
Стваланы крычыць злязаць...
Канагоны за вагоны,
Забойшчыкі пад забой,

А санашнік справу знае,
На сабе санкі цягае,
Яго выгляд, як у чорта,
І спіна уся пацёрта...

## Жыццё мае нялёгкае...

Жыццё маё нялёгкае,
У горадзе цяжка пражыць,
Сямейку сваю родную
Даводзіцца забыць.
З дзярэўні пісьмы пішуць —
Раскошна сын жыве,
Палучку палучае,
Дамоў грошы не шле.
Якая там палучка —
У месяц рублёў пяць,
Ідзеш сабе і думаеш,
Куды грошы дзяваць?..

## Раз, было, я замарыўся...

Раз, было, я замарыўся
І трошкі заспаў,
Прышоў на работу,
Свісток прасвістаў.
Майстар пакасіўся,
Слова не сказаў,
Тры рублі у кнігу
Ураз запісаў...

## Пажыў, пажыў я на свеце...

Пажыў, пажыў я на свеце,
Панасіў бальшых лапцей,
Паработаў я работы,
Паядаў я гнілых шчэй.
Бацька дома работае,
Сын у Піцеры жыве.
Бацька грошы дажыдае,
Сын ў апорачках ідзе.
А гармонька-матушка!
Няма хлеба-мякушка.
Пап'ю кіслага кваску —
Разганю сваю таску.
З гаспадаром я разлічыўся,
Ні граша не атрымаў,
Я з канторушкі пайшоў,
Кулаком слёзы уцёр.

## Поўна, братцы, нам крушыцца...

Поўна, братцы, нам крушыцца,*
Перастанем таскаваць.
Запяем мы з гора песню
Пра салдацкае жыццё.

* Першы радок двухрадкоўя паўтараецца два разы.

Вот мы лагерам стаялі
За ракою, за Дняпром.

Блох кармілі, вош тачыла
За салдацкім каўняром.

Дняпро-рэчка невялічка,
Пераходаў на ёй цьма.

А стаялі мы за рэчкай
Без малога гады два.

Перашлі мы рэчку бродам
На левую старану.

Там разбілі свой лагер
І наелісь палыну.

Прыказалі па камандзе
Быць гатовым ка сматру.

Паказацца енералам,
Пракрычаць «ура» цару.

Дзень і ноч мы капашылісь
З амуніцыей сваёй.

Кацялкі мы шаравалі
Палын-горкаю травой.

Прыехалі камандзіры,
Пачалі нас муштраваць.

Каму чарка, каму палка,
А салдацікі маўчаць.

Прыехалі енералы,
Прыказалі ў ружжы стаць.

Загрымелі барабаны,
На кані прыскочыў цар.

Якаво жа вам, рабяты,
Палыном-травой стаяць,

Не пара лі вам, рабяты,
Ва паходы выступаць?

Даў па чарцы нам гаркнуўшы,
Прыказаў нам выступаць.

Пацягнуліся мы паходам
Супроць немца ваяваць.

Так мы з немцам ваявалі,
Пралівалі кроў сваю.

А за што скажыце, братцы,—
Усё за горкую судзьбу.

**Мы ж не зналі, братцы-таварышы...**

Мы ж не зналі, братцы-таварышы,
Нам прыказікі прышлі.

Прышлі, прышлі нам, братцы, прыказы,
Штоб ў паход скарэй ішлі.

Дзень із ноччу мы, братцы, ў паходзе —
Мы змарнаваліся.

Ляцяць кулі, кулі і карцечы,
Рассыпаюцца дажджом.

Ляжаць германцы — яны маладыя,
Раздаваюцца плачом.

Чуюць слёзы нашыя армейцы,
І ім ў вакопах цяжало.

### У нядзельку раненька...

У нядзельку раненька
Узышло сонца ясненька,

Татка коніка поіць,
Дужа жаласна плача.

Прышоў сынок, пытае:
— Чаго, татка, плачаш,

Да нашто ж, каму рана,
Татка, коніка поіш?

— Табе, сынку, гадую,
На вайну на лютую.

На вайну ты паедзеш,
А дамой ці прыедзеш.

— Не плач, татка, за мною,
Трэба кончыць з вайною,

Трэба кончыць з вайною
Да з вайною ліхою.

### Салдацкая песня напярэдадні Кастрычніка

Пад Варшаву падхадзілі,
Афіцэры ўперадзі,
А як пушкі загрымелі —
Афіцэры пазадзі.

Ах, вы каты, вы зладзеі,
А куды вы завялі,
Самі спраталісь ў вакопы,
А салдатаў на штыхі.

Эй, рэбяты, вы брасайце
Дарам кроў праліваць,
А пайдзем-ка мы ў вакопы
Афіцэраў разганяць.

Не жалейце вы, рэбяты,
А каліце ўсіх пад пяты,
Уласць Саветаў заваюем,
А буржуяў усіх раздуем.

### Адпусцілі сялян «на свабоду»...

Адпусцілі сялян «на свабоду»
Дзевятнаццатага феўраля,
Толькі землі не далі народу —
Вось вам «міласць» цара і дваран.

Мужыкі без зямлі прападаюць,
А дваране і рады таму,
Што за бесцань яны нанімаюць
Мужыкоў на работу сваю.

Прыціскае нас земскі начальнік
І ураднік дыхнуць не дае,
Поп пужае нас адам крамешным
І за трэбы тры скуры дзярэ.

## Жыў у Петраградзе адзін негадзяй...

Жыў у Петраградзе
Адзін негадзяй,
Жыў у Петраградзе
Быўшы цар Нікалай.

ЗадумаўНіколка
З Германьяй ваяваць
І стаў жа ён нас
Да ўсіх прадаваць.
Палілася жа кроў
Бальшою ракой,
Усё прадавалась
Зладзейскай рукой...

## Мікалаю, Мікалаю...

Мікалаю, Мікалаю,
Дзе я цябе пахаваю?
Пры дарозе, у даліне,
Каб па табе воўкі вылі,
А сабакі танцавалі,
Тваю душу паміналі.

## А мы бога паміналі...

А мы бога паміналі,
А мы бога папрасілі
За Міколіна здароўе:
Каб і ручкі не служылі,
Каб і ножкі не хадзілі,
Каб ад сонца ён туляўся,
Каб ад ветру ён валяўся,
Каб саломкай падпіраўся.

## Салдацкія прыпеўкі...

Піша, хлопцы, жонка мне:
— Ці хутко канец вайне?
Ой, ці хутко, барыня,
Ці хутко, сударыня?
Ці хутко кончыцца вайна,
Бо сумую я адна.
Што ты скажаш, барыня,
Барыня, сударыня?
Ці хутко скончыцца вайна,
Бо абрыдла нам яна.
Ой, абрыдла, барыня,
Ну яе, сударыня!
Вайна начата ні намі,
А царскімі царамі ды панамі.
Праўда гэта, барыня?
Ой, праўда, сударыня!
За чужыя багажы
Не палезем на нажы!
Ой, нашто нам, барыня,
Ой, нашто, сударыня!
Ў нас няма цара ўжо болей,
Весь народ на вольнай волі.
Ой, як добра, барыня,
Добра як, сударыня!

Усе паны баяцца краху,
Разбягаюцца са страху.
Уцякаюць, барыня,
Каб хутчэй, сударыня!
А мы слёз не будзем ліць,
Землю іх давай дзяліць.
Ой, як добра, барыня,
Добра як, сударыня!
Вот якія ў нас дзяла —
Рэвалюцыя прышла.
Ой, як добра, барыня,
Добра як, сударыня!

# НАРОДНА-ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921—1939)

Фальклор Заходняй Беларусі займае сваё адметнае месца ў гісторыі беларускай народна-паэтычнай культуры. Ён склаўся ва ўмовах вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльную і палітычную свабоду супраць панска-польскага прыгнёту і адыграў значную ролю ў гэтай барацьбе. Творчасць гэта цікавая як з пункту погляду адлюстравання сацыяльнай псіхалогіі мас у перыяд актыўнага іх грамадскага жыцця, так і з боку пазнання спецыфікі мастацкай практыкі народа ў часы грамадскіх зрухаў, у рэвалюцыйную эпоху.

У Заходняй Беларусі заставаўся стары эканамічны ўклад з прыватнай уласнасцю, сацыяльным і нацыянальным уціскам. У гэтых умовах працягвала бытаваць традыцыйная народная творчасць, набываючы, аднак, большую сацыяльную завостранасць. Лепшыя песенныя ўзоры сталі служыць актуальным задачам дня. Яны сцвярджалі веліч і хараство народнага генія.

Паміма таго, што стары гаспадарчы і сямейны ўклад быў глебай, на якой працягвала жыццё і каляндарная паэзія і сямейна-бытавая, у сацыяльнай псіхалогіі мас за час Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўжо першага этапа вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі адбыліся карэнныя змены. І гэта было прадумовай з'яўлення новай масавай творчасці, адметнай сваім ідэйна-мастацкім складам, формай. Яшчэ да Рыжскага міру (сакавік 1921 г.) з часу з'яўлення на беларускіх землях польскіх легіёнаў (1919—1920 гг.) у беларускай народнай творчасці з'явілася тэма барацьбы з белапалякамі. Знайшла яна выказ у вострых палітычных прыпеўках і ў лірычнай песні, у якой, напрыклад, маладая беларуская дзяўчына сумуе па сваім каханым, чырвоным камандзіры, расстраляным польскімі жаўнерамі («На высокай зялёнай магіле»).

У першыя гады заняволення Заходняй Беларусі там развіўся пад кіраўніцтвам КПЗБ даволі значны партызанскі рух. Настрой няскоранасці, дух супраціўлення адбівала ў сабе і паэзія таго часу: самадзейныя пры-

пеўкі пра паноў, іх прагнасць і баязлівасць, песні пра герояў народнага супраціўлення («Атаман Муха» і др.).

Сярэдзіна дваццатых гадоў і другая палавіна іх адзначаліся шырокім вызваленчым рухам у форме легальных арганізацый («Беларуская сялянска-работніцкая грамада», Сялянска-работніцкі клуб «Змаганне», «Таварыства беларускай школы» і інш.), якія стварылі шырокую сетку легальнага перыядычнага друку рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку. Узнятыя да свядомага грамадскага жыцця масы пацягнуліся да асветы, да друкаванага слова. Карэспандэнты з вёсак і гарадоў слалі ў рэдакцыі вершаваныя допісы, карэспандэнцыі, нярэдка гумарыстычнага ці сатырычнага зместу. Гэта была масавая самадзейная паэзія, больш удалыя рэчы якой праз друк ізноў вярталіся ў народ і набывалі там шырокае бытаванне ў выглядзе прыпевачных куплетаў, песень. Героем гэтых твораў выступаў сам народ, які падымаўся да разумення свайго сацыяльнага і палітычнага становішча, свайго права.

Значную ролю ў станаўленні сацыяльнай і нацыянальнай свядомасці працоўных Заходняй Беларусі адыграла беларуская рэвалюцыйна-дэмакратычная літаратура і перш за ўсё творы Я. Купалы і Я. Коласа, многія з якіх набылі шырокую ўсенародную свядомасць, фальклярызаваліся. Гэта вершы Купалы «Гэй, наперад», «За свабоду сваю», «Не пагаснуць зоркі ў небе» і інш., коласаўскі «Нёман», «Сціхні ты, змоўкні, песня пакуты», «Доля батрачкі» і інш.

У 30-я гады, нягледзячы на разгром легальных дэмакратычных арганізацый, вызваленчы рух не спыняўся. Шырокае распаўсюджанне ў народзе набылі песні міжнароднага пралетарыяту «Інтэрнацыянал», «Варшавянка», «Чырвоны сцяг» і інш. Вядомыя рэвалюцыйныя песні «Беснуйтесь, тираны!», «Мы кузнецы», «Молодая гвардия» прайшлі ва ўмовах вызваленчай барацьбы Заходняй Беларусі своеасаблівую народную рэдакцыю.

У 30-я гады вызваленчы рух працоўных Заходняй Беларусі адзначыўся рэвалюцыйнымі выступленнямі пралетарыяту і сялянства. Па гарачых слядах падзей узнікаюць песні «Так званая вёска Асташын» (пра антыпанскае выступленне сялян Навагрудчыны), «Нарачанка» (аб барацьбе нарачанскіх рыбакоў). Героем масавых песень становіцца мужны змагар падполля — камуніст (песні «Пра Сяргея Прытыцкага», «Пра Колю Арцюха» і інш.). Паасобныя песні расказвалі пра суровую заходнебеларускую рэчаіснасць: прыгнёт, галечу, клікалі на барацьбу з прыгнятальнікамі («Перайшлі каляды», «Ой, вядуць, вядуць», «Пад гоман вясёлы» і інш.). Часта рэвалюцыянеры-падпольшчыкі ў мэтах прапаганды паспяхова выкарыстоўвалі старую каляндарную абраднасць і паэзію. Пад выглядам калядоўшчыкаў, валачобнікаў яны хадзілі па вёсках і ў сваіх «калядках», «валачобных», дзе была выкарыстана толькі традыцыйная форма, выкрывалі буржуазны ўрад, клікалі працоўных на змаганне («Браты мае, ўжо час настаў», «Чырвоная зорка», «Сягоння Купалле, заўтра — Ян» і інш.).

Істотны раздзел заходнебеларускага фальклору складаюць песні палітзняволеных. Зняволеныя барацьбіты, нягледзячы на суровыя ўмовы, і ў турмах жылі паўнакроўным духоўным жыццём. Дух рэвалюцыйнай салідарнасці, узаемавыручкі, глыбокай веры ў ідэалы камунізма панаваў сярод зняволеных турмы Лукішкі, якую называлі заходнебеларускай Бастыліяй, у Картуз-Бярозе, Гродзенскай, Навагрудскай, Глыбоцкай і іншых турмах на Заходняй Беларусі і ў самой Польшчы. Як успамінае адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля ў Заходняй Беларусі М. С. Арэхва, амаль кожны другі палітзняволены ў турме пісаў вершы. Некаторыя з гэтых твораў падхопліваліся ўсімі і станавіліся песнямі. Так, у Лукішках быў створаны марш грамады «Сто тысяч нас было сяброў», атрымала вядомасць турэмная песня «Ціха гасла чароўная зорка». У канцэнтрацыйным лагеры Бяроза Картузская ўзніклі творы, моцныя сваёй антыімперыялістычнай накіраванасцю, інтэрнацыянальным пафасам (песні «Марш бярозаўцаў», «У Бярозаўскай бятанярні», «Ой, у Бярозе» і інш.).

Завяршальны раздзел заходнебеларускай народна-паэтычнай творчасці вылучаецца агульным мажорным тонам. Гэта пераважна песні і прыпеўкі аб вызваленні працоўных Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. Чырвонай Арміяй. У паэзіі вераснёўскіх дзён пульсуе радасць вызваленай зямлі, гучыць удзячнасць вызваліцелям. Тэма жыцця і барацьбы працоўных Заходняй Беларусі да ўз'яднання іх у адзінай савецкай дзяржаве была дамінуючай у народнай творчасці заходніх абласцей аж да Вялікай Айчыннай вайны. І толькі Вялікая Айчынная вайна захінула сабой раней пераж ытае народам. Як само жыццё падрыхтавала барацьбітоў заходнебеларускага камуністычнага падполля да змагання з новым ворагам, самым небяспечным да таго ворагам чалавецтва — гітлераўскім фашызмам, так і заходнебеларускі фальклор сваім высокаідэйным баявітым гучаннем стаў прамым папярэднікам тэмы вызваленчай барацьбы ў фальклоры Вялікай Айчыннай вайны.

**Літаратура**

*Калеснік У. А.* Час і песні. Мінск, 1962.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967.

## Шалейце вы, каты!

Шалейце вы, каты, піце нашу кроў,
Будуйце астрогі, гадуйце шпікоў,
Паўстане да бою народ катаваны
На смерць, на смерць, на смерць вам, тыраны!

За волю народа, за права яго
Не страшны кайданы і змрочны астрог,

Бо вольнага духу не скуць у кайданы
На смерць, на смерць, на смерць вам, тыраны!

З усходу бліжэй бура ўсё грукаціць,
За Нёман, за Віслу яна праляціць,
І сонца свабоды з-за хмараў нам гляне —
Парвем, парвем, парвем мы кайданы.

Работнікам рукі ад зграі ліхой
Усе мы падайма, паклічам на бой,
Бо нас аб'яднала ліхая нядоля,
Пот крывавы, здзек і няволя.

## Атаман Муха

Польскі бот неміласэрдны
Топча край беларусоў.
Грабіць, муча пан бязмерна —
Не было такіх часоў.
Стогнуць вёскі ад падаткаў,
Пухне з голаду народ,
Лад вядзе бізун і ўзятка,
Патурае розны зброд.
Вось на помсту за няволю,
За грабежства і за здзек
Устаў на кліч народнай волі
Беднай вёскі чалавек.
Ён пагібель ліхадзеяў —
Гэта Муха-атаман.
Перад ім са страху млее
Ксёндз-груган, пузаты пан.
Горы золата з палацаў
Муха скажа, дык плыве
Скуль узяты, там дзе праца
У курнай хатачцы жыве.
Дзмухане са злосці Муха —
Мігам знікне панскі двор.
Кулаком імпэтна бухне —
Ляжа ворагаў бугор.
Мухі моц непераможна,
Бо пакрыўджаныя з ім,
Нават Польшча вельможна
Ператрусіла зусім.
Лес і поле, горы-долы

Атамана берагуць,
Беларусі вёскі, сёлы
Пад яго крыло імкнуць.
Скалыхнуў народ да бою
Муха, слаўны атаман,
Прападай жа з галавою
Акупант наш, польскі пан!

### Прыпеўкі

Кінуў жонку, ды начуе
Пан са стрэльбай у руках.
А як страх які пачуе,
Дык збаўленне у нагах.

Кукурэкнуў на ўсе крэсы
Наш чырвоны петушок,
Нагавіцы, інтарэсы
Пан пакінуў і уцёк.

Эй, Варшава, нас не руш
Ды на лбе сабе адзнач,
Што ўсім крыкнуў беларус:
— Я вам больш не паслугач!

Вывеў польскі пан пузаты
Волю-долю з нашай хаты.
Охі-ўздохі кіну-рыну,
Торгну пана за чупрыну.

### Заходнебеларускі гімн

Не пагаснуць зоркі ў небе
Покі неба будзе,
Не загіне край наш родны
Покі будуць людзі.

Ночка цёмная на свеце
Вечна не пануе,
Зерне, кінутае ў ніву,
Усходзе ды красуе.

І зацвіў наш край, як сонца,
Пасля непагоды
У роўнай волі, у роўнай долі
Між усіх народаў.

### Нёман

Льецца Нёман паміж гораў
Светлы, чысты, як з расы,
Накапаў ён ям і нораў
Гоніць воды праз лясы.

Колькі раз рыбацкі човен
На грудзях тваіх гуляў:
Ой ты, Нёман, быстры Нёман,
Колькі дум ты мне нагнаў.

Сёння горкі твае воды
Ад гарачых нашых слёз,
Ад нядолі, ад няволі,
Што з сабою пан прынёс.

Але пройдуць дні нягоды,
І настане светлы май,
Калі злучыш назаўсёды
Разарваны лёсам край.

## Наперад, гэй...

Да родных ніў пальецца спеў
З прызывам ўсіх да працы,
Хто шчасця век у жыцці не меў,
Ідзі яго шукаці.

Наперад, гэй, хутчэй, хутчэй
Да той жаданай мэты,
Хай свеціць сонца нам святлей
І мы яму пасвецім.*

Дзе серп блішчыць, звініць каса,
Дзе льецца пот крывавы,
З рассветам змые ўсё раса,
Пальецца песня славы.

І на прасторы родных ніў
Свабоды сцяг паставім,
Дзе кат свабоду закляйміў,
Там волю мы праславім.

Уставай, галодны беларус,
Служыць радзімай справе,
Скінь з плеч няволю і прымус,
Здабудзь дарогу к славе.

## Маладняк

Смялей! Зару спаткаем,
Сябры, у барацьбе!
І шчыльнымі радамі
Праб'ем мы шлях сабе.
Наперад, марш! На новы шлях!
Вышэй юнацкі вольны сцяг!

Мы маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.**

Мы паднявольнай працы
Спазналі ўсе прыгон
І радасці ў юнацтве
Не ведалі мы дзён:
Ярмо фашызма церпім мы,
На душах цемры кайданы.

Мы маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

Пад гоман звонкай сталі
Лілі мы пот і кроў
І шчасце мы кавалі
Для банды буржуёў.
Але прыгон, што нас душыў,
Барацьбітамі нас зрабіў.

Мы маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

На бой з гвалтаўнікамі,
Сябры, за намі ўслед!
Мазольнымі рукамі
Мы створым новы свет.
За намі ўсе! Гартуйце сталь!
Смялей ў сонечную даль.

У бой, маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

## Кавалі

Мы кавалі з юнацкім духам,
Куём мы будучыні дні,
Наш цяжкі молат ўзлятае пухам
І ў сталь магутную грыміць.

Мы кавалі зямлі рабочай
Аб лепшай долі летуцім,
Ды не дарма мы трацім сілы,
Недарам сталлю мы грымім.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.
** Прыпеў паўтараецца два разы.

Бо сталь сваім магутным гулам
Рве путы цемры векавой
І ў гарадах зямное кулі
Рабочы люд ўстае сцяной.

Куём мы шчасце для народу,
Правы на ўласнае дабро
І за жаданую свабоду
Мы ўсе змагаліся й памром.

Мы кавалі з юнацкім духам,
Куём мы будучыні дні,
Наш цяжкі молат ўзлятае пухам
І ў сталь магутную грыміць.

### Нарачанка

Рыбакі нарачанскія, сяляне,
Вы збірайцеся ўсе ў грамаду.
Не давайце вы рыбу фашысту,
Не спраўляйце гарматаў яму.

Не патрэбны нам іхні гарматы,
Нам ахвота яшчэ толькі жыць.
Усе сілы паны пакладаюць,
Рыбакоў нарачанскіх пабіць.

Рыбакоў нарачанскіх ёсць многа,
Ім не ўдасца ўсіх пагубіць,
Прыдзе дзень і гадзіна расплаты,
Пан у жаху ад нас задрыжыць.

Вы не думайце, кучка фашыстаў,
Што вы будзеце век панаваць,
Прыдзе час — мы жыццё пабудуем,
Будзем вашы двары раздзяляць.

Рыбакі нарачанскія дружны,
Яны многа па свеце чуваць,
А панам усё гэта ёсць страшна,
Што не хочуць Нарочча аддаць.

Для нас Нарач ёсць родная маці:
Нас карміла, паіла сыноў,
Не дапусцім яе мы ў крыўду,
Усёй сілай адгонім паноў.

### Нас не зломіць нядоля ліхая...

Нас не зломіць нядоля ліхая,
Не сагнёмся прад ёю дугой,
Мы — сям'я кавалёў маладая,
Майстры будучыні людской.

Нам не страшны маланкі і буры,
Не спалохаемся перуноў,
Нашай моцнай юнацкай натуры
Не зламаць усеўладным паном.

Нас нядоля-бяда гадавала,
Голад-холад карміў, даглядаў,
Мы — сям'я кавалёў маладая,
Уціск нашую моц гартаваў.

Дык наперад, арлы маладыя,—
Пойдзем прышласці лепшай шукаць,
Знішчым горы і слёзы людскія,
Хто ж нас можа цяпер утрымаць?

Наперад! Лепшы лёс нас чакае,
Сонца будзе нам лепей свяціць,
Мы — сям'я кавалёў маладая,
Йдзем аковы няволі разбіць.

### Гэй, наперад!..

Гэй, наперад, покі сэрца
Б'ецца, рвецца на прастор,
Годзе млеці ў паняверцы,
Гэй, да сонца, гэй, да зор.

Хай бацькі стагналі ўчора,
Йшлі на той свет без пары,
Сёння ў нашай моцы — доля,
Мы жыцця гаспадары!

Думка ў думку дружна, смела
Усе наперад грамадой.
Кожны ведай сваё дзела —
Знай, за праўду крэпка стой.

### Браты мае...

(«Велікодная»)

Браты мае, ўжо час настаў,
Бо кожны з нас за праўду стаў.
І мы гаворым на ўвесь свет:
Будуй Савет! Будуй Савет! Будуй Савет!

За гэта ўсё паноў хвалі,
Такое жыццё даў нам бог,
І дзень, і ноч, як вол, рабі,
Бадай ён здох! Бадай ён здох! Бадай ён здох!

Ты баек тых не пад'ясі,
Што баюць нам аб небясі,
Не вер ты, цёмны наш народ,
Ідзі ўпярод! Ідзі ўпярод! Ідзі ўпярод!

Годзе без хлеба гараваць,
Уставай, таварыш, годзе спаць.
Ідзі ў свіран к кулаку
Па хлеб, па сала й па муку,
То пад'ясі! То пад'ясі! То пад'ясі!

**Марш бярозаўцаў...**

Палямі палескімі група ішла,
Штыхі наваколі, як шчаціннe,
А сэрца нам такт адбівала: раз-два,
Дзесь плакала маці аб сыне.

Зямля нам ледзь чутна шаптала ў слязах:
— Ой, стрэне ў Бярозе вас доля.
І каты, і здзекі, і карцэраў жах,
Няволя навокал, няволя!

Галоў не схілялі, ішлі, як на бой,
Сыны барацьбы і пакуты.
Да дна пілі келіх атруты ліхой,
Праклятага ладу атруты.

Марш, марш, толькі ша, навіна ёсць, браты.
І шэптам пайшло ўздоўж калоны:
«Усюды бастуюць». Раўняйся, раз-два,
Кітай мкне наперад Чырвоны.

Там знаюць усе, што не стала ў нас двух,
Што здзек, што тэрор тут шалёны.
Бярозаўцы, рот-фронт! Не зломяць наш дух,
Бо крочаць за намі мільёны.

## Нас душаць зладзеі-акупанты...

Нас душаць зладзеі-акупанты,
Нас душаць буржуі і паны,
Па спінах гуляе гумовая палка,
Гаротныя нявольнікі мы.

На бой, маладзёжнае племя,
З чырвоным штандарам ў руках,
Супроць акупанта, бяспраўя, няволі,
За ўладу рабочых і сялян.*

Працуем, гаруем дні і ночы,
Свой пот праліваем ракой,
А ўсё для акупанта, паноў і падпанкаў,
Для катаў, купцоў-ліхвяроў.

Нам прыклад падалі Саветы,
Як скінуць буржуяў і паноў,
Як волю і шчасце здабыць для народа,
І мы той дарогай пайдзём.

Выходзьце, сыны Беларусі,
З рабочых кварталаў і сёл.
Наперад, за жыццё, свабоду і шчасце,
Наперад у рашучы бой.

## Чырвоная зорка

Чырвоная зорка, чырвоная зорка
На ўсходзе свеціць,
Каб вызваляліся, каб вызваляліся,
Кліча свае дзеці.

Сурмы іграюць, на бой прызываюць,
Мужык прабудзіўся і абразуміўся,
Пазнаў, што волі, шчасця і долі
Ад веку вякоў не мае.**

Устаньце з няволі, устаньце з няволі,
Досыць гараваці,
Бо свет нам новы, бо свет нам новы
Трэба будаваці.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

Мы ўсе брацці, мы ўсе брацці,
Сям'я беларусаў,
У сваім родным краі, у сваім родным краі
Жыць будзем без прымусаў.

У сваім родным краі, у сваім родным краі
Жыць добра нам будзе.
Вольна і свабодна, вольна і свабодна,
Аж здзівяцца людзі.

### Стары год пражыўшы...

Стары год пражыўшы, жывем новы год,
Чаго ж дачакаўся наш бедны народ?
Дачакаліся мы мукі,
Будуць помніць нашы ўнукі
Да смерці паноў.

Нашу зямельку ад нас аднялі,
Панскіх сыночкаў панадзялялі.
А за гэтыя падаткі
І кароўкі і цяляткі
Ад нас аднялі.

Бо паны волю такую маюць,
З мужыка шкуру жыўцом здзіраюць:
Як пан дзярэ, то ксёндз строга:
Cierp, duszeczko, to od boga
Cierp, duszeczko, cierp!

Як мы будзем у касцёл хадзіць
Ды будзем слухаць, што ксёндз гаворыць,
Дык, браткі, з гэтай нядолі
Не выйдзе дабра ніколі,
Покуль будзем жыць.

Пан пехатою не ходзе,
Ён любіць ездзіць на самаходзе.
Едзе, пуза адваліўшы,
Досыта крыві напіўшысь,
Гэта ўсё людской.

Што паны робяць за нашы грошы?
Яны спраўляюць абед харошы,

П'юць віно, ядуць дзічыну,
Штоноч — свежую дзяўчыну,
Бо яны — паны.

Цяжка на сэрцы запала дума:
— Ці ж ад паноў ўжо ратунку няма?
Ёсць ратунак, вам прызнацца,—
У КПЗБ запісацца
І пабіць паноў.

### Заходнебеларуская купалка

Сёння Купала, а заўтра Ян,
Будзе, панове, ліха вам.

Будзе вам ліха, ліха ліхое,
Скончыцца вам панства такое.

Сёння Купала, а заўтра Ян,
Будзе, панове, ліха вам!

### Ой, вядуць, вядуць...

Ой, вядуць, вядуць дарогай скутых,
Не лісты звіняць асеннія, а путы,
Не лясы галосяць следам у дуброве,
А, застаўшыся, сіроты і удовы.

Толькі помсты нашай путамі не звяжуць,
Яна зарывам і поўначчу ўстаніць,
Над асадніцкімі хатамі, сялібамі,
Палацовымі яна зазвоніць шыбамі.

### Смерць вязня

Ціха гасла чароўная зорка,
Яе блеск недзе гінуў між хмар.
За турэмнай цаглянай сцяною
Паміраў малады камунар.

Хмары чорныя дзіка глядзелі,
Дзіка гром у гары гракатаў,
Прытуліўшысь да кратаў сталёвых
Барацьбіт з захапленнем шаптаў:

— Ох, каб сілы юнацкай хоць трохі
Засталося ў схудалых грудзях,
Каб дзяўчыне каханай апошні
Пацалунак злажыці я мог.

Каб пабачыць таварышоў мілых,
Ім аддаць свой апошні прывет,
Я спакойна сышоў бы ў магілу,
Без пратэсту пакінуў бы свет!

Толькі вобразы мілых луналі
І неслісь у невядомы шлях,
Перад ім абразы ўсплывалі
І ўсплыў перад ім працы сцяг.

Так пагасла чароўная зорка,
Так памёр малады камунар,
Народ песняй яго ўспамінае,
За геройства складаючы дар.

### Пад гоман вясёлы...

Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы ўсіх на бяседзе такой
Успомнім мы, брацці, аб долі няроўнай,
Пра ўсіх тых, хто церпіць за край родны свой.

З гарачай душою ўсе лепшыя сілы,
Што выйшлі з рабоча-сялянскай сям'і,
Адных ужо крыюць курганы-магілы,
Другія — у мурах за кратай турмы.

У Познань і Кракаў, у далёку чужыну,
Загнаны ў няволю ён быццам навек,
Бацькоў старых кінуў і мілу дзяўчыну,
Сам церпіць ён голад, і холад, і здзек.

І белым тварам прынікшы да кратаў,
Зоркі шукае на небе начном,
Каб думку занесла да роднае хаты,
Каб кліч перадала ўсім брацціям ў сяло.

Змагайся, мой дружа, з наезнікам-панам,
Змагайся за лепшую долю сваю,

Змагайся за лепшую долю-свабоду,
Хоць цяжка змагацца, а ўсё зможаш ты.

Пад гоман вясёлы, пад звон чары поўнай,
Пры зборы ўсіх мы прысягу даём:
«Не зломяць нас віхры ў той бітве няроўнай;
За здзек з нашых брацця́ў мы помсту
нясём».

**Гусі**

Як ляцелі гусі
Ды над Беларуссю,
Ляцелі, ляцелі,
Апусціліся, селі.
Гусі тыя былі
Шляхецкага роду,
Яны нарабілі
У нашым полі шкоды.
— Гыля, гыля, гусі,—
Яны не баяцца,
У нашай Беларусі
Сталі абжырацца.
Паадраслі пёры,
Набраліся шыку,
Пыхі і гонару
Гусь-то — пан вялікі.

Як над нашым полем
Ды аднаго году
Ляцелі саколы
З-пад сонца ўсходу.
Як убачаць гусі,
Моцна напужаліся,
З палёў Беларусі
Ледзь яны падняліся.
Ды ляцелі гусі,
Хто куды каторы,
У палёх Беларусі
Пагублялі пёры.
Пагублялі шапкі,
Панскую асанку
Ды ляцелі з крыкам:
— Уцякай, васпанку!

# НАРОДНА-ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ САВЕЦКАГА ЧАСУ



# БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ НАРОДНА-ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Новая эпоха, якая пачалася пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, характарызуецца вялікім размахам развіцця народнай творчасці. Народнае мастацтва савецкага часу фарміравалася пад уплывам вялікіх падзей, што адбываліся ў нашай краіне. У ім ярка адлюстраваны адносіны савецкіх людзей да тых карэнных змен, якія здзяйсняліся ў сацыялістычным грамадстве.

Лепшыя традыцыі дарэвалюцыйнага фальклору трывала ўвайшлі ў савецкую народную творчасць. У першыя гады Савецкай улады актыўна бытавалі амаль усе жанры беларускага фальклору. Асаблівай папулярнасцю карысталіся традыцыйныя творы цікавага зместу і дасканалай мастацкай формы, якія адпавядалі эстэтычным запатрабаванням працоўных. Паступова, са зменамі ў жыцці народа змяняўся змест і ўдасканальвалася форма вуснапаэтычных твораў.

Гісторыя беларускага савецкага фальклору дзеліцца на два перыяды: народная творчасць эпохі пабудовы сацыялізму і народная творчасць перыяду развітога сацыялізму.

У гады сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў асяроддзі беларускага народа былі папулярнымі песні «Інтэрнацыянал», «Марсельеза», «Варшавянка», «Смела, таварышы, ў ногу» і інш. Гэтыя песні абуджалі баявы дух працоўных, натхнялі на барацьбу супраць унутранай контррэвалюцыі і інтэрвентаў. На Беларусі разгарнулася партызанская барацьба з белапольскімі акупантамі. Беларускаму народу імпанавалі ідэі песень, якія спяваліся ў 20-я гады чырвонаармейцамі: «Па сібірскіх тайгах і далінах», «Па далінах, па загор'ях», пра Чапаева і інш. Вуснапаэтычная творчасць набывала інтэрнацыянальны характар.

У народных творах перыяду грамадзянскай вайны, аднаўлення і рэканструкцыі гаспадаркі краіны ўслаўляюцца Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, героі грамадзянскай вайны, раскрываюцца змены ў грамадстве, адлюстроўваецца рост свядомасці працоўнага чалавека, загарта-

ванага ў баях за свабоду. Выказваючы нянавісць да контррэвалюцыі, беларускі народ трапна выкарыстаў магутную зброю сатыры і бязлітасна высмеяў Калчака, Дзянікіна, Пятлюру, Пілсудскага і іншых ворагаў савецкай дзяржавы. У песнях, частушках, прыказках гэтага перыяду адлюстравана новае жыццё нашага народа, сацыялістычнае будаўніцтва, класавая барацьба ў горадзе і вёсцы, рост культуры, ліквідацыя непісьменнасці. Цяжкаму і бязрадаснаму жыццю ў дакастрычніцкі час супрацьпастаўлялася свабоднае і светлае жыццё пры Савецкай уладзе. Значнае месца займала тэма калектывізацыі і барацьбы з кулакамі. Ваяўнічы характар набывае антырэлігійная народная творчасць.

Шматлікія народныя творы прысвечаны правадыру працоўных усяго свету У. І. Леніну і Камуністычнай партыі.

У савецкай народнай творчасці ўсіх перыядаў вобраз У. І. Леніна займае самае пачэснае месца. Нездарма М. Горкі заўважыў, што «фальклор у нашы дні ўзвёў Уладзіміра Леніна на вышыню міфічнага героя старажытнасці, роўнага Праметэю».* У казках і легендах, вусных апавяданнях і сказах, песнях і частушках, прыказках і прымаўках выказана гарачая любоў працоўных да вялікага правадыра. У вобразе У. І. Леніна ўвасоблены мудрасць генія і прастата самага чалавечнага чалавека, жорсткасць да ворагаў народа і чуласць, увага да працоўных.

Найбольшае месца ў народнай творчасці ў даваенныя гады займалі песні, частушкі, сказы аб перамозе калгаснага ладу, аб ударніках працы палёў, фабрык і заводаў. У гэтых творах выказваецца гарачы патрыятызм, любоў да нашай партыі і ўрада. Савецкія народныя творы ўспрынялі лепшыя мастацкія традыцыі дарэвалюцыйнага фальклору і зведалі на сабе ўплыў прафесіянальнай літаратуры.

Гераізм і мужнасць, гарачы патрыятызм нашага народа ярка адлюстраваны ў фальклоры Вялікай Айчыннай вайны. Беларускія народныя творы гэтага перыяду заклікалі да барацьбы з гітлераўскімі захопнікамі, са здраднікамі Радзімы, натхнялі воінаў Савецкай Арміі і партызан на подзвігі. Вострая народная сатыра развенчвала міф аб неперможнасці гітлераўскай арміі, усяляла ўпэўненасць у перамозе над ненавісным ворагам. Народныя творы паказвалі злачынствы і здзекі раз'юшаных фашыстаў над насельніцтвам акупіраваных тэрыторый. Нямала твораў прысвечана героям Вялікай Айчыннай вайны — Канстанціну Заслонаву, Ціхану Бумажкову, Сяргею Грышыну і інш. Творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, доўгі час карысталіся папулярнасцю і ў пасляваенныя гады, а некаторыя з іх жывуць у народзе і ў нашы дні.

Перамога над нямецка-фашысцкімі захопнікамі — адна з найбольш пашыраных тэм у пасляваенныя гады. У гэты перыяд цэнтральнай становіцца тэма, прысвечаная аднаўленню і развіццю народнай гаспадаркі, камуністычнаму будаўніцтву. Значнае месца займаюць творы аб ролі навукі

---

* *Горький М.* О литературе. М., 1953, с. 703.

ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, аб асваенні космасу. Важнай тэмай сучаснай народнай творчасці з'яўляецца тэма барацьбы за мір. Шырока выкарыстоўваецца і зброя сатыры, якая накіроўваецца супраць усяго таго, што перашкаджае нашаму руху ўперад.

### Літаратура


*Дарэвалюцыйная* і Савецкая Беларусь у народнай творчасці. Пад рэдакцыяй Я. Коласа і М. М. Нікольскага. Мінск, 1938.

*Песні* беларускага народа, т. 1. Пад агульнай рэдакцыяй М. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата. Мінск, 1940.

*Жанчына* ў беларускай народнай творчасці. Склалі Э. Галубок, А. Калечыц і Н. Багдановіч. Пад рэдакцыяй М. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата. Мінск, 1940.

*Беларускія* народныя прыказкі і прымаўкі. Склаў Ф. Янкоўскі. Мінск, 1961.

*Антырэлігійныя* казкі, частушкі, прыказкі. Склалі А. І. Залескі, К. П. Кабашнікаў і А. С. Фядосік. Мінск, 1961.

*Беларускі* фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Складальнікі: І. В. Гутараў, М. Я. Грынблат, К. П. Кабашнікаў, І. С. Сцяпунін, І. К. Цішчанка. Мінск, 1961.

*У. І. Ленін* у беларускай народнай творчасці. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі. Мінск, 1967.

*Анталогія* беларускай народнай песні. Укладанне і каментарыі Г. І. Цітовіча. Мінск, 1968.

*Песні* савецкага часу. Складальнік Г. А. Барташэвіч. Складальнік музычнай часткі В. І. Ялатаў. Мінск, 1971.

*Кабашнікаў К. П.* Нарысы па беларускаму фальклору. Мінск, 1963.

*Беларуская* народная вуснапаэтычная творчасць. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі, І. В. Гутарава і М. Я. Грынблата. Мінск, 1967.

*Цішчанка І. К.* Беларуская частушка. Мінск, 1971.


## КАЗКІ, СКАЗЫ, АНЕКДОТЫ

### Ленінская праўда

Жылі ў вёсцы два браты. Поле яны аралі, зямлю слязьмі палівалі і гарбы сабе нажывалі. Хлябок і жывёлу ў іх паны забіралі, а плацілі за гэта кулакамі ў спіну.

Жылі браты не год і не два, а невядома колькі. Вакол і другія мужыкі таксама жылі.

Абрыдла братам працаваць на чужое здароўе. Вырашылі яны адправіцца па Расіі-матушцы праўды шукаць.

Ідуць яны месяц, ідуць год, а насустрач ім стаіць вялікае сяло. Пасярод — панскі дом і царква каменная.

«Дай,— думаюць браты,— зойдзем сюды і спытаем праўды».

Ідуць яны па вёсцы, а насустрач ім пан у калясцы едзе.

— Чые вы, мужыкі, адкуль ідзяце і чаго шукаеце? — запытаў іх пан.

Браты адказваюць яму:

— Жылі мы, жылі ў галечы, у горы, і больш моцы не хапіла так жыць. Ідзём праўды шукаць. Навучы нас, пане, дзе яе знайсці.

— Добра,— кажа пан,— пакажу я вам праўду, калі пажадаеце, толькі вы мне папрацуйце за гэта.

Згадзіліся браты.

Працавалі яны, працавалі: поле аралі, зямлю слязьмі палівалі. Прайшоў год, падыходзяць яны да пана і кажуць:

— Навучы зараз, пане, як нам праўду знайсці.

— Ну, вось вам і праўда,— адказвае ім пан,— голь нямытая, працаваць вам заўсёды на нас, паноў.

Плюнулі браты і пайшлі далей.

Ідуць яны месяц, ідуць год. Бачаць — стаіць поп.

— Навучы, айцец, дзе праўду знайсці,— пытаюць яны.

— Добра,— кажа ён,— я вам праўду ў цара нябеснага вымалю, а вы ў мяне папрацуйце за гэта.

Згадзіліся браты. Працавалі яны, працавалі, слязьмі зямлю палівалі. Прайшоў год. Прышлі браты да папа, а ён кажа:

— Працуйце вы добра і не гнявіце бога,— вось і ваша праўда.

Плюнулі браты і пайшлі далей.

Прыходзяць яны да купца. Вышаў ён таўсты і багацейшы за пана і папа.

— Добра,— кажа купец,— навучу я вас праўдзе, толькі папрацуйце на мяне.

Згадзіліся браты. Сталі браты працаваць і гарбы нажываць. Вучыў іх купец, як народ ашukваць і беднату абмерваць. Не дачакаліся і года, як малодшы брат і кажа:

— Не пайду я больш праўду шукаць, няма яе на свеце, праўды мужыцкай.

І вярнуўся ён у сваю вёску. А старэйшы брат настойлівы — не хацеў ён без праўды дамоў варочацца. Пайшоў ён адзін да фабрыканта.

Фабрыкант і за пана, і за папа, і за купца багацей. Пачаў старшы брат працаваць у яго. А на фабрыцы шмат людзей працуе.

Працавалі яны многа год. Гарбы нажывалі, а праўды не бачылі. Толькі раз пачуў брат на змене ціхую гутарку:

— Ёсць чалавек адзін — ён і праўду ведае. Завуць гэтага чалавека Леніным, а жыве ён на поўначы, у Піцеры.

Запомніў брат імя гэта і пайшоў шукаць гэтага чалавека.

Ішоў шмат дзён, а магчыма і месяцаў. Прышоў у Піцер. Бачыць — ідзе рабочы, ён яго запытаў ціхенька:

— Дзе тут Леніна знайсці?

А той яму яшчэ цішэй:

— Пойдзем са мной, я цябе давяду.

Вось і прыйшлі яны ў звычайны пакой. Вакол розных кніг шмат. Вышаў да іх чалавек, адзет не багата, але чыста. Ён і гаворыць:

— Добры дзень, таварышы, што скажаце добрага?

Расказаў яму брат, як ён праўду шукаў. Доўга з ім гаварыў Ленін аб парадках на фабрыцы, распытваў аб вясковай беднаце, а потым сказаў:

— Правільна ты зрабіў: на фабрыцы праўды ты лепш даведаешся. Вы яе там у руках трымаеце.

І расказаў Ленін брату, як трэба за рабочую праўду змагацца, каб не служыць ні панам, ні купцам, ні фабрыкантам, і як выгнаць іх разам з царом.

Вярнуўся брат зноў на фабрыку і пачаў другім ленінскую праўду таемнымі словамі расказваць. Адзін расказвае, а дзесяць слухаюць, дзесяць расказваюць, сто слухаюць. І пайшла ленінская праўда па ўсім свеце.

Шмат год хадзіла яна па фабрыках і вёсках. Узнімала рабочых і сялян на барацьбу. А ў кастрычніку 1917 года аб'явілася гэтая праўда звонкім голасам, залпамі на ўвесь свет. Пайшлі рабочыя і сяляне бязлітаснай вайной на памешчыкаў і фабрыкантаў. А вёў іх тады сам Ленін.

І ўзяла верх у кастрычніку ленінская праўда.

З таго часу рабочы і селянін больш не працуюць на паноў і фабрыкантаў, гарбоў не нажываюць, зямлю слязьмі не паліваюць, самі гаспадары сваіх фабрык, сваёй зямлі і свайго жыцця.

## Вялікі багатыр

У адным царстве, у вялікім гасударстве нарадзіўся Багатыр. Жыве ён, убіраецца ў сілу ды да жыцця прыглядаецца. А жыццё было — і гаварыць жудасна. Дзень і ноч працавалі людцы гаротныя, пот праліваючы, на паноў-крывасмокаў, а тыя толькі жырэюць ды ўсміхаюцца. Усюды ваяводаў панастаўлялі. Б'юць бедняка, рабуюць.

Працуюць людзі на зямлі, пад зямлёй у шахтах ды жыццё аплакваюць. Як убачыў гэта Багатыр, дык сэрца ёкнула, ад жаласці забалела. Не есць ён, не п'е, а ўсё думу думае: як гэта зрабіць, каб людзі дружна і багата жылі. Доўга думу думаў Багатыр і надумаўся хадзіць па свету і людзей навучаць.

Сабраў ён раз люду цьма-цьмой. Сабраў і пачаў навучаць іх, каб стрэлы вастрылі, нажы тачылі ды на паноў ішлі. Слухаюць людзі бедныя Багатыра, як татку роднага, ды розуму набіраюцца. І пайшла слава па ўсяму свету пра добрага чалавека.

Пачулі гэта паны, знюхалі ды выдалі такі загад — злавіць Багатыра і аддаць пад суд. Пачулі людзі пра загад панскі і захавалі Багатыра ў цёмным лесе, каб ніхто не знайшоў.

Але нядоўга хаваўся Багатыр. Сабраў ён яшчэ больш люду і пайшоў на паноў ваяваць. Спужаліся паны, як асінавы ліст, задрыжэлі і паслалі свае войскі супраць Багатыра. Каля цёмнага лесу яны сустрэліся. Завязаўся такі бой, што лес гуў і клаўся ад топату і стукату. Біліся багатырскія войскі з панскімі. Але паны былі тады моцныя, яны перамаглі. Зноў насу-

нулася на царства, на вялікае гасударства ноч чорная. Застагналі людзі бедныя, палілася кроў распраўная.

Жывуць людцы, зноў гаруюць да пакутуюць. А тут, як на сваю пагібель, пачалі паны біцца паміж сабой. Давай бедняка пасылаць у бой. Біўся, біўся ён ды кажа:



*В. і М. Басалыгі.* Саломка

— Годзе мне з голаду пухнуць ды ў лахманах хадзіць. Хайт-ка пан сам паваюе.

Прачуў гэта Багатыр ды ўзрадаваўся:

— Гэта добра, сыны мае родныя. Толькі трэба паноў пабіць ды па-новаму зажыць.

Паслухалі Багатыра беднякі, пачалі паноў лупіць, за шыварат калаціць. А Багатыр узяў пушку, выкаціў на плошчу шырокую ды як гухнуў у царскі дом — аж зямля закалацілася, мора замуцілася. Пачулі ўсе ўсюды стрэлы Багатыра — збегліся да яго, у палацы пайшлі паноў латашыць, капіталістаў душыць. А ён ваюе і навучае людзей:

— Не здавайцеся, браты. Не паддавайцеся на панскую вудачку.

Паслухалі людзі свайго бацьку і паноў ушчэнт разбілі. Скончылася вайна. Цяпер перамаглі багатырскія войскі.

Давай людзі па-новаму жыць ды Багатыра слухаць. А жылі яны дружна, як браты родныя. І раптам бяда звалілася на людзей — памёр Багатыр. Падарвала сілу смелага ваяводы змяя чорная. І давай тут людзі плакаць. Асілкі, і тыя плакалі. Плакалі памочнікі яго, рыдалі сокалы верныя. Плакалі людзі доўга ці мала, ды парашылі зрабіць вялікаму чалавеку такую дамавіну, каб ён ляжаў там, як жывы, каб ворагі і ў смерці баяліся яго, каб усе дзеці маглі паглядзець на дарагога бацьку. Нанеслі граніту моцнага, цэглы чырвонай і змуравалі вялікі каменны будынак.

Праходзяць людзі каля труны вялікай, глядзяць на ясны твар памершага Багатыра. А ён ляжыць, быццам жывы, усміхаецца і гаворыць людзям:

— Не здавайцеся, голубы мае крылатыя, перамагайце прыгнятальнікаў ва ўсім свеце.

### Як мужык-бядняк дабіўся сваёй праўды

Жыў-быў мужык-бабыль, здаровы, працавіты мужчына, здольны на ўсякую работу. Сухія і чэрствыя мазалі ніколі не сыходзілі з яго закаравелых рук. Але колькі ён ні біўся, колькі ні матаўся, а з нужды-голаду выбіцца не мог. Хата-халупа развалілася, жонка б'ецца без кароўкі, дзеткі плачуць — есці хочуць, а самому хоць лезь у пятлю ці галавою ў пролубку. Няма і не відна ніякага выхаду. Такая мужыцкая доля, каб век на другіх працаваць, мазалі наганяць і самому галадаць.

Вось мужык, падцягнуўшы свой жывот папругай, пайшоў дабівацца праўды, як жыць на свеце працоўнаму люду без нястач і голаду. Прышоў к цару і стаў прасіць яго навесці добры парадак і праўду сярод людзей, каб усім было добра жыць і працаваць. Цар скоса паглядзеў на мужыка і паслаў яго ў салдаты і далей на вайну. Мужык некалькі гадоў пацёрся ў салдатах, пабываў на вайне, атрымаў некалькі ран і вярнуўся дамоў, дзе знайшоў сваю сям'ю ў горшай бядзе і голадзе. Пачухаў сваю патыліцу мужык і падумаў: «Дык вось якая царская праўда, якія царскія парадкі».

Пайшоў мужык шукаць праўду ў пана. Зняў шапку і стаў прасіць прыняць яго на работу, каб пракарміць сябе і падгадаваць сваю сям'ю. Паглядзеў пан з насмешкай на мужыка і паслаў яго батраком на свой фальварак. Праслужыў мужык год батраком на панскім фальварку і патрабаваў плату за сваю работу. Пан паслаў мужыка на канюшню і загадаў сваім слугам даць яму сто лоз гарачых за гадавую работу, а затым прагнаў яго са двара. Прышоў мужык дамоў і знайшоў там яшчэ большыя нястачы і гора. Пачухаў мужык патыліцу і падумаў: «Дык вось яна панская праўда, панская ласка».

Пайшоў мужык шукаць праўду ў заможніка-кулака і стаў прасіць яго прыняць к сабе на падзённую работу, каб пракарміць сябе і падгадаваць сваю сям'ю. Кулак паглядзеў на бедняка і паставіў яго к сабе на работу

з умовай — плаціць за кожныя тры месяцы акуратна. Бядняк праслужыў падзённікам тры месяцы з гакам і патрабаваў плату за сваю работу, а кулак, замест платы, паказаў яму дулю і прагнаў яго са двара. Прышоў бядняк-мужык дамоў, паглядзеў на сваіх дзяцей і падумаў: «Дык вось якая праўда ў кулакоў-жывадзёраў».

Пайшоў мужык шукаць праўду ў папа і стаў прасіць яго параіць, як бедняку выбіцца з нястачы і голаду. Поп ласкава паглядзеў на беднага мужыка і параіў яму заказаць малебен за палепшанне мужыцкага жыцця з умовай, што мужык за параду і малебен адпрацуе шэсць дзён на папоўскай гаспадарцы. Мужык хаця-нехаця згадзіўся на заказ малебна і адпрацаваў у гаспадарцы папа шэсць дзён. Але жыццё мужыка-бедняка ні капелькі не палепшала, наадварот — яшчэ пагоршала. Пачухаў мужык патыліцу і падумаў: «Дык вось яна папоўская праўда, папоўская малітва».

Пайшоў мужык шукаць праўду па розных шляхах і напрамках. Хадзіў доўга па свету, сустракаўся з рознымі людзьмі, а праўды нідзе не знайшоў. Нарэшце, сустрэў на сваім шляху чалавека праўдзівага, каторы распытаў мужыка-бедняка, дзе ён быў, куды хадзіў і чаго шукаў. Мужык праўдзіва расказаў, што хадзіў шукаць праўду і ў цара, і пана, і заможніка-кулака, і папа, але, акрамя здзекаў з мужыка, нічога там не знайшоў. Падарожны выслухаў і сказаў яму:

— Ты крэпкі, працавіты мужык, але шукаеш праўду там, дзе яе ніколі не было і не можа быць. Калі хочаш дабіцца праўды і лепшага жыцця, ідзі за рабочым і сумесна з ім пераламайце рэбры вашым царам і панам, заможнікам-кулакам і папам. Толькі такім шляхам вы сумесна з рабочым даб'ецеся сваёй праўды і лепшага жыцця для ўсіх працоўных.

Субяседнік развітаўся з мужыком, назваўся Леніным і пайшоў сваёй дарогай. Мужык падбадзёрыўся і падумаў: «Дык вось дзе сапраўдная наша праўда, дык вось якім шляхам трэба дабівацца праўды і лепшага жыцця для ўсіх працоўных».

Пайшоў мужык-бядняк за рабочым, і сумесна яны скінулі цара і прагналі паноў, кулакоў-міраедаў, капіталістаў, чыноўнікаў і папоў, устанавілі сваю, Савецкую ўладу, а зараз пад кіраўніцтвам партыі Леніна будуюць сацыялізм у сваёй краіне, дзе жыць стала лепш, жыць стала весялей для ўсіх працоўных.

**Пяць зярнят**

Не павысыхалі балоты ад крыві. Траслася дрыгва — і ступі, здаецца, чалавек, дык і, сілу меўшы, не выберацца — затопне.

Плачуць людзі, не меўшы паратунку. А паны гойсаюць па вёсках, гвалтуюць дзевак, рабуюць, старым бароды абразаюць. Плачуць бедныя людзі, мучаюцца. Просяць паратунку ад бога, а бог выракся, мусіць, людзей. Ды калі б хоць быў ён, хто яго бачыў. Можа, калі і быў? Толькі і тады ўсякая разачка находзіла на людзей. Ён даваў дождж не тады, як

людзі просяць, а больш, як мужчыны косяць ды бабы жнуць. Змочыць, і людзі прарослае збожжа ў гумны вязуць.

Пайшла па свеце прачутка, што прыдзе такі чалавек, што людзям збавенне дасць. Загадалі паны, каб у вёскі не пускалі таго чалавека на начлег, каравул па ўсім сяле паставілі, як ад пошасці, баранілі ад таго чалавека.

Толькі прышоў у тую вёску нейкі чалавек, ніхто не ведаў, адкуль ён, а можа і ведалі? Хто яго ведае.

Зайшоў гэта чалавек у адну хату, папрасіўся начаваць — не пускаюць. У другую — там гаспадар сабакамі зацкаваў. Хадзіў ён так мо' ажно да самай поўначы. Няма беднаму прытулку.

Хадзіў, хадзіў, прыбіўся, замарыўся, ды пад акном адной беднай хаты паваліўся.

А жыла ў гэтай хаце бедная ўдава. Мужыка забілі на вайне, з дробнымі дзеткамі, як гарохам, пакутавала. Была кароўка, і тую паны забралі. А ведама ж, з кароўкай дык і хлеба з'ясі, а без кароўкі адна пагібель чалавеку.

Вышла ўдава на двор, бачыць — ажно на прызбе ляжыць чалавек ды просіць, моліць, каб у хату пусціла.

— Няможна, загад у нас такі паны далі. Каб нікога не пускаць.

— Ну, тады я хоць крыху пасяджу ў цябе, ды перакусіць можа дасі чаго...

Узяла таго чалавека ў хату, пасадзіла ў запечку, а каб есці чаго даць, дык не было. Расплакалася тады бедная ўдава, што не будзе чаго малым есці.

— Не плач,— кажа той чалавек,— я табе дапамагу.— Дастаў ён пяць зярнят і даў той жанчыне.

Рада жанчына, ажно сама не ведае, што рабіць. Глядзіць на таго чалавека і плача.

— Чым жа табе, добры чалавек, заплаціць?

Ён і кажа:

— Нічога мне ад цябе не трэба.

Па часе развітаўся ды і вышаў з хаты. Як толькі ён вышаў, дык у хаце адразу светла зрабілася, на стале розныя яствы з'явіліся, а на куце пяціконцая зорка загарэлася.

На дварэ ж такая завіруха ўзнялася, што, здаецца, ўсё скрозьдонне праваліцца. Бегаюць пад вокнамі ўдовінай хаты паны і ўсё крычаць, каго гэта ўдава ў хату пусціла. А тады страляць пачалі. Толькі ўдовіну хату кулі не бяруць. Сядзіць маладзіца, трасецца, а што і рабіць, не ведае. Толькі вось супакоілася ўсё, а ў хату вайшоў нейкі чалавек, от, здаецца, як мужык.

— Куды,— кажа,— той госць пайшоў, кажы?

Пакуль думала, у хату і ўся вёска сабралася, усе пачалі пытацца:

— Куды пайшоў чалавек, мы за ім пойдзем.

Думала, думала ўдава ды і запыталася:

— А што ж гэта, суседзі, за чалавек такі?

— Гэта чалавек, што цуда робіць. А завуць яго Ленін.

Паказала тады ўдава, куды ён пайшоў. І на ўсё жыццё з тых пор яго больш за роднага бацьку любяць.

Яно і праўда, што Ленін лепш за роднага бацьку.

### Проська-змагарка

Даўным-даўно гэта было. Вельмі цяжка тады жылося на нашай вялікай зямлі. Паны ў сялян кроў смакталі, жыць добра не давалі.

Вось жыла-была ў аднаго пана прыгожая сялянка Агапа. Мела яна двух сыноў-кавалёў і дачку Проську. Прыгожыя былі браты-кавалі, на ўвесь свет сваёй працай славіліся.

А такой красуні, такой прыгажуні, якой была Проська, увесь свет абыдзі — нідзе не знойдзеш. Вочы яе былі, што сінь палёў, што зоркі ясныя, што сонца залатое, рукі, што тысячы рук. Імі яна магла карміць і адзяваць увесь свет.

А запяе Проська — бег рэк становіцца, пушчы не гамоняць, птушкі не пяюць, ветры не шумяць — усе слухаюць ды слухаюць Проську-прыгажуню. Хоць і была на ўвесь свет белы найздальнейшая і прыгажэйшая, аднак кепска ёй жылося. Слязьмі горкімі яна лугі паіла, горам цяжкім лясы сушыла.

Ноч і дзень Проська з маткай і братамі на пана працавала, славу багатыра яму здабывала.

Так з году ў год гаравалі яны. Але скора мамка родная Проські не вытрымала цяжкай працы, дрэннага жыцця. Памёрла бедная... Яшчэ горш стала жыць Проська. Угледзеў яе аднойчы пан, і галава яму аж ускружылася. Надта яму падабалася Проська-прыгажуня. Загадаў ён слугам сваім у палац яе прывесці, каб сваёй палюбоўніцай зрабіць.

Паляцелі слугі панскія на конях быстрых. Сілай у братоў-кавалёў сястру адабралі. Завезлі яны к пану злому, за вялікія дзверы пасадзілі. Сядзіць Проська,сумуе. Не хоча яна славы панскай, шкада ёй братоў-кавалёў, усіх бедных людзей.

Надышла цёмная-цёмная ночка. Заснулі слугі панскія. Адамкнула дзверы вялікія Проська, як сінічка, выпархнула з палаца пана-зладзея, пана-разбойніка, галубкай беленькай над хатай сваіх братоў апусцілася. Рана-ранюсенька пан аб прыгажуні сваёй успомніў. Устаў ён, адамкнуў вялікія дзверы, а там нікога няма.

Узлаваўся ён. Загадаў слугам сваім і войску Проську-прыгажуню ў палац што б там ні стала вярнуць. Кінуліся дзікай чарадой падлізы панскія на хату братоў-кавалёў. Але не так лёгка прыйшлося ўзяць. За Проську браты-кавалі заступіліся, усе сяляне, як адзін чалавек, гарой за яе сталі. Завязалася барацьба з слугамі панскімі. Біліся, біліся браты-кавалі за сястру родную, адважна змагаліся ўсе сяляне, але ж ўсё-такі сіла большая

аказалася на баку паноў. Пачалі вязаць Проську, а яна, адважная, непакорная такая, смелую да людзей прамову гаворыць, навучае іх:

— Людзі добрыя, залаценькія, падыміцеся, даражэнькія, ды вазьміце вы зброю вострую, ды паўстаньце сілай грознаю. А вы, браткі мае родныя, сваёй сястрыцы паслухайце, зброяй смяртэльнай к пану ў дзверы пастукайце. Куйце, братцы, мячы вострыя, узбройвайце масы бедныя, усіх паноў знішчайце, беднаму люду дарогу дайце!

Вязалі Проську, у ланцугі закоўвалі, а яна людзям праўду казала, свет ім адкрывала. І ўсе слухалі, варухнуцца ніхто не мог,— так смела і праўдзіва гаварыла Проська-змагарка. Завезлі Проську-змагарку, у цямніцу яе за непакорнасць укінулі. Пан ад радасці ж заскакаў, што перамогу такую атрымаў. Назначыў ён з вялікай радасці баль.

Заззялі палацы панскія агнём яркім, вясёлай музыкай заліліся. Сабралася к яму бачана-нябачана гасцей. Усіх ён смачнай ежай частаваў, заморскім віном паіў, лоўкімі штукарамі весяліў, прыгожымі песнямі і музыкай радаваў.

Позна весяліліся. Усім-усякім забаўляў багаты пан сваіх гасцей. Пад канец балю гасцям надакучылі забавы. Пачалі сумаваць госці. І тут успомніў пан пра Проську-прыгажуню, Проську-вясёлую. Дарагіх гасцей парадаваць захацеў, сваім слугам сказаў, каб весялуню на баль ураз з цямніцы прывялі. Пабеглі слугі ў цямніцу і дзіву даліся. Жалезныя краты разломлены, а Проські і след прастыў.

Выратавалі яе браты-кавалі. Выкавалі яны сабе мячы-самасекі, надзелі шапкі-невідзімкі і прабраліся ў палацы панскія.

Паслаў быў пан пагоню вяліку, але нідзе не знайшлі Проські-змагаркі. Уцякла яна ў лес. А там многа народу сабралася. Ад паноў, вядома, усе хаваліся, каб адпомсціць паганцам за цяжкае, за беднае жыццё сялянскае.

Выбралі сяляне Проську-змагарку сваім атаманам. З таго часу сталі паліць кругом панскія палацы. Помстай гарэлі сэрцы сялян да паноў. Усё больш і больш барацьбітоў збіралася. Для ўсіх іх браты-кавалі зброю кавалі, чым маглі ўзбройвалі. Ніхто не мог перамагчы Проські-змагаркі.

Дзе яна з баявой дружынай праходзіла, там паны прападалі, людзі бедныя шчаслівымі станавіліся,— не ліліся слёзы горкія, а несліся песні звонкія; дзе балоты, пустыні былі, там сады зацвілі, радасць на тым месцы хадзіла.

Вось якою заступніцай за народ была Проська-змагарка.

### Было ды мінулася гора

Як я жыў пры цары, пазнаў гора і бяды, на свае семдзесят пяць год меў я многа ўсякіх прыгод. Жыў я пад панскім прыгонам, працаваў на полі да сёмага поту, а дзеці хлеба не елі ў ахвоту. Палкай пан мяне біў, жонку да вечара на полі трымаў, паратунку ад пана я не знаў. А як падатак збі-

ралі, нас палкамі збівалі. Мы ў бога збавення шукалі, але нешта яго не даждалі.

Над маёю хатай павісла гора — няма дзеткам хлеба скора; к пану не пойдзеш прасіцца, да яго не прыступіцца. Скінуў я шапку, стаў на калена, але ў пана палка, як палена, пан мяне з хаты выкідае, майго гора ён не знае. «Ты, кажа, як пад плотам пажывеш, тады плату прынясеш». Поп бедаку не спагадае, яму ўсё не хапае, уладыка сем раз дзерці з беднага лыка.

Але даволі нам стала прыгон цярпець, больш панам і папам на нашай шыі ўжо не сядзець. Адышло, мінулася гора, паноў з іх маёнткаў мы паскідалі, самі вольна жыць сталі. Стала вясёлай мая сям'я, дзеці ў школу ідуць, іх навукам там вучаць; падрастуць, іх да працы далучаць. У калгасе жыву я заможна, і, нягледзячы на старасць сваю, у калгасе я першы ўдарнік і ўжо не тужу...

### Жыццё без бога і святых

Як жылі мы раней?

Раней мы толькі і ведалі, што пакарацца кулаку і папу.

Яны нас вучылі: «Маліцеся і атрымаеце збаўленне ад усіх грахоў. Рай вам будзе на тым свеце».

За сваё жыццё ранейшае мы не мала гора перажылі і розных недахваткаў мелі: то хлеба няма, то дзеці босыя.

Верылі ў бога, білі ілбы ў царкве ў падлогу, але ўвесь век галадалі. На вузенькай палосцы кожны год быў неўраджай, хлеба свайго хапала ўсяго на тры-чатыры месяцы. Прыходзілася працаваць за кавалак хлеба ў пана і кулака.

Кожнае лета ў нашу вёску прыязджаў поп свянціць невялічкія палоскі «святой» вадой, служыў малебства. Сяляне аддавалі за гэта папу апошнія капейкі, а ўвосень знімалі той жа самы мізэрны ўраджай.

Прышла рэвалюцыя. Старое жыццё знікла. Рэвалюцыя змяніла свет, і жывем мы без бога і святых, самі гаспадары свайго жыцця. Як кінулі верыць папоўскім байкам, у калгасе нашым ураджай на дзіва, усе ўзяліся за працу — поле наша вокам не акінеш, ураджай багаты ў калгасных свірнах.

Жывем мы без папа, царквы, дзецям нашым не забіваюць галовы рэлігійным дурманам, школы для іх адкрыты...

### Варажбітка

Жыла-была ў адной вёсцы бабка старэнькая, варажбітка.

Вядома — вайна. Ні табе пісем, ні тэлеграм, а мужчыны з вёскі на вайну пайшлі, хочацца бабам пра іх што-небудзь даведацца. Вось і ходзяць яны да варажбіткі. Тое-сёе яна ім і ўгадвала. І разнеслася слава пра варажбітку, што яна можа нават угадаць, чым вайна скончыцца.

Прыехалі неяк у вёску два немцы курэй ды яйкі збіраць. Пачулі яны пра варажбітку і прыперліся да яе:

— Варажы, матка, чым вайна скончыцца.

Бабка спалохалася, адмаўляецца.

— Не ўмею я варажыць!



*В. і М. Басалыгі.* Саломка

Немцы за вінтоўкі:

— Варажы, інакш капут зробім!

Прыйшлося паслухацца. Папрасіла яна дастаць двух пеўняў — чырвонага і чорнага. Сама-то яна ведала, што такіх пеўняў толькі два ў сяле, якраз у суседзяў. І сілу іх ведала. Пабеглі немцы і ў хуткім часе прывалаклі пеўняў. Тады і кажа бабка:

— Цяпер прызначце самі, які будзе нямецкая армія, а які чырвоная. І мне нічога не кажыце.

А сама думае: «Чорт вам даў чырвонага сваім палічыць. Вы чырвонага, як чорт ладана, баіцеся. А чырвоны певень чорнага на маіх вачах разоў пяць за вясну дубасіў».

— Гут,— кажуць немцы,— прызначылі.

Пашаптала бабка над пеўнямі, што ў галаву ўзбрыло, абсыпала іх соллю для прыліку і пусціла біцца.

Счубіліся пеўні. Спачатку чорны пачаў перамагаць. Стаяць немцы, рагочуць; яны яму, відаць, несучы сюды, шнапсу ў дзюбку ўлілі. І так было насеў чорны, што збіў і паваліў чырвонага.

Ляжыць чырвоны, а чорны кругом ходзіць і на яго пазірае. Толькі чырвоны нядоўга ляжаў. Сабраўся ён з сіламі ды як усхопіцца, як насядзе на чорнага, ды так ёмка, што той хутка і лапкі ўгору задраў.

— Ну,— кажа хітрая бабка,— глядзіце самі. Я ж не ведаю, на каго вы ставілі. Толькі перамога будзе за чырвоным.

Немцы выйшлі ад бабкі вельмі раззлаваныя. А людзі, што былі пры гэтым, смяяліся: яны, як і бабка, разумелі, на каго немцы стаўку зрабілі.

### Пра мужыка Івана

У адным сяле жыў дзед Іван. Ён часта хадзіў у грыбы і ведаў у лесе ўсе дарогі і куткі. А любіў гэтыя куткі за тое, што нарадзіўся тут і пражыў увесь век.

Настала зіма. Былі вялікія мяцеліцы, снегу намяло так, што нельга было ні прайсці, ні праехаць.

Прыехалі ў вёску немцы, сабралі яны ўсіх людзей і пачалі пытаць, хто знае дарогу на Маскву. Адзін стары патрос барадой і кажа:

— Я пражыў тут увесь век, ведаю кожную дарожку. Хадземце, я вас правяду на Маскву.

Дзед узяў кій і пайшоў наперадзе, а немцы пайшлі за ім. Дзед вёў, вёў, а калі настаў вечар, немцы пытаюцца ў яго:

— Куды ты нас вядзеш, стары пёс?

Ён ім адказвае, што скора будзе відаць вёска. Вядзе стары немцаў. Настала ноч. Дзед кажа:

— Мусіць, мы збіліся з дарогі.

Немцы зноў сталі крычаць на яго:

— Куды ты нас, стары пёс, вядзеш?

— Паночкі, я вас вяду на Маскву.

— Хутчэй даводзь нас да вёскі, а то ад цябе застанецца толькі попел.

Дзед гаворыць ім:

— Скора мне восемдзесят год, як я хадзіў па гэтых ваколіцах.

А сам думае: «Убачыце вы Маскву, як я сваю патыліцу. Я завяду вас туды, адкуль воран касцей вашых не вынясе».

Потым немцы выбіліся з сіл, сталі крычаць:

— Стой, стары пёс! Ты не туды нас вядзеш!

І пачалі яго біць. Тады стары кажа:

— Вы думалі, што я здраднік, за ваша паганае золата прадаў свой народ, сваю зямлю?! Дык ведайце, што я пайшоў на смерць па сваёй добрай волі і зрабіў гэта дзеля таго, каб знішчыць вас і выратаваць сваю зямлю. Я павёў вас туды, куды і шэры воўк не забяжыць, куды каршун злы сваіх касцей не заносіў. Не бачыць вам Масквы!

Так загінуў дзед-герой за сваю зямлю, за свой народ.

## Камандзір Дзёмін

Гэта было ў Чашніцкім раёне. Выйшаў аднойчы на дарогу Дзёмін, камандзір партызанскага атрада, а там якраз рухаліся ўласаўцы.

Дзёмін быў адзін, а іх — 27 конных. Наган, праўда, у Дзёміна быў, але ён ім не паказваў, а сказаў проста, па-брацку:

— Хлопцы, калі ў вас будзе якое непаразуменне, вы ўсе будзеце перабіты. Ідзіце за мной.

Уласаўцы думалі, што папалі ў засаду, і паехалі за ім. Дзёмін вёў іх кіламетраў 4—5 да атрада, а яны думалі, што ўсё засада.

Тады малыя і старыя смяяліся, як гэта так — адзін дваццаць сем прывёў.

## Як Заслонаў немцаў-карнікаў сустрэў

Недалёка ад месца, дзе Заслонаў стаяў, было балота. Яно ўсё пазарастала хмызняком, толькі пасярэдзіне быў такі паўвостраў-палянка. Калі сказалі Заслонаву, што яго едуць лавіць немцы, ён адразу загадаў зрабіць засаду, а сам пераапрануўся, лапцікі надзеў, парык — ну проста дзядок старэнькі — і пайшоў насустрач немцам.

Пад'язджаюць да яго немцы, сталі пытаць:

— Куды, стары, ідзеш, адкуль ты?

А ён ім адказвае:

— Хадзіў во да сваёй дачкі ў вёску, яна там жыве. Дроў дапамог ёй насячы, а зараз вось дахаты іду.

Немцы яго зноў пытаюць:

— Ці былі там партызаны?

— Былі і паехалі ў лес толькі што.

— Паказвай хутчэй, дзе яны хаваюцца.

— Яны ж мяне ледзь не забілі, а дачку дык разарылі,— кажа Заслонаў і павёў іх у лес.

Навокал ціха, спакойна. Бачыць Заслонаў, што ўжо ўсе фашысты заехалі на гэты востраў, тады ён адскочыў у кусты, застрэліў афіцэра з нагана і камандуе:

— Па фашыстах — агонь!

Кінуліся немцы, хто куды, але ніводнага з іх партызаны не выпусцілі: каго перабілі, каго жыўцом узялі, а хто ў балоце загінуў.

А Заслонаў тады і кажа байцам сваім:

— Кожнаму ў нашым жыцці трэба ваяваць і зброяй, і розумам.

### Як Заслонаў у разведку хадзіў

Апрануўся Заслонаў у форму нямецкага генерала і паехаў у Сянно глядзець нямецкія ўмацаванні. Заходзіць ён да ваеннага каменданта горада:

— Я начальнік вобласці. Прапаную паказаць умацаванні, размяшчэнне немцаў, паліцаяў.

Ну, вядома, ваенны камендант выцягнуўся ў струнку, рад старацца выканаць загад вышэйшага начальства. Павёў, паказвае дзоты, умацаванні, інтэрнаты нямецкіх салдат і паліцаяў, а Заслонаў ходзіць з ім і ўсё гэта бярэ на заметку. А ад'ютант яго ў кабінеце каменданта паклаў запіску: «Заслонаў знайшоў вашы ўмацаванні слабымі. Дзякуй вам за азнаямленне ад дзядзі Косці, хутка прыйдзем да вас у госці».

Заслонаў агледзеў усё і паехаў да сваіх партызан. А ноччу прыйшоў са сваімі партызанамі і разграміў увесь гарнізон.

### Цвярозыя разважанні

Ноч. Ля кастра два фрыцы. Кураць, гутараць.

— Фрыц, мы былі ў Варшаве, пабывалі ў Парыжы, ці давядзецца нам пабываць у Берліне?

### Вылечылі

— Ад сэрца вітаю вас, Марта, з дарагім госцем, а вас, Ганс, з прыездам на радзіму. Але, майн гот! Які ў вас змардаваны выгляд! Адкуль вы такі прывалакліся?

— З рускага курорта, сусед.

### Курортнікі

— Чаму вашы салдаты маюць такі дрэнны выгляд, палкоўнік Драпке?

— Яны толькі што прыбылі з савецкага курорта.

### Добра, ды не зусім

— Дзень добры, Фрыц! Адкуль?

— Дзень добры, дзядзька Бекер! З Расіі вярнуўся. Нагу там страціў.

— Гэта дрэнна.

— Дрэнна, ды не зусім! Мой друг Вілі галаву страціў, а я жывы.

— Гэта добра!

— Добра, ды не зусім: прыехаў у Эсен, дома няма,— англійская бомба разбурыла.

— Вось гэта дрэнна.

— Дрэнна, ды не зусім: жыву я цяпер на свежым паветры — сонца, прырода, апетыт.

— І сапраўды, як добра!

— Добра, ды не зусім: апетыт ёсць, а есці няма чаго. З нашага эрзацхлеба хутка і апошнюю нагу працягнеш, на той свет адправішся.

— Гэта зусім дрэнна.

— Дрэнна, ды не зусім: там я са сваімі сябрамі сустрэнуся. Вып'ем, што бог дасць.

— Гэта добра. Не забудзься выпіць за здароўе фюрэра.

### Дакладны адказ

— Як ты думаеш, Ганс, ці доўга чырвоныя будуць наступаць?

— Мне здаецца, што да тых пор, пакуль кожны з нас, немцаў, не будзе ўзнагароджаны драўляным крыжам.

### Да зімы мы не дажывём

— Ганс, чырвоныя б'юць летам і восенню, а што ж будзе зімой? Божа ж мой!

— Не палохайся, Курт, і не турбуйся, да зімы мы не дажывём.

### Красамоўнае маўчанне

— Пан оберст, што кажуць франтавікі аб савецкай артылерыі?

— Тыя, якія зведалі яе агонь, пан генерал, нічога не кажуць — яны на тым свеце.

### У фашысцкім шпіталі

У р а ч. Скажы, Фрыц, што чуваць на фронце пра нашу перамогу?

Ф р ы ц. Ад грому рускай артылерыі і ад разрываў снарадаў, пан доктар, нічога не чуваць.

### Храбры ваяка

— Пан обер-лейтэнант, вам прыходзілася калі-небудзь прымушаць чырвонаармейцаў бегчы?

— О, вядома! Учора, напрыклад, яны беглі за намі 20 кіламетраў.

### Салдацкая размова

— Ведаеш, Эрых, па-мойму, рускія дрэнна разбіраюцца ў мясцовасці.
— Чаму ты так думаеш?
— Ды вось учора ноччу прыйшлі сюды два чырвонаармейцы, а каб не заблудзіць, чатырох нашых з сабой павялі.

### Дрэнны клімат

— Які паганы клімат у гэтай Беларусі! Толькі ўчора прыехаў, а ўжо страляе і коле.
— У якім месцы?
— З усіх бакоў!

### Навагоднія падарункі

— Сцяпан, куды немцы паехалі?
— Разбіраць партызанскія навагоднія падарункі. Цэлых два эшалоны ляжаць пад адхонам.

### Бабуля і ўнучак

— Унучак, дзе ты быў, як гарэў нямецкі склад? Трэба было сысці з воч немцаў, каб дарэмна не прычапіліся, праклятыя.
— Не, бабулька, я тады зусім не быў у іх на вачах, я ў той час другі склад падпальваў.

### У разведцы

— Бабулька, ці шмат немцаў засталося ў вашай вёсцы?
— Многа, родненькія. Цэлы магільнік.

### У нямецкім шпіталі

— Гер оберст, за адвагу ў баі з партызанамі фюрэр узнагародзіў вас жалезным крыжам. Віншую! Цісну руку!
— Дзякуй вам, пан генерал. На жаль, магу падаць вам толькі нагу: рукі мне ў Беларусі партызаны адцяпалі.

### Пекла і рай

— Я накіраваў у Мінск эшалон з карным атрадам для задушэння партызан, але тут па-ранейшаму для нас не жыццё, а сапраўднае пекла,— скардзіўся нямецкі генерал каменданту горада.

— Выбачайце, пан генерал, асмелюся давесці да вашага ведама, што партызаны, відавочна, улічылі гэтыя абставіны і адправілі эшалон з карным атрадам проста ў рай,— пахмура адказаў фашысцкі камендант.

### Законнае пытанне

— Обер-лейтэнант абяцаў, што пасля гэтай контратакі мы, салдаты, будзем есці сала, біфштэксы і шакалад.
— Адкуль обер ведае, чым кормяць на тым свеце?

### У нямецкай школе

— Карл, якое ты ведаеш найбольш распаўсюджанае дрэва ў Расіі.
— Бяроза, гер настаўнік.
— Добра. А што з бярозы робяць?
— Крыжы для нашых салдат, гер настаўнік.

### Дакладны адрас

У эшалоне, які ехаў на фронт, адзін немец запытаў другога:
— Ганс, куда мы едзем?
— А хіба не ведаеш? Ды куды паехалі мільёны немцаў. У магілу!

### Ці вернемся мы ў Данбас?

— Фрыц, як ты думаеш, ці вернемся мы ў Данбас?
— Дурань, падумай лепш, ці вернемся ў Германію.

### Канец ясны

— Фрыц! У цябе яшчэ захаваўся партсігар?
— Захаваўся. А што?
— Аддай яго мне. Ты ўсё роўна ў атаку ідзеш.

### Небяспечная хвароба

— На што вы скардзіцеся, хворы?
— Доктар, цяжка! У мяне зуб на зуб не трапляе. У мяне сутаргі.
— Калі ў вас наступаюць гэтыя сутаргі?
— Калі наступаюць рускія.

### Па загадзя распрацаванаму плану

Пасля няўдалай карнай экспедыцыі афіцэр прабірае салдата:

— Як магло здарыцца, што вы, Ганс Мюлер, узнагароджаны «Жалезным крыжам», першы ўцякалі ад партызан?

— Я не ўцякаў, пане капітан. Я проста выраўніваў лінію фронта і планамерна пакідаў занятыя пазіцыі па загадзя распрацаванаму плану.

### Сур'ёзнае разыходжанне

Беларускі партызан:

— У мяне з фашыстамі сур'ёзнае разыходжанне па зямельнаму пытанню.

— Якое ж?

— Яны хочуць быць на нашай зямлі, а я хачу, каб яны былі ў нашай зямлі.

### Гутарка сяброў

— Як бы я хацеў зараз пабачыць нашага Вілі...

— Ды ён жа ў палоне ў рускіх!

— Вось там бы я і хацеў яго ўбачыць.

### Асвоіў

— Што гэта няма вестак ад Аскара? Ён, напэўна, пачаў ужо асвойваць зямлю, якую даў яму ў Беларусі фюрэр?

— Вестак і не будзе.

— Чаму?

— Ён ужо асвоіў...

— Усю, і так скора?

— Усю — не ўсю, аршыны тры... Там, дзе ёсць партызаны, шмат часу для гэтага не патрэбна.

### Зазнаўся

— Як табе падабаецца? Ганс прыехаў з фронту, нават рукі не падае.

— Зазнаўся, мусіць?

— Ды не! Руку ён пакінуў пад Віцебскам.

### Сабаку з'еў

У лагеры ваеннапалонных сустрэліся два немцы — Ганс, узяты ў палон пад Сталінградам, і Фрыц, узяты пад Корсунем. Ганс пачаў расказваць Фрыцу пра жахі сталінградскага акружэння:

— Ведаеш, да таго дайшло, што мы ледзь не падохлі з голаду.
— Ды што ты мне расказваеш, як маломý, пра акружэнне! — перабіў яго Фрыц.— Я сам на гэтай справе сабаку з'еў.



Народны хор

— Цэлага сабаку! — крыкнуў з зайздрасцю Ганс.— Ну, дык я табе скажу, што ты быў не ў акружэнні, а ў цешчы ў гасцях. Мы дык скуры конскія і нават халявы са сваіх ботаў паелі.

### Пяты вінаваты

— І што гэта такое? — звярнуўся адзін фрыц да другога.— Ад Ленінграда аж да Пскова дабеглі, а рускія ўсё смаляць па пятах. І як мы ні маскіруемся пры адступленні, усюды яны нас убачаць.
— А ведаеш чаму?
— Ну?
— Мы так драпаем, што аж пяты блішчаць: яны нас і дэмаскіруюць.

### Адпачынак

— Ганс, пішы апошняе пісьмо родным і завяшчанне!
— А што, мы заўтра ў бой ідзём?

— Не, нас адводзяць на кароткі адпачынак у бліжэйшы тыл.
— Дык пры чым тут пісьмо і завяшчанне?
— Пры тым, што там партызаны прадоўжаць наш адпачынак на векі вечныя.

### У нямецкім бліндажы

Палкоўнік фон Гоп-Скок заўважыў, што обер-лейтэнант спіць у ботах.
— Чаму вы спіце ў ботах, пан афіцэр? Гэта ж... не гігіенічна!
— Затое практычна, пан палкоўнік. Я больш спадзяюся на свае ногі, чым на свой батальён.

### Верная дарога

Нямецкі памешчык, пад'язджаючы прасёлачнай дарогай да густога лесу, сустрэў беларускага селяніна і пытае:
— Куды вядзе гэта дарога?
— У магілу,— адказаў селянін, дастаючы гранату.

### У яго зноў баявыя поспехі

Два фрыцы гутараць у зямлянцы.
— Шанцуе Курту. У яго зноў баявыя поспехі. Яшчэ адна такая ўдалая бамбардзіроўка, і ён будзе прадстаўлены да ўзнагароды.
— Няўжо яму ўдалося знайсці і разбамбіць партызанскі лагер?
— Не. Яго звяно забіла і параніла адну карову, астатнія разбегліся.

### Дарэмныя захады

— Ці не пойдзем мы ў вёску, ды ці не сцягнем авечку? — сказаў адзін воўк другому.
— Дарэмныя захады,— адказаў другі.— Там да нас ужо немцы пабывалі.

### У Берліне

— Як жывеце?
— Нічога сабе.
— Як разумець гэта «нічога сабе»?
— Вельмі проста: усё забралі гестапаўцы.

### Цёплае і халоднае

— Я вас не пазнаю, пане Мюлер,— сказаў адзін берлінец другому.— Вы раней так цёпла адклікаліся на ўсе мерапрыемствы фюрэра.

— Дарагі мой! — адказаў Мюлер.— Хіба вы забыліся, колькі разоў праводзілася ўжо кампанія зімовай дапамогі? Усё цёплае забралі ў нас эсэсаўцы.

### У раённай управе

У раённую ўправу прыехаў гітлераўскі начальнік. У памяшканні ўправы нікога не было, толькі прыбіральшчыца мыла падлогу.

Гітлеравец заўважыў пыл і павуцінне на партрэтах фашысцкіх главароў.

— Гэта што такое? — зароў фашыст, паказваючы на партрэт Гітлера.

Прыбіральшчыца адказала:

— Я нанялася толькі выскрабсці падлогу, а ўбіраць бруд са сцен не мая справа.

### У судзе

— Фрыц Бегнер, вы абвінавачваецеся ў тым, што ў час контратакі ўцякалі ад рускіх на захад.

— Божа мой, гер суддзя! Я не ўцякаў, а даганяў свайго пана ефрэйтара.

— А ён чаго бег?

— Ён даганяў фельдфебеля.

— А фельдфебель?

— Пан фельдфебель даганяў обер-лейтэнанта.

— А лейтэнант чаго бег?

— Даганяў пана палкоўніка.

— А пан палкоўнік?

— Пан палкоўнік даганяў пана генерала, які бег да фюрэра, каб далажыць аб нашай перамозе.

— Хайль! — гаркнулі суддзі, і суд быў спынены.

### Смех і слёзы

— Як людзі адносяцца ад тваёй работы? — пытаецца пры сустрэчы кравец у свайго таварыша.

— Смяюцца,— адказвае той.

— Гэта яшчэ нічога, што смяюцца. Вось я як пашыю, дык плачуць.

### Я не з тых

— Колькі табе год, Мальвіна?
— Дзевятнаццаць.
— Дык год назад ты тое ж самае гаварыла.
— Я не з тых, што сёння гавораць адно, а заўтра другое.

### Арыфметыка

— Ці багата, бабка, ваша кароўка малака дае?
— Дзесяць літраў.
— А колькі прадаваць носіце?
— Пятнаццаць.

### Размова суседак

— Алена, глядзі, якая ў мяне сукенка! Ці падабаецца?
— А дзе ж ты яе купіла?
— Пашыла.
— Дзіва што! Твая швачка шые так, што і на азяродзе ляжыць добра.

### Выкруціўся

Аднойчы ў царкве за споведзь старая бабулька дала папу бутэльку самагонкі. Поп схаваў бутэльку ў кішэню і пачаў маліцца, адбіваць паклоны.

Неяк бутэлька вываліласа ў папа з кішэні і пакацілася па падлозе. Усе, хто быў у царкве, убачылі гэта. Папу стала няёмка, але ён не разгубіўся. У царкве вісеў вялікі абраз «Тайная вячэра». Ён павярнуўся тварам да абраза і сказаў на ўсю царкву:

— Святыя! Вы там калі п'яце, дык піце, але бутэлек сюды не кідайце!

## ПЕСНІ

### У Маскве сяе ночы Ленін будзе

Над Масквою-горадам
Воран крача,
А ў Маскву дарогаю
Коннік скача.

Бяду воран кліча
Людзям багатым,

Бяду воран кліча
Людзям праклятым.

Над Масквою хмары,—
Не відна свету,
Там ваююць людзі
За Саветы.

Над Масквою-горадам
Воран крача,
А ў Маскву дарогаю
Коннік скача.

У Маскве на вуліцах
Кроў ліецца,
Ў маладога конніка
Сэрца б'ецца.

Ён вязе вялікія
Весці людзям,
Што ў Маскве сяе ночы
Ленін будзе.

### Сямён Будзённы

Ой, за лесам, лесам цёмным
З сваімі байцамі
Выязджаў Сямён Будзённы
З коннымі палкамі.

Коні мчацца, не стрымаеш,
Міма курных сёлаў.
Знаюць байцы, знаюць коні
Каманду Сямёна.

— Гэй, люд бедны, люд убогі,
Стань у шэраг з намі!
Ды наперад, ды ў дарогу
Пад чырвона знамя.

Сабраліся бедны людзі,
Народ абыдзённы:
— Прынімай нас, бацька родны,
Прынімай, Будзённы.

Ў нашых сэрцах гнеў ўскіпае
На паноў, падпанкаў,
Бо яны кроў нашу пілі,
Пілі без устанку.

Пойдзем, пойдзем мы, адпомсцім
За усе іх здзекі,
Ім цяпер мы ўсё прыпомнім
Зруйнуем навекі...

Паглядзеў Сямён Будзённы
Позіркам лагодным,
Гэтак цёпла і ласкава,
Быццам бацька родны.

— Я прашу вас, добры людзі,
Сядайце на коні!
Мы з Савецкае краіны
Ворага прагонім.

Ой, за лесам, лесам цёмным
З сваімі байцамі
Выязджаў Сямён Будзённы
Стройнымі радамі.

А насустрач ім здалёку
Ворагі імчацца,
У пагоны плечы ўбраны,
А крыжамі грудзі.

— А ну, хлопцы, а ну, храбры,
Вынімайце шашкі.
Мы пакажам, як мы любім
Бацькаўшчыну нашу...

Як вынялі байцы шашкі
Ды з сталёвых ножан,
Як махнулі, як шахнулі,
Засвісцелі шашкі.

Наперадзе сам Будзённы
Б'ецца смела, храбра,
Прыпадае конь да долу
Ды варонай масці.

Піка ў піку, шашка ў шашку,
Каманда ў каманду,
Знаюць байцы, знаюць коні
Каманду Сямёна.

Да золаку да самага
Ў полі, чыстым краі,
Змагаліся будзёнаўцы
Ды з варожай зграяй.

А як сонца паднялося
На лясы, на сёлы,—
Дрогнуў вораг, здаўся вораг
У палон Сямёну.

Многа крыві пралілося
На шырокім полі.
Многа байцоў асталося
На сёдлах на конях.

Люты вораг не забудзе
Нашых вострых шашак.
Знае вораг, як мы ўмеем
Адважна змагацца.

Няхай толькі сустрэнецца,—
Пад пікамі зляжа,
Пад шашкамі, пад кулямі,
Пад нагамі ў коней.

### Свецел месячка

Ўзышоў свецел месячка —
Ясная зара,
Асвяціў дарожаньку
Цёмнага сяла.
Была ты, дарожанька,
Непрыглядная,
Стала ж ты, дарожанька,
Ненаглядная!
Парой-непагодаю
Тугой ты гула —
Гаротную долечку
Навек пракляла!

Прайшоў той дарожанькай
Волат-чалавек,
Пракляцце з дарожанькі
Зняў рукой навек.
Шырокую дарожаньку
Ленін пратаптаў,
Пракладку дарожанькі
Сонцам азарыў.
Цяпер нам дарожанька
Большая дана:
Працаваць машынаю,
Вадзіць трактара!

## На кургане

— Гонкая сасонка
У полі на кургане,
Раскажы праўдзіва,
Шчыра, ад душы,

Пра каго ты песні
Шумныя спяваеш,—
З кім гамоніш позна
У начной цішы?

— Гаманю заўсёды
Я з байцом свабоды,
Пада мной ляжыць ён
У зямлі сырой.

Ён заснуў навекі
За правы народа,
Жыццём за свабоду
Заплаціў сваім.

Я яму спяваю
Аб жыцці вясёлым,
Што квітнее сонцам,
Дыхае вясной.

Што з Крэмля ліецца
У гарады і сёлы,
Неабсяжнай моцнай
Радзімы маёй.

Пра людскую радасць
Песні я спяваю,
Пра квяцісты, вольны
Край наш залаты.

## А ў полі, полі, пры зялёным гаі...

А ў полі, полі, пры зялёным гаі,
Дзе цячэ крыніца, салавей спявае,
А я з той крыніцы ды ваду насіла,
І на чужым полі жала і касіла.

Не сабе касіла, не сабе я жала,
На полі-прakляццi цяжка працавала.
З поля позна прыдзеш, дзеткі дома плачуць,
Кажуць: «Дай нам есці, дай нам есці, маці».

Пагляджу на дзетак, а ім есці трэба,
Пабягу ў цэркву прасіць у папа хлеба,
А той дасць паўпуда, кажа — адпрацуеш;
Гнешся зноў на полі, і так век гаруеш.

І вось так я жыла, жыла, бедавала,
Серп з рук не кідала, а век галадала,
З года ў год гібела, сохла, гаравала,
Пакуль сонца волі, праўды не заззяла.

**А ў полі, полі мы спяваем...**

А ў полі, полі мы спяваем,
Залатыя снапочкі вяжам.
На нас сонца з-за хмар пазірае,
Наша поле святлом залівае.



На жалейцы

Поле, поле красой апавіта,
А мы радасна жнём, працавіта,
І не хочацца стаць ані разу,—
Не заморышся, весела разам.

За ракою машыны грукочуць,
Трактарысты жартуюць, рагочуць
І дзяўчатам спяваюць частушкі,
Аж зайздросцяць ім рыбы і птушкі.

Аж гамоняць гаі і прысады,
Ажно валяцца яблыкі ў садах;
Як пяём мы аб радаснай працы,
Ажно чуюць паны у палацах.

Аж пачэсваюць тлустыя каркі —
Больш не выпіць ужо ім ні чаркі
За цяжкую за нашу работу,
За пабоі, за нашу згрызоту...

Сонца нізка над лесам ўжо ходзіць,
Нам не хочацца з поля сыходзіць,
Брыгадзіра к сабе заклікаем,
Ён зацягне, а мы падтрымаем;

— Гэй ты, песня, кацісся за мора,
Ускалыхні ўсю зямлю, ўсе прасторы,
Абыйдзі ўсе даліны і горы,
Запалі ты у свеце ўсе зоры.

Мы бадзёрыя людзі і моцны,
Мы адважныя, нас — міліёны;
Мы стаханаўцы,— загартаваны
На зямлі, нам навечна адданай.

У двор прыдзем, спачнем, пагуляем,
Патанцуем, газет пачытаем,
А назаўтра з вясёлым настроем
Зноў на працу мы ўсе выйдзем строем.

### Я старэнькая...

Я старэнькая, дзетачкі мае,
І жыла я семдзесят зім і лет,
Ой, вялікі, дзетачкі, белы свет,
Я ж думала, у свеце праўды нет.

Як была я, дзетачкі, малада,
Мае грудзі ціснула нішчата,
Мае вочы слёзамі заплылі,
Людзі сэрца выелі, як звяры.

Не ідзі, не ідзі ў маю хату смерць,
У маёй хаце некуда цябе дзець.

Ой, ты села б у клець, там у закрамах,
Ды там жыта буйнае і мука.

А ты б села ў хату маю, у куце,
Ды цябе мой венічак змяце.
А ты б села ў поплаве ў сенакос,
Ды цябе б мы стапталі ў сенакос.

А ты б села ў палі ў баразну,
Ды цябе там трактары разнясуць.
Убірайся, лютая, са двара,
Мне, старой, не хочацца паміраць,
Са сваімі дзеткамі хачу быць,
Са сваімі роднымі хачу жыць.

### Пайду, пайду, Ясю мілы...

Пайду, пайду, Ясю мілы,
Пайду замуж за цябе,
Бо на свеце прыгажэе
Няма хлопца ну нідзе!

Буду я цябе любіць,
Буду дужа шанаваць,
Радасць папалам дзяліць,
Гора з хаты выганяць.

На калгасным нашым полі
Разам будзем працаваць:
Араць, сеяць, жаць, касіці,
Песні радасці спяваць.

Ураджай збяром бязлікі,
Часць дзяржаве аддамо,
Наш народ, народ вялікі,
Дзякуй скажа нам сваё.

Пайду, пайду, Ясю мілы,
Пайду замуж за цябе,
Бо на свеце прыгажэе
Няма хлопца ну нідзе.

Буду я цябе любіць,
Буду дужа шанаваць,
Радасць папалам дзяліць,
Сваё шчасце будаваць!

### Вішанька

Чаму, вішанька, ты хілая была,
Што, чарэшанька, у гору не расла, эх!
А сёлета буйным цветам зацвіла?

Як мне, вішаньцы, цвятамі не цвісці,
Як чарэшаньцы ў гору не расці, эх!
Мне садоўнік палівае карані.

Чаму, дзевіца, не весела была,
Чаму, красная, на гульні не ішла, эх!
А сёлета ўсю брыгаду весяліш?

Як жа мне не быць вясёлай, маладой,
У калгасе я не знаюся з бядой, эх!
Зарабілі мы багата працадзён.

Мы купілі плацці новенькія
Ды баціначкі шаўровенькія, эх!
Ёсць ў чым выйсці пагуляць, паплясаць!

### За гарою ля крыніцы...

За гарою ля крыніцы,
Дзе халодная вада,
За жняяркай там вязала
Снапы дзеўка малада.

Ой, вязала ды спявала,
Што на свеце добра жыць,
Толькі трэ па-гаспадарску,
Па-сумленнаму рабіць.

Буйну радасць прывіталі
Аўсы, жыта на палёх.
К нам заможнасць уступіла
На калгасніцкі парог.

### Да ўжо вечар вечарэе...

Да ўжо вечар вечарэе,
Наш брыгадзір весялее.
Па палетку пахаджае,
Сваіх жнейкаў напрашае:
— Жніце, жніце, мае жнейкі,
Самі сябе не пазніце,
Каня майго не таміце,
Мой конь вараненькі,
Я ваш брыгадзір маладзенькі.

### Як сабраў брыгадзір жнеек...

Як сабраў брыгадзір жнеек —
Усё маладзенькіх дзевак.
А жнуць жнейкі, пажынаюць,
Яны жыта дажынаюць.
Яны жыта дажынаюць —

Партыі дзякуй пасылаюць.
За шырокую ніву,
За вялікае поле,
Партыі дзякуй пасылаюць.
— Наша жыта ўрадліва:
Каласом каласіста
І зярном ядраніста.
Яны жыта дажынаюць
І вянок завіваюць,—
Не для пана багатага —
Для калгаса вялікага.

### А над ракою...

А над ракою сарокі сакочуць,
А за ракою трактар стракочыць;
Трактар стракочыць, ды галасісты,
А ў нашым калгасе лён валакністы,
Лён галавісты, авёс вяцісты,
А наш старшыня ды ганарысты.
Ён гонар маець — ўраджай шчытаець,
Куды пахінецца — аж засмяецца,
Усюды вяліка, усюды багата,—
Расце ў калгасе і клуб і хата.

### Лён

Эх ты, лён наш, лён кудравы,
Лён кудравы, даўгунец.
Ты расці, расці на славу,
Сінявокі маладзец!

Для цябе у нас машыны,
Не старэнькі ўжо станок.
Калісь бабкі пры лучыне
Пралі цёмны худ-лянок.

Мы цябе і мнём і трэплем,
Каб дзяржаве добрым здаць,
І ў рэспубліцы Саветаў
Першынство заваяваць.

Мы цябе так апрацуем,—
Любата будзе глядзець.
Ты расці, расці на славу,
Сінявокі маладзец!

### Ці багат ты, зяцюхна?..

*(Калгасная вясельная)*

— Ці багат ты, зяцюхна,
Ці багат,
Колькі маеш коні
Й жарабят?

— Ой, багат я, цёшча,
Ой, багат,
Многа маю коні
Й жарабят.




Вокладка партызанскага часопіса

— Колькі маеш, зяцюхна,
Мер аўса,
Ці твая шырокая
Паласа?

— Многа маю, цёшча,
Мер аўса,
Мая на ўсё поле
Паласа.

І збажына ў гумнах,
І ў палях,—
Ўсё гэта калгаснае,
Ўсё маё.

### Не выходзь з-за лесу, сонца...

Не выходзь з-за лесу, сонца,
Не сушы расу.
Натачылі мы бясконца
Вострую касу.
Эй, рэж, каса, рэж, рэж!
Мы не ведаем меж, меж!
Эй вы, росы мае, росы,
Чыстая вада,
Роўна сцелюцца пракосы —
Косіць грамада.
Эй, рэж, каса, рэж, рэж!
Мы не ведаем меж, меж!
Смела песню запяём мы
Пад касы узмах.
Добра, весела жывём мы
Дома, на палях.
Эй, рэж, каса, рэж, рэж!
Мы не ведаем меж, меж!

### Спявала дзяўчына...

Спявала дзяўчына
У садзе зялёным,
А вусны гарэлі
Макам чырвоным.

Ой, сокал мой, сокал,
Як сонейка, ясны,
Стаіш на граніцы
Рабоча-калгаснай.

Будзь горды, мой сокал,
І ў сцюжу, і ў вецер
На варце краіны,
Найлепшай у свеце.

Спявала дзяўчына
У садзе зялёным,
Што мілы на варце
Граніцы чырвонай.

### Ой, у лузе, у лузе...

Ой, у лузе, у лузе
Растуць два дубочкі,
Прыехалі к маці
Два родных сыночкі.

Рада была маці,
Седзячы ў святліцы,
Старэйшы сын кажа:
— Стаю на граніцы,

Стаю на граніцы
З вінтоўкай ў руках я,
За адвагу ордэн
Нашу на грудзях я.

Другі сын, малодшы,
Што быў брыгадзірам,
Ён у Арміі Чырвонай
Цяпер камандзірам.

Сыноў маці частуе
Пірагом смачненькім,
Чаркі налівае
Віном саладзенькім.

## Сястра брату каня асядлала...

Сястра брату каня асядлала,
Выпраўляла народу служыць:
— Сваю родную, братка, краіну
Ты умей ад паноў бараніць.

Годзе ім на зямлі нашай роднай
Пот і кроў нашу піць і смактаць
І на шыі рабоча-сялянскай
Дзень і ноччу дапозна гуляць.

А аб працы, браток, будзь спакойны,
За цябе я змагу працаваць,
Сваёй працай жаночай, упартай
У баях вам змагу памагаць.

## Люлі-люлі, мой маленькі...

*(Калыханка)*

Маці сына палажыла,
Стала песеньку спяваць:
— Люлі-люлі, мой маленькі,
Закрый вочкі, пара спаць.

Вырасцеш, сынок, вялікі,
Пойдзеш ў Армію служыць,
Сам таварыш Варашылаў
Будзе там цябе вучыць.

Злосны вораг за мяжою
Хоча зноў вайну адкрыць,
І ты будзеш, мой сыночак,
Гэтых гадаў трапна біць.

Маці села над калыскай,
Стала сына калыхаць:
— Надышла ужо і ночка,
Люлі-люлі, пара спаць...

### Падзяка

Вясёлы лажуся, вясёлы ўстаю,
Ўжо сонейка свеціць у нашым краю.

Прыпеў:

Мы Партыі дзякуй сардэчнае шлём
За тое, што сёння свабодна жывём! *

Бо Верасень месяц, семнаццаты дзень,
Ён зняў з нас навекі і смутак і цень.

Славамі не ў сілах я то апісаць,
Як нам цяпер міла «таварыш» сказаць!

### Вее ў лесе вецер...

Вее ў лесе вецер,
Гойдае галіны,
Кліча ўсіх нас партыя
Бараніць краіну:

— Ненавісны вораг,
Гітлер — гад паганы,
Перашкодзіў жыць нам мірна,
Хоча быць тут панам.

Уставайце, братцы,
Уставайце, людзі,
Няма літасці паганцу,
Люты бой тут будзе!..

Загулі балоты,
Застагнала поле,—
Выйшлі людзі ўсе са зброяй
Бараніці долю.

Ворага-фашыста,
Паганага фрыца —
Проста ў логава бандыта,
Да яго сталіцы!

І ідуць героі
Сэрца гаду выняць,
Ўзняць сцяг перамогі
У самім Берліне.

### Праважала сына маці...

Праважала сына маці
У бой вялікі, важны,
Праважала і казала:
— Будзь, сынок, адважным! **

Немцы лютыя напалі
На радную землю,
Залатых калоссяў хвалі
Памялі і сцерлі.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага слупка.
** Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца два разы.

Падпалілі нашы вёскі,
Гарады разбілі,
Над народам нашым вольным
Здзекі учынілі.

А за гэта гадам лютым
Заплаціць патрэбна,
Каб ніколі больш пакуты
Наш народ не ведаў.

За Савецкую Радзіму
З яе громкай славай
Байцы Арміі Чырвонай
Сталі дружнай лавай.

У радах адважных, мужных
Будзь і ты, мой родны!
Ў бой за родную краіну
За спакой народны!

**На кані вараным...**

На кані вараным
Выязджаў партызан. Эй!
Шабля вострая з ім
Шчэ й гранаты, наган.*

Ён каня задзяржаў,
Пацягнуўся рукой. Эй!
Конь бадзёры іржаў,
Біў зямлю ён нагой.

Дзве рукі, як замок,
Крэпка зжаліся на міг. Эй!
— Да спаткання, сынок!—
Яму кажа стары.

Сын крануў павады,
Сам фуражкай ўзмахнуў. Эй!
І паехаў туды,
Адкуль чуцен быў гул.

Конь памчаўся стралой,
Толькі вецер свісцеў. Эй!
Гэта красны баец
К партызанам ляцеў.

**Цячэ рэчка ля паляны...**

Цячэ рэчка ля паляны,
Беражкі крутыя,
Там сышліся партызаны,
Хлопцы удалыя.

Толькі камандзір атрада
Штосьці невясёлы,
Бо за лесам фрыцы-гады
Паляць нашы сёлы.

Яны паляць і кідаюць
Наш народ у пекла,
Кроў ружовая густая
Па зямлі пацекла.

— Партызаны, партызанкі,—
Камандзір гаворыць,—
Нашых дзетак давяць танкі,
Вунь шалее вораг.

Пойдзем, хлопцы, пойдзем, братцы,
Край агнём палае.
За цябе ідзём змагацца,
Беларусь лясная.

Дык давайце будзем біцца,
Каб фашыстаў сцерці,
Чым палонным быць пад фрыцам,
Лепш ў баі памерці.

Адказалі партызаны
Бацьку-камандзіру:
— Знішчым ворагаў паганых,
Хопіць куль і жвіру.

* Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца двойчы.

І пайшлі у бой лавінай
На фашыстаў-катаў,
Стала вольнай зноў краіна,
Ззяе сцяг крылаты.

Залячылі людзі раны,
Расцвітай, Расія!
Вам спасіба, партызаны,
Хлопцы удалыя.

**Па полі, пакрытым туманам...**

Па полі, пакрытым туманам,
Туды, дзе дыміўся цягнік,
Ішлі змагары-партызаны,
Іх вёў камандзір-падрыўнік.

Праходзілі смела, бадзёра,
Намер іх няможна спыніць!
За крыўду народа, за гора
Фашыстам ішлі адамсціць.

Жаданнем іх сэрцы гарэлі
Пусціць эшалон пад адкос.
Ім вецер дуў ў полы шынеляў,
Мароз красіў шчокі і нос.

І шмат узляцела ў паветра
Ад рук іх варожых машын.
Ім сведкай становяцца ветры
Ды шум стогадовых хваін...

**У бары кукавала зязюля...**

У бары кукавала зязюля,
Яе песню я слухаў не раз,
Гэта ты, дарагая матуля,
Залівалася плачам па нас...

І не страшны нам вораг
праклятый,
Б'ём яго мы удзень і ўначы,
Скора, скора падмажа ён пяты,
Ды не ўдасца, бадай, уцячы...

Не сумуй, дарагая матуля,
Што сыноў тваіх дома няма,
Нас мінула варожая куля,
І не страшна нам злая зіма.

Калі ж заўтра варожая куля
Прынясе мне смяротны канец,
Не сумуй, дарагая матуля,
Што за край наш загіне баец.

**Каб жыць на свабодзе па-людску...**

Каб жыць на свабодзе па-людску,
Каб гора ніколі не мець,
Нясуць партызаны са Слуцку
Праклятаму ворагу смерць.

Выходзяць на бітву аршанцы,
Суровы ідзе Магілёў,
Каб помсціць фашысцкім паганцам,
За гвалты, за здзек і за кроў.

Штыхамі шчаціціцца Мозыр,
У гневе гудзе Белавеж,

24 Зак. 3328

І помста бязлітасна, грозна
Паўстала з сялянскіх застрэш.

Бушуе народным паўстаннем
І Гомель, і Віцебск, і Пінск,
І ворагу помсціць за раны
Наш родны разбураны Мінск.

І людзі выпростваюць плечы,
Скідаюць нявольніцтва груз,
Чырвонае войска наўстрэчу
Ідзе да цябе, Беларусь.

### У лесе, на імшыстай палянцы...

У лесе, на імшыстай палянцы,
Пад восеньскі шум баравы
Сышліся мы ў цёмнай зямлянцы,
Каб голас паслухаць Масквы.

Зямлю грэе сонца ўжо скупа,
І з дрэваў асыпаўся ліст,
Праверыў па музыцы рупар
Нязменна вясёлы радыст.

Вось грымнулі воплескі громам,—
Зямлянка, зямлянка, зважай!
І голас, як сонца, знаёмы
Пачуў беларускі наш край.

У нас прасвятліліся вочы,
І стала ў зямлянцы цяплей,
І кожны наблізіцца хоча
Да рупара трошкі бліжэй.

### Ніколі не згіне ад лютых пажараў...

Ніколі не згіне ад лютых пажараў
Вялікі і слаўны наш край.
У бой за Радзіму збірайся, таварыш,
Ідзі партызаніць у гай.

На прускага ката!
За вёску і хату! —

Кліч помсты народнай заве.
Ідуць у атаку
Лясныя салдаты,
Грукочуць гранаты,
Крычаць аўтаматы:
Жыве Беларусь!
Жыве! *

Змагайся без страху з навалай варожай
За шчасце калгасных палёў;
У пушчах Палесся, на Нёмане й Сожы
Грыміць навальніца баёў.

Адважныя хлопцы сядзяць у засадах,
Разгневана пушча гудзе:
— Ад куль не схавацца вам, лютыя гады,
Расплаты не ўнікнуць нідзе!
Ніколі не згіне ад лютых пажараў
Вялікі і слаўны наш край.
У бой за Радзіму збірайся, таварыш,
Ідзі партызаніць у гай.

### Не зязюлька плача і кукуе...

На мяжы, дзе зломак кукурузы
Перавесіў пер'і цераз тын,
Спіць герой Савецкага Саюза
Партызан Заслонаў Канстанцін.

Не зязюлька плача і кукуе
У дрымучых віцебскіх лясах,
Гэта песню мы пяём такую,
Што любіў насвістываць ён сам.

Мы яе пад кулямі спявалі,
Прабіваліся па пахі у вадзе.
Колькі ворагаў — ніколі не злічалі,
А пыталіся адразу толькі: «Дзе?»

Над зямлёй руінаў і пажарышч
Ўстане сонца, гляне цераз тын.
Спі спакойна, доблесны таварыш,
Спі, герой, Заслонаў Канстанцін.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

## Ў чыстым полі, ў полі пад ракітай...

Ў чыстым полі, ў полі пад ракітай,
Дзе клубіўся па начы туман,
Там ляжыць ў сырой зямлі зарыты,
Там схаваны юны партызан.

Я сама героя праважала,
Ў дальні пуць, на слаўныя дзяла,
Баявую шаблю падавала,
Варанога коніка вяла.

На траву, на травушку сцяпную,
Ён упаў, прастрэлены ў баю,
За Савецкую зямлю радную
Ён аддаў геройску жызнь сваю.

## Трава палягае...

Трава палягае,
Віхуры галосяць,
На свежыя раны
Пясочку наносяць.

Нясіце вы, ветры,
Жалобу матулі,
Скасілі сыночка
Нямецкія кулі.

І ночка праходзіць,
Другая мінае,
Матуля над сынам
Нямцоў праклінае:

— Бадай вам,
нямцове,
Пазнацца з труною,
Як вы разлучылі
Сыночка са мною.

## Быццам чорная навала...

Быццам чорная навала,
Вораг рваўся ў родны край,
І краіна застагнала
Ад бандыцкіх чорных зграй.

Быццам змей дваццаціглавы,
Поўз фашысцкі чорны зброд,
Стаў таптаць палі і травы,
Стаў паліць ён наш народ.

Наша вёска невялічка,
Называюць Астравок.

Партызанаў сувязныя
Ўсе пасаджаны ў астрог.

Але мукі ім не страшны,
Смелы, храбры наш народ.
Фрыц стараецца дарэмна
Ў іх дабіцца, дзе атрад.

Збеснаваўся вораг люты,
Ідзе ў вёску Астравок,
Ўсіх людзей сагнаў у хаты
І не выпусціў, паджог.

Крыкі жалю, злобы, помсты
Па акрузе разняслісь,
І да вёскі к партызанам,
Як прызывы, данясліся.

Сіла гневу, жалю, помсты
Іх ў атаку падняла.
І на ворага-паганца
Мсціць за вёску павяла.

За пакуты ўсёй краіны
Кожны помсціў партызан,
Не адзін фашыст загінуў,
Пакаціўся у бур'ян.

Хай запомніць вораг дзікі,
Што не знішчыць наш народ,
Хай не ткне свіное рыла
Ў наш савецкі агарод.

**Бывайце здаровы!..**

Бывайце здаровы,
Багата жывіце
І нашы парады
Ад сэрца прыміце!

У кожным палку каб
Героем быў кожны,
А ваш камандзір каб
Героем быў двойчы.

Каб снайперы білі
Найболей тых фрыцаў,
На кожнага была б
Штук гэтак па трыццаць.

А калі не трыццаць,
А болей іх будзе,
Ніхто не спытае,
Ніхто не асудзіць.

Каб наша пяхота
І танкаў лавіна
Пакінула б фрыцам
Зямлі тры аршыны.

Хай фрыцам ў Берліне
Дастануцца слёзы,
А фрыцам ў Расіі —
Крыжы і бярозы.

Каб вы разагналі
Ўсю зграю пагану,
Каб кожны баец ваш
Хадзіў бы з медалем.

А калі баец ваш
І з ордэнам будзе,
Ніхто не спытае,
Ніхто не асудзіць.

Яшчэ вам жадаем
Вярнуцца дадому,
Убачыць у шчасці
Усіх сваіх родных.

Бывайце здаровы,
Багата жывіце,
Паганых ўсіх фрыцаў
На захад ганіце.

Ганіце вы фрыцаў
На захад, на захад,
Каб жыць вам вясёла,
Каб жыць вам багата.

Каб сонца вам ззяла
На ніве жыцейскай,
Каб ваша дывізія
Стала гвардзейскай.

**Прыстань, прыстань, знаёмая вёска...**

Прыстань, прыстань, знаёмая вёска,
Ці даўно ты садамі цвіла,
Ці даўно вечарамі гармошка
Сабірала на танцы дзяўчат?

Ты скажы мне, дзе дзеліся хаты
І куды твае людзі пайшлі?
Папалілі ўсё ворагі, каты,
І людзей папалілі жывых.

Напіліся крыві чалавечай
І зямлю напаілі слязой,
Гэта тыгры у скуры авечай
Па краіне гуляюць з касой.

Дзе іх сэрца, фашысцкія гады,
Дзе душа іх, паганая кроў,
Каб дзяцей вырываці з рук матак
І паліць на вачах у бацькоў?..

На адплату, браты-беларусы,
На адплату за нашых дзяцей,
За жанчын, за сірот на адплату
Падымайцеся, брацці, жывей!

### Забрукуй, сівы галубочак...

Забрукуй, сівы галубочак,
На чырвонай каліне,—
Няхай плача малады малойчык
Па харошай дзяўчыне.

Няхай плача, няхай тужыць,
Галоўку клапоча:
Высахла я на былінку,
Скарыцца ж не хочу.

Выганяе люты вораг
З роднае хаты,
У няволю гнаці хоча,
Ліхадзей закляты.

У няволю гнаці хоча,
Ліхадзей закляты,
Ды яму я не скаруся,
Лепей утаплюся.

Баліць галоўка, баліць макоўка,
Нечым завязаці,
Няма мілага, чарнабровага,
Некім наказаці.

Завяжу галоўку, завяжу макоўку
Шоўкавым платочкам,
Пашлю да мілага, чарнабровага
Сівога галубочка.

— Ляці, сівы галубочак,
Ляці, не садзіся,
Прыляціш да майго мілога,
Нізенька скланіся.

Ляцеў сівы галубочак,
Ляцеў, не садзіўся,
Прыляцеў да майго мілога,
Нізенька скланіўся.

— Ой, ідзі, мой міленькі,
З Арміяй Чырвонай
Вызваляці, бараніці
Край наш любы, родны.

### Гэй вы, фрыцы-ягамосці,

Гэй вы, фрыцы-ягамосці,
Завітайце к нам у «госці»,
Мы гасцей як след прымаем
І падносім ім, што маем:
Хто гранату, а хто кулю,
А хто толавую «дулю».
Вельмі ўдалая прылада
Падрыхтована для гада:
Шнур з яечкам на канцы,
Немцу смерць у тым яйцы.

### Ой, з-пад горкі ўсё туман...

Ой, з-пад горкі ўсё туман,
Ўсё туман, ўсё туман.

А ў тумане шэрым конік
Вараны, вараны.

На ім едзе камандзірык
Малады, малады.

Вёў ён сотню партызанаў
За сабой, за сабой.

Проціў немцаў усе стаялі,
Як сцяна, як сцяна.

Кулі сыпалісь, жужжалі,
Як пчала, як пчала.

З іх нікога не забіла,
З іх, байцоў, з іх, байцоў.

Толькі ўбіла камандзіра
Малайцоў, малайцоў.

### Пінская партызанская

Каля лесу, з-пад ракі,
Па палях гарыстых
Йшлі да нашага сяла
Ворагі-фашысты.*




*А. Паслядовіч.* Партызаны і салдаты — браты нашы родныя

Захацелася у нас
Хлебам накарміцца,
Захацелася дабром
Нашым пажывіцца.

І фашысты не дайшлі
Да лясной паляны,—
Там сустрэлі іх агнём
Нашы партызаны.

Не далі мы у жыцці
Збыцца іх надзеям,
Па савецкай па зямлі
Не хадзіць зладзеям!

---

* Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца двойчы.

### Па дарожках па лясных...

Па дарожках па лясных
Голас раздаецца.
Група пінскіх партызан
Эй! Едзе да й смяецца.

У дзярэўню за скатом
Немцы прыязджалі.
Партызанам падвязло:
Эй! Фрыцаў пастралялі.

Ой, дарожка каратка,
Што каля Бастыня:
Жыццё скончылі сваё
Эй! Немцы із Берліна.

Не хацелась паміраць
Злодзеям нямецкім,
Ім хацелась пагуляць,
Эй! Па зямлі савецкай.

### Партызаніць бацька Ніны...

Партызаніць бацька Ніны,
Партызаніць і яна,
А за Ніну больш дзяўчыны
Прыгажэйшай тут няма.

Дома ў вёсцы зараз матка
Засталася толькі быць,
Бо ў старой іх роднай хаце
Пасяліўся рыжы фрыц.

Фрыц не просты — обер нейкі,
Тупарылы і руды,
Ён прысланы аж з Вілейкі
Камендантаваць сюды.

Йшла раз Ніна на заданне,
Міну ў кошыку нясла,
Не магла прайсці тут Ніна
Міма роднага сяла.

І зайшла праведаць матку,
Сёе-тое распытаць,
І прыйшлося тут дзяўчыне
Фрыца гэтага спаткаць.

— Ты карош, дзяўчына, ошань,—
Разгаворы фрыц пачаў,
І набок скасіўшы вочы,
На пасцелю паказаў.

— Пачакае хай заданне,—
Ніна думае тайком.—
Пагуляю я ў «каханне»
З гэтым дохлым прусаком.

І пасцелю ў задуменні
Стала Ніна рыхтаваць,
Фрыц стаіць у захапленні:
— Ну і дзеўка, што казаць!

Адвярнуўся на хвіліну
Фрыц у вокны паглядзець,
Ніна міну пад пярыну
Ціха з кошыка кладзець.

— Распранайся ж, мой каханы,
І ў пасцельку ў добры час,
Я адпраўлю толькі маму,
Каб не бачыла тут нас.

І міргнуўшы фрыцу міла,
Ніна выйшла за парог,
Матку з хаты падхапіла
І за вербы з усіх ног.

Толькі фрыц крануў пярыну,
Захляснула вочы бель.
Аж да неба ўзняла міна
Хату, фрыца і пасцель,

**А Лявоніху Лявон палюбіў...**

А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявонісе чаравічкі купіў,
Лявоніха — душа ласкавая —
Чаравічкамі палясківае.

На гармоніку Лявонісе пад тон
Грае, грае, прыўдарае сам Лявон.
Ух-ха! Весяліся душа!
Ух-ха! Лявоніха хараша!
Раптам — вораг! Загрымела ў нас вайна,
Аблілася наша кроўю старана.
Ох, бяда, бяда, вялікая бяда —
Грабіць край наш чорных гітлерцаў арда.
Дзе ж ты, дзе, мая Лявоніха, цяпер?
Мо замучыў цябе немец, люты звер?
Не, Лявоніха з Лявонам у лясу,
І Лявоніха абрэзала касу.
Не абцасамі, а стрэламі пастуквае,
Немцаў кулямі з-за кусцікаў прыхлопвае.
Кулямётам жа Лявонісе пад тон
Грае, грае, прыўдарае сам Лявон.
Рэха весела абодвум ім падказвае,
Біты вораг перад імі аж падскаквае.
Ух-ха! Лезе з немца душа!
Ух-ха! Лявоніха хараша!

**Дайце ў рукі мне гармонь...**

Дайце ў рукі мне гармонь,
Залатыя планкі,
Я спяю вам, як дамоў
Фрыц уцёк з Удранкі.
Частавалі іх тады
Нашыя брыгады,
І пабеглі хто куды
Гітлераўцы-гады.

Уцякалі без сапог.
Фрыц параніў ногі,
І сярод глухіх дарог
Збіўся ён з дарогі.

Пазабыў знаёмы пуць
Гітлеравец «бравы»,—
Трэба ўлева павярнуць,
Павярнуў управа.

Дзень і ноч праходзіў ён,
І назаўтра рана
У нашу вёску трапіў ён...
У рукі к партызанам.
Не вярнуўся фрыц дамоў
Ад ракі Удранкі,
Эх, гармонь, мая гармонь,
Залатыя планкі.

**Хутка сонца заззяе над намі...**

Хутка сонца заззяе над намі —
Сустракаць будзем волі зару.
У чужынцаў ляжаць пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!

Там, на ўсходзе, грыміць кананада,
Ноччу неба гарыць у агні.
Гэта крышаць фашысцкага гада
Пабрацімы твае і сыны.

Дзень і ноч ўсё мацнеюць раскаты,
Дзень і ноч бой без упынку кіпіць:
Гэта час надыходзіць расплаты,
Гэта гнеў наш пажарам гарыць.

Беларусь, наша маці, краіна!
Гэта дзень вызвалення ідзе,
Узнімі ж ўсю нянавісць і сілу
І абруш па варожай брыдзе...

Няхай помста твая запалае
Ў кожнай скібе стаптанай раллі,
Хай нямецкую набрыдзь змятае
З нашай роднай пакутнай зямлі.

Хутка сонца заззяе над намі —
Сустракаць будзем волі зару.
У чужынцаў ляжаць пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!

**Над зямелькай зара йшла...**

Над зямелькай зара йшла,
Чары сыпала:
Зорак рэшата нясла,
Ўсе рассыпала.
І гараць яны, гараць,
Зоркі ясныя,
Навяваюць яны нам
Думкі шчасныя.

Чаго зоркі так на нас
Узіраюцца,
З неба гэтак праз ўвесь час
Усміхаюцца?
Бо учора мы былі
Паднявольныя,
А сягоння мы ізноў
Людзі вольныя.

Песні радасці пяём
Маладзецкія,
Не чужацкія ліхія,
А савецкія.
Шчаслівейшымі з усіх
Людзьмі сталі мы,
Дзякуй шчырае байцам
Пасылалі мы.

**Із далёкіх із краёў...**

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў,
Эй, шлі салдацікі дамоў.

Па вузенькай дарожцы
Запыліла вочы ім,
Эй, запыліла вочы ім.

То пясочак, то не дым,
То Радзіма — не Берлін,
Эй, то Радзіма — не Берлін.

Вот і роднае сяло
На прыгорачку відно,
Эй, на прыгорачку відно.

Выхадзіце, сёстры, брацця,
Пераможцаў сустракаці,
Эй, пераможцаў сустракаці!

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў,
Эй, шлі салдацікі дамоў.

**На магіле ружы расцвітаюць...**

На магіле ружы расцвітаюць,
Шэпча бэз над кветкамі вяргінь,
А ў магіле спіць герой савецкі —
Партызан Заслонаў Канстанцін.

Не салоўка голасам пявучым
Над ракой калыша ціхі гай,
Гэта мы яму спяваем песню
Пра любімы, родны, вольны край.

У дрымучых у лясах аршанскіх
Гэтай песні ён не даспяваў,
Ад смяротнай кулі, ад фашысцкай,
За Радзіму вольную ён паў.

Беларусь, ты бацькаўшчына наша,
Ўдаль і ўшыр прасторам ты лягла,
Кветкай яркай, кветкаю прыгожай
Між рэспублік вольных расцвіла.

Ой, з-за лесу-бору па-над хатай
Ясна свеціць сонца цераз тын.
Мы табе пяём сягоння песню,
Наш герой — Заслонаў Канстанцін.

**Я рана ўстану...**

Я рана ўстану,
Пайду на расу,
К магіле-кургану
Вянок панясу.

Пад гэтым курганам
Каханы ляжыць,
Навокал калгаснае
Жыта шуміць.

Пад гэтым курганам
Каханы ляжыць,
Жыццё яго рана
Смерць ўспела скасіць.

Пайшоў ў партызаны,
Фашыстаў знішчаў,
За край свой каханы
Жыццё ён аддаў.

Сама на магілу
Вянок палажу,
— Прымі вянок, мілы,—
Яму я скажу.

Каб змог ты, каханы,
Устаць, паглядзець,
Як край лечыць раны,
Расці стаў, квітнець.

**Гэту песню мы самі складалі...**

Гэту песню мы самі складалі
На шырокіх калгасных палях
Пра дзень светлы, што мы адстаялі
У суровых і цяжкіх баях.

Не! Не стаў родны край паланянкай,
Сваё шчасце будуе ён зноў.
І цяпер Беларусь-партызанка
Знае нашых дачок і сыноў.

Электрычнасць у хаце у кожнай,
Табуны на шырокіх лугах,
Мы жывём, як ніколі, заможна,
Перад намі шчаслівы лёг шлях.

**Зацвілі пралескі...**

Зацвілі пралескі пры дарозе ў полі,
Салаўі запелі голасна ў бары.

Партызанаў сувязныя
Ўсе пасаджаны ў астрог.

Але мукі ім не страшны,
Смелы, храбры наш народ.
Фрыц стараецца дарэмна
Ў іх дабіцца, дзе атрад.

Збеснаваўся вораг люты,
Ідзе ў вёску Астравок,
Ўсіх людзей сагнаў у хаты
І не выпусціў, паджог.

Крыкі жалю, злобы, помсты
Па акрузе разняслісь,
І да вёскі к партызанам,
Як прызывы, даняслісь.

Сіла гневу, жалю, помсты
Іх ў атаку падняла.
І на ворага-паганца
Мсціць за вёску павяла.

За пакуты ўсёй краіны
Кожны помсціў партызан,
Не адзін фашыст загінуў,
Пакаціўся у бур'ян.

Хай запомніць вораг дзікі,
Што не знішчыць наш народ,
Хай не ткне свіное рыла
Ў наш савецкі агарод.

## Бывайце здаровы!..

Бывайце здаровы,
Багата жывіце
І нашы парады
Ад сэрца прыміце!

У кожным палку каб
Героем быў кожны,
А ваш камандзір каб
Героем быў двойчы.

Каб снайперы білі
Найболей тых фрыцаў,
На кожнага была б
Штук гэтак па трыццаць.

А калі не трыццаць,
А болей іх будзе,
Ніхто не спытае,
Ніхто не асудзіць.

Каб наша пяхота
І танкаў лавіна
Пакінула б фрыцам
Зямлі тры аршыны.

Хай фрыцам ў Берліне
Дастануцца слёзы,
А фрыцам ў Расіі —
Крыжы і бярозы.

Каб вы разагналі
Ўсю зграю пагану,
Каб кожны баец ваш
Хадзіў бы з медалем.

А калі баец ваш
І з ордэнам будзе,
Ніхто не спытае,
Ніхто не асудзіць.

Яшчэ вам жадаем
Вярнуцца дадому,
Убачыць у шчасці
Усіх сваіх родных.

Бывайце здаровы,
Багата жывіце,
Паганых ўсіх фрыцаў
На захад ганіце.

Ганіце вы фрыцаў
На захад, на захад,
Каб жыць вам вясёла,
Каб жыць вам багата.

Каб сонца вам ззяла
На ніве жыцейскай,
Каб ваша дывізія
Стала гвардзейскай.

**Прыстань, прыстань, знаёмая вёска...**

Прыстань, прыстань, знаёмая вёска,
Ці даўно ты садамі цвіла,
Ці даўно вечарамі гармошка
Сабірала на танцы дзяўчат?

Ты скажы мне, дзе дзеліся хаты
І куды тваe людзі пайшлі?
Папалілі ўсё ворагі, каты,
І людзей папалілі жывых.

Напіліся крыві чалавечай
І зямлю напаілі слязой,
Гэта тыгры у скуры авечай
Па краіне гуляюць з касой.

Дзе іх сэрца, фашысцкія гады,
Дзе душа іх, паганая кроў,
Каб дзяцей вырываці з рук матак
І паліць на вачах у бацькоў?..

На адплату, браты-беларусы,
На адплату за нашых дзяцей,
За жанчын, за сірот на адплату
Падымайцеся, брацці, жывей!

### Забрукуй, сівы галубочак...

Забрукуй, сівы галубочак,
На чырвонай каліне,—
Няхай плача малады малойчык
Па харошай дзяўчыне.

Няхай плача, няхай тужыць,
Галоўку клапоча:
Высахла я на былінку,
Скарыцца ж не хочу.

Выганяе люты вораг
З роднае хаты,
У няволю гнаці хоча,
Ліхадзей закляты.

У няволю гнаці хоча,
Ліхадзей закляты,
Ды яму я не скаруся,
Лепей утаплюся.

Баліць галоўка, баліць макоўка,
Нечым завязаці,
Няма мілага, чарнабровага,
Некім наказаці.

Завяжу галоўку, завяжу макоўку
Шоўкавым платочкам,
Пашлю да мілага, чарнабровага
Сівога галубочка.

— Ляці, сівы галубочак,
Ляці, не садзіся,
Прыляціш да майго мілога,
Нізенька скланіся.

Ляцеў сівы галубочак,
Ляцеў, не садзіўся,
Прыляцеў да майго мілога,
Нізенька скланіўся.

— Ой, ідзі, мой міленькі,
З Арміяй Чырвонай
Вызваляці, бараніці
Край наш любы, родны.

### Гэй вы, фрыцы-ягамосці,

Гэй вы, фрыцы-ягамосці,
Завітайце к нам у «госці»,
Мы гасцей як след прымаем
І падносім ім, што маем:
Хто гранату, а хто кулю,
А хто толавую «дулю».
Вельмі ўдалая прылада
Падрыхтавана для гада:
Шнур з яечкам на канцы,
Немцу смерць у тым яйцы.

### Ой, з-пад горкі ўсё туман...

Ой, з-пад горкі ўсё туман,
Ўсё туман, ўсё туман.

А ў тумане шэрым конік
Вараны, вараны.

На ім едзе камандзірык
Малады, малады.

Вёў ён сотню партызанаў
За сабой, за сабой.

Проціў немцаў усе стаялі,
Як сцяна, як сцяна.

Кулі сыпаліся, жужжалі,
Як пчала, як пчала.

З іх нікога не забіла,
З іх, байцоў, з іх, байцоў.

Толькі ўбіла камандзіра
Малайцоў, малайцоў.

## Пінская партызанская

Каля лесу, з-пад ракі,
Па палях гарыстых
Йшлі да нашага сяла
Ворагі-фашысты.*




*А. Паслядовіч.* Партызаны і салдаты — браты нашы родныя

Захацелася у нас
Хлебам накарміцца,
Захацелася дабром
Нашым пажывіцца.

І фашысты не дайшлі
Да лясной паляны,—
Там сустрэлі іх агнём
Нашы партызаны.

Не далі мы у жыцці
Збыцца іх надзеям,
Па савецкай па зямлі
Не хадзіць зладзеям!

* Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца двойчы.

### Па дарожках па лясных...

Па дарожках па лясных
Голас раздаецца.
Група пінскіх партызан
Эй! Едзе да й смяецца.

У дзярэўню за скатом
Немцы прыязджалі.
Партызанам падвязло:
Эй! Фрыцаў пастралялі.

Ой, дарожка каратка,
Што каля Бастыня:
Жыццё скончылі сваё
Эй! Немцы із Берліна.

Не хацелась паміраць
Злодзеям нямецкім,
Ім хацелась пагуляць,
Эй! Па зямлі савецкай.

### Партызаніць бацька Ніны...

Партызаніць бацька Ніны,
Партызаніць і яна,
А за Ніну больш дзяўчыны
Прыгажэйшай тут няма.

Дома ў вёсцы зараз матка
Засталася толькі быць,
Бо ў старой іх роднай хаце
Пасяліўся рыжы фрыц.

Фрыц не просты — обер нейкі,
Тупарылы і руды,
Ён прысланы аж з Вілейкі
Камендантаваць сюды.

Йшла раз Ніна на заданне,
Міну ў кошыку нясла,
Не магла прайсці тут Ніна
Міма роднага сяла.

І зайшла праведаць матку,
Сёе-тое распытаць,
І прыйшлося тут дзяўчыне
Фрыца гэтага спаткаць.

— Ты карош, дзяўчына, ошань,—
Разгаворы фрыц пачаў,
І набок скасіўшы вочы,
На пасцелю паказаў.

— Пачакае хай заданне,—
Ніна думае тайком.—
Пагуляю я ў «каханне»
З гэтым дохлым прусаком.

І пасцелю ў задуменні
Стала Ніна рыхтаваць,
Фрыц стаіць у захапленні:
— Ну і дзеўка, што казаць!

Адвярнуўся на хвіліну
Фрыц у вокны паглядзець,
Ніна міну пад пярыну
Ціха з кошыка кладзець.

— Распранайся ж, мой каханы,
І ў пасцельку ў добры час,
Я адпраўлю толькі маму,
Каб не бачыла тут нас.

І міргнуўшы фрыцу міла,
Ніна выйшла за парог,
Матку з хаты падхапіла
І за вербы з усіх ног.

Толькі фрыц крануў пярыну,
Захляснула вочы бель.
Аж да неба ўзняла міна
Хату, фрыца і пасцель,

**А Лявоніху Лявон палюбіў...**

А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявонісе чаравічкі купіў,
Лявоніха — душа ласкавая —
Чаравічкамі палясківае.

На гармоніку Лявонісе пад тон
Грае, грае, прыўдарае сам Лявон.
Ух-ха! Весяліся душа!
Ух-ха! Лявоніха хараша!
Раптам — вораг! Загрымела ў нас вайна,
Аблілася наша кроўю старана.
Ох, бяда, бяда, вялікая бяда —
Грабіць край наш чорных гітлерцаў арда.
Дзе ж ты, дзе, мая Лявоніха, цяпер?
Мо замучыў цябе немец, люты звер?
Не, Лявоніха з Лявонам у лясу,
І Лявоніха абрэзала касу.
Не абцасамі, а стрэламі пастуквае,
Немцаў кулямі з-за кусцікаў прыхлопвае.
Кулямётам жа Лявонісе пад тон
Грае, грае, прыўдарае сам Лявон.
Рэха весела абодвум ім падказвае,
Біты вораг перад імі аж падскаквае.
Ух-ха! Лезе з немца душа!
Ух-ха! Лявоніха хараша!

## Дайце ў рукі мне гармонь...

Дайце ў рукі мне гармонь,
Залатыя планкі,
Я спяю вам, як дамоў
Фрыц уцёк з Удранкі.
Частавалі іх тады
Нашыя брыгады,
І пабеглі хто куды
Гітлераўцы-гады.

Уцякалі без сапог.
Фрыц параніў ногі,
І сярод глухіх дарог
Збіўся ён з дарогі.
Пазабыў знаёмы пуць
Гітлеравец «бравы»,—
Трэба ўлева павярнуць,
Павярнуў управа.

Дзень і ноч праходзіў ён,
І назаўтра рана
У нашу вёску трапіў ён...
Ў рукі к партызанам.
Не вярнуўся фрыц дамоў
Ад ракі Удранкі,
Эх, гармонь, мая гармонь,
Залатыя планкі.

## Хутка сонца заззяе над намі...

Хутка сонца заззяе над намі —
Сустракаць будзем волі зару.
У чужынцаў ляжаць пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!

Там, на ўсходзе, грыміць кананада,
Ноччу неба гарыць у агні.
Гэта крышаць фашысцкага гада
Пабрацімы твае і сыны.

Дзень і ноч ўсё мацнеюць раскаты,
Дзень і ноч бой без упынку кіпіць:
Гэта час надыходзіць расплаты,
Гэта гнеў наш пажарам гарыць.

Беларусь, наша маці, краіна!
Гэта дзень вызвалення ідзе,
Узнімі ж ўсю нянавісць і сілу
І абруш па варожай брыдзе...

Няхай помста твая запалае
Ў кожнай скібе стаптанай раллі,
Хай нямецкую набрыдзь змятае
З нашай роднай пакутнай зямлі.

Хутка сонца заззяе над намі —
Сустракаць будзем волі зару.
У чужынцаў ляжаць пад нагамі
Ты не будзеш, мая Беларусь!

### Над зямелькай зара йшла...

Над зямелькай зара йшла,
Чары сыпала:
Зорак рэшата нясла,
Ўсе рассыпала.
І гараць яны, гараць,
Зоркі ясныя,
Навяваюць яны нам
Думкі шчасныя.

Чаго зоркі так на нас
Узіраюцца,
З неба гэтак праз ўвесь час
Усміхаюцца?
Бо учора мы былі
Паднявольныя,
А сягоння мы ізноў
Людзі вольныя.

Песні радасці пяём
Маладзецкія,
Не чужацкія ліхія,
А савецкія.
Шчаслівейшымі з усіх
Людзьмі сталі мы,
Дзякуй шчырае байцам
Пасылалі мы.

### Із далёкіх із краёў...

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў,
Эй, шлі салдацікі дамоў.

Па вузенькай дарожцы
Запыліла вочы ім,
Эй, запыліла вочы ім.

То пясочак, то не дым,
То Радзіма — не Берлін,
Эй, то Радзіма — не Берлін.

Вот і роднае сяло
На прыгорачку відно,
Эй, на прыгорачку відно.

Выхадзіце, сёстры, брацця,
Пераможцаў сустракаці,
Эй, пераможцаў сустракаці!

Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў,
Эй, шлі салдацікі дамоў.

### На магіле ружы расцвітаюць...

На магіле ружы расцвітаюць,
Шэпча бэз над кветкамі вяргінь,
А ў магіле спіць герой савецкі —
Партызан Заслонаў Канстанцін.

Не салоўка голасам пявучым
Над ракой калыша ціхі гай,
Гэта мы яму спяваем песню
Пра любімы, родны, вольны край.

У дрымучых у лясах аршанскіх
Гэтай песні ён не даспяваў,
Ад смяротнай кулі, ад фашысцкай,
За Радзіму вольную ён паў.

Беларусь, ты бацькаўшчына наша,
Ўдаль і ўшыр прасторам ты лягла,
Кветкай яркай, кветкаю прыгожай
Між рэспублік вольных расцвіла.

Ой, з-за лесу-бору па-над хатай
Ясна свеціць сонца цераз тын.
Мы табе пяём сягоння песню,
Наш герой — Заслонаў Канстанцін.

### Я рана ўстану...

Я рана ўстану,
Пайду на расу,
К магіле-кургану
Вянок панясу.

Пад гэтым курганам
Каханы ляжыць,
Навокал калгаснае
Жыта шуміць.

Пад гэтым курганам
Каханы ляжыць,
Жыццё яго рана
Смерць ўспела скасіць.

Пайшоў ў партызаны,
Фашыстаў знішчаў,
За край свой каханы
Жыццё ён аддаў.

Сама на магілу
Вянок палажу,
— Прымі вянок, мілы,—
Яму я скажу.

Каб змог ты, каханы,
Устаць, паглядзець,
Як край лечыць раны,
Расці стаў, квітнець.

### Гэту песню мы самі складалі...

Гэту песню мы самі складалі
На шырокіх калгасных палях
Пра дзень светлы, што мы адстаялі
У суровых і цяжкіх баях.

Не! Не стаў родны край паланянкай,
Сваё шчасце будуе ён зноў.
І цяпер Беларусь-партызанка
Знае нашых дачок і сыноў.

Электрычнасць у хаце у кожнай,
Табуны на шырокіх лугах,
Мы жывём, як ніколі, заможна,
Перад намі шчаслівы лёг шлях.

### Зацвілі пралескі...

Зацвілі пралескі пры дарозе ў полі,
Салаўі запелі голасна ў бары.

У калгасным садзе ружавеюць дрэвы
І гамоняць пчолы ад ранняй зары.

На калгасным полі зелянеюць руні,—
Прынясе багаты ураджай зямля.

Хлеба поўны клеці, сена поўны пуні,
Нам і весяліцца, нам і пагуляць.

Мы жывём багата, радасна спяваем:
Нам не ведаць болей смутку і тугі.

Льецца наша песня ад края да края
Пра сваю Радзіму — край наш дарагі.

### Радасць жней

Ой, мы ў полі жыта жалі,
Спелае, калгаснае,
І снапы, снапы вязалі
Туга перавяслами.

Як снапы, снапы складалі
Ў бабкі залацістыя,
Песні новыя спявалі,
Песні галасістыя.

Жыта буйнае, густое
Долу нахілялася,
Сонца ў небе залатое
Радасна ўсміхалася.

Зжалі, ўбралі сваю ніву
І ідзём дахаты мы;
Знаем, будзем жыць шчасліва,
Як заўжды, багатымі.

### Жніўная

Ой, калышуцца жыты ў полі,
Залатыя звіняць каласы,
Льецца жніўная песня ў прыволлі
Песня шчасця і светлай красы.

Раніцою пад сонейкам ясным,
Дзе хвалюецца жытні прастор,
Там спявае аб шчасці калгасным
Самаходны камбайна матор.

Адзываецца бор адгалоскам,
Песня вольная ў далі плыве,
Усміхаецца ветліва вёска,
Бо шчасліва сягоння жыве.

Эх, любуйцеся, далі, прыволлем,
Дзе кіпіць маладое жніво,
Як пяюць за рулём камбайнёры
Аб Радзіме сваёй дарагой.

### Ясны зоры залацістыя...

Ясны зоры залацістыя,
Любы нам лугі квяцістыя,
Эх, старонка, доляй шчасная,
Наша вольная, калгасная.

Сонцам колас наліваецца,
Морам жыта калыхаецца,
Нестрыманаю ахвотаю
Добра ў полі за работаю.

Няма краю прыгажэйшага,
Ураджаем багацейшага,
Слаўнай славаю свабоднаю,
Звонкай песняю народнаю.

Ясны зоры залацістыя,
Любы нам лугі квяцістыя,
Эх, старонка, доляй шчасная,
Наша вольная, калгасная.

**Мы — людзі Савецкай зямлі...**

Мы — людзі Савецкай зямлі,
Мы працаю шчасце сабе здабылі.
І ясныя зоры нам свецяць з Крамля,
І вольную песню спявае зямля.

І радасна сонца вітае наш век,
Шчасліва савецкі жыве чалавек,
Пад сонцам свабоды праходзяць гады,
Квітнеюць прасторы, растуць гарады.

Гамоняць пустыні і рэкі пяюць,
Над Волгай, дзе ясныя зоркі ўстаюць:
Праменні над светам далёка відны,
Святлом камунізма нам ззяюць яны.

**Ураджайная плясавая**

Калгаснае поле —
Краю не відно,
Хіліць буйны колас
Золата-зярно.

П р ы п е ў: Як нам песень не спяваць,
Як нам танцаў не плясаць:
Хіліць буйны колас
Золата-зярно.

Дзе былі балоты,
Дзе шумеў чарот —
Ураджай збірае
Вольны наш народ.

П р ы п е ў: Як нам песень не спяваць,
Як нам танцаў не плясаць:
Ураджай збірае
Вольны наш народ.

Сцеліць збожжа пластам
Лабагрэйкі ўзмах,
Як ластаўкі, ўююцца
Жнеі на палях.

П р ы п е ў: Як нам песень не співаць,
Як нам танцаў не плясаць:
Як ластаўкі, ўююцца
Жнеі на палях.

Там, дзе з жытам зліўся
Неба сіні край,
Косіць і малоціць
Багатыр-камбайн.

П р ы п е ў. Як нам песень не співаць,
Як нам танцаў не плясаць:
Косіць і малоціць
Багатыр-камбайн.

**Брыгадзір мой міленькі...**

Брыгадзір мой міленькі,
Гарманіст удаленькі:
Як зайграе ў вольны час,
Сабярэ людзей ураз.

Ой ты, мілы, мілы мой,
Ганаруся я табой!

Папрыходзіць сюды шмат,
Як маліначак, дзяўчат
На яго усё глядзець,—
Цяжка мне гэта цярпець.

Ой ты, мілы, мілы мой,
Ганаруся я табой!

Пачакай жа, любы мой,
Буду Працы я герой;
Глянуць хлопцы й на мяне,—
Табе раўнаваць, не мне...

Ой ты, мілы, мілы мой,
Ганаруся я табой!

**Ой, дзеванькі, паслухайце...**

Ой, дзеванькі, паслухайце:
Кажуць, што я закахалася,
Ночкай цёмнай цалавалася...
Гэта ўсё няпраўда,
Гэта ўсё няпраўда, няпраўда!



Вячоркі

Кажуць: дзяўчына высахла,
Вочы сінія засмучаны,
Сэрца любасцю атручана...
Гэта ўсё няпраўда,
Гэта ўсё няпраўда, няпраўда!

Ой, дзеванькі, паслухайце:
Не была бы я калгасніцай,
Каб сядзела век за прасніцай.
А гэта ўсё праўда,
А гэта ўсё праўда, ўсё праўда!

Толькі сэрца у дзяўчыны
Усё сумуе ночкаю цёмнаю

Па каханню непрытомнаму,
Ой, гэта праўда,
Ой, гэта ўсё праўда, ўсё праўда!

### Жартоўная песня

Ой, хацела ж мяне маць
За Івана замуж даць.
Не хачу, не пайду,
Я Івана не люблю.
А Іван лянівы дужа.
Не хачу такога мужа.
Не хачу, не пайду,
Я Івана не люблю.

Ой, хацела мяне маць
За Якуба замуж даць,
Я сказала, не пайду,
Я Якуба не люблю.
У Якуба тоўсты губы,
Цалавацца трэба будзе,
Не хачу, не пайду,
Я Якуба не люблю.

Ой, хацела мяне маць
За Піліпа замуж даць.
Я сказала, не пайду,
Я Піліпа не люблю.
А Піліп такі сярдзіты.
Я баюсь, што буду біта.
Не хачу, не пайду,
Я Піліпа не люблю.

Ой, хацела мяне маць
За Рыгора замуж даць.
Я сказала, не пайду,
Я Рыгора не люблю.
А ў Рыгора нос угору,
Мне з Рыгорам будзе гора,
Не хачу, не пайду,
Я Рыгора не люблю.

Ой, хацела мяне маць
За Мікіту замуж даць.

Я сказала, не хачу,
Я Мікіту не люблю.
А Мікіта з носам ходзіць,
За ім дзеўкі роем ходзяць,
Не хачу, не пайду,
Я Мікіту не люблю.

А ў мяне ўжо на прымеце
Трактарыст любімы Пеця,
Вось яго я і люблю,
За яго замуж пайду.
Трактарыст ён першы ў полі,
На камбайне вельмі здольны.
Ой, хачу, ой, люблю,
Калі возьме, дык пайду.

### Беларусь мая...

Беларусь мая, маці родная!
За сялом рака паўнаводная,
За ракой сады салаўіныя,
Льюцца песні ўдаль пераліўныя.

Твой народ устаў, у паход
пайшоў
На дрыгву балот непраходную,
Рэкі быстрыя супыняючы,
Шырыню палёў засяваючы.

Дружна праца йдзе несціханая,
Карпусы ўстаюць мураваныя.
Морам ніва ў нас калыхаецца,
У сэрцы песняю адзываецца.

І гараць агні над прасторамі,
Залацістымі свецяць зорамі,
Каб з бядою век ты не зналася,
Шчасцем-доляю красавалася.

### Святочная

Як жа нам сягоння свята не гуляць,
Як жа нам сягоння песень не спяваць,
Калі ў нашым полі машына гудзе,
Калі ў нас работа дружная ідзе.*

Калі ў нашай хаце радасць і святло,
Калі ў нашай хаце шчасце расцвіло,
Калі ў нашай хаце госцейкі сядзяць,
Залатыя зоркі на грудзях гараць.

За сталом наш бацька — вайны ветэран,
Родны сын у бацькі — слаўны партызан,

За сталом нявеста — дбалы палявод,
Нашых жа герояў знае ўвесь народ.

---

* Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца двойчы.

Як жа нам сягоння свята не гуляць,
Як жа нам сягоння песень не спяваць,
Пражылі на свеце слаўных сорак год,
Многа сустракалі у жыцці прыгод.

Па-над нашым краем вечна сонцу ззяць,
Каласістым нівам вечна красаваць.
Узлятай ты, песня наша, узлятай,
Мір табе і воля, Беларускі край.

**Калгасная святочная**

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Жадаем мы шчасця
У кожную хату.

Перш-наперш такое
Жаданне ў нас будзе,—
Каб шчасце ракою
Цякло нашым людзям.

Пшаніцы б шумелі,
Як морскія хвалі,
Каб гралі вяселлі,
Радзіны б гулялі.

Жадаем калгасу
На нівах, на пожнях
Па ўсіх паказальніках
Поспехі множыць.

За гордасць героя
У працы ваюйце,
На славу Савецкай
Радзімы працуйце.

Жадаем вам працы
Увішнай і спорнай,
Каб цешыўся сябра,
Каб корчыўся вораг.

І гор залатых
Яшчэ вам пажадаем,
Тых гор, што ўсе людзі
Завуць ураджаем.

Яшчэ пажадаць вам
Засталася мала,
Каб сіла калгаса
Штодзень нарастала.

Жадаем мы жыць вам
І весела й сыта
Назло прайдзісветам,
Заморскім бандытам.

Бывайце ж здаровы,
Жывіце багата,
Жадаем мы шчасця
У кожную хату.

**Юбілейная застольная**

Сабраліся мы сёння
На нашае свята
Сям'ёю вялікай
Калгаснай, багатай.

За стол юбілейны
Мы ўсіх запрашаем,
За партыю першы
Наш тост падымаем.

Мы з песняй у светлае
Заўтра шагаем,
Мы партыю родную
Ў ёй услаўляем.

Што шлях к камунізму
Шчаслівы нам меціць,
Што праўду бароніць
І мір ва ўсім свеце.

Мы вып'ем за творчы
Наш шлях пераможны,
За тое, што жыць мы
Без песні не можам.

Бо песня ад сэрца
Шчаслівага рвецца,
Бо песня самім жа
Жыццём саздаецца.

### У нас, у Яроміне, свята...

У нас, у Яроміне, свята,
Прывольная песня гучыць
Аб шчасці, аб лёсе багатым,
Аб тым, як нам хораша жыць.*

Хвалюцца буйныя нівы,
Дамы-каменіцы растуць,
У нашым калгасе шчасліва
Працоўныя людзі жывуць.

Прайдзіся па фермах прасторных,
Наведай калгасны наш сад,
Усюды убачыш узоры,
Народных багаццяў лад.

У нас, у Яроміне, свята,
Прывольная песня гучыць,
Аб шчасці, аб лёсе багатым,
Аб тым, як нам хораша жыць.

### Прывітальная роднаму Мінску

Дзе ў чыстых водах Нёмана купаецца зара,
Кругом цвіце, красуецца цудоўная зямля.
Глядзіш — не налюбуешся, так шмат жывой красы.
Ліюцца песні звонкія праз нівы і лясы.

Хай песні над краем звіняць весялей,
Агні камунізма хай свецяць ярчэй,
Хай слава Радзімы да сонца ляціць
І радасці, шчасцю не будзе граніц.**

* Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца двойчы.
** Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

Як вучыць наша партыя, працуе ў нас народ,
Шумяць палі калгасныя ўраджаем кожны год.
І кукуруза сочная у нас расце, як гай,
Шмат мяса, масла, кужалю цяпер дае наш край.

У нас заводы новыя па ўсёй зямлі гудуць,
У нас дарогі светлыя да перамог вядуць.
Табе, сталіца, родны Мінск, мы сёння прыняслі
Паклон і песні шчырыя з наднёманскай зямлі.

**Прывітальная Мінску**

Добры дзень, дарагая сталіца
Беларускай цудоўнай зямлі.
Мы прыйшлі да цябе пакланіцца,
Песню шчасця табе прыняслі.*

Няхай шчырая песня раскажа
Пра вялікі і радасны час,
Што ў жыццё у заможнае наша
Шлях трымае наш родны калгас.

Свеціць сонца цудоўнага рання,
Ад прастораў калгасных палёў,
Ты прымі, родны Мінск, прывітанне
І гарачую нашу любоў.

**Дэпутатка**

Ёсць у нашым у калгасе
Ды дзяўчына слаўная,
Прыгажэй сваіх падружак,
На ўсе рукі спраўная.

Не дарэмна на красуню
Хлопцы заглядаюцца,
А за што наша дзяўчына
Хлопцам падабаецца?

Ці за вочы, ці за бровы,
Ці за косы белыя?
Ці за подзвігі у працы,
Дзелавыя, смелыя?

Ці за ордэн, што на грудзях
Сонцам разгараецца,
Ці за тое, што героем
Яна называецца?

Нашы хлопцы у рабоце
Многа чаго вартыя.
Толькі цяжка параўнацца
З дзяўчынай упартаю.

За вялікую работу,
Шчырую, выдатную,
Выбіраем дэпутаткай
Ды дзяўчыну слаўную.

* Апошнія два радкі кожнага слупка паўтараюцца двойчы.

У Вярхоўным у Савеце,
З думамі свабоднымі,
Наша дзеўчына занята
Справамі народнымі.

І працоўным нашым
людзям,
Што ні пажадаецца,—
Па савецкаму закону
Усё ў жыцці збываецца.

## ЧАСТУШКІ

### Помніць Леніна мы будзем...

Помніць Леніна мы будзем,
Будзем помніць і любіць;
Як настаўніка і друга
Ў сэрцы беражна насіць.

Сонца яркае ўзыходзіць,
Асвятляючы бары.
Нас на бой за хлеб і волю
Ленін вёў у Акцябры.

Цераз горы і даліны
Далі драла белыя,
Усіх бандытаў мы разбілі
Па загаду Леніна.

Мы разбілі ўсіх бандытаў,
Разгрмілі на франтах,
Бо да гэтага нас клікаў
Смелы голас Ільіча.

Куплю Леніна партрэт,
Залатую рамачку,
Вывеў ён мяне у свет,
Цёмную сялячачку.

Ой, як Ленін паміраў,—
Ўся краіна плакала:
Гора цяжкае прыйшло,
Цяжкае для ўсякага.

На сцяне вісіць карціна,
Рамачка пабелена.
Я цяпер чытаю кнігі
Дарагога Леніна.

Эх, каб Ленін мог сягоння
Паглядзець, як мы жывём,
Як з яго вучэннем мудрым
К жыццю новаму ідзём.

Асвятляе сонца поле
Яркімі праменнямі,
Вечным сонцам над зямлёю
Ззяе вобраз Леніна.

Мы цяпер усе жывём
Шчасліва і ўпэўнена,
Бо жыццё сваё вядзем
Па заветах Леніна.

Сабірайцеся, падружкі,
Песню звонкую спяём,
З новым ленінскім законам
К камунізму мы ідзём.

### Рэвалюцыя прыйшла — людзям шчасце прынясла...

Рэвалюцыя прыйшла —
Людзям шчасце прынясла,
Цёмна ночка стала днём,
Зажывём, эх, зажывём.

Расцвіла ў садочку
Маладая вішанька.
Жыць свабодна толькі сталі
Мы пасля Кастрычніка.

Над сялом нашым прыгожа
Загараліся агні.
Запаліў іх родны Ленін
У Кастрычніцкія дні.

Калчаку падбілі вока
І Пілсудскаму шчаку,
А Дзянікін засмучоны,
За слязою лье слязу.

У катле ды на агні
Варылася каша.
Не надзейцеся, буржуі,—
Беларусь не ваша.

Як паны на нас ішлі
З песнямі вясёлымі,
Мы сустрэлі іх з «пашанай» —
Кулямі свінцовымі.

Паны розныя над намі
Захацелі панаваць,—
Хутка ж стрэльбы пакідалі
І што сілы уцякаць.

Эй, яблычка,
Наліваецца,
А Савецкая ўлада
Узмацняецца.

## Наша слаўная Радзіма расцвітае і расце

Дзе былі раней балоты
І шумеў хваёвы лес,
Там цяпер гудзе работа —
Збудавалі там Белдрэс.

Не шумі, зялёны бор,
Густымі вяршынамі.
Сёння поўніцца прастор
Песнямі машыннымі.

Хай буржуй-кулак трасецца,
Свайму богу моліцца.
Весела у нас жывецца
І работа спорыцца.

Кулакі вы, кулакі,
Папоўскія галовачкі.
Не ўдасца вам сарваць
Хлебанарыхтовачкі.

Бедната, цясней рады,
Прэч папы і гандляры!
Прэч, кулак, павук няволі,
Панаваць табе даволі!

Адышлі ўжо тыя годы,
Калі люд наш гараваў:
На ўсю вёску адны боты,
Хто жаніўся — надзяваў.

Пра брыгаду нашай Ніны
Грыміць слава на ўвесь край:
Са свайго сабрала поля
Стопудовы ўраджай.

Больш не вернецца ніколі
Жыццё цяжкае да нас,—
Мы заможныя ў калгасе,
Бальшавіцкім стаў калгас.

На малінніку весела
Ягадзінка ясная.
Не хачу жыцця другога,
Як жыцця калгаснага.

Выйдзі ў поле, глянь наўкола —
Мора жытняе шуміць.
Эй, як радасна, вясёла
У калгасе стала жыць.

У калгасе клуб і яслі,
Скрозь электрыка гарыць.
Добра, весела жывецца —
Яшчэ лепей будзем жыць.

Шырэй, вуліца, раздайся,
Трактарам дарогу дай.
Мы змагацца будзем дружна
За высокі ўраджай.

Ой, на небе, ясным небе
Выплыў месячык-юнак.
Сёння на палях калгасных
Гаспадар — былы батрак.

На калгаснай дружнай працы
Самі песні творацца.
У нас весела жывецца
І работа спорыцца.

Па-над вёскай песня льецца,
Як рака бурлівая.
Дзякуй партыі ад сэрца
За жыццё шчаслівае.

Беларусь, мая старонка,
Край мой вольны, дарагі,
Ты ідзеш наперад гонка,
Нясеш Леніна сцягі.

Богу я раней малілась,
Бабай цёмнаю была.
А цяпер паразумнела:
Кнігі Леніна ўзяла.

Рэлігійныя абрады
Забываюцца навек.
Без папоўскага дурману
Жыве вольны чалавек.

Я вазьму платок у рукі,
Разганю ў полі туман,
Мы дазналіся з навукі,
Што рэлігія — дурман.

Дзед старэнькі ля парога
Заявіў: «Не веру ў бога.
Не Хрыстос даў хлеб для нас,
А машына і калгас».

Спадзяецца хто на «неба»,
Той застанецца без хлеба.
Мы навуку паважаем,
Значыць, будзем з ураджаем.

Ад папоўскага дурману
Адвучыла школа нас.
Мы не верым больш у бога,
Шчасце нам прынёс калгас.

Разлівайся, разлівайся,
Рэчанька шумлівая.
Стала нашая жанчына
Вольная, шчаслівая.

Звонкай радасцю багата
Юнасць гаварлівая.
Мы, савецкія дзяўчаты,—
Самыя шчаслівыя.

Сабірайцеся, падружкі,
Песню звонкую спяём,
З новым ленінскім законам
К камунізму мы ідзём.

Раней я была батрачкай,
Быў нямілы белы свет;
А сягоння дэпутаткай
Выбіраюць у Савет.

Будзем пільна, як чэкісты,
Край савецкі вартаваць,
Ні шпіёны, ні фашысты
Нас не здолеюць зламаць.

Узвівайся, сцяг чырвоны,
Смела мы ідзём за ім.
За свабоду, за Саветы
Жыццё й сілы аддадзім.

Калі зноў вайна пачнецца,
Пойдзем мы з табой у бой,
Ты — чырвоным камандзірам,
Я — чырвонаю сястрой.

Скора з гонарам я буду
Камбайнёркай працаваць,
А мой мілы скора будзе
Гордым сокалам лятаць.

Я ў калгасе працавала,
Поле трактарам арала.
Сяду я на самалёт,
Зраблю смелы пералёт.

Мы вайны ліхой не хочам,
А на варце мы стаім.
Хай падлезе люты вораг,
Мы адпор ураз дадзім.

**Нашы мужныя героі родны край праславілі**

У сорак першым на граніцы
Немцы бомбы скінулі,
Вілі, альберты і фрыцы
На наш край нахлынулі.

Сквапны Гітлера сабакі
На калгасныя прысмакі,
Мы ж дадзім такога сала,
Каб калом у горле стала.

Неба хмарамі дыміцца,
Вецер соснамі гудзе,
Смелы кулі не баіцца
І ў баі не прападзе.

Ішлі немцы грабіць вёску,
Ішлі з аўтаматамі,
Партызаны частавалі
Немчуру гранатамі.

Ранкам ясным перад спёкай,
Сонца мыецца ў расе,
Немцу я за вока — вока,
А за зуб — вымаю ўсе.

Просіць фрыц, зайшоўшы ў хату,
— Матка, яйкі, матка, шпэк...
Я ж яму ражком у горла,
Падавіўся каб навек.

Афіцэр прыйшоў у хату,
Лезе ў печ ён з галавой,
А калгасніца Агата —
Па загрыўку качаргой.

Наляцелі немцы-каты
Папалілі нашы хаты,
Мы цяпер жывем у пушчы,
Днём і ноччу катаў трушчым.

Колькі лесам не хадзіла,
Усё кусты арэхавы;
Колькі хлопцаў не любіла,
Усе на фронт паехалі.

Колькі ягад я сабрала,
Чорненькай смародзіны;
На зашчыту хлопцы сталі,
Патрыёты Родзіны.

Падружачка дарагая,
Дзе ж то нашы сокалы?
— На іх шэрыя шынелі,
Паясы шырокія.

*

Падруга мілая мая,
Ці чула пра мілёначка —
У яго цяпер пагоны,
На пагонах зорачкі.

*

Мой мілёначак на фронце
І не першы ўжо раз,
Б'е фашыстаў там няшчадна,
Апраўдаў ён мой наказ.

*

Дзевачкі, мароз, мароз,
Ёлачкі аб'інелі,
А мой міленькі ў баі
Стаіць на першай лініі.

Ой, падружка дарагая,
Табе навасці нясу,
Твой мілёнак чарнабровы
Ляжыць ранены ў лясу.

Я, бывала, прыпявала,
А цяпер ўжо не пяю;
Калі трэба раненым
Дык вазьміце кроў маю.

Зламаю ветку-вінаградку,
Зламаю я смародзіну;
А мой мілы ў партызанах
Зашчышчае Родзіну.

Партызан як прыдзе ў хату,
Стаўлю я на стол харчы,
Бо гатова, нібы брату,
Партызану памагчы.

Наша хата — лес зялёны,
Бліндажы і шалашы,
Смела наш баец чырвоны
Немцаў-ворагаў глушы.

І пад Мінскам і пад Брэстам,
Ля Вілейкі, ля Свянцян
Не знаходзіць немец месца
Ад удараў партызан.

Мы на Пцічы, мы на Сожы,
На Вілейцы, на Дзвіне
Білі, б'ем салдат варожых
Па загрыўку, па спіне.

Выйшлі немцы на засаду,
Каля лесу заляглі,
А мы іх, фашысцкіх гадаў,
Прыкавалі да зямлі.

Цераз рэчку быструю
Немец мосцік выстраіў,
Партызаны падышлі,
Мост ўзарвалі і пайшлі.

Партызанская работа —
Немцам гора і турбота:
Што ні ноч, то пад адхон
Пушчан новы эшалон.

Немцы ладзілі засаду,
Выбіралі хмызнякі,
Падпаўзлі да іх мы ззаду
Ды ударылі ў штыкі.

Ночка цёмная без зорак,
Як магу цябе забыць,
Калі гэтай ночкай цёмнай
Пайшоў немцаў я глушыць.

Нарачанскія туманы
Засцілаюць берагі,
Б'юць нямецкіх акупантаў
Партызаны-рыбакі.

Нарач-возера, як мора,
Не убачыш берагоў.
Бараніць свае прасторы
Кожны верны сын гатоў.

На ўзбярэжжах на разлогіх
Чараты — куды ні глянь.
Хочуць фрыцы запалохаць
Нас, свабодных нарачан.

Ды нямецкія загады,
Не застрашаць рыбакоў:
Забіраем аўтаматы,
Выплываючы на лоў.

Закідаем падвалокі,
Не зважаем на загад —
Немца ўтопім у затоках,
Як у лужыне шчанят.

Пойдзеш, мілы, ў партызаны,
Вазьмі мяне ваяваць:
Будзеш біць ты з кулямёта,
Я — патроны падаваць.

Прыйшоў немец па пасаг
З аўтаматам у руках,
Куляй і гранатаю
Немца я пасватаю.

Сэрца б'ецца і сумуе,
Жаль мне сэрца роднага —
Палюбіла партызана,
Мсціцеля народнага.

Ў партызаны паступіла,
Красну лентачку нашу,
Партызана палюбіла,
Партызанам даражу.

Я надзену шынель шэры,
Шапачку-вушаначку,
Пазнавай жа, мой міленькі,
Сваю партызаначку.

А мой мілы партызан,
А я — партызаначка,
У кавалерыю мы пойдзем —
Баявая парачка.

Разышоўся Вільгельм Кубэ:
— Беларусь — калонія!
Партызаны міну ў бок —
І ўся цырымонія.

Паліцай на казе
Самагонку вязе,
Яму куля ўздагон —
І душа з яго вон.

Дождж ідзе, дождж ідзе,
На вуліцы слізка.
Уцякайце, паліцаі,
Партызаны блізка.

Паліцэйскія сабакі,
Куды будзеце ўцякаць?
Скора вас фашысты кінуць,
Мы не будзем вас прымаць.

Ой, не спіць Адольф-скаціна,
Гебельсу маркоціцца.
Іх ваенная машына
У канаву коціцца.

Не хавайся, Гітлер-вораг,
Ўсюды мы цябе знайдзём,
Мы упэўнены, што скора
Усіх фашыстаў пераб'ём.

Як ты, Гітлер, не старайся,
Ўсюды справы твае — «швах»,
Ты Расію не раскусіш,
Бо арэх не па зубах.

З неба зорачка упала,
Яшчэ многа упадзе,
Многа Гітлеру папала,
Яшчэ болей пападзе.

Ах ты, Гітлер касавокі,
Ненавісны вораг мой,
Бацьку вывез у няволю,
Засталась я сіратой.

Сядзіць Гітлер на асіне,
Богу моліцца балван:
— Памажыце, ўсе святыя,
Пакарыці партызан!

Тэлеграму з таго свету
Прыслаў Гітлеру Кубэ:
— Прыязджай, мой родны фюрэр,
Мне тут сумна без цябе.

Пачуў Гітлер у Берліне,
Што ён скора ўжо загіне,
Падхваціў свае манаткі
І ўцякае без аглядкі.

Не садзіце на машыну
На машыну сінюю —
Не вязіце вы мяне
Ў Германію сілаю.

Надаелі мне дубы,
Сосны надакучылі:
Фрыцы сэрца пераелі,
«Бобікі» замучылі.

Надаела пайка хлеба,
І салома мятая.
Да чаго ж нам надаела
Тут жыццё праклятае.

Ты, машына паравая,
Адвязі мяне дамой,
Мне фашысцкая старонка
Аказалася турмой.

Калі б знала, ведала,
На вайну б паехала,
На вайну, у самы бой,
Дзе ваюе мілы мой.

Найдзі, хмара, найдзі, гром,
І разбі фашысцкі дом,
За каменнаю сцяной
Забі Гітлера стралой.

Ты кукуй, кукуй, зязюля,
На зялёнай на мяжы,
Ты ляці стралою, куля,
Чэрап фрыцу праніжы.

Стаіць бяроза над ракой,
Галіначка хістаецца,
А мой мілы ў партызанах
З фрыцамі змагаецца.

На ігрушы спеюць грушы,
А на дубе — жалуды,
Вытрасае з катаў душу
Мой мілёнак малады.

Выйдзем ноччу, дзевачкі,
Станем на узгорачкі,
Можа, ўбачым на усходзе
Крамлёўскія зорачкі.

Немчуру не раз мы білі
Ды пра ўсё яны забылі;
А на гэты, відаць, раз
Будуць вечна помніць нас.

Нашы мужныя героі
Родны край праславілі,
Пасярод Германіі
Чырвоны сцяг паставілі.

**Адышла вайна-навала...**

Адышла вайна-навала,
Адгрымеў суровы бой.
Сонца светлае заззяла
Над краінай дарагой.

Мой мілёнак трактарыстам,
Водзіць трактар з краю ў край.
У вайну граміў фашыстаў —
Цяпер росціць ураджай.

Мілы мой прышоў з вайны,
Глянь на гімнасцёрачку:
Справа, злева ардэны
І Героя зорачка.

Ваня мой служыў танкістам,
Узнагароджан не раз быў,
А ў калгасе трактарыстам —
Новы ордэн заслужыў.

Мы фашыстаў разграмілі.
Перасталі ваяваць.
Едзем мы цяпер дадому
Край Саветаў будаваць.

Партызаны-партызаны,
Браты нашы родныя,
Вы геройскі ваявалі
За справы народныя.

Не грукочуць грозна пушкі,
Мы у працы, не ў баю.
У новых песнях і частушках
Славім Родзіну сваю.

Эх, цвіці, красуй навокал,
Беларускі родны край!
Хай звініць, расце высока
Наш савецкі ураджай.


*А. Паслядовіч.* Жанчынкі

Дзе снарадныя варонкі
Сум наводзілі на нас,
З пераможнай песняй звонкай
Падымаем мы калгас.

Быў любімы мой танкістам,
Біў фашыстаў на вайне,
А цяпер ён трактарыстам
Норму выканаў ўтрайне.

Дзе я біла подлых фрыцаў
За савецкую зямлю,
Там цяпер я жну пшаніцу,
Лён высокі цераблю.

Хай іскрыцца, каласіцца
Буйным коласам ячмень,
Залацістая пшаніца
Хай пяе пра новы дзень!

Разлятайся песняй, слава:
За ўраджай пайшоў калгас,
Каб Савецкая дзяржава
Багацела кожны час...

Харашо у нас ў калгасе,
Проста горад, не сяло:
Маем школу, клуб і яслі,
Электрычнае святло.

Сонца ўсходзіць камунізма,
Сонца ўсходзіць яснае.
Слава партыі любімай
За жыццё калгаснае.

Грай, баян, спявай, падружка,
Пра жыццё калгаснае.
Склалі мы свае частушкі
Новыя, сучасныя.

У калгасе клуб і яслі,
Скрозь электрыка гарыць.
Добра, весела жывецца,
Яшчэ лепей будзем жыць.

Расцягні гармонь, таварыш,
З медзянымі гукамі,
З агратэхнікаю дружым —
Вернаю навукаю.

Працавалі ўсе як трэба,
Будзем лепей працаваць,
Будзеш ты багата хлебам,
Родная айчына-маць.

Зоры, зоры, зоры ў небе
Залатымі роямі.
Будзе гэты год багаты
Новымі героямі.

Ярка ззяюць над зямлёю
Зоркі жнівеньскіх начэй.
А у нашых у герояў
Зоркі ззяюць шмат ярчэй.

Аднавілі мы на дзіва
Нашы сёлы, гарады,
Жывём весела, шчасліва,
Ззяе сонца нам заўжды.

Мы балота асушаем
Да камуны наш узлёт,
Ураджайнасць павышаем
Дзень ад дня і з году ў год!

На балотах на палескіх
Будзе слаўны ураджай;
Хто не верыць нашай славе —
Падзівіцца прыязджай!

Ой, прыедзьце, падзівіцесь,
Як нам добра стала жыць:
Над калгасам кожны вечар
Электрычны свет гарыць.

Мы знайшлі сваю дарогу
К шчасцю, радасці і славе,
Што нам трэба, усё ёсць —
Слаўся наша маладосць.

Кветкі ў полі завіліся
І ў вачах іскрыцца май.
Камсамольцы ўзяліся
Павышаць наш ураджай.

Куды едзем, куды йдзём,
Песні радасці пяём.
Не ведаем перашкод,—
Камсамол — такі народ!

Калі хочаш у калгасе
Мець высокі ўраджай,
Дык з брыгадаю у поле
Спазаранку выязджай.

Я пайду гуляць на рэчку,
На лужочку кветкі рваць.
Шанаваць калгас я буду
І старанна працаваць.

Нашы рукі не дрыжаць —
Не такія людзі.
Добра сеялі, а жаць
Яшчэ лепей будзем.

Мы заможна і культурна
У калгасе ўсе жывём.
Цвёрдым крокам к камунізму
Разам з партыяй ідзём.

Калі хараша жывецца,
Песня весела пяецца.
Мы ж вось весела пяём —
Значыць хараша жывём.

Шуміць ніва залатая...
Эх, якая шырыня!
Я дзяўчына баявая —
Камбайнёркай буду я!

Працай дружнай і руплівай
Наш праславіўся калгас:
Усе культурна і шчасліва
Сталі жыць цяпер у нас.

Ой, шчаслівa наша доля!
Грыміць слава на ўвесь край:
Мы штогод збіраем з поля
Стопудовы ураджай.

Ой, падружка, радасць маю —
Трактарыста я кахаю,
Так сказаў мне мілы мой:
«Буду сватацца зімой».

Працай дружнай і руплівай
Наша славіцца звяно.
Наша ніва — ўсім на дзіва:
Што ні колас — паўкіло!

Грай, баян! А ну, падружкі,
Пра жыццё пра шчаснае
Прапяём свае частушкі,
Новыя, калгасныя.

У калгасны новы дом
Ходзім мы на спеўкі,
Зараз мы пра наш калгас
Прапяём прыпеўкі.

Наш калгасны старшыня,
Ён з народам раіцца,
І таму калгас багаты
Ураджаем славіцца.

**Дружна мы сям'ёй рашылі...**

Дружна мы сям'ёй рашылі,
Каб калгасы аб'яднаць,*
Бо на тым шырокім полі
Будзе лепей працаваць.

Выйду, выйду на прыволле,
Пагляджу на свой калгас,—
Ой, шырока наша поле,
Стала шырай ў многа раз.

Паплывуць па ім камбайны,
Пацячэ зярно ракой,
Мы памножым працай дбайнай
Моц Радзімы дарагой.

**Песня коціцца над светам...**

Песня коціцца над светам,
Твары ўсмешкай свецяцца,
Што савецкая ракета
Дасягнула Месяца.

Сабірайцесь, хлопцы, дзеўкі,—
Свецяць зоры ясныя.
Заспяваем мы прыпеўкі,
Новыя, сучасныя.

На калгаснай дружнай працы
Самі песні твораца.
У нас весела жывецца
І работа спорыцца.

Вецер песні мне спявае,
Сонца грае з раніцы.
Я старанная ў калгасе —
Лепшая ўдарніца.

* Кожныя два радкі паўтараюцца двойчы.

Выйдзі ў поле, глянь наўкола —
Мора жытняе шуміць.
Эх, як радасна, вясёла
У калгасе стала жыць.

Эй, пайду я танцаваць,
Запяю прыпевачкі.
Заўтра еду я вучыцца,
Да сустрэчы, дзевачкі.

Лён высокі, лён зялёны
Зацвітае за сялом.
Не патрэбны нам іконы,
Камуністамі расцём.

Не іконы ў маёй хаце,—
Вісіць Леніна партрэт.
Гэта ж Ленін даў нам шчасце,
Гэта ж ён даў людзям свет.

Не баімся мы вас, каты,
Не палохайце вайной,
Ёсць у нас ракет багата,
Маем атам грозны свой.

Працавіты наш народ
Усюды б'е рэкорды.
Крышыць наш атамаход
Лёд вайны халоднай.

Кажам мы: «Вайна не трэба,
Ну, навошта нам яна?
Хай сінее мірна неба,
Хай цвіце заўжды вясна».

Нам калгаснае жыццё
Вельмі спадабалася.
Не пужай, Амерыка,
Не на тых нарвалася.

Я ішла пад вечар лугам,
Роднаю дарожанькай.
Нада мною мільганула
Зорка спадарожніка.

У касмічную ракету
Чалавек савецкі сеў.
Славу партыі, Саветам
Мы спяваем шчыра ўсе.

Пейце, дзевачкі, прыпеўкі,
А я буду памагаць —
Скора, скора на планеты
Касманаўты паляцяць.

Кажа дзед сваёй бабулі:
— На цябе я не бурчу,
Не сварыся й ты, Настуля,
Бо на Месяц палячу.

А бабуля кажа дзеду:
— Не палохай ты, Іван,
Бо вазьму вось і паеду
Ад цябе да марсіян.

Ленінская партыя —
Партыя народная.
Наша новая Праграма —
Зорка пуцяводная.

Я працоўных абавязкаў
Многа на сябе бяру:
Радасць, шчасце камунізма —
Гэта справа нашых рук.

Аб народзе аб савецкім
Партыя клапоціцца.
Усё для шчасця чалавека
Ў нашым краі робіцца.

Разрасціся, дуб зялёны,
Ручаёчак, зазвіні,
Мы пяём і кожны шчасліў
Ў нашы ленінскія дні.

### Край родны

Краіна Саветаў
Усіх шчаслівей
І песні спявае
Усіх прыгажэй.

А песні пра тое,
Што весела жыць,
І партыі дзякуй
У песні гучыць.

Нас партыя родная
К шчасцю вядзе,
Пад ленінскім сцягам
Краіна ідзе.

Каб ворагам нашым
Патачкі не даць,
Сцяг Леніна будзем
Мацней мы трымаць.

Квітней жа, Радзіма,
Цвятамі вясны,
Мы — Леніна племя,
Радзімы сыны.

## ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ, ЗАГАДКІ

Ад ленінскай навукі мацнеюць розум і рукі.
Да шчасця і свабоды вядзе партыя народы.
Ленінаў запавет перарабляе ўвесь свет.
Ленінізм — просты шлях у камунізм.
Ленінскі запавет абляцеў увесь свет
Нам не страшна ў бядзе, бо нас партыя вядзе.
Заваявалі волю — знайшлі долю.
Дзе ўлада народа — там шчасце і свабода.
Не верыў бальшавікам, дык паверыў панскім бізунам.
Рэвалюцыя настала і жанчына вольнай стала.
Рэвалюцыя прыйшла, людзям шчасце прынясла.
Так уцякалі паны, што пагублялі жупаны.
Божая ласка не дасць нам ні хлеба, ні мяска.
Гонар і слава таму прыходзяць, хто на працы наперадзе ходзіць.
Гультая не трымай у сакрэце — крытыкуй яго ў газеце.
Дзе ўлада народа, там шчасце і свабода.
На бога спадзяешся — без кашулі астанешся.
Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму, хто ў справе стойкі.
Папы ды малебны нам больш не патрэбны.
Пра што некалі снілі, тое пры Саветах зрабілі.
Той бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць.
Хто без навукі, той як бязрукі.
Як не даражыць жыццём, калі да камунізма ідзём!
Якая заслуга, такая і пашана.
Якая справа, такая і слава.
Ад навукі галава не баліць.
Агранома хваляць не за белыя рукі.

Агранома хваляць не за плакаты, а затое, як багацеюць хаты.
Адзін жыў — хлеба прасіў, калектывам жывём — адзін аднаго ў госці завём.
Бацьку любі, старых паважай, здароўе беражы, а калгаснае дабро сцеражы.
Беражы зярнятка: пабагацее і калгас, і твая хатка.
Брыгадзір і капейкі не варт, калі чарачцы рад.
Добра працуем — калгас мацуем.
Закончыш жніво ўпору, будзе што вазіць у камору.
Калгас без уліку, што хата без дзвярэй.
Калі хочаш, каб быў ураджай, агратэхніку паважай.
Кулаку ад калгасных варот круты паварот.
Лянок не любіць лянот.
Славіцца хата не вугламі, а працаднямі.
Той калгас багат, у якім лад.
У калгасе працаваць — гора і бяды не знаць.
У калгасе якая работа, такая і плата.
Хто калгаснага не шануе, той і свайго не мае.
Хто круціць ды матае, таму на сходзе пападае.
Цяпер машыны не даюць людзям гнуць спіны.
Не будзе таго ніколі, каб жылі мы ў няволі.
Фашыстаў біць — Радзіму любіць.
Не давай праходу фрыцу — ратуй родную зямліцу.
Падняўся дзед Мінай,— фашыст, стрэльбу кідай.
Не мялі языком, а калі штыком.
Фашысцкую заразу знішчай адразу.
Не страшны дні суровыя, калі рады сталёвыя.
Прапаў, як фашыст пад Сталінградам.
Папала рыбка ў нерат — ні назад, ні наперад, зайшоў фашыст у Сталінград — ні наперад, ні назад.
Фашысты для нас магілу капалі, але самі ў яе папалі.
Будзе помніць вораг партызанскі порах.
Фашысцкі салдат — разбойнік і кат.
Гітлер прынёс такі рай, што хоць з голаду памірай.
Фашысцкі лад — пятля ды кат.
Сабака віляе хвастом, а Гебельс — языком.
Толку з «дучы», як з гнілой кучы.
Кубэ крута панаваў, ды скора і дуба даў.
Для прадажнай псіны — кол з асіны.
Для здрадніка хоць згары ўвесь свет, толькі б ён быў адзет.
Кожнай фашысцкай гадзіне вісець на перакладзіне.
Колькі, фашыст, не круці, а ад смерці не ўцячы.
Фашысцкаму ваяку рускі штык не да смаку.
Фашысцкаму грамілу — куля ў лоб і кол у магілу.

Даў фашысту ў рабро — зробіш сабе дабро.
Ішоў да нас ваякам, назад паўзе ракам.
Будзе часіна — дойдзем да Берліна.
Партызаны і там, партызаны і тут: скора Гітлеру капут.
Няпраўдай фашысты ўсю Еўропу заваявалі, але дамоў не папалі.
Пераступілі фашысты нашыя парогі, да паламалі свае ногі.
На Маскву ішлі з падскокам, а назад пакаціліся бокам.
Савецкая сіла — ворагу магіла.
Голас партыі — голас міру.
З дарогі нас ніхто не саб'е, калі партыя ўперад вядзе.
За камуністамі пайшлі, волю і шчасце знайшлі.
За партыяй ісці — у шчасці жыць і цвісці.
За камуністамі пойдзеш — свабоду знойдзеш.
Каб добра жыць, партыя вучыць шчыра рабіць.
Камуністы нас вялі, таму і свабоду знайшлі.
Мы мацнеем і расцём, бо за партыяй ідзём.
Новая Праграма ў камунізм вядзе прама.
Партыя — правадыр народных мас, усіх і кожнага з нас.
Партыі слова — усіх поспехаў аснова.
Партыя скажа — дарогу пакажа.
Партыя з намі — перамога за намі.
Промні сонца найцяплейшыя — словы партыі наймудрэйшыя.
Сіла партыі — у народзе.
Сіла партыі таму бязмерна, што яна народу верна.
Славе партыі крылляў не трэба.
Таму і добра жывём, што за партыяй ідзём.
Партыя адкрыла нам вочы, што сіла ў саюзе сялян і рабочых.
У камуністаў так водзіцца, што слова са справай не разыходзіцца.
Па запаветах Леніна ў камунізм ідзём упэўнена.
Пакуль людзі будуць жыць, будуць Леніна любіць.
Каб не ленінскае вучэнне, нам бы жыць было мучэнне.
Ленінская праўда — святлей за сонца.
Ленінскае слова — усяму аснова.
Слова Леніна не забудзецца, што завяшчаў ён, тое і збудзецца.
Словы Леніна збыліся — лепш у калгасе разжыліся.
Словы Леніна — роднае слова народа.
Сілу слова Леніна ўвесь свет ведае.
Той патрыёт, хто змагаецца за ленінскую справу і народ.
Ленінская праўда — мацней за атам.
Без ленінскіх запаветаў не было б улады Саветаў.
Ленінскі запавет — праўда на ўвесь свет.
Ленінскі запавет абляцеў увесь свет.
Ленінскі ўказ, што бацькоўскі наказ.
Леніна завет — на тысячу лет.

25 Зак. 3328

Адной рукой і вузла не завяжаш.
Без калектыву — жыццё нешчасліва.
Будучае пачынаецца сёння.
Добра вяроўка доўгая, а прамова кароткая.
Добры чалавек, параіўшы, не шкадуе.
Жаданая праца, як сонца ўзыход.
За агульным сталом яда смачней.
Калі праца — асалода, жыццё — харaство.
Калі ты мудры — перамажы мяне доказам.
Кожны чалавек свайго шчасця каваль.
Лета працуе на зіму, а зіма — на лета.
Ненадзейны друг страшней ядавітага ворага.
Не саромся пытаць — болей спытаеш, болей спазнаеш.
Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму, хто ў справе стойкі.
Не той наперадзе, што абагнаў, а той, што за сабой цягне.
Не хваліся план складаючы, а пахваліся год канчаючы.
Нагаварыў на мяшок, а справы — на вяршок.
Не той друг, што мёдам мажа, а той, што праўду ў вочы кажа.
Парады патрэбны і мудраму.
Праца робіць чалавека разумным.
Сам гінь, а таварыша выручай.
Там, дзе згода, заўсёды добрая пагода.
Той патрыёт, хто змагаецца за народ.
Дружная праца — крыніца багацця.
Мокра ў маі — будуць пышныя караваі.
На кульгавым кані далёка не заедзеш.
Не забягай з самахвальствам упярод — паслухай, што скажа народ.
Не ўсякаму слову вер, лепш на справе правер.
У калгасе брыгадзір, як на фронце камандзір.
У полі працу паважай — багаты вырасце ўраджай.
Хто аб усім пытае, той многа знае.
Хто любіць працаваць, той не будзе доўга спаць.
Хто старанна працуе, той мір мацуе.
Адукацыяй не кічысь, а ў народа вучысь.
Бачыць вока далёка, а розум — яшчэ далей.
Чым больш навукі, тым разумней рукі.
Абразы і малебны больш нам не патрэбны.
Ад сектанцкага вучэння гора ды мучэнне.
Без бога ясней дарога.
Без малення жнём і косім, у Ільі пагоды не просім.
Вера, бог, царква і звоны — усё старыя забабоны.
Конь любіць авёс, а поп — каб што прынёс.
Не бог памагае, а навука.
Не паможа кадзіла, калі хвароба зваліла.

Не чакай з неба дараванага хлеба.
Раней былі царква і віно — цяпер клуб і кіно.
Хто ўмее працай жыць, той не пойдзе маліцца і варажыць.
Цуды робяць людзі, а не святыя.
Што нам да неба, калі самі маем усё, што трэба.
Аб міру на зямлі дбаем, хоць звышмагутныя ракеты маем.
Прыняў прысягу — ад яе ні шагу.
Савецкая Армія не адзіна, з ёй уся наша краіна.
У савецкага тыла вялікая сіла.
Хто языком штурмуе — не шмат наваюе.
Глядзі, каб ад іх «халоднай вайны» ды не стала ім жа горача.
Добрым людзям мір, а шаленцам — галавою ў вір.
На савецкі каравай рот не разявай.
Нашы сябры — па ўсёй зямлі.
Птушцы — воля, чалавеку — мір.
Сёння, паночкі, не ваш кірмаш.
Без навук, як без рук.
Вучоны без практыкі — пчала без мёду.
Вучы народ, вучыся і ў народа.
Да чаго не дойдзеш, тое ў кніжцы знойдзеш.
Дзе няма ведаў, там не будзе смеласці.
Дыплом мае, а справай не ўладае.
Навука хлеба не просіць, а хлеб дае.
Не ганарыся званнем, а ганарыся ведамі.
Не кажы «вучыўся», а кажы, што пазнаў.
Не той многа ведае, хто доўга жыў, а той, хто многа вучыўся.
Новага добрага не дзічыся, а што не ведаеш — вучыся.
Умелыя рукі — памочнікі навукі.
Чалавек невучоны, як тапор нетачоны.

* * *

Не агонь, а чырвоным колерам гарыць, не птушка, а ў паднябессе ўзлятае, не ліхтар, а ўсім людзям шлях асвятляе. *(Крамлёўская зорка)*
Чырвоным колерам гарыць, над галовамі ўецца, заўсёды ўперадзе ідзе, як завецца? *(Сцяг)*
Плыве ў прасторы, ды не ў моры, караблём завецца, а ля зорак уецца. *(Касмічны карабель)*
Малыш-каратыш чыхае жарам, абдае варам, агнём дзьме, жалезам плюе. *(Пісталет)*
Па балоту ідзе, не тоне ў вадзе, ідзе праз рвы, але нежывы. *(Танк)*
Без языка жыве, не есць, не п'е, а гаворыць. *(Радыё)*
На страсе жораў сядзіць, у хаце на стале скрынка стаіць, у пакоі святло патушана, а ўвесь свет відаць. *(Тэлевізар)*

Без ног, а бяжыць, без голасу, а крычыць, вочы, як колы, ды не бачыць нікога. *(Аўтамабіль)*

У грудзях агонь гарыць, у жываце вар кіпіць, дымам дыхціць, парам пыхціць, хуценька бяжыць. *(Паравоз)*

Бяжыць па вадзе, а на кані не дагоніш. *(Параход)*

Што такое? Паляцела высока, не відаць вокам. *(Самалёт)*

Гудзе, як пчала, ляціць, як страла, крыламі не махае, хто адгадае? *(Самалёт)*

Крылы мае, высока лятае, людзей возіць, адпачынку не просіць. *(Самалёт)*

Конь стальны арэ, жне і косіць і есці не просіць. *(Трактар)*

Жалезны конь, у жываце агонь, есці (аўса) не просіць, арэ, жне і косіць. *(Трактар)*

Што гэта за машына, што разам жне і малоціць, а ідзе — ажно зямлю калоціць? *(Камбайн)*

Шуміць і стракоча ад ранку да ночы, па полі шагае, рукамі махае. *(Жняярка)*

Гусь па вуліцы ідзе, дзюбай вуліцу грызе. *(Экскаватар)*

У школе пражывае, шмат гаспадароў мае, што год іх мяняе і ўсім дапамагае. *(Парта)*

Сарока-белабока да хаты прыляцела, у парозе села, з-за мяжы і з усёй краіны прынесла навіны. *(Газета)*

Дваццаць два чалавекі забіць мяне хочуць; як заб'юць, адзінаццаць радуюцца, адзінаццаць сумуюць, а я жывы застаюся. *(Футбольны мяч)*

Лесам і полем ідзе, дзецям падаркі нясе, а прыходзіць раз у год — якраз пад Новы год. *(Дзед Мароз)*

# МЕТОДЫКА ЗБІРАННЯ ФАЛЬКЛОРУ

У заключнай прамове на Першым усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў А. М. Горкі звярнууся з заклікам да паэтаў і празаікаў, да шырокай грамадскасці: «Паўтараю: пачатак мастацтва слова — у фальклоры. Збірайце ваш фальклор, вучыцеся на ім...»

Вялікае значэнне фальклору ў жыцці народа патрабуе ад нас уважлівага вывучэння і збірання песень, казак, прыказак, прымавак, частушак і іншых жанраў вуснапаэтычнай творчасці.

Па-сапраўднаму разгарнуць гэту работу, наблізіць яе да патрэб сённяшняга дня можна толькі пры ўдзеле ўсёй нашай грамадскасці. Стварэнне шырокай сеткі пастаянных карэспандэнтаў, якія б збіралі фальклорныя матэрыялы, з'яўляецца адной з галоўных задач фалькларыстыкі.

Беларускі фальклор, багацце і высокі мастацкі ўзровень якога неаднаразова падкрэсліваліся многімі даследчыкамі, з даўніх часоў прыцягваў да сябе ўвагу.

У другой палове XIX і пачатку XX ст. былі выдадзены буйнейшыя зборнікі беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці: зборнікі песень і прыказак І. І. Насовіча, шматтамовыя выданні фальклору розных жанраў П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава, М. Федароўскага, Ул. М. Дабравольскага, зборнік казак А. К. Сержпутоўскага і многа іншых каштоўных прац.

Аднак у справе збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці і яе вывучэння мелі месца вялікія недахопы. У дарэвалюцыйных зборніках беларускага фальклору пераважаюць абрадавая паэзія, фантастычныя казкі, легенды, духоўныя вершы і г. д., а антыпрыгонніцкія творы займалі параўнаўча невялікае месца, што стварала памылковае ўяўленне аб ідэйным змесце беларускага фальклору. На самай жа справе беларускі народ, які на працягу многіх стагоддзяў вёў жорсткую барацьбу з прыгнятальнікамі, стварыў вялікую колькасць песень, казак, прымавак, накіраваных супраць

памешчыкаў, чыноўнікаў, духавенства і нават супраць рэлігіі і існаваўшага ладу наогул.

Дарэвалюцыйныя даследчыкі і збіральнікі беларускай вуснапаэтычнай творчасці не цікавіліся рабочым фальклорам, амаль не збіралі яго і зусім не друкавалі. Тэндэнцыйны падыход да народнай творчасці праявіўся і ў тым, што мы амаль не маем запісаў рэвалюцыйнай паэзіі часоў першай рускай рэвалюцыі, хаця дакументы сведчаць аб тым, што рэвалюцыйная песня шырока бытавала на Беларусі.

У працах некаторых дарэвалюцыйных даследчыкаў выказана няправільная думка, быццам бы беларускі народ не стварыў сваёй гістарычнай паэзіі, таму што не меў дзяржаўнасці. Гэтая прадузятая думка вельмі шкодна адбілася на збіральніцкай працы. Збіральнікі не шукалі гістарычных твораў, а калі яны ім трапляліся, адносілі іх ці да абрадавай паэзіі, ці да духоўных вершаў і г. д. Такім чынам, багатая гістарычная паэзія, у якой адлюстравалася гераічная барацьба беларускага народа супраць іншаземных захопнікаў, супраць сацыяльнага, нацыянальнага і духоўнага прыгнёту, заставалася па-за ўвагай многіх збіральнікаў і даследчыкаў.

Мала ўвагі звярталі збіральнікі і на частушкі. Іх лічылі непаўнацэннымі творамі, адзнакай распаду народнай песеннай творчасці. Гэтае зусім беспадстаўнае процістаўленне песень і частушак шкодна адбілася на збіранні важнага жанру беларускага фальклору.

За гады Савецкай улады работа па збіранню і вывучэнню беларускага фальклору набыла шырокі размах. Яна разгортвалася на прынцыпова новай аснове. Вядомае палажэнне марксісцка-ленінскай тэорыі, што народ з'яўляецца стваральнікам усіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, вызначыла напрамак работы фалькларыстаў. У даваенныя гады былі запісаны цікавыя творы, якія адлюстравалі новае жыццё свабоднага беларускага народа, яго любоў да сваёй Радзімы, да Камуністычнай партыі. У значнай ступені былі ліквідаваны недахопы ў збіранні дакастрычніцкага фальклору, напрыклад антыпрыгонніцкіх і антырэлігійных твораў, больш увагі было звернута на рабочы фальклор, а таксама на такі папулярны жанр народнай творчасці, як частушкі. У 30-х гадах быў выдадзены шэраг тэматычных зборнікаў беларускага фальклору. Пры сектары этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР быў створаны багаты архіў, а таксама вельмі каштоўная фанатэка. Але ўсе гэтыя матэрыялы загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

У час вайны і пасля яе значная работа была праведзена ў галіне збірання і вывучэння партызанскага фальклору. Каштоўныя матэрыялы сабраны ў розных жанрах гістарычнага эпасу беларускага народа. Але нават і ў гэтых галінах, якія былі ў цэнтры ўвагі збіральнікаў і даследчыкаў фальклору, патрэбна зрабіць яшчэ вельмі многа.

Улічваючы ўсю работу, якая была выканана па збіранню беларускага фальклору, наяўнасць як апублікаваных, так і архіўных фальклорных матэрыялаў і, галоўнае, найбольш надзённыя патрабаванні ў гэтай галіне, трэба

вызначыць асноўныя напрамкі, у якіх павінны зараз працаваць збіральнікі фальклору.

1. Трэба падкрэсліць важнасць збірання фальклорных твораў сучаснасці, твораў сённяшняга дня, у якіх ярка адлюстроўваюцца вялікія поспехі нашага народа ва ўсіх галінах жыцця, яго барацьба за мір ва ўсім свеце.

2. Вялікае навуковае і грамадска-палітычнае значэнне маюць фальклорныя творы першых год рэвалюцыі, асабліва рэвалюцыйная паэзія: гімны, песні, маршы, а таксама творы іншых жанраў. На Беларусі яшчэ з часоў першай рускай рэвалюцыі былі добра вядомы «Интернационал», «Смело, товарищи, в ногу», «Варшавянка» і іншыя рэвалюцыйныя песні, пад уплывам якіх народ складаў новыя творы той жа ідэйнай накіраванасці. Значная частка падобных твораў з цягам часу выпала з народнага рэпертуару, але ў памяці народа яны захоўваюцца і зараз.

3. Вялікай увагі патрабуе фальклор Вялікай Айчыннай вайны, у прыватнасці партызанскі фальклор.

Хаця, як было сказана, да гэтага часу сабрана ўжо значная колькасць вуснапаэтычных твораў часоў Вялікай Айчыннай вайны, многія матэрыялы яшчэ не запісаны.

4. У сувязі з ростам рабочага класа ў Беларусі, з стварэннем нацыянальных рабочых кадраў неабходна звярнуць значна больш увагі на рабочы фальклор, які займае важнае месца ва ўсёй народнай вуснапаэтычнай творчасці.

5. Разам з творамі сучаснасці трэба збіраць і дарэвалюцыйны фальклор, многія творы якога шырока распаўсюджаны зараз і з'яўляюцца ўзорамі высокага мастацкага майстэрства народа.

З дарэвалюцыйнага фальклору асобую ўвагу неабходна звярнуць на творы, у якіх адлюстравалася барацьба беларускага народа з сацыяльным і нацыянальным прыгнётам; яго імкненне да свабоды, да ўз'яднання з вялікім рускім народам, а таксама на гістарычную паэзію беларускага народа: песні, паданні, легенды і г. д.

Вызначэнне пералічаных галоўных напрамкаў у збіранні беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці зусім не азначае, што трэба збіраць толькі гэтыя творы, а ўвесь астатні фальклор можа заставацца па-за ўвагай збіральнікаў. Навуковае і грамадскае значэнне маюць усе сапраўды народныя па сваёй ідэйнай накіраванасці і высокамастацкія творы беларускага фальклору, незалежна ад іх жанру і часу стварэння. Усе іх і патрэбна збіраць.

## Падрыхтоўка да збірання фальклору

Збіральнік народнай творчасці павінен вывучыць раён, дзе ён вядзе запіс. Трэба пазнаёміцца з мінулым краю, ведаць гістарычныя падзеі, асобныя бітвы ў час войнаў, сялянскія паўстанні, рэвалюцыйны рух, а таксама

гістарычныя помнікі, старажытныя збудаванні, курганы і г. д. Абапіраючыся на гэтыя веды, у размове з насельніцтвам можна нагадаць той ці іншы факт і ў сувязі з ім запытацца, ці не склалася ў народзе паданне, песня, легенда ці які-небудзь другі твор, звязаны з гэтай падзеяй. Пры вывучэнні краю неабходна звярнуць увагу і на сучасны яго стан: эканамічнае развіццё, культурныя дасягненні і г. д. Вельмі карысна сувязь з калектывамі мастацкай самадзейнасці, у якіх не толькі выконваюцца, але часта і складаюцца новыя фальклорныя творы.

Увогуле трэба падкрэсліць навуковую каштоўнасць звестак аб самадзейных калектывах, якія зараз адыгрываюць важную ролю ў развіцці духоўнай культуры народа. Гісторыя калектыва мастацкай самадзейнасці, яго рэпертуар, лепшыя салісты і іншае патрабуюць нашай увагі.

Пры збіранні рабочага фальклору вельмі важна ведаць гісторыю прадпрыемства. Калі яно заснавана яшчэ ў дарэвалюцыйны час, трэба высветліць, калі, пад чыім кіраўніцтвам адбываліся маёўкі, забастоўкі, мітынгі, якія іншыя важныя падзеі мелі месца на гэтым прадпрыемстве. Падобная інфармацыя дапаможа збіральніку ў размовах з ветэранамі працы хутчэй атрымаць неабходныя звесткі аб распаўсюджанасці рэвалюцыйнай і рабочай паэзіі і яе характарыстыку.

Вопыт работы па збору рабочага фальклору сведчыць аб карыснасці сувязей з грамадскімі арганізацыямі прадпрыемства, рэдакцыяй ці рэдкалегіяй заводскай газеты, калектывам мастацкай самадзейнасці.

У падрыхтоўку трэба ўключыць і азнаямленне з этнаграфічнай літаратурай, таму што многія творы фальклору звязаны з народнымі звычаямі або абрадамі.

Не менш карысна вывучыць асаблівасці мясцовай гаворкі, што дазволіць збіральніку найбольш дакладна запісваць фальклорныя творы.

## Як запісваць фальклор

Перад тым, як гаварыць аб запісванні фальклорных твораў, неабходна спыніцца на патрабаваннях да запісаў. Думка аб тым, што ў запісах фальклорных твораў павінна быць адлюстравана душа народа, яго жыццё, мары і надзеі, узнікла даўно. Найбольш абгрунтавана яна была выказана М. А. Дабралюбавым у рэцэнзіі на зборнік А. Афанасьева «Народныя рускія казкі», дзе М. А. Дабралюбаў пісаў: «Нам казкі важныя болей за ўсё як матэрыялы для характарыстыкі народа».

У гэтым жа артыкуле М. А. Дабралюбаў патрабаваў ад збіральнікаў вуснай народнай творчасці не абмяжоўвацца простым запісваннем тэксту песні або казкі, а перадаваць і ўсю абстаноўку, як знешнюю, так і ўнутраную. Што гэта азначае практычна?

Сам па сабе фальклорны твор, хаця і ўяўляе вялікую мастацкую каштоўнасць і выказвае глыбокія думкі, не дае поўнага малюнка адносін народа

да гэтага твора. Ці верыць казачнік у сваю казку, ці сапраўды тая ці іншая песня — абрадавая, ці супадае паданне з рэчаіснасцю і многія іншыя пытанні патрабуюць адказаў. Таму збіральнік фальклору разам з запісаным творам павінен даць адказ на многія падобныя пытанні. Галоўныя з іх — гэта адносіны выканаўцы да твора і адносіны да твора слухачоў: сур'ёзныя, іранічныя, адмоўныя, станоўчыя і г. д. Такія заўвагі, калі іх абагуліць, дапамагаюць вызначыць гісторыю асобных жанраў ці груп фальклорных твораў. Так, заўвагі Е. Раманава, М. Федароўскага і іншых збіральнікаў беларускага фальклору другой паловы XIX ст. адносна пашыранасці, асабліва сярод моладзі, гумарыстычных і сатырычных казак, якія ўсё больш трывала ўваходзілі ў рэпертуар казачнікаў, не толькі характарызавалі змены ў казачным эпасе, але і наогул сведчылі аб павелічэнні ўдзельнай вагі рэалістычных твораў у беларускім фальклоры.

Важна ведаць, наколькі пашыраны той ці іншы твор, межы яго распаўсюджанасці, калі іх магчыма вызначыць.

У асобных выпадках у пэўную мясцовасць прыносяць з сабою творы людзі з іншых месц. Цікава высветліць, як гэтыя творы ўспрымаюцца, як уваходзяць у мясцовы рэпертуар: са зменамі ці цалкам захоўваюць свой першапачатковы выгляд.

Многія творы беларускай народнай паэзіі звязаны з пэўнымі абрадамі і звычаямі.

Добра, калі разам з абрадавымі песнямі збіральнік дае апісанне абрадаў, з якімі яны звязаны. Параўнанне сённяшніх запісаў з дарэвалюцыйнымі дасць магчымасць высветліць, якія элементы абрадаў больш устойлівыя. Вывучэнне гэтых з'яў дапаможа нам стварыць новыя абрады або падтрымаць тое карыснае новае, што ўзнікае ў народзе.

Пры запісах песень трэба абавязкова адзначыць, як тая ці іншая песня называецца ў народзе: калядная, вяснянка, калыханка, жніўная, талочная, шахцёрская і г. д.

Зараз на дапамогу збіральнікам павінна прыйсці сучасная гуказапісваючая апаратура. Але і ў гэтым выпадку, калі фальклорны твор, асабліва песня ў харавым выкананні, запісваецца на магнітафон, неабходна весці запісы ў сшытку ці ў блакноце. Такі запіс гарантуе дакладнасць тэксту, да якога збіральнік дадае ўсе неабходныя звесткі, аб якіх гаварылася вышэй.

Запісваць творы народнай паэзіі неабходна ад выканаўцы ў час выканання. Добры народны выканаўца — гэта сапраўдны мастак, які часта ідзе сваім шляхам і па сутнасці стварае свае ўласныя варыянты народных твораў. Ён уносіць у іх свой мастацкі густ, свае адносіны да той ці іншай з'явы, свой светапогляд. Але такое творчае выкананне патрабуе пэўных умоў. Ні ў якім разе нельга перабіваць выканаўцу пытаннямі, просьбамі спыніцца, паўтарыць той ці іншы радок, даваць яму няспынна адчуваць, што запісваецца кожнае яго слова. У гэтым выпадку замест добрага мастацкага твора мы можам запісаць сюжэтную схему, пераказаную сухой невыразнай мовай.

Калі ж збіральнік не паспеў запісаць асобныя месцы фальклорнага твора, ён іх павінен прапусціць, і толькі пасля таго, як выкананы ўвесь твор, можна папрасіць зноў паўтарыць яго. Запісваць трэба слова ў слова, захоўваючы ўсе асаблівасці мовы і манеру выканання.

Ні ў якім выпадку нельга апрацоўваць запісы, «падпраўляць» мову ці змест, бо гэтым самым знішчаецца ўсякая навуковая каштоўнасць работы. Запісваць творы трэба так, як чуе іх збіральнік. «Пісаць як чуеш» — гэта павінна быць правілам. Прытрымліваючыся яго, збіральнік перадасць не толькі змест, але і ўсе моўныя асаблівасці твора.

Захаванне галоўных дыялектных асаблівасцей: фанетычных, марфалагічных і лексічных — мае важнае навуковае значэнне. Пэўныя асаблівасці сведчаць аб старажытнасці ўзнікнення твора, іншыя дапамагаюць вызначыць месца яго ўзнікнення і г. д. Апрача гэтага, мясцовыя асаблівасці арганічна ўваходзяць у сістэму мастацкіх сродкаў твора.

Фальклорныя запісы робяцца ў адпаведнасці з існуючай зараз сістэмай графікі, звычайным беларускім алфавітам, які дазваляе перадаць усе адценні мовы. Можна запісваць і ў фанетычнай транскрыпцыі, але гэта больш складана. Трэба запісваць усе адступленні, уводныя эпізоды, а таксама рэплікі слухачоў. Абавязкова адзначаць месца знаходжання нацiску. Дыялектныя, мала пашыраныя словы неабходна растлумачыць. Пажадана такое тлумачэнне атрымаць ад самога выканаўцы твора ці ад слухачоў.

Запіс фальклорных твораў — цяжкая і складаная справа. Розныя фальклорныя жанры маюць свае асаблівасці.

Песня, як і ўсе творы, запісваецца ў час выканання, пасля чаго запіс правяраецца і ўдакладняецца пры паўторным выкананні ці пад дыктоўку выканаўцы. Песня падзяляецца на асобныя музычныя фразы, якія супадаюць з вершаванымі радкамі. Пры запісванні неабходна прытрымлівацца гэтага падзелу. Калі ёсць магчымасць, пажадана запісваць песню адначасова двума збіральнікамі. Пасля запісу тэкст звяраецца, а спрэчныя месцы высвятляюцца ў выканаўцы. Найбольш каштоўнымі з'яўляюцца запісы песень, дзе разам з тэкстамі даецца і мелодыя.

Больш складаным з'яўляецца запіс эпічных жанраў. Хуткі тэмп, у якім часам вядзецца расказ, не заўсёды дазваляе запісаць яго слова ў слова. Пры паўторнай перадачы твора казачнік рэдка прытрымліваецца яго першапачатковага тэксту. Таму, калі празаічны тэкст немагчыма запісаць поўнасцю, можна першыя сказы запісаць поўнасцю, стараючыся захаваць у іх мясцовыя асаблівасці мовы, а далей запісваць скарочанымі словамі. Скарачаць можна толькі вядомыя словы, якія часта ўжываюцца ў творы. Мастацкія прыёмы (паралелізмы, параўнанні і г. д.) і ў гэтым выпадку неабходна запісваць цалкам. Пажадана як можна шырэй выкарыстоўваць пры фальклорных запісах магнітафон.

Калі песні, казкі, частушкі можна запісваць, папярэдне падрыхтаваўшыся да гэтага, то так званыя «малыя» жанры: прыказкі, прымаўкі, загадкі — запісаць значна цяжэй. Яны не выконваюцца, а ўжываюцца амаль усім на-

сельніцтвам, прадбачыць загадзя іх ужыванне ў мове немагчыма. Таму збіральніку гэтых жанраў трэба быць надзвычай уважлівым да народнай мовы. Адны і тыя ж прыказкі і прымаўкі звычайна ўжываюцца ў розных выпадках, набываюць розны сэнс, у сувязі з гэтым іх неабходна запісваць у кантэксце, гэта значыць разам з іншымі словамі або сказамі, каб было зразумела, якую думку падкрэсліваў ці абагульняў чалавек. Калі тая ці іншая прыказка або прымаўка ўжыта ў пэўным сэнсе і вядома, што яна ўжываецца і ў іншых выпадках, неабходна падкрэсліць гэта. Разам з загадкай трэба запісваць і адгадкі, якіх да адной загадкі можа быць некалькі. Звычайна песні, частушкі, казкі, легенды, народная драма, сказы маюць варыянты, гэта значыць блізкія па змесце, па ідэйных і мастацкіх асаблівасцях творы, якія часам адрозніваюцца паміж сабой двума-трыма словамі або радкамі. У іншых выпадках гэтыя адрозненні бываюць больш істотнымі. Калі запісан твор і ёсць яго варыянты, неабходна запісваць і іх.

## Пашпартызацыя фальклорных запісаў

Запіс фальклорнага твора набывае навуковую каштоўнасць толькі тады, калі ён мае падрабязную пашпартызацыю. Вядома, што фальклорныя запісы з'яўляюцца не толькі мастацкімі творамі, але і матэрыялам для даследаў прадстаўнікоў розных галін навукі: фалькларыстаў, літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў, гісторыкаў, энтографаў, мастацтвазнаўцаў і інш. Для навуковых даследаў трэба ведаць час, месца запісу, ад каго запісана і многія іншыя звесткі. Таму да кожнага запісу фальклорнага твора неабходна дадаць наступнае:

1) звесткі аб асобе, якая запісала твор: прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, адукацыя, прафесія, адрас;

2) дату запісу;

3) месца запісу твора: вобласць, раён, вёска, калгас, горад, завод, навучальная ўстанова;

4) звесткі аб асобе, ад якой запісаны твор: прозвішча, імя, імя па бацьку, узрост, нацыянальнасць, прафесія, адукацыя, адрас.

Калі высвятляецца, што асаблівасці біяграфіі выканаўцы мелі пэўны ўплыў на яго рэпертуар, трэба адзначыць і гэтыя з'явы. Напрыклад, чалавек, які доўга жыў у другой мясцовасці, можа прынесці з сабой творы, якія ён успрыняў там. Гэтыя творы могуць набыць пашырэнне ў новым месцы (так, напрыклад, распаўсюджваліся ў Беларусі салдацкія песні) і могуць застацца толькі здабыткам гэтай адной асобы. Такія факты маюць значную навуковую цікавасць;

5) ад каго выканаўца пераняў твор.

Да пашпарта дадаюцца звесткі, аб якіх было сказана раней у раздзеле «Як запісваць фальклор»: аб распаўсюджанасці твора, сувязі з гістарычнымі падзеямі, абрадамі і г. д.

Пашпартызацыю павінны мець і магнітафонныя запісы. Перад тым, як пачаць запісы фальклорных твораў, збіральнік запісвае на стужцы ўсе асноўныя звесткі, што ўваходзяць у пашпарт фальклорнага твора: хто вядзе запісы, дзе, калі і ад каго. Перад кожным творам абʼяўляецца яго назва і жанравая прыналежнасць. У канцы запісаў, зробленых ад аднаго выканаўцы або ў адным населеным пункце, пашпарт паўтараецца. Да кожнай магнітафоннай стужкі прыкладаецца вопіс твораў, якія на ёй запісаны ў парадку іх выканання.

# СПІС СКАРАЧЭННЯЎ

| | |
|---|---|
| *Барышаў, Саннікаў* | *Барышаў Г. І., Саннікаў А. К.* Беларускі народны тэатр батлейка. Мінск, 1962. |
| Беларусь у нар. тв-ці | Дарэвалюцыйная і Савецкая Беларусь у народнай творчасці. Пад рэдакцыяй Я. Коласа і М. М. Нікольскага. Мінск, 1938. |
| Бел. жарты | Беларускія жарты. Мінск, 1915. |
| Белорусские песни | Белорусские песни, собранные И. И. Носовичем. Записки ИРГО по отделению этнографии, т. 5. Спб., 1873. |
| Бел. песні | Беларускія народныя песні. Запіс М. Чуркіна. Мінск, 1959. |
| Бел. народ... | Беларускі народ супраць папоў і рэлігіі. Мінск, 1939. |
| Бел. фальклор... | Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Мінск, 1961. |
| Бел. эпас | Беларускі эпас. Пад рэдакцыяй П. Ф. Глебкі і І. Гутарава. Мінск, 1959. |
| *Бессонов* | *Бессонов П.* Белорусские песни. М., 1871. |
| *Gawrońska.* | *Gawrońska.* B. Piesni ludowe ziemi Wileńskiej i Nowogródzkiej. Wilno, 1935. |
| *Грынблат* | *Грынблат М.* Песні беларускага народа, т. 1. Мінск, 1940. |
| *Дмитриев* | *Дмитриев М.* Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края. Вильна, 1869. |
| *Добровольский*, ч. 1 | *Добровольский В. Н.* Смоленский этнографический сборник, ч. I. Спб., 1891. |
| *Добровольский*, ч. 4 | *Добровольский В. Н.* Смоленский этнографический сборник, ч. IV. М., 1903. |
| *Довнар-Запольский* | *Довнар-Запольский М.* Песни пинчуков. вып. I. Киев, 1895. |
| Жанчына ў бел. тв-ці | Жанчына ў беларускай народнай творчасці. Пад рэдакцыяй М. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата. Мінск, 1940. |
| *Zienkiewicz* | *Zienkiewicz R.* Piosenki gminne ludu Pinskiego. Kowno, 1851. |
| *Кабашнікаў, Цішчанка* | *Кабашнікаў К. П., Цішчанка І. К.* Беларускія частушкі. Мінск, 1960. |

| | |
|---|---|
| *Каминский* | *Каминский В. А.* Белорусы Ново-Александровского уезда. Филологические записки Воронежского университета, вып. V. Воронеж. 1910. |
| *Калеснік* | *Калеснік У.* Рэвалюцыйныя песні былой Заходняй Беларусі.— «Полымя», 1956, № 9. |
| *Киркор* | *Киркор А.* Заметки о западной части Гродненской губернии. Этнографический сборник, вып. III. Спб., 1858. |
| *Косич* | *Косич М.* Литвины-белорусы Черниговской губернии. Живая старина. Спб., 1901, вып. III—IV. |
| Ленін у бел. тв-ці | У. І. Ленін у беларускай народнай творчасці. Мінск, 1967. |
| *Малевич* | *Малевич С.* Белорусские народные песни. Спб., 1907. |
| Нар. тв-ць | Народная творчасць. Укладальнік С. І. Васілёнак. Мінск, 1940. |
| *Никифоровский* | *Никифоровский М. Я.* Белорусские песни-частушки. Вильна, 1911. |
| Песні бел. народа | Песні бел. народа, т. І. Пад рэдакцыяй М. М. Нікольскага і М. Я. Грынблата. Мінск, 1940. |
| *Радченко* | *Радченко З.* Гомельские народные песни. Спб., 1888. |
| *Романов*. Материалы... | *Романов Е. Р.* Материалы по этнографии Гродненской губернии, вып. І. Вильна, 1912. |
| *Романов*, вып. 1-2 | *Романов Е. Р.* Белорусский сборник, т. І, вып. І-ІІ. Киев, 1886. |
| *Романов*, вып. 3 | *Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. III. Витебск, 1887. |
| *Романов*, вып. 5 | *Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. V. Витебск, 1891. |
| *Романов*, вып. 6 | *Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. VI. Могилев, 1901. |
| *Романов*, вып. 8 | *Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. VIII. Вильна, 1912. |
| *Сахараў* | *Сахараў С. П.* Народная творчасць латгальскіх і ілкустэнскіх беларусаў, вып. І. Рыга. 1940. |
| *Сержпутоўскі* | *Сержпутоўскі А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета. Л., 1926. |
| Сучасны фальклор | Сучасны беларускі фальклор. Склаў І. В. Гутараў. Мінск, 1963. |
| Сучасныя песні... | Сучасныя народныя песні і частушкі. Гомель, 1955. |
| *Тэраўскі* | *Тэраўскі*. Беларускі лірнік. Берлін, 1922. |
| *Federowski*, t. 3 | *Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej, t. III. Kraków, 1903. |
| *Federowski*, t. 5 | *Federowski M.* Lud białoruski.., t. V. Warszáwa, 1950. |
| *Цітовіч* | *Цітовіч Г.* Песні беларускага народа. Мінск, 1959. |
| *Чуркін* | *Чуркін Н.* Беларускія народныя песні і танцы. Мінск, 1949. |
| *Czeczot* | *Czeczot I.* Piosinki wieśniacze z nad Niemna i Dzwiny... Wilno, 1846. |

| | |
|---|---|
| *Шейн*. Бел. песни | *Шейн П. В.* Белорусские песни. Спб., 1873. |
| *Шейн*, т. 1, ч. 1 | *Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. т. I, ч. I. Спб., 1887. |
| *Шейн*, т. 1, ч. 2 | *Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. I, ч. II, Спб., 1890. |
| *Шейн*, т. 2 | *Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. II. Спб., 1893. |
| *Шейн*, т. 3 | *Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. III. Спб., 1902. |
| *Ширма*. Двести песен | *Ширма Г. Р.* Двести белорусских народных песен. М., 1958. |
| *Шлюбскі* | *Шлюбскі А.* Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны, т. I. Мінск, 1927. |
| *Шырма*. Бел. песні... | *Шырма Р. Р.* Беларускія народныя песні, загадкі, прыказкі. Мінск, 1974. |
| *Шырма*, т. 1 | *Шырма Р.* Беларускія народныя песні, т. 1. Мінск, 1959. |
| *Шырма*, т. 2 | *Шырма Р.* Беларускія народныя песні, т. 2. Мінск, 1960. |
| *Шырма*, т. 3 | *Шырма Р.* Беларускія народныя песні, т. 3. Мінск, 1962. |
| *Ялатаў* | *Ялатаў В. І.* Ад песні да песні. Мінск, 1961. |
| *Янкоўскі* | *Янкоўскі Ф.* Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы. Мінск, 1962. |

# ЗМЕСТ-ПАКАЗАЛЬНІК *


| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* ** |
|---|---|---|
| 5 | **Ад складальнікаў** | |
| 7 | **Уводзіны** | |
| 9 | **Асаблівасці і значэнне вуснапаэтычнай творчасці** | |
| 19 | **Заснавальнікі марксізма-ленінізма аб фальклоры і рэвалюцыйнай паэзіі** | |
| | К. Маркс | |
| 19 | Уводзіны (з эканамічных рукапісаў 1857—1858 гадоў) | *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., изд. 2-е, т. 12, с. 736—738 |
| | Ф. Энгельс | |
| 20 | Нямецкія народныя кнігі | *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., изд. 1-е, т. 2, с. 26—34 |
| 23 | З працы К. Маркса «Канспект кнігі Льюіса Г. Моргана «Старажытнае грамадства» | Архив К. Маркса и Ф. Энгельса, т. 9. М., 1941, с. 45 |
| 23 | З артыкула Ф. Энгельса «Ландшафты» | *Маркс К., Энгельс Ф.* Соч., изд. 2-е, т. 41, с. 75—76 |
| | У. І. Ленін | |
| 23 | Еўгеній Пацье (Да 25-годдзя яго смерці) | *Ленін У. І.* Творы, т. 36, с. 190—191 |
| | У. І. Ленін | |
| 25 | Развіццё рабочых хораў у Германіі | *Ленін У. І.* Творы, т. 36, с. 192—193 |
| 26 | З артыкула У. І. Леніна «Крытычныя заметкі па нацыянальнаму пытанню» | *Ленин В. И.* Полн. собр. соч. Изд. 5-е, т. 24, с. 113—150 |
| 26 | З прамовы У. І. Леніна на III Усерасійскім з'ездзе Расій- | *Ленин В. И.* Полн. собр. соч. Изд. 5-е, т. 41, с. 304—305 |


* Склала Г. А. Пятроўская.

** Крыніцы даюцца у скарачэнні (гл. с. 789).

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| | скага Камуністычнага Саюза Моладзі «Задачы саюзаў моладзі» | |
| 26 | У. І. Ленін аб вуснай народнай творчасці | *Бонч-Бруевич В. Д.* Ленин об устном народном творчестве.— «Советская этнография», 1954, № 4, с. 117—134 |
| 30 | **Пісьменнікі і дзеячы культуры аб вуснай народнай творчасці** | |
| 30 | В. Р. Бялінскі | *Белинский В. Г.* Полн. собр. соч., т. 5, с. 328 |
| 30 | М. А. Дабралюбаў | *Добролюбов Н. А.* Собр. соч., т. 3. М.— Л., 1962, с. 232—238 |
| 31 | М. Г. Чарнышэўскі | *Чернышевский Н. Г.* Полн. собр. соч., т. 2, с. 297—298 |
| 32 | Максім Горкі | *Горький М.* О литературе. М., 1953, с. 698, 703 |
| 32 | П. М. Шпілеўскі | «Современник», 1853, № 7, с. 13—14 |
| 33 | Аляксандр Рыпінскі | Białorus. Pariz, 1840, с. 27 |
| 33 | Ян Чачот | Dzieje folklorystyki Polskiej 1800—1863. Warszawa, 1970, s. 214 |
| 33 | Ігнат Храпавіцкі | Rubon, 1845, № 5, 8, 61, 69 |
| 34 | Адам Міцкевіч | *Mickiewicz A.* Dzieła wszystkie, t. 16, s. 230 |
| 34 | Уладзіслаў Сыракомля | Gazieta Warszawska, 1855, 25 чэрвеня |
| 34 | М. В. Доўнар-Запольскі | *Довнар-Запольский М. В.* Исследования и статьи, т. 1. Киев, 1909, с. 337 |
| 35 | Янка Купала | Любімы паэт беларускага народа. Мінск, 1960, с. 11—12 |
| 35 | Якуб Колас | *Лужанін М.* Колас расказвае пра сябе. Мінск, 1964, с. 20—21; Якуб Колас. Бібліяграфічны даведнік. Склалі Н. Ватацы, М. Пратасевіч, М. Базарэвіч. Мінск, 1962, с. 19 |
| 36 | Максім Багдановіч | *Багдановіч М.* Збор твораў у двух тамах, т. 2. Мінск, 1968, с. 7—8 |
| 36 | Цётка | *Пашкевіч-Цётка А.* «Лучынка», 1915, № 2 |
| 37 | Змітрок Бядуля | *Бядуля З.* Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных песнях і казках. Мінск, 1924, с. 99—101 |
| 37 | Максім Гарэцкі | *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускай літаратуры. Мінск, 1926, с. 30—31; *Гарэцкі М., Дзяржынскі У. Каравай.* Вы- |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| | | пісы з беларускай літаратуры, ч. 1. Мінск, 1963, с. 5, 8 |
| 38 | Кандрат Крапіва | *Крапіва К.* Збор твораў у чатырох тамах, т. 4. Мінск, 1963, с. 267 |
| 38 | А. А. Афанасьеў | «Полымя», 1969, № 1, с. 198 |
| 38 | С. В. Саўчанка | *Савченко С. В.* Русская народная сказка. Киев, 1914, с. 245—246 |
| 39 | Е. Р. Раманаў | *Романов Е. Р.* Белорусские народные мелодии.— Белорусский сборник, вып. 7. Вильно, 1910, с. 4 |
| 39 | Міхал Федароўскі | *Саламевіч Я.* Міхал Федароўскі. Мінск, 1972, с. 224 |
| 39 | Антон Грыневіч | Каляндар на 1921 г. Вільня, 1920, с. 15 |
| 39 | М. М. Пятуховіч | «Полымя», 1918, № 3, с. 177 |
| 40 | А. Т. Твардоўскі «Лявоніха» | *Твардовский А.* Родина и чужбина. Записки, очерки, рассказы. М., 1960, с. 145—151 |
| 42 | А. Т. Твардоўскі Сэрца народа | *Там жа,* с. 94, 96 |
| 43 | А. К. Сержпутоўскі | *Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белорусов полешуков. Спб., 1911, с. 2—4, 7. |
| 45 | Максім Танк | «Беларускі летапіс», 1937, № 2—3, с. 40 |
| 48 | Янка Брыль | *Брыль Я.* Збор твораў у чатырох тамах, т. 3. Мінск, 1968, с. 222—223 |
| 48 | П. І. Чайкоўскі пра беларускую песню (З успамінаў мастака М. В. Мікешына) | З асабістага архіва Л. Н. Дробава |
| 49 | Р. Р. Шырма | *Шырма Р.* Беларускія народныя песні. Вільня, 1929, с. 3 |
| 52 | Аляксандр Фадзееў (з пісьма да Р. Р. Шырмы) | «Звязда, 1974, 25 жніўня |
| 53 | Віктар Балашоў | З асабістага архіва Р. Р. Шырмы |
| 53 | Ніл Гілевіч | Наша родная песня. Мінск, 1968, с. 11—12 |
| 54 | Г. І. Цітовіч | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні. Мінск, 1969, с. 9 |
| 55 | Таццяна Лапаціна | «ЛіМ», 1968, 27 сакавіка |
| 56 | Сяргей Гарадзецкі | Зб. «Памяці Янкі Купалы». Ташкент, 1943, с. 33 |
| 56 | Драга Ёнтак | «Полымя», 1969, № 1, с. 198 |
| 56 | Здэнек Няедлы | «Беларусь», 1944, № 6, с. 21 |
| 56 | Вячаслаў Адамчык | *Адамчык В.* Міг бліскавіцы. Мінск, 1965, с. 5—10 |

| С. | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 58 | Вера Палтаран (Як запісвалі песні) | *Палтаран В.* Дзівасіл.— «Полымя», 1968, с. 161—167 |
| 65 | **Народна-паэтычная творчасць дакастрычніцкага часу** | |
| 67 | **Замовы** | |
| 68 | Замова паляўнічага | *Романов,* вып. 5, 155 |
| 68 | Замова на стрэльбу | *Шейн,* т. 2, 556 |
| 68 | Замова для пчол | Зап. Ул. К. Цішчанка ў 1975 г. у в. Улукі Слаўгарадскага р-на ад бацькі — К. А. Цішчанкі (1897 г. н.), які запомніў гэту замову ад свайго бацькі. АІМЭФ, ф. 8, воп. 75, спр. 104, сш. 1, арк. 68 |
| 69 | Замова пры выгане скаціны ў поле | *Шейн,* т. 2, 553 |
| 70 | Замова на сцаленне малака ў каровы | *Романов,* вып. 5, 22 |
| 70 | Замова на захаванне жывёлы | Зап. Г. А. Барташэвіч у в. Іскань Быхаўскага р-на ад Гапеевай Д. І., ф. 8, воп. 73, спр. 69, сш. 1, арк. 83. |
| 70 | Замова ад ваўка | *Романов,* вып. 5, 44 |
| 71 | Замова ад лясуна | *Шейн,* т. 2, 552 |
| 71 | Замова ад дамавіка | *Там жа,* 524 |
| 71 | Замова ад русалкі | *Там жа,* 525—526 |
| 71 | Замова ад ліхога вока | *Шлюбскі,* 37—38 |
| 73 | Замова ад злога духа | *Романов,* вып. 5, 25 |
| 73 | Замова ад нячыстай сілы | *Там жа,* 10 |
| 73 | Замова ад ляку | *Там жа,* 36 |
| 73 | Замова ад ляку | *Там жа,* 34 |
| 74 | Замова ад ляку | Зап. Г. А. Барташэвіч у пас. Кулага (в. Іскань) Быхаўскага р-на ад Гапеевай Д. І., ф. 8, воп. 73, спр. 69, сш. 2, арк. 59 |
| 74 | Замова ад крыксы | *Романов,* вып. 5, 33 |
| 74 | Замова ад змяінага ўкусу | *Шейн,* т. 2, 550 |
| 75 | Замова ад шалу | *Романов,* вып. 5, 104 |
| 75 | Замова ад крывацячэння | *Шейн,* т. 2, 540 |
| 75 | Замова ад ліхаманкі | *Там жа,* 554 |
| 75 | Замова ад лішая | *Романов,* вып. 5, 95 |
| 75 | Замова ад скулы | *Добровольский,* ч. 1, 195 |
| 76 | Замова ад зубнога болю | *Шейн,* т. 2, 540 |
| 76 | Замова ад хваробы валасоў | *Там жа,* 554 |
| 76 | Замова ад залатніка | Зап. І. Цішчанка ў 1951 г. у в. Улукі Слаўгарадскага р-на ад Ганны Пракарэнкі (1860 г. н.) |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 77 | Любоўная замова (прысушка) | *Романов,* вып. 5, 151—152 |
| 77 | Замова ад нагавору | Зап. пад кіраўніцтвам Л. М. Салавей студэнткамі Мінскага педінстытута імя М. Горкага А. Г. Ляшкевіч і І. І. Мурашка ў 1975 г. у в. Прусы Старадарожскага р-на ад Вусік П. С. (68 год), ф. 8, воп. 73, спр. 69, сш. 1, арк. 52 |
| 77 | Любоўная замова (прысушка) | Зап. Г. А. Барташэвіч у 1975 г. у в. Клінок Чэрвеньскага р-на ад В. Х. Алісейчык, 76 г. АІМЭФ АН БССР, ф. 8, воп. 75, спр. 96, сш. 1, арк. 43 |
| 79 | **Каляндарна-абрадавая паэзія** | |
| 82 | Кароткае апісанне абрадаў земляробчага календара | Апісанне абрадаў пададзена на падставе запісаў А. Г. Кіркора, П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава |
| 85 | Зімовыя песні | |
| 85 | Прыехала каляда на сівым коніку... | Белорусские песни, 75 |
| 85 | Ляцеў каршунішча, каляда... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак. Мінск, 1973, с. 31 |
| 86 | А йшоў-перайшоў, каляда... | *Там жа,* 32 |
| 86 | Прыехала каляда ў вазочку... | *Там жа,* 13 |
| 87 | Да ішлі, ехалі калядкі... | *Там жа,* 12 |
| 87 | Прыехала каляда на белым кані... | *Там жа,* 13 |
| 87 | Тыдзень, тыдзень да каляд... | Белорусские песни, 72 |
| 87 | А калядачкі... | *Романов,* вып. 8, 128 |
| 88 | Ішла каляда... | *Шырма,* т. 3, 256 |
| 89 | Насцілайце сталы, накладайце хлябы... | Зап. А. С. Ліс у 1969 г. у в. Сінькевічы Лунінецкага р-на ад А. Клеўжыц (78 год), АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 17, сш. 3, арк. 20 |
| 89 | Ці дома, дома сам пан гаспадар?.. | *Шырма,* т. 3, 258 |
| 89 | Да ці дома сам пан гаспадар... | *Шейн,* т. 1, ч. 1, 58 |
| 90 | За сяньмі, сяньмі там за новымі... | Русский филологический вестник, т. 3. Варшава, 1885, № 1—2, с. 266 |
| 91 | Ой, рана, рана куры запелі... | *Шырма,* т. 3, 262—263 |
| 92 | Ой, у лузе, у лузе, красна каліна... | *Радченко,* 110—111 |
| 92 | Стаяла бярозка тонкая, высокая... | *Довнар-Запольский,* 42 |
| 92 | А ў лесе, лесе... | *Романов,* вып. 7, 120 |
| 93 | Там за садамі трава-мурава... | *Шырма,* т. 3, 267 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 93 | Узышло, узышло тры месяцы... | *Там жа*, 261 |
| 93 | Ой, пад лесам да пад высокім... | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 75—76 |
| 94 | А рана, рана куры папелі... | *Радченко*, 117 |
| 94 | Зажурылася крутая гара | *Романов*, вып. 7, 117 |
| 95 | Ды ехаў я, ехаў... | *Шырма*, т. 3, 275 |
| 95 | Там за рэчкаю, там за быстраю... | *Там жа*, 265 |
| 96 | Пайшла каляда калядуючы... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах. Мінск, 1973, с. 66 |
| 96 | Да мостам, мостам да вярбованькім... | *Там жа*, 71—72 |
| 97 | Ездзіў хлопец за рэчаньку... | *Там жа*, 67 |
| 97 | Ой, калядачкі, вярніцеся... | *Там жа*, 69 |
| 98 | Го-го-го, каза... | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 92 |
| 98 | Паварачывайся, казёл... | *Там жа*, 97—98 |
| 99 | На новае лета... | *Шырма*, т. 3, 277—278 |
| 99 | Наша масленка катліва... | *Там жа*, 293 |
| 100 | У нас сягоння масленіца... | *Сербаў І.* Аб беларускай народнай песні.— «Гоман», 1918, № 88 |
| 100 | Наша масленіца гадавая... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў. Мінск, 1974, 56 |
| 100 | У нас маслены дзень... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 347 |
| 101 | Мы на горушцы пабывалі, пабывалі... | *Романов*, вып. 7, 140 |
| 101 | Веснавыя песні | |
| 101 | Благаславі, божа мілы, зіму замыкаці... | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 126 |
| 102 | Зіма з летам сустракаецца... | *Радченко*, 1 |
| 102 | Прыдзі, прыдзі вясна... | Подольские губернские ведомости, 1895, № 26 |
| 103 | Благаславі, божа... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 68 |
| 104 | Ты, пчолка ярая... | *Kuba Z.* Białoruski norodni pišni. Slovanski sbornik. Praha, 1887, VI, s. 245 |
| 104 | Жаваранак, ранняя птушэчка... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 68 |
| 104 | Вясна красна, вясна красна наступае... | *Там жа*, 70 |
| 104 | Вясна красна, што ты нам прынясла?.. | Зап. у 1966 г. у в. Хадоркі Івацэвіцкага р-на ад П. Кульгавеня (61 год), АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 13, сш. 12, арк. 13, веснавая |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 105 | Шуміць-гудзе, вясна ідзе... | Зап. А. Фядосік у 1974 г. у г. Валожыне ад Г. Рубацкай (74 гады), АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 87 |
| 105 | Ой, вясна, вясна, што ты прынясла... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 73 |
| 105 | Ой, прышла вясна красна... | *Сербаў І.* Сакуны-беларусы. Спб., 1915, с. 134—135. Зап. у 1911 г. у в. Жыцень |
| 106 | Ой, вясна мая вясёлая... | Зап. М. Гваздзёў у 1960 г. у в. Азершчына Рэчыцкага р-на ад Т. Лапацінай (1891 г. н.), АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 92 а, арк. 129 |
| 106 | Вол бушуе... | *Шырма*, т. 3, 13 |
| 106 | Да вясна красна... | *Federowski*, t. 5, 659—660 |
| 106 | Вясна красна... | *Чуркін*, 95—96 |
| 107 | Рынулі рэкі... | *Шырма*, т. 3, 25 |
| 107 | Хадзіла паванька... | *Там жа*, 31 |
| 107 | Стаптана трава зеляная... | *Косич*, 11 |
| 108 | А ляцела сойка цераз чыста поле... | *Ялатаў*, 17 |
| 108 | Зязюля куе, лецячка чуе... | *Киркор*, 92 |
| 108 | Зайдзі, зайдзі, зоранька вячэрняя... | *Zienkiewicz*, 156 |
| 109 | Да зязюля куе... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 73 |
| 109 | Была ў маткі... | *Там жа*, 76 |
| 110 | Зязюлечка баравая... | *Там жа*, 77 |
| 110 | Сярод Дуная дзевачка сядзіць | *Там жа*, 78 |
| 111 | Бяжыць рэчка ад мельнічка — ой, рана!.. | *Киркор*, 93 |
| 111 | Ой, там па моры па сіняму... | Зап. М. Гваздзёў у 1960 г. у в. Азершчына Рэчыцкага р-на ад Т. Лапацінай (1891 г. н.), АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 92 а, арк. 135 |
| 112 | На первы дзень, на вялікдзень... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 83 |
| 112 | Вялічка ідзець — нечага надзець... | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 162 |
| 113 | Добры вечар, пане гаспадару... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 84—85 |
| 114 | Ішлі, прайшлі валачобныя... | *Там жа*, 85—87 |
| 116 | Ідуць, гудуць валачоўнічкі... | *Романов*, вып. 7, 175—176 |
| 117 | Ідзём, пайдзём у слаўны дом... | *Сахараў*, 14—15 |
| 119 | Дзень добры табе, пане гаспадару!.. | Белорусские песни, 81—82 |
| 120 | Ішлі-бралі валачобнікі... | *Романов*, вып. 7, 171 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 121 | У нядзельку ранюсенька... | Зап. А. Ліс у 1974 г. у в. Гародзькі Валожынскага р-на ад В. Кезік і М. Кезік. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 83, сш. 2, арк. 27 |
| 121 | Добры вечар, пане гаспадару... | Зап. А. Ліс у 1974 г. у в. Лістапады ад Д. Вайцюлевіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 83, сш. 3, арк. 8 |
| 122 | А з-пад лесу, лесу цёмнага... | *Романов*, вып. 7, 165 |
| 122 | Добры вечар таму... | *Сербаў І.* Аб беларускай народнай песні.— «Гоман», 1918, № 85 |
| 123 | Дай на вяліκдзень, дай на першы дзень... | Зап. А. Ліс у 1970 г. у в. Востраў Зэльвенскага р-на ад С. Татарына (1903 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 83, сш. 4, арк. 1 |
| 124 | Добры вечар да паненачка... | Зап. Г. Барташэвіч у 1965 г. у в. Бокшыцы Слуцкага р-на ад М. Шэлег (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 99 а, сш. 1, арк. 16 |
| 124 | Чый то домік на прыгорачку | Зап. А. Ліс. у 1974 г. у в. Гародзькі Валожынскага р-на ад В. Кезік і М. Кезік. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 83. сш. 2, арк. 29 |
| 125 | Добры вечар, ды паненачка... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 105 |
| 125 | А ў матулькі адна дочка... | *Там жа*, 113—114 |
| 127 | Пасвіла дзеўка табун коней... | *Романов*, вып. 7, 167—168 |
| 127 | А ў гародзе ды на пераходзе... | *Шырма*, т. 3, 89 |
| 128 | Ой, на азярыне ды на сіненькай... | *Там жа*, 36 |
| 129 | Лужком, лужком ды далінкаю... | *Там жа*, 32 |
| 130 | Авёс зелен... | Зап. у Валожыне. АГТ, арк. 6, № 11 |
| 130 | Ой, на моры, на сінім Дунаі... | *Шырма*, т. 3, 49—50 |
| 131 | А ў лесе, лесе да на верасе... | *Бессонов*, 13 |
| 131 | Добры вечар, слічны панічок!.. | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 120—121 |
| 132 | У цёмным лесе стучыць, гручыць... | *Там жа*, 122—123 |
| 132 | Дзень вялікі, дзень вялік... | *Там жа*, 126 |
| 133 | Даўно, даўно тое было... | *Шырма*, т. 3, 14 |
| 134 | А ў балоце на калодзе... | *Романов*, вып. 7, 147 |
| 134 | Ты дуброва, ты дуброва... | Зап. К. Кузняцова і М. Малочка ў 1959 г. у в. Некрашы Багушэўскага р-на ад В. Задоры (1914 г. н.) і А. Корзун (1917 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 43, арк. 46 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 134 | Як пайшоў Мікола... | Беларускія народныя песні сольныя і харавыя, вып. 1, 1928, 61 |
| 135 | Юр'я, Юр'я, божа мой... | *Бессонов*, 23 |
| 136 | Юры, уставай рана... | *Шырма*, т. 3, 112 |
| 136 | Ой ты, Юр'я, Мікола... | Зап. К. Кузняцова ў 1963 г. у в. Лоск Маладзечанскага р-на ад С. Гнілазуб (1926 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 80, сш. 4, арк. 1 |
| 136 | Ой, выйду я на вулічку... | *Шырма*, т. 3, 111 |
| 137 | Падай, Юрыла, ключы і замкі... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 73 |
| 137 | Павядзем Юр'е да бору... | *Там жа*, 76 |
| 137 | Юр'ева маці ўпроч пайшла... | Зап. А. Мацейчык у в. Рудаўляны Гродзенскага р-на.— «Студэнцкая думка», 1926, № 1, с. 29 |
| 138 | Да што там у стайні стучэла... | Зап. у 1934 г. у в. Спягліца Вілейскага р-на ад В. Рукойцік |
| 138 | Юр'я, уставай рана... | Зап. у м. Валожын, АРГТ, 4, 13, № 3, арк. 5 |
| 139 | Юр'е, добры вечар... | *Зеленин Д. К.* Описание рукописей, вып. 1, с. 12 |
| 139 | Лятала пава па сенажаці... | Зап. А. Ліс у 1974 г. у в. Яцкава Валожынскага р-на ад М. Пашкоўскай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 83, сш. 1, арк. 30 |
| 139 | Пры лужку бела бярозка зашумела... | Зап. у 1937 г. у в. Замошша Паставскага пав. ад У. Шаблыкі |
| 140 | Вылятала галачка, вылятала... | *Шырма*, т. 3, 34 |
| 140 | У майго татулькі... | Зап. А. Ліс у 1972 г. у в. Забор'е Шаркаўшчынскага р-на ад Ч. Трубіла. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 57, сш. 2, арк. 9 |
| 141 | Ды хадзіў карагод... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 128—129 |
| 141 | Завілася пчолка над варатамі... | *Тэраўскі*, 76 |
| 142 | Ды рынула вада з Дуная... | *Радченко*, 48—49 |
| 142 | Устань рана, перапёлачка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 42 |
| 143 | Пойдзем мы, дзеванькі, на луг гуляці... | *Там жа*, 42 |
| 143 | Не радуйся, клён да ясення... | *Шейн*, т. 1, ч. 5, 186—187 |
| 144 | Ці ты бывала, тройца, ці бывала... | Песні бел. народа, т. 1, 17—18 |
| 144 | На граной нядзелі... | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 199 |
| 145 | Пойдзем, дзевачкі, у шчыры бор... | *Шейн*, т. 3, 17 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 145 | Летнія песні | |
| 145 | Купальскія і пятроўскія песні | |
| 145 | Ішла Купала сялом, сялом... | Зап. В. Іваноўская ў 1964 г. у в. Дахны Смаргонскага р-на ад Я. Іваноўскай (1909 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 85, сш. 1, арк. 9 |
| 145 | Сягоння Купала, а заўтра Ян... | *Federowski*, 5, 717 |
| 146 | Да ўзыйдзі, месячык... | Минская старина, вып. 2. Минск, 1911, с. 229 |
| 146 | Прасілася Гарыслаўка ў ойчанькі... | *Бессонов*, 48 |
| 147 | Ой, пойдзем, сястрыцы... | *Цітовіч*, 31 |
| 147 | Ой, рана, рана на Яна... | *Federowski*, 710—711 |
| 148 | Ой, рана на Йвана... | *Чуркін*, 99 |
| 148 | Ой, нету, нету Купаліша... | *Czeczot*, 32 |
| 149 | А як я ў зёлачкі пашла... | Зап. Л. М. Салавей у 1972 г. у в. Якубоўшчына Міёрскага р-на ад М. С. Малец (1906 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 52, сш. 1, арк. 24 |
| 149 | Ты, купалінька, рана, рана... | *Карский Е.* Отчет о поездке в Белоруссию в 1903 г. Спб., 1905, с. 9. Зап. у в. Янаўцы (Фабіянава, у Латгаліі) |
| 149 | Купалачка, дзе твая дачка?.. | *Czeczot*, 33—34 |
| 150 | А хто ж у нас не жанаты ходзіць?.. | *Романов*, вып. 8, 218 |
| 150 | Купала. Янава ночка невялічка, Купала... | Зап. І. Місуна ў 1969 г. у в. Сваткі Мядзельскага р-на ад В. Роўда. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 66 |
| 151 | Была ў суседа дачушка... | Виленский вестник, 1895, № 134 (Залессе, Ашмянскага пав.) |
| 151 | Купалялё, на сенажаці... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 43 |
| 151 | Малая ночка Купалночка... | Зап. у Брэсцкім пав. І. Ярашэвіч.— «Undyna», 1846, с. 13 (Вядомасці пра купальніц) |
| 152 | Да зялёны кусток распускаецца... | *Сахараў*, 21 |
| 152 | Купала на Йвана... | Зап. Г. Барташэвіч у 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага р-на ад А. Ігнатовіч (1908 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 110, сш. 3, арк. 1 |
| 152 | Каліна, а па ельнічку | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 353 |
| 153 | Ой, каліна, а хто ж у нас... | *Там жа*, 353 |
| 153 | Каліна, чыя рута за вадою... | *Там жа*, 355 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 154 | А ў масце, масце... | Зап. А. Ліс у 1967 г. у в. Плешчыцы Шклоўскага р-на ад Г. Кавалёвай (1924 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 111, сш. 2, арк. 26 |
| 154 | Кукуй, зязюленька, не ўпікай... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 150 |
| 154 | А ў бару, бару, на баравіне... | *Там жа*, 156 |
| 155 | А ў нашым жыце перапяліца... | *Там жа*, 180—181 |
| 155 | Ішоў вечар па вулачцы... | *Там жа*, 142 |
| 156 | Ішла Купалка сялом, сялом... | *Там жа*, 142 |
| 156 | Каліна на лузе стаяла... | *Там жа*, 145 |
| 157 | Купалка Яна на вулку звала... | *Там жа*, 158 |
| 157 | На вуліцы скрыпка грае... | *Там жа*, 149—150 |
| 157 | Чаму, зязюлька, не кукуеш?.. | *Там жа*, 144 |
| 158 | Купальна ночка невялічка... | *Малевич*, 27—28 |
| 158 | Ішла паненка цераз бор... | *Там жа*, 29 |
| 159 | У чыстым полі зялёны луг не кошаны... | *Романов*, вып. 8, 229 |
| 159 | Ой, то-то! Ляцелі гусі рад па раду... | *Там жа*, 234 |
| 160 | Ой, то-то! Хто гэту гару капаў... | *Там жа*, 236 |
| 160 | Да Купаленка, рана, рана... | *Добровольский*, ч. 4, 218 |
| 160 | Цёмная ночка Купалачка... | *Дмитриев*, 231 |
| 161 | А што ў нас сягоння за вечар быў?.. | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 236 |
| 161 | Ішла Купалінька па вуліцы... | *Шейн*. Бел. песни, 433 |
| 162 | Я зёлкі ў полі збіраю... | *Там жа*, 433 |
| 162 | Сонейка, сонейка, Ян з Пятром ходзяць... | *Czeczot*, 4 |
| 162 | На моры вутка купалась... | *Шейн*, Бел. песни, 440 |
| 163 | Ай, бору мой, бору мой!.. | *Там жа*, 444 |
| 163 | Ляцеў чыжык цераз рынак... | *Сахараў*, 25 |
| 164 | Кукавала зязюлька ў садочку... | *Карский Е.* Белорусские песни села Березовца Новогрудского у.— Русский филологический вестник, т. 3. Варшава, 1884, с. 128—129 |
| 164 | У нашага войта на дварэ... | Зап. У. Паўлюкоўскі ў 1929 г. у в. Брыксічы Баранавіцкага п., ф. 8, воп. 3, спр. 17, арк. 3—4 |
| 165 | Ай, то, то, ды за гарою за каменнаю... | *Czerny A.* Piesni Bialoruskie z powiatu Dzisnenskiego... Zbór wiadomosci do antropologii krojowej, t. 28. Kraków, 1895, s. 216 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 165 | А ў горадзе на рынку... | *Гарэцкі М., Ягорaў А.* Народныя песні з мелодыямі. Мінск, 1928, с. 85—86 |
| 166 | Цераз гару чорна сцежка... | Зап. А. Ліс у 1966 г. у в. Сенькава Верхнедзвінскага р-на ад А. Саўлук (1880 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 104, сш. 2, арк. 37 |
| 166 | А на Купалу... | *Шлюбскі,* 110 |
| 166 | Да ў адным канцы Купала... | *Federowski,* t. 5, 713 |
| 167 | Да не будзе лецечка... | *Довнар-Запольский,* 59 |
| 167 | Ой, у лесе, у лесе пры барку... | *Federowski,* t. 5, 713 |
| 167 | А ў майго татулькі тры сады зялёных... | *Шлюбскі,* 110 |
| 168 | Ой, дымна за дваром... | *Бессонов,* 32 |
| 168 | Перад Пятром, пятым днём... | Зап. А. Ліс у 1972 г. у в. Дзеркавічы Верхнедзвінскага р-на ад Н. Новікавай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 57, сш. 1, арк. 11 |
| 169 | Купала на Івана! Што Іван робіць?.. | *Романов,* вып. 1—2, 277 |
| 169 | Зажурылася малада ўдованька... | *Булгаковский Д. Г.* Пинчуки... Спб., 1890, с. 61 |
| 169 | Ой, разгон, разгон Пятроў дзень... | *Federowski,* t. 5, 711 |
| 170 | А я дзеўка добрая Алеся... | *Шлюбскі,* 125 |
| 170 | Да ў нашым сяле тры вуліцы... | Дзень паэзіі, 1969, с. 139 |
| 170 | А ў лузе касец косіць... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 49 |
| 170 | Ой, рана, рана, на Яна-Купала... | *Малевич,* 30 |
| 171 | Жніўныя песні | |
| 171 | Гаварыла поле шырокае... | Зап. А. Гурскі ў 1967 г. у в. Ланькава Бялыніцкага р-на ад М. Краўцовай (1905 г. н.), Г. Котавай (1894 г. н.) і С. Котавай (1907 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 112, сш. 1, арк. 31 |
| 171 | У полі жыта палавее... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 199 |
| 171 | Як пайду я дарогаю... | Зап. А. Ліс у 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага р-на ад П. Ігнатовіч (1909 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 111, сш. 1, арк. 31 |
| 172 | Ой, час, пара дадоманьку... | Зап. Е. Кійко ў в. Данілавічы Дзятлаўскага р-на ад З. Сёмухі (1879 г. н.). АІМЭФ, ф. 3, воп. 1, спр. 84, сш. 1, арк. 33 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 172 | Да знаці пана, знаці... | Зап. К. Кабашнікаў у 1952 г. у г. Тураве ад П. Чорнай (1870 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 84, сш. 2, арк. 23 |
| 173 | Пералсані, божа, хмаркі... | Зап. Г. Барташэвіч і К. Кузняцова ў 1958 г. у в. Сорагі Слуцкага р-на ад Н. Забелы (1893 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 41, сш. 3, арк. 1 |
| 173 | Ой, не ляжы, ветру, ў полі... | Зап. Я. Бартко ў 1962 г. у в. Петравы Дзятлаўскага р-на ад моладзі. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 4, сш. 1, арк. 11 |
| 173 | Ой, месяц ясненькі... | Зап. Е. Кійко у в. Данілавічы Дзятлаўскага р-на ад Я. Груда (1913 г. н.). АІМЭФ, ф. 18, воп. 10, спр. 7, сш. 6, арк. 4 |
| 174 | Да ўжо сонца за бор, за бор... | Зап. Н. Русаловіч у в. Скарынічы Мінскага р-на ад Г. Станішэўскай. АІМЭФ, ф. 13, воп. 5, спр. 6, арк. 28 |
| 174 | Ой, закаціся, сонейка... | *Federowski*, t. 5, 743 |
| 174 | Няхай вечар бардзей будзе... | *Там жа*, 757 |
| 175 | Паслаў мяне свёкар... | *Там жа*, 759 |
| 175 | Сакатала бочачка... | Зап. І. І. Лушчыцкая ў 1961 г. у в. Сосенка Вілейскага р-на ад Я. Шалуха (1902 г. н). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 65, сш. 6, арк. 12 |
| 175 | І звіўся хмель... | *Косич*, 24 |
| 175 | Ой, красуйся, жыцейка... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 249 |
| 176 | А высока, далёка... | *Там жа*, 249 |
| 176 | Чырвона ружачка... | *Там жа*, 249 |
| 177 | Дзевачка з поля ішла... | *Там жа*, 252 |
| 177 | Палуднічкі прагудзелі... | *Там жа*, 268 |
| 177 | Кругло, мало балоцечка... | *Там жа*, 263 |
| 177 | Наш гаспадар маладзенькі... | *Там жа*, 270 |
| 178 | А чыя ж то валока... | Зап. Л. Грыгарук у 1958 г. у в. Пасынкі на Беласточчыне ад М. Грыгарук. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 68 |
| 178 | Выйшла маці жыта жаці... | Зап. В. Сіўцова ў 1965 г. у в. Панскае Крупскага р-на ад Н. Сямёнавай (1905 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 67, сш. 11 |
| 178 | Што ў мяне была за свякровачка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 360 |
| 178 | Баліць мая сярэдзінка... | *Радченко*, 57 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 179 | Добры вечар, нашай маці... | Зап. А. Ліс у 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага р-на ад Х. Казловай (1908 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 111, сш. 1, арк. 3 |
| 179 | Чые гэта талачане... | *Zienkiewicz*, 228 |
| 179 | Ой, дайце мне загон-разгон... | Зап. І. Цішчанка ў 1956 г. у в. Хорск Давыд-гарадоцкага р-на ад М. Паскрэб (1876 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 39, сш. 5, арк. 27 |
| 179 | Ой, пара й, пара да двара... | Зап. М. Грынблат у 1960 г. у в. Грудзінава Сіроцінскага р-на ад К. Шаўцовай (1917 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 47, сш. 4, арк. 23 |
| 180 | Ой, я маладзенька дый жыта жала... | Зап. Т. Андрушкевіч у 1960 г. у в. Завод Жлобінскага р-на ад А. Бушкевіч (1905 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 16, арк. 15 |
| 180 | Ой, закаціся, ярка сонейка... | Зап. Т. Андрушкевіч у 1960 г. у в. Скепня Жлобінскага р-на ад Г. Елінскай. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 16, арк. 16 |
| 180 | Глядзіць, глядзіць маё вочка... | Зап. А. Емельянаў у 1968 г. у в. Грабёл Расонскага р-на ад А. Бутравай (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 8, арк. 79 |
| 180 | Сіняе азёрачка... | Зап. А. Гурскі ў 1961 г. у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад М. Адамейка (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 63, сш. 2, арк. 38 |
| 181 | У слаўнага пана... | *Довнар-Запольский*, 59 |
| 181 | Да гула пчолка, гула... | *Янчук Н. А.* По Минской губернии. Известия императорского общества любителей естествознания, антропологии и этнографии, т. LXI. М., 1889, кн. IX, вып. 1, с. 76 |
| 182 | Вялік наш бор, вялік... | *Там жа*, 74 |
| 182 | Ты наш пане — баране... | Зап. К. Кабашнікаў у 1956 г. у в. Баравое Лельчыцкага р-на ад Я. Шамко (1872 г. н.). АІМЭФ, ф. 9, воп. 5, спр. 9, сш. 2, арк. 14 |
| 182 | У добрага пана... | Зап. В. Гусціновіч у 1960 г. у м. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на ад У. Зініч (1881 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 14, сш. 2, арк. 101 |
| 183 | Ой, жыта жну, пажынаю... | Зап. В. Гусціновіч у 1956 г. у м. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на ад А. Гарбацэвіч. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 4, сш. 1, арк. 19 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 183 | Мая мамка, мая кветка... | Зап. А. Фядосік у 1948 г. у в. Кашэвічы Капаткевіцкага р-на ад С. Мароз (1902 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 8, спр. 2, сш. 6, арк. 8. |
| 183 | Ой, у полі бярэзінка... | Зап. У. Міцкевіч у 1948 г. у в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на. АІМЭФ, ф. 13, воп. 8, спр. 2, сш. 23, арк. 2 |
| 183 | Поле маё, поле маё вялікае і вясёлае... | Зап. А. Ліс у 1964 г. у в. Вышадкі Гарадоцкага р-на ад М. Барысавай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 86, сш. 2, арк. 10 |
| 184 | Добра жаць — шырокая ніўка... | *Шырма*, т. 3, 188 |
| 184 | Ой, пара дамоў, пара... | *Там жа*, 186 |
| 184 | На лугу касцы косяць... | *Там жа*, 173 |
| 185 | Лета ж маё, лецейка... | *Там жа*, 172 |
| 185 | Ды ўжо вечар вечарэе... | Зап. Л. Ткачова ў 1960 г. у в. Баравуха Слуцкага р-на ад М. Сяўрук (1895 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 55, сш. 5, арк. 33 |
| 185 | Калі ж тая серада прайшла... | *Шырма*, т. 3, 109 |
| 185 | Сонейка, сонейка... | *Там жа*, 179 |
| 186 | Ой, пара нам дамоў, пара... | *Там жа*, 160 |
| 186 | Ой, гудцы гудуць... | *Federowski*, t. 5, 741 |
| 187 | Закурыўся ціхі дробны дожджык... | Зап. В. Скідан у 1967 г. у м. Галоўчын Бялыніцкага р-на ад У. Дракінай (1902 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 105, арк. 7 |
| 187 | Пара дамоў, пара... | Зап. А. Ліс у 1960 г. у в. Ветхава Смаргонскага р-на ад А. Ліс (1907 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 54, сш. 4, арк. 21 |
| 187 | А мы поле рачком сышлі... | Зап. Г. Барташэвіч і А. Янголь у 1965 г. у в. Бокшыцы Слуцкага р-на ад М. Шэлег (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 29, сш. 3, арк. 34 |
| 188 | А пара нам дамоў ісці... | *Шлюбскі*, 149 |
| 188 | Да ў нашага пана... | *Czecrot*, 10—11 |
| 188 | Дажынкі | Зап. У. Коўчар у 1946 г. у в. Кірава Слуцкага р-на ад Г. Крывашэй (1884 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 17, сш. 1, арк. 7 |
| 189 | Ай, добра ноч!.. | *Шейн*. Бел. песни, 474 |
| 190 | Ой, хадзіў Раю... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 273—274 |
| 190 | Хадзіў Спарыш па вуліцы... | *Шейн*. Бел. песни, 493—494 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 190 | Разгарыся вячэрняя зорка... | *Там жа*, 497 |
| 191 | Кацiўся вяночак па полю... | *Гильтебрандт П.* Сборник памятников народного творчества Северо-Западного края. Вильна, 1866, с. 209 |
| 191 | У нас сягоння вайна была... | *Киркор*, 233 |
| 192 | Ляцеў саколік па полю... | *Романов*. Материалы, 164 |
| 192 | Рада, рада шэра перапёлка... | *Сахараў*, 49 |
| 193 | Нiўка, нiўка, аддай маю сiлку... | *Романов*, вып. 8, 262 |
| 193 | Адчыняйце шчытовы вароты... | *Там жа*, 261 |
| 193 | Ой, я з поля цяку, бягу... | *Federowski*, t. 5, 754 |
| 193 | Жала я жыта... | Зап. М. Стырнэ ў 1949 г. у в. Старая Дуброва Акцябрскага р-на ад М. Жулега (1889 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 27, сш. 1, арк. 10—11 |
| 194 | А ў нашага пана... | Зап. А. Ліс у 1967 г. у в. Малая Багацькаўка Мсцiслаўскага р-на ад Н. Нажынскай (1873 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 111, сш. 3, арк. 11 |
| 194 | Да цi выйшла да цёмная туча... | *Добровольский*, ч. 4, 258 |
| 195 | Дажыначная | Зап. А. Ліс у 1970 г. у в. Адамчукi Вiльнюскага р-на ад А. Стэфановiч (1907 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 27, сш. 1, арк. 45 |
| 195 | А чы поўна арэхавая чаша... | *Шейн*. Бел. песни, 501 |
| 196 | Восеньскiя песнi | |
| 196 | Чаго ты, косю, чаго, сiвенькi?.. | *Шырма*, т. 3, 208 |
| 196 | А ў цёмным лесе... | Зап. А. Салавей у 1972 г. у в. Якубоўшчына Мiёрскага р-на. АIМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 78, сш. 1, арк. 21 |
| 197 | Ай, у бару цiцярук балбочыць... | *Шейн*. Бел. песни, 482 |
| 197 | Сiнiя мае два галубочкi... | Зап. А. Ліс у 1975 г. у в. Гудоўшчына Маладзечанскага р-на ад А. Луцкай (1902 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 75, спр. 106, сш. 1, арк. 36 |
| 198 | Восень мая, восень... | Зап. М. Гваздзёў у 1967 г. у в. Плешчыцы Шклоўскага р-на ад Г. Ксяндзовай (1927 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 108, сш. 3, арк. 31 |
| 198 | Ай, восень, восень, макрота... | Зап. Г. Барташэвiч у 1964 г. у в. Ледневiчы Сенненскага р-на ад Г. Цывы (1922 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 90, сш. 2, арк. 18 |
| 198 | Ужо не раненька, ужо не позненька... | Зап. А. Гурскi ў 1963 г. у в. Запруддзе Маладзечанскага р-на ад Н. Шаўлюк (1903 г. н.). АIМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 79, сш. 2, арк. 46 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 199 | Няпраўдзівая каліна казала... | *Шейн.* Бел. песни, 479 |
| 199 | Перапёлка, перапёлка... | *Там жа,* 479—480 |
| 199 | Бярозка з лістом... | *Там жа,* 480 |
| 200 | Ай, чый то конік пад борам... | Зап. Г. Барташэвіч у 1964 г. у в. Ледневічы Сенненскага р-на ад Г. Цывы (1922 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 90, сш. 2, арк. 19 |
| 200 | А віхор каліну паламаў... | Зап. А. Гурскі ў 1961 г. у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад А. Круглік (1904 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 63, сш. 2, арк. 40 |
| 201 | Дзе я радзілася, не была... | Зап. Л. Ткачова ў 1961 г. у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад В. Бурдыка (1898 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 61, сш. 1, арк. 20 |
| 201 | Ой, заржы, заржы, вараны каню... | *Шырма,* т. 3, 229—230 |
| 202 | Праду я, праду, спатанькі хачу... | Зап. М. Гваздзёў у 1967 г. у в. Галаўчын Бялыніцкага р-на ад В. Хадасевіч (1894 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 108, сш. 1, арк. 42—43 |
| 202 | Ай, упала ластаўка, упала... | *Шейн.* Бел песни, 490—491 |
| 203 | А тонка-звонка сасонка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 56 |
| 203 | Хто на стаёнцы зазвоніць... | *Там жа,* 55 |
| 204 | Там пад борам-лесам... | Зап. А. Ліс у 1970 г. у в. Адамчукі Вільнюскага р-на ад А. Янкоўскага (1903 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 27, сш. 2, арк. 1 |
| 204 | Авясец, мамухна... | *Шлюбскі,* 165 |
| 204 | Дзе ты, хмелю, быў?.. | Зап. А. Ліс у 1974 г. у в. Дубіна Юрждыцкая, хут. Барок ад Г. Іванчык (1902 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 83, сш. 2, арк. 23 |
| 204 | Ой, пры Дунаю, пры ціхусенькім... | *Gawrońska, 36—37* |
| 205 | Вядзьмедзька кару дзярэць... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 294 |
| 205 | Пушчу я паву... | Зап. А. Салавей і П. Каруза ў в. Якубоўшчына Верхнедзвінскага р-на ад М. Малец (1906 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 52, сш. 2, арк. 45 |
| 206 | Дабро маё зеляное, зеляное... | Зап. А. Барыс у 1972 г. у в. Фралова Міёрскага р-на ад Н. Кашыры (1901 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 55, сш. 1, арк. 65 |
| 206 | Ходзіць вутачка па сенажаці... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 292 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 207 | Ой, зара мая, несхадзімая... | *Там жа*, 298 |
| 207 | Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце?.. | *Радченко*, 137 |
| 208 | Лугавая зязюлечка, лугам ляціш... | *Полевой А.* О языке населения Новозыбковского уезда Гомельской губернии. Минск, 1926, с. 46 |
| 208 | Ішла цяцера з лугоў, з балотаў... | *Сахараў*, рукапіс, IV. АІМЭФ, ф. 3, воп. 10 |
| 209 | Ці я табе, мая мамачка... | Зап. А. Ліс у в. Крэва Смаргонскага р-на ад Н. Майсевіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 84, сш. 3, арк. 30 |
| 209 | Досыць, калінка чырвоненькая... | Зап. В. Шніп у 1952 г. у в. Пуганы Радашковіцкага р-на ад Я. Мацюгі. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 40, сш. 55, арк. 7 |
| 210 | Час дамоў, час дамоў, час дамоў ісці... | Зап. А. Гурскі ў 1960 г. у в. Грудзінава Сіроцінскага р-на ад А. Шаўцовай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 48, сш. 4, арк. 22—23 |
| 210 | Хадзіла дзевенька... | *Шейн*. Бел. песни, 485 |
| 210 | Недаспелая макаўка... | Зап. А. Гурскі ў 1963 г. у в. Бабцы Глыбоцкага р-на ад Х. Герасімёнак (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 7, сш. 3, арк. 25 |
| 210 | Гуляй, гуляй, шчука, плаціца... | *Сахараў*, 63 |
| 211 | Ой, не вылятай, сіва зязюленька... | *Цітовіч*, 53 |
| 211 | Разлійся, вадзіца... | *Шейн*. Бел. песни, 483 |
| 212 | Асіна балота красіла... | *Шейн*, т. 1, ч. 1, 260 |
| 212 | Віліся пчолачкі... | *Там жа*, 258 |
| 212 | Ой, зялён мой лён, зялён... | Зап. І. Лушчыцкая ў 1961 г. у в. Пасынкі Мядзельскага р-на ад Л. Роліч (1896 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 65, сш. 1, арк. 43 |
| 212 | Каханка дзеванька, каханка... | *Шейн*. Бел песни, 483 |
| 213 | Затужылася Евачка... | Зап. Г. Барташэвіч у 1964 г. у в. Ледневічы Сенненскага р-на ад Г. Цывы (1922 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 90, сш. 2, арк. 20 |
| 213 | Ды на полі ліпа з сонейкам йграець... | *Сахараў*, 51 |
| 213 | Кляновы лісточак... | *Шырма*, т. 3, 248 |
| 214 | Хадзіў-пахадзіў... | *Шейн*. Бел. песни, 484—485 |
| 214 | Зялёная дубравачка... | Зап. М. Гваздзёў у 1967 г. у в. Галаўчын Бялыніцкага р-на ад В. Хадасевіч (1894 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 108, сш. 1, арк. 14 |

26 Зак. 3328

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 215 | Ішла дзевачка за вароцейкі... | Зап. К. Кузняцова ў 1963 г. у в. Лоск Маладзечанскага р-на ад А. Лазар (1926 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 80, сш. 6, арк. 16 |
| 215 | За цёмным лесам — трава павяла... | *Сахараў*, 52 |
| 216 | На моры вутачка купавалася... | *Каминский*, 743 |
| 216 | Закракатала шэра вутанька на рацэ... | *Сахараў*, 50—51 |
| 216 | Ой, чаго, зімачка... | Зап. Т. Андрушкевіч у 1963 г. у в. Завод Жлобінскага р-на ад К. Пашкоўскай (1895 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 3, спр. 27, арк. 13 |
| 217 | Румяна поле, румяна... | Зап. А. Ліс у 1961 г. у в. Пасынкі Мядзельскага р-на ад С. Савук (1902 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 68, сш. 4, арк. 38—39 |
| 217 | Былі ў дзеда тры дачушкі... | *Сахараў*, 52 |
| 218 | Жураввы лятуць... | Зап. А. Гурскі ў 1963 г. у в. Ракаўцы Смаргонскага р-на ад Н. Ярошка (1895 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 79, сш. 2, арк. 40 |
| 218 | Ападае лісточак... | Зап. В. Іваноўская ў 1961 г. у в. Лунін Лунінецкага р-на ад групы дзяўчат. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 71, сш. 4, арк. 3 |
| 218 | На гары лён... | *Ялатаў*, 14 |
| 219 | Доўга, доўга я з вечара сяджу... | *Каминский*, 744 |
| 219 | Як пайшоў жа кужаль па кутах, па лаўках... | *Сахараў*, 59 |
| 219 | Талочныя песні | |
| 220 | Талака, талака... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 302 |
| 220 | Гаспадар, гаспадар... | *Там жа*, 302 |
| 221 | А і добра мы табе... | *Там жа*, 302 |
| 221 | Чыя ж гэта талака?.. | *Там жа*, 303 |
| 221 | Талака, талака... | *Там жа*, 304 |
| 221 | Добра мне, добра... | *Там жа*, 304—305 |
| 221 | Як сядзем мы на лавачцы... | *Там жа*, 305 |
| 222 | На мяне казалі... | *Там жа*, 306—307 |
| 222 | А знаць наш бацюшка багата жывець... | *Шейн*. Материалы, т. 1, ч. 1, с. 206 |
| 222 | А чыя ж то жана па двару ходзіць... | *Романов*, вып. 1—2, 174 |
| 223 | Ішла талака з чыстага поля... | *Там жа*, 275 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 223 | Ці не пчолка... | *Шейн*. Бел. песни, 413 |
| 223 | Ах вы, мілы мае бабачкі... | *Гарэцкі М., Ягораў А.* Народныя песні з мелодыямі, с. 106 |
| 223 | Ды знаць наша доля худая... | *Шейн*. Бел. песни. 412—413 |
| 223 | А мы свайму пану... | *Шлюбскі*. Матэрыялы.., ч. 1, 166 |
| 224 | Каля месяца, каля яснага... | *Шейн*. Бел. песни, 423 |
| 224 | Ня слава, ня слава, Андрэйка, твая... | *Там жа*, 415 |
| 224 | Ні слава, ні слава, Янaчка, твая... | *Сахараў*. Народная творчасць, 54 |
| 224 | Ні слава, ні слава, гаспадар, твая... | *Шейн*. Бел. песни, 414 |
| 225 | Мы мужове-панове... | *Там жа*, 424 |
| 225 | Таргуйся, таргуйся, Кірылку, з намі... | *Шейн*. Материалы.., т. 1, ч. 1, 205 |
| 225 | Па полю сіз голуб лятаіць... | *Гарэцкі М., Ягораў А.* Народныя песні з мелодыямі, с. 107 |
| 226 | Сілязенька галоўка сізенька... | *Романов*, вып. 8, 197 |
| 226 | Ні слава, ні слава, Ярэмка, твая... | *Шлюбскі*, 168—169 |
| 226 | Да баранaчка чорненькі, чорненькі... | *Шейн*. Бел. песни, 505 |
| 227 | Дзе ж тая барэлачка... | *Романов*, вып. 1—2, 272—273 |
| 227 | Ох вы, столікі мае... | *Шейн*. Материалы.., т. 1. ч. 1, 206 |
| 229 | **Сямейна-абрадавая паэзія** | |
| 231 | Хрэсьбінныя песні | |
| 231 | Сцелецца да ўецца... | Зап. В. Коўчур у 1946 г. у в. Цараўцы Слуцкага р-на ад Г. Крывашэй. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 17, бл. 1, арк. 1 |
| 232 | Ой, дымна, дымна ў садзе... | *Косич*, 34 |
| 233 | А між сеначак, між каморачак... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 313—314 |
| 234 | Раса пала на травіцу... | *Там жа*, 315 |
| 234 | Не кукуй, зязюлечка, рана... | Зап. І. І. Лушчыцкая ў 1961 г. у в. Жыцькава Барысаўскага р-на ад Г. І. Рыжковай (51 г.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 62, бл. 4, арк. 24 |
| 235 | Каб я ведала, каб знала... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 221 |
| 236 | Каб я знала, ведала... | Зап. М. П. Гваздзёў у 1965 г. у в. Зубава Аршанскага р-на ад Х. С. Рабекінай (53 г.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 94, бл, 1, арк. 19—20 |
| 236 | А бабулька, пахнючая мята... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 332 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 237 | Не стук стучыць... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 110 |
| 237 | Бабулька ж мая міленькая... | Зап. Г. А. Барташэвіч у в. Міхалішкі Астравецкага р-на ад Ю. С. Пагады. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 33, бл. 2, арк. 22—23 |
| 238 | Ох, учора мае кумачкі... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 112 |
| 239 | Наша бабачка а пірагі пякла... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 220 |
| 239 | Ды хто ў нас, ды хто ў нас... | Зап. Ю. Ф. Мацкевіч і Г. І. Цітовіч у 1946 г. у в. Крывічы Старобінскага р-на ад С. М. Чарэўка (50 г.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 10, арк. 46 |
| 240 | А што па масту, па калінаваму... | *Шейн,* т. 1, ч. 1, 22 |
| 240 | Парадзіха ў полазе ляжыць... | *Там жа,* 22 |
| 240 | Бабка к унучцы... | Зап. М. Аўхімовіч у 1967 г. у в. Гумны Крупскага р-на ад старых жанчын у час хрэсьбін. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 11, сш. 7, арк. 20 |
| 241 | Сядзіць баба на куце... | Зап. К. Б. Кузняцова ў 1964 г. у в. Гаршчэўшчына Талачынскага р-на ад М. Ц. Бохан. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 91, бл. 2, арк. 14—15 |
| 241 | Ці ведаеш, бабка... | Зап. З. Я. Мажэйка ў 1963 г. у в. Аношкі Лепельскага р-на ад Х. К. Гарбачовай.— «Радзінная паэзія», с. 186 |
| 241 | А ў бару дуб'ё... | Зап. Г. А. Барташэвіч у 1965 г. у в. Лядцы Дубровенскага р-на ад Х. П. Малахавай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 99, бл. 3, арк. 3, № 2 |
| 241 | Наша бабулька да й малімонка... | Зап. Л. Р. Савікоўская і Г. І. Цітовіч у 1945 г. у в. Кіржына Крывіцкага р-на ад Н. І. Грышкевіч (60 г.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 2, арк. 102 |
| 242 | Бедавала наша бабулька... | Зап. М. Я. Грынблат і Г. І. Цітовіч у 1945 г. у в. Асаўлянскія Хутары Крывіцкага р-на ад Л. М. Місун. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 2, арк. 87 |
| 242 | Упілася бабка, упілася... | *Самцэвіч П. А.* Хрэсьбіны ў в. Унтальянка Барысаўскага р-на Менскай акругі.— «Наш край», 1928, № 11 |
| 243 | А скочыла наша Хрыстынка... | *Романов,* вып. 8, 347 |
| 243 | Чарачка медавая... | Зап. А. І. Гурскі ў 1965 г. у в. Салаўі Аршанскага р-на ад М. С. Балашэнка і інш. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 25, бл. 2, арк. 6 |

| С. | Змест | Крыніцы |
| --- | --- | --- |
| 244 | Кума мая, кумачка... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, с. 115 |
| 244 | Кум з кумою на куце сядзіць... | Зап. Ф. І. Юхневіч у 1958 г. у в. Бардзілава Халопеніцкага р-на ад Т. Е. Кручок. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 13, сш. 1, арк. 2 |
| 245 | Стаіць шацёр над вадою... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 425 |
| 245 | Кланялася кума куму... | *Там жа,* 63 |
| 246 | Ой, кум да кумы заляцаўся... | *Federowski.* Lud białoruski, t. 6, 554 |
| 248 | Што ж то за красачка... | *Романов,* вып. 8, 340—341 |
| 249 | У нашага кума бела бяроза... | *Шейн.* Бел. песни, 6, № 12 |
| 249 | Ішоў кум па сялу... | *Шейн,* т. 1, ч. 1, 24—25 |
| 250 | Кум з кумою на покуце сядзяць... | *Там жа,* 24 |
| 250 | Кума кума любіла... | *Шейн.* Бел. песни, 3 |
| 250 | Чэраз бор сасна... | *Гарэцкі М., Ягорaў А.* Народныя песні з мелодыямі, с. 3—4 |
| 251 | На гарэ ліпка нахілілася... | Зап. Ф. І. Юхневіч у 1958 г. у в. Бардзілава Халопеніцкага р-на ад Т. Е. Кручок. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 13, сш. 1, арк. 2 |
| 251 | На стале каша стала... | *Шырма,* т. 2, 252 |
| 251 | А ў нядзелечку з параненечку... | *Шейн,* т. 1, ч. 1, 24 |
| 251 | Я ў хрэсьбінкі паманілася... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 352 |
| 252 | Каля месяца... | *Шейн.* Бел. песни, 9 |
| 252 | Ой, два браты, ой, два браты... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 426—427 |
| 253 | Прасілі мяне на хрысцінaчкі... | Зап. А. Фядосік у 1974 г. у в. Гародзькі Валожынскага р-на ад Е. Глябовіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 86, сш. 2, арк. 21 |
| 253 | Я ўчора, малада... | *Чуркін,* 106 |
| 254 | Пасаджу я квасол... | *Шырма,* т. 2, 262—263 |
| 254 | Ёсць у нашай бабкі... | *Там жа,* 265 |
| 255 | Каля месяца, каля яснага... | Зап. Я. Сакалова ў 1967 г. у в. Перагон Слаўгарадскага р-на ад Н. Баруценка (1907 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 11, сш. 8, арк. 1—2. |
| 255 | Ой запала, ой запала... | Зап. А. С. Фядосік у 1974 г. у г. Валожыне ад Г. М. Рубацкай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 86, бл. 1, арк. 10 |
| 255 | У нашага Іванькі... | Зап. М. П. Гваздзёў у 1961 г. у в. Салтанаў Рэчыцкага р-на ад К. Ра- |

| С. | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| | | кусевіч (80 г.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 60, арк. 79—80 |
| 256 | Выбачайце, госці... | Зап. М. Я. Грынблат у 1969 г. у в. Сінкевічы Лунінецкага р-на ад Е. Я. Клеўжыц (76 г.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 14, сш. 1, арк. 11—13 |
| 257 | А чаму ты, яліначка, не зялёна?.. | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 320—321 |
| 257 | А ў цёмным лесе сава кугічыць... | *Там жа,* 355 |
| 258 | За лес, за лес сонца коціцца... | *Там жа,* 358 |
| 258 | Хрэсьбінныя прыгаворкі | *Грынблат М. Я., Ялатаў В. І.* Радзінная паэзія. Мінск, 1971, с. 644—645 |
| 259 | **Вясельная паэзія** | |
| 259 | Абрад вясельны | |
| 259 | Сватанне | |
| 261 | Заручыны | |
| 263 | Вянец | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 13—40 |
| 275 | Вяселле ў вёсцы Берлеж Блужскага сельсавета Пухавіцкага раёна | Зап. А. С. Фядосік у 1973 г. у в. Берлеж Пухавіцкага раёна ад В. Гайдучонак і Н. Паўловіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 73, спр. 70, бл. 5, арк. 23—47 |
| 282 | Вясельныя песні | |
| 282 | Хадзілі стральцы-лаўцы па полю... | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 181 |
| 282 | Ой, скарэй бы вячора паждаці... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 86—87 |
| 283 | Да ў месяца два ражкі крутыя... | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 80 |
| 283 | Ай не шум шуміць... | Зап. П. Пратасевіч у 1967 г. у в. Казіно Ушацкага р-на ад С. Пратасевіч. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 24, сш. 4, арк. 30 |
| 283 | Татачка мой родненькі!.. | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 339 |
| 284 | Прыехалі сваты на двор... | *Там жа,* 91 |
| 284 | Ці ты, дзевачка, не чуеш?.. | Жанчына ў бел. тв-ці, 146 |
| 285 | Прыляцелі коршуны з сакалом... | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 157 |
| 285 | З суботы на нядзелю нявеста сон відзела... | Жанчына ў бел. тв-ці, 143 |
| 285 | Хвалілася каліначка за ракой... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 93 |
| 286 | Стукнула, грукнула на дварэ... | *Там жа,* 91 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 286 | Разжалілася каліна... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 136 |
| 286 | Да разгарэлася каліна... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 339 |
| 287 | Іду замуж, да не ведаю... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 167 |
| 287 | Ой, звонка, звонка сасонка... | *Там жа*, 224 |
| 288 | Дзяўчыначка мая заручоная... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 388 |
| 288 | Будзе табе, дзевачка, вялікае гора... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 428 |
| 288 | Пойдзеш, дзевачка, ў чужыя людзі... | *Там жа*, 430 |
| 289 | Мамачка мая, родная мая... | *Там жа*, 430 |
| 289 | Як табе, маё сонейка... | *Там жа*, 437 |
| 290 | Станьце, дружачкі, да ўсе ў рад... | Жанчына ў бел. тв-ці, 152 |
| 290 | Не плач, не плач, мая матулька... | Зап. М. Аўхімовіч у 1967 г. у в. Купаленка Крупскага р-на ад Л. Аўхімовіч (1902 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 11, сш. 7, арк. 2—3 |
| 290 | А ўжо позненька, не раненька... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 340 |
| 291 | Шкада табе, мамачка, а мне горш... | Жанчына ў бел. тв-ці, 145 |
| 291 | Зборная субота... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 88 |
| 292 | Кукавала зязюля ў садочку... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 49 |
| 292 | Калінка мая лугавая... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 225 |
| 293 | У гародзе мята... | *Там жа*, 167 |
| 293 | Ішла Надзечка з вядром па ваду... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 137 |
| 293 | Каліна-маліна... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 313 |
| 294 | Чырвоная ружа... | *Там жа*, 312 |
| 294 | Стаяла бяроза сорак лет... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 365 |
| 294 | На чыей гэта ніве... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 274 |
| 295 | Караваю, мой раю... | *Там жа*, 63 |
| 295 | Каравайнічкі, пачынайнічкі... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 365 |
| 295 | Сыпце пшаніцу... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 140 |
| 296 | Каб я знала, каб я ведала... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 167—168 |
| 296 | Лятуць, лятуць белы лебедзі цераз сад... | *Там жа*, 70 |
| 296 | Ой, ляцелі гусанькі цераз сад... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 94 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 297 | Сонейка каля акон ідзе... | Зап. А. Абрамовіч у 1967 г. у в. Гарадок Маладзечанскага р-на ад Г. Зялёнкі і П. Чапаты. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 11, сш. 6, арк. 8 |
| 297 | Непраўдзівая калінка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 66 |
| 298 | Сцякліся дзве рэчанькі... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 149 |
| 298 | Да дуба, зязюлька, да дуба... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 168 |
| 298 | За гарой, за гарой... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 114 |
| 298 | Сядай, Надзечка, у канец стала... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 152 |
| 299 | Ой, у полі крыніцы стаялі... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 175 |
| 299 | Мецена вуланька... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 155 |
| 300 | Паселі дзевачкі... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 172 |
| 300 | Кацілася калясо з клеці... | Зап. А. Фядосік у 1973 г. у в. Крынка Асіповіцкага р-на ад Е. Аўдзейчык. АІМЭФ, ф. 8, воп. 73, спр. 70, бл. 3, арк. 21 |
| 300 | А ў нашага суседа... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 64 |
| 301 | Ой, сваточкі, галубочкі, просім вас... | Жанчына ў бел. тв-ці, 155 |
| 301 | Ой, у полі, у полі... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 437—438 |
| 302 | Прыйшоў на вяселле наш сваток... | *Цітовіч Г. І.* Анталогія беларускай народнай песні, 105 |
| 302 | Ды казалі наш малады... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 80 |
| 303 | Наша маладая — суравежка, суравежка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 173 |
| 303 | А куды ж ты, наша Манячка, глядзела?.. | *Там жа*, 72—73 |
| 303 | Кукавала зязюлька, што лес мал... | *Ширма.* Двести песен, 87 |
| 304 | Хвалілася цешча зяцем... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 73 |
| 304 | Ты мой садыньку, вінаграданьку... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 320 |
| 304 | А хто, а хто магілачку патаптаў?.. | *Шырма.* Бел. песні, 76 |
| 305 | Знаць па вутаньцы... | *Шейн.* Бел. песни, 339 |
| 305 | Ясная заранachка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 71 |
| 305 | Зялён рамон па падвор'ю сцеліцца... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 384 |
| 306 | Мая мамачка, заставайся здарова... | *Шейн*, т. 1, ч. 2, 115 |
| 306 | Страпянулася ластаўка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 318 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 306 | Лісцем дарога прысцілаецца... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 164 |
| 307 | Адчыняй, матка, аконца... | Зап. А. Клышко ў 1967 г. у в. Мілеўцы Навагрудскага р-на ад А. Коршун (1912 г. н.). АІМЭФ, ф. 13 воп. 10, спр. 25, арк. 9 |
| 307 | Адчыні, матулька, варота... | *Чуркін,* 112 |
| 307 | Выносъ, маці, дзежку... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, 165 |
| 308 | Ой, знаці, знаці... | Зап. А. Клышко ў 1967 г. у в. Мілеўцы Навагрудскага р-на ад А. Коршун (1912 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 25, арк. 9. |
| 308 | Не плач, малодачка... | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 81 |
| 308 | А каліна-маліна... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 94 |
| 308 | Хваліўся Іванька сваёй жаною... | *Там жа,* 86 |
| 309 | Як заручалі, тады казалі... | Зап. М. Аўхімовіч у 1967 г. у в. Гумны Крупскага р-на ад А. Сіляк (1903 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 11, сш. 7, арк. 12. |
| 309 | У новай каморы наша Анютка заснула... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 65—66 |
| 310 | Ой, гула пчолка, гула... | *Там жа,* 176 |
| 310 | Ці мая камора ў цяні стаяла... | *Там жа,* 431 |
| 311 | Ластаўка-перапёлачка... | *Там жа,* 438 |
| 311 | Сваціца, галубіца, просім вас... | *Гілевіч Н.* Песні народных свят і абрадаў, 406 |
| 311 | Аддалі мяне, забылі мяне... | *Чуркін,* 111 |
| 312 | Хаўтурныя галашэнні | |
| 312 | Мой міленькі дружок... | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 648—649 |
| 314 | А мой мілюсенькі, а мой раднюсенькі!.. | *Там жа,* 683—684 |
| 315 | Ах, мая ж ты матушка... | *Там жа,* 672—673 |
| 315 | Яблычка маё недаспелае... | *Шейн,* т. 1, ч. 2, 654—655 |
| 316 | Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае... | *Там жа,* 657—658 |
| 318 | Дзедка мой, галубочак мой! | *Там жа,* 690 |
| 318 | Бабка мая, зязюлька мая! | *Там жа,* 690—691 |
| 319 | Прыказкі і прымаўкі | *Янкоўскі Ф. М.* Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы. Мінск, 1962; Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР |
| 339 | Загадкі | |
| 345 | Казкі | |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 347 | Лісічка-сястрычка і воўк | Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мінск, 1971, с. 38 |
| 348 | Каток, пеўнічак і лісічка | *Шейн*, т. 2, 1—3 |
| 350 | Дзедава рукавічка | «Могилевская старина».— Сб. ст. «Могилевские губернские ведомости» под ред. Е. Романова, вып. 3. Могилев, 1903, с. 81—82 |
| 351 | Зайчык і вожык | *Klich F.* Texty białoruskie z powiaty Nowogrodskiego. Materyaly i prace Komisyi językowey. Kraków, t. 2, b. 1, 1907 |
| 352 | Мужык, воўк і ліса | Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі, 153 |
| 353 | Лісічка-сястрычка, заяц, воўк і мядзведзь | Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі, 277—282 |
| 358 | Ліса-каталічка | *Романов*, вып. 3, 28 |
| 358 | Воўк, лісіца і аўца | *Там жа*, 35 |
| 359 | Вайна ваўка з сабакам | *Шейн*, т. 2, 259—261 |
| 361 | Сачыўка | Зап. Л. М. Салавей у в. Навасёлкі Мядзельскага р-на Мінскай вобл. ад Н. Скурко (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 84 |
| 362 | Курка-рабушка | *Романов*, вып. 3, 1—2 |
| 364 | Кот Максім — сват | *Шейн*, т. 2, 11—15, № 8 |
| 367 | Казка пра падчарку | Зап. К. П. Кабашнікаў у 1974 г. у в. Смародзінка Крупскага р-на Мінскай вобл. ад Х. Кавалёвай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, спр. 91 |
| 368 | Бабіна дачка і дзедава дачка | *Шейн*, т. 2, 92—94 |
| 371 | Аб трох братох і воўку | Чарадзейныя казкі, ч. 1. Мінск, 1973, с. 486—489, № 64 |
| 374 | Два ў кораб арэшкі | Зап. К. П. Кабашнікаў у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад У. Рамбольскай (1906 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, № 44 |
| 377 | Іван Іванавіч-царэвіч | *Романов*, вып. 4, 169 |
| 386 | Іванушка-дурачок і канёк-Гарбунок | *Шейн*, т. 2, 279 |
| 389 | Рогі | *Романов*, вып. 3, 181 |
| 395 | Івашка-мядзведжае вушка | *Романов*, вып. 6, 340—347 |
| 404 | Жораваў кашалёк | *Романов*, вып. 3, 271—276 |
| 411 | Дзіва | *Шейн*, т. 2, 165—167 |
| 412 | Каток-залаты лабок | *Романов*, вып. 3, 359—361 (даецца ў скарачэнні) |

| С. | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 415 | Асілак | *Сержпутовский*, 87—90 (даецца ў скарачэнні) |
| 417 | Іванка-прастачок | *Там жа*, 149—152 |
| 419 | Каваль і аднавокае гора | *Шейн*, т. 2, 151—154 |
| 421 | Мена | *Романов*, вып. 3, 379—381 |
| 423 | Мужык, яго жонка і пан | *Шейн*, т. 2, 187—190 |
| 425 | Мужык і паніч | *Там жа*, 308—310 |
| 427 | Як мужык хітра гуся падзяліў | *Federowski*, t. 3, 149—150 |
| 428 | Кацярына | *Шейн*, т. 2, 197 |
| 429 | Пану навука | *Сержпутоўскі*, 103—107 |
| 432 | Мужык і пан | *Шейн*, т. 2, 371—373 |
| 435 | Асцярожны пасланец | *Сержпутоўскі*, 83—86 |
| 438 | Не люба — не слухай | *Шейн*, т. 2, 244—246 |
| 439 | Несцерка | *Романов*, вып. 3, 400—402 |
| 442 | Завідны поп | *Сержпутоўскі*, 40—41 |
| 442 | Поп і дзяк | *Шейн*, т. 2, 213—217 |
| 445 | Шаптуха | *Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белорусов-полешуков. Спб., 1911, с. 176—178, № 77. |
| 446 | Як я з дзедам пакутваў | *Шейн*, т. 2, 246 |
| 447 | Кулак і батрак | Беларусь у нар. тв-ці, 62 |
| 449 | Легенды і паданні | |
| 450 | Вялікі грэшнік | *Шейн*, т. 2, 371—373 |
| 451 | Як чалавек зрабіў агонь... | АІМЭФ, ф. 9, воп. 3, спр. 20, арк. 332 |
| 452 | Адкуль сяляне і паны... | *Pietkiewicz Cz.* Kultura duchowa Polesia Kzeczyckiego. Warszawa, 1938, с. 78—79 |
| 452 | Чаму варагуюць сабака, кот і мышы | *Шейн*, т. 2, 349, № 195 |
| 453 | Салдат Дзяніс і смерць | *Шейн*, т. 2, 412 |
| 454 | Аб Воўгі, Дняпры і Сажы і бацькі іх Нівісном | *Добровольский*, ч. 1, 233—234 |
| 455 | Пра Нёман і Лашу | Зап. Г. Кляўко ў 1951 г. АІМЭФ |
| 456 | Пра чайку і возера Нарач | *Астаневіч М.* Скарбы Нарачы.— «Звязда», 1966, 5 ліпеня |
| 456 | Ад чаго Нясвіж пашоў | Зап. В. В. Максімовіч у 1951 г. у в. Лань Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. ад Л. Дашка |
| 457 | Пра скарб | *Pietkiewicz Cz.* Kultura duchowa Polesia Kzeczyckiego. Warszawa, 1938 |
| 457 | Чаму бабы работаюць не аддыхаючы | *Шейн*, т. 2, 399 |
| 457 | Ілья і Пятро | *Сержпутоўскі*, 16 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 459 | Як п'яніца ў рай папаў | *Добровольский*, ч. 1, 255—286 |
| 460 | Машэка | *Шейн*, т. 2, 451—453. Упершыню апубл. Ф. Падабед у «Могилевских ведомостях», 1851, № 8 (неофициальная часть). Перакл. з руск. мовы К. Кабашнікава |
| 461 | Нарач | «Нарачанская зара», 1969, 7 кастрычніка. Зап. С. Ждановіч |
| 463 | Анекдоты | |
| 464 | Віншаванне | *Шейн*, т. 2, 315 |
| 465 | Скупы пан | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 30, арк. 10 |
| 465 | Сваю службу знае | *Там жа*, арк. 16 |
| 465 | Самыя лепшыя грушы | *Там жа*, арк. 23 |
| 465 | Хітры хлапчук | Бел. жарты, 9 |
| 465 | Рахунак шаўцоў | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 30, арк. 13 |
| 466 | Рапарт пану | Бел. жарты, 10 |
| 466 | Разышоўся, як заечае сала | *Там жа*, 10—11 |
| 466 | І пану дасталося | *Там жа*, 34 |
| 467 | Суддзя і селянін | *Там жа*, 12 |
| 467 | Дурны суддзя | *Там жа*, 15 |
| 467 | Добра зразумеў | «Наша ніва», 1914, 16 мая |
| 467 | Свінка паела | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 30, арк. 10 |
| 467 | Жартаўлівы гаспадар | *Federowski*, t. 3, 116 |
| 468 | Жартаўлівы парабак | *Там жа*, 118 |
| 468 | Шануй старога, як дзіця маленькае | *Там жа*, 28 |
| 468 | Тату на старасць | *Там жа*, 28 |
| 469 | Пан і мужык | Зап. В. П. Коўчур у 1946 г. у в. Чырвонае возера Старобінскага р-на ад Ф. Берніховіча. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 17, сш. 2, арк. 9 |
| 469 | Няхай | *Сержпутоўскі*, 37—38 |
| 470 | Асцюкі | Бел. жарты, 79 |
| 471 | Сын Хвядос | *Шейн*, т. 2, 306—307 |
| 472 | Ото ж добрая пасудзіна | *Сержпутоўскі*, 237—238 |
| 472 | Што бог злучыў, таго не разлучай | *Там жа*, 239—240 |
| 474 | Набожны ксёндз | *Шейн*, т. 2, 322 |
| 474 | Ці ведаеш, што гэта тройца? | *Там жа*, 321 |
| 475 | Пропаведзь | *Federowski*, t. 3, 209 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 475 | Поп і запаведзі | Бел. жарты, 36—37 |
| 476 | Карась | Беларускі народ супраць папоў і рэлігіі. Мінск, 1939, с. 42 |
| 476 | Пра аднаго дзеда і Міколу | Антырэлігійныя казкі, частушкі, прыказкі. Мінск, 1957, с. 67 |
| 476 | Споведзь шляхціча | *Federowski*, t. 3, 174 |
| 476 | Папоўская пропаведзь | «Беларусь», 1959, № 1, с. 29 (зап. Я. Колас) |
| 476 | Разжаліў | *Романов*, вып. 3, 428 |
| 477 | У пекле | «Беларусь», 1960, № 6, с. 27 |
| 477 | Бедная баба | Бел. жарты, 1 |
| 477 | Мужчына за мужчыну цягне | *Federowski*, t. 3, 79—80 |
| 477 | Дзіцятка | Бел. жарты, 2 |
| 478 | Не тутэйшы | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 30, арк. 16 |
| 478 | Колькі год | Бел. жарты, 6 |
| 478 | Вялікі чын | *Там жа*, 7 |
| 478 | Немажлівая рэч | *Там жа*, 8 |
| 478 | Калі селянін есць курыцу? | Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 г., с. 17 |
| 478 | Пакаштаваў | Народныя ўсмешкі. Мінск, 1961, с. 14 |
| 479 | Гераічны і гістарычны эпас | |
| 480 | Казкі на былінныя сюжэты | |
| 480 | Ілья | *Романов*, вып. 3, 259—262 (друкуецца ў скарачэнні) |
| 483 | Аб Ілюшку | Бел. эпас, 57—61 |
| 487 | Бязногі багатыр | *Сержпутоўскі*, 47—52 |
| 491 | Іван Пракрасны і князь Ладымяр | *Шейн*, т. 2, 168—170 |
| 493 | Курыла Кажамяка | *Романов*, вып. 3, 217—219 |
| 494 | Паданні | |
| 494 | Асілкі | Бел эпас, 145—146 |
| 495 | Адкуль Рубеж | *Там жа*, 212 |
| 496 | Пра вайну са шведамі | Рукап. аддз. б-кі Вільнюск. ун-та, А-63/II. 172 |
| 496 | Бітва пад Лясной | Бел. эпас, 213 |
| 496 | Вайна шведска | *Federowski*, t. 3, 5 |
| 496 | Платон-казак | *Сержпутоўскі*, 166—167 |
| 497 | Гістарычныя песні | |
| 497 | Вох вы, людзі, людзі старыя... | *Добровольский*, ч. 4, 609—610 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 499 | Як белы свет завадзіўся... | Зап. В. І. Скідан у 1973 г. у в. Звіняцкае Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. ад А. Апанасенкі (1898 г. н.). АІМЭФ, ф .8, воп. 73, спр. 71, сш. 2, арк. 48—50 |
| 501 | Сяўрук | *Шейн,* т. 2, 178—179 |
| 502 | Прыехаў дзед на паляначку... | Бел. эпас, 162 |
| 503 | Падыймаліcь чорны хмары... | *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускай літаратуры. Вільня, 1925, 58 |
| 503 | Вох ты, ёлка, ялінка... | *Добровольский,* ч. 4, 10 |
| 504 | Каля лесу, каля цёмнага... | Бел. эпас, 167 |
| 504 | Ой, лятаў-палятаў ды сівы гарол... | *Там жа,* 175—176 |
| 505 | Із-за Слуцка, із-за Клецка... | *Там жа,* 182 |
| 506 | Ой, у горадзе Магілёве дымам пацягнула... | *Там жа,* 183 |
| 506 | Хранцуз бераг заступіў... | *Там жа,* 192 |
| 507 | Каля рэчачкі Дняпра... | *Там жа,* 204 |
| 508 | Спомнім, братцы, пра былое... | *Добровольский,* ч. 4, 635 |
| 509 | Пазаабрадавыя песні | |
| 511 | Антыпрыгонніцкія песні | |
| 511 | Ах ты сонца-сонейка... | *Шейн.* Бел. песни, 77 |
| 511 | Не плач, маё дзіцятка... | *Бычко-Машко И. Е.* Сборник народных песен. Спб., 1911, с. 34 |
| 511 | А ў бары зязюлька кукуе... | Жанчына ў бел. тв-ці, 258 |
| 512 | Добры наш пан, добры наш пан... | Нар. тв-ць, 103 |
| 512 | У там той вёсцы вецер вее... | *Czeczot,* 30 |
| 513 | Ой, со дома, пане браце... | *Грынблат,* 166 |
| 515 | Бадай пану ў дварэ страшна... | *Гильтебрандт П.* Сборник памятников народного творчества Северо-Западного края. Вильна, 1866, с. 122 |
| 515 | Ой, закурэла, ой, ды задымела... | *Цітовіч,* 253—254 |
| 516 | Ой, ты, дуб-дубіна... | *Чуркін,* 115 |
| 516 | Прывыкайце, чорны вочы... | *Цітовіч,* 258 |
| 517 | Каліна-маліна... | *Там жа,* 263 |
| 517 | Ты запей, запей, жавароначак... | *Там жа,* 255 |
| 518 | Рэкруцкія песні | |
| 518 | Зашумела дубровачка зялёная... | *Грыневіч А., Зязюля А.* Беларускія песні з нотамі, т. 2. Пб., 1912, с. 36 |
| 518 | Ой, з-пад лесу, лесу цёмнага... | *Шырма,* т. 2, 329—330 |
| 519 | З-пад зялёнага дуба... | *Federowski,* t. 5, 798 |

| С. | Змест | Крыніцы |
| --- | --- | --- |
| 520 | Цёпла восень і з дажджом... | АІМЭФ, воп. 10, спр. 78, сш. 2, арк. 5 |
| 520 | У канцы садзіку зялёнага... | *Чуркін*, 124 |
| 521 | Баравая ягадачка... | *Шырма*, т. 2, 325 |
| 521 | Салдацкія і казацкія песні | |
| 521 | А ў нядзельку рана стала рассвітаці... | *Радченко*, 192 |
| 522 | Цёмна ночка да нявідная... | *Гильтебрандт П.* Сборник памятников народного творчества Северо-Западного края. Вильна, 1866, с. 12—13 |
| 522 | Гэй, зашумела зялёна дуброва, шчыры бор... | АІМЭФ, ф. 8, спр. 26, сш. 3, арк. 45—46 |
| 523 | Як я молада была... | *Цітовіч*, 224 |
| 524 | У нядзельку раненька... | *Там жа*, 222—223 |
| 525 | Ды на нашым гародзе... | *Чуркін*, 122—123 |
| 527 | Каліна-маліна... | *Цітовіч*, 231 |
| 527 | Зазвінелі новы ключы... | *Там жа*, 235 |
| 528 | Ах ты, зорка мая... | *Там жа*, 236 |
| 528 | Зялёная ды дуброванька... | *Шырма*, т. 2, 360—361 |
| 529 | Шчука-рыба у моры... | *Гильтебрандт П.*, с. 59—60 |
| 530 | Ой ты, поле маё... | *Чуркін*, 128 |
| 531 | Памёр, памёр салдаціку... | *Там жа*, 129—130 |
| 532 | Прыляцелі гусі... | *Шырма*, т. 2, 312 |
| 533 | За гарою трава шуміць... | *Булгаковский Д. Г.* Пинчуки... Спб., 1890, с. 138—139 |
| 533 | Ой, у полі пад вішанькаю... | *Czeczot*, 25 |
| 534 | Дзе крыніца глыбокая... | *Шырма*, т. 2, 304—305 |
| 535 | Цёмна ночка наступае... | *Грыневіч А., Зязюля Н.*, т. 2, с. 21—22 |
| 535 | Чумацкія, бурлацкія і прымацкія песні | |
| 535 | Чумак рана уставае... | *Радченко*, 195 |
| 536 | Валы мае палавыя... | АІРЛ АН СССР, кал. 30, сш. 1, арк. 38 |
| 536 | Ты чумача, чумача... | АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 4, сш. 1, арк. 15—20 |
| 537 | Дзе ж ты, бурлак, валачыўся... | *Грынблат М. Я.* Песні беларускага народа, т. 1. Мінск, с. 113—114 |
| 537 | Да сядзіць пугач у лузе на каліне... | *Там жа*, 117 |
| 538 | Ой, хто не служыў, братцы, у багатыра... | *Там жа*, 118 |
| 539 | А нікому, а нікому... | АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 63, сш. 1, арк. 42 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 540 | Расцвілася чарэшанька... | Зап. М. Я. Грынблат у 1970 г. у в. Падзюргеляны Эйшыцкага р-на Літоўскай ССР ад В. Лялькі. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 26, сш. 1, арк. 39—47 |
| 542 | Сямейна-бытавыя песні | |
| 542 | Піце, піце, госцейкі, піце... | Зап. А. Емельянаў у 1960 г. у в. Цяцерын Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл. ад Ф. Нырцовай (1914 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 8, арк. 54 |
| 542 | Ах вы, столікі мае... | *Чуркін*, 105, № 69 |
| 542 | На гарэ вярбіца... | Зап. А. І. Гурскі ў 1965 г. у в. Ляды Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. ад Е. Г. Клімавай (1917 г. н.) і П. Каржаевай (1918 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 95, бл. 1, арк. 8 |
| 543 | Ой, за бор, за бор... | *Шырма*, т. 2, 26, № 12 |
| 543 | Ды ўжо сонейка за лес коцішца... | *Цітовіч*, 180 |
| 544 | Ты, каліна, ты, маліна... | *Там жа*, 177 |
| 545 | Чырвоная каліначка... | *Там жа*, 178 |
| 546 | Стуку-груку... | Зап. Г. А. Барташэвіч у 1968 г. у в. Прысынкі Уздзенскага р-на ад В. С. Шыдлоўскай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 6, сш. 4, арк. 3, № 2 |
| 546 | Што на свеце пачуваецца... | *Шырма*, т. 2, 81, № 53 |
| 547 | Ой, зелена, зелена... | *Грыневіч А., Зязюля А.*, т. 2, 19, № 16 |
| 547 | Як пайду я ў каморачку... | *Шырма*, т. 2, 39, № 21 |
| 548 | Я ўчора ў піру была... | *Цітовіч*, 277 |
| 549 | Бяда салаўю, бяда... | *Шырма*, т. 2, 213, № 151 |
| 549 | Ой, запяю песню вясёлую... | Зап. М. А. Янкоўскі ў 1959 г. у в. Вёснаў Глускага р-на ад А. Верашчакі. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 3, сш. 1, арк. 55 |
| 550 | Ой, палын — трава горкая... | *Шырма*, т. 2, 54, № 32 |
| 550 | Ой, гаю мой, гаю... | *Цітовіч*, 181 |
| 551 | Чырвоная каліначка... | *Грыневіч А., Зязюля А.*, т. 2, с. 5—6 |
| 552 | Ой горкая я і доля мая... | Зап. Ул. К. Цішчанка ў 1975 г. у в. Улукі Слаўгарадскага р-на ад В. К. Цішчанкі. АІМЭФ, ф. 8, воп. 75, спр. 104; сш. 1, арк. 68 |
| 552 | Вярба, вярба, дзе ж ты расла?.. | *Цітовіч*, 187 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 553 | О, не кукуй, зязюленька, рана... | *Там жа,* 190—191 |
| 554 | Белая бярозачка... | Зап. М. А. Янкоўскі ў 1959 г. у в. Вёснаў Глускага р-на ад А. Верашчакі. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 3, сш. 1, арк. 66 |
| | Любоўныя песні | |
| 555 | Ой, у полі верба расла... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 181 |
| 555 | Ой, зарадзілі сільна, буйна... | *Цітовіч,* 113 |
| 556 | А ў полі вярба... | *Там жа,* 116 |
| 556 | Ой, рабіначка... | *Там жа,* 100 |
| 557 | Ляціць галка цераз балку... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, с. 192—193 |
| 558 | Чаму не прыйшоў, ці не прыехаў... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 285 |
| 558 | Ці свет, ці світае... | *Цітовіч,* 126—127 |
| 559 | Зялёны дубочак... | *Там жа,* 110 |
| 559 | Ляціць сарока ды скрай аблока... | *Там жа,* 108—109 |
| 560 | Пайду я ў садочак... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 195—196 |
| 560 | Ці не быстрая рэчка... | Зап. Э. Н. Ледаковіч у 1959 г. у в. Лявонавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. ад Н. Чурко. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 20, арк. 92 |
| 561 | Ты, чырвоная каліна... | *Цітовіч,* 119—120 |
| 561 | На гарэ дубочак... | *Шырма,* т. 1, 86 |
| 562 | Усе хмарачкі ды па парачцы... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 99—100 |
| 563 | Ой, крушына, крушына... | Дзень паэзіі. Мінск, 1969, с. 140—141. |
| 563 | Ой, ці ўсе лугі пакошаны... | *Шырма,* т. 1, 66 |
| 564 | Ой, белая бярозанька... | *Там жа,* 60 |
| 565 | Ой, пад гаем зяляненькім... | Зап. В. Шымук у 1959 г. ад калгасніка сельгасарцелі імя Чапаева Дзятлаўскага р-на А. К. Вайцешкі. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 9, сш. 1, арк. 34 |
| 565 | Цякла рэчка з-пад мястэчка... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 400 |
| 566 | Туман, туман па даліне... | *Грыневіч А., Зязюля А.,* т. 2, 7—8 |
| 567 | А дзе тая крынічанька... | *Там жа,* 4 |
| 568 | Здрада, здрада, чорны бровы, здрада... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 107 |
| 569 | Ой, ляцелі гусі... | *Шырма,* т. 1, 23 |
| 569 | Паехаў мой мілы... | *Ледаковіч Э. Н.* Беларускія народныя песні Гродзеншчыны. Мінск, 1960, с. 5—6 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 569 | У агародзе вярба расла... | *Захарава В. А.* Беларускі фальклор у сучасных запісах, с. 201 |
| 570 | Ці свет, ці світае... | *Грыневіч А., Зязюля А.*, т. 2, 14 |
| 571 | Ой, хадзіла Машанька... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 186—187 |
| 571 | Ой, заржы, заржы, сівы коніку... | *Грыневіч А., Зязюля А.*, т. 2, с. 9 |
| 572 | Сядзіць голуб пры дубку... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, 329 |
| 573 | Што за месяц, што за ясны... | *Цітовіч*, 104 |
| 573 | Жартоўныя песні | |
| 573 | Ой, у полі крынічанька... | Зап. М. П. Гваздзёў у в. Азершчына Лепельскага р-на ад Г. Лапіцкай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 92, арк. 478 |
| 574 | Ой, пасею я рамоню... | *Federowski*, t. 5, 26 |
| 575 | Ой, паслала мяне маці... | Зап. М. П. Гваздзёў у 1961 г. у в. Гарадзец Кобрынскага р-на ад Е. І. Казакевіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 69, сш. 3, арк. 34 |
| 576 | Ой, хацела ж мяне маці... | *Цітовіч*, 200 |
| 577 | Сам не знаю, не ведаю... | *Там жа*, 286 |
| 577 | Хлопец пашаньку пахае... | *Там жа*, 289 |
| 578 | Ой, пайду я лугам... | *Ледаковіч Э. Н.* Беларускія народныя песні Гродзеншчыны, 70 |
| 578 | Чабарок, чабарок... | *Цітовіч*, 285 |
| 579 | Чаму ж мне не пець... | Жарт. песні. Складанне І. К. Цішчанкі. Мінск, 1974, с. 70 |
| 579 | На дварэ дожджык... | Зап. М. П. Гваздзёў у 1958 г. у в. Азершчына Лепельскага р-на ад Г. Лапіцкай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 92, арк. 475 |
| 580 | А мой мілы захварэў... | *Цітовіч*, 273—274 |
| 581 | Было ў цёшчы сем зяцёў... | *Добровольский*, ч. 4, с. 377 |
| 583 | Спарадзіла чачотачка семера дачок... | *Шейн.* Материалы, т. 1, ч. 1, с. 527—529 |
| 584 | А як дзед з бабай пайшоў па каліну... | *Романов*, т. 1, 1—2 |
| 585 | Пасеяў мужык грэчку... | Зап. І. І. Лушчыцкая у 1960 г. у в. Засулле Стаўбцоўскага р-на ад А. К. Кумец. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 52, арк. 25 |
| 585 | А ў верасні месяцы... | Зап. І. С. Курбека ў 1960 г. у Докшыцкім р-не. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 7 |
| 586 | Ах, ты дуй, ах, ты дуй... | *Грынблат*, 266 |
| 587 | Захацела бабусенька... | *Чуркін*, 160 |
| 588 | Ой, у лесе пры даліне... | АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 48, сш. 2, арк. 1б |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 589 | Песні да танцаў, скокаў і гульняў | |
| 589 | Юрачка | *Чуркін*, 172 |
| 590 | Кадрыль | *Там жа*, 174 |
| 590 | А Мікіта жыта носіць... | *Чуркін*, 174 |
| 590 | Антон маладзенькі... | *Там жа*, 173 |
| 591 | Падушачка, падушачка... | *Цітовіч*, 314—315 |
| 591 | А Лявоніху Лявон палюбіў... | *Там жа*, 304—305 |
| 592 | А у полі ніўка... | *Цітовіч*, 311 |
| 594 | Гэй, гэй, таўкачыкі... | *Чуркін*, 172 |
| 594 | Пасеялі дзеўкі лён... | *Цітовіч*, 316 |
| 594 | Старэнькі дзедка... | *Чуркін*, 169 |
| 594 | Ой, да прадай, бабушка, бычка... | *Цітовіч*, 321—322 |
| 596 | Жаніцьба Цярэшкіна... | *Шырма*, т. 3, 284 |
| 599 | Яшчар | *Шырма*, т. 3, 283 |
| 600 | Балады | |
| 600 | На бітым гасцінцы... | *Шырма*, т. 1, 275—276 |
| 601 | Гэй, там пры дарозе... | *Там жа*, 279—280 |
| 602 | А дзе месяц, дзе зара... | *Там жа*, 295—296 |
| 603 | Бандароўна... | Жанчына ў бел. тв-ці, 127—129 |
| 604 | Наляцелі жураўлі... | *Шейн*. Бел. песни, 143—144 |
| 606 | Крапіўка мая стрыклівая... | Зап. Г. А. Барташэвіч у 1965 г. у в. Ляўкі Аршанскага р-на Віцебскай вобл. ад П. М. Ступаковай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 12, арк. 20 |
| 607 | Жыла ўдоўка на адзіноцы... | Зап. Л. М. Салавей у 1974 г. у в. Малыя Хальнявічы Крупскага р-на ад Е. П. Каралёвай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 74, с. 84, сш. 1, арк. 15 |
| 608 | Пайшла Ціхоня ў места... | Зап. І. І. Мазанік у 1971 г. у в. Пятрылавічы Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. ад Я. Трубіш. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, с. 35, сш. 7, арк. 7 |
| 609 | Ой, у Слуцку на рыначку стала навіна... | Зап. Е. Зяленска-Дмухоўска. ДДГА Літоўскай ССР, ф. 1135, воп. 10, спр. 219, арк. 54—54 а, б |
| 609 | Ой, загадалі на вайну... | *Бессонов П. А.* Белорусские песни. М., 1871, с. 39—40 |
| 610 | Прыехалі да Марусі госці... | АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 76, сш. 1, арк. 20. Зап. Л. М. Салавей |
| 611 | Жана з мужам не ў любосці жыла... | Зап. Л. М. Салавей у 1966 г. ад В. Г. Хацяновіч (1907 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, вып. 10, сш. 45, арк. 5 |
| 612 | А з-пад гаю галка вылятала... | *Гілевіч Н.* Песні сямі вёсак, с. 140—141 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 613 | **Дзіцячы фальклор** | |
| 615 | Калыханкі | |
| 615 | А-а, а-а, каткі два... | Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 39, сш. 1, арк. 46 |
| 615 | Люлі-люлі-люлі... | *Шейн*. Бел. песни, с. 16 |
| 615 | Пайдзі, коця, на вулку... | *Там жа*, 20 |
| 616 | Ах ты, коцік, мой каток... | Зап. Г. А. Барташэвіч у 1968 г. у в. Белая Дуброва Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 6, сш. 2, арк. 50 |
| 616 | Люлі-люлі-люлі... | Дзіцячы фальклор. Складальнік Г. А. Барташэвіч. Мінск, 1972, с. 140 |
| 616 | А-а, люлі-люлі-люленькі... | Зап. В. Ф. Гусціновіч у 1958 г. у в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад Г. П. Дамашэвіч. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, спр. 4, сш. 1 |
| 617 | Баю-баю-баінькі... | Зап. М. П. Гваздзёў у 1965 г. у в. Вялікае Сяло Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. ад П. П. Куляшовай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 94, сш. 3, арк. 13 |
| 617 | А-а-а, люлі-люлінькі... | Дзіцячы фальклор, с. 168<br>Зап. В. Ф. Гусціновіч у 1960 г. у в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад М. Р. Гусціновіч. Фонд РДНТ |
| 617 | Ой, баю-баю-баю... | Зап. М. Я. Грынблат у 1964 г. у в. Сурміно Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. ад Н. Б. Маскалёвай. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 87, сш. 5, арк. 34 |
| 617 | А-а, а-а, малое... | Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай (1911 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 39, сш. 1, арк. 46, № 55 |
| 618 | Люляй-люляй, дзіця спаць... | *Federowski*, t 5, 613, № 1438 |
| 618 | Люлі, малое дзіця... | *Czeczot*, c. 74 |
| 618 | Забаўлянкі | |
| 618 | Ладу-ладу-ладкі... | *Грыневіч А*. Беларускі дзіцячы спеўнік. Вільня, 1925, с. 5, № 1 |
| 619 | Лады-лады-ладкі... | Дзіцячы фальклор, с. 193 |
| 619 | Кацюты, кацюты... | *Там жа*, 195 |
| 619 | Чук-чук, чукавала... | *Там жа*, 206 |
| 619 | Кую, кую ножку... | *Там жа*, 212 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 620 | Мышка, мышка, дзе была... | *Грыневіч А.* Беларускі дзіцячы спеўнік, с. 6, № 3 |
| 621 | Ішоў бай па сцяне... | *Грыневіч А., Зязюля А.*, с. 30 |
| 621 | Песні | |
| 621 | Пайшоў конік да вады... | Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай (1911 г. н). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 39, сш. 1, арк. 52—53, № 63 |
| 622 | Зайчык маленькі... | Зап. Н. М. Шнаркевіч у 1970 г. у г. Вільнюсе ад К. Асіповіч (з в. Маркава Маладзечанскага р-на). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 37, сш. 2, арк. 15 |
| 622 | А шэрая козанька... | *Грыневіч А.* Беларускі дзіцячы спеўнік, с. 11, № 10 |
| 622 | Заклічкі, прыгаворкі | |
| 622 | Сонейка, сонца... | Зап. Г. А. Барташэвіч у 1971 г. у в. Дукора Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. ад дзяцей. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 40, арк. 10 |
| 622 | Дождждык, дожджык, секані... | Тэкст зап. Г. А. Барташэвіч, мелодыю — В. І. Ялатаў у 1971 г. у в. Хацежына Мінскага р-на Мінскай вобл. ад вучняў Ульянаўскай пачатковай школы. АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 40, арк. 40 |
| 622 | Дожджык, дожджык, крапані... | Зап. А. С. Емельянаў у 1971 г. у в. Прынёманне Гродзенскага р-на Гродзенскай вобл. ад Л. Кірэні (11 год). АІМЭФ, ф. 8, воп. 2, спр. 42, арк. 30 |
| 623 | Не йдзі, не йдзі, дожджыку... | *Грыневіч А.* Беларускі дзіцячы спеўнік, с. 13, № 14 |
| 623 | Гары, гары гарка... | *Federowski*, t. 5, 617, № 1452 |
| 623 | Калода, калода... | Дзіцячы фальклор, с. 364 |
| 623 | Слімак, слімак... | *Там жа*, 369 |
| 624 | Калека, калека... | *Романов*, 2, 172 |
| 624 | Каза, каза, дай малака... | *Добровольский*, 4, с. 477 |
| 624 | Жылі-былі мужыкі... | *Там жа*, 477 |
| 624 | Да вілася пчолачка... | Дзіцячы фальклор, с. 374 |
| 624 | Ехала ікаўка... | *Там жа*, с. 374 |
| 624 | Дражнілкі | |
| 624 | Мі-кі-та! Ці ты та?.. | *Шейн П.* Бел. песни, с. 35 |
| 625 | Наталля — пралля... | *Там жа*, 36 |
| 625 | Дзілінь-дзілінь-баў!.. | *Романов*, 2, № 76, № 8 |
| 625 | Віця, Віця, Віцяля... | Дзіцячы фальклор, с. 380 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 625 | Сяргей-верабей... | *Там жа*, 380 |
| 626 | Лічылкі | |
| 626 | Раз, два, тры, чатыры... | *Там жа*, 393 |
| 626 | Раз, два — булава... | *Там жа*, 399 |
| 626 | Раз, два, тры, чатыры... | *Там жа*, 400 |
| 626 | Сядзіць немец на паліцы... | *Там жа*, 400 |
| 626 | Сядзіць зайчык на прыпечку... | *Там жа*, 401 |
| 626 | Первенчыкі... | *Там жа*, 401 |
| 627 | Сем семярэй... | *Там жа*, 402 |
| 627 | Саломінка... | *Добровольский*, 2, 491—492 |
| 627 | Чыкі-чыкі-чыкарок... | Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Бараўцы Куранецкага р-на ад дзяцей. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 1, арк. 140 |
| 627 | Цок-цыгірок... | *Романов*, вып. 8, 567 |
| 628 | Кацілася тоoба... | Зап. І. Л. Сагарава ў 1950 г. у в. Веляцін Хойніцкага р-на. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 35, сш. 1, арк. 13 |
| 628 | Эна, бэна, рэсь... | Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Порса Куранецкага р-на ад Галі Сінко (12 гадоў). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 1, арк. 161 |
| 628 | Э-ката, пэ-ката, мэ... | Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Палачаны Маладзечанскага р-на ад Ніны Струмілінай (13 гадоў). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 1, арк. 170 |
| 629 | А ты, коцік, не гуляй... | *Романов*, вып. 8, 567 |
| 629 | Гульні | |
| 629 | Палачка-шукалачка | Дзіцячы фальклор, 501 |
| 629 | Гарлачыкі | *Добровольский*, 4, 496 |
| 629 | У яркі | *Романов*, вып. 8, 576—577 |
| 630 | У пераскочкі | *Там жа*, 565 |
| 630 | У каваля | *Чарняўская*. Дзяціныя гульні, с. 542 |
| 630 | У казу | *Романов*, вып. 8, 568—569 |
| 631 | У караля | *Шейн*, т. 3, 215—216 |
| 631 | Прарок | Дзіцячыя гульні, с. 5 |
| 631 | У чыжыка | *Романов*, вып. 8, 580 |
| 633 | Частушкі | *Никифоровский*; *Кабашнікаў*, *Цішчанка*. АІМЭФ, ф. 8, 9 |
| 643 | Народны тэатр | |
| 644 | Апісанне батлеечнага прадстаўлення, якое адбывалася ў Рэчыцы, Мозыры, Капаткевічах і Парычах | *Шейн*, т. 3, 141—144 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 647 | Апісанне батлеечнага прадстаўлення былой Мінскай губерні | *Барышаў, Саннікаў,* 143—144 |
| 647 | Цар Ірад | Известия отделения русского языка и словесности императорской академии, т. 13, кн. 2. Спб., 1908, с. 71—78 |
| 653 | Батлеечнае прадстаўленне на Навагрудчыне | *Барышаў, Саннікаў,* 149—162 |
| 664 | Слуцкая батлейка | Зап. С. Баркоўскі ў 1957 г. у г. Слуцку ад удзельніка батлейкі С. Трывога. АІМЭФ, ф. 1, спр. 5, арк. 114—127 |
| 672 | Цар Мамай | Зап. К. П. Кабашнікаў у 1960 г. у в. Бялевічы Слуцкага р-на ад С. В. Дудара (1890 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 57, сш. 3, арк. 23—29 |
| 677 | **Фальклор рабочых. Паэзія змагання** | |
| 678 | Прывыкайце, чорны вочы... | Песні бел. народа, 87 |
| 679 | Ой ты, доля, наша долечка... | Зап. Н. Андрэева ў 1962 г. у в. Рацэмля Навагрудскага р-на ад В. Будзюк. АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 1 |
| 679 | Горка, доля ты батрацкая... | Беларускія народныя і рэвалюцыйныя песні. Мінск, 1938, с. 160 |
| 680 | Ой, ляцелі гускі... | Песні бел. народа, 92 |
| 680 | Не па ўласнай мы ахвоце... | «Народна творчісць та етнографія», 1963, № 3, с. 77 |
| 680 | Салавей мой сізакрылы... | Песні бел. народа, 131 |
| 681 | Ой ты, салавейку, ой ты, рабакрылы... | *Там жа,* 130 |
| 681 | А хто не быў на чыгунцы... | *Там жа,* 134 |
| 682 | Дзе работаюць шахцёры... | «Народна творчісць та етногра- 1963, № 2, с. 76 |
| 682 | Жыццё маё нялёгкае... | «Полымя рэвалюцыі», 1935, № 8, с. 130 |
| 682 | Раз, было, я замарыўся... | *Васілёнак С. І.* Народная творчасць. Мінск, 1940, с. 248 |
| 682 | Пажыў, пажыў я на свеце... | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 206—207 |
| 682 | Поўна, братцы, нам крушыцца... | *Грынблат,* 213—214 |
| 683 | Мы ж не зналі, братцы-таварышы... | *Там жа,* 215 |
| 684 | У нядзельку раненька... | Зап. М. Чуркін і І. Сербаў у 1936 г. у в. Лядцо Пухавіцкага р-на ад Аню- |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| | | ты і Альжбеты Жаўнерчык. АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 5, арк. 31—32 |
| 684 | Салдацкая песня напярэдадні Кастрычніка | «Полымя рэвалюцыі», 1937, № 11, с. 165 |
| 684 | Адпусцілі сялян «на свабоду»... | Бел. народ.., 121 |
| 685 | Жыў у Петраградзе адзін негадзяй... | Песні бел. народа, 217 |
| 685 | Мікалаю, Мікалаю... | *Никифоровский*, 4 |
| 685 | А мы бога паміналі... | *Там жа*, 8 |
| 686 | Салдацкія прыпеўкі... | Зап. М. Жылінскі ў 1962 г. у в. Каміяніцы Свіслацкага р-на ад Іосіфа Карася (1879 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 10, спр. 2. |
| 687 | **Народна-паэтычная творчасць Заходняй Беларусі** | |
| 689 | Шалейце вы, каты! | Зап. А. Ліс у 1961 г. на Слонімшчыне ад розных асоб. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 76, сш. 3, арк. 11 |
| 690 | Атаман Муха | «Чырвоны сцяг». Вільня, 1924, № 3 |
| 691 | Прыпеўкі | «Чырвоны сцяг», 1925, № 4 |
| 691 | Заходнебеларускі гімн | Зап. А. Ліс у 1961 г. у г. п. Любча ад Аеры Булаўка (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 13, воп. 8, спр. 43, арк. 32. Фальклорны варыянт верша Я. Купалы |
| 691 | Нёман | *Цітовіч*, 357 |
| 692 | Наперад, гэй... | Зап. А. Ліс у 1961 г. у г. Глыбокае ад Надзеі Сакалоўскай (1910 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 68, сш. 1, арк. 1—2. Народны варыянт верша П. Пестрака |
| 692 | Маладняк | Зап. А. Ліс у 1960 г. у в. Еськавічы Нясвіжскага р-на ад Лукаша Капыткі (1908 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 54, сш. 4, арк. 2. Пераклад, заходнебеларускі варыянт верша А. Безыменскага |
| 692 | Кавалі | Зап. А. Ліс у 1960 г. у г. Нясвіжы ад У. Гуля (1914 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 54, сш. 4, арк. 1. Пераклад верша Ф. Шкулёва «Кузнецы» |
| 693 | Нарачанка | Зап. А. Ліс у 1961 г. у в. Пасынкі Мядзельскага р-на ад М. Субача (1896 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 68, сш. 1, арк. 12—14. |
| 693 | Нас не зломіць нядоля ліхая | «Полымя», 1956, № 9 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 694 | Гэй, наперад!.. | АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 85, арк. 4 (верш. Я. Купалы, муз. А. Грыневіча) |
| 694 | Браты мае... | «Полымя», 1956, № 9 |
| 695 | Марш бярозаўцаў... | «Полымя», 1958, № 2, с. 178 |
| 696 | Нас душаць зладзеі-акупанты... | *Каленік*, 116 |
| 696 | Чырвоная зорка | *Там жа*, 113 |
| 697 | Стары год пражыўшы... | *Там жа*, 114 |
| 698 | Заходнебеларуская купалка | *Цітовіч*, 258 |
| 698 | Ой, вядуць, вядуць... | «Вілейская праўда», 1939, 27 лістапада |
| 698 | Смерць вязня | Зап. А. Ліс у 1960 г. у в. Еськавічы Нясвіжскага р-на ад Лукаша Капыткі (1908 г. н.). АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 54, сш. 4, арк. 15 |
| 699 | Пад гоман вясёлы... | *Каленік*, 115 |
| 700 | Гусі | *Грынблат М.* Падпольныя народныя песні ў былой Польшчы. «ЛіМ», 1941 15 лютага |
| 701 | **Народна-паэтычная творчасць савецкага часу** | |
| 703 | Беларуская савецкая народна-паэтычная творчасць | |
| 705 | Казкі, сказы, анекдоты | |
| 705 | Ленінская праўда | Ленін у бел. тв-ці, 17—19 |
| 707 | Вялікі багатыр | *Там жа*, 25—26 |
| 709 | Як мужык-бядняк дабіўся сваёй праўды | *Там жа*, 20—24 |
| 710 | Пяць зярнят | *Там жа*, 29—30 |
| 712 | Проська-змагарка | Жанчына ў бел. тв-ці, 136 |
| 713 | Было ды мінулася гора | Беларускі народ супраць папоў і рэлігіі. Мінск, 1939, 99—100 |
| 714 | Жыццё без бога і святых | *Там жа*, 108 (друкуецца ў скарачэнні) |
| 714 | Варажбітка | Зб. «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны». Мінск, 1961, с. 438—439. Зап. у 1945 г. у в. Гарадзец Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. |
| 716 | Пра мужыка Івана | *Там жа*, 444—445. Зап. А. А. Пекар у 1946 г. у в. Языль Старадарожскага р-на Мінскай вобл. |
| 717 | Камандзір Дзёмін | *Там жа, 448*. Зап. А. І. Нікіценка ў 1947 г. у в. Алехнава Сенненскага р-на |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 717 | Як Заслонаў немцаў-карнікаў сустрэў | *Там жа.* Зап. А. І. Нікіценка ў 1947 г. у в. Алехнава Сенненскага р-на ад П. Е. Маханькова |
| 718 | Як Заслонаў у разведку хадзіў | *Там жа,* 451. Зап. А. І. Нікіценка ў 1947 г. у в. Нямота Сенненскага р-на |
| 718 | Цвярозыя разважанні | *Там жа,* 497 |
| 718 | Вылечылі | *Там жа,* 496 |
| 718 | Курортнікі | *Там жа,* 496 |
| 718 | Добра, ды не зусім | *Там жа,* 496 |
| 719 | Дакладны адказ | *Там жа,* 489 |
| 719 | Да зімы мы не дажывём | *Там жа,* 489 |
| 719 | Красамоўнае маўчанне | *Там жа,* 489 |
| 719 | У фашысцкім шпіталі | *Там жа,* 489 |
| 719 | Храбры ваяка | *Там жа,* 489 |
| 720 | Салдацкая размова | *Там жа,* 489 |
| 720 | Дрэнны клімат | *Там жа,* 482 |
| 720 | Наваго́днія падарункі | *Там жа,* 486 |
| 720 | Бабуля і ўнучак | *Там жа,* 486 |
| 720 | У разведцы | *Там жа,* 492 |
| 720 | У нямецкім шпіталі | *Там жа,* 491 |
| 720 | Пекла і рай | *Там жа,* 481 |
| 721 | Законнае пытанне | *Там жа,* 497 |
| 721 | У нямецкай школе | *Там жа,* 497 |
| 721 | Дакладны адрас | *Там жа,* 497 |
| 721 | Ці вернемся мы ў Данбас? | *Там жа,* 497 |
| 721 | Канец ясны | *Там жа,* 497 |
| 721 | Небяспечная хвароба | *Там жа,* 479 |
| 722 | Па загадзя распрацаванаму плану | *Там жа,* 478 |
| 722 | Сур'ёзнае разыходжанне | *Там жа,* 479 |
| 722 | Гутарка сяброў | *Там жа,* 478 |
| 722 | Асвоіў | *Там жа,* 481 |
| 722 | Зазнаўся | *Там жа,* 491 |
| 722 | Сабаку з'еў | *Там жа,* 500 |
| 723 | Пяты вінаваты | *Там жа,* 500 |
| 723 | Адпачынак | *Там жа,* 481 |
| 724 | У нямецкім бліндажы | *Там жа,* 478 |
| 724 | Верная дарога | *Там жа,* 478 |
| 724 | У яго зноў баявыя поспехі | *Там жа,* 475 |
| 724 | Дарэмныя захады | *Там жа,* 475 |
| 724 | У Берліне | *Там жа,* 475 |
| 725 | Цёплае і халоднае | *Там жа,* 475 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 725 | У раённай управе | *Там жа,* 479 |
| 725 | У судзе | *Там жа,* 478 |
| 725 | Смех і слёзы | Праблемы сучаснага беларускага фальклору. Мінск, 1969, с. 166. Зап. А. Шастаковіч у 1964 г. у в. Рудзевічы Мядзельскага р-на ад І. А. Літвіновіча |
| 726 | Я не з тых | *Там жа,* 167. Зап. В. Скідан у 1964 г. у в. Мокіш Хойніцкага р-на ад У. А. Краўчанкі |
| 726 | Арыфметыка | *Там жа,* 167. Зап. В. Скідан у 1964 г. у в. Рудакоў Хойніцкага р-на ад А. П. Бржэзінскага |
| 726 | Размова суседак | *Там жа,* 168. Зап. А. Фядосік у 1967 г. у г. п. Мікашэвічы ад В. С. Данілава |
| 726 | Выкруціўся | *Там жа,* 165. Зап. В. Маеўскі |
| 726 | Песні | |
| 726 | У Маскве сяе ночы Ленін будзе | Ленін у бел. тв-ці, 39 |
| 727 | Сямён Будзённы | Чырвоная Армія і абарона Радзімы ў беларускай народнай творчасці. Мінск, 1938, с. 20—23 |
| 729 | Свецел месячка | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 227 |
| 730 | На кургане | Беларусь у нар. тв-ці, 88—89 (друкуецца ў скарачэнні) |
| 730 | А ў полі, полі, пры зялёным гаі... | Жанчына ў бел. тв-ці, 302 |
| 731 | А ў полі, полі мы спяваем... | Дарэвалюцыйная і савецкая Беларусь у народнай творчасці. Мінск, 1938, с. 214—216 |
| 732 | Я старэнькая... | АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 60, арк. 84 |
| 733 | Пайду, пайду, Ясю мілы... | Песні бел. народа, 377—378 |
| 733 | Вішанька | *Шырма Р.* Беларускія песні. Мінск, 1955, с. 117 |
| 734 | За гарою ля крыніцы... | Жанчына ў бел. тв-ці, 369 |
| 734 | Да ўжо вечар вечарэе... | Зап. І. Цішчанка ў 1956 г. у в. Дзялячыцы Любчанскага р-на ад М. І. Клімовіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 39, сш. 6, арк. 15. |
| 734 | Як сабраў брыгадзір жнеек... | Беларусь у нар. тв-ці, 219 |
| 735 | А над ракою... | Зап. у 1937 г. ад Н. Сямашка ў Нацкім сельсавеце Ветрынскага р-на. АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 23, арк. 50. |
| 735 | Лён | Жанчына ў бел. тв-ці, 384 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 735 | Ці багат ты, зяцюхна?.. | *Там жа,* 442 |
| 737 | Не выходзь з-за лесу, сонца... | Зап. М. Гваздзёў у 1961 г. у в. Салтанаў Рэчыцкага р-на ад З. Ракусевіч. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 60 |
| 737 | Спявала дзяўчына... | Жанчына ў бел. тв-ці, 473 |
| 737 | Ой, у лузе, у лузе... | *Там жа,* 474 |
| 738 | Сястра брату каня асядлала... | *Там жа,* 471 |
| 738 | Люлі-люлі, мой маленькі... | *Там жа,* 447 |
| 739 | Падзяка | Песні беларускага народа. Выбранае. Укладанне і каментарыі Г. І. Цітовіча. Мінск 1959, с. 363—364 |
| 739 | Вее ў лесе вецер... | Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны, 261 |
| 739 | Праважала сына маці... | *Там жа,* 60. Зап. М. Меяровіч у 1945 г. у в. Чудзін Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Мелодыю зап. Л. Мухарынская ў 1951 г. у г. Касцюковічы ад Е. Віраб'евай |
| 740 | На кані вараным... | Зап. В. І. Ялатаў у 1957 г. у в. Верхняя Тошчыца Быхаўскага р-на ад В. А. Сысоевай і Т. І. Ціханцовай. АІМЭФ, ф. 2, воп. 7, № 3 |
| 740 | Цячэ рэчка ля паляны... | Зап. І. С. Тулупаў у в. Белае Балота Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Р. І. Палавінка. АІМЭФ, ф. 13, воп. 9, № 19 |
| 741 | На полі, пакрытым туманам... | Бел. фальклор, 72 |
| 741 | У бары кукавала зязюля... | *Там жа,* 69 |
| 741 | Каб жыць на свабодзе па-людску... | *Там жа,* 63 |
| 742 | У лесе, на імшыстай палянцы... | *Там жа,* 73 |
| 742 | Ніколі не згіне ад лютых пажараў... | *Там жа,* 106—107 |
| 743 | Не зязюлька плача і кукуе... | *Там жа,* 149 |
| 744 | Ў чыстым полі, ў полі пад ракітай... | *Там жа,* 155 |
| 744 | Трава палягае... | *Там жа,* 159 |
| 744 | Быццам чорная навала... | Зап. І. Трус у 1950 г. у Уздзенскім р-не Мінскай вобл. АІМЭФ, ф. 9, воп. 1, № 16 |
| 745 | Бывайце здаровы!.. | Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны, 214—215 |
| 746 | Прыстань, прыстань, знаёмая вёска... | *Там жа,* 227 |
| 747 | Забрукуй, сівы галубочак... | *Там жа,* 238—239 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 747 | Гэй вы, фрыцы-ягамосці... | Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны, 204 |
| 747 | Ой, з-пад горкі ўсё туман... | *Там жа*, 258 |
| 748 | Пінская партызанская | Песни счастья. М.—Л., 1950, с. 15. Зап. Г. Цітовіч у в. Лунін Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. |
| 749 | Па дарожках па лясных... | Зап. М. Грынблат у 1946 г. у Мінску ад калгасніцы С. І. Сацкевіч з в. Лунін Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. АІМЭФ, ф. 9, воп. 1, № 16 |
| 749 | Партызаніць бацька Ніны... | Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны, 209—210. Зап. Л. С. Савікоўская ў 1945 г. у в. Горна Плешчаніцкага р-на Мінскай вобл. ад загадчыцы хаты-чытальні В. Р. Еляневіч, якая чула гэту песню ад партызан партызанскай брыгады імя Калініна ў 1943 г. |
| 750 | А Лявоніху Лявон палюбіў... | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 287—288 |
| 751 | Дайце ў рукі мне гармонь... | Бел. фальклор, 211 |
| 751 | Хутка сонца заззяе над намі... | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 290 |
| 752 | Над зямелькай зара йшла... | Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны, 262 |
| 753 | Із далёкіх із краёў... | Песні бел. народа, 372 |
| 753 | На магіле ружы расцвітаюць... | Бел. фальклор, 150 |
| 754 | Я рана ўстану | Сучасны фальклор, 22 |
| 754 | Гэту песню мы самі складалі... | *Там жа*, 22—23 |
| 754 | Зацвілі пралескі... | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 308 |
| 755 | Радасць жней | Сучасныя песні.., 15 |
| 755 | Жніўная | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 309—310 |
| 755 | Ясны зоры залацістыя... | Сучасны фальклор, 29 |
| 756 | Мы — людзі Савецкай зямлі... | *Там жа*, 29—30 |
| 756 | Ураджайная плясавая | *Там жа*, 31—32 |
| 757 | Брыгадзір мой міленькі... | *Чуркін*, 124—125 |
| 758 | Ой, дзеванькі, паслухайце... | *Там жа*, 122—123 |
| 759 | Жартоўная песня | Зап. Г. Барташэвіч і К. Кузняцова на аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Бабруйску ў 1952 г. АІМЭФ, ф. 9, воп. 4, № 7 |
| 760 | Беларусь мая... | Сучасны фальклор, 89 |
| 760 | Святочная | Песні над Дзвіной. Віцебск, 1959, с. 11 |

| *С.* | *Змест* | *Крыніцы* |
|---|---|---|
| 761 | Калгасная святочная | Зап. А. Фядосік ў 1958 г. у в. Сінкевічы Ленінскага р-на Брэсцкай вобл. ад М. В. Лук'яновіча. АІМЭФ, ф. 9, воп. 3, № 11 |
| 761 | Юбілейная застольная | Зап. В. Акулава ў 1951 г. у в. Азершчына ад Т. К. Лапацінай. АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, № 26 |
| 762 | У нас, у Яроміне, свята... | Зап. А. Гурскі ў 1961 г. у в. Яроміна Гомельскага р-на. Песня створана харавым калектывам в. Яроміна. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 70, сш. 3, арк. 2 |
| 762 | Прывітальная роднаму Мінску | Сучасны фальклор, 91 |
| 763 | Прывітальная Мінску | Зап. Л. Ткачова ў 1961 г. у в. Яроміна Гомельскага р-на ад удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. АІМЭФ, ф. 8, воп. 1, спр. 70, сш. 1, арк. 27 |
| 763 | Дэпутатка | АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, спр. 34, арк. 310—311 |
| 764 | Частушкі | |
| 764 | Помніць Леніна мы будзем... | Ленін у бел. тв-ці; АІМЭФ АН БССР |
| 764 | Рэвалюцыя прыйшла — людзям шчасце прынясла... | *Кабашнікаў*, Цішчнка, 63—71; АІМЭФ АН БССР |
| 765 | Наша слаўная Радзіма расцвітае і расце | *Там жа*, 72—125 |
| 767 | Нашы мужныя героі родны край праславілі | Бел. фальклор, 383—432 |
| 770 | Адышла вайна-навала... | Тэксты выбраны з раздзела пад такой жа назвай са зборніка «Сучасны беларускі фальклор», с. 21—28 |
| 773 | Дружна мы сям'ёй рашылі... | Зап. В. Акулава ў в. Азершчына Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. ад Т. К. Лапацінай. АІМЭФ, ф. 9, воп. 2, № 26 |
| 773 | Песня коціцца над светам... | *Кабашнікаў*, *Цішчанка*; Сучасны фальклор; АІМЭФ АН БССР |
| 775 | Край родны | Сучасны беларускі фальклор. Склаў І. В. Гутараў. Мінск, 1963, с. 132—133 |
| 775 | Прыказкі, прымаўкі, загадкі | Бел. фальклор, 459—480; *Янкоўскі*; Сучасны фальклор; АІМЭФ АН БССР; Загадкі. Складальнікі М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мінск, 1973 |

| С. | Змест | Крыніцы |
|---|---|---|
| 781 | **Методыка збірання фальклору** | |
| 783 | Падрыхтоўка да збірання фальклору | |
| 784 | Як запісваць фальклор | |
| 787 | Пашпартызацыя фальклорных запісаў | |

На белорусском языке.

БЕЛОРУССКИЙ ФОЛЬКЛОР. ХРЕСТОМАТИЯ.

Рэдактар *Г. А. Пятроўская*
Мастак *У. П. Савіч*
Мастацкі рэдактар *В. М. Валянтовіч*
Тэхнічны рэдактар *П. В. Фрайман*
Карэктар *Л. А. Шлыковіч*

АТ 24566. Здадзена ў набор 4/VI 1976 г. Падпісана да друку 10/XII 1976 г. Папера 70×90$^{1}/_{16}$. Друк. арк. 52,5 (61,425.). Ул.-выд. арк. 42,93. Выд. № 74—198. Заказ 3328. Тыраж 4000 экз. Цана 2 руб. 06 кап.

Выдавецтва «Вышэйшая школа» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Рэдакцыя літаратуры па філалогіі, культуры і мастацтву. 220600. Мінск, вул. Кірава, 24.
Паліграфічны камбінат ім Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, вул. Чырвоная, 23.

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР